# «КОМПАС»

## Дапаможнік па адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі

**2-е выданне (з праўкамі), 2015 г.**

**Аўтары**
Патрыцыя Брандэр
Лорэ Дэ Віт
Назіла Ганея
Руі Гомес
Элі Кін
Анастасія Нікіціна
Юсціна Пінкевічутэ

**Рэдактары**
Патрыцыя Брандэр
Элі Кін
Вера Юхаш
Анэт Шнайдэр

**Каардынацыя праекта і канчатковая рэдакцыя**
Руі Гомес

**Малюнкі**
Панчо

**Асаблівы ўклад у змест дапаможніка**
Яніна Арсеньева, Эва Борбелі-Нагі, Карына Чупіна, Ганна Клейтан, Анэт Шнайдэр, Дзьёрдзы Тот

**Аўтары першага выдання «Компаса» (2002 г.):**
Патрыцыя Брандэр, Элі Кін, Руі Гомес, Мары-Лор Лемінэр, Барбара Алівейра, Яна Андрацкова, Алесіё Сурыян, Алена Суслава

*«Компас» выдаваўся ў некалькіх публікацыях, прысвечаных выхаванню дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека, якія былі распрацаваны сектарамі адукацыі і моладзі Дырэктарата Савета Еўропы па справах дэмакратычнай грамадзянскасці і ўдзелу. Больш падрабязная інфармацыя даступна па спасылцы: www.coe.int/compass.*

Аўтары дапаможніка нясуць адказнасць за погляды, якія ў ім выкладзены;
яны не абавязкова адлюстроўваюць погляды Савета Еўропы.
Аўтарскія правы на публікацыю належаць Савету Еўропы.
Перадрукоўванне і распаўсюджванне гэтага дапаможніка ці яго частак у камерцыйных мэтах у любой форме і любымі сродкамі, электроннымі (CD-ROM, Інтэрнэт і г. д.) або механічнымі, у тым ліку метадам фотакапіравання, запісу на любы носьбіт інфармацыі або ў любую сістэму, забараняецца без пісьмовага дазволу аддзела выдавецтва (publishing@coe.int), Дырэктарата Савета Еўропы па камунікацыі (копію адправіць у Еўрапейскі маладзёжны цэнтр у Будапешце, 1-3 Zivatar utca, H-1024 Budapest, Hungary (Венгрыя); адрас электроннай пошты: eycb.secretariat@coe.int).
Перадрук матэрыялаў гэтай публікацыі дазваляецца толькі ў некамерцыйных адукацыйных мэтах і пры ўмове дакладнага цытавання крыніцы.
Выключныя аўтарскія правы на малюнкі Панчо належаць самому мастаку.
За дазволам на іх рэпрадукцыю трэба звяртацца непасрэдна да мастака, калі толькі гэта не мае непасрэднага дачынення да практыкаванняў, апісаных у дапаможніку.

Дызайн: Studio1

Малюнкі: © “Pancho”

Фатаграфіі:
старонка 67: Савет Еўропы
старонка 170 © MTI (Нельсан Мандэла)
старонка 170 © David King Collection (Яўгенія Гінзбург)
старонка 171 © MTI (Марцін Лютэр Кінг)
старонка 171 © MTI (Махатма Гандзі)
старонка 172 © Gamma Press (До Аун Сан Су Чжы)
старонка 172 © Tibet Information Network (Нгаванг Сандрол)

Малюнкі на старонках 162, 163 і 180 выканаў Джымі Казоя

© Савет Еўропы, кастрычнік 2012 г.

Першае выданне: 2002 г.
Другое выданне (поўнасцю перагледжанае і абноўленае): 2012 г.
Перадрукавана (з праўкамі): 2015 г.

Аддзел выдавецтва Савета Еўропы

F-67075 Страсбург, Cedex
ISBN 978-92-871-8116-9

Надрукавана ў Венгрыі

# *Савет Еўропы Генеральны сакратар*

Адна з самых галоўных задач XXI стагоддзя – гарантаваць правы чалавека для ўсіх.

Рэагаванне на новыя выклікі, звязаныя з правамі чалавека, з'яўляецца пастаяннай задачай для Савета Еўропы. Тым не менш правы чалавека нельга ажыццявіць аднымі юрыдычнымі мерамі. Правы чалавека лепш за ўсё выконваюцца, абараняюцца і цэняцца тады, калі мы ўсе іх разумеем, становімся на іх абарону і кіруемся імі ў сваіх дзеяннях.

Менавіта таму адукацыя ў галіне правоў чалавека – навучанне *пра* правы*, праз* правы *і для* правоў чалавека – выконвае вельмі важную ролю ў прадухіленні парушэнняў правоў чалавека і пераўтварэнні дэмакратыі ва ўстойлівы лад жыцця. Гэта асабліва тычыцца дзяцей і моладзі. Сама адукацыя ў галіне правоў чалавека з'яўляецца правам, замацаваным у артыкуле 26 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Хартыя аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека, прынятая Камітэтам міністраў у 2010 годзе, заклікае дзяржавы-ўдзельніцы забяспечыць кожнаму чалавеку ў межах іх тэрыторыі доступ да выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека праз усе магчымыя сродкі адукацыі, у тым ліку і нефармальную адукацыю. Яна таксама прызнае незаменную ролю няўрадавых грамадскіх арганізацый і маладзёжных арганізацый у гэтым працэсе.

«Компас» быў упершыню апублікаваны ў 2002 годзе з мэтай падтрымкі працы фасілітатараў адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі. Даступны на больш чым 30 мовах, «Компас» прынёс адукацыю ў галіне правоў чалавека ў жыццё незлічоных маладых людзей у Еўропе і іншых рэгіёнах свету. Яго дзіцячая версія – «Кампасіта» – мела не меншы поспех.

Працэс сталення ў сучаснай Еўропе можа быць цяжкім і балючым. Занадта шмат маладых людзей глядзяць у будучыню з трывогай і страхам замест упэўненасці. Рамка Савета Еўропы па правах чалавека забяспечвае этычную і нарматыўную аснову для маладзёжнай палітыкі і працы з моладдзю, ад якой трэба адштурхвацца падчас вырашэння пытанняў у галіне правоў і абавязкаў маладых людзей. Практыка адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі, якая стала магчымай з дапамогай «Компаса», з'яўляецца прыкладам пашырэння правоў і магчымасцей маладых людзей у якасці адказных грамадзян, адукатараў і прапагандыстаў правоў чалавека.

Я спадзяюся, што гэта новае выданне дапаможніка будзе натхняць і матываваць практыкаў адукацыі ў галіне правоў чалавека ў іх важнай працы.

Турб'ёрн Ягланд.

**Удзячнасць**

*Выказваем словы падзякі, удзячнасці і высокай ацэнкі наступным людзям:*

- членам даведачна-інфармацыйнай групы за перагляд «Компаса» і за іх уклад, ідэі і падтрымку;
- членам кансультатыўнай групы па адукацыі ў галіне правоў чалавека (2009–2010 гг.): Аляксандру Багдановічу, Ганне Дабравольскай, Цьеры Дзюфору, Караліне Гербара, Георгу Піркеру, Анэт Шнайдэр, Костасу Трыантафуласу і Сары Уфхільм за іх уклад і зацікаўленасць;
- настаўнікам і ўдзельнікам паглыбленага курсу падрыхтоўкі па навучанні ў галіне правоў чалавека паводле «Компаса» (ACT-HRE), а таксама тым, хто прыняў удзел у выданнях Навучальнага курса для трэнераў па адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі 2009 і 2010 гадоў, для якіх гэта было вучэбнае заданне;
- удзельнікам форуму па адукацыі ў галіне правоў чалавека «Жыць, вучыцца і змагацца за правы чалавека», асабліва членам групы па перaглядзе «Компаса»;
- Марыасу Антоніа, Казунары Фуджы, Крысце Меер, Ане Разанавай, Жужане Рутай, Агаце Штаер, Сары Уфхільм і Вільтруду Вайдынгеру за іх уклад, ідэі і час;
- Юльяну Атуілу, Рэгісу Брылату, Давіду Купіне, Сандрыне Жусе, Брыгіце Напівоцы, Юліі Пярэрва, Мігелю Сільве, Дэнісу Ван Дэр Веуру, Агнес Фон Маравіч за ўклад у напісанне і рэдагаванне тэкстаў пра работу Савета Еўропы;
- кансультантам «Компаса» па пытаннях адукацыі з Еўрапейскіх маладзёжных цэнтраў у Будапешце і Страсбургу: Ірыс Бавідаман, Горану Бульдыёскі, Фларыяну Сэскону, Мено Этэма, Жызэль Эўрар, Ласло Фёльдзі, Мары Геаргеску, Дарыюшы Гжэмны, Сабіне Клокер, Зары Лавчан, Надзін Лямуры-Байя, Марце Медлінске, Яэлі Агане, Анцы Рухандры Пандэі, Анэт Шнайдэр і Інзе Штуэр за іх крытычныя заўвагі, цярпенне, падтрымку і творчасць;
- Анцье Ротэмунд за падтрымку і ўклад у павышэнне якасці і даступнасці «Компаса» на родных мовах тых, хто вывучае правы чалавека;
- членам групы трэнераў маладзёжнага сектара Савета Еўропы за іх бескампрамісную сумленнасць у ацэнках выкарыстання «Компаса» ў практыцы навучання правам чалавека;
- перакладчыкам і рэдактарам, якія прынялі ўдзел у перакладзе «Компаса» і падзяліліся сваім вопытам;
- усім тым, хто, часам выпадкова, паўплываў на фарміраванне гэтага тэксту;
- Рэйчал Эплбі за яе дапамогу з вычытваннем тэксту на англійскай мове, бо для дасканаласці няма ніякай мяжы!
- Жужане Мальнар за яе пастаянны сакратарскі ўклад, а таксама яе калегам Эржбеце Банкі, Ніне Капур, Джэкі Лубелі, Вінчэнце Кватронэ і Габрыэле Ціша за іх дапамогу і падтрымку.

Мы зрабілі ўсё магчымае, каб прасачыць сувязь паміж тэкстам і дзейнасцю яго аўтараў і падзякаваць ім. Прыносім выбачэнні за любыя недахопы і будзем рады выправіць іх у наступным выданні.

# Змест

**Уводзіны да выдання 2012 года** (з праўкамі 2015 г.)........................................ 10

**Глава1 – Адукацыя ў галіне правоў чалавека і «Компас»: уводзіны**

1.1. Уводзіны ў адукацыю ў галіне правоў чалавека ........................................ 16
1.2. Падыходы да адукацыі ў галіне правоў чалавека ў «Компасе»............ 29
1.3. Выкарыстанне «Компаса» ў адукацыі ў галіне правоў чалавека .......... 45

**Глава 2 – Практыкаванні і метады навучання ў галіне правоў чалавека**

Агляд практыкаванняў........................................................................................ 72
Зводная табліца практыкаванняў па тэмах, агляд і звязаныя правы ......................... 73
**58 практыкаванняў на аснове вопыту і метадаў навучання ў галіне правоў чалавека ........................................................................................ 78**
Каляндар правоў чалавека ........................................................................ 338
Стартавыя практыкаванні ........................................................................ 345
Практыкаванні для ацэнкі навучання ........................................................ 350

**Глава 3 – Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека**

Аб гэтай главе........................................................................................ 357
3.1. Адукацыя ў галіне правоў чалавека і актывізм ........................................ 358
3.2. Простыя дзеянні ў абарону правоў чалавека........................................ 362
3.3. Распрацоўка плана дзеянняў ........................................................ 370

**Глава 4 – Разуменне правоў чалавека**

Уводзіны ........................................................................................ 381
4.1. Што такое правы чалавека?........................................................ 382
4.2. Эвалюцыя правоў чалавека ........................................................ 395
4.3. Юрыдычная абарона правоў чалавека ........................................ 401
4.4. Актывізм у галіне правоў чалавека і роля НГА ........................................ 418
4.5. Пытанні і адказы па правах чалавека........................................ 424
4.6. Пытанні на засыпку ........................................................ 427

**Глава 5 – Асноўная інфармацыя па глабальных тэмах правоў чалавека**

1. Дзеці ........................................................................................ 435
2. Грамадзянскасць і ўдзел........................................................ 436
3. Культура і спорт........................................................................ 437
4. Дэмакратыя........................................................................ 438
5. Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці ........................ 439
6. Дыскрымінацыя і нецярпімасць ........................................................ 440
7. Адукацыя........................................................................ 441
8. Навакольнае асяроддзе........................................................ 442
9. Гендарныя пытанні........................................................ 443
10. Глабалізацыя ........................................................................ 444
11. Здароўе ........................................................................ 445
12. СМІ........................................................................ 446
13. Міграцыя........................................................................ 447
14. Мір і гвалт........................................................................ 448
15. Беднасць ........................................................................ 449

16. Рэлігія і вера ........................................................................................................ 450
17. Гістарычная памяць ................................................................................................ 451
18. Вайна і тэрарызм .................................................................................................... 452
19. Праца........................................................................................................................ 453

**Дадаткі**

**Выбраныя міжнародныя дакументы па правах чалавека**

**Статус ратыфікацыі асноўных міжнародных дакументаў па правах чалавека** 457

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый.................................................................................. 458

Савет Еўропы ............................................................................................................... 467

**Гласарый.................................................................................................................. 478**

# Вітаем у «Компасе» і гэтым выданні з унесенымі праўкамі!




«Компас» быў упершыню апублікаваны ў 2002 годзе ў рамках Маладзёжнай праграмы адукацыі ў галіне правоў чалавека, якую праводзіў Дырэктарат Савета Еўропы па справах моладзі і спорту. Праграма была распрацавана таму, што адукацыя ў галіне правоў чалавека (АПЧ) – у значэнні адукацыйных праграм і практыкаванняў, накіраваных на забеспячэнне роўнасці чалавечай годнасці, – была і застаецца надзвычай важнай для фарміравання цэлага вымярэння дэмакратычнага грамадзянства для ўсіх маладых людзей і для прасоўвання культуры ўсеагульных правоў чалавека. «Компас» стаў даведачным дапаможнікам для многіх людзей, якія прымаюць удзел у заснаванай на каштоўнасцях працы з моладдзю і нефармальнай адукацыі.

На сённяшні дзень ён даступны больш чым на 30 мовах, ад арабскай і японскай да ісландскай і баскскай. У некаторых краінах ён стаў часткай матэрыялаў для адукацыі ў галіне правоў у школах, а ў некаторых іншых яго нельга выкарыстоўваць у школах. Прыгоды «Компаса» ва ўсёй Еўропе часта адлюстроўваюць неаднародную рэальнасць адукацыі ў галіне правоў чалавека, якую прасоўваюць тут і ўціскаюць там, ухваляюць адны і крытыкуюць іншыя.

Поспех «Компаса» паўтарыў яго малодшы брат «Кампасіта» – дапаможнік па адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам дзяцей. Абедзве публікацыі накіраваны на падтрымку ажыццяўлення Хартыі Савета Еўропы аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека.

> Вопыт Праграмы адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі ў апошнія дзесяць гадоў служыў кансалідацыі заснаванага на правах чалавека падыходу да маладзёжных мерапрыемстваў і эфектыўнаму прасоўванню адукацыі ў галіне правоў чалавека ў працы з моладдзю і маладзёжнай палітыцы.
>
> *Пасланне ўдзельнікаў форуму «Жыць, вучыцца і змагацца за правы чалавека»*

«Компас» і яго публікацыя на розных мовах сталі тым сродкам, дзякуючы якому адукацыя ў галіне правоў чалавека ўвайшла ў парадак дня працы з моладдзю і навучальную праграму многіх школ. У шэрагу краін былі створаны нацыянальныя сеткі па адукацыі ў галіне правоў чалавека, якія дапамагаюць праваахоўным арганізацыям і спецыялістам у галіне адукацыі ў іх працы, накіраванай на забеспячэнне доступу да адукацыі ў галіне правоў чалавека для большай колькасці дзяцей і маладых людзей па ўсёй Еўропе. Форум па адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі «Жыць, вучыцца і змагацца за правы чалавека», які прайшоў у Будапешце ў 2009 годзе, падкрэсліў важнасць адукацыі ў галіне правоў чалавека на сённяшні дзень[1]:

Правы чалавека нельга абараняць і прасоўваць аднымі юрыдычнымі інструментамі. Адукацыя ў галіне правоў чалавека – навучанне пра правы, праз правы і для правоў чалавека – выконвае вельмі важную ролю ў іх разуменні, падтрымцы і прасоўванні кожным чалавекам.

Праца, якая праводзіцца для маладых людзей і з іх удзелам з дапамогай «Компаса» – дапаможніка па адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі, – ясна паказвае, што Савет Еўропы можа разлічваць на шчодрасць, адданасць і кампетэнтнасць маладых людзей, якія дапамогуць зрабіць адукацыю ў галіне правоў чалавека рэальнасцю для многіх іншых маладых людзей. [...] Вопыт, атрыманы падчас працы з моладдзю і нефармальнага навучання, быў паспяхова пастаўлены на службу адукацыйных праектаў у галіне правоў чалавека для ўсіх, у тым ліку забяспечыў узаемадапаўняльнасць фармальнага і нефармальнага навучання.

Адукацыя ў галіне правоў чалавека не можа быць выключнай адказнасцю НГА і маладзёжных арганізацый, таксама як і не можа ажыццяўляцца толькі на добраахвотных пачатках. Дзяржавы нясуць асноўную адказнасць за ажыццяўленне адукацыі ў галіне правоў чалавека. Яны павінны забяспечваць яе ўсёахопнасць, устойлівасць і аказваць ёй падтрымку такімі спосабамі, якія б прадугледжвалі пэўную ролю для фармальнага і нефармальнага сектараў адукацыі.

Для многіх выпадковых практыкаў адукацыі ў галіне правоў чалавека «Компас» стаў сінонімам адукацыі ў галіне правоў чалавека. Аднак адукацыя ў галіне правоў чалавека значна шырэй за «Компас». «Компас» паказвае маршруты і прапануе спосабы ажыццяўлення адукацыі ў галіне правоў чалавека на практыцы, але пакідае выбар маршруту і спосабу фасілітатару і ў канчатковым выніку – навучэнцам.

«Компас» – гэта не права чалавека, у адрозненне ад адукацыі ў галіне правоў чалавека.

## Забеспячэнне актуальнасці «Компаса» ў другім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя

У першыя дзесяць гадоў свайго існавання «Компас» сутыкнуўся з хуткімі зменамі кола пытанняў і праблем у галіне правоў чалавека і адукацыі ў галіне правоў чалавека. Сярод іх былі паскарэнне працэсаў глабалізацыі, рост тэрарызму і глабальнай вайны з тэрарызмам у адказ, сусветны фінансавы крызіс, наступствы змен клімату, выкліканых дзейнасцю чалавека, розныя каляровыя рэвалюцыі ў Грузіі, Украіне і шэрагу арабскіх краін, пашырэнне Інтэрнэту, войны ў Іраку і Афганістане, цунамі і ядзерная катастрофа ў Фукусіме і многае іншае. У той час «Компас» адчайна кідаўся ад аднаго крызісу да іншага, а ў некаторых абласцях і састарэў. У выніку быў апублікаваны перагледжаны і абноўлены варыянт 2012 года выдання.

Наша асноўная задача зводзілася да таго, каб зрабіць «Компас» 2012 года актуальным для другога дзесяцігоддзя XXI стагоддзя. Мы прынялі да ўвагі ацэнкі карыстальнікаў, якія яны далі ў Інтэрнэце і іншымі спосабамі, а таксама «паскарэнне тэмпаў гісторыі» – не ўсё, што было важна ў 2002 годзе, засталося такім жа важным дзесяць гадоў пасля, і важкасць набылі многія іншыя пытанні. У выніку выданне «Компаса» 2012 года стала развіццём таго, што было раней, сумессю старога і новага. Чытачы і практыкі ў галіне правоў чалавека атрымалі інфармацыю і апісанне практыкаванняў, што ахопліваюць актуальныя праблемы, пры тым што ад старой версіі засталіся абмеркаванне спрэчных пытанняў, арыентацыя на навучэнца і неабходнасць прыняцця мер.

## Што змянілася ў гэтым выданні?

Першыя чатыры главы выдання 2015 года не адрозніваюцца ад адпаведных глаў выдання 2012 года. Розніца ў тым, што ў новай версіі адсутнічае шырокая даведачная інфармацыя главы 5. Гэта не значыць, што даведачная інфармацыя непатрэбна; яна вельмі важная! Падрабязная інфармацыя пра дзевятнаццаць тэм даступна ў Інтэрнэце на сайце www.coe.int/compass і пастаянна абнаўляецца. У версіі 2015 года вы знойдзеце больш кароткую главу 5, у якой прыводзіцца кароткі агляд гэтых тэм і просьба дапамагчы забяспечыць актуальнасць і адпаведнасць даведачнага матэрыялу праз зваротную сувязь.

Мы імкнуліся да таго, каб выданне 2015 года стала для практыкаў дастатковым і практычным дапаможнікам па адукацыі ў галіне правоў чалавека, якога ім так не хапае. Размяшчэнне даведачнай інфармацыі на сайце Савета Еўропы гарантуе яе актуальнасць. Больш таго, адсутнасць неабходнасці раздрукоўваць 160 старонак даведачнай інфармацыі дазволіла нам выдаць менш аб'ёмны і дарагі дапаможнік і сэканоміць паперу, абараніўшы такім чынам навакольнае асяроддзе.

COMPASS

«Компас» дае кірунак для навучэнцаў, адукатараў і фасілітатараў адукацыі ў галіне правоў чалавека. Але кожнаму з іх трэба акрэсліць свой уласны шлях для навучання і дзеянняў у галіне правоў чалавека.

Забеспячэнне актуальнасці «Компаса» ў другім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя было нашай галоўнай задачай.

Асноўныя каштоўнасці і падыходы, якія ляжаць у аснове «Компаса», цалкам застаюцца ў сіле. «Компас» павінен быць:

**Дастатковым**. Карыстальнікі змогуць знайсці ўсё, што патрэбна для таго, каб пазнаёміць моладзь з правамі чалавека.

**Гатовым да выкарыстання**. Прапанаваныя практыкаванні не патрабуюць дадатковых рэсурсаў або працяглай падрыхтоўкі.

**Актуальным для моладзі**. Практыкаванні і пытанні ў галіне правоў чалавека неадрыўна звязаны з клопатамі і поглядамі падлеткаў і маладых дарослых.

**Практычным і заснаваным на вопыце**. Усе практыкаванні ўключаюць прапановы па прымяненні вывучанага матэрыялу на практыцы, такім чынам даючы ўдзельнікам магчымасць выйсці за межы кагнітыўных працэсаў.

**Падыходзіць для фармальнай і нефармальнай адукацыі**. Нягледзячы на тое, што практыкаванні былі распрацаваны для нефармальнай адукацыі, амаль усе яны могуць праводзіцца ў школьных класах з некаторай адаптацыяй, напрыклад, у дачыненні да працягласці.

**Адаптацыйным**. Усе практыкаванні можна адаптаваць да кантэксту, групы і грамадства, у якіх яны выконваюцца. Прапановы па зменах дапамагаюць фасілітатару ствараць свае ўласныя адаптацыі.

**Зыходным пунктам**. Зацікаўленыя фасілітатары і адукатары знойдуць шмат прапаноў і рэсурсаў, каб паглыбіцца ў канкрэтныя пытанні або даведацца больш аб правах чалавека.

**Універсальным і халістычным**. «Компас» можна прымяніць да любога пытання ў галіне правоў чалавека і з навучэнцамі любога ўзроўню падрыхтоўкі. У яго аснове ляжыць інклюзіўны і халістычны падыход да навучання, які аб'ядноўвае каштоўнасці, пазіцыі, навыкі і веды.

## Наперад!

«Компас» напісаны для ўсіх, хто цікавіцца правамі чалавека і хоча прыняць удзел у адукацыі ў галіне правоў чалавека. Тыя, хто толькі знаёміцца з «Компасам», павінны ведаць, што мы не рабілі ніякіх дапушчэнняў адносна ўзроўню ведаў ні пра правы чалавека і адукацыю ў галіне правоў чалавека, ні пра тэмы, якія мы абралі для працы. Мы таксама не рабілі ніякіх дапушчэнняў адносна папярэдняга вопыту навучання або правядзення практыкаванняў. Дапаможнік змяшчае шмат матэрыялаў пра тое, як праводзіць практыкаванні і як адаптаваць іх і развіць у адпаведнасці з патрэбамі навучэнцаў і асаблівасцямі сітуацыі. Прадугледжаны спецыяльны раздзел з парадамі для настаўнікаў. Для некаторых «практычныя дзеянні» могуць на першы погляд аказацца праблематычнымі, таму мы ўдзяляем асаблівую ўвагу самой канцэпцыі і дэтальна тлумачым яе ролю ў навучальным працэсе ў главе 3.

«Компас» уяўляе сабой крыніцу інфармацыі, інструментаў і парад для адукацыі ў галіне правоў чалавека. Гэта значыць, што яго можна выкарыстоўваць па-рознаму, і няма ніякага канкрэтнага зыходнага пункта. Тым не менш мы рэкамендуем вам пачаць з азнаямлення са зместам, які прыводзіцца на папярэдніх старонках, акунуцца ў дапаможнік і азнаёміцца з яго агульнай структурай і матэрыяламі. Многія адразу праяўляюць найбольшы інтарэс да практыкаванняў. Гэта нядрэнна, але мы рэкамендуем па меншай меры прачытаць главу 1.3 «Выкарыстанне «Компаса» для адукацыі ў галіне правоў чалавека» перад выкананнем якіх-небудзь практыкаванняў.

Мы спадзяёмся, што вам спадабаецца працаваць з выданнем «Компаса» 2015 года. Паведаміце нам, калі ў нас атрымалася даць вам патрэбную інфармацыю і інструменты, і дапамажыце развівацца далей, размясціўшы свой водгук на сайце www.coe.int/compass.

## Зноскі

1 Паведамленне ўдзельнікаў форуму «Жыць, вучыцца і змагацца за правы чалавека», даклад Гавана Цітлі, Савет Еўропы, 2010 г.

# Глава 1
# Адукацыя ў галіне правоў чалавека і «Компас»: уводзіны

# Змест гэтай главы


**1. Уводзіны ў адукацыю ў галіне правоў чалавека ........................................ 16**

1.1 Што такое правы чалавека? ........................................ 16
1.2 Што такое адукацыя ў галіне правоў чалавека ........................................ 17
1.3 Адукацыя ў галіне правоў чалавека – фундаментальнае права чалавека .......... 19
1.4 Адукацыя ў галіне правоў чалавека ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ................ 20
1.5 Адукацыя ў галіне правоў чалавека ў Еўропе ........................................ 21
1.6 Маладзёжная палітыка і адукацыя ў галіне правоў чалавека ........................ 24
1.7 Адукацыя ў галіне правоў чалавека і моладзь ........................................ 26
1.8 На шляху да культуры правоў чалавека ........................................ 27

**2. Падыходы да адукацыі ў галіне правоў чалавека ў «Компасе»......... 29**

2.1 Адукацыя ў галіне правоў чалавека ў розных адукацыйных сістэмах .................. 30
2.2 Педагагічная аснова адукацыі ў галіне правоў чалавека ў «Компасе»................. 32
2.3 Адукацыя ў галіне правоў чалавека: працэс і вынікі ........................................ 35
2.4 Адукацыя ў галіне правоў чалавека і іншыя адукацыйныя сферы........................ 38
2.5 Часта задаваныя пытанні аб выкарыстанні адукацыі ў галіне правоў чалавека ў працы з моладдзю ........................................ 43

**3. Выкарыстанне «Компаса» ў адукацыі ў галіне правоў чалавека............ 45**

3.1 Што ёсць у «Компасе» ........................................ 45
3.2 Фасілітацыя ........................................ 46
3.3 Агульныя рэкамендацыі для карыстальнікаў........................................ 48
3.4 Агульныя рэкамендацыі па правядзенні практыкаванняў ........................................ 51
3.5 Адаптацыя практыкаванняў «Компаса» да вашых патрэб.............................. 56
3.6 Спецыяльныя парады для настаўнікаў ........................................ 59
3.7 Метады, якія ляжаць у аснове практыкаванняў «Компаса»........................................ 61

# 1. Уводзіны ў адукацыю ў галіне правоў чалавека

«Каб кожны чалавек і кожны орган грамадства ... імкнуўся шляхам асветы і адукацыі садзейнічаць рэалізацыі гэтых правоў і свабод».

*Прэамбула да Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, 1948 г.*

«Навучанне і адукацыя з мэтай фарміравання павагі да гэтых правоў і свабод» з'яўляецца асновай адукацыі ў галіне правоў чалавека. Аднак, перш чым разбірацца з тым, што сабой уяўляе адукацыя ў галіне правоў чалавека і як яна адбываецца на практыцы, неабходна ўдакладніць, што такое «гэтыя правы і свабоды», якіх яна тычыцца. Таму мы пачынаем з кароткіх уводзінаў у правы чалавека.

Як людзям карыстацца правамі чалавека і абараняць іх, калі яны ніколі гэтаму не вучыліся?

## 1.1. Што такое правы чалавека?

На працягу гісторыі кожнае грамадства распрацоўвала сістэмы для забеспячэння сацыяльнай згуртаванасці шляхам кадыфікацыі правоў і абавязкаў грамадзян.

Нарэшце, у 1948 годзе міжнародная супольнасць дамовілася аб кодэксе правоў, які будзе абавязковым для ўсіх дзяржаў; такім кодэксам стала Ўсеагульная дэкларацыя правоў чалавека (УДПЧ). З 1948 года былі ўзгоднены і прыняты і іншыя дакументы аб правах чалавека, напрыклад Еўрапейская канвенцыя аб правах чалавека 1950 года і Канвенцыя ААН аб правах дзіцяці (КПД) 1990 года.

Правы чалавека адлюстроўваюць асноўныя патрэбы чалавека; яны вызначаюць базавыя стандарты, без якіх людзі не могуць жыць годна. Правы чалавека тычацца роўнасці, чалавечай годнасці, павагі, свабоды і справядлівасці. Прыклады правоў уключаюць у сябе свабоду ад дыскрымінацыі, права на жыццё, свабоду слова, права ўступаць у шлюб і ствараць сям'ю, а таксама права на адукацыю. (Кароткае апісанне і поўны тэкст УДПЧ прыводзяцца ў дадатках).

Правы чалавека належаць усім людзям у аднолькавай ступені, усюды і ў любы час. Правы чалавека з'яўляюцца ўніверсальнымі, а гэта значыць аднолькавымі для ўсіх людзей ва ўсіх краінах. Яны з'яўляюцца неад'емнымі, непадзельнымі і ўзаемазалежнымі, гэта значыць, ніколі не могуць быць адабранымі; усе правы аднолькава важныя і дапаўняюць адно аднаго, напрыклад права ўдзельнічаць у кіраванні і ў свабодных выбарах залежыць ад свабоды слова.

Як людзі могуць карыстацца правамі чалавека і абараняць іх, калі яны ніколі гэтаму не вучыліся? Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (УДПЧ) прызнае гэта ў сваёй прэамбуле, а ў артыкуле 26 дае кожнаму права на адукацыю, якая павінна «ўмацоўваць павагу да правоў чалавека і асноўных свабод». Мэтай адукацыі ў галіне правоў чалавека з'яўляецца стварэнне свету з культурай правоў чалавека. Гэта такая культура, у якой паважаюцца правы ўсіх людзей і правы самі па сабе; культура, у якой людзі разумеюць свае правы і абавязкі, прызнаюць парушэнні правоў чалавека і прымаюць меры па абароне правоў іншых асоб. Гэта культура, дзе правы чалавека з'яўляюцца такой жа часткай жыцця людзей, як мова, звычаі, мастацтва і сувязь з месцам жыхарства.

## 1.2. Што такое адукацыя ў галіне правоў чалавека

З 1948 года была выкананая – і выконваецца сёння – вялікая і разнастайная работа ў інтарэсах адукацыі ў галіне правоў чалавека. Існуе шмат спосабаў ажыццяўлення адукацыі ў галіне правоў чалавека, таму што людзі бачаць свет па-рознаму, адукатары працуюць у розных сітуацыях, а розныя арганізацыі і дзяржаўныя ўстановы маюць розныя інтарэсы; такім чынам, прынцыпы застаюцца аднолькавымі, у той час як практыка можа адрознівацца. Каб атрымаць уяўленне аб разнастайнасці метадаў навучання і мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў гэтай сферы, дастаткова паглядзець на ролі і інтарэсы розных «асоб і інстытутаў грамадства» і зразумець, як яны расстаўляюць акцэнты і фарміруюць сферу сваіх інтарэсаў у адукацыі ў галіне правоў чалавека.

У 1993 годзе Сусветная канферэнцыя па правах чалавека прызнала адукацыю ў галіне правоў чалавека «важнай для прасоўвання і дасягнення стабільных і гарманічных адносін паміж супольнасцямі і для ўмацавання ўзаемаразумення, цярпімасці і міру». У 1994 годзе Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый абвясціла Дзесяцігоддзе ААН па адукацыі ў галіне правоў чалавека (1995–2004 гг.) і настойліва заклікала ўсе дзяржавы – удзельніцы ААН садзейнічаць «навучанню, распаўсюджванню і інфармаванню, накіраваным на будаўніцтва ўсеагульнай культуры правоў чалавека». У выніку ўрады сталі прыкладаць значныя намаганні, каб прасоўваць адукацыю ў галіне правоў чалавека, галоўным чынам, у рамках дзяржаўных адукацыйных праграм. Урады надаюць вялікае значэнне міжнародным адносінам, падтрыманню правапарадку і агульнага функцыянавання грамадства, таму яны больш схільныя разглядаць адукацыю ў галіне правоў чалавека як сродак умацавання міру, дэмакратыі і сацыяльнага парадку.

Адукацыйныя праграмы і мерапрыемствы, накіраваныя на забеспячэнне роўнасці чалавечай годнасці

Мэтай Савета Еўропы з'яўляецца стварэнне агульнай дэмакратычна-прававой прасторы на ўсім еўрапейскім кантыненце з павагай да яго асноўных каштоўнасцей: правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства закону. Такі акцэнт на каштоўнасцях адлюстроўваецца ва ўсіх вызначэннях адукацыі ў галіне правоў чалавека. Напрыклад, спасылаючыся на свае абавязацельствы па забеспячэнні актыўнага ўдзелу моладзі ў працэсе прыняцця рашэнняў і дзейнасці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях, Маладзёжная праграма Савета Еўропы па адукацыі ў галіне правоў чалавека вызначае адукацыю ў галіне правоў чалавека як

> «...адукацыйныя праграмы і мерапрыемствы, накіраваныя на забеспячэнне **роўнасці ў чалавечай годнасці**[1], у спалучэнні з іншымі праграмамі, напрыклад тымі, якія заахвочваюць міжкультурнае навучанне, удзел і пашырэнне правоў і магчымасцей меншасцей».

Хартыя Савета Еўропы аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека (2010 г.)[2] вызначае адукацыю ў галіне правоў чалавека як

> адукацыю, навучанне, павышэнне дасведчанасці, інфармаванне, выкарыстанне метадаў і практыкаванняў, якія накіраваны на забеспячэнне навучэнцаў ведамі, навыкамі і разуменнем, развіццё іх пазіцый і паводзін для **пашырэння іх магчымасцей зрабіць свій унёсак у пабудову і абарону ўсеагульнай культуры правоў чалавека ў грамадстве** з мэтай заахвочвання і абароны правоў чалавека і асноўных свабод.

Існуюць і іншыя азначэнні адукацыі ў галіне правоў чалавека, такія як дае Amnesty International:

> адукацыя ў галіне правоў чалавека прадстаўляе сабой **працэс**, з дапамогай якога людзі даведваюцца пра свае правы і правы іншых людзей падчас сумеснага і інтэрактыўнага навучання.

Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіянальны рэсурсны цэнтр па адукацыі ў галіне правоў чалавека асабліва вылучае ўзаемасувязь паміж правамі чалавека і жыццём людзей, якія займаюцца адукацыяй у галіне правоў чалавека:

Адукацыя ў галіне правоў чалавека ўяўляе сабой **сумесны працэс**, які складаецца са спецыяльна распрацаваных набораў вучэбнай дзейнасці, заснаванай на выкарыстанні ведаў, каштоўнасцей і навыкаў у галіне правоў чалавека, якія накіраваны на шырокую грамадскасць і дапамагаюць ёй зразумець свой вопыт і ўзяць кантроль над сваім жыццём.

Сусветная праграма Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па адукацыі ў галіне правоў чалавека вызначае такую адукацыю як:

*адукацыю, навучанне і інфармаванне, накіраваныя на* ***пабудову ўсеагульнай культуры правоў чалавека***. Усебаковая адукацыя ў галіне правоў чалавека не толькі забяспечвае веды аб правах чалавека і механізмах іх абароны, але і дапамагае развіць навыкі, неабходныя для прасоўвання, абароны і ўжывання правоў чалавека ў штодзённым жыцці. Адукацыя ў галіне правоў чалавека спрыяе фарміраванню пазіцый і паводзін, неабходных для абароны правоў чалавека ўсімі членамі грамадства

Культура, дзе правы чалавека вывучаюць, жывуць у адпаведнасці з імі і «дзейнічаюць» для іх.

Народны рух за *навучанне* ў галіне правоў чалавека аддае перавагу тэрміну «навучанне» перад тэрмінам «адукацыя» ў галіне правоў чалавека, а таксама надае асаблівую ўвагу ***правам чалавека як ладу жыцця***. Акцэнт на навучанні, а не на адукацыі таксама закліканы падкрэсліць індывідуальны характар працэсу азнаямлення з правамі чалавека і іх прымянення ў паўсядзённым жыцці чалавека.

Паняцце «іншыя інстытуты грамадства» ўключае ў сябе НГА і мясцовыя ініцыятывы, якія дзейнічаюць у сферах падтрымкі ўразлівых груп насельніцтва, абароны навакольнага асяроддзя, маніторынгу дзейнасці ўрадаў, прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама прасоўвання сацыяльных змен. Кожная НГА ўносіць у адукацыю ў галіне правоў чалавека сваё ўласнае бачанне. Так, напрыклад, Amnesty International лічыць, што «адукацыя ў галіне правоў чалавека мае фундаментальнае значэнне для ліквідацыі асноўных прычын парушэнняў правоў чалавека, прадухілення парушэнняў правоў чалавека, барацьбы з дыскрымінацыяй, заахвочвання роўнасці і пашырэння ўдзелу людзей у дэмакратычных працэсах прыняцця рашэнняў».[3]

Адукацыя ў галіне правоў чалавека павінна інфармаваць грамадства аб праблемах гендара і ўлічваць міжкультурнае навучанне.

На форуме па адукацыі ў галіне правоў чалавека для моладзі і з яе ўдзелам «Жыць, вучыцца і змагацца за правы чалавека», які адбыўся ў Будапешце ў кастрычніку 2009 года, становішча маладых людзей у Еўропе было ахарактарызавана як «няўстойлівае і нестабільнае, якое для многіх азначае сур'ёзны падрыў роўнасці магчымасцей іграць значную ролю ў грамадстве […] правы чалавека, асабліва сацыяльныя правы і свабода ад дыскрымінацыі, гучаць як пустыя словы, калі не ілжывыя абяцанні. Існуючыя выпадкі дыскрымінацыі і сацыяльнай ізаляцыі нельга прыняць і цярпець». Такім чынам, удзельнікі форуму, азадачаныя праблемамі роўнасці магчымасцей і дыскрымінацыі, пагадзіліся, што «адукацыя ў галіне правоў чалавека павінна сістэматычна інфармаваць грамадства аб праблемах гендара і гендарнай роўнасці. Акрамя таго, яна павінна ўключаць міжкультурнае навучанне; [...] Мы чакаем ад Савета Еўропы, [...] што ў сваіх праграмах адукацыі ў галіне правоў чалавека ён будзе ставіць на першае месца праблемы меншасцей, у тым ліку пытанні дыскрымінацыі па прыкмеце гендарнай і этнічнай прыналежнасці, рэлігійных поглядаў або перакананняў, здольнасцей і сексуальнай арыентацыі».

Урады і НГА схільны разглядаць адукацыю ў галіне правоў чалавека з пункту гледжання вынікаў у выглядзе пажаданых правоў і свабод, у той час як педагагічны персанал, як правіла, сканцэнтраваны на каштоўнасцях, прынцыпах і маральным выбары. Бэці Рырдан у публікацыі «Выхаванне чалавечай годнасці», 1995 г., сцвярджае, што «адукацыя ў галіне правоў чалавека была задумана як сацыяльнае навучанне, заснаванае на прынцыпах і стандартах, [...] якія дапамогуць развіць уменне рабіць маральны выбар, займаць прынцыповыя пазіцыі па розных пытаннях; іншымі словамі, развіць маральную і інтэлектуальную цэласнасць».[4]

Трэнеры, фасілітатары, выкладчыкі і іншыя эксперты ў адукацыі ў галіне правоў чалавека, якія працуюць непасрэдна з маладымі людзьмі, схільныя думаць у кантэксце кампетэнцый і метадалогіі.

Зразумела, што розныя арганізацыі, правайдары адукацыйных паслуг і спецыялісты, якія працуюць у сферы адукацыі ў галіне правоў чалавека, выкарыстоўваюць розныя вызначэнні ў адпаведнасці са сваёй філасофіяй, мэтамі, мэтавымі групамі або прыналежнасцю да тых ці іншых супольнасцей. Тым не менш існуе відавочны кансэнсус наконт таго, што адукацыя ў галіне правоў чалавека ўключае ў сябе тры аспекты:

Адукацыя ў галіне правоў чалавека прадугледжвае навучанне гэтым правам.

- навучанне **аб** правах чалавека, пра тое, што яны сабой уяўляюць, як гарантуюцца або абараняюцца;
- навучанне **праз** правы чалавека, прызнанне таго, што кантэкст і спосаб арганізацыі і ажыццяўлення адукацыі ў галіне правоў чалавека павінны быць прыведзены ў адпаведнасць з каштоўнасцямі ў гэтай сферы (напрыклад, удзел, свабода думкі і выказвання меркавання і г. д.) і таго, што ў адукацыі ў галіне правоў чалавека працэс навучання не менш важны, чым яго змест;
- навучанне **для** правоў чалавека шляхам развіцця ў навучэнцаў навыкаў, пазіцый і каштоўнасцей, якія б дазвалялі ім прымяняць каштоўнасці правоў чалавека ў сваім жыцці і самастойна або сумесна з іншымі прымаць меры для прасоўвання і абароны правоў чалавека.

З іншага боку, калі задумацца пра тое, як ажыццяўляць адукацыю ў галіне правоў чалавека, як дапамагаць людзям атрымліваць неабходныя веды, уменні і погляды, якія дазволяць ім выканаць сваю ролю ў фарміраванні культуры правоў чалавека, то мы ўбачым, што нельга проста «выкладаць» правы чалавека, бо іх трэба засвойваць праз вопыт. Такім чынам, адукацыя ў галіне правоў чалавека павінна ажыццяўляцца ***праз*** паглыбленне ў правы чалавека на практыцы. Гэта азначае, што тое, ***як*** і ***дзе*** адбываецца адукацыя ў галіне правоў чалавека, павінна адлюстроўваць каштоўнасці правоў чалавека (навучанне ***ў галіне*** правоў чалавека); кантэкст і дзейнасць павінны быць такімі, каб годнасць і роўнасць былі неад'емнымі часткамі такога навучання.

У гэтым дапаможніку мы асабліва імкнуліся паказаць, што, якімі б цікавымі ці займальнымі ні здаваліся метады і практыкаванні, менавіта спасылкі на правы чалавека робяць навучанне аб правах чалавека вартым даверу. У ім таксама прыводзяцца розныя прапановы наконт навучання праз практычныя дзеянні.

## 1.3. Адукацыя ў галіне правоў чалавека – фундаментальнае права чалавека

Адукацыя павінна быць накіравана на поўнае развіццё чалавечай асобы і на павелічэнне павагі да правоў чалавека.
Артыкул 26 УДПЧ

Правы чалавека маюць важнае значэнне таму, што ні адзін чалавек не можа выжыць у адзіночку, а несправядлівасці пагаршаюць якасць жыцця на індывідуальным, мясцовым і глабальным узроўнях. Тое, што мы робім у Еўропе, аказвае ўплыў на тое, што адбываецца ў іншых частках свету. Напрыклад, адзенне, якое мы носім, можа быць зроблена з выкарыстаннем дзіцячай працы ў Азіі, у той час як спадчына еўрапейскай каланіяльнай гісторыі спрыяе палітычнай і рэлігійнай нестабільнасці ў Іраку, Самалі і Афганістане, у выніку чаго адчайныя шукальнікі прытулку грукаюцца ў нашыя дзверы. Такім жа чынам мільёны людзей у Афрыцы і Азіі вымушаныя пакідаць свае дамы з-за наступстваў змен клімату, якія ў значнай ступені выкліканы дзейнасцю прамыслова развітых краін. Але правы чалавека важныя не толькі таму, што іх парушэнні ў іншых частках свету аказваюць пэўны ўплыў на наша жыццё; клопат пра іншых з'яўляецца фундаментальным маральным абавязкам, які прысутнічае ва ўсіх культурах і рэлігіях. Парушэнні правоў чалавека маюць месца ўсюды – не толькі ў іншых краінах, але і ў нас, таму адукацыя ў галіне правоў чалавека мае такое важнае значэнне. Толькі маючы поўнае разуменне правоў чалавека і павагу да іх, мы можам спадзявацца на фарміраванне культуры, у якой такія правы паважаюць, а не парушаюць. Менавіта таму права на адукацыю ў галіне правоў чалавека атрымлівае ўсё большае прызнанне ў якасці аднаго з правоў чалавека.

Адукацыя ў галіне правоў чалавека з'яўляецца не толькі маральным, але і замацаваным у міжнародных прававых дакументах правам. Артыкул 26 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека абвяшчае, што кожны чалавек мае права на адукацыю і што «адукацыя павінна быць накіравана на поўнае развіццё чалавечай асобы і на павелічэнне павагі да правоў чалавека і асноўных свабод. Адукацыя павінна прасоўваць узаемаразуменне, цярпімасць і сяброўства паміж народамі, расавымі і рэлігійнымі групамі і садзейнічаць намаганням Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па падтрыманні міру». З іншага боку, у артыкуле 28 Канвенцыі аб правах дзіцяці гаворыцца, што «школьная дысцыпліна павінна забяспечвацца метадамі, якія не абражаюць годнасць дзіцяці». Адукацыя павінна быць накіравана на развіццё асобы дзіцяці, яго талентаў і здольнасцей, выхаванне павагі да правоў чалавека і асноўных свабод, падрыхтоўку да адказнага жыцця ў свабодным грамадстве, развіццё разумення, талерантнасці і роўнасці, павагі да навакольнага асяроддзя».

Правы чалавека ўяўляюць сабой нешта большае, чым проста прыгожыя словы.

Адукацыя ў галіне правоў чалавека таксама з'яўляецца законным палітычным патрабаваннем. На форуме «Жыць, вучыцца і змагацца за правы чалавека» было прызнана, што «каштоўнасці, якімі кіруецца Савет Еўропы, з'яўляюцца ўніверсальнымі для ўсіх нас і накіраваны на забеспячэнне неад'емнай годнасці кожнага чалавека». Таксама ў пасланні форуму было нагадана, што правы чалавека ўяўляюць сабой нешта большае, чым проста прыгожыя словы: яны з'яўляюцца таксама маральнымі і палітычнымі патрабаваннямі, у роўнай ступені дастасавальнымі як да адносін паміж дзяржавай і насельніцтвам, так і да адносін паміж людзьмі і ўнутры краін.

## 1.4. Адукацыя ў галіне правоў чалавека ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый выконвае незаменную ролю ў адукацыі ў галіне правоў чалавека ў свеце. Сусветная канферэнцыя па правах чалавека, якая прайшла ў Вене ў 1993 годзе, зноў пацвердзіла важную ролю адукацыі ў галіне правоў чалавека, прафесійнай падрыхтоўкі і інфармавання грамадскасці ў прасоўванні правоў чалавека. У 1994 годзе Генеральная Асамблея ААН абвясціла Дзесяцігоддзе адукацыі ў галіне правоў чалавека, якое ахоплівае перыяд з 1 студзеня 1995 года па 31 снежня 2004 года.

Сусветная праграма адукацыі ў галіне правоў чалавека была распрацавана ў 2004 годзе ў мэтах стымулявання развіцця культуры правоў чалавека.

Пасля аналізу яго вынікаў у 2004 годзе была распрацавана Сусветная праграма адукацыі ў галіне правоў чалавека. Першая фаза праграмы накіравана на адукацыю ў галіне правоў чалавека ў сістэмах пачатковай і сярэдняй школьнай адукацыі. Усе дзяржавы былі заклікаsuccessivelyны распрацаваць ініцыятывы ў рамках Сусветнай праграмы і яе Плана дзеянняў. Савет па правах чалавека прыняў рашэнне прысвяціць другі этап (2010–2014 гады) адукацыі ў галіне правоў чалавека ў вышэйшых навучальных установах і рэалізацыі навучальных праграм у галіне правоў чалавека сярод настаўнікаў і адукатараў, дзяржаўных служачых, супрацоўнікаў праваахоўных органаў і вайскоўцаў на ўсіх узроўнях. Адпаведна, у верасні 2010 года быў прыняты План дзеянняў на другім этапе, падрыхтаваны Упраўленнем Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека. ААН таксама заклікала дзяржавы-ўдзельніцы працягваць адукацыю ў галіне правоў чалавека ў пачатковых і сярэдніх школах. Не абмежаваная часовымі рамкамі Сусветная праграма з'яўляецца асновай калектыўных дзеянняў і платформай для супрацоўніцтва паміж урадамі і ўсімі іншымі зацікаўленымі бакамі.

У снежні 2011 года Генеральная Асамблея прыняла Дэкларацыю ААН па адукацыі і навучанню ў галіне правоў чалавека. Дэкларацыя лічыцца наватарскай, таму што гэта першы дакумент, прысвечаны непасрэдна адукацыі ў галіне правоў чалавека, які, такім чынам, з'яўляецца вельмі каштоўным інструментам для адстойвання інтарэсаў і павышэння дасведчанасці аб важнасці такой адукацыі. Дэкларацыя абвяшчае, што «кожны чалавек мае права ведаць, запытваць і атрымліваць інфармацыю аб усіх правах чалавека і асноўных свабодах і павінен мець доступ да адукацыі і падрыхтоўкі ў галіне правоў чалавека» і што «адукацыя і навучанне ў галіне правоў чалавека маюць важнейшае значэнне для прасоўвання ўсеагульнай павагі да ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх і іх выканання ў адпаведнасці з прынцыпамі ўсеагульнасці, непадзельнасці і ўзаемазалежнасці правоў чалавека». У дэкларацыі таксама змяшчаецца шырокае вызначэнне адукацыі і падрыхтоўкі ў галіне правоў чалавека, якое ахоплівае адукацыю *пра* правы, *праз* правы і *для* правоў чалавека.

Дэкларацыя ўскладае галоўную адказнасць «за заахвочванне і забеспячэнне адукацыі і навучання ў галіне правоў чалавека» (артыкул 7) на дзяржаву.

У сістэме ААН адукацыю ў галіне правоў чалавека каардынуе размешчанае ў Жэневе Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, дзеючае пад эгідай Савета па правах чалавека.

«Каб кожны чалавек і кожны орган грамадства імкнуўся шляхам асветы і адукацыі садзейнічаць рэалізацыі гэтых правоў і свабод»

*Прэамбула да Дэкларацыі ААН па адукацыі і падрыхтоўцы ў галіне правоў чалавека*

## 1.5. Адукацыя ў галіне правоў чалавека ў Еўропе

### *Савет Еўропы*

Для дзяржаў – членаў Савета Еўропы правы чалавека значаць нешта большае, чым проста сцвярджэнне; правы чалавека з'яўляюцца часткай іх прававой базы і, такім чынам, павінны быць неад'емнай часткай адукацыі моладзі. Еўрапейскія краіны зрабілі істотны ўнёсак у найбольш значны праваабарончы акт дваццатага стагоддзя – Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека, якая была прынята Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 10 снежня 1948 года. Еўрапейская канвенцыя па правах чалавека, якая была прынята праз два гады і мае юрыдычную сілу для ўсіх дзяржаў – членаў Савета Еўропы, узяла свае прынцыпы і ідэі з гэтага дакумента ААН. Узнікненне правоў чалавека, якімі мы ведаем іх сёння, шмат чым абавязана масавым парушэнням правоў чалавека падчас Другой сусветнай вайны ў Еўропе і за яе межамі.

У 1985 годзе Камітэт міністраў выдаў Рэкамендацыю R (85) 7 краінам – членам Савета Еўропы аб выкладанні і навучанні аб правах чалавека ў школах. У рэкамендацыі падкрэсліваецца, што ўсе маладыя людзі павінны вывучаць правы чалавека ў рамках іх падрыхтоўкі да жыцця ў плюралістычнай дэмакратыі.

Значэнне рэкамендацыі ўзрасло пасля Другога саміту Савета Еўропы (1997 г.), калі кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў дзяржаў-членаў вырашылі «выступіць з ініцыятывай у вобласці выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці ў мэтах павышэння ўзроўню інфармаванасці грамадзян аб іх правах і абавязках у дэмакратычным грамадстве». Праект па выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці, які быў запушчаны ў адказ, сыграў важную ролю ў садзейнічанні і падтрымцы ўключэння выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека ў школьныя сістэмы.

Адданасць правам чалавека таксама прадугледжвае адданасць адукацыі ў галіне правоў чалавека. Інвестыцыі ў навучанне правам чалавека забяспечваюць надзейную будучыню для кожнага; кароткатэрміновыя скарачэнні фінансавання адукацыі вядуць да доўгатэрміновых страт.

*Пасланне ўдзельнікаў форуму «Жыць, вучыцца і змагацца за правы чалавека», 2009 г.*

Дзяржавы-ўдзельніцы павінны «забяспечыць кожнаму чалавеку ў межах іх тэрыторыі доступ да выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека». *Хартыя Савета Еўропы аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека*

Распрацоўка праграмы адукацыі моладзі ў галіне правоў чалавека, а таксама публікацыя і пераклады «Компаса» і, пазней, «Кампасіта» спрыялі далейшаму прызнанню адукацыі ў галіне правоў чалавека, у прыватнасці, з дапамогай нефармальнай адукацыі і працы з моладдзю.

У 2010 годзе Камітэт міністраў у рамках Рэкамендацыі CM/Rec (2010) 7 прыняў Хартыю Савета Еўропы аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека. Хартыя заклікае дзяржавы-ўдзельніцы ўключыць выхаванне дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыю ў галіне правоў чалавека ў навучальныя праграмы ўстаноў фармальнай адукацыі дашкольнага, пачатковага і сярэдняга школьнага ўзроўняў і ў сістэму прафесійнай адукацыі і навучання. Хартыя таксама заклікае дзяржавы-ўдзельніцы «павысіць ролю няўрадавых грамадскіх арганізацый і маладзёжных арганізацый у выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і правам чалавека, асабліва ў сістэме нефармальнай адукацыі. Яны павінны прызнаць каштоўнасць такіх арганізацый і іх дзейнасці для сістэмы адукацыі, забяспечыць ім, дзе гэта магчыма, патрэбную падтрымку і ў поўнай меры выкарыстоўваць вопыт, якім яны могуць падзяліцца з установамі адукацыі любога тыпу».

Як гаворыцца ў Хартыі, «забеспячэнне доступу да выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека для кожнага па месцы яго жыхарства» павінна стаць мэтай дзяржаўнай палітыкі і заканадаўства, якія тычацца адукацыі ў галіне правоў чалавека. Дакумент устанаўлівае мэты і прынцыпы адукацыі ў галіне правоў чалавека і змяшчае рэкамендацыі па маніторынгу, ацэнцы і даследаванням. Хартыя суправаджаецца тлумачальнай запіскай, у якой прыводзіцца падрабязная інфармацыя і прыклады, якія раскрываюць яе змест, а таксама рэкамендацыі па яе практычным прымяненні.

Роля адукацыі ў галіне правоў чалавека ў адносінах да абароны і прасоўвання правоў чалавека ў Савеце Еўропы атрымала далейшае развіццё са стварэннем у 1999 годзе пасады Камісара па правах чалавека. У задачы Камісара ўваходзіць «развіццё *адукацыі* і павышэнне *дасведчанасці* пра правы чалавека», садзейнічанне дзяржавам – удзельніцам Савета Еўропы ва ўкараненні стандартаў правоў чалавека, у выяўленні магчымых недахопаў у заканадаўстве і практыцы, а таксама забеспячэнне кансультацый па пытаннях абароны правоў чалавека ў Еўропе.

Выконваючы свой мандат, Камісар надае асаблівую ўвагу адукацыі ў галіне правоў чалавека і лічыць, што правы чалавека могуць быць дасягнуты толькі тады, калі людзі інфармаваныя аб сваіх правах і ведаюць, як іх выкарыстоўваць. Адукацыя ў галіне правоў чалавека, такім чынам, мае цэнтральнае значэнне для эфектыўнага ўкаранення еўрапейскіх стандартаў. У шэрагу сваіх дакладаў ён заклікаў нацыянальныя ўлады ўмацоўваць сістэмы адукацыі ў галіне правоў чалавека. Школьнікі і моладзь, таксама як і выкладчыкі і ўрадавыя чыноўнікі, павінны быць адукаванымі, каб прасоўваць каштоўнасці талерантнасці і павагі да іншых. У адной з публікацый пад назвай «Адукацыя ў галіне правоў чалавека з'яўляецца адным з прыярытэтаў – патрабуюцца больш канкрэтныя дзеянні»[5] ён заявіў, што «больш увагі надаецца падрыхтоўцы вучняў да рынку працы, а не развіццю навыкаў для жыцця, якія ўключалі б каштоўнасці правоў чалавека». Нельга забываць ні пра «правы чалавека праз адукацыю», ні пра «правы чалавека на адукацыю».

Такім чынам, прасоўванне права на адукацыю ў галіне правоў чалавека ў Савеце Еўропы носіць міжгаліновы і міждысцыплінарны характар.

Савет Еўропы падтрымлівае сувязь і каардынуе сваю працу па адукацыі ў галіне правоў чалавека з іншымі міжнароднымі арганізацыямі, сярод якіх ЮНЕСКА, Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, АБСЕ (Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе) і Агенцтва Еўрапейскага саюза па асноўных правах. Савет Еўропы таксама выступаў у якасці рэгіянальнага каардынатара Сусветнай праграмы ААН па адукацыі ў галіне правоў чалавека.

## Еўрапейскі цэнтр Вергеланда

www.theewc.org

Еўрапейскі цэнтр Вергеланда з'яўляецца рэсурсным цэнтрам, які займаецца пытаннямі адукацыі ў вобласці правоў чалавека, міжкультурнага ўзаемаразумення і дэмакратычнай грамадзянскасці. Цэнтр быў створаны ў 2008 годзе як сумесны праект Нарвегіі і Савета Еўропы. Асноўнымі мэтавымі групамі з'яўляюцца спецыялісты ў галіне адукацыі, навуковыя супрацоўнікі, кіраўнікі і іншыя актывісты.

У дзейнасць Цэнтра Вергеланда ўваходзіць наступнае:

- падрыхтоўка настаўнікаў, выкладчыкаў для настаўнікаў і іншых адукатараў;
- навукова-даследчая дзейнасць;
- канферэнцыі і наладжванне сувязей, у тым ліку інтэрактыўная экспертная база даных;
- электронная платформа для распаўсюджвання інфармацыі, навучальных матэрыялаў і перадавой практыкі.

## *Еўрапейскі саюз*

www.fra.europa.eu

Агенцтва Еўрапейскага саюза па асноўных правах было створана ў 2007 годзе ў якасці кансультатыўнага органа для гарантыі абароны асноўных правоў чалавека ў ЕС. Агенцтва, якое базіруецца ў Вене, Аўстрыя, з'яўляецца незалежным органам Еўрапейскага саюза, створаным для аказання дапамогі і распаўсюджвання спецыяльных ведаў у Еўрапейскім саюзе і яго дзяржавах-удзельніцах у працэсе ўжывання права ЕС да сітуацый, звязаных з асноўнымі правамі. Адной з задач Агенцтва з'яўляецца інфармаванне грамадскасці аб асноўных правах, у тым ліку правах чалавека, як яны вызначаны ў Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека і ў Хартыі Еўрапейскага саюза аб асноўных правах.

Маладзёжныя праграмы Еўрапейскага саюза на працягу многіх гадоў надаюць асаблівую ўвагу роўнасці, актыўнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека.

Многія маладзёжныя праекты, якія ажыццяўляюцца ў рамках праграм «Моладзь» і «Эразмус», заснаваны на нефармальным навучанні і даюць маладым людзям магчымасць азнаёміцца з каштоўнасцямі правоў чалавека і прыняць удзел у адукацыі ў галіне правоў чалавека.

## 1.6. Маладзёжная палітыка і адукацыя ў галіне правоў чалавека

Савет Еўропы мае даўнюю гісторыю далучэння маладых людзей да працэсаў еўрапейскага будаўніцтва, а таксама разглядае маладзёжную палітыку ў якасці неад'емнай часткі сваёй дзейнасці. Першыя мерапрыемствы для маладзёжных лідараў адбыліся ў 1967 годзе, а ўжо ў 1972 годзе былі заснаваны Еўрапейскі маладзёжны цэнтр і Еўрапейскі маладзёжны фонд. З таго часу адносіны паміж Саветам Еўропы і моладдзю развіваліся паслядоўна, прычым моладзь і маладзёжныя арганізацыі былі важнымі ўдзельнікамі і партнёрамі ўсіх ключавых момантаў як для арганізацыі, так і для Еўропы ў цэлым. Як у працэсах дэмакратызацыі былых камуністычных краін, так і пры будаўніцтве міру і пераадоленні канфліктаў у канфліктных рэгіёнах ці ў барацьбе з расізмам, антысемітызмам, ксенафобіяй і нецярпімасцю моладзь і яе арганізацыі заўсёды маглі разлічваць на Савет Еўропы, таксама як і Савет мог спадзявацца на моладзь. Мяккая і глыбокая бяспека на еўрапейскім кантыненце не можа існаваць без падтрымкі з боку адукацыі ў галіне правоў чалавека і дэмакратычнага ўдзелу.

Забеспячэнне моладзі роўнымі магчымасцямі і ведамі, якія дазволяць ім актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх аспектах жыцця грамадства.

Мэта маладзёжнай палітыкі вызначана Саветам Еўропы як «забеспячэнне моладзі – дзяўчат і юнакоў, маладых жанчын і мужчын – роўнымі магчымасцямі і ведамі, якія дазволяць ім пашырыць кругагляд, павысіць кваліфікацыю і развіць уменні, каб актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх аспектах жыцця грамадства»[6].

Роля моладзі, маладзёжных арганізацый і маладзёжнай палітыкі ў прасоўванні права на адукацыю ў галіне правоў чалавека таксама выразна прапісана ў прыярытэтах маладзёжнай палітыкі Савета Еўропы, сярод якіх значацца правы чалавека і дэмакратыя, якія рэалізуюцца з акцэнтам на:

- забеспячэнні маладых людзей магчымасцямі ў поўнай меры карыстацца правамі чалавека і валодаць чалавечай годнасцю і іх уключэнні ў працу ў гэтай сферы;
- садзейнічанні актыўнаму ўдзелу моладзі ў дэмакратычных працэсах і структурах;
- стварэнні роўных для ўсіх маладых людзей магчымасцей удзелу ва ўсіх аспектах паўсядзённага жыцця;
- гарантыі гендарнай роўнасці і прадухіленні ўсіх форм гвалту па прычыне гендарнай прыналежнасці;
- інфармаванні моладзі аб пытаннях навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця і стымуляванні актыўнай дзейнасці ў гэтых сферах;
- спрашчэнні для ўсёй моладзі доступу да інфармацыі і кансультацыйных паслуг.

Два іншыя тэматычныя напрамкі работы Савета Еўропы – сумеснае жыццё ў разнастайных супольнасцях і сацыяльная інклюзія маладых людзей – таксама цесна звязаны з адукацыяй у галіне правоў чалавека.

Маладзёжная палітыка Савета Еўропы цесна звязана з дзіцячай, паколькі дзіцячая і маладзёжная тэматыкі ў значнай ступені перакрываюць адна адну.

www.coe.int/act4hre

У 2000 годзе з нагоды 50-годдзя Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека Дырэктарат па справах моладзі і спорту пачаў рэалізацыю праграмы адукацыі моладзі ў галіне правоў чалавека, якая стала асноўным напрамкам работы Савета Еўропы з моладдзю і яго маладзёжнай палітыкі. Маладыя людзі і маладзёжныя арганізацыі выконвалі ў гэтай праграме галоўныя ролі адукатараў і актывістаў па абароне правоў чалавека і зрабілі значны ўнёсак у дзейнасць Савета Еўропы.

Яшчэ адным напрамкам развіцця праграмы стала публікацыя «Компаса» ў 2002 годзе і яго далейшы пераклад на больш за 30 моў. Праграма агульнаеўрапейскіх і нацыянальных курсаў па падрыхтоўцы выкладчыкаў і актывістаў спрыяла з'яўленню іх фармальных і нефармальных супольнасцей, якія дэманструюць адчувальныя вынікі, хоць яны і сур'ёзна адрозніваюцца ад краіны да краіны. Поспех маладзёжнай праграмы адукацыі ў галіне правоў чалавека засноўваўся таксама на:

- падтрымцы асноўных рэгіянальных і нацыянальных навучальных мерапрыемстваў для спецыялістаў па падрыхтоўцы настаўнікаў і працаўнікоў з моладдзю у дзяржавах-удзельніцах, якія былі арганізаваны ў супрацоўніцтве з нацыянальнымі арганізацыямі і ўстановамі;
- развіцці афіцыйных і нефармальных сетак арганізацый і адукатараў у галіне правоў чалавека на аснове падыходаў нефармальнага навучання на еўрапейскім і нацыянальным узроўнях;
- каардынацыі метадаў і падыходаў да адукацыі ў галіне правоў чалавека ў рамках агульнай праграмы дзейнасці маладзёжнага сектара Савета Еўропы;
- развіцці інавацыйных падыходаў да выкладання і навучання і стандартаў якасці адукацыі ў галіне правоў чалавека і нефармальнага навучання, такіх як укараненне электроннага навучання праз паглыблены трэнінг па адукацыі ў галіне правоў чалавека на аснове «Компаса»;
- забеспячэнні адукацыйнымі метадамі і рэсурсамі еўрапейскай маладзёжнай кампаніі «Усе розныя – усе роўныя» ў падтрымку разнастайнасці, правоў чалавека і ўдзелу;
- распаўсюджванні «жывой бібліятэкі» як метадалогіі міжкультурнага навучання для барацьбы са стэрэатыпамі і забабонамі;
- забеспячэнні палітычных і адукацыйных рамак для дзейнасці ў сферы міжкультурнага дыялогу.

Тысячы маладых людзей ва ўсёй Еўропе падключыліся да праграмы ў рамках пілотных праектаў па адукацыі ў галіне правоў чалавека Еўрапейскага маладзёжнага фонду.




У 2009 годзе з нагоды 60-годдзя Савета Еўропы адбыўся маладзёжны форум па адукацыі ў галіне правоў чалавека «Жыць, вучыцца і змагацца за правы чалавека», які сабраў у Еўрапейскіх маладзёжных цэнтрах у Будапешце і Страсбургу больш за 250 удзельнікаў.

Яны звярнуліся да Камітэта міністраў Савета Еўропы з пасланнем, у якім падкрэсліваліся прынцыпы і патрэбы адукацыі ў галіне правоў чалавека ў Еўропе на аснове:

- забеспячэння адпаведнага ўзроўню распаўсюджвання і падтрымкі праз праекты і партнёраў на нацыянальным і мясцовым узроўнях, а таксама шляхам распрацоўкі аптымальнай камунікацыі паміж еўрапейскім, нацыянальным і мясцовым узроўнямі дзеянняў;

- падтрымкі супрацоўніцтва паміж удзельнікамі фармальнай і нефармальнай адукацыі і інстытутамі па правах чалавека ў мэтах распрацоўкі нацыянальных праграм адукацыі ў галіне правоў чалавека;
- развіцця патэнцыялу няўрадавых партнёраў пры забеспячэнні больш шырокага ўдзелу дзяржаўных маладзёжных партнёраў;
- падтрымкі транснацыянальнага супрацоўніцтва і сетак па адукацыі ў галіне правоў чалавека;
- больш глыбокага разумення канкрэтных пытанняў правоў чалавека, якія тычацца моладзі (сярод іх гвалт і адчужанасць);
- уключэння гендарнага і міжкультурнага вымярэння ў якасці неад'емных частак канцэпцыі роўнасці пры павазе да чалавечай годнасці;
- цеснай сувязі мерапрыемстваў па адукацыі ў галіне правоў чалавека з паўсядзённай рэальнасцю жыцця моладзі, працы з моладдзю, маладзёжнай палітыкі і нефармальнага навучання;
- уліку непазбежнага ўзаемадзеяння і ўзаемадапаўняльнага характару адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі і дзяцей;
- прызнання і прасоўвання адукацыі ў галіне правоў чалавека як права чалавека і інфармавання шырокіх колаў грамадства аб гэтым;
- прыняцця да ўвагі абароны свабоды і бяспекі актывістаў і адукатараў у галіне правоў чалавека;
- вылучэння на першы план праблем меншасцей, у тым ліку гендарных, этнічных, рэлігійных, звязаных з перакананнямі, інваліднасцю ці сексуальнай арыентацыяй;
- стымулявання актыўнага ўдзелу і ўключэння моладзі і дзяцей у працэсы адукацыі;
- павышэння інфармаванасці дзяржаў і дзяржаўных органаў аб іх адказнасці за прасоўванне і падтрымку адукацыі ў галіне правоў чалавека ў фармальнай і нефармальнай адукацыі.

## 1.7. Адукацыя ў галіне правоў чалавека і моладзь

Здаецца відавочным, што моладзь павінна быць зацікаўлена ў адукацыі ў галіне правоў чалавека, але рэальнасць сведчыць аб тым, што большасць маладых людзей у Еўропе маюць абмежаваны доступ да такой адукацыі. «Компас» быў створаны, каб змяніць такое становішча.

Навучанне маладых людзей правам чалавека выгадна не толькі грамадству, але і самім маладым людзям. У сучасным грамадстве моладзь усё часцей сутыкаецца з выпадкамі сацыяльнага адчужэння, рэлігійнымі, этнічнымі і нацыянальнымі адрозненнямі, а таксама з недахопамі – як і перавагамі – глабалізацыі. Адукацыя ў галіне правоў чалавека закранае гэтыя праблемы і можа дапамагчы людзям знайсці каштоўнае ў розных перакананнях, пазіцыях і поглядах, а таксама ў відавочных супярэчнасцях сённяшняга полікультурнага грамадства, у якім яны жывуць.

У спецыяльным дакладзе Еўрабарометра за сакавік 2008 года, які мае назву «Адносіны еўрапейскіх грамадзян да навакольнага асяроддзя», сцвярджаецца, што еўрапейцы надаюць вялікае значэнне экалогіі: 96 % заяўляюць, што яна для іх альбо вельмі, альбо даволі важная. У прыватнасці, маладыя людзі выказваюць гатоўнасць прысвяціць сваю энергію і энтузіязм вырашэнню экалагічных праблем. Адным з прыкладаў стаў марш, які адбыўся ў Капенгагене ў снежні 2009 года і сабраў 100 тысяч чалавек, якія заявілі аб неабходнасці прыняцця мер па барацьбе са зменай клімату. Мы, як адукатары, павінны выкарыстаць такую энергію найлепшым чынам. Тое, што моладзь возьме гэтыя ідэі на ўзбраенне, відаць ужо па многіх акцыях: ад праграм, якія маладыя людзі праводзяць у малых маштабах і на разавай аснове ў маладзёжных клубах і школах, да буйных міжнародных мерапрыемстваў, што арганізуюць Савет Еўропы і Еўрапейскі саюз.

Яшчэ адзін прыклад дзейнасці маладых людзей з Еўропы, якія атрымалі адукацыю ў галіне правоў чалавека, тычыцца падрыхтоўкі дакладаў па краінах для Групы па правах меншасцей. Гэтыя даклады, якія выкарыстоўваюцца ўрадамі, НГА, журналістамі і навукоўцамі, дазваляюць даведацца пра меркаванні такіх супольнасцей, даюць аналіз іх становішча, практычныя парады і рэкамендацыі адносна магчымых шляхоў далейшай працы. У гэтых адносінах адукацыю ў галіне правоў чалавека можна разглядаць як дадатак да працы Еўрапейскага суда па правах чалавека, якія разам даюць зразумець, што да парушэнняў нельга ставіцца памяркоўна. Тым не менш адукацыя ў галіне правоў чалавека прапаноўвае нешта большае: яна ўяўляе сабой перш за ўсё добры спосаб прадухілення парушэнняў і, адпаведна, павышэння эфектыўнасці механізмаў папярэджання і пакарання. Людзі, якія набылі каштоўнасці павагі і роўнасці, сперажывання і адказнасці, якія атрымалі навыкі сумеснай працы і навучыліся крытычна думаць, будуць менш за ўсё схільныя парушаць правы іншых людзей. Маладыя людзі таксама выступаюць у якасці адукатараў і фасілітатараў адукацыі ў галіне правоў чалавека, тым самым уяўляючы сабой узор магутнай падтрымкі і рэсурсу для падрыхтоўкі і рэалізацыі планаў адукацыі ў галіне правоў чалавека на нацыянальным і мясцовым узроўнях.

## 1.8. На шляху да культуры правоў чалавека

Ты можаш вырваць усе кветкі, але табе не спыніць вясны

*Пабла Неруда*

«Усе дарогі вядуць у Рым». Гэтая агульнавядомая прымаўка азначае, што існуе шмат спосабаў дасягнення пастаўленай мэты. Падобна да таго, як усе дарогі вядуць у Рым, ёсць шмат розных спосабаў арганізацыі адукацыі ў галіне правоў чалавека. Таму такая адукацыя, магчыма, лепш за ўсё апісваецца з пункту гледжання таго, што яна ставіць сваёй мэтай, а мэта ў яе наступная: сфарміраваць культуру, дзе правы чалавека разумеюць, абараняюць і паважаюць, або, перафразуючы словы ўдзельнікаў Форуму па адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі, які адбыўся ў 2009 годзе, «культуру, дзе правы чалавека вывучаюць, жывуць у адпаведнасці з імі і за іх змагаюцца».

Культура правоў чалавека азначае не проста такую культуру, дзе кожны ведае свае правы; веды не абавязкова вядуць да павагі, а без павагі заўсёды будуць парушэнні. Як тады апісаць культуру правоў чалавека і якімі якасцямі павінны валодаць яе прыхільнікі? Аўтары гэтага дапаможніка працавалі над гэтымі пытаннямі і сфармулявалі некаторыя (але не ўсе) адказы. Культура правоў чалавека – гэта такая культура, у якой людзі:

- валодаюць ведамі аб правах чалавека і асноўных свабодах і паважаюць іх;
- маюць уяўленне аб самапавазе і аб павазе да іншых, шануюць чалавечую годнасць;
- вылучаюцца поглядамі і паводзінамі, у якіх праяўляецца павага да правоў іншых;
- на практыцы дэманструюць сапраўдную гендарную роўнасць ва ўсіх сферах;
- праяўляюць павагу, разуменне і прызнанне культурных адрозненняў, асабліва ў дачыненні да розных нацыянальных, этнічных, рэлігійных, моўных і іншых меншасцей і супольнасцей;
- з'яўляюцца паўнапраўнымі і актыўнымі грамадзянамі;
- выступаюць за дэмакратыю, сацыяльную справядлівасць, грамадскую гармонію, салідарнасць і сяброўства паміж народамі і краінамі;

- актыўна падтрымліваюць дзейнасць міжнародных арганізацый, накіраваных на фарміраванне культуры міру, заснаванай на ўсеагульных каштоўнасцях правоў чалавека, міжнароднага ўзаемаразумення, талерантнасці і негвалтоўя.

Гэтыя ідэалы будуць па-рознаму праяўляцца ў розных грамадствах з-за адрозненняў у іх сацыяльным, эканамічным, гістарычным і палітычным вопыце і ў рэаліях. Адсюль вынікае, што будуць таксама мець месца розныя падыходы да адукацыі ў галіне правоў чалавека. Могуць панаваць розныя погляды на лепшыя або найбольш прыдатныя спосабы фарміравання культуры правоў чалавека, але інакш і быць не можа. Усе людзі, групы, супольнасці і культуры маюць розныя зыходныя пункты і праблемы. Культура правоў чалавека павінна браць да ўвагі і паважаць гэтыя адрозненні.

# 2. Падыходы да адукацыі ў галіне правоў чалавека ў «Компасе»

## Выкарыстанне «Компаса» для адукацыі ў галіне правоў чалавека ў розных культурах і на розных мовах

Вопыт першага выдання «Компаса» паказаў, што можна стварыць адзін дапаможнік для ўсёй Еўропы. Адрозненні паміж культурамі і мовамі з'яўляюцца не перашкодамі, а больш рэсурсамі, якія ўзбагачаюць нашу працу. Кожны чалавек мае дачыненне да правоў чалавека, таму што кожны з нас мае пачуццё годнасці і адчувае сябе абражаным, калі яму адмаўляюць у яго правах. Больш таго, правы чалавека з'яўляюцца ўсеагульнымі і абвешчаны ў міжнародных дакументах, такіх як Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, з чаго вынікае, што мэты і прынцыпы адукацыі ў галіне правоў чалавека з’яўляюцца прыдатнымі да любога грамадства, хаця нельга забываць, што практычнае ажыццяўленне адукацыі ў галіне правоў чалавека павінна заўсёды ўлічваць кантэкст.

Еўропа ўвасабляе свет ва ўсёй яго разнастайнасці. На гэтым кантыненце размаўляюць больш чым на 200 мовах. У яе межах можна знайсці ўсе асноўныя рэлігіі свету. Гэты кантынент асацыюецца з нараджэннем дэмакратыі і ў той жа час з некаторымі з горшых прыкладаў фашызму і таталітарызму, якія бачыў свет. Мінулае Еўропы адзначана халакостам, каланіялізмам і рабствам, а сёння яна мае ядзерную зброю, якой хопіць, каб знішчыць усё жывое на Зямлі. У той жа час яна штогод прысуджае Нобелеўскую прэмію міру і заснавала пастаянны Суд па правах чалавека, прызнаны ва ўсім свеце.

Сёння ў склад Еўропы ўваходзяць многія дзяржавы, якіх нават не існавала ў 1949 годзе, калі Савет Еўропы быў толькі створаны, а таксама і тыя, межы якіх амаль не змяняліся на працягу соцень гадоў. Некаторыя працягваюць мяняцца і сёння, бо канфлікты падрываюць устойлівасць меж. У Еўропе жывуць людзі, якія штодня сутыкаюцца з гвалтам і канфліктамі, у той час як многія іншыя жывуць у адносным міры, бяспецы і дастатку.

У кожнай еўрапейскай краіне ёсць і мільянеры, і мільёны людзей, якія жывуць за мяжой беднасці. Існуюць адрозненні як паміж краінамі, так і ў межах кожнай краіны. Станьце настаўнікам у адной частцы Еўропы, і зможаце зарабляць у дзень больш, чым вашы калегі з іншых яе частак атрымліваюць за месяц. Станьце настаўнікам у іншай частцы Еўропы, і не будзеце атрымліваць зарплату некалькі месяцаў запар. А што наконт іх вучняў? Працягласць абавязковага школьнага навучання вар'іруецца ад дзевяці гадоў на Кіпры і ў Швейцарыі да 13 гадоў у Бельгіі і Нідэрландах. Пасля заканчэння школы шансы на атрыманне працы ў розных краінах таксама адрозніваюцца, як і шансы маладых людзей атрымаць сацыяльную падтрымку і стаць самастойнымі. Узровень беспрацоўя сярод моладзі, паводле даных Еўрастата, можа вагацца ад 7,6 % у Нідэрландах да 44,5 % у Іспаніі і 43,8 % у Латвіі.[7]

Сацыяльныя, культурныя і палітычныя ўмовы адукацыі ў галіне правоў чалавека ў розных супольнасцях і краінах адрозніваюцца, таму некаторыя дэталі ў падыходах, змесце і метадах могуць адрознівацца, хоць прынцыпы і мэты ўсюды адны і тыя ж.

*Бацькі могуць толькі даць добрую параду або накіраваць іх [дзяцей] на правільны шлях, але канчатковае фарміраванне характару чалавека знаходзіцца ў яго ўласных руках.*

*Ганна Франк*

## 2.1. Адукацыя ў галіне правоў чалавека ў розных адукацыйных сістэмах

Вопыт першага выдання «Компаса» паказаў, што ён шырока выкарыстоўваецца не толькі ў маладзёжных клубах, маладзёжных арганізацыях і НГА, але і ў школах, на прадпрыемствах і нават у дзяржаўных адукацыйных установах. Іншымі словамі, «Компас» выкарыстоўваецца ў працы з людзьмі ўсіх узростаў і ў розных адукацыйных сістэмах.

Спачатку мы спадзяваліся, што «Компас» будзе карысным перш за ўсё для спецыялістаў па працы з моладдзю ў нефармальным адукацыйным асяроддзі, напрыклад у клубах для пазашкольнай работы, спартыўных групах, маладзёжных аб'яднаннях пры цэрквах, у студэнцкіх клубах, групах па абароне правоў чалавека і ў арганізацыях, якія займаюцца маладзёжнымі абменамі. У гэтых умовах асноўная ўвага надаецца асабістаму і сацыяльнаму развіццю маладых людзей, і менавіта з гэтай прычыны выкарыстоўваецца халістычны падыход, накіраваны на ўдасканаленне ведаў і навыкаў і развіццё поглядаў у сацыяльным кантэксце.

Аднак «Компас» выкарыстоўваецца і ва ўстановах фармальнай адукацыі – школах, каледжах і ўніверсітэтах, дзе ў цэнтры ўвагі нярэдка знаходзіцца набыццё ведаў, а не развіццё навыкаў і перакананняў. Многія настаўнікі знаходзяць магчымасць выкарыстоўваць «Компас» на занятках па гісторыі, геаграфіі, мове і грамадзянскай адукацыі, і гэтыя магчымасці будуць расці па меры таго, як будзе ажыццяўляцца пераход да вучэбных праграм, заснаваных на кампетэнцыях. Падрыхтоўка спецыялістаў такіх прафесій, як выкладчыкі, менеджары, дзяржаўныя служачыя і супрацоўнікі судовых органаў, часта ляжыць дзесьці паміж фармальным і нефармальным падыходам, але і тут трэнеры выкарыстоўваюць «Компас» як для адукацыі ў галіне правоў чалавека ў цэлым, так і для вырашэння праблем, якія тычацца роўнасці магчымасцей і расізму ў самой установе.

Практыкаванні «Кампасіта» часта больш простыя і забаўляльныя, а з-за сваёй невялікай працягласці патэнцыяльна лепш падыходзяць для выкарыстання ў класе.

«Компас» быў акрэдытаваны ў якасці афіцыйнага навучальнага дапаможніка ў школах некаторых краін. Усведамляючы важнасць укаранення адукацыі ў галіне правоў чалавека ў працы з дзецьмі малодшага ўзросту, Дырэктарат Савета Еўропы па справах моладзі таксама распрацаваў «Кампасіта» – дапаможнік па адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам дзяцей. «Кампасіта» прызначаны для працы з дзецьмі ва ўзросце ад 7 да 13 гадоў і, як вынікае з назвы, заснаваны на падыходах і метадалогіі «Компаса».

Людзі па-рознаму падыходзяць да вывучэння і выкладання правоў чалавека, і хоць кожнае з практыкаванняў «Компаса» прапануе метады і асаблівасці іх прымянення, цікавыя самі па сабе, канчатковая мэта нашай працы заключаецца ў тым, каб удзельнікі маглі засвоіць матэрыял і прымяняць тое, чаму навучыліся, на практыцы. Некаторыя нашы прапановы па замацаванні вывучанага ўключаюць практыкаванні з сям'ёй або з сябрамі ці напісанне ліста ў СМІ. Гэта толькі два са шматлікіх спосабаў выкарыстання «Компаса» ў нефармальнай адукацыі.

Падыходы да фармальнай адукацыі, асабліва выкарыстаныя метады і роля выкладчыка, таксама адрозніваюцца ў розных краінах, як і даступнасць нефармальнай адукацыі ў выглядзе маладзёжных клубаў і арганізацый, іх філасофія і дзейнасць. Але, нягледзячы на існуючыя структурныя адрозненні паміж фармальнай і нефармальнай адукацыяй, пры іх апісанні мы можам зрабіць некаторыя абагульненні.

### *Інфармальная адукацыя*

Інфармальнай адукацыяй называюць працэс навучання на працягу ўсяго жыцця, падчас якога кожны чалавек набывае погляды, каштоўнасці, навыкі і веды пад уплывам як адукацыйных рэсурсаў, так і свайго ўласнага асяроддзя, а таксама паўсядзённага вопыту. Людзі вучацца ў сям'і і суседзяў, на рынку і ў бібліятэцы, на мастацкіх выставах, на працы і падчас чытання, удзелу ў гульнях і спартыўных мерапрыемствах. СМІ з'яўляюцца вельмі важным сродкам інфармальнай адукацыі і ажыццяўляюць яе праз паказ, напрыклад, п'ес ці мастацкіх і дакументальных фільмаў, тэлевізійных дэбатаў, трансляцыю музыкі і спеваў. Навучанне такім шляхам часта адбываецца незапланавана і не мае структуры.

### *Фармальная адукацыя*

Фармальная адукацыя адносіцца да структураванай сістэмы адукацыі, якая прасціраецца ад пачатковай (а ў некаторых краінах з дашкольнай) да школьнай і вышэйшай адукацыі і ўключае спецыяльна распрацаваныя праграмы прафесійнай, тэхнічнай і спецыяльнай падрыхтоўкі. Фармальная адукацыя нярэдка ўключае ў сябе ацэнку набытых навучэнцамі ведаў або кампетэнцый і грунтуецца на праграме, якая ў большай або меншай ступені выключае магчымасць адаптацыі да індывідуальных патрэб і пераваг. Фармальная адукацыя звычайна прадугледжвае афіцыйнае прызнанне і сертыфікацыю.

### *Нефармальная адукацыя*

Нефармальнай адукацыяй называюць запланаваныя і структураваныя праграмы і працэсы асабістага і сацыяльнага навучання маладых людзей, накіраванага на паляпшэнне цэлага шэрагу навыкаў і кампетэнцый па-за межамі афіцыйнай вучэбнай праграмы. Нефармальная адукацыя – гэта тое, што мы назіраем у такіх месцах, як маладзёжныя арганізацыі, спартыўныя клубы, драматычныя гурткі і супольнасці, дзе маладыя людзі сустракаюцца, напрыклад, каб прыняць удзел у сумесных праектах або гульнях, абмеркаваць нейкія пытанні, схадзіць у паход або заняцца музыкай і арганізацыяй тэатральных пастановак. Дасягненні ў нефармальнай адукацыі, як правіла, цяжка пацвердзіць, хоць іх сацыяльнае прызнанне расце. Нефармальная адукацыя павінна быць:

- добраахвотнай;
- даступнай для кожнага (у ідэале);
- арганізаваным працэсам з адукацыйнымі мэтамі;
- заснаванай на ўдзеле навучэнцаў;
- арыентаванай на навучэнцаў;
- накіраванай на навучанне навыкам для жыцця і фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі;
- заснаванай на выкарыстанні як індывідуальных, так і групавых форм навучання з апорай на калектыўны падыход;
- халістычнай і арыентаванай на працэс;
- заснаванай на вопыце і дзеянні;
- арганізаванай у адпаведнасці з патрэбамі ўдзельнікаў.

Фармальная, нефармальная і інфармальная формы адукацыі ўзаемадапаўняюць і ўзмацняюць адна адну ў працэсе навучання на працягу ўсяго жыцця. Мы хочам яшчэ раз падкрэсліць, што практыкаванні «Компаса» можна паспяхова прымяняць у самых розных сітуацыях, у фармальных ці менш фармальных умовах, на рэгулярнай або нерэгулярнай аснове. Таксама лічым патрэбным адзначыць, што аўтары дапаможніка, разумеючы, што важнасць любога працэсу залежыць ад таго, дзе і як ён адбываецца, схіляюцца ў бок нефармальнай адукацыі як патэнцыяльна больш спрыяльнай для вывучэння правоў чалавека (а таксама таму, што першапачаткова «Компас» быў распрацаваны для працы з моладдзю). Што тычыцца школ і каледжаў, то трэба падкрэсліць, што адукацыя ў галіне правоў чалавека не можа разглядацца як нешта, што адбываецца толькі на занятках; яна павінна распаўсюджвацца на ўсю школу і на пазашкольнае асяроддзе. Дэмакратычнае кіраўніцтва ўстановамі адукацыі ўяўляе сабой кірунак, які іграе ўсё больш важную ролю ў працэсе адукацыі ў галіне правоў чалавека (і з'яўляецца пацвярджэннем яе важнасці)[8].

Узаемазалежнасць паміж ведамі, поглядамі і навыкамі характэрна для якаснай адукацыі ў галіне правоў чалавека, а таксама нефармальнай адукацыі.

*Вынікі форуму «Жыць, вучыцца і змагацца за правы чалавека», 2009 г.*

У гэтым дапаможніку вы знойдзеце інфармацыю аб правах чалавека і аб самых разнастайных звязаных з імі пытаннях, а таксама больш за 60 практыкаванняў для навучання моладзі правам чалавека. Гэтымі практыкаваннямі справа не абмяжоўваецца; у дапаможніку ёсць вялікі раздзел, у якім апісваецца метадалогія навучання правам чалавека і тлумачыцца, як выкарыстоўваць практыкаванні ў розных сітуацыях і як самастойна адаптаваць іх або распрацоўваць. Таксама ёсць інфармацыя і рэкамендацыі пра тое, як дапамагчы маладым людзям вырашаць пытанні, якія тычацца іх саміх, і «брацца за справу» (глава 3).

У адукацыі ў галіне правоў чалавека метад і змест узаемазвязаныя і ўзаемазалежныя.

## 2.2. Педагагічная аснова адукацыі ў галіне правоў чалавека ў «Компасе»

Недастаткова проста ведаць аб правах чалавека; людзі павінны таксама развіваць свае навыкі і погляды, каб разам абараняць правы чалавека, выкарыстоўваць інтэлектуальныя, духоўныя і фізічныя здольнасці, каб дамагчыся асабістых і сацыяльных пераўтварэнняў, неабходных для будаўніцтва глабальнай культуры правоў чалавека.

### *Халістычны падыход да навучання*

Пытанні правоў чалавека тычацца чалавека ў цэлым (яго цела, розуму і душы) і ўсіх аспектаў яго жыцця ад калыскі да магілы. Чалавек як цэлае жыве ў цэласным свеце, дзе ўсё ўзаемазвязана; адукацыя ў галіне правоў чалавека абавязкова ўключае ў сябе халістычны, г. зн. усёахопны падыход да навучання. Халістычнае навучанне спрыяе развіццю асобы ў цэлым – яе інтэлектуальнага, эмацыянальнага, сацыяльнага, фізічнага, мастацкага, творчага і духоўнага патэнцыялу. Халістычнае навучанне таксама падразумявае, што навучанне адбываецца ў сацыяльным кантэксце, які ахоплівае ўвесь паўсядзённы вопыт; гэта надае яму міждысцыплінарны характар і звязвае ў адно цэлае традыцыйныя прадметы школьнай праграмы.

Халістычны падыход таксама азначае, што мы імкнёмся прыцягваць і выкарыстоўваць кагнітыўныя, практычныя і ацэначныя аспекты навучання, гэта значыць, нас цікавіць не толькі тое, што навучэнцы вывучаюць, але і тое, як яны ўжываюць свае веды ў адносінах, паводзінах або ў дзеяннях, індывідуальных ці калектыўных, накіраваных на абарону правоў чалавека.

Халістычнае навучанне прадугледжвае дыферэнцыраванае навучанне. У «Компасе» прадстаўлены розныя віды вучэбнай дзейнасці, якія арыентаваны як на кагнітыўную, так і на эмацыйную сферу, і ўлічваюць цэлы шэраг стыляў навучання і адрозненняў інтэлектуальнага характару.

### *Адкрыты характар навучання*

Адкрыты характар навучання азначае, што яно пабудавана такім чынам, што шматлікія (комплексныя) адказы на пытанні не толькі магчымыя, але і чаканыя. Удзельнікаў не накіроўваюць на пошукі адзінага «правільнага» адказу, таму што жыццё не чорна-белае, а нявызначанасць з'яўляецца рэчаіснасцю, у якой мы жывём. Адкрыты характар навучання ўмацоўвае ўпэўненасць у сабе, калі трэба выказаць сваё меркаванне і думаць крытычна. Для адукацыі ў галіне правоў чалавека гэта асабліва істотна, таму што пытанні правоў чалавека непазбежна выклікаюць розныя меркаванні і розныя погляды; таму важна, каб навучэнцы не толькі вучыліся разам, але маглі заставацца кожны пры сваім меркаванні або прыйсці да процілеглых высноў ці пунктаў гледжання.

### *Растлумачэнне каштоўнасцей*

Удзельнікі атрымліваюць магчымасць вызначаць, удакладняць і выказваць свае погляды і каштоўнасці і супрацьпастаўляць іх поглядам і каштоўнасцям іншых у бяспечным асяроддзі, заснаваным на годнасці кожнай чалавечай асобы, на свабодзе думкі і выказвання меркавання, а таксама на павазе да меркаванняў іншых.

### *Удзел*

Удзел у адукацыі ў галіне правоў чалавека азначае, што маладыя людзі ўдзельнічаюць у прыняцці рашэнняў аб тым, што і як яны збіраюцца даведацца пра правы чалавека. Дзякуючы ўдзелу маладых людзей у гэтым працэсе ў іх развіваюцца розныя кампетэнцыі, у тым ліку здольнасць прымаць рашэнні, слухаць, спачуваць і паважаць іншых, браць на сябе адказнасць за свае рашэнні і дзеянні.

Удзел патрабуе спрыяльнага асяроддзя, якое дапаможа навучэнцам узяць на сябе адказнасць за дзейнасць, у якую яны ўцягнуты.

Такім чынам, адукацыя ў галіне правоў чалавека павінна даць маладым людзям магчымасць вырашаць, калі, якім чынам і якія тэмы яны хацелі б прапрацаваць. Гэта азначае, што роля лідара або настаўніка заключаецца ў тым, каб выступаць у якасці метадыста, гіда, сябра ці ментара, але не інструктара, які перадае веды або прымае рашэнні і кантралюе, што і як трэба вывучаць.

Практыкаванні гэтага дапаможніка патрабуюць актыўнага ўдзелу; навучэнец павінен быць актыўным і паглыбленым у занятку; нельга сядзець склаўшы рукі і быць пасіўным назіральнікам. У гэтым сэнсе наша методыка шмат у чым абавязана працы Аўгуста Баала і іншых піянераў сацыяльнай адукацыі ў тым, што тычыцца ўсвядомленых адносін да сваіх дзеянняў, да саміх сябе і да іншых. Калі навучэнцы (удзельнікі) не прымаюць актыўнага ўдзелу ў практыкаванні, яго лепш адкласці або прыпыніць і спытаць іх аб прычынах такой пасіўнасці. Гэта таксама з'яўляецца часткай адукацыі ў галіне правоў чалавека.

Удзел патрабуе фарміравання спрыяльнага асяроддзя, якое дапаможа навучэнцам (удзельнікам) узяць на сябе адказнасць за дзеянні і працэсы, у якіх яны прымаюць удзел. Важна быць адкрытым і сумленным з удзельнікамі, у тым ліку і ў пытанні аб межах удзелу. Лепш акрэсліць межы ўдзелу загадзя, чым потым маніпуляваць сітуацыяй або імітаваць удзел.

### *Навучанне праз супрацоўніцтва*

Навучыцца паважаць іншых і працаваць разам складае адну з мэт адукацыі ў галіне правоў чалавека. Пры навучанні праз супрацоўніцтва людзі вучацца, працуючы разам, дамагаючыся вынікаў, карысных як для іх саміх, так і для астатніх членаў групы. Навучанне праз супрацоўніцтва спрыяе павышэнню паспяховасці і прадукцыйнасці, стварае атмасферу ўзаемнай падтрымкі, клопату і самаадданасці, дапамагае дасягненню больш высокай сацыяльнай кампетэнтнасці і самапавагі. У гэтым яго адрозненне ад навучання на аснове канкурэнцыі. Канкурэнтнае навучанне нярэдка спрыяе ўласнай зацікаўленасці, праяўленню непавагі да іншых, фанабэрыстасці сярод пераможцаў, у той час як тыя, хто прайгралі, нярэдка губляюць матывацыю і самапавагу.

### *Навучанне праз вопыт*

Навучанне праз вопыт з'яўляецца краевугольным каменем адукацыі ў галіне правоў чалавека, таму што асноўныя навыкі і каштоўнасці ў сферы правоў чалавека, такія як камунікатыўнасць, крытычнае мысленне, гатоўнасць абараняць іншых, талерантнасць і павага, нельга засвоіць у працэсе простага выкладання – іх вывучаюць праз вопыт і практыку.

Веды аб правах чалавека важны, але недастатковы самі па сабе. Неабходна, каб маладыя людзі мелі значна больш глыбокае разуменне таго, як правы чалавека развіваюцца з патрэб чалавека і чаму іх трэба абараняць. Так, напрыклад, маладыя людзі, якія непасрэдна не сутыкаліся з расавай дыскрымінацыяй, могуць думаць, што гэта пытанне іх не тычыцца. З пункту гледжання правоў чалавека, такое становішча непрымальна – людзі ва ўсім свеце нясуць адказнасць за абарону правоў іншых людзей.

Аднаго вопыту для навучання недастаткова.

У «Компасе» мы даем магчымасць атрымаць вопыт праз практыкаванні, такія як ролевыя гульні і аналіз сітуацыі, падчас якіх мы задаём пытанні і ставім перад удзельнікамі праблемы, для якіх яны павінны знайсці рашэнне. Аднак вопыту самога па сабе недастаткова. Каб навучыцца чаму-небудзь праз вопыт, важна асэнсаваць тое, што адбылося, зрабіць высновы і перанесці на практыку тое, што вы даведаліся ў ходзе навучання: без замацавання вопытам вывучанае будзе страчана.

## Дэвід Колб і яго цыкл навучання праз вопыт

У 1984 годзе Дэвід Колб апублікаваў працу «Навучанне праз вопыт: вопыт як крыніца навучання і развіцця». Яго тэорыя дапускае, што ў працэсе навучання існуе чатыры фазы.

Усе практыкаванні ў «Компасе» будуюцца ў адпаведнасці з гэтай мадэллю. Праводзіцца пэўная дзейнасць, якая дае ўдзельнікам *вопыт* (запланаваная падзея, стымул, практыкаванне, напрыклад ролевая гульня), за якой ідуць *аналіз* (фаза 2) і *ацэнка* (фаза 3). Апісанне кожнага практыкавання ўключае ў сябе магчымыя пытанні, якія дапамогуць накіраваць працэс аналізу і абмеркавання, падчас якога людзі змогуць асэнсаваць, што адбылося, як яны сябе адчувалі і як гэты новы вопыт суадносіцца з тым, што яны ведалі раней, і з больш шырокім светам. Нарэшце, удзельнікі пераходзяць да фазы 4, гэта значыць, да *практычных дзеянняў*, выкарыстання вывучанага на практыцы. У «Компасе» мы змяшчаем прапановы па далейшай дзейнасці навучэнцаў, у тым ліку рэкамендацыі наконт таго, як маладым людзям ажыццявіць вывучанае на практыцы, каб прынесці карысць іх супольнасці. Важна разумець, што чатыры фазы ўяўляюць сабой чатыры неад'емныя часткі цэлага працэсу навучання; людзі нічога не зразумеюць без рэфлексіі, і які сэнс ад навучання, калі яго не выкарыстоўваць? А простае, бяздумнае выкананне практыкаванняў «Компаса» (фаза 1) без іншых фаз ёсць ні што іншае, як парушэнне асноўных прынцыпаў адукацыі ў галіне правоў чалавека!

Некаторыя выказваюць занепакоенасць такім моцным жаданнем сацыяльных пераўтварэнняў і лічаць, што заахвочванне актыўнасці заходзіць занадта далёка. Не варта з-за гэтага перажываць. Як адукатары, мы імкнёмся натхняць маладых людзей на тое, каб яны ўзялі на сябе клопат аб правах чалавека, і даць ім неабходныя інструменты, каб яны маглі дзейнічаць там і тады, дзе і калі яны адчуюць, што гэта неабходна.

Тут, мабыць, неабходна растлумачыць, як мы выкарыстоўваем тэрмін «дзейнасць» у «Компасе». Мы выкарыстоўваем яго як у значэнні «стымул, метад або падзея», якая адбываецца ў фазе 1 навучальнага цыкла, так і ў значэнні «мерапрыемства цалкам», якое ахоплівае ўсе чатыры стадыі навучальнага цыкла. На практыцы з кантэксту, у якім гэты тэрмін выкарыстоўваецца, павінна быць зразумела, ці мы гаворым пра метад або пра метад разам з аналізам і ацэнкай, практычнымі дзеяннямі і далейшай дзейнасцю.




### ***Арыентацыя на навучэнца***

Адукацыя ў галіне правоў чалавека мае вельмі ясную мэту: садзейнічаць навучанню пра правы чалавека, для правоў чалавека і праз правы чалавека. Хоць веды аб правах чалавека і кампетэнцыі ў галіне правоў чалавека з'яўляюцца складанай часткай такой адукацыі, у яе цэнтры знаходзіцца навучэнец ці ўдзельнік. Важна не столькі тое, што дае або перадае фасілітатар або выкладчык, і не змест таго, што будзе вывучана («Сёння мы разгледзім тэму смяротнага пакарання»). У цэнтры ўвагі знаходзяцца менавіта навучэнцы (удзельнікі), таму што важна менавіта тое, чаму яны навучацца і якія высновы зробяць, бо ў такім выпадку атрыманыя веды і вопыт больш значныя для ўдзельніка (або зусім нязначныя, што таксама важна адзначыць) і хутчэй за ўсё атрымаюць практычнае прымяненне. З арыентацыі на ўдзельніка выцякае шмат іншых палажэнняў і наступстваў, у тым ліку гатоўнасць фасілітатара адаптаваць змест і ўзровень складанасці праграмы да рэальных здольнасцей удзельнікаў, гэта значыць, зрабіць тое, што ў працэсе падрыхтоўкі «Компаса» мы называлі «пачынаць з людзей».

## 2.3. Адукацыя ў галіне правоў чалавека: працэс і вынікі

Ключавыя адукацыйныя падыходы, якія выкарыстоўваюцца ў «Компасе», – навучанне праз супрацоўніцтва, удзел і навучанне праз вопыт – аб'ядноўваюцца падчас выканання практыкаванняў, іх абмеркавання і далейшай дзейнасці ў мэтах стварэння працэсу, які:

- пачынаецца з таго, што людзі ўжо ведаюць, з іх меркаванняў і вопыту, і на гэтай аснове дазваляе ім шукаць і разам знаходзіць новыя ідэі і вопыт (навучанне ***аб*** правах чалавека);

- спрыяе таму, што маладыя людзі прымаюць удзел у абмеркаванні, уносяць у яго свой уклад і як мага больш вучацца адзін у аднаго (навучанне ***праз*** правы чалавека);
- падтрымлівае людзей у пераўтварэнні іх ведаў у простыя, але эфектыўныя дзеянні, якія дэманструюць іх непрыманне несправядлівасці, няроўнасці і парушэнняў правоў чалавека (навучанне ***для*** правоў чалавека).

Каб дасягнуць максімальнага эфекту, адукатары, спецыялісты па адукацыі ў галіне правоў чалавека павінны не забываць пра сваю мэту: правы чалавека пашыраюць правы і магчымасці моладзі, нават калі яны не праяўляюць актыўнасці. На практыцы не існуе адрозненняў паміж адукацыяй у галіне правоў чалавека як працэсам і як вынікам; праз дзейнасць яны становяцца адзіным цэлым, у якім працэс і змест, метады і вынікі становяцца ўзаемазалежнымі, бо, як сказаў, здаецца, Махатма Гандзі, «няма шляху да міру, мір і ёсць шлях».

Падобна таму, як вышэй мы паспрабавалі апісаць асноўныя прыкметы культуры правоў чалавека, далей мы – аўтары гэтага дапаможніка – таксама паспрабуем пералічыць веды, навыкі і погляды чалавека, які атрымаў адукацыю ў гэтай галіне. Гэтыя кампетэнцыі паслужаць нам у якасці асновы для распрацоўкі мэт нашых практыкаванняў.

У агульных рысах вынікі адукацыі ў галіне правоў чалавека можна апісаць з пункту гледжання ведаў і разумення, навыкаў і пазіцый наступным чынам:

- дасведчанасць і разуменне пытанняў правоў чалавека, у выніку чаго людзі могуць распазнаць і прызнаць парушэнні правоў чалавека: вывучэнне таго, што такое правы чалавека, як іх можна абараняць у краіне пражывання, якія органы нясуць адказнасць за іх абарону; якія міжнародныя дагаворы прымяняюцца, выканання якіх правоў удзельнікі (маладыя людзі) могуць патрабаваць (навучанне *аб* правах чалавека);
- навыкі і здольнасці змагацца і абараняць свае ўласныя і чужыя правы чалавека, такія як павышэнне дасведчанасці, прапаганда і агітацыя за правы, разуменне магчымасці звязацца з адпаведнымі органамі або прэсай (навучанне *ў абарону* правоў чалавека) і гэтак далей;
- пазіцыі павагі да правоў чалавека, у выніку чаго людзі паважаюць правы іншых, а ўдзельнікі жывуць у адпаведнасці з каштоўнасцямі правоў чалавека; так званае «гарызантальнае вымярэнне» правоў чалавека прымяняецца да зносін паміж людзьмі, а не толькі паміж людзьмі і дзяржаўнымі ўстановамі (як у так званым «вертыкальным вымярэнні»). Такія пазіцыі могуць праяўляцца ў сям'і, сярод аднагодкаў, у школе, у маладзёжнай арганізацыі або ў клубе (навучанне *праз* і навучанне *ў* правах чалавека).

### *Мэты, заснаваныя на кампетэнцыях*

Пастаноўка агульных мэт бывае карысная, але, каб выкладанне правоў чалавека было больш эфектыўным, мы павінны быць значна больш дакладнымі ў вызначэнні мэт і ясна акрэсліць, якія кампетэнцыі мы хочам развіваць у маладых людзей, з якімі працуем. Мы павінны задаць сабе пытанне: якія веды неабходныя маладым людзям, каб больш глыбока ўсвядоміць розныя аспекты правоў чалавека? Якія навыкі і перакананні спатрэбяцца ім у справе абароны правоў чалавека? Адказы на гэтыя пытанні дапамогуць апісаць нашы мэты больш дакладна. Ніжэй пералічваюцца тыя характэрныя рысы і ключавыя паняцці адукацыі ў галіне правоў чалавека, якія былі выяўлены падчас падрыхтоўкі «Компаса» і ў практычнай дзейнасці па навучанні маладых людзей правам чалавека па ўсёй Еўропе. Яны складаюць аснову для сістэмы практыкаванняў, прапанаваных у дапаможніку.

### *Веданне і разуменне*

- Ключавыя паняцці: свабода, справядлівасць, роўнасць, чалавечая годнасць, недыскрымінацыя, дэмакратыя, усеагульнасць, правы, абавязкі, узаемазалежнасць і салідарнасць.
- Ідэя аб тым, што правы чалавека забяспечваюць аснову для абмеркавання і ўзгаднення мадэлей паводзін у сям'і, у школе, у грамадстве і свеце ў цэлым.
- Роля правоў чалавека, іх мінулае і будучыня ў жыцці чалавека, у жыцці супольнасцей, а таксама ў жыцці іншых людзей ва ўсім свеце.
- Адрозненні і сувязь паміж грамадска-палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі правамі.
- Мясцовыя, нацыянальныя, міжнародныя арганізацыі, НГА і асобы, якія працуюць для падтрымкі і абароны правоў чалавека.
- Розныя падыходы да разумення і рэалізацыі правоў чалавека ў розных грамадствах і розных групах у межах аднаго грамадства, і розныя крыніцы легітымнасці, у тым ліку рэлігійныя, духоўныя і прававыя крыніцы.
- Асноўныя сацыяльныя змены, гістарычныя падзеі і прычыны, якія вядуць да прызнання правоў чалавека.
- Правы, замацаваныя ў асноўных міжнародна-прававых актах, створаных для абароны правоў чалавека, напрыклад Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (УДПЧ), Канвенцыя ААН аб правах дзіцяці (КПД) і Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод (ЕКПЧ).
- Правы чалавека, замацаваныя ў нацыянальных канстытуцыях і законах, і органы, адказныя за іх маніторынг на нацыянальным узроўні.

На практыцы паміж працэсам і вынікамі адукацыі ў галіне правоў чалавека не павінна быць размежавання.

### *Навыкі*

- Актыўнае слуханне і камунікацыя: уменне выслухаць розныя пункты гледжання, адстойваць свае ўласныя правы і правы іншых людзей.
- Крытычнае мысленне: уменне знаходзіць значную інфармацыю, крытычна ацэньваць доказы, распазнаваць забабоны і прадузятасці, формы маніпуляцый і прымаць рашэнні на аснове аргументаваных меркаванняў.
- Навыкі супрацоўніцтва і станоўчага вырашэння канфліктаў.
- Навыкі ўдзелу ў працы сацыяльных груп і іх арганізацыі.
- Здольнасць распазнаваць парушэнні правоў чалавека.
- Уменне дзейнічаць у мэтах прасоўвання і абароны правоў чалавека – як на месцах, так і ў глабальным маштабе.

### *Перакананні і каштоўнасці*

- Пачуццё адказнасці за свае дзеянні, імкненне да асабістага развіцця і сацыяльных пераўтварэнняў.
- Дапытлівасць, адкрытасць розуму і разуменне каштоўнасці разнастайнасці культур.
- Суперажыванне і салідарнасць з іншымі людзьмі, імкненне падтрымаць тых, чые правы знаходзяцца пад пагрозай.
- Пачуццё чалавечай годнасці, уласнай значнасці і значнасці іншых людзей незалежна ад сацыяльных, культурных, моўных або рэлігійных адрозненняў.
- Пачуццё справядлівасці, імкненне працаваць у імя дасягнення ідэалаў усеагульных правоў чалавека, роўнасць і павага да разнастайнасці.

## 2.4. Адукацыя ў галіне правоў чалавека і іншыя адукацыйныя сферы

Амаль кожная праблема ў сучасным свеце звязана з парушэннямі правоў чалавека.

Правы чалавека закранаюць усе аспекты нашага жыцця на мясцовым і глабальным узроўнях. Калі мы зазірнём ва Ўсеагульную дэкларацыю правоў чалавека (УДПЧ), то ўбачым, што амаль усе праблемы сучаснага свету – беднасць, забруджванне навакольнага асяроддзя, змяненне клімату, эканамічная няроўнасць, СНІД, абмежаваны доступ да адукацыі, расізм і войны – уключаюць у сябе парушэнні правоў чалавека.

Цяжка сказаць, якая з названых несправядлівасцей больш ці менш важная. Перспектыва змяняецца ў залежнасці ад месца, дзе вы знаходзіцеся, і ад вашага асабістага статусу. Больш за тое, яны ўзаемазвязаны паміж сабой да такой ступені, што рашэнне любой з іх уключае ў сябе рашэнне іншай. Правы чалавека *непадзельныя*, *узаемазалежныя* і *ўзаемазвязаныя*, і немагчыма ўзяць і выбраць, якія з іх варта прымаць і паважаць.

Нельга сказаць, што гэтыя праблемы прадстаўляюць інтарэс выключна для адукатараў, якія працуюць у галіне правоў чалавека; яны аднолькава актуальны для ўсіх, хто аддае сілы справе стварэння справядлівага і мірнага свету, у якім павага і роўнасць з'яўляюцца нормай. Калі людзі працуюць, напрыклад, у сферы адукацыі для развіцця, выхавання ў духу міру, адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця або выхавання грамадзянскасці, гэта значыць, што мы ўсе працуем з узаемазалежнымі і ўзаемазвязанымі пытаннямі і «Компасу» ёсць што прапанаваць у гэтай сувязі. Правы чалавека сапраўды разнастайныя і паўстаюць у значна больш разнастайных формах, чым мы можам сабе ўявіць! Часта, асабліва ў працы з моладдзю, мы заклікаем маладых людзей развіваць у сабе пачуцці адказнасці і годнасці, але не абавязкова называем гэта адукацыяй у галіне правоў чалавека.

Выхаванне дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыя ў галіне правоў чалавека адрозніваюцца, хутчэй, акцэнтам і маштабам, чым мэтамі і практыкай.

### *Грамадзянская адукацыя* (выхаванне дэмакратычнай грамадзянскасці)

Згодна з Хартыяй Савета Еўропы аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека, «Выхаванне дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыя ў галіне правоў чалавека цесна ўзаемазвязаны і ўзаемна дапаўняюць адно аднаго. Яны адрозніваюцца, хутчэй, акцэнтам і маштабам, чым мэтамі і практыкай. У выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці галоўная ўвага надаецца дэмакратычным правам, абавязкам і актыўнаму ўдзелу ў грамадзянскай, палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай, прававой і культурнай сферах жыцця грамадства, у той час як адукацыя ў галіне правоў чалавека ахоплівае больш шырокі спектр правоў чалавека і асноўных свабод ва ўсіх аспектах жыцця людзей».

Праграма па выхаванні грамадзянскасці ўключае раздзелы, прысвечаныя палітыцы і працы ўрадаў, прававой сістэмы, сродкаў масавай інфармацыі, мультыкультуралізму і праблеме роўных магчымасцей. «Компас» прапануе вялікую колькасць адпаведных практыкаванняў па тэмах «Дэмакратыя», «Грамадзянскасць і ўдзел», «СМІ», «Агульныя правы чалавека», «Дыскрымінацыя і нецярпімасць» і «Гендарныя пытанні».

Гэтыя тэмы «Компаса» таксама будуць карысныя ўрадавым і няўрадавым грамадскім арганізацыям, якія займаюцца выхаваннем грамадзянскасці ў працы з мігрантамі і бежанцамі, якія маюць патрэбу ў навучанні, каб стаць юрыдычна і сацыяльна прызнанымі грамадзянамі краіны.

### *Асабістая і сацыяльная адукацыя*

У многіх краінах існуе пэўная форма адукацыі, якая разглядае ролю чалавека ў грамадстве і дапамагае маладым людзям падрыхтавацца да вырашэння асабістых праблем, з якімі яны сутыкнуцца. Змест такой адукацыі можа перасякацца з пытаннямі грамадзянскасці, але таксама можа ўключаць аспекты асабістага жыцця чалавека, звязаныя з адпачынкам, напрыклад спорт, клубы і аб'яднанні, музыку, мастацтва і іншыя формы культуры. Такое навучанне можа таксама тычыцца асабістых адносін. Правы чалавека ўключаюцца ў гэтыя пытанні двума галоўнымі спосабамі: па-першае, таму што развіццё асобы і асабістых адносін характарызуецца маральнымі і сацыяльнымі аспектамі, у якіх павінны пераважаць каштоўнасці правоў чалавека; а па-другое, таму што права на ўдзел у культурным і грамадскім жыцці замацавана ва УДПЧ, а таксама ў іншых міжнародных дагаворах. Нават калі моладзь, з якой вы працуеце, можа скарыстацца гэтым правам, то ва ўсім свеце жывуць маладыя людзі, якія гэтага зрабіць не могуць.

«Компас» прапануе розныя практыкаванні ў рамках тэм «Удзел» і «Культура і спорт», якія могуць быць карысныя выкладчыкам, якія працуюць у сферы асабістай і сацыяльнай адукацыі.

### *Выхаванне каштоўнасцей (маральнае выхаванне)*

Ніхто не можа быць раскрытыкаваны за навучанне каштоўнасцям правоў чалавека!

Выхаванне каштоўнасцей з'яўляецца агульнай часткай школьнай праграмы ў многіх краінах, але гэта часта прыводзіць да ўзнікнення дзвюх фундаментальных праблем у свядомасці людзей: якім каштоўнасцям павінна вучыць такое выхаванне і як зрабіць так, каб гэтыя каштоўнасці не навязваліся людзям і не ўспрымаліся як каштоўнасці большасці? Цалкам дапушчальна і апраўдана абраць зыходным пунктам правы чалавека, таму што правы чалавека заснаваны на каштоўнасцях, якія з'яўляюцца агульнымі для ўсіх асноўных рэлігій і культур і прызнаюцца – але не абавязкова ператвараюцца ў жыццё – амаль у кожнай краіне свету. Каштоўнасці, якія ляжаць у аснове правоў чалавека, носяць універсальны характар, хоць спосаб іх выражэння ў розных грамадствах можа значна адрозніваецца. Правы чалавека былі распрацаваны ў працэсе перамоў і ў выніку дасягнення кансэнсусу паміж урадамі краін усяго свету. Таму ніхто не можа быць раскрытыкаваны за навучанне каштоўнасцям правоў чалавека!

### *Глабальная адукацыя*

Спецыялісты ў галіне глабальнай адукацыі прызнаюць важнасць халістычнага падыходу да прадмета, таму што цэняць узаемазалежнасць сацыяльных, эканамічных, экалагічных і палітычных аспектаў нашага свету і сцвярджаюць, што, як грамадзяне свету, мы маем абавязкі перад сусветнай супольнасцю.

У Маастрыхцкай дэкларацыі глабальнай адукацыі (2002 г.)9 гаворыцца, што глабальнай з'яўляецца такая адукацыя, якая адкрывае людзям вочы і даносіць да іх розуму рэаліі глабалізацыі, а таксама заахвочвае іх несці ў свет больш справядлівасці, роўнасці і правоў чалавека для ўсіх. Яна ўключае ў сябе адукацыю для развіцця, адукацыю ў галіне правоў чалавека, адукацыю ў інтарэсах устойлівага развіцця, выхаванне ў імя міру і прадухілення канфліктаў і міжкультурнае навучанне.

Прызнанне правоў чалавека ў якасці зыходнага пункта для вывучэння сацыяльных, эканамічных, экалагічных і палітычных аспектаў нашага свету дасць спецыялістам у галіне глабальнай адукацыі магчымасць узбагаціць сваю педагагічную дзейнасць.

Заахвочваючы навучэнцаў і адукатараў сумесна працаваць над глабальнымі пытаннямі з прымяненнем дасягненняў інавацыйнай педагогікі, метады і практыкі глабальнай адукацыі дапамагаюць зразумець складаныя рэаліі і працэсы, якія маюць месца ў сучасным свеце; яны імкнуцца развіваць каштоўнасці, адносіны, веды і навыкі, якія дазваляюць людзям павярнуцца тварам да праблем, якіх становіцца ўсё больш у сучасным узаемазвязаным свеце, зразумець гэтыя праблемы і знайсці для іх рашэнне ў духу «глабальнай адказнасці грамадзян свету».

«Компас» прапануе вялікую колькасць практыкаванняў у рамках тэмы «Глабалізацыя», таму што многія пытанні правоў чалавека сёння маюць вельмі важнае глабальнае вымярэнне. Напрыклад, у практыкаванні «Можна ўвайсці?» на старонцы 115 удзельнікі мадэлiруюць вопыт шукальнікаў прытулку.

### Міжкультурная адукацыя

Міжкультурная адукацыя накіравана на развіццё ўзаемаразумення паміж культурамі праз вывучэнне падабенстваў і адрозненняў паміж культурамі і народамі. Адсутнасць міжкультурнага ўзаемаразумення часта прыводзіць да расавай дыскрымінацыі, нецярпімасці, паклёпу і гвалту на месцах і ў глабальным маштабе. Сумнымі ілюстрацыямі да праблем, якія могуць узнікаць у выніку няздольнасці людзей паважаць прадстаўнікоў іншых культур і жыць побач з імі, з'яўляюцца праявы расізму, дыскрымінацыі і гвалту, з якімі можна сутыкнуцца ва ўсіх краінах.

Прычыны канфліктаў ніколі не бываюць простымі, але няроўнае размеркаванне рэсурсаў і няроўнасць у палітычных і сацыяльных правах застаюцца асноўнымі крыніцамі нецярпімасці і дыскрымінацыі. Таму прававая перспектыва з'яўляецца лагічным падыходам, які бяруць на ўзбраенне спецыялісты па міжкультурнай адукацыі, якія знойдуць шмат карысных матэрыялаў па гэтай тэме ў «Компасе» і іншых публікацыях Савета Еўропы.

Маладзёжны сектар Савета Еўропы значныя намаганні прысвяціў галіне міжкультурнай адукацыі, асабліва ў рамках Еўрапейскіх маладзёжных цэнтраў і Еўрапейскага маладзёжнага фонду. З 1995 года ў Еўропе вядзецца кампанія супраць расізму, ксенафобіі, антысемітызму і нецярпімасці пад лозунгам «Усе розныя – усе роўныя», накіраваная супраць росту варожасці і нецярпімасці ў адносінах да меншасцей[10]. Пакет дыдактычных матэрыялаў, які быў падрыхтаваны для кампаніі «Усе розныя – усе роўныя» і з'яўляецца папярэднікам «Компаса», змяшчае шмат карысных практыкаванняў, якія дапаўняюць матэрыялы «Компаса», для працы па тэме «Дыскрымінацыя і нецярпімасць».

### Антырасісцкая адукацыя

Антырасісцкая адукацыя накіравана на тое, каб пакласці канец шматвяковай спадчыне панавання расісцкіх поглядаў і ідэалогіі, і прымае ў якасці зыходнага пункту гледжання сцвярджэнне, што мы жывём у полікультурным і дэмакратычным грамадстве, дзе ўсе грамадзяне маюць права на роўнасць і справядлівасць. Іншымі словамі, яна бярэ на ўзбраенне падыход, заснаваны на абароне правоў, і цесна звязана з міжкультурнай адукацыяй.

Добрым зыходным пунктам для спецыялістаў-практыкаў у галіне антырасісцкай адукацыі з'яўляюцца глава і практыкаванні «Компаса», прысвечаныя тэме «Дыскрымінацыя і нецярпімасць». Калі вас цікавіць метад адукацыі «роўны вучыць роўнага», яшчэ больш ідэй вы знойдзеце ў іншай публікацыі Савета Еўропы – «ДАміно» (DOmino).

У Савеце Еўропы пытаннямі правоў чалавека, адукацыі і барацьбы супраць расізму займаецца Еўрапейская камісія супраць расізму і нецярпімасці (ЕКРН). Задачай ЕКРН з'яўляецца барацьба супраць расізму, расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі, антысемітызму і нецярпімасці ў Вялікай Еўропе з пункту гледжання абароны правоў чалавека. Яе дзейнасць заснавана на Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека, яе дадатковых пратаколах і адпаведным прэцэдэнтным праве.

### Адукацыя для развіцця

Правы чалавека – важны аспект адукацыі для развіцця

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека і Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах змяшчаюць шэраг артыкулаў, якія з'яўляюцца ключавымі для разумення права на развіццё, напрыклад прасоўванне сацыяльнага прагрэсу і паляпшэнне ўмоў жыцця, права на абарону ад дыскрымінацыі, права на ўдзел у грамадска-палітычных справах, права на дастатковы жыццёвы ўзровень і права на свабоднае самавызначэнне. Яны таксама змяшчаюць права чалавека на сацыяльны і міжнародны парадак, пры якім правы і свабоды, выкладзеныя ў Дэкларацыі, могуць быць цалкам рэалізаваны.

Права на развіццё было абвешчана ААН у 1986 годзе ў «Дэкларацыі аб праве на развіццё» і прынята Генеральнай Асамблеяй ААН у адпаведнасці з рэзалюцыяй 41/128. Права на развіццё, замацаванае Венскай дэкларацыяй 1993 года, уяўляе сабой групавое права, якое належыць людзям у іх сукупнасці і ў выніку гэтага адрозніваецца ад тых правоў, якія належаць фізічным асобам.

Спецыялісты ў галіне адукацыі для развіцця прызнаюць правы чалавека ў якасці важнага элемента сваёй працы. Аднак яны не заўсёды зыходзяць з правоў чалавека. Традыцыйны падыход да адукацыі для развіцця заключаецца ў вывучэнні адносін паміж людзьмі, якія жывуць у «развітых» краінах Поўначы, і людзьмі з краін Поўдня, якія «знаходзяцца ў стадыі развіцця», і ў імкненні зразумець, як эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя і экалагічныя фактары вызначаюць жыццё людзей. Мы лічым, што падыход да гэтых пытанняў з пункту гледжання правоў чалавека дасць дадатковы стымул працы па гэтай тэме. Яшчэ адным станоўчым момантам з'яўляецца тое, што практыкаванні, якія мы прапануем у «Компасе», развіваюць навыкі, пазіцыі і каштоўнасці, якія дазваляюць людзям працаваць разам, каб дамагацца пераўтварэнняў, што ўяўляе сабой адну з важнейшых мэт адукацыі для развіцця.

Такія тэмы «Компаса», як «Праца», «Беднасць», «Здароўе», «Глабалізацыя» і «Навакольнае асяроддзе», маюць найбольш відавочныя сувязі з адукацыяй для развіцця.

### Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця (экалагічная адукацыя)

Калі мы захочам падысці да пытанняў навакольнага асяроддзя з пазіцыі правоў чалавека, зыходным пунктам можа стаць артыкул 25 УДПЧ, які тычыцца права на дастатковы ўзровень жыцця, у тым ліку дастатковае харчаванне, адзенне і жыллё. Паколькі жыццё чалавека залежыць ад здаровага і ўстойлівага навакольнага асяроддзя, улік правоў чалавека ў планетарным маштабе і правоў будучых пакаленняў патрабуе вынясення пытанняў навакольнага асяроддзя на першы план. Сёння некаторыя эксперты нават гавораць аб неабходнасці афіцыйнага прызнання асобных экалагічных правоў чалавека.

Навакольнае асяроддзе забяспечвае нас таварамі і паслугамі, якія падтрымліваюць наша жыццё і наш лад жыцця. Аднак ужо даўно ясна, што мы жывём на планеце, існаванне якой не бясконцае, і што дзейнасць чалавека мае сур'ёзныя наступствы для стану навакольнага асяроддзя і дабрабыту чалавецтва. З гэтага пункту гледжання, дзеянні, накіраваныя на далейшае эканамічнае развіццё, павінны быць збалансаваны з улікам таго, як дорага яны абыдуцца чалавецтву і прыродзе ў цэлым. Экалагічная адукацыя ставіць сваёй мэтай прыцягнуць увагу грамадскасці да гэтых пытанняў і садзейнічаць узмацненню клопату аб прыродных рэсурсах планеты і павагі да іх.

Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця, якую часта звязваюць з экалагічнай адукацыяй, таксама падкрэслівае неабходнасць фарміравання халістычнага ўяўлення аб пытаннях навакольнага асяроддзя і развіцця. Тэрмін «устойлівае развіццё» ўвайшоў у шырокі ўжытак пасля Канферэнцыі ААН па навакольным асяроддзі і развіцці, якая адбылася ў Рыа-дэ-Жанэйра ў 1992 годзе; ён азначае развіццё, якое накіравана на задавальненне цяперашніх патрэб без шкоды для будучых пакаленняў. Іншымі словамі, устойлівасць – гэта такі клопат пра наваколле, які пакідае яго прыдатным для жыцця будучых пакаленняў. Таму такія каштоўнасці правоў чалавека, як справядлівасць і роўнасць, ляжаць у аснове ідэі ўстойлівасці.

Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця, згодна з ЮНЕСКА, заклікана дапамагчы людзям развіваць пазіцыі, навыкі і веды з тым, каб прымаць абгрунтаваныя рашэнні на карысць сабе і іншым на сённяшні дзень і на будучыню і дзейнічаць у адпаведнасці з гэтымі рашэннямі.

Дзесяцігоддзе ААН па адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця (2005–2014 гг.), вядучай установай якога з'яўляецца ЮНЕСКА, ставіць сваёй задачай інтэграцыю прынцыпаў, каштоўнасцей і практыкі ўстойлівага развіцця ва ўсе аспекты адукацыі і навучання з мэтай вырашэння сацыяльных, эканамічных, культурных і экалагічных праблем, з якімі мы сутыкаемся ў XXI стагоддзі.

Існуюць вельмі цесныя сувязі паміж адукацыяй у інтарэсах устойлівага развіцця, адукацыяй для развіцця, глабальнай адукацыяй і адукацыяй у галіне правоў чалавека, асабліва ў тым, што тычыцца развіцця поглядаў, навыкаў і ведаў, неабходных для прыняцця абгрунтаваных рашэнняў на карысць саміх сябе і нашай планеты і ажыццяўлення дзеянняў у адпаведнасці з гэтымі рашэннямі. Разам з тэмамі, якія згадваюцца вышэй і маюць дачыненне да глабальнай адукацыі і адукацыі для развіцця, у «Компасе» ёсць асобная тэма, прысвечаная навакольнаму асяроддзю, у якой пытанні ўстойлівага развіцця разглядаюцца з пункту гледжання правоў чалавека.

### *Адукацыя ў духу міру*

Ключавымі паняццямі адукацыі ў духу міру, як сведчыць практыка многіх школьных і ўніверсітэцкіх праграм, з'яўляюцца паняцці гвалту і яго кантролю, скарачэння і ліквідацыі. Навучанне ў духу міру знаходзіць адлюстраванне ў планах і праграмах па канфліктalогіі, міжкультурнай адукацыі, адукацыі для развіцця, светабудове і экалагічнай адукацыі. Часцей за ўсё гэты падыход развіваецца як рэакцыя на пэўны набор праблем, якія ўспрымаюцца ў якасці прычын сацыяльнай несправядлівасці, канфліктаў і войнаў.

З іншага боку, адукацыя ў духу міру, зыходным пунктам якой з'яўляюцца правы чалавека, заснаваныя на паняццях чалавечай годнасці і ўсеагульнасці, можа лягчэй прывесці да больш глыбокага разумення міру – міру не толькі ў сэнсе спынення гвалту, але і ў сэнсе аднаўлення адносін і стварэння сацыяльных, эканамічных і палітычных сістэм, якія з большай доляй верагоднасці паспрыяюць фарміраванню доўгатэрміновага мірнага асяроддзя.

Адукацыя ў духу міру разглядае самыя розныя формы гвалту, такія, напрыклад, як фізічны або паводзінскі гвалт, у тым ліку войны; структурны гвалт, г. зн. беднасць і нягоды, якія з'яўляюцца вынікам несправядлівых сацыяльных і эканамічных структур; палітычны гвалт з боку рэпрэсіўных сістэм, якія занявольваюць, запалохваюць і праследуюць іншадумцаў, а таксама бедных, бяспраўных і маргіналізаваных людзей; культурны гвалт, накіраваны на абясцэньванне і разбурэнне ідэнтычнасці і ладу жыцця асобных людзей; а таксама гвалт у форме расізму, сексізму, этнацэнтрызму, каланіяльнай ідэалогіі і іншыя формы духоўнага адчужэння, якія прэтэндуюць на тое, каб абгрунтаваць агрэсію, дамінаванне, несправядлівасць і прыгнёт.

Успрыманне ўсіх гэтых форм гвалту як парушэнняў асобных стандартаў правоў чалавека забяспечвае канструктыўны рух наперад. Прынятая ў адукацыі ў галіне правоў чалавека метадалогія крытычнага мыслення і навучання праз вопыт прыўносіць не толькі элемент канкрэтнага вопыту, але і больш дасканалыя нарматыўныя і апісальныя параметры. Такія тэмы, закранутыя ў «Компасе», як «Мір і гвалт» і «Вайна і тэрарызм», дадуць практыкам багаты матэрыял.

COMPASS

Адукацыя ў духу міру, зыходным пунктам якой з'яўляюцца правы чалавека, можа лягчэй прывесці да больш глыбокага разумення міру.

## 2.5. Пытанні аб выкарыстанні адукацыі ў галіне правоў чалавека ў працы з моладдзю

Незалежна ад таго, ці працуеце вы ў маладзёжнай арганізацыі, з'яўляецеся школьным настаўнікам або членам НГА, якая працуе з моладдзю, і незалежна ад таго, ці былі вы ўжо раней заняты ў адной са згаданых вышэй форм навучання, правы чалавека маюць непасрэднае дачыненне да вашай працы. Аднак з-за шэрагу прычын вы можаце крыху сумнявацца наконт неабходнасці адукацыі ў галіне правоў чалавека. Ніжэй мы прыводзім некаторыя часта задаваныя пытанні аб адукацыі ў галіне правоў чалавека і спрабуем адказаць на іх, каб зняць некаторыя сумненні, якія ўзнікаюць у людзей адносна такой адукацыі і яе выкарыстання ў сваёй працы.

***Ці не лепш было б маладым людзям больш ведаць пра абавязкі, чым пра правы?***

**Адказ**: І правы, і абавязкі ляжаць у аснове правоў чалавека, і гэты дапаможнік робіць упор як на правах, так і на абавязках. Артыкул 1 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека абвяшчае, што «ўсе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны … павінны ставіцца адзін да аднаго ў духу брацтва». Артыкул 30 абвяшчае: «... [ні] дзяржава, [ні] група або асоба [не маюць] права займацца якой-небудзь дзейнасцю або ажыццяўляць дзеянні, накіраваныя на знішчэнне правоў і свабод, якія тут замацаваны». Практыкаванні «Компаса» накіраваны на тое, каб паказаць, што ніводнае права не можа быць выкарыстана для парушэння правоў іншых людзей і што кожны чалавек павінен паважаць правы іншых.

***Ці не будуць бацькі, дырэктары школ і мясцовае кіраўніцтва перашкаджаць выкладанню правоў чалавека як форме палітычнай прапаганды, якая будзе падбухторваць на бунтарскія паводзіны?***

**Адказ**: Адукацыя ў галіне правоў чалавека заахвочвае дзяцей, маладых людзей і дарослых у поўнай меры ўдзельнічаць у жыцці грамадства і ў яго развіцці. Важна разумець розніцу паміж развіццём кампетэнцый удзелу і палітычнай дзейнасцю. Адукацыя ў галіне правоў чалавека праз дыскусіі і ўдзел садзейнічае развіццю ў маладых людзей крытычнага мыслення і дапытлівага розуму і заахвочвае іх прымаць абгрунтаваныя рашэнні і паводзіць сябе належным чынам. Таму адукацыя ў галіне правоў чалавека таксама звязана з грамадзянскай і палітычнай адукацыяй, дазваляючы маладым людзям убачыць сувязь паміж правамі чалавека, сацыяльнымі пытаннямі, адукацыяй і палітыкай. У выніку можа здарыцца так, што маладыя людзі пачынаюць – або, наадварот, спыняюць – прымаць удзел у працы палітычных партый на мясцовым або нацыянальным узроўнях, прыходзячы да ўсведамлення сваіх правоў на ўдзел у палітычным жыцці і свабоду думкі, аб'яднанняў і выказвання меркавання. Але гэта павінен быць іх уласны выбар.

Важна таксама мець на ўвазе, што ў дадатак да навыкаў, непасрэдна звязаных з вывучэннем правоў чалавека, адукацыя ў галіне правоў чалавека, як можна бачыць з «Компаса», падтрымлівае развіццё такіх сацыяльных і камунікатыўных навыкаў, як супрацоўніцтва, праца ў групах, актыўнае слуханне і гаварэнне.

***Хіба не дзяржава нясе адказнасць за тое, каб у людзей была магчымасць вывучаць правы чалавека?***

**Адказ**: Дзяржавы – удзельніцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый абавязаны садзейнічаць адукацыі ў галіне правоў чалавека ва ўсіх яе формах. Артыкул 26 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека абвяшчае, што «(1) кожны чалавек мае права на адукацыю […] і што (2) адукацыя павінна быць накіравана на поўнае развіццё чалавечай асобы і на павелічэнне павагі да правоў чалавека і асноўных свабод». Права на адукацыю ў цэлым і на адукацыю ў галіне правоў чалавека ў прыватнасці таксама выкладзена ў артыкуле 28 Канвенцыі аб правах дзіцяці. Нягледзячы на гэта, многія ўрады вельмі мала зрабілі для таго, каб садзейнічаць прасоўванню адукацыі ў галіне правоў чалавека і ўключэнню правоў чалавека ў навучальныя праграмы. Асобныя адукатары і няўрадавыя грамадскія арганізацыі могуць індывідуальнымі або сумеснымі намаганнямі зрабіць многае, каб садзейнічаць укараненню адукацыі ў галіне правоў чалавека ў школах і іншых установах адукацыі, а таксама праводзіць лабіраванне і аказваць націск на ўрады сваіх краін, каб яны выконвалі свае абавязацельствы ў гэтай сферы.

***А што калі ў маёй краіне няма парушэнняў правоў чалавека?***

**Адказ**: У свеце няма практычна ні адной краіны, дзе заўсёды б паважаліся ўсе правы чалавека, прычым у роўнай меры для ўсіх людзей, хаця больш правільна будзе сказаць, што ў некаторых краінах правы чалавека парушаюць часцей і больш адкрыта, чым у іншых.

Але адукацыя ў галіне правоў чалавека не зводзіцца да размовы аб парушэннях. Гаворка ідзе, перш за ўсё, пра разуменне правоў чалавека як універсальнай каштоўнасці, агульнай для ўсіх людзей, і ўсведамленне неабходнасці іх абароны. Да таго ж, ніводная краіна не можа сцвярджаць, што ў ёй наогул не парушаюцца ніякія правы. Напрыклад, усе дзяржавы – удзельніцы Савета Еўропы былі асуджаны за парушэнні правоў чалавека ў Еўрапейскім судзе па правах чалавека. Існуе просты спосаб убачыць сітуацыю рэальнымі вачыма: паглядзець на найбліжэйшае сацыяльнае асяроддзе або супольнасць. Хто апынуўся ў ізаляцыі? Хто жыве ў беднасці? Чые дзеці пазбаўлены правоў? Яшчэ адзін спосаб – паглядзець на тое, як ваш урад і кампаніі, якія працуюць у вашай краіне, парушаюць правы чалавека ў іншых краінах, напрыклад, прадаючы зброю недэмакратычным рэжымам, заключаючы гандлёвыя пагадненні, якія эксплуатуюць фактычных вытворцаў, уводзячы пратэкцыянісцкія правілы і прэтэнзіі на правы ўласнасці, выдаючы патэнты на лекі з тым, каб перашкодзіць выпуску больш танных аналагаў.

# 3. Выкарыстанне «Компаса» ў адукацыі ў галіне правоў чалавека

Існуе шмат розных спосабаў выкладання і навучання аб правах чалавека. Ваш падыход да той ці іншай тэмы будзе залежаць ад таго, ці працуеце вы ў фармальным або нефармальным сектары, ад палітычнай, сацыяльнай і эканамічнай сітуацыі ў вашай краіне, ад узросту маладых людзей, а таксама ад іх інтарэсаў і матывацыі да адукацыі ў галіне правоў чалавека. Ён таксама будзе залежаць ад вашага ўласнага вопыту працы ў сферы правоў чалавека і ў адпаведнай адукацыі.

Вы можаце працаваць у маладзёжнай арганізацыі, быць трэнерам, школьным настаўнікам або выкладчыкам для дарослых, членам дыскусійнай групы ў царкве ці маладым актывістам. Кім бы вы ні былі і дзе б ні працавалі, мы спадзяёмся, што вы знойдзеце ў нашым дапаможніку нешта карыснае для сябе. Мы не ставім ніякіх патрабаванняў адносна навыкаў выкладання або папярэдніх ведаў аб правах чалавека.

«Компас» – гібкі рэсурс. Прасоўванне правоў чалавека ўяўляе сабой бесперапынны і творчы працэс, і вы – як карыстальнік гэтага выдання – з'яўляецеся яго неад'емнай часткай. Мы спадзяёмся, што вы возьмеце ідэі, якія мы выклалі ў дапаможніку, і будзеце выкарыстоўваць іх і адаптаваць пад уласныя патрэбы і патрэбы маладых людзей, з якімі працуеце. Мы спадзяёмся таксама, што вы будзеце крытычна ацэньваць тое, пра што даведаліся, і падзеліцеся з намі сваімі меркаваннямі. Форма зваротнай сувязі знаходзіцца на сайце www.coe.int/compass.

Ніхто з нас не ведае таго, што ведаем мы ўсе разам.

*Лаа-Цзы*

## 3.1. Што ёсць у «Компасе»

Мы настойліва раім вам пачаць з кароткага прагляду ўсяго дапаможніка, каб атрымаць агульнае ўяўленне пра яго змест. У дапаможніка няма канкрэтнага «пачатку»; і мы хацелі б, каб вы самі выбралі тыя раздзелы, якія маюць непасрэднае дачыненне да вашай працы.

**Глава 1.** Гэта ўводзіны ў правы чалавека і адукацыю ў галіне правоў чалавека, кароткае настаўленне па выкарыстанні дапаможніка.

**Глава 2.** У гэтай главе прыводзяцца практыкаванні. Тут вы знойдзеце 58 практыкаванняў рознага ўзроўню складанасці для вывучэння правоў чалавека ў іх сувязі з абранай тэмай і рознымі правамі. Гэтыя практыкаванні будуць інструментам вашай працы з маладымі людзьмі.

**Глава 3.** Глава «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека» раскрывае тое, што мы маем на ўвазе пад гэтымі словамі, і змяшчае ідэі і парады для прасоўвання правоў чалавека ў грамадстве і ў свеце ў цэлым.

**Глава 4.** Гэта глава змяшчае даведачную інфармацыю аб правах чалавека і аб іх гістарычным развіцці разам з апісаннем міжнародных стандартаў і дакументаў.

**Глава 5.** Тут вы знойдзеце кароткі агляд даведачнай інфармацыі па агульных тэмах «Компаса», якая таксама даступна ў Інтэрнэце на сайце www.coe.int/compass. Таксама тут прыводзяцца парады па пошуку і ацэнцы інфармацыі.

***Дадаткі.*** Кароткі агляд асноўных дэкларацый, канвенцый і іншых дакументаў па правах чалавека, а таксама гласарый тэрмінаў, якія часцей за ўсё выкарыстоўваюцца ў «Компасе».

У «Компасе» вы знойдзеце дастаткова матэрыялу, каб пачаць працу па навучанні моладзі правам чалавека. «Компас» быў напісаны для ўсіх, хто хоча ўдзельнічаць у адукацыі ў галіне правоў чалавека незалежна ад таго, ці прайшоў ён нейкае навучанне і ці мае навыкі ў гэтай сферы. Каб пачаць, вам не трэба быць «экспертам» у галіне правоў чалавека; наяўнасць цікавасці да правоў чалавека і да адукацыі ў гэтай сферы само па сабе ўжо з'яўляецца дастатковай кваліфікацыяй.

### *Тэмы правоў чалавека*

Мы не разлічвалі на тое, каб ахапіць усе пытанні правоў чалавека ў адной кнізе. Таму мы абмежаваліся тым, што ўзялі пытанні, якія маюць самае непасрэднае дачыненне да жыцця маладых людзей, і сабралі іх разам, арганізаваўшы па 20 тэмах. Даведачныя матэрыялы па кожнай тэме прадстаўлены ў главе 5 і ў Інтэрнэце на сайце www.coe.int/compass, а перакрыжаваныя спасылкі паміж практыкаваннямі і тэмамі можна знайсці ў рэзюмэ практыкаванняў на старонцы 72.

Ніжэй у алфавітным парадку прыводзяцца 20 глабальных тэм.

1. Агульныя правы чалавека
2. Адукацыя
3. Беднасць
4. Вайна і тэрарызм
5. Гендарныя пытанні
6. Гістарычная памяць
7. Глабалізацыя
8. Грамадзянскасць і ўдзел
9. Дзеці
10. Дыскрымінацыя і нецярпімасць
11. Дэмакратыя
12. Здароўе
13. Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці
14. Культура і спорт
15. Міграцыя
16. Мір і гвалт
17. Навакольнае асяроддзе
18. Праца
19. Рэлігія і вера
20. СМІ

## 3.2. Фасілітацыя

У «Компасе» мы выкарыстоўваем слова «фасілітатар» для апісання людзей, якія рыхтуюць, ажыццяўляюць і каардынуюць дзейнасць. Фасілітатар «стварае ўмовы», «дапамагае», заахвочвае іншых у тым, каб навучацца і развіваць свой патэнцыял. Роля фасілітатара заключаецца ў тым, каб ствараць бяспечныя ўмовы, у якіх удзельнікі навучаюцца праз вопыт, даследаванне, абмен. Гэта справа не аднаго чалавека, таму фасілітатар не з'яўляецца лідарам-«экспертам», які дзеліцца ведамі з іншымі. Кожны павінен расці, дзякуючы абмену вопытам, як удзельнікі, так і фасілітатары.

Варта адзначыць, што магчымасці выступаць у ролі фасілітатара ў працы з маладымі людзьмі і працаваць у атмасферы роўнасці і супрацоўніцтва не ўсюды ў Еўропе аднолькавыя. У сектары фармальнай адукацыі мы знаходзім адрозненні ў мэтах і ў самой філасофіі адукацыі, метадах аўдыторнай працы і навучальных праграмах. Рэдка такое здараецца, каб школьнікі і студэнты вырашалі, што ім вучыць, і не кожны настаўнік можа ўзяць на сябе ролю фасілітатара. У нефармальным сектары можна сустрэць значныя несупадзенні не толькі ў мэтах і філасофіі розных арганізацый, але і ў дзейнасці і магчымасцях, якія яны прапануюць, а стыль кіравання вар'іруецца ад аўтарытарнага да дэмакратычнага. Гэтыя адрозненні сустракаюцца не толькі паміж краінамі, але і ўнутры кожнай краіны.

Мы ўсе жывём і працуем у рамках адукацыйных і сацыяльных норм нашага грамадства, і таму нярэдка нам цяжка ўсвядоміць наш непазбежны этнацэнтрызм. У выніку мы ўспрымаем свае дзеянні як нешта належнае і звычайнае. Карысна задумацца аб уласным стылі, манеры працы і адносінах з маладымі людзьмі, з якімі вы працуеце, з тым, каб удасканаліць свае навыкі фасілітацыі[11].

Калі чалавек займае пазіцыю лідара, яму бывае цяжка «выпусціць з-пад кантролю» рычагі кіравання, але, выступаючы ў ролі фасілітатара ў адукацыйных праграмах па правах чалавека, вы павінны быць гатовы перадаць удзельнікам адказнасць за іх навучанне, даць ім магчымасць прааналізаваць сітуацыю або праблему, якая іх займае, думаць сваім розумам і прыходзіць да сваіх уласных высноў. Гэта не азначае, што ўся адказнасць ляжа на маладых людзей. Перад фасілітатарам стаіць складаная задача па стварэнні бяспечнай прасторы, у якой маладыя людзі змогуць вучыцца, якая будзе адпавядаць іх узроўню сталасці і здольнасці ўдзельнічаць у сумеснай працы.

«Тэхнічны» бок ролі фасілітатара ў школьным або класным асяроддзі не абавязкова значна адрозніваецца ад яго ролі ва ўмовах нефармальнага навучання, а інструкцыі да практыкаванняў «Компаса» можна прымяніць да любой сферы навучання.

## *Рашэнне праблем як аснова адукацыі ў галіне правоў чалавека*

Пытанні правоў чалавека нярэдка супярэчлівыя, паколькі ў розных людзей розныя сістэмы каштоўнасцей і яны па-рознаму разумеюць правы і абавязкі. Гэтыя адрозненні, якія праяўляюцца ў выглядзе розных меркаванняў па адным і тым жа пытанні, і складаюць аснову нашай працы па адукацыі ў галіне правоў чалавека.

Адукацыя ў галіне правоў чалавека накіравана на дасягненне дзвюх важных мэт: па-першае, прывіць маладым людзям навыкі ацэньваць розныя пункты гледжання на праблему – і зусім не абавязкова згаджацца з імі – і, па-другое, дапамагчы ім развіваць навыкі пошуку ўзаемапрымальных рашэнняў гэтых праблем.

Гэты дапаможнік і яго практыкаванні заснаваны на дапушчэнні, што рознагалоссе ў пунктах погляду можна выкарыстаць канструктыўна для працэсу навучання. Як і ў многіх іншых нефармальных адукацыйных відах дзейнасці, мэта заключаецца не столькі ў тым, каб дасягнуць згоды кожнага, колькі ў тым, каб удзельнікі развівалі ў сябе навыкі крытычна думаць, слухаць адзін аднаго, выказваць свае меркаванні і паважаць адрозненні ў меркаваннях.

Фасілітацыя ў выкананні практыкаванняў і авалоданні канструктыўнымі падыходамі да канфліктаў можа здавацца складанай і збянтэжыць, але на самай справе гэта не так. Кожнае практыкаванне суправаджаецца «Парадамі фасілітатарам» і «Дадатковай інфармацыяй», якія дапамогуць вам у працы.



Вы павінны быць гатовы перадаць удзельнікам адказнасць за іх навучанне.

Кантэкст, у якім праводзяцца практыкаванні, аднак, можа запатрабаваць большай адаптацыі і паставіць фасілітатара, адукатара або настаўніка перад сур'ёзнымі дылемамі. Напрыклад, калі заняткі па адукацыі ў галіне правоў чалавека з'яўляюцца абавязковымі, гэта можа паўплываць на вынікі і, магчыма, на адносіны навучэнцаў да правоў чалавека. Іншы аспект звязаны з адзнакамі, якія характэрны для многіх сістэм фармальнай адукацыі, асабліва, калі ў школе сур'ёзна ўспрымаецца толькі тое, за што паставілі адзнаку.

Падказкі наконт таго, што рабіць у такіх выпадках, можна знайсці ў дапаможніку «Адукацыя для дэмакратыі: даведачныя матэрыялы па адукацыі ў галіне дэмакратычнай грамадзянскасці і правоў чалавека[12]».

## 3.3. Агульныя рэкамендацыі для карыстальнікаў

Вы павінны выкарыстоўваць «Компас» так, каб ён адпавядаў вашым патрэбам і патрэбам маладых людзей, з якімі вы працуеце. Няма ніякай розніцы, на якой старонцы вы адкрыеце дапаможнік. Вы можаце выкарыстоўваць «Компас» у якасці крыніцы інфармацыі аб правах чалавека – аб галоўных канвенцыях у тым выглядзе, як яны былі створаны ў 1948 годзе і як змяніліся з тых часоў. Вы таксама можаце выкарыстоўваць «Компас» як зборнік інфармацыі аб правах чалавека, звязаных з беднасцю, гендарнымі і іншымі пытаннямі. Аднак асноўны інтарэс звычайна выклікаюць менавіта практыкаванні, паколькі яны з'яўляюцца інструментам рэалізацыі адукацыі ў галіне правоў чалавека.

### Як выбраць практыкаванне

Для пачатку вы павінны вельмі выразна сабе ўяўляць, чаго канкрэтна вы хочаце дасягнуць; сфармулюйце сваю мэту. Потым вы можаце перайсці да выбару практыкавання, якое мае прамое дачыненне да тэмы, што вас цікавіць, і якое прадугледжвае выкарыстанне зручных для вас і вашай моладзі метадаў. Практыкаванне павінна падыходзіць вам і вашай групе па ўзроўні складанасці і ўпісацца ў час, на які вы разлічваеце.

Уважліва прачытайце апісанне практыкавання як мінімум двойчы і паспрабуйце ўявіць сабе, як група можа на яго адрэагаваць і што сказаць. Вельмі верагодна, што вы вырашыце крыху змяніць практыкаванне або скарэкціраваць некаторыя пытанні часткі «Аналіз і ацэнка», каб накіраваць навучанне па лепшым для вас шляху. Пераканайцеся ў тым, што ў вас ёсць усе неабходныя матэрыялы і дастаткова месца, асабліва калі ўдзельнікі будуць у працэсе разбівацца на малыя групы.

Усе практыкаванні маюць стандартны фармат. Піктаграмы і загалоўкі дапамогуць чытачу атрымаць цэласнае ўяўленне аб практыкаванні.

### Умоўныя абазначэнні і загалоўкі, якія дапамагаюць апісаць практыкаванне

Агульныя правы чалавека



**Тэмы**

У лік тэм, адабраных для «Компаса», увайшлі тыя, якія адпавядаюць яго прызначэнню, напрыклад, агульныя правы чалавека, беднасць, здароўе.

Правы чалавека ўзаемазвязаныя і непадзельныя, і розныя пытанні накладваюцца адно на адно, а гэта азначае, што кожнае практыкаванне непазбежна будзе тычыцца некалькіх тэм. У практыкаванні паказваюцца тры тэмы, сувязь з якімі найбольш відавочна праяўляецца падчас яго выканання.

Узровень 1



**Складанасць**

Гаворачы аб складанасці, мы хочам апісаць не толькі ўзровень складанасці таго ці іншага метаду, але і тое, якія формы крытычнага мыслення, аналітычныя і камунікатыўныя навыкі спатрэбяцца ўдзельнікам, каб з задавальненнем выканаць практыкаванне.

Пры выкананні большасці практыкаванняў, якія патрабуюць базавых навыкаў, выкарыстоўваюцца простыя метады; такія практыкаванні не патрабуюць сур'ёзнай падрыхтоўкі і часта не займаюць шмат часу. З іншага боку, практыкаванні, якія патрабуюць добрых навыкаў мыслення і камунікацыі, часта дзеляцца на некалькі частак, якія выконваюцца па парадку, патрабуюць лепшай падрыхтоўкі і займаюць больш часу.

Практыкаванні 1-га ўзроўню складанасці кароткія і простыя. Але іх перавага заключаецца ў тым, што яны дазваляюць удзельнікам узаемадзейнічаць і наладзіць зносіны. Практыкаванні тыпу «энерджайзер» і «ледакол», як і практыкаванні на замацаванне, трапляюць якраз у гэту катэгорыю.

Практыкаванні 2-га ўзроўню складанасці не патрабуюць папярэдніх ведаў аб правах чалавека ці добра развітых навыкаў індывідуальнай або групавой працы. Многія практыкаванні на гэтым узроўні распрацаваны так, каб дапамагчы людзям развіць камунікатыўныя навыкі і ўменні працаваць у групе і ў той жа час стымуляваць зацікаўленасць у правах чалавека.

Практыкаванні 3-га ўзроўню з'яўляюцца больш складанымі і накіраваны на развіццё больш глыбокага разумення праблемы і пранікнення ў яе сутнасць. Яны патрабуюць больш высокага ўзроўню кампетэнцый у вядзенні дыскусіі і навыкаў працы ў групе.

Практыкаванні 4-га ўзроўню складанасці больш працяглыя, патрабуюць добрых навыкаў працы ў групе і вядзення дыскусій, канцэнтрацыі ўвагі і супрацоўніцтва паміж удзельнікамі; падрыхтоўка да такіх практыкаванняў таксама займае больш часу. Акрамя таго, яны носяць больш комплексны, усёабдымны характар, дзякуючы чаму забяспечваецца больш шырокае і глыбокае разуменне пытанняў.

**Памер групы**

Мы ўдакладняем колькасць людзей, якая патрабуецца для паспяховага выканання практыкавання. Калі частка практыкавання прадугледжвае працу ў малых групах, іх памер паказваецца ў дужках.

**Час**

Мы прыводзім агульны час у хвілінах, неабходны для выканання ўсяго практыкавання, уключаючы падвядзенне вынікаў і абмеркаванне, з зазначаным лікам удзельнікаў. Запланаваны час не ўключае ў сябе абмеркаванне або дзеянні, звязаныя з правядзеннем ацэнкі.

Вам трэба будзе самастойна вызначыць, колькі часу патрабуецца на выкананне практыкавання. Калі вы працуеце з вялікай колькасцю малых груп, то прыйдзецца вылучыць больш часу для зваротнай сувязі для кожнай з іх на агульным пасяджэнні. Калі група вялікая, трэба пакінуць дастаткова часу, каб ва ўсіх была магчымасць унесці свой уклад у аналіз і ацэнку.

**Агляд**

Для правядзення агляду мы называем прадмет абмеркавання і асноўны метад, які павінен выкарыстоўвацца ў практыкаванні. Напрыклад, мы расказваем, што ў практыкаванні гаворка пойдзе пра людзей, якія шукаюць прытулак, або аб прадузятасці ў сродках масавай інфармацыі, і паведамляем, ці прадугледжвае гэта практыкаванне абмеркаванне ў невялікіх групах або выкарыстанне ролевых гульняў.

**Звязаныя правы**

Здольнасць суадносіць вопыт і падзеі з пэўнымі правамі чалавека з'яўляецца ключавой мэтай адукацыі ў галіне правоў чалавека. Аднак паколькі правы чалавека ўзаемазвязаныя і непадзельныя, розныя пытанні накладваюцца адно на адно, а гэта азначае, што кожнае практыкаванне непазбежна будзе тычыцца некалькіх тэм. У прыватнасці, калі гаворка ідзе пра рэзюмэ Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (гл. старонку 600), мы называем тры правы, прыклады якіх прыводзяцца ў практыкаванні і якія павінны быць прадметам абмеркавання падчас падвядзення вынікаў і ацэнкі.

**Мэты**

Мэты адносяцца да мэт адукацыі ў галіне правоў чалавека, якія маюць дачыненне да кампетэнцый, ведаў, навыкаў, поглядаў і каштоўнасцей, апісаных на старонцы 37.

**Матэрыялы**

Пералік сродкаў і абсталявання, неабходных для выканання практыкавання.

**Падрыхтоўка**

Пералік таго, што фасілітатар павінен зрабіць перад правядзеннем практыкавання.

Мы лічым само сабой зразумелым, што фасілітатар будзе рыхтавацца да працы па пытаннях тэмы і, калі гэта спатрэбіцца, азнаёміцца з даведачнай інфармацыяй, прадстаўленай у главе 5 на сайце www.coe.int/compass. Таму напамін пра гэта не прыводзіцца ў кожным практыкаванні.

**Інструкцыі**

Спіс інструкцый пра тое, як выконваць практыкаванне.

**Аналіз і ацэнка**

Мы прапануем пытанні, якія павінны дапамагчы фасілітатару правесці аналіз і ацэнку. Яны задуманы як кіраўніцтва; мы таксама чакаем, што некаторыя пытанні вы падрыхтуеце самастойна, каб пераканацца ў тым, што вы правялі навучанне ў адпаведнасці са сваімі мэтамі.

**Парады фасілітатарам**

Гэта інструкцыі і тлумачэнне педагагічных прыёмаў і тых пытанняў, пра якія неабходна памятаць. Напрыклад, калі ў практыкаванні гаворка ідзе пра стэрэатыпы ў дачыненні да меншасцей, варта пацікавіцца, ці ёсць у вашай групе прадстаўнікі такой меншасці.

**Варыянты**

Тут мы выкладаем некаторыя ідэі аб тым, як можна адаптаваць практыкаванне для выкарыстання ў розных сітуацыях і дапрацаваць яго. Аднак гэта не больш чым прапановы, і вы як фасілітатар можаце мяняць практыкаванне такім чынам, як яно, на вашу думку, будзе лепш адказваць патрэбам групы.

**Прапановы па далейшай працы**

Выкананнем практыкавання справа не канчаецца; пасля яго завяршэння неабходна перайсці да далейшай працы, каб вывучанае было замацавана і не забыта. У дадатак да вышэйсказанага мы павінны нагадаць, што важнай мэтай адукацыі ў галіне правоў чалавека з'яўляецца забеспячэнне маладых людзей магчымасцю дзейнічаць для вырашэння пытанняў, якія тычацца іх непасрэдна.

Таму мы апісваем некаторыя ідэі адносна таго, што рабіць далей, напрыклад прапануем тэмы для даследаванняў і пошуку матэрыялаў у мясцовай бібліятэцы або ў Інтэрнэце, пра якія потым можна расказаць усёй групе. Мы таксама прапануем ідэі іншых практыкаванняў, якія вы можаце запланаваць на наступны раз.

**Ідэі для дзеяння**

Практычныя дзеянні – адна з важных мэт адукацыі ў галіне правоў чалавека; мы хочам прывіць маладым людзям навыкі, якія дазволяць ім дзейна падысці да вырашэння праблем, якія іх тычацца. Мы яшчэ раз падкрэсліваем гэта, і менавіта таму ў нашым дапаможніку ёсць асобная глава, прысвечаная дзеянням (глава 3), і таму мы ўключылі ідэі для дзеянняў у кожнае практыкаванне.

**Важныя даты**

ААН і многія іншыя арганізацыі выкарыстоўваюць ідэю правядзення дня памяці або святкавання, каб прыцягнуць увагу грамадскасці да розных аспектаў правоў чалавека. Мы сабралі больш за дзевяноста такіх «важных дат» і прапануем вам выкарыстоўваць іх у якасці арыенціраў, да якіх вы можаце прымеркаваць вашы ўласныя мерапрыемствы. Напрыклад, група маладых асоб, якія шукаюць прытулак у Даніі, сумесна з мясцовым маладзёжным аддзяленнем Дацкага Чырвонага Крыжа, якое мае сваё кафэ, правялі публічнае мерапрыемства ў Дзень бежанцаў – 20 чэрвеня.

**Дадатковая інфармацыя**

У гэтым раздзеле мы даём дадатковую даведачную інфармацыю, якая мае непасрэднае дачыненне да практыкаванняў. Мы вам таксама рэкамендуем у кожным выпадку звяртацца да главы 5 на сайце www.coe.int/compass, дзе вы знойдзеце даведачную інфармацыю па канкрэтных тэмах, якія разглядаюцца ў вашых практыкаваннях.

**Раздатачны матэрыял**

Гэта ролевыя карткі, інфармацыйныя бюлетэні і карткі дыскусій, якія вам неабходна скапіраваць. Пры гэтым варта памятаць, што вы можаце свабодна змяняць іх з улікам патрэб вашай групы.

## 3.4. Агульныя рэкамендацыі па правядзенні практыкаванняў

Выкананне практыкаванняў рэдка праходзіць менавіта так, як вы чакалі. У гэтым заключаецца каштоўнасць і адначасова выклік, якім стане для вас праца з практыкаваннямі «Компаса». Вам прыйдзецца навучыцца хутка рэагаваць на ўсё, што адбываецца ў класе. Галоўнае памятаць наступнае: трэба ставіць ясныя мэты і быць гатовым да іх дасягнення.

### Сумесная фасілітацыя

Заўсёды, калі гэта магчыма, старайцеся арганізаваць сумесную фасілітацыю. Настаўнікі называюць гэта «навучаннем у камандзе». Практычныя перавагі такой працы заключаюцца ў тым, што ў гэтым выпадку будзе ўжо мінімум два чалавекі, якія будуць дзяліць адказнасць за працу з малымі групамі або выкананне асобных задач. Калі занятак вядуць два фасілітатары, ім лягчэй змяняць тэмп і рытм працы для падтрымання цікавасці. Два фасілітатары могуць і падтрымаць адзін аднаго, калі раптам нешта пойдзе не па плане, і наогул аддача заўсёды больш значная, калі робіш нешта з кім-небудзь яшчэ, а не ў адзіночку.

Сумесная фасілітацыя патрабуе, каб абодва фасілітатары прымалі ўдзел у падрыхтоўцы практыкавання, і пры гэтым кожны павінен добра ведаць сваю ролю. Тым не менш лепш за ўсё рыхтаваць практыкаванні ў камандзе з прыцягненнем і саміх маладых людзей.

### Старанная падрыхтоўка

Уважліва прачытайце ўсю інфармацыю пра практыкаванне, лепш нават двойчы! «Прайграйце» яе ў сябе ў галаве, паспрабуйце ўявіць, як усё будзе праходзіць. Паспрабуйце таксама ўявіць сабе, як група будзе рэагаваць і што яна можа сказаць. Удзельнікі абавязкова зададуць вам пытанні, на якія вы не будзеце ведаць адказаў. Але ў гэтым няма нічога незвычайнага: вы прыйшлі ў клас, каб вучыцца разам з маладымі людзьмі. Тым не менш вы павінны максімальна падрыхтавацца, прачытаўшы ўсю неабходную даведачную інфармацыю.

Праверце, ці ёсць у вас пад рукой не толькі неабходныя матэрыялы, але і дадатковыя на той выпадак, калі да вас прыйдзе больш чалавек, чым вы чакалі, ці калі ў кагосьці зломіцца аловак або перастане пісаць фламастар.

### Кіраванне часам

Старанна плануйце мерапрыемства і не спрабуйце ўціснуць залішне шмат спраў у адведзены для занятку час. Калі выкананне практыкавання зойме больш часу, чым вы чакалі, трэба паспрабаваць скараціць яго, каб у вас засталося дастаткова часу для дыскусіі (гл. заўвагі па цыкле навучання на старонцы 34). У такім выпадку нядрэнна звярнуцца да ўдзельнікаў і параіцца з імі, ці не лепш адразу або хвілін праз пяць спыніць працу або як-небудзь інакш вырашыць праблему.

З іншага боку, калі ў вас раптам засталося шмат часу, не спрабуйце зацягваць абмеркаванне, а зрабіце перапынак або кароткую зарадку тыпу «энерджайзер», каб зняць напружанне.

### Стварэнне бяспечнага асяроддзя

Маладыя людзі, з якімі вы працуеце, павінны адчуваць сябе свабодна і быць гатовымі праводзіць даследаванні і здзяйсняць адкрыцці, а таксама ўзаемадзейнічаць і дзяліцца адзін з адным. Будзьце з імі шчырыя, прыязныя, заўсёды хваліце сваіх удзельнікаў і не губляйце пачуццё гумару. Не выкарыстоўвайце жаргон або мову, якіх удзельнікі могуць не зразумець. Людзі адчуваюць сябе ў бяспецы, калі ведаюць, пра што ідзе гаворка, таму тое, як вы апішаце занятак, мае вялікае значэнне. Не варта пачынаць адразу, без папярэдняй падрыхтоўкі; трэба спачатку наладзіць адпаведную атмасферу. Адным са спосабаў зрабіць гэта з'яўляецца выкарыстанне «ледакола».

### Усталяванне правілаў

Важна, каб усе ў групе разумелі асноўныя правілы працы з практыкаваннямі. Напрыклад, кожны павінен несці сваю долю адказнасці за занятак, кожны павінен мець шанец быць пачутым, мець магчымасць выказацца і прыняць удзел у агульнай працы. Ніхто не павінен адчуваць націску, кожны павінен свабодна выказацца, калі яму штосьці замінае. Гэтыя асноўныя правілы павінны быць абмеркаваны і ўзгоднены, калі вы толькі пачынаеце працаваць з класам ці групай, і вы можаце час ад часу вяртацца да іх, асабліва калі ў групу прыходзяць новыя людзі.

### Дакладныя інструкцыі

Пераканайцеся, што ўсе зразумелі вашы інструкцыі і ведаюць, што яны павінны рабіць. Добра пачынаць працу з тлумачэння ў агульных рысах таго, што ўяўляе сабой практыкаванне і што ў яго ўваходзіць, напрыклад ролевыя гульні. Няхай удзельнікі ведаюць, колькі часу ў іх ёсць на выкананне пастаўленай задачы, і за пяць хвілін да заканчэння не забудзьце папярэдзіць іх аб тым, што час заканчваць, каб у іх была магчымасць зрабіць гэта як трэба.

### Фасілітацыя дыскусій

Дыскусія займае цэнтральнае месца ў працэсе адукацыі ў галіне правоў чалавека. Давядзіце да ведама кожнага члена групы, што пры жаданні ён можа ўдзельнічаць у працы. Выкарыстоўвайце словы, выразы і мову, зразумелыя для групы, і тлумачце значэнні слоў і тэрмінаў, з якімі яна не знаёмая; для гэтага на старонцы 620 маецца гласарый. Заклікайце ўдзельнікаў выказваць свае думкі. Памятайце, што паміж глабальнымі і лакальнымі праблемамі павінен быць баланс, каб людзі ўспрымалі праблемы як нешта, што мае да іх жыцця непасрэднае дачыненне.

Часам дыскусіі «буксуюць». У гэтым выпадку вам трэба высветліць прычыну. Гэта можа адбыцца таму, напрыклад, што тэма была вычарпана або аказалася занадта эмацыянальнай. Вы павінны будзеце вырашыць, ці варта задаць пытанне-падказку, змяніць тактыку або рухацца далей. Ніколі не варта схіляцца да таго, каб даваць гатовыя адказы на пытанні ўдзельнікаў ці вырашаць іх праблемы замест іх; група павінна знайсці свае ўласныя адказы, слухаючы адзін аднаго і абменьваючыся думкамі. Удзельнікі могуць, вядома, спытаць ваша меркаванне або папрасіць парады, але прымаць рашэнні група павінна самастойна.

## Аналіз і ацэнка

Ні адно практыкаванне «Компаса» не завяршаецца без аналізу і ацэнкі; гэта частка дзейнасці дае арыенціры для навучання і дапамагае ўдзельнікам укараніць тое, чаму яны навучыліся, у больш шырокі кантэкст. Дайце ўдзельнікам дастаткова часу, каб яны маглі завяршыць сваё практыкаванне і пры неабходнасці выйсці з ролі, перш чым прыступіць да абмеркавання таго, што яны рабілі і пра што даведаліся. Не забудзьце выдаткаваць час у канцы кожнага практыкавання, каб пагаварыць пра тое, чаму яны навучыліся і як гэта суадносіцца з іх уласным жыццём, іх бліжэйшым асяроддзем і жыццём усяго свету. Без разважання над зробленым людзі мала чаму вучацца са свайго ўласнага вопыту. Мы прапануем вам правесці працэс аналізу і ацэнкі праз паслядоўнасць крокаў, падчас якіх вам варта задаваць удзельнікам пытанні наступнага характару:

- што адбылося падчас выканання практыкавання і як яны сябе пры гэтым адчувалі;
- што новага яны даведаліся пра сябе;
- што новага яны даведаліся пра пытанні, якія разглядаліся ў практыкаванні, і адпаведныя правы чалавека;
- як яны цяпер могуць рухацца наперад і выкарыстоўваць тое, пра што даведаліся.

## Ацэнка навучання

Без разважання над зробленым людзі мала чаму вучацца са свайго ўласнага вопыту.

Перыядычная ацэнка і разгляд таго, што вы робіце і чаму навучаеце, вельмі важны, паколькі гэта дапамагае атрымаць агульную карціну таго, як ідуць справы, і дазваляе ўдасканальваць свае практычныя навыкі. Час такой ацэнкі залежыць ад абставін: гэта можа быць у канцы дня на семінары або ў канцы серыі з двух або трох заняткаў або сустрэч.

Кожны раз, калі вы праводзіце такое замацаванне, знайдзіце час, каб расслабіцца, супакоіцца і падумаць пра наступнае:

- як, з вашага пункту гледжання, прайшло мерапрыемства (ці мерапрыемствы): яго падрыхтоўка, тэрмін выканання і г. д.;
- чаму новаму навучыліся ўдзельнікі і ці дасягнулі яны мэт, якія ставіліся перад імі;
- якія агульныя вынікі: што група будзе рабіць цяпер, зыходзячы з вынікаў выкананай працы;
- што новага даведаліся вы самі пра тэме занятку і пра ролю фасілітатара.

Перыядычная ацэнка навучання з групай таксама важна, і яе варта праводзіць не надта сур'ёзна, каб пазбегнуць яго пераўтварэння ў яшчэ адну дыскусію, асабліва калі вы ўжо патрацілі шмат часу на аналіз і ацэнку. Каб даведацца, як гэта зрабіць, у пункце «Практыкаванні для ацэнкі навучання» главы 2 на старонцы 350 вы знойдзеце апісанне некалькіх метадаў, якія прадугледжваюць выкарыстанне, сярод іншага, мовы цела, малюнкаў і мадэліравання.

## Тэмп працы

Большасць практыкаванняў можна правесці за 90 хвілін, таму падтрымліваць тэмп будзе проста. Тым не менш, каб не згубіць нацэленасць удзельнікаў на працу, можна рабіць невялікія перапынкі, напрыклад паміж выкананнем практыкавання і правядзеннем яго аналізу і ацэнкі або паміж аналізам і ацэнкай і абмеркаваннем наступнага этапа працы. Калі сілы і энергія ўдзельнікаў відавочна слабеюць, можна выкарыстоўваць практыкаванні тыпу «энерджайзер». Памятайце таксама, што вельмі важна, каб пасля завяршэння занятку ўдзельнікі маглі супакоіцца і расслабіцца.

## Зваротная сувязь

Зваротная сувязь – гэта каментарый наконт таго, што нехта зрабіў ці сказаў. Здольнасць даваць і атрымліваць зваротную сувязь – вельмі важны навык, і вы павінны будзеце дапамагчы членам групы яго засвоіць.

Нярэдка зваротная сувязь успрымаецца як неабгрунтаваная крытыка, нават калі гэта і не ўваходзіла ў намер таго, хто яе даваў. Ключавымі словамі для зваротнай сувязі з'яўляюцца такія паняцці, як «павага», «канкрэтнасць» і «аргументацыя».

Выкарыстоўваючы метад зваротнай сувязі, важна праявіць павагу да іншага чалавека, засяродзіцца на тым, што канкрэтна ён сказаў ці зрабіў, і абгрунтаваць свой пункт гледжання. Вы можаце сказаць: «Я рашуча не згодны з тым, што вы толькі што сказалі, таму што ...». Многія людзі лёгка зрываюцца на негатыўныя каментарыі, а гэта можа нанесці іншым боль. Ваша роля фасілітатара заключаецца ў тым, каб навучыць маладых людзей даваць зваротную сувязь канструктыўна, добразычліва. Напрыклад, варта растлумачыць, што:

- крытычныя заўвагі трэба пачынаць са станоўчага сцвярджэння;
- трэба паважаць іншага чалавека і адмовіцца ад прыніжальных заўваг;
- варта факусіравацца на паводзінах, а не на асобе;
- трэба абгрунтоўваць свой пункт гледжання;
- трэба несці адказнасць за свае словы праз выкарыстанне тэхнікі «Я-выказвання».

Атрымліваць зваротную сувязь цяжка, асабліва калі ёсць рознагалоссе. Ваша роля ў тым, каб дапамагаць маладым людзям вучыцца на ўласным вопыце і рабіць так, каб яны адчувалі падтрымку, а не націск ці прыніжэнне. Навучыце іх уважліва прыслухоўвацца да крытыкі і не кідацца адразу абараняць сябе ці свае пазіцыі. Асабліва важна, каб чалавек правільна разумеў, што мае на ўвазе той, хто дае зваротную сувязь, і знайшоў час, каб у поўнай меры ацаніць тое, што было сказана, а потым прыняць або не прыняць гэта.

## Супраціўленне з боку ўдзельнікаў

Сумесныя мерапрыемствы прад'яўляюць да іх удзельнікаў высокія патрабаванні, і, нягледзячы на тое, што вы будзеце выкарыстоўваць розныя метады, напрыклад абмеркаванне, маляванне, ролевыя гульні ці музыку, не ўсе практыкаванні і не заўсёды будуць падыходзіць усім удзельнікам. Калі ўдзельнік давярае вам і можа растлумачыць, чаму яму не падабаюцца канкрэтныя практыкаванні, то ў вас атрымаецца перабудаваць сваю працу з улікам яго інтарэсаў шляхам дыялогу і перамоў.

Пад «супраціўленнем» мы маем на ўвазе паводзіны, свядома накіраваныя на зрыў дзейнасці. Усе фасілітатары рана ці позна сутыкаюцца з супраціўленнем удзельнікаў. Яно можа прымаць розныя формы. Які-небудзь няўпэўнены ў сабе малады чалавек можа парушаць парадак, рыпаючы крэслам, напяваючы што-небудзь сабе пад нос або размаўляючы з суседам. Больш адмысловыя спосабы зрыву заняткаў – недарэчныя пытанні ці намаганні ўсё перавярнуць на жарт. Яшчэ адна «гульня» парушальнікаў заключаецца ў тым, каб «падколваць» фасілітатара. Вам могуць сказаць: «Вам нас не зразумець, вы ўжо даўно выйшлі з нашага ўзросту» або «Вы нам нічога, акрамя дыскусій, не прапануеце, давайце проста рабіць практыкаванні!». Трэці тып «гульні» заключаецца ў спробах ухіліцца ад навучання, напрыклад, калі маладыя людзі на ўсё рэагуюць рэплікамі накшталт «Так, але ... ».

Відавочна, што лепш за ўсё пазбягаць праяўленняў супраціўлення. Напрыклад, быць у курсе спраў кожнага чалавека ў групе і быць гатовым да любых эмацыянальных выбухаў, якія могуць быць выкліканыя пэўным практыкаваннем або нейкай часткай ролевай гульні ці мадэліравання. Пераканайцеся ў тым, што кожны чалавек у групе адчувае сябе ў бяспецы і ведае, што яго ніхто не прымушае расказваць нешта пра сябе, што ён не хацеў бы расказваць. Дайце ўдзельнікам час на тое, каб яны разагрэліся перад тым ці іншым практыкаваннем і перавялі дух пасля яго.

Нарэшце, памятайце пра тое, што трэба пакідаць дастаткова часу на аналіз практыкавання і дыскусію, каб кожны адчуваў, што яго меркаванне і ўдзел цэняцца.

Кожны раз вы самі павінны вырашыць, як лепш справіцца з цяжкай сітуацыяй, але майце на ўвазе, што звычайна лепшым спосабам вырашэння праблемы з'яўляецца яе адкрытае абмеркаванне і прыцягненне ўсёй групы да пошукаў рашэння. Не ўступайце ў доўгія дыскусіі і спрэчкі з адным членам групы. Гэта можа выклікаць абурэнне і незадаволенасць іншых удзельнікаў і прывесці да поўнай страты цікавасці.

## Кіраванне канфліктам

Канфлікт з'яўляецца непазбежным і неабходным элементам адукацыі ў галіне правоў чалавека.

Канфлікт можа быць карысным і даць імпульс творчасці, калі ім кіраваць належным чынам; больш за тое, ён з'яўляецца непазбежным і неабходным элементам адукацыі ў галіне правоў чалавека! Рознагалоссе і эмоцыі з'яўляюцца непазбежнымі, калі гаворка ідзе аб правах чалавека, таму што людзі бачаць свет па-рознаму, а іх перакананні, думкі і забабоны раптам аспрэчваюцца. Канфлікт як частка адукацыі ў галіне правоў чалавека дае людзям магчымасць развіваць такія навыкі і пазіцыі, як крытычнае мысленне і супрацоўніцтва, суперажыванне і пачуццё справядлівасці.

Канфлікты цяжка прадбачыць і бывае цяжка вырашыць, асабліва калі яны ўзнікаюць таму, што ўдзельнікі адчуваюць сябе няўпэўнена, калі разбіраюць пытанні, звязаныя з эмоцыямі і каштоўнасцямі, калі ў іх недастаткова развітыя кампетэнцыі для працы ў групе, калі яны маюць цалкам супрацьлеглыя падыходы да тэмы ці розныя каштоўнасці. Паспрабуйце захоўваць спакой і стрыманасць і не дазваляйце ўцягнуць сябе ў канфлікт паміж членамі групы.

Практыкаванні «Компаса» накіраваны на навучанне ў бяспечным асяроддзі. Уважліва выбірайце тыя, якія вам падыходзяць, і адаптуйце іх пад сітуацыю, калі гэта патрэбна.

Выкарыстоўвайце іх так, каб выклікаць ва ўдзельнікаў розныя меркаванні наконт таго ці іншага пытання; няхай яны ведаюць, што рознагалоссе – гэта нармальна і што ўсеагульнасць правоў чалавека зусім не азначае, што ўсе людзі павінны разумець іх абсалютна аднолькава.

Некаторыя парады:

- Выдзеліце дастаткова часу для падвядзення вынікаў і абмеркавання. Калі трэба, дабаўце яшчэ часу.
- Дапамагайце растлумачыць пазіцыі, меркаванні і інтарэсы людзей.
- Здымайце напружанасць у групе. Напрыклад, папрасіце ўсіх сесці або абмеркаваць пытанне ў невялікіх падгрупах на працягу трох хвілін ці скажыце нешта, што дазволіць паглядзець на пытанне з іншага боку.
- Заахвочвайце ўсіх актыўна слухаць адзін аднаго.
- Падкрэслівайце тое, што аб'ядноўвае людзей, а не тое, што іх раздзяляе.
- Шукайце кансэнсус. Заахвочвайце людзей выяўляць агульныя інтарэсы замест таго, каб вымушаць іх ісці на кампраміс і адмаўляцца ад сваіх поглядаў.
- Шукайце варыянты вырашэння праблем без «аднаўлення» канфлікту.
- Тым, хто гэтага пажадае, прапануйце пагаварыць у прыватным парадку ў іншы час.

Калі ўзнікаюць больш сур'ёзныя і глыбокія канфлікты, лепш адкласці пошук спосабаў іх вырашэння і пашукаць іншае, больш прыдатнае выйсце. Тым часам вы можаце прадумаць розныя спосабы вырашэння канфлікту. Больш таго, адклаўшы спробы вырашыць канфлікт, вы дасце яго ўдзельнікам час лішні раз падумаць над сітуацыяй і выпрацаваць новыя падыходы і рашэнні.

Канфлікты, якія ўзнікаюць у групе, і шляхі іх вырашэння могуць быць выкарыстаны для развіцця разумення і пранікнення ў сутнасць прычын і цяжкасцей вырашэння сусветных канфліктаў. Справядліва і адваротнае: абмеркаванне міжнародных канфліктаў можа даць больш глыбокае разуменне канфліктаў, што ўзнікаюць у штодзённым жыцці.

## 3.5. Адаптацыя практыкаванняў «Компаса» да вашых патрэб

Практыкаванні «Компаса» былі апрабаваны і пратэсціраваны ў розных умовах фармальнай і нефармальнай адукацыі, і каментарыі карыстальнікаў пацвярджаюць справядлівасць фразы, якую прыпісваюць Аўрааму Лінкальну: «Можна падабацца некаторым людзям увесь час і ўсім людзям – некаторы час, але нельга падабацца ўсім людзям заўсёды!». «Компас» разлічаны на тое, каб быць вашай інструкцыяй і дапаможнікам у працы; але гэта не кніга гатовых рэцэптаў і не канон, напісаны на каменных скрыжалях.

Аўтары «Компаса» сутыкнуліся з дзвюма асноўнымі праблемамі. Першая заключаецца ў тым, каб надаць практыкаванням настолькі агульны характар, каб пытанні, якія ў іх абмяркоўваюцца, тычыліся як мага больш шырокай аўдыторыі, і ў той жа час зрабіць іх дастаткова дэтальнымі, каб яны маглі дайсці да самага сэрца праблем той ці іншай групы ў дачыненні да гэтага пытання. Другой праблемай з'яўляецца адваротнае: як распрацаваць практыкаванні, якія глыбока закранаюць пытанні, важныя для некаторых груп, але разам з тым з'яўляюцца зусім нецікавымі ці занадта далікатнымі, каб абмяркоўваць іх у іншых.

З названых прычын практыкаванні «Компаса» амаль абавязкова трэба адаптаваць або перапрацоўваць з улікам патрэб маладых людзей, з якімі вы працуеце. На старонцы 61 ёсць раздзел пра «асноўныя метады», якія мы выкарыстоўвалі ў дапаможніку. Разуменне розных метадаў дапаможа вам прыстасаваць практыкаванні да пэўных умоў.

### *Адаптацыя практыкаванняў*

Практыкаванні з'яўляюцца інструментамі, з якімі мы працуем: вы павінны быць упэўнены, што абраны вамі інструмент падыходзіць вам па характары пытанняў, якія абмяркоўваюцца, і падыдзе вашай групе.

У абавязкі фасілітатара ўваходзіць далікатная наладка, карэкціроўка і адаптацыя практыкавання да патрэб маладых людзей, з якімі ён працуе.

### Практычныя аспекты

Разважаючы пра прыдатнасць таго ці іншага метаду, варта падумаць і пра практычныя аспекты.

**Складанасць**. Калі ўзровень складанасці практыкавання занадта высокі, падумайце, як зрабіць яго прасцей. Напрыклад, можна адкінуць некаторыя пытанні, перапісаць карткі са сцверджаннямі або распрацаваць іншыя пытанні для падвядзення вынікаў і абмеркавання. Калі вы лічыце, што ўдзельнікам можа стаць нудна або яны могуць адчуюць сябе абражанымі нізкім узроўнем складанасці практыкавання, паспрабуйце падаць яго як кароткія і вясёлыя ўводзіны ў тэму.

**Памер групы**. Калі ў вас вялікая група, вам могуць спатрэбіцца памочнікі і дадатковы час. Калі вы даяце дадатковы час, сачыце за тым, каб само практыкаванне або яго аналіз і ацэнка не зацягнуліся. Разгледзьце магчымасць падзелу групы на дзве часткі для аналізу і ацэнкі, пасля чаго іх прадстаўнікі змогуць коратка выказацца на агульным пасяджэнні. Калі вы праводзіце ролевыя гульні, дазвольце сыграць кожную ролю двум удзельнікам.

Калі ж у вашай групе мала ўдзельнікаў, а практыкаванне прадугледжвае працу ў малых групах, паменшыце колькасць груп замест колькасці чалавек у кожнай групе. У гэтым выпадку вы захаваеце разнастайнасць меркаванняў у кожнай групе.

**Час**. Магчыма, вам спатрэбіцца разбіць практыкаванне на два заняткі. У якасці альтэрнатывы паспрабуйце правесці гэтыя два заняткі адзін за адным, напрыклад, дамовіцца з адміністрацыяй навучальнай установы, каб яна прадугледзела ў раскладзе два заняткі запар для вашага практыкавання. Калі вы працуеце ў маладзёжным клубе, правядзіце такое практыкаванне ў выхадныя.

**Агляд**. Тут вы знойдзеце кароткае апісанне асноўных методык, на якіх грунтуецца практыкаванне, у тым ліку агульныя парады па выкарыстанні метадаў і прыёмаў.

**Матэрыялы**. Імправізуйце! Калі ў вас няма паперы для фліпчарта, купіце рулон папяровых шпалер і парэжце яго на кавалкі патрэбнай даўжыні. Калі ў вас маленькае памяшканне або яно застаўлена мэбляй так, што застаецца зусім мала месца для перамяшчэння або падзелу на малыя групы, паспрабуйце знайсці іншае, большага памеру, або, калі надвор'е добрае, выйдзіце на вуліцу.

**Падрыхтоўка**. Падыходзьце да справы творча! Калі вы хочаце што-небудзь скапіраваць, а ў вас няма доступу да капіравальнай тэхнікі, затое ёсць камп'ютар і прынтар, то зрабіце лічбавую фатаграфію і раздрукуйце копіі самастойна.

**Інструкцыі**. Некаторыя практыкаванні складаюцца з дзвюх частак. Верагодна, што ўжо першая частка дазволіць вам дасягнуць вашых мэт.

**Варыянты**. Варыянты практыкаванняў, якія вы распрацуеце, могуць заняць больш ці менш часу, чым зыходнае практыкаванне. Улічвайце гэта.

**Аналіз і ацэнка**. Калі прапанаваныя пытанні не адказваюць вашым патрэбам, падрыхтуйце іншыя. Выкарыстоўвайце даведачныя матэрыялы для натхнення. І сачыце за тым, каб новыя пытанні мелі непасрэднае дачыненне да правоў чалавека.

**Прапановы па далейшай працы**. Калі рэкамендаваныя прапановы не падыходзяць або выклікаюць праблемы практычнага характару, знайдзіце нешта іншае. Выкарыстайце кароткую інфармацыю пра практыкаванні на старонцы 72, каб выбраць з іх тое, якое вам больш падыдзе.

**Ідэі для дзеяння**. Калі рэкамендаваныя прапановы не падыходзяць або выклікаюць праблемы практычнага характару, знайдзіце нешта іншае. Звярніцеся да главы 3 «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека».

## *Распрацоўка практыкаванняў*

Распрацоўка практыкавання – справа больш цяжкая, чым яго адаптацыя. Вам можа спадабацца яго змест, напрыклад, карткі са сцвярджэннямі або карткі ролевых гульняў, але вам захочацца выкарыстаць іншы метад, які вам здаецца больш прыдатным. Напрыклад, вы можаце выкарыстаць некаторыя карткі са сцверджаннямі для практыкавання «Хвіліначку!» на старонцы 199, ужыўшы пры гэтым метад, распрацаваны для практыкавання «Дзе вы стаіце?» на старонцы 329.

І наадварот, вы можаце працаваць над пытаннем аб прытулку і бежанцах і ўпадабаць ідэі, якія прыводзяцца для практыкавання «Можна ўвайсці?», але ў той жа час вы адчуваеце, што па той ці іншай прычыне прапанаваная ролевая гульня вам не падыходзіць. У гэтым выпадку вы можаце, у адпаведнасці з інструкцыямі, падзяліць групу на больш дробныя і раздаць ролевыя карткі, а потым выкарыстаць методыку «Акварыум», прыведзеную на старонцы 64, і дазволіць двум бежанцам і двум супрацоўнікам іміграцыйнай службы абмеркаваць і ўзгадніць свае пазіцыі.

Настаўнікам, якія працуюць з вялікім класам, можна рэкамендаваць выкарыстанне метаду дэбатаў (гл. старонку 64) або дазволіць групе азнаёміцца з інфармацыяй па пытанні, якую даюць ролевыя карткі, а потым правесці маштабнае абмеркаванне, напрыклад, пытання «Наш клас лічыць, што варта прыняць усіх бежанцаў, якія жадаюць прыехаць у нашу краіну».

**Агульныя рэкамендацыі**

Заахвочвайце маладых людзей быць у курсе ўсяго, што адбываецца ў свеце, як у мясцовым, так і ў глабальным маштабе, і разглядайце пытанні, якія іх цікавяць, у якасці зыходнага пункта для вашай працы – вашай сумеснай працы. Заўсёды старайцеся прыцягваць маладых людзей да вырашэння пытання, як і што вывучаць. Ступень іх удзелу на практыцы будзе залежаць ад таго, ці працуеце вы ў сектары нефармальнай або фармальнай адукацыі, ад узросту маладых людзей, ад часу, які ў вас ёсць, і ад рэсурсаў. Аднак у любым выпадку старайцеся па меры магчымасці прыцягваць маладых людзей да выбару практыкаванняў, якія яны хацелі б выканаць.

Удзельнікі не павінны адчуваць сябе збянтэжана ці быць вымушаныя расказваць пра сябе і пра свае перакананні больш, чым яны б таго хацелі.

Асцярожна і прадумана падыходзьце да вырашэння спрэчных або правакацыйных пытанняў. Калі пытанне ў вашым грамадстве лічыцца табу і, хутчэй за ўсё, выклікае супраціўленне з боку людзей, надзеленых уладай, разгледзьце гэтае пытанне пад іншым вуглом або ў іншым кантэксце. Напрыклад, запрасіце людзей задумацца аб правах, звязаных са свабодай выказвання меркавання, выкарыстоўваючы прыклад з гісторыі. Пытанні аб рэлігіі, правах асоб нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі і правах на ўступленне ў шлюб і стварэнне сям'і рэкамендуецца разглядаць менавіта такім чынам з выкарыстаннем практыкавання «Вернікі» (старонка 105) ці «Гэта хутка састарэе» (старонка 272).

Разуменне таго, што мы жывём у свеце, дзе некаторыя пытанні з'яўляюцца спрэчнымі ці выклікаюць рознагалоссе, з'яўляецца важнай часткай адукацыі ў галіне правоў чалавека. Тым не менш пры разглядзе правоў, звязаных з супярэчлівымі або правакацыйнымі пытаннямі, вы павінны зрабіць так, каб удзельнікі адчувалі сябе ўпэўнена, не бянтэжыліся і не былі вымушаны расказваць пра сябе і пра свае перакананні больш, чым яны б таго хацелі. Такія метады, як практыкаванне-сцверджанне або аналіз сітуацыі, з'яўляюцца добрымі інструментамі, якія ствараюць некаторую дыстанцыю паміж чалавекам і тэмай. Яшчэ адзін падыход – прымусіць удзельнікаў разгледзець пытанне з розных бакоў. Яны маглі б, напрыклад, запрасіць каго-небудзь, каб выступіць перад групай з пункту гледжання той ці іншай меншасці.

Калі ў вашай групе існуюць розныя погляды на тое ці іншае пытанне (напрыклад, калі меншасць думае, што пэўнае пытанне не з'яўляецца важным або не мае дачынення да іх жыцця), проста папрасіце іх растлумачыць і абгрунтаваць сваё меркаванне. Вам трэба будзе авалодаць іх увагай так, каб ім захацелася пакапацца ў тэме глыбей. Паказ фільма, арганізацыя візіту ў якую-небудзь установу (цэнтр па прыёме бежанцаў, цэнтр для бяздомных, этнічную краму або кафэ) або запрашэнне дакладчыка дапамогуць вам абудзіць у маладых людзей цікаўнасць.

Калі маладыя людзі гатовы дзейнічаць, вы павінны расказаць ім аб наступствах таго, што яны збіраюцца рабіць. Яны павінны ведаць пра магчымыя ці верагодныя асабістыя, сацыяльныя і палітычныя наступствы сваіх запланаваных дзеянняў. Навучыць маладых людзей думаць самастойна і браць на сябе адказнасць – важная мэта адукацыі ў галіне правоў чалавека; таму вам варта апісаць любыя цяжкасці, якія вы можаце прадбачыць, абгрунтаваць сваю пазіцыю і даць ім парады. Калі вы хочаце пераканаць іх, што некаторыя формы дзеяння непажаданыя, варта прапанаваць ім альтэрнатыву (выкарыстоўвайце главу 3 «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека» як крыніцу ідэй аб розных формах практычных дзеянняў).

## 3.6. Спецыяльныя парады для настаўнікаў

Водгукі ад настаўнікаў сведчаць пра тое, што «Компас» выкарыстоўваецца ў школах па ўсёй Еўропе на ўроках мовы, геаграфіі, гісторыі, грамадзянскасці і паліталогіі. Напрыклад, на ўроках мовы цытаты з практыкавання «Усе роўныя – усе розныя» (старонка 97) могуць быць выкарыстаны ў якасці тэкстаў для развіцця слоўнікавага запасу і праверкі разумення, а практыкаванне «Хвіліначку!» (старонка 199) можа быць зручным для трэніроўкі навыкаў гаварэння. З іншага боку, статыстычныя даныя аб дзіцячай працы, гендарным нераўнапраўі і доступе да адукацыі (якія можна знайсці ў розных раздзелах даведачнай інфармацыі ў главе 5 на сайце www.coe.int/ compass) могуць быць выкарыстаны на ўроках матэматыкі, каб замяніць хрэстаматыйныя прыклады і, такім чынам, унесці ўклад у павышэнне інфармаванасці і абуджэнне зацікаўленасці ў пытаннях правоў чалавека. «Сетка жыцця» можа быць выкарыстана на ўроках біялогіі як уводзіны ў курс заняткаў аб прадуктах харчавання або біяразнастайнасці; «Аповесць аб двух гарадах» – у сацыяльных даследаваннях; «Вернікі» – у рэлігійнай адукацыі; «Гісторыя Ашыка» і «Увага: мы ўсе бачым!» могуць дадаць яшчэ адзін погляд на гандаль на ўроках геаграфіі, а прыклады з практыкавання «Змагары за правы» могуць дадаць цікавасці да ўрокаў па міжнародных адносінах. Магчымасці бязмежныя.

Дасягнуць мэт адукацыі ў галіне правоў чалавека ў кантэксце аўдыторных заняткаў можа быць надзвычай складана.

Варта прызнаць, што існуюць некаторыя фундаментальныя праблемы, якія даводзіцца вырашаць дзеля дасягнення мэт адукацыі ў галіне правоў чалавека ва ўмовах аўдыторнай працы. Напрыклад, часу, які звычайна адводзіцца на ўрок, можа аказацца недастаткова, каб завяршыць нейкія практыкаванні, акрамя самых кароткіх, або вучні могуць не мець магчымасці выбраць, што ім хочацца вывучаць. Акрамя таго, магчымасці прымянення таго, чаму яны навучыліся, могуць быць абмежаванымі, але ўсе гэтыя цяжкасці не з'яўляюцца непераадольнымі. Настаўнікі, напрыклад, знаходзяць спосабы пераадолець такія праблемы, як недасканаласць раскладу, раздзяліўшы практыкаванне на два заняткі або скарыстаўшыся магчымасцямі «тэматычнага тыдня» (або класнай гадзіны), калі звычайны расклад не дзейнічае.

У некаторых краінах адукацыя ў галіне правоў чалавека патрабуе змен у практыцы вядзення заняткаў з тым, каб адысці ад традыцыйных форм работы (метаду навучання chalk and talk, калі настаўнік дае вучням інфармацыю, якую яны павінны вывучыць на памяць) і рухацца да развіцця крытычнага мыслення і больш незалежных формаў навучання. У краінах, дзе настаўнікі звычайна не выступаюць у ролі трэнера, кансультанта або фасілітатара, змены павінны ўводзіцца паступова – так, каб і настаўнікі, і вучні адчувалі сябе ўпэўнена, працуючы ў дэмакратычнай атмасферы, калі можна свабодна выказваць свае думкі і задаваць пытанні. Разуменне метадаў і прыёмаў, якія выкарыстоўваюцца ў «Компасе», дапаможа настаўнікам унесці адпаведныя змены ў сваю працу; яны апісаны ніжэй на старонцы 61 і ўключаюць у сябе рэкамендацыі па арганізацыі абмеркавання ў вялікіх класах. Яшчэ адзін спосаб развіцця навыкаў фасілітатара прадугледжвае сумесную працу з тым, хто мае адпаведны вопыт. Напрыклад, можна запрасіць супрацоўніка мясцовай праваахоўнай арганізацыі, каб ён правёў занятак або дапамог вам яго правесці.

У ідэале выкладчыкі ўсіх прадметаў павінны сістэматычна развіваць адпаведныя кампетэнцыі ў рамках базавай адукацыі і дадатковых курсаў. Публікацыя «Як усе настаўнікі могуць прыняць удзел у навучанні грамадзянскасці і правам чалавека: асновы развіцця кампетэнцый» можа стаць дадатковым дапаможнікам па гэтым пытанні.[13]

Шэраг практычных праблем у гэтай сферы быў выяўлены не так даўно ў ходзе невялікага даследчага праекта, прысвечанага выкарыстанню эксперыментальных практыкаванняў з «Компаса» і адукацыйнага пакета «Усе розныя – усе роўныя» на занятках па мове ў дацкіх ВНУ.

Даследаванне паказала, што самі практыкаванні студэнтам спадабаліся, і самі выкладчыкі адзначалі, што студэнты працавалі з захапленнем. Тым не менш на этапе аналізу і ацэнкі паўсталі некаторыя цяжкасці. Студэнтам было цяжка адысці ад звычайных форм аўдыторнай працы, і яны часцей звярталіся да выкладчыка, а не адзін да аднаго, што ў выніку не заўсёды дазваляла ўсталяваць дыялог і свабодны абмен думкамі сярод роўных. Студэнтам хацелася пачуць каментарый або папраўку ад выкладчыкаў, а таксама яны чакалі, што тыя будуць выклікаць іх выступаць па чарзе. У выніку студэнты, як правіла, трацілі свой час, думаючы пра тое, што ім сказаць, і не слухалі, што кажуць іншыя, і не адказвалі ім. Акрамя таго, аказалася, што вельмі цяжка змяніць прывычныя адносіны ў групе, і лідары заставаліся лідарамі, а жартаўнікі не ставіліся да ўсяго сур’ёзна.

Адукацыю ў галіне правоў чалавека нельга навязаць або ажыццявіць пад дыктоўку.

Вывад заключаецца ў тым, што праца ў аўдыторыі з практыкаваннямі каштоўная тым, што дазваляе студэнтам паглыбіцца ў тэму, але не заўсёды можна з упэўненасцю сказаць, што ўсе без выключэння мэты адукацыі ў галіне правоў чалавека былі дасягнуты, асабліва тыя, якія тычацца развіцця супрацоўніцтва і ўмення ўзяць на сябе адказнасць і дзейнічаць. Тым не менш школы могуць унесці значны ўклад у развіццё пэўных кампетэнцый, якія пералічаны на старонцы 36 у якасці мэт адукацыйных праграм па правах чалавека, такіх, напрыклад, як актыўнае слуханне і камунікацыя, крытычнае мысленне і цікаўнасць. На першы погляд, практычныя дзеянні таксама могуць паказацца праблематычнымі ва ўмовах школы. Тым не менш пад дзеяннямі можна разумець многія рэчы, а ў класе або аўдыторыі гэта можа азначаць агульнае паляпшэнне паводзін, праяўленне большай павагі да іншых, рашэнне вучняў самастойна даведацца пра герояў барацьбы за правы чалавека ці прымяняць больш крытычны падыход да гісторыі. У главе 3 ёсць і іншыя ідэі адносна таго, як брацца за справу.

Калі выкладчыкам цяжка выкарыстоўваць у сваёй працы вялікую колькасць практыкаванняў, трэба мець на ўвазе, што адукацыя ў галіне правоў чалавека таксама прадугледжвае развіццё ў вучняў кругагляду і разумення, напрыклад, таго, што такое правы чалавека, як праходзіла гістарычнае развіццё такіх правоў, якія ёсць прававыя дакументы, у чым заключаецца актуальнасць правоў чалавека для развіцця грамадзянскай супольнасці і міру ва ўсім свеце; усе гэтыя пытанні цалкам упісваюцца ў сістэму фармальнай адукацыі. Даведачная інфармацыя аб правах чалавека і глабальных тэмах (главы 4, 5 і дадаткі) уяўляе сабой каштоўны навучальны матэрыял.

Настаўнікам, якія працуюць з дзецьмі ва ўзросце ад 7 да 13 гадоў, таксама будзе цікава бліжэй азнаёміцца з «Кампасіта» – дапаможнікам па адукацыі ў галіне правоў чалавека, які адрасаваны дзецям, паколькі яго практыкаванні ў нейкай меры больш падыходзяць для працы ў школе.

Нарэшце, асобнага каментарыя заслугоўвае і «псеўдаадукацыя ў галіне правоў чалавека», пад якой мы разумеем навучанне, якое прэтэндуе на званне адукацыі ў галіне правоў чалавека, але ў сілу спосабаў і прыёмаў, якія ў ім выкарыстоўваюцца, не мае права быць прызнаным такім. Ёсць шмат спосабаў арганізацыі адукацыі ў галіне правоў чалавека, але, як паказана ў пачатку гэтага дапаможніка, сам працэс мае вялікае значэнне. Гэта значыць, што, для таго каб прызнаць навучанне, звязанае з правамі чалавека, адукацыяй у галіне правоў чалавека, яно павінна быць прасякнута павагай да навучэнцаў і імкненнем навучыць іх паважаць і шанаваць правы чалавека. Адукацыю ў галіне правоў чалавека нельга навязаць або ажыццявіць пад дыктоўку. Акрамя таго, адукацыя ў галіне правоў чалавека не можа разглядацца як нешта, што адбываецца толькі на занятках; яна павінна распаўсюджвацца на ўсю школу і на пазашкольнае асяроддзе.

## 3.7. Метады, якія ляжаць у аснове практыкаванняў «Компаса»

Разуменне метадаў і тэхнічных прыёмаў, якія ляжаць у аснове практыкаванняў «Компаса», і валоданне імі мае істотнае значэнне для іх паспяховага выканання.

Метады, якія мы выкарыстоўваем, мы называем «практыкаваннямі», таму што ўдзельнікі бываюць псіхалагічна і нярэдка фізічна актыўна ўцягнутыя ў працэс. Аднак нашы метады – нешта большае, чым проста практыкаванні, дзейнасць, каб запоўніць час; яны вырашаюць ясныя адукацыйныя задачы, і мы выкарыстоўваем іх з пэўнай мэтай. Часам практыкаванні называюцца «гульнямі». Маецца на ўвазе, што практыкаванні могуць быць такімі ж вясёлымі, як і гульні! На жаль, некаторыя людзі звязваюць слова «гульня» з дзіцячай забаўкай і забываюць пра яе каштоўны адукацыйны аспект.

Разуменне асноўнай метадалогіі дапаможа вам як адаптаваць практыкаванні з улікам патрэб маладых людзей, з якімі вы працуеце, так і распрацаваць свае ўласныя практыкаванні. Больш таго, падчас напісання інструкцый па працы з практыкаваннямі мы зыходзілі з таго, што людзі ведаюць і разумеюць такія паняцці, як «праца ў групах», «мазгавы штурм» і «ролевыя гульні». Яны апісаны ніжэй.

### *Праца ў групах*



Праца ў групах ляжыць у аснове многіх практыкаванняў; яна прадугледжвае сумесную працу людзей, аб'яднанне іх навыкаў, талентаў і моцных бакоў для выканання агульнай задачы. Праца ў групах:

- Выхоўвае адказнасць. Калі людзі адчуваюць, што нясуць адказнасць за тое, што робяць, яны, як правіла, усімі сіламі імкнуцца да вынікаў.
- Развівае навыкі камунікацыі. Людзям трэба навучыцца слухаць, каб разумець, што кажуць іншыя, рэагаваць на іх ідэі і развіваць на гэтай аснове свае ўласныя меркаванні.
- Развівае супрацоўніцтва. Людзі хутка разумеюць, што калі яны працуюць для дасягнення агульнай мэты, то ім працуецца лепш, калі яны супрацоўнічаюць, а не канкурыруюць адзін з адным.
- Станоўча адбіваецца на навыках прыняцця рашэнняў. Людзі хутка разумеюць, што найлепшы спосаб прыняць рашэнне – гэта ацаніць усю наяўную інфармацыю і паспрабаваць знайсці рашэнне, якое б задавальняла кожнага. Той, хто адчувае сябе выключаным з працэсу прыняцця рашэнняў, можа сапсаваць працу групы, не выконваючы рашэнняў, якія былі прыняты астатнімі членамі групы.

Важна адзначыць, што паспяховая праца ў групе павінна быць мэтанакіраванай; у групы павінна быць поўная яснасць у тым, на якое пытанне неабходна знайсці адказ і якая праблема патрабуе вырашэння. Сказаць групе «абмеркаваць пытанне» – зусім не прадуктыўна. Якой бы ні была тэма, вельмі важна, каб праца па ёй была дакладна акрэслена і каб удзельнікі засяродзіліся на дасягненні мэты, што патрабуе ад іх зваротнай сувязі з усёй групай. Гэта не азначае, што вынік – гэта адзінае, што мае значэнне. Сутнасць заключаецца ў тым, што, працуючы разам у рамках дакладна пастаўленых мэт, удзельнікі ў большай ступені змогуць навучыцца новаму.

Большасць практыкаванняў «Компаса» прадугледжваюць працу ў малых групах у фазе «пагружэння ў вопыт» (фаза дзейнасці) і працу ў агульнай групе ў фазах «рэфлексіі» і «абагульнення», якія таксама ўваходзяць у цыкл навучання (ацэнка і падвядзенне вынікаў). Праца ў малых групах патрабуе ад кожнага ўдзелу і дапамагае развіваць навыкі супрацоўніцтва. Памер малой групы залежыць ад сітуацыі, напрыклад ад таго, колькі людзей усяго прысутнічае на занятку і ці прасторны пакой, у якім ён праходзіць. Малая група можа складацца нават з 2 ці 3 чалавек, але лепш за ўсё працуецца ў невялікіх групах па 6–8 чалавек. Праца ў малых групах можа працягвацца і 15 хвілін, і гадзіну, і цэлы дзень у залежнасці ад пастаўленай задачы.




## *Мазгавы штурм*

Мазгавы штурм выкарыстоўваецца для таго, каб прапанаваць да абмеркавання новую тэму, падштурхнуць да выкарыстання творчага падыходу і хутка выпрацаваць мноства новых ідэй. Ім таксама можна карыстацца для вырашэння пэўнай праблемы ці адказу на пытанне.

Як праводзіць мазгавы штурм:

1. Вырашыце, па якой праблеме вы будзеце праводзіць мазгавы штурм, і сфармулюйце яе ў выглядзе простага пытання ці сцверджання.
2. Напішыце пытанне на вялікім аркушы паперы або на дошцы, змясціўшы іх так, каб усім было добра бачна.
3. Папрасіце ўдзельнікаў выказаць свае ідэі па гэтым пытанні. Запішыце ідэі пад прапанаваным пытаннем або сцверджаннем. Выкарыстоўвайце пры гэтым асобныя словы або кароткія фразы.
4. Спыніце мазгавы штурм, калі ідэі скончацца.
5. Прайдзіцеся па ўсіх прапановах і папрасіце пракаментаваць іх.
6. Потым падвядзіце вынікі і, узяўшы за аснову новыя веды ўдзельнікаў, пераходзьце да абмеркавання або да працы над практыкаваннем.

Правілы мазгавога штурму:

1. Запісвайце КОЖНУЮ новую прапанову. Часта самыя незвычайныя ідэі аказваюцца самымі карыснымі і цікавымі!
2. Ніхто не павінен каментаваць, ацэньваць напісанае, пакуль не будуць выказаны ўсе ідэі.
3. Таксама забараняецца паўтараць ужо выказанае. Калі хтосьці выкажа думку, якая ўжо запісана на дошцы, падзякуйце за падказку і ветліва пакажыце, дзе вы яе запісалі.
4. Заахвочвайце кожнага да актыўнага ўдзелу.
5. Выказвайце свае ўласныя ідэі, толькі калі неабходна падштурхнуць групу.
6. Калі выказаная прапанова незразумелая для ўдзельнікаў, папрасіце аўтара ўнесці яснасць.




**«Насценны роспіс»**

Гэта адна з форм мазгавога штурму. Фасілітатар запісвае сцверджанне або пытанне, па якіх трэба будзе правесці мазгавы штурм, на шырокай, нічым не занятай сцяне. Аднак затым ужо не фасілітатар, а самі ўдзельнікі запісваюць свае ідэі на маленькіх лістках паперы (напрыклад, стыкерах) і наляпляюць іх на сцяну. Перавага гэтага метаду заключаецца ў тым, што ўдзельнікі могуць сядзець і самастойна думаць, пакуль яшчэ не апынуліся пад уплывам ідэй іншых, а карткі пазней, падчас дыскусіі, можна будзе пераляпіць такім чынам, каб згрупаваць падобныя паміж сабой ідэі.



**Гульня ў асацыяцыі**

Гэта яшчэ адна форма мазгавога штурму, якую можна выкарыстоўваць у якасці «ледакола» або ўводзін у дыскусію ці практыкаванне. Удзельнікі садзяцца ў круг, і фасілітатар пачынае з таго, што называе ключавое слова (слова, якое пазначае нешта, што ляжыць у аснове тэмы, якая будзе разбірацца). Хтосьці з удзельнікаў паўтарае ключавое слова, а потым называе любое іншае слова, якое першае прыйшло яму ў галаву як асацыяцыя з ключавым, і ўсё ідзе па крузе. Як варыянт, кожны можа сказаць нешта, звязанае са словамі папярэдняга ўдзельніка.

## *Дыскусійныя практыкаванні*



Дыскусіі з'яўляюцца неад'емнай часткай адукацыі ў галіне правоў чалавека таму, што менавіта такім шляхам людзі вучацца аналізаваць інфармацыю, крытычна думаць, развіваць навыкі зносін, абмену думкамі і навучання на ўласным вопыце, таму фаза «аналіз і ацэнка» з'яўляецца галоўнай часткай любога практыкавання.

Існуе шмат розных спосабаў вядзення дыскусіі, і некаторыя з іх (асабліва тыя, якія прадугледжваюць высокую ступень супрацоўніцтва і ўдзелу) можна з упэўненасцю разглядаць як практыкаванне ў поўным сэнсе гэтага слова. Напрыклад, дыскусіі ў малых групах, дзе ўдзельнікі павінны вырашыць праблему, можна лічыць практыкаваннем, напрыклад «Хвіліначку!» (старонка 199) і «Пагаворым пра секс» (старонка 211). Залішне нагадваць, што пасля практыкавання-дыскусіі ўдзельнікі ўсё роўна праводзяць аналіз і ацэнку таго, чаму яны навучыліся!

## Дыскусіі ў вялікіх групах



### Дыскусійныя групы

Гэта карысны метад, калі абмеркаванне разам з усёй групай не дае ніякіх ідэй. Папрасіце ўдзельнікаў абмеркаваць нейкую тэму ў парах або маленькіх групах на працягу некалькіх хвілін, а потым падзяліцца сваімі думкамі з астатняй часткай групы. Вы хутка адчуеце ў групе атмасферу, як у пчаліным вуллі, а вучні так і будуць «гудзець» ідэямі!

### Метад аналізу сцверджанняў

Гэтая тэхніка дазваляе ўдзельнікам выказаць сваё меркаванне без неабходнасці яго абгрунтавання. Гэта далікатны спосаб заахвоціць людзей быць больш упэўненымі ў сабе, калі трэба падзяліцца сваім меркаваннем.

Падрыхтуйце некалькі картак са сцверджаннямі (4–6 будзе дастаткова) па тэме або тэмах, якія вы хочаце вывучыць з групай. Зрабіце дзве таблічкі са словамі «Я згаджаюся» і «Я не згаджаюся» і пакладзіце іх на падлогу на адлегласці ў 6–8 метраў адзін ад аднаго. Пры жаданні можна пакласці паміж таблічкамі вяроўку ці стужку, каб падкрэсліць сувязь паміж двума крайнімі пунктамі гледжання.



Прачытайце ўслых адно з падрыхтаваных сцверджанняў і папрасіце ўдзельнікаў заняць месцы паміж дзвюма крайнасцямі, выбраўшы сабе месца ў адпаведнасці з асабістым меркаваннем; тыя, хто не зрабіў свой выбар, няхай стаяць у цэнтры. Папрасіце ўдзельнікаў, калі яны пажадаюць, растлумачыць, чаму яны занялі тое ці іншае месца. Скажыце, што ўдзельнікі могуць памяняць сваё месца ўздоўж лініі, калі зменяць меркаванне пад уздзеяннем пачутых аргументаў.

Варыянт гэтага практыкавання называецца «Пункты гледжання». Прыляпіце чатыры таблічкі на чатыры сцяны аўдыторыі: «Я згаджаюся», «Я не згаджаюся», «Я не ведаю» і «Я хачу нешта сказаць». Як і ў першым выпадку, удзельнікі выбіраюць сабе месца ў адпаведнасці з іх адказам, але ў любы час могуць змяніць яго.



**Акварыум**

Гэты метад дазваляе ўдзельнікам адрасаваць свае каментарыі адзін аднаму, а не фасілітатару ці настаўніку. Запрасіце некалькі чалавек – у ідэале ад чатырох да шасці – сесці ў невялікі круг у сярэдзіне пакоя і абмеркаваць тэму, у той час як усе астатнія застануцца сядзець за межамі гэтага круга і слухаць «рыб у акварыуме». Калі адзін з назіральнікаў хоча ўнесці свой уклад у дыскусію, ён робіць адзін-два крокі наперад і ўстае за адной з «рыб». Гэтая «рыба», такім чынам, павінна пакінуць «акварыум» і далучыцца да слухачоў.

У гэтага метаду ёсць шэраг пераваг, галоўная з якіх заключаецца ў тым, што ўдзельнікі кантралююць працэс абмеркавання, і не толькі таму, што любы чалавек можа выйсці наперад, каб выказаць сваё меркаванне, калі ён сам гэтага пажадае, але і таму, што іншыя члены групы могуць прымусіць замаўчаць таго, хто надта доўга размаўляе ці паўтараецца, і заняць яго месца.



**Дэбаты**

Метад традыцыйных парламенцкіх дэбатаў асабліва карысны ў аўдыторыі, дзе не так многа магчымасцей для выкарыстання іншых форм дыскусіі. Калі ўвесь клас гатовы абмеркаваць нейкае пытанне (напрыклад, «гэтая палата лічыць, што правы чалавека не з'яўляюцца ўсеагульнымі, пакольк яны – вынаходка Захаду»), то адзін з вучняў назначаецца выконваць ролю старшыні замест настаўніка.

Яшчэ адной формай дэбатаў з'яўляецца дыскусійная панэль, удзельнікі якой, якія выступаюць у ролі «экспертаў», адказваюць на пытанні аўдыторыі. Гэта добры спосаб выкласці інфармацыю, заахвоціць аўдыторыю задаваць пытанні і разглядаць розныя пункты гледжання, а таксама паказаць, што правы чалавека з'яўляюцца складанай тэмай. Раздайце, напрыклад, ролевыя карткі для практыкавання «Мака-кітабоі» (старонка 215) васьмі добраахвотнікам (па два чалавекі, якія прадстаўляюць кожную з чатырох груп, якія прымаюць удзел у дыскусіі). Гэтыя восем чалавек выкарыстоўваюць карткі для падрыхтоўкі да абароны сваёй пазіцыі, а потым займаюць месцы ў прэзідыуме, каб адказаць на пытанні і абгрунтаваць свой пункт гледжання перад аўдыторыяй. У канцы занятку клас можа правесці галасаванне па пытанні, ці павінен быць забаронены кітабойны промысел.



## Дыскусіі ў малых групах

Практыкаванні дыскусійнага характару лепш за ўсё праводзіць у невялікіх групах, таму што тады ў кожнага ўдзельніка з'явіцца шанец унесці свой уклад. У невялікіх групах людзі не толькі адчуваюць сябе больш упэўнена і свабодна, але і кожны атрымлівае дастаткова часу, каб выказацца.

Такія практыкаванні выконваюцца з апорай на дапаможны навучальны матэрыял, выкладзены, як правіла, на картках. Прыкладамі такога матэрыялу могуць быць фрагменты тэлевізійных навін, плакаты, карткі са сцверджаннямі, аналіз сітуацый і фатаграфіі. Пры падрыхтоўцы матэрыялаў важна памятаць пра склад мэтавай групы і пазбягаць выкарыстання інфармацыі, якая можа быць абразлівай ці занадта асабістай. Акрамя таго, пры працы з малодшымі групамі неабходна мець на ўвазе ўзровень навыкаў чытання, а таксама ведання мовы, калі вы працуеце ў полікультурнай групе; у такіх выпадках трэба выкарыстоўваць простую мову. Інфармацыя на картках павінна быць прадстаўлена як мага карацей, пажадана не больш за 2–8 радкоў на палове аркуша фармату А4.

**Метад AAA BBB CCC**



Гэта вельмі карысны прыём, калі вы хочаце, каб удзельнікі самі развівалі свае веды і разуменне без таго, каб вы іх «вучылі». Навучэнцы працуюць у малых групах, каб атрымаць практычныя веды аб нейкім адным аспекце тэмы. Потым групы фарміруюцца нанава, каб члены новых груп маглі падзяліцца сваімі ведамі.

Падрыхтуйце картку са сцверджаннямі або картку з пытаннямі для кожнай групы па тэме, з якой вы хочаце працаваць. Кожная група павінна працаваць над рознымі аспектамі адной і той жа праблемы.

Падзяліце ўдзельнікаў на тры невялікія групы: групу А, групу В і групу С. Дайце кожнай групе нейкі час для абмеркавання пытання ці праблемы. Потым сфарміруйце групы нанава так, каб у кожнай новай групе было па адным чалавеку з кожнай з пачатковых груп; іншымі словамі, у выніку склад новых груп можа быць прадстаўлены як АВС, АВС і АВС. Пастаўце перад новымі групамі АВС задачу вырашыць заяўленую раней праблему і прыйсці да кансэнсусу намаганнямі кожнага ўдзельніка.

**Карткі ў капелюшы**



Гэты прыём дазваляе вельмі далікатна ўвесці тэму, стымуляваць удзельнікаў да дыскусіі і выпрацоўкі ідэй. Зрабіце некалькі картак з пытаннямі або сцверджаннямі і пакладзіце іх у капялюш. Потым прайдзіце з капелюшом па крузе або пакладзіце яго ў сярэдзіну круга. Папрасіце ўдзельнікаў па чарзе ўзяць па адной картцы з капелюша і пракаментаваць пытанне або сцверджанне.

Фасілітатар, каб не рабіць карткі самастойна, можа прапанаваць удзельнікам зрабіць свае ўласныя карткі з пытаннем ці сцверджаннем. У гэтым выпадку пытанні ставяцца групе ананімна, што асабліва карысна пры абмеркаванні далікатных тэм.

**Ранжыраванне**




Гэты дыскусійны метад добра выкарыстоўваць, калі вам трэба стымуляваць мэтанакіраваную дыскусію ў малых групах. Вам спатрэбіцца набор картак са сцверджаннямі для кожнай малой групы; дзевяці-дванаццаці сцверджанняў будзе дастаткова. Выберыце кароткія, простыя сцверджанні, якія маюць дачыненне да тэмы, прапанаванай для абмеркавання, і напішыце адно сцверджанне на кожнай картцы.

Групы павінны абмеркаваць сцверджанні і паспрабаваць прыйсці да згоды наконт размеркавання іх па важнасці. Такое ранжыраванне можна адлюстраваць у форме лесвіцы або ромба. У рэйтынгу ў форме лесвіцы найбольш важнае сцверджанне змяшчаецца зверху, наступнае па важнасці размяшчаецца на прыступцы ніжэй і гэтак далей; найменш важнае сцверджанне займае месца ўнізе.




Пры выкарыстанні метаду ромба спатрэбіцца дзевяць картак са сцверджаннямі. Удзельнікі вядуць перамовы і выбіраюць самае важнае сцверджанне, пад якім размяшчаюць два крыху менш важных, потым тры сцверджання сярэдняй важнасці і гэтак далей, як паказана на дыяграме. Паколькі праблемы рэдка бываюць простымі і яснымі, метад ромба выкарыстоўваецца часцей за просты рэйтынг. Ён выглядае менш надуманым і таму больш прымальны для ўдзельнікаў. Ён таксама дае больш магчымасцей для дасягнення кансэнсусу. Адзін з варыянтаў гэтага метаду прадугледжвае напісанне васьмі сцверджанняў і перадачу ўдзельнікам адной чыстай карткі, каб яны самі яе запоўнілі.

**Аналіз сітуацый (кейсы)**

Метад аналізу канкрэтных сітуацый (кейсаў) прадугледжвае выкарыстанне кароткіх «гісторый» пра людзей і падзеі, якія ілюструюць праблему. Як і картка са сцверджаннямі, метад аналізу сітуацыі з'яўляецца карысным недыдактычным інструментам падачы інфармацыі.




Гэты метад з'яўляецца каштоўным яшчэ і таму, што стварае дыстанцыю паміж удзельнікамі і праблемай, што здымае напружанасць падчас яе абмеркавання. Напрыклад, калі ў групе ёсць задзіры, а вы хочаце вырашыць гэту праблему, вы можаце расказаць гісторыю, у якой гаворка пойдзе аб запалохванні і якая змяшчае некаторыя паралелі з рэальнай сітуацыяй. Удзельнікі чытаюць такія «гісторыі», аналізуюць праблему і спрабуюць распрацаваць спосабы яе вырашэння.



## *Тэатр*

Разгляд праблем і ідэй з дапамогай тэатральнай педагогікі можа даць чалавеку імпульс для такога ўсплёску эмоцый, думак, мар і творчасці, на які ён у звычайных умовах часта не здольны. Тэатральны метад прадугледжвае поўнае пагружэнне чалавека – яго розуму, душы і цела – і, такім чынам, уцягвае ў працэс не толькі інтэлект, але пачуцці і эмоцыі, што і робіць яго такім магутным інструментам. Акрамя таго, ён вельмі эфектыўны, таму што падыходзіць навучэнцам розных стыляў навучання – тым, хто лепш успрымае на слых, вачыма ці тактыльна.

Аналіз вынікаў вучэбнай працы з'яўляецца асабліва важным для практыкаванняў з выкарыстаннем тэатральнай методыкі, уключаючы ролевыя гульні і мадэліраванне сітуацый. Гульцам спатрэбіцца час, каб выйсці з ролі, перш чым перайсці да абмеркавання сваіх пачуццяў і прычын, з якіх яны зрабілі тое ці іншае.

### Ролевыя гульні

Ролевая гульня – гэта кароткая п'еса, разыграная ўдзельнікамі. Нягледзячы на тое, што ўдзельнікі асноўваюцца на сваім жыццёвым вопыце, калі разыгрываюць пэўную сітуацыю; ролевыя гульні ў асноўным заснаваны на імправізацыі. Ролевыя гульні могуць спрыяць лепшаму разуменню сітуацыі і абуджаць спачуванне да персанажаў, якіх гульцы ўвасабляюць. Яны дазваляюць людзям перажываць складаныя сітуацыі, але робіцца гэта ў бяспечнай атмасферы.

Да ролевай гульні трэба падыходзіць з вялікай асцярогай. Па-першае, важна даць удзельнікам час, каб выйсці з ролі пасля завяршэння практыкавання. Па-другое, кожны павінен паважаць пачуцці іншых і памятаць аб сацыяльнай структуры групы. Напрыклад, пры пастаноўцы ролевай гульні, у якой гаворка ідзе пра людзей з інваліднасцю, неабходна прымаць да ўвагі той факт, што ў некаторых удзельнікаў могуць быць праблемы са здароўем (што можа быць не адразу прыкметным) або сваякі ці блізкія з інваліднасцю. Нельга прычыніць ім боль, ці рабіць іх аб'ектам асабліва пільнай увагі, ці маргіналізаваць. Калі гэта здарыцца, пастаўцеся да гэтага з усёй сур'ёзнасцю, прынясіце прабачэнні і растлумачце свой учынак.

Акрамя таго, ні ў якім разе нельга дапускаць стэрэатыпы. Ролевыя гульні «выцягваюць» з удзельнікаў тое, што яны думаюць пра іншых, дзякуючы іх «здольнасці» да гульні і імітацыі. Менавіта гэта робіць такія практыкаванні вельмі вясёлымі! Таму карысна падчас аналізу спытаць: «Вы сапраўды думаеце, што людзі, якіх вы сыгралі, з'яўляюцца менавіта такімі?». Адукацыйная місія навучання складаецца ў тым, каб людзі памяталі пра неабходнасць крытычна ставіцца да любой інфармацыі, таму спытайце ўдзельнікаў, адкуль яны атрымалі звесткі, якія сталі асновай іх бачання персанажа.

### Сімуляцыя

Сімуляцыю можна разглядаць як пашыраную, структураваную ролевую гульню (але яно не прадугледжвае высокай ступені імправізацыі), якая пераносіць удзельнікаў у незнаёмыя ім сітуацыі і прымушае іграць нейкую ролю. Напрыклад, зала суда ў практыкаванні «Доступ да лекаў» (старонка 87) добра апісана і прадстаўлена на ілюстрацыі, а ўдзельнікі атрымліваюць падрабязную інфармацыю пра ролю, якую яны павінны іграць. Сімуляцыя патрабуе вельмі вялікай эмацыянальнай аддачы і мабілізацыі інтэлектуальных здольнасцей, асабліва ад тых удзельнікаў, якія павінны абараняць пункт гледжання, з якім асабіста не згодны.

### Форум-тэатр

Форум-тэатр уяўляе сабой інтэрактыўную форму тэатральнай педагогікі, якая заахвочвае аўдыторыю да ўзаемадзеяння і дазваляе разгледзець розныя варыянты вырашэння нейкай праблемы або пытання. Форум-тэатр (таксама вядомы як «тэатр Баала», «тэатр прыгнечаных» або «тэатр для развіцця») стварыў у пачатку 1970-х гг. Аўгуста Баал, які намагаўся пашырыць магчымасці сваёй аўдыторыі.

Форум-тэатр з'яўляецца адной з форм ролевай гульні. Аўдыторыі прапануюць кароткую п'есу, у якой цэнтральны персанаж сутыкаецца з прыгнётам або перашкодай, якія ён не ў стане пераадолець; сюжэт паказваецца такім чынам, каб быць блізкім аўдыторыі. Пасля заканчэння п'еса пачынаецца спачатку, але пры гэтым гледачы могуць выйсці на сцэну і прапанаваць альтэрнатыўныя варыянты развіцця падзей. Акцёры абмяркоўваюць вынікі гэтых варыянтаў з аўдыторыяй, арганізуючы своеасаблівыя тэатральныя дэбаты, падчас якіх адбываецца абмен вопытам і ідэямі, што развівае ва ўдзельнікаў пачуццё салідарнасці і ўпэўненасці ў сваіх сілах і магчымасцях.

Форум-тэатр з'яўляецца вельмі карысным інструментам для адукацыі ў галіне правоў чалавека, напрыклад, пры вывучэнні шляхоў вырашэння праблем або канфліктаў. Ён дазваляе людзям выйсці на сцэну і даследаваць розныя магчымасці. Такое мерапрыемства можа быць выкарыстана ў якасці своеасаблівай рэпетыцыі рэальнай падзеі ці для таго, каб выявіць і прааналізаваць альтэрнатывы ў любой сітуацыі, якая адносіцца да мінулага, сучаснасці або будучыні.

## *Аўдыявізуальныя метады*

### Выкарыстанне відарысаў: фатаграфій, карыкатур, малюнкаў, калажаў



«Карціна вартая тысячы слоў». Візуальныя вобразы з'яўляюцца магутным інструментам падачы інфармацыі і абуджэння цікавасці. Памятайце, што малюнак з'яўляецца важным сродкам самавыяўлення і камунікацыі, прычым не толькі для тых, хто аддае перавагу візуальнаму стылю мыслення, але і для тых, хто не вельмі ўдалы прамоўца. Ідэі для практыкаванняў з выкарыстаннем фатаграфій і малюнкаў прадстаўлены разам у главе 2 пад агульнай назвай «Гульні з відарысамі» (старонка 247).

**Парады па стварэнні калекцыі відарысаў**

Відарысы з'яўляюцца такім універсальным сродкам, што фасілітатару можна параіць заняцца стварэннем уласнай калекцыі. Іх можна ўзяць, напрыклад, з газет, часопісаў, плакатаў, турыстычных брашур, паштовак.

Выражце карцінкі, прымацуйце іх на карткі і пакрыйце празрыстай плёнкай (прадаюцца для абгортвання кніг), каб зрабіць іх даўгавечнымі, лёгкімі і прыемнымі ў выкарыстанні. Калекцыя будзе выглядаць як набор, калі ўсе карткі будуць аднаго памеру. Фармат А4 – ідэальны памер, але А5 таксама добры і практычны варыянт.

Будзе нядрэнна, калі на адваротным баку карткі вы паставіце нумар і пазначыце крыніцу, арыгінальную назву ці яшчэ якую карысную інфармацыю пра відарыс. Так на занятках удзельнікі будуць бачыць толькі малюнак і рэагаваць толькі на яго, не растрачваючы ўвагу на іншае.

Пры падборы малюнкаў паспрабуйце знайсці выявы поўначы, поўдня, усходу і захаду, а таксама рознага прыроднага і сацыяльнага асяроддзя.

Падчас выбару выяў людзей імкніцеся да разнастайнасці і ўлічвайце гендар, расу, стан здароўя, узрост, нацыянальнасць і культуру. Таксама майце на ўвазе, што ўспрыманне відарысаў залежыць ад іх памеру і колеру. Няўдалы выбар малюнка можа сказіць яго ўспрыманне, таму паспрабуйце сабраць гарманічную калекцыю, у якой усе відарысы будуць больш-менш аднастайнымі.

Не забудзьце праверыць, ці існуюць аўтарскія правы на відарысы і фатаграфіі, якія вы хочаце выкарыстаць.



## Выкарыстанне фільмаў, відэаролікаў і радыёп'ес

Фільмы, відэаролікі і радыёп'есы з'яўляюцца магутнымі інструментамі для адукацыі ў галіне правоў чалавека і карыстаюцца папулярнасцю сярод моладзі. Абмеркаванне пасля прагляду фільма павінна стаць добрым зыходным пунктам для далейшай працы. Тэмамі абмеркавання могуць стаць першапачатковая рэакцыя на фільм, рэальнасць адлюстравання ў ім жыцця ці персанажаў, накіраванасць фільма на прапаганду нейкага канкрэтнага палітычнага ці маральнага пункту гледжання, а таксама правы чалавека, якія былі ў ім закрануты!

Не забудзьце праверыць, ці існуюць аўтарскія правы ці іншыя абмежаванні на публічны паказ відэафайлаў, якія вы збіраецеся выкарыстаць. Прагляд фільма разам з класам або групай моладзі можа быць кваліфікаваны як публічны паказ.

## Фатаграфаванне, стварэнне фільмаў і відэаролікаў

Сучасны тэхнічны ўзровень відэакамер, лічбавых камер і мабільных тэлефонаў робіць здыманне фільмаў і фатаграфаванне ўсё больш даступным заняткам. Фатаграфіі і фільмы, знятыя маладымі людзьмі, дазваляюць ім наглядна дэманстраваць свой пункт гледжання і погляды, а таксама рабіць выдатны ілюстрацыйны матэрыял.

### Відэапісьмы

Відэапісьмы – гэта правераны спосаб зламаць бар'еры і забабоны. Яны дазваляюць людзям, якія інакш не маглі б сустрэцца тварам да твару, «пагаварыць» і абмяняцца інфармацыяй пра тое, як яны жывуць і што для іх важна. Адным з прыкладаў з'яўляецца брытанскі тэлевізійны праект, які паказаў, як цыганка і чалавек, які пражываў недалёка ад цыганскага табара, не размаўлялі адзін з адным. Тым не менш медыятару ўдалося пераканаць іх абмяняцца серыяй відэапісьмаў. Кожны з іх пачаў з таго, што паказаў свой дом і прадставіў членаў сваёй сям'і. У наступных пісьмах яны яшчэ больш паказалі і расказалі пра сваё жыццё, і паступова забабоны сталі знікаць, саступіўшы месца разуменню і спагадзе. Яны зразумелі, што мелі значна больш агульнага, чым маглі сабе ўявіць, і, у рэшце рэшт, дамовіліся сустрэцца асабіста.

## *СМІ: газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне, Інтэрнэт*

СМІ – незаменная крыніца добрага матэрыялу для дыскусій. Заўсёды цікава абмеркаваць, якім чынам былі прадстаўлены навіны ці інфармацыя, і прааналізаваць забабоны і стэрэатыпы. Далейшае абмеркаванне можа быць прысвечана такім тэмам, як права ўласнасці на сродкі масавай інфармацыі, палітычнае скажэнне інфармацыі, цэнзура і свабода слова. Практыкаванне «Першая паласа» на старонцы 181 спецыяльна прысвечана гэтым пытанням, і яшчэ больш ідэй вы знойдзеце ў даведачных матэрыялах аб СМІ, перайшоўшы па спасылцы www.coe.int/compass. Яшчэ раз нагадваем аб неабходнасці праверкі аўтарскіх правоў на любыя матэрыялы, якія вы хочаце выкарыстаць.

## Канцавыя зноскі

[1] Выдзелена рэдактарамі.

[2] Рэкамендацыя Камітэта міністраў CM/Rec (2010)7 аб Хартыі Савета Еўропы аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека.

[3] http://www.amnesty.org/en/human-rights-education

[4] Betty A. Reardon: *Educating for Human Dignity – Learning about rights and responsibilities, University of Pennsylvania Press*, 1995

[5] www.fra.europa.eu (accessed on 13 October 2010)

[6] Рэзалюцыя Камітэта міністраў CM/Res (2008)23 аб маладзёжнай палітыцы Савета Еўропы. Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, План дзеянняў у рамках Сусветнай праграмы па адукацыі ў галіне правоў чалавека – першая фаза, Жэнева, 2006 г.

[7] Даныя Еўрастата за снежань 2009 г. – інфармацыйны выпуск Еўрастата 16/2010 ад 29 студзеня 2010 г.

[8] See for example, Backman, E. & Trafford, B. (2006) *Democratic governance of schools*. Strasbourg: Council of Europe

[9] Прынцыпы глабальнай адукацыі – канцэпцыя і метадалогія па пытаннях глабальнай адукацыі для адукатараў і кіраўнікоў, цэнтр «Поўнач-Поўдзень» Савета Еўропы, 2008 г.

[10] Другая еўрапейская маладзёжная кампанія «Усе розныя – усе роўныя» ў падтрымку разнастайнасці, правоў чалавека і ўдзелу праходзіла ў 2007–2008 гг.

[11] Наборы навучальных матэрыялаў «Асновы навучання» і «Арганізацыйны менеджмент» могуць стаць карысным зыходным пунктам для выкладчыкаў і фасілітатараў у знаёмстве з рознымі стылямі навучання і адносінамі паміж удзельнікамі працэсу навучання. Набор «Асновы навучання», Council of Europe Publishing, 2002 г. Набор «Арганізацыйны менеджмент», Council of Europe Publishing, 2000 г. Можна спампаваць па спасылцы www.youth-partnership-eu.coe.int

[12] Gollob, R., Krapf, P., Ólafsdóttir, Ó., and Weidinger, W. (2010) *Educating for democracy: Background materials on democratic citizenship and human rights education*. Strasbourg: Council of Europe

[13] Brett, P., Mompoint-Gaillard, P. and Salema M.H. (2009) *How all teachers can support citizenship and human rights education: a framework for the development of competences*. Strasbourg: Council of Europe.

# Глава 2

# Практыкаванні
# і метады навучання
# ў галіне правоў чалавека

# Агляд практыкаванняў

| | Узровень | Дзеці | Грамадзянскасць і ўдзел | Культура і спорт | Дэмакратыя | Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці | Дыскрымінацыя і нецярпімасць | Адукацыя | Навакольнае асяроддзе | Гендарныя пытанні | Агульныя правы чалавека | Глабалізацыя | Здароўе | СМІ | Міграцыя | Мір і гвалт | Беднасць | Рэлігія і вера | Гістарычная памяць | Вайна і тэрарызм | Праца | Старонка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тры рэчы | 2 | | | | | | | | ✓ | | | | | | ✓ | | | | | ✓ | | 78 |
| Мячэць у Сліпівілі | 2 | | ✓ | | | | ✓ | | | | | | | | | | | ✓ | | | | 81 |
| Доступ да лекаў | 4 | | | | | | ✓ | | | | | ✓ | ✓ | | | | | | | | | 87 |
| Сыграем гэта! | 2 | ✓ | ✓ | | | | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | 94 |
| Усе роўныя – усе розныя | 2 | | | | | | ✓ | | | | | ✓ | | ✓ | | | | | | | | 97 |
| Гісторыя Ашыка | 2 | ✓ | | | | | | | | | | ✓ | | | | | | | | | ✓ | 100 |
| Вернікі | 3 | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | | | | ✓ | | | | 105 |
| Увага, мы ўсё бачым! | 3 | | ✓ | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | | | 110 |
| Можна ўвайсці? | 3 | | | | | | ✓ | | | | | | | | ✓ | ✓ | | | | | | 115 |
| *Чахал супраць Вялікабрытаніі* | 4 | | | | ✓ | | | | | | | | | | | ✓ | | | | ✓ | | 120 |
| Змяніце свае акуляры | 2 | | | | | ✓ | | | | | | | | | ✓ | | ✓ | | | | | 126 |
| Правы дзяцей | 2 | ✓ | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | | | | 130 |
| Розныя зарплаты | 2 | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | | | | ✓ | 135 |
| Ці ёсць у нас альтэрнатывы? | 3 | ✓ | | | | | | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | 140 |
| Хатнія справы | 3 | | | | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | 144 |
| Доста! | 4 | | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | | ✓ | ✓ | | 151 |
| Гульня «Намалюй слова» | 1 | | | | | | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | 156 |
| Адукацыя для ўсіх? | 2 | ✓ | ✓ | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | | | | 158 |
| Выбірай! | 2 | | ✓ | | ✓ | | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | 164 |
| Змагары за правы | 2 | | ✓ | | | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | 167 |
| Пагуляем на пальцах | 4 | | | | | | | | ✓ | | | | | | ✓ | ✓ | | | | | | 173 |
| Улада кветак | 2 | ✓ | | | | | | | | | ✓ | | | | | | | ✓ | | | | 177 |
| Першая паласа | 3 | | | | | | | | ✓ | | | ✓ | | ✓ | | | | | | | | 181 |
| Гераіні і героі | 2 | | ✓ | | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | | | | | 186 |
| Колькі нам патрэбна? | 3 | | | | | | | ✓ | | | | | ✓ | | | | | | | ✓ | | 189 |
| Я хачу працаваць | 3 | | | | | ✓ | ✓ | | | | | | | | | | | | | | ✓ | 193 |
| Хвілінaчку | 2 | | | ✓ | | | | | | | ✓ | ✓ | | | | | | | | | | 199 |
| Моўны бар’ер | 2 | | | | | | ✓ | | | | | | | | ✓ | | | | | ✓ | | 203 |
| Пачуць голас кожнага | 3 | ✓ | ✓ | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | | | | 207 |
| Пагаворым пра секс | 4 | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | | 211 |
| Мака-кітабоі | 4 | | | ✓ | | | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | | | 215 |
| Вузы супрацоўніцтва | 4 | | ✓ | | ✓ | | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | 223 |
| Тэгі памяці | 2 | | | ✓ | | | | | | | | | | | | | | | ✓ | ✓ | | 227 |
| Маё жыццё не шоу | 3 | | | | | | | ✓ | | | | | | ✓ | | ✓ | | | | | | 232 |
| На лесвіцы | 3 | | ✓ | ✓ | ✓ | | | | | | | | | | | | | | | | | 236 |
| Варыянты нашай будучыні | 2 | ✓ | | | | | | | ✓ | | | | ✓ | | | | | | | | | 240 |
| Шлях у краіну Роўнасці | 2 | | | | | | ✓ | ✓ | | ✓ | | | | | | | | | | | | 244 |
| Гульні з відарысамі | 1 | | | | | | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | 247 |
| Электрастанцыя | 3 | | ✓ | | | | | | | | ✓ | | | | | ✓ | | | | | | 251 |
| Адказ расізму | 3 | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | | ✓ | | | | | | 254 |
| «Бінга» на тэму правоў | 1 | | | | | | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | 260 |
| Барацьба за багацце і ўладу | 3 | | | | | | | | | | | ✓ | ✓ | | | | ✓ | | | | | 263 |
| Убачыць свае магчымасці | 2 | ✓ | | | | ✓ | ✓ | | | | | | | | | | | | | | | 267 |
| Хутка састарэе | 2 | | | | | | | ✓ | | | | ✓ | | | | | | ✓ | | | | 272 |
| Спорт для ўсіх | 2 | | | ✓ | | ✓ | | | | | | | ✓ | | | | | | | | | 276 |
| Зрабі крок наперад | 2 | | | | | | ✓ | | | | ✓ | | | | | | ✓ | | | | | 281 |
| Аповесць пра два гарады | 4 | | ✓ | | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | | ✓ | 286 |
| Тэрарызм | 2 | | | | | | | | | | | ✓ | | | | ✓ | | | | ✓ | | 295 |
| Кіданне камянёў | 2 | ✓ | | | | | | | | | | | | | | ✓ | | | | ✓ | | 299 |
| Храналогія правоў | 3 | | | | | | | | | | ✓ | | | | | | | ✓ | ✓ | | | 302 |
| Галасаваць ці не галасаваць? | 4 | | ✓ | | ✓ | | | | | | ✓ | | | | | | | | | | | 306 |
| Пасяджэнне прафсаюза | 3 | | ✓ | | ✓ | | | | | | | | | | | | | | | | ✓ | 312 |
| Гвалт у маім жыцці | 3 | | | | | | | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | | ✓ | | 317 |
| Сетка жыцця | 2 | | | | | | | | ✓ | | | ✓ | ✓ | | | | | | | | | 320 |
| Калі прыйдзе заўтра | 2 | | | | | | | | | | | ✓ | | ✓ | | ✓ | | | | | | 324 |
| Дзе вы стаіце? | 2 | | ✓ | | | | | | | | ✓ | | | | | | ✓ | | | | | 329 |
| Хто я такія? | 2 | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | ✓ | | | | 332 |
| Праца і дзеці | 2 | | | | | | ✓ | | | ✓ | | | | | | | | | | | ✓ | 335 |
| Каляндар правоў чалавека | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 338 |
| Стартавыя практыкаванні | 2 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 345 |
| Практыкаванні для ацэнкі навучання | 1 | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | 350 |

# Зводная табліца практыкаванняў

| Назва | Тэмы | Агляд | Звязаныя правы |
|---|---|---|---|
| Тры рэчы | • Міграцыя<br>• Вайна і тэрарызм<br>• Навакольнае асяроддзе | У гэтым практыкаванні выкарыстоўваюцца метады дыскусій і ранжыравання ў форме ромба, каб дапамагчы людзям зразумець, што значыць раптам пакінуць свой дом. | Права на прытулак у іншых краінах ад праследавання. Свабода рэлігіі і перакананняў. Свабода думкі і інфармацыі. |
| Мячэць у Сліпівілі | • Рэлігія і вера<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Грамадзянскасць і ўдзел | Гэта практыкаванне нацэлена на даследаванне рознагалосся ў сувязі з будаўніцтвам новай мячэці ў раёне з традыцыйна хрысціянскім насельніцтвам з дапамогай інсцэніроўкі пасяджэння муніцыпальнага савета. | Свабода ад дыскрымінацыі. Свабода рэлігіі і перакананняў. Свабода думкі і інфармацыі. |
| Доступ да лекаў | • Здароўе<br>• Глабалізацыя<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой інсцэніроўку судовага працэсу «Лекі ад СНІДу», які адбыўся ў Паўднёвай Афрыцы ў 2000 годзе. У ім разглядаюцца наступныя пытанні: ВІЧ (СНІД), доступ да лекаў і як прымірыць супярэчныя прэтэнзіі на правы. | Права на жыццё і годнасць. Права на абарону маральных і матэрыяльных інтарэсаў, якія з'яўляюцца вынікам навуковай вытворчасці. Права на здароўе. |
| Сыграем гэта! | • Агульныя правы чалавека<br>• Дзеці<br>• Грамадзянскасць і ўдзел | З дапамогай гэтага акцёрскага практыкавання ўдзельнікі прадстаўляюць сваё ўспрыманне правоў чалавека. | Усе правы чалавека. |
| Усе роўныя – усе розныя | • Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Глабалізацыя<br>• СМІ | Гэта кароткая віктарына, дастаткова правакацыйная і таму цікавая, яна ў той жа час з'яўляецца добрай асновай для эфектыўнага групавога абмеркавання поглядаў і стэрэатыпаў. | Роўнасць чалавечай годнасці. Права на ўсе правы і свабоды без дыскрымінацыі. Права на нацыянальную прыналежнасць. |
| Гісторыя Ашыка | • Дзеці<br>• Праца<br>• Глабалізацыя | Гэта практыкаванне для абмеркавання. Зыходны пункт – гісторыя дзіцяці-рабочага. Удзельнікі даследуюць аспекты дзіцячай працы, яе прычыны і спосабы спынення. | Абарона ад эканамічнай эксплуатацыі. Права на адукацыю. Права на адпачынак і вольны час. |
| Вернікі | • Рэлігія і вера<br>• Культура і спорт<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць | Удзельнікі параўноўваюць і супрацьпастаўляюць розныя перакананні. | Свабода рэлігіі і перакананняў. Свабода думкі і інфармацыі. Свабода ад дыскрымінацыі. |
| Увага, мы ўсё бачым! | • Глабалізацыя<br>• Навакольнае асяроддзе<br>• Грамадзянскасць і ўдзел | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі даведваюцца пра сацыяльны, эканамічны і экалагічны кошт баваўнянай футболкі. Потым яны пераходзяць да планавання і прыняцця мер для вырашэння парушэння звязаных правоў чалавека. | Права выбіраць працу па жаданні і ўступаць у прафсаюзы. Права на дастатковы ўзровень жыцця. Права на бяспечнае і здаровае навакольнае асяроддзе. |
| Можна ўвайсці? | • Міграцыя<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Мір і гвалт | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой ролевую гульню, прысвечаную групе бежанцаў, якія спрабуюць перабрацца ў іншую краіну. У ім разглядаюцца пытанні цяжкага становішча бежанцаў і сацыяльна-эканамічныя аргументы за і супраць забеспячэння прытулкам. | Права шукаць прытулак у іншых краінах. Права на невыдварэнне. Свабода ад дыскрымінацыі. |
| *Чахал супраць Вялікабрытаніі* | • Вайна і тэрарызм<br>• Мір і гвалт<br>• Дэмакратыя | Сімуляцыя (міні-суд) з мэтай вывучэння рэальнай справы, якая была разгледжана Еўрапейскім судом па правах чалавека. | Свабода ад катаванняў. Права на пошук прытулку. Права на справядлівы публічны судовы разбор. |
| Змяніце свае акуляры | • Беднасць<br>• Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці<br>• Міграцыя | Гэта вельмі простае практыкаванне для правядзення на вольным паветры, якое можна выкарыстаць як нефармальнае адукацыйнае практыкаванне. Удзельнікі могуць выйсці і даследаваць мясцовасць чужымі вачыма. | Усе правы чалавека. |
| Правы дзяцей | • Дзеці<br>• Агульныя правы чалавека<br>• Адукацыя | У гэтым практыкаванні выкарыстоўваецца метад рэйтынгу ў форме ромба, які дапамагае інфармаваць аб Канвенцыі аб правах дзіцяці і распачаць яе абмеркаванне. | Правы дзяцей (усе). Права свабодна выказваць меркаванне па ўсіх пытаннях, якія тычацца дзіцяці. Права на абарону ад эканамічнай эксплуатацыі. Права на адпачынак і вольны час і права карыстацца набыткамі сваёй культуры. |
| Розныя зарплаты | • Праца<br>• Гендарныя пытанні<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць | Гэта сімуляцыя сутыкае ўдзельнікаў з рэальным становішчам на рынку працы. Абмяркоўваюцца пытанні рознай аплаты аднолькавай працы, дыскрымінацыі на працоўным месцы і палітыка нізкай аплаты працы маладых працаўнікоў. | Права на свабодны выбар працы і ўступленне ў прафсаюзы. Права на справядлівую аплату працы і роўную аплату аднолькавай працы. Права не падвяргацца дыскрымінацыі на падставе ўзросту або полу. |

| Назва | Тэмы | Агляд | Звязаныя правы |
|---|---|---|---|
| Ці ёсць у нас альтэрнатывы? | • Мір і гвалт<br>• Дзеці<br>• Здароўе | Ролевая гульня, у якой разглядаюцца праблемы міжасабовага гвалту і цкавання. | Права на годнасць. Права на абарону ад усіх відаў фізічнага і псіхалагічнага гвалту. |
| Хатнія справы | • Гендарныя пытанні<br>• Мір і гвалт<br>• Здароўе | Удзельнікі абмяркоўваюць практычныя сітуацыі і аналізуюць прычыны ўзнікнення і спосабы прадухілення розных відаў хатняга гвалту. | Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. Свабода ад катаванняў і зневажальнага абыходжання. Права на роўнасць перад законам. |
| Доста! | • Гістарычная памяць<br>• Вайна і тэрарызм<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі распрацоўваюць і ажыццяўляюць праект дзеянняў у мэтах садзейнічання дасведчанасці пра ахвяр халакосту і пра генацыд цыганоў. | Права на абарону ад дыскрымінацыі. Права на жыццё. Культурныя правы. |
| Гульня «Намалюй слова» | • Агульныя правы чалавека | Гэта камандная гульня, удзельнікі якой павінны праявіць свае творчыя здольнасці і намаляваць слова, якое адносіцца да правоў чалавека. | Свабода перакананняў і выказвання меркавання. Свабода думкі. Роўнасць чалавечай годнасці і правоў. |
| Адукацыя для ўсіх? | • Адукацыя<br>• Дзеці<br>• Грамадзянскасць і ўдзел | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі шукаюць парныя карткі і задумваюцца над няроўнасцю адукацыйных магчымасцей ва ўсім свеце і аб дасягненні «адукацыі для ўсіх». | Права на адукацыю. Права на поўнае раскрыццё сваіх фізічных, інтэлектуальных, духоўных, этычных і сацыяльных магчымасцей. Права на роўнасць. |
| Выбірай! | • Дэмакратыя<br>• Грамадзянскасць і ўдзел<br>• Агульныя правы чалавека | Гэта практыкаванне пабудавана на дыскусіі, падчас якой абмяркоўваюцца правы і абавязкі ў дэмакратычным грамадстве і дэмакратычная форма дыскусіі. | Права на ўдзел у кіраванні і свабодных выбарах. Свабода перакананняў і выказвання меркавання. Свабода думкі. |
| Змагары за правы | • Агульныя правы чалавека<br>• СМІ<br>• Грамадзянскасць і ўдзел | У гэтым практыкаванні выкарыстоўваюцца інфармацыйныя карткі для таго, каб абудзіць цікавасць да герояў барацьбы за правы чалавека. | Свабода перакананняў і выказвання меркавання. Права на роўнасць перад законам і права на справядлівы суд. Свабода ад катаванняў і зневажальнага абыходжання |
| Пагуляем на пальцах | • Навакольнае асяроддзе<br>• Мір і гвалт<br>• Міграцыя | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой мадэліраванне конкурсу на самую лепшую маладзёжную экалагічную групу. Ці будуць яны сумленнымі або стануць падманваць? | Права на роўнасць перад законам. Права на жыццё і выжыванне. Права на міжнародны парадак, пры якім правы і свабоды могуць быць цалкам рэалізаваны. |
| Улада кветак | • Агульныя правы чалавека<br>• Рэлігія і вера<br>• Дзеці | Гэта практыкаванне творчага характару прысвечана абмеркаванню правоў чалавека ў цэлым: што яны сабой уяўляюць, для чаго яны патрэбны і як мы павінны іх абараняць. | Усе правы чалавека. |
| Першая паласа | • СМІ<br>• Глабалізацыя<br>• Навакольнае асяроддзе | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой сімуляцыю, у якой група журналістаў рыхтуе першую паласу газеты, якая вось-вось пойдзе ў друк. | Права на свабоду думкі, перакананняў і выказвання меркавання. Свабода ад умяшання ў асабістае жыццё, сям'ю, жыллё і перапіску. Права ўдзельнічаць у культурным жыцці супольнасці. |
| Гераіні і героі | • Гендарныя пытанні<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Грамадзянскасць і ўдзел | Гэта практыкаванне ўключае індывідуальную працу, працу ў агульнай і малых групах, мазгавы штурм і дыскусію аб гераінях і героях як сімвалах сацыялізацыі і культуры, аб укараненні гендарных стэрэатыпаў у нашай гісторыі, культуры і паўсядзённым жыцці. | Права на роўнасць. Свабода ад дыскрымінацыі. Свабода перакананняў і выказвання меркавання. |
| Колькі нам патрэбна? | • Вайна і тэрарызм<br>• Здароўе<br>• Адукацыя | Гэта практыкаванне ўключае ў сябе абмеркаванне і прыняцце рашэнняў. Працуючы ў малых групах, удзельнікі вырашаюць, як яны пераразмяркуюць глабальны ваенны бюджэт на фінансаванне васьмі Мэт развіцця тысячагоддзя. | Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. Права на развіццё. Права на дастатковы ўзровень жыцця.Права на ахову здароўя і адукацыю. |
| Я хачу працаваць | • Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці<br>• Праца<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць | У гэтым практыкаванні выкарыстоўваецца ролевая гульня для вывучэння пытанняў, звязаных з правам на працу для асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. | Права на працу. Права не падвяргацца дыскрымінацыі. Права на дастатковы ўзровень жыцця. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Хвіліначку | • Культура і спорт<br>• Глабалізацыя<br>• Агульныя правы чалавека | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі павінны хутка і вынаходліва гаварыць на працягу адной хвіліны аб адносінах паміж спортам і правамі чалавека. | Усе правы чалавека. |
| Моўны бар’ер | • Міграцыя<br>• Вайна і тэрарызм<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой мадэліраванне цяжкасцей, з якімі сутыкаюцца бежанцы падчас падачы заявы аб забеспячэнні прытулкам. У ім закранаюцца пытанні крушэння надзей і эмацыянальнага стану бежанцаў, пераадолення моўнага бар'ера і дыскрымінацыі падчас падачы заявы. | Права прасіць і атрымліваць прытулак. Права не падвяргацца дыскрымінацыі па прыкмеце этнічнай прыналежнасці або краіны паходжання. Права лічыцца невінаватым, пакуль віна не даказана. |
| Пачуць голас кожнага | • Адукацыя<br>• Грамадзянскасць і ўдзел<br>• Дзеці | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой дыскусію для малых груп і на агульным пасяджэнні на тэму таго, што такое адукацыя і наколькі яна адпавядае ці не адпавядае патрэбам людзей, а таксама на тэму ўдзелу ў працэсе прыняцця рашэнняў. | Права на адукацыю, уключаючы права на адукацыю ў галіне правоў чалавека. Свабода перакананняў і выказвання меркавання. Права на ўдзел у кіраванні сваёй краінай. |
| Пагаворым пра секс | • Гендарныя пытанні<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Здароўе | У гэтым практыкаванні ўжываецца метад «акварыума» для аналізу адносін грамадства да сексуальнасці, уключаючы гамафобію. | Права на роўнасць. Свабода ад дыскрымінацыі. Свабода выказвання меркавання і свабода аб'яднанняў. |
| Мака-кітабоі | • Культура і спорт<br>• Навакольнае асяроддзе<br>• Глабалізацыя | Гэта практыкаванне ўключае працу ў малых групах, ролевую гульню, дыскусію і дасягненне кансэнсусу па пытаннях устойлівага выкарыстання марскіх рэсурсаў і правоў карэнных народаў на вольнае вызначэнне свайго эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця. | Права ўдзельнічаць у культурным жыцці супольнасці. Права на харчаванне і доступ да прыродных рэсурсаў. Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. |
| Вузы супрацоўніцтва | • Грамадзянскасць і ўдзел<br>• Дэмакратыя<br>• Агульныя правы чалавека | Практыкаванне прадугледжвае абмеркаванне правоў і абавязкаў грамадзян, урада, НГА і СМІ ў дэмакратычным грамадстве. | Права на ўдзел у кіраванні краінай і ў свабодных выбарах. Свабодны доступ да інфармацыі і свабода выказвання меркавання. Кожны мае абавязкі перад супольнасцю. |
| Тэгі памяці | • Гістарычная памяць<br>• Вайна і тэрарызм<br>• Культура і спорт | Удзельнікі агульнымі намаганнямі ствараюць «воблака тэгаў», каб адлюстраваць свае думкі і пачуцці, якія абуджаюць у іх ваенныя мемарыялы. | Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. Права на ўдзел у культурным жыцці. Свабода думкі і сумлення. |
| Маё жыццё не шоу | • СМІ<br>• Мір і гвалт<br>• Адукацыя | Гэта практыкаванне накіравана на развіццё дасведчанасці аб злоўжываннях у сферы ІКТ у цэлым і аб кіберцкаванні ў прыватнасці. | Права на свабоду думкі, перакананняў і выказвання меркавання. Свабода ад умяшання ў асабістае жыццё, сям’ю, жыллё і перапіску. Свабода ад бесчалавечнага абыходжання або абыходжання, якое зневажае чалавечую годнасць. |
| На лесвіцы | • Грамадзянскасць і ўдзел<br>• Дэмакратыя<br>• Культура і спорт | Гэта практыкаванне ўключае ролевыя гульні і дыскусію. Маладыя людзі разважаюць пра сэнс удзелу моладзі ў грамадскім жыцці і абмяркоўваюць магчымасці больш актыўнага ўдзелу іх саміх у жыцці мясцовай супольнасці. | Права на ўдзел у кіраванні краінай і ў свабодных выбарах. Права на ўдзел у культурным жыцці. Свабода думкі і інфармацыі. |
| Варыянты нашай будучыні | • Дзеці<br>• Навакольнае асяроддзе<br>• Здароўе | Падчас выканання практыкавання ўдзельнікі малююць, абдумваюць і абмяркоўваюць свае надзеі і трывогі ў сувязі з будучыняй свайго пакалення. Сярод іншых падымаюцца наступныя пытанні: праблемы экалогіі, якія ўплываюць на будучыя пакаленні, мясцовае развіццё і патрэбы насельніцтва. | Права на свабодны доступ да інфармацыі і свабоду выказвання меркавання. Права быць пачутым па ўсіх пытаннях, што тычацца асноўных інтарэсаў дзіцяці. Права на дастатковы ўзровень жыцця. |
| Шлях у краіну Роўнасці | • Гендарныя пытанні<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Адукацыя | Гэта практыкаванне прадугледжвае працу ў малых групах, фантазію і навыкі малявання, якія дапамогуць разгледзець пытанні гендарнай роўнасці і дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын. | Свабода ад дыскрымінацыі па прыкмеце полу і гендару. Права на ўступленне ў шлюб і стварэнне сям’і. Права на роўнасць перад законам. |

| Назва | Тэмы | Агляд | Звязаныя правы |
|---|---|---|---|
| Гульні з відарысамі | • Агульныя правы чалавека | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі працуюць з візуальнымі вобразамі, якія адлюстроўваюць артыкулы Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (УДПЧ). | Усе правы чалавека. |
| Электрастанцыя | • Мір і гвалт<br>• Грамадзянскасць і ўдзел<br>• Агульныя правы чалавека | Удзельнікі праводзяць мазгавы штурм па гвалце, абмяркоўваючы вядомыя ім выпадкі яго праяўлення ў паўсядзённым жыцці, і потым шукаюць нестандарныя шляхі вырашэння гэтай праблемы. | Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. Свабода ад дыскрымінацыі. Свабода ад умяшання ў асабістае жыццё, сям’ю, жыллё і перапіску. |
| Адказ расізму | • Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Культура і спорт<br>• Мір і гвалт | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі ролевай гульні разыгрываюць сур'ёзны інцыдэнт для вывучэння праблем расізму і прадузятасці, у прыватнасці, супраць цыганоў, а таксама выпрацоўкі варыянтаў рэагавання на расізм у школе і іншых адукацыйных установах. | Роўнасць чалавечай годнасці і правоў. Свабода ад дыскрымінацыі. Свабода думкі, сумлення і перакананняў. |
| «Бінга» на тэму правоў | • Агульныя правы чалавека | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой простую віктарыну і варыяцыю гульні «Бінга», у якой удзельнікі дзеляцца сваімі ведамі аб правах чалавека і вопытам у гэтай галіне. | Любыя правы чалавека. |
| Барацьба за багацце і ўладу | • Беднасць<br>• Глабалізацыя<br>• Здароўе | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой мадэліраванне барацьбы за багацце і ўладу, дэманструе няроўнасць і несправядлівасць беднасці. | Роўнасць чалавечай годнасці і правоў. Права на дастатковы ўзровень жыцця. Права на здароўе, ежу і прытулак. |
| Убачыць свае магчымасці | • Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Дзеці | Практычнае практыкаванне, мэтай якога з’яўляецца выклікаць суперажыванне людзям з інваліднасцю. Сярод іншага закранае пытанні перашкод на шляху інтэграцыі такіх людзей у грамадства і ўспрымання правоў людзей з інваліднасцю як асноўных правоў чалавека. | Права не падвяргацца дыскрымінацыі. Роўнасць чалавечай годнасці і правоў. Права на сацыяльнае забеспячэнне. |
| Хутка састарэе | • Рэлігія і вера<br>• Глабалізацыя<br>• Адукацыя | У гэтым практыкаванні прапануецца абмеркаваць, як развіваюцца вераванні і перакананні, як яны набіраюць сілу і як і чаму змяняюцца з цягам часу. | Свабода думкі, сумлення і перакананняў. Свабода перакананняў і выказвання меркавання. Права свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці супольнасці. |
| Спорт для ўсіх | • Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці<br>• Культура і спорт<br>• Здароўе | Гэта практыкаванне патрабуе вялікіх выдаткаў энергіі. Удзельнікі выкарыстоўваюць сваю фантазію і творчыя задаткі для стварэння новых гульняў. | Права карыстацца сваім фізічным і псіхічным здароўем. Роўнасць чалавечай годнасці і правоў. Права на адпачынак і вольны час. |
| Зрабі крок наперад | • Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Беднасць<br>• Агульныя правы чалавека | Мы ўсе роўныя, але некаторыя раўнейшыя за іншых. У гэтым практыкаванні ўдзельнікі бяруць на сябе ролі і далей дзейнічаюць у залежнасці ад шанцаў і магчымасцей, якія ім выпадаюць у жыцці. | Права на роўнасць чалавечай годнасці і правоў. Права на адукацыю. Права на ўзровень жыцця, неабходны для падтрымання здароўя і дабрабыту. |
| Аповесць пра два гарады | • Грамадзянскасць і ўдзел<br>• Навакольнае асяроддзе<br>• Праца | Гэта настольная гульня, удзельнікі якой выбіраюць горад, у якім хацелі б жыць, і выгоды, якімі хацелі б карыстацца.<br>Сярод іншых закранаюцца наступныя пытанні: салідарнасць у грамадстве, сэнс выплаты падаткаў і каштоўнасць дэмакратыі на месцах. | Права на сацыяльнае забеспячэнне. Права мець уласнасць. Права на дастатковы ўзровень жыцця. |
| Тэрарызм | • Вайна і тэрарызм<br>• Мір і гвалт<br>• Глабалізацыя | Выкарыстоўваючы метад аналізу сітуацыі, удзельнікі абмяркоўваюць аспекты, якія робяць нейкі ўчынак тэрарыстычным актам, і выпрацоўваюць вызначэнне тэрарызму. | Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. Свабода ад катаванняў і зневажальнага абыходжання. Права на мір. |
| Кіданне камянёў | • Вайна і тэрарызм<br>• Мір і гвалт<br>• Дзеці | У гэтым практыкаванні ролевая гульня выкарыстоўваецца для вывучэння прычын, па якіх людзі здзяйсняюць акты гвалту. | Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. Права на прызнанне правасуб’ектнасці асобы. Права на роўную абарону з боку закону. |
| Храналогія правоў | • Агульныя правы чалавека<br>• Гістарычная памяць<br>• Рэлігія і вера | Удзельнікі калектыўнымі намаганнямі ствараюць храналогію падзей, якія сталі вехамі ў развіцці канцэпцыі правоў ад 2000 года да н. э. да цяперашняга часу, і робяць прагнозы на будучыню. | Права на адукацыю, уключаючы адукацыю ў галіне правоў чалавека. Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. Свабода рэлігіі і перакананняў. |

| Назва | Тэмы | Агляд | Звязаныя правы |
|---|---|---|---|
| Галасаваць ці не галасаваць? | • Дэмакратыя<br>• Грамадзянскасць і ўдзел<br>• Агульныя правы чалавека | У практыкаванні прапануецца правесці ў супольнасці апытанне грамадскай думкі з мэтай вывучэння праблем галасавання на выбарах і грамадзянскага ўдзелу. | Права на ўдзел у кіраванні краінай і ў свабодных выбарах. Свабода перакананняў і выказвання меркавання. Права на мірныя сходы і аб'яднанні. |
| Пасяджэнне прафсаюза | • Праца<br>• Дэмакратыя<br>• Грамадзянскасць і ўдзел | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой мадэліраванне перамоў аб памеры заработнай платы і ўмовах працы паміж працадаўцам і працаўнікамі з удзелам прадстаўнікоў прафсаюза. | Права на працу. Права на справядлівыя ўмовы працы. Права на стварэнне прафсаюзаў і ўступленне ў іх. Права на забастоўку. |
| Гвалт у маім жыцці | • Мір і гвалт<br>• Вайна і тэрарызм<br>• Здароўе | Падчас выканання гэтага практыкавання ўдзельнікі абмяркоўваюць свой асабісты вопыт, звязаны з міжасабовым гвалтам. | Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. Свабода думкі, сумлення і перакананняў. Свабода ад катаванняў і зняважальнага абыходжання. |
| Сетка жыцця | • Навакольнае асяроддзе<br>• Глабалізацыя<br>• Здароўе | Гэта практыкаванне прадугледжвае мазгавы штурм сувязей у глабальнай харчовай сетцы. Удзельнікі даследуюць узаемазалежнасць жывога і нежывога і ўздзеянне ўсіх відаў чалавечай дзейнасці на навакольнае асяроддзе. | Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. Права свабодна распараджацца сваімі прыроднымі багаццямі і рэсурсамі. Свабода рэлігіі і перакананняў. |
| Калі прыйдзе заўтра | • Мір і гвалт<br>• Глабалізацыя<br>• СМІ | У гэтым практыкаванні выкарыстоўваюцца інфармацыйныя даведкі і дыскусія для вывучэння пытанняў абароны грамадства ад злачынцаў, правоў чалавека ў дачыненні да злачынцаў і смяротнага пакарання. | Права на жыццё. Свабода ад катаванняў і зняважальнага абыходжання. Права на роўнасць чалавечай годнасці. |
| Дзе вы стаіце? | • Агульныя правы чалавека<br>• Грамадзянскасць і ўдзел<br>• Беднасць | У гэтым практыкаванні-дыскусіі ўдзельнікі літаральна «ўстаюць сцяной», адстойваючы сваё меркаванне аб грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных правах. | Усе правы чалавека. |
| Хто я такія? | • Гендар<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць<br>• Рэлігія і вера | Гэта практыкаванне ўключае работу ў дыскусійных групах, мазгавы штурм, маляванне і групавую дыскусію, прысвечаныя вывучэнню розных бакоў ідэнтычнасці. | Роўнасць чалавечай годнасці і правоў. Свабода ад дыскрымінацыі. Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. |
| Праца і дзеці | • Праца<br>• Гендар<br>• Дыскрымінацыя і нецярпімасць | Гэта ролевая гульня на тэму рэпрадуктыўных правоў і дыскрымінацыя жанчын на працоўным месцы. | Права выбіраць працу па жаданні і ўступаць у прафсаюзы. Права на ўступленне ў шлюб і стварэнне сям'і. Свабода ад дыскрымінацыі. |
| **Каляндар правоў чалавека** | • Усе правы чалавека | Каляндар уяўляе сабой спіс дзён, у якія людзі ва ўсім свеце адзначаюць правы чалавека, шануюць іх абаронцаў, успамінаюць тых, хто іх парушаў, а таксама выказваюць свае надзеі і радасць. Важныя даты ўключаюць міжнародныя дні, афіцыйна абвешчаныя ААН, сусветныя дні, якія прызнаюцца НГА, гадавіны гістарычных падзей. | Усе правы чалавека. |
| **Стартавыя практыкаванні** | • У дадатак да любога практыкавання «Компаса» | Апісаныя гульні і практыкаванні для пачаткоўцаў не толькі спрыяюць стварэнню ў групе пазітыўнай атмасферы, але і дапамагаюць весці навучанне правам чалавека ў займальнай форме. | Усе правы чалавека. |
| **Практыкаванні для ацэнкі навучання** | • У дадатак да любога практыкавання «Компаса» | Замацаванне з'яўляецца неад'емнай часткай цыкла эмпірычнага навучання, які ляжыць у аснове падыходу, які выкарыстоўваецца ў гэтым дапаможніку па адукацыі ў галіне правоў чалавека. Прапанаваныя ніжэй практыкаванні ўяўляюць сабой лёгкія і цікавыя метады дапамагчы людзям вучыцца на ўласным вопыце. Іх можна выкарыстоўваць пасля правядзення аднаго з практыкаванняў «Компаса», але яны не павінны замяняць сабой падрабязны аналіз і ацэнку. | Права на адукацыю ў галіне правоў чалавека. Права на адукацыю. Права на ўдзел. |

COMPASS

Міграцыя

Вайна і тэрарызм

Навакольнае асяроддзе

Узровень 2

Любы памер групы

30 хвілін

# Тры рэчы

*«Жыццё – гэта выбар.*
*Але каб выбар быў правільны, вам трэба ведаць, хто вы і дзе вы знаходзіцеся, куды хочаце ісці і чаму хочаце туды патрапіць».*

*Кофі Анан*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • міграцыя,<br>• вайна і тэрарызм,<br>• навакольнае асяроддзе. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | любы (малыя гупы: 5–6 чалавек) |
| **Час** | 30 хвілін |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні выкарыстоўваюцца метады дыскусій і ранжыравання ў форме ромба, каб дапамагчы людзям зразумець, што значыць раптам пакінуць свой дом. |
| **Звязаныя правы** | • права на прытулак у іншых краінах ад праследавання;<br>• свабода рэлігіі і перакананняў;<br>• свабода думкі і інфармацыі. |
| **Мэты** | • развіць разуменне таго, што значыць быць вымушаным пакінуць свой дом;<br>• развіць уменне прымаць рашэнні і навыкі дасягнення кансэнсусу;<br>• садзейнічаць выхаванню пачуцця суперажывання і салідарнасці з бежанцамі. |
| **Матэрыялы** | • стыкеры або невялікія лісты паперы (прыкладна 8 * 8 см), па 3 на кожнага ўдзельніка;<br>• ручка або аловак, па адным на кожнага ўдзельніка. |

## Інструкцыі

1. Пазнаёмце з тэмай міграцыі, выкарыстоўваючы метад мазгавога штурму для абмеркавання прычын, па якіх людзі пераязджаюць жыць у іншае месца.
2. Скажыце ўдзельнікам, што падчас практыкавання трэба ўявіць сабе, што яны вымушаны пакінуць свае дамы. Растлумачце сутнасць мазгавога штурму і пералічыце «фактары-штуршкі», якія прымушаюць людзей бегчы, напрыклад войны, стыхійныя бедствы, праследаванне або тэрарызм. Потым папрасіце групу адгадаць, колькі перамешчаных асоб налічваецца сёння ў свеце.
3. Папрасіце ўсіх падзяліцца на малыя групы і раздайце маленькія аркушы паперы і алоўкі.
4. Папрасіце ўсіх уявіць сабе, што яны павінны раптам пакінуць свае дамы па нейкай прычыне і што яны могуць узяць з сабой толькі тры рэчы. Якія тры рэчы яны возьмуць? Назву кожнай рэчы трэба напісаць на асобным аркушы паперы.
5. Папрасіце кожнага па чарзе расказаць пра свой выбар і растлумачыць прычыны такога рашэння.
6. Папрасіце ўдзельнікаў разам абмеркаваць розныя варыянты і прычыны, паспрабаваць прыйсці да кансэнсусу і вызначыць прыярытэты з дапамогай метаду ранжыравання ў форме ромба (гл. старонку 65).
7. Нарэшце, папрасіце кожную з малых груп па чарзе паказаць вынікі сваёй працы.

COMPASS

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**18 снежня**
Міжнародны дзень мігранта

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з аналізу рэйтынгу рэчаў па версіі кожнай з груп, а затым перайдзіце да абмеркавання таго, што новага даведаліся ўдзельнікі і якое дачыненне гэтыя веды маюць да правоў чалавека.

- Ці былі нейкія незвычайныя рэчы, якія ўдзельнікі хацелі ўзяць з сабой?
- Ці лёгка было ранжыраваць рэчы? Якога роду рознагалоссе назіралася ў групах з гэтай нагоды?
- Наколькі падобныя або розныя былі рэйтынгі розных груп?
- Наколькі практычным быў іх выбар? Ці думалі яны ў асноўным аб фізічным выжыванні або таксама аб сваіх эмацыянальных або духоўных патрэбах?
- Цяжка было б ім, калі б яны сапраўды былі вымушаны бегчы?
- Чаго людзям больш за ўсё не хапала б, калі б яны былі вымушаны бегчы?
- Ці знаёмы яны з кім-небудзь, хто пакінуў свой дом?
- Наколькі рэалістычным з'яўляецца практыкаванне? Ці заўсёды чалавек мае магчымасць выбраць, што ўзяць з сабой?
- А што можна сказаць пра дзяцей і маладых людзей? Ці вялікая верагоднасць таго, што бацькі прымуць да ўвагі іх канкрэтныя патрэбы, калі будуць пакаваць рэчы?
- Што мы можам зрабіць, каб прыцягнуць увагу да патрэб бежанцаў у нашай супольнасці (ці ва ўсім свеце)?
- Якія правы чалавека абараняюць канкрэтна бежанцаў?

## Парады для фасілітатара

Пры знаёмстве з практыкаваннем папрасіце ўдзельнікаў задумацца аб міграцыі ў агульным плане. Прыкладам прычын, па якіх людзі пераязджаюць, могуць быць вучоба ці праца, тое, што міграцыя – іх лад жыцця, а таксама паводка, землятрус або засуха, вайна і палітычнае праследаванне. У канцы мазгавога штурму аб'яднайце розныя прычыны перамяшчэння ў два розныя спісы ў залежнасці ад таго, «выштурхваюць» яны людзей (вайна або праследаванне ў роднай краіне) або «выцягваюць» іх (лепшыя магчымасці для працы і вучобы ў іншай краіне).

На 4 кроку вам неабходна будзе распрацаваць сцэнарый такім чынам, каб удзельнікі працавалі ў рамках адной сітуацыі. Выберыце найбольш прыдатную і цікавую сітуацыю для вашай групы. Сітуацыя «вайна» можа аказацца складанай, калі ніхто не меў непасрэднага вопыту ўдзелу ў ёй, а вось сцэнарый на тэму тэракту можа быць больш рэалістычным. Паспрабуйце стварыць сцэнарый, які быў бы праўдападобным. Калі ў якасці магчымай прычыны вы выбралі «паводка», тады, калі ваш горад знаходзіцца ў даліне, мае сэнс сказаць, што ўзровень вады ў рацэ падымаецца, патокі вады пагражаюць знесці масты, і вада хутка затопіць усё наваколле. З іншага боку, калі вы жывяце ва ўзгорыстай або гарыстай мясцовасці, то небяспека можа ўзнікнуць з-за праліўных дажджоў, у выніку якіх апоўзні і селевыя патокі зальюць горад. Магчыма, трэба будзе ўдакладніць, што ўдзельнікі павінны ўявіць сабе, што яны бягуць са сваіх дамоў, што не змогуць вярнуцца і што іх чакае доўгая дарога, магчыма, у адзін канец.

**Па даных УВКБ ААН, на канец 2010 года налічвалася:**
**- 10,55 мільёна бежанцаў**
**- 14,7 мільёна ўнутрана перамешчаных асоб і**
**3,5 мільёна людзей без грамадзянства.**

Выбраныя ўдзельнікамі рэчы і іх практычная каштоўнасць будуць залежаць ад сталасці ўдзельнікаў. Выбар узятых рэчаў таксама будзе залежаць ад многіх іншых фактараў, напрыклад ад надвор'я, пары года і ад прычын, па якіх людзі пакідаюць дамы. Напрыклад, калі здарыцца паводка, а людзі не ўмеюць плаваць, яны могуць узяць што-небудзь, што выкарыстаюць у якасці плыта. Важна падкрэсліць, што не існуе правільных ці няправільных варыянтаў, калі справа даходзіць да асабістага выбару і пераваг, хоць могуць быць варыянты, якія на справе акажуцца больш разумнымі і практычнымі, чым астатнія.

**Заўвага.**
Існуюць пэўныя адрозненні ў вызначэнні тэрмінаў «бежанец», «УПА», «шукальнік прытулку» і «працаўнік-мігрант», якія апісваюцца ў даведачнай інфармацыі аб міграцыі ў главе 5 на сайце www.coe.int/compass

Калі людзей, якія шукалі прытулак ад вайны і праследавання ў Даніі, спыталі, што яны ўзялі з сабой, усе сказалі, што ў першую чаргу яны бралі грошы. Пашпарт або пасведчанне асобы таксама важны, але, па іх словах, «у выпадку неабходнасці заўсёды можна купіць фальшывыя дакументы». Тое ж самае тычыцца цёплай вопраткі і ежы: калі вы пры грашах, то рэчы заўсёды можна купіць. Для некаторых адным з прыярытэтаў была Біблія як важны сродак падтрымання іх духоўных патрэб.

Падчас працы над практыкаваннем прапануецца выкарыстоўваць ранжыраванне ў форме ромба і стыкеры па дзвюх прычынах: па-першае, адназначны выбар у такіх абставінах – цяжкі і ненатуральны, і па-другое, ранжыраванне ў форме ромба больш канкрэтнае, а стыкеры (і меркаванні) можна лёгка перагрупаваць у ходзе дыскусіі.

## Варыянты

Гэты метад можна выкарыстаць для вывучэння адносін людзей да розных аспектаў любой тэмы, напрыклад:

- Дзеці: назавіце 3 самыя важныя прыкметы шчаслівага дзяцінства.
- Грамадзянскасць і ўдзел: якія 3 самыя важныя якасці патрэбны чалавеку для жыцця ў мультыкультурным грамадстве?
- Культура і спорт: назавіце 3 самыя важныя для вас аспекты вашай культуры?
- Дэмакратыя: назавіце 3 самыя важныя рэчы, якія патрэбны краіне для паспяховага функцыянавання дэмакратыі.
- Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці: перамяшчэнне прадстаўляе найбольшую цяжкасць для людзей з інваліднасцю. Назавіце 3 найбольш эфектыўныя паляпшэнні, якія можна ажыццявіць у горадзе, у якім мы жывём, напрыклад, для невідушчых людзей?
- Дыскрымінацыя і нецярпімасць: вы збіраецеся ў доўгае падарожжа цягніком і павінны будзеце ехаць у адным вагоне з людзьмі з розных краін. Абярыце 3 нацыянальнасці, з прадстаўнікамі якіх вам хацелася б ехаць разам. (Вы можаце пашырыць практыкаванне, дадаўшы 3 нацыянальнасці, з прадстаўнікамі якіх вы менш за ўсё хацелі б дзяліць вагон або купэ.)
- Адукацыя: з пункту гледжання садзейнічання камунікацыі і паразуменню паміж народамі, якія 3 мовы павінны вывучаць дзеці ўсёй Зямлі ў якасці сусветных?
- Навакольнае асяроддзе: якія 3 віды пад пагрозай вымірання павінны стаць мэтай наступнай кампаніі Сусветнага фонду дзікай прыроды?
- Гендарная роўнасць: назавіце 3 галоўныя прычыны, чаму гендарная дыскрымінацыя ўсё яшчэ існуе.
- Глабалізацыя: якія 3 Мэты развіцця тысячагоддзя з'яўляюцца для вас найбольш важнымі?
- Здароўе: тытунь, какаін, алкаголь, гашыш, эфедрын або Віягра? Пра якія 3 наркотыкі маладым людзям у вашай краіне больш за ўсё патрэбна дадатковая інфармацыя?
- СМІ: якія 3 інавацыі ў сродках масавай інфармацыі за апошнія 10 гадоў унеслі найбольшы ўклад у прасоўванне правоў чалавека?
- Міграцыя: калі б вам давялося пакінуць вашу краіну, у якіх 3 краінах вы б хацелі жыць?
- Мір і гвалт: назавіце 3 самыя вялікія пагрозы глабальнаму міру.
- Беднасць: якія 3 крокі (дзеянні) будуць найбольш паспяховымі для ліквідацыі беднасці?
- Рэлігіі і перакананні: назавіце 3 самыя эфектыўныя меры барацьбы з распаўсюджваннем фундаменталізму.
- Гістарычная памяць: падумайце пра помнік у вашым горадзе, які быў створаны ў гонар нацыянальнай гістарычнай падзеі. Прапануйце 3 спосабы публічна ўшанаваць гэту падзею, каб дакументы і інфармацыя пра яе вывучаліся без скажэнняў і злоўжыванняў.
- Вайна і тэрарызм: у цяперашні час існуе міжнароднае пагадненне аб забароне проціпяхотных мін; якія 3 віды зброі трэба забараніць следам?
- Праца: якія 3 парушэнні права на дастойную працу турбуюць вас больш за ўсё?

## Прапановы па далейшай працы

Калі група захоча даследаваць, што значыць пакінуць дом і спрабаваць знайсці прытулак, то можна выканаць практыкаванне «Можна ўвайсці?» на старонцы 115 або «Моўны бар'ер» на старонцы 203.

Падзеі мінулага абуджаюць усякага роду ўспаміны; калі група захоча паразважаць пра тое, якія ўспаміны абуджаюць ваенныя мемарыялы, то можна выкарыстаць практыкаванне «Тэгі памяці» на старонцы 227.

## Ідэі для дзеяння

Спытайце ў членаў вашай сям'і, сяброў або калег, якія тры рэчы яны ўзялі б з сабой, і распачніце дыскусію аб правах чалавека і бежанцаў.

Знайдзіце мясцовую арганізацыю, якая працуе з шукальнікамі прытулку і бежанцамі, і даведайцеся, як вы можаце ёй дапамагчы.

# Мячэць у Сліпівілі

*«Той, хто не адстойвае ўласныя перакананні, будзе скакаць пад чужую дудку».*

*Малкальм Ікс*

**Тэмы**
- рэлігія і вера,
- дыскрымінацыя,
- грамадзянскасць і ўдзел.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** 15–30 чалавек

**Час** 2–2,5 гадзіны

**Агляд** Гэта практыкаванне нацэлена на даследаванне рознагалосся ў сувязі з будаўніцтвам новай мячэці ў раёне з традыцыйна хрысціянскім насельніцтвам з дапамогай інсцэніроўкі пасяджэння муніцыпальнага савета.

**Звязаныя правы**
- свабода ад дыскрымінацыі;
- свабода рэлігіі і перакананняў;
- свабода думкі і інфармацыі.

**Мэты**
- перажыць вопыт рэальнага канфлікту, які можа ўзнікнуць падчас задавальнення запытаў разнастайных груп насельніцтва;
- вывучыць права на свабоду рэлігіі і перакананняў;
- развіць навыкі вядзення дэбатаў і аналізу.

**Матэрыялы**
- папера для картак з імёнамі;
- папера для фліпчарта;
- гадзіннік або секундамер;
- невялікі званочак для мэра.

**Падрыхтоўка**
- падрыхтуйце фотакопіі ролевых картак на старонцы 85, апісанне праблемы і правілы правядзення дэбатаў (па жаданні);
- падрыхтуйце карткі з імёнамі для розных партый (груп), якія будуць прысутнічаць на пасяджэнні;
- адлюструйце розныя ролі на фліпчарце, каб усім было бачна;
- пераканайцеся, што ў вас дастаткова месца для «пасяджэння савета» і ёсць асобныя месцы для розных груп, дзе яны змогуць абмеркаваць сваю пазіцыю загадзя або праводзіць сустрэчы.

Рэлігія і вера

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Грамадзянскасць і ўдзел

Узровень 2

15–30

2–2,5 гадзіны

## Інструкцыі

1. Прачытайце ўслых апісанне праблемы ў раздатачным матэрыяле на старонцы 85. Растлумачце, што ўсе ўдзельнікі – жыхары Сліпівіля і што ўсіх турбуе праблема будаўніцтва мячэці на закінутым участку зямлі, які належыць муніцыпалітэту.
2. Пакажыце ўдзельнікам спіс розных роляў і папрасіце выбраць сабе адну з іх. Раздайце ролевыя карткі і апісанне праблемы, пакажыце, дзе групы могуць сустрэцца для абмеркавання і дзе будзе пазней праходзіць «пасяджэнне савета».
3. Растлумачце правілы вядзення дэбатаў, якія будуць дзейнічаць падчас пасяджэння. Яны прыводзяцца на старонцы 85.
4. Растлумачце, што да пасяджэння ва ўсіх будзе 30 хвілін для сустрэчы з іншымі грамадзянамі, падрыхтоўкі выступлення і прыняцця рашэння аб галасаванні. Раскажыце, што пасяджэнне гарадскога савета будзе працягвацца 40 хвілін і што з-за вялікай колькасці ўдзельнікаў час на выступленне кожнага вельмі абмежаваны. Па гэтай прычыне ўсе павінны падрыхтаваць адзін-два пункты, якія яны хочуць асабліва падкрэсліць.

5. Падчас фазы падрыхтоўкі паклапаціцеся пра месца правядзення «пасяджэння савета». Пажадана, каб усе сядзелі паўколам або ў форме падковы, а мэр – наперадзе на некаторым узвышшы. Партыі або групы павінны мець магчымасць сесці разам, на сталах перад імі вам трэба размясціць карткі з імёнамі.
6. Па заканчэнні адведзенай паўгадзіны абвясціце пачатак пасяджэння (або папрасіце мэра зрабіць гэта). Ён павінен нагадаць удзельнікам асноўныя правілы правядзення дэбатаў і сказаць уступнае слова.
7. Пасля заканчэння пасяджэння, праз 40 хвілін, мэр павінен заклікаць удзельнікаў да галасавання. Калі галасы будуць падлічаны і аб'яўлены вынік, вы абвесціце заканчэнне практыкавання і папросіце ўдзельнікаў сесці кругам для аналізу.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце падвядзенне вынікаў, павітаўшы ўсіх удзельнікаў па іх сапраўдным імені або выкарыстаўшы іншы метад, які дапаможа ім выйсці з настрою, у якім яны былі падчас мадэліравання. Гэта трэба зрабіць перад пачаткам аналізу.

Спытайце ўдзельнікаў, што яны думаюць пра працэс, які толькі што завяршыўся:

- Ці здзівілі вас вынікі галасавання і ці адлюстравалі яны пазіцыю чалавека, якога вы ігралі?
- У якой ступені, на вашу думку, вы здолелі аказаць уплыў (у вашай ролі) на вынік?
- Ці змяніўся ваш падыход або стаўленне да праблемы пасля абмеркавання з іншымі ўдзельнікамі або групамі?
- Наколькі проста ці няпроста вам было атаясамліваць сябе з роллю? Чаму?
- На вашу думку, ці можа такая сітуацыя здарыцца ў рэальным жыцці? Ці можаце вы прывесці прыклады?
- Як бы вы адрэагавалі, калі б падобны выпадак адбыўся ў вашым горадзе (раёне)? Ці змяніла гэта гульня ў нейкай ступені ваша стаўленне?
- Што вы разумееце пад правам свабоды думкі, сумлення і рэлігіі? Ці ведаеце вы якія-небудзь прыклады з гісторыі (або сучаснасці), калі ў такіх правах адмаўлялі?
- Чаму вы лічыце, што свабода рэлігіі павінна быць адным з асноўных правоў чалавека?
- У якой ступені, на ваш погляд, гэта права выконваецца ў вашай супольнасці?

## Парады для фасілітатараў

Калі ёсць магчымасць, лепш праводзіць гэту гульню разам з яшчэ адным фасілітатарам, каб была магчымасць адначасова адказваць на пытанні і каардынаваць кожны этап выканання практыкавання.

Практыкаванне можа быць больш плённым, калі ў распараджэнні маецца больш часу, асабліва для самога пасяджэння, каб ва ўдзельнікаў была магчымасць адрэагаваць на каментарыі іншых. Таксама можна размеркаваць ролі загадзя або ў выпадковым парадку, каб сэканоміць час занятку.

Падчас фазы падрыхтоўкі варта правяраць, што ўдзельнікі сустракаюцца з іншымі ўдзельнікамі і плануюць, што яны збіраюцца сказаць падчас пасяджэння.

Пры размеркаванні роляў не забывайце, што роля мэра з'яўляецца вельмі няпростай і што чалавек, які будзе яе выконваць, павінен быць упэўнены ў сваіх сілах. Ён павінен умець весці пасяджэнне і пры неабходнасці ўмець спыніць выступоўцаў, каб даць магчымасць выказацца ўсім. Вы павінны абмеркаваць гэту задачу з удзельнікам, які будзе выконваць ролю мэра, да пачатку практыкавання.

Пажадана, каб пасля гэтага вы пакінулі ўсю фасілітацыю пасяджэння на ўдзельніка, які іграе мэра, каб ён адчуваў, што яму давяраюць, і каб іншыя ўдзельнікі паважалі яго рашэнні, а не глядзелі ўвесь час на вас. Зразумела, калі ўзнікнуць цяжкасці, вы можаце ўмяшацца, аднак зрабіць гэта трэба так, каб не падарваць аўтарытэт «мэра».

Калі мадэліраванне выйдзе з-пад кантролю, напрыклад таму, што ўдзельнікі адыдуць ад тэмы або пачнуць абмяркоўваць новую інфармацыю, або калі савет зойдзе ў тупік і не зможа прыйсці да кансэнсусу, звярніце ўвагу ўдзельнікаў на тое, што менавіта так можа здарыцца і ў рэальным жыцці, і гэта не значыць, што практыкаванне не атрымалася. Вы можаце абмеркаваць гэту тэму ў канцы аналізу, каб абмеркаваць цяжкасці, з якімі даводзіцца сутыкацца ў рэальным жыцці пры вырашэнні такіх складаных пытанняў, як гэта.

Падчас аналізу важна пазбегнуць паўтораў мадэліравання. Удзельнікам неабходна абстрагавацца ад ролі, якую яны ігралі, каб аб'ектыўна разважаць пра тое, што адбылося. Вы павінны дапамагчы ім паглядзець на сітуацыю з іх пункту гледжання, а не з пункту гледжання персанажаў, якіх яны ігралі.

Каб падрыхтаваць правядзенне аналізу і ацэнкі, вы можаце прачытаць даведачную інфармацыю пра рэлігію і перакананні, якую можна знайсці на старонцы 562.

## Варыянты

У залежнасці ад кантэксту, у якім вы працуеце, магчыма, будзе больш прыдатным правесці практыкаванне па тэме «Царква ў Сліпівілі» або «Храм у Сліпівілі» і размясціць іх, напрыклад, у пераважна мусульманскім раёне. Ці вы можаце выбраць нейкую іншую камбінацыю.

Вы можаце ўключыць у практыкаванне журналістаў, якія будуць асвятляць працэс і дапамогуць атрымаць незалежны пункт гледжання, але гэта падоўжыць выкананне практыкавання, асабліва калі вы збіраецеся абмеркаваць рэпартажы з групай (глядзіце прапановы ніжэй).

## Прапановы па далейшай працы

Абмяркуйце аспекты свабоды рэлігіі і перакананняў, а таксама спрэчкі, якія ўзнікалі ў вашай краіне. Рэальныя інцыдэнты (гісторыі, апісаныя ў навінах), якія маюць дачыненне да пытання, могуць паслужыць добрым зыходным пунктам, асабліва для абмеркавання ў невялікіх групах. Вы можаце развіць дыскусію, больш падрабязна вывучыўшы погляды ўдзельнікаў на рэлігію і яе ўплыў на жыццё моладзі пры дапамозе практыкавання «Вернікі» на старонцы 105.

Калі ў пасяджэнні ўдзельнічаюць журналісты, вы можаце выкарыстаць выкананы імі аналіз падзей падчас асобнага занятку. Асабліва будзе карысна разгледзець адрозненні паміж рэпартажамі, каб абмеркаваць ролю і ўплыў СМІ. Практыкаванне «Першая паласа» на старонцы 181 даследуе механізм фарміравання і змены меркаванняў, асабліва ў СМІ.

Можна сканцэнтравацца на развіцці навыкаў дэбатаў, аналізу ці перакanання, узяўшы за аснову спрэчныя або супрацьлеглыя сцверджанні, якія ўзніклы падчас аналізу, і правёўшы практыкаванне «Выбірай!» на старонцы 164.

## Ідэі для дзеяння

Папрасіце ўдзельнікаў паглядзець на сваё ўласнае асяроддзе і паспрабаваць ацаніць, у якой ступені выконваюцца правы розных рэлігійных супольнасцей. Паспрабуйце арганізаваць сустрэчы з прадстаўнікамі некаторых з гэтых супольнасцей і выслухаць, як яны бачаць сітуацыю з захаваннем сваіх правоў.

У залежнасці ад кантэксту, у якім вы і ўдзельнікі жывяце і працуеце, а таксама ад актуальных пытанняў, якія абмяркоўвае гарадскі савет, можа быць цікава наведаць яго пасяджэнне і прыняць удзел у мясцовых палітычных дыскусіях, якія закранаюць правы чалавека на мясцовым узроўні.

## Дадатковая інфармацыя

Права на свабоду рэлігіі ў міжнародных стандартах у галіне правоў чалавека: магчыма, вы захочаце скапіраваць прыведзеную ніжэй інфармацыю для прадстаўнікоў Мусульманскай асацыяцыі Сліпівіля і групы «Маладыя сліпівільцы за правы чалавека!».

ВАЖНАЯ ДАТА

**21 верасня**
Міжнародны дзень міру

*Еўрапейская канвенцыя аб правах чалавека, артыкул 9:*

1 Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэта права ўключае свабоду мяняць сваю рэлігію або перакананні і свабоду вызнаваць сваю рэлігію або перакананні як аднаасобна, так і разам з іншымі ў публічным або прыватным парадку падчас богаслужэння, навучання і выканання рэлігійных і рытуальных абрадаў.

2 У адносінах да свабоды вызнаваць сваю рэлігію або перакананні дзейнічаюць толькі такія абмежаванні, якія ўстаноўлены законам і з'яўляюцца неабходнымі ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах грамадскай бяспекі, аховы грамадскага парадку, здароўя або маралі ці абароны правоў і свабод іншых асоб.

*Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, артыкул 18:*

Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэта права ўключае свабоду мяняць сваю рэлігію або перакананні і свабоду вызнаваць сваю рэлігію або перакананні як аднаасобна, так і разам з іншымі ў публічным або прыватным парадку падчас навучання, богаслужэння і выканання рэлігійных і рытуальных абрадаў.

*Канвенцыя аб правах дзіцяці, артыкул 30:*

У тых дзяржавах, дзе існуюць этнічныя, рэлігійныя або моўныя меншасці ці асобы з ліку карэннага насельніцтва, дзіцяці, што належыць да такіх меншасцей або карэннага насельніцтва, не можа быць адмоўлена ў праве сумесна з іншымі членамі сваёй групы карыстацца сваёй культурай, вызнаваць сваю рэлігію і выконваць яе абрады, а таксама карыстацца роднай мовай.

Гэта практыкаванне было распрацавана на аснове практыкавання «Мячэць у Сліпівілі» з кнігі «**Кампаньён**» – дапаможніка для кампаніі па навучанні і адукацыі для пераўтварэнняў у галіне разнастайнасці, правоў чалавека і ўдзелу, апублікаванага Саветам Еўропы. Ідэя практыкавання: Сусана Ульрых. 2000. *Achtung (+) Toleranz – Wege demokratischer Konfliktlösung*. Verlag Bertelsmann Stiftung

Нягледзячы на тое, што гэта практыкаванне прадугледжвае мадэліраванне выдуманай сітуацыі, у Еўропе і за яе межамі існуе мноства падобных спрэчак, якія тычацца будаўніцтва месцаў адпраўлення культу для рэлігійных меншасцей. У лістападзе 2009 года па выніках нацыянальнага рэферэндуму была ўхвалена канстытуцыйная папраўка, якая забараняе будаўніцтва новых мінарэтаў у Швейцарыі. Такі вынік рэферэндуму патэнцыяльна парушае права мусульман адкрыта практыкаваць сваю рэлігію шляхам пакланення, навучання, выканання абрадаў, якое з'яўляецца неад'емнай часткай права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі. Да таго ж такая тэндэнцыя набірае моц у шэрагу еўрапейскіх і іншых краін, дзе нядаўна былі прыняты законы ці зараз разглядаюцца законапраекты аб забароне нашэння ісламскіх галаўных убораў (ці то паранджа, нікаб або хіджаб) у публічных месцах, што таксама стварае аснову для дыскрымінацыі па прыкмеце рэлігійнай прыналежнасці. «Артыкул 19», праваабарончая арганізацыя, мэтай якой з'яўляецца абарона права на свабоду выказвання меркавання па ўсім свеце, апублікавала прававы каментарый адносна забароны нашэння ўбораў, якія закрываюць увесь твар (www.article19.org). Магчыма, вас зацікавяць праблемы, з якімі ў цяперашні час сутыкаюцца іншыя рэлігійныя меншасці ў Еўропе.

## Спіс удзельнікаў

Паспрабуйце сфарміраваць збалансаваныя групы з аднолькавай колькасцю прадстаўнікоў кожнай палітычнай партыі і кожнай грамадзянскай групы. Колькасць «звычайных грамадзян» можа быць любой.

- мэр Сліпівіля;
- члены гарадскога савета: у ім павінны быць прадстаўлены 3 партыі, у кожнай з іх можа быць па 1 ці 2 удзельнікі;
- «Маладыя сліпівільцы за правы чалавека!»: 1 або 2 прадстаўнікі;
- аб'яднанне «Мінулае і сучаснасць»: 1 або 2 прадстаўнікі;
- «Мусульманская асацыяцыя Сліпівіля»: 1 або 2 прадстаўнікі;
- звычайныя грамадзяне: столькі, колькі неабходна;
- па жаданні: 1 ці 2 журналісты, якія вядуць рэпартаж аб пасяджэнні.

### Правілы правядзення дэбатаў

Вы можаце змяніць гэтыя правілы ў залежнасці ад памеру групы і часу, які ў вас ёсць.

- пасяджэнне будзе ўзначальваць мэр, і яго рашэнне па ўсіх пытаннях будзе канчатковым;
- калі вы хочаце выступіць, вы павінны падняць руку і атрымаць дазвол ад мэра;
- каментарыі павінны быць кароткімі, не даўжэй за 2 хвіліны;
- пасяджэнне закончыцца праз 40 хвілін галасаваннем наконт таго, ці трэба будаваць мячэць;
- усе, хто прысутнічаюць на пасяджэнні, маюць права ўдзельнічаць у дэбатах і галасаванні.

## Ролевыя карткі

## Раздатачны матэрыял

### Мячэць у Сліпівілі (для ўсіх удзельнікаў)

Вы жывяце ў маляўнічым горадзе Сліпівілі з насельніцтвам каля 80 000 чалавек. За апошнія 60 гадоў склад насельніцтва радыкальна змяніўся, часткова таму, што маладыя людзі спрабуюць пераехаць у вялікія гарады, бо там больш магчымасцей працаўладкавання, але таксама і таму, што ў рэгіён прыбыла вялікая колькасць іміgranцкіх сямей, многія з іх – з мусульманскіх краін. Некаторыя з гэтых сямей жывуць у горадзе ўжо ў трэцім пакаленні, але ўсё роўна многія ставяцца да іх з падазрэннем, як да прыезджых. Яны складаюць амаль 15 % ад агульнай колькасці насельніцтва.

Мусульмане ў Сліпівілі хочуць пабудаваць мячэць на закінутым участку зямлі, які належыць муніцыпалітэту, што выклікае актыўнае супрацьстаянне ў горадзе. Гэтая зямля была занядбана і з'яўлялася крыніцай скаргаў у гарадскі савет многія гады, таму што яна знаходзіцца каля асноўнай гандлёвай вуліцы, і доўгі час там квітнелі вандалізм і наркотыкі. Таму калі багаты бізнесмен прапанаваў муніцыпалітэту дапамогу, каб пазбавіцца ад набалелай праблемы, мэр падумаў, што яму вельмі пашанцавала. Савет з гатоўнасцю пагадзіўся аддаць зямлю пад будаўніцтва новай мячэці і фінансаваць 20 % яго кошту. Астатнія 10 % выдаткаў на будаўніцтва, якія бізнесмен не мог пакрыць, павінна была сабраць мусульманская супольнасць. Будаўніцтва павінна было пачацца на гэтым тыдні, але раззлаваныя жыхары, якія выступаюць супраць праекта, закідалі савет скаргамі. Гарадскі савет арганізаваў спецыяльнае пасяджэнне, на якое запрасілі ўсіх, каб знайсці рашэнне праблемы. Пасяджэнне адбудзецца праз паўгадзіны і будзе асвятляцца СМІ.

### Ролевая картка: мэр Сліпівіля

Вы з'яўляецеся старшынёй пасяджэння, і ў вашы абавязкі ўваходзіць як прывітанне ўдзельнікаў напачатку пасяджэння, так і абвяшчэнне правілаў правядзення дэбатаў. Падчас пасяджэння вы павінны даць кожнаму магчымасць выказацца і сачыць за тым, каб гэта не зацягвалася надоўга. Вас вельмі непакоіць негатыўная афарбоўка, якую атрымаў гэты праект, і вы плануеце да пачатку пасяджэння паспрабаваць пагаварыць з некаторымі прадстаўнікамі груп, каб пераканаць іх змякчыць сваю пазіцыю.

### Ролевая картка: член гарадскога савета (традыцыяналісцкая партыя, 1–2 удзельнікі)

Вы прадстаўляеце ў гарадскім савеце традыцыяналісцкую партыю і рашуча выступаеце супраць мячэці. Вы лічыце няправільным, што гарадская зямля і рэсурсы савета павінны быць выкарыстаны на будаўніцтва мячэці, якая не адлюстроўвае традыцыі гэтай краіны і гэтага горада. Вы лічыце, што сем'ям іміграntаў ужо досыць пашанцавала, што ім дазволена жыць у гэтым горадзе, і што яны не павінны навязваць іншы стыль жыцця жыхарам краіны, у якой яны госці. Вы таксама заклапочаны тым, што мячэць можа стаць месцам вярбоўкі тэрарыстаў.

**Ролевая картка: член гарадскога савета (папулісцкая партыя, 1–2 удзельнікі)**

Вы прадстаўляеце ў гарадскім савеце папулісцкую партыю. Вы падтрымліваеце рашэнне аб будаўніцтве мячэці на ўчастку, часткова таму, што разумееце, што мусульманская супольнасць аказала дабратворны ўплыў на эканоміку горада, і вы не хочаце настроіць яе супраць горада. Аднак вы занепакоены скаргамі жыхароў і не хочаце распальвання непатрэбнага канфлікту сярод мясцовых жыхароў. Вы таксама хочаце захаваць месца ў савеце ў наступных выбарах у савет і хутчэй за ўсё падтрымаеце той варыянт, які будзе здавацца найменш супярэчлівым.

**Ролевая картка: член гарадскога савета (партыя разнастайнасці, 1–2 удзельнікі)**

Вы прадстаўляеце ў гарадскім савеце партыю разнастайнасці. Вы ўпэўнены, што досыць вялікая частка насельніцтва Сліпівіля родам з розных куткоў свету ўзбагаціла культурнае жыццё горада, і лічыце несправядлівым, што горад пазбавіў многіх з гэтых людзей магчымасці вызнаваць сваю рэлігію. Вы таксама разумееце, што занядбаная зямля з'яўляецца крыніцай сацыяльных праблем у горадзе і што ў савета ў цяперашні час няма грошай, каб самому заняцца асваеннем гэтага ўчастка.

**Ролевая картка: члены сліпівільскага аб’яднання «Мінулае і сучаснасць» (2–4 удзельнікі)**

Вы прадстаўляеце адну з асноўных груп, якія выступаюць супраць мячэці. Вы з'яўляецеся членам традыцыйнай (немусульманскай) супольнасці Сліпівіля і лічыце важным захаваць старажытную культуру горада, дзе большасць жыхароў пражылі ўсё сваё жыццё. Месца для будаўніцтва мячэці знаходзіцца недалёка ад цэнтра горада, і яе будзе бачна з усіх бакоў; акрамя таго, мячэць можа засланіць від на галоўную царкву з цэнтральнай плошчы. Вы лічыце, што характар вашага роднага горада вось-вось зменіцца намаганнямі людзей, якія прыехалі сюды зусім нядаўна. Вы не разумееце, чаму людзі, якія прыехалі ў вашу краіну з іншых мясцін, не могуць жыць па тых жа правілах, па якіх жывяце вы.

**Ролевая картка: члены ініцыятыўнай маладзёжнай групы «Маладыя сліпівільцы за правы чалавека!» (2–4 удзельнікі)**

Ваша група была сфарміравана, каб вырашыць некаторыя з самых вострых праблем моладзі ў сучасным Сліпівілі. Вы разглядаеце будаўніцтва мячэці як забеспячэнне патрэбы мусульманскай супольнасці ў месцы пакланення і рашэнне мноства сацыяльных праблем, якія ўзніклі ў выніку таго, што зямля так доўга была ў занядбаным стане. Вы падтрымліваеце будаўніцтва гэтай мячэці, але занепакоены тым, што іншыя сацыяльныя праблемы не атрымаюць належнай увагі з-за таго, што гарадскі савет будзе часткова фінансаваць праект. Гэта ў асаблівасці тычыцца маладзёжнага бюджэту, які за апошнія 5 гадоў быў урэзаны да такога ўзроўню, што больш не ў стане забяспечыць патрэбы гарадской моладзі.

**Ролевая картка: члены «Мусульманскай асацыяцыі Сліпівіля» (2–4 удзельнікі)**

Вы ўжо некалькі гадоў просіце гарадскі савет даць вам месца для правядзення мусульманскіх набажэнстваў, але вам пастаянна адмаўляюць па фінансавых прычынах. Вы лічыце несправядлівым, што мусульманская супольнасць павінна фінансаваць 10 % выдаткаў на будаўніцтва, у той час як эканамічныя ўмовы большасці яе членаў такія цяжкія, а ў хрысціянскай супольнасці 11 месцаў для правядзення набажэнства, пры тым што ходзяць на іх намнога менш людзей, чым будуць хадзіць у мячэць. Вы лічыце, што ўклад, які ўнесла мусульманская супольнасць у развіццё горада, не шануецца і што супраць людзей вашай супольнасці вядзецца дыскрымінацыя ў розных аспектах жыцця. Адмаўляючы ў будаўніцтве мячэці, гарадскі савет адмаўляе членам вашай супольнасці ў асноўным праве на свабоду веравызнання.

**Ролевая картка: жыхары Сліпівіля**

Вы занепакоены канфліктам, які захліснуў Сліпівіль, і хочаце наведаць пасяджэнне гарадскога савета, каб прагаласаваць. Пакуль што вы не ведаеце, за які варыянт будзеце галасаваць, вам неабходна пагаварыць з як мага большай колькасцю прадстаўнікоў розных груп, каб прыняць рашэнне.

# Доступ да лекаў

*«Змяніць становішча да лепшага можна толькі сумеснымі намаганнямі занепакоеных грамадзян у глабальных маштабах».*

*Закі Ахмат, лідар «Кампаніі ў падтрымку лячэння»*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • здароўе,<br>• глабалізацыя,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць. |
| **Складанасць** | узровень 4 |
| **Памер групы** | 16–40 чалавек |
| **Час** | 190 хвілін |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой інсцэніроўку судовага працэсу «Лекі ад СНІДу», які адбыўся ў Паўднёвай Афрыцы ў 2000 годзе. У ім разглядаюцца наступныя пытанні:<br>• ВІЧ (СНІД) і доступ да лекаў;<br>• як прымірыць супярэчныя прэтэнзіі на правы. |
| **Звязаныя правы** | • права на жыццё і годнасць;<br>• права на абарону маральных і матэрыяльных інтарэсаў, якія з'яўляюцца вынікам навуковай вытворчасці;<br>• права на здароўе. |
| **Мэты** | • павысіць дасведчанасць аб праве на здароўе, асабліва аб праве на доступ да таннай медыцыны, а таксама да лячэння і прафілактыкі ВІЧ (СНІДу);<br>• развіць навыкі зносін, супрацоўніцтва і дасягнення кансэнсусу;<br>• выхаваць салідарнасць і ідэалы справядлівасці. |
| **Матэрыялы** | • папера для фліпчарта і ручкі;<br>• ролевыя карткі для інсцэніроўкі судовага працэсу;<br>• інструкцыі для працы ў малых групах (па адной для кожнага ўдзельніка);<br>• маленькія карткі (10 х 6 см), па адной чырвонай і адной зялёнай для кожнага ўдзельніка;<br>• месца для агульнага пасяджэння і для працы ў малых групах. |
| **Падрыхтоўка** | Да першай часткі:<br>• зрабіце ксеракопіі ролевых картак, прызначаных для інсцэніроўкі судовага працэсу, па адной на чалавека.<br>Да другой часткі:<br>• для працы ў малых групах зрабіце ксеракопіі інструкцый, па адной для кожнага ўдзельніка;<br>• падрыхтуйце па адной чырвонай і адной зялёнай картцы для кожнага ўдзельніка. |

## Інструкцыі

Практыкаванне складаецца з дзвюх частак. Частка 1 уяўляе сабой інсцэніроўку судовага працэсу, а частка 2 – этап дасягнення кансэнсусу.

**Частка 1**. **Судовы працэс** (агульная працягласць: 65 хвілін).

1 Увядзіце ўдзельнікаў у кантэкст. ВІЧ (СНІД) уяўляе сабой вельмі небяспечную глабальную эпідэмію, але асабліва сур'ёзных маштабаў ён дасягнуў у Паўднёвай Афрыцы, дзе мільёны беднякоў пакутуюць і паміраюць ад гэтай хваробы толькі таму, што ў іх няма грошай на дарагія медыкаменты. Адзіная альтэрнатыва для іх – гэта ўжыванне больш танных заменнікаў неабходных лекаў. Вядучыя фармацэўтычныя прадпрыемствы выступаюць супраць гэтага. Імкнучыся абараніць свае правы ўласнасці, яны аб'ядналі сілы ў барацьбе за тое, каб ніводная дзяржава не магла вырабляць непатэнтаваныя аналагі такіх лекаў і прадаваць іх танней. Яны распачалі судовы разбор супраць урада Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі (ПАР), які распаўсюджвае і прадае таннейшыя непатэнтаваныя аналагі лекаў ад ВІЧ (СНІДу).



Здароўе

Глабалізацыя

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Узровень 4

16–40

190 хвілі

2. Растлумачце ўдзельнікам, што яны разыграюць першую частку (папярэдняе слуханне) судовага працэсу, які адбыўся ў Паўднёвай Афрыцы ў 2001 годзе. Трэба адказаць на наступныя пытанні: ці з'яўляецца права ўласнасці дастатковай падставай для таго, каб ставіць пад пагрозу права нейкай часткі насельніцтва на жыццё і чалавечую годнасць? Ці з'яўляюцца правы на жыццё і здароўе дастаткова важкімі аргументамі, каб пераважыць права ўласнасці?
3. Падзяліце ўдзельнікаў на чатыры роўныя групы. Адна група будзе прадстаўляць фірму «Фарма Інк.», другая – урад ПАР, трэцяя – членаў кампаніі ў падтрымку лячэння (КПЛ), а чацвёртая – суддзяў.
4. Раздайце ролевыя карткі адпаведным групам.
5. Дайце групам 25 хвілін, каб прачытаць свае ролевыя карткі і падрыхтаваць свае выступленні і (або) пытанні для судовага працэсу. Кожная група павінна выбраць прадстаўніка і аднаго або двух экспертаў, якія будуць падтрымліваць гэтага прадстаўніка і дапамагаць яму адказваць на пытанні на пасяджэнні.
6. Калі ўсе групы падрыхтуюцца, запрасіце ўдзельнікаў на агульнае пасяджэнне. Пры гэтым яны павінны заставацца ў сваіх групах.
7. Прадстаўнікі фірмы «Фарма Інк.», урада Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі і КПЛ маюць пяць хвілін, каб апісаць свае пазіцыі і задаць пытанні. Суддзі павінны прадставіць кожную групу і даць ім магчымасць выказацца па чарзе.
8. Затым у суддзяў будзе 10 хвілін, каб адказаць на пытанні, якія задалі групы, вырашыць працэдурныя пытанні і падагульніць розныя аргументы і пазіцыі.

**Частка 2. Дасягненне кансэнсусу** (агульная працягласць: 100 хвілін)

1. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на малыя групы па 4 чалавекі ў кожнай. У кожнай групе павінен быць адзін былы прадстаўнік «Фарма Інк.», урада ПАР і КПЛ, а таксама адзін былы суддзя.
2. Раздайце копіі інструкцый для малых груп, а таксама кожнаму ўдзельніку па адной чырвонай і адной зялёнай картцы. Пераканайцеся, што кожны разумее, што трэба рабіць, і ведае прызначэнне і правілы выкарыстання каляровых картак.
3. Дайце групам 30 хвілін, каб разгледзець супярэчныя прэтэнзіі і паспрабаваць прыйсці да кансэнсусу.
4. Зноў збярыце ўсіх у адну групу і папрасіце прадставіць вынікі дыскусіі. Дайце кожнай групе 5 хвілін на прадстаўленне справаздачы. Запішыце асноўныя рашэнні і пытанні на фліпчарце.
5. Пасля таго як групы выкладуць свае пазіцыі (рашэнні), пераходзьце да абмеркавання працэсу прыняцця рашэнняў. Можна задаць наступныя пытанні:
   - Ці лёгка было дасягнуць кансэнсусу?
   - Якія моцныя і слабыя бакі такога падыходу?
   - Ці ўзнікала супярэчнасць паміж імкненнем дасягнуць узгодненага рашэння і спробай уцягнуць усіх членаў групы ў яго абмеркаванне?
   - Якія пытанні былі самымі вострымі?
6. Гэту частку практыкавання вы можаце завяршыць, зачытаўшы наступную вытрымку з рашэння суда ад 19 красавіка 2001 года:

   «(…) Пашырэнне доступу да больш танных лекаў (…) – гэта пахвальная мэта і, у кантэксце эпідэміі ВІЧ (СНІДу), канстытуцыйны абавязак вышэйшага парадку, звязаны з абавязкам дзяржавы забяспечваць павагу, абарону, прасоўванне і рэалізацыю шэрагу асноўных правоў, уключаючы правы на чалавечую годнасць і жыццё (якія лічацца крыніцай усіх астатніх правоў) (…). Прадстаўленыя істцамі (г. зн. фармацэўтычнымі кампаніямі) (…) аргументы наконт парушэння закону нельга лічыць абгрунтаванымі».

## Аналіз і ацэнка

Ацэнка ўжо пачалася падчас абмеркавання ў рамках другой часткі практыкавання. Зараз прапануйце ўдзельнікам абдумаць увесь працэс у цэлым і вызначыць асноўныя праблемы правоў чалавека, звязаныя з судовым працэсам. Можна задаць наступныя пытанні:

- Ці чулі ўдзельнікі пра гэты працэс раней?
- Якія былі іх першыя думкі пра гэты разбор напачатку практыкавання?
- Як разуменне ўдзельнікамі пытанняў мяняліся ў ходзе практыкавання?
- Як бы ўдзельнікі параўналі два метады прыняцця рашэнняў: спаборны і кансэнсус? Які метад дае больш здавальняючыя вынікі? Як бы вы ахарактарызавалі паспяховы вынік?
- Якія асноўныя праблемы правоў чалавека былі закрануты судовым працэсам?
- Часта здараецца, што прэтэнзіі па розных правах чалавека параўноўваюцца паміж сабой. Як бы вы размеркавалі розныя прэтэнзіі па прыярытэтах? Якія крытэрыі вы б выкарыстоўвалі?
- Якія наступствы маюць судовыя разборы для ВІЧ-інфіцыраваных людзей у вашай краіне? Напрыклад, ці даступны непатэнтаваныя лекі (джэнерыкі)?
- Што робіцца ў вашай краіне, каб інфармаваць грамадскасць пра ВІЧ (СНІД)? Што яшчэ можна і трэба было б зрабіць?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**1 снежня**
Міжнародны дзень СНІДу

## Парады для фасілітатараў

На правядзенне гэтага практыкавання спатрэбіцца шмат часу, таму што ў ім закранаюцца складаныя пытанні і ўдзельнікі павінны іх старанна абдумаць. Варта адзначыць, што абедзве часткі практыкавання неабавязкова выконваць у адзін і той жа дзень, іх можна правесці на двух асобных занятках.

Вам трэба растлумачыць, што мэта чырвонай і зялёнай картак – дапамагчы ўдзельнікам зразумець, што дапамагае прыняць рашэнне і што замінае гэтаму працэсу. У ідэале ў канцы дыскусій і перамоў у другой частцы практыкавання ўсе ўдзельнікі паказваюць зялёныя карткі, што значыць, што яны прыйшлі да адзінага ўзгодненага рашэння.

У другой частцы практыкавання некаторыя групы змогуць дасягнуць згоды, іншыя – не. У ходзе дыскусіі вы павінны паспрабаваць выявіць моцныя і слабыя бакі прыняцця рашэнняў метадам кансэнсусу. Папрасіце групы, якія дасягнулі згоды, апісаць не толькі сваю канчатковую пазіцыю, але і асноўныя аргументы, на якіх яна грунтуецца. Затым папрасіце групы, якія не змаглі прыйсці да згоды, расказаць, што іх збліжала, а што паглыбляла рознагалоссе паміж імі. Заўвага: больш інфармацыі пра спосабы дасягнення кансэнсусу можна знайсці ў дадатковай інфармацыі па тэме «Мір і гвалт» у главе 5 на сайце www.coe.int/compass.

Важна высветліць становішча, у якім знаходзяцца носьбіты ВІЧ (СНІДу) у вашым рэгіёне, і адаптаваць (звязаць) практыкаванне да актуальных для іх праблем. Заўвага: назва групы фармацэўтычных кампаній, «Фарма Інк.», прыдумана спецыяльна для гэтага практыкавання.

## Варыянты

Можна сабраць групу журналістаў, якія будуць асвятляць судовы працэс. Для гэтага спатрэбяцца дадатковыя матэрыялы: камеры, камп’ютар і прынтар. Дайце ім некаторую колькасць часу на прадстаўленне сваёй справаздачы ў канцы пасяджэння. Колькасць часу будзе залежаць ад абранага фармату, напрыклад газетны артыкул, радыё- або тэлерэпартаж, блог. Калі вы выбераце гэты варыянт, трэба будзе зрабіць ролевыя карткі для журналістаў. Таксама неабходна будзе закласці дадатковыя 15 хвілін на заданне і яшчэ 10 хвілін на ацэнку працы журналістаў.

## Прапановы па далейшай працы

Абмяркуйце праблемы правоў на жыццё і на чалавечую годнасць у вашай краіне, звязаныя з пытаннямі аховы здароўя. Рэальныя выпадкі і гісторыі, апісаныя ў навінах, могуць стаць добрым зыходным пунктам, асабліва для абмеркавання ў малых групах.

Доступ да лекаў

Азнаёмцеся з інфармацыяй аб стане спраў у галіне аховы здароўя і правоў чалавека ў розных краінах свету. Наведайце вэб-сайты або знайдзіце публікацыі вядучых НГА (MSF, TAC, Christian Aid, Oxfam, Save the Children) і міжнародных арганізацый (СААЗ). Высветліце, якія дзеянні робяцца ў мэтах паляпшэння становішча ў галіне аховы здароўя, і запішыце іх на фліпчарце.

Арганізацыя «Кампанія ў падтрымку лячэння» правяла вельмі паспяховую кампанію і працягвае сваю актыўную дзейнасць у Паўднёвай Афрыцы і за яе межамі (гл. www.tac.org.za). На жаль, не ўсе кампаніі так жа паспяхова дасягаюць пастаўленых мэт. Гэта адбываецца па мностве прычын, адной з якіх можа быць дрэнная арганізацыя і неэфектыўная рэклама. Група можа азнаёміцца з гэтымі пытаннямі і развіць свае навыкі правядзення паспяховых кампаній з дапамогай практыкаванні «Увага, мы ўсё бачым!» на старонцы 110 або «Доста!» на старонцы 151.

## Ідэі для дзеяння

Паспрабуйце высветліць, хто арганізуе акцыі па пытаннях здароўя ў вашым рэгіёне і якім чынам вы можаце ўнесці свой уклад.

## Дадатковая інфармацыя

Гэта практыкаванне заснавана на справе, якую Вярхоўны суд ПАР разглядаў у 2001 годзе. Асацыяцыя вытворцаў фармацэўтычнай прадукцыі Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі ўзбудзіла судовы іск супраць прэзідэнта рэспублікі Нельсана Мандэлы і іншых асоб, уключаючы арганізацыю «Кампанія ў падтрымку лячэння» (КПЛ), прад'явіўшы ім абвінавачанні ў ігнараванні іх патэнтаў на лекі ад ВІЧ і ўвозе больш танных, непатэнтаваных лекаў для лячэння мільёнаў грамадзян, пакутаваўшых ад СНІДу.

Суддзі былі вымушаны нейкім чынам збалансаваць супрацьлеглыя інтарэсы і правы абодвух бакоў. З аднаго боку, Асацыяцыя вытворцаў фармацэўтычнай прадукцыі спасылалася на сваё права ўласнасці, права роўнасці і права свабоднага выбару занятку, прафесіі і працы, тады як урад і КПЛ, з другога боку, сцвярджалі, што абавязкам дзяржавы з'яўляецца павага, абарона і забеспячэнне захавання асноўных правоў грамадзян на чалавечую годнасць і жыццё.

У сваім гістарычным рашэнні суд прыйшоў да высновы, што права на ўласнасць з'яўляецца правам больш нізкага парадку ў параўнанні з правам на чалавечую годнасць і правам на жыццё і таму павінна быць абмежавана. Пасля гэтага фармацэўтычныя кампаніі знялі свае абвінавачанні. Такі вынік віталі ў шырокіх колах як «сапраўдны трыумф Давіда над Галіяфам, і не толькі для нас, жыхароў ПАР, але і для народаў многіх краін у стадыі развіцця, якія змагаюцца за доступ да паслуг аховы здароўя» (сумесны прэс-рэліз НГА ад 19 красавіка 2001 года). «Гэта рэдкая і вельмі значная перамога бедных людзей над магутнымі транснацыянальнымі кампаніямі! Але зараз наша задача зводзіцца да таго, каб сумесна з урадам і вытворцамі лекаў забяспечыць медыкаментамі тых, хто мае ў іх патрэбу», – заявіў Кевін Уоткінс з Oxfam. На сайце Time.com маецца кароткае апісанне гэтай праблемы, апублікаванае 5 сакавіка 2001 года. Яго можна знайсці па пошукавым запыце «AIDS Drugs Case Puts Our Ideas About Medicine on Trial» («Справа аб леках супраць СНІДу выпрабоўвае нашы прадстаўленні аб медыцыне»).

## СНІД і тэндэнцыі глабалізацыі

У багатых краінах людзі з ВІЧ (СНІДам) могуць жыць лепш і даўжэй дзякуючы антырэтравірусным лекам, якія дзяржавы забяспечваюць бясплатна. У краінах Поўдня ВІЧ-інфіцыраваныя пакутуюць больш і паміраюць раней, таму што не маюць доступу да неабходных лячэбных працэдур. У сярэднім гадавыя выдаткі на ахову здароўя ў такіх краінах складаюць каля 10 долараў на душу насельніцтва, у той час як трайная тэрапія, даступная ў краінах Поўначы, абыходзіцца ў 10 000–15 000 долараў у год.

Беднасць і нізкі ўзровень адукацыі ў спалучэнні з сацыяльнай няроўнасцю паскараюць распаўсюджванне эпідэміі, але праблема носіць, перш за ўсё, палітычны характар, і для яе вырашэння патрабуюцца намаганні ўрадаў, міжнародных органаў і фармацэўтычных кампаній. Для таго каб барацьба са СНІДам была эфектыўнай, трэба падключыць да яе міжнародныя механізмы і інстытуты. Перш за ўсё, гэта Міжнародны валютны фонд, Сусветная гандлёвая арганізацыя (СГА), ТРЫПС (Пагадненне па гандлёвых аспектах правоў інтэлектуальнай уласнасці), ГАТС (Генеральнае пагадненне аб гандлі паслугамі) і Орган вырашэння спрэчак, які выконвае функцыі трыбунала СГА.

**Барацьба з ВІЧ (СНІДам) – адна з васьмі Мэт развіцця тысячагоддзя ААН.**

**Раздатачны матэрыял**

**Ролевыя карткі для інсцэніроўкі судовага працэсу**

### Ролевая картка: «Фарма Інк.»

Вы прадстаўляеце групу старэйшых кіраўнікоў кампаніі «Фарма Інк.». Ваша кампанія з'яўляецца адным з вядучых у свеце вытворцаў лекаў. Вы купілі правы на камерцыйнае выкарыстанне асноўных лекаў, якія ўжываюцца для лячэння ВІЧ (СНІДу). Ваша задача – захоўваць прыбытковасць кампаніі і радаваць акцыянераў. Таму вы імкняцеся абараніць права кампаніі вызначаць прадажную цану яе прадукцыі з улікам такіх складнікаў, як выдаткі на навуковыя даследаванні, вытворчыя выдаткі і зарплаты працаўнікоў. Такім чынам, калі іншай кампаніі будзе дазволена проста капіраваць вашы прадукты і прадаваць іх па больш нізкай цане, гэта паставіць пад пагрозу ваш прыбытак і ўстойлівасць вашай фірмы. Таму вы аб'ядналі свае сілы з іншымі вядучымі фармацэўтычнымі кампаніямі, каб не дапусціць капіравання і продажу вашых прадуктаў любой дзяржавай па больш нізкіх цэнах і, калі трэба, звярнуцца ў суд. Вы распачалі судовы працэс супраць паўднёваафрыканскага ўрада.

Вам неабходна падрыхтаваць аргументы для абароны сваёй пазіцыі. На прадстаўленне аргументаў падчас працэсу ў вас будзе пяць хвілін.

### Ролевая картка: урад Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі

Вы з'яўляецеся высокапастаўленымі службовымі асобамі ўрада ПАР. Ваш урад спрабуе адказаць на патрабаванне фармацэўтычных кампаній, якія падалі супраць вас іск. «Фарма Інк.» дамагаецца таго, каб ва ўсіх дзяржавах былі забаронены капіраванне і продаж іх прадукцыі па больш нізкіх цэнах, чым прадае сама кампанія. Вы, у прынцыпе, згодны з пазіцыяй «Фарма Інк.».

Аднак народны рух пад кіраўніцтвам «Кампаніі ў падтрымку лячэння» (КПЛ) заяўляе, што забеспячэнне доступу да танных лекаў, асабліва ў кантэксце эпідэміі ВІЧ (СНІДу), з'яўляецца канстытуцыйным абавязкам дзяржавы. Вы адрэагавалі на палітычны ціск грамадскасці і дазволілі імпарт больш танных (непатэнтаваных) лекаў з такіх краін, як Інданезія.

Вам неабходна падрыхтаваць аргументы для абароны сваёй пазіцыі. На прадстаўленне аргументаў падчас працэсу ў вас будзе пяць хвілін.

### Ролевая картка: «Кампанія ў падтрымку лячэння»

Вы прадстаўляеце паўднёваафрыканскую групу актывістаў «Кампаніі ў падтрымку лячэння» (КПЛ). Гэта арганізацыя заяўляе, што дзяржава абавязана забяспечыць доступ да танных лекаў, асабліва ў кантэксце эпідэміі ВІЧ (СНІДу). Урад адрэагаваў на вашы патрабаванні, пачаўшы імпарт больш танных лекаў.

Вы таксама ўпэўнены, што дзяржава абавязана аказваць фінансавую дапамогу ВІЧ-пазітыўным людзям і арганізацыям, якія змагаюцца супраць гэтых хвароб.

Аднак фармацэўтычныя кампаніі падалі іск супраць урада ПАР, каб не дапусціць капіравання і продажу іх прадукцыі па больш нізкіх цэнах. Таму вы вырашылі аб'яднаць сілы з урадам, каб абараніць ролю дзяржавы ў забеспячэнні доступу да танных лекаў.

Вам неабходна падрыхтаваць аргументы для абароны сваёй пазіцыі. На прадстаўленне аргументаў падчас працэсу ў вас будзе пяць хвілін.

**Ролевая картка: суддзі**

Вы іграеце ролю суддзяў, якія разглядаюць іск вядучых фармацэўтычных кампаній супраць урада ПАР, якія спрабуюць дамагчыся забароны капіравання і продажу іх прадукцыі па больш нізкіх цэнах. Актывісты, якія прадстаўляюць «Кампанію ў падтрымку лячэння» (КПЛ), падтрымліваюць пазіцыю ўрада.

Ваша роля заключаецца ў тым, каб запрасіць бакі па чарзе прадставіць свае пазіцыі. Пасля гэтага вы не павінны агучваць ніякіх меркаванняў і не рабіць высноў. Ваша задача – дапамагчы ўдакладніць пазіцыі бакоў і коратка сфармуляваць іх аргументы ў падтрымку супярэчных патрабаванняў.

Галоўная праблема заключаецца ў тым, каб вырашыць канфлікт паміж сустрэчнымі прэтэнзіямі, якія тычацца правоў чалавека. Абарона (урад і КПЛ) спасылаецца на правы на жыццё і чалавечую годнасць, а абвінавачанне («Фарма Інк.») абапіраецца на права на ўласнасць. У афіцыйных пратаколах судовага пасяджэння можна знайсці наступную фармуліроўку:

«***Правы на жыццё і чалавечую годнасць*** з'яўляюцца самымі важнымі з усіх правоў чалавека і крыніцамі ўсіх астатніх асабістых правоў. Абвясціўшы сябе прыхільнікамі грамадства, заснаванага на прызнанні правоў чалавека, мы абавязаны шанаваць гэтыя два правы больш, чым любыя іншыя. І дзяржава павінна дэманстраваць гэта ва ўсіх сваіх дзеяннях, уключаючы пакаранне злачынцаў.»

*супраць*:

«***Права на ўласнасць*** абараняецца раздзелам 25 Канстытуцыі ПАР, якая абвяшчае: “Уласнасць. 25 (1). Ніхто не можа быць пазбаўлены ўласнасці, інакш як у адпаведнасці з законамі агульнага дзеяння, і ніякі закон не можа дазволіць адвольнага пазбаўлення ўласнасці”».

Вы павінны падрыхтаваць пытанні для ўсіх трох бакоў. У вас будзе дзесяць хвілін, каб задаць пытанні і выслухаць адказы.

**Ролевая картка: журналісты** (па жаданні, глядзіце «Варыянты» вышэй)

Вы – група журналістаў, якім вам даручана асвятляць судовае пасяджэнне.

Ваша задача – зрабіць рэпартаж пра судовае пасяджэнне і прадставіць усе пункты гледжання. У вас ёсць доступ да асобных пасяджэнняў, арганізаваных рознымі бакамі: суддзямі, «Кампаніяй у падтрымку лячэння», паўднёваафрыканскім урадам і кампаніяй «Фарма Інк.». Прысутнічаючы на пасяджэннях, вы можаце толькі назіраць; вы не мае права перашкаджаць працы груп, перарываць яе ці браць у ёй удзел. Аднак можна браць індывідуальныя інтэрв'ю, калі гэта не перашкаджае працэсу. Вы таксама можаце фатаграфаваць і маеце доступ да камп’ютара, прынтара і Інтэрнэту для працы.

Вы плануеце прадставіць вынікі сваёй працы ў канцы пасяджэння. Фармат можаце выбраць самі, напрыклад блог, твіт, артыкул у газеце альбо радыё- ці тэлерэпартаж. На прадстаўленне справаздачы ў вас будзе 10 хвілін.

**Інструкцыі для малых груп па 2 частцы практыкавання**

Вы – група з чатырох чалавек, кожны з якіх прадстаўляе адзін з чатырох бакоў:

- «Фарма Інк.»,
- урад Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі,
- актывісты, якія прадстаўляюць «Кампанію ў падтрымку лячэння» (КПЛ),
- суддзі на гэтым працэсе.

**Інструкцыі**

1. Кожны ўдзельнік павінен па чарзе прадставіцца і абвясціць, які бок ён прадстаўляе, іншымі словамі, якую ролю іграе.
2. Затым кожны павінен выказаць сваё меркаванне наконт сітуацыі, якая склалася, у канцы судовага пасяджэння. Тыя, хто лічыць, што рашэнне будзе знайсці лёгка, павінны паказаць зялёную картку, а тыя, хто лічыць гэту задачу цяжкай, павінны паказаць чырвоную картку (мэта выкарыстання картак – дапамагчы ўсім зразумець, як праходзіць працэс дасягнення кансэнсусу).
3. Цяпер вы павінны пастарацца прыйсці да рашэння, заснаванага на кансэнсусе ўсіх чатырох членаў групы. Прыняцце рашэння праходзіць у некалькі раўндаў. Суддзя кіруе ходам абмеркавання і апошнім выкладае сваю пазіцыю.
   - першы раўнд: выкладзіце вашу пазіцыю;
   - другі раўнд: падзяліцеся сваімі ідэямі пра тое, як можна вырашыць праблему;
   - трэці раўнд: абмяркуйце розныя варыянты рашэнняў.
4. Уважліва слухайце адзін аднаго. Пасля кожнага выступлення вы павінны паказаць картку адпаведнага колеру, які адлюстроўвае вашы пачуцці адносна перспектыў дасягнення рашэння, якое б задаволіла ўсіх.
5. У канцы працэсу пошуку кансэнсусу выберыце дакладчыка, які прадставіць вынікі абмеркавання на агульным пасяджэнні.

COMPASS

Агульныя правы чалавека

Дзеці

Грамадзянскасць і ўдзел

Узровень 2

9+ (малыя групы па 4–5 чалавек)

90 хвілін

# Сыграем гэта!

*Пакажыце, што вы разумееце пад правамі чалавека!*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • агульныя правы чалавека,<br>• дзеці,<br>• грамадзянскасць і ўдзел. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | 9+ (малыя групы: 4–5 чалавек) |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Агляд** | З дапамогай гэтага акцёрскага практыкавання ўдзельнікі прадстаўляюць сваё ўспрыманне правоў чалавека. |
| **Звязаныя правы** | • усе правы чалавека. |
| **Мэты** | • даследаваць асноўную ідэю або канцэпцыю правоў чалавека;<br>• развіць міжкультурныя і камунікацыйныя навыкі;<br>• развіць навыкі супрацоўніцтва і творчасці. |
| **Матэрыялы** | • касцюмы, цацкі, бытавыя прадметы;<br>• папера, каляровыя алоўкі;<br>• клей, шнур і кардон. |

## Інструкцыі

1. Растлумачце, што мэтай гэтага практыкавання з'яўляецца перадача агульнай ідэі або канцэпцыі правоў чалавека сродкамі тэатральнага мастацтва такім чынам, каб зрабіць яе зразумелай людзям, якія адносяцца да розных культур і размаўляюць на розных мовах.
2. Растлумачце ўдзельнікам, што выкарыстанне слоў не дапускаецца: гэта павінна быць пантаміма. Пры жаданні, аднак, групы могуць скарыстацца нейкімі матэрыяламі ці рэквізітам.
3. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на малыя групы па 4–6 чалавек і дайце кожнай групе вялікі аркуш паперы і набор каляровых алоўкаў (маркераў).
4. Дайце групам 10 хвілін, каб яны шляхам мазгавога штурму вызначылі свае ідэі па правах чалавека, а затым назвалі дзве-тры асноўныя, якія збіраюцца паказаць пантамімай.
5. Пасля гэтага дайце групам 30 хвілін на падрыхтоўку і рэпетыцыю пантамімы. Растлумачце, што гэта групавое заданне, у якім кожны павінен прыняць удзел.
6. Па заканчэнні 30 хвілін збярыце групы разам, каб кожны ўдзельнік мог паглядзець прадстаўленні астатніх.
7. Пасля кожнага прадстаўлення дайце некалькі хвілін на зваротную сувязь і абмеркаванне.
8. Папрасіце гледачоў даць сваю інтэрпрэтацыю таго, што яны толькі што ўбачылі, і паспрабаваць назваць асноўныя ідэі, якія хацелі выказаць аўтары інсцэніроўкі.
9. Потым дайце магчымасць самой групе коратка растлумачыць моманты, якія не прагучалі падчас абмеркавання. Паўтарыце гэту працэдуру для кожнага прадстаўлення.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з агляду самога практыкавання, а затым абмяркуйце, што ўдзельнікі даведаліся аб правах чалавека.

- Якія адчуванні ўзнікалі ва ўдзельнікаў пры выкананні гэтага практыкаванні? Ці аказаліся яны цяжэй, чым яны думалі першапачаткова, ці лягчэй? Якія аспекты або паняцці выказаць было цяжэй за ўсё?
- Ці даведаліся ўдзельнікі пра нешта новае аб правах чалавека? Ці былі яны здзіўлены, што ведаюць больш, чым меркавалі?

- Ці былі падабенствы і адрозненні паміж рознымі выступленнямі?
- Ці былі істотныя рознагалоссі адносна ідэі аб правах чалавека ў групе? Як яны былі пераадолены?
- Асноўваючыся на выступленнях, якія характарыстыкі правоў чалавека ўдзельнікі лічаць найбольш важнымі і агульнымі для ўсіх?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**10 снежня**
Дзень правоў чалавека

## Парады для фасілітатараў

За выключэннем выпадкаў, калі ўдзельнікі ўвогуле нічога не ведаюць пра канцэпцыю правоў чалавека, гэта практыкаванне цікавей выконваць з мінімальнымі пачатковымі інструкцыямі ад фасілітатара. Асноўная мэта практыкавання – выявіць уражанні і веды аб правах чалавека, назапашаныя маладымі людзьмі на працягу жыцця. На гэта варта звярнуць асаблівую ўвагу да таго, як групы прыступяць да працы, каб удзельнікі не адчувалі скаванасці з-за «няведання» таго, што канкрэтна ўяўляюць сабой правы чалавека.

Растлумачце ўдзельнікам, што іх задача – прадставіць «правы чалавека ўвогуле», а не нейкае адно або некалькі канкрэтных правоў. Яны могуць выбраць канкрэтнае права і апісаць яго агульныя характарыстыкі, аднак яны не павінны забываць пра тое, каб паспрабаваць адлюстраваць аспекты, агульныя для розных правоў чалавека. У канцы занятку гледачы павінны быць у стане адказаць (ці наблізіцца да адказу) на пытанне «Што такое правы чалавека?».

Не дапускайце таго, каб удзельнікі, якія лічаць сябе дрэннымі акцёрамі, не прымалі актыўнага ўдзелу ў гульні! Растлумачце ім, што роляў хопіць на ўсіх і што ў гэтым практыкаванні ўся група павінна атрымліваць задавальненне ад пастаноўкі. Некалькі незвычайных прадметаў рэквізіту (што хочаце – ад патэльняў, цацачных аўтамабіляў, капелюшоў да падушак, камянёў, вечка ад вядра для смецця і г. д.) могуць ажывіць прадстаўленне і запаліць творчую іскру.

Калі групе не абысціся без падказак у самым пачатку практыкавання ці ў канцы абмеркавання, можна прапанаваць ім наступныя тэмы:

- Правы чалавека – гэта правы, якія чалавек мае проста таму, што з’яўляецца чалавекам; усе маюць роўныя правы.
- Правы чалавека належаць усім людзям у роўнай ступені, ва ўсім свеце і назаўсёды.
- Правы чалавека непадзельныя і ўзаемазалежныя: вам не могуць адмовіць у якім-небудзь праве толькі таму, што яно «менш важнае» або «не з'яўляецца асноўным».
- Правы чалавека – асноўныя стандарты, без якіх людзі не могуць жыць годна.

## Варыянты

Калі ўдзельнікам цяжка разыграць пантаміму, можна прапанаваць ім замест гэтага стварыць калектыўную «статую». Калі фасілітатар потым зробіць фатаграфіі, атрымаецца калекцыя «калектыўных відарысаў», якія можна будзе выкарыстаць на іншым занятку для пачатку абмеркавання або для арганізацыі выстаўкі.

Альтэрнатыўным варыянтам можа стаць выкананне гэтага практыкавання з дапамогай малюнкаў: прапануйце групам зрабіць плакаты (без слоў), якія паказвалі б асноўныя ідэі правоў чалавека. Затым зрабіце выстаўку розных плакатаў.

Калі вы хочаце прыцягнуць увагу груп да пэўных ідэй, можна прапусціць пункты 3 і 4 інструкцыі і раздаць малым групам ключавыя словы, напрыклад роўнасць, мір, беднасць і салідарнасць. Даючы розныя словы кожнай з груп, вы ахопіце больш ідэй; даючы адно і тое ж слова розным групам, вы атрымаеце цікавую разнастайнасць вынікаў.

Гэта практыкаванне таксама можна выконваць не столькі для ўвядзення ўдзельнікаў у курс паняццяў, колькі для таго, каб арганізаваць і ўдакладніць іх меркаванні пасля таго, як яны ўжо прайшлі некаторыя практыкаванні з дапаможніка або правялі ўласныя даследаванні.

## Прапановы па далейшай працы

Знайдзіце п'есы або іншыя літаратурныя творы, звязаныя з тэмай правоў чалавека, і арганізуйце тэатральнае прадстаўленне для жыхароў вашай супольнасці.

Каб працягнуць працаваць над правамі чалавека ўвогуле, можна выканаць практыкаванне «Улада кветак» на старонцы 177. Калі ж група захоча пайсці далей і разгледзець канкрэтныя правы чалавека, чаму б не азнаёміцца з Канвенцыяй аб правах дзіцяці з дапамогай практыкавання «Правы дзяцей» на старонцы 130.

Яшчэ адзін спосаб працягнуць практыкаванне – прапанаваць удзельнікам напісаць кароткія пісьмы пра тое, што для іх азначае канцэпцыя правоў чалавека (глядзіце практыкаванне «Дарагі сябар» у адукацыйным пакеце «Усе розныя – усе роўныя»). Мэта напісання пісьма – дапамагчы ўдзельнікам растлумачыць свае ідэі, выклікаць рэакцыю ў адказ і развіць дыялог. Такім чынам, пісьмы могуць быць адрасаваны ўдзельнікам групы ці ж выкарыстоўвацца для выканання сумеснага практыкавання з іншымі школамі або маладзёжнымі клубамі.

У раздзеле 4 даведніка «ДАміно» ёсць «Гісторыі, расказаныя маладымі людзьмі», якія можна ўзяць за аснову для дыскусіі аб значнасці правоў чалавека ў паўсядзённым жыцці.

## Ідэі для дзеяння

Вы можаце падрыхтаваць пантамімы або тэатральныя сцэнкі з удзелам усёй групы і паказаць іх удзельнікам з іншых груп. Калі вы выбралі варыянт з плакатамі або «калектыўныя відарысы», арганізуйце выставу вашых фатаграфій або плакатаў. Абодва варыянты можна выкарыстоўваць для святкавання Дня правоў чалавека.

Пантамімы таксама можна зняць на відэакамеру і выкласці запісы ў Інтэрнэце.

# Усе роўныя – усе розныя

*Усе людзі роўныя ўвогуле і розныя ў прыватнасці. Агульную роўнасць і прыватныя адрозненні трэба паважаць*[1].

**Складанасць** узровень 2

**Час** 40 хвілін

**Памер групы** 6–60 чалавек (малыя групы па 3–4 чалавекі)

**Тэмы**
- дыскрымінацыя і нецярпімасць,
- глабалізацыя,
- СМІ.

**Агляд** Гэта кароткая віктарына, дастаткова правакацыйная і таму цікавая, яна ў той жа час з'яўляецца добрай асновай для эфектыўнага групавога абмеркавання.
- ВІЧ (СНІД) і доступ да лекаў;
- як прымірыць супярэчныя прэтэнзіі на правы.

**Звязаныя правы**
- роўнасць чалавечай годнасці;
- права на ўсе правы і свабоды без дыскрымінацыі;
- права на нацыянальную прыналежнасць.

**Мэты**
- пашырыць разуменне ўсеагульнасці правоў чалавека;
- развіць здольнасць крытычна і незалежна ўспрымаць інфармацыю;
- развіць усведамленне этнацэнтрызму і забабонаў у саміх удзельніках і ў іншых, а таксама развіць навыкі міжкультурнага навучання.

**Матэрыялы**
- раздатачныя матэрыялы;
- ручкі або алоўкі, па адным для кожнага чалавека;
- вялікі ліст паперы (А3) або фліпчарт і маркер.

**Падрыхтоўка** Зрабіце копіі раздатачнага матэрыялу для ўсіх удзельнікаў, напішыце неабходную інфармацыю на дошцы ці скарыстайце праектар.

## Інструкцыі

1. Паведаміце ўдзельнікам, што наступнае практыкаванне – гэта свайго роду віктарына, але яе канчатковая мэта не вызначыць тых, хто знае больш ці менш за ўсіх; гэта спаборніцтва – толькі зыходны пункт.
2. Раздайце або пакажыце на экране дзве цытаты, дайце ўдзельнікам пару хвілін, каб іх прачытаць.
3. Папрасіце кожнага ўдзельніка вызначыць:
   a) крыніцу першага тэксту; з якой кнігі або дакумента ўзяты ўрывак?
   b) з якой краіны (часткі свету) аўтар другога тэксту?
4. Калі ўсе будуць гатовы, разбіце іх на групы прыблізна па тры чалавекі. Дайце ім 20 хвілін на абмеркаванне і аналіз адказаў, а таксама на падрыхтоўку калектыўнага адказу на наступныя пытанні:
   - Чаму яны аддалі перавагу менавіта гэтаму адказу, а не іншым?
   - Што тэксты расказваюць пра іх аўтараў?
   - Чаму аўтары напісалі гэтыя тэксты?
   - Якое іх меркаванне пра тэксты?



Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Глабалізацыя

СМІ

Узровень 2

6–60 (малыя групы)

40 хвілін

[1]Дэкларацыя правоў і абавязкаў чалавека, прапанаваная моладдзю (1989 год)

5. Калі групы скончаць працу, збярыце адказы на пытанне «а» ад кожнай групы. Папрасіце кожную групу пералічыць прычыны, якімі яны кіраваліся, робячы той ці іншы выбар. Паўтарыце гэту працэдуру з адказамі на пытанне «b». Запішыце адказы на фліпчарце.
6. Назавіце прозвішча аўтара – Саід аль-Андалусі (з Іспаніі) – і пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з кароткага агляду практыкавання і, калі палічыце, што група гатова, пераходзьце да знаёмства з паняццямі этнацэнтрызму і прадузятасці. Задайце наступныя пытанні (на агульным занятку або, пры неабходнасці, у малых групах):

- Ці здзівіла ўдзельнікаў паходжанне аўтара?
- Як яны першапачаткова спрабавалі яго вызначыць? Рабілі здагадкі? Выкарыстоўвалі інтуіцыю? Сапраўды ведалі аўтара?
- Ці змяніў хто-небудзь сваё меркаванне ў ходзе дыскусій у малых групах? Як удзельнікі абаранялі свае погляды ў групах? Энергічна? Вагаліся?
- Чаму аўтар апісвае людзей з Поўначы менавіта такім чынам?
- Якія падказкі пра аўтара, яго знешнасць і культуру дае нам другі тэкст?
- У якой ступені погляды аўтара з'яўляюцца вынікам яго ўласнага этнацэнтрызму і прадузятасці? Ці можна справядліва сцвярджаць, што ў тыя часы культура народаў паўночнай Еўропы была менш «цывілізаванай», чым культура аўтара?
- Ці могуць удзельнікі прывесці прыклады такога абыходжання са свайго вопыту, з кніг? Як могуць адчуваць сябе людзі, якіх лічаць непаўнавартаснымі?
- Якія наступствы могуць быць, калі людзей не будуць цаніць такімі, якія яны ёсць? Ці могуць яны прывесці прыклады з гісторыі? З сучаснасці?
- Як процідзейнічаць наступствам прадузятасці? Ці ёсць у мясцовасці ці краіне, дзе жывуць удзельнікі, людзі ці групы, якія сталі ахвярамі прадузятасці? Хто канкрэтна?
    - Адукацыя – адзін са спосабаў барацьбы з прадузятасцю. Што яшчэ павінна быць зроблена?

## Парады для фасілітатараў

Урыўкі ўзяты з кнігі вядомага навукоўца з горада Кордава ў Андалусіі (сучасная Іспанія), які нарадзіўся ў 1029 годзе нашай эры (у 420 годзе па мусульманскім летазлічэнні). Саід аль-Андалусі славіўся сваёй мудрасцю і ведамі. Для яго цывілізацыя і навука былі цесна звязаны з веданнем Святога Карана. Ён быў дасведчаны не толькі ў галіне рэлігіі, але і ў галіне арабскай літаратуры, медыцыны, матэматыкі, астраноміі і іншых навук.

Трэба памятаць, што ў той час Міжземнаморскі басейн, а асабліва арабскія каралеўствы вакол яго, складалі – для аўтара – цэнтр «цывілізацыі». «На Поўначы», як Саід называе паўночную Еўропу, навукі не былі так развіты, як у арабскім свеце, Персіі, Кітаі і Індыі.

Трэба памятаць пра тое, што ў залежнасці ад узроўню групы можа ўзнікнуць неабходнасць паказаць, як можна падыходзіць да чытання тэксту больш крытычна. Пакажыце, напрыклад, што з другога тэксту вырысоўваецца культура і знешнасць аўтара – хутчэй за ўсё, ён быў цемнаскуры і кучаравы. Крытычнае чытанне прадугледжвае не толькі разуменне зместу тэксту, але і ўлік яго кантэксту, асобы аўтара і прычын таго, чаму ён напісаў тое ці іншае. Разуменне гэтага – важны крок да правільнага ўспрымання тэкстаў (гісторыі, навін, вершаў, песень і г. д.) і ўсведамлення каштоўнасцей, якія яны перадаюць.

Для таго каб прадэманстраваць праблему этнацэнтрызму, вы можаце, напрыклад, звярнуць увагу ўдзельнікаў на тое, што Саід з яго смуглай скурай і кучаравымі валасамі ўяўляе сабой выдатны прыклад чалавека, якога многія ў Еўропе не палічаць «нармальным». Важна таксама, каб у працэсе дыскусіі вы дапамаглі ўдзельнікам зразумець, што культурныя адрозненні не робяць людзей «лепшымі» або «горшымі» за іншых. Падкрэсліце, што цяжка судзіць непрадузята, бо мы лічым стандартам сваю ўласную культуру. Разуменне гэтага – гэта значыць свайго ўласнага этнацэнтрызму – важны крок да яго прызнання ў іншых, да ўмення наладзіць паспяховыя зносіны з прадстаўнікамі іншых культур.

У канцы занятку пакіньце некаторы час на тое, каб працягнуць абмеркаванне закранутых пытанняў. Напрыклад, пагаварыце пра выкладанне гісторыі і пра тое, як многа (ці як мала) мы, еўрапейцы, ведаем пра культуру іншых народаў.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**5 мая**
Дзень Еўропы

## Прапановы па далейшай працы

Калі вы хочаце больш дэталёва вывучыць ідэю ўсеагульнасці правоў чалавека, рэкамендуем выканаць практыкаванне «Сыграем гэта!» на старонцы 94, якое прадугледжвае творчыя і тэатральныя метады.

## Ідэі для дзеяння

Знайдзіце ў газетах і Інтэрнэце розныя версіі сучасных ці гістарычных падзей, што адбыліся ў вашай краіне (супольнасці), і параўнайце, як іх апісваюць розныя бакі (зацікаўленыя групы). Сайт Presse Europe – добрая крыніца навін, апублікаваных у розных газетах розных краін і на розных мовах (http://www.presseurop.eu/en).

Іншы рэсурс, Indymedia – аб'яднанне незалежных медыяарганізацый і соцень журналістаў, якія асвятляюць падзеі на месцах незалежна. Сайт даступны на розных мовах (http://www.indymedia.org/en/).

**Заўвага.**
Урыўкі ўзяты з выдання «Кніга разнавіднасцей нацый – навука ў Сярэднявеччы», аўтар Саід аль-Андалусі, пераклад Семаан І. Салем і Алок Кумар. Выдавецтва University of Texas Press, Осцін, 1991 год.

## Раздатачны матэрыял

**Віктарына «Усе розныя – усе роўныя»**

**a) Хто з'яўляецца аўтарам ніжэй прыведзенага тэксту? З якой кнігі або дакумента ён узяты?**

«Усе людзі зямлі – ад усходу да захаду, з поўначы і з поўдня – складаюць адзіную групу; (яны) адрозніваюцца па трох асноўных прыкметах: паводзіны, знешнасць і мова».

Выберыце адзін з наступных адказаў:

a) Дэкларацыя ЮНЕСКА аб расе і расавых забабонах, 1958 год
b) Герадот, «Запіскі падарожніка», 198 год да н. э.;
c) Індыйскія веды, каля 3000 гадоў да н. э.;
d) Даклад маладзёжнай кампаніі «Усе розныя – усе роўныя», Савет Еўропы, 1996 год;
e) Саід-аль Андалусі, 1029 год н. э. (420 год па мусульманскім летазлічэнні);
f) Марка Пола, «Падарожжы», 1300 год н. э.;
g) Ніводнае з вышэйпрыведзенага.

**b) З якой краіны (рэгіёну) свету аўтар наступнага тэксту?**

«Тыя, хто жывуць на крайняй Поўначы (Еўропы…), пацярпелі з-за аддаленасці ад сонца. Там паветра халоднае, а неба хмарнае. Таму тэмперамент у іх млявы, а паводзіны грубыя. Як вынік, целы ў іх сталі вялізнымі, скура – белай, а валасы звісаюць уніз. Яны страцілі праніклівасць і вастрыню ўспрымання. Іх адолелі невуцтва і лянота, яны пабіты бяссіллем і глупствам».

Выберыце адзін з наступных адказаў:

a) Кітай; b) Еўропа; c) Індыя; d) Афрыка; e) Персія; f) Ніводнае з вышэйпрыведзенага.

COMPASS

Дзеці

Праца

Глабалізацыя

Узровень 2

5+

90 хвілі

# Гісторыя Ашыка

*Дзіцячая праца дае неабходны заработак сем'ям і супольнасцям. Забараніце яе, і першымі будуць пакутаваць дзеці. Хіба вы не згодны?*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • дзеці,<br>• праца,<br>• глабалізацыя. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | 5+ |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне для абмеркавання. Зыходны пункт – гісторыя дзіцяці-рабочага. Удзельнікі даследуюць аспекты дзіцячай працы, яе прычыны і спосабы спынення. |
| **Звязаныя правы** | • абарона ад эканамічнай эксплуатацыі;<br>• права на адукацыю;<br>• права на адпачынак і вольны час. |
| **Мэты** | • пашырыць веды аб дзіцячай працы, асабліва ў кантэксце Мэт устойлівага развіцця;<br>• развіць навыкі крытычнага мыслення і аналізу складаных праблем;<br>• садзейнічаць замацаванню каштоўнасцей справядлівасці і адказнасці за пошук рашэнняў праблем парушэння правоў чалавека. |
| **Матэрыялы** | • копіі матэрыялаў «Факты з жыцця Ашыка», па адной на кожнага ўдзельніка;<br>• ручкі або маркеры, па адным на малую групу;<br>• папера для фліпчарта або вялікія лісты паперы (А3). |
| **Падрыхтоўка** | • зрабіце копіі табліцы «Ідэі для вырашэння» на вялікіх аркушах паперы фармату А3, па адным на малую групу плюс адзін для агульнага пасяджэння;<br>• азнаёмцеся з інфармацыяй аб дзіцячай працы, даведайцеся вызначэнне дзіцячай працы і наколькі шырока яна распаўсюджана;<br>• азнаёмцеся з мэтамі ўстойлівага развіцця. |

## Інструкцыі

1. Спытайце ўдзельнікаў, што ім вядома аб дзіцячай працы.
2. Растлумачце, што гэта практыкаванне грунтуецца на гісторыі Ашыка – дзіцяці з Пакістана, якое працуе на цагельным заводзе. Задача ўдзельнікаў – паспрабаваць знайсці магчымыя спосабы змены становішча Ашыка.
3. У якасці размінкі прапануйце «калектыўнае складанне аповесці». З дапамогай сваёй фантазіі ўдзельнікі павінны прыдумаць гісторыю аднаго дня з жыцця хлопчыка. Няхай кожны з удзельнікаў па чарзе дадае да апавядання па сказе.
4. Падзяліце ўдзельнікаў на малыя групы па пяць чалавек максімум. Дайце кожнай матэрыял «Факты з жыцця Ашыка» і 10 хвілін на чытанне і абмен думкамі.
5. Дайце кожнай групе табліцу з «Ідэямі для вырашэння». Растлумачце задачу: шляхам мазгавога штурму знайсці магчымыя рашэнні праблем Ашыка і іншых дзяцей-рабочых. Затым яны павінны запоўніць табліцу з прапановамі магчымых шляхоў вырашэння праблем «да заўтра», «да наступнага месяца» і «да 2030 года». Дайце 30 хвілін на выкананне задання і выбар дакладчыка ад кожнай групы.

6. На агульным пасяджэнні прапануйце ўдзельнікам па чарзе выказаць свае думкі па змесце кожнага слупка. Асноўныя ідэі запісвайце на фліпчарце. Дайце магчымасць абмеркаваць гэтыя ідэі, але памятайце пра час!
7. Калі табліца будзе запоўнена, пераходзьце да агульнага абмеркавання і аналізу.

## Аналіз і ацэнка

- Глыбіня абмеркавання залежыць ад агульнай эрудыцыі ўдзельнікаў, але паспрабуйце высветліць іх думкі як адносна дзіцячай працы, так і адносна магчымых рашэнняў праблемы.
- Што было вядома ўдзельнікам аб праблеме дзіцячай працы да занятку? Як яны пра гэта даведаліся? З якіх крыніц?
- Ці ёсць дзіцячая праца ў іх краіне (горадзе)? Якую працу выконваюць дзеці і чаму?
- Ці трэба дазваляць дзецям працаваць, калі яны гэтага хочуць?
- «Дзіцячая праца дае неабходны заработак сем'ям і супольнасцям. Забараніце яе, і першымі будуць пакутаваць дзеці». Ваша стаўленне да гэтага выказвання?
- Чым нам, як спажыўцам, выгадна дзіцячая праца?
- Ці цяжка было прыдумляць магчымыя меры па вырашэнні праблемы дзіцячай працы?
- Які з трох слупкоў («да заўтра», «да наступнага месяца» і «да 2030 года») аказалася цяжэй за ўсё запоўніць? Чаму?
- Праблеме дзіцячай працы было прысвечана нямала дэкларацый і канферэнцый як у асобных краінах, так і на міжнародным узроўні. Чаму ж гэта праблема ўсё яшчэ застаецца такой маштабнай?
- Якім чынам Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека і Канвенцыя аб правах дзіцяці абараняюць дзяцей ад эксплуатацыі?
- Хто нясе адказнасць за рашэнне праблемы? (Маркерам іншага колеру запішыце прапановы на фліпчарце.)
- Што могуць зрабіць звычайныя людзі, такія як мы, для таго, каб унесці свой уклад у дасягненне Мэт устойлівага развіцця, асабліва тых, якія тычацца ліквідацыі галечы і голаду, а таксама забеспячэння ўсеагульнай пачатковай адукацыі? Як і калі?

## Парады для фасілітатараў

Калі ўдзельнікі мала што ведаюць аб праблеме, азнаёмце іх у пачатку практыкавання з фактамі аб дзіцячай працы і яе наступствах. Заданне можна зрабіць больш інтэрактыўным, калі ўзяць статыстыку з графіка ў раздзеле «Дадатковая інфармацыя» і зрабіць на яе аснове невялікую віктарыну.

Нялішне будзе падкрэсліць, што датай дасягнення Мэт устойлівага развіцця з'яўляецца 2030 год і што гэтыя мэты выцякаюць з Мэт развіцця тысячагоддзя, якія ставіліся на 2015 год. 17 Мэт устойлівага развіцця адлюстроўваюць праблемы чалавечага жыцця ва ўсёй іх складанасці і ўзаемазалежнасці.

Тры з іх маюць непасрэднае дачыненне да гісторыі Ашыка:

- Мэта 1: паўсюдная ліквідацыя крайняй галечы ва ўсіх яе формах;
- Мэта 4: забеспячэнне ўсёахопнай і справядлівай якаснай адукацыі і заахвочванне магчымасцей навучання на працягу ўсяго жыцця для ўсіх;
- Мэта 8: садзейнічанне няўхільнаму, усёахопнаму і ўстойліваму эканамічнаму росту, поўнай і прадукцыйнай занятасці і дастойнай працы для ўсіх.

Для атрымання дадатковай інфармацыі аб Мэтах устойлівага развіцця глядзіце практыкаванне «Колькі нам патрэбна?» на старонцы 192 і на сайце www.undp.org.

Групам можа быць цяжка запоўніць першыя два слупкі («праз дзень», «праз месяц»), і гэта можа выклікаць пачуццё бяссілля і роспачы. Каб падбадзёрыць удзельнікаў, зачытайце наступную цытату:

«Задача вялікая, але не настолькі, каб быць празмерна цяжкай або невырашальнай. Нават развітыя краіны сутыкаюцца з праблемай дзіцячай працы. Гэта паказвае, што яе прычыны тлумачацца не недахопам рэсурсаў, а недахопам рашучасці. Давайце пакладзём гэтаму канец» (з рашэння індыйскага Вярхоўнага суда па справе М. Ч. Мехта супраць штата Тамілнад і іншых, Індыя, 1986 год).



**ВАЖНАЯ ДАТА**

**12 чэрвеня**
Сусветны дзень барацьбы з дзіцячай працай

Звычайна ўдзельнікі разумеюць, што для знаходжання эфектыўнага і доўгатэрміновага вырашэння праблемы спачатку неабходна вызначыць яе прычыны, з аналізу якіх рашэнне нярэдка выцякае само сабой. Гэта варта падкрэсліць асобна, асабліва калі нейкая група зайшла ў тупік. Вы можаце стымуляваць выпрацоўку новых ідэй, падказаўшы наступныя магчымыя рашэнні:

- змагацца з галечай, каб дзецям не трэба было працаваць;
- павялічваць зарплаты дарослых, каб дзецям не трэба было працаваць;
- удасканальваць адукацыю, каб яна была больш прывабнай і лепш адпавядала патрэбам дзяцей;
- распрацаваць міжнародныя нормы найму дзяцей на працу;
- забараніць прадукцыю, выробленую з выкарыстаннем дзіцячай працы;
- распрацаваць на міжнародным узроўні мінімальныя стандарты працы як умову членства ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА).

Каб зрабіць практыкаванне больш актуальным і цікавым, карыстайцеся бягучымі мясцовымі або міжнароднымі паведамленнямі аб выкарыстанні дзіцячай працы.

## Варыянты

Калі вы хочаце папярэдне забяспечыць удзельнікаў інфармацыяй аб дзіцячай працы, можна правесці віктарыну, напрыклад, узяць яе з сайтаў www.unicef.org або www.thinkquest.org.

Замест таго каб пачаць з «калектыўнага складання аповесці» (2 пункт інструкцыі), падзяліце ўдзельнікаў на малыя групы максімум па 5 чалавек. Раздайце кожнай групе па пяць аркушаў фармату А3 і папрасіце намаляваць пяць падзей звычайнага дня Ашыка і прадставіць малюнкі ў выглядзе комікса. Калі групы скончаць працу, папрасіце іх прадставіць свае гісторыі.

Фасілітатары, якія ўмеюць добра маляваць, могуць намаляваць гісторыю Ашыка ў выглядзе комікса, прадставіўшы кожную сцэну яго жыцця ў новым кадры. Не ўскладняйце комікс, уключыце ў яго толькі самую асноўную інфармацыю. Зрабіце копіі комікса (адну для кожнай групы) і выражце кадры. Раздайце кожнай групе па адным наборы малюнкаў і папрасіце скласці аповесць пра Ашыка, дадаючы кароткі тэкст або рэплікі персанажаў. Калі групы скончаць працу, папрасіце іх прадставіць свае аповесці.

## Прапановы па далейшай працы

Натхніце членаў групы на актыўны ўдзел у кампаніях па абароне правоў чалавека, расказаўшы, як дванаццацігадовы канадскі хлопчык разам са сваімі сябрамі заснаваў арганізацыю «Дзеці могуць вызваліць дзяцей», прачытаўшы ў газеце артыкул пра забойства дванаццацігадовага пакістанца, які працаваў на фабрыцы і выступіў супраць дзіцячай працы http://en.wikipedia.org/wiki/Free_the_Children.

Даведайцеся больш пра тое, як дзеці-рабочыя ў Перу арганізавалі Нацыянальны рух маладых перуанскіх рабочых, на сайце http://mnnatsop-natsperu.blogspot.com/ (на іспанскай мове).

Можна працягнуць занятак абмеркаваннем праблем няроўных магчымасцей для дзяцей у вашым грамадстве з дапамогай практыкавання «Зрабі крок наперад».

Калі вы хочаце даведацца больш пра Мэты ўстойлівага развіцця і параўнаць, колькі грошай спатрэбіцца для паляпшэння жыцця Ашыка, з тым, колькі трацяцца ў свеце на ваенныя сілы, звярніцеся да практыкавання «Колькі нам патрэбна» на старонцы 189.

Зрабіце гісторыю Ашыка больш асабістай для груп. Папрасіце ўдзельнікаў падумаць, дзе праходзіць мяжа, якая падзяляе працадаўцаў, якія эксплуатуюць такіх дзяцей, як Ашык, і працадаўцаў, якія плацяць абсурдна малыя зарплаты маладым людзям, якія працуюць па вечарах або нядзелях, каб зарабіць кішэнныя грошы ці ўтрымацца ў школе або ВНУ? Як наконт бацькоў, якія выкарыстоўваюць сваіх дзяцей для выканання работ па гаспадарцы або ў сямейным бізнесе? Якія асабісты вопыт маюць удзельнікі? Калі ўдзельнікі захочуць падрабязней разгледзець гэтыя ідэі, звярніцеся да практыкавання «Маё дзяцінства» у адукацыйным пакеце «Усе розныя – усе роўныя».

## Ідэі для дзеяння

Вы можаце прыняць удзел у некаторых кампаніях, напрыклад: http://www.cleanclothes.org, таксама можа пачаць выбіраць вопратку і іншыя рэчы, якія купляеце, у адпаведнасці з краінай вытворчасці. Паводле ацэнак МАП на 2013 год, з 2000 года колькасць непаўналетніх працаўнікоў ва ўсім свеце скарацілася на трэць (з 246 мільёнаў да 168 мільёнаў чалавек). Больш за палову з іх – 85 мільёнаў – выконваюць небяспечныя віды работ (у 2000 годзе іх колькасць дасягала 171 мільёна).

## Дадатковая інфармацыя

Паняцце «дзіцячая праца» адносіцца да найму дзяцей на пастаяннай і працяглай аснове. Многія міжнародныя арганізацыі лічаць такую практыку эксплуататарскай, і яна з'яўляецца незаконнай у многіх краінах. Дзіцячая праца адрозніваецца ад нерэгулярнай або частковай занятасці дзяцей або маладых людзей, якія зарабляюць сабе на кішэнныя выдаткі або ў якасці дадатку да стыпендыі. Аднак гэта не азначае, што той, хто зарабляе кішэнныя грошы, ніколі не падвяргаецца эксплуатацыі.

У главе 5 на сайце www.coe.int/compass у раздзеле дадатковай інфармацыі па тэмах «Дзеці» і «Праца» прыводзіцца больш інфармацыі пра дзіцячую працу, тавары, што выпрабляюцца дзецьмі, міжнароднае заканадаўства аб дзіцячай працы і наступствы дзіцячай працы для дзіцяці.

Прыведзеная ніжэй табліца паказвае колькасць дзяцей ад 5 да 17 гадоў, занятых у дзіцячай працы.

Колькасць дзяцей-рабочых, распаўсюджанасць дзіцячай працы і працы ў небяспечных умовах у групе ад 5 да 17 гадоў у розных рэгіёнах (2012 год)

| **Рэгіён** | **Дзеці-рабочыя** | | **Дзіцячая праца** | | **Праца ў небяспечных умовах** | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Лічбы | % | Лічбы | % | Лічбы | % |
| Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён | 129 358 | 15,5 | 77 723 | 9,3 | 33,860 | 4,1 |
| Лацінская Амерыка і краіны Карыбскага басейна | 17 843 | 12,5 | 12 505 | 8,8 | 9638 | 6,8 |
| Краіны Афрыкі на поўдзень ад Сахары | 83 570 | 30,3 | 59 031 | 21,4 | 28 767 | 10,4 |
| Блізкі Усход і Паўночная Афрыка | 13 307 | 12,1 | 9244 | 8,4 | 5224 | 4,7 |
| У цэлым у свеце ў 2012 годзе | **264 427** | **16,7** | **167 956** | **10,6** | **85 344** | **5,4** |

Спасылка. Даныя для Табліц 1 і 2 узяты з Глабальных ацэнак і тэндэнцый МАП у дачыненні да дзіцячай працы, 2000–2012 гады.

Заўвага: (а) сума рэгіянальных паказчыкаў меншая за сусветныя паказчыкі таму, што апошнія ўлічваюць краіны, якія знаходзяцца па-за межамі чатырох асноўных рэгіёнаў, якія пералічаны вышэй.

Размах праблемы дзіцячай працы такі, што па гэтай тэме існуе велізарная колькасць інфармацыі. Сярод карысных вэб-сайтаў сайты Міжнароднай арганізацыі працы (http://www.ilo.org), ЮНІСЕФ (http://www.unicef.org) і Фонду Save the Children (http://www.oneworld.org).

Даклад Фонду экалагічнай справядлівасці «Дзеці, якія стаяць за вытворчасцю нашай бавоўны» падрабязна апісвае неверагодныя ўмовы, у якіх знаходзяцца прыблізна адзін мільён дзяцей, некаторым з іх усяго 5 гадоў. Яны працуюць па 12 гадзін у спякоту і мароз, многія пакутуюць ад фізічнага, слоўнага і часам сексуальнага гвалту. http://www.ejfoundation.org/page481.html

## Раздатачныя матэрыялы

**Раздатачны матэрыял 1: факты з жыцця Ашыка**



**Асабістыя даныя**
Імя: Ашык Хашмір
Узрост: 11 гадоў
Грамадзянства: Пакістан
Сям’я: бацькі, дзед і бабка, сястра, 3 браты
Сямейны даход: каля 70 еўра ў месяц

**Даныя аб «прафесіянальнай дзейнасці»**
«Прафесія»: працоўны на цагельным заводзе
Працоўны час: 12–16 гадзін у дзень з паўгадзінным перапынкам, 6 дзён на тыдзень
Прадукцыйнасць: каля 600 цаглін у дзень
Зарплата: 1,3 еўра за 1000 цаглін (50 % ідзе на пагашэнне доўгу сям'і)
Стаж: працуе з пяцігадовага ўзросту

**Дадатковая інфармацыя**
Ужо два гады сям'я знаходзіцца ў даўгавой кабале: яна ўзяла ў доўг 6000 пакістанскіх рупій (110 еўра). На сённяшні дзень сума доўгу з працэнтамі складае 280 еўра. Бацька паслаў Ашыка ў школу на тры месяцы, але ўладальнік фабрыкі вярнуў яго на працу, а бацьку пакараў. Даходу сям'і не хапае ні на вучобу дзяцей у школе, ні на нармальнае харчаванне, ні на медыцынскую дапамогу.

Крыніца: http://www.freethechildren.org

**Раздатачны матэрыял 2: факты з жыцця Ашыка**
Што можна зрабіць у сітуацыі Ашыка і іншых дзяцей-працоўных?

| Да заўтра? | Да наступнага месяца? | Да 2030 года? |
|---|---|---|
| | | |

# Вернікі

*Правы чалавека ўяўляюць сабой універсальны стандарт. Яны з'яўляюцца кампанентам усіх рэлігій і цывілізацый.*

*Шырын Эбадзі*

| | | |
|---|---|---|
| **Складанасць** | узровень 3 | |
| **Тэмы** | • рэлігія і вера,<br>• культура і спорт,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць. | |
| **Памер групы** | любы (малыя групы па 4–5 чаавек) | |
| **Час** | 180 хвілін | |
| **Агляд** | Удзельнікі параўноўваюць і супрацьпастаўляюць розныя перакананні. | |
| **Звязаныя правы** | • свабода рэлігіі і перакананняў;<br>• свабода думкі і інфармацыі;<br>• свабода ад дыскрымінацыі. | |
| **Праблемы** | • рэлігійная разнастайнасць;<br>• успрыманне рэлігіі і яе ўплыву на жыццё маладых людзей;<br>• веды аб розных рэлігіях і іх пастановах адносна духоўных і свецкіх пытанняў. | |
| **Мэты** | • даведацца пра розныя сістэмы перакананняў і рэлігій;<br>• развіць крытычнае мысленне;<br>• развіць здольнасць прымаць разнастайнасць перакананняў і рэлігій. | |
| **Матэрыялы** | • копіі картак са сцверджаннямі (адзін камплект на малую групу);<br>• зручныя месцы для малых груп, дзе можна добра ўладкавацца і абмеркаваць заданне;<br>• адзін фасілітатар для кожнай малой групы. | |
| **Падрыхтоўка** | • нарэжце карткі;<br>• азнаёмцеся з даведачнай інфармацыяй аб рэлігіі і перакананнях у главе 5. | |

Рэлігія і вера

Культура і спорт

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Узровень 3

Любы памер групы (малыя групы: 4–5 чалавек)

180 хвілін

## Інструкцыі

1. Растлумачце, што ў гэтым практыкаванні ўдзельнікі будуць абмяркоўваць свае перакананні; нехта можа быць глыбока рэлігійным, іншыя – у меншай ступені, а нехта будзе атэістам. Мэта заключаецца ў тым, каб прыйсці да больш глыбокага разумення артыкула 18 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека праз абмен поглядамі і навучыцца думаць крытычна аб розных спосабах пошуку сэнсу жыцця.
2. Старанна растлумачце ўдзельнікам неабходнасць добра думаць пра тое, што яны гавораць і як выказваюцца. Абарона рэлігійных перакананняў, а таксама рэлігійных сімвалаў ад абразы і прыніжэння падпадае пад дзеянне права на свабоду рэлігіі. Тым не менш такая абарона павінна суадносіцца са свабодай думкі і выказвання меркавання і не азначае поўны імунітэт ад крытыкі рэлігійных перакананняў. Таму сумленнае, адкрытае пытанне заўсёды дапушчальна, тады як гаворка, поўная забабонаў і дыскрымінацыі, – не.
3. Падзяліце ўдзельнікаў на невялікія групы па 4–6 чалавек і папрасіце, каб яны 3–4 хвіліны паразважалі аб сваіх асабістых перакананнях. Напрыклад, калі яны вернікі, спытайце іх, наколькі поўна яны выконваюць рэлігійныя рытуалы, прадугледжаныя іх канфесіяй?
4. Затым, выкарыстоўваючы тэхніку «ледакола», папрасіце ўдзельнікаў расказаць, як яны ў першы раз прынялі ўдзел у рэлігійнай цырымоніі.
5. Зараз пакладзіце карткі тварам уніз у сярэдзіне групы. Скажыце ўдзельнікам, што ў іх ёсць адна гадзіна на абмеркаванне, таму трэба рабіць гэта хутка, каб прапрацаваць як мага больш картак. У выніку яны атрымаюць больш шырокі погляд на пытанні, а разабрацца ў тэмах, якія ўяўляюць асаблівую цікавасць, можна будзе пазней.

6. Растлумачце, што ў кожным раўндзе ўдзельнік бярэ картку, чытае яе ўслых, а затым каменціруе сцверджанне. Потым іншыя могуць унесці свой уклад, звярнуўшыся па прыклады да сваёй уласнай рэлігіі або адпаведнага вопыту.
7. Затым пераходзьце да новага раўнда гульні; няхай іншы гулец возьме картку.
8. Калі ўсе карткі будуць абмеркаваны або скончыцца час, пераходзьце да аналізу (у тых жа групах).

## Аналіз і ацэнка

- Ці сутыкнуліся ўдзельнікі з якімі-небудзь цяжкасцямі падчас абмеркавання тых ці іншых сцверджанняў? Чаму гэта адбылося?
- Ці здзівілі вас якія-небудзь факты, перакананні або адносіны да вашай уласнай жыццёвай пазіцыі?
- Што агульнага маюць людзі, нягледзячы на іх розныя жыццёвыя пазіцыі?
- Якія фундаментальныя адрозненні паміж жыццёвымі пазіцыямі ўдзельнікаў былі агучаны? Ці з'яўляюцца яны непрымірымымі?
- Чаму так важна ведаць аб жыццёвай пазіцыі іншых людзей? Наколькі вы недасведчаны ў гэтым плане? Ці варта вам ведаць пра гэта больш?
- Прымаючы да ўвагі, што свабода рэлігіі і перакананняў з'яўляецца правам чалавека, ці лёгка паважаць людзей, калі вы катэгарычна не згодны з іх жыццёвай пазіцыяй?
- Якую ролю адыгрываюць невуцтва і забабоны адносна розных жыццёвых пазіцыі ва ўспрыманні адным народам іншага?
- Ці ўсе людзі ў вашай краіне карыстаюцца свабодай рэлігіі і перакананняў? Калі не, то чаму гэта адбываецца?
- Якія формы парушэння свабоды рэлігіі і перакананняў сустракаюцца ў вашай краіне?
- У якой меры свабода думкі, сумлення і рэлігіі павінна ўлічваць практыку рэлігійных супольнасцей, якая можа адрознівацца ад той, што пераважае ў грамадстве? Прыкладамі такіх практык могуць стаць адрозненні ў падыходах да ўдзелу жанчын у рэлігійным жыцці супольнасці, традыцыйныя цырымоніі з удзелам дзяцей, законы, звязаныя з хрышчэннем, разводам ці пахаваннем, забарона на выяву заснавальніка і г. д.
- Што трэба мець на ўвазе пры планаванні мерапрыемстваў з удзелам усёй групы, напрыклад пікніка, спартыўных спаборніцтваў або выхадных, каб кожны незалежна ад рэлігіі або перакананняў мог прыняць удзел?
- Часам пры падрыхтоўцы такіх мерапрыемстваў можа быць цяжка задаволіць патрэбы ўсіх з улікам іх рэлігійных перакананняў. Як вы звычайна знаходзіце рашэнне? Калі вы вымушаны ісці на кампраміс, як вы вызначаеце прыярытэт патрэб розных людзей?
- Што было самым цікавым з таго, што вы даведаліся падчас працы над гэтым практыкаваннем?

## Парады для фасілітатара

У гэтым практыкаванні вы маеце справу з далікатнай тэмай, таму важна, каб кожны адчуваў сябе камфортна. Працуйце з практыкаваннем у спакойнай манеры; свабодная абстаноўка дапамагае справе. Пераканайцеся, што ўсе ведаюць пра тое, што ніхто на іх не аказвае ціску і не патрабуе, каб яны сказалі больш, чым хочуць або могуць.

Паважайце ўклад усіх удзельнікаў і прычыны, якія стрымліваюць іх: не кожны ў стане растлумачыць прычыны той ці іншай практыкі, прынятай у іх рэлігійным асяроддзі, асабліва калі гэты чалавек вырас і быў выхаваны ў рамках пэўнай рэлігіі з самага ранняга ўзросту. У такіх пытаннях рэлігія вельмі падобна да культуры: кожны схільны прымаць свае каштоўнасці і культурны ўклад як нешта «натуральнае».

Сцеражыцеся ціску асобных удзельнікаў на іншых. Не дазваляйце нікому займаць абарончую пазіцыю ў пытаннях аб іх рэлігійных перакананнях, напрыклад калі хтосьці скажа: «Як вы можаце быць адэптам гэтай рэлігіі і дапускаць…?».

Старайцеся не загразнуць у дэталях. Трымайце пад кантролем непрапрацаваныя карткі і сачыце за часам, каб яго хапіла для абмеркавання большасці з іх. Няхай дыскусія ідзе натуральным шляхам; умешвайцеся толькі тады, калі адчуеце, што пытанне вычарпана, або існуе небяспека зайсці занадта далёка, або на паверхню выходзяць адносіны «дамінавання».

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**16 лістапада**
Міжнародны дзень талерантнасці

Будзьце гатовы прывесці дадатковую інфармацыю, асабліва пра рэлігіі, не прадстаўленыя ў групе, або сыграць ролю «адваката д'ябла».

Калі гэта магчыма, выконвайце практыкаванне разам з памочнікам для вядзення абмеркавання і падвядзення вынікаў у малых групах; калі ў вас няма памочніка, праверце, ці нельга падрыхтаваць некалькі добраахвотнікаў з ліку ўдзельнікаў, каб яны выступілі ў гэтай ролі. У некаторых выпадках гэта можа быць важным, каб праявіць павагу да ўкладу і вопыту кожнага і забяспечыць канструктыўнасць абмеркавання. Калі вы не можаце спадзявацца на памочнікаў, то паспрабуйце правесці аналіз і ацэнку з усімі ўдзельнікамі разам.

Веру, па азначэнні, нельга растлумачыць з дапамогай рацыянальных аргументаў, і вы павінны стрымліваць спробы аспрэчыць рэлігійныя перакананні рацыянальнымі аргументамі. Вам, магчыма, трэба будзе падкрэсліць значэнне і важнасць павагі права кожнага чалавека на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі. Гэта не азначае, што вы павінны паважаць тое, у што вераць іншыя, але вы павінны паважаць іх права верыць у тое, у што яны хочуць верыць. Памятайце таксама, што развіццё крытычнага мыслення з'яўляецца важнай мэтай адукацыі ў галіне правоў чалавека і што параўнанне розных жыццёвых пазіцый дапаможа людзям усвядоміць, што іх выбар не адмяняе выбару іншых. Мы спадзяёмся, што падчас выканання гэтага дыскусійнага практыкавання ўдзельнікі прыйдуць да разумення, што іх выбар з'яўляецца не абсалютным, а адносным. Практыкаванне дапаможа таксама выявіць моцныя і слабыя бакі кожнай школы або традыцыі. Рэлігійны фанатызм і нецярпімасць звычайна вынікаюць са строгай выбіральнасці мыслення і адмовы ад плюралізму. Ніводная рэлігія не з'яўляецца маналітнай, і таму ніводная інтэрпрэтацыя нейкай рэлігіі не з'яўляецца самай аўтарытэтнай ці больш рэпрэзентатыўнай, чым іншыя інтэрпрэтацыі або іншыя рэлігіі, не кажучы ўжо пра перавагу над імі.

## Варыянты

Калі вы праводзіце практыкаванне з некалькімі малымі групамі, будзе добра скончыць працу адначасова. Перад тым, як удзельнікі падзеляцца на групы, і да сустрэчы на агульным пасяджэнні папрасіце іх разгледзець наступныя пытанні і быць гатовымі выказацца па іх пазней:

- Прывядзіце прыклады невуцтва і забабонаў пра рэлігійныя і нерэлігійныя традыцыі ў вашай краіне.
- Што мы можам зрабіць, каб невуцтва і забабонаў стала менш?

## Прапановы па далейшай працы

Калі вы выконваеце гэта практыкаванне ў монарэлігійнай групе, у вас будзе шмат магчымасцей для далейшага абмеркавання. Наведайце вэб-сайт http://www.religioustolerance.org і скапіруйце спіс рэлігій і нетэістычных рэлігій і этычных сістэм. Спытайце групу, што яны чулі і ведаюць пра іх.

Магчыма, вы захочаце паглыбіцца ў гісторыю развіцця розных перакананняў і прадставіць гэта ў графічным выглядзе. Азнаёмцеся з раздзелам «Варыянты» практыкавання «Храналогія правоў» на старонцы 303.

Паўлу Фрэйрэ сказаў: «Вучыць значыць верыць у змены». Калі група захоча абмеркаваць, што такое адукацыя і наколькі яна адказвае ці не адказвае патрэбам людзей, то яе можа зацікавіць практыкаванне «Пачуць голас кожнага» на старонцы 207.

## Ідэі для дзеяння

У залежнасці ад умоў, у якіх вы і ўдзельнікі жывяце і працуеце, вам можа быць цікава наведаць рэлігійны ці грамадскі цэнтр іншай рэлігіі і пазнаёміцца з іх маладзёжнымі групамі, каб абмеркаваць магчымыя сумесныя дзеянні. Яны могуць уключаць:

- мерапрыемства ў Міжнародны дзень правоў чалавека (10 снежня);
- узаемныя запрашэнні з нагоды важных рэлігійных свят (урачыстасцей);
- сумесныя дзеянні на карысць бедных.

## Дадатковая інфармацыя

Артыкул 18 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека абвяшчае: «Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэта права ўключае свабоду мяняць сваю рэлігію або перакананні і свабоду вызнаваць сваю рэлігію або перакананні як аднаасобна, так і разам з іншымі ў публічным або прыватным парадку падчас богаслужэння, навучання і выканання рэлігійных і рытуальных абрадаў».

Для вырашэння задач гэтага практыкавання і каб ахапіць найбольшую колькасць сістэм перакананняў, мы выкарыстоўваем вызначэнне рэлігіі, якое прыводзіцца на вэб-сайце www.religioustolerance.org: «Рэлігія – гэта любая канкрэтная сістэма вераванняў у бажаство, якая часта ўключае рытуалы, кодэкс этыкі і філасофію жыцця». Тэрмін «рэлігія» адносіцца як да асабістай практыкі, якая тычыцца веры супольнасці і групавых рытуалаў, так і да агульнай сістэмы прадстаўленняў, якая вынікае з перакананняў, якіх прытрымліваецца чалавек. Альтэрнатывамі рэлігіі з'яўляюцца атэізм, скептыцызм, вальнадумства і гуманізм.

У гэтым практыкаванні мы засяроджваем сваю ўвагу на «свабодзе думкі, сумлення і рэлігіі», гэта значыць на праве прытрымлівацца рэлігіі або не прытрымлівацца яе ў залежнасці ад асабістага выбару. Таму мы выкарыстоўваем тэрмін «жыццёвая пазіцыя» ў якасці агульнага канцэпту, які ўключае ў сябе як рэлігіі, так і альтэрнатывы рэлігіі без якой-небудзь дыскрымінацыі на карысць адной з іх. Пад «жыццёвай пазіцыяй» мы маем на ўвазе сукупнасць ідэй, якія дапамагаюць нам зразумець свет і знайсці сэнс і каштоўнасць жыцця. Многія жыццёвыя пазіцыі носяць відавочна рэлігійны характар, напрыклад хрысціянства, індуізм і іслам. Некаторыя жыццёвыя пазіцыі з'яўляюцца нерэлігійнымі, такія як дыялектычны матэрыялізм Карла Маркса і яго паслядоўнікаў, аб'ектывізм Айн Рэнд і гуманізм. Іншыя жыццёвыя пазіцыі, напрыклад будызм і канфуцыянства, традыцыйна адносяцца да рэлігіі, але многія іх паслядоўнікі не згодны з такой класіфікацыяй і сцвярджаюць, што, паколькі іх перакананні не ўключаюць ідэю бажаства, будызм і канфуцыянства з'яўляюцца філасофіямі. Панятце «жыццёвая пазіцыя» ахоплівае ўсё вышэйзгаданае.

Базавую, простую ў выкарыстанні інфармацыю аб асноўных канфесіях, якія існуюць ва ўсім свеце, можна знайсці на вэб-сайтах Аб'яднанай рэлігійнай ініцыятывы (www.uri.org) і Кансультантаў правінцыі Антарыа па пытаннях рэлігійнай талерантнасці (www.religioustolerance.org).

Гэта практыкаванне распрацавана на аснове практыкавання «Вернікі», якое змяшчаецца ў «Мазаіцы» – адукацыйным камплекце па Еўрапейска-Міжземнаморскай працы з моладдзю, апублікаваным у рамках партнёрства паміж Еўрапейскай камісіяй і Саветам Еўропы ў галіне працы з моладдзю.

**Карткі**

| | |
|---|---|
| У нас ёсць адмысловая цырымонія ініцыяцыі дзяцей у нашу жыццёвую пазіцыю. | У нас ёсць асаблівыя абрады і нормы пахавання. |
| Мужчыны і жанчыны маюць розныя функцыі і ролю ў нашай жыццёвай пазіцыі, напрыклад у асноўных цырымоніях. | Пэўны час у календары мы прысвячаем посту. |
| У імя маёй жыццёвай пазіцыі ўчыняліся або зараз учыняюцца злачынствы і дыскрымінацыя. | Нас вучаць дапамагаць бедным. |
| У нас асаблівы погляд на гомасексуальнасць. | Мы носім сімвалы або адмысловую вопратку. |
| Наша жыццёвая пазіцыя прадугледжвае спецыфічныя маральныя нормы і запаведзі, якія тычацца шлюбу і сексуальнасці. | Мы прытрымліваемся асаблівых поглядаў на аборт. |
| Наша жыццёвая пазіцыя заснавана на святых кнігах або пісаннях. | Мы верым у каштоўнасць жыцця як найбольш важнае, што трэба захоўваць. |
| Наша жыццёвая пазіцыя вучыць талерантнасці да іншых рэлігій і канфесій. | Наша жыццёвая пазіцыя ў значнай меры сфарміравана прарокамі, якія прызнаюцца носьбітамі боскіх паведамленняў. |
| Мы верым у жыццё пасля смерці і ў судны дзень. | У нас ёсць важныя святы, якія лічацца нацыянальнымі ў нашых краінах. |
| Мы шануем мёртвых па меншай меры адзін раз у год і наведваем магілкі. | У нас ёсць свой уласны каляндар, які часта адрозніваецца ад грамадзянскага. Наш Новы год выпадае не на 1 студзеня. |
| Мы арганізуем школы і класы, дзе дзеці вывучаюць нашу жыццёвую пазіцыю. | Мы лічым, што жыццё ўключае не толькі матэрыяльныя рэчы, але і мае важнае духоўнае вымярэнне. |
| У нас ёсць уласныя гісторыі пра тое, як быў створаны свет. | У нас ёсць пэўныя ўяўленні аб тым, з кім уступаць ці не ўступаць у шлюб. |
| Наша жыццёвая пазіцыя ахоплівае не толькі духоўныя пытанні але і грамадскі ўклад. | Нас часта не разумеюць і нярэдка ўціскаюць. |
| Нам трэба маліцца некалькі разоў на дзень. | Адзін дзень у тыдзень нам нельга працаваць і трэба прысутнічаць на богаслужэнні. |
| Мы лічым, што ў нас ёсць асаблівыя адносіны з Богам. | Мы кантралюем уласнае жыццё. |
| Мы лічым, што сэнс і мэта жыцця ў пастаянным творчым пошуку. | У цэнтры нашай жыццёвай пазіцыі – любоў. |
| Наша жыццёвая пазіцыя дае этычную аснову і дакладна апісвае маральныя каштоўнасці. | Рытуалы, прадугледжаныя нашай жыццёвай пазіцыяй, дапамагаюць дасягнуць духоўнасці, пачуцця здзіўлення з таго, што мы з'яўляемся часткай чагосьці большага, чым мы самі. |

Глабалізацыя

Навакольнае асяроддзе

Грамадзянскасць і ўдзел

Узровень 3

Любы памер групы (малыя групы па 5–8 чалавек)
Частка 1: 45 хвілін.
Частка 2: не вызначана.
Частка 3: не вызначана

# Увага, мы ўсё бачым!

*«Ніхто не рабіў большай памылкі, чым той, хто нічога не рабіў толькі таму, што мог зрабіць толькі нямногае.»*

Эдмунд Бёрк

| | |
|---|---|
| **Складанасць** | узровень3 |
| **Тэмы** | • глабалізацыя,<br>• навакольнае асяроддзе,<br>• грамадзянскасць і ўдзел. |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі даведваюцца пра сацыяльны, эканамічны і экалагічны кошт баваўнянай футболкі. Потым яны пераходзяць да планавання і прыняцця мер для вырашэння парушэння звязаных правоў чалавека. |
| **Звязаныя правы** | • права выбіраць працу па жаданні і ўступаць у прафсаюзы;<br>• права на дастатковы ўзровень жыцця;<br>• права на бяспечнае і здаровае навакольнае асяроддзе. |
| **Памер групы** | • любы (малыя групы па 5–8 чалавек) |
| **Час** | • Частка 1: 45 хвілін. Частка 2: не фіксіравана. Частка 3: не фіксіравана. |
| **Мэты** | • даведацца больш аб глабальнай прыродзе індустрыі вытворчасці адзення і зразумець сапраўдны кошт адзення, якое мы купляем;<br>• развіць навыкі аналізу інфармацыі, планавання і прыняцця мер;<br>• стымуляваць творчасць, фантазію і актыўнасць. |
| **Матэрыялы** | • фліпчарт і маркеры;<br>• раздатачны матэрыял. |
| **Падрыхтоўка** | • зрабіце копіі інфармацыйнага лістка, па адной для кожнага ўдзельніка;<br>• памятайце пра тое, што вы павінны падтрымліваць удзел членаў групы. |

## Інструкцыі

### Частка 1. Азнаямленне з праблематыкай

1. Растлумачце групе, што вы збіраецеся абмеркаваць вопратку, якую яны купляюць, а таксама сацыяльныя, эканамічныя і экалагічныя наступствы таго ці іншага выбару.
2. Папрасіце ўдзельнікаў паглядзець на этыкеткі іх футболак або світараў, каб даведацца, дзе і з чаго яны зроблены. Колькі яны каштавалі? Намалюйце на фліпчарце табліцу і запішыце краіны і цэны.
3. Спытайце, ці з'яўляюцца грошы адзіным параметрам выбару, а потым раздайце лісткі з інфармацыяй «Разлік сапраўднага кошту бавоўны» і «Сапраўдны кошт адной баваўнянай футболкі» і дайце ўдзельнікам 5 хвілін, каб азнаёміцца з данымі.
4. Затым з дапамогай мазгавога штурму пералічыце праблемы, якія выкрывае гэта інфармацыя, напрыклад правы працоўных, уключаючы дзіцячую працу, выкарыстанне рэсурсаў (вады і паліва), наступствы глабалізацыі, шкода пестыцыдаў і іншых таксічных рэчываў для навакольнага асяроддзя і наступствы глабалізацыі.
5. Спытайце групу, як зараз, у святле гэтых ведаў, яны ўспрымаюць куплю футболкі. Якія меры яны могуць прыняць для спынення парушэнняў? Выпрацуйце пры дапамозе мазгавога штурму ідэі практычных дзеянняў, напрыклад лепш даглядаць за адзеннем, каб яно не так хутка зношвалася, у будучыні купляць толькі «этычныя» футболкі або запусціць кампанію ў мясцовай супольнасці, каб расказаць сваім аднагодкам пра гэтыя праблемы. Абмяркуйце, якія ідэі ўдзельнікаў здаюцца найлепшымі. Прапануйце знайсці больш інфармацыі па гэтых пытаннях і ацаніць магчымасць здзяйснення гэтых ідэй.

**Частка 2. Рашэнні і практычныя дзеянні**

6. Няхай удзельнікі прааналізуюць праведзеныя даследаванні, знойдуць найлепшыя ідэі і вырашаць, якія меры трэба прыняць.
7. Папрасіце іх разбіцца на малыя групы ў залежнасці ад тыпу мер, якія яны хочуць рэалізаваць, і падрыхтаваць кароткі канспект прапановы, які павінен уключаць:
   - выразныя мэты і задачы;
   - апісанне прапанаванага мерапрыемства (байкот, канцэрты, тэле- або радыёпраграмы, вулічныя паказы, раздача лістовак і г. д.), а таксама пералік прычын такога выбару;
   - графік падрыхтоўкі мерапрыемства і яго правядзення;
   - месцы, дзе будзе праводзіцца мерапрыемства (школы, грамадскія будынкі і г. д.);
   - меркаваны кошт і неабходныя рэсурсы.
8. Папрасіце кожную групу прадставіць свае праекты, затым папрасіце ўсіх пракаментаваць і ўнесці свае прапановы для магчымага паляпшэння.

**Частка 3. Рэалізацыя**

- Выберыце адно мерапрыемства, каб у ім удзельнічала ўся група, альбо дазвольце ўдзельнікам працаваць у малых групах у адпаведнасці з выбраным імі мерапрыемствам;
- у канцы мерапрыемства або кампаніі ацаніце, як яны прайшлі і чаго дабілася група.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**Другая субота мая**
Сусветны дзень справядлівага гандлю

## Аналіз і ацэнка

**Пасля часткі 1:**

- Ці з'яўляецца грашовы кошт самым важным? Калі не, то чаму?
- Наколькі важны сацыяльны, эканамічны і экалагічны кошт? Ці ёсць кампанент кошту, які важнейшы за іншых? Якія правы чалавека парушаюцца?
- Колькі вы гатовы заплаціць за футболку?
- Што ўплывае на поспех кампаніі?
- Ці лічыце вы, што арганізацыі, якія працуюць у сферы абароны правоў чалавека, такія як НГА, міжнародныя арганізацыі, агенцтвы ААН і арганізацыі, якія праводзяць антыглабалісцкія кампаніі, дасягаюць рэальных вынікаў? Чаму?

**Пасля часткі 2:**

- Ці проста было дамовіцца аб плане дзеянняў? Ці ўсе задаволены тым, як у малых групах прымаліся рашэнні? Чаму?
- Чаму былі абраны менавіта такія мерапрыемствы?
- Ці ўсё адчувалі сябе часткай працэсу? Чаму?
- Супраць парушэння якіх правоў чалавека накіраваны мерапрыемствы кожнай групы?

**Пасля 3 часткі:**

- Як прайшло мерапрыемства ці кампанія? Ці ўсё прайшло па плане? Чаму?
- Што трэба будзе ўлічыць у наступны раз?
- Ці ўсе адчувалі ўцягнутымі ў працэс і карыснымі? Калі не, то чаму і што можна палепшыць у наступны раз?
- Чаму яшчэ вы навучыліся, выконваючы гэта практыкаванне і прымаючы канкрэтныя меры?

## Парады для фасілітатараў

Добра падрыхтуйцеся. Прачытайце главу 3, раздзел «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека» для лепшага разумення спосабаў ажыццяўлення практычнай дзейнасці і яе арганізацыі. Таксама прачытайце аб лесвіцы ўдзелу Харта ў дадатковай інфармацыі па тэме «Грамадзянскасць і ўдзел» на сайце www.coe.int/compass.

У дадатковай інфармацыі па тэме «Глабалізацыя» на сайце www.coe.int/compass вы знойдзеце больш інфармацыі аб транснацыянальных кампаніях. Перад тым, як пачаць гэта практыкаванне, праверце, ці мае кампанія Clean Clothes Campaign ці іншая падобная арганізацыя філіялы ў вашай краіне.

Увага, мы ўсё бачым!

Даведайцеся, якія акцыі праводзіць кампанія Clean Clothes Campaign. Магчыма, у вас атрымаецца выкарыстаць іх гатовы інструментарый. Так прасцей дзейнічаць, напрыклад, выкласці відэа ад Clean Clothes Campaign пра спартыўную вопратку на сайце ці ў блогу групы, чым ствараць матэрыялы для інфармавання грамадскасці самому. Аднак адна з мэт гэтага практыкавання – заахвочваць удзел і творчы падыход. Такім чынам, вам варта падкрэсліць, што ўдзельнікі маюць абсалютную свабоду для «вынаходства» любой новай стратэгіі правядзення кампаніі.

Калі вы хочаце ацаніць кошт з пункту гледжання вугляроднага следу, вы можаце выкарыстаць даныя «Экаметрыкі», якая правяла ацэнку вугляроднага следу адзення, узяўшы ў якасці прыкладу 3 пары сподняй бялізны. У сподняй бялізне і футболкі, верагодна, будуць падобныя паказчыкі, хоць споднюю бялізну, магчыма, мыюць часцей, затое прасуюць радзей. Вынік – 57 кілаграм вуглякіслага газу за ўвесь перыяд існавання. Наведайце сайт www.ecometrica.co.uk і пашукайце па запыце “apparel fact sheet” (факты пра адзенне).

## Варыянты

Вы можаце развіць першую частку практыкавання, каб натхніць удзельнікаў глыбей задумацца аб сапраўдным кошце, таму:

1. Пачніце, спытаўшы ўдзельнікаў аб кошце іх футболкі, і падлічыце сярэдні кошт.
2. Затым папрасіце іх паглядзець на этыкетках футболак, дзе яны былі зроблены.
3. Затым папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на малыя групы і з дапамогай мазгавога штурму зрабіць спіс усіх этапаў працэсу вытворчасці ад вырошчвання бавоўны да рознічнага продажу тавару ў краме.
4. Зноў сабраўшы ўсіх у адну групу, параўнайце спісы і зрабіце адзін агульны, які сумуе розныя элементы пад агульнымі загалоўкамі, напрыклад «транспарціроўка», «працоўныя выдаткі», «выкарыстанне энергіі» і г. д.
5. Затым, зноў разбіўшы ўдзельнікаў на малыя групы, папрасіце іх ацаніць кошт кожнага пункта, напрыклад вырошчванне бавоўны, агульныя працоўныя выдаткі, транспарціроўка і г. д.
6. Усе разам абмяркуйце ацэнкі кожнай групы.
7. Нарэшце, раздайце лісткі з інфармацыяй і папрасіце іх пракаментаваць.

## Прапановы па далейшай працы

Звяжыцеся з філіялам кампаніі Clean Clothes Campaign у вашай краіне, каб працягнуць распачатую ў групе працу.

Вы можаце правесці даследаванне на прадмет справядлівага гандлю спартыўным абуткам; па гэтай спасылцы вы знойдзеце статыстыку сапраўднага кошту спартыўнага абутку: http://www.vetementspropres.be

Магчыма, групе будзе цікава больш дасканала вывучыць пытанні і праблемы, звязаныя з карпаратыўнай сацыяльнай адказнасцю. Напрыклад, многія акцыі і мерапрыемствы з высакароднымі матывамі атрымліваюць фінансаванне ад кампаній, адказных за парушэнне правоў чалавека. Такія кампаніі таксама могуць забруджваць навакольнае асяроддзе падчас вытворчага працэсу. Група можа абмеркаваць пытанні, узнятыя ў наступнай заяве Джэрэмі Джыл, рэжысёра і заснавальніка арганізацыі Peace One Day: «З пункту гледжання Peace One Day, мы не маглі б існаваць ці дзейнічаць без карпаратыўных спонсараў. Мая пазіцыя простая. Я перакананы, што, каб паўплываць на ланцужок паставак, нам неабходна «быць заадно». Вельмі цяжка, верагодна нават немагчыма, знайсці кампанію, ланцужок паставак якой цалкам на 100 % адпавядае міжнародным законам у галіне правоў чалавека ці заканадаўству аб гандлі, хаця, вядома, гэта вельмі пажадана».

Інфармацыю пра гэты канкрэтны прыклад можна знайсці на сайтах www.peaceoneday.org і http://www.clearingthehurdles.org.

Калі група захоча даведацца больш аб праве на жаданую працу і ўступленне ў прафсаюзы, можна выканаць практыкаванне «Гісторыя Ашыка» на старонцы 100, якое разглядае праблемы дзіцячай працы, або практыкаванне «Пасяджэнне прафсаюза» на старонцы 312. Калі група вырашыць паглыбіцца ў пытанне аб спартыўнай вопратцы і разгледзець іншыя аспекты правоў чалавека, звязаныя са спортам, вы можаце працягнуць занятак практыкаваннем «Хвіліначку» на старонцы 199.

## Ідэі для дзеяння

Працягніце пачатую працу, аб'яднаўшыся з іншымі мясцовымі зацікаўленымі групамі, і адзначце Сусветны дзень справядлівага гандлю. Добрай крыніцай натхнення паслужыць сайт http://www.wftday.org/.
Атрыманыя веды і набыты вопыт правядзення мерапрыемстваў можна таксама ўжыць, каб правесці кампанію па іншых пытаннях, якія хвалююць групу. На працягу года ўзнікае мноства магчымасцей аб’яднаць намаганні з іншымі зацікаўленымі бакамі і арганізаваць мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне інфармаванасці грамадства аб іншых праблемах у галіне правоў чалавека, напрыклад аб правах жанчын у Міжнародны жаночы дзень 8 сакавіка, аб правах бежанцаў 20 чэрвеня і аб правах чалавека 10 снежня. Супрацоўнічаючы з іншымі групамі і арганізацыямі, вы прадэманструеце сваю салідарнасць у барацьбе за правы чалавека, знойдзеце новых сяброў, добра праведзяце час і шмат чаму навучыцеся.

## Дадатковая інфармацыя

Многія арганізацыі працуюць для забеспячэння справядлівай вытворчасці і справядлівага гандлю. Скарыстайце пошукавую службу, каб знайсці арганізацыі, якія дзейнічаюць у вашым раёне. У такіх арганізацый ёсць партнёры ў многіх еўрапейскіх краінах:

- www.cleanclothes.org змяшчае вялікую колькасць інфармацыі і праводзіць кампаніі, у якіх вы можаце прыняць удзел;
- на сайце http://www.organicconsumers.org кампаніі Clothes for a Change можна прачытаць артыкул «Ці была ваша футболка зроблена дзецьмі?»;
- марка People Tree з'яўляецца піянерам справядлівага гандлю ў свеце моды: http://www.peopletreefoundation.org/;
- даклад фонду Environmental Justice Foundation «Дзеці, якія стаяць за вытворчасцю нашай бавоўны» падрабязна апісвае неверагодныя ўмовы, у якіх знаходзіцца прыблізна адзін мільён дзяцей, некаторым з іх усяго 5 гадоў. Яны працуюць па 12 гадзін у спякоту і мароз, многія пакутуюць ад фізічнага, слоўнага і часам сексуальнага гвалту: http://www.ejfoundation.org;
- мэта фонду Fair Wear Foundation – палепшыць умовы працы ў сферы вытворчасці адзення: http://fairwear.org;
- сетка Fair Trade Resource Network – інфармацыйная платформа, распрацаваная для пашырэння справядлівага гандлю і для таго, каб «стварыць рынак, дзе шануюць людзей, якія вырабляюць прадукты, якія мы ядзім, і тавары, якімі мы карыстаемся»: www.ftrn.org;Іграй
- кампанія Play Fair – гэта кааліцыя груп, якія абараняюць правы працоўных. Яна імкнецца прымусіць спартыўныя брэнды, якія вырабляюць прадукцыю для Алімпійскіх гульняў, адмовіцца ад патагонных прадпрыемстваў у сваім ланцужку паставак і паважаць правы чалавека ў галіне працы: www.clearingthehurdles.org.

## Раздатачныя матэрыялы

**Адсочванне сапраўднага кошту бавоўны**

Футболкі з бавоўны – прадукт, атрыманы ў выніку працы розных глабальных кампаній, вытворчыя магутнасці якіх размешчаны практычна ў кожнай краіне свету. Прыклад прыводзіцца ніжэй.

Стандартная баваўняная ферма ў Буркіна-Фасо – зямельнае ўладанне адной сям'і, якая здольна апрацаваць 6–8 гектараў зямлі. Адзін кілаграм бавоўны-сырцу, выробленага ў Буркіна-Фасо, каштуе 0,23 еўра. Для многіх вытворцаў бавоўны грошы, атрыманыя з яе продажу, – адзіны заробак за ўвесь год.

З фермы бавоўна перавозіцца на бавоўнаачышчальную фабрыку для вытворчасці баваўнянага пуху. Гэты працэс падымае кошт за кілаграм да 0,56 еўра. Працоўным плацяць 73,40 еўра адзін раз у два тыдні.

Затым бавоўна перавозіцца ў порт Ламэ ў Тога, дзе яе прадаюць гандлярам па цане 0,88 еўра за кілаграм. Каля паловы бавоўны прадаецца ў Кітай: яе грузяць на судны, якія ідуць у такія парты, як Шанхай, дзе яе прадаюць на мясцовыя прадзільныя фабрыкі па цане 0,97 еўра за кілаграм. Большасць рабочых на фабрыках родам з бедных рэгіёнаў, часта з сельскай глыбінкі. Яны жывуць у інтэрнатах пры фабрыках і працуюць вельмі шмат за вельмі невялікую плату.

Затым адзенне, якое вырабляецца для мноства вядомых заходніх брэндаў, нярэдка на той жа вялікай фабрыцы, на якой прадзецца пража, адпраўляецца ў порт на экспарт. Сярэдняя цана футболкі, якая імпартуецца ў ЗША, складае 1,10 еўра, але крамы на Манхэтэне прадаюць дзве футболкі за 14,70 еўра.

Бавоўна, якая ў Афрыцы каштавала 0,56 еўра за кілаграм, цяпер каштуе 18,40 еўра за кілаграм.

Гэта інфармацыя ўзята з Інтэрнэту, з праграмы канала навін BBC «Адсочванне сапраўднага кошту бавоўны» ад 2 мая 2007 года.

**Сапраўдны кошт адной баваўнянай футболкі**

- выкарыстанне вады: 2157 літраў (45 % выкарыстоўваецца для ірыгацыі);
- выкарыстанне энергіі: 8 кілават-гадзін (28 800 000 джоўляў) электраэнергіі для прадзільных і швейных машын, 41,6–110 літраў паліва для транспарціроўкі па сушы і морам;
- аддегласць транспарціроўкі: 8851–15 128 км і больш;
- выкіды газу: NOx, CO, $CO_2$, (парніковыя газы) $SO_2$, $N_2O$, лятучыя злучэнні;
- таксічныя рэчывы: 1–3 г пестыцыдаў, дызельныя выхлапы, цяжкія металы (фарбавальнікі);
- кошт імпарту: 0,44–0,77 еўра;
- дзіцячая праца: у 17 краінах сярэдняя зарплата складае 0,37 еўра ў дзень;
- іншае: 53–91 г угнаенняў.

Крыніца: Earth Intelligence Network,
http://true-cost.re-configure.org/
http://forum.re-configure.org

# Можна ўвайсці?

*Бежанцы, вяртайцеся дадому! – Яны б вярнуліся, калі б маглі.*

**Складанасць**
- узровень 3

**Памер групы**
- 6–20 чалавек

**Час**
- 60 хвілін

**Тэмы**
- міграцыя,
- дыскрымінацыя і нецярпімасць,
- мір і гвалт.

**Агляд**

Гэта практыкаванне ўяўляе сабой ролевую гульню, прысвечаную групе бежанцаў, якія спрабуюць перабрацца ў іншую краіну. У ім разглядаюцца наступныя пытанні:
- бядотнае становішча бежанцаў;
- сацыяльна-эканамічныя аргументы за і супраць забеспячэнне прытулкам.

**Звязаныя правы**
- права шукаць прытулак у іншых краінах;
- права на невыдварэнне (права не быць дэпартаваным у сваю краіну, дзе бежанцам могуць пагражаць праследаванне або смерць);
- свабода ад дыскрымінацыі.

**Мэты**
- паглыбіць веды пра бежанцаў і іх правы;
- выпрацаваць навыкі выкладання аргументаў і фармуліроўкі меркаванняў;
- стымуляваць салідарнасць з людзьмі, якія былі раптоўна вымушаны пакінуць свае дамы.

**Матэрыялы**
- ролевыя карткі;
- фліпчарт або дошка для пісьма;
- крэйда або якая-небудзь мэбля для імітацыі кантрольна-прапускнога пагранічнага пункта;
- ручкі і папера, каб назіральнікі маглі рабіць нататкі.

**Падрыхтоўка**
- размножце ролевыя карткі, раздайце па адной картцы для кожнага пагранічніка, бежанца і назіральніка;
- аформіце сцэну для ролевай гульні. Напрыклад, намалюйце на падлозе лінію, якая будзе азначаць мяжу, або расстаўце мэблю, каб стварыць фізічную мяжу з праходам для кантрольна-прапускнога пункта. Выкарыстайце стол у якасці стойкі пагранічнага кантролю ў офісе;
- азнаёмцеся з інфармацыяй пра бежанцаў і іх становішчы ва ўсім свеце.

Міграцыя

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Мір і гвалт

Узровень 3

6–20 чалавек

60 хвілін

## Інструкцыі

1. Растлумачце, што гэта ролевая гульня, у цэнтры якой – група бежанцаў, якія пакінулі радзіму ў пошуках бяспекі і хочуць уехаць у іншую краіну.
2. Пачніце з мазгавога штурму, каб высветліць веды ўдзельнікаў аб бежанцах. Запішыце асноўныя моманты на вялікім лісце паперы або на фліпчарце, каб вярнуцца да іх пазней падчас дыскусіі.
3. Пакажыце ўдзельнікам месца дзеяння і растлумачце сітуацыю. Скажыце, што яны знаходзяцца на мяжы паміж краінамі X і Y. Прыбыла вялікая колькасць бежанцаў. Яны хочуць перасекчы мяжу і ўехаць у краіну Y. Яны галодныя, стаміліся і замерзлі, бо прайшлі доўгі шлях ад сваіх краін P, Q і R. У некаторых з іх ёсць трохі грошай, а пасведчанняў асобы ці пашпартоў няма амаль што ні ў каго. Пагранічнікі з краіны Y маюць розныя пункты гледжання на сітуацыю, якая склалася. Бежанцы ў адчаі і прыводзяць розныя аргументы, каб паспрабаваць пераканаць пагранічнікаў упусціць іх.

4. Падзяліце ўдзельнікаў на тры групы: адна група будзе прадстаўляць бежанцаў, другая – пагранічную службу ў краіне Y, а трэцяя выступіць у якасці назіральнікаў.
5. Скажыце «бежанцам» і «пагранічнікам» распрацаваць пэўную ролю для кожнага чалавека і іх аргументы. Скажыце назіральнікам, што ім трэба будзе даць зваротную сувязь. Раздайце ролевыя карткі і дайце ўдзельнікам пятнаццаць хвілін на падрыхтоўку.
6. Пачніце ролевую гульню. Вам трэба будзе самастойна вырашыць, калі яе спыніць, але дзесяці хвілін звычайна дастаткова.
7. Дайце назіральнікам пяць хвілін, каб падрыхтаваць зваротную сувязь; затым пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

**Аналіз і ацэнка**

Спачатку папрасіце назіральнікаў выказаць сваё меркаванне аб ролевай гульні ў цэлым. Затым выслухайце каментарыі гульцоў пра тое, як яны адчувалі сябе ў ролях бежанцаў або пагранічнікаў, пасля чаго пераходзьце да агульнага абмеркавання тэмы і таго, што даведаліся ўдзельнікі. Задайце наступныя пытанні:

- Наколькі справядлівым было абыходжанне з бежанцамі?
- Бежанцы маюць права на абарону згодна з артыкулам 14 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і Канвенцыі аб статусе бежанцаў, прынятай у 1951 годзе. Ці атрымалі бежанцы права на абарону? Чаму?
- Ці можа краіна мець права адмовіць бежанцам у прытулку? Калі? Па якіх прычынах?
- Калі б вы былі пагранічнікам, ці адмовілі б вы каму-небудзь? А калі б ведалі, што ў іх краіне іх чакае смерць?
- Як бежанцаў сустракаюць на межах вашай краіны? Ці парушаюцца якія-небудзь з іх правоў чалавека? Якія канкрэтна?
- Што можна і трэба зрабіць у першую чаргу для таго, каб людзі не станавіліся бежанцамі?

**Парады для фасілітатара**

Сітуацыя з бежанцамі вельмі моцна адрозніваецца па ўсёй Еўропе, і вам трэба добра падумаць, як саставіць сцэнарый і адаптаваць практыкаванне да пастаўленых мэт. Карысна прыдумаць кароткую перадгісторыю пра выдуманыя краіны X і Y, дзе адбываецца дзеянне, краіну Z, якая ляжыць далёка за краінамі Y і P, Q і R, адкуль паходзяць бежанцы.

Знайдзіце інфармацыю аб вызначэннях бежанца, асобы ў пошуках прытулку (глядзіце ў даведачным раздзеле аб міграцыі). Таксама звярніце ўвагу на асноўныя краіны паходжання бежанцаў і колькасць бежанцаў у суседніх краінах. Акрамя таго, праверце, колькі бежанцаў жыве ў вашай краіне і ў іншых еўрапейскіх краінах. Інфармацыю пра гэта можна знайсці на вэб-сайце unhcr.org.

Правядзіце мазгавы штурм, каб высветліць, што ўдзельнікі ўжо ведаюць пра прычыны існавання бежанцаў, пра тое, што вымушае людзей бегчы са сваіх краін, з якіх краін яны прыбываюць і ў якія краіны накіроўваюцца. Гэта дапаможа вам вырашыць, як праводзіць аналіз і ацэнку і якая дадатковая інфармацыя можа спатрэбіцца ўдзельнікам на гэтым этапе.

Падумайце, як паступіць, калі сярод удзельнікаў ёсць бежанец. Калі ён не супраць, вы маглі б абапірацца на яго вопыт і выкарыстаць яго ў якасці спецыяліста.

Тры групы неабавязкова павінны быць роўнымі па колькасці ўдзельнікаў. Напрыклад, у групу назіральнікаў вы можаце ўключыць толькі трох ці чатырох чалавек, а астатнія будуць непасрэднымі ўдзельнікамі гульні. У рэальным жыцці, хутчэй за ўсё, бежанцаў намнога больш за пагранічнікаў, і вы можаце адлюстраваць гэта ў ролевай гульні. Добра даць назіральнікам ролю «журналістаў», якія павінны скласці справаздачу і прадставіць яе ў рамках падвядзення вынікаў.

Падумайце, чаго вы хочаце дасягнуць з дапамогай гэтага практыкавання і як лепш абсталяваць сцэну з улікам гэтага. Ці з'яўляюцца вашы бежанцы гуртам змораных, галодных людзей у роспачы? У гэтым выпадку вы маглі б правесці практыкаванне на адкрытым паветры ў лесе ці на рацэ або возеры, калі вашы ўцекачы павінны прыбыць у перапоўненай лодцы, якая працякае. Калі вы знаходзіцеся ў памяшканні і хочаце разыграць сцэну ў цёмную, халодную ноч, можна выключыць святло і адчыніць вокны. Калі ж вашы бежанцы прыбываюць невялікімі групкамі і спрабуюць перасекчы мяжу ў афіцыйным месцы, стварыце «офіс», дзе службовыя асобы могуць (хутка) правяраць пашпарты бежанцаў і пытаць, адкуль яны прыехалі.

Перагледзьце ролевыя карткі і адаптуйце іх па меры неабходнасці. Майце на ўвазе, што ролевая гульня можа развівацца вельмі хаатычна. У гэтым выпадку спыніце практыкаванне (як у форум-тэатры) і папрасіце журналістаў узяць інтэрв'ю ў бежанцаў і пагранічнікаў. Гэта дазволіць усім супакоіцца і слухаць больш уважліва.

## Варыянты

Пасля аналізу правядзіце ролевую гульню яшчэ раз, але няхай удзельнікі памяняюцца ролямі. Цяпер назіральнікі павінны атрымліваюць дадатковую задачу вызначыць любыя адрозненні паміж першай і другой ролевымі гульнямі, асабліва тыя, якія прывялі да больш актыўнай абароны правоў бежанцаў.

Вы таксама можаце сфарміраваць чацвёртую групу, удзельнікі якой будуць іграць грамадзян, якія хочуць дапамагчы, але не могуць зрабіць шмат чаго з-за паліцэйскіх і бюракратычных абмежаванняў.

Правядзіце яшчэ адну ролевую гульню з удзелам афіцыйнай каманды прадстаўнікоў УВКБ ААН або Чырвонага Крыжа, каб дапамагчы бежанцам у краіне Х.

## Прапановы па далейшай працы

Даведайцеся больш аб бежанцах у вашай краіне, асабліва пра рэаліі іх паўсядзённага жыцця. Удзельнікі могуць звязацца з мясцовай асацыяцыяй бежанцаў і ўзяць інтэрв'ю ў працаўнікоў, валанцёраў і бежанцаў.

Наведайце вэб-сайт www.newtimes.dk, дзе вы можаце прачытаць апавяданні, напісаныя (на англійскай мове) шукальнікамі прытулку і бежанцамі ў Даніі. Выберыце апавяданне і абмяркуйце сваю рэакцыю.

Брытанскі Чырвоны Крыж мае шмат інфармацыі і праводзіць многа мерапрыемстваў, прысвечаных бежанцам, што знайшло ўвасабленне ў праекце Positive Images: www.redcross.org.uk.

Група можа праверыць свае веды аб бежанцах, перайшоўшы па спасылцы www.proprofs.com

Школьны клас можа пажадаць працягнуць знаёмства з тэмай шляхам вывучэння інфармацыі пра ролю УВКБ ААН (www.unhcr.ch), а затым напісаць «афіцыйную справаздачу», уключыўшы ў яе наступныя пункты:

- аргументы, якія пераканалі пагранічнікаў упусціць бежанцаў у краіну;
- любыя няправільныя паводзіны з боку пагранічных службаў;
- рэкамендацыі наконт таго, што краіна Y павінна зрабіць, каб абараніць правы бежанцаў.

Абмяркуйце цяперашнюю сітуацыю ў Еўропе. Якім чынам рэагуюць палітыкі? Як розныя краіны адносяцца да бежанцаў, чаму іх пазіцыі так адрозніваюцца? Напрыклад, вы маглі б параўнаць палітыку краін, якія прыхільна ставяцца да бежанцаў, з палітыкай тых краін, што закрываюць свае межы для іх. Папрасіце групу падзяліцца на малыя групы, кожная з якіх будзе прадстаўляць асобную краіну, і распрацаваць еўрапейскі план барацьбы з крызісам.

Вы таксама можаце спытаць, як простыя людзі ў вашай і ў іншых еўрапейскіх краінах адносяцца да такой праблемы і што яны робяць. Гэта, відавочна, выклікае пытанні наконт таго, што ведаем мы самі і ці маем права абагульняць. Карысным практыкаваннем можа стаць аналіз паведамленняў СМІ на прадмет прысутнасці любых скажэнняў інфармацыі.

Абмяркуйце, ці адпавядае Жэнеўская канвенцыя патрэбам сучаснасці і ці патрабуецца яе абнаўленне. Напрыклад, у многіх краінах шукальнікі прытулку, каб атрымаць статус бежанца, павінны даказаць, што асабіста падвяргаюцца праследаванню; не дастаткова проста быць членам групы, якая падвяргаецца праследаванню, ці прыехаць з зоны баявых дзеянняў. Акрамя таго, Канвенцыя не ахоплівае кліматычных бежанцаў.

Вы таксама можаце правесці практыкаванне «Тры рэчы», каб дапамагчы людзям зразумець, што значыць быць вымушаным раптоўна пакінуць свой дом, не маючы нават часу, каб сабраць патрэбныя рэчы з сабой. Калі вы хочаце правесці практыкаванне, прысвечанае жыццю бежанцаў пасля перасячэння мяжы і працэсу атрымання прытулку, звярніце ўвагу на практыкаванне «Моўны бар'ер». Таксама можна зрабіць калаж ці плакаты, якія адлюстроўваюць цяжкасці, з якімі сутыкаюцца бежанцы; гл. «Гульні з відарысамі».

## Ідэі для дзеяння

Наладзьце кантакт з мясцовай ці нацыянальнай арганізацыяй, якая працуе з бежанцамі, якія жывуць у вашай краіне, і спытайце, што вы можаце зрабіць, каб падтрымаць іх. Напрыклад, многія з іх сумуюць і цяжка інтэгруюцца ў грамадства; яны будуць рады знайсці новых сяброў ці атрымаць дапамогу ў вывучэнні мовы.

Дзеці, якія прыходзяць адны, без членаў сям'і, у пошуках прытулку, асабліва ўразлівыя. Група магла б даведацца, што адбываецца з гэтымі непаўналетнімі без бацькоў у іх краіне і як ім можна дапамагчы. Можна стаць ім сябрам, дапамагчы вывучаць мову і атрымліваць адукацыю, гуляць у футбол і хадзіць на прагулкі разам.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**20 чэрвеня**
Сусветны дзень бежанцаў

Вызначэнні і статыстыка па бежанцах і мігрантах знаходзяцца ў раздзеле «Міграцыя» ў главе 5 на вэб-сайце www.coe.int/.

## Можна ўвайсці?

Запрасіце НГА, якая працуе з бежанцамі, або нават саміх бежанцаў у школу або клуб, каб даведацца больш аб тым, як яны трапляюць у вашу краіну, атрымліваюць прытулак і жывуць далей.

Сайт Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў (УВКБ ААН) змяшчае шмат інфармацыі, лістовак і відэа для арганізацыі семінара аб бежанцах у вашай арганізацыі або школе: http://www.unhcr.org.

## Дадатковая інфармацыя

Бежанцы – гэта людзі, вымушаныя з'ехаць, каб захаваць жыццё або свабоду. Яны не атрымліваюць абароны ад сваёй дзяржавы, наадварот, нярэдка ім пагражае іх уласны ўрад. Калі іншыя краіны не прымаюць бежанцаў і не дапамагаюць ім, яны асуджаюць іх на смерць або на жыццё ў нясцерпных умовах без сродкаў да існавання і без правоў.

Іншыя карысныя сайты:

http://councilforeuropeanstudies.org/
http://www.refugeesinternational.org/

## Раздатачныя матэрыялы

**Ролевая картка бежанца**

*Аргументы бежанцаў і варыянты дзеянняў*

Вам трэба будзе сыграць змешаную групу бежанцаў, таму падчас падрыхтоўкі кожны ўдзельнік павінен прыдумаць апісанне сваёй асобы: узрост, пол, сямейнае становішча, прафесія, фінансавае становішча, рэлігія і якія рэчы маюцца з сабой. Таксама трэба вырашыць, з якой краіны бежанец родам, P, Q або J, і ад чаго бяжыць – ад вайны, праследавання ці адсутнасці правоў чалавека або па іншай прычыне.

Падрыхтуйце свае аргументы і тактыку; вам трэба вырашыць, ці варта выкласці свае аргументы ад імя групы або кожны член па чарзе назаве па адным.

Вы можаце як выкарыстаць прыведзеныя ніжэй аргументы, так і прапанаваць свае:

- Мы маем законнае права шукаць прытулак.
- Нашы дзеці галадаюць; вы несяце маральную адказнасць за дапамогу нам.
- Мяне заб'юць, калі я вярнуся.
- У мяне няма грошай. У мяне ёсць толькі два ювелірныя вырабы, вельмі дарагія майму сэрцу.
- Мне больш няма куды пайсці.
- У маім родным горадзе я быў урачом (медсястрой, інжынерам).
- Мне патрэбны прытулак толькі на той час, пакуль не будзе бяспечна вярнуцца дадому.
- Ваша краіна пусціла іншых бежанцаў, чаму не пускае нас?
- Дзе мы? Кантрабандысты абяцалі даставіць нас у краіну Z.
- Я паспрабую падкупіць чыноўнікаў, каб атрымаць дазвол уехаць у краіну.
- Мае маці і брат ужо ў краіне Y.
- Я на шляху да краіны Z, я не хачу спыняцца ў краіне Y.

Абмяркуйце наступныя пытанні:

- Ці ёсць у каго-небудзь з вас праязныя дакументы? Ці сапраўдныя яны або фальшывыя?
- Ці згадзіцеся вы раздзяліцца, калі пагранічнікі папросяць вас?
- Што вы будзеце рабіць, калі вас паспрабуюць адправіць назад? Якія ў вас ёсць варыянты? Напрыклад, ці ёсць лагер бежанцаў, куды вы маглі б пайсці? Ці ёсць спосаб атрымаць праязны дакумент? Ці можаце вы знайсці кантрабандыста і заплаціць яму? Ці ёсць іншы шлях у краіну Y?

**Ролевая картка назіральніка**

Ваша задача заключаецца ў назіранні за ролевай гульнёй. У канцы вам будзе прапанавана выказаць сваё меркаванне. Выберыце прадстаўніка.

Падчас назірання вы павінны, акрамя ўсяго іншага, ведаць:

- розныя ролі, якія іграюць бежанцы і пагранічнікі;
- маральныя і юрыдычныя аргументы, якія яны выкарыстоўваюць, і як яны іх прыводзяць;
- сачыць за любымі парушэннямі правоў чалавека.

Вы павінны вырашыць, як будзеце за ўсім назіраць. Напрыклад, вы можаце падзяліцца на дзве падгрупы, адна з якіх будзе сачыць за бежанцамі, а другая – за пагранічнікамі.

## Раздатачныя матэрыялы

**Ролевая картка пагранічніка**

*Аргументы пагранічніка і варыянты дзеянняў*

Падрыхтуйце свае аргументы і тактыку; вам трэба вырашыць, ці варта выкласці свае аргументы ад імя групы або кожны член па чарзе назаве па адным.

Вы можаце як выкарыстаць прыведзеныя ніжэй аргументы, так і прапанаваць свае:

- Яны даведзены да адчаю; мы не можам адправіць іх назад.
- Калі мы адправім іх назад, а іх арыштуюць, будуць катаваць або заб'юць, маральная адказнасць ляжа на нас.
- Па законе мы абавязаны прымаць бежанцаў.
- У іх няма грошай, і ім спатрэбіцца дапамога дзяржавы. Наша краіна не можа сабе гэтага дазволіць.
- Ці ёсць у іх праязныя дакументы або пасведчанне асобы? Сапраўдныя яны ці фальшывыя?
- Ці падобны яны на сапраўдных бежанцаў? Можа быць, некаторыя з'явіліся сюды, проста імкнучыся да больш высокага ўзроўню жыцця?
- Наша краіна – ваенны і дзелавы партнёр краіны X. Нельга, каб хто-небудзь заўважыў, што мы ім дапамагаем.
- А раптам яны валодаюць прафесіямі, якія патрэбны нашай краіне?
- У нашай краіне і так дастаткова бежанцаў. Мы павінны клапаціцца пра сваіх грамадзян. Няхай бежанцы знойдуць сабе краіну багацей.
- Мы можам запатрабаваць хабар за дазвол на ўезд.
- Калі мы пусцім у краіну гэтых, тады прытулак запатрабуюць і іншыя.
- Яны не валодаюць нашай мовай, вызнаюць іншую рэлігію і ядуць іншую ежу. Яны не змогуць інтэгравацца ў наша грамадства.
- Сярод іх могуць быць тэрарысты або ваенныя злачынцы.
- Нам дазволена пускаць толькі тых, хто бяжыць ад вайны ў краіне Р.
- Ці хочуць яны запатрабаваць прытулак у краіне Y?
- Ці ёсць у іх грошы або каштоўнасці, за якія яны змогуць жыць, пакуль будзе разглядацца іх заява на атрыманне прытулку?

Перш чым пачаць гульню, падумайце аб наступным:

- Ці ўсім бежанцам вы дазволіце перасекчы мяжу?
- Ці дазволіце вы перасекчы мяжу толькі некаторым з іх? Каму і ў залежнасці ад чаго?
- Ці падзеліце вы іх па ўзросце, прафесіі, фінансавым становішчы і г. д.?
- Ці зробіце вы што-небудзь замест гэтага? Што канкрэтна?

**Заўвага**.
Гэта практыкаванне – адаптаваны варыянт з кнігі «Першыя крокі: дапаможнік для пачатковага этапа адукацыі ў галіне правоў чалавека», Amnesty International, London, 1997. Апошнюю версію практыкавання глядзіце ў семінары «На межах Еўропы», www.amnesty.org.
Фраза «Бежанцы, вяртайцеся дадому! – Яны б вярнуліся, калі б маглі» была лозунгам кампаніі УВКБ ААН.

COMPASS

Вайна і тэрарызм

Мір і гвалт

Дэмакратыя

Узровень 4

Любы памер групы

120 хвілін

# *Чахал супраць Вялікабрытаніі*

*Калі ён вернецца, яго будуць катаваць!*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • вайна і тэрарызм,<br>• мір і гвалт,<br>• дэмакратыя. |
| **Складанасць** | узровень 4 |
| **Памер групы** | любы |
| **Час** | 120 хвілін |
| **Агляд** | Сімуляцыя (міні-суд) з мэтай вывучэння рэальнай справы, якая была разгледжана Еўрапейскім судом па правах чалавека. |
| **Звязаныя правы** | • свабода ад катаванняў;<br>• права на пошук прытулку;<br>• права на справядлівы публічны судовы разбор. |
| **Мэты** | • даць удзельнікам веды аб ролі Еўрапейскага суда па правах чалавека і аб частковай адмене артыкулаў закону аб правах чалавека;<br>• развіць навыкі крытычнага мыслення і фармуліроўкі лагічных аргументаў;<br>• культываваць пачуццё справядлівасці і чалавечай годнасці. |
| **Матэрыялы** | • копіі ролевых картак;<br>• ручкі і папера для нататак;<br>• інфармацыйная картка для фасілітатара. |
| **Падрыхтоўка** | • зрабіце копіі і выражце карткі, прадстаўленыя на старонцы 123. У кожнага ўдзельніка павінна быць свая ўласная картка, і лепш мець аднолькавую колькасць (наколькі гэта будзе магчыма) суддзяў, прадстаўнікоў урада Вялікабрытаніі і прадстаўнікоў сп-ра Чахала.<br>• пранумаруйце карткі ў кожнай групе: 1, 2, 3, 4 і гэтак далей;<br>• вам спатрэбіцца дастаткова месца, каб кожны з «судоў» (па 3 чалавекі) мог размясціцца асобна ад іншых. |

## Інструкцыі

1. Скажыце групе, што занятак будзе прысвечаны справе, якая разглядалася ў Еўрапейскім судзе па правах чалавека. Спытайце ўдзельнікаў, што яны ведаюць пра гэты суд і пра Еўрапейскую канвенцыю аб правах чалавека.
2. Прачытайце ўслых картку з інфармацыяй па справе і пераканайцеся, што ўсе разумеюць сутнасць пытання «Ці будзе дэпартацыя сп-ра Чахала парушэннем артыкула 3?».
3. Падзяліце ўдзельнікаў на 3 роўныя групы.
- група А прадстаўляе сп-ра Чахала;
- група В прадстаўляе ўрад Вялікабрытаніі;
- група С прадстаўляе членаў Еўрапейскага суда па правах чалавека.
4. Раздайце кожнай групе копіі адпаведных ролевых картак і растлумачце ўдзельнікам, што ў іх ёсць 30 хвілін, каб абмеркаваць і растлумачыць свае пазіцыі. Групы А і В павінны выкарыстаць гэты час, каб падрыхтаваць свае аргументы, а група С (група суддзяў) павінна падрыхтаваць пытанні для абодвух бакоў.
5. Праз 30 хвілін папрасіце ўдзельнікаў перагрупавацца: удзельнік пад нумарам 1 застаецца ў сваёй групе, пад нумарам 2 – пераходзіць у іншую і гэтак далей; у выніку ў кожнай новай групе будзе па адным прадстаўніку сп-ра Чахала, урада Вялікабрытаніі і суддзяў.

6. Растлумачце, што кожная новая малая група ўяўляе сабой міні-суд. Суды будуць мець у сваім распараджэнні 20 хвілін, каб выслухаць аргументы абодвух бакоў і пытанні, якія зададуць самі суддзі.
7. Па заканчэнні гэтага часу кожны суддзя павінен прыйсці да рашэння, ці будзе парушаны артыкул 3, калі сп-р Чахал будзе дэпартаваны. Зноў збярыце ўсю групу разам і папрасіце суддзяў абвясціць свае рашэнні і агучыць аргументы.
8. Дайце прадстаўнікам дзвюх іншых груп магчымасць выказаць сваё меркаванне наконт абвешчаных судовых рашэнняў, а затым раскажыце ім, як Еўрапейскі суд у рэальнасці вырашыў гэту справу (гл. інфармацыйную картку ніжэй у раздзеле «Раздатачныя матэрыялы»).
9. Спытайце ўдзельнікаў, што яны думаюць наконт рашэння Еўрапейскага суда, а затым пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

- Якія аспекты справы былі самымі цяжкімі?
- Ці цяжка вам было іграць сваю ролю?
- Як вы лічыце, «суддзя» з вашай малой групы прыняў правільнае рашэнне? Якія фактары былі найбольш важнымі пры прыняцці канчатковага рашэння?
- Чаму, на ваш погляд, Еўрапейская канвенцыя аб правах чалавека нават у выключных выпадках выступае супраць абмежавання права на свабоду ад катаванняў?
- Якія, на ваш погляд, будуць наступствы, калі катаванні будуць час ад часу дазволены?
- Як усё гэта суадносіцца з сучаснай «вайной з тэрарызмам»? Ці ведаеце вы што-небудзь пра падобныя дзеянні або справы?
- Чаму нам патрэбны Еўрапейскі суд па правах чалавека?
- Ці ведаеце вы пра якія-небудзь справы з вашай краіны, якія дайшлі да гэтага суда?
- Хто можа давесці справу да разгляду ў Еўрапейскім судзе па правах чалавека?

## Парады для фасілітатараў

Падчас працы над пунктам 4, калі ўдзельнікі будуць прадстаўляць свае пазіцыі, трэба папярэдзіць іх, што пры далейшым разглядзе гэтай справы яны будуць падзелены на групы для працы над справай у фармаце судовага пасяджэння. Прапануйце ім выкарыстоўваць частку часу для абмеркавання падрабязнасцей справы з іншымі ўдзельнікамі, а астатні час прысвяціць падрыхтоўцы сваёй уступнай заявы. Суддзі павінны ўдакладніць падрабязнасці справы і падумаць, якую дадатковую інфармацыю яны запытаюць у абодвух бакоў, перш чым прыняць рашэнне.

Растлумачце абодвум бакам судовага разбору, што нават калі яны не згодны з пазіцыяй, якую ім выпала абараняць, то ім усё роўна трэба найлепшым чынам абараніць яе перад суддзямі.

Будзе лепш, калі вы знойдзеце магчымасць размясціць розныя «суды» ў розных памяшканнях (пункт 6) ці, па меншай меры, настолькі далёка адзін ад аднаго, каб у ніводнага з іх не было магчымасці падслухаць іншых.

Папрасіце суддзяў распараджацца часам у ходзе «судовага разбору». Суддзі павінны загадзя спланаваць, колькі часу яны адвядуць на разгляд пытанняў і як будуць дзяліць час паміж бакамі. Падкрэсліце, што кожны бок павінен атрымаць прыкладна роўны адрэзак часу і што яшчэ павінен застацца час для высвятлення пунктаў гледжання абодвух бакоў.

Калі ўдзельнікі яшчэ не знаёмы з такой інфармацыяй, вы можаце паведаміць ім некаторыя даныя з даклада Дзіка Марці «Тайныя затрыманні і незаконная перадача зняволеных з удзелам дзяржаў – членаў Савета Еўропы: другі даклад», у якім расказваецца аб тайных затрыманнях і ўмовах утрымання зняволеных у Гуантанама (гл. даведачную інфармацыю на тэму «Вайна і тэрарызм» на сайце www.coe.int/compass).

COMPASS

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**26 чэрвеня**
Міжнародны дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у падтрымку ахвяр катаванняў

## Прапановы па далейшай працы

У практыкаванні «Тэрарызм» на старонцы 295 даюцца розныя вызначэнні тэрарызму і прыводзяцца прыклады розных тэрарыстычных актаў. Вы таксама можаце звярнуць увагу на практыкаванне «Калі прыйдзе заўтра» на старонцы 324, дзе разглядаецца яшчэ адно права чалавека, якое не можа быць абмежавана, – права на жыццё. Там жа прыводзіцца фрагмент тэксту, напісанага маладым чалавекам з камеры смертнікаў.

## Дадатковая інфармацыя

Вельмі простае рэзюмэ аб Еўрапейскім судзе па правах чалавека і яго працы прыводзіцца на сайце www.abouthumanrights.co.uk.

Еўрапейскі суд па правах чалавека з'яўляецца міжнародным судовым органам, які быў заснаваны ў адпаведнасці з Еўрапейскай канвенцыяй аб правах чалавека (ЕКПЧ) у 1950 годзе для маніторынгу выканання правоў чалавека дзяржавамі – удзельніцамі Савета Еўропы. www.echr.coe.int.

Суд палічыў, што, калі б брытанскі ўрад пайшоў на ажыццяўленне запланаванай дэпартацыі сп-ра Чахала, гэта было б парушэннем артыкула 3. Развагі суддзяў зводзіліся да наступнага:

«Артыкул 3 замацоўвае адну з асноўных каштоўнасцей дэмакратычнага грамадства… Суду добра вядомы велізарныя цяжкасці, з якімі сёння сутыкаюцца дзяржавы падчас абароны свайго насельніцтва ад тэрарыстычнага гвалту. Тым не менш нават у такіх умовах Канвенцыя забараняе катаванні і бесчалавечнае або зневажальнае чалавечую годнасць абыходжанне або пакаранне незалежна ад паводзін ахвяры. У адрозненне ад большасці асноўных палажэнняў Канвенцыі і Пратаколаў № 1 і 4 артыкул 3 не прадугледжвае выключэнняў, і ніякія адступленні ад гэтага не з'яўляюцца дапушчальнымі ў адпаведнасці з артыкулам 15 нават у выпадку надзвычайнай сітуацыі, якая пагражае жыццю нацыі…

…Забарона жорсткага абыходжання, прадугледжаная артыкулам 3, з'яўляецца настолькі ж абсалютнай і ў выпадку высылкі. Такім чынам, кожны раз, калі ёсць істотныя падставы меркаваць, што ў выпадку высылкі чалавека ў іншую дзяржаву ён сутыкнецца з рэальнай рызыкай падвергнуцца абыходжанню, якое супярэчыць артыкулу 3, то, калі такая высылка будзе мець месца, адказнасць за абарону гэтага чалавека ад такога абыходжання будзе несці дзяржава, якая з'яўляецца членам Канвенцыі. У такіх умовах дзеянні гэтага чалавека, якімі б непажаданымі або небяспечнымі яны ні былі, не маюць істотнага значэння».

**Адступленне**. Тэрмін «адступленне» выкарыстоўваецца для абазначэння акта выхаду з прававой нормы або, у выпадку Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека, прыпынення прававых абавязацельстваў дзяржаў-членаў па канкрэтных артыкулах. Артыкул 15 ЕКПЧ дазваляе дзяржаве-ўдзельніцы рабіць гэта «падчас вайны ці іншага надзвычайнага становішча», але дзяржава павінна інфармаваць Генеральнага сакратара Савета Еўропы загадзя, а частковае адступленне павінна быць «строга прадыктавана вострай неабходнасцю». Артыкул 15 таксама абвяшчае, што не можа быць ніякіх адступленняў ад артыкулаў 3, 4.1 і 7 і што адступленне ад артыкула 2 магчыма толькі ў выпадку «гібелі людзей у выніку правамерных ваенных дзеянняў».

На працягу шэрагу гадоў у Вялікабрытаніі ўжывалася адступленне ад некаторых частак артыкула 5, і гэта практыка была адноўлена ў лістападзе 2001 года пасля тэрарыстычных актаў у ЗША ў верасні 2001 года на той падставе, што Вялікабрытанія сутыкнулася з тэрарыстычнай пагрозай. Вялікабрытанія была адзінай дзяржавай – удзельніцай Савета Еўропы, якая вырашыла выкарыстаць сваё права на адступленне ў выніку тэрактаў 2001 года ў ЗША. Адступленне было анулявана ў 2005 годзе ў адпаведнасці з рашэннем Палаты лордаў, якая прыйшла да высновы, што яно носіць дыскрымінацыйны характар і, такім чынам, несумяшчальнае з Канвенцыяй.

Рэзюмэ Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека прыводзіцца на старонцы 610.

## Ідэі для дзеяння

Даведайцеся, якія справы з вашай краіны разглядаліся ў Еўрапейскім судзе па правах чалавека і ці былі прыняты рашэнні, якія прызнавалі факт парушэнняў. Для атрымання дадатковай інфармацыі па гэтых пытаннях наведайце вэб-сайт www.echr.coe.int і ўвядзіце пошукавы запыт «HUDOC database».

## Раздатачныя матэрыялы

**Карткі для работы па пункце 2 часткі «Інструкцыі»**

**Справа**

Карамжыт Сінгх Чахал з'яўляецца грамадзянінам Індыі, але ў цяперашні час жыве ў Вялікабрытаніі. Будучы сікхам, ён выступае ў падтрымку кампаніі за стварэнне незалежнай дзяржавы сікхаў у індыйскім штаце Пенджаб.

Брытанскі ўрад спрабуе дэпартаваць сп-ра Чахала ў Індыю, сцвярджаючы, што яго падтрымка незалежнасці сікхаў і папярэдняя дзейнасць азначаюць, што ён уяўляе пагрозу для нацыянальнай бяспекі Вялікабрытаніі, асабліва з улікам цяперашняй заклапочанасці з нагоды тэрарыстычнай дзейнасці.

Сп-р Чахал выступае супраць яго дэпартацыі і звяртаецца ў Еўрапейскі суд па правах чалавека, сцвярджаючы, што ён упэўнены ў тым, што яго будуць катаваць, калі ён вернецца ў Індыю. Ён сцвярджае, што гэта было б парушэннем артыкула 3 і што, такім чынам, урад не мае права дэпартаваць яго.

**Ролевая картка Карамжыта Сінгха Чахала**

Вы грамадзянін Індыі, але ў цяперашні час жывяце ў Вялікабрытаніі. Вы сікх і выступаеце ў падтрымку кампаніі за стварэнне незалежнай дзяржавы сікхаў у індыйскім штаце Пенджаб.

Брытанскі ўрад спрабуе дэпартаваць вас у Індыю, сцвярджаючы, што ваша падтрымка незалежнасці сікхаў і папярэдняя дзейнасць азначаюць, што вы ўяўляеце пагрозу для нацыянальнай бяспекі Вялікабрытаніі, асабліва з улікам цяперашняй заклапочанасці з нагоды тэрарыстычнай дзейнасці.

Вы ўпэўнены, што калі вернецеся ў Індыю, то падвергнецеся катаванням, як і многія з вашых сяброў і сям'і і як вы самі, калі ў апошні раз былі ў Індыі. Гэта было ўсяго шэсць гадоў таму, і вас арыштавалі і трымалі за кратамі Пенджаба 21 дзень. Увесь гэты час вас трымалі ў наручніках у жудасных умовах, білі да страты прытомнасці, наносілі ўдары электрычным токам па розных частках цела і інсцэніравалі смяротнае пакаранне. Пазней вы былі вызвалены без прад'яўлення абвінавачанняў.

**Вы сцвярджаеце наступнае**:

1. Вы не пагроза нацыянальнай бяспецы Вялікабрытаніі, таму што выступаеце за мірнае вырашэнне канфлікту ў Індыі.
2. Вас, безумоўна, будуць зноў катаваць, калі вы вернецеся ў Індыю, таму што сітуацыя там істотна не змянілася, а вы цяпер яшчэ больш вядомы як сепаратыст.
3. Калі ўрад Вялікабрытаніі дэпартуе вас, то гэта будзе азначаць адмаўленне вам у праве быць свабодным ад катаванняў. Гэта стане парушэннем артыкула 3 ЕКПЧ.

### Артыкулы Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека:

**Артыкул 3: Забарона катаванняў**

Ніхто не павінен падвяргацца катаванням ці бесчалавечнаму або зневажальнаму чалавечую годнасць абыходжанню ці пакаранню.

**Артыкул 15: Адступленне ад выканання абавязацельстваў у надзвычайных сітуацыях**

1. Падчас вайны ці іншага надзвычайнага становішча ўрад можа абмежаваць некаторыя правы ў гэтай канвенцыі, але толькі тады, калі гэта абсалютна неабходна.
2. Правы, абвешчаныя ў артыкулах 3, 4 (і) і 7, не могуць быць абмежаваны. Права на жыццё не можа быць абмежавана, за выключэннем выпадкаў гібелі людзей у выніку правамерных ваенных дзеянняў.

## Раздатачныя матэрыялы

**Ролевая картка ўрада Вялікабрытаніі**

**Справа**

Карамжыт Сінгх Чахал з'яўляецца грамадзянінам Індыі, але ў цяперашні час жыве ў Вялікабрытаніі. Будучы сікхам, ён выступае ў падтрымку кампаніі за стварэнне незалежнай дзяржавы сікхаў у індыйскім штаце Пенджаб.

Вы выступаеце ад імя ўрада Вялікабрытаніі, які спрабуе дэпартаваць сп-ра Чахала ў Індыю, і сцвярджаеце, што яго падтрымка незалежнасці сікхаў і папярэдняя дзейнасць азначаюць, што ён уяўляе пагрозу для нацыянальнай бяспекі Вялікабрытаніі, асабліва з улікам цяперашняй заклапочанасці з нагоды тэрарыстычнай дзейнасці.

Сп-р Чахал змагаецца супраць дэпартацыі праз Еўрапейскі суд, сцвярджаючы, што яго, несумненна, будуць катаваць, калі ён вернецца ў Індыю. Ён сцвярджае, што гэта было б парушэннем артыкула 3 і што, такім чынам, урад не мае права дэпартаваць яго.

**Вы сцвярджаеце наступнае**:

1. Сп-ру Чахалу не пагражае сур'ёзная рызыка падвергнуцца катаванням, таму што сітуацыя ў Індыі змянілася з тых часоў, калі ён быў там у апошні раз, і ў вас ёсць гарантыі ад урада Індыі, што там ён будзе ў бяспецы.
2. Сп-р Чахал уяўляе пагрозу для нацыянальнай бяспекі тут, у Вялікабрытаніі, з-за яго дзейнасці ў падтрымку руху за незалежнасць сікхаў.
3. Такім чынам, яго права не падвяргацца катаванням павінна быць абмежавана і не павінна мець перавагу над магчымымі пагрозамі для нацыянальнай бяспекі.

### Артыкулы Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека:

**Артыкул 3: Забарона катаванняў**

Ніхто не павінен падвяргацца катаванням ці бесчалавечнаму або зневажальнаму чалавечую годнасць абыходжанню ці пакаранню.

**Артыкул 15: Адступленне ад выканання абавязацельстваў у надзвычайных сітуацыях**

1. Падчас вайны ці іншага надзвычайнага становішча ўрад можа абмежаваць некаторыя правы ў гэтай канвенцыі, але толькі тады, калі гэта абсалютна неабходна.
2. Правы, абвешчаныя ў артыкулах 3, 4 (і) і 7, не могуць быць абмежаваны. Права на жыццё не можа быць абмежавана, за выключэннем выпадкаў гібелі людзей у выніку правамерных ваенных дзеянняў.

**Ролевая картка суддзяў**

**Справа**

Карамжыт Сінгх Чахал з'яўляецца грамадзянінам Індыі, але ў цяперашні час жыве ў Вялікабрытаніі. Будучы сікхам, ён выступае ў падтрымку кампаніі за стварэнне незалежнай дзяржавы сікхаў у індыйскім штаце Пенджаб.

Брытанскі ўрад спрабуе дэпартаваць сп-ра Чахала ў Індыю, сцвярджаючы, што яго падтрымка незалежнасці сікхаў і папярэдняя дзейнасць азначаюць, што ён уяўляе пагрозу для нацыянальнай бяспекі Вялікабрытаніі, асабліва з улікам цяперашняй заклапочанасці з нагоды тэрарыстычнай дзейнасці.

Сп-р Чахал змагаецца супраць дэпартацыі праз Еўрапейскі суд, сцвярджаючы, што яго, несумненна, будуць катаваць, калі ён вернецца ў Індыю. Ён сцвярджае, што гэта было б парушэннем артыкула 3 і што, такім чынам, урад не мае права дэпартаваць яго.

**Верагоднасць прымянення катаванняў: інфармацыя з розных крыніц**

У дакладзе за 1995 год спецыяльны дакладчык ААН па пытаннях катаванняў пракаментаваў практыку катаванняў у паліцыі:

«...вельмі мала інцыдэнтаў таго, што абгрунтавана лічыцца не проста распаўсюджаным феноменам, але сапраўднай эпідэміяй, становяцца прадметам судовага разбору і яшчэ менш вядуць да прызнання парушальнікаў вінаватымі».

Нядаўняя справаздача Amnesty International адлюстроўвае карціну парушэнняў правоў чалавека, учыненых супрацоўнікамі паліцыі Пенджаба, якія дзейнічалі ў рамках аперацый за межамі свайго штата. Amnesty International сцвярджае, што вядомыя сікхі-сепаратысты па-ранейшаму сутыкаюцца з сур'ёзнай рызыкай «знікнення», утрымання пад вартай без рашэння суда і следства, катаванняў і пазасудовага смяротнага пакарання, што нярэдка практыкуе паліцыя Пенджаба.

### Артыкулы Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавека:

**Артыкул 3: Забарона катаванняў**

Ніхто не павінен падвяргацца катаванням ці бесчалавечнаму або зневажальнаму чалавечую годнасць абыходжанню ці пакаранню.

**Інфармацыйная картка для фасілітатара для работы па пункце 8 часткі «Інструкцыі»**

Рэзюмэ па справе «Чахал супраць Вялікабрытаніі» (22414/93) [1996] ЕКПЧ 54 (15 лістапада 1996 года).

**Факты**. Заяўнік з'яўляецца сікхам, які незаконна ўехаў у Вялікабрытанію, але яго знаходжанне ў краіне пазней было ўзаконена ў рамках агульнай амністыі для незаконных мігрантаў. Ён быў палітычна актыўным членам абшчыны сікхаў у Вялікабрытаніі і сыграў важную ролю ў стварэнні і арганізацыі Міжнароднай маладзёжнай федэрацыі сікхаў. Ён быў арыштаваны, але не асуджаны за змову з мэтай забіць тагачаснага прэм'ер-міністра Індыі, а пазней быў асуджаны за напад і бойку, але рашэнне суда было анулявана. Было прынята рашэнне аб яго дэпартацыі з прычыны яго палітычнай дзейнасці і распачатага супраць яго следства па крымінальнай справе, і ён быў узяты пад варту да рашэння ЕСПЧ.

**Скарга**. Заяўнік сцвярджаў, што яго высылка ў Індыю прывядзе да рэальнай рызыкі прымянення катаванняў, бесчалавечнага або зневажальнага чалавечую годнасць абыходжання, і гэта стала б парушэннем артыкула 3 Еўрапейскай канвенцыі. Ён таксама заявіў аб парушэнні яго права на свабоду волі, гарантаванага артыкулам 5.

**Судовае рашэнне**. ЕСПЧ выявіў парушэнне артыкула 3 і артыкулаў 5(4) і 13, але не выявіў парушэння артыкула 5(1).

**Абгрунтаванне**. Артыкул 3 змяшчае гарантыю, якая з'яўляецца абсалютнай нават у выпадку высылкі, таму Вялікабрытанія не можа спасылацца на свае інтарэсы нацыянальнай бяспекі для апраўдання дэпартацыі заяўніка. Заяўнік сутыкнецца з рэальнай рызыкай жорсткага абыходжання ў выпадку дэпартацыі ў Індыю. Парушэнне артыкула 5(1) не было ўстаноўлена, паколькі рашэнне мае важнае значэнне і не можа быць прынята паспешліва. Адстойванне інтарэсаў нацыянальнай бяспекі не вызваляе нацыянальныя ўлады ад эфектыўнага кантролю з боку нацыянальных судоў, таму разбор у брытанскіх судах не адпавядаў патрабаванням артыкула 5(4).

http://www.hrcr.org/safrica/citizenship/Chahal.html

COMPASS

Беднасць

Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці

Міграцыя

Узровень 2

Любы памер групы

90 хвілін

# Змяніце свае акуляры

*Я ведаю, што не бачу рэчы такімі, якія яны ёсць; я бачу рэчы такімі, якімі я іх бачу.*

*Лорал Лі*[1]

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • беднасць,<br>• інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці,<br>• міграцыя. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | любы |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Агляд** | Гэта вельмі простае практыкаванне для правядзення на вольным паветры, падчас якога ўдзельнікі могуць выйсці і даследаваць мясцовасць чужымі вачыма. |
| **Звязаныя правы** | усе правы |
| **Мэты** | • павысіць дасведчанасць аб няроўнасці ў грамадстве;<br>• развіць навыкі назірання і фантазіі;<br>• садзейнічаць умацаванню салідарнасці і матывацыі да працы ў імя справядлівасці. |
| **Матэрыялы** | • акуляры. Старыя акуляры, набытыя ў краме сэканд-хэнд ці на рынку, або проста аправа без шкла;<br>• вялікія аркушы паперы і ручкі;<br>• старыя часопісы, паштоўкі, кавалачкі паперы для калажу, клей;<br>• скотч для замацавання фотаздымкаў;<br>• лічбавы фотаапарат ці мабільны тэлефон, які дазваляе рабіць фотаздымкі, у ідэале па адным на кожнага ўдзельніка ці адзін або некалькі для ўсёй групы;<br>• камп’ютар і прынтар. |

## Інструкцыі

1. Разам з групай правядзіце мазгавы штурм, прысвечаны людзям, якія адносяцца да тых ці іншых уразлівых груп або жывуць на мяжы адчужанасці; гэта могуць быць, напрыклад, асобы з інваліднасцю ці людзі, якія не маюць жылля.
2. Папрасіце кожнага ўдзельніка выбраць аднаго такога чалавека, які яго зацікавіў, і растлумачце яму, што ў рамках практыкавання трэба будзе выйсці на вуліцу і даследаваць мясцовасць вачыма такога чалавека.
3. Падкрэсліце, што справа не ў тым, каб сыграць ролю, а ў тым, каб выйсці на вуліцу і ўявіць сабе, як гэта – быць іншым чалавекам. Як бы ўдзельнікі адчулі сябе на месцы гэтага чалавека? Напрыклад, ці могуць такія людзі карыстацца ўсімі выгодамі? Дзе яны могуць купіць хлеб (калі могуць сабе гэта дазволіць)? Дзе яны жывуць?
4. Раздайце акуляры, калі яны ў вас ёсць! Скажыце ўдзельнікам, што, пакуль яны будуць гуляць па ваколіцы, яны павінны рабіць фотаздымкі з дапамогай лічбавых камер або мабільных тэлефонаў у якасці матэрыялаў для далейшай працы. Узгадніце з усімі час вяртання.
5. Пасля вяртання папрасіце кожнага ўдзельніка перакінуць свае фотаздымкі на камп’ютар, а потым выбраць дзве, тры ці чатыры, раздрукаваць іх, прыклеіць да вялікага аркуша паперы і размясціць на сцяне. Фотаздымкі павінны заставацца без назвы.
6. Калі ўсе фотаздымкі будуць размешчаны на сценах, папрасіце кожнага паспрабаваць адгадаць, якія групы на іх прадстаўлены; потым папрасіце кожнага ўдзельніка па чарзе прадставіць свае фотаздымкі і растлумачыць, чаму яго зацікавіла гэта канкрэтная група, вачыма якой ён/яна/яны хацелі «ўбачыць свет».

[1]У Лорал Лі, якая сказала: «Я ведаю, што не бачу рэчы такімі, якія яны ёсць; я бачу рэчы такімі, якімі я іх бачу», – знайшлі рак, калі ёй было дваццаць дзевяць гадоў. Насуперак прагнозам урачоў, пасля гэтага яна пражыла яшчэ дваццаць гадоў і выхавала траіх дзяцей, падарожнічала і пісала. У яе выпадку нежаданне бачыць рэчы такімі, якія яны ёсць, было натхненнем. У іншых умовах гэта было б глупствам.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з агляду выставы, а потым папрасіце ўдзельнікаў па чарзе распавесці, што яны перажылі і што бачылі.

- Што здарылася? Ці спадабалася вам гэтае практыкаванне? Чаму?
- Што было самым дзіўным з таго, што вы для сябе адкрылі?
- Чаму вы выбралі менавіта гэты прыклад?
- Якія прадузятасці або стэрэатыпы былі ў вас пра чалавека, якога вы выбралі? Які ўплыў яны аказалі на тое, як вы выконвалі практыкаванне, і на тое, што менавіта вы вырашылі «ўбачыць»?
- Ці абудзіла гэта практыкаванне ў вашым сэрцы якое-небудзь спачуванне да чалавека, які апынуўся на мяжы адчужэння? Чаму?
- Што новага вы даведаліся пра сябе?

Цяпер перайдзіце да абмеркавання некаторых больш агульных пытанняў:

- «Я ведаю, што не бачу рэчы такімі, якія яны ёсць; я бачу рэчы такімі, якімі я іх бачу». Якое ўздзеянне аказваюць нашы стэрэатыпы і перакананні на тое, якім мы бачым свет вакол нас?
- Адкуль мы бяром інфармацыю аб маргінальных і ўразлівых групах?
- Наколькі рызыкоўна рабіць здагадкі пра нейкага чалавека на падставе агульных уяўленняў пра групу ў цэлым?
- Наколькі рызыкоўна рабіць высновы пра нейкую групу на падставе аднаго-двух прыкладаў?
- Якія правы чалавека канкрэтна абараняюць людзей з уразлівых груп або тых, якія жывуць на мяжы адчужэння, якіх ідэнтыфікавалі ўдзельнікі практыкавання?
- Як часцей за ўсё парушаюцца правы гэтых людзей?
- Наколькі лёгка ім адстойваць свае правы?
- Хто павінен несці адказнасць за тое, каб іх правы не парушаліся ці каб яны маглі імі скарыстацца?

## Парады для фасілітатара

Вы можаце выканаць гэта практыкаванне ў якасці ўступнага або асноўнага. У ходзе занятку яно можа стаць своеасаблівым перапынкам на адпачынак, калі ўдзельнікі змогуць выйсці падыхаць свежым паветрам, або спосабам правесці вольны час.

Інструкцыі прадугледжваюць індывідуальную працу ўдзельнікаў, але практыкаванне можа быць выканана і ў малых групах. Арганізуйце практыкаванне з улікам розных практычных меркаванняў, такіх як памер групы і наяўнасць фотакамер. Майце на ўвазе, што ўдзельнікам спатрэбіцца час, каб прадставіць свае фотаздымкі, таму ў залежнасці ад памеру групы абмяжуйце колькасць здымкаў, якую кожны ўдзельнік можа выбраць для выстаўкі.

Прыкладамі людзей з уразлівых груп насельніцтва могуць стаць адзінокая маці з маленькімі дзецьмі, пенсіянер, імігрант, чалавек у інвалідным вазку або ВІЧ-пазітыўны чалавек. Прыкладамі людзей на мяжы адчужэння могуць стаць бяздомныя людзі, непісьменныя людзі, людзі з псіхічнымі парушэннямі або члены рама супольнасці. Усё гэта – прыклады груп людзей, якія пазбаўлены магчымасцяў, даступных для большасці. Усе людзі з уразлівых або маргіналізаваных груп часта падвяргаюцца якой-небудзь дыскрымінацыі, напрыклад у тым, што тычыцца доступу да годнага жылля і да працы, менавіта з-за сітуацыі, у якой яны апынуліся.

Вельмі важна, каб удзельнікі разумелі, што яны не могуць ігнараваць той факт, што бачаць свет на свае вочы, але ў той жа час яны павінны ўявіць сабе, што значыць быць чалавекам, які жыве на перыферыі грамадства. Яны мусяць ведаць, што, прыходзячы на заняткі са сваімі ранейшымі стэрэатыпамі і сімпатыямі, яны рызыкуюць умацаваць у сабе скажоныя ці памылковыя перакананні.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**Другі чацвер кастрычніка**
Сусветны дзень зроку

Яны таксама павінны разумець, што стэрэатыпы – гэта (карысныя) абагульненні пра групу людзей, але імі трэба карыстацца асцярожна, таму што ў межах групы бывае вялікая варыяцыя і абагульненні нельга прымяніць да кожнага чалавека. Дадатковую інфармацыю аб стэрэатыпах можна атрымаць у раздзеле «Дыскрымінацыя і нецярпімасць» на сайце www.coe.int/compass.

## Варыянты

Інструкцыі прадугледжваюць індывідуальную працу ўдзельнікаў, але практыкаванне можа быць выканана і ў малых групах у залежнасці ад колькасці фотакамер ці мабільных тэлефонаў, даступных для здымання.

Замест таго, каб рабіць асобныя плакаты, усе здымкі можна аб'яднаць і зрабіць агульную выстаўку або слайд-шоу пад назвай «Жыццё на задворках грамадства».

Замест таго, каб рабіць фотаздымкі, папрасіце ўдзельнікаў, каб пасля вяртання яны расказалі выдуманую гісторыю пра нейкага чалавека або паказалі яе ў форме пантамімы.

Калі вы хочаце, каб удзельнікі зразумелі, як гэта – жыць па-іншаму, глядзець на свет іншымі вачыма і ісці іншым шляхам, то дайце ім новыя акуляры і новы абутак! У розных мовах існуюць розныя выразы, каб прапанаваць людзям паспрабаваць уявіць сябе іншым чалавекам і перажыць спачуванне да іншага чалавека.

У тым выглядзе, як яно апісана, практыкаванне рэкамендуе ўдзельнікам уявіць сабе, як жыве чалавек, які знаходзіцца ва ўразлівым або маргінальным становішчы, а потым выйсці і паспрабаваць паглядзець на свет яго вачыма. У якасці альтэрнатывы можна выйсці і паназіраць, а потым уключыць фантазію і прыдумаць астатняе. Растлумачце, што ў нашым паўсядзённым жыцці мы вельмі заняты і ўвогуле не звяртаем увагі на іншых людзей. Цяпер жа ім трэба будзе глядзець вельмі ўважліва! Скажыце ўдзельнікам, каб яны выйшлі ў горад, за 5 хвілін выбралі каго-небудзь і пайшлі за ім. Падкрэсліце, што зрабіць гэта трэба непрыкметна і не турбаваць абранага чалавека. Гэта можа быць любы, хто выглядае «незвычайна», пажадана такі чалавек, чыё жыццё вельмі моцна адрозніваецца ад жыцця ўдзельніка. Скажыце ўдзельнікам, што ім трэба запомніць самае першае ўражанне пра гэтага чалавека і прычыну, па якой яны вырашылі выбраць менавіта яго. Далей ім трэба пайсці за сваім аб'ектам, уважліва назіраць за ім/ёй, спрабаваць уявіць сабе, хто ён/яна, і намаляваць агульную карціну яго/яе жыцця, напрыклад:

- Якое ў яго/яе можа быць імя?
- Колькі яму/ёй гадоў?
- Чым ён/яна займаецца?
- Куды ён/яна ідзе?
- Дзе ён/яна жыве?
- Ці ёсць у яго/яе партнёр або сям'я, ці ён/яна адзінокі(-ая)?
- Ці мае ён/яна праца? Кім ён/яна працуе? Ці ён/яна беспрацоўны(-ая)?
- Што можа зрабіць яго/яе шчаслівым(-ай)?
- Ці ёсць у яго/яе хобі? Калі ёсць, то якое?
- Што яму/ёй падабаецца з ежы і напіткаў?

Дагаварыцеся, што, напрыклад, праз 30 хвілін усе вернуцца, каб падзяліцца сваім вопытам. Яны могуць распавесци пра жыццё абранага імі чалавека словамі або з дапамогай фотаздымкаў.

Магчыма, вы захочаце выкарыстаць ролі, пералічаныя ў практыкаванні «Зрабі крок наперад» на старонцы 281. Гэта магло б стаць добрым увядзеннем у практыкаванне або яго працягам.

## Прапановы па далейшай працы

З дапамогай практыкавання «Зрабі крок наперад» на старонцы 281 вы можаце зразумець, якім чынам няроўнасць магчымасцяў уплывае на жыццё людзей.

Практыкаванне «Аповесць пра два гарады» на старонцы 286 дазваляе даследаваць пытанне аб тым, як абраныя намі спосабы фінансавання сацыяльнага забеспячэння ўплываюць на жыццё супольнасці.

Калі чалавек аказваецца на задворках грамадства, то для выхаду з гэтага становішча яму патрэбна праца з належным заробкам. Знайсці яе можа быць цяжка, калі вы, напрыклад, чалавек з інваліднасцю або імігрант. Вы можаце азнаёміцца з некаторымі такімі сітуацыямі, звярнуўшыся да практыкавання «Я хачу працаваць» на старонцы 193.

## Ідэі для дзеяння

Выканайце гэта практыкаванне з сям'ёй, сябрамі ці калегамі і пачніце абмеркаванне правоў чалавека.

Вы таксама можаце праверыць свае прадстаўленні пра маргінальныя пласты насельніцтва, арганізаваўшы сустрэчу з яго прадстаўніком, напрыклад, праз праект «Жывая бібліятэка» або, калі вас цікавяць бяздомныя і бежанцы, наведаўшы прытулак або цэнтр размяшчэння асоб у пошуках прытулку. Таксама вы можаце звязацца з актывістам маладзёжнай арганізацыі або з сацыяльным работнікам, які займаецца маргіналізаванымі групамі насельніцтва, і папрасіць іх расказаць пра сапраўднае жыццё людзей, з якімі яны працуюць.

## Дадатковая інфармацыя

У кантэксце гэтага практыкавання мы выкарыстоўваем тэрмін «уразлівыя групы (асобы)», які азначае людзей, якія не заўсёды ў стане пракарміць сябе, не з'яўляюцца самадастатковымі або вымушаны спадзявацца на фінансавую падтрымку. Таму яны жывуць у беднасці. У якасці прыкладаў можна прывесці адзінокіх маці, імігрантаў ці асоб з інваліднасцю. Людзі часта з'яўляюцца «ўразлівымі», таму што асноўная частка грамадства паводзіць сябе такім чынам, які ставіць іх у такое становішча. Гэтыя людзі і групы лічаць сябе ўразлівымі, таму што яны пазбаўлены доступу да аховы здароўя, адукацыі, інфармацыі і працаўладкавання ў параўнанні з асноўнай часткай грамадства. Людзі з уразлівых груп могуць таксама адчуваць недахоп самастойнасці, матывацыі, адказнасці і павагі да сябе. Бар'еры на шляху да самазабеспячэння могуць уключаць адсутнасць рэсурсаў, напрыклад адсутнасць працы, капіталу або даступнага грамадскага транспарту для людзей з інваліднасцю. Яшчэ адным бар’ерам з’яўляецца недаступнасць: кошт, дрэнная планіроўка, адлегласць, адсутнасць рэкламы і ўвагі грамадства да праблем канкрэтнай групы. Рэсурс таксама можа быць недаступным, калі ён не падабаецца, непрыемны для пэўнай групы або не адпавядае яе каштоўнасцям. Пры гэтым «уразлівыя» не абавязкова жывуць на «задворках грамадства» або на мяжы адчужэння.

Калі мы выкарыстоўваем тэрмін «задворкі грамадства», мы маем на ўвазе канцэптуальнае, а не фізічнае месцазнаходжанне. Па сутнасці людзі, якія жывуць на задворках грамадства, выключаны з удзелу ў грамадскім жыцці. Прыкладамі людзей, якія жывуць на задворках або перыферыі грамадства, могуць стаць зняволеныя, бяздомныя людзі, людзі з псіхічнымі парушэннямі ці пэўныя групы, напрыклад рама. Бяздомны чалавек, напрыклад, не зможа зарэгістравацца для галасавання, таму што ў яго няма паштовага адраса. Гэта можа азначаць, што такія людзі губляюць права на галасаванне па ключавых пытаннях, якія могуць закранаць іх жыццё; яны застаюцца па-за межамі грамадства, таму што ім не даюць магчымасці паўплываць на тое, як імі будуць кіраваць і якія паслугі ім будуць аказваць. Іншым прыкладам уразлівага чалавека можа быць непісьменны чалавек, які становіцца ізгоем, таму што не ў стане запоўніць бланк скаргі або заявы на працу.

Ідэя «Жывой бібліятэкі» ўзнікла ў Даніі ў 2000 годзе і ў цяперашні час прасоўваецца Саветам Еўропы ў кнізе пад назвай «Не судзіце пра кнігу па яе вокладцы!». «Жывая бібліятэка» працуе гэтак жа, як і звычайная бібліятэка: чытачы прыходзяць і пазычаюць «кнігу» на абмежаваны перыяд часу. Пасля прачытання яны вяртаюць кнігу ў бібліятэку і пры жаданні могуць узяць іншую. Існуе толькі адно адрозненне: кнігі ў «Жывой бібліятэцы» – гэта людзі, і яны ўступаюць у дыялог з чытачамі. Такія кнігі ў «Жывой бібліятэцы» прадстаўляюць групы, якія сутыкаюцца з забабонамі і стэрэатыпамі і нярэдка становяцца ахвярамі дыскрымінацыі і сацыяльнай ізаляцыі.

Для далейшага азнаямлення з пытаннямі дыскрымінацыі і праблемамі, якія патрабуюць сацыяльнага дзеяння, можна прачытаць кнігу Стывена Е. Маера, доктара філасофіі, пад назвай «Што такое ўразлівыя групы?», даступную на сайце www.effectivecommunities.com/articles.

**Заўвага**.
Гэта практыкаванне было распрацавана на аснове ранейшага, якое было створана і апрабавана ўдзельнікамі навучальнага курса «Навучанне правам чалавека і нефармальнасць: як вы будзеце дзейнічаць у нефармальныя часы і моманты з пункту гледжання адукацыі ў галіне правоў чалавека?», арганізаванага Асацыяцыяй «Інтэркультура» (Дзінан, Францыя, май 2009 года). Гэта практыкаванне ўлічвае вопыт работы з ідэямі групы «Тэорыя выбуху» і звязанага з ёю праекта «Вершнік сказаў». http://www.blasttheory.co.uk

## Правы дзяцей

*У раздробленым свеце дзеці – гэта аб'яднальная сіла, якая можа згуртаваць нас для падтрымкі агульных маральных прынцыпаў.*

*Граса Машэл-Мандэла*

Дзеці

Агульныя правы чалавека

Адукацыя

Узровень 2

Любы (малыя групы па 3–4 чалавекі)

60 хвілін

| | |
|---|---|
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | любы (малыя групы: 3–4 чалавекі) |
| **Час** | 60 хвілін |
| **Тэмы** | • дзеці,<br>• агульныя правы чалавека,<br>• адукацыя. |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні выкарыстоўваецца метад рэйтынгу ў форме ромба як стымул да абмеркавання Канвенцыі аб правах дзіцяці (КПД), уключаючы наступныя пытанні:<br>• асноўныя правы чалавека і асаблівыя правы дзіцяці, якія змяшчаюцца ў канвенцыі;<br>• правы і абавязкі ў адпаведнасці з КПД;<br>• як адстойваць правы? |
| **Звязаныя правы** | • правы дзяцей (усе);<br>• права свабодна выказваць меркаванне па ўсіх пытаннях, якія тычацца дзіцяці;<br>• права на абарону ад эканамічнай эксплуатацыі;<br>• права на адпачынак і вольны час і права карыстацца здабыткамі сваёй культуры. |
| **Мэты** | • азнаямленне з Канвенцыяй аб правах дзіцяці (КПД);<br>• развіццё навыкаў крытычнага аналізу інфармацыі і яе суаднясення з рэчаіснасцю;<br>• развіццё пачуцця адказнасці, салідарнасці, справядлівасці і роўнасці. |
| **Матэрыялы** | • карткі са сцвердажаннямі, па адным наборы на малую групу;<br>• вялікі ліст паперы для насценнай табліцы і маркеры;<br>• прасторнае памяшканне для раздзельнай працы малых груп. |
| **Падрыхтоўка** | • скарочаны варыянт Канвенцыі аб правах дзіцяці глядзіце на старонцы 605. Пералічыце артыкулы на вялікім аркушы паперы ў выглядзе насценнай табліцы;<br>• праглядзіце прыведзеныя ніжэй карткі са сцвердажаннямі і суаднясіце іх з КПД. Вырашыце, якія артыкулы Канвенцыі могуць выклікаць найбольш цікавую дыскусію ў вашай групе. Прадумайце, якія пытанні ў найбольшай ступені цікавяць членаў групы, а якія з'яўляюцца самымі спрэчнымі. У выпадку неабходнасці выберыце іншыя правы і зрабіце свае ўласныя карткі;<br>• падрыхтуйце па адным наборы картак для кожнай малой групы. Раскладзіце іх па канвертах, каб не пераблытаць! |

## Інструкцыі

1. Дайце кароткі агляд КПД. Спытайце, што ўдзельнікам вядома аб канвенцыі. Звярніце ўвагу ўдзельнікаў на насценную табліцу і пералічыце асноўныя артыкулы канвенцыі.
2. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на малыя групы з трох-чатырох чалавек. Раздайце канверты з карткамі.

3. Растлумачце правілы ранжыравання ў форме ромба. Кожная група павінна абмеркаваць, якое дачыненне да іх жыцця мае кожнае з дзевяці атрыманых сцверджанняў, і размясціць карткі ў форме ромба ў парадку іх важнасці. Трэба пакласці на стол самае важнае сцверджанне, а пад ім размясціць два менш важныя сцверджанні, пад імі – тры яшчэ менш важныя, у чацвёртым радку трэба размясціць зноў две карткі, а ў пятым – адну, з найменш важным сцверджаннем. У выніку карткі будуць размешчаны ў выглядзе ромба.
4. Дайце групам 25 хвілін на абмеркаванне і вызначэнне ступені важнасці сцверджанняў.
5. Калі малыя групы скончаць працу, прапануйце ім прайсціся па пакоі і азнаёміцца з вынікамі ранжыравання ў іншых групах. Затым збярыце ўсіх удзельнікаў на агульнае пасяджэнне для аналізу.

ВАЖНАЯ ДАТА

**20 лістапада**
Сусветны дзень дзіцяці

## Аналіз і ацэнка

Спачатку папрасіце ўсе групы па чарзе прадставіць вынікі сваіх абмеркаванняў. Пасля гэтага высветліце, ці спадабалася ўдзельнікам практыкаванне і чаму яны з яго дапамогай навучыліся, выкарыстоўваючы наступныя пытанні:

- Як суадносяцца вынікі абмеркаванняў у розных групах? Што супадае і што адрозніваецца?
- Чаму ў розных людзей розныя перавагі?
- Некаторыя могуць сказаць, што ў іх супольнасці адно з правоў важнейшае за іншых, але нельга казаць, што нейкае права само па сабе важнейшае за іншых. Чаму?
- Ці хоча якая-небудзь з груп змяніць размяшчэнне сваіх картак пад уплывам аргументаў іншых? Якія аргументы аказаліся самымі пераканаўчымі?
- У цэлым, якія з правоў дзіцяці не карыстаюцца належнай павагай у вашым грамадстве і чаму?
- Ці адсутнічаюць у канвенцыі якія-небудзь правы, якія, па меркаванні ўдзельнікаў занятку, трэба туды ўключыць?
- Чаму дзецям патрэбна ўласная канвенцыя?
- Калі існуе Канвенцыя аб правах дзіцяці, ці не трэба прыняць Канвенцыю аб правах моладзі ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў? Якія асаблівыя правы моладзі павінна ўключаць такая канвенцыя?
- Правы дзіцяці, прадугледжаныя КПД, – гэта добра, але наколькі рэальна выкананне правоў дзіцяці на справе?
- Як дзеці могуць дамагацца выканання сваіх правоў?
- Калі адным са спосабаў адстойвання сваіх правоў з'яўляецца ўдзел у дэмакратычным працэсе, што ўдзельнікі могуць пачаць рабіць дома, у школе, у клубе, каб дамагчыся выканання сваіх правоў? Якія правы асабліва значныя для маладых людзей у групе?
- Ці выкарыстоўваецца ў вашым горадзе прылада «Маскіт», якая прызначана для разгону моладзі ў публічных месцах? Якія правы маладых людзей парушае прымяненне такой прылады?
- Да каго ў сваім грамадстве могуць звярнуцца дзеці, калі ім стала вядома пра выпадкі сур'ёзных парушэнняў іх правоў?

## Парады для фасілітатараў

Больш падрабязна пра метад ранжыравання ў форме ромба чытайце ў раздзеле «Як карыстацца дапаможнікам» на старонцы 45 у главе 1. Звярніце ўвагу груп на тое, што не існуе адзінага правільнага спосабу размяшчэнне картак, таксама як няма і няправільнага. Удзельнікі павінны разумець, што ў розных людзей розны вопыт і, адпаведна, розныя прыярытэты, якія варта паважаць. Тым не менш яны павінны імкнуцца да дасягнення кансэнсусу ў кожнай групе адносна парадку размяшчэння картак. Урэшце рэшт, у рэальным жыцці прыходзіцца расстаўляць прыярытэты прымаць рашэнні з улікам інтарэсаў усіх!

Падчас апісання практыкавання і працэсу ацэнкі трэба растлумачыць удзельнікам, што расстаўляць прыярытэты трэба ў адпаведнасці з важнасцю правоў у жыцці саміх удзельнікаў. Няма сэнсу абмяркоўваць прыярытэт правоў увогуле. Правы чалавека непадзельныя, таму будзе некарэктным сцвярджаць, што права на адукацыю больш важнае за свабоду слова. Але будзе правільным сказаць, што ў маёй супольнасці права на адукацыю больш важнае, таму што ў нас няма школы, хоць і ёсць свабодная прэса.

## Варыянты

Замест дзевяці картак з артыкуламі КПД раздайце восем, а адну пакіньце пустой, каб члены групы самі вызначылі дзявяты.

Пакладзіце карткі ў капялюш і прапануйце ўдзельнікам па чарзе выняць па адной картцы і на працягу адной хвіліны гаварыць на вызначаную ў ёй тэму. Інфармацыю аб гэтым метадзе глядзіце ў практыкаванні «Хвіліначку» на старонцы 199.

Папрасіце малыя групы напісаць кароткае апавяданне або разыграць кароткую сцэнку, у якой адлюстроўваўся б эпізод, звязаны з абранымі артыкуламі КПД. Як варыянт, гэтыя апавяданні (сцэнкі) могуць быць заснаваны на падзеях, апісаных у СМІ, нечым, пра што ўдзельнікі чулі ці што бачылі ў фільмах або спектаклях, чыталі ў кнізе або ў часопісе. Сцэнкі можна дапаўняць у працэсе: удзельнікі могуць пачаць з прайгравання нейкага эпізоду, а потым перайсці да пошуку рашэнняў або шляхоў прадухілення ў будучыні інцыдэнтаў, падобных на гэты, ці парушэнняў правоў у цэлым.

## Прапановы па далейшай працы

Запрасіце выступіць перад групай чалавека, знаёмага з КПД: суддзю, адваката, пракурора, кіраўніка дзіцячай службы «Тэлефон даверу», дзіцячага псіхолага, супрацоўніка ўпраўлення ўпаўнаважанага па правах чалавека. Перад размовай правядзіце мазгавы штурм наконт магчымых парушэнняў правоў дзіцяці, такіх як дрэннае абыходжанне, сексуальная эксплуатацыя, грэбаванне абавязкамі ў адносінах да дзяцей ці здзекі. Спытайце ў эксперта, хто нясе адказнасць за гэтыя пытанні і клапоціцца пра іх у мясцовай супольнасці, напрыклад бацькі, паліцыя, службы дапамогі, сацыяльныя працаўнікі і г. д. Папрасіце парады, як дзейнічаць, калі стаў сведкам парушэнняў, асабліва такіх сур'ёзных, як жорсткія адносіны суседа да сваіх дзяцей. Такія пытанні патрабуюць такту, удзелу і асцярожнасці.

Выберыце пытанне, важнае для ўсёй групы, і папрасіце ўдзельнікаў яго абмеркаваць, звяртаючы асаблівую ўвагу на тое, чаму, на іх думку, іх правы парушаюцца. Ім трэба таксама падумаць, як іх парушаныя правы суадносяцца з правамі іншых людзей. Акрамя таго, можна прыняць удзел у абмеркаванні на Дэбатапедыі. Прапанаваныя тэмы: выкарыстанне санкцый для спынення дзіцячай працы, ці маюць дзеці права ведаць сваіх біялагічных бацькоў, прэзерватывы ў школах, мабільныя тэлефоны ў вучняў у школе, ці варта знізіць выбарчы ўзрост, зніжэнне ўзросту дазволенага спажывання спіртных напояў. Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўваюцца на сайце http://debatepedia.idebate.org/en/index.php/Category:Youth.

Даведайцеся больш пра работу Савета Еўропы з моладдзю – увядзіце пошукавы запыт «будаўніцтва Еўропы для дзяцей і разам з дзецьмі».

Практыкаванне «На лесвіцы» на старонцы 236 дае магчымасць разгледзець розныя пытанні, якія маюць дачыненне да маладзёжнага ўдзелу.

Дзеці і моладзь нярэдка падвяргаюцца дыскрымінацыі. Калі група хоча паглыбіцца ў праблему дыскрымінацыі, звярніцеся да практыкавання «Усе розныя – усе роўныя» на старонцы 97.

## Ідэі для дзеяння

Калі вы працуеце ў школе, папрасіце вучняў азнаёміцца з адміністрацыйнымі распараджэннямі і палітыкай школы і вызначыць, наколькі школа выконвае свае абавязкі ў адпаведнасці з КПД. Напрыклад, ці забяспечвае яна адукацыю, накіраваную на развіццё асобы, талентаў і здольнасцей дзіцяці, ці ж асноўны ўпор робіцца на муштру вучняў для экзаменаў? Ці маюць яны права свабодна выказваць сваё меркаванне па ўсіх пытаннях, якія іх тычацца? Ці прыслухоўваюцца да іх думкі па-сапраўднаму? Іншымі словамі, ці працуе школьны савет і наколькі эфектыўна? Ці паважаюць годнасць дзіцяці ў працэсе падтрымання дысцыпліны ў школе? Як рэагуе школа на праявы расізму і жорсткасці? Абмяркуйце, дзе і што можна палепшыць і якія меры можна і неабходна прыняць для гэтага? Азнаёмцеся з прыкладамі з раздзела «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека» і прыступайце да планавання праекта. Будзьце асцярожны, не спяшайцеся, пазбягайце крокаў, якія (без патрэбы) будуць нерваваць настаўнікаў, асабліва калі ў іх узнікне ўражанне, што вы спрабуеце абмежаваць іх уладу!

Калі вы працуеце ў маладзёжным клубе або арганізацыі, папрасіце іх членаў прааналізаваць палітыку кіравання і магчымасці для ўдзелу.

Прыміце ўдзел у дыскусіі на сайце http://debatepedia.idebate.org (катэгорыя: моладзь).

## Дадатковая інфармацыя

З поўным тэкстам Канвенцыі, адпаведных дакументаў ЮНІСЕФ аб становішчы дзяцей у свеце, якія выдаюцца штогод, іншымі кнігамі і публікацыямі аб правах дзіцяці можна азнаёміцца, перайшоўшы па спасылках у главе 5 на сайце www.coe.int/compass, раздзел «Дзеці».

Парламенцкая асамблея Савета Еўропы заклікала забараніць «гукавыя гарматы» для разгону моладзі (прылада «Маскіт»). На пасяджэнні ў чэрвені 2010 года Асамблея заклікала забараніць усе акустычныя прылады, якія дыскрымінуюць моладзь, напрыклад гукавыя гарматы «Маскіт», якія выдаюць магутны гукавы сігнал, чутны амаль усім людзям ва ўзросце да 20 гадоў, але практычна нячутны для тых, каму больш за 25 гадоў; такія прылады выкарыстоўваюцца для разгону моладзі ў публічных месцах. Рэкамендацыя Асамблеі, аднагалосна прынятая парламентарыямі ўсіх краін – членаў Савета Еўропы, абвяшчае, што гэта «выключна абразлівая» прылада дыскрымінуе маладых людзей, нібы яны «непажаданыя птушкі або шкоднікі». Яе выкарыстанне можа таксама парушаць правы чалавека, такія як права на прыватнае жыццё або свабоду сходаў, а таксама можа прадстаўляць сабой зневажальнае чалавечую годнасць абыходжанне, паколькі выклікае боль у вушах.

**«Калі 16-гадовыя дастаткова дарослыя, каб піць ваду, якую забруджвае прамысловасць, якую вы рэгулюеце, калі 16-гадовыя дастаткова дарослыя, каб дыхаць паветрам, атручаным заводамі па спальванні смецця, пабудаванымі дзяржавай, калі 16-гадовыя дастаткова дарослыя, каб хадзіць па вуліцах, небяспечных з-за правальнай палітыкі ў вобласці кантролю над наркотыкамі і злачыннасцю, калі 16-гадовыя дастаткова дарослыя, каб жыць у галечы ў самай багатай краіне свету, калі 16-гадовыя дастаткова дарослыя, каб захварэць у краіне з самай горшай дзяржаўнай медыцынай у свеце, калі 16-гадовыя дастаткова дарослыя, каб хадзіць у школы, якія вы недастаткова фінансуеце, тады 16-гадовыя дастаткова дарослыя, каб адыграць сваю ролю ў паляпшэнні сітуацыі».**

*Рэбека Цільсен, 14 гадоў, з выступлення перад падкамітэтам палаты прадстаўнікоў Мінесоты ў 1991 годзе наконт зніжэння выбарчага ўзросту.*

## Раздатачныя матэрыялы

**Карткі са сцверджаннямі**

Зрабіце ксеракопіі прыведзеных ніжэй вытрымак з артыкулаў КПД і разрэжце іх на карткі.

| |
|---|
| Дзіця мае права свабодна выказваць свае погляды на ўсе пытанні, якія яго тычацца, прычым гэтыя погляды павінны атрымліваць належную ўвагу. Дзіця мае права на свабоду выказвання меркавання. |
| Права дзіцяці на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі павінна паважацца. Дзіця мае права на ўдзел у аб’яднаннях і мірных сходах. |
| Кожнае дзіця мае права на свабоду ад умяшання ў яго прыватнае і сямейнае жыццё, жыллё і перапіску. Дзіця павінна быць абаронена ад незаконных нападкаў на яго гонар і рэпутацыю. |
| Бацькі нясуць асноўную адказнасць за выхаванне і развіццё дзіцяці. |
| Дзіця мае права на адукацыю. Дзяржавы павінны забяспечыць абавязковую пачатковую адукацыю, бясплатную і даступную для ўсіх. Школьная дысцыпліна павінна падтрымлівацца з дапамогай метадаў, у аснове якіх ляжыць павага чалавечай годнасці дзіцяці. Адукацыя павінна быць накіравана на развіццё асобы, талентаў і здольнасцей дзіцяці, выхаванне павагі да правоў чалавека і асноўных свабод, падрыхтоўку дзіцяці да свядомага жыцця ў свабодным грамадстве ў духу міру, сяброўства, разумення, цярпімасці і роўнасці, выхаванне павагі да навакольнага асяроддзя. |
| Дзіця мае права на адпачынак і вольны час, права ўдзельнічаць у культурным жыцці і займацца мастацтвам. |
| Дзіця павінна быць абаронена ад эканамічнай эксплуатацыі і ад выканання працы, якая з'яўляецца небяспечнай для яго жыцця і развіцця. Дзіця павінна быць абаронена ад усіх формаў сексуальнай эксплуатацыі і сексуальнага гвалту, выкарыстання ў прастытуцыі або ў іншых незаконных сексуальных практыках, у парнаграфіі і парнаграфічных матэрыялах. |
| Дзяржава павінна прыняць усе магчымыя меры для абароны дзяцей, закранутых узброеным канфліктам, і догляду за імі. |
| Дзіця, якое абвінавачваецца ў парушэнні крымінальнага заканадаўства, павінна мець гарантыі таго, што на яго распаўсюджваецца прэзумпцыя невінаватасці, пакуль віна не будзе даказана ў адпаведнасці з законам; такое дзіця мае права на атрыманне прававой дапамогі пры ажыццяўленні сваёй абароны, а таксама права не даваць паказанняў або не прызнаваць сваю віну; права на павагу яго асабістага жыцця і абыходжанне з улікам яго ўзросту, абставін і дабрабыту. Дзеці, якія ўчынілі злачынствы ва ўзросце да 18 гадоў, не падлягаюць смяротнаму пакаранню або пажыццёваму турэмнаму зняволенню без магчымасці вызвалення. |

# Розныя зарплаты

*Роўная плата за роўную працу!*

**Тэмы**
- праца,
- гендар,
- дыскрымінацыя і нецярпімасць.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** 6 і больш чалавек

**Час** 60 хвілін

**Агляд** Гэта сімуляцыя сутыкае ўдзельнікаў з рэальным становішчам на рынку працы. Абмяркоўваюцца наступныя пытанні:
- розная аплаты аднолькавай працы;
- дыскрымінацыя на працоўным месцы;
- палітыка нізкай аплаты працы маладых працаўнікоў.

**Звязаныя правы**
- права на свабодны выбар працы і ўступленне ў прафсаюзы;
- права на справядлівую аплату працы і роўную аплату аднолькавай працы;
- права не падвяргацца дыскрымінацыі па прыкмеце ўзросту або полу.

**Мэты**
- расказаць удзельнікам пра рэаліі дыскрымінацыі на працоўным месцы;
- развіць уменне адказваць на несправядлівасць і абараняць правы;
- садзейнічаць прасоўванню салідарнасці, роўнасці і справядлівасці.

**Матэрыялы**
- 1 экзэмпляр тарыфных ставак працаўнікоў;
- ідэнтыфікатары, адзін на кожнага ўдзельніка (працаўніка);
- валюта. Можна выкарыстоўваць валюту са старонкі 354 «Компаса».

**Падрыхтоўка**
- Падрыхтуйце ідэнтыфікатары. У іх можна адлюстраваць толькі ўзрост і пол працаўніка. Для даведкі карыстайцеся тарыфнай сеткай.
- Прыдумайце для ўдзельнікаў нейкае заданне; збярыце ў адно месца любое абсталяванне або матэрыялы, якія могуць спатрэбіцца для яго выканання.

Праца

Гендар

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Узровень 2

6 і больш

60 хвілін

## Інструкцыі

1. Растлумачце ўдзельнікам, што яны будуць іграць ролю працаўнікоў, якія павінны выканаць нейкую працу для свайго працадаўцы (вас!). Турбавацца не трэба – усе атрымаюць заработную плату. Мы не прызнаём рабства!
2. Раздайце ідэнтыфікатары ў адвольным парадку, кожнаму ўдзельніку па адным.
3. Растлумачце заданне і ўпэўніцеся, што ўсе зразумелі, што ім трэба рабіць.
4. Няхай прыступаюць да працы!
5. Калі ўся праца будзе выканана, папрасіце працаўнікоў устаць у чаргу па заработную плату. Заплаціце кожнаму ў адпаведнасці з узростам і полам, як гэта адлюстравана ў тарыфнай сетцы. Вы павінны гучна падлічваць грошы, каб усе ведалі, колькі грошай хто атрымаў.
6. Калі ўдзельнікі пачнуць задаваць пытанні ці скардзіцца, адказвайце коратка і не ўступайце ў перамовы.
7. Вы павінны будзеце самі вырашыць, як далёка вы можаце зайсці, але спыніцеся, калі адчуеце, што атмасфера абвастраецца! Дайце ўсім час супакоіцца і выйсці з ролі, а потым сядзьце ў кола для аналізу.

## Аналіз і ацэнка

Правядзіце абмеркаванне паэтапна. Пачніце з разгляду самой сітуацыі:

- Як вы сябе адчувалі, калі атрымалі больш (або менш), чым іншыя працаўнікі, хоць усе выконвалі абсалютна аднолькавую задачу?
- Чаму адны атрымалі больш (або менш), чым іншыя? Якія крытэрыі былі выкарыстаны?
- Як вы сябе адчувалі, калі атрымалі больш за астатніх? Як вы сябе адчувалі, калі атрымалі менш за астатніх?
- Ці практыкуецца такая дыскрымінацыя на працоўных месцах у вашай краіне або супольнасці?

Затым абмяркуйце адрозненні ў аплаце працы па палавой прыкмеце:

- Ці апраўдана розная аплата адной і той жа працы, выкананай мужчынам і жанчынай? Чаму? Чаму не? Калі так, то ў якіх выпадках?
- Што, калі мужчына выконвае працу лепш, чым жанчына? Ці з'яўляецца гэта дастатковай падставай для таго, каб плаціць жанчыне менш?
- Калі мужчына больш кваліфікаваны, чым жанчына, ці значыць гэта, што яму трэба плаціць больш?
- Ці лічыце вы, што існуе праца, якую павінны выконваць выключна мужчыны? Чаму? Чаму не? Калі так, то якая праца?
- Ці лічыце вы, што існуе праца, якую павінны выконваць выключна жанчыны? Чаму? Чаму не? Калі так, то якая праца?
- Ці лічыце вы, што пазітыўная дыскрымінацыя можа быць апраўдана ў мэтах змянення сацыяльных установак?

Урэшце рэшт, абмяркуйце аплату працы ў залежнасці ад узросту:

- Ці існуе ў вашай краіне практыка рознай аплаты працы ў залежнасці ад узросту? Калі няма, то ці лічыце вы, што яе трэба ўвесці?
- Як можна лагічна абгрунтаваць прымяненне такой палітыкі, асабліва ў дачыненні да маладых людзей?
- Што вы думаеце пра такую палітыку? Ці яна добрая? Дрэнная? Патрэбная? Непатрэбная? Прывядзіце аргументы.
- Якія правы чалавека яна парушае або можа парушыць?
- Як можна дабіцца выканання гэтых правоў?

## Парады для фасілітатараў

Калі трэба дадаць да спіса працаўнікоў або выдаліць некаторых з яго, прасачыце, каб пры гэтым захоўваўся баланс паміж колькасцю працаўнікоў рознага полу і ўзросту. Калі група вялікая ці вы хочаце правесці дыскусію аб двух розных відах дыскрымінацыі, можна падзяліць групу на дзве часткі. Тады адна падгрупа зможа абмеркаваць тэму дыскрымінацыі па прыкмеце полу, а другая – па прыкмеце ўзросту.

Якога роду заданні падыходзяць для гэтага практыкавання? Кожны ўдзельнік павінен працаваць над адным і тым жа заданнем. Паспрабуйце таксама выбраць нешта такое, чым некалькі чалавек маглі б заняцца адначасова, каб тыя, хто чакае сваёй чаргі, не засумавалі. Прадумайце наступныя моманты:

- Калі вы хочаце займацца на вуліцы, ці падыходзіць для гэтага сезон?
- Ці дастаткова ў вас месца?
- Ці могуць людзі рознага ўзросту, мужчыны і жанчыны выконваць гэту працу аднолькава лёгка і эфектыўна?
- Ці бяспечная гэтая праца?
- Ці не паставіць гэта праца каго-небудзь з удзельнікаў у няёмкае становішча? Ці не адмовіцца хто-небудзь ад яе па этычных меркаваннях?
- Колькі часу зойме яе выкананне?
- Ці патрабуецца для яе выканання вялікая колькасць навыкаў?
- Як яе можна паўтарыць некалькі разоў?

Прыклады заданняў:

- Вымыць класную дошку і акуратна напісаць на ёй нейкую канкрэтную фразу.
- Зняць кнігі з паліцы і пакласці іх у каробку. Перанесці каробку ў іншы кут пакоя, распакаваць яе і паставіць кнігі на іншую паліцу.
- Зрабіць фігурку з паперы (самалёцік або шапку).
- Прывесці ў парадак кабінет або частку саду.
- Прыбраць смецце на пэўным участку.
- Вымыць вокны ў школе (будынку), дзе праходзіць занятак, або вымыць машыны настаўнікаў (трэнераў)!
- Сабраць лісце трох розных відаў і прымацаваць іх да аркуша паперы.
- Знайсці вызначэнне слова і запісаць яго на аркушы паперы. (Калі вы выбераце розныя словы, якія адносяцца да тэмы правоў чалавека, у выніку ў вас можа атрымацца кароткі тэрміналагічны гласарый!)

Калі будзеце выдаваць грошы і тлумачыць розніцу ў аплаце, вам трэба будзе прыдумаць нейкія «прычыны». Іх можна прывязаць да рэальнай сітуацыі або проста ўзяць з галавы. Напрыклад:

- хто спатыкнуўся, той атрымае менш;
- хто ўсміхаўся і быў задаволены, атрымае больш;
- сёння пятніца!

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**Другі аўторак красавіка**
Еўрапейскі дзень роўнай аплаты працы

## Варыянты

Грошы неабавязкова павінен выдаваць фасілітатар, касірамі могуць стаць двое ўдзельнікаў.

У залежнасці ад абранага задання можна вызначыць тэрмін яго выканання, як на заводзе. Калі заданне вельмі простае або ў вас менш за шэсць гульцоў, можна правесці тры-чатыры раўнды, кожны з якіх будзе адпавядаць аднаму працоўнаму дню. Пасля кожнага раўнда працаўнікі ідуць у банк, падпісваюць дакументы і атрымліваюць плату за дзень. Будзьце гатовы, што некаторыя ўдзельнікі хутка зразумеюць, што плата несправядлівая, і пачнуць скардзіцца. У гэтым выпадку вы можаце звольніць іх і сказаць астатнім, што ім прыйдзецца працаваць больш. Будзьце гатовы да таго, што ў гэты момант рабочыя могуць абвясціць забастоўку. Сачыце, каб удзельнікі не адышлі ад тэмы, і не забывайце пра першапачатковую мэту практыкавання.

Калі вы не хочаце праводзіць гэта практыкаванне ў форме інсцэніроўкі, вы можаце адаптаваць інфармацыю і выкарыстаць яе для дыскусіі. Зрабіце для кожнага працаўніка даведку з апісаннем працы, узростам, полам і памерам заработнай платы. Вы можаце таксама ўключыць у даведку такія дэталі, як адукацыя і прафесійны вопыт. Альбо вы можаце скласці некалькі падрабязных анкет некаторых працаўнікоў. Аднак майце на ўвазе, што простае абмеркаванне не выклікае настолькі ж моцнай эмацыянальнай рэакцыі, як інсцэніроўка.

## Прапановы па далейшай працы

Калі ўдзельнікам падабаюцца ролевыя гульні і яны хочуць даведацца больш пра ролю прафсаюзаў у абароне правоў працаўнікоў на справядлівую плату і ўмовы працы, вы можаце правесці практыкаванне «Пасяджэнне прафсаюза» на старонцы 312. Ролевая гульня «Праца і дзеці» на старонцы 335 разглядае праблемы правоў жанчын і роўнасці на працоўным месцы.

## Ідэі для дзеяння

Знайдзіце інфармацыю аб правах працоўных і законах вашай краіны. Калі вы падзарабляеце (вечарамі, па выхадных або падчас канікулаў), абавязкова высветліце свае правы як працаўніка, напрыклад, ці атрымліваеце вы больш высокую плату за працу ў вячэрні час або ў выхадныя? Ці вы застрахаваны? Ці ў парадку абсталяванне, якім вы карыстаецеся, і ці выконваецца тэхніка бяспекі? Даведайцеся пра наступствы неафіцыяльнага працаўладкавання, калі ні вы, ні ваш працадавец не паведамляеце пра працу ў падатковыя службы.

## Дадатковая інфармацыя

Паколькі ў сярэднім жанчыны зарабляюць менш за мужчын, ім даводзіцца працаваць больш, каб атрымаць тую ж зарплату. Еўрапейскі дзень роўнай аплаты працы адзначаецца ў аўторак, бо менавіта да аўторка жанчына зарабляе столькі, колькі мужчына зарабіў за мінулы тыдзень.

Пытанні няроўнага ўзнагароджання працаўнікоў у розных краінах адрозніваюцца, у тым ліку ў залежнасці ад таго, ці мае месца дыскрымінацыя па прыкмеце ўзросту або полу. Гендарная дыскрымінацыя ўяўляе сабой проста дыскрымінацыю жанчын. Гістарычна склалася так, што жанчыны знаходзілася ў нявыгадным становішчы ў сацыяльнай, палітычнай і эканамічнай сферах. Прыклады дыскрымінацыі жанчын на працоўным месцы ўключаюць дыскрымінацыю ў працэсе адбору кандыдатаў і наймання на працу, дыскрымінацыю пры прасоўванні па службе, а таксама дыскрымінацыю ў аплаце працы – жанчыны ў цэлым атрымліваюць больш нізкую зарплату, чым мужчыны. Ужо той факт, што жанчыны за тую ж працу атрымліваюць менш, чым мужчыны, з'яўляецца парушэннем права на справядлівую аплату працы.

Маладыя людзі як працаўнікі таксама павінны атрымліваць справядлівую аплату. Аднак сітуацыя ў гэтых адносінах вельмі складаная і адрозніваецца ў розных краінах. У цэлым узровень беспрацоўя сярод моладзі вышэй, чым сярод людзей старэйшага ўзросту.

Хоць у цэлым прынцып роўнай платы за роўную працу выконваецца, у многіх краінах аплата працы моладзі лічыцца асаблівым выпадкам, і маладым работнікам за тую ж самую працу плацяць менш, чым дарослым. У такога падыходу два тлумачэнні. З аднаго боку, мэта зводзіцца да таго, каб утрымаць маладых людзей ад выхаду на рынак працы і заахвоціць іх працягваць адукацыю. З іншага боку, працадаўцы павінны мець нейкі стымул прымаць на працу маладых людзей без вопыту і неабходных навыкаў, асабліва тых, хто кідае школу і хто інакш будзе «боўтацца на вуліцы», пападзе ў бяду і стане абузай для дзяржавы; колькасць такіх маладых людзей усё расце. Ужыванне гэтага падыходу і яго поспех у барацьбе супраць беспрацоўя сярод моладзі ў розных краінах адрозніваюцца.

Еўрапейскі камітэт па сацыяльных правах (орган, які адказвае за выкананне Еўрапейскай сацыяльнай хартыі) не лічыць, што нізкая плата маладым людзям супярэчыць гарантыі справядлівай аплаты працы, калі адрозненне не з'яўляецца істотным і выраўноўваецца за кароткі перыяд часу. Напрыклад, лічыцца прымальным аплачваць працу 15 і 16-гадовых падлеткаў на 30 % ніжэй за мінімальную аплату працы дарослага, у той час як для маладых людзей ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў розніца не павінна перавышаць 20 %.

Моладзь не заўсёды атрымлівае нізкую зарплату. На самай справе маецца значная праслойка адукаваных маладых людзей, якія вельмі добра зарабляюць, – на думку некаторых, нават занадта добра! Напрыклад, вельмі шмат моладзі працуе ў сектары новых тэхналогій, і яны атрымліваюць значна больш высокую зарплату, чым працаўнікі, якія набліжаюцца да пенсіённага ўзросту.

**Права на справядлівае ўзнагароджанне**

**Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, артыкул 7**

Дзяржавы, якія ўдзельнічаюць у гэтым пакце, прызнаюць права кожнага на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы, уключаючы, у прыватнасці:

(a) узнагароджанне, якое забяспечвае для ўсіх працаўнікоў як мінімум:
(b) справядлівую зарплату і роўнае ўзнагароджанне за працу роўнай каштоўнасці без якога б там ні было адрознення, прычым, у прыватнасці, жанчынам павінны гарантавацца ўмовы працы не горш за тыя, якімі карыстаюцца мужчыны, з роўнай платай за роўную працу.

**Еўрапейская сацыяльная хартыя**

Артыкул 7 (5). Права дзяцей і маладых людзей на справядлівае ўзнагароджанне для маладых працаўнікоў і стажораў.
Артыкул 8 (3). Права працоўных жанчын на адсутнасць дыскрымінацыі па прыкмеце полу ў плане аплаты працы.

**Раздатачны матэрыял**

**Тарыфная сетка аплаты працы працаўнікоў у адпаведнасці з полам і ўзростам.**

| | Пол | Узрост | Плата ў еўраграшах |
|---|---|---|---|
| 1. | Мужчынскі | 35 гадоў | 100 |
| 2. | Жаночы | 16 гадоў | 30 |
| 3. | Мужчынскі | 22 гады | 70 |
| 4. | Жаночы | 32 гады | 90 |
| 5. | Мужчынскі | 16 гадоў | 50 |
| 6. | Жаночы | 19 гадоў | 60 |
| 7. | Мужчынскі | 26 гадоў | 100 |
| 8. | Мужчынскі | 20 гадоў | 70 |
| 9. | Жаночы | 24 гады | 80 |
| 10. | Мужчынскі | 37 гадоў | 100 |
| 11. | Жаночы | 17 гадоў | 30 |
| 12. | Жаночы | 23 гады | 80 |

COMPASS

Мір і гвалт

Дзеці

Здароўе

Узровень 3

9–24 чалавек (3 падгрупы)

90 хвілін

# Ці ёсць у нас альтэрнатывы?

*Калі б я толькі мог з кім-небудзь пагаварыць пра гэта!*

| | |
|---|---|
| **Складанасць** | узровень 3 |
| **Памер групы** | 9–24 чалавек (3 падгрупы) |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Тэмы** | • мір і гвалт,<br>• дзеці,<br>• здароўе. |
| **Агляд** | Ролевая гульня, у якой разглядаюцца праблемы:<br>• міжасабовага гвалту;<br>• цкавання. |
| **Звязаныя правы** | • свабода ад зневажальнага абыходжання;<br>• права на годнасць;<br>• права на абарону ад усіх відаў фізічнага і псіхалагічнага гвалту. |
| **Мэты** | • больш даведацца аб прычынах і наступствах цкавання;<br>• развіць навыкі рашэння праблем;<br>• выклікаць спачуванне да ахвяр цкавання. |
| **Матэрыялы** | • копіі сюжэтаў, якія трэба будзе разыграць (па адным сюжэце на групу);<br>• адзін экзэмпляр старонкі «Гісторыі з жыцця»;<br>• месца для правядзення ролевай гульні. |

## Інструкцыі

1. Апішыце практыкаванне. Растлумачце, што ўдзельнікам трэба будзе працаваць у малых групах, каб падрыхтаваць і прадставіць кароткія інсцэніроўкі на тэму цкавання.
2. Правядзіце кароткі мазгавы штурм на тэму «Што такое цкаванне?». Няхай усе прыйдуць да адзінага вызначэння гэтай з'явы, даведаюцца, якія формы яна можа прымаць і што яна можа мець месца ў любой школе, ВНУ, клубе, арганізацыі або на працоўным месцы.
3. Падзяліце ўдзельнікаў на тры групы, раздайце кожнай па адным сюжэце для пастаноўкі. Дайце 15 хвілін на падрыхтоўку і рэпетыцыю.
4. Калі ўсе групы падрыхтуюцца, запрасіце іх па чарзе прадставіць свае сюжэты.
5. Устрымайцеся ад заўваг, пакуль не выступяць усе групы, і пераходзьце да агульнага абмеркавання.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з абмеркавання саміх сюжэтаў.

- З якой крыніцы быў узяты матэрыял для пастаноўкі сюжэтаў? Можа, з кніг ці фільмаў пра цкаванне або з перажытага вопыту?
- Ці выглядалі пастаноўкі рэалістычнымі?
- Якія рэплікі з першага сюжэта былі канструктыўнымі і садзейнічалі вырашэнню праблемы, а якія заміналі?
- Што тычыцца другога сюжэта: ці лёгка адкрыта пагаварыць з сябрам, які сам цкуе іншых? Якая тактыка ў цэлым можа даць станоўчы вынік, а якой варта пазбягаць?

- Наконт трэцяга сюжэта: ці лёгка адкрыта пагаварыць з сябрам, які з’яўляецца ахвярай цкавання? Як знайсці прымальны для ахвяры выхад са становішча?

Цяпер папрасіце трох добраахвотнікаў зачытаць тры розныя гісторыі з жыцця. Няхай група выкажацца наконт гэтых выпадкаў, а затым пераходзьце да абмеркавання прычын цкавання, розных рэакцый на яго і правоў, якія пры гэтым парушаюцца.

- Як вы думаеце, як адчувае сябе той, хто з'яўляецца аб'ектам цкавання?
- Ці вінаваты самі ахвяры цкавання?
- Чаму адны людзі цкуюць іншых? Можа быць, з дапамогай нападкаў яны хочуць нешта даказаць?
- Ці лічыцца цкаванне формай гвалту?
- Ці звязана цкаванне з імкненнем да ўлады?
- Ці непазбежна цкаванне?
- Калі вашага сябра цкуюць, ці варта пра гэта паведаміць старэйшым, нават калі сябар падзяліўся сваёй праблемай па сакрэце?
- Якія найбольш распаўсюджаныя забабоны тычацца людзей, якіх цкуюць?
- Хто нясе адказнасць за кантроль праблемы цкавання?
- Што б вы зрабілі, калі б сталі аб'ектам цкавання?
- Што рабіць з людзьмі, якія займаюцца цкаваннем? Як прымусіць іх спыніць такія паводзіны? Ці варта іх пакараць?
- Якія правы чалавека парушаліся ў кожнай гісторыі з жыцця?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**4 чэрвеня**
Міжнародны дзень нявінных дзяцей – ахвяр агрэсіі

## Парады для фасілітатараў

Цкаванне бывае прамое і ўскоснае. Прамое цкаванне ўключае такія паводзіны, калі кагосьці абзываюць, дражняць, штурхаюць, тузаюць, б'юць, адбіраюць сумкі і іншыя рэчы і раскідваюць іх, прымушаюць аддаць грошы ці іншую маёмасць, пагражаюць ці абражаюць па прыкмеце рэлігіі, колеру скуры, дэфекту або звычкі. Ускоснае цкаванне – гэта, напрыклад, распаўсюджванне плётак з мэтай ізаляваць ахвяру ад асяроддзя. У такой з’явы можа быць адзін або некалькі зачыншчыкаў, і накіравана яна бывае супраць канкрэтнага чалавека ці некалькіх людзей. Сутнасць як прамога, так і ўскоснага цкавання – сістэматычнае фізічнае і псіхічнае запалохванне, якое ператвараецца з часам у непарыўны ланцужок гвалту і ўціску.

Калі вы працуеце з інфармацыйна-асветніцкай групай, у клубе, каледжы або на працоўным месцы, вы можаце адаптаваць сюжэты з улікам канкрэтнай сітуацыі. Памятайце пра тое, што маладыя людзі ў вашых групах самі маглі сутыкацца з цкаваннем, таму фарміруйце групы і раздавайце сюжэты з улікам гэтага.

## Варыянты

Замест ролевай гульні можна прапанаваць тром групам прааналізаваць кожную сітуацыю і прыдумаць свае рашэнні праблемы.

Можна засяродзіцца на адной з сітуацый і даць кожнай групе адзін і той жа сюжэт для працы. Кожная група павінна будзе прадставіць свой уласны варыянт гісторыі з магчымымі рашэннямі і альтэрнатывамі. Перавага такога падыходу заключаецца ў тым, што ён дае магчымасць лепш зразумець усе пытанні і атрымаць больш варыянтаў вырашэння праблемы.

Калі ў вас мала часу або няма месца для правядзення ролевай гульні, можна выкарыстаць гісторыі з жыцця як матэрыял для абмеркавання ў невялікіх групах. Папрасіце ўдзельнікаў абдумаць сітуацыі і прапанаваць варыянты канкрэтных рашэнняў і альтэрнатыў, а таксама расказаць, што б яны рабілі, калі б сталі аб'ектам цкавання.

## Прапановы па далейшай працы

Высветліце, ці арганізавана дзе-небудзь паблізу падрыхтоўка адукатараў (маладых добраахвотнікаў) па метадзе «роўны вучыць роўнага» у сферы ўрэгулявання канфліктаў. Запрасіце выкладчыка прыйсці і выступіць перад групай і прадумайце магчымасць стварэння сістэмы пасрэдніцтва ў школе, каледжы або клубе, дзе ў ролі медыятараў будуць выступаць аднагодкі навучэнцаў.

Калі вас цікавяць прыклады ўдалага навучання па метадзе «роўны вучыць роўнага», зазірніце ў раздзел «Міратворчы праект у Афенбаху, Германія; прыклад медыяцыі сярод аднагодкаў у школах», раздзел 5.1 дапаможніка «Даміно».

Калі захочаце абмеркаваць кіберцкаванне, звярніцеся да практыкавання «Маё жыццё не шоу!» на старонцы 232. Акрамя таго, групе можна прапанаваць распрацаваць меры супраць цкавання для сваёй школы або арганізацыі. Можна распрацаваць праграму па барацьбе з цкаваннем, выкарыстоўваючы метад, апісаны ў практыкаванні «Адказ расізму» на старонцы 254.

У раздзеле 4 дапаможніка «Даміно» пад назвай «Гісторыі, расказаныя маладымі людзьмі» можна прачытаць гісторыю Габора пра тое, як яго цкавалі ў школе, бо ён яўрэй. Выкарыстайце гэты прыклад, каб пачаць дыскусію пра антысемітызм або задаць пытанне «Што б вы рабілі ў гэтай сітуацыі?».

## Ідэі для дзеяння

Знайдзіце групу або асацыяцыю, якая займаецца праблемай цкавання ў вашай краіне, і прапануйце ёй сваю дапамогу.

Калі ў вас вельмі творчая група, прапануйце ёй напісаць свае сюжэты і разыграць іх.

Члены групы могуць таксама арганізаваць дэбаты на тэму цкавання ў сваіх школах або супольнасцях.

Разам з сябрамі стварыце ў сваёй школе ці супольнасці групу дапамогі маладым людзям – ахвярам цкавання.

## Дадатковая інфармацыя

Людзі, якія займаюцца цкаваннем, часам не ўсведамляюць, наколькі цяжка даводзіцца ахвяры. Магчыма, яны лічаць, што проста дражняць чалавека ці разыгрываюць яго, і гэта проста «вельмі смешна». Пачацца ўсё можа менавіта з жарту, але праз пару дзён ці тыдняў гэта пачынае засмучаць таго, над кім смяюцца. Часам задзіры лічаць, што, крыўдзячы людзей, яны выглядаюць зухаватымі. Яны могуць зайздросціць чалавеку або яго знешнасці. Магчыма, яны прывыклі быць у цэнтры ўвагі, і ім не падабаецца, што хтосьці аказаўся цікавейшым за іх, таму стараюцца абразіць гэтага чалавека. Часта задзіры не маюць навыкаў зносін і не ўмеюць сябраваць. У іх могуць быць праблемы дома: калі людзі назіраюць гвалт ці абразу ў сваёй сям'і, яны пераймаюць убачанае. Ім дрэнна, і яны хочуць прычыніць боль іншым, каб тым таксама стала дрэнна. Цялесныя пакаранні таксама могуць быць прычынай цкавання, бо яны вучаць дзяцей успрымаць гвалт як прымальны і прыдатны спосаб вырашыць канфлікт або прымусіць іншых зрабіць нешта. Аб кампаніі Савета Еўропы па спыненні цялесных пакаранняў можна прачытаць у матэрыяле «Адмова ад цялесных пакаранняў дзяцей, пытанні і адказы» на сайце www.coe.int.

Задзірам патрэбна дапамога. Ім неабходна зразумець прычыны, якія прывялі іх да цкавання іншых, даведацца, як змяніць свае паводзіны, і асабліва навучыцца кіраваць сваімі пачуццямі так, каб не параніць іншых, і быць настойлівым, каб дабівацца свайго. Удзельнічаючы ў мерапрыемствах, якія дадуць ім новыя захапленні, адцягнуць іх ад цкавання і раскрыюць іх здольнасці, яны пачнуць паважаць сябе і лічыць сябе добрымі людзьмі, якія не прычыняюць болю іншым.

Дадатковую інфармацыю можна знайсці на сайтах www.bullying.co.uk, www.bullying.org, www.bullyonline.org або па пошукавым запыце «цкаванне».

**Крыніцы**

www.bullying.co.uk
www.bullying.org
www.bullyonline.org
www.bullybusters.org.uk
www.kidshealth.org
www.teenhelp.org
www.breaktheabusecycle.com
www.bullying.com.

## Раздатачныя матэрыялы

**Сюжэты для ролевай гульні**

### Сюжэт 1

Вучань звяртаецца да адміністрацыі і спрабуе растлумачыць, што аднаго з яго аднакласнікаў пастаянна цкуюць. Дырэктар аўтарытарны і кансерватыўны. Ён лічыць, што стандарты падаюць і наогул моладзь пайшла нікуды не вартая. Класны кіраўнік не хоча браць на сябе адказнасць за тое, што адбываецца. Іншыя настаўнікі недаацэньваюць праблему і не распазнаюць здзеклівыя паводзіны. Работнік аддзела адукацыі мясцовага органа ўлады заклапочаны, але ў дадзены момант занадта завалены справамі, каб дапамагчы.

### Сюжэт 2

Група вучняў спрабуе пагаварыць з прыяцелем, які цкуе вучня малодшага класа.

### Сюжэт 3

Некалькі вучняў сабраліся, каб абмеркаваць, як дапамагчы прыяцелю, якога цкуе група старшакласнікаў. Яны хочуць дапамагчы свайму сябру і прадумаць розныя спосабы зрабіць гэта.

## Рэальныя гісторыі

**Гісторыя 1**

«Мне 12 гадоў, і я цярпець не магу хадзіць у школу, бо мяне там ніхто не любіць. Там ёсць група дзяцей, якія ўвесь час абзываюцца. Яны кажуць, што я тлустая і пачварная і што мае бацькі павінны саромецца мяне. Мая лепшая сяброўка больш са мной не размаўляе і нават пасябравала з некаторымі з тых, хто мяне крыўдзіць. Я яе ненавіджу. У мяне наогул нікога няма, і я баюся, што тое, што яны сказалі пра маіх бацькоў, – праўда».

Разана

**Гісторыя 2**

«У гэтым годзе я перайшла ў новы каледж і з першага дня заўважыла, што некаторыя дзяўчаты дзіўна на мяне глядзяць. Потым я зразумела, што яны зайздросцяць мне, таму што я падабаюся хлопцам. Цяпер у маёй шафцы з'яўляюцца запіскі з пагрозамі. Мне таксама тэлефануюць на хатні тэлефон з пагрозамі. Мае падручнікі некалькі разоў kралі. На мінулым тыдні я пайшла ў туалет, і за мной зайшлі тры дзяўчынкі; яны сталі на мяне крычаць, пагражаць мне нажом і сказалі, што мне трэба знайсці іншае месца для вучобы, назвалі мяне распусніцай. Я больш не магу трываць. Мне страшна, я злуюся. Я спрабавала пагаварыць пра гэта з дырэктарам, але яна мяне толкам і не выслухала. Не ведаю, што мне рабіць».

Лізбет

**Гісторыя 3**

«Мой лепшы сябар расказаў, што некаторыя вучні з нашай школы прыстаюць да яго. Я хацеў яму дапамагчы і пайшоў з імі пагаварыць, але пасля гэтага яны сталі рабіць тое ж самае і са мной. Цяпер нас абодвух цкуюць: смяюцца з нас, робяць розныя прыкрасці і пагражаюць пабіць. Мы вырашылі нікому нічога не казаць, бо баімся, што, калі раскажам, стане яшчэ горш».

Эндру

COMPASS

Гендар

Мір і гвалт

Здароўе

Узровень 3

6–30 чалавек (малыя групы па 2–6 чалавек)

120 хвілін

# Хатнія справы

*«Паліцыя заўсёды прыязджае занадта позна, калі наогул прыязджае».*

*Трэйсі Чапман*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • гендар,<br>• мір і гвалт,<br>• здароўе. |
| **Складанасць** | узровень 3 |
| **Памер групы** | 6–30 чалавек (малыя групы па 2–6 чалавек) |
| **Час** | 120 хвілін |
| **Агляд** | Удзельнікі абмяркоўваюць практычныя сітуацыі і аналізуюць прычыны ўзнікнення і спосабы прадухілення розных відаў хатняга гвалту. |
| **Звязаныя правы** | • права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць;<br>• свабода ад катаванняў і зневажальнага абыходжання;<br>• права на роўнасць перад законам. |
| **Мэты** | • паглыбіць веды пра розныя віды хатняга гвалту;<br>• развіць уменне абмяркоўваць і аналізаваць парушэнні правоў чалавека;<br>• выхаваць пачуцці суперажывання і ўпэўненасці ў сабе, якія дапамогуць выступіць супраць хатняга гвалту. |
| **Матэрыялы** | • вялікія аркушы паперы або дошка і маркеры для мазгавога штурму і працы ў групах;<br>• выберыце адну або некалькі прыведзеных ніжэй сітуацый або прыдумайце сваю. Зрабіце па адным экзэмпляры для кожнага ўдзельніка;<br>• копіі «Кіруючых указанняў па правядзенні групавых дыскусій» (па адной на малую групу). |
| **Падрыхтоўка** | • звяжыцеся з арганізацыямі па падтрымцы ахвяр хатняга гвалту ў вашай краіне або супольнасці;<br>• прадумайце пытанні хатняга гвалту, над якімі хочаце папрацаваць падчас практыкавання, і будзьце гатовы дапамагчы ўдзельнікам, калі тэма закране іх асабіста. |

## Інструкцыі

1. Пазнаёмце групу з тэмай практыкавання шляхам правядзення мазгавога штурму пра «самыя распаўсюджаныя формы гвалту ў акрузе». Запішыце ўсё, што прапануюць удзельнікі, але нічога на гэтым этапе не абмяркоўвайце. Размясціце дошку або фліпчарт так, каб усе маглі бачыць напісанае.
2. Папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на малыя групы па 2–6 чалавек. У вас павінна атрымацца не менш за тры групы.
3. Раздайце ім карткі з апісаннямі сітуацый. Раздайце таксама экзэмпляры «Кіруючых указанняў па правядзенні групавых дыскусій».
4. Дайце ўдзельнікам 5 хвілін, каб прачытаць апісанні сітуацый. Падкрэсліце, што абмеркаванне ў іх групе павінна грунтавацца на гэтых апісаннях. Удзельнікі павінны разумець, што абмеркаванне хатняга гвалту можа закрануць многіх асабіста, таму нікога нельга прымушаць расказваць больш, чым ён сам хоча.
5. Дайце групам 1 гадзіну на працу ў групах.
6. У канцы збярыце ўсіх на агульнае абмеркаванне і ацэнку.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з кароткага агляду таго, як прайшла праца ў групах. Ці маглі сітуацыі, апісаныя ў картках, мець месца ў вашым горадзе? Наколькі актуальны такія пытанні? Калі групы працавалі над рознымі сітуацыямі, няхай кожная з іх раскажа пра вынікі аналізу розных злачынстваў. Пасля гэтага пачніце размову пра актуальнасць разгледжаных пытанняў у жыцці ўдзельнікаў:

- Наколькі распаўсюджаны выпадкі хатняга гвалту ў вашым раёне і ў цэлым па краіне?
- Якія правы чалавека пры гэтым парушаюцца?
- Якія прычыны хатняга гвалту?
- Чаму мужчыны дазваляюць сабе такія паводзіны ў адносінах да жанчын часцей, чым наадварот?
- Як можна спыніць хатні гвалт? Што могуць (павінны) зрабіць:
  - дзяржаўныя органы?
  - мясцовыя ўлады?
  - удзельнікі сітуацыі?
  - сябры і суседзі?
- Абдумайце абмеркаваныя віды гвалту. Яшчэ раз зірніце на зыходны спіс, састаўлены ў выніку мазгавога штурму. Ці можна што-небудзь дадаць да гэтага спіса?

Спытайце, ці не хоча хто-небудзь працягнуць працу над закранутымі пытаннямі, і абмяркуйце, што можна было б зрабіць далей.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**25 лістапада**
Міжнародны дзень барацьбы за ліквідацыю гвалту ў адносінах да жанчын

## Парады для фасілітатараў

Ахвярай хатняга гвалту можа стаць кожны. Ён сустракаецца як у гетэрасексуальных парах, так і ў аднаполых саюзах і закранае людзей любога ўзросту, этнічнага паходжання і фінансавага становішча. Нягледзячы на тое што часцей ад жорсткага абыходжання пакутуюць жанчыны, мужчыны таксама падвяргаюцца нападкам, асабліва вербальным і эмацыянальным. Хатні гвалт, які таксама называюць сямейным, узнікае ў тым выпадку, калі адзін з удзельнікаў блізкіх адносін або шлюбу спрабуе падавіць партнёра і кіраваць ім. Жорсткае абыходжанне ў сямейна-бытавой сферы, якое ўключае ў сябе фізічны гвалт, называецца хатнім гвалтам.

Часцей за ўсё ад канфліктаў з прымяненнем гвалту пакутуюць жанчыны, і адбываюцца гэтыя канфлікты дома, адсюль і назва «Хатнія справы». Аднак часам (досыць рэдка) гвалт зыходзіць ад жанчыны, таму мы вырашылі прывесці тут гісторыю Ганса.

Памятайце пра далікатны характар тэмы, якая абмяркоўваецца, як і пра права на ананімнасць (прыватнасць) (многія ўдзельнікі маглі сутыкнуцца з хатнім гвалтам дома або ў сям'і). Дайце ўсім зразумець, што нікога не вымушаюць расказваць больш, чым ён захоча. Вы можаце змяніць некаторыя дэталі або зусім замяніць сітуацыі, каб адаптаваць занятак да патрэб удзельнікаў.

Удзельнікі мужчынскага полу могуць вельмі востра адрэагаваць на практыкаванне ці нейкія моманты ў абмеркаванні. Важна памятаць пра тое, што мэта занятку не заключаецца ў тым, каб прымусіць мужчын або юнакоў адчуць віну за тое, што робяць іншыя мужчыны; тым не менш некаторыя сцвярджаюць, што мужчыны з'яўляюцца элементам патрыярхальнай сістэмы прыгнёту і, такім чынам, іграюць у ёй сваю ролю. Такі пункт гледжання можа стаць асновай вельмі цікавых дыскусій. Таксама нялішне абмеркаваць непасрэдныя і ўскосныя наступствы гвалту супраць жанчын для мужчын.

Калі скончыць занятак хвілінай маўчання ў памяць ахвяр хатняга гвалту, гэта паслужыць магутным фіналам практыкавання і будзе спрыяць суперажыванню і салідарнасці.

## Варыянты

Адной групе можна даручыць разыграць нейкую сітуацыю, а астатнія будуць гледачамі. Фасілітатар будзе час ад часу спыняць дзеянне і прасіць гледачоў прапанаваць альтэрнатыўныя паводзіны, якія маглі б разрадзіць сітуацыю і прывесці да станоўчага выніку.

## Прапановы па далейшай працы

Група можа звязацца з мясцовым аддзяленнем паліцыі і спытаць у іх, як яны паступаюць, калі да іх тэлефануюць з просьбай аб дапамозе ў выпадку хатняга гвалту. Таксама можна звярнуцца ў бліжэйшую арганізацыю па аказанні дапамогі жанчынам і запрасіць яе прадстаўніка расказаць пра сітуацыю ў раёне з лічбамі і фактамі.

Яшчэ адна тэма, якая ў многіх краінах застаецца блізкай да табу, – гэта сексуальнасць, у прыватнасці, гомасексуальнасць. Калі група цікавіцца такімі тэмамі, вы можаце правесці практыкаванне «Пагаворым пра секс!» на старонцы 211.

## Ідэі для дзеяння

Звярніцеся ў мясцовы цэнтр, які працуе з жанчынамі-бежанцамі, у інфармацыйны цэнтр ці арганізацыю па абароне правоў жанчын і спытайце, якія ў іх патрэбы і як вы можаце дапамагчы.

## Дадатковая інфармацыя

Нягледзячы на тое што жанчыны таксама могуць учыняць гвалт і што гвалт у аднаполых саюзах таксама паступова пачынае прызнавацца, факты сведчаць пра тое, што ў пераважнай большасці выпадкаў ахвярамі з’яўляюцца менавіта жанчыны і дзяўчаты, якія пакутуюць ад рук мужчын. Таму Генеральная Асамблея ААН у 1993 годзе прыняла Дэкларацыю аб ліквідацыі гвалту ў адносінах да жанчын (CEDAW). Гэты дакумент вызначае гвалт у адносінах да жанчын як «любы акт гвалту па гендарнай прыкмеце, які прычыняе ці можа прычыніць фізічную, сексуальную або псіхалагічную шкоду або пакуты жанчынам, у тым ліку пагрозы такіх дзеянняў, прымус або наўмыснае пазбаўленне волі або ў грамадскім, або ў асабістым жыцці». Гэта ўключае сярод іншага «фізічны, сексуальны і псіхалагічны гвалт, які мае месца ў сям'і, у тым ліку нанясенне пабояў, сексуальны гвалт у адносінах да дзяўчынак у сям'і, гвалт, звязаны з пасагам, згвалтаванне жонкі мужам, пашкоджанне жаночых палавых органаў і іншыя традыцыйныя практыкі, якія наносяць шкоду жанчыне; пазашлюбны гвалт і гвалт, звязаны з эксплуатацыяй; фізічны, сексуальны і псіхалагічны гвалт, які мае месца ў грамадстве ў цэлым, у тым ліку згвалтаванне, сексуальны гвалт, сексуальныя дамаганні і запалохванні на працы, у навучальных установах і іншых месцах; гандаль жанчынамі і прымус да прастытуцыі; фізічны, сексуальны і псіхалагічны гвалт з боку або пры патуранні дзяржавы, дзе б ён ні адбываўся».

Дадатковую інфармацыю аб Дэкларацыі аб ліквідацыі гвалту ў адносінах да жанчын можна знайсці ў главе 5 «Гендарныя пытанні» на сайце www.coe.int/compass.

**Гвалт у адносінах да жанчын на працягу жыцця**

| **Фаза** | **Тып гвалту** |
|---|---|
| Да нараджэння | Выбарачныя аборты па прыкмеце полу; уздзеянні пабояў падчас цяжарнасці на развіццё дзіцяці |
| Маленства | Забойствы дзяўчынак; фізічны, сексуальны і псіхалагічны гвалт |
| Дзяцінства | Дзіцячыя шлюбы; жаночае абразанне; фізічны, сексуальны і псіхалагічны гвалт; дзіцячая прастытуцыя і парнаграфія |
| Падлеткавы ўзрост і сталыя гады | Гвалт падчас заляцання і спатканняў (напрыклад, абліванне кіслатой і згвалтаванне падчас спатканняў); вымушаны секс па эканамічных прычынах (напрыклад, калі дзяўчаты, якія атрымліваюць адукацыю, займаюцца сексам з дарослымі мужчынамі ў абмен на аплату вучобы); інцэст; сексуальны гвалт на працоўным месцы; згвалтаванне; сексуальныя дамаганні; вымушаная прастытуцыя і парнаграфія; гандаль жанчынамі; гвалт з боку партнёра; згвалтаванне ў шлюбе; гвалт і забойствы, звязаныя з пасагам; забойства партнёра; псіхалагічны гвалт; жорсткае абыходжанне з жанчынамі з інваліднасцю; вымушаная цяжарнасць |
| Пажылы ўзрост | Вымушанае «самагубства» ці забойства ўдоў па эканамічных прычынах; фізічны, сексуальны і псіхалагічны гвалт |

Крыніца: інфармацыйны зборнік «Гвалт у адносінах да жанчын», Сусветная арганізацыя аховы здароўя, 1997 г.

COMPASS

## Хатні гвалт

Парушэнні правоў жанчын адбываюцца не толькі падчас вайны. Часцей за ўсё яны здараюцца дома. «Менавіта «прыватны» характар гэтага гвалту заўсёды так ускладняў і да гэтага часу ўскладняе ўмяшанне і дапамогу».[1]

Даследаванні паслядоўна паказваюць, што ў жанчыны больш шанцаў быць збітай, згвалтаванай або забітай сваім цяперашнім або былым партнёрам, чым кім-небудзь іншым[2]. Хатні гвалт уздзейнічае не толькі на жанчыну, але і на дзяцей, асабліва гэта тычыцца дзяўчынак і дзяўчат.

## Выстаўка «Маўклівыя сведкі»

Гэта практыкаванне было навеяна выстаўкай, прысвечанай праблемам хатняга гвалту і забойстваў жанчын, якая была арганізавана жаночай праваабарончай арганізацыяй NANE (Будапешт, Венгрыя) у Еўрапейскім маладзёжным цэнтры ў Будапешце; на ёй былі прадстаўлены таксама гісторыі Эстэр і Каці. Мэта выставы заключалася ў тым, каб прыцягнуць увагу грамадскасці да маштабнасці і жорсткасці хатняга гвалту і забойстваў, расказаўшы гісторыі забітых жанчын – «маўклівых сведак».

Арганізацыя выстаўкі «Маўклівыя сведкі» можа стаць вельмі практычным і эфектыўным спосабам падняць пытанне хатняга гвалту ў вашай супольнасці, горадзе ці раёне. Існуе літаратура з рэкамендацыямі па арганізацыі выстаўкі і падрыхтоўцы сведак, у тым ліку кніга пад назвай «Вынікі», якая расказвае пра першыя гады кампаніі ў ЗША і змяшчае шмат гісторый, якія могуць быць выкарыстаны ў якасці прыкладаў. Адрас у Інтэрнэце: http://www.silentwitness.net. Там таксама можна знайсці вялікі спіс арганізацый, якія ўжо праводзілі падобныя выставы.

## Першы еўрапейскі закон аб гвалце па гендарнай прыкмеце

Арганічны закон аб інтэграваных мерах абароны ад гвалту па гендарнай прыкмеце. 22 снежня 2004 года ў Іспаніі быў прыняты закон, які прадугледжвае стварэнне спецыяльных судоў і інтэграваных рэабілітацыйных цэнтраў, паляпшэнне падтрымкі ахвяр і шэраг працэдур, накіраваных на абарону жанчын, якія знаходзяцца пад пагрозай.

## Спецыяльны дакладчык ААН па пытаннях гвалту ў адносінах да жанчын

У чэрвені 2009 года ААН заснавала пасаду спецыяльнага дакладчыка ААН па пытаннях гвалту ў адносінах да жанчын. У 2010 годзе першы працаўнік на гэтай пасадзе, Рашыда Манджу, прадставіла Савету па правах чалавека першы тэматычны даклад аб гвалце ў адносінах да жанчын, яго прычынах і наступствах. З тэкстам даклада можна азнаёміцца на сайце www2.ohchr.org.

### Дадатковыя матэрыялы ў Інтэрнэце

- www.wave-network.org. Еўрапейскі інфармацыйны цэнтр супраць гвалту мае базу даных па ўсіх еўрапейскіх арганізацыях, якія аказваюць дапамогу жанчынам.
- www.ewlcentreonviolence.org. Еўрапейскі жаночы лабісцкі цэнтр на вэб-сайце «Гвалт у адносінах да жанчын». Ён змяшчае шмат інфармацыі пра гвалт у адносінах да жанчын, уключаючы справаздачы па краінах.
- www.whiteribbon.ca. Кампанія «Белая стужка» – «найбуйнейшая кампанія мужчын, якія змагаюцца за спыненне гвалту мужчын у адносінах да жанчын».
- www.europrofem.org. EuroPRO-Fem, еўрапейская мужчынская сетка феміністычнага кірунку; уяўляе сабой сетку арганізацый і праектаў на чале з мужчынамі, якіх хвалююць пытанні мужчынскага дамінавання, гвалту і прыгнёту жанчын.
- www.hotpeachpages.net. Міжнародны даведнік Агенцтва па барацьбе з хатнім гвалтам змяшчае інфармацыю па ўсіх краінах свету.
- www.unifem.org. Сайт жаночага фонду ААН змяшчае шмат матэрыялаў аб гендарных праблемах і гвалце ў адносінах да жанчын.

**Заўвага**.

Гісторыі Каці і Эстэр былі расказаны ў кнізе Крысціны Марваі «Тэрор у сям'і: збіванне жонкі і закон», выдадзенай у Будапешце ў 1998 годзе.

## Раздатачныя матэрыялы

**Сітуацыя 1. Эстэр**

Ён пачаў лаяцца з жонкай, абвінавачваючы яе ў тым, што яна не памыла бялізну, не прыгатавала ежу і наогул нічога не зрабіла па гаспадарцы. Увесь гэты час ён яе збіваў, наносячы ўдары кулакамі па галаве і твары. Ён вырваў у яе пасмы валасоў і біў яе ботамі. Сарваўшы з жонкі вопратку, ён кінуў яе на ложак, маючы намер працягнуць збіванне.

Усё гэта адбывалася на вачах у іх 8-гадовай дачкі, якая маліла яго спыніцца. Ён спыніўся, скінуў Эстэр з ложка і заснуў.

Той ноччу Эстэр памерла.

**Сітуацыя 2. Каці**

Каці спрабавала парваць са сваім жаніхом, які стаў усё часцей падымаць на яе руку. Яна знайшла кватэру ў іншым горадзе, але ён працягваў тэлефанаваць і пагражаць ёй. Нервы Каці былі на мяжы.

Аднойчы яе жаніх падпільнаваў яе пасля працы, каб прымусіць вярнуцца да яго. Ён павёз яе ў бліжэйшы лес і там паспрабаваў задушыць яе світарам. На наступны дзень Каці сказала калегам на працы, што баіцца, што аднойчы ён яе сапраўды задушыць.

Праз 4 дні яе жаніх выпіў і зноў чакаў яе пасля працы. Калі яна выйшла, ён стаў яе збіваць. У той вечар ён вырашыў, што ім трэба наведаць сваякоў. Па дарозе ён некалькі разоў спыняў машыну. Каці, бачачы, у якім ён стане, пагадзілася заняцца з ім сексам, але ён быў занадта п'яны.

Каці сказала свайму жаніху, што ён яе больш не цікавіць. Гэта яго вельмі раззлавала. Ён схапіў доўгі скураны рэмень і задушыў яе.

Затым ён выцягнуў яе цела з машыны, кінуў яго ў канаву і закідаў галлём.

**Сітуацыя 3. Марыя**

Марыі было 70 гадоў. Яе муж памёр 10 гадоў таму назад, і яна жыла ў невялікім доме са сваім саракагадовым сынам Філіпам. Ён быў беспрацоўным і часам моцна напіваўся. Марыя ведала, што ён цягае грошы ў яе з кашалька, але, як правіла, маўчала, не жадаючы новых праблем. П'яны Філіп бываў вельмі агрэсіўным, і часам Марыі даводзілася замыкацца ў сваім пакоі, каб схавацца ад яго.

Аднойчы Філіп прыйшоў дадому вельмі п'яным і раззлаваўся з-за таго, што вячэра была не гатова. Марыя сказала, што нічога не прыгатавала, таму што стамілася і дрэнна сябе адчувае, а ён у адказ пачаў граміць мэблю ў пакоі. У Марыі не было сіл і часу, каб уцячы, і сын кінуў у яе стул. Марыя паспрабавала абараніцца, але ўпала і ўдарылася галавой. Прыбег сусед, але было занадта позна. Марыя памерла, не прыходзячы да прытомнасці, яшчэ да прыезду ў бальніцу.

**Сітуацыя 4. Леандра**

Леандра было 8 гадоў. Ён жыў у маленькай кватэрцы з трохгадовай сястрой, маці і яе сужыцелем Янам. Свайго бацькі Леандра не ведаў. Яму падабалася вучыцца, але яму не падабаўся Ян. Ян быў жорсткі і часам збіваў Леандра. Леандра баяўся Яна, дрэнна спаў і страціў апетыт. Настаўніца Леандра заўважыла гэта і выклікала яго бацькоў, таму што была ўпэўнена, што Леандра можа вучыцца значна лепш, ён быў няўважлівым і часам біўся з сябрамі. Маці сустрэлася з настаўніцай, але не стала расказваць пра сітуацыю дома. Вярнуўшыся дадому, яна перадала Яну словы настаўніцы. Ян раззлаваўся і зноў збіў Леандра, на гэты раз зламаўшы яму руку. У бальніцы маці схлусіла, сказаўшы, што Леандра ўпаў.

**Сітуацыя 5. Баназ**

Баназ некалькі разоў спрабавала паведаміць у паліцыю, што яе жыццё ў небяспецы. У снежні 2005 года бацька напаў на яе і паспрабаваў забіць. Дзяўчына вельмі спалохалася і звярнулася ў паліцыю. Аднак следчыя не паставіліся да яе слоў сур'ёзна.

Баназ збегла, але потым вярнулася дадому і паспрабавала таемна працягваць адносіны са сваім маладым чалавекам; бацька пагражаў забіць абодвух, калі яны не перастануць сустракацца. Баназ угаворвалі пераехаць у бяспечнае месца, але яна лічыла, што дома нічога не здарыцца, таму што там яе маці.

Баназ знікла 24 студзеня, а праз тры месяцы яе згніўшы труп знайшлі ў чамадане, закапаным у садзе. На судзе яе бацька і дзядзька прызналіся, што заказалі забойства, вырашыўшы, што яна зганьбіла сям'ю, закахаўшыся ў мужчыну, шлюбу з якім яе сваякі не ўхвалялі. Баназ было ўсяго 20 гадоў.

http://news.bbc.co.uk/2/hi/6722699.stm; 11 чэрвеня 2007 г.

**Сітуацыя 6. Аміра**

Аміры было чатыры гады, калі яе сям'я ўцякла з ахопленага вайной Самалі і пасялілася ў адным з еўрапейскіх гарадоў, дзе ёй жылося невымерна лепш.

Неяк раніцай, калі Аміры было ўжо адзінаццаць, маці прапанавала ёй наведаць цётку, каб дзяўчынка магла пагуляць з аднагодкай, сваёй стрыечнай сястрой. Аміра не падазравала, што маці і цётка ўпотай запрасілі з Магадыша жанчыну, каб зрабіць дочкам абразанне. Яны лічылі, што гэта неабходна, інакш дзяўчынкі ніколі не знойдуць сабе мужоў.

Нечакана маці і цётка схапілі Аміру. Яна расказвае: «Яны мяне трымалі, а жанчына, якую я ніколі раней не бачыла, пачала рэзаць. Я крычала, але цётка заціснула мне рот рукой. Абяцайце, што ніхто не даведаецца пра тое, што я з вамі гаварыла, – маліла Аміра. – Калі ў нашай супольнасці даведаюцца, то мяне назавуць здрадніцай, і мне давядзецца ўцякаць. І наогул, я не хачу, каб мае бацькі патрапілі ў турму».

Заснавана на матэрыялах http://www.dailymail.co.uk/femail/article-505796 ад 3 студзеня 2008 года і www.fgmnetwork.org.

**Сітуацыя 7. Дэніз**

«Я ахвяра інцэсту; бацька згвалтаваў мяне, калі мне было пятнаццаць. Гэта быў не першы раз і не апошні. Але тады я зацяжарыла.

Аднойчы ўвечары мне стала вельмі дрэнна, і бацькі завезлі мяне ў бальніцу. Урач хуткай дапамогі выявіў, што, акрамя цяжкай формы грыпу, у мяне цяжарнасць тэрмінам 19 тыдняў. Урач сказаў мне, што я цяжарная, і спытаў, чаго я хачу. Нягледзячы на боль і пачуццё віны, я адмовілася рабіць аборт. Мой бацька ўпаў у дзікую лютасць і запатрабаваў, каб я пагадзілася. Урач адмовіўся, прыслухаўшыся да майго рашэння.

Бацька запатрабаваў знайсці спецыяліста па абортах, і праз гадзіну гэты чалавек прыехаў у бальніцу. Я паспрабавала збегчы з назіральнага крэсла, але ён загадаў тром медсёстрам трымаць мяне, пакуль ён прывязваў мяне да ложка і калоў мышачны рэлаксант, каб я не супраціўлялася. Я працягвала крычаць, што не хачу аборту. Ён загадаў мне: «Заткніся і кінь гарлапаніць!» У рэшце рэшт, мне зрабілі агульны наркоз».

Заснавана на матэрыялах www.humanlife.org

**Сітуацыя 8. Ганс**

Антонія праследавала і абражала свайго мужа Ганса на працягу некалькіх гадоў. Аднойчы яна сказала, што ёй хочацца пераехаць яго машынай. У іншы раз яна ілжыва абвінаваціла яго ў разбэшчванні яе дзяцей. Пісьмы з абвінавачаннямі Ганса ў педафіліі з'явіліся ў суседскіх паштовых скрынях. У паліцыі гэтым абвінавачанням не паверылі, але западозрылі, што Антонія мае да іх нейкае дачыненне.

Тры гады назад яны разышліся, а год назад – развяліся.

Некалькі месяцаў назад Антонія пайшла за Гансам, які вяртаўся дадому з працы, і кінула ў яго падпаленае ўпрыгажэнне, напоўненае бензінам. Упрыгажэнне не загарэлася, але пазней следчыя знайшлі бензін на дзвярах і сценах.

Аднойчы днём, калі Ганс гуляў з сабакам, да яго падбегла нейкая жанчына. Пачуўся гучны гук. Ён закрычаў, кінуўся да дома і схаваўся там, жанчына рушыла ўслед за ім. Паліцыя і ўрачы знайшлі яго пры смерці на падлозе ў сталовай. Выратаваць Ганса не змаглі: куля ўвайшла яму ў правае плячо і, разарваўшы лёгкія, засела ў аорце.

Заснавана на матэрыялах http://www.seattlepi.com

**Кіруючыя ўказанні па правядзенні групавых дыскусій**

I. Аналіз злачынства (20 хвілін)
1. Што вы можаце сказаць пра гэта злачынства, зыходзячы з прадстаўленай інфармацыі?
2. Дзе магло адбыцца такое злачынства? Ці магло яно здарыцца ў вас па суседстве?
3. Чаму адбылося гэта злачынства?
4. Ці можна знайсці якое-небудзь апраўданне такому злачынству?
5. Як ахвяра магла б абараніць сябе?

II. Пераход да сацыяльнай рэчаіснасці (40 хвілін)
6. Ці ведаеце вы пра выпадкі хатняга гвалту або ці чулі пра іх у апошні час?
7. Якія формы прымае хатні гвалт у нашым грамадстве?
8. Што могуць зрабіць ахвяры, калі ім неабходна дапамога?
9. Ці варта паліцыі ўмешвацца пры паведамленні пра гвалт, або такое ўмяшанне можа разглядацца як парушэнне прыватнасці жыцця і, такім чынам, правоў чалавека?
10. Што ў падобных сітуацыях могуць зрабіць ахвяры? Што можа зрабіць парушальнік?
11. Ці вядомы вам выпадкі хатняга гвалту ў дачыненні да мужчын?
12. Пералічыце магчымыя прычыны хатняга гвалту.
13. Як можна прадухіліць і спыніць хатні гвалт?
14. Што могуць (павінны) зрабіць:
    a. дзяржаўныя органы?
    b. супольнасць?
    c. удзельнікі сітуацыі?
    d. сябры і суседзі?

# Доста!

*«Гісторыя вучыць толькі таму, што яна нас ніколі нічому не навучыла».*

*Гегель*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • гістарычная памяць,<br>• вайна і тэрарызм,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць. |
| **Складанасць** | узровень 4 |
| **Памер групы** | любы (малыя групы па 2–3 чалавекі) |
| **Час** | 1 дзень |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі распрацоўваюць і ажыццяўляюць праект дзеянняў у мэтах садзейнічання дасведчанасці пра ахвяр халакосту і пра генацыд цыганоў-рама. |
| **Звязаныя правы** | • права на абарону ад дыскрымінацыі;<br>• права на жыццё;<br>• культурныя правы. |
| **Мэты** | • даведацца больш аб усіх ахвярах нацысцкага халакосту, у прыватнасці, цыганоў-рама;<br>• папрактыкавацца ў выбары, планаванні і правядзенні публічнай акцыі;<br>• развіць пачуццё чалавечай годнасці і пачуццё справядлівасці. |
| **Матэрыялы** | • папера для фліпчарта і маркеры;<br>• копіі раздатачнага матэрыялу «Кароткая гісторыя праследавання Х» (па жаданні);<br>• для часткі 2 («Выбар і складанне праекта дзеянняў») будзе карысна мець выхад у Інтэрнэт або раздрукаваныя даведачныя матэрыялы;<br>• копіі блок-схемы праекта дзеянняў, прыведзенай у раздзеле 3 на старонцы 374 (па жаданні). |
| **Падрыхтоўка** | • перад пачаткам занятку раскажыце групе, што вы плануеце абмеркаваць халакост, і пагаварыце асобна з тымі, для каго гэта тэма можа аказацца цяжкай.<br>• зрабіце копіі раздатачнага матэрыялу, па адной на кожную малую групу;<br>• азнаёмцеся з главой 3 «Компаса» пад назвай «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека». |

COMPASS

**Гістарычная памяць**

**Вайна і тэрарызм**

**Дыскрымінацыя і нецярпімасць**

**Узровень 4**

**Любы памер групы (малыя групы па 2–3 чалавекі)**

**60 хвілін**

## Інструкцыі

**Частка 1. Падрыхтоўка групы** (90 хвілін)

1. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на невялікія групы па 2–3 чалавекі, аб'яднаныя агульным пачуццём ідэнтычнасці. Яно можа быць звязана з іх этнічнай ці нацыянальнай прыналежнасцю, але ў іх таксама могуць быць нейкія агульныя сацыяльныя ці рэлігійныя прыкметы. Дайце ім некалькі хвілін, каб абмеркаваць гэта пачуццё ідэнтычнасці ў межах малой групы.
2. Раздайце ўдзельнікам раздатачны матэрыял «Кароткая гісторыя праследавання Х» або выберыце такую інфармацыю, якая магла б абудзіць у іх пэўнае пачуццё наконт сістэматычнага жорсткага абыходжання, якое выпала на долю Х, не называючы ім, аднак, імя гэтай групы (цыганы-рама).
3. Коратка абмяркуйце іх рэакцыі, а затым дайце малым групам 15 хвілін, каб адказаць на наступныя пытанні:
   - Як бы вы сябе адчувалі, калі б «вашы» людзі падвергліся такому абыходжанню ў нейкі момант найноўшай гісторыі? (Папрасіце ўдзельнікаў сканцэнтравацца на групе, абранай імі ў пункце 1).

- Што было б найбольш складана для супольнасці, якая перажыла такое выпрабаванне, і што было б карысна ці неабходна, напрыклад акцыя падтрымкі з боку членаў іншых супольнасцей на мясцовым, нацыянальным або міжнародным узроўні?

4. Цяпер папрасіце малыя групы разбіцца па парах і падзяліцца сваімі адказамі. Дайце гэтым групам яшчэ 15 хвілін і папрасіце саставіць спіс канкрэтных прапаноў, якія маглі б дапамагчы членам супольнасці, якія перажылі такое абыходжанне.
5. Збярыце ўсю групу разам і перанясіце ўсе прапановы на фліпчарт. Растлумачце, што 2-я частка практыкавання будзе прысвечана выбару адной з прапаноў, над якой і будзе працаваць група. Аднак перш чым ісці далей, спытайце:
   - Ці можаце вы адгадаць, пра якіх людзей ішла гаворка ў раздатачных матэрыялах?
   - Якія яшчэ групы насельніцтва нацысты імкнуліся знішчыць?
   - Што здарылася з гэтымі групамі насельніцтва ў вашай краіне падчас Другой сусветнай вайны?
6. Спытайце ўдзельнікаў, што яны ведаюць пра становішча цыганоў-рама сёння. Якія правы чалавека парушаюцца ў дачыненні да іх?
7. Раскажыце групе пра кампанію «Доста!» і дадайце, што яны маглі б рэалізаваць праект дзеянняў у падтрымку гэтай кампаніі.

**Частка 2. Выбар і распрацоўка праекта дзеянняў**

Гэта частка практыкавання заснавана на главе 3 «Компаса» пад назвай «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека», да якой вы можаце звярнуцца за больш падрабязнай інфармацыяй.

8. Растлумачце, што праект дзеянняў, які яны арганізуюць, не можа ставіць мэтай вырашыць усе праблемы, выяўленыя ў ходзе працы над папярэдняй часткай, але што ён павінен імкнуцца да дасягнення канкрэтных і вымерных вынікаў, якія могуць прынесці пэўную карысць супольнасці цыганоў-рама.
9. Папрасіце ўдзельнікаў выбраць на фліпчарце любыя прапановы, якія, на іх думку, з'яўляюцца дасягальнымі для групы. Пры гэтым яны могуць выключыць некаторыя прапановы або дадаць новыя.
10. Абмяркуйце прапановы і прыйдзіце да кансэнсусу наконт выбару дзеяння для ўсёй групы. Выкарыстайце блок-схему праекта дзеянняў з главы 3. Пераканайцеся, што:
    - дзеянне, якое яны выбралі, будзе садзейнічаць вырашэнню праблемы;
    - дзеянне цалкам рэальна, улічвае рэсурсы групы і перашкоды, з якімі яна можа сутыкнуцца;
    - «рашэнне праблемы» з'яўляецца досыць канкрэтным, таму ўдзельнікі будуць ведаць, ці дасягнулі яны мэты.
11. Складзіце «Схему рашэнняў», каб кожны ведаў, што і калі ён павінен рабіць.
12. Прыступайце да працы!

**Частка 3. Ажыццяўленне праекта дзеянняў.**

## Аналіз і ацэнка

Пытанні аб дзеяннях:

- Ці задаволены вы дзеяннямі ў цэлым? Чаму? Чаму не?
- Што вы думаеце пра ваш асабісты ўклад і пра працу групы ў цэлым?
- Як вы думаеце, якія вынікі дзеянняў былі самымі важнымі? Ці адпавядаюць яны мэтам, якія вы ставілі ў самым пачатку?
- Як вы лічыце, ці можна было нешта зрабіць па-іншаму, каб дзеянне было больш эфектыўным? Растлумачце сваё меркаванне.
- Ці былі ў вас нейкія памылкі?
- Што б вы аднеслі да асноўных «урокаў», калі б вам прыйшлося арганізаваць яшчэ адно дзеянне (на любую тэму)?

Пытанні аб навучальным працэсе:

1. Якія вынікі сталі найбольш важнымі асабіста для вас? Ці адчуваеце вы, што ваша меркаванне або стаўленне да пытання неяк змянілася? Растлумачце сваё меркаванне.
2. Што вы лічыце найбольш цяжкім ва ўсім практыкаванні, уключаючы і самі дзеянні?
3. Што вам прынесла найбольшае задавальненне?
4. Як вы думаеце, што яшчэ можна зрабіць, каб развіць ваш праект? Ці ёсць у вас жаданне зрабіць гэта?
5. Што вы даведаліся аб правах чалавека ў ходзе выканання гэтага практыкавання?
6. Ці цяжка ўдзельнічаць у кампаніі па абароне правоў чалавека? Ці плануеце вы ўдзельнічаць у кампаніі па абароне правоў чалавека пасля гэтага практыкавання?
7. Ці з'яўляюцца правы, якіх патрабуюць для сябе цыганы-рама, «выключнымі» або прыдатнымі для іншых груп насельніцтва, якія маргіналізаваны або праследуюцца? Растлумачце сваё меркаванне.
8. Чаму праца, звязаная з гістарычнай памяццю, важна для навучання ў галіне правоў чалавека?
9. Як у вашай краіне арганізавана адукацыя па тэме халакосту?

## Парады для фасілітатараў

Выдзеліце 90 хвілін на частку 1 («Падрыхтоўка групы»), 90 хвілін на частку 2 («Выбар і распрацоўка праекта дзеянняў») і 60 хвілін на частку 4 («Аналіз і ацэнка»). Як доўга будзе працягвацца частка 3 («Ажыццяўленне праекта дзеянняў»), будзе залежаць ад саміх дзеянняў! Уся праца можа ажыццяўляцца паслядоўна на працягу аднаго дня або ў розныя дні.

Ёсць цэлы шэраг прычын, па якіх гэта практыкаванне з'яўляецца складаным не толькі з пункту гледжання арганізацыі, але і з пункту гледжання зместу.

Вы павінны загадзя ведаць склад вашай групы і магчымыя рэакцыі ўдзельнікаў на практыкаванне. Калі хто-небудзь з членаў групы мае сваякоў, якія сталі ахвярамі халакосту або іншых аналагічных падзей, вы маглі б абмеркаваць з імі характар практыкавання загадзя, так каб яны мелі магчымасць падрыхтавацца або адмовіцца ад удзелу, калі не адчуваюць сябе дастаткова падрыхтаванымі.

Да кожнага этапа практыкавання трэба падысці далікатна, быць гібкім і, безумоўна, не абвяшчаць дыскусію адразу, калі адчуваеце, што людзям трэба больш часу, каб выказаць свае пачуцці. Калі група ўпершыню сутыкаецца з такімі пытаннямі, магчыма, будзе больш эфектыўна выдзеліць на частку 1 («Падрыхтоўка групы») цэлы занятак працягласцю 90–120 хвілін, а затым зрабіць перапынак і перайсці да частак 2–4.

Што тычыцца пункта 1.1, мы б параілі вам падумаць загадзя пра тое, што тут могуць узнікнуць цяжкасці. У такім выпадку складзіце спіс катэгорый і папрасіце ўдзельнікаў ідэнтыфікаваць сябе з адной з іх, напрыклад, у якасці балельшчыка нейкай футбольнай каманды, чалавека, які размаўляе па-французску, тых, хто вывучае іспанскую мову, чалавека, які захапляецца хіп-хопам, гуляе ў тэніс ці займаецца плаваннем. Вы таксама можаце папрасіць удзельнікаў проста разбіцца па парах па палавой прыкмеце.

Калі магчыма, паспрабуйце правесці работу па пунктах 1.2 і 1.3 без абмеркавання пытання, хто ўваходзіць у групу X. Ваша задача – дабіцца, каб удзельнікі былі абураны несправядлівасцю, і ступень іх абурэння не будзе высокай, калі яны будуць ведаць, што група X – гэта цыганы-рама. Гэта адбываецца таму, што забабоны наконт цыганоў-рама настолькі моцныя, што некаторыя ўдзельнікі могуць падсвядома (ці свядома) апраўдваць тое, як з імі абыходзяцца.

У «Кароткай храналогіі халакосту цыганоў-рама» (гл. ніжэй) усе спасылкі на «рама» або «цыганоў» былі заменены на «X». Пры выкарыстанні гэтай інфармацыі вы можаце звярнуцца да абранай «групы» ці нават папрасіць удзельнікаў уявіць сабе, што гэта іх група.

Вы просіце ўдзельнікаў суаднесці сябе з важнай для іх групай толькі для таго, каб яны маглі «адчуць», што такое быць аб'ектам таго ці іншага абыходжання. Тым не менш удзельнікам усё яшчэ можа быць складана суадносіць сябе з цыганамі-рама і іх праблемамі з-за моцных забабонаў наконт гэтай групы насельніцтва. Як бы там ні было, вы павінны вырашыць гэту праблему, і таму выдзеліце дастаткова часу на працу па пункце 1.3, каб удзельнікі паспелі абмеркаваць усе праблемы. Скажыце ім, што, паводле ацэнак, ад 75 да 80 % ад колькасці цыганоў-рама ў Еўропе было забіта падчас халакосту, а ў некаторых краінах гэты паказчык дасягаў 90 %. Вы можаце папрасіць удзельнікаў уявіць сабе, што было б, калі б яны страцілі 90 % свайго насельніцтва або 90 % членаў гэтай канкрэтнай групы: у групе з 20 чалавек засталося б толькі 2 чалавекі.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**8 красавіка**
Міжнародны дзень цыганоў-рама

**2 жніўня**
Дзень памяці ахвяр генацыду – цыганоў-рама і сінці

Настойліва рэкамендуецца, калі гэта ўвогуле магчыма, на стадыі планавання і да рэалізацыі запланаванага дзеяння паспрабаваць звязацца з членамі супольнасці цыганоў-рама. Як мінімум вам трэба спытаць у іх, ці будзе добра ўспрынята акцыя, якую плануе ваша група. У якасці альтэрнатывы звяжыцеся з мясцовай групай, якая працуе з цыганамі-рама або падтрымлівае іх.

Калі вам не хапае часу або калі ўдзельнікам цяжка даецца працэс планавання, вы можаце выкарыстаць блок-схему з главы 3 у якасці прыкладу.

## Варыянты

Першая відавочная альтэрнатыва – замяніць групу цыганоў-рама на іншую групу людзей, якія сталі ахвярамі халакосту. У гэтым плане неацэнную паслугу вам зробіць сайт дабрачыннага фонду «Дзень памяці ахвяр халакосту» (www.hmd.org.uk). Ён змяшчае інфармацыю, у тым ліку матэрыялы для школ, аб усіх групах, якія падвяргаліся ганенням з боку нацыстаў, уключаючы яўрэяў, гомасексуалістаў, людзей з інваліднасцю, прадстаўнікоў супольнасцей цыганоў-рама і сінці, еўрапейцаў негроіднай і змяшанай рас, Сведак Іеговы, палякаў і прадстаўнікоў іншых славянскіх народаў, якія не з’яўляліся яўрэямі, камуністаў, сацыялістаў і прафсаюзных дзеячаў. На сайце таксама ёсць інфармацыя пра апошнія выпадкі генацыду ў Камбоджы, Босніі і Герцагавіне, Руандзе і Судане.

Яшчэ адной альтэрнатывай можа стаць разгляд становішча народа, групы або супольнасці, лёс якіх сістэматычна ігнаруецца.

## Прапановы па далейшай працы

Калі ўдзельнікі захочуць больш уважліва паглядзець на сваё асяроддзе вачыма чалавека, які знаходзіцца ў абяздоленым становішчы або жыве на задворках грамадства, можна правесці практыкаванне «Змяні свае акуляры» на старонцы 126.

Акрамя таго, калі ўдзельнікам падабаюцца ролевыя гульні, і яны праяўляюць цікавасць да вывучэння прычын, якія прымушаюць людзей прымаць удзел у гвалтоўных актах, мае сэнс звярнуцца да практыкавання «Кіданне камянёў» на старонцы 299.

## Дадатковая інфармацыя

«Доста» – слова цыганскага паходжання, якое азначае «хопіць, дастаткова», – гэта назва інфармацыйна-прапагандысцкай кампаніі, накіраванай на тое, каб бліжэй пазнаёміць звычайных грамадзян з цыганамі-рама. Інфармацыю пра кампанію «Доста!» можна знайсці на сайце http://dosta.org. Калі ў вас ёсць доступ да Інтэрнэту, то вашым вучням будзе карысна зайсці на гэты сайт. Ёсць і іншыя сайты, якія змяшчаюць інфармацыю пра халакост і могуць быць выкарыстаны для вывучэння гэтай тэмы: http://isurvived.org; http://www.preventgenocide.org.

Да арганізацый, якія займаюцца адукацыяй па тэме халакосту, адносіцца фонд «Памяць, адказнасць і будучыня» (нямецкая абрэвіятура EVZ), вэб-сайт www.stiftung-evz.de. У задачы і сферу дзейнасці гэтага фонду ўваходзяць крытычны разгляд гісторыі, праца ў галіне правоў чалавека, прыхільнасць ахвярам нацыянал-сацыялізму. На вэб-сайце гэтага фонду вы можаце азнаёміцца з публікацыяй «Правы чалавека і гісторыя, праблемы ў сферы адукацыі».

Яшчэ адна арганізацыя, якая займаецца пытаннямі халакосту, – фонд Ганны Франк (www.annefrank.ch). Фонд Ганны Франк ставіць сваёй задачай садзейнічаць дабрачыннай дзейнасці, іграць сацыяльную і культурную ролю ў духу Ганны Франк у мэтах далейшага паляпшэння ўзаемаразумення паміж рознымі рэлігіямі, служыць справе міру паміж народамі, а таксама заахвочваць міжнародныя кантакты паміж маладымі людзьмі. Фонд рэалізуе праекты па ўсім свеце, напрыклад, працуе з супольнасцю далітаў у Індыі, з дзецьмі і сем'ямі ў гарадскіх трушчобах і ў сельскіх раёнах Перу.

**Інфармацыйнае бюро еўрапейскіх цыганоў-рама** рэгулярна рыхтуе інфармацыю па пытаннях, якія маюць дачыненне да цыганоў-рама ў Еўропе. (http://www.erionet.org).

**Еўрапейскі цэнтр па правах цыганоў-рама** з'яўляецца грамадскай юрыдычнай арганізацыяй, якая змагаецца з расізмам і парушэннямі правоў у адносінах да цыганоў-рама. (http://www.errc.org).

**Раздатачны матэрыял**

**Вельмі кароткая гісторыя праследавання Х**

| | |
|---|---|
| 1890 год | У Германіі праводзіцца канферэнцыя па пытаннях «адкідаў грамадства Х». Ваенныя атрымліваюць права рэгуляваць перамяшчэнне Х. |
| 1909 год | Праводзіцца палітычная канферэнцыя на тэму «Пытанне Х». Рэкамендавана, каб усе Х мелі асаблівы знак для іх лёгкай ідэнтыфікацыі. |
| 1920 год | Двое вучоных уводзіць паняцце «жыццё, не вартае жыцця», прапаноўваючы, каб усе Х былі стэрылізаваны і ліквідаваны як народ. |
| 1922 год | (І да канца 1920-х гадоў): усе Х на нямецкіх тэрыторыях сфатаграфаваны і ў іх узяты адбіткі пальцаў. |
| 1926 год | У Германіі прыняты закон для кантролю «Х-чумы». (Гэта мера з'яўляецца прамым парушэннем умоў Веймарскай канстытуцыі.) |
| 1927 год | У Баварыі (Германія) будуюцца спецыяльныя лагеры для ўтрымання Х. Восем тысяч Х адпраўляюць у гэтыя лагеры. |
| 1928 год | Усе Х знаходзяцца пад пастаянным наглядам паліцыі. Пабудаваны новыя лагеры для ўтрымання Х. |
| 1934 год | Праводзіцца стэрылізацыя Х шляхам ін'екцый і кастрацыі, іх адпраўляюць у лагеры ў Дахау, Дзізельштрасэ, Заксенхаўзен і іншыя месцы. У гэтым годзе прымаюцца два законы, якія забараняюць немцам уступаць у шлюб з прадстаўнікамі іншых рас. |
| 1938 год | Паміж 12 і 18 чэрвеня сотні Х па ўсёй Германіі і Аўстрыі былі арыштаваны, збіты і зняволены. Х з'яўляецца першай групай насельніцтва, якой забаронена наведваць школы. |
| 1939 год | Упраўленне па пытаннях расавай гігіены заяўляе: «Усіх Х варта разглядаць як спадчынна хворых, і адзіным рашэннем з'яўляецца іх ліквідацыя (гэта значыць, што мэта складаецца ў тым, каб без усялякіх ваганняў ліквідаваць гэты дэфектны элемент насельніцтва)». |
| 1940 год | Першая акцыя масавага генацыду ў гісторыі халакосту: у канцэнтрацыйным лагеры Бухенвальд 250 дзяцей Х выкарыстоўваюцца ў якасці паддоследных трусоў для тэсціравання цыяністага газу. У тым жа годзе Х забаронена праца любога роду. |
| 1941 год | У ліпені пачынаецца аперацыя «Забіць усіх яўрэяў, Х і псіхічна хворых» у якасці канчатковага нацысцкага рашэння. Пачынаецца халакост. 800 Х забіты за адну ноч 24 снежня ў Крыме. |
| 1944 год | 1 жніўня 4000 Х былі атручаны газам і спалены ў лагеры Аўшвіц-Біркенау падчас адной масавай акцыі. |
| 1945 год | Да канца вайны 70–80 % Х былі знішчаны нацыстамі. Ні адзін Х не быў выкліканы для дачы паказанняў на Нюрнбергскім працэсе, ніхто не сведчыў ад іх імя. Х як народу не былі выплачаны рэпарацыі за ваенныя злачынствы. |
| 1950 год | Першая з многіх заяў урада Германіі ў гэтым і наступных гадах аб тым, што ён не вінен Х ніякіх рэпарацый за ваенныя злачынствы. |
| 1992 год | Германія «прадае» Румыніі Х, якія шукалі прытулак, за 21 млн долараў і 1 лістапада пачынае адпраўляць іх у наручніках. Некаторыя з Х пакончылі з сабою, каб не ехаць. Нямецкае інфармацыйнае агенцтва Deutsche Presse-Agentur просіць заходніх журналістаў не ўжываць слова «дэпартацыя», таму што гэта слова выклікае «няёмкія гістарычныя асацыяцыі». |
| 2010 год | Французскі прэзідэнт звязвае Х са злачыннасцю, называючы іх лагеры крыніцай прастытуцыі і дзіцячай эксплуатацыі. Французскія ўлады дэманціруюць больш за 100 лагераў і дэпартуюць больш за 1000 Х, у асноўным у Румынію. |

Скарочаная версія «Кароткай храналогіі халакосту цыганоў-рама» Яна Хэнкока
Поўная версія даступна на сайце http://www.osi.hu/rpp/holocaust.html

COMPASS

Агульныя правы чалавека

Узровень 1

8 і больш (малыя групы па 4–5 чалавек)

45 хвілін

# Гульня «Намалюй слова»

*Немастакі таксама маюць правы!*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • агульныя правы чалавека. |
| **Складанасць** | узровень 1 |
| **Памер групы** | 8 і больш чалавек (малыя групы па 4–5 чалавек) |
| **Час** | 45 хвілін |
| **Агляд** | • Гэта камандная гульня, удзельнікі якой павінны праявіць свае творчыя здольнасці і намаляваць слова, якое адносіцца да правоў чалавека. |
| **Звязаныя правы** | • свабода перакананняў і выказвання меркавання;<br>• свабода думкі;<br>• роўнасць чалавечай годнасці і правоў. |
| **Мэты** | • паглыбіць веды аб УДПЧ;<br>• развіць навыкі зносін і творчага мыслення;<br>• заахвоціць салідарнасць і павагу да разнастайнасці. |
| **Матэрыялы** | • насценная табліца, у якой пералічаны артыкулы УДПЧ;<br>• вялікі аркуш паперы або папера для фліпчарта і маркер для запісу вынікаў;<br>• аркушы паперы (фармату А4) і алоўкі для малявання ў групах; на кожны раўнд гульні па адным аркушы паперы на каманду;<br>• клейкая стужка ці кнопкі для развешвання малюнкаў. |
| **Падрыхтоўка** | • знайдзіце на старонцы 600 скарочаны тэкст УДПЧ і перапішыце яго на вялікі ліст паперы;<br>• зрабіце ўласны спіс правоў. |

## Інструкцыі

1. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на малыя групы па чатыры-пяць чалавек і прыдумаць назву для сваёй групы (каманды).
2. Растлумачце, што падчас выканання практыкавання групы будуць спаборнічаць паміж сабой. Адзін з членаў кожнай каманды атрымае адзін артыкул УДПЧ і адлюструе яго на малюнку. Астатнія члены каманды павінны будуць здагадацца, аб якім праве ідзе гаворка. Каманда, якая першай дасць правільны адказ, заробіць адзін бал. Пераможа каманда, якая набярэ найбольшую колькасць балаў.
3. Папрасіце каманды ўзяць некалькі аркушаў паперы і алоўкі і сесці дзе-небудзь у пакоі. Каманды павінны сесці так, каб не мець магчымасці падслухаць іншыя каманды.
4. Выклікайце аднаго ўдзельніка з кожнай каманды. Дайце яму адно права з вашага спіса, напрыклад «свабода ад катаванняў».
5. Папрасіце выкліканых удзельнікаў вярнуцца да сваіх груп і намаляваць малюнак, які паказвае гэта права, а астатнія члены каманды павінны паспрабаваць яго адгадаць. Дазваляецца толькі маляваць, лічбы ці словы пісаць нельга. Размаўляць мастаку таксама не дазваляецца, можна толькі пацвярджаць правільнасць адказу.
6. Астатнім членам каманды дазваляецца выказваць свае здагадкі, але задаваць пытанні яны не могуць.
7. Пасля кожнага раўнда папрасіце ўсіх мастакоў напісаць назву права, намаляванага на малюнку, незалежна ад таго, завяршылі яны яго ці не, і адкласці паперу ў бок.
8. Правядзіце другі раўнд з іншымі ўдзельнікамі ў ролі мастакоў і іншымі правамі. Паўтарыце 7–8 разоў. У кожным раўндзе маляваць павінны новыя ўдзельнікі. Паспрабуйце арганізаваць гульню так, каб кожны ўдзельнік атрымаў магчымасць памаляваць хаця б адзін раз.
9. У канцы гульні папрасіце каманды развесіць малюнкі, каб можна было параўнаць і абмеркаваць розныя трактоўкі і адлюстраванне розных правоў.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з агляду самога практыкавання, затым пераходзьце да абмеркавання таго, што ўдзельнікі ведаюць аб правах чалавека. Папрасіце ўдзельнікаў адказаць на наступныя пытанні:

- Адлюстроўваць правы чалавека аказалася лягчэй або цяжэй, чым яны чакалі?
- Як удзельнікі прымалі рашэнне аб тым, як адлюстраваць тое ці іншае права? Адкуль яны бралі вобразы?
- Калі ўдзельнікі малявалі парушэнні, каб праілюстраваць правы, ці могуць такія парушэнні здарыцца ў іх краіне?
- Параўнайце розныя адлюстраванні аднаго і таго ж права. Колькі розных прыёмаў было ўжыта, каб намаляваць і растлумачыць адну і тую ж канцэпцыю?
- Пасля абмеркавання ўсіх малюнкаў спытайце ўдзельнікаў, ці шмат новага яны даведаліся аб правах чалавека (або новага не было наогул).
- Ці лічаць яны, што правы чалавека маюць нейкае дачыненне да іх жыцця? Якія канкрэтна?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**10 снежня**
Дзень правоў чалавека

## Парады для фасілітатараў

Перш чым прыступіць да гэтага практыкавання, вы павінны прачытаць УДПЧ (гл. старонку 601) і ведаць, што маецца на ўвазе пад правамі чалавека; напрыклад, што яны гарантаваны на міжнародным узроўні, абаронены законам і арыентаваны на годнасць чалавека, абараняюць як асобу, так і цэлыя групы людзей, іх нельга ні ў каго адняць, яны роўныя, узаемазалежныя і ўсеагульныя.

Вам трэба будзе вырашыць, як карыстацца насценнай табліцай. Калі ўдзельнікі дрэнна ведаюць УДПЧ, варта перад выкананнем практыкавання паказаць ім табліцу, каб яны атрымалі некаторае ўяўленне пра тое, што менавіта трэба адгадаць. Калі ўдзельнікі валодаюць больш глыбокімі ведамі, вы можаце скарыстацца табліцай у канцы практыкавання, каб завязаць дыскусію аб правах, якія не былі намаляваны.

Вы павінны разумець, што ўдзельнікам, якія лічаць сябе дрэннымі мастакамі, гэта задача можа паказацца занадта складанай. Растлумачце ім, што вы не патрабуеце ад іх ствараць шэдэўр, і прапануйце кожнаму паспрабаваць. Можа быць, яны самі здзівяцца, убачыўшы, якія здольнасці ў іх маюцца.

Каб выбраць правы для малявання, скарыстайце скарочаную версію УДПЧ, прыведзеную на старонцы 600. Можна прапанаваць наступныя правы: права на жыццё, свабода ад катаванняў, права на справядлівы судовы разбор, свабода ад дыскрымінацыі, права на неўмяшанне ў прыватнае жыццё, права на адукацыю, свабода ад рабства, свабода аб'яднанняў, свабода выказвання меркавання, права на грамадзянства, свабода думкі і рэлігіі, права выбіраць, права на працу, права на здароўе, права ўласнасці, права на заключэнне шлюбу і стварэнне сям'і і права выбару мужа (жонкі).

## Варыянты

Калі ў групе менш за 8 чалавек, гульню можна правесці адной групай. У першым раўндзе папрасіце маляваць аднаго з удзельнікаў, а той, хто адгадае, будзе маляваць наступным, і гэтак далей.

Замест малявання можна папрасіць удзельнікаў паказаць выбраныя правы пантамімай.

## Прапановы па далейшай працы

У практыкаванні «Улада кветак» на старонцы 177 таксама выкарыстоўваецца маляванне: удзельнікі шукаюць адказ на пытанне, дзе бярэ пачатак канцэпцыя правоў.

Калі групе падабаюцца творчыя заданні, можна прапанаваць практыкаванне «Сыграем гэта!» на старонцы 94, падчас якога ўдзельнікам прапануецца паказаць пантаміму, каб перадаць агульную канцэпцыю правоў чалавека.

Магчыма, удзельнікам будзе цікава працягнуць вывучэнне правоў, якія адносяцца да пэўнай групы, напрыклад правы людзей з інваліднасцю, у чым ім дапаможа практыкаванне «Убачыць свае магчымасці» на старонцы 267.

COMPASS

Адукацыя

Дзеці

Грамадзянскасць і ўдзел

Узровень 2

6–30 (малыя групы па 4–5 чалавек)

90 хвілін

# Адукацыя для ўсіх?

*У цябе добрая памяць? Давай праверым!*

**Тэмы**
- адукацыя,
- дзеці,
- грамадзянскасць і ўдзел.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** 6–30 чалавек (малыя групы па 4–5 чалавек)

**Час** 90 хвілін

**Агляд** У гэтым практыкаванні ўдзельнікі шукаюць парныя карткі і задумваюцца над няроўнасцю адукацыйных магчымасцей ва ўсім свеце і аб дасягненні Мэты ўстойлівага развіцця нумар 4 – якаснай адукацыі для ўсіх.

**Звязаныя правы**
- права на адукацыю;
- права на поўнае раскрыццё сваіх фізічных, інтэлектуальных, духоўных, этычных і сацыяльных магчымасцей;
- права на роўнасць.

**Мэты**
- пашырыць веды аб адукацыі і пра тое, як яна закранае ўсе сферы жыцця;
- развіць памяць і навыкі крытычнага аналізу;
- прывіць пачуццё адказнасці, уласнай годнасці і справядлівасці.

**Матэрыялы**
- набор картак на групу з трох-чатырох удзельнікаў;
- папера і ручкі для заўваг у 2-й частцы практыкавання.

**Падрыхтоўка**
- Прачытайце ўсе карткі са сцверджаннямі.
- Азнаёмцеся з Мэтай устойлівага развіцця нумар 4 і яе задачамі (гл. дадатковую главу «Адукацыя»).
- Зрабіце копіі аркушаў з гульнявымі карткамі і прыклейце іх на кардон, каб яны даўжэй вам праслужылі. Нарэжце 40 картак.

## Інструкцыі

1. Спытайце ўдзельнікаў, што ім вядома аб Мэтах устойлівага развіцця (МУР). Пры неабходнасці коратка раскажыце пра МУР, адзначыўшы, што Мэтай устойлівага развіцця нумар 4 з'яўляецца забеспячэнне якаснай адукацыі для ўсіх да 2030 года.
2. Растлумачце, што практыкаванне складаецца з дзвюх частак: частка 1 – гульня на развіццё памяці; частка 2 – разгляд пытанняў і іх абмеркаванне.

**Частка 1. Гульня на развіццё памяці** (10 хвілін)

1. Растлумачце, што ў гульні маецца 20 пар картак; кожная пара ўключае картку са сцверджаннем і адпаведную ёй картку з выявай. Задача ўдзельнікаў – сабраць карткі ў пары. Усе сцверджанні тычацца пытанняў, так ці інакш звязаных з Мэтай устойлівага развіцця нумар 4, правамі чалавека і адукацыяй. Пытанні (набраныя курсівам) прызначаны для абмеркавання пазней.
2. Спытайце, ці ведаюць удзельнікі гульню пад назвай «Канцэнтрацыя», «Памяць», «Пелманізм» ці «Пары», бо менавіта ў яе яны будуць гуляць у малых групах па чатыры чалавекі. Напомніце правілы: перавернутыя плячыма ўверх карткі раскладваюцца на падлозе ці на стале. Удзельнік, які пачынае гульню, пераварочвае дзве карткі. Калі картка (ці абедзве) утрымлівае сцверджанне, то ўдзельнік зачытвае назву карткі і гэта сцверджанне (але не пытанні, выдзеленыя курсівам, – яны для другой часткі практыкавання). Калі карткі не падыходзяць адна да адной, удзельнік зноў пераварочвае іх плячыма ўверх і кладзе на ранейшыя месцы. Затым дзве карткі бярэ наступны гулец. Гульня заканчваецца, калі ўсе карткі будуць перавернуты. Выйграе той, у каго картак больш.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**8 верасня**
Міжнародны дзень пісьменнасці

**Частка 2. Разгляд пытанняў і іх абмеркаванне** (60 хвілін)

1. Запішыце ўсе пытанні на фліпчарце. Папрасіце добраахвотнікаў зачытаць назвы картак, пакуль вы будзеце іх запісваць.
2. Прапануйце групе выбраць 4–6 найбольш цікавых для яе пытанняў.
3. Падзяліце ўдзельнікаў на малыя групы па 4–5 чалавек. Прапануйце кожнай падгрупе выбраць для абмеркавання два пытанні, якія ёй здаюцца найбольш цікавымі для абмеркавання.
4. Пасля ўзгаднення і размеркавання тэм дайце групам 20 хвілін на абмеркаванне двух выбраных варыянтаў. Пытанне, надрукаванае на картцы курсівам, павінна стаць зыходным пунктам для дыскусіі.
5. Па заканчэнні 20 хвілін папрасіце ўдзельнікаў сабрацца на агульнае абмеркаванне. Разглядайце пытанні адно за адным па чарзе. Кожная група мае 5 хвілін на выкладанне свайго матэрыялу і не больш за 5 хвілін на пытанні і адказы.
6. Пасля таго як групы асветляць выбраныя пытанні, пераходзьце да аналізу.

## Аналіз і ацэнка

У вас ужо была магчымасць абмеркаваць самі пытанні, так што зараз варта ацаніць саму гульню і тое, што даведаліся ўдзельнікі:

- Ці спадабалася ім гульня на развіццё памяці?
- Ці падыходзіць яна як уводзіны да абмеркавання праблем адукацыі?
- Як прайшлі абмеркаванні ў групах? Ці ўсе лічылі, што могуць прыняць у іх удзел?
- Артыкул 26 УДПЧ абвяшчае права на адукацыю. Што такое права прадугледжвае на практыцы?
- Ці не занадта шмат цяжкасцей стаіць на шляху адукацыі? Ці дасягальна мэта забяспечыць магчымасці інклюзіўнай і справядлівай адукацыі і навучання на працягу ўсяго жыцця для ўсіх да 2030 года?
- Як вы лічыце, чаму адукацыя стала адной з Мэт устойлівага развіцця?
- Што перашкаджае ажыццяўленню права на адукацыю ў вашай краіне, супольнасці або школе?
- Які ўклад у дасягненне МУР нумар 4 у вашай краіне і (або) у краінах, якія развіваюцца, можаце ўнесці вы, ваша група, ваша супольнасць?
  Ці існуе небяспека таго, што права на адукацыю ў галіне правоў чалавека акажацца «забытым», калі настолькі востра стаіць неабходнасць паляпшэння адукацыі, якая забяспечвае пісьменнасць і прафесіянальныя навыкі? Калі так, то што можна зрабіць?

## Парады для фасілітатараў

Гэты метад заклікаНы ўнесці элемент забаўляльнасці ў працэс збору інфармацыі, неабходнай для абмеркавання.

Правядзенне гэтай гульні не нясе для фасілітатара асаблівых цяжкасцей. Перад выкананнем гэтага практыкавання абавязкова прачытайце ўсе карткі. Пераканайцеся, што вы ведаеце, якая картка якой адпавядае, каб даваць парады па ходзе гульні і вырашаць спрэчныя сітуацыі. Тлумачачы правілы, пакажыце адну пару для ілюстрацыі. Пакажыце, чым сцверджанне адрозніваецца ад пытання.

Вы можаце сказаць удзельнікам, што гульня называецца «Памяць», таму што ў ёй трэба запамінаць, дзе ляжаць розныя карткі, каб складаць з іх пары.

Другую частку практыкавання можна арганізаваць такім чынам, каб дзве розныя групы абмяркоўвалі адно і тое ж пытанне. Хутчэй за ўсё, гэта дасць больш ідэй. Падгрупам прыйдзецца дамовіцца, якія канкрэтна пытанні абмяркоўваць.

Вам прыйдзецца вырашыць, у які момант правядзення практыкавання лепш даць групе падрабязную інфармацыю аб МУР нумар 4. Калі і як вы гэта зробіце, будзе залежаць ад групы і даступнага часу. Вы можаце зрабіць гэта, калі будзеце апісваць само практыкаванне або падчас аналізу. Вы можаце падсумаваць мэты, каб атрымаць лепшае бачанне пытання.

Пры капіраванні картак мае сэнс іх павялічыць, каб тэкст лягчэй чытаўся. Калі вы прыклеіце іх на тоўстую паперу, карткі стануць больш даўгавечнымі і імі зручней будзе карыстацца.

На некаторых картках прыводзяцца скарачэнні, напрыклад АПЧ (адукацыя ў галіне правоў чалавека). Апісваючы гульню, растлумачце, што гэтыя літары азначаюць.

Помніце, што каля трэці картак змяшчаюць сцверджанні, якія адносяцца да Мэты ўстойлівага развіцця нумар 4, якая была абвешчана ААН у 2015 годзе. Астатнія карткі прысвечаны праблемам правоў чалавека і адукацыі або праблемам, якія неабходна вырашыць, каб забяспечыць якасную адукацыю для ўсіх.

## Варыянты

Калі часу на правядзенне часткі 2 недастаткова, выкарыстайце метад, апісаны ў практыкаванні «Хвіліначку!». Кожны ўдзельнік павінен выбраць адно з пытанняў на картках, якія ў яго ёсць, і гаварыць на гэту тэму на працягу адной хвіліны, не паўтараючыся і не робячы паўз. Гэты варыянт таксама будзе карысным, калі вы лічыце, што ўдзельнікам трэба палепшыць навыкі вуснай прэзентацыі.

У другой частцы можна сэканоміць час, калі загадзя падрыхтаваць набор вельмі павялічаных картак з адпаведнымі назвамі. У такім выпадку замест таго, каб запісваць тэзісы, можна будзе проста прымацаваць гэтыя карткі да дошкі. Гэта зойме менш часу і будзе добра выглядаць.

## Прапановы па далейшай працы

Шэраг праблем, закранутых у гульні на развіццё памяці, можна разгледзець і ў рамках іншых практыкаванняў. Калі вы захочаце абмеркаваць праблему суадносін бюджэту на адукацыю і іншыя сацыяльныя патрэбы і бюджэту на ўзбраенне, можна выканаць практыкаванне «Колькі нам патрэбна?». Праблемы дзіцячай працы і адсутнасці доступу да адукацыі разглядаюцца ў практыкаванні «Гісторыя Ашыка».

## Ідэі для дзеяння

На картках апісаны шэраг праблем, якія стаяць на шляху дасягнення мэты забеспячэння якаснай адукацыі для ўсіх да 2030 года. Група можа выбраць нейкую адну праблему для далейшага вывучэння, пошуку ідэй па дасягненні задач і наступных дзеянняў па іх ажыццяўленні. У раздзеле 3 «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека» вы знойдзеце рэкамендацыі аб тым, як прыступіць да гэтай задачы.

Чаму б не напісаць пісьмо членам вашага парламента з пытаннем аб тым, што робіць ваша краіна для дасягнення задач у рамках Мэты ўстойлівага развіцця нумар 4.

## Дадатковая інфармацыя

Права на адукацыю абвешчана ў артыкуле 26 УДПЧ. Аднак хоць дзяржавы ў цэлым прызналі гэта права і абавязаліся забяспечыць бясплатную пачатковую адукацыю для ўсіх, у рэчаіснасці бясплатная адукацыя існуе не для ўсіх, а толькі для меншасці. Задача 4.1 Мэты ўстойлівага развіцця нумар 4 з’яўляецца апошняй ініцыятывай ААН, накіраванай на забеспячэнне гэтага права для кожнага.

Існуюць і іншыя ініцыятывы па садзейнічанні прасоўвання адукацыі ва ўсім свеце. «Адукацыя для ўсіх» была тэмай Сусветнай канферэнцыі па адукацыі для ўсіх у Джамцьене, Тайланд, у 1990 годзе. Затым, у 2000 годзе, міжнародная супольнасць сабралася ў Дакары, Сенегал, на Сусветны форум па адукацыі для агляду прагрэсу, дасягнутага ў забеспячэнні базавай адукацыі, і ўмацавання прыхільнасці да адукацыі для ўсіх. Каля 1100 удзельнікаў з 164 краін прынялі Дакарскія рамкі дзеянняў, узяўшы на сябе абавязацельствы па забеспячэнні якаснай базавай адукацыі для ўсіх да 2015 года. На ЮНЕСКА была ўскладзена агульная адказнасць за каардынацыю ўсіх міжнародных удзельнікаў, а таксама за падтрыманне глабальнага імпульсу.

На форуме было прызнана, што розныя краіны сутыкаюцца з рознымі цяжкасцямі: у адных не хапае рэсурсаў, у іншых – палітычнай волі. Адным з вынікаў форуму стала прызнанне таго, што для дасягнення мэт і задач адукацыі для ўсіх і захавання такога становішча неабходна аб'яднаць намаганні шырокага круга партнёраў з розных краінах пры падтрымцы рэгіянальных і міжнародных агенцтваў і інстытутаў.

На форуме падкрэслівалася прынцыповая важнасць навучання па тэмах устойлівага развіцця, міру, эфектыўнага ўдзелу кожнага чалавека ў жыцці грамадства і здаровай эканомікі ў XXI стагоддзі. Пахвальным вынікам працы Сусветнага форуму па адукацыі стала вызначэнне канкрэтных мэт і тэрмінаў іх дасягнення, а таксама выпрацоўка мер, якія павінны быць прыняты на розных узроўнях для забеспячэння адукацыі для ўсіх. Ці будуць дасягнуты гэтыя мэты і прыняты намечаныя меры – гэта пытанне, адказ на які мы атрымаем толькі ў тым выпадку, калі кожны член грамадства на сваім узроўні ведае пра мэту забеспячэння адукацыі для ўсіх і ўносіць свой уклад у яе дасягненне.

**Крыніца**:

ЮНЕСКА: Адукацыя для ўсіх. Заключны даклад Сусветнага форуму па адукацыі, 2000 год.

Ініцыятыва Сусветнага форуму па адукацыі супала з прыняццем ААН Мэт развіцця тысячагоддзя (МРТ) да 2015 года. З 8 МРТ толькі дзве звязаны з адукацыяй: мэта 2 (забеспячэнне ўсеагульнай пачатковай адукацыі) і мэта 3 (забеспячэнне гендарнай роўнасці і пашырэння правоў і магчымасцей жанчын).

Дадатковая інфармацыя аб адукацыі для ўсіх даступна на вэб-сайце UNESCO.org; пра МРТ чытайце на www.un.org/millenniumgoals, а інфармацыю аб міжнароднай палітыцы і супрацоўніцтве ў галіне адукацыі і падрыхтоўкі кадраў шукайце на www.norrag.org.

У 2015 годзе Генеральная Асамблея ААН афіцыйна прыняла МУР, якія павінны былі прыйсці на змену Мэт развіцця тысячагоддзя. (Для атрымання агульнай інфармацыі аб МУР гл. раздзел дадатковай інфармацыі ў практыкаванні «Колькі нам патрэбна?» і www.undp.org). Мэта ўстойлівага развіцця нумар 4 тычыцца якаснай адукацыі і прадугледжвае забеспячэнне інклюзіўнай і справядлівай адукацыі і навучання на працягу ўсяго жыцця для ўсіх да 2030 года. МУР нумар 4 мае сем задач:

1. Да 2030 года забяспечыць, каб усе дзяўчынкі і хлопчыкі атрымалі бясплатную, справядлівую і якасную пачатковую і сярэднюю адукацыю, якая прывядзе да адпаведных і эфектыўных вынікаў навучання.
2. Да 2030 года забяспечыць, каб усе дзяўчынкі і хлопчыкі мелі доступ да якаснага развіцця, догляду і адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту, якія падрыхтуюць іх да пачатковай адукацыі.
3. Да 2030 года забяспечыць роўны доступ да таннай і якаснай тэхнічнай, прафесійнай і вышэйшай адукацыі, у тым ліку ва ўніверсітэтах, для ўсіх жанчын і мужчын.
4. Да 2030 года істотна павялічыць колькасць моладзі і дарослых, якія маюць адпаведныя навыкі, у тым ліку тэхнічныя і прафесійныя, для занятасці, годнай працы і прадпрымальніцтва.
5. Да 2030 года ліквідаваць гендарную няроўнасць у сферы адукацыі і забяспечыць роўны доступ да ўсіх узроўняў адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі для ўразлівых груп насельніцтва, уключаючы асоб з абмежаванымі магчымасцямі, карэнных народаў і дзяцей, якія знаходзяцца ва ўразлівым становішчы.
6. Да 2030 года забяспечыць пісьменнасць і веданне лічэння ўсёй моладзі і значнай часткі дарослых, як мужчын, так і жанчын.
7. Да 2030 года забяспечыць, каб усе навучэнцы набылі веды і навыкі, неабходныя для садзейнічання ўстойліваму развіццю, у тым ліку за кошт адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця і ўстойлівага ладу жыцця, правоў чалавека, гендарнай роўнасці, заахвочвання культуры міру і ненасілля, глабальнага грамадзянства і прызнання культурнай разнастайнасці і ўкладу культуры ва ўстойлівае развіццё.

Дадатковую інфармацыю можна знайсці на наступных сайтах:

- Справаздача па глабальным маніторынгу па тэме «Адукацыя для ўсіх»: www.unesco.org/en/efareport;
- Сусветная адукацыйная кампанія: www.campaignforeducation.org;
- Праект «Права на адукацыю»: www.right-to-education.org.



**Грошы і адукацыя**

Без грошай урад не можа выконваць свае абавязацельствы. Гэта таксама пытанне стандартаў: нізкая зарплата настаўнікаў і адсутнасць навучальных матэрыялаў адмоўна адбіваюцца на якасці адукацыі. Няма грошай – няма адукацыі.

*Вы згодны з гэтым?*



**Гендарная роўнасць і адукацыя**

Многія краіны значна прасунуліся ў справе дасягнення гендарнай роўнасці ў адукацыі. Аднак у некаторых краінах дзяўчынкам і жанчынам забаронена наведваць школу.

*Ці лічыце вы, што гэта зніжае давер да МУР нумар 4?*



**Харчаванне і адукацыя**

Праграмы «Харчаванне для адукацыі» забяспечваюць школьныя абеды або выдачу харчавання на дом, каб дзеці з бедных сем'яў былі здаровыя і маглі вучыцца.

*Ці з'яўляюцца праграмы «Харчаванне для адукацыі» ключавымі для дасягнення задач МУР нумар 4?*



**Адукацыя для ўсіх**

Папярэднія ініцыятывы па забеспячэнні пачатковай адукацыі для ўсіх не дасягнулі сваіх задач. Цяпер МУР нумар 4 ставіць задачу забяспечыць якасную адукацыю і магчымасці навучання на працягу ўсяго жыцця для ўсіх да 2030 года.

*Які сэнс у пастаноўцы відавочна недасягальных мэт?*



**Наркотыкі і адукацыя**

Ужыванне алкаголю, цыгарэт і іншых наркатычных рэчываў – праблема многіх школ і ўніверсітэтаў. Залежнасць перашкаджае навучанню і павялічвае гвалт.

*Ці можа строгая ўнутрышкольная палітыка ў дачыненні да наркатычных рэчываў вырашыць праблему?*



**Узбраенне і адукацыя**

У многіх краінах вялікая частка бюджэту накіроўваецца на ваенныя выдаткі, а на сацыяльны сектар, асабліва адукацыю, сродкаў не хапае.

*Ці можна лічыць бяспеку важнейшай за адукацыю?*



**Педагогі і адукацыя**

Добрыя настаўнікі – гэта неабходнасць. Аднак у многіх краінах, якія развіваюцца, падрыхтоўка настаўнікаў можа быць мінімальнай.

*Ці ёсць неабходнасць у мінімальных патрабаваннях, такіх як дыплом педагога, для ўсіх школьных настаўнікаў?*



**Міграцыя і адукацыя**

Чым больш адукаваны чалавек, тым больш верагоднасць таго, што ён эмігрыруе. Мноства ўрачоў, настаўнікаў, інжынераў і спецыялістаў па інфармацыйных тэхналогіях з краін, якія развіваюцца, працуюць у Еўропе.

*Ці можна з пункту гледжання этыкі апраўдаць той факт, што Еўропа выйграе дзякуючы ўцечцы мазгоў з краін, дзе гэтыя людзі сапраўды патрэбны?*



**Бясплатная адукацыя**

Пункт 4.1 МУР абвяшчае забеспячэнне бясплатнай пачатковай і сярэдняй адукацыі для ўсіх да 2030 года.

*Ці сапраўды гэта добрая ідэя? Ці не цэняць людзі нешта больш, калі павінны за гэта заплаціць?*



**Адукацыя ў галіне правоў чалавека**

«Кожны чалавек і сацыяльны орган, арыентуючыся на УДПЧ, павінен праз навучанне і адукацыю выхоўваць павагу да правоў і свабод». Генеральная Асамблея ААН.

*Якія канкрэтна «сацыяльныя органы» найбольш эфектыўна забяспечваюць адукацыю ў галіне правоў чалавека?*



**Глабалізацыя і адукацыя**

Глабальныя ланцужкі стварэння кошту вымушаюць прадпрыемствы краін, якія развіваюцца, спецыялізавацца на выкананні пэўных задач, напрыклад вырабляць адзенне на фабрыцы, дзе ад працаўнікоў патрабуецца вельмі нізкая падрыхтоўка.

*Ці зніжае глабалізацыя каштоўнасць адукацыі?*



**Мір і адукацыя**

Адукацыю ў духу міру трэба ўключыць у афіцыйныя праграмы навучальных устаноў. Атрымання адпаведных ведаў выключна дзякуючы нефармальнаму навучанню відавочна не дастаткова.

*Як бы вы ўключылі адукацыю ў духу міру ў афіцыйныя навучальныя праграмы?*



**Інтэрнэт і адукацыя**

У многіх краінах інфармацыйныя тэхналогіі сталі найважнейшай часткай працэсу адукацыі: яны неабходны для даследчай і дамашняй работы.

*Калі б кожнае дзіця ў свеце мела доступ да камп'ютара, які патэнцыял можна было б раскрыць? Якія праблемы можна было б вырашыць?*



**Спорт і адукацыя**

Спартыўныя заняткі павінны абавязкова ўваходзіць у школьную праграму. Спорт вучыць таму, чаго нельга даведацца на ўроках па іншых прадметах. Ён неабходны для правільнага развіцця цела і розуму.

*Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем або лічыце, што іншыя прадметы, напрыклад прыкладныя навукі і прафесійнае навучанне, павінны мець прыярытэт?*



**Універсітэцкая (вышэйшая і далейшая) адукацыя**

Пункт 4.3 МУР абвяшчае забеспячэнне роўнага доступу да таннай тэхнічнай, прафесійнай і вышэйшай адукацыі для ўсіх да 2030 года.

*Якія меры трэба прыняць для забеспячэння «роўнага доступу» і «таннасці» на практыцы?*



**Сацыяльнае выключэнне і адукацыя**

У некаторых еўрапейскіх краінах дзяцей цыганоў-рама аўтаматычна запісваюць у класы для разумова адсталых проста на падставе іх этнічнай прыналежнасці. У іншых іх накіроўваюць у асобныя школы або класы, якія забяспечваюць адукацыю ніжэйшай якасці і спецыяльна прызначаныя для цыганоў-рама.

*Які найлепшы спосаб уключыць такіх дзяцей у адукацыйную сістэму?*



**Навакольнае асяроддзе і адукацыя**

Пункт 4.7 МУР абвяшчае забеспячэнне ўсім навучэнцам ведаў і навыкаў, неабходных для садзейнічання ўстойліваму развіццю, да 2030 года.

*Як бы вы ўключылі адукацыю ў галіне навакольнага асяроддзя ў афіцыйныя навучальныя праграмы?*



**Адукацыя для дарослых**

Пункт 4.6 МУР абвяшчае забеспячэнне пісьменнасці значнай часткі дарослага насельніцтва да 2030 года.

*Ці мэтазгодна накіроўваць грошы на праграмы ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых, а не ўкладваць іх у будучыню, фінансуючы пачатковую адукацыю?*



**Дысцыпліна і адукацыя**

У розных краінах школы выкарыстоўваюць розныя дысцыплінарныя метады. Сярод іх цялесныя пакаранні, адхіленне ад заняткаў, дадатковая праца, выключэнне і ўдзел у працы савета школы або каледжа.

*Як, на вашу думку, лепш за ўсё забяспечваць дысцыпліну ў навучальнай установе?*



**СНІД (ВІЧ) і адукацыя**

«Першай бітвай, якую мы павінны выйграць у вайне са СНІДам, павінна стаць бітва са сцяной маўчання і кляймом ганьбы» (Кофі Анан).

*Якую ролю адукацыйныя ўстановы павінны адыгрываць у барацьбе з ВІЧ (СНІДам)?*

COMPASS

Дэмакратыя

Грамадзянскасць і ўдзел

Агульныя правы чалавека

Узровень 2

Любы памер групы

60 хвілін

# Выбірай!

*Як вы ўмееце пераконваць?*

**Тэмы**
- дэмакратыя,
- грамадзянскасць і ўдзел,
- агульныя правы чалавека.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** любы памер групы

**Час** 60 хвілін

**Агляд** Гэта практыкаванне пабудавана на дыскусіі, падчас якой абмяркоўваюцца:
- правы і абавязкі ў дэмакратычным грамадстве,
- дэмакратычная форма дыскусіі.

**Звязаныя правы**
- права на ўдзел у кіраванні і свабодных выбарах;
- свабода перакананняў і выказвання меркавання;
- свабода думкі.

**Мэты**
- разгледзець некаторыя супярэчлівыя аспекты дэмакратычнага грамадства;
- развіць уменне слухаць, спрачацца, пераконваць;
- садзейнічаць супрацоўніцтву і непрадузятасці.

**Матэрыялы**
- адкрытая прастора, доўгая сцяна і 2 крэслы;
- картка (фармату А4), каляровыя ручкі для малявання знакаў;
- клейкая стужка;
- карткі невялікага фармату і ручкі (па жаданні).

**Падрыхтоўка**
- Зрабіце два надпісы: «Згаджаюся» і «Не згаджаюся» і прымацуйце іх на процілеглых канцах доўгай сцяны. Уздоўж сцяны павінна быць досыць месца, каб усе маглі выстраіцца ў адну лінію.
- Пастаўце два крэслы ў цэнтры памяшкання, на паўметра адзін ад аднаго так, каб вакол іх было досыць месца для перамяшчэння ўдзельнікаў.
- Выберыце адно са сцверджанняў, прыведзеных ніжэй, або сфармулюйце сваё ўласнае.

## Інструкцыі

1. Пакажыце на надпісы на сцяне і паведаміце, што збіраецеся зачытаць выказванне, з якім удзельнікі могуць у большай ці меншай ступені згаджацца ці не згаджацца.
2. Прачытайце ўслых абранае сцверджанне.
3. Папрасіце ўдзельнікаў заняць месцы ўздоўж сцяны паміж двума знакамі ў адпаведнасці з тым, «наколькі» яны згодны ці не згодны: тыя, хто цалкам не згодны ці згодны, павінны ўстаць з адпаведнага боку, астатнія – дзесьці пасярэдзіне.
4. Калі ўсе вызначацца з выбарам месцаў, запрасіце двух удзельнікаў, якія стаяць на процілеглых канцах сцяны, заняць месцы на крэслах у цэнтры памяшкання. Астатнім трэба ўстаць за тым з іх, з кім яны «больш за ўсё» згодны, альбо заняць месца ў цэнтры, калі яны не вызначылі свайго стаўлення.
5. Дайце тым, хто сядзіць у крэслах, па адной хвіліне, каб расказаць, чаму яны згодны або не згодны са сцверджаннем. Ніхто не павінен перабіваць іх ці дапамагаць ім. Усе павінны слухаць моўчкі.
6. У канцы іх выступленняў папрасіце тых, хто яшчэ не вызначыўся, зрабіць гэта і ўстаць за якім-небудзь крэслам (ніхто не павінен заставацца нейтральным), каб атрымалася дзве групы: адна, якая падтрымлівае сцверджанне, і другая, якая выступае супраць. Дайце групам дзесяць хвілін на тое, каб асобна адна ад адной падрыхтаваць аргументы на карысць сваёй пазіцыі і абраць для іх выкладання новых дакладчыкаў.

7. Па завяршэнні 10 хвілін папрасіце новых дакладчыкаў заняць месцы ў крэслах, а групы «прыхільнікаў» устаць за імі.
8. Дайце дакладчыкам па тры хвіліны на выкладанне аргументаў, пасля чаго прыхільнікі аднаго або іншага боку могуць перайсці да апанентаў, калі іх аргументы аказаліся досыць пераканаўчымі.
9. Дайце групам яшчэ па пяць хвілін для пошуку новых аргументаў і выбару трэцяй пары дакладчыкаў. Як і раней, пасля іх выступлення ўдзельнікі могуць пры жаданні змяніць свае пазіцыі.
10. Збярыце ўсіх на аналіз.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**19 верасня**
Дзень выбарчага права

## Аналіз і ацэнка

Запрасіце ўсіх паразважаць пра тое, як працякала дыскусія і якую мэту яна мела, а таксама ў чым каштоўнасць плюралістычнага грамадства. Не дапускайце аднаўлення дыскусіі па саміх пытаннях.

- Ці змяніў хто-небудзь сваю пазіцыю падчас дыскусіі? Калі так, пад уплывам якіх аргументаў?
- Ці не лічаць удзельнікі, што на іх паўплывалі не толькі пэўныя аргументы, але і, напрыклад, ціск групы, эмацыянальнасць выступленняў, азарт спаборніцтва?
- Ці мела абмеркаванне гэтых пытанняў які-небудзь сэнс для тых, хто не змяніў сваёй пазіцыі падчас дыскусіі? Пад уплывам якіх аргументаў яны маглі б змяніць свае погляды?
- Чаму ў людзей разыходзяцца меркаванні? Як адносіцца да гэтага ў дэмакратычным грамадстве?
- Ці варта ва ўмовах дэмакратыі ставіцца памяркоўна да любых поглядаў?
- Што вы адчувалі, калі ў дыскусіі вас прадстаўляў нехта іншы або, наадварот, калі вы выступалі ў якасці дэлегата і выказвалі меркаванне сваіх прыхільнікаў?
- Што значыць мець уласнага прадстаўніка ў палітычным жыцці на мясцовым і дзяржаўным узроўнях? Або ў арганізацыях ці аб’яднаннях, у якія ўваходзяць удзельнікі (або ў школьным класе)?
- Якія правы чалавека могуць быць парушаны ў такой сітуацыі?

## Парады для фасілітатараў

Першая частка практыкавання, калі ўдзельнікі займаюць месцы ўздоўж сцяны, павінна заняць не больш пары хвілін. Яе сэнс у тым, каб людзі вызначылі сваю «першапачатковую пазіцыю» і параўналі яе з пазіцыямі іншых.

Мэта практыкавання заключаецца і ў тым, каб папрактыкаваць навыкі зносін і пераканання, і ў тым, каб паразважаць пра сутнасць праблемы. Таму парайце ўдзельнікам думаць не толькі пра змест і форму выкладання сваёй пазіцыі, але і пра тое, у якім выглядзе або форме вашы аргументы будуць найбольш пераканаўчымі для процілеглага боку. Іх мэта – перацягнуць у сваю «партыю» як мага больш людзей. У перапынках паміж выступленнямі варта прааналізаваць пазіцыю праціўнікаў і падумаць, як яе аслабіць.

Акрамя прапанаваных ніжэй сцверджанняў магчыма выкарыстанне іншых тэм для дыскусіі – важна толькі, каб абранае сцверджанне выклікала палеміку ў групе.

Помніце, што розныя раўнды абмеркавання аднаго сцверджання патрабуюць каля 30 хвілін. Калі вы хочаце абмеркаваць больш сцверджанняў, вам адпаведна спатрэбіцца выдзеліць на гэта больш часу.

Выбірай!

Рэкамендуецца гібка падыходзіць да паслядоўнасці этапаў занятку з улікам таго, наколькі моцная ці слабая група, наколькі жвава праходзіць дыскусія. Напрыклад:

- можаце дадаць адзін-два раўнды, калі хочаце, каб у ролі дакладчыкаў выступілі як мага больш удзельнікаў;
    - калі вы ўжо праводзілі ў групе гэта практыкаванне – і нават калі не праводзілі – можаце ўнесці ў яго элемент нечаканасці, змяніўшы парадак выбару першых дакладчыкаў, напрыклад, запрасіць на гэту ролю трэціх з канца ўдзельнікаў;
- у адзін з перапынкаў паміж раўндамі вы можаце прапанаваць, каб «прыхільнікі» кожнага дакладчыка папрацавалі з дакладчыкам процілеглага боку, г. зн., падрыхтавалі аргументы супраць сваіх жа пазіцый. Гэта дапаможа лепш зразумець пункт гледжання саперніка і, можа быць, унясе ажыўленне ў практыкаванне, асабліва калі ніхто не хоча пераходзіць з адной групы ў іншую.

Дазвольце дакладчыкам мець пры сабе кавалачкі паперы памерам з паштоўку з коратка сфармуляванымі аргументамі, у якія яны маглі б зазіраць падчас свайго выступлення.

Вы можаце закрануць пытанне аб магчымасці ўстанаўлення меж «плюралізму» або свабоды выказвання меркавання ў грамадстве, памяркоўным да іншадумства: ці павінны быць дазволены, напрыклад, фашысцкія і нацыяналістычныя дэманстрацыі?

## Прапановы па далейшай працы

Пры жаданні працягнуць працу па тэме фарміравання і змены меркаванняў, асабліва пад уплывам СМІ, звярніце ўвагу на практыкаванне «Першая паласа» на старонцы 181.

Калі вы хочаце абмеркаваць суадносіны паміж поглядамі людзей і іх уяўленнямі аб свеце і стэрэатыпамі, вам варта звярнуцца да практыкавання «Слоўнік культуры» з навучальнага пакета «Усе розныя – усе роўныя».

## Ідэі для дзеяння

Калі вы выбралі для групы сцверджанне пра галасаванне, на наступных занятках можаце вывучыць звычкі галасавання ў мясцовай супольнасці; гл. практыкаванне «Галасаваць ці не галасаваць» на старонцы 306.

## Дадатковая інфармацыя

Дзень выбарчага права адзначаецца 19 верасня: у гэты дзень у 1893 годзе Новая Зеландыя дала жанчынам права голасу, стаўшы першай у свеце краінай з усеагульным выбарчым правам.

## Раздатачны матэрыял

**Прапанаваныя для абмеркавання сцверджанні**

- Галасаваць на выбарах – наш маральны абавязак.
- Мы павінны выконваць усе законы, нават несправядлівыя.
- У дэмакратычным грамадстве ўладу маюць толькі палітыкі.
- «Народ атрымлівае тых лідараў, якіх заслугоўвае».
- Кантраляваць паўсядзённую дзейнасць урада – абавязак грамадзян.
- Свабода выказвання меркавання азначае, што вы можаце казаць усё, што пажадаеце.
- Неафашысцкія партыі трэба забараніць.
- Экстрэмістам трэба забараніць публічныя выступы.
- Удзел у галасаванні павінен быць абавязковым.
- Няма сэнсу выбіраць прадстаўнікоў у школьны савет, таму што там толькі ідзе абмеркаванне і даюцца рэкамендацыі: абавязковых да выканання рашэнняў савет прымаць не можа.

# Змагары за правы

*Гэта – ідэал, дзеля якога я спадзяюся жыць і якога спадзяюся дамагчыся. Але калі спатрэбіцца, я гатовы за гэты ідэал памерці.*

Нельсан Мандэла

**Тэмы**
- агульныя правы чалавека,
- СМІ,
- грамадзянскасць і ўдзел.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** любы памер групы (малыя групы па 3–4 чалавекі)

**Час** 60 хвілін

**Агляд** У гэтым практыкаванні выкарыстоўваюцца інфармацыйныя карткі для таго, каб абудзіць цікавасць да герояў барацьбы за правы чалавека. На абмеркаванне ставяцца наступныя пытанні:
- палітычнае праследаванне;
- змагары за правы чалавека XX стагоддзя;
- барацьба за правы ў розных краінах.

**Звязаныя правы**
- свабода перакананняў і выказвання меркавання;
- права на роўнасць перад законам і права на справядлівы суд;
- свабода ад катаванняў і зняважальнага абыходжання.

**Мэты**
- даведацца пра некаторых людзей, якія змагаліся за правы чалавека ў розных краінах;
- развіць навыкі збору і апрацоўкі інфармацыі, супрацоўніцтва і працы ў групе;
- падняць павагу і цікавасць да правоў чалавека, сфарміраваць пачуццё адказнасці за іх захаванне.

**Матэрыялы**
- набор з 30 картак на кожную малую групу;
- нажніцы;
- канверты;
- па жаданні: клей і кардон для прыклейвання картак на тоўстую аснову.

**Падрыхтоўка**
- падрыхтуйце памяшканне для працы ў малых групах;
- зрабіце копіі картак са старонкі 170, каб у вас было па адным наборы на кожную малую групу;
- разрэжце аркушы з карткамі,ператасуйце іх і раскладзіце па канвертах. Важна, каб наборы не змешваліся!

## Інструкцыі

1. Папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на малыя групы па 3–4 чалавекі. Выдайце кожнай групе па наборы картак.
2. Папрасіце ўдзельнікаў раскласці карткі на падлозе тварам уніз.
3. Растлумачце, што карткі апісваюць падзеі з жыцця шасці актывістаў барацьбы за правы чалавека. Мэта кожнай групы заключаецца ў тым, каб вызначыць, да якога з гэтых персанажаў адносяцца апісаныя падзеі і такім чынам коратка ахарактарызаваць кожнага з іх.
4. Растлумачце, што кожная з гэтых асоб апісана на пяці картках (напрыклад, на адной картцы з набору «A», на адной з «B», на адной з «C», на адной з «D» і на адной з набору «E»).
5. Папрасіце ўдзельнікаў па чарзе браць па адной картцы, пакуль карткі не скончацца.
6. Дайце групам некалькі хвілін, каб яны моўчкі прачыталі свае карткі.

COMPASS

Агульныя правы чалавека

СМІ

Грамадзянскасць і ўдзел

Узровень 2

Любы памер групы (малыя групы па 3–4 чалавекі)

60 хвілін

7. А цяпер за працу! Дайце кожнай групе магчымасць распрацаваць сваю стратэгію апісання адпаведнай асобы. На гэту працу ўдзельнікам спатрэбіцца 15–20 хвілін.
8. Збярыце ўсіх разам і папрасіце прадстаўніка адной з груп апісаць сваімі словамі адну з асоб. Потым паўтарыце тое ж самае па чарзе з астатнімі групамі, каб усе асобы былі прадстаўлены, а кожная група зможа праверыць, ці правільна яна склала «кавалачкі» мазаікі.

## Аналіз і ацэнка

Задайце наступныя пытанні:

1. Ці лёгка было выконваць практыкаванне і якія стратэгіі розныя групы ўжылі для сартавання картак?
2. Пра якіх асоб удзельнікі ўжо чулі раней, а пра каго даведаліся ўпершыню? Чаму, на іх думку, удзельнікі раней не чулі пра некаторых людзей, у той час як іншыя ім вельмі добра вядомы?
3. Ці здзівілі ўдзельнікаў якія-небудзь факты? Што іх больш за ўсё шакіравала або ўразіла?
4. Папрасіце ўдзельнікаў адабраць тыя цытаты, якія ім бліжэй за ўсё: як бы яны павялі сябе, апынуўшыся на месцы гэтага чалавека?
5. Якіх канкрэтна правоў чалавека дамагаліся розныя «змагары»?
6. Ці з'яўляецца «гераізм» непрыдатным спосабам абароны правоў чалавека? Якія дзеянні даступны людзям, чые правы парушаюцца?

## Парады для фасілітатараў

Пра кожнага персанажа існуе нямала інфармацыі, і прапанаваныя кароткія біяграфіі даюць вельмі павярхоўнае (і суб'ектыўнае) прадстаўленне аб іх жыцці. У гэтым спісе маглі б апынуцца сотні іншых актывістаў, якія абараняюць правы чалавека. Гл. http://www.universalrights.net/heroes/.

Калі вы вырашылі выкарыстоўваць прыклады з «Компаса», але лічыце, што маладыя людзі, з якімі вы працуеце, не знаёмы з гэтымі персанажамі, можна пачаць з кароткага ўступнага практыкавання. Вазьміце фатаграфіі чатырох ці пяці знакамітасцей, якія сталі пасламі ААН і добра вядомы ў вас у краіне, наклейце іх партрэты на вялікія лісты паперы і павесьце на сцяну. Папрасіце членаў групы назваць іх імёны і сказаць, чым яны займаюцца ў якасці паслоў ААН.

Варта адзначыць, што ніхто не павінен лічыць сябе абавязаным падзяляць пазіцыю, якой прытрымліваліся гэтыя актывісты. Існуе шмат спосабаў змагацца за правы чалавека, і розныя людзі выбіраюць розныя шляхі ў адпаведнасці са сваімі перакананнямі і здольнасцямі: напрыклад, працуючы ў існуючай НГА, арганізуючы петыцыі або прамое лабіраванне.

## Варыянты

Выдайце кожнай групе пустую картку і папрасіце напісаць кароткую біяграфію якога-небудзь змагара за правы чалавека па іх выбары. Затым папрасіце групы абмяняцца карткамі і адгадаць «змагароў». Калі вы выбераце гэты варыянт практыкавання, будзьце гатовы да сюрпрызаў: у ліку змагароў могуць апынуцца знакамітасці і зоркі эстрады. Вам варта прымаць усе прапановы, падкрэсліваючы тое, чаго гэтыя людзі дамагліся ці за што змагаліся. Калі вы не згодны з роляй той ці іншай асобы ў барацьбе за правы чалавека, прапануйце іншым удзельнікам выказаць сваё меркаванне.

## Прапановы па далейшай працы

Мы настойліва рэкамендуем пасля гэтага практыкавання прапанаваць удзельнікам сабраць інфармацыю аб іншых праваабаронцах, каб лепш зразумець тых людзей, якія на працягу ўсёй гісторыі рабілі свой уклад у барацьбу за правы чалавека.

Група магла б пачаць са стварэння ўласнай «партрэтнай галерэі» актывістаў барацьбы за правы чалавека. Зыходным пунктам маглі б стаць тыя шэсць праваабаронцаў, якія былі адабраны для гэтага практыкавання: іх фатаграфіі разам з цытатамі і кароткімі біяграфіямі можна наклеіць на кардон і павесіць у пакоі. Можна папрасіць кожнага члена групы сабраць звесткі пра іншых актывістаў і размясціць іх у партрэтнай галерэі. Усе шэсць прадстаўленых у гэтым практыкаванні актывістаў змагаліся за грамадзянскія і палітычныя правы, але вы можаце пашырыць кола правоў, дадаўшы сацыяльныя і эканамічныя правы. Прыкладам можа паслужыць Чыка Мендэс.

У грамадзянскай супольнасці ёсць цэлы шэраг спосабаў выражэння свайго меркавання і барацьбы за правы чалавека. Калі вы хочаце больш даведацца пра гэта, вы можаце выканаць практыкаванне «Вузы супрацоўніцтва» на старонцы 223.

Можна спыніцца на сітуацыях, у якіх даводзіцца адстойваць уласныя правы. У гэтым выпадку звярніцеся да практыкавання «Адгадай, хто прыйдзе ў госці» з навучальнага пакета «Усе розныя – усе роўныя», якое прапануе ўявіць, што можа адбыцца, калі вы захочаце пазнаёміцца са сваімі бацькамі свайго хлопца або дзяўчыну, якія тым «не падыходзяць».

## Ідэі для дзеяння

Знайдзіце інфармацыю пра каго-небудзь з сучасных палітычных вязняў або праваабаронцаў, напрыклад пра тых, каго арганізацыя Amnesty International называе «вязнямі сумлення». Напішыце пісьмо або арганізуйце інфармацыйную кампанію, каб расказаць людзям пра гэтых зняволеных, і пастарайцеся паўплываць на адказных службовых асоб, патрабуючы іх вызвалення.

## Дадатковая інфармацыя

Аддзяленне Amnesty International у Вялікабрытаніі падрыхтавала гістарычны плакат, прысвечаны абаронцам правоў чалавека, які можна заказаць на іх вэб-сайце http://www.amnesty.org.uk.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**10 снежня**
Дзень правоў чалавека

## Раздатачныя матэрыялы

### Карткі для дыскусіі

| | |
|---|---|
| **A**<br>«Я змагаўся супраць панавання белых і змагаўся супраць панавання чорных. Я выношваў ідэал дэмакратычнага і вольнага грамадства, у якім усе людзі жывуць гарманічна і маюць роўныя магчымасці. Гэта ідэал, дзеля якога варта жыць і за які варта змагацца. Але калі спатрэбіцца, я гатовы за гэты ідэал памерці».<br>Нельсан Мандэла | **A**<br>«Пасля некалькіх пакутлівых, але ў той жа час суцяшальных сустрэч я сама ўбачыла, як з глыбінь маральнай дзікасці раптам чуўся крык «гэта мая віна», і як разам з гэтым крыкам пацыент вяртаў сабе права называцца чалавекам».<br>Яўгенія Гінзбург |
| **B**<br>Нарадзіўся(-лася) у сяле паблізу ад горада Умтата, на першых дэмакратычных выбарах у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы быў абраны прэзідэнтам гэтай краіны ва ўзросце 76 гадоў. Да таго моманту – і пасля яго – яго/яе жыццё было прысвечана | **B**<br>Нарадзіўся(-лася) у 1906 годзе ў Расіі і памёр(-ерла) у Маскве ў 1977 годзе. Працаваў(-ла) непрыметным(-ай) настаўнікам(-цай) і журналістам, пакуль сталінскі рэжым не прычапіў да яго/яе ярлык тэрарыста на сфабрыкаваным судовым працэсе. Правёў(-яла) 18 гадоў у |
| **C**<br>барацьбе супраць апартэіду – расісцкай сістэмы, якую былы ўрад белых выкарыстоўваў для падаўлення чарнаскурай большасці насельніцтва. Ён/яна падвяргаўся(-лася) рэпрэсіям у самых розных формах: быў пазбаўлены магчымасці сустракацца з людзьмі, быў вымушаны сысці ў падполле і, нарэшце, | **C**<br>сібірскіх лагерах у жахлівых умовах з-за таго, што адмовіўся(-лася) абвінаваціць іншых у злачынствах, якіх яны не здзяйснялі. Першы год правёў(-яла) у адзіночным зняволенні ў сырой камеры, дзе яму/ёй забаранялі выконваць фізічныя практыкаванні, размаўляць, спяваць або класціся на ложак днём. Пазней |
| **D**<br>яго/яе арыштавалі і пасадзілі ў турму ва ўзросце 44 гадоў. Правёў(-ла) 28 гадоў за кратамі, далёка ад сям'і і дзяцей. | **D**<br>яго/яе пераводзілі з адных сібірскіх працоўных лагераў у іншыя – у тым ліку і ў самы страшны лагер, адкуль мала хто вяртаўся жывым, у пакаранне за дапамогу таварышу па заключэнні. |
|  |  |

| | |
|---|---|
| **A**<br>«У мяне ёсць мара, што настане дзень, калі гэта нацыя падымецца і будзе жыць у адпаведнасці з сапраўдным сэнсам свайго сімвала веры: «Мы лічым відавочнай ісцінай тое, што ўсе людзі створаны роўнымі». Я мару пра той дзень, калі чацвёра маіх дзяцей будуць жыць у такой краіне, дзе іх будуць судзіць не па колеры скуры, а па якасцях іх характару».<br>Марцін Лютэр Кінг | **A**<br>«Ненасілле – самая магутная сіла ў распараджэнні чалавецтва. Яна магутнейшая за самую магутную зброю знішчэння, створаную розумам чалавека».<br>Махатма Гандзі |
| **B**<br>Нарадзіўся(-лася) у Атланце, штат Джорджыя, у 1929 годзе, калі па законе ў аўтобусах, тэатрах і кіно чарнаскурыя маглі садзіцца толькі на спецыяльна адведзеныя для іх месцы і піць толькі з фантанчыкаў для чарнаскурых. Калі яму/ёй споўнілася 28 гадоў, ён/яна стаў(-ла) адным(-ой) з заснавальнікаў | **B**<br>Нарадзіўся(-лася) у індыйскай сям'і са штата Гуджарат у 1869 годзе, калі Брытанская імперыя яшчэ валодала Індыяй пры дапамозе сілы. Ён/яна узначаліў(-ла) барацьбу за незалежнасць, ніколі не адмаўляючыся ад сваёй глыбокай веры ў |
| **C**<br>арганізацыі цэркваў для чарнаскурых, якая выступала ў падтрымку мірных шэсцяў, дэманстрацый і байкотаў супраць расавай сегрэгацыі. Гэта арганізацыя ўдзельнічала ў маршы пратэсту ў горадзе Бірмінгем, штат Алабама, калі на вуліцы з песнямі выйшлі сотні школьнікаў, | **C**<br>негвалтоўны пратэст і рэлігійную цярпімасць, хоць яго/яе некалькі разоў арыштоўвалі і саджалі ў турму. Калі індыйцы звярталіся да гвалту адзін супраць аднаго або ў барацьбе з брытанскім праўленнем, ён/яна аб'яўляў(-ла) галадоўку і працягваў(-ла) яе да таго часу, пакуль гвалт не спыняўся. Ён/яна узначаліў(-ла) марш працягласцю 241 мілю праз усю Індыю, |
| **D**<br>якія падтрымалі пратэст. Улады выклікалі паліцыю з баявымі сабакамі і пажарнікаў з брандспойтамі. Яго/яе арыштавалі і кінулі ў турму. | **D**<br>пераканаўшы сваіх прыхільнікаў не адказваць на жорсткасць паліцыі і арміі. За сваё жыццё, якое прайшло пад знакам нястомнай барацьбы за мір, ён/яна правёў(-яла) у агульнай складанасці 2338 дзён у турэмным зняволенні. |
|  |  |

| | |
|---|---|
| **A**<br>«Мы не спрабуем разбурыць або знішчыць ваенны рэжым; гэта яны ўвесь час пагражаюць знішчыць нас, але… мэта нашага руху – стварэнне такога грамадства, у якім бяспека гарантуецца ўсім, уключаючы вайскоўцаў».<br>Аўн Сан Су Чжы | **A**<br>«На жаль, гэту сумную песню я ў думках пасылаю тым, хто дапамагае зняволеным. Гэтыя адчуванні ў гэту цёмную пару – я ніколі не забуду страшных катаванняў. Хай не давядзецца ніводнай разумнай істоце перажыць мае цяперашнія пакуты».<br>Нгаванг Сангдрол |
| **B**<br>Нарадзіўся(-лася) у 1945 годзе ў Бірме. Быў(-ла) сынам/дачкой забітага нацыянальнага героя барацьбы за незалежнасць і вызваленне ад каланіяльнага прыгнёту. Стаў(-ла) папулярным лідарам барацьбы за дэмакратыю | **B**<br>Гэты(-а) будыйскі(-ая) манах/манашка, перакананы(-ая) у тым, што Тыбет павінен быць незалежным ад Кітая. Упершыню кітайскія ўлады арыштавалі яго/яе, калі яму/ёй было 10 гадоў. Яго/яе адзіным злачынствам |
| **C**<br>ва ўмовах жорсткага ваеннага рэжыму; ледзь не загінуў(-ла), калі салдатам было загадана цэліцца ў яго/яе. Правёў(-яла) 6 гадоў пад хатнім арыштам, хоць яму/ёй не было прад'яўлена ніякіх абвінавачанняў. Ён/яна быў(-ла) практычна адрэзаны(-а) ад знешняга свету. Нават пасля вызвалення | **C**<br>быў удзел у мірнай дэманстрацыі за незалежнасць Тыбета. Калі яму/ёй было 15 гадоў, ён/яна быў(-ла) зноў арыштаваны(-а) і атрымаў(-ла) 3 гады турэмнага зняволення. Тэрмін зняволення быў павялічаны спачатку за тое, што ён/яна спяваў(-ла) у турме песні аб незалежнасці, а потым – яшчэ на 8 гадоў – за тое, што |
| **D**<br>ўрад не дазволіў яму/ёй развітацца з жонкай/мужам, якая(-і) памірала(-ў). У 1991 годзе ён/яна атрымаў(-ла) Нобелеўскую прэмію міру. 13 лістапада 2010 года яго/яе вызвалілі з-пад хатняга арышту. | **D**<br>крычаў(-ла) «Свабоду Тыбету!», стоячы пад дажджом у турэмным двары. Пасля перанесеных катаванняў ён/яна пакутуе ад праблем з ныркамі. |
|  |  |

# Пагуляем на пальцах

*Магчыма, мы ўсе прыбылі сюды на розных суднах, але цяпер мы знаходзімся ў адной лодцы.*

Марцін Лютэр Кінг-малодшы

COMPASS

Навакольнае асяроддзе

Мір і гвалт

Міграцыя

Узровень 4

Любы памер групы (малыя групы па 5 чалавек)

60 хвілін

**Тэмы**
- навакольнае асяроддзе,
- мір і гвалт,
- міграцыя.

**Складанасць** узровень 4

**Памер групы** любы памер групы (малыя групы па 5 чалавек)

**Час** 60 хвілін

**Агляд** Гэта практыкаванне ўяўляе сабой мадэліраванне конкурсу на самую лепшую маладзёжную экалагічную групу. Ці будуць яны сумленнымі або стануць падманваць?

**Звязаныя правы**
- права на роўнасць перад законам;
- права на жыццё і выжыванне;
- права на міжнародны парадак, пры якім правы і свабоды могуць быць цалкам рэалізаваны.

**Мэты**
- развіць разуменне каштоўнасці супрацоўніцтва і неабходнасці кантролю і праверкі пагадненняў;
- развіць навыкі супрацоўніцтва;
- развіць пачуццё справядлівасці і сумленнасці.

**Матэрыялы**
- копіі інструкцый, па адной на групу;
- копіі пратаколаў, па адной на групу;
- адна ручка на групу для суддзі-сакратара;
- месца для працы ў малых групах.

## Інструкцыі

Абмалюйце сцэну дзеяння: праводзіцца конкурс на самы лепшы маладзёжны экалагічны клуб у горадзе (школе або класе). Кожны ўдзельнік прадстаўляе нейкую маладзёжную групу, і спаборніцтва павінна выявіць тую, якая пяройдзе на наступны этап конкурсу. Мэта складаецца ў тым, каб набраць максімальна магчымую колькасць балаў.

1. Папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на групы па 5 чалавек і сесці ў невялікія кругі.
2. Чатыры чалавекі будуць іграць ролі прадстаўнікоў чатырох маладзёжных клубаў-канкурэнтаў, а пяты – ролю суддзі-сакратара. Растлумачце, што сакратар вядзе лік, з'яўляецца суддзёй і адказвае за падачу сігналу аб пачатку гульні ў кожным раўндзе. Ён нясе адказнасць за вядзенне пратакола гульні і сочыць за выкананнем устаноўленых правілаў.
3. Папрасіце кожную групу вырашыць, хто будзе суддзёй-сакратаром.
4. Раздайце копіі інструкцый суддзям-сакратарам у кожнай групе. Папрасіце зачытаць іх членам групы і пераканацца, што гульцы ведаюць, як гуляць, і разумеюць правілы налічэння балаў. Размясціце табліцу вынікаў (пратакол) так, каб кожны мог яго бачыць і сачыць за лікам падчас гульні.
5. Калі ўсе групы будуць гатовы, можна згуляць трэніровачны раўнд. Калі ўсім будзе ясна, што і як трэба рабіць, то конкурс можа пачынацца.
6. Калі групы згуляюць усе 10 раўндаў, папрасіце суддзяў-сакратароў падлічыць агульныя балы іх груп і адзначыць самыя высокія і самыя нізкія індывідуальныя паказчыкі. Затым пераходзьце да аналізу і абмяркуйце, як прайшла гульня і што новага даведаліся ўдзельнікі, спачатку ў малых групах, а затым у агульнай.

## Аналіз і ацэнка

Папрасіце ўдзельнікаў малых груп разгледзець наступныя пытанні:

- Хто атрымаў найбольшую колькасць балаў? Як вам удалося перамагчы?
- Хто атрымаў найменшую колькасць балаў? Як вы сябе адчуваеце?
- Хто-небудзь адчувае сябе падманутым? Чаму?
- Ці заключалі вы якія-небудзь пагадненні перад раўндамі 5, 8 і 10? Што гэта былі за пагадненні?
- Хто-небудзь парушыў пагадненне? Чаму?

Затым пераходзьце да агульнага абмеркавання:

- Папрасіце суддзяў-сакратароў абвясціць самы высокі і самы нізкі індывідуальны паказчык і агульную колькасць балаў, якія набрала група. Запішыце гэтыя лічбы на дошцы.
- Якая група набрала самую вялікую агульную колькасць балаў? Ці былі ў гэтай групе гульцы, якія супрацоўнічалі дзеля агульнай справы, ці, наадварот, падманвалі?
- Як гэта гульня суадносіцца з рэальнасцю? Прывядзіце канкрэтныя прыклады.
- Калі людзі згаджаюцца прыняць меры па абароне навакольнага асяроддзя, як мы можам пераканацца, што ўсе бакі на самай справе вядуць сумленную гульню?
- Ці ёсць сэнс у тым, каб адна група стала «самай экалагічнай» за кошт іншых?
- Адной з прычын таго, што палітыкам не ўдалося дасягнуць пагаднення па выкідах $CO_2$ на 15-й канферэнцыі бакоў (COP 15) у рамках Сусветнай кліматычнай канферэнцыі ў 2009 годзе, была адсутнасць адзінства наконт механізмаў праверкі. Ці атрымалася б у іх дамовіцца, калі б яны зрабілі «крок назад» і перанеслі сваю ўвагу з практычных дэталяў на тыя правы чалавека, якія пры гэтым парушаліся? Абмяркуйце гэта пытанне.
- Якія правы больш за ўсё звязаны са змяненнем клімату? Якія правы парушаюцца пры гэтым?
- Прымаючы да ўвагі, што бедныя краіны больш за іншых пакутуюць ад змены клімату, а багатыя краіны парадзілі гэту праблему, як вы думаеце, які шлях можна было б абраць у якасці сумленнага спосабу дасягнення справядлівасці?
- Існуючыя мадэлі змены клімату прадказваюць рост суровых пагодных з'яў, а гэта азначае, што мільёны людзей застануцца без прытулку. Як ваша краіна рэагуе на гэта?
- Ці зможа адукацыя ў галіне правоў чалавека адыграць станоўчую ролю ў барацьбе са змяненнем клімату? Калі так, то якім чынам?

COP 15 – скарачэнне назвы 15-й канферэнцыі бакоў, якая стала часткай Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату (РКЗК ААН). Яе таксама называюць Канферэнцыяй ААН па змяненні клімату 2009 года.

## Парады для фасілітатараў

Вынік гульні пакажа, што тыя групы, дзе гульцы супрацоўнічалі, атрымалі больш высокія балы, у той час як тыя групы, дзе хтосьці звярнуўся да падману, атрымалі больш нізкія агульныя ацэнкі; іншымі словамі, атрымліваецца, што чалавек можа рабіць нешта вельмі добра для сябе, але за кошт іншых. Сутнасць навучання ў гэтым выпадку заключаецца ў тым, каб паказаць, што, калі людзі супрацоўнічаюць, то яны ўсе разам маюць шанцы на выйгрыш.

Пры абмеркаванні недахопаў добраахвотных пагадненняў і плюсаў і мінусаў урадавых дырэктыў і законаў вы можаце спытаць удзельнікаў, што яны думаюць пра інфармацыйныя кампаніі, якія ставяць мэтай заручыцца падтрымкай выбаршчыкаў для прыняцця мер, якія могуць быць непапулярнымі, але неабходнымі. Разгледзьце такі прыклад: некалькі гадоў таму група «Чыстая Брытанія» правяла кампанію «Мая маленькая абгортка ўжо нічога не зменіць». Была паказана вуліца, заваленая абгорткамі ад цукерак, многія з якіх мелі таблічкі з надпісамі «Я ўжо нічога не змяню». Што б вы падумалі, убачыўшы такі плакат?

- Калі я прыкладу намаганні і аднясу сваё смецце дадому, вуліцы стануць трохі чысцей, і гэта можа быць добрым прыкладам для іншых (гэты варыянт мог бы даць вынік «1 вялікі палец» і «3 простыя пальцы»).
- Калі некаторыя з нас зробяць гэта, толку ад гэтага будзе не вельмі многа, і зусім яго не будзе, калі іншыя людзі будуць пакідаць пасля сябе ўсё больш смецця («2 вялікія пальцы» і «2 простыя пальцы»).
- Калі мы зможам пераканаць большасць людзей клапаціцца аб чысціні вуліц, на вуліцах будзе чысцей. Але заўсёды знойдзецца хтосьці, хто будзе працягваць смеціць і ў той жа час атрымліваць асалоду ад чысціні вуліц, якой дабіліся іншыя людзі. Дык чаму яны павінны карыстацца «ільготным праездам»? («3 вялікія пальцы» і «1 просты палец»).
- Чаму я павінен нешта рабіць, калі ніхто іншы рабіць гэтага не будзе? («4 простыя пальцы»).

Добрым прыкладам можа быць і сітуацыя «Мой маленькі аўтамабіль нічога не зменіць» (калі гаворка ідзе аб скарачэнні выкідаў $CO_2$) або «Калі я буду сушыць сваю вопратку з дапамогай сушылкі, а не развешваць яе ў двары, гэта нічога не зменіць» (у справе эканоміі энергіі). Вам варта знайсці прыклад, які будзе лепш зразумелы вашай групе.

У многіх гарадах штрафуюць тых, хто кідае смецце на вуліцах і дазваляе сабакам забруджваць тратуары; добраахвотныя акцыі тут не працуюць. Неабходна нейкае ўрэгуляванне гэтай сферы. Адным з ключавых недахопаў Капенгагенскага пагаднення – выніку канферэнцыі COP 15 – стала менавіта тое, што не былі прадугледжаны строгія метады маніторынгу і верыфікацыі выкідаў $CO_2$.

## Прапановы па далейшай працы

Магчыма, група захоча разгледзець эфектыўнасць розных відаў санкцый і пакарання для тых, хто парушае правілы ў сям'і, школе, маладзёжнай групе або супольнасці. Якія найбольш эфектыўныя спосабы маглі б прымусіць людзей захоўваць правілы?

Падкажыце ўдзельнікам, што лепшым спосабам дасягнення высокіх паказчыкаў можа стаць загад «усім пагуляць на пальцах». У рэальнасці аналагам такога загаду маглі б стаць дырэктывы і распараджэнні ўрада, які б, напрыклад, загадаў усім перастаць вадзіць аўтамабіль (для зніжэння выкідаў $CO_2$) або глядзець тэлевізар не больш за адну гадзіну ў дзень (для эканоміі электраэнергіі), дазволіў бы купляць не больш за адну тэхналагічную прыладу, напрыклад мабільны тэлефон, музычны плэер або гульнявую кансоль, раз у тры гады (для эканоміі рэсурсаў) і прымусіў усіх стаць вегетарыянцамі (для больш эфектыўнага выкарыстання зямлі, зніжэння выкідаў $CO_2$ і $NO_x$ ад адходаў жывёлагадоўлі). Ці можа група прывесці прыклады заканадаўства, якія далі б такі ж эфект, як загад «пагуляць на пальцах»? (Правілы дарожнага руху маглі б стаць адным з такіх прыкладаў). Папрасіце групу разгледзець такое пытанне: а ці не вядзе прыняцце падобных мер да ўшчамлення правоў чалавека? Якіх канкрэтна і якім чынам?

Практыкаванне «Барацьба за багацце і ўладу» на старонцы 263 дае нам яшчэ адзін від мадэліравання сітуацыі, якая тычыцца несправядлівасці ў выніку няроўнага размеркавання рэсурсаў. Калі вы хочаце даследаваць раўнавагу ў прыродзе і тое, як мы яе парушаем, паспрабуйце выканаць практыкаванне «Сетка жыцця» на старонцы 320.

## Ідэі для дзеяння

Група магла б заняцца мясцовымі экалагічнымі праблемамі і, аб'яднаўшыся з іншымі, прымусіць мясцовых палітыкаў прыняць меры для іх вырашэння.

Калі ўдзельнікі цікавяцца пытаннямі міжнароднай палітыкі, яны, магчыма, захочуць даведацца, чаму не атрымалася дасягнуць пагаднення на COP 15 і што трэба зрабіць, каб садзейнічаць умацаванню даверу і ўзаемаразумення паміж народамі.

Неабходнасць прыняцця мер па змяненні клімату ў цяперашні час з'яўляецца для чалавецтва найбольш актуальнай задачай. Папрасіце групу падумаць пра тое, што кожны з іх можа зрабіць, каб паменшыць выкіды $CO_2$ асабіста, на мясцовым, нацыянальным і міжнародным узроўнях. Зыходным пунктам можа стаць www.footprintdiary.com – мабільная і сеткавая праграма, якая змяшчае інфармацыю аб наступствах змены клімату і дапамагае карыстальнікам карэкціраваць іх асабістае спажыванне.

## Дадатковая інфармацыя

Празрыстасць была галоўнай тэмай COP 15 да прыбыцця сусветных лідараў, якія прынялі ў ёй удзел у самым канцы. На папярэдніх сесіях быў узгоднены прынцып, у адпаведнасці з якім скарачэнне выкідаў у краінах, якія развіваюцца, падлягае «кантролю, справаздачы і праверкам», або, для сціслласці, КСП. Канцэпцыя КСП павінна быць непасрэдна прыменена да Нацыянальных планаў дзеянняў па змягчэнні наступстваў змянення клімату, якія краіны ў стадыі развіцця прымаюць на добраахвотнай аснове, таму зразумела зацікаўленасць у тым, каб краіны, якія з'яўляюцца лідарамі па аб'ёмах выкідаў сярод краін так званай «хуткай індустрыялізацыі», менавіта Кітай і Індыя, паставілі мэты і згадзіліся на прымяненне кантролю і праверак.

Незаключэнне пагаднення аб справядлівым маніторынгу ў гэтай сферы ілюструе складанасць такіх пытанняў, асабліва тых, што тычацца справядлівасці і роўнасці. Пярэчанне краін, якія развіваюцца, у прыватнасці, Кітая, складалася ў тым, што першапачатковая прапанова была вельмі несправядлівай, паколькі выкіды на душу насельніцтва ў іх краінах значна менш, чым у развітых, якія павінны ўзяць на сябе большыя абавязацельствы па скарачэнні выкідаў, бо менавіта на іх ляжыць вялікая частка віны за ўзнікненне праблемы.

Фонд экалагічнай справядлівасці бачыць прамую сувязь паміж неабходнасцю забеспячэння экалагічнай бяспекі і абаронай асноўных правоў чалавека (http://www.ejfoundation.org).

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**5 чэрвеня**
Дзень навакольнага асяроддзя

**Валанцёрская дзейнасць не дарэмная; лепш рабіць хоць нешта, чым не рабіць нічога, і ваш прыклад можа падштурхнуць іншых. На гэтай ідэі заснавана ініцыятыва «Ратавальнікі клімату» Сусветнага фонду дзікай прыроды, мэта якой складаецца ў тым, каб прымусіць кампаніі паменшыць аб'ём выкідаў $CO_2$.**
http://www.worldwildlife.org/climate/business.html

Гэта практыкаванне ўзята з публікацыі «Давайце возьмем свет у свае рукі», © Woodcraft Folk, 1993 год

## Раздатачныя матэрыялы

**Інструкцыя**

Мэта гульні складаецца ў тым, каб набраць як мага больш балаў.
Як праходзіць гульня:

- Калі суддзя-сакратар скажа «тры», выкіньце кулак наперад, паказваючы просты палец або вялікі палец уверх. У кожным раўндзе вы павінны выбраць адно з двух: выкінуць просты палец ці вялікі палец.
- Вы можаце размаўляць з іншымі ўдзельнікамі толькі ў трох выпадках: перад раўндамі нумар 5, 8 і 10.
- Вы павінны згуляць усе 10 раўндаў.

**Як лічыць балы**

Гэта залежыць ад таго, якую камбінацыю «простых пальцаў» і «вялікіх пальцаў» выкінуць удзельнікі.

- Калі кожны з 4 удзельнікаў выкідвае «вялікі палец», то кожны гулец атрымлівае +1 бал.
- Калі тры ўдзельнікі выкідваюць «вялікі палец», а адзін выкідвае «просты палец», то тыя, хто выкінуў «вялікі палец», атрымліваюць -1 бал, а той, хто выкінуў «просты палец», атрымлівае +3 балы.
- Калі два ўдзельнікі выкідваюць «вялікі палец», а два іншых «просты палец», то першыя два атрымліваюць -2 балы кожны, а два апошнія +2 балы кожны.
- Калі адзін удзельнік выкідвае «вялікі палец», а тры іншых «просты палец», то першы атрымлівае -3 балы, а тры іншых +1 бал кожны.
- Калі ўсе ўдзельнікі выкідваюць «просты палец», то кожны з іх атрымлівае -1 бал.

Гэтыя даныя запісваюцца ў табліцы ніжэй (камбінацыі простых (П) і вялікіх (В) пальцаў і адпаведныя ім балы, набраныя гульцамі):

| ВВВВ | ВВВП | ВВПП | ВППП | ПППП |
|---|---|---|---|---|
| +1+1+1+1 | -1-1-1+3 | -2-2+2+2 | -3+1+1+1 | -1-1-1-1 |

Раўнды 5, 8 і 10 з'яўляюцца бонуснымі раўндамі. Дадатковыя балы налічваюцца наступным чынам:
Раўнд 5: ваш лік за гэты раўнд памнажаецца на 3.
Раўнд 8: ваш лік за гэты раўнд памнажаецца на 5.
Раўнд 10: ваш лік за гэты раўнд памнажаецца на 10.
Пасля кожнага раўнда суддзя-сакратар запаўняе пратакол.

| Пратакол | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Імя гульца | | | | |
| Раўнд | | | | |
| 0 (трэніровачны раўнд) | | | | |
| 1 | | | | |
| 2 | | | | |
| 3 | | | | |
| 4 | | | | |
| 5 (балы памнажаюцца на 3) | | | | |
| 6 | | | | |
| 7 | | | | |
| 8 (балы памнажаюцца на 5) | | | | |
| 9 | | | | |
| 10 (балы памнажаюцца на 10) | | | | |
| Агульны лік (1–10 раўнд): | | | | |

# Улада кветак

*Усе заўтрашнія кветкі спяць у сённяшнім насенні.*

Індыйская прыказка

**Тэмы**
- агульныя правы чалавека,
- рэлігія і вера,
- дзеці.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** любы памер групы (малыя групы па 3–4 чалавекі)

**Час** 80 хвілін

**Агляд** Вынікам гэтага практыкавання будзе сцяна кветак, якія сімвалізуюць разнастайнасць групы. Гэта практыкаванне творчага характару прысвечана абмеркаванню правоў чалавека ў цэлым: што яны сабой уяўляюць, для чаго патрэбны і як мы павінны іх абараняць.

**Звязаныя правы**
- усе правы чалавека.

**Мэты**
- развіць разуменне ўзаемасувязі паміж патрэбамі чалавека, асабістым дабрабытам і правамі чалавека;
- развіць навыкі разважання і аналізу;
- умацаваць салідарнасць і павагу да разнастайнасці.

**Матэрыялы**
- вялікая пустая сцяна, на якой можна павесіць усе малюнкі;
- копіі раздатачнага матэрыялу, па адной на чалавека;
- аловак для кожнага ўдзельніка, гумкі, каляровыя маркеры – на групу;
- ліпкая стужка для замацавання малюнкаў на сцяне;
- фліпчарт і маркеры.

**Падрыхтоўка**
- зрабіць копіі старонкі з раздатачным матэрыялам, адну на кожнага чалавека.

## Інструкцыі

Растлумачце ўдзельнікам, што гэта практыкаванне будзе праходзіць у форме дыскусіі аб правах чалавека, але спачатку яны павінны падумаць пра тое, што значыць быць чалавекам.

**Частка 1. Высвятленне таго, што значыць быць паўнавартаснай асобай**

1. Растлумачце, што, для таго каб чалавек мог адчуваць сябе паўнавартаснай асобай, неабходна, каб задавальняліся пэўныя яго патрэбы. Напрыклад, для элементарнага выжывання нам патрэбны ежа і вада, сон і паветра. Нам таксама патрэбна бяспека: асабістая бяспека, фінансавая бяспека і добрае здароўе. Мы маем патрэбу ў любові і пачуцці прыналежнасці, і іх нам даюць сяброўства, адносіны з блізкімі людзьмі і сям'я. Мы таксама маем патрэбу ў павазе: нам хочацца адчуваць, што нас прымаюць і цэняць іншыя людзі, адчуваць, што мы можам цалкам рэалізаваць увесь свой патэнцыял.
2. Папрасіце кожнага ўдзельніка намаляваць кветку і адлюстраваць на ёй свае ўласныя патрэбы. Кветка павінна мець восем пялёсткаў:
   • асноўныя патрэбы;
   • асабістая бяспека;
   • фінансавая бяспека;
   • здароўе;
   • сяброўства;
   • сям'я;
   • павага;
   • самарэалізацыя асобы.

COMPASS

**Агульныя правы чалавека**

**Рэлігія і вера**

**Дзеці**

**Узровень 2**

**Любы памер групы (малыя групы па 3–4 чалавекі)**

**80 хвілін**

Памеры пялёсткаў павінны адпавядаць таму значэнню, якое кожная з васьмі патрэб мае ў цяперашні час у іх жыцці. Намалюйце на фліпчарце ўзор таго, як вы гэта сабе ўяўляеце, але падкрэсліце, што гэта толькі прыклад: ва ўсіх удзельнікаў кветкі будуць розныя.

3. Раздайце паперу, ручкі і каляровыя маркеры і папрасіце кожнага ўдзельніка намаляваць сваю асабістую кветку ў цэнтры аркуша, пакідаючы вакол пустое месца. Растлумачце, што не бывае правільных або няправільных, добрых ці дрэнных «варыянтаў»: кветка кожнага ўдзельніка будзе ўнікальнай. Скажыце, каб ніхто не падпісваў свой малюнак. Дайце дзесяць хвілін на выкананне гэтага задання.
4. Цяпер папрасіце ўдзельнікаў падумаць аб умовах, неабходных для таго, каб яны маглі «заквітнець» і стаць паўнавартаснымі асобамі. Папрасіце намаляваць вакол кветкі лісце, якое будзе прадстаўляць гэтыя ўмовы, і напісаць на лісці ключавыя словы. Дайце на гэта дзесяць хвілін.
5. У заключэнне папрасіце ўдзельнікаў прыклеіць свае малюнкі на сцяну, каб атрымалася выстаўка.

**Частка 2. Вызначэнне сувязі паміж чалавечымі патрэбамі і правамі чалавека**

6. Дайце ўдзельнікам час, каб яны разглядзелі кветкі. Затым папрасіце іх разбіцца на малыя групы па 3–4 чалавекі і дайце ім заданне абмеркаваць наступныя пытанні:
    - Ці ёсць сувязь паміж правамі чалавека і кветкамі з лісцем? Калі так, то якая?
    - У чым важнасць і значэнне правоў чалавека?
    - Што азначае асабіста для вас выраз «правы чалавека»?

Цяпер папрасіце кожную групу выказаць сваё меркаванне, а затым пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з кароткага агляду практыкавання, а затым пераходзьце да вынікаў абмеркавання ў малых групах і паспрабуйце высветліць, што новага ўдзельнікі даведаліся аб правах чалавека:

- Ці спадабалася вам гэта практыкаванне? Чаму?
- Ці цяжка было прыняць рашэнне аб памеры пялёсткаў? Ці ўсе з васьмі патрэб аднолькава важныя для паўнавартаснага жыцця?
- Ці існуюць іншыя патрэбы, якія не прадстаўлены на пялёстках і якія варта дадаць?
- Хто з удзельнікаў напісаў што-небудзь у цэнтры кветкі?
- Ці здзівілі вас якія-небудзь адрозненні і падабенствы паміж пялёсткамі розных людзей? Што гэта кажа вам пра людзей?
- Якія будуць наступствы для людзей, чые пялёсткі пашкоджаны?
- Што неабходна для абароны розных пялёсткаў? Што ўдзельнікі напісалі на лісці?
- Ці ёсць якая-небудзь сувязь паміж тым, што ўдзельнікі напісалі на лісці, і самой ідэяй правоў чалавека?
- Што новага вы даведаліся пра сябе як чалавека? Якое дачыненне гэта мае да правоў чалавека?
- Якія правы чалавека больш за ўсё патрэбны, каб мы расквітнелі і сталі паўнавартаснымі людзьмі (па месцы свайго жыхарства)?
- Ці з'яўляюцца некаторыя правы чалавека важнейшымі за іншыя? Для каго? Калі? Дзе?
- Чаму мы павінны быць гатовы абараняць і развіваць правы чалавека?
- Што мы можам зрабіць, каб лепш абараняць правы чалавека?
- Ці існуюць якія-небудзь патрэбы, якія не адлюстраваны ні ў адной з існуючых канвенцый аб правах чалавека?

## Парады для фасілітатараў

Кветка, адлюстраваная ніжэй, не больш чым прыклад. Важна падкрэсліць, што кожны ўдзельнік павінен вырашыць для сябе, які памер павінны мець розныя пялёсткі яго кветкі. Колер розных частак малюнка таксама выбірае сам удзельнік.

COMPASS

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**28 мая**
Еўрапейскі дзень добрасуседства

Вы не павінны завастраць увагу на цэнтры кветкі – няхай удзельнікі самі дадумаюцца да таго, што там, верагодна, трэба размясціць нешта важнае. Таксама дайце ім свабоду выбару ідэй для новых пялёсткаў – такіх, напрыклад, як культурная бяспека, свабода выбару ва ўсіх аспектах жыцця, справядлівасць размеркавання выгад, права на ўдзел, самаідэнтыфікацыю, рэлігію або веру. Дапамажыце ўдзельнікам усталяваць узаемасувязь паміж патрэбамі, выгадамі ад іх задавальнення, наступствамі іх незадавальнення і тым, як яны абаронены заканадаўствам аб правах чалавека і іншымі прававымі інструментамі.

Падчас працы над пунктам 4 вам, магчыма, варта даць удзельнікам некалькі падказак. Вы можаце адзначыць, што лісце забяспечвае – «сілкуе» – кветку сонечным святлом, вадой і двухвокісам вугляроду, і выказаць ідэю аб тым, што, напрыклад, фінансавая бяспека таксама забяспечваецца за кошт такіх рэчаў, як праца, банкаўская сістэма і прафсаюзы. Можна, вядома, дадаць права на працу, як гэта зроблена ў артыкуле 23 УДПЧ, але пажадана, каб удзельнікі самі ўсталявалі сувязі паміж правамі чалавека і іншымі з'явамі.

Вельмі важна ўсталяваць сувязь паміж патрэбамі чалавека і правамі чалавека і паказаць, што правы чалавека з'яўляюцца асновай свету, у якім задавальняюцца патрэбы кожнага чалавека. Вы маглі б абмеркаваць з групай прэамбулу да УДПЧ (гл. старонку 601). Яна пачынаецца з прызнання чалавечай годнасці, роўнасці і неад'емных правоў усіх членаў чалавечай сям'і ў якасці асновы свабоды, справядлівасці і міру ва ўсім свеце, а затым пераходзіць да апісання такіх высокіх памкненняў простых людзей, якімі з'яўляюцца свабода слова, веравання і свабода ад страху і галечы.

## Варыянты

Каб сэканоміць час, вы можаце выканаць пункты з 1-га па 4-ты і затым адразу пачаць агульную дыскусію аб правах чалавека з усёй групай. Гэта можа аказацца мэтазгодным у выпадку працы з маладымі людзьмі, якім, магчыма, цяжка даюцца практыкаванні на канцэптуальным узроўні. Не ўсе могуць зразумець ідэю выкарыстання пялёсткаў розных памераў для выражэння рознай ступені важнасці той ці іншай патрэбы, а некаторым пошук сувязей патрэб з правамі чалавека можа паказацца досыць абстрактным заняткам.

Вы можаце, наадварот, пашырыць практыкаванне, папрасіўшы ўдзельнікаў вызначыць, якія правы чалавека абараняюць тыя ці іншыя патрэбы, выяўленыя ў ходзе практыкавання. Выкарыстайце рэзюмэ УДПЧ на старонцы 600.

## Прапановы па далейшай працы

Вы можаце прапанаваць удзельнікам даследчы праект, які б дазволіў ім даведацца аб гістарычным развіцці правоў чалавека і вывучыць так званыя «новыя правы».

Калі ўдзельнікам спадабалася расказваць пра тое, што важна ў іх жыцці, то варта правесці практыкаванне «Вернікі» на старонцы 105, якое прысвечана перакананням. Акрамя таго, удзельнікі могуць скарыстацца практыкаваннем «Бінга» на тэму правоў!» (старонка 260), якое прапануе актыўныя метады даследавання ўзаемасувязей паміж паўсядзённым жыццём і правамі чалавека. Калі яны цікавяцца новымі правамі, то ім падыдзе практыкаванне «Пагуляем на пальцах!» на старонцы 173, дзе ідзе гаворка пра правы, звязаныя з навакольным асяроддзем.

## Ідэі для дзеяння

Прапануйце ўдзельнікам выканаць гэта практыкаванне, каб завязаць дыскусію аб правах чалавека з членамі іх сем'яў, сябрамі і калегамі.

## Дадатковая інфармацыя

Ідэя задавальнення патрэб чалавека як умовы развіцця паўнавартаснай асобы ўзята з работ Маслоу, а таксама Грыфіна і Цірэла «Чалавек як данасць» (Human Givens). Асноўнымі патрэбамі з'яўляюцца тыя, якія дазваляюць нашаму целу жыць; сексуальныя патрэбы таксама ўваходзяць у гэту катэгорыю.

Асабістая бяспека ўключае ў сябе наяўнасць жылля – дома, «даху над галавой», – а таксама неабходнасць адчуваць сябе ў бяспецы ад рабаўнікоў і бандытаў, ад вайны і тэрарыстычных актаў. Фінансавая бяспека азначае наяўнасць грошай на годны ўзровень жыцця, а таксама запасу на выпадак беспрацоўя. Здароўе азначае добрае здароўе, а таксама доступ да паслуг аховы здароўя, калі вы патрапіце ў аварыю або захварэеце. Сяброўства ўключае ў сябе магчымасць уступаць у клубы і аб'яднанні, а таксама магчымасць свабодна выбіраць сяброў і партнёраў для інтымных адносін. Сям'я значыць, што ніхто не можа гвалтоўна аддзяляць вас ад вашай сям'і. Павага значыць, што вас паважаюць і цэняць іншыя як за тое, хто вы ёсць, так і за тое, што вы робіце. Рэалізацыя патэнцыялу па-іншаму называецца «самарэалізацыяй»: яна прадугледжвае наяўнасць магчымасці стаць такім чалавекам, якім вы хочаце быць, рэалізаваць свае здольнасці ў поўнай меры і адчуваць упэўненасць у сабе на тым месцы, якое выпала вам у гэтым свеце.



# Першая паласа

*Самая сур'ёзная пагроза свабодзе – адсутнасць крытыкі.*

Воле Шайінка

**Тэмы**
- СМІ,
- глабалізацыя,
- навакольнае асяроддзе.

**Складанасць** узровень 3

**Памер групы** 10–24 чалавек (малыя групы па 4–8 чалавек)

**Час** 180 хвілін

**Агляд** Гэта практыкаванне ўяўляе сабой сімуляцыю, у якой група журналістаў рыхтуе першую паласу газеты, якая вось-вось пойдзе ў друк. Працуючы ў малых групах, удзельнікі вывучаюць наступныя пытанні:
- прадузятасць, стэрэатыпы і аб'ектыўнасць у СМІ;
- вобразы і роля СМІ ў асвятленні правоў чалавека.

**Звязаныя правы**
- права на свабоду думкі, перакананняў і выказвання меркавання;
- свабода ад умяшання ў асабістае жыццё, сям’ю, жыллё і перапіску;
- права ўдзельнічаць у культурным жыцці супольнасці.

**Мэты**
- пашырыць уяўленне аб СМІ і іх падыходзе да пытанняў правоў чалавека;
- развіць навыкі зносін і супрацоўніцтва;
- выхаваць пачуццё адказнасці і імкненне да сацыяльных пераўтварэнняў.

**Матэрыялы**
- вялікае памяшканне, у якім дастаткова месца для працы дзвюх-трох груп і правядзення агульнага пасяджэння;
- 40–45 фотаздымкаў з газет ці часопісаў;
- папера і ручкі для запісаў;
- вялікія аркушы (фармату А3) або папера для фліпчарта, маркеры;
- нажніцы і клей для кожнай малой групы;
- сталы, рабочай паверхні якіх дастаткова для таго, каб расласці на іх усе матэрыялы.

**Падрыхтоўка**
- выберыце 40–45 фотаздымкаў з часопісаў ці нацыянальных газет;
- улічвайце, што вам спатрэбіцца тры камплекты аднолькавых фатаграфій, па адным на кожную групу, таму прыйдзецца альбо купіць усе газеты, з якіх вы будзеце браць здымкі, у трох экзэмплярах, альбо скарыстацца ксераксам;
- раскладзіце адзін набор фатаграфій на стале.

## Інструкцыі

1. Азнаёмце ўдзельнікаў з практыкаваннем. Растлумачце, што яно ўяўляе сабой інсцэніроўку вечара ў рэдакцыі мясцовай газеты, дзе журналісты працуюць над першай паласой сваёй газеты. Хоць гэта і мясцовая газета, якая абслугоўвае жыхароў пэўнай акругі, яна паставіла сваёй задачай рэгулярна інфармаваць чытачоў пра падзеі ў свеце, у тым ліку і пра становішча ў галіне правоў чалавека.
2. Прадэманструйце ўдзельнікам першую паласу газеты, падкрэсліце асаблівасці і тыповыя элементы макета.

COMPASS

СМІ

Глабалізацыя

Навакольнае асяроддзе

Узровень 3

10–24 чалавек (малыя групы па 4–8 чалавек)

180 хвілін

3. Пакажыце ўдзельнікам фатаграфіі. Папрасіце іх моўчкі абысці стол з раскладзенымі на ім фатаграфіямі, устрымліваючыся ад каментарыяў. Растлумачце, што з гэтымі фатаграфіямі яны будуць працаваць; тады яны змогуць выкарыстоўваць і інтэрпрэтаваць іх па-свойму.
4. Падзяліце ўдзельнікаў на тры рабочыя групы па 6–8 чалавек. Кожная група – рэдакцыя, якая працуе над сваёй газетай. Яе задача – прадумаць і падрыхтаваць макет першай паласы выпуску, які выйдзе заўтра раніцай.
5. Папрасіце кожную групу прыдумаць назву для сваёй газеты.
6. Рэдкалегіі прыступаюць да працы. Раздайце кожнай групе паперу, клей, нажніцы, ручкі, але фатаграфіі пакуль не давайце.
7. Правядзіце інструктаж. Удзельнікі павінны распрацаваць макет першай паласы сваёй газеты.
8. Групам адводзіцца адна гадзіна на тое, каб выбраць чатыры ці пяць навін, якія яны хочуць асвятліць у газеце. Ім трэба падумаць аб тым, якое ўражанне акажа першая паласа. Можна не выкладаць навіну цалкам: дастаткова выбраць здымак, напісаць загаловак, аўтарскі радок і ўступ. Складаць поўны тэкст артыкулу не трэба, можна проста паказаць з дапамогай зафарбаванага прамавугольніка, якое месца ён зойме на паласе.
9. Прапануйце пачаць з абмеркавання тэм і пытанняў, якія яны хацелі б уключыць у свой матэрыял. Паведаміце ўдзельнікам, што праз дзесяць хвілін яны атрымаюць фатаграфіі з «аддзела друку».
10. Праз дзесяць хвілін працы раздайце групам камплекты фотаздымкаў, па адным на групу. Дайце ім 50 хвілін для завяршэння працы.
11. Праз гэты час прапануйце групам выкласці свае напрацоўкі так, каб усе маглі іх прачытаць. Затым пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з аналізу самога практыкавання, а затым пераходзьце да абмеркавання сродкаў масавай інфармацыі і праблем, звязаных з правамі чалавека і іх выкананнем.

- Як была арганізавана праца груп? Як працавалі ўдзельнікі: як адна каманда або займаліся рознымі «артыкуламі» паасобку ці ўдваіх-утраіх? Як яны прымалі рашэнні аб тым, як рабіць працу і якія тэмы асвятляць? Быў у іх лідар, або ўдзел у прыняцці рашэнняў прымалі ўсе? Ці ўсе адчувалі, што могуць унесці свой уклад у працу?
- Як адбіраліся тэмы або пытанні для першай паласы? Што было першасным: тэма або здымак? Як яны дзейнічалі: спачатку вызначалі тэму, а затым шукалі прыдатную ілюстрацыю да яе, ці наадварот, нейкі фотаздымак падказваў ідэю, на аснове якой ствараўся артыкул?
- Якія тэмы або пытанні былі прадстаўлены? Якое дачыненне яны маюць да правоў чалавека? Ці былі тэмы, якія камусьці хацелася асвятліць, але давялося адмовіцца? Па якой прычыне гэта здарылася?
- Што аб'ядноўвае першыя палосы розных газет? Ці выкарыстоўваліся ў іх аднолькавыя тэмы і фатаграфіі?
- Ці выкарыстоўваліся аднолькавыя фатаграфіі для ілюстрацыі розных тэм?
- Адкуль людзі даведваюцца пра навіны? З газет, тэлебачання, радыё або з Інтэрнэту? Чаму яны сочаць (ці не сочаць) за навінамі?
- Ці спрабавалі ўдзельнікі падрыхтаваць традыцыйную першую паласу або стварылі новы макет? Які найбольш дзейсны спосаб прыцягнуць увагу чытачоў?
- Якія навіны дамінуюць у СМІ ў рэальным жыцці?
- Ці добра асвятляецца ў навінах праблематыка правоў чалавека ў цэлым?
- Як часта навіны бываюць прадстаўлены як гісторыі аб правах чалавека?
- Адно з галоўных спрэчных пытанняў, якія тычацца СМІ, – гэта іх «аб'ектыўнасць». Ці магчыма ў прынцыпе, на думку ўдзельнікаў, аб'ектыўнае асвятленне навін? Ці пажадана гэта?
- Якія правы чалавека або парушэнні правоў чалавека адлюстраваны ў розных артыкулах?
- Ці спрабавалі ўдзельнікі ў сваіх артыкулах звязаць прычыны і вынікі, Поўнач і Поўдзень, развіццё і навакольнае асяроддзе, багатых і бедных і гэтак далей? Як гэтыя праблемы прадстаўлены ў сапраўдных СМІ?

- Як удзельнікі ўяўляюць сабе моладзь з іншых частак свету? З «бедных» краін? З «багатых» краін?
- Ці адсутнічалі ў камплектах фотаздымкаў нейкія важныя тэмы ці праблемы?

## Парады для фасілітатараў

Адбіраючы здымкі для практыкавання, старайцеся забяспечыць іх разнастайнасць і пазбягаць стэрэатыпаў. Звычайна навіны перанасычаныя паведамленнямі аб забойствах, войнах і іншых катастрофах і значна радзей змяшчаюць пазітыўную інфармацыю (у Афрыцы, напрыклад, адбываюцца не толькі вайна і голад!). Ваш набор фотаздымкаў павінен даць удзельнікам магчымасць праілюстраваць і «добрыя», і «дрэнныя» навіны. Здымкі павінны быць разнастайнымі ў плане ўзросту, полу, расы, культуры, геаграфічнага становішча і г. д. Улічвайце інтарэсы маладых людзей і ўключыце здымкі, звязаныя з апошнімі навінамі і папулярнымі асобамі. Магчыма, вы знойдзеце прыдатныя ідэі ў прыведзеным ніжэй спісе.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**3 мая**
Сусветны дзень свабоды друку

Тэлевядучая
Глобус
Група кінааператараў дзесьці ў краіне трэцяга свету
Хлопчык-чысцільшчык абутку з рэкламай фірмы Philips
Дзеці, якія кідаюць камяні
Жанчыны на будаўніцтве плаціны
Выплата дапамогі па беспрацоўі
Шахцёр-афрыканец
Бройлерныя куры
Чаму немаўляты паміраюць ад голаду, калі ежы хапае?
Пестыцыды
Рэклама рэстарана, якія гандлюе гамбургерамі
Лесапавал у джунглях
Выпаленая спёкай глеба
Дзеці гуляюць у вадзе
Ірыгацыя
Мыццё машыны

Нафта, якая гарыць
«Грынпіс» у дзеянні
Слуп дыму з завадской трубы
Рэклама Баціды
Цялежкі, поўныя кавы
Рэклама кока-колы
Прадавец на пляжы
Рынак у краіне трэцяга свету
Адзінокая жанчына
Трушчобы ў Бруселі
Трушчобы ў краіне трэцяга свету
Перапоўнены смеццевы бак
Сартаванне бляшанак
Халадзільнікі на сметніку
Негрыцянскі юнак з гітарай
Nintendo
Рок-зорка
Вулічныя дзеці
Мультыкультурная вечарынка

Мараканская дзяўчына
Дзяржаўная паліцыя
Графіці
Антырасісцкі канцэрт
Парламент
Наркотыкі
Вядомы палітык, напрыклад, прэзідэнт ЗША
Нельсан Мандэла
Сустрэча сусветных лідараў на міжнародным кліматычным саміце COP 15
Лагер бежанцаў
Бежанцы каля пасольства
Эрык Кантона
Дзеці ў цэнтры для асоб у пошуках прытулку
Футбаліст
Amnesty International у дзеянні
Дэманстрацыя на Філіпінах
Войскі ЗША ў Афганістане
Самалійскія піраты ў дзеянні

Самалёт F16 з бомбамі
Партызан
Два мёртвыя салдаты
Фермы, а не зброя
Гара мяшкоў з зернем
Продаж тавараў краін трэцяга свету
Жаночы мітынг
Планаванне сям'і
Прафілактыка СНІДу
Натоўп людзей
Грамадскі транспарт
Ваенны трыбунал
Выстаўка аўтамабіляў
Затор на вуліцы
Мерапрыемства веласіпедыстаў
Юнак з мікрафонам
Узлёт касмічнага карабля
Затоплены востраў у Ціхім акіяне.

Апісваючы практыкаванне, падкрэсліце асаблівасці і тыповыя элементы макета першай паласы: прыкметны загаловак, які прыцягвае ўвагу чытача, аўтарскі радок (напрыклад, «піша наш карэспандэнт па праблемах навакольнага асяроддзя Мухамад Шміт»). За імі ідзе ўступ, які раскрывае тэму артыкула, і асноўны тэкст. Абмяркуйце, як фотаздымкі выкарыстоўваюцца для ілюстрацыі гісторыі або для прыцягвання ўвагі чытача. Звярніце ўвагу і на тое, чаго на малюнках няма! Раскажыце, як абрэзваюць фатаграфіі, каб прыцягнуць увагу чытача да таго, што хоча паказаць фатограф ці рэдактар. Таксама звярніце ўвагу на тое, як пішуцца загалоўкі. Карысна прадэманстраваць макет першай паласы замежнай газеты: так прасцей адцягнуць увагу ад зместу і засяродзіцца на агульным уражанні.

Заахвочвайце творчы падыход да выбару ідэй і спосабаў іх падачы. Удзельнікі могуць пісаць, абрэзваць здымкі, маляваць карыкатуры. Тон іх газеты можа быць сур'ёзным, гумарыстычным або іранічным. У залежнасці ад групы вырашыце, ці варта абмеркаваць гэтыя моманты больш падрабязна або лепш проста дазволіць удзельнікам працаваць і паглядзець, што атрымаецца.

## Варыянты

У якасці варыянта гэтага практыкавання можна прапанаваць групам заняцца падрыхтоўкай выпуску навін для радыё або тэлебачання. Калі вы выбралі тэлевізійныя навіны, рэкамендуем праецыраваць выявы з камп'ютара ці слайд-праектара на экран у цёмным пакоі, каб стварыць адчуванне прагляду тэлеперадачы. Яшчэ адзін варыянт – стварэнне інтэрнэт-старонкі або блога.

## Прапановы па далейшай працы

Абмяркуйце аспекты правоў чалавека, абраныя групамі для сваіх навін. Напрыклад, якое становішча маюць гэтыя правы ў вашай краіне?

Удзельнікі могуць звязацца з мясцовай газетай, радыёстанцыяй або тэлеканалам і пагаварыць з журналістамі аб іх працы, абмеркаваць праблему аб'ектыўнасці і асвятлення глабальных праблем і пытанняў правоў чалавека ў СМІ.

Калі ўдзельнікаў зацікавілі фатаграфіі і тое, як прэса выкарыстоўвае іх (ці злоўжывае імі), магчыма, ім спадабаюцца такія практыкаванні, як «Частка карціны» і «Подпіс», апісаныя ў раздзеле «Іншыя гульні з відарысамі» ў канцы практыкавання «Гульні з відарысамі» на старонцы 249. Калі групе падабаюцца заданні, у якіх трэба хутка думаць, прапануйце ім практыкаванне «Хвіліначку!» на старонцы 199, прысвечанае сувязям паміж спортам і правамі чалавека.

Калі ж група хацела б расслабіцца, паслухаць музыку і пры гэтым даведацца нешта новае пра іншыя народы, культуры, музыку і мову, звярніцеся да практыкавання Knysna blue у навучальным пакеце «Усе розныя – усе роўныя».

## Ідэі для дзеяння

Многія мясцовыя радыёстанцыі даюць магчымасць розным групам мясцовага насельніцтва выпускаць свае перадачы. Падключыцеся да такога групавога праекта, збярыце матэрыял і падрыхтуйце перадачу па тэме, якая прадстаўляе цікавасць для аўдыторыі, напрыклад пад лозунгам «Думай глабальна – дзейнічай лакальна».

Зайдзіце на сайт www.newtimes.dk, каб даведацца, як бежанцы, якія жадаюць атрымаць прытулак у Даніі, выкарыстоўваюць СМІ. Вы можа захацець дапамагчы бежанцам у вашай краіне (або іншым меншасцям) арганізаваць нешта падобнае.

Для распаўсюджвання інфармацыі звярніцеся да мясцовых (радыёканалаў, газет) і міжнародных СМІ, уключаючы сацыяльныя сеткі (Hi5, Facebook, Twitter і блогі).

## Дадатковая інфармацыя

Гэта практыкаванне закранае наступныя праблемы:

**а) СМІ**

1. На маладых людзей, як і на дарослых, пастаянна навальваюцца горы разнастайнай інфармацыі з самых розных крыніц. Некаторыя людзі разумеюць гэта, а некаторыя – не. Можна спытаць у сябе: што мы робім з гэтымі звесткамі? Ці значыць гэта, што мы лепш інфармаваныя, або не абавязкова?
2. Камерцыялізацыя СМІ пастаянна ўзмацняецца; усё большую трывогу выклікаюць спрашчэнне сэнсу, ігра на стэрэатыпах і пагоня за сенсацыямі. Знайсці якасныя навіны становіцца ўсё цяжэй, ці не так?
3. Апошняе асабліва тычыцца навін аб праблемах няроўнасці, перш за ўсё ў дачыненні да краін, якія развіваюцца. Навіны «не з Захаду» часта падаюцца з заходняга пункту гледжання. У выніку навіны нярэдка аказваюцца негатыўнымі і сумнымі. Аднабаковае мысленне і негатыўны тон сталі нормай. Ці згодны вы з гэтым?

4. Рост папулярнасці Інтэрнэту прывёў да заняпаду журналістыкі. Ніл Генры, былы карэспандэнт Washington Post, а цяпер прафесар журналістыкі ў Каліфарнійскім універсітэце ў Берклі, кажа: «Я бачу свет, у якім пошукі ісціны ў інтарэсах грамадскасці перастаюць быць культурнай каштоўнасцю сярод усёй гэтай мітусні вакол тэхналогій; свет, у якім прафесійная журналістыка, якая кіруецца агульнапрынятымі этычнымі каштоўнасцямі, іграе ўсё меншую ролю ў нашай сістэме навін і інфармацыі, якая ўсё расце, бо мы збягаем у сетку ў пошуках апошняй «навінкі». І я не магу не баяцца будучыні, у якой прафесійных журналістаў стане яшчэ менш, у якой людзі, якія шукаюць навіны, будуць знаходзіць не навіны, а чарговыя тырады падвальных блогераў, фэйкавыя паведамленні пра навіны ад дзяржаўных чыноўнікаў і піяр, які ўмела распаўсюджваюць рэкламшчыкі, якія хочуць толькі прадаваць, прадаваць, прадаваць».
5. Дзякуючы блогерам і публікацыям у сацыяльных сетках, мы сталі значна бліжэй да таго, што адбываецца ў свеце. «Сырыя» матэрыялы валодаюць вялікай сілай уздзеяння; уявіце сабе рэакцыю людзей на артыкулы, аматарскія відэазапісы і паведамленні ў сацыяльных сетках, зробленыя ў месцах, дзе адбыліся землетрасенні і іншыя катастрофы, або ў зонах ваенных дзеянняў.
6. Інтэрнэт даў людзям ва ўсім свеце доступ да навін і інфармацыі з першых рук. Гэта значна ўскладніла цэнзуру.
7. Ці магчыма і пажадана аб'ектыўнасць? Ці можна пазбегнуць уплыву сваёй уласнай культуры? І ці не з'яўляецца выкладанне меркаванняў «абодвух бакоў» на самай справе разнавіднасцю інфармацыйнай прадузятасці? Напрыклад, нягледзячы на пастаянныя заявы Міжурадавай групы экспертаў па змене клімату (МГЭЗК) аб тым, што дзейнасць чалавека мае «значны» ўплыў на клімат у свеце і што глабальнае пацяпленне – гэта сур'ёзная праблема, якую трэба вырашаць неадкладна, знарочыстая непрадузятасць прэсы дала невялікай групе скептыкаў магчымасць шырока распаўсюдзіць свае погляды.

**b) Правы чалавека**

СМІ, безумоўна, іграюць важную ролю ў прыцягненні ўвагі грамадства да праблем правоў чалавека. Але мы павінны разумець, у якім выглядзе асвятляецца гэта тэматыка і чым гэта матывавана. Неабходна крытычна падыходзіць да таго, якія факты і інфармацыю нам прапануюць – ці не падаюць – і якім чынам. Напрыклад, адных і тых жа ўдзельнікаў ваенных дзеянняў у залежнасці ад сваіх палітычных прыхільнасцей адна газета назаве «змагарамі за свабоду», а другая – тэрарыстамі. Прадстаўнікі іншых культур могуць паказвацца неаб'ектыўна. Напрыклад, інуітаў могуць паказаць у якім-небудзь рэпартажы як самабытных, загартаваных холадам людзей, якія жывуць у іглу і вядуць барацьбу за захаванне свайго традыцыйнага ладу жыцця, але як толькі гаворка заходзіць пра кітабойны промысел, яны адразу становяцца «забойцамі кітоў».

**c) Адданасць справе**

Некалькі здымкаў, адабраных для практыкавання, павінны паказаць, што ў людзей, і ў першую чаргу ў моладзі, ёсць магчымасць узяцца за нейкую цалкам рэальную справу. Мы як выкладчыкі, маладзёжныя працаўнікі і г. д. хочам, каб у маладых людзей быў стымул працаваць у імя паляпшэння становішча ў свеце. Мы задаёмся пытаннем, як нам лепш за ўсё заахвоціць маладых людзей узяцца за справу, і можам сумнявацца ў тым, наколькі прывабнымі яны бачаць тыя магчымасці, якія зараз у іх маюцца. Нейкія адказы на гэтыя пытанні мы зможам атрымаць з тых слайдаў, якія выберуць для працы маладыя ўдзельнікі.

**Заўвага.**

Гэта практыкаванне распрацавана на аснове «Фабрыкі навін», якая была першапачаткова афармлена на нідэрландскай мове Робам Адрыянсенам і Грынвіцкай групай для NCOS, платформы для НГА па развіцці Фламандыі. Пазней Неле Хірс пераклала яе на англійскую мову і адаптавала для Еўрапейскай федэрацыі міжкультурнага навучання.

COMPASS

Гендар

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Грамадзянскасць і ўдзел

Узровень 2

Любы (малыя групы па 5–7 чалавек)

60 хвілін

# Гераіні і героі

*Яна – мой герой. А хто твой?*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • гендар,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць,<br>• грамадзянскасць і ўдзел. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | любы (малыя групы па 5–7 чалавек) |
| **Час** | 60 хвілін |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне ўключае індывідуальную працу, працу ў агульнай і малых групах, мазгавы штурм і дыскусію аб:<br>• гераінях і героях як сімвалах сацыялізацыі і культуры;<br>• укараненні гендарных стэрэатыпаў у нашай гісторыі, культуры і паўсядзённым жыцці. |
| **Звязаныя правы** | • права на роўнасць;<br>• свабода ад дыскрымінацыі;<br>• свабода перакананняў і выказвання меркавання. |
| **Мэты** | • вывучэнне прычын існавання розных пунктаў гледжання на гістарычныя падзеі;<br>• развіццё навыкаў крытычнага аналізу;<br>• развіццё цікаўнасці, непрадузятасці і справядлівасці. |
| **Матэрыялы** | • папера і ручкі (па адной сіняй і адной чырвонай ручцы на кожнага ўдзельніка – не абавязкова, але пажадана);<br>• папера для фліпчарта і маркеры. |

## Інструкцыі

1. Дайце ўдзельнікам 5 хвілін, каб яны ўзгадалі тых нацыянальных гераінь і герояў (гістарычных або сучасных), якія выклікаюць у іх асаблівае захапленне.
2. Раздайце паперу і ручкі і папрасіце кожнага ўдзельніка начарціць два слупкі. У першым трэба запісаць (чырвонай ручкай) імёны трох-чатырох гераінь з кароткім апісаннем таго, хто яны такія і што зрабілі для сваёй краіны. Унізе ўдзельнікі павінны напісаць ключавыя словы, якія апісваюць характарыстыкі, якія ў іх асацыюююцца з гераінямі ў цэлым.
3. Паўтарыце працэс (выкарыстоўваючы сінюю ручку) для трох-чатырох герояў. Запішыце гэту інфармацыю ў другі слупок.
4. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на малыя групы па 5–7 чалавек і расказаць адзін аднаму, каго яны выбралі сваімі гераінямі і героямі. Папрасіце групы выбраць чатырох самых дастойных гераінь і чатырох самых дастойных герояў.
5. Зараз пераходзьце да агульнага абмеркавання; запішыце прапанаваныя групамі спісы гераінь і герояў у два слупкі на фліпчарце. Унізе запішыце ключавыя словы, якія характарызуюць іх асабістыя якасці.
6. Абмяркуйце спісы асабістых якасцей і тое, як гераіні і героі становяцца прыкладамі для пераймання і ў якой ступені яны абумоўліваюць узнікненне гендарных стэрэатыпаў. Затым пераходзьце да аналізу.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з агляду практыкавання і спытайце ўдзельнікаў, што яны даведаліся пра герояў і гераінь. Затым пераходзьце да размовы пра стэрэатыпы ў цэлым і пра тое, як яны ўплываюць на ўяўленні і дзеянні людзей. Задайце ўдзельнікам наступныя пытанні:

- Што за людзі гэтыя гераіні і героі? (Звычайныя мужчыны і жанчыны? Каралі?) Што яны рабілі? (Змагаліся? Пісалі вершы?) Як удзельнікі даведаліся пра іх?
- У чым падабенства і ў чым адрозненні паміж двума спісамі адметных якасцей?
- Якія каштоўнасці адстойваюць гераіні і героі? Ці агульныя гэтыя каштоўнасці і для герояў, і для гераінь або паміж імі ёсць адрозненні?
- Што людзі разумеюць пад словам «стэрэатып»? Наколькі стэрэатыпы адпавядаюць рэчаіснасці? Ці заўсёды стэрэатыпы негатыўныя?
- Ці ёсць у вас асабіста і ў вашым грамадстве ў цэлым агульныя стэрэатыпы і ўяўленні пра мужчын і жанчын?
- Ці адчуваюць удзельнікі сябе звязанымі гэтымі чаканнямі? Якім чынам?
- Ці ўключае спіс асабістых якасцей, складзены ў ходзе практыкавання, рысы, якія некаторыя людзі ўспрымаюць як нацыянальныя асаблівасці?
- У якой меры сацыяльныя і культурныя бар'еры з'яўляюцца вынікам стэрэатыпнага мыслення?
- Якім чынам гендарныя стэрэатыпы пазбаўляюць людзей іх правоў?
- Якія дакументы і артыкулы ў галіне правоў чалавека абараняюць людзей ад дыскрымінацыі па гендарнай прыкмеце?
- Стэрэатыпныя чаканні часта становяцца перашкодай як для мужчын, так і для жанчын, абмяжоўваючы іх магчымасці і варыянты жыццёвага выбару. З якімі гендарнымі бар'ерамі сутыкаліся ўдзельнікі на ўласным вопыце? Дзе – дома, у школе, у клубе, на працы?
- Што ўдзельнікі могуць зрабіць для ліквідацыі гэтых бар'ераў? Ці могуць яны намеціць стратэгію, якая дазволіць адысці ад культурных нормаў і каштоўнасцей, звязаных з мужнасцю і жаноцкасцю?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**18 ліпеня**
Міжнародны дзень Нельсана Мандэлы

| Прыклад вынікаў, атрыманых у ходзе працы над пунктам 2 адной з груп ва Украіне | |
|---|---|
| **Гераіні** | **Героі** |
| Княгіня Вольга – першая хрысціянка ў Кіеўскай Русі. | Князь Уладзімір – хрысціцель Кіеўскай Русі (старая назва Украіны). |
| Маладая жанчына Раксалана была захоплена ў палон туркамі. Яна жыла ў гарэме хана і, карыстаючыся сваім становішчам, аказвала ўплыў на палітыку. | Гетман Мазепа – змагар за незалежнасць. |
| Паэтэса Леся Украінка пісала аб украінскім нацыянальным характары і эмансіпацыі жанчын. | Паэт Шаўчэнка ўслаўляў свабоду. |
| • моцная, хітрая, мяккая, жаноцкая, уплывовая, прыгожая | • моцны, магутны, адважны, храбры, нязломны, упарты |

## Парады для фасілітатараў

Словы «гераіня» і «герой» па-рознаму ўспрымаюцца ў розных супольнасцях. Памятайце пра гэта і паклапаціцеся пра тое, каб іх значэнне было вызначана правільна з самага пачатку. Магчыма, будзе карысным падкрэсліць, што гераіні і героі – гэта ўзоры для пераймання.

Падчас працы над пунктам 5 інструкцый вы павінны выслухаць усе меркаванні малых груп і запісаць іх на фліпчарце. Калі хто-небудзь з удзельнікаў прапануе такія паняцці як «жаноцкі» або «мужны», на гэтым этапе іх варта прыняць, але вярнуцца да іх падчас аналізу і абмеркаваць значэнні гэтых слоў.

У залежнасці ад мэтавай групы і кантэксту ўдзельнікам можа быць прасцей звязаць тэму з правамі чалавека, калі вы папросіце іх назваць гераінь і герояў барацьбы за правы чалавека (праваабаронцаў, актывістаў, людзей, якія, на іх думку, дамагліся пераўтварэнняў у сваёй краіне ці ў свеце). Затым можна абмеркаваць развіццё правоў чалавека, іх уплыў на мясцовае, рэгіянальнае і міжнароднае заканадаўства і розныя праблемы.

Гэта практыкаванне добра падыдзе для груп, якія адрозніваюцца культурнай разнастайнасцю, бо ў такіх групах культурны элемент становіцца больш прыкметным. Змяшайце групы і растлумачце ўдзельнікам, што гераіні і героі могуць быць з краіны іх пражывання або з краіны іх паходжання.

## Варыянты

Працуючы з больш маладымі групамі, вы можаце захацець выбраць іншыя тыпы гераінь і герояў, напрыклад персанажаў коміксаў і фільмаў, зорак поп-культуры, кіно ці спорту. Занятак можна пачаць з чытання коміксаў, а затым правесці мазгавы штурм, каб вызначыць характэрныя рысы іх персанажаў. Як варыянт, вы можаце развесіць плакаты з зоркамі эстрады і спорту і папрасіць удзельнікаў прыдумаць ім рэплікі і напісаць на плакатах або што-небудзь туды дамаляваць. Калі вы пагадзіцеся прымаць любыя адказы на пытанне «хто вашы гераіні і героі?» без якіх-небудзь абмежаванняў, вы даведаецеся шмат цікавага і нечаканага, што дапаможа правесці плённую дыскусію. Так, удзельнікі могуць назваць сваіх бацькоў, Юрыя Гагарына, Hello Kitty, Нельсана Мандэлу або Бетховена!

Папрасіце кожнага з удзельнікаў выбраць дзве асобы, якіх яны паважаюць, не ўдакладняючы, што трэба выбраць адну жанчыну і аднаго мужчыну. Падчас аналізу папрасіце іх падлічыць, каго больш у спісах: мужчын ці жанчын. Спытайце ўдзельнікаў, ці мае гэта нейкае значэнне.

## Прапановы па далейшай працы

Калі група захоча пазнаёміцца з гераінямі і героямі барацьбы за правы чалавека, правядзіце практыкаванне «Змагары за правы» на старонцы 167.

## Ідэі для дзеяння

Дайце асабістае абяцанне звяртаць больш увагі на выкарыстанне стэрэатыпаў у вашым паўсядзённым жыцці, асабліва тых, якія вядуць да прадузятасці як з боку іншых, так і (ненаўмысна!) з вашага боку.

Знайдзіце інфармацыю пра жанчын, якія ўнеслі ўклад у развіццё вашай краіны (ці свету, калі вы працуеце ў міжнароднай групе), але не атрымалі шырокую вядомасць. Арганізуйце выстаўку ў вашай школе або маладзёжным клубе. Можна таксама напісаць артыкул для мясцовай газеты або зняць кароткае відэа аб гэтых жанчынах і размясціць яго ў Інтэрнэце.

Арганізуйце свята, каб адзначыць Міжнародны жаночы дзень.

Падключыцеся да мясцовых, нацыянальных або міжнародных кампаній, звязаных з пытаннямі правоў жанчын, напрыклад з праблемамі роўнай платы за роўную працу, гандлю людзьмі ці роўнага доступу да адукацыі для дзяцей ва ўсім свеце.

## Дадатковая інфармацыя

**Крыніца:**
Праграма развіцця ААН (ПРААН). Гендар у праграме развіцця, навучальна-інфармацыйны пакет, асноўныя пункты праграмы і праекта прыцягнення грамадскай увагі да гендарных пытанняў. Студзень 2001 года

«Стэрэатып» – гэта занадта спрошчанае, абагульненае і часта неўсвядомленае меркаванне пра людзей або ідэі, якое можа прывесці да забабонаў і дыскрымінацыі. Гэта абагульненне, пры якім характэрныя рысы, уласцівыя нейкай частцы групы, распаўсюджваюцца на ўсю групу. Напрыклад, італьянцы любяць оперу, рускія любяць балет, маладыя людзі ў чорных скураных куртках на матацыклах – небяспечныя, а ўсе чарнаскурыя з Афрыкі. Прыпісванне мужчынам і жанчынам пэўных роляў ці чаканне ад іх пэўнага тыпу паводзін на падставе іх гендару называецца «гендарнай стэрэатыпізацыяй».

Словы «пол» і «гендар» могуць выклікаць блытаніну. «Пол» адносіцца да біялагічных адрозненняў паміж мужчынамі і жанчынамі, якія з'яўляюцца ўніверсальнымі і нязменнымі. Слова «гендар» апісвае сацыяльныя атрыбуты, якія чалавек набывае або засвойвае ў працэсе сацыялізацыі, будучы членам пэўнай супольнасці.

Такім чынам, гендар адносіцца да сацыяльна абумоўленых атрыбутаў, роляў, дзеянняў, абавязкаў і патрэб, звязаных з прадстаўленнем пра мужчыну (мужны) і жанчыну (жаноцкая) у пэўным грамадстве і ў пэўны час, а таксама пра члена нейкай супольнасці ўнутры гэтага грамадства.

COMPASS

# Колькі нам патрэбна?

*Людзі могуць дасягнуць агульнай мэты, ідучы featрознымі шляхамі.*

Амаду Ампатэ Ба

**Тэмы**
- вайна і тэрарызм,
- здароўе,
- адукацыя.

**Складанасць** узровень 3

**Памер групы** любы (малыя групы па 5–6 чалавек)

**Час** 60 хвілін

**Агляд** Гэта практыкаванне ўключае ў сябе абмеркаванне і прыняцце рашэнняў. Працуючы ў малых групах, удзельнікі вырашаюць, як яны пераразмяркуюць глабальны ваенны бюджэт на фінансаванне чатырох Мэт устойлівага развіцця (МУР).

**Звязаныя правы**
- права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць;
- права на развіццё;
- права на дастатковы ўзровень жыцця;
- права на ахову здароўя і адукацыю.

**Мэты**
- пашырыць веды аб Мэтах устойлівага развіцця;
- развіць навыкі рашэння праблем і крытычнае мысленне;
- культываваць салідарнасць і гатоўнасць да пошуку рашэнняў глабальных праблем.

**Матэрыялы**
- грошы «Компаса»; у вас павінны быць банкноты пазначаных ніжэй наміналаў (па адным камплекце на малую групу)
  8 x 100 у. а.
  15 x 50 у. а.
  20 x 10 у. а.
- карткі, якія адлюстроўваюць Мэты ўстойлівага развіцця (МУР) 2, 3, 4 і 6 (адзін камплект на малую групу);
- канверт (адзін на малую групу);
- фліпчарт і дзве ручкі рознага колеру;
- плакат з 17 Мэтамі ўстойлівага развіцця.

**Падрыхтоўка**
- зрабіце плакат з 17 МУР; павялічце дыяграму з МУР на старонцы XX з дапамогай ксеракса;
- зрабіце ксеракопіі лагатыпаў МУР 2, 3, 4 і 6, каб зрабіць карткі памерам прыкладна 10 x 10 см;
- раскладзіце грошы і карткі па канвертах.

Вайна і тэрарызм

Здароўе

Адукацыя

Узровень 3

Любы памер групы (малыя групы па 5–6 чалавек)

60 хвілін

## Інструкцыі

1. Растлумачце, што ў гэтым практыкаванні гаворка пойдзе пра тое, як свет можа знайсці грошы, каб вырашыць шэраг найбольш вострых сацыяльных і эканамічных праблем, якія стаяць перад намі сёння.
2. Спытайце ўдзельнікаў, што яны ведаюць пра Мэты ўстойлівага развіцця (МУР). Колькі з іх яны могуць пералічыць?
3. Пакажыце плакат і, калі трэба, коратка раскажыце пра МУР і прыхільнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый да іх.
4. Падзяліце ўдзельнікаў на групы па 5–6 чалавек і апішыце сюжэт: эканамісты ўпарта працуюць над тым, каб фінансаваць МУР, але грошай усё роўна не хапае. Зараз «вам», адной з многіх рабочых груп ААН, даручана ацаніць, ці дастаткова 1750 млрд долараў для пакрыцця штогадовага дэфіцыту (фінансавы разрыў) у рамках дадатковага фінансавання для дасягнення мэты 2 (адсутнасць голаду), мэты 3 (добрае здароўе), мэты 4 (якасная адукацыя) і мэты 6 (чыстая вада і санітарныя ўмовы).
   Для таго каб група лепш сабе ўяўляла, што значыць 1750 млрд долараў, скажыце ўдзельнікам, што глабальны ВУП у 2014 годзе склаў 77 000 млрд долараў; ВУП ЗША склаў 17 500 млрд долараў; Германіі – 3850 млрд долараў і Самалі – 5,7 млрд долараў.

Колькі нам патрэбна?

5. Раздайце канверты з карткамі з МУР і грашыма. Растлумачце, што 1 у. а. раўняецца 1 млрд долараў.
6. Папрасіце групы падумаць пра тое, што трэба зрабіць, каб выканаць кожную з чатырох МУР, і як лепш размеркаваць грошы, каб гарантаваць, што мэты будуць выкананы. Яны павінны пакласці грошы на картку кожнай мэты. Не трэба траціць усе грошы – ёсць яшчэ 13 МУР, якія таксама прыйдзецца фінансаваць дадаткова.
7. Цяпер папрасіце кожную групу па чарзе паведаміць аб тым, якія сумы яны выдзелілі на кожную МУР, і запішыце гэтыя лічбы на фліпчарце. Гэты этап не прадугледжвае ніякіх абмеркаванняў: тлумачэнне прычын прынятых рашэнняў лепш пакінуць на далейшае абмеркаванне.
8. Цяпер паведаміце ім сумы, якія, згодна з Інстытутам развіцця замежных краін (ODI), патрабуюцца для запаўнення дэфіцыту фінансавання ў год:
   - мэта 2 – адсутнасць голаду: 50 млрд долараў,
   - мэта 3 – добрае здароўе: 40 млрд долараў,
   - мэта 4 – якасць адукацыі: 40 млрд долараў і
   - мэта 6 – чыстая вада і санітарныя ўмовы: 30 млрд долараў.

Напішыце іх на фліпчарце ручкамі рознага колеру і папрасіце групы размеркаваць свае сродкі адпаведным чынам і падлічыць, колькі засталося.

9. Скажыце групе, што лічба 1750 млрд долараў была ўзята не з галавы: на самай справе гэта сума глабальных ваенных выдаткаў у 2014 годзе.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з кароткага агляду таго, як прайшло практыкаванне, а затым пераходзьце да размовы пра тое, чаму ўдзельнікі навучыліся.

- Як працавалі групы? Ці лёгка было дамовіцца наконт прыярытэтаў і сум? Як яны вырашалі любое рознагалоссе?
- Ці ёсць якія-небудзь каментарыі наконт неабходнага дадатковага фінансавання МУР 2, 3, 4 і 6? Ці аказалася сума ў 175 млрд долараў большай або меншай, чым думалі ўдзельнікі?
- Ці не думаеце вы, што мы павінны скараціць ваенныя выдаткі і выкарыстоўваць гэтыя грошы для пакрыцця дэфіцыту фінансавання МУР?
- Як наконт дадатковага фінансавання, якое патрабуецца для астатніх 13 мэт? Вы б патрацілі на іх 1580 млрд долараў, што ў вас засталіся?
- Бяспека, несумненна, вельмі важна. Якія асноўныя пагрозы стаяць сёння перад чалавекам на мясцовым і глабальным узроўні?
- Як лепш за ўсё патраціць 1776 млрд долараў, што трацяцца сёння на ваенныя патрэбы ва ўсім свеце?
- Якія правы чалавека маюць дачыненне да МУР 16 – мір і справядлівасць – і МУР 2, 3, 4 і 6?
- Што група можа зрабіць на мясцовым і нацыянальным узроўні ў мэтах садзейнічання МУР?

## Парады для фасілітатараў

МУР былі прыняты толькі ў 2015 годзе, і варта падкрэсліць, што даныя аб памеры разрыву ў фінансаванні (які патрабуе дадатковага фінансавання) з'яўляюцца прыкладнымі (odi.org). Звярніце ўвагу, што само практыкаванне было распрацавана ў 2016 годзе і на той час не было даступна ніякіх лічбаў, якія апісвалі б памер фінансавання, неабходнага для рэалізацыі астатніх МУР.

На кроку 4 інструкцый у якасці прыкладаў мы згадалі тры краіны: ЗША, таму што яна мае самы высокі ў свеце ВУП, Германію, таму што яна мае самы высокі ВУП у Еўропе, і Самалі, таму што яе ВУП – адзін з самых нізкіх у свеце, акрамя таго, краіна мае доўгую гісторыю вайны і гвалту. Зрабіць практыкаванне больш цікавым дапаможа ўключэнне даных па краінах, адкуль родам удзельнікі. Вы можаце знайсці адпаведную інфармацыю на сайце worldbank.org.

Не трэба чакаць, што ўдзельнікі зробяць рэалістычныя ацэнкі дадатковых патрэб у фінансаванні з невялікай колькасцю фонавых ведаў, якія ў іх маюцца. Папрасіце іх абапірацца на тое, што ім вядома, і адгадаць.

Усе лічбы, прыведзеныя ў практыкаванні, былі акруглены ў большы ці меншы бок па практычных прычынах, але яны па-ранейшаму блізкія да рэальнасці. Напрыклад, ваенны бюджэт у 2014 годзе, паводле Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследаванняў праблем міру (sipri.org), складаў 1776 млрд долараў. Што тычыцца неабходнасці дадатковага фінансавання МУР, то, паводле ODI.org, для мэт 2, 3, 4 і 6 сумы складаюць адпаведна 50,2, 37, 38 і 26,8 млрд долараў у год.

Сэнс таго, каб прасіць групы размеркаваць і пераразмеркаваць грошы, у тым, каб даць ім «фізічную карціну» і дапамагчы ўсвядоміць, як мала грошай, на самай справе, нам трэба.

Падчас аналізу вы можаце падкрэсліць, што агульная гадавая патрэба ў дадатковым фінансаванні для дасягнення МУР 2, 3, 4 і 6 складае 175 млрд долараў – толькі адна дзясятая частка гадавога глабальнага ваеннага бюджэту.

Пытанні, якія могуць паўстаць падчас дыскусіі пра бяспеку, уключаюць:

- Састарэлае ваеннае і абароннае мысленне не ўлічвае новыя пагрозы з якімі мы сутыкаемся сёння, такія як ВІЧ, вірусы Эбола і Зіка, транснацыянальная злачыннасць, кібертэрарызм, арганізаваная злачыннасць, тэрарызм і змяненне клімату.
- Мае месца значна больш грамадзянскіх войнаў, чым раней. Моцная нацыянальная абарона не гарантуе бяспеку.

- У Дакладзе ААН аб развіцці чалавецтва 1994 года пагрозы для бяспекі чалавека разглядаліся ў сямі раздзелах: палітыка, эканоміка, медыцына, харчаванне, экалогія, асабістая і грамадская бяспека. У многіх адносінах дасягненне МУР павысіць узровень нашай бяспекі.
- Дыскрымінацыя і парушэнні сацыяльна-эканамічных правоў з'яўляюцца асноўнымі прычынамі канфліктаў, абумоўліваюць глыбокую незадаволенасць і фарміруюць групавыя ідэнтычнасці, якія могуць пры пэўных абставінах прывесці да калектыўнага гвалту.
- Парушэнні грамадзянскіх і палітычных правоў часта становяцца прычынамі канфлікту. Адмову ў праве ўдзелу ў палітычным жыцці звязваюць з унутраным канфліктам.
- Парушэнне права на недатыкальнасць асобы, асабліва ў рэпрэсіўных рэжымах, прыводзіць да канфлікту;
- Краіны з поўнай дэмакратыяй перажываюць менш канфліктаў, чым краіны без дэмакратыі і традыцый павагі правоў чалавека.
- Назіранне з дапамогай беспілотных лятальных апаратаў, відэакамеры ў грамадскіх месцах, перахоп тэлефонных размоў і інтэрнэт-паведамленняў ажыццяўляюцца ў імя бяспекі. Наколькі неабходна такое назіранне і якія правы яно парушае, а якія – абараняе?

Сувязь паміж МУР 16 і правамі чалавека можна знайсці ў даведачнай інфармацыі па пытаннях міру і гвалту.

ВАЖНАЯ ДАТА

**20 снежня**
Міжнародны дзень салідарнасці людзей

## Варыянты

Вы можаце пераўтварыць практыкаванне ў ролевую гульню пра перагаворы з мэтай узгаднення бюджэтаў на вайсковыя патрэбы і МУР. Раздзяліце ўдзельнікаў на малыя групы і дайце ім ролі, напрыклад прадстаўнікоў урада, НГА, якая працуе з пытаннямі галечы, ВІЧ, адукацыі, генерала ад вайскоўцаў, прадстаўніка ваеннай прамысловасці, прадстаўніка рабочых на заводзе, дзе вырабляецца зброя, салдат і іншых зацікаўленых бакоў. Па кожнай ролі вам трэба будзе даць некаторыя рэкамендацыі, напрыклад:

- урад: ваша прыярытэтная задача – паляпшэнне якасці жыцця для сваіх грамадзян і ў той жа час падтрыманне бяспекі вашай краіны;
- НГА: для вас галоўнае – рэзка паменшыць ваенныя выдаткі і пакласці канец запазычанасці самых бедных краін;
- прадстаўнік ваеннай прамысловасці: ваша мэта – не страціць рынкі і грошы, але вы гатовы весці перагаворы;
- прадстаўнік прафсаюза працаўнікоў ваеннай прамысловасці: вы хочаце жыць лепш і пад мірным небам, але таксама баіцеся страціць свае працоўныя месцы.

## Прапановы па далейшай працы

Пачніце дыскусію аб тым, што магло б прывесці да павышэння глабальнай бяспекі; зрабіце наборы картак з 10 задачамі МУР 16 і папрасіце ў малых групах вызначыць іх прыярытэт з дапамогай ранжыравання ў форме ромба (інструкцыі па такім ранжыраванні можна знайсці на старонцы 65). Далей спытайце ўдзельнікаў пра іх меркаванне наконт таго, наколькі кожная з гэтых задач магла б садзейнічаць павышэнню глабальнай бяспекі; няхай абгрунтуюць свае адказы. З якімі правамі чалавека звязаны гэтыя задачы?

Папрасіце ўдзельнікаў параўнаць ВНП (валавы нацыянальны прадукт) і ІРЧП (індэкс развіцця чалавечага патэнцыялу) сваёй краіны (ці Еўропы ў цэлым) з краінай, якая развіваецца (ці з Афрыкай у цэлым), а затым даследаваць прычыны такой няроўнасці як раней, так і ў цяперашні час. Ці павінны багатыя краіны браць на сябе больш адказнасці за адсутнасць развіцця ў іншых месцах?

Вы таксама можаце папрасіць удзельнікаў даследаваць МРТ і высветліць, што іх краіна робіць для дасягнення гэтых мэт.

Практыкаванні «Доступ да лекаў», «Можна ўвайсці?» (тычыцца мігрантаў) або «Барацьба за багацце і ўладу» можна выкарыстаць, каб дапоўніць і паглыбіць веды ўдзельнікаў аб прычынах і наступствах беднасці і недастатковага развіцця.

## Ідэі для дзеяння

Праводзячы практыкаванне ў школе або ў рамках іншай падзеі, ператварыце яго ў віктарыну. Зрабіце сваю ўласную віктарыну або выкарыстайце адну з тых, што прадстаўлены ў Інтэрнэце, напрыклад на www.boombox.com або 17goals.org/quiz. Таксама можна адлюстраваць лагатыпы і спіс мэт на вялікім плакаце і папрасіць наведвальнікаў пракаменціраваць сваю рэакцыю.

Вы таксама можаце папрасіць удзельнікаў высветліць, як іх краіна плануе ажыццяўляць МУР. Калі вы лічыце, што ваш урад робіць недастаткова, вы маглі б напісаць члену парламента ад вашай мясцовасці. Даведайцеся, што адбываецца на еўрапейскім узроўні, і напішыце свайму члену Еўрапейскага парламента.

## Дадатковая інфармацыя

Мэты ўстойлівага развіцця былі ўзгоднены ў ААН у верасні 2015 года. Яны з'яўляюцца працягам Мэт развіцця тысячагоддзя (МРТ) і накіраваны (як вынікае з назвы) на забеспячэнне ўстойлівага развіцця для ўсіх да 2030 года; дасягненне міру і справядлівасці, свету без галечы і голаду, з якаснай адукацыяй для ўсіх – свету, у якім правы чалавека паважаюць і забяспечваюць для ўсіх. Замест 8 МРТ у цяперашні час існуе 17 МУР, якія адлюстроўваюць той факт, што пытанні развіцця чалавека з'яўляюцца складанымі і ўзаемазалежнымі.

Адным з самых важных адрозненняў паміж МРТ і МУР з'яўляецца разуменне той ролі, якую небяспека і гвалт іграюць у стрымліванні развіцця, а таксама ролі міру і стабільнасці ў яго падтрымцы.

## Колькі нам патрэбна?

МУР 16 – мір і справядлівасць – ставіць 10 задач:

16.1 Значна скараціць усе формы гвалту і звязаныя з ім паказчыкі смяротнасці ва ўсім свеце;

16.2 Пакласці канец неналежнаму абыходжанню, эксплуатацыі, гандлю людзьмі, катаванням і ўсім формам гвалту ў дачыненні да дзяцей;

16.3 Садзейнічаць вяршэнству права на нацыянальным і міжнародным узроўнях і забяспечыць роўны доступ да правасуддзя для ўсіх;

16.4 Да 2030 года значна скараціць незаконныя фінансавыя патокі і патокі зброі, садзейнічаць аднаўленню і вяртанню выкрадзеных актываў і змагацца з усімі формамі арганізаванай злачыннасці;

16.5 Істотна знізіць узровень карупцыі і хабарніцтва ва ўсіх іх формах;

16.6 Распрацаваць эфектыўныя, падсправаздачныя і празрыстыя інстытуты на ўсіх узроўнях;

16.7 Забяспечыць аператыўны, усеагульны, актыўны і прадстаўнічы працэс прыняцця рашэнняў на ўсіх узроўнях;

16.8 Пашырыць і ўмацаваць удзел краін, якія развіваюцца, у інстытутах глабальнага кіравання;

16.9 Да 2030 года забяспечыць прававую ідэнтычнасць для ўсіх, у тым ліку рэгістрацыю нараджэння;

16.10 Забяспечыць публічны доступ да інфармацыі і абараняць асноўныя свабоды ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі дагаворамі.

Наступныя дакументы змяшчаюць больш падрабязную інфармацыю:

- Альтэрнатыўныя выдаткі і праграма развіцця ААН, Міжнароднае бюро міру, www.IPB.org;
- Плата за прагрэс: як будуць фінансавацца прынятыя пасля 2015 года мэты ў новай сістэме аказання дапамогі? www.odi.org;
- Ці з'яўляюцца парушэнні правоў чалавека прычынай унутранага канфлікту? Оскар Н. Т. Томс і Джэймс Рон у 29 выпуску часопіса Human Rights Quarterly (2007 год);
- Фінансаванне ліквідацыі беднасці да 2030 года: інфаграфіка ад www.odi.org;
- Бяспека: аснова, якой не хапае ў Мэтах развіцця тысячагоддзя? www.odi.org.

**Карысная інфармацыя**
Даклады аб развіцці чалавецтва: http://hdr.undp.org/en/

Стакгольмскі міжнародны інстытут даследаванняў праблем міру (SIPRI): http://www.sipri.org/

Інстытут трэцяга свету: http://www.item.org.uy/eng/index.php

Больш падрабязную інфармацыю аб МРТ можна знайсці на: http://www.un.org/millenniumgoals

**Заўвага**. Значкі МРТ былі першапачаткова распрацаваны для кампаніі МРТ у Бразіліі

## Раздатачныя матэрыялы

- Беднасць – ліквідацыя беднасці ва ўсіх яе формах ва ўсім свеце
- Харчаванне – ліквідацыя голаду, дасягненне харчовай бяспекі і паляпшэнне харчавання, садзейнічанне ўстойліваму развіццю сельскай гаспадаркі
- Здароўе – забеспячэнне здаровага ладу жыцця і садзейнічанне дабрабыту ўсіх у любым узросце
- Адукацыя – забеспячэнне інклюзіўнай і справядлівай якаснай адукацыі і магчымасцей навучання на працягу ўсяго жыцця для ўсіх
- Жанчыны – дасягненне гендарнай роўнасці і пашырэнне правоў і магчымасцей усіх жанчын і дзяўчынак
- Вада – забеспячэнне даступнасці водных рэсурсаў і санітарных умоў для ўсіх, а таксама ўстойлівага кіравання імі
- Энергія – забеспячэнне доступу да недарагой, надзейнай, устойлівай і сучаснай энергіі для ўсіх
- Эканоміка – падтрымка ўстойлівага і інклюзіўнага эканамічнага росту, поўнай і прадукцыйнай занятасці і годнай працы для ўсіх
- Інфраструктура – стварэнне ўстойлівай інфраструктуры, садзейнічанне інклюзіўнай і ўстойлівай індустрыялізацыі, стымуляванне інавацый
- Няроўнасць – скарачэнне няроўнасці ўнутры краін і паміж імі
- Серада пражывання – пераўтварэнне гарадоў і населеных пунктаў у інклюзіўныя, бяспечныя, жыццяздольныя і ўстойлівыя
- Спажыванне – забеспячэнне ўстойлівых мадэляў вытворчасці і спажывання
- Клімат – прынясце тэрміновых мер па барацьбе са змяненнем клімату і яго наступствамі
- Марскія экасістэмы – захаванне і ўстойлівае выкарыстанне акіянаў, мораў і марскіх рэсурсаў для ўстойлівага развіцця;
- Экасістэмы – абарона, аднаўленне і садзейнічанне ўстойліваму выкарыстанню наземных экасістэм, устойлівае кіраванне лясамі, барацьба з апустыньваннем, а таксама спыненне дэградацыі зямель і іх аднаўленне, спыненне страты біяразнастайнасці
- Інстытуты – падтрымка развіцця мірных і інклюзіўных грамадстваў у інтарэсах устойлівага развіцця, забеспячэнне доступу да правасуддзя для ўсіх і стварэнне эфектыўных, падсправаздачных інстытутаў на ўсіх узроўнях
- Устойлівасць – умацаванне механізмаў ажыццяўлення і актывізацыі глабальнага партнёрства ў інтарэсах устойлівага развіцця

# Я хачу працаваць!

*У мяне ёсць патрэбныя навыкі!*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці,<br>• праца,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць. |
| **Складанасць** | узровень 3 |
| **Памер групы** | 20 чалавек |
| **Час** | 120 хвілін |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні выкарыстоўваецца ролевая гульня для вывучэння пытанняў, звязаных з правам на працу для асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. |
| **Звязаныя правы** | • права на працу;<br>• права не падвяргацца дыскрымінацыі;<br>• права на дастатковы ўзровень жыцця. |
| **Мэты** | • дабіцца разумення праблем людзей з інваліднасцю на працоўным месцы і ў грамадстве;<br>• развіць практычныя навыкі адстойвання сваіх правоў;<br>• развіць пачуццё адказнасці і ўсведамленне чалавечай годнасці. |
| **Матэрыялы** | • копіі ролевых картак;<br>• папера і алоўкі для назіральнікаў;<br>• невялікі стол і 2 крэслы для гульцоў, крэслы для назіральнікаў; |
| **Падрыхтоўка** | • размножце ролевыя карткі. |

COMPASS

Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці

Праца

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Узровень 3

20 чалавек

120 хвілін

## Інструкцыі

1. Спытайце ва ўдзельнікаў, што яны разумеюць пад выразам «права на працу». З дапамогай інфармацыі, якая даецца ў канцы практыкавання, растлумачце, што падпадае пад дзеянне законаў аб правах чалавека, не пераходзячы пры гэтым да абмеркавання праблем людзей з інваліднасцю.
2. Затым папрасіце ўдзельнікаў падумаць пра тое, з якімі цяжкасцямі могуць сутыкнуцца людзі з інваліднасцю пры ўладкаванні на працу. Растлумачце ў двух словах паняцце «разумнае прыстасаванне».
3. Растлумачце ўдзельнікам, што яны павінны будуць разыграць серыю інтэрв'ю пры прыёме на працу ў аддзел абслугоўвання кліентаў невялікай кампаніі. Кожны з кандыдатаў на вакансію мае інваліднасць. Выклічце пяць добраахвотнікаў на ролю працадаўца, які будзе праводзіць інтэрв'ю, і яшчэ пяць – на ролю кандыдатаў на вакансію.
4. Раздайце ролевыя карткі. Няхай кожны гулец выбера аднаго-двух сяброў, якія дапамогуць яму лепш падрыхтавацца да сваёй ролі. Дайце ім 10–15 хвілін на гэта.
5. Пастаўце стол і 2 крэслы ў цэнтры пакоя і папрасіце астатніх удзельнікаў заняць свае месцы ў якасці назіральнікаў. Папрасіце аднаго назіральніка выступіць у ролі суддзі-хронаметрыста.
6. Пачніце гульню. Папрасіце першага працадаўца запрасіць першага кандыдата. Інтэрв'ю павінна быць кароткім, не больш за 5 хвілін.
7. Запрасіце другога працадаўца заняць сваё месца за сталом і правесці інтэрв'ю з другім кандыдатам.
8. Па завяршэнні ўсіх інтэрв'ю папрасіце ўдзельнікаў выйсці з ролі і далучыцца да назіральнікаў для аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з пытанняў да кандыдатаў на вакансію:

- Як вы сябе адчувалі падчас сімуляцыі? Што вам спадабалася ці не спадабалася?
- Як вы лічыце, наколькі добра вы справіліся са сваёй роллю? Што было самым цяжкім?

Затым спытайце працадаўцаў:

- Як вы сябе адчувалі падчас сімуляцыі? Што вам спадабалася ці не спадабалася?
- Як вы лічыце, наколькі добра вы справіліся са сваёй роллю? Што было самым цяжкім?

Затым папрасіце выказацца назіральнікаў:

- Ці могуць такія сітуацыі адбыцца ў рэальным жыцці?
- Ці праявілі працадаўцы павагу да кандыдатаў і разуменне іх патрэб?

Затым пераходзіце да дыскусіі з удзелам усёй групы:

- Што вы можаце сказаць аб праве людзей з інваліднасцю на працу? Як вы думаеце, ці гарантавана іх права на працу на практыцы?
- Якія, на вашу думку, асноўныя прычыны высокага ўзроўню беспрацоўя сярод асоб з інваліднасцю? Хіба гэта справядліва?
- Хто, на вашу думку, павінен несці адказнасць за справядлівае стаўленне да людзей з інваліднасцю? Што вы думаеце пра ідэю «разумнага прыстасавання»?
- Ці ведаеце вы каго-небудзь, хто адчуў на сабе дыскрымінацыю – любога роду – пры прыёме на працу? А вам самім не даводзілася адчуваць што-небудзь падобнае?
- Што мы можам зрабіць, каб выкараніць адносіны дыскрымінацыі ў грамадстве?
- Якія правы чалавека варта ўлічваць пры разглядзе магчымасцей працаўладкавання асоб з інваліднасцю?

## Парады для фасілітатараў

Папрасіце ўдзельнікаў не пераігрываць, а весці сябе як мага бліжэй да рэальных паводзін людзей у падобнай сітуацыі. Гэта асабліва важна для выканаўцаў ролі працадаўцаў, якія могуць схіляцца да таго, каб іграць ролю «злыдня».

Члены групы, якія не ўдзельнічаюць у ролевай гульні, павінны моўчкі назіраць за тым, што адбываецца, і браць на заметку ўсе перыпетыі гульні і тыя недахопы ў выкананні роляў працадаўца ці кандыдата, якія кінуцца ім у вочы.

Паведаміце выканаўцам ролі кандыдатаў на вакансію, што ў картках прыводзяцца прыклады «разумнага прыстасавання» ўмоў працы да патрэб такіх кандыдатаў, на якое працадаўцам прыйдзецца пайсці ў імя справядлівага абыходжання з такой катэгорыяй працаўнікоў.

Вы можаце абмеркаваць дзеянні, да якіх людзі з інваліднасцю і маладыя працаўнікі маглі б звярнуцца, каб змяніць пазіцыю працадаўцаў. Абмяркуйце таксама, наколькі праўдзіва выканаўцы ролі працадаўцаў перадалі тыповае стаўленне да асоб з інваліднасцю.

У ходзе абмеркавання магчымых прычын высокага ўзроўню беспрацоўя сярод асоб з інваліднасцю вы маглі б прывесці некаторыя прыклады, такія як:

- адсутнасць ведаў аб патрэбах, звязаных з інваліднасцю, на працоўным месцы;
- адсутнасць ведаў пра тое, што можа рабіць чалавек з інваліднасцю;
- некваліфікаваная праца для людзей з інваліднасцю;
- наём на працу па «няправільных» прычынах (напрыклад, гэтага патрабуе закон або квоты, але без прыстасавання ўмоў працы да патрэб такіх людзей);
- страх перад новымі і адаптыўнымі тэхналогіямі;
- тэндэнцыя многіх асоб з інваліднасцю схаваць гэты факт.

Падкрэсліце як адказнасць працадаўцаў перад людзьмі з інваліднасцю, так і абавязак апошніх абараняць уласныя інтарэсы. Абмяркуйце, чаму людзі з інваліднасцю часта думаюць, што яны павінны хаваць гэты факт пры працаўладкаванні? Ці ведае хто-небудзь пра такія прыклады? Як гэтага пазбегнуць?

## Варыянты

Вы маглі б прапанаваць удзельнікам, каб яны загадзя, перад ролевай гульнёй, напісалі аб'яву аб найманні на працу, апісаўшы ў ёй саму працу і патрабаванні да кандыдатаў.

## Прапановы па далейшай працы

У залежнасці ад наяўнасці часу і ўзроўню інфармаванасці членаў групы аб праблемах асоб з інваліднасцю і пытаннях іх занятасці вы можаце папрасіць групу распрацаваць наступныя рэкамендацыі:

- як змяніць стаўленне працадаўцаў да людзей з інваліднасцю;
- падрыхтаваць праект кампаніі па праблемах адносін да права на працу і павышэнні інфармаванасці грамадства аб сумежных пытаннях.

Падзяліце ўдзельнікаў на малыя групы і дайце ім 30 хвілін на абмеркаванне і падрыхтоўку рэкамендацый і іх адлюстраванне на фліпчарце, а затым выдзеліце кожнай групе 5 хвілін на прэзентацыю.

Калі ўдзельнікам падабаюцца ролевыя гульні і яны хацелі б вывучыць пытанні, звязаныя з дыскрымінацыяй працуючых маці, то можна правесці практыкаванне «Праца і дзеці» на старонцы 335.

Яшчэ адно практыкаванне на тэму працы і занятасці – «Пасяджэнне прафсаюза» на старонцы 321. У ім мадэліруюцца перагаворы па пытаннях заработнай платы і ўмоў працы паміж працадаўцам і працаўнікамі з удзелам прадстаўнікоў прафсаюза.

Умовы працы для асоб з інваліднасцю палепшыліся пасля рашучага ўмяшання палітыкаў. Аказваецца, гэта сапраўды важна, за якіх палітыкаў вы галасуеце! Калі вы хочаце правесці даследаванне адносін людзей да грамадзянскага ўдзелу і ўдзелу ў выбарах, звярніцеся да практыкавання «Галасаваць ці не галасаваць?» на старонцы 306.

## Ідэі для дзеяння

Паспрабуйце высветліць, якія арганізацыі або кампаніі ў вашым раёне маюць палітыку, якая апісвае супрацоўніцтва з асобамі з інваліднасцю. Група магла б правесці даследаванне і высветліць, ці ведаюць у гэтых арганізацыях пра патрабаванні, якія змяшчаюцца ў Канвенцыі ААН аб правах людзей з інваліднасцю, і як яны выконваюць гэтыя патрабаванні.

## Дадатковая інфармацыя

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**7 кастрычніка**
Сусветны дзень дзеянняў за дастойную працу

**Факты і лічбы з Еўрапейскага форуму па праблемах асоб з інваліднасцю**

- У краінах Еўрапейскага саюза 65 мільёнаў чалавек – асобы з інваліднасцю.
- Сярод асоб з інваліднасцю беспрацоўных у два-тры разы больш, чым сярод тых, хто такімі не з'яўляецца.
- Толькі 16 % з тых, хто сутыкаецца з абмежаваннямі пры працаўладкаванні, атрымліваюць нейкую дапамогу.
- У многіх з іх ужо «адбілі жаданне працаваць», і яны нават не спрабуюць шукаць працу. Так яны трапляюць у катэгорыю так званага «неактыўнага насельніцтва».
- Чым вышэй ступень абмежавання магчымасцей канкрэтнага чалавека, тым менш у яго шанцаў на працаўладкаванне. Толькі 20 % людзей з цяжкай формай інваліднасці працуюць у параўнанні з 68 % тых, хто не мае інваліднасці.
- Па ўсёй Еўропе толькі 38 % людзей з інваліднасцю ва ўзросце ад 16 да 34 гадоў маюць працоўныя даходы ў параўнанні з 64 % тых, хто інваліднасці не мае. Даходы людзей з інваліднасцю значна ніжэй за даходы людзей без інваліднасці.

Крыніца: www.edf-feph.org

Я хачу працаваць!

Колькасць насельніцтва дзяржаў – членаў Савета Еўропы складае каля 800 млн чалавек, што азначае, што ў яго межах пражывае каля 80 мільёнаў людзей з інваліднасцю. Паводле ацэнак СААЗ, у сучасным свеце налічваецца больш за мільярд людзей з той ці іншай формай інваліднасці – каля 15 % ад агульнай колькасці насельніцтва Зямлі. Іх колькасць расце з-за войнаў і разбурэння, нездаровых умоў жыцця ці адсутнасці ведаў пра інваліднасць, яе прычыны, прафілактыку і лячэнне. Асабліва ўразлівымі сярод людзей з інваліднасцю з'яўляюцца жанчыны, дзеці, старыя, ахвяры катаванняў, бежанцы і перамешчаныя асобы, а таксама працаўнікі-мігранты. Напрыклад, жанчыны з інваліднасцю падвяргаюцца дыскрымінацыі як па гендарнай прыкмеце, так і на падставе інваліднасці.

**Права на працу**

*Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах*

Артыкул 6:

Дзяржавы – бакі гэтага Пакта прызнаюць права на працу, якое ўключае права кожнага чалавека на атрыманне магчымасці зарабляць сабе на жыццё працай, якую ён свабодна выбірае або на якую ён свабодна згаджаецца (…).

Артыкул 7:

Дзяржавы – бакі гэтага Пакта прызнаюць права кожнага на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы (…).

*Еўрапейская сацыяльная хартыя*

Частка I

Кожны павінен мець магчымасць зарабляць сабе на жыццё шляхам свабоднага выбару прафесіі і заняткаў.

Усе працаўнікі маюць права на справядлівыя ўмовы працы.

*Канвенцыя ААН аб правах людзей з інваліднасцю*

Гэты дагавор быў адкрыты для падпісання ў сакавіку 2007 года.

Артыкул 27:

1. Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць права людзей з інваліднасцю на працу нараўне з іншымі; яно ўключае права на атрыманне магчымасці зарабляць сабе на жыццё працай, якую ён свабодна выбраў або на якую ён свабодна пагадзіўся, ва ўмовах, калі рынак працы і вытворчае асяроддзе з'яўляюцца адкрытымі, інклюзіўнымі і даступнымі для людзей з інваліднасцю. Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць і заахвочваюць рэалізацыю права на працу, у тым ліку для асоб, якія атрымалі інваліднасць падчас працоўнай дзейнасці, шляхам прыняцця, у тым ліку ў заканадаўчым парадку, неабходных мер…

**«Разумнае прыстасаванне»**

«Разумнае прыстасаванне» азначае любое змяненне або ўнясенне мадыфікацый у працу, яе ўмовы або прынятыя спосабы яе выканання, якія дазваляюць асобам з інваліднасцю выконваць гэту працу або карыстацца выгадамі, даступнымі на гэтым працоўным месцы іншым асобам, нараўне з імі.

Больш падрабязная інфармацыя аб праблемах асоб з інваліднасцю і адукацыі ў галіне правоў чалавека даступна на сайце www.hrea.org

Напрыклад, невідушчая машыністка не можа карыстацца стандартным камп'ютарам і клавіятурай. Паняцце «разумнае прыстасаванне» былі распрацавана для таго, каб пераадольваць падобныя бар'еры. Калі некаторыя характарыстыкі працоўнага месца ставяць асобу з інваліднасцю ў нявыгадныя ўмовы ў параўнанні з людзьмі, якія не маюць такіх абмежаванняў, працадавец павінен прыняць меры для «карэкцыі» названых характарыстык працоўнага месца. У адпаведнасці з новай Канвенцыяй аб правах людзей з інваліднасцю працадаўцы будуць абавязаны прымяніць такое «разумнае прыстасаванне», а адмова будзе разглядацца як дыскрымінацыя.

**Раздатачныя матэрыялы**

Ролевыя карткі

**Кандыдат на вакансію 1**

Вы з'яўляецеся асобай з абмежаваннямі па слыху. Вы добра чытаеце па вуснах ва ўмовах дастатковага асвятлення. Вы заўсёды правяраеце, ці правільна вы разумееце, пра што ідзе гаворка, пытаючыся, напрыклад: «Ці правільна я зразумеў(-ла), што…?» Для вашай эфектыўнай працы ў кампаніі неабходна, каб зала пасяджэнняў была абсталявана прыладай для перадачы гуку непасрэдна на слыхавы апарат, а на вашым працоўным месцы былі тэлефон з узмацняльнікам гучнасці і светлавая сігналізацыя або тэлефон, які трансфармуе гукавое паведамленне ў тэкст.

Падумайце, аб чым вам трэба будзе папрасіць у ходзе інтэрв'ю і як вы будзеце гэта рабіць.

**Кандыдат на вакансію 2**

Вы глухі чалавек і для зносін з іншымі карыстаецеся мовай жэстаў. На інтэрв'ю вам патрабуецца суправаджэнне перакладчыка, а гэта азначае, што на яго правядзенне спатрэбіцца дадатковы час. Для зносін з кліентамі на вашым працоўным месцы вам спатрэбіцца тэлефон з функцыяй трансфармацыі гаворкі ў тэкставае паведамленне і (або) сэрвіс рэтрансляцыі тэксту (паслуга аператара, якая дазваляе людзям з абмежаваннямі слыху, зроку ці гаворкі тэлефанаваць карыстальнікам звычайных тэлефонаў з дапамогай клавіятуры або дапаможнай прылады).

Падумайце, аб чым вам трэба будзе папрасіць у ходзе інтэрв'ю і як вы будзеце гэта рабіць.

Заўвага: вам спатрэбіцца дапамога аднаго з удзельнікаў, які сыграе ролю вашага перакладчыка.

**Кандыдат на вакансію 3**

Вы сляпы чалавек, і вас павінен суправаджаць памочнік, чые падарожныя выдаткі (у тым ліку і на правядзенне інтэрв'ю) павінен аплаціць працадавец. На працоўным месцы вам спатрэбіцца камп'ютар са спецыяльнай клавіятурай і праграмным забеспячэннем, якое «агучвае» тэкст, які з'яўляецца на экране. Для перамяшчэння па горадзе вам спатрэбіцца сабака-павадыр. Вы ведаеце, што працадаўцы неахвотна бяруць такіх людзей на працу з-за высокага кошту і складанасці тэхнічнага абсталявання працоўнага месца.

Падумайце, аб чым вам трэба будзе папрасіць у ходзе інтэрв'ю і як вы будзеце гэта рабіць.

Заўвага: вам спатрэбіцца дапамога аднаго з удзельнікаў.

**Кандыдат на вакансію 4**

Вы ўжываеце інвалідны вазок. Ваша працоўнае месца павінна знаходзіцца ў будынку побач з паркоўкай, а ўсе пад'езды, ліфты, прыбіральні, офісы і месцы агульнага карыстання павінны быць даступны для інваліднага вазка. Гэта значыць, побач з лесвіцамі, якія вядуць да любога з названых месцаў, павінны быць прадугледжаны пандусы. Для вас спатрэбіцца таксама змяніць працоўнае месца разам з пісьмовым сталом, каб вы маглі працаваць, знаходзячыся ў вазку.

Падумайце, аб чым вам трэба будзе папрасіць у ходзе інтэрв'ю і як вы будзеце гэта рабіць.

**Кандыдат на вакансію 5**

Вы чалавек з дыслексіяй і падаяце заяву на працу, дзе пэўную колькасць часу трэба будзе траціць на чытанне і пісьмо. У вас выдатная кваліфікацыя для працы, уключаючы здольнасць вельмі добра чытаць і пісаць, але вам цяжка працаваць у шумным асяроддзі або стрэсавых сітуацыях і выконваць працу ў кароткія тэрміны. Вы просіце даць вам больш часу, каб выканаць тэст на напісанне пісьма, які ўваходзіць у выпрабаванне.

Падумайце, аб чым вам трэба будзе папрасіць у ходзе інтэрв'ю і як вы будзеце гэта рабіць.

Ролевыя карткі працадаўцаў

**Працадавец 1**

Вы будзеце праводзіць інтэрв'ю з чалавекам, якія мае абмежаванні па слыху. Размаўляйце з ім, амаль не адкрываючы рота, часта пазіраючы ўбок і седзячы ў дрэнна асветленым месцы, каб па вашых вуснах цяжка было нешта прачытаць. Гаварыце хутка і не хавайце ваша нецярпенне і нежаданне адказваць на пытанні ці слухаць тлумачэнні. Калі кандыдат папросіць вас нешта паўтарыць, рабіце гэта з відавочнай і перабольшанай неахвотай, ствараючы ўражанне, што кандыдат не настолькі разумны, каб зразумець вас з першага разу.

Прадумайце пытанні, якія вы маглі б задаць кандыдату на інтэрв'ю.

**Працадавец 2**

Вы будзеце праводзіць інтэрв'ю з абсалютна глухім чалавекам, і праходзіць яно будзе праз сурдаперакладчыка. У ходзе размовы накіроўвайце свае заўвагі перакладчыку, а не кандыдату. Рабіце выгляд, што вы кудысьці спяшаецеся і не хочаце марнаваць занадта шмат часу, чакаючы, пакуль ваша гаворка будзе перакладзена або пакуль кандыдат адкажа перакладчыку. Менавіта ў гэтыя моманты часта перапыняйце кандыдата. Вы наогул не разумееце, як глухі чалавек зможа мець зносіны з кліентамі, і думаеце, што тлумачэнне мовы жэстаў на інтэрв'ю з'яўляецца пустым марнаваннем часу. Вы таксама лічыце, што глухому чалавеку на працоўным месцы заўсёды будзе патрэбны сурдаперакладчык – хоць ён (яна) гэта адмаўляе, – а вы не хочаце лішняга чалавека ў офісе.

Прадумайце пытанні, якія вы маглі б задаць кандыдату на інтэрв'ю.

**Працадавец 3**

Вы будзеце праводзіць інтэрв'ю з абсалютна сляпым чалавекам і лічыце, што такія людзі наогул не падыходзяць для гэтай працы. Вы ўпэўнены, што тэхналагічнае аснашчэнне яго працоўнага месца будзе занадта дарагім і, у любым выпадку, не зможа кампенсаваць яго абмежаваныя магчымасці. Вы таксама сумняваецеся, што іншыя супрацоўнікі захочуць мець зносіны з такім калегай.

Прадумайце пытанні, якія вы маглі б задаць кандыдату на інтэрв'ю.

**Працадавец 4**

Вы будзеце праводзіць інтэрв'ю з чалавекам у інвалідным вазку. Ён будзе пытацца вас аб прыстасаванасці вашага будынка для інвалідных вазкоў, а ён як раз зусім для гэтага не прыстасаваны. Вам добра вядома, наколькі дорага зрабіць усе неабходныя змены, але вы будзеце імкнуцца не выкарыстоўваць гэта як прычыну адмовіць такому кандыдату, бо ведаеце, што незаконна дыскрымінаваць кандыдатаў толькі таму, што іх фізічныя магчымасці абмежаваны. Вы будзеце спрабаваць знайсці апраўданні і прычыны, каб адмовіць, хоць на самай справе ўпэўнены, што гэты кандыдат вельмі добра падыходзіць для гэтай працы.

Прадумайце пытанні, якія вы маглі б задаць кандыдату на інтэрв'ю.

**Працадавец 5**

Вы будзеце праводзіць інтэрв'ю з чалавекам з дыслексіяй, і вас раздражняюць яго дадатковыя патрабаванні. Усе кандыдаты прайшлі пісьмовы тэст, і вы не хочаце пагадзіцца з просьбай гэтага кандыдата даць яму больш часу на выкананне задання. Вы лічыце, што калі кандыдат не ў стане напісаць пісьмо ў адведзены час і ў тых жа ўмовах, што і ўсе астатнія, то яго не трэба браць на гэту працу.

Прадумайце пытанні, якія вы маглі б задаць кандыдату на інтэрв'ю.

# Хвіліначку

*Ці можаце вы гаварыць на працягу адной хвіліны без ваганняў і без паўтораў?*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • культура і спорт,<br>• глабалізацыя,<br>• агульныя правы чалавека. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | любы |
| **Час** | 40 хвілін |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі павінны хутка і вынаходліва гаварыць на працягу адной хвіліны аб адносінах паміж спортам і правамі чалавека. |
| **Звязаныя правы** | • усе правы чалавека. |
| **Мэты** | • зразумець, што правы чалавека ўзаемазвязаныя і непадзельныя;<br>• развіць крытычнае мысленне;<br>• развіць упэўненасць у сабе для выказвання ўласнага меркавання. |
| **Матэрыялы** | • сцверджанні, па адным на кожнага ўдзельніка;<br>• капялюш;<br>• гадзіннік з секунднай стрэлкай ці хранометр. |
| **Падрыхтоўка** | • скапіруйце прыведзены ніжэй спіс і разрэжце яго на асобныя сцверджанні;<br>• скруціце паперкі і пакладзіце іх у капялюш. |

Культура і спорт

Глабалізацыя

Агульныя правы чалавека

Узровень 2

Любы памер групы

40 хвілін

## Інструкцыі

1. Папрасіце ўдзельнікаў сесці ў круг.
2. Перадайце капялюш па крузе. Папрасіце ўсіх па чарзе, не гледзячы, выцягнуць з капелюша адну паперку.
3. Дайце ўдзельнікам 5 хвілін, каб падрыхтавацца да выступлення на працягу адной хвіліны без паўз па тэме, напісанай на выцягнутай паперы. Па правілах рабіць паўзы і паўтарацца не дазваляецца.
4. Па чарзе запрашайце ўдзельнікаў выступіць з «прамовай».
5. Пасля кожнай «прамовы» коратка абмяркуйце яе на працягу дзвюх-трох хвілін. Калі тэма выклікала актыўную дыскусію, пазначце яе для сябе і дамоўцеся з групай вярнуцца да яе абмеркавання ў канцы.
6. Пасля таго як усе выступяць, вярніцеся да тых абмеркаванняў, якія вам давялося перапыніць раней.
7. Затым пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з агляду пройдзенага практыкавання, затым абмяркуйце закранутыя пытанні і, нарэшце, іх сувязь з правамі чалавека.

- Ці цяжка было гаварыць на адну тэму на працягу цэлай хвіліны без перапынку?
- Якія тэмы былі найбольш складанымі і чаму?
- Якое з выказванняў аказалася самым спрэчным і чаму?
- Якая інфармацыя здзівіла ўдзельнікаў больш за ўсё?
- Якія правы чалавека знаходзіліся пад пагрозай у кожным са сцверджанняў?
- Ці з'яўляецца права на спорт правам чалавека? Калі так, як яно замацавана ў розных дакументах аб правах чалавека?
- Ці ўсе ў вашай супольнасці маюць доступ да заняткаў спортам, якія ім падабаецца? Калі не, то чаму? Што можна зрабіць, каб гэта выправіць?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**7 красавіка**
Сусветны дзень здароўя (СААЗ)

## Парады для фасілітатараў

Гэта практыкаванне мае некалькі ўзроўняў, і пытанні можна інтэрпрэтаваць па-рознаму. Важна, каб практыкаванне адпавядала ўзроўню маладых людзей, якія яго выконваюць. Вы можаце сказаць нешта неадназначнае, каб вымусіць усіх глыбока задумацца, але будзьце асцярожны: удзельнікі могуць падумаць, што вы чакаеце ад іх «правільнага адказу».

Калі вы лічыце, што прыведзеныя ніжэй сцверджанні могуць аказацца нецікавымі для вашай групы, падрыхтуйце замест іх іншыя. Калі ў вас вельмі вялікая група, правядзіце практыкаванне ў падгрупах.

Калі нехта сумняваецца ў сваіх аратарскіх здольнасцях, прапануйце ім паспрабаваць свае сілы, нягледзячы ні на што. Няхай яны выступаюць на працягу паўхвіліны ці нават 20 секунд, дайце ім магчымасць папярэдне перагаварыць з сябрамі або выступіць пазней. Тым не менш будзьце гатовы, што не ўсіх атрымаецца пераканаць.

Добрым пачаткам можа стаць гульня ў асацыяцыі, апісаная на старонцы 62. Падрыхтуйце карткі з такімі словамі, як «спорт», «інваліднасць» або «Алімпійскія гульні».

## Варыянты

У малой групе можна правесці два ці больш раўндаў. У кожным з іх удзельнікі выцягваюць па адной паперцы.

Яшчэ адзін варыянт гульні – пакласці карткі ў капялюш згодна з інструкцыямі і папрасіць каго-небудзь дастаць адно сцверджанне і прачытаць яго ўслых. Удзельнікі пачнуць абмяркоўваць прапанаваную тэму, але замест таго, каб гаварыць на працягу хвіліны, яны могуць спыніцца ў любы момант, і наступны чалавек павінен працягнуць, пачаўшы з апошняга слова, якое сказаў папярэдні гулец.

Гэту тэхніку выцягвання сцверджанняў з капелюша можна адаптаваць для любой тэмы, якую вы захочаце абмеркаваць.

## Прапановы па далейшай працы

Калі ўдзельнікі пажадаюць працягнуць абмеркаванне тэмы спорту і адчуваюць сябе бадзёра, вы можаце правесці практыкаванне «Спорт для ўсіх» на старонцы 281.

Калі нейкая тэма выклікала асаблівую цікавасць, звярніцеся да зместу дапаможніка, каб знайсці практыкаванне на гэту тэму.

Магчыма, групе спадабаецца гумарыстычны падыход да вывучэння правоў чалавека, тады можна пагуляць з малюнкамі Панчо ў главе 5 (гл. «Гульні з відарысамі» на старонцы 76), або яны могуць расказваць анекдоты (гл. «Конкурс еўражартаў» у навучальным пакеце «Усе розныя – усе роўныя»).

## Ідэі для дзеяння

Выберыце адно пытанне, з якім хочаце папрацаваць, і ўзгадніце вашы далейшыя дзеянні. Распрацуйце праект далейшай працы над гэтым пытаннем. Звяжыцеся з мясцовай арганізацыяй, якая працуе ў гэтым кірунку. Выкарыстайце гэты праект, каб паглыбіць веды ўдзельнікаў і дапамагчы ім прааналізаваць, якія навыкі працы ў групе і рэалізацыі ідэй на практыцы яны набылі.

## Дадатковая інфармацыя

http://www.athletesunitedforpeace.org.

**Заўвага**. Сцверджанні звязваюць спорт з кожнай з 20 тэм «Компаса». Гэта паказвае, наколькі правы чалавека ўзаемазвязаны і непадзельны.

## Раздатачныя матэрыялы

### Спіс сцверджанняў

**Спорт і агульныя правы чалавека**

Ці лічыце вы Эмануэля Адэбаёра годным паслом добрай волі ЮНЭЙДС?

**Спорт і агульныя правы чалавека**

Спартсмены міжнароднага ўзроўню павінны выконваць пэўны кодэкс паводзін. Тыя, хто парушаюць гэтыя правілы, напрыклад, выкарыстоўваючы спартыўныя мерапрыемствы для палітычных заяў, сутыкаюцца з дысцыплінарным пакараннем. Ці лічыце вы, што гэта парушае права чалавека на свабоду выказвання меркавання?

**Спорт і агульныя правы чалавека**

У паліцыі ёсць права не пускаць футбольных балельшчыкаў на матчы ў іншыя краіны, калі ёсць падазрэнні, што яны могуць стаць прычынай беспарадкаў на стадыёнах. Ці законна такім чынам пазбаўляць іх права свабоды перамяшчэння і ўступлення ў аб'яднанні?

**Спорт і агульныя правы чалавека**

Ці лічыце вы, што краіну для правядзення Алімпійскіх гульняў трэба выбіраць у адпаведнасці са становішчам з правамі чалавека ў ёй?

**Спорт і дзеці**

Што б вы сказалі амбіцыйным бацькам і трэнерам, якія прымушаюць дзяцей цэлымі днямі займацца спортам? Хто павінен мець права прымаць рашэнні пра здароўе дзіцяці і вызначаць, як яно будзе праводзіць вольны час?

**Спорт, грамадзянскасць і ўдзел**

Многія людзі нараджаюцца ў адной краіне, але потым пераязджаюць у іншую і мяняюць сваё грамадзянства. Нягледзячы ні на што, яны працягваюць падтрымліваць нацыянальную каманду роднай краіны, а не за каманду краіны, якая дала ім новы дом. Ці павінен добры грамадзянін быць прыхільнікам нацыянальнай каманды той краіны, у якой жыве?

**Спорт і культура**

Культуру можна апісаць як набор агульных поглядаў, каштоўнасцей, мэт і ўсталяваных практык, які характарызуе ўстанову, арганізацыю або групу. Ці з'яўляецца культурай «футбольная культура»?

**Спорт і дэмакратыя**

Ці лічыце вы, што палітыкі вашай краіны выкарыстоўваюць спорт або спартыўныя мерапрыемствы для таго, каб адцягнуць увагу людзей ад палітычных і эканамічных праблем?

**Спорт і інваліднасць**

У якой ступені Паралімпійскія гульні ламаюць стэрэатыпы аб людзях з інваліднасцю?

**Спорт, дыскрымінацыя і нецярпімасць**

Ці неабходна ўстанаўленне пола спартсменаў для забеспячэння сумленных спаборніцтваў або гэта сур'ёзны замах на чалавечую годнасць і права на прыватнасць?

**Спорт і навакольнае асяроддзе**

Палі для гольфа часта крытыкуюць за шкоду, якую яны прыносяць і людзям, і навакольнаму асяроддзю, бо іх нярэдка разбіваюць на зямлі, якую мясцовае насельніцтва раней выкарыстоўвала для сельскай гаспадаркі і лесаводства. Акрамя таго, падтрыманне іх у належным стане патрабуе шмат вады, гербіцыдаў і пестыцыдаў. Ці лічыце вы, што гольф такім чынам становіцца пытаннем правоў чалавека?

**Спорт і гендарныя пытанні**

Некаторыя сцвярджаюць, што сярод вядучых трэнераў і спартыўных адміністратараў вельмі мала жанчын па прычыне дыскрымінацыі. Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем? Калі так, то як гэта можна выправіць?

**Спорт і глабалізацыя**

Спартыўны абутак і шматлікі іншы спартыўны інвентар часта вырабляецца ў краінах Усходняй Еўропы і Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну з выкарыстаннем таннай працоўнай сілы. Рабочыя не хочуць губляць працу і не бастуюць. Што мы, спажыўцы, можам зрабіць, каб не мець дачынення да іх эксплуатацыі?

**Спорт і здароўе**

Што можна зрабіць на мясцовым узроўні ў барацьбе з выкарыстаннем забароненых прэпаратаў у спорце?

**Спорт і СМІ**

Ці лічыце вы, што нейкая адна тэлевізійная кампанія мае права куплі эксклюзіўнай трансляцыі спартыўнага мерапрыемства?

**Спорт і міграцыя**

Кажуць, што адзін з прасцейшых і важнейшых спосабаў інтэграцыі мігрантаў – спорт і спартыўныя заняткі. Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем? Чаму?

**Спорт, мір і гвалт**

У якой ступені спаборніцкі спорт спрыяе супрацоўніцтву і разуменню паміж людзьмі, а ў якой – узмацняе нацыяналізм і ксенафобію?

**Спорт і беднасць**

У многіх краінах спорт, асабліва футбол, дае людзям магчымасць выбрацца з беднасці. Ці варта ў такім выпадку бедным краінам надаваць футболу больш увагі?

**Спорт і беднасць**

Многія футбалісты ў Еўропе атрымліваюць велізарныя зарплаты. Ці апраўдана гэта і справядліва?

**Спорт, рэлігія і вера**

Многія спартыўныя клубы гуляюць у выхадныя. Ці з'яўляецца гэта дыскрымінацыяй у дачыненні да людзей, якія прысвячаюць суботы (Шабат) ці нядзелі для рэлігійных мэт?

**Спорт і гістарычная памяць**

Алімпійскі стадыён у Берліне быў прадметам асаблівай гордасці Гітлера на Алімпійскіх гульнях 1936 года, які нацысты выкарыстоўвалі для прапаганды. Такім чынам, для многіх людзей гэты будынак – сімвал фашызму. Цяпер стадыён адрамантаваны, хоць некаторыя прапаноўвалі знесці яго, а іншыя – пакінуць разбурацца, «як Калізей у Рыме». Што, на вашу думку, трэба зрабіць з гэтым будынкам?

**Спорт, вайна і тэрарызм**

«Сур'ёзны спорт не мае нічога агульнага з сумленнай гульнёй. Ён поўны нянавісці, зайздрасці, самахвальства, грэбавання любымі правіламі і садысцкага задавальнення ад сузірання гвалту; іншымі словамі, гэта вайна без стральбы». 1945 год, Джордж Оруэл. Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем?

**Спорт і праца**

Ці лічыце вы, што прафесіянальныя спартсмены павінны валодаць такімі ж правамі і абавязкамі, як і любы іншы працаўнік, напрыклад у плане працоўнага часу, выплаты падаткаў і права аб'ядноўвацца ў прафсаюзы?

# Моўны бар’ер

*Ці можаце вы адказаць на гэтыя пытанні? Ці прымуць у вас заяву аб атрыманні прытулку?*

| | |
|---|---|
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | любы |
| **Час** | 60 хвілін |
| **Тэмы** | • міграцыя,<br>• вайна і тэрарызм,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць. |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой мадэліраванне цяжкасцей, з якімі сутыкаюцца бежанцы падчас падачы заявы аб атрыманні прытулку. У ім закранаюцца наступныя пытанні:<br>• крушэнне надзей і эмацыянальны стан бежанцаў;<br>• пераадоленне моўнага бар'ера;<br>• дыскрымінацыя падчас падачы заявы. |
| **Звязаныя правы** | • права прасіць і атрымліваць прытулак;<br>• права не падвяргацца дыскрымінацыі на падставе этнічнай прыналежнасці або краіны паходжання;<br>• права лічыцца невінаватым, пакуль віна не даказана. |
| **Мэты** | • звярнуць увагу на факты дыскрымінацыі ў дачыненні да асоб у пошуках прытулку з боку пагранічных і іміграцыйных службаў;<br>• развіць навыкі міжкультурнай камунікацыі;<br>• выклікаць спачуванне да бежанцаў і асоб у пошуках прытулку. |
| **Матэрыялы** | • копіі бланка заявы аб атрыманні прытулку, па адной на кожнага ўдзельніка;<br>• ручкі, па адной на кожнага ўдзельніка. |
| **Падрыхтоўка** | • падрыхтуйце памяшканне такім чынам, як быццам гэта афіцыйны кабінет чыноўніка, які будзе сядзець за сталом. |

## Інструкцыі

1. Дазвольце ўдзельнікам увайсці ў ваш «кабінет», але ні з кім не вітайцеся і рабіце выгляд, што вы не заўважаеце іх прысутнасці. Нічога не кажыце пра тое, што будзе далей.
2. Пачакайце некалькі хвілін звыш прызначанага часу, а затым раздайце ўсім бланкі «Заявы аб атрыманні прытулку» і ручкі.
3. Скажыце, што ў іх ёсць пяць хвілін на запаўненне бланка, і больш – ні слова. Не звяртайце ўвагі на пытанні і пратэсты. Калі вам трэба нешта сказаць, гаварыце на замежнай (або прыдуманай) мове з выкарыстаннем жэстаў. Звядзіце камунікацыю да мінімуму. Памятайце, што праблемы бежанцаў вас не тычацца, вы наогул тут толькі для таго, каб раздаць бланкі, а потым сабраць іх зноў!
4. Коратка павітайце тых, хто спазніўся (напрыклад, фразай: «Вы спазніліся. Бярыце бланк і запаўняйце. У вас засталося ўсяго некалькі хвілін».).
5. Праз пяць хвілін збярыце бланкі, не ўсміхаючыся і ні з кім не ўступаючы ў асабісты кантакт.
6. Выберыце які-небудзь запоўнены бланк і выклікайце яго аўтара. Кіньце на бланк прыдзірлівы позірк і знайдзіце прычыну зрабіць заўвагу, напрыклад: «Тут няма адказу на 8-е пытанне» або «Бачу, на 6-е пытанне вы далі адмоўны адказ. Заява адкланяецца». Не ўступайце ні ў якія дыскусіі і адразу выклікайце наступнага.

**Міграцыя**

**Вайна і тэрарызм**

**Дыскрымінацыя і нецярпімасць**

**Узровень 2**

**Любы памер групы**

**60 хвілін**

7. Паўтарыце гэту працэдуру некалькі разоў. Разглядаць усе заявы не трэба, гуляйце ролю бюракрата да таго часу, пакуль усе не зразумеюць, у чым справа.
8. Вярніцеся да сваёй ролі фасілітатара і прапануйце ўдзельнікам абмеркаваць тое, што адбылося.

## Аналіз і ацэнка

Спытайце, якія пачуцці ўзніклі ва ўдзельнікаў падчас выканання практыкавання, а затым абмяркуйце тое, што адбылося, што новага яны даведаліся і якое дачыненне гэта мае да правоў чалавека.

- Што адчувалі ўдзельнікі падчас запаўнення незразумелай анкеты?
- Наколькі рэалістычнай была інсцэніроўка падачы заявы на атрыманне прытулку?
- Ці лічыце вы, што ў вашай краіне да асоб, якія просяць прытулку, ставяцца справядліва? Чаму так? Чаму не?
  - Якія наступствы чакаюць тых, каму адмоўлена ў прытулку?
- Ці даводзілася ўдзельнікам, не валодаючы мовай, сутыкацца са службовымі асобамі, напрыклад з паліцэйскім або кантралёрам? Як яны сябе пры гэтым адчувалі?
- Якія правы чалавека закранаюцца ў гэтым практыкаванні?
- Ці маюцца ў асоб, якія просяць прытулак, якія-небудзь магчымасці патрабаваць абароны ў выпадку парушэння іх правоў?
- Колькі асоб просяць прытулак у вашай краіне? Ці прымае ваша краіна справядлівую колькасць бежанцаў?
- Якія правы асоб у пошуках прытулку парушаюцца ў вашай краіне?

## Парады для фасілітатараў

Гэта практыкаванне не адрозніваецца складанасцю для фасілітатара: галоўнае, што патрабуецца ад вас, гэта праўдзіва сыграць ролю строгага і жорсткага бюракрата. Лёс бежанцаў вас не хвалюе – вы проста робіце сваю працу! Справа ў тым, што многія не хочуць прымаць бежанцаў у сваёй краіне. Іміграцыйныя службы маюць указанні адсейваць бежанцаў і дазваляць уезд толькі тым, у каго ў парадку дакументы, якія сведчаць іх асобу, і хто запоўніць анкету правільна. Бежанцы часта дрэнна ведаюць мову іншай краіны, і ім вельмі цяжка запаўняць бланкі. Акрамя таго, яны знаходзяцца ў разгубленым і ўзрушаным стане. Ім цяжка зразумець, што адбываецца, калі іх заявы адхіляюць, а яны не ведаюць толкам, у чым прычына.

Бланк «Заявы аб атрыманні прытулку» складзены на крэольскай мове. Крэольскія мовы ўзніклі ў выніку кантактаў паміж двума народамі, якія не маюць агульнай мовай. Напрыклад, крэольская ямайская – гэта своеасаблівая сумесь англійскай лексікі, дыялектнага вымаўлення і граматыкі моў Заходняй Афрыкі. Існуе некалькі крэольскіх моў, якія выкарыстоўваюцца, напрыклад, на Гаіці і ў Дамініканскай Рэспубліцы, а таксама на некаторых астравах Ціхага і Індыйскага акіянаў, такіх як Папуа – Новая Гвінея і Сейшэльскія Астравы. У гэтым практыкаванні крэольская мова выкарыстоўваецца таму, што мала хто з еўрапейцаў ведае яе. Калі ў вашай групе хтосьці размаўляе на гэтай мове, папрасіце яго ўзяць на сябе ролю супрацоўніка пагранічнай паліцыі або іміграцыйнай службы.

## Прапановы па далейшай працы

Вы можаце пазнаёміцца з аргументамі за і супраць уезду бежанцаў у краіну, звярнуўшыся да практыкавання «Можна ўвайсці?» на старонцы 115.

Многія асобы ў пошуках прытулку ў Еўропе сутыкаюцца з цяжкасцямі інтэграцыі з-за нізкага ўзроўню адукацыі ў іх родных краінах. Даведацца больш аб няроўнасці ўзроўню адукацыі ў свеце вы можаце з практыкавання «Адукацыя для ўсіх» на старонцы 158.

## Ідэі для дзеяння

Даведайцеся больш аб працэдурах разгляду заяў і аб тым, што на самай справе адбываецца ў вашай краіне, калі асоба ў пошуках прытулку даходзіць да граніцы. Дзе і калі гэтыя людзі запаўняюць першыя бланкі? Ці маюць яны права на перакладчыка з самага пачатку? Пашукайце інфармацыю на афіцыйным сайце вашага ўрада, запрасіце супрацоўніка іміграцыйнай службы, каб ён расказаў пра цяжкасці яго працы, і пагаварыце з тым, хто сам шукаў прытулак: як такія асобы бачаць сітуацыю, наколькі справядлівая, з іх пункту гледжання, сама сістэма, з якімі праблемамі яны сутыкаюцца, асабліва на этапе запаўнення бланкаў. Атрыманай інфармацыяй можна падзяліцца з іншымі бежанцамі ці накіраваць яе ў іміграцыйныя службы або такія арганізацыі, як УВКБ ААН і Amnesty International.

У асаблівай абароне маюць патрэбу дзеці, і ў першую чаргу тыя, хто шукае прытулак без суправаджэння бацькоў або дарослага блізкага члена сям'і. Высветліце, якія працэдуры існуюць для непаўналетніх без суправаджэння, і даведайцеся, ці можаце вы аказаць такім дзецям практычную дапамогу, напрыклад, выконваючы пераклад неабходных дакументаў або прапанаваўшы сябе ў якасці апекуна (гл. ніжэй).

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**21 лютага**
Міжнародны дзень роднай мовы

## Дадатковая інфармацыя

**Бежанцы**
Слова «бежанец» звычайна выкарыстоўваецца, калі гаворка ідзе пра чалавека, які пакідае сваю краіну ў пошуках бяспекі. Яно таксама мае больш дакладнае прававое значэнне: «бежанец» – гэта той, хто афіцыйна прызнаецца ў якасці чалавека, якому патрабуецца абарона ў адпаведнасці з Жэнеўскай канвенцыяй 1951 года. У сваю чаргу, «асоба ў пошуках прытулку» – гэта чалавек, які імкнецца стаць юрыдычна прызнаным бежанцам. Фармальныя азначэнні тэрмінаў прыводзяцца ў гласарыі, а больш поўную інфармацыю можна знайсці ў адпаведным раздзеле практыкавання «Можна ўвайсці?» на старонцы 115.

> Далей прыводзіцца інфармацыя, узятая з сайта Еўрапейскага савета па справах бежанцаў і выгнаннікаў www.ecre.org.
>
> Шанцы бежанцаў атрымаць абарону часта залежаць ад працэдур, якія выкарыстоўваюцца пры разглядзе спраў аб забеспячэнні прытулку. Нават самыя пераканаўчыя хадайніцтвы аб міжнароднай абароне могуць пацярпець няўдачу, калі яны разглядаюцца не ў поўным аб'ёме і прадузята. Пагранічныя і іміграцыйныя ўлады павінны разумець усю сур'ёзнасць іх абавязацельства прымаць асоб у пошуках прытулку, і самім такім асобам павінна быць даступна юрыдычная і кансультатыўная дапамога.
>
> 1 снежня 2005 года ўступіла ў сілу Дырэктыва аб працэдурах забеспячэння прытулку ў ЕС, якая ўстанаўлівае мінімальныя стандарты працэдур для дзяржаў-членаў, звязаныя з даваннем і адменай статусу бежанца. Гаворка ідзе аб такіх пытаннях, як доступ да працэдур (у тым ліку падчас перасячэння граніцы), утрыманне пад вартай, разгляд заяў, правядзенне індывідуальных інтэрв'ю і аказанне прававой дапамогі. Еўрапейскі савет па справах бежанцаў і выгнаннікаў прызнае, што Дырэктыва 2005 года «не змагла ўсталяваць стандарты, якія б гарантавалі поўны і справядлівы разгляд заяў аб забеспячэнні прытулку. [Застаюцца нявырашанымі] пытанні, якія тычацца … накладання санкцый на пагранічныя працэдуры, якія адступаюць ад прынцыпаў і гарантый самой Дырэктывы». Каб удасканаліць сістэму забеспячэння прытулку ў Еўропе, у 2009 годзе ў Дырэктыву былі ўнесены некаторыя змены.

Больш ідэй для практыкаванняў на тэму бежанцаў можна знайсці ў пакеце матэрыялаў брытанскага Чырвонага Крыжа. Наведайце сайт www.redcross.org.uk і знайдзіце там раздзел Positive Images.

**Дзеці ў пошуках прытулку**
Камісар Савета Еўропы па правах чалавека пісаў 20 красавіка 2010 года: «Мы абавязаны абараніць гэтых дзяцей (непаўналетніх без суправаджэння). Галоўнае – гэта тое, што яны маюць права на абарону. Першым крокам павінна стаць не аўтаматычнае рашэнне аб вяртанні, а больш хуткае прызначэнне апекуна, які будзе прадстаўляць інтарэсы дзіцяці. Гэта лепшая абарона як ад любых злоўжыванняў з боку гандляроў людзьмі, так і ад магчымай халатнасці ўлад у краіне знаходжання». Гл. http://commissioner.cws.coe.int

Гэта практыкаванне падрыхтавана на аснове матэрыялаў кнігі «Выдраныя з коранем» Д. Донах'ю і Н. Флаўэрса, выдавецтва Hunter House Publishers, 1995 год.

## Раздатачныя матэрыялы

**Бланк заявы аб забеспячэнні прытулкам**

| Заява аб атрыманні прытулку | |
|---|---|
| 1. Appellido | |
| 2. Primer nombre | |
| 3. Fecha de nacimiento | |
| 4. Pais, ciudad de residencia | |
| 5. Ou genyen fanmi ne etazini? | |
| 6. Kisa yo ye pou wou | |
| 7. Ki papye imagrasyon fanmi ou yo genyen isit? | |
| 8. Eske ou ansent? | |
| 9. Eske ou gen avoka? | |
| 10. Ou jam al nahoken jyman | |

# Пачуць голас кожнага

*Навучаць – значыць верыць у перамены.*

Паўлу Фрэйрэ

**Тэмы**
- адукацыя,
- грамадзянскасць і ўдзел,
- дзеці.

**Складанасць** узровень 3

**Памер групы** 8–50 (малыя групы па 6–8 чалавек)

**Час** 120 хвілін

**Агляд** Гэта практыкаванне ўяўляе сабой дыскусію для малых груп і на агульным пасяджэнні на наступныя тэмы:
- што такое адукацыя і наколькі яна адпавядае ці не адпавядае патрэбам людзей;
- удзел у працэсе прыняцця рашэнняў.

**Звязаныя правы**
- права на адукацыю, уключаючы права на адукацыю ў галіне правоў чалавека;
- свабода перакананняў і выказвання меркавання;
- права на ўдзел у кіраванні сваёй краінай.

**Мэты**
- задумацца над сістэмай адукацыі і тым, наколькі яна адпавядае патрэбам людзей;
- развіць навыкі сумеснай дзейнасці і ўдзелу ў працэсах дэмакратычнага прыняцця рашэнняў на ўзроўні школы і клуба;
- спрыяць справядлівасці і ўключэнню людзей у жыццё грамадства.

**Матэрыялы**
- 4 вялікіх аркушы паперы або паперы для фліпчарта і ручкі на кожную малую групу з чатырох чалавек;
- дадатковая папера для запісаў на выпадак неабходнасці.

**Падрыхтоўка**
- зрабіце копіі раздатачных матэрыялаў, па адным камплекце на кожную малую групу.

COMPASS

Адукацыя

Грамадзянскасць і ўдзел

Дзеці

Узровень 3

8–50 (малыя групы па 6–8 чалавек)

120 хвілін

## Інструкцыі

Гэта практыкаванне складаецца з дзвюх частак: частка 1 (35 хвілін) – абмеркаванне пытання аб тым, якому тыпу адукацыі аддаюць перавагу ўдзельнікі, і частка 2 (60 хвілін) – абмеркаванне таго, як распрацаваць дэмакратычныя сістэмы, якія дазволяць маладым людзям выказваць свае меркаванні адносна адукацыі, якую яны атрымліваюць.

**Частка 1**. Якую адукацыю мы атрымліваем і якую хацелі б атрымліваць?
(35 хвілін)

1. Пачніце з кароткага абмеркавання таго, што людзі маюць на ўвазе пад паняццем «адукацыя». Падкрэсліце, што адукацыя – гэта не толькі тое, што адбываецца ў школе або ВНУ. Растлумачце адрозненні паміж фармальнай, нефармальнай і інфармальнай адукацыяй. Удзельнікі павінны ведаць, што атрыманне адукацыі – гэта права чалавека (артыкул 26 УДПЧ).
2. З дапамогай мазгавога штурму вызначце ўсе станоўчыя і адмоўныя аспекты школьнай сістэмы адукацыі ў вашай краіне і запішыце ключавыя словы на фліпчарце.
3. Правядзіце кароткі агляд ключавых слоў і падумайце, чаму сістэма адукацыі такая, якая яна ёсць, прымаючы да ўвагі названыя пункты, напрыклад навучальны план, колькасць вучняў у класе, школьныя правілы, якія тычацца формы адзення, і пазашкольныя мерапрыемствы.
4. Папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на невялікія групы па 4–5 чалавек. Раздайце тэкст артыкула 28 Канвенцыі аб правах дзіцяці (КПД). Дайце групе 15 хвілін, каб вызначыць каштоўнасць іх права на адукацыю. Напрыклад, ці даступна пачатковая адукацыя для ўсіх у вашым грамадстве на бясплатнай аснове? Калі не, хто застаецца выключаным з адукацыйнага працэсу і чаму? Якія формы дысцыпліны існуюць і ці паважаюць яны чалавечую годнасць кожнага? Ці садзейнічае навучальны план развіццю асобы, талентаў і здольнасцей кожнага вучня? Якія прыярытэты стаяць перад адукацыяй, напрыклад падрыхтоўка добрага грамадзяніна або кваліфікаванай рабочай сілы? Ці ўключана ў навучальны план адукацыя ў галіне правоў чалавека?

5. Сабярыце малыя групы на агульнае пасяджэнне і папрасіце ўсіх удзельнікаў падзяліцца ўражаннямі аб працы.

**Частка 2.** Распрацоўка дэмакратычных сістэм, якія даюць людзям магчымасць выказаць сваё меркаванне. (60 хвілін)

1. Спытайце групу, хто прымае рашэнне адносна тыпу адукацыі, якую яны атрымліваюць?
2. Папрасіце ўдзельнікаў зноў разбіцца на малыя групы і прааналізаваць, як у іх школе прымаюцца рашэнні. Напрыклад, хто вырашае, якія прадметы будуць выкладацца ці якія пазашкольныя мерапрыемствы будуць праводзіцца. Як ажыццяўляецца кіраванне школай або ВНУ? Як прымаюцца рашэнні, звязаныя з бюджэтам і выдаткамі? Як распрацоўваецца і зацвярджаецца палітыка? Які ўплыў мае навучэнец?
3. Скажыце ўдзельнікам, што ў іх ёсць не толькі права на адукацыю; у адпаведнасці з артыкулам 12 Канвенцыі аб правах дзіцяці, «дзіця мае права выказваць сваё меркаванне па ўсіх пытаннях, якія яго тычацца, прычым поглядам дзіцяці надаецца належная ўвага».
4. Папрасіце кожную групу абмеркаваць усе станоўчыя і адмоўныя бакі наяўнасці дэмакратычна абранага органа, такога як вучнёўскі савет, для вырашэння пытанняў аб адукацыі на лакальным узроўні.
5. Наступны этап залежыць ад сітуацыі, у якой знаходзяцца ўдзельнікі. Калі ў вашай школе няма вучнёўскага савета, няхай групы абмяркуюць, якім яны хацелі б бачыць такі савет, якія ў яго былі б паўнамоцтвы і як яго можна заснаваць. Калі ў вашай школе або ВНУ ўжо існуе вучнёўскі савет, то ўдзельнікі могуць прааналізаваць яго працу і распрацаваць план яе паляпшэння. Растлумачце сутнасць SWOT-аналізу і дайце 30 хвілін на складанне адпаведнага плана дзеянняў на вялікім аркушы паперы для фліпчарта.
6. Збярыцеся на агульнае пасяджэнне і папрасіце групы паказаць вынікі сваёй працы.

## Аналіз і ацэнка

Многае ўжо прагучала падчас дыскусій на папярэдніх стадыях працы, тым не менш варта яшчэ раз абмеркаваць практыкаванне ў цэлым, даведацца, чаму навучыліся ўдзельнікі і што яны плануюць рабіць далей.

- Ці спадабалася ўдзельнікам практыкаванне? Ці было яно карысным? Чаму? Чаму не?
- Чаму склаліся менавіта такія механізмы прыняцця рашэнняў? На падставе якіх прэцэдэнтаў у мінулым? Ці выконвалі яны свае функцыі раней? Ці актуальны яны зараз? Калі не, то чаму?
- Чаму механізмы і працэдуры прыняцця рашэнняў неабходна рэгулярна пераглядаць?
- Як можн параўнаць планы дзеянняў розных груп?
- Наколькі яны затратныя ў плане часу, неабходных намаганняў і грошай?
- Наколькі яны рэалістычныя? (Помніце пра тое, што грандыёзныя планы – гэта добра, але да мэты трэба ісці паступова, крок за крокам!)
- «Дзіця мае права выказваць сваё меркаванне па ўсіх пытаннях, якія яго тычацца, прычым поглядам дзіцяці надаецца належная ўвага». Наколькі рэалістычнае гэта патрабаванне ў дачыненні да нацыянальнага навучальнага плана? Якім можа быць уклад моладзі?
- У якой ступені артыкул 12 выконваецца ў школе? Колькі часу трэба даць на «выказванне свайго меркавання»?
- Права на адукацыю некаторых груп, напрыклад цыганоў-рама, нярэдка парушаецца. Чаму гэта адбываецца, і якім чынам можна спрасціць для іх доступ да адукацыі?
- Якім чынам ваша школа забяспечвае адукацыю ў галіне правоў чалавека? Ці вывучаеце вы правы чалавека і розныя канвенцыі? Ці ёсць у вас магчымасць прыняць удзел у праектах, якія садзейнічаюць прасоўванні правоў чалавека ў вашай школе і супольнасці?

## Парады для фасілітатараў

У гэтым практыкаванні згадваюцца «вучнёўскія саветы» школ і ВНУ; няхай гэта не спыняе тых, хто працуе ў нефармальным асяроддзі. Практыкаванне аднолькава падыходзіць для членаў маладзёжных клубаў і аб’яднанняў, у якіх ёсць свой кіруючы орган, якую б назву ён не меў. Проста замяніце адпаведныя тэрміны.

Азнаёмцеся з артыкуламі 12 і 28 Канвенцыі аб правах дзіцяці (гл. старонку 605). Калі вы працуеце з маладымі людзьмі, якім ужо споўнілася 18 гадоў, спасылайцеся на права на адукацыю, абвешчанае ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (артыкул 26).

У раздзеле дадатковай інфармацыі па тэме адукацыі (www.coe.int/compass) вы знойдзеце агульную інфармацыю аб адукацыі і правах чалавека. Інфармацыю пра адрозненні паміж фармальнай, нефармальнай і інфармальнай адукацыяй вы знойдзеце на старонцы 30. SWOT-аналіз апісваецца і тлумачыцца ў раздзеле «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека» на старонцы 370.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**Тыдзень, на які выпадае 15 кастрычніка**
Еўрапейскі тыдзень мясцовай дэмакратыі

**Для чаго патрэбны школьны савет?**

Мэта школьнага (вучнёўскага) савета – даць навучэнцам магчымасць выказаць сваё меркаванне па школьных пытаннях, якія непасрэдна іх тычацца. Існуе мноства важкіх прычын для арганізацыі вучнёўскага савета і забеспячэння яго эфектыўнай працы. Тыя ж самыя аргументы прымяняюцца да рады або кіруючага камітэта маладзёжных арганізацый.

**Карысць для навучэнцаў**

Удзел у школьным савеце спрыяе адукацыйнаму ці асабістаму развіццю навучэнцаў, таму што:

- савет спрыяе навучанню грамадзянскасці, павышэнню палітычнай эфектыўнасці і дэмакратычных поглядаў;
- савет спрыяе павышэнню ўпэўненасці ў сабе і развіццю асабістых каштоўнасцей;
- навучэнцы атрымліваюць паўнамоцтвы, каб кідаць выклік уладам;
- моладзь вучыцца прымаць справядлівыя рашэнні і несці за іх адказнасць;
- навучэнцы больш даведваюцца пра жыццёвыя рэаліі, напрыклад, як працаваць у рамках абмежаванага бюджэту ці з адміністрацыяй, якая не адказвае на запыты.

**Прагматычная выгада**

- Дэмакратычны стыль кіравання больш эфектыўны, чым аўтарытарны, бо заахвочвае вучняў браць на сябе адказнасць.
- Саветы падтрымліваюць супрацоўніцтва, накіроўваюць энергію ў патрэбнае рэчышча і памяншаюць ізаляцыю.
- Саветы могуць палепшыць атмасферу ў школе: навучэнцы будуць больш давяраць настаўнікам, правілы будуць успрымацца як больш справядлівыя;
    - Якія б ні былі абмежаванні з-за знешняга сацыяльнага і палітычнага ціску, вучнёўскі савет – практычны спосаб паказаць навучэнцам добрасумленнасць калектыву навучальнай установы і прыхільнасць да пэўных каштоўнасцей.

## Прапановы па далейшай працы

Дайце групе глыбей развіць ідэі, якія нарадзіліся падчас працы над практыкаваннем, і паспрабаваць павялічыць важкасць меркавання моладзі ў прыняцці рашэнняў у навучальных установах або клубах з дапамогай некаторых парад, якія можна знайсці на старонцы 358 у раздзеле «Адукацыя» главы 5 раздзела «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека».

Калі групе спадабалася разважаць пра тое, якую адукацыю яна хацела б атрымліваць, можаце прапанаваць ёй настольную гульню «Аповесць пра два гарады» на старонцы 286, у якой разглядаюцца пытанні таго, у якім горадзе людзі хацелі б жыць. Калі ўдзельнікі хочуць даведацца больш пра агульнае стаўленне да галасавання, звярніце ўвагу на практыкаванне «Галасаваць ці не галасаваць» на старонцы 306.

## Ідэі для дзеяння

Удзельнікі могуць звязацца і абмяняцца інфармацыяй з іншымі школьнымі саветамі на мясцовым, нацыянальным або міжнародным узроўні.

## Дадатковая інфармацыя

Ступень удзелу моладзі ў працэсе прыняцця рашэнняў залежыць ад яе ўзросту і пытання, якое абмяркоўваецца. У якасці прыкладу выкарыстайце лесвіцу ўдзелу моладзі Роджэра Харта, якую можна знайсці на сайце www.freechild.org. Больш інфармацыі пра лесвіцу ўдзелу вы знойдзеце ў раздзеле «Грамадзянскасць і ўдзел» главы 5 на сайце www.coe.int/compass.

У многіх краінах пашыраюцца магчымасці прамога ўключэння ў працэсы прыняцця рашэнняў, напрыклад, шляхам партыцыпатарнага бюджэтавання – працэсу, у рамках якога ўдзел зацікаўленых бакоў непасрэдна адбіваецца на зменах у палітыцы або ў прыярытызацыі выдаткаў. Гэта не проста кансультацыя, а ўвасабленне прамой, заснаванай на абмеркаванні дэмакратыі: http://www.participatorybudgeting.org.uk. Прыкладам можа паслужыць праграма партыцыпатарнага бюджэтавання Udecide у Ньюкасле (Вялікабрытанія), у рамках якой у 2009 годзе ў навучэнцаў было 20 % галасоў у вырашэнні пытанняў набыцця паслуг для гарадскога Дзіцячага фонду з бюджэтам 2,25 млн фунтаў стэрлінгаў. Прызнаючы дзяцей і моладзь экспертамі, гэты праект паставіў сваёй мэтай даць рэальную магчымасць паўплываць на размеркаванне сродкаў Фонду тым навучэнцам горада, якія з найбольшай верагоднасцю атрымаюць ад гэтага выгаду.

Арганізацыйнае бюро прафсаюзаў еўрапейскіх вучняў (OBESSU) – еўрапейская парасоністая арганізацыя, якая аб'ядноўвае розныя аб’яднанні школьнікаў. Яе праца накіравана на:

- прадстаўніцтва поглядаў школьнікаў Еўропы ў розных адукацыйных установах і на розных платформах;
- падтрымку і паляпшэнне якасці і даступнасці адукацыі і адукацыйнай дэмакратыі ў Еўропе;
- паляпшэнне ўмоў для прасоўвання салідарнасці, супрацоўніцтва і разумення паміж навучэнцамі сярэдніх школ Еўропы;
- ліквідацыю дыскрымінацыі і несправядлівага стаўлення ў рамках адукацыйных сістэм у краінах Еўропы.

## Раздатачныя матэрыялы

**Канвенцыя аб правах дзіцяці,** артыкул 28:

Дзіця мае права на адукацыю. Дзяржавы павінны забяспечыць абавязковую пачатковую адукацыю, бясплатную і даступную для ўсіх, і садзейнічаць развіццю розных формаў сярэдняй адыкацыі, рабіць іх даступнымі кожнаму дзіцяці. Школьная дысцыпліна павінна падтрымлівацца з дапамогай метадаў, у аснове якіх ляжыць павага чалавечай годнасці дзіцяці. Адукацыя павінна быць накіравана на развіццё асобы, талентаў і здольнасцей дзіцяці, выхаванне павагі да правоў чалавека і асноўных свабод, падрыхтоўку дзіцяці да свядомага жыцця ў свабодным грамадстве ў духу міру, сяброўства, разумення, цярпімасці і роўнасці, выхаванне павагі да навакольнага асяроддзя.

# Пагаворым пра секс

*Пагаворым пра секс; пагаворым пра цябе і пра мяне.*[1]

| | |
|---|---|
| **Складанасць** | узровень 4 |
| **Памер групы** | 10–15 чалавек |
| **Час** | 60 хвілін |
| **Тэмы** | • гендарныя пытанні,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць,<br>• здароўе. |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні ўжываецца метад «акварыума» для аналізу адносін грамадства да сексуальнасці, уключаючы гамафобію. |
| **Звязаныя правы** | • права на роўнасць;<br>• свабода ад дыскрымінацыі;<br>• свабода выказвання меркавання і свабода аб'яднанняў. |
| **Мэты** | • пашырыць разуменне пытанняў і правоў, звязаных з сексуальнасцю і сексуальнай ідэнтычнасцю;<br>• развіць упэўненасць у сабе пры выказванні ўласнага меркавання аб разнастайнасці сексуальных пераваг;<br>• садзейнічаць развіццю талерантнасці і суперажывання ў дачыненні да людзей, непадобных да іншых. |
| **Матэрыялы** | • 3 крэслы;<br>• 2 фасілітатары (пажадана);<br>• дастаткова прасторнае памяшканне, каб удзельнікі маглі свабодна перамяшчацца;<br>• дошка або фліпчарт і маркеры;<br>• маленькія аркушы паперы і ручкі;<br>• капялюш. |
| **Падрыхтоўка** | • памятайце, што для многіх людзей, асабліва для моладзі, сексуальнасць – вельмі асабістае і далікатнае пытанне. Будзьце гатовы адаптаваць метадалогію або тэму, або і тое, і другое;<br>• вызначце некалькі вядомых асоб, якія адкрыта выказваюць сваю сексуальнасць, уключаючы гетэрасексуальных і гомасексуальных, бісексуальных і транссексуальных мужчын і жанчын. |

## Інструкцыі

1. Увядзіце ўдзельнікаў у кантэкст. Растлумачце, што, хоць многія і лічаць сексуальнасць асабістай справай, але права не падвяргацца дыскрымінацыі на падставе сексуальнай арыентацыі з'яўляецца асноўным правам чалавека, якое абараняецца заканадаўствам большасці еўрапейскіх краін. Гэта практыкаванне – магчымасць даследаваць стаўленне да сексуальнасці і, у прыватнасці, да гомасексуальнасці і гетэрасексізму. Для размінкі правядзіце мазгавы штурм і згадайце вядомых людзей, якія адкрыта заяўляюць аб сваёй сексуальнай арыентацыі.
2. Раздайце ўдзельнікам ручкі і паперу і папрасіце іх запісаць любыя пытанні аб гомасексуальнасці або сексуальнасці ў цэлым, пасля чаго паперкі з пытаннямі складзіце ў капялюш. Пытанні павінны быць ананімнымі.
3. Растлумачце, што сутнасць гэтага практыкавання заключаецца ў даследаванні адносін да сексуальнасці і, у прыватнасці, да гомасексуальнасці. Удзельнікі могуць свабодна выказваць як традыцыйныя, так і нестандартныя погляды, нават калі яны будуць спрэчнымі або супярэчыць нормам, прынятым у іх грамадстве. Яны могуць згаджацца ці не згаджацца з гэтымі поглядамі, не баючыся насмешак або асуджэння.

COMPASS

**Гендарныя пытанні**

**Дыскрымінацыя і нецярпімасць**

**Здароўе**

**Узровень 4**

**10–15**

**60 хвілін**

[1] адаптаваны радок з папулярнай песні амерыканскага хіп-хоп трыа Salt-n-Pepa (1991 год)

4. Пастаўце перад групай паўкругам тры крэслы. Яны прызначаны для трох удзельнікаў, якія знаходзяцца ў «акварыуме». Астатнія члены групы становяцца назіральнікамі.
5. Растлумачце, што для пачатку вы запросіце двух добраахвотнікаў далучыцца да вас для размовы ў «акварыуме». Калі ў нейкі момант да вас захоча далучыцца нехта яшчэ, ён можа гэта зрабіць, але, паколькі ў акварыуме ёсць месца толькі для трох рыбак, хто-небудзь з тых, хто займае крэслы, павінен саступіць яму месца. Каб папасці ў «акварыум», удзельнік павінен падысці да крэслаў і дакрануцца да пляча адной «рыбкі». Яны памяняюцца месцамі, і былая «рыбка» зойме месца сярод назіральнікаў.
6. Усе могуць выказаць сваё меркаванне, аднак можна таксама выказаць меркаванне, з якім удзельнік не згодны. Такім чынам будуць агучаны супярэчлівыя, «палітычна некарэктныя» ці неверагодныя пункты гледжання, і тэма будзе абмеркавана са мноства розных бакоў. Падкрэсліце, што агрэсіўныя і абразлівыя заўвагі ў адрас удзельнікаў групы не дапускаюцца.
7. Папрасіце добраахвотніка выцягнуць паперку з пытаннем з капелюша і прыступіць да яго абмеркавання. Абмеркаванне працягваецца да таго часу, пакуль тэма не будзе цалкам вычарпана і ўдзельнікі не пачнуць паўтарацца.
8. Затым запрасіце трох іншых добраахвотнікаў пачаць абмеркаванне новага пытання, прытрымліваючыся тых жа правілаў.
9. Абмяркуйце столькі пытанняў, колькі дазволіць час. Да пачатку аналізу і ацэнкі дайце ўдзельнікам кароткі перапынак, каб яны прыйшлі ў сябе пасля выхаду з «акварыума». Гэта асабліва важна пасля гарачай дыскусіі па спрэчных пытаннях.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з кароткага агляду таго, як удзельнікі адчувалі сябе, знаходзячыся ў «акварыуме» і за яго межамі. Затым абмяркуйце розныя пункты гледжання, якія прагучалі ў ходзе дыскусіі, і ўрэшце тое, што ўдзельнікі даведаліся ў працэсе:

- Ці здзівілі або шакіравалі каго-небудзь выказаныя меркаванні? Якія канкрэтна? Чаму?
- Наколькі прагрэсіўных поглядаў адносна сексуальнасці прытрымліваюцца людзі ў вашай краіне?
- Ці павінны юнакі і дзяўчаты адпавядаць пэўнай сексуальнай арыентацыі і ролі? Якой?
- Як успрымаюць (маладых) людзей, якія не адпавядаюць гэтым спадзяванням, і як да іх ставяцца?
- Ці з'яўляюцца некаторыя групы больш адкрытымі, чым іншыя? Чаму?
- Якія фактары ўплываюць на фарміраванне нашай сексуальнасці?
- На чым людзі засноўваюць свае маральныя ўяўленні аб сексуальнасці?
- Ці адрозніваюцца погляды ўдзельнікаў на сексуальнасць ад поглядаў іх бацькоў або дзядоў? Калі так, то чым? Чаму?
- Ці існуюць у вашай краіне законы, якія забараняюць сексуальныя адносіны паміж дарослымі па ўзаемнай згодзе? Калі так, то што менавіта забараняюць такія законы? Чаму яны існуюць? Ці лічыце вы іх разумнымі?
- Артыкул 16 УДПЧ абвяшчае: «Мужчыны і жанчыны, якія дасягнулі паўналецця, маюць права без усякіх абмежаванняў, незалежна ад расы, грамадзянства або рэлігіі, браць шлюб і засноўваць сям'ю». Чаму «сексуальная арыентацыя» не ўключана нароўні з «расай, грамадзянствам і рэлігіяй»? Ці трэба яе ўключыць?
- У некаторых краінах законы і націск з боку грамадства ўступаюць у канфлікт з правам чалавека на павагу і годнасць, на выбар партнёра, на свабоду заключэння шлюбу і г. д. Якім чынам можна вырашыць гэтыя супярэчнасці?

## Парады для фасілітатараў

Не забывайце аб сацыяльным кантэксце, у якім працуеце, і адаптуйце практыкаванне адпаведным чынам.

Мэта гэтага практыкавання заключаецца ў тым, каб даць удзельнікам магчымасць задумацца над уласнай сексуальнай арыентацыяй і грамадскімі нормамі, а таксама выхаваць у іх упэўненасць у выказванні ўласных поглядаў пры захаванні памяркоўнасці да тых, хто прытрымліваецца іншых пунктаў гледжання. Прыняцце таго ці іншага пункту гледжання, як і дасягненне кансэнсусу не з'яўляецца мэтай гэтага практыкавання.

Фасілітатару рэкамендуецца падрыхтавацца да правядзення практыкавання і прачытаць дадатковую інфармацыю па тэме «Гендарныя пытанні» главы 5 на сайце www.coe.int/compass. Падумайце, якія тэмы могуць усплыць. Вось некаторыя з найбольш часта задаваных пытанняў і тэм, якія абмяркоўваюцца:

- Што такое гомасексуальнасць?
- У чым розніца паміж гетэрасексуаламі, гомасексуаламі, лесбіянкамі, бісексуаламі і транссексуаламі?
- Ці з'яўляецца гомасексуальнасць хваробай?
- Як становяцца гомасексуаламі ці лесбіянкамі?
- Што можна сказаць аб рызыцы заражэння СНІДам?

У адных краінах гомасексуальнасць прымаецца грамадствам, і такія людзі могуць уступаць у шлюб, тады як у іншых гэта злачынства, якое караецца смерцю.

Важна таксама, каб вы як фасілітатар усведамлялі свае ўласныя маральныя ўстаноўкі і перакананні адносна таго, што вы лічыце правільным для самога сябе, для сваёй сям'і і для іншых, памятаючы пра тое, што гэтыя ўстаноўкі праявяцца ва ўсім, што вы зробіце ці скажаце (ці не зробіце і не скажаце). Прынцыпова важна, каб вы прызналі свае маральныя каштоўнасці і забабоны і зразумелі іх паходжанне, каб дапамагчы ўдзельнікам, у сваю чаргу, зразумець паходжанне іх уласных маральных каштоўнасцей.

Мэта мазгавога штурму, прысвечанага знакамітым людзям, якія публічна выказваліся наконт сваёй сексуальнасці, складаецца ў тым, каб заахвоціць удзельнікаў гэтак жа адкрыта абмяркоўваць пытанні сексуальнасці. Пры гэтым можна таксама ўдакладніць такія паняцці як гетэрасексуалы, гомасексуалы, лесбіянкі, бісексуалы і транссексуалы (гл. Дадатковую інфармацыю ў главе 5 на сайце www.coe.int/compass).

У гэтым практыкаванні вам адводзіцца вельмі важная роля: вы павінны задаць агульны настрой. Адным са спосабаў пачаць дыскусію можа быць размова паміж двума фасілітатарамі. Адзін з вас можа пачаць з фразы: «Вы чулі, Пітэр прызнаўся, што ён гомасексуал?» Ваш калега можа адказаць: «Не, я б у жыцці не падумаў, ён зусім не падобны на такога». Такім чынам будзе зразумела, што размова ідзе аб агульным знаёмым, таму гэта абмеркаванне сярод сваіх, а не тэарэтычная дыскусія. Гэта дапаможа пачаць абмеркаванне таго, што ўдзельнікі ведаюць пра гомасексуальнасць і як адносяцца да яе.

Можна спадзявацца, што адзін з назіральнікаў хутка зойме ваша месца, і дыскусія працягнецца сярод саміх удзельнікаў. Аднак вы і далей павінны заставацца ў гульні, выконваючы ролю назіральніка, каб у вас заставалася магчымасць яшчэ раз уступіць у размову. Такім чынам вы зможаце незаўважна кіраваць ходам абмеркавання, альбо прапаноўваючы новы напрамак, альбо тактоўна выводзячы з гульні ўдзельніка, які не прытрымліваецца яе правілаў.

Па жаданні вы можаце ўвесці правіла, згодна з якім адзін пункт гледжання можна выказаць толькі адзін раз. Такім чынам вы зможаце пазбегнуць бясконцага абмеркавання толькі абмежаванага кола тэм і паўтарэння адных і тых жа папулярных забабонаў.

Калі вам захочацца падказаць групе некаторыя ідэі для абмеркавання, можаце прапанаваць наступныя:

- Ці павінен адрознівацца ўзрост сексуальнай згоды (для ўступлення ў шлюб ці палавых зносін) для гомасексуалаў?
- Ці трэба дазволіць парам гомасексуалаў і лесбіянак уступаць у шлюб і мець дзяцей ці не? Чаму?
    - Ці праўда, што мужчыны, якія маюць палавыя кантакты з мужчынамі, больш рызыкуюць заразіцца СНІДам, чым жанчыны, якія маюць палавыя кантакты з мужчынамі?

Калі група вялікая, у вас не будзе часу абмеркаваць усе пытанні. Майце на ўвазе, што некаторыя будуць расчараваныя або незадаволеныя, што іх пытанне не было ўзнята. Каб выправіць такую сітуацыю, вы можаце ў канцы занятку прыклеіць усе пытанні на сцяну. Гэта паслужыць стымулам для ўдзельнікаў працягнуць дыскусію ў вольны час.

COMPASS

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**17 мая**
Міжнародны дзень барацьбы з гамафобіяй і трансфобіяй

## Варыянты

Гэты метад можна выкарыстоўваць пры абмеркаванні любой тэмы, напрыклад расізму, адукацыі або змяненняў клімату.

## Прапановы па далейшай працы

Было б цікава разгледзець, як сексуальнасць і асабліва гомасексуальнасць прадстаўлены ў СМІ. Збярыце фатаграфіі з газет, часопісаў і з Інтэрнэту і папрасіце ўдзельнікаў зрабіць да іх подпісы або дадаць рэплікі персанажаў (гл. «Іншыя гульні з відарысамі» у канцы практыкавання «Гульні з відарысамі» на старонцы 249).

Практыкаванне «Гэта хутка састарэе» на старонцы 272 разглядае, як стаўленне да розных пытанняў, у тым ліку і да сексу, змяняецца з цягам часу.

## Ідэі для дзеяння

Звяжыцеся з арганізацыяй, якая працуе з лесбіянкамі, гомасексуаламі, бісексуаламі і транссексуаламі ў вашай краіне. Запрасіце аднаго з іх прадстаўнікоў выступіць перад вашай групай і прааналізуйце, якія праблемы, звязаныя з роўнасцю і правамі чалавека, стаяць у вашай краіне найбольш востра.

## Дадатковая інфармацыя

Чалавечая сексуальнасць – неад'емная частка жыцця і адна з базавых патрэб. Сексуальнасць уздзейнічае на нашу асобу і на нашы паводніцкія характарыстыкі – сацыяльныя, асабістыя, эмацыянальныя, псіхалагічныя, якія праяўляюцца ў нашых узаемаадносінах з іншымі людзьмі. Наша сексуальнасць фарміруецца пад уплывам нашага полу і гендарных асаблівасцей, а таксама цэлага шэрагу іншых фактараў і дынамічна змяняецца на працягу ўсяго жыцця.

## Сексуальная разнастайнасць і правы чалавека

Пры першым поглядзе гэтыя два пытанні могуць паказацца нязвязанымі. Можна сцвярджаць, што першае адносіцца да сферы асабістага і індывідуальнага выбару, у той час як другое – да грамадскай сферы прававых і палітычных структур, дзейнасць якіх закранае грамадзян. Тым не менш нядаўнія гістарычныя, антрапалагічныя і сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што сексуальная ідэнтычнасць і розныя мадэлі дэманстрацыі сексуальнага жадання ў розныя эпохі і ў многіх культурах лічыліся і лічацца патэнцыяльна разбуральнымі для грамадскага парадку. У некаторых краінах яны разглядаюцца як парушэнне традыцыйных маральных ці рэлігійных нормаў, а ў іншых разглядаюцца як псіхічнае захворванне.

Лічыцца, што існуе нейкая сацыяльная і рэлігійная гегемонія, вынікам якой становіцца спыненне роўнага доступу да правоў чалавека. Традыцыйны пункт гледжання абвяшчае, што гетэрасексуальнасць з'яўляецца «натуральным» і, такім чынам, «нармальным» спосабам выказвання сексуальнага жадання, а таму маральна дапушчальнай, у той час як іншыя формы выказвання сексуальнага жадання адносяцца да «ненатуральных» і таму маральна непрымальных.

**Заўвага**. Матэрыял адаптаваны з сайта Камісіі па абароне правоў гомасексуалаў і лесбіянак (http://www.iglhrc.org).

# Мака-кітабоі

*Як тут ні кажы, а паляванне на кітоў – гэта забойства, а забойства – гэта дрэнна.*

Таварыства абароны кітоў і дэльфінаў

| | |
|---|---|
| **Складанасць** | узровень 4 |
| **Памер групы** | больш за 14 чалавек (малыя групы па 5 чалавек) |
| **Час** | 150 хвілін |
| **Тэмы** | • культура і спорт,<br>• навакольнае асяроддзе,<br>• глабалізацыя. |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне ўключае працу ў малых групах, ролевую гульню, дыскусію і дасягненне кансэнсусу па наступных пытаннях:<br>• устойлівае выкарыстанне марскіх рэсурсаў;<br>• правы карэнных народаў на свабоднае вызначэнне свайго эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця. |
| **Звязаныя правы** | • права ўдзельнічаць у культурным жыцці супольнасці;<br>• права на харчаванне і доступ да прыродных рэсурсаў;<br>• права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. |
| **Мэты** | • развіць разуменне супярэчлівых патрабаванняў, звязаных з правам на ўдзел у культурным жыцці і абаронай навакольнага асяроддзя;<br>• развіць крытычнае мысленне, уменне аргументаваць і дасягаць кансэнсусу;<br>• дапамагчы выпрацаваць непрадузятае стаўленне да культурных адрозненняў. |
| **Матэрыялы** | • раздатачныя матэрыялы;<br>• ручкі і папера для запісаў падчас працы ў групах. |
| **Падрыхтоўка** | • Прачытайце раздатачныя матэрыялы для азнаямлення з інфармацыяй па пытаннях для абмеркавання. Пасля гэтага вы зможаце пры неабходнасці выступаць у якасці кансультанта.<br>• Зрабіце копіі ролевых картак для кожнай групы. Кожны ўдзельнік павінен мець уласную ролевую картку. |

COMPASS

Культура і спорт

Навакольнае асяроддзе

Глабалізацыя

Узровень 4

Больш за 14 (малыя групы па 5 чалавек)

150 хвілін

## Інструкцыі

Практыкаванне дзеліцца на дзве часткі: частку 1 (30 хвілін) – уводзіны ў практыкаванне і агляд пытанняў, звязаных з аховай навакольнага асяроддзя і культурай, і частку 2 (90 хвілін) – інсцэніроўку пасяджэння з удзелам прадстаўнікоў племені мака і працаўнікаў палявання на кітоў з мэтай прыйсці да кансэнсусу.

**Частка 1**. Уводзіны ў экалагічныя і культурныя пытанні. (30 хвілін)

1. Растлумачце, што гэта практыкаванне звязана з экалагічнымі і культурнымі правамі. У цэнтры ўвагі – жаданне племені мака аднавіць паляванне на кітоў і супраціўленне з боку актывістаў абароны навакольнага асяроддзя і іншых бакоў.
2. Раскажыце групе пра мака і растлумачце, што гэты канфлікт цягнецца ўжо шмат гадоў, пры гэтым юрыдычныя выдаткі ўзрастаюць, не прыводзячы да станоўчага выніку. Актывісты абароны навакольнага асяроддзя ўжывалі неразумныя метады, якія паставілі пад пагрозу іх жыццё і жыццё іншых, да таго ж некаторыя прадстаўнікі племені мака адчулі сябе пакрыўджанымі і таму парушылі закон і сталі паляваць на кітоў нелегальна. Гэта вельмі непрыемная сітуацыя для ўсіх, і, здаецца, бакам пара сесці за стол перагавораў, паглядзець, ці ёсць у іх агульныя пазіцыі, і паспрабаваць знайсці рашэнне.

3. Цяпер пазнаёмце ўдзельнікаў з некаторымі пытаннямі і папрасіце, каб яны адрэагавалі на гэтыя пытанні, заняўшы «высокае або нізкае» становішча. (Выкарыстанне гэтага метаду апісана на старонцы 351). Прачытайце па чарзе наступныя сцверджанні:
   - народныя звычаі варта паважаць да таго часу, пакуль яны не пачынаюць ісці насуперак правам чалавека;
   - мы павінны паважаць права народа свабодна выбіраць сабе ежу, быць веганамі, вегетарыянцамі або есці мяса;
   - ежу, якую мы ядзім, трэба атрымліваць метадамі, якія не наносяць шкоды навакольнаму асяроддзю;
   - у жывёлагадоўлі нельга ўжываць такіх жорсткіх метадаў, як інтэнсіўная гадоўля або жорсткія метады забою;
   - культурныя традыцыі народа вельмі важны, і іх неабходна паважаць;
   - на кітоў нельга паляваць нават у культурных мэтах.

**Частка 2**. Інсцэніроўка пасяджэння з мэтай вырашыць тупіковую сітуацыю паміж племенем мака і праціўнікамі палявання на кітоў. (90 хвілін)

1. Нагадайце групе, што на працягу многіх гадоў ідзе жорсткае супрацьстаянне як у літаральным, так і ў прававым сэнсе і што настаў час знайсці рашэнне праблемы. Гэта практыкаванне – інсцэніроўка пасяджэння, якое было праведзена выдуманай арганізацыяй пад назвай «КРЭСТ» (Англійскі варыянт назвы (CREST) складаецца з пачатковых літар слоў, якія ў перакладзе на рускую мову азначаюць культура, правы, навакольнае асяроддзе, устойлівасць і дыялог). «КРЭСТ» з'яўляецца незалежнай арганізацыяй, якая намагаецца звязаць правы чалавека з праблемамі аховы навакольнага асяроддзя. Прадстаўнікі арганізацыі імкнуцца дапамагчы бакам прыйсці да разумення шляхам дыялогу. У практыкаванні мадэліруецца правядзенне арганізацыяй «КРЭСТ» сустрэчы0 прадстаўнікоў чатырох груп:
   a. племені мака, якое хоча аднавіць паляванне на кітоў;
   b. Альянсу Крайняй Поўначы (АКС) – парасоністай арганізацыі, якая прадстаўляе інтарэсы кітабояў і паляўнічых на цюленяў і выступае ў падтрымку будучыні берагавых культур і разумнага выкарыстання пагалоўя марскіх млекакормячых. АКС падтрымлівае мака.
   c. «Марскога пастуха» (МП) – арганізацыі, якая расследуе і дакументуе парушэнні палажэнняў міжнароднага права, правілаў і пагадненняў аб абароне жывой прыроды мораў і акіянаў. Гэта арганізацыя не падтрымлівае просьбу мака.
   d. Грынпіс – арганізацыі актывістаў па ахове навакольнага асяроддзя, якая выступае супраць палявання на кітоў у прынцыпе.
2. «КРЭСТ» іграе ролю пасрэдніка. У цэнтры ўвагі пяць пытанняў:
   - Чаму кіты такія важныя?
   - Ці знаходзяцца шэрыя кіты пад пагрозай знікнення?
   - Чаму племя мака павінна перастаць есці мяса кітоў?
   - Ці можна неяк змяніць рытуал палявання племені мака на кітоў?
   - Калі можна дасягнуць дамоўленасці, якая сістэма маніторынгу спатрэбіцца для забеспячэння абароны кітоў?
3. Папрасіце чатырох добраахвотнікаў сыграць ролю прадстаўнікоў арганізацыі «КРЭСТ» і падзяліце астатніх удзельнікаў на чатыры аднолькавыя малыя групы. Раздайце ролевыя карткі. Дайце групам 30 хвілін на абмеркаванне інфармацыі, разгляду пазіцый і распрацоўку аргументаў па ўсіх пяці пытаннях.
4. Пасля заканчэння падрыхтоўкі збярыце групы на агульнае пасяджэнне на чале з прадстаўнікамі арганізацыі «КРЭСТ». Пасяджэнне павінна цягнуцца 60 хвілін.
5. Прадстаўнікі арганізацыі «КРЭСТ» адкрываюць пасяджэнне кароткім уступным словам аб правах чалавека і праблемах навакольнага асяроддзя, нагадваючы, што мэта пасяджэння – абмен інфармацыяй і абмеркаванне вострых праблем, сфармуляваных у пяці прыведзеных вышэй пытаннях. Затым прадстаўнікі племені мака выкладаюць сваю пазіцыю, пасля чаго пачынаецца адкрытае абмеркаванне пытанняў.
6. У канцы абмеркавання прадстаўнік арганізацыі «КРЭСТ» павінен падвесці вынікі. Зрабіце кароткі перапынак і пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Спачатку прапануйце групам асвяжыць у памяці ход дыскусіі і падумаць, ці можна было прыйсці да кансэнсусу па якім-небудзь з пастаўленых пытанняў. Затым пераходзьце да абмеркавання агульных пытанняў.



- Ці цяжка было выконваць розныя ролі?

- Што было самым цікавым з таго, што даведаліся ўдзельнікі?
- Якія аргументы былі самымі пераканаўчымі? Тыя, што разлічаны на эмоцыі, або рацыянальныя, лагічныя довады?
- Наколькі цяжка было зразумець пазіцыю процілеглага боку? Наколькі цяжка было прыняць яе?
- Ці было нешта агульнае ў пазіцыях бакоў па кожным з пяці пытанняў?
- Наколькі цяжка ў рэальным жыцці прыняць іншую культурную традыцыю, якая можа паказацца грубай, незразумелай або неэтычнай?
- У які момант сутыкненне культур ператвараецца ў дыскрымінацыю?
- Наколькі цяжка непрадузята падыходзіць да культурных адрозненняў?
- Ці непазбежная страта культуры ў выніку глабалізацыі? Ці можна лічыць культуру, якая змянілася, страчанай? Ці не варта разглядаць культурныя змены як пазітыўны працэс у кантэксце пераменлівага свету?
- Якія правы чалавека закранаюцца ў гэтым практыкаванні?
- Юрыдычныя калізіі вакол правоў звычайна вырашаюцца ў судзе. Ці падыходзіць гэты спосаб для вырашэння праблем, звязаных з правамі чалавека?
- Якія патрабаванні павінны атрымаць прыярытэт – правы людзей на жыццё і ежу ці абарона навакольнага асяроддзя і захаванне відаў?

У канцы занятку даведайцеся, ці змянілася стаўленне ўдзельнікаў да пытанняў, звязаных з паляваннем на кітоў, з дапамогай метаду «высока або нізка». Паўтарыце тыя ж пытанні, якія вы задавалі ў частцы 1.

## Парады для фасілітатараў

Складанасць пытанняў, якія разглядаюцца ў гэтым практыкаванні, азначае, што яно лепш за ўсё падыходзіць для сталай групы, якая валодае добрымі навыкамі вядзення дыскусіі. Практыкаванне прадугледжвае засваенне вялікага аб'ёму інфармацыі і, як бачна з тэксту на ролевых картках, наяўнасці пэўных ведаў па тэрміналогіі правоў чалавека. Можа быць, гэта практыканне варта правесці за два занятк і, зрабіўшы перапынак паміж імі, каб у груп быў час прачытаць ролевыя карткі і падумаць над пытаннямі.

Адна з важных задач гэтага практыкавання заключаецца ў тым, каб паказаць маладым людзям абмежаванасць іх пунктаў гледжання, абумоўленую культурнымі традыцыямі, і даць ім магчымасць пераасэнсаваць сваё стаўленне да ўстойлівага карыстання рэсурсамі жывой прыроды. Для многіх людзей паляванне на кітоў з'яўляецца вельмі эмацыянальным пытаннем, прычым часта ў іх ужо ёсць вельмі цвёрдыя перакананні на гэты конт. Гэта, з аднаго боку, ажыўляе дыскусію, а з другога – ускладняе працу над гэтай тэмай. Напрыклад, вы маглі б спытаць удзельнікаў, як бы яны адрэагавалі, калі б ім было забаронена спажываць нейкую асаблівую ежу, уласцівую іх культуры, ладу жыцця і традыцыям. Яшчэ адной задачай з'яўляецца развіццё навыкаў дасягнення кансэнсусу, менавіта таму практыкаванне прадугледжвае фармат пасяджэння на чале з выдуманай арганізацыяй «КРЭСТ» (займаецца пытаннямі культуры, правоў, навакольнага асяроддзя, устойлівасці і дыялогу), якая іграе ролю пасрэдніка. Перад правядзеннем практыкавання азнаёмцеся з інфармацыяй пра дасягненне кансэнсусу на старонцы 545.

Падчас працы над часткай 2 пункта 1 пры жаданні можна падрабязна абмеркаваць некаторыя з наступных пытанняў:

- Чаму кіты такія важныя? Улічвайце пры гэтым эканамічныя, гістарычныя, экалагічныя і духоўныя аспекты.
- Ці знаходзяцца шэрыя кіты пад пагрозай знікнення? Ці маюцца на гэты конт навуковыя доказы?
- Чаму племя мака павінна перастаць есці мяса кітоў? Падумайце пра тое, што, прытрымліваючыся сваёй культурнай традыцыі, іўдзеі і мусульмане не ядуць свініну, але пры гэтым яны не замінаюць іншым людзям спажываць свіное мяса.
- Ці можна неяк змяніць рытуал палявання мака на кітоў? Памятайце, што культурныя традыцыі могуць мяняцца, і яны сапраўды мяняюцца: напрыклад, у адказ на эпідэмію СНІДу ў сусветных культурах размовы пра секс больш не з'яўляюцца табу, а звязаныя з сексам рытуалы, накшталт «ачышчэння ўдавы», падпадаюць пад забарону і змяняюцца.
- Калі можна дасягнуць дамоўленасці, якая сістэма маніторынгу спатрэбіцца для забеспячэння абароны кітоў? Падумайце пра адкрыты доступ да інфармацыі, пра тое, хто мог бы выступіць у ролі суддзі і вырашыць, ці было ў пэўным годзе пагалоўе кітоў дастатковым, і як супрацьстаяць падману ў гэтым пытанні.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**9 жніўня**
Міжнародны дзень карэнных народаў

**Вэб-сайт Альянсу Крайняй Поўначы**: www.highnorth.no

**Вэб-сайт арганізацыі «Марскі пастух»**: http://www.seashepherd.com/

**Вэб-сайт Міжнароднай кітабойнай камісіі:** www.iwcoffice.org

**Вэб-сайт племені мака**: www.makah.com

**Вэб-сайт арганізацыі «Грынпіс»:** http://www.greenpeace.org

Пераканайцеся, што ўдзельнікі правільна разумеюць некаторыя тэрміны і паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў ролевых картках і прыводзяцца ніжэй.

**Карэнныя народы**

Не існуе адназначных прыкмет, якія дазваляюць аднесці той ці іншы народ да карэннага. Увогуле, можна сказаць, што яны з'яўляюцца нашчадкамі тых, хто першапачаткова засяляў тую ці іншую тэрыторыю да прыходу каланізатараў і да правядзення дзяржаўных меж. Яны заўсёды займаюць маргінальнае становішча ў сваіх дзяржавах і часта вядуць племянны лад жыцця. Дэкларацыя правоў карэнных народаў, прынятая ў 2007 годзе, прызнае іх права на самавызначэнне, свабоднае эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё і права на чалавечую годнасць і разнастайнасць культур.

**Прынцып засцярогі**

Прынцып засцярогі абвяшчае, што «калі якая-небудзь дзейнасць можа нанесці шкоду здароўю чалавека або навакольнаму асяроддзю, неабходна прыняць меры засцярогі нават у тым выпадку, калі нейкія прычынна-выніковыя сувязі немагчыма цалкам абгрунтаваць з навуковага пункту гледжання». Гэты прынцып прадугледжвае неабходнасць дзеянняў у сітуацыі нявызначанасці; ускладанне цяжару доказу на тых, хто абумовіў рызыку; аналіз альтэрнатыў патэнцыяльна шкодным відам дзейнасці; прыняцце рашэнняў на аснове шырокага ўдзелу.

**Устойлівасць**

Сусветная камісія ААН па навакольным асяроддзі і развіцці (WCED) у дакладзе 1989 года, названым таксама Дакладам Брунтлан, вызначыла тэрмін «устойлівае развіццё» як «развіццё, якое задавальняе патрэбы сённяшняга дня, не рызыкуючы здольнасцю будучых пакаленняў задаволіць свае патрэбы».

«Устойлівае выкарыстанне» – тэрмін, які ўжываецца толькі адносна аднаўляльных рэсурсаў. Гэта прадугледжвае выкарыстанне рэсурсу такімі тэмпамі, якія дазваляюць яму аднаўляцца. Існуе ўзгоднены ў глабальных маштабах прынцып устойлівага выкарыстання прыродных багаццяў на аснове навуковых доказаў і аб'ектыўных даных.

## Варыянты

Калі вы працуеце з невялікай групай, яе можна падзяліць не на чатыры, а на дзве часткі: з аднаго боку будуць мака і Альянс Крайняй Поўначы, а з другога – Грынпіс і «Марскі пастух».

Для выканання гэтага практыкавання вы можаце запланаваць два заняткі, каб даць групам магчымасць знайсці патрэбную інфармацыю і мець больш часу для вызначэння сваіх пазіцый.

Гэта практыкаванне можна таксама правесці ў фармаце агульнай дыскусіі. Няхай кожную групу – мака, Альянс Крайняй Поўначы, «Марскі пастух» і Грынпіс – прадстаўляе асобны чалавек, які павінен будзе выкласці сваю пазіцыю і адказаць на пытанні аўдыторыі. У заключэнне правядзіце галасаванне па кожным з пяці пытанняў. Такім чынам вы зможаце абмеркаваць правы чалавека, культурныя і экалагічныя аспекты гэтай тэмы, але без элемента дасягнення кансэнсусу.

## Прапановы па далейшай працы

Калі група жадае вывучыць тэму культурных змен, правядзіце практыкаванне «Хутка састарэе» на старонцы 272.

## Ідэі для дзеяння

Падтрымлівайце карэнныя народы, купляючы іх прадукты. Многія рамесныя вырабы ў крамах, якія гандлююць «сумленна купленымі» таварамі, былі створаны прадстаўнікамі карэнных народаў. У наступны раз, калі вы захочаце купіць каму-небудзь падарунак, зазірніце ў такую краму.

## Дадатковая інфармацыя

У Інтэрнэце даступна кніга Роба ван Гінкеля (Універсітэт Амстэрдама) «Мака-кітабоі, або смерць Левіяфана: адраджэнне традыцый і спрэчкі аб самабытнасці ў новым тысячагоддзі». Шукайце па запыце «Makah Whale Hunt and Leviathan's Death: Reinventing Tradition and Disputing Authenticity in the Age of Modernity».

Інфармацыю аб правах карэнных народаў можна знайсці на сайце Міжнароднай рабочай групы па справах карэнных народаў www.iwgia.org, а поўны тэкст Дэкларацыі правоў карэнных народаў 2007 года – на сайце www.un.org.

На сайце www.uncaged.co.uk вы знойдзеце дадатковую інфармацыю аб правах жывёл і аб тым, што дабрыню і павагу трэба праяўляць да ўсіх істот, надзеленых пачуццямі і розумам.

## Раздатачныя матэрыялы

**Агульная інфармацыя для фасілітатара**

Народ мака (іх таксама называюць племенем мака ці проста мака) пражывае ў рэзервацыі, размешчанай у самай паўночна-заходняй частцы паўвострава Алімпік у штаце Вашынгтон (ЗША). У цяперашні час плошча рэзервацыі складае прыблізна 27 000 акраў. У ліпені 1999 года даныя перапісу насельніцтва племені паказалі, што ўсяго ў ім налічваецца 1214 чалавек, хоць у цяперашні час у рэзервацыі пражывае толькі 1079 з іх. Сярэдні ўзровень беспрацоўя ў рэзервацыі дасягае 51 %. Даходы амаль 49 % сем'яў рэзервацыі знаходзяцца за федэральнай мяжой беднасці, а 59 % жылля не адпавядае бягучым стандартам якасці.

Нягледзячы на гэту змрочную карціну, традыцыі племені застаюцца вельмі моцнымі, і многія мака пасля заканчэння ВНУ вяртаюцца ў рэзервацыю, каб працаваць у мясцовай клініцы ці ў школе, дапамагаючы роднаму племені. Крыніца: http://content.lib.washington.edu/aipnw/renker/contemporary.html

*Кароткая гісторыя нядаўніх спрэчак:*

- Кастрычнік 1997 года: рашэннем Міжнароднай кітабойнай камісіі племя мака забяспечана квотай на адлоў чатырох шэрых кітоў у год.
- 10 мая 1999 года: мака ўпершыню за больш чым 70 гадоў палявалі на кітоў. Актывісты абароны навакольнага асяроддзя перапынілі паляванне, рызыкуючы сваім жыццём і жыццём іншых людзей.
- 17 мая 1999 года: злоўлены адзін кіт.
- 9 чэрвеня 2000 года: апеляцыйны суд 9-й акругі пастанавіў забараніць паляванне на кітоў да правядзення новай ацэнкі стану навакольнага асяроддзя.
- Ліпень 2001 года: праведзена новая ацэнка. Паляванне зноў дазволена.
- 2002 год: Міжнародная кітабойная камісія задаволіла заяву мака на аднаўленне квоты на адлоў кітоў яшчэ на пяць гадоў.
- Снежань 2002 года: калегія ў складзе трох суддзяў 9-й акругі прыпыніла паляванне на нявызначаны тэрмін да атрымання поўнай справаздачы аб яго ўплыве на стан навакольнага асяроддзя.
- Люты 2005 года: племя мака падало афіцыйную заяву ў адрас Нацыянальнай службы марскога рыбалоўства аб скасаванні Акта аб абароне марскіх млекакормячых, што дазволіла б ім паляваць на кітоў.
- Верасень 2007 года: некаторыя прадстаўнікі племені, не дачакаўшыся ніякага афіцыйнага рашэння, пачалі паляваць на кітоў нелегальна.
- Май 2008 года: Служба рыбалоўства прадставіла праект справаздачы аб уздзеянні на навакольнае асяроддзе.
- Сярэдзіна 2009 года: не было вынесена ніякага канчатковага рашэння або пастановы па заяве на скасаванне.

Крыніца: http://www.historylink.org

Дадатковую інфармацыю пра кітабойны промысел і племя мака шукайце на сайце http://www.historylink.org (па запыце makah whaling)

## Ролевыя карткі

**Ролевая картка арганізацыі «КРЭСТ»**

Ваша пазіцыя па праблеме палявання на кітоў нейтральная. Ваша роля – даць агульную інфармацыю аб правах чалавека і заканадаўстве па навакольным асяроддзі, стаць пасрэднікам паміж групамі і ў канцы падвесці вынікі. Ваша роля ў якасці фасілітатараў пасяджэння заключаецца ў тым, каб сачыць за тым, каб дыскусія не адыходзіла ад тэмы, і дапамагаць вырашаць непаразуменні. Дапамажыце групам перастаць факусіравацца на адрозненнях і замест гэтага высветліць, што ў іх ёсць агульнага, што дапаможа прыйсці да кансэнсусу па наступных пытаннях:

- Чаму кіты такія важныя?
- Ці знаходзяцца шэрыя кіты пад пагрозай знікнення?
- Чаму племя мака павінна перастаць есці мяса кітоў?
- Ці можна неяк змяніць рытуал палявання племені мака на кітоў?
- Калі можна дасягнуць дамоўленасці, якая сістэма маніторынгу спатрэбіцца для забеспячэння абароны кітоў?

Пачніце з прывітання ўсіх удзельнікаў. Вызначце рамкі дыскусій. Выдзеліце хвіліны дзве на тое, каб увесці ўдзельнікаў у кантэкст, коратка пералічыўшы асноўныя правы чалавека і аспекты аховы навакольнага асяроддзя, звязаныя з пытаннем на парадку дня. Сфармулюйце мэту пасяджэння яшчэ раз: абмеркаваць пэўныя пытанні і прыйсці да ўзаемаразумення, каб знайсці доўгатэрміновае рашэнне канфлікту.

Затым, да пачатку агульнай дыскусіі, запрасіце племя мака прадставіць свае аргументы на карысць аднаўлення палявання на кітоў. Пасля 50-хвіліннай дыскусіі вы павінны будзеце коратка падвесці вынікі і пералічыць спрэчныя пытанні, якія ўзніклі на пасяджэнні і якія трэба будзе вырашыць на наступным этапе.

**Некаторая дадатковая інфармацыя па правах чалавека, культуры і ахове навакольнага асяроддзя**

Артыкул 1 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах абвяшчае:

1. Усе народы маюць права на самавызначэнне. Згодна з гэтым правам, яны свабодна вызначаюць свой палітычны статус і свабодна забяспечваюць сваё эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё.
2. Усе народы для дасягнення сваіх мэт могуць свабодна распараджацца сваімі прыроднымі багаццямі і рэсурсамі без парушэння якіх-небудзь абавязацельстваў, што вынікаюць з міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва, заснаванага на прынцыпе ўзаемнай выгады, і з міжнароднага права. Ніводны народ ні ў якім разе не можа быць пазбаўлены належных яму сродкаў для існавання.

Артыкул 15 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах абвяшчае:

1. Дзяржавы – бакі гэтага Пакта прызнаюць права кожнага чалавека на:

   (a) удзел у культурным жыцці;
   (b) карыстанне вынікамі навуковага прагрэсу і іх практычнага прымянення.

У прэамбуле да Венскай дэкларацыі 1993 года заяўляецца: «Усе правы чалавека ўсёахопныя, непадзельныя і ўзаемазвязаныя. Міжнародная супольнасць павінна ставіцца да правоў чалавека глабальна, на справядлівай і роўнай аснове, з аднолькавым падыходам і ўвагай. … неабходна браць пад увагу значэнне нацыянальнай і рэгіянальнай спецыфікі і розных гістарычных, культурных і рэлігійных асаблівасцей».

У 1981 годзе Міжнародная кітабойная камісія дазволіла карэнным народам паляваць на кітоў для задавальнення іх уласных патрэб. Такі промысел быў вызначаны як «паляванне на кітоў для мэт спажывання мясцовым карэнным насельніцтвам, якое ажыццяўляецца абарыгеннымі, карэннымі або мясцовымі народамі або ад імені гэтых народаў, якіх аб'ядноўваюць моцныя супольныя, сямейныя, сацыяльныя і культурныя адносіны, звязаныя з традыцыйнай залежнасцю ад палявання на кітоў і іх выкарыстання».

У Канвенцыі ААН па марскім праве абвяшчаецца: «Адным з агульных прынцыпаў з'яўляецца аптымальна ўстойлівае выкарыстанне аднаўляльных марскіх рэсурсаў».

У 1982 годзе Міжнародная кітабойная камісія абвясціла мараторый на здабычу шэрых кітоў, прызнаных відам пад пагрозай знікнення. У 1994 годзе іх папуляцыя аднавілася прыблізна да 21 000 асобін, і яны былі выключаны са Спіса відаў пад пагрозай знікнення ў ЗША.

**Ролевая картка племені мака**

Ваша роля – расказаць пра сітуацыю індзейцаў-мака, якія жывуць на паўночна-заходнім узбярэжжы Паўночнай Амерыкі. Паляванне на кітоў з'яўляецца важнай культурнай традыцыяй племені мака, і вы толькі хочаце мець права забіваць пяць шэрых кітоў у год.

Выкарыстайце вашы ўласныя веды аб правах чалавека і праблемах навакольнага асяроддзя разам з наступнай інфармацыяй:

- Нягледзячы на тое, што апошняе паляванне на кітоў адбылося 70 гадоў таму, абрады, рытуалы, спевы і паданні перадаваліся з пакалення ў пакаленне і не зніклі. Вакол палявання ўзнікла цэлая сацыяльная структура.
- Цяпер некаторыя індзейцы-мака зарабляюць на жыццё лоўляй ласося і ціхаакіянскай вугальнай рыбы і прадаюць улоў мясцоваму рыбазаводу, аднак захавалася і традыцыя ўзаемнай падтрымкі, па якой сем'і і сябры дзеляцца ўловам адзін з адным.
- Пагалоўе кітоў скарацілася да крытычных паказчыкаў у выніку кітабойнага промыслу, які вялі еўрапейцы і амерыканцы. Цяпер папуляцыя дасягнула гістарычнага максімуму, і кіты былі выключаны са Спіса відаў пад пагрозай знікнення ў ЗША.
- Наша моладзь ганарыцца сваёй прыналежнасцю да племені, яго культуры і гісторыі. Быць часткай культуры з даўнімі традыцыямі – гэта вялікі гонар, якім мала хто з маладых амерыканцаў можа пахваліцца.
- Мы не збіраемся паляваць на шэрых кітоў у камерцыйных мэтах. Для нас гэта рытуал і забеспячэнне надзённай ежы.
- Мы запыталі да 5 шэрых кітоў, але гэта не значыць, што мы возьмем іх усіх.
- Мы вядзём промысел на малых кабатажных суднах, выкарыстоўваючы традыцыйны ручны гарпун. Магчыма, мы будзем выкарыстоўваць яго мадыфікаваны варыянт з гранатай на канцы, які ўжываюць на Алясцы для палявання на грэнландскіх кітоў.
- Мы зробім усё для таго, каб шэры кіт больш ніколі не трапіў у Спіс відаў пад пагрозай знікнення.

**Ролевая картка арганізацыі «Марскі пастух» і Таварыства па захаванні кітоў і дэльфінаў**

Арганізацыя «Марскі пастух» (Sea Shepherd International) – гэта некамерцыйная няўрадавая грамадская арганізацыя (НГА), якая расследуе і дакументуе парушэнні палажэнняў міжнароднага права, правілаў і пагадненняў аб абароне жывой прыроды мораў і акіянаў. Таварыства па захаванні кітоў і дэльфінаў (ТЗКД) – гэта самая актыўная ў свеце дабрачынная арганізацыя, якая займаецца захаваннем і забеспячэннем прымальных умоў пражывання кітоў, дэльфінаў і марскіх свіней (бурых дэльфінаў).

Выкарыстайце вашы ўласныя веды аб правах чалавека і праблемах навакольнага асяроддзя разам з наступнай інфармацыяй:

- «Як тут ні кажы, але паляванне на кітоў – гэта забойства, а забойства – гэта дрэнна».
  - Кіты не людзі, але яны нічым не горшыя за людзей. Мысленне чалавека, які ўхваляе забойства кітоў, супадае з мысленнем чалавека, які згодны з генацыдам «непаўнавартасных» людзей.
  - У глыбокім сэнсе кіты і некаторыя іншыя разумныя млекакормячыя заслугоўваюць калі не правоў чалавека, то ўжо дакладна «гуманістычных правоў».
- Сапраўдная прычына ініцыятывы мака заключаецца ў тым, што, як яны выдатна ведаюць, мяса кітоў у Японіі прадаецца па цане 80 долараў за кілаграм. Адзін кіт каштуе амаль 1 мільён долараў.
- Калі мака атрымаюць дазвол на кітабойны промысел, гэта паставіць пад пагрозу тысячы кітоў, паколькі Нарвегія, Японія, Расія і Ісландыя палічаць гэта прэцэдэнтам.
- Мы знаходзімся ў стане пошуку балансу, спрабуючы паважаць гістарычнае права людзей прытрымлівацца сваіх старадаўніх традыцый і пры гэтым захаваць і абараніць кітоў.
- У 1995 годзе Расію крытыкавалі за промысел шэрага кіта, сцвярджаючы, што кітовае мяса ішло не ў ежу карэнным народам, а на адкорм ліс на пушных фермах.
- Культуры мяняюцца. Эскімосы, якія жывуць на поўначы Аляскі, у эканамічным плане цяпер значна адрозніваюцца ад тых людзей, якія палявалі там на кітоў сто гадоў таму. Нафтаздабыча прынесла мясцовым жыхарам каласальныя грошы. Паляванне з выкарыстаннем сучасных катараў і верталётаў наўрад ці ўпісваецца ў паняцце абарыгеннага промыслу.
- Пакуль Міжнародная кітабойная камісія (МКК) працягвае дэбаты па такім эмацыянальным пытанні, як аднаўленне камерцыйнага палявання на кітоў, сотні кітоў і іх меншых па памеры сародзічаў, дэльфінаў і марскіх свіней, штогод гінуць у выніку абарыгеннага промыслу, не прыцягваючы практычна ніякай увагі.
- У кантэксце жывой прыроды варта прытрымлівацца прынцыпу засцярогі.

**Ролевая картка Альянсу Крайняй Поўначы**

Альянс Крайняй Поўначы з'яўляецца парасоністай арганізацыяй, якая прадстаўляе інтарэсы кітабояў і паляўнічых на цюленяў з Канады, Грэнландыі, Фарэрскіх астравоў, Ісландыі і Нарвегіі. АКП імкнецца захаваць берагавыя культуры і выступае за рацыянальнае выкарыстанне пагалоўя марскіх млекакормячых.

Выкарыстайце вашы ўласныя веды аб правах чалавека і праблемах навакольнага асяроддзя разам з наступнай інфармацыяй:

- Мака палявалі на кітоў на працягу 2000 гадоў, а потым прыйшлі белыя імперыялісты, прысвоілі промысел і разбурылі традыцыйны лад жыцця племені.
- Цяпер пагалоўе кітоў зноў досыць вялікае, але белыя людзі хочуць забараніць нам выкарыстанне гэтага рэсурсу і пазбавіць нас права на промысел.
- Розныя культуры ніколі не дамовяцца наконт таго, якіх жывёл абараняць, а якіх лепш падаваць на вячэру. У паўночнай Нарвегіі ў людзей склаліся асаблівыя адносіны да гаг, у той час як у Даніі грудка гэтых качак лічыцца далікатэсам. Таму на аргументы наконт таго, што «кіты – гэта зусім іншае», можна адказаць: «Іншае для каго?».
- Паляванне на кітоў і на цюленяў дазваляецца да таго часу, пакуль яно вядзецца карэнным насельніцтвам не для камерцыйных мэт і выключна для «традыцыйнага ўжывання». Гэта несправядліва, таму што:
  - паняцце «традыцыйнасці», як правіла, вызначаюць людзі староннія;
  - звязванне палявання на кітоў і цюленяў з некамерцыйным спосабам вытворчасці пазбаўляе людзей іх натуральнага права вызначаць сваю будучыню;
  - ніводная культура не застаецца статычнай, але палітыка праціўнікаў кітабойнага промыслу, па сутнасці, уяўляе сабой спробу «замарозіць» сітуацыю, ператварыць культуру, якая развіваецца, у статычны музейны экспанат.
  - здаецца, што большасць урадаў, якія падпісалі канвенцыю Міжнароднай кітабойнай камісіі (арганізацыі, якая кантралюе кітабойны промысел), асуджаюць ужо саму ідэю камерцыялізацыі. Іранічна, што такога пункту гледжання прытрымліваюцца ўрады, якія звычайна актыўна выступаюць за свабодны гандаль.
- Дзеючы мараторый, ці палітыку «рукі прэч ад кітоў», цяжка апраўдаць лагічнымі аргументамі. У сельскай гаспадарцы, рыбалоўстве і лесагаспадарцы многія віды дзейнасці ніяк нельга аднесці да ўстойлівага прыродакарыстання, аднак ні адна з іх поўнасцю не забаронена.
- «Марскія млекакормячыя з'яўляюцца часткай жывых рэсурсаў акіянскіх экасістэм. Іх неабходна абараняць, калі ім пагражае небяспека, а паляваць на іх можна толькі тады, калі ёсць упэўненасць у тым, што памер папуляцыі гэта дапускае. Паляванне таксама можа быць неабходна для таго, каб не дапусціць празмернага росту папуляцыі і парушэння балансу ў марскіх экасістэмах». (Даклад Савета Еўропы па марскіх млекакормячых ад 12 ліпеня 1993 года)
- Кітабойны промысел – добры прыклад таго, як пры дапамозе міжнароднага супрацоўніцтва празмернае выкарыстанне рэсурсаў можа ператварыцца ў рацыянальнае. Міжнароднае супрацоўніцтва недасканалае, аднак яно можа быць эфектыўным, і мы бачым гэта на практыцы.

**Ролевая картка арганізацыі «Грынпіс»**

Прыхільнікі руху «Грынпіс» ва ўсім свеце праводзяць кампаніі ў падтрымку сваіх уяўленняў аб тым, як зрабіць наш свет больш устойлівым.

Выкарыстайце вашы ўласныя веды аб правах чалавека і праблемах навакольнага асяроддзя разам з наступнай інфармацыяй:

- У розных культурах свету кіты лічацца святымі жывёламі, і кожны іх від успрымаецца як суверэнная нацыя, вартая павагі і абароны.
- Кіты прыносяць радасць многім тысячам людзей, якія за імі проста назіраюць.
- Грынпіс не ўхваляе ні адзін са спосабаў кітабойнага промыслу, але і не выступае супраць промыслу, які сапраўды забяспечвае сродкі да існавання і ў якім адсутнічае камерцыйны складальнік.
- Шэрыя кіты штогод мігрыруюць на велізарныя адлегласці і толькі ненадоўга заходзяць у воды паблізу пасяленняў мака.
- Калі аднаму племені дазволіць забіваць 5 шэрых кітоў, то іншыя плямёны Канады і Аляскі заявяць: «Што ж, калі ім можна паляваць на кітоў, то можна і нам».
- Вельмі складана вызначыць дакладную колькасць кітоў у розных папуляцыях. Памер большасці папуляцый вядомы з дакладнасцю плюс-мінус 50 %. Змены адбываюцца вельмі павольна, і цяжка сказаць, павялічваецца ці памяншаецца папуляцыя, пасля некалькіх гадоў вывучэння. Але несумненна тое, што прычынай скарачэння колькасці кітоў з'яўляецца іх промысел у камерцыйных мэтах.

# Вузы супрацоўніцтва

*Дэмакратыя – гэта не тое, у што вы верыце, і не вешалка для капелюша; гэта тое, што вы робіце. Вы ўдзельнічаеце. І калі вы спыняецеся, дэмакратыя памірае.*

Эбі Хофман

| | |
|---|---|
| **Складанасць** | узровень 4 |
| **Памер групы** | 8–20 чалавек |
| **Час** | 120 хвілін |
| **Тэмы** | • грамадзянскасць і ўдзел,<br>• дэмакратыя,<br>• агульныя правы чалавека. |
| **Агляд** | Практыкаванне прадугледжвае абмеркаванне правоў і абавязкаў грамадзян, урада, НГА і СМІ ў дэмакратычным грамадстве. |
| **Звязаныя правы** | • права на ўдзел у кіраванні краінай і ў свабодных выбарах;<br>• свабодны доступ да інфармацыі і свабода выказвання меркавання;<br>• кожны мае абавязкі перад супольнасцю. |
| **Мэты** | • развіць разуменне ўзаемасувязі паміж правамі і абавязкамі;<br>• развіць уменне весці дыскусію і супрацоўнічаць;<br>• стымуляваць павышэнне грамадзянскай адказнасці. |
| **Матэрыялы** | • аркуш паперы фармату А4 і аловак для кожнай групы для нататак;<br>• 4 вялікія аркушы паперы фармату А3 або паперы для фліпчарта (па адным аркушы для кожнай групы для запісу «тэзісаў»);<br>• 3 маркеры (адзін чырвоны, адзін зялёны і адзін сіні) для кожнай групы;<br>• 4 маткі нітак (рознага колеру для кожнай групы);<br>• скотч для кожнай групы;<br>• нажніцы;<br>• адзін экзэмпляр правілаў гульні на групу. |
| **Падрыхтоўка** | • ад кожнага матка адрэжце па 6 нітак даўжынёй 1,5 м (усяго 24 адрэзкі, па 6 штук кожнага колеру, па адным колеры на групу). |

COMPASS

Грамадзянскасць і ўдзел

Дэмакратыя

Агульныя правы чалавека

Узровень 4

8–20 чалавек

120 хвілін

## Інструкцыі

1 Растлумачце, што мэта практыкавання – стварыць «карту» сувязей паміж чатырма «бакамі» (ідэальнага) дэмакратычнага грамадства.

2 Падзяліце ўдзельнікаў на чатыры роўныя групы, якія прадстаўляюць чатыры «бакі» дэмакратычнага грамадства: урад, НГА, СМІ і грамадзян.

3 Дайце кожнай групе адзін аркуш паперы фармату А4 і адзін аловак для запісу нататак. Затым прапануйце ім на працягу 10-хвіліннага мазгавога штурму сфармуляваць ролю, якую іх «бок» іграе ў дэмакратычным грамадстве, гэта значыць, якія яго асноўныя *функцыі*. У канцы абмеркавання ўдзельнікі павінны прыйсці да згоды па пяці найбольш значных функцыях.

4 На наступным этапе ўдзельнікі будуць рыхтаваць свае «тэзісы». Выдайце кожнай групе аркуш паперы фармату А3 або паперы для фліпчарта і чырвоны маркер і папрасіце напісаць уверсе аркуша, які «бок» яны прадстаўляюць, а ніжэй пералічыць пяць яго найбольш важных функцый.

5 Збярыце групы разам і папрасіце прадставіць свае «тэзісы». Няхай удзельнікі падзеляцца сваімі думкамі. Спытайце іх, ці згодны яны з асноўнымі функцыямі гэтых чатырох «бакоў». Калі групы пажадаюць, яны могуць змяніць свае спісы з улікам каментарыяў.

6. Зараз зноў падзяліце ўсіх на чатыры групы і раздайце ім зялёныя маркеры. Дайце пятнаццаць хвілін на правядзенне мазгавога штурму з мэтай высветліць, што ім патрэбна ад астатніх, каб выконваць свае ўласныя функцыі. Незадоўга да заканчэння часу прапануйце групам выбраць два найбольш важныя патрабаванні, якія яны прад'яўляюць да кожнага з іншых «бакоў», і запісаць іх зялёным маркерам пад асобнымі загалоўкамі.
7. Раздайце копіі «Правілаў гульні», пераканайцеся, што ўсе разумеюць, што трэба рабіць. Затым папрасіце групы раскласці свае «тэзісы» ў сярэдзіне пакоя ў форме квадрата прыкладна ў 1 метры адзін ад аднаго (гл. схему). Групы займаюць месцы па вуглах ля сваіх аркушаў.
8. Раздайце кожнай групе па 6 адрэзкаў нітак, рулоне скотча і сінім маркеры.
9. Час правесці раўнды перагавораў. Выдзеліце на кожны з іх па дзесяць хвілін. Нагадайце ўдзельнікам, што іх мэта – скласці схему адносін паміж рознымі «бакамі», і калі нейкае патрабаванне будзе прынята, два аркушы паперы трэба злучыць пры дапамозе ніткі і скотча, што будзе азначаць, што бок прымае на сябе адказнасць.
10. Пераходзьце да ацэнкі і аналізу, пакуль удзельнікі яшчэ сядзяць вакол схемы.

## Аналіз і ацэнка

Папрасіце ўдзельнікаў паглядзець на створаную імі сетку і абдумаць выкананае практыкаванне:

- Ці цяжка было ўявіць сабе функцыі ўрада, НГА, СМІ і грамадзян у дэмакратычным грамадстве?
- Ці мела месца рознагалоссе ўнутры груп наконт прымальнасці або непрымальнасці асобных патрабаванняў?
- Якія з вашых патрабаванняў былі адхілены іншымі групамі? Чаму? Ці выклікала б гэта якія-небудзь праблемы ў рэальнасці?
- Ці прынялі групы якія-небудзь патрабаванні, якія не прымалі раней? Што яны думаюць пра гэта цяпер?
- Ці даведаліся ўдзельнікі падчас выканання практыкавання што-небудзь новае пра дэмакратычнае грамадства, чаго не ведалі раней? Ці былі нечаканасці?
- Якія правы разглядаюцца ў гэтым практыкаванні?
- Артыкул 29 УДПЧ абвяшчае: «Кожны чалавек мае абавязкі перад супольнасцю, у якой толькі і магчыма свабоднае і поўнае развіццё яго асобы». Якія найбольш важныя абавязкі вы несяце ў паўсядзённым жыцці?
- Якія ролі выконваюць розныя «бакі» ў справе прадухілення парушэнняў правоў кожнага чалавека?
- Якія ролі выконваюць розныя «бакі» ў справе забеспячэння доступу кожнага да адукацыі ў галіне правоў чалавека?

## Парады для фасілітатараў

Выкарыстанне нітак чатырох розных колераў (кожны з якіх адпавядае аднаму з «бакоў») дапаможа зрабіць схему больш прывабнай, што таксама дазволіць лягчэй адсачыць сувязі паміж патрабаваннямі, напрыклад, усе патрабаванні грамадзян будуць жоўтага колеру, а патрабаванні СМІ – чорнага.

Падчас працы над 5-м пунктам інструкцый, пасля таго як групы складуць спісы сваіх функцый, не абмяркоўвайце іх занадта доўга на агульным пасяджэнні. Лепш выкарыстайце гэты час для тлумачэння наступнага этапа працы ў малых групах. Нагадайце групам, што яны могуць пазначыць для сябе функцыі іншых груп.

Калі групам цяжка прыдумаць функцыі, прапануйце ім падумаць, што робіць іх «бок» і чаго б мы пазбавіліся, калі б яго не было. Каб дапамагчы групам у вырашэнні гэтай задачы, вы можаце прывесці некалькі прыкладаў:

- урады ствараюць праекты законаў, распрацоўваюць агульную палітыку і забяспечваюць жыццё краіны ў рамках бюджэту;
- НГА лабіруюць інтарэсы меншасцей, займаюцца складанымі праблемамі, якімі ўрад (ці апазіцыя) не займаюцца, і праводзяць кампаніі за ўнясенне зменаў у заканадаўства;

- СМІ паведамляюць пра палітыку ўрада, расследуюць складаныя праблемы і даюць аналіз і каментарыі;
- да «функцый» грамадзян адносіцца ўсё, што важна ў дэмакратычным грамадстве; дыяпазон ідэй можа быць шырокім – ад балаціравання ў парламент да ўдзелу ў актыўнай барацьбе за правы чалавека, стварэння арганізацый для абароны асобных груп насельніцтва, накіравання запытаў, удзелу ў палітычным жыцці і г. д.

Падчас складання спісаў на этапе 5 папярэдзьце групы, каб іх патрабаванні да іншых «бакоў» не былі занадта нерэалістычнымі. Патрабаванні павінны быць прымальнымі, таму не трэба ставіць несправядлівыя або празмерныя патрабаванні.

Падчас працы над пунктам 9 давядзіце да ведама ўдзельнікаў, што перагаворы не трэба ўспрымаць як «спаборніцтва» ці траціць на іх занадта шмат часу. Асабліва падкрэсліце, што групы павінны ўспрымаць гэту працу як *супрацоўніцтва* з мэтай стварыць грамадства, у якім «бакі» дзейнічаюць сумесна для агульнага задавальнення. Такім чынам, пагадненняў пажадана дасягнуць адносна хутка: скажыце групам, што ім трэба згаджацца з разумнымі патрабаваннямі і адкідваць неразумныя, пакідаючы спрэчныя пытанні для абмеркавання на далейшых этапах працы.

Калі трэба дапамагчы групе асэнсаваць патрабаванні і адказнасць, можна прывесці ў прыклад адносіны паміж СМІ і грамадзянамі: журналістам трэба даведацца, дзе адбываецца тая ці іншая падзея, а грамадзяне абавязаны папярэджваць СМІ і даваць паказанні сведак.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**15 верасня**
Міжнародны дзень дэмакратыі

## Варыянты

Практыкаванне можна зрабіць больш ці менш складаным, змяняючы колькасць «бакоў» у грамадстве; напрыклад, можна дадаць такія «бакі», як «дзелавыя колы», «меншасці», «уразлівыя групы» і г. д. Аднак гэта таксама значна ўскладніць працэс перагавораў, і ў такім выпадку будзе цяжка выслухаць патрабаванні кожнай з груп належным чынам. Вы можаце таксама выкарыстаць катэгорыі грамадства, больш набліжаныя да жыцця моладзі, напрыклад замяніць «грамадзян» «моладдзю», а «ўрад» – «навучальнай установай».

Каб спрасціць практыкаванне, можна разбіць удзельнікаў на меншую колькасць груп, напрыклад толькі на «грамадзян» і «ўрад». Гэты варыянт пераважны пры невялікай колькасці ўдзельнікаў.

Можна паспрабаваць правесці практыкаванне без складання «тэзісаў»: тады ў ходзе перагавораў прадстаўнік першай групы будзе трымаць адзін канец ніткі ў руцэ, а другі працягне каму-небудзь з другой групы. Да канца практыкавання ўсе члены «грамадства» будуць фізічна звязанымі паміж сабой, калі не кінуць канцы нітак!

## Прапановы па далейшай працы

Група можа працягнуць ускладняць схему, дадаючы да яе розныя групы грамадства (гл. «Варыянты»). Для большай яснасці можна перанесці схему на іншы аркуш паперы. Падумайце пра тое, якія сувязі недастаткова развіты ў вашым грамадстве і што можна зрабіць, каб сітуацыя змянілася.

Калі ўдзельнікі захочуць падумаць, у якім кірунку рухаецца грамадства і, у асаблівасці, якім бы яны хацелі бачыць яго развіццё, тады мае сэнс правесці практыкаванне «Варыянты нашай будучыні» на старонцы 240.

## Ідэі для дзеяння

Выканайце гэта практыкаванне яшчэ раз, але ўжо для аналізу таго, як узаемадзейнічаюць паміж сабой ваша мясцовае кіраўніцтва, мясцовыя СМІ, мясцовыя НГА і грамадзяне. Вызначце, дзе сувязі маглі б быць больш цеснымі, і прыцягніце да гэтага ўвагу «бакоў»: можна пісаць ім пісьмы, весці блог або размясціць артыкул у мясцовых СМІ. Вы маглі б пачаць на практыцы ўмацоўваць сувязі паміж вашай арганізацыяй, школай, ВНУ ці клубам і іншымі «бакамі».

**Раздатачныя матэрыялы**

**Правілы гульні**

1. Мэта практыкавання заключаецца ў тым, каб кожны «бок» дамогся прыняцця сваіх патрабаванняў іншымі «бакамі».
2. Перагаворы праводзяцца паміж парамі «бакоў» у тры раўнды:
   - раўнд 1: грамадзяне вядуць перагаворы з НГА, а СМІ – з урадам;
   - раўнд 2: грамадзяне вядуць перагаворы са СМІ, а НГА – з урадам;
   - раўнд 3: грамадзяне вядуць перагаворы з урадам, а СМІ – з НГА.
3. У кожным раўндзе пары самі вырашаюць, каму пачынаць, і па чарзе ставяць патрабаванні адзін да аднаго.
4. Удзельнікі, якія ставяць патрабаванне, павінны пры гэтым імкнуцца да яснасці і выразнасці. Пажадана растлумачыць, што канкрэтна ўваходзіць у патрабаванне і чаму яго трэба задаволіць, г. зн., чым яно дапаможа гэтаму «боку» выканаць свае ўласныя функцыі.
5. Перш чым вырашыць, як паступіць – прыняць або не прыняць патрабаванне, трэба прааналізаваць, наколькі яно справядліва і наколькі ажыццявіма.
6. Калі «бок» прымае патрабаванне, пары прымацоўваюць абодва канцы ніткі скотчам да адпаведных аркушаў, што азначае, што пагадненне дасягнута. «Бок», які згаджаецца, робіць кароткі запіс у сваіх «тэзісах» сінім маркерам, каб памятаць пра сваю адказнасць і пра тое, што яны пагадзіліся рабіць.
7. Калі «бок» адхіляе патрабаванне, адрэзак ніткі трэба адкласці ў бок.
8. Вядзіце перагаворы, пакуль усе патрабаванні не будуць абмеркаваны.
9. У кожным раўндзе працэс паўтараецца да таго часу, пакуль не з'явяцца сувязі паміж усімі чатырма «бакамі».
10. У канцы гэтага працэсу павінна атрымацца схема сувязей паміж рознымі «бакамі» ў дэмакратычнай краіне. У кожнага з «бакоў» будзе спіс «тэзісаў» з пералікам іх функцый, напісаны чырвоным маркерам, спіс патрабаванняў іншых «бакоў», напісаны зялёным маркерам, а таксама спіс дзеянняў, на якія яны згадзіліся, каб задаволіць патрабаванні іншых «бакоў», напісаны сінім маркерам. Патрабаванні і дзеянні будуць прадстаўлены каляровымі ніткамі.















# Тэгі памяці

*Да таго часу, пакуль у львоў не будзе сваіх гісторыкаў, апавяданні пра паляванне будуць праслаўляць паляўнічых.*

Афрыканская прыказка

**Тэмы**
- гістарычная памяць,
- вайна і тэрарызм,
- культура і спорт.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** 10–15 чалавек

**Час** 120 хвілін

**Агляд** Удзельнікі агульнымі намаганнямі ствараюць «воблака тэгаў», каб адлюстраваць свае думкі і пачуцці, якія абуджаюць у іх ваенныя мемарыялы.

**Звязаныя правы**
- права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць;
- права на ўдзел у культурным жыцці;
- свабода думкі і сумлення.

**Мэты**
- паразважаць пра гістарычныя факты і міфы аб мінулых войнах і ролю ваенных мемарыялаў;
- развіць творчы патэнцыял і навыкі самастойнага мыслення;
- спрыяць развіццю фантазіі і спачування.

**Матэрыялы**
- папера для фліпчарта;
- скотч;
- мноства каляровых маркераў;
- фатаграфіі ваенных мемарыялаў (па жаданні);
- прыклады воблакаў тэгаў (па жаданні).

**Падрыхтоўка**
- Зрабіце вялікі аркуш паперы (памерам прыкладна 1,5 х 1,5 м), склеіўшы скотчам некалькі лістоў паперы для фліпчарта. Ліст павінен быць дастаткова вялікім, каб уся група магла размясціцца вакол яго.
  Правядзіце праз сярэдзіну аркуша тонкую лінію.

Гістарычная памяць

Вайна і тэрарызм

Культура і спорт

Узровень 2

10–15 чалавек

120 хвілін

## Інструкцыі

1. Пераканайцеся, што кожны ведае, што такое «воблака тэгаў», і растлумачце, што група, не звяртаючыся да камп’ютара, будзе ствараць воблака тэгаў для ілюстрацыі асацыяцый і ўспамінаў, якія абуджаюць у іх ваенныя мемарыялы.
2. Папрасіце, каб кожны з удзельнікаў падумаў пра нацыянальны мемарыял, узведзены недалёка ад месца яго жыхарства ў якасці напаміну аб вайне, напрыклад аб Другой сусветнай вайне. Няхай яны паспрабуюць успомніць, як ён выглядае, і адзначаць пачуцці, думкі і асацыяцыі – як станоўчыя, так і адмоўныя, – якія выклікае ў іх гэты мемарыял.
3. Раздайце ўсім каляровыя маркеры і папрасіце размясціцца вакол аркуша паперы. Няхай кожны ўдзельнік запіша свой «тэг» на лісце паперы ў адпаведнасці з наступнымі агульнымі прынцыпамі:
   a. тэгі абсалютна індывідуальныя: яны проста паказваюць, як вы ўспрымаеце пэўны аб'ект;
   b. адмоўныя асацыяцыі павінны размяшчацца па левы бок ад лініі пасярэдзіне; чым больш яны адмоўныя, тым бліжэй да левага краю аркуша яны павінны размяшчацца;
   c. станоўчыя пачуцці трэба запісаць на правым баку аркуша; чым яны больш станоўчыя, тым бліжэй да правага краю аркуша яны павінны размяшчацца;
   d. калі мемарыял выклікае моцныя пачуцці, іх трэба запісаць больш вялікім (тоўстым) шрыфтам, чым слабыя пачуцці.

4. Калі ўсе ўдзельнікі запішуць свае тэгі, папрасіце іх адысці ад аркуша і ацаніць «воблака тэгаў» – вынік калектыўнай працы. Цяпер спытайце:
    a. Ці ёсць у «воблаку» моцныя ідэі або вобразы?
    b. Ці здзівіў удзельнікаў які-небудзь з тэгаў?
    c. На аркушы адлюстравана больш станоўчых ці адмоўных пачуццяў?
    d. Якія пачуцці аказаліся самымі моцнымі?
    e. Як вы думаеце, якой трэба памятаць вайну будучым пакаленням? Ці не хапае чаго-небудзь у «воблаку», ці не трэба яго падправіць?
5. Цяпер папрасіце ўдзельнікаў зноў узяць у рукі маркеры. На гэты раз яны павінны думаць не пра рэальныя, існуючыя мемарыялы, а пра ўяўны мемарыял, які мог бы ўвасобіць для кожнага з іх сутнасць вайны. Працэс стварэння тэгаў трэба паўтарыць: няхай кожны з удзельнікаў запіша свае тэгі на той жа аркуш, дзе запісаны першыя ідэі. Падкрэсліце, што першае воблака тэгаў з'яўляецца цяпер грамадскім здабыткам, які нельга сціраць, таму новыя тэгі трэба размясціць над першапачатковымі.
6. Калі «воблака» атрымае завершаны выгляд, папрасіце ўсіх яшчэ раз паглядзець на карціну ў цэлым, а затым пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з абмеркавання працэсу стварэння воблака тэгаў, а затым пераходзьце да пытанняў, якія тычацца памяці і правоў чалавека:

- Ці адчувалі вы, што можаце неяк паўплываць на форму атрыманага воблака? Ці былі вы расчараваны іншымі тэгамі, якія здаваліся больш моцнымі, чым тыя, што вы хацелі прапанаваць?
- Ці дзейнічалі вы самастойна падчас стварэння другога воблака або адчувалі спакусу абмеркаваць свае ідэі з іншымі і аб'яднаць намаганні?
- У якой ступені паўплывалі на вас тэгі іншых удзельнікаў ці тыя, што ўжо былі на аркушы?
- Ці моцна адрозніваецца канчатковае воблака ад першага і якія галоўныя ідэі на ім адлюстраваны?
- Ці перадае канчатковае воблака пасланні і ідэі пра Другую сусветную вайну, важныя для будучых пакаленняў, лепш, чым першапачатковае? Чаму? Чаму не?
- Чаму афіцыйныя мемарыялы, як правіла, «праслаўляюць» вайну? Вы самі таксама думаеце, што вайна павінна праслаўляцца?
- Ці ведаеце вы, што нават падчас вайны дзейнічаюць пэўныя мінімальныя стандарты, замацаваныя ў Жэнеўскай канвенцыі, якія павінны рэгуляваць дзеянні ваюючых бакоў? Вы можаце пералічыць якія-небудзь з гэтых стандартаў?
- Як вы думаеце, ці правільна, што салдаты фактычна губляюць сваё права на жыццё ў час вайны?
- Якую ідэю нясуць афіцыйныя помнікі пра іншы бок, пра «ворага»? Як мы павінны разумець гэтыя пасланні сёння?
- Ці лёгка вам было ўявіць сабе іншы мемарыял? Якім бы ён быў? Што вы лічыце важным і што – найбольш складаным у гэтай частцы задання?
- Ці могуць мемарыялы сапраўды нагадаць нам пра жахі вайны? Ці для гэтага яны існуюць?
- Як вы думаеце, ці хацелі б тыя, хто перажыў вайну ці загінуў на ёй, каб людзі памяталі пра гэты перыяд гісторыі? Ці адрознівалася б іх воблака тэгаў ад вашых?
- Калі б вы страцілі ў вайне кагосьці з блізкіх, як бы вы хацелі, каб пра іх памяталі, і што б вы хацелі расказаць пра вайну наступнаму пакаленню?
- Ці пашырыла гэта практыкаванне ваша разуменне правоў чалавека? Якім чынам?

## Парады для фасілітатараў

Вы можаце паэксперыментаваць з колерам. Напрыклад, вы маглі б прапанаваць, каб усе адмоўныя асацыяцыі былі напісаны чорным, а ўсе станоўчыя – іншым колерам. Можна выкарыстаць больш цёмныя і больш светлыя адценні па меры аддалення ад лініі пасярэдзіне. А калі вы захочаце, каб другое воблака адрознівалася ад першага, то можаце папрасіць, каб тэгі першага воблака былі напісаны адным колерам, а тэгі, якія дабавяцца пазней, – іншым.

Вы можаце выкарыстаць фатаграфіі мемарыялаў, калі лічыце, што гэта будзе карысна, але больш эфектыўна папрасіць удзельнікаў завяршыць першы этап напісання тэгаў па памяці – гэта сапраўды пакажа, якія тэгі памяці з'яўляюцца найбольш устойлівымі!

Абмеркаванне па пункце 4 зрабіце кароткім. Паспрабуйце разгледзець розныя ідэі наконт таго, чаму мы памятаем пра мінулае, і абудзіць ва ўдзельнікаў распрацоўку творчых ідэй наконт альтэрнатыўных тыпаў мемарыялаў. Калі ўдзельнікі лічаць, што першае воблака адлюстроўвае памяць аб падзеях менавіта такой, якой яны хацелі б яе захаваць, паспрабуйце выкарыстаць дадатковую інфармацыю па тэме памяці, якая прыводзіцца ў главе 5 на сайце www.coe.int/compass.

На другім этапе нанясення тэгаў дайце ўдзельнікам свабоду адаптаваць або змяняць першапачатковае воблака так, як яны хочуць, і дазвольце ім абмяркоўваць ідэі з іншымі, хаця іх рашэнні, у рэшце рэшт, павінны быць індывідуальнымі.

Трэба пакінуць досыць месца для новых слоў у другім раўндзе. Вам можа паказацца, што воблака атрымліваецца заблытаным, але гэта адлюстроўвае тое, што адбываецца, калі, выбіраючы словы і робячы пазнакі ў рэальным жыцці, вы сутыкаецеся з тым, што іншыя людзі ўжо зрабілі гэта раней за вас. Напісанне новых слоў паверх старых можа перадаць ідэю, што наша ўспрыманне абумоўлена культурай, а калі ўсе думаюць па-рознаму, бывае цяжка пачуць голас кожнага. Аднак вы можаце зрабіць і два асобных воблака тэгаў, калі думаеце, што ў гэтым выпадку вашай групе будзе прасцей аналізаваць свае думкі і пачуцці.

## Варыянты

Замест таго каб пісаць свае тэгі непасрэдна на аркушы паперы, удзельнікі маглі б пісаць іх на невялікіх лістках, якія можна лёгка перамяшчаць па вялікім аркушы. Гэта дазволіць уносіць змены на другім этапе, напрыклад, дасць магчымасць размясціць падобныя тэгі блізка адзін да аднаго для большай пераканаўчасці.

Вы можаце выкарыстаць іншыя падзеі ў гісторыі, калі лічыце, што яны падыдуць вашай групе лепш, чым Другая сусветная вайна, напрыклад халакост, Першая сусветная вайна, грамадзянская вайна ці рэгіянальныя войны. Важна толькі тое, каб гэтыя падзеі адзначаліся ў грамадстве тым ці іншым спосабам.

Маладым людзям было б цікава параўнаць сваё ўспрыманне вайны з успрыманнем тых людзей, якія перажылі яе жахі. Вы маглі б зрабіць перапынак пасля стварэння першага воблака і даць удзельнікам магчымасць спытаць у прадстаўнікоў старэйшага пакалення, якімі яны хацелі б пакінуць успаміны пра вайну для будучых пакаленняў і ці добра адлюстроўваюць іх існуючыя ваенныя мемарыялы.

Вы можаце выкарыстаць ідэю стварэння воблака тэгаў (на паперы або ў электронным выглядзе) у якасці далейшай працы для многіх іншых практыкаванняў «Компаса», асабліва калі хочаце сабраць матэрыял для выстаўкі.

Альтэрнатыўныя важныя даты: 27 студзеня – Міжнародны дзень памяці ахвяр халакосту і 23 жніўня – Міжнародны дзень памяці ахвяр гандлю рабамі і яго ліквідацыі.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**8–9 мая**
Дні памяці і прымірэння ў гонар тых, хто аддаў сваё жыццё падчас Другой сусветнай вайны

## Прапановы па далейшай працы

Прайдзіцеся па вашым раёне, каб падлічыць колькасць вуліц, названых у гонар камандуючых войскамі або знакамітых бітваў, і колькасць вуліц, названых у гонар вядомых людзей, якія змагаліся за мір. Высвятліце, хто ў горадзе вырашае, як называць вуліцы, і прапануйце імёны людзей, якія, на ваш погляд, вартыя таго, каб пра іх памяталі.

Калі ўдзельнікі хацелі б даведацца, як іх воблака тэгаў выглядае з боку, вы маглі б папрасіць двух добраахвотнікаў стварыць на аснове рукапіснага электроннае воблака тэгаў, выкарыстоўваючы рэсурс http://www.wordle.net/create. Яго можна затым раздрукаваць або захаваць для публічнага прагляду і знаёмства з думкамі моладзі пра мемарыялы.

Вы можаце звярнуцца да практыкавання «Хвіліначку!» на старонцы 199, дзе знойдзеце прапановы для разгляду пытанняў, звязаных з гістарычнай памяццю і, у прыватнасці, з Алімпійскім стадыёнам у Берліне, пабудаваным па загадзе Гітлера, і падумаць, як варта далей выкарыстаць гэты будынак.

Калі група захоча паразважаць пра нашых герояў і гераінь і пра тое, як мы іх памятаем і паважаем, вы можаце папрацаваць з практыкаваннем «Гераіні і героі» на старонцы 186.

## Ідэі для дзеяння

Нават калі вы вырашыце правесці гэта практыкаванне ў рамках аднаго занятку, не забудзьце папрасіць маладых людзей пагаварыць з прадстаўнікамі старэйшага пакалення, каб быць больш інфармаванымі.

Арганізуйце правядзенне мерапрыемства, прысвечанага памяці героя, які змагаўся на мір. Яго можна правесці ў форме фестывалю музыкі і танца, выстаўкі або імправізацыі, падчас якога калектыўнымі намаганнямі ўзводзіцца помнік. Забяспечце рэкламу мерапрыемства і папрасіце людзей прынесці прадмет, які для іх з'яўляецца сімвалам памяці. Гэта можа быць што хочаце, напрыклад белы мак як сімвал міру, фатаграфіі загінуўшых на вайне сваякоў ці абутак, які хтосьці насіў, калі яны ўпершыню прыехалі ў гэту краіну і папрасілі прытулку.

## Дадатковая інфармацыя

«Воблака тэгаў» або «воблака слоў» (ці нават «спіс узважаных слоў» у візуальным дызайне) уяўляе сабой візуальнае ўвасабленне «тэгаў» або ключавых слоў. Звычайна словы пералічваюцца ў алфавітным парадку, а важнасць таго ці іншага тэга вылучаецца памерам шрыфту або колерам, таму воблака тэгаў можна разглядаць як адмысловы графік. У Інтэрнэце, дзе гэта ідэя была распрацавана, тэгі, як правіла, звязаны паміж сабой гіперспасылкамі, якія вядуць да мноства элементаў, якія так ці інакш звязаны з тэгам.

На наступнай старонцы прыводзіцца прыклад таго, як могуць выглядаць тэгі.

## Раздатачныя матэрыялы

**Інструкцыі**

- Правядзіце тонкую лінію пасярэдзіне аркуша.
- Адмоўныя асацыяцыі трэба пісаць у левай частцы аркуша, і чым больш адмоўнымі яны з'яўляюцца, тым бліжэй да левага краю яны павінны знаходзіцца.
- Станоўчыя пачуцці трэба пісаць у правай частцы аркуша, і чым больш станоўчымі яны з'яўляюцца, тым бліжэй да правага краю яны павінны знаходзіцца.
- Найбольш моцныя пачуцці, абуджаныя мемарыялам, трэба запісаць таўсцейшым (больш вялікім) шрыфтам, чым слабейшыя пачуцці.

**Прыклад таго, як можа выглядаць воблака тэгаў**



COMPASS

СМІ

Мір і гвалт

Адукацыя

Узровень 3

4–30 чалавек

90 хвілін

# Маё жыццё не шоу!

*«Палкі і камяні могуць зламаць мне косці, але словы таксама могуць зрабіць мне балюча!»*[1]

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • СМІ,<br>• мір і гвалт,<br>• адукацыя. |
| **Складанасць** | узровень 3 |
| **Памер групы** | 4–30 чалавек |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне накіравана на развіццё дасведчанасці аб злоўжываннях у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) у цэлым і аб кіберцкаванні ў прыватнасці. |
| **Звязаныя правы** | • права на свабоду думкі, перакананняў і выказвання меркавання;<br>• свабода ад умяшання ў асабістае жыццё, сям'ю, жыллё і перапіску;<br>• свабода ад бесчалавечнага абыходжання або абыходжання, якое зневажае чалавечую годнасць. |
| **Мэты** | • павысіць дасведчанасць аб неправамерным выкарыстанні мабільнага тэлефона і Інтэрнэту;<br>• развіць навыкі творчага мыслення і знайсці спосабы барацьбы з «кіберзлачыннасцю»;<br>• абудзіць пачуцці суперажывання і салідарнасці. |
| **Матэрыялы** | • фліпчарты і ручкі;<br>• спіс сцверджанняў;<br>• скотч або вяроўка, каб адзначыць лінію на падлозе. |
| **Падрыхтоўка** | • Азнаёмцеся з парадамі для фасілітатараў і растлумачце ўдзельнікам, што такое кіберцкаванне, у чым яно праяўляецца і якія шляхі яго выкаранення. Папярэдне вывучыце гэта пытанне і даведайцеся, якія законы супраць кіберцкавання прыняты ў вашай краіне. |

## Інструкцыі

1. Пачніце з кароткага мазгавога штурму на тэму цкавання. Папрасіце ўдзельнікаў пару хвілін падумаць аб гэтай з'яве, даць ёй вызначэнне і расказаць, у чым яна праяўляецца. Затым збярыце адказы і запішыце іх на фліпчарце.
2. Паўтарыце тое ж самае на тэму кіберцкавання і запішыце адказы на новай паперы фліпчарта.
3. Адзначце на падлозе лінію з дапамогай скотча або вяроўкі, даўшы ёй назву «так-лінія». Папрасіце ўдзельнікаў выстраіцца ў дзве шарэнгі па абодва бакі «так-лініі».
4. Растлумачце, што вы збіраецеся зачытаць некалькі сцверджанняў пра кіберцкаванне і просіце даць на іх адказ, не выкарыстоўваючы слоў. Той, хто згодны са сцверджаннем, павінен зрабіць крок наперад і стаць на «так-лінію». Папрасіце ўсіх адказваць сумленна.
5. Зачытайце першае сцверджанне. Дайце ўдзельнікам час на абдумванне і адказ. Затым папрасіце іх азірнуцца кругом і звярнуць увагу на тое, колькі чалавек стала на «так-лінію».
6. Папрасіце ўсіх вярнуцца на зыходныя пазіцыі і зачытайце наступнае сцверджанне.
7. Атрымаўшы адказ на апошняе сцверджанне, збярыце ўсіх у круг і пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

[1]Фраза «**Палкі і камяні могуць зламаць мне косці, але ад слоў мне ніколі не будзе балюча**» часта прыпісваецца рабам эпохі рабства ў ЗША. Ідэя заключалася ў тым, што, калі наглядчык толькі праклаў цябе і абазваў зневажальнымі словамі, то гэта было намнога лепш, чым быць жорстка пакараным пугай.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з каменціравання сцверджанняў і ўражанняў ад іх, а затым пераходзьце да размовы пра тое, што агульнага можна знайсці ў розных відах цкавання і як з імі змагацца.

- Што вы ведалі пра кіберцкаванне да гэтага практыкавання?
- Ці ўсё сцверджанні апісваюць настолькі сур'ёзныя сітуацыі, што іх можна аднесці да кіберцкавання? Чаму так? Чаму не?
- Ці існуюць іншыя віды кіберцкавання, якія не былі згаданы?
- Наколькі распаўсюджана такая з'ява ў вашым асяроддзі і ў вашай краіне?
- Якія правы чалавека парушаюцца пры кіберцкаванні?
- Чаму людзі цкуюць іншых? Чаму людзі становяцца ахвярамі?
- Чаму людзі, якія былі ахвярамі цкавання, часам пачынаюць цкаваць іншых?
- Што можна зрабіць, каб спыніць кіберцкаванне? Што могуць зрабіць ахвяры? Што могуць зрабіць іншыя?
- Што вы можаце зрабіць, каб абараніць сябе ад кіберцкавання?
- Якія правы чалавека знаходзяцца пад пагрозай, калі кагосьці цкуюць?
- Артыкул 19 УДПЧ абвяшчае: «Кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў і на свабоднае іх выказванне; гэта права ўключае свабоду бесперашкодна прытрымлівацца сваіх перакананняў і свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі сродкамі і незалежна ад дзяржаўных меж». Ці трэба ўстанавіць абмежаванні на свабоду слова? Калі так, то якія будуць наступствы і хто павінен устанаўліваць такія межы? Калі свабода слова не можа быць абмежавана, якія будуць наступствы?

## Парады для фасілітатараў

Феномен цкавання і кіберцкавання закранае далікатныя пытанні, і вы павінны быць гатовы да таго, што некаторыя ўдзельнікі будуць рэагаваць на іх вельмі эмацыянальна, успомніўшы свой уласны сумны вопыт. Людзі, якія сталі аб'ектам цкавання, звычайна перажываюць пачуццё віны і сораму і не ўсведамляюць сябе ў якасці ахвяр, а тыя, хто цкуе, магчыма, таксама не зусім разумеюць, чаму яны гэта робяць. Такім чынам, перш чым прыступаць да вывучэння тэмы кіберцкавання, добра падрыхтуйцеся і падумайце аб мэтазгоднасці запрасіць якога-небудзь эксперта ў гэтай сферы, які мог бы вам дапамагчы.

Прыклады таго, як варта адказваць на цкаванне:

- Не адказвайце на пагрозы або зневажальныя ці паклёпніцкія паведамленні.
- Складзіце чорны спіс адрасоў электроннай пошты.
- Змяніце адрас электроннай пошты.
- Змяніце пастаўшчыка паслуг інтэрнэту.
- Змяніце рахунак мабільнага тэлефона.
- Захоўвайце абразлівыя паведамленні ў якасці доказу.
- Абмяркуйце праблему з тым, каму давяраеце. Калі вы дзіця, у нейкі момант вам давядзецца прыцягнуць дарослых.
- У некаторых сітуацыях вы можаце выступіць супраць хулігана. Арганізуйце сустрэчу з удзелам пасрэдніка і паспрабуйце дапамагчы хулігану зразумець наступствы яго дзеянняў.
- У некаторых выпадках будзе мэтазгодна звязацца з мясцовым аддзяленнем паліцыі або пракансультавацца з адвакатам.

Звярніце ўвагу, што не рэкамендуецца прымаць меры ў адказ, г. зн. адказваць хулігану тым жа спосабам, таму што такія паводзіны могуць прывесці да грамадзянскага або крымінальнага іску супраць вас.

Прыклады дзеянняў, якія можна зрабіць, каб абараніць сябе ад цкавання:

- Скараціце час у Інтэрнэце – не трэба быць анлайн увесь час.
- Ніколі не адкрывайце электронныя паведамленні ад людзей, якіх вы не ведаеце.
- Рэгулярна мяняйце свае паролі.
- Не пазначайце ў сваім профілі занадта шмат асабістых даных.

Самае галоўнае ў гэтым практыкаванні заключаецца ў тым, каб удзельнікі зразумелі, што нельга маўчаць, а, наадварот, трэба абмеркаваць з кім-небудзь праблему, калі яны самі сутыкнуліся з ёй або калі сталі яе сведкам.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**8 лютага**
Сусветны дзень бяспечнага Інтэрнэту

Адукацыя з'яўляецца ключом як да прадухілення цкавання, так і да яго спынення. Механізм гэтай з'явы вельмі складаны, і прычыны ў кожным канкрэтным выпадку бываюць рознымі, але абодва бакі – ахвяра і хуліган – павінны зразумець складанасць сацыяльных і псіхалагічных фактараў, якія ўплываюць на праблему, каб пачаць шлях да яе вырашэння. Ахвярамі становяцца часцей за ўсё людзі сарамлівыя, адчувальныя, чымсьці заклапочаныя і няўпэўненыя ў сабе; іх вылучае нізкая самаацэнка і адсутнасць сацыяльных навыкаў. Сярод фізічных асаблівасцей, якія, як правіла, становяцца прадметам цкавання, варта адзначыць такія, як залішняя вага, нізкі рост, наяўнасць інваліднасці ці прыналежнасць да іншай расы, рэлігійнай або сацыяльнай групы. Людзі, якія цкуюць іншых, робяць гэта, мяркуючы, што ў выніку яны будуць адчуваць сябе больш моцнымі і важнымі, здольнымі кіраваць іншымі людзьмі. Яны таксама думаюць, што ў вачах іншых яны будуць выглядаць экстраардынарнымі і набудуць папулярнасць. Цкаванне таксама з'яўляецца для іх спосабам прыцягнуць увагу да сваёй персоны, атрымаць тое, што хочуць, або пакараць тых, каму зайздросцяць.

## Варыянты

Многія з тых, каго цкавалі, пазней самі пачыналі цкаваць іншых, таму вельмі важна прымусіць людзей задумацца аб асабістай адказнасці. Зачытаўшы сцверджанні, правядзіце другі раўнд, але ў гэты раз з пункту гледжання таго, хто цкуе іншых. Пры гэтым не патрабуйце ад удзельнікаў уставаць на «так-лінію» – няхай яны пастаяць на сваіх месцах і паразважаюць. Можаце адаптаваць сцверджанні наступным чынам: «Вы калі-небудзь адкрывалі чужую паштовую скрыню без згоды ўладальніка?» або «Вы калі-небудзь карысталіся чужым мабільным тэлефонам без згоды ўладальніка?»

Калі для вашай групы тэма цкавання з'яўляецца прызнанай праблемай, вы можаце разгледзець яе больш глыбока. У такіх выпадках форум-тэатр з'яўляецца добрым спосабам зразумець прычыны цкавання і выпрацаваць метады барацьбы з ім. Папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на малыя групы, каб абмеркаваць вядомыя ім рэальныя выпадкі цкавання. Гэта можа быць інцыдэнт, у якім апынуліся яны самі або нехта з іх знаёмых. Кожная група павінна выбраць адзін эпізод, з якім яна хацела б працаваць. Удзельнікі павінны паспрабаваць уявіць сабе прычыны, якія заахвоцілі хулігана цкаваць іншых, як на самай справе адбыўся інцыдэнт, што было потым і якія былі наступствы. Затым кожная малая група павінна разыграць эпізод у форме кароткай п'есы перад усёй групай. Па завяршэнні спектакля папрасіце ўдзельнікаў паўтарыць фінальную сцэну – «што здарылася з прычыны цкавання» – і запрасіце «публіку» прапанаваць альтэрнатыўныя дзеянні ахвяр.

## Прапановы па далейшай працы

Прыдумайце лозунг для кампаніі па барацьбе з кіберцкаваннем.

Распрацуйце палітыку барацьбы з кіберцкаваннем для вашай школы або клуба ці прапануйце пераглядзець існуючую палітыку.

Вы можаце вывучыць іншыя аспекты гвалту, звярнуўшыся да практыкавання «Гвалт у маім жыцці» на старонцы 317.

## Ідэі для дзеяння

Выкарыстайце ідэю другога варыянта фіналу, апісаную вышэй, і разыграйце вашы п'есы перад іншымі навучэнцамі, маладзёжнымі групамі ці бацькамі.

Арганізуйце публічныя дэбаты наконт гэтага пытання ў вашай школе або клубе, таму што многія настаўнікі і бацькі не ведаюць пра тое, што адбываецца.

Даведайцеся, ці праводзіцца ў вашым раёне інфармацыйная кампанія пра рызыкі і злоўжыванні ў сферы ІКТ, і падумайце, як вы можаце прыняць у ёй удзел.

## Дадатковая інфармацыя

Кіберцкаванне – гэта выкарыстанне электроннай пошты, сэрвісаў імгненных паведамленняў, чатаў, пэйджараў, мабільных тэлефонаў або іншых форм інфармацыйных тэхналогій з мэтай наўмысна праследаваць ці запалохваць кагосьці або пагражаць яму. Яно можа ўключаць такія дзеянні, як:

- выказванне пагрозы;
- адпраўленне
- правакацыйных, абразлівых паведамленняў на тэму расавай ці этнічнай прыналежнасці;
- нападкі на гомасексуалаў;
- спробы заразіць камп’ютар ахвяры вірусам;
- спробы запоўніць электронную паштовую скрыню бессэнсоўнымі паведамленнямі;
- размяшчэнне ў сетцы або распаўсюджванне лжывай інфармацыі пра чалавека з мэтай нанясення шкоды яму або яго рэпутацыі;
- ізаляцыя кагосьці ад групы і запрашэнне іншых здзекавацца або жартаваць з яго;
- спроба выдаць сябе за кагосьці іншага з тым, каб астатнія падумалі, што менавіта той чалавек сказаў нешта, у што сам хуліган не верыць або чаго ён не казаў;
- распаўсюджванне фотаздымкаў чалавека, асабліва тых, на якіх ён паўстае ў няёмкай сітуацыі, без яго дазволу;
- абмен паведамленнямі электроннай пошты без дазволу аўтара;
- аказанне ціску на іншых з мэтай выключыць каго-небудзь з супольнасці (анлайн або афлайн);
- неаднаразовае адпраўленне камусьці непрыемных, злосных і абразлівых паведамленняў.

Кіберцкаванне часта бывае справай рук дзяцей, але яно зусім не зводзіцца да дзяцей. Адна з самых вялікіх праблем у барацьбе з кіберцкаваннем заключаецца ў тым, што хуліган застаецца ананімным, што ўскладняе яго пошукі.

У Інтэрнэце ёсць шмат сайтаў, прысвечаных паводзінам у сітуацыі кіберцкавання. Пашукайце звесткі пра мясцовыя ініцыятывы. Агульную інфармацыю можна знайсці на наступных сайтах:
http://www.stopcyberbullying.org/
http://yp.direct.gov.uk/cyberbullying/
http://europa.eu/legislation_summaries

**Канвенцыя Савета Еўропы аб кіберзлачыннасці**

Канвенцыя аб кіберзлачыннасці, якая ўступіла ў сілу 1 ліпеня 2004 года, з'яўляецца першым міжнародным дагаворам аб злачынствах, якія здзяйсняюцца праз Інтэрнэт і іншыя камп’ютарныя сеткі і складаюцца, у прыватнасці, у парушэнні аўтарскіх правоў, камп’ютарным махлярстве, дзіцячай парнаграфіі і парушэнні бяспекі сеткі. Яна таксама змяшчае шэраг паўнамоцтваў і працэдур, такіх як пошук у камп’ютарных сетках і перахоп паведамленняў. Зайдзіце на http://conventions.coe.int і знайдзіце дагавор № 185.

## Сцверджанні

- Ці адкрываў хто-небудзь калі-небудзь вашу паштовую скрыню без вашай згоды?
- Ці чытаў хто-небудзь калі-небудзь вашы (тэкставыя) SMS-паведамленні без вашай згоды?
- Ці дасылаў вам хто-небудзь калі-небудзь абразлівыя паведамленні, непрыемныя відарысы або відэа на ваш мабільны тэлефон або на адрас вашай электроннай пошты?
- Ці адпраўляў хто-небудзь калі-небудзь інфармацыю (фота, відэа) пра вас камусьці яшчэ без вашай згоды?
- Ці размяшчаў хто-небудзь калі-небудзь фотаздымкі або інфармацыю пра вас на вэб-сайце або на старонцы ў сацыяльных сетках без вашай згоды?
- Ці рэдагаваў хто-небудзь вашы матэрыялы фотаздымкаў або відэа без вашай згоды?
- Ці давалі вы калі-небудзь каму-небудзь вашы паролі?
- Ці абражаў вас хто-небудзь у чаце інтэрактыўнай гульні?
- Ці атрымлівалі вы калі-небудзь трывожныя (непрыемныя) тэлефонныя званкі?
- Ці рабіў хто-небудзь недарэчныя каментарыі ў вашым блогу (на вашай старонцы ў сацыяльных сетках)?
- Ці рассылаў хто-небудзь ілжывую (непрыемную) інфармацыю (чуткі) пра вас па электроннай пошце ці па SMS?
- Ці ведаеце вы каго-небудзь, хто стаў ахвярай кіберцкавання?
- Ці ведаеце вы, што існуюць спецыяльныя законы аб гвалце такога роду?
- Як вы думаеце, ці павінны быць устаноўлены межы таго, што людзі могуць размяшчаць у Інтэрнэце?
- Ці варта забараніць мабільныя тэлефоны ў школах?

Грамадзянскасць і ўдзел

Дэмакратыя

Культура і спорт

Узровень 3

12–30 чалавек

120 хвілін

# На лесвіцы

*«Мы як грамадзяне абавязаны ўмяшацца і прыняць удзел, бо менавіта грамадзяне змяняюць становішча рэчаў».*

Жазэ Сарамагу

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • грамадзянскасць і ўдзел,<br>• дэмакратыя,<br>• культура і спорт. |
| **Памер групы** | 12–30 чалавек |
| **Складанасць** | узровень 3 |
| **Час** | 120 хвілін |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне ўключае ролевую гульню і дыскусію. Удзельнікі разважаюць пра сэнс удзелу моладзі ў грамадскім жыцці і абмяркоўваюць магчымасці больш актыўнага ўдзелу іх саміх у жыцці мясцовай супольнасці. |
| **Звязаныя правы** | • права на ўдзел у кіраванні краінай і ў свабодных выбарах;<br>• права на ўдзел у культурным жыцці;<br>• свабода думкі і інфармацыі. |
| **Мэты** | • разгледзець спосабы ўдзелу моладзі ў грамадскім жыцці і фактары, якія перашкаджаюць або садзейнічаюць гэтаму ўдзелу;<br>• развіць навыкі супрацоўніцтва, арганізацыі і ўдзелу ў акцыях сумесна з іншымі;<br>• развіць пачуццё адказнасці за свае дзеянні. |
| **Матэрыялы** | • раздатачныя матэрыялы: «Лесвіца ўдзелу» (гл. таксама даведачную інфармацыю па пытаннях грамадзянскасці і ўдзелу ў главе 5 на сайце www.coe.int/compass);<br>• вялікі аркуш паперы, маркер і нажніцы;<br>• стыкеры або маленькія лісткі паперы для замацавання скотчам на сцяне;<br>• сцяна. |
| **Падрыхтоўка** | • зрабіце копіі раздатачных матэрыялаў, па адным экзэмпляры на малую групу;<br>• зрабіце 6 знакаў: «Перашкоды», «Кантроль», «Няма кантролю», «Спрыяльныя ўмовы», «Кантроль», «Няма кантролю». |

## Інструкцыі

**Частка 1**. Што такое лесвіца ўдзелу? (45 хвілін)

1. Спытайце ўдзельнікаў, як яны разумеюць тэрмін «удзел моладзі».
2. Раздайце копіі дыяграмы з лесвіцай удзелу і растлумачце, што гэта мадэль для разважання аб розных спосабах удзелу. Коратка абмяркуйце розныя ўзроўні.
3. Падзяліце групу на 8 малых груп. Выдзеліце кожнай групе адзін узровень удзелу і папрасіце кожную з іх падрыхтаваць кароткую ролевую гульню на 2–3 хвіліны для ілюстрацыі ўзроўню ўдзелу, які ёй выпаў.
4. Калі групы будуць гатовы, прапануйце ім па чарзе прадставіць свае сцэнкі. Дазвольце ўдзельнікам задаваць пытанні або, калі яны захочуць, вылучыце час для абмеркавання кожнай гульні пасля яе завяршэння.

**Частка 2**. Як мы ўдзельнічаем

5. Папрасіце ўдзельнікаў на працягу 5 хвілін падумаць і ўспомніць прыклады са свайго жыцця па найбольшай колькасці ўзроўняў з 8. Няхай яны падумаюць аб усіх аспектах свайго жыцця: дома, у школе, у клубе, на працы, з сям'ёй і з сябрамі.

6. Потым прапануйце ўдзельнікам падзяліцца сваімі прыкладамі ў малых групах па 4–5 чалавек. Папрасіце ўдзельнікаў, каб пры абмеркаванні прыкладаў яны прыдумалі магчымыя варыянты перашкод (таго, што перашкаджае ім рухацца ўверх па лесвіцы) і спрыяльных умоў (таго, што дапамагае ім рухацца ўверх па лесвіцы). Кожны варыянт яны павінны запісаць на асобны стыкер.
7. Пакуль групы вядуць свае дыскусіі, прыляпіце падрыхтаваныя знакі «Перашкоды» і «Спрыяльныя ўмовы» на сцяну на адлегласці каля 2 метраў адзін ад аднаго. Затым збярыце групы на агульнае абмеркаванне і папрасіце іх прыляпіць стыкеры са сваімі варыянтамі на сцяну пад адпаведнымі загалоўкамі.
8. Абмяркуйце абодва спісы варыянтаў з удзельнікамі. Папрасіце іх растлумачыць любыя неадназначныя сцверджанні і паспрабуйце вырашыць любое рознагалоссе паміж удзельнікамі адносна месца, якое павінна заняць кожнае сцверджанне.
9. Цяпер прыляпіце на сцяну загалоўкі «Кантроль» і «Няма кантролю», размясціўшы іх пад першымі загалоўкамі, і папрасіце ўдзельнікаў падзяліць кожны спіс сцверджанняў на дзве падгрупы ў залежнасці ад таго, ці маюць яны (або ці могуць мець) кантроль над гэтымі рэчамі, або сцверджанні падпадаюць пад уплыў знешніх фактараў, якія знаходзяцца па-за межамі кантролю ўдзельнікаў.
10. У канцы яшчэ раз агледзьце палажэнне ўсіх чатырох спісаў на сцяне. Затым пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

- Ці дапамагло вам гэта практыкаванне больш грунтоўна паразважаць пра формы свайго ўдзелу ў розных сферах жыцця? Што вас здзівіла больш за ўсё?
- Як вы думаеце, удзел моладзі ў цэлым знаходзіцца на высокім або нізкім узроўні – у вашай школе, клубе, па месцы жыхарства? Якія прычыны гэтага?
- Ці мае нейкае значэнне актыўны ці неактыўны ўдзел моладзі ў жыцці грамадства? Чаму?
- Ці лічаць удзельнікі нізкі ўзровень удзелу моладзі вынікам уплыву пераважна ўнутраных (псіхалагічных) або пераважна знешніх фактараў?
- Як людзі разумеюць, што маюць магчымасць удзельнічаць у сапраўдным сэнсе слова, іншымі словамі, калі іх удзел перастае быць сімвалічным?
- Ці хацелі б члены групы мець магчымасць удзельнічаць на больш высокай «ступені» ў параўнанні з тым, што адбываецца ў гэты момант? Калі так, то ў якіх сферах? Назавіце аргументы «за» і «супраць».
- Ці хацелі б члены групы мець магчымасць удзельнічаць на больш нізкай «ступені» ў параўнанні з тым, што адбываецца ў гэты момант? Калі так, то ў якіх сферах? Назавіце аргументы «за» і «супраць».
- Колькі чалавек лічаць, што яны маглі б удзельнічаць больш актыўна ў параўнанні з тым, як яны ўдзельнічаюць у цяперашні час, і колькі з іх лічаць, што яны будуць удзельнічаць больш актыўна? Калі так, то як і калі?
- Якім чынам права на ўдзел у прыняцці рашэнняў гарантавана ў дакументах па правах чалавека?

## Парады для фасілітатараў

У 2-й частцы практыкавання папрасіце ўдзельнікаў прыдумаць як мага больш розных спосабаў удзелу. У пошуках ідэй парайце звярнуцца да даведачнай інфармацыі аб грамадзянскасці і ўдзеле на сайце www.coe.int/compass.

Пры тлумачэнні канцэпцыі лесвіцы ўдзелу паспрабуйце данесці да ўсіх, што гэта мадэль не сцвярджае, што знаходжанне на самым «высокім» узроўні заўсёды з'яўляецца лепшым варыянтам. У розных сітуацыях і ў залежнасці ад вопыту людзей, наяўнасці ў іх часу або ўзроўню зацікаўленасці можа аказацца найбольш дарэчным выступіць у якасці кансультанта або ў якасці прадстаўніка. Няма нічога па сутнасці «няправільнага» ў тым, калі з вамі ў пэўных умовах проста кансультуюцца (або нават проста інфармуюць). Тым не менш тры ніжнія ступені – маніпуляцыя, упрыгожванне і імітацыя дзейнасці – з'яўляюцца непрымальнымі і не могуць разглядацца як «удзел», таму што ўдзел і ўклад у гэтым выпадках мінімальныя або ўвогуле адсутнічаюць. Вы павінны асабліва падкрэсліць гэты момант і быць упэўненымі ў тым, што ні ў каго на гэты конт няма ніякага сумнення.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**28 верасня**
Міжнародны дзень права ведаць

Калі група будзе разважаць пра спрыяльныя фактары і перашкоды, дапамажыце ім размясціць як мага больш сцверджанняў пад катэгорыяй «Кантроль». Вы можа прывесці некалькі прыкладаў або нагадаць ім, што «Перашкоды» могуць быць псіхалагічнымі, а таксама фізічнымі або структурнымі. У ходзе дыскусій падводзьце ўдзельнікаў да пошуку шляхоў у абыход рэчаў або сітуацый, якія здаюцца перашкодамі; напрыклад, калі ім здаецца, што «ўлады (настаўнікі ці кіраўніцтва клуба або ВНУ) не дазволяць нам», задайце ім пытанне, ці спрабавалі яны папрасіць у іх дазволу.

Калі яны скажуць: «Мы не думаем, што зможам гэта зрабіць», – спытайце ў іх, ці спрабавалі яны зрабіць гэта.

Калі яны скажуць: «Калі мы зробім гэта, то нашы бацькі (настаўнікі, мясцовыя ўлады) раззлуюцца», – дапамажыце ім знайсці іншыя спосабы пастаноўкі пытання такім чынам, каб згаданыя асобы рэагавалі па-іншаму.

Вы можаце выкарыстоўваць гэта практыкаванне як магчымасць пагаварыць аб ступені ўдзелу членаў групы ў вучобе і ў рабоце клуба ў цэлым. Яно можа дапамагчы вам вывучыць шляхі і спосабы, якія прывядуць да больш актыўнага ўдзелу і праяўлення ініцыятывы з іх боку.

Калі вынесці на абмеркаванне пытанне аб тым, ці не ствараюць некаторыя члены групы перашкод для іншых, пазбаўляючы іх магчымасці ўдзельнічаць на больш высокім узроўні, гэта можа стаць пачаткам размовы на тэму пра ціск з боку аднагодкаў і пра цкаванне.

## Варыянты

Вы можаце выкарыстаць ролевую гульню ў пачатку практыкавання для вывучэння пытання аб перашкодах і спрыяльных фактарах замест таго, каб маладыя людзі ўспаміналі аналагічныя прыклады з іх уласнага жыцця. Пасля кожнага выступлення выкарыстоўвайце тэхніку форум-тэатра (гл. главу 1, старонку 67) і прасіце ўдзельнікаў зноў разыграць сцэнку, але даць ёй іншы накірунак. Гэта дазволіць ім вывучыць шляхі пераадолення перашкод у сітуацыях, больш падобных на іх уласнае жыццё, што можа неяк паўплываць на ўзровень іх удзелу.

## Прапановы па далейшай працы

Складзіце разам з групай план дзеянняў, каб даць удзельнікам магчымасць адчуць адказнасць і ўзяць пад свой кантроль тое, што яны робяць і чаму вучацца.

Практыкаванне «Увага, мы ўсе бачым!» на старонцы 110 спрыяе развіццю адказнасці і асабістай зацікаўленасці і паказвае розныя спосабы ўдзелу ў кампаніі.

## Ідэі для дзеяння

Даручыце групе скласці спіс пытанняў і сітуацый з жыцця супольнасці іх раёна, якія яны хацелі б змяніць. Затым папрасіце іх вылучыць адзін ці два пункты з гэтага спіса, дзе, на іх думку, яны могуць нешта змяніць, і падумаць, як зрабіць так, каб іх голас быў пачуты, і як яны самі могуць садзейнічаць вырашэнню гэтага пытання іншым спосабам. А цяпер заахвоцьце іх ажыццявіць свой намер на практыцы!

## Дадатковая інфармацыя

Удзел моладзі – гэта актыўнае ўцягванне маладых людзей у жыццё грамадства, і яно мае на ўвазе высокую ступень удзелу ў планаванні і прыняцці рашэнняў у любой сферы, у якой маладыя людзі раней не ўдзельнічалі; гэта можа быць, напрыклад, дзейнасць, звязаная са спортам, з працай школы, клуба, аб’яднання і раёна ў цэлым. Гэта азначае, што маладыя людзі ўдзельнічаюць у распрацоўцы мерапрыемстваў, якія адказваюць сапраўдным патрэбам і ўздзеянне або наступствы якіх распаўсюджваюцца на іншых, г. зн. выходзяць за межы маладзёжнай групы.

www.coe.int/youth/haveyoursay

Савет Еўропы на аснове перагледжанай Еўрапейскай хартыі аб удзеле моладзі ў мясцовым і рэгіянальным жыцці выдаў дапаможнік пад назвай «Скажы сваё слова». Гэта выдатны рэсурс для развіцця ўдзелу моладзі, у якім маецца асобны раздзел з практыкаваннямі.

У Еўропе існуе традыцыя кансалідаванага ўдзелу і прадстаўніцтва моладзі. Напрыклад, адданасць Савета Еўропы справе актыўнага ўдзелу моладзі можна праілюстраваць на прыкладзе сістэмы сумеснага кіравання маладзёжным сектарам. Кансультатыўны савет па справах моладзі аб'ядноўвае 30 прадстаўнікоў міжнародных маладзёжных няўрадавых грамадскіх арганізацый і нацыянальных маладзёжных саветаў, якія разам з прадстаўнікамі Еўрапейскага кіруючага камітэта па справах моладзі прымаюць рашэнні аб прыярытэтах і праграмах і выдаюць рэкамендацыі для будучых стратэгій і праграм. Кансультатыўны савет таксама фармулюе меркаванні і прапановы па любых пытаннях, якія маюць дачыненне да моладзі, у рамках Савета Еўропы.

Еўрапейскі маладзёжны форум з'яўляецца незалежнай дэмакратычнай платформай пад кіраўніцтвам моладзі, у склад якой уваходзіць каля 100 нацыянальных маладзёжных саветаў і міжнародных арганізацый моладзі. Дзейнасць Еўрапейскага маладзёжнага форуму накіравана на тое, каб даць моладзі магчымасць актыўна ўдзельнічаць у жыцці грамадства і садзейнічаць паляпшэнню якасці свайго жыцця, прадстаўляючы і адстойваючы свае патрэбы і інтарэсы, а таксама патрэбы і інтарэсы маладзёжных арганізацый перад еўрапейскімі інстытутамі, Саветам Еўропы і Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый. Еўрапейскі маладзёжны форум лічыць, што павінна быць створана «культура ўдзелу». Гэта азначае, што парадак дня маладзёжнай палітыкі павінен развівацца паралельна з больш шырокім удзелам моладзі ў працэсах прыняцця рашэнняў па пытаннях, якія яе датычацца і якія ўплываюць на яе становішча.

Кансультатыўны савет па справах моладзі

Еўрапейскі маладзёжны форум: www.youthforum.org

У 1992 годзе Роджэр Харт распрацаваў мадэль «Удзел дзяцей: ад сімуляцыі да паўнапраўя» (Даследчы цэнтр ЮНІСЕФ «Іначэнці», Фларэнцыя).

**Удзел**:
Ступень 8: сумеснае прыняцце рашэнняў.
Ступень 7: рашэнні ініцыююцца і кіруюцца маладымі людзьмі.
Ступень 6: рашэнні ініцыююцца дарослымі і прымаюцца сумесна з маладымі людзьмі.
Ступень 5: кансультацыі з маладымі людзьмі, іх інфармаванне.
Ступень 4: пастаноўка задання перад маладымі людзьмі, іх інфармаванне.

**Адсутнасць удзелу**:
Ступень 3: фармальны (сімвалічны) удзел маладых людзей.
Ступень 2: выкарыстанне маладых людзей у якасці ўпрыгожвання.
Ступень 1: маніпуляцыя маладымі людзьмі.

Дзеці

Навакольнае асяроддзе

Здароўе

Узровень 2

Больш за 6 (малыя групы па 3–4 чалавекі)

60 хвілін

# Варыянты нашай будучыні

*Прагрэс наш правяраецца не тым, як мы павялічваем стан багатых, а тым, як мы дапамагаем бедным.*

Франклін Д. Рузвельт

**Тэмы**
- дзеці,
- навакольнае асяроддзе,
- здароўе.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** Больш за 6 (малыя групы па 3–4 чалавекі)

**Час** 60 хвілін

**Агляд** Падчас выканання практыкавання ўдзельнікі малююць, абдумваюць і абмяркоўваюць свае надзеі і трывогі ў сувязі з будучыняй свайго пакалення. Сярод іншых падымаюцца наступныя пытанні:
- праблемы экалогіі, якія ўплываюць на будучыя пакаленні;
- у якой меры мясцовае развіццё адпавядае патрэбам насельніцтва;
- рухаючыя сілы развіцця.

**Звязаныя правы**
- права на свабодны доступ да інфармацыі і свабода выказвання меркавання;
- права быць пачутымі па ўсіх пытаннях, што тычацца асноўных інтарэсаў дзіцяці;
- права на дастатковы ўзровень жыцця.

**Мэты**
- развіць веды пра жыццё ў грамадстве, правы і абавязкі;
- развіць уменні адкрыта абмяркоўваць, працаваць у камандзе і прадстаўляць сабе перспектыву;
- развіць дапытлівасць і веру ў тое, што будучыня залежыць ад кожнага маладога чалавека і што іх дзеянні маюць сэнс.

**Матэрыялы**
- папера для малявання;
- вялікія аркушы для канчатковага праекта;
- фарбы, пэндзлікі, алоўкі, ручкі і маркеры;
- матэрыялы для калажаў, напрыклад, каляровая папера, часопісы, галінкі, рыс, бабы, апалае лісце, ракавінкі, саломінкі для піцця;
- нажніцы;
- клей і скотч;
- карціны або фатаграфіі, якія паказваюць, як выглядаў раён (пасёлак) дзесяць або дваццаць гадоў таму (па жаданні);
- карты мясцовасці, дзе вы жывяце, як старыя, так і новыя (па жаданні).

## Інструкцыі

1. Апішыце канцэпцыю перамен, якія адбываюцца з часам. Прапануйце ўдзельнікам успомніць, як выглядалі іх дамы, вуліцы ў мінулым, як яны змяніліся. Ці змяніўся інтэр'ер пакояў у вашай школе або навучальным цэнтры, ці з'явілася новая мэбля? Ці ёсць новыя будынкі ў акрузе, напрыклад гандлёвыя цэнтры, жылыя мікраараёны, дарогі, гульнявыя паркі або велатрэкі?
2. Спытайце, чаму такія змены адбыліся, хто вырашаў, што і дзе мяняць і якім чынам? Напрыклад, ці забяспечылі гэты план забудовы патрэбы ў недарагім жыллі для мясцовых жыхароў або тут з'явіліся раскошныя апартаменты ці дамы адпачынку, у якія інвесціравала нейкая фінансавая кампанія?

3. Коратка абмяркуйце адзін-два прыклады: каму і якую карысць прынесла развіццё? Што б удзельнікі зрабілі, калі б ад іх залежала сітуацыя?
4. Правядзіце сувязь паміж прыняццем рашэнняў, якія ўплываюць на жыццё іншых людзей, і правамі чалавека. Ці з'яўляюцца правы чалавека карыснай асновай для прыняцця рашэнняў? Ці стануць правы чалавека ў будучыні больш (ці менш) важным фактарам для тых, хто прымае рашэнні? Чаму?
5. Скажыце ўдзельнікам, што час прыйшоў! Зараз лепшы момант падумаць пра тое, у якой будучыні яны могуць апынуцца і як на яе можна паўплываць.
6. Падзяліце ўсіх на групы па тры-чатыры чалавекі.
7. Раздайце паперу і ручкі і папрасіце намаляваць, даўшы поўную свабоду фантазіі, ідэальны выгляд свайго квартала або гарадка ў будучыні.
8. Калі папярэдні план будзе гатовы і ўзгоднены, кожная група павінна адлюстраваць яго на вялікім аркушы, выкарыстоўваючы матэрыялы для калажу.
9. Па завяршэнні працы прапануйце групы па чарзе прадставіць свае планы і патлумачыць, дзе яны запазычылі свае ідэі і як іх развівалі. Пасля кожнага выступлення пакідайце час на кароткія пытанні і адказы. Агульная дыскусія будзе праводзіцца пазней, у рамках аналізу і ацэнкі.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**12 жніўня**
Міжнародны дзень моладзі

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з высвятлення таго, як праходзіла праца ў групах. Затым абмяркуйце, наколькі планы адказвалі ці не адказвалі патрэбам людзей у здаровым навакольным асяроддзі.

- Ці ўсе атрымалі магчымасць удзельнічаць у працэсе і ўнесці свой уклад? Як групам удавалася знаходзіць найлепшае прымяненне індывідуальным здольнасцям кожнага?
- Што яны адчувалі, слухаючы чужыя думкі пра свае планы?
- Што яны адчувалі, выказваючы сваё меркаванне аб чужых планах?
- Ці будуць яны гатовы пайсці на кампраміс і адступіцца ад нейкіх сваіх ідэалаў для выпрацоўкі агульнага для ўсяго класа або групы плана, які адказваў бы патрэбам і чаканням усіх астатніх членаў класа або групы?
- Ці ўлічваюцца ў планах пытанні аховы навакольнага асяроддзя, напрыклад неабходнасць знізіць выкіды двухвокісу вугляроду, карыстацца аднаўляльнымі і ўстойлівымі рэсурсамі і наладзіць паўторную перапрацоўку адходаў?
- Ці спадабалася ўдзельнікам адчуваць сябе «архітэктарамі ўласнай будучыні»? Ці вераць удзельнікі ў ажыццяўленне сваіх ідэй? Чаму? Чаму не?
- Ці вераць яны, што дарослыя стануць абмяркоўваць гэтыя планы? Чаму? Чаму не?
- Што аказалася самым нечаканым у планах?
- Якія ў іх як у грамадзян будуць правы ў будучыні?
- Якія ў іх як у грамадзян будуць абавязкі ў будучыні?
- Ці маюць маладыя людзі ў вашай школе (клубе ці супольнасці) права голасу ў абмеркаванні перамен, якія тычацца іх саміх, або перамен у цэлым? Выкананне якіх правоў яны маглі б запатрабаваць, каб мець магчымасць удзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў?
- Якія ў цэлым магчымасці маюць маладыя людзі, каб уплываць на дэмакратычныя працэсы, якія фарміруюць іх жыццё і іх будучыню?
- Якія аб'екты інфраструктуры спатрэбяцца, каб гарантаваць кожнаму чалавеку права на ахову здароўя, адпачынак, вольны час і культурнае жыццё?

## Парады для фасілітатараў

Назва практыкавання – «Варыянты нашай будучыні». Наўмыснае выкарыстанне множнага ліку азначае, што будучыня не прадвызначана, яна будзе такой, якой мы яе зробім. Іншымі словамі, задача моладзі заключаецца ў тым, каб пабудаваць будучыню ў адпаведнасці са сваімі ідэаламі і ўяўленнямі.

Каб праілюстраваць канцэпцыю перамен, пакажыце здымкі, зробленыя ў вашай мясцовасці дзесяць ці дваццаць гадоў таму. Прапануйце ўдзельнікам таксама задумацца над глабальнымі зменамі. Напрыклад, над тым, што яшчэ трыццаць гадоў таму Інтэрнэт быў тэмай навуковай фантастыкі, а праз некалькі гадоў усе школы і бібліятэкі свету будуць падключаны да гэтай сеткі.

Калі ўдзельнікі дрэнна ўяўляюць, якім будзе іх горад у будучыні, дапамажыце ім пытаннямі:

- Хто будзе жыць у горадзе? Тыя, хто тут нарадзіўся, або прыезджыя? Якога ўзросту? Ці будуць яны жыць у сем'ях?
- Як будуць праходзіць іх будні? Дзе яны будуць купляць прадукты? Як будуць перамяшчацца па горадзе?
- Якія аб’екты інфраструктуры (бальніцы, стаматалагічныя клінікі і г. д.) будуць ім патрэбны?
- Якія ў іх будуць школы?
- На якім транспарце яны будуць перамяшчацца?
- Як будуць выглядаць іх дамы?
- Якім будзе іх грамадскае жыццё? Як яны будуць праводзіць вольны час?
- Ці будуць у іх хатнія жывёлы?
- Якой будзе іх праца?
- Якія новыя тэхнічныя перамены могуць адбыцца?
- А як наконт навакольнага асяроддзя? Прыроды?

## Варыянты

Замест калажу можна зрабіць мадэлі з падручнага матэрыялу: з кардонных упаковак, рулонаў туалетнай паперы, паштовак або, напрыклад, элементаў «Лега».

Замест складання агульных планаў аб тым, якім бы яны хацелі бачыць свой населены пункт, удзельнікі могуць выбраць пусты, прыдатны для забудовы ўчастак, які можна асвоіць. Прапануйце групе даследаваць патрэбы розных груп насельніцтва і падрыхтаваць прапанову, якую яны змогуць адправіць у органы мясцовага самакіравання. На ўчастку можна пабудаваць такія аб'екты, як гандлёвы комплекс, цэнтр вольнага часу, школу, жылы масіў, аўтамабільную стаянку, адкрытую зялёную прастору, гульнявую пляцоўку, спартыўнае поле, утульны сквер з лаўкамі для пажылых людзей, гарадскую ферму, запаведнік жывой прыроды, парк забаў, стаянку для падарожнікаў або лужок для гульні ў шары. Калі вы хочаце зрабіць гэта ў якасці праекта практычных дзеянняў, вы знойдзеце інфармацыю аб планаванні і рэалізацыі такіх праектаў у главе 3.

## Прапановы па далейшай працы

Вы можаце высветліць, як ваш населены пункт мог бы адаптавацца да будучых выпрабаванняў, звязаных з «праходжаннем піка здабычы нафты» і змяненнем клімату. Ініцыятыва сацыяльнай сеткі «Гарады ў пераходны перыяд» заклікае мясцовых жыхароў вывучыць усе аспекты жыцця іх супольнасці (харчаванне, энергазабеспячэнне, транспарт, ахову здароўя, духоўнае жыццё, эканоміку і сродкі да існавання і г. д.), прымяніць творчы падыход і, у канчатковым выніку, укараніць распрацаваны супольнасцю «План дзеянняў па зніжэнні спажывання энергіі» на перыяд у 15–20 гадоў. На сённяшні дзень рэалізуюцца наступныя ініцыятывы: стварэнне грамадскіх ферм для вытворчасці прадуктаў харчавання, праект «біржа адходаў» (у рамках якога адходы адных прадпрыемстваў перадаюцца іншым прадпрыемствам для паўторнай перапрацоўкі), рамонт старых рэчаў замест адпраўкі іх на сметнік і развіццё гандлёвай сістэмы мясцовага абмену. Дадатковую інфармацыю і прыклады таго, як людзі развіваюць гэту канцэпцыю ва ўсім свеце, можна знайсці на сайце www.transitiontowns.org або па пошукавым запыце «Transition Towns».

Таксама можна прапанаваць удзельнікам стварыць персаналізаваную, самабытную, ілюстраваную і забяспечаную каментарыямі буйнамаштабную карту іх горада ці раёна, дзе будуць выдзелены важныя для іх аб'екты. Напрыклад, графіці, незвычайнае дрэва каля дарогі або «неафіцыйны» маршрут, па якім яны перамяшчаюцца па горадзе, каб скараціць адлегласць. Зафіксаваць факт існавання чагосьці – гэта першы крок да таго, каб паказаць, што гэты аб'ект мае каштоўнасць; гэта спосаб зберагчы яго ад знішчэння ў ходзе нявызначанага будучага «развіцця».



Гл. праект Parish Maps на сайце www.commonground.org.uk.

Ёсць яшчэ адзін спосаб агледзець і «задакументаваць» месцазнаходжанне, падыход да выкарыстання рэсурсаў, асаблівыя рысы, ландшафт, асноўныя формы землекарыстання ў якой-небудзь мясцовасці – гэта метад, вядомы як «папярочны абыход»; ён быў выкарыстаны Сусветным банкам у «аналізе беднасці і яе сацыяльных наступстваў». Паспрабуйце яго як-небудзь, калі захочаце выбрацца за горад! Знайдзіце «transect walk» на сайце http://web.worldbank.org.

Даведайцеся больш пра тое, як складаюцца планы развіцця вашага раёна або горада і як можна паўплываць на гэты працэс. Падключайцеся да працэсу прыняцця рашэнняў у вашай школе, клубе, арганізацыі, наведваючы пасяджэнні кіруючага савета або нават балатуючыся на выбарах. Азнаёмцеся з іншымі практыкаваннямі, якія могуць дапамагчы даследаваць варыянты будучыні. Напрыклад, «Шлях у краіну Роўнасці» падкажа, як дасягнуць гендарнай роўнасці.

Па жаданні можна выкарыстаць яшчэ адно практыкаванне, дзе маладых людзей заклікаюць да ўдзелу ў працэсе дэмакратычнага прыняцця рашэнняў, на гэты раз у дачыненні да таго, якую адукацыю яны хацелі б атрымаць праз удзел у працы школьных саветаў; гэта практыкаванне носіць назву «Пачуць голас кожнага», гл. старонку 207.

Марачы аб будучыні, мы можам ужо цяпер пачаць будаваць больш справядлівае грамадства. Калі група захоча разглядзець праблему цкавання і паглядзець, як фарміруецца суперажыванне і павага да іншых, можна выканаць практыкаванне «Ці ёсць у нас альтэрнатывы?» на старонцы 140.

## Ідэі для дзеяння

Арганізуйце выстаўку калажаў і запрасіце членаў мясцовага савета паслухаць вашы думкі.

Знайдзіце копіі планаў (гадавых і доўгатэрміновых) стратэгіі развіцця вашага горада ці раёна. Абмяркуйце іх у групе, а затым парайцеся з вашымі сябрамі і членамі сям'і. Выкладзіце свае думкі, стварыўшы блог, напісаўшы артыкул у мясцовую газету, арганізаваўшы мітынг з нагоды гэтай праблемы або выступіце на публічным сходзе, арганізаваным мясцовымі ўладамі.

Звяжыцеся з мясцовай групай «Парадак дня на XXI стагоддзе» (Agenda 21) ці іншай экалагічнай групай і прыступіце да сумеснай працы ў імя стабільнай будучыні.

COMPASS

Гендарныя пытанні

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Адукацыя

Узровень 2

Больш за 4 чалавекі

120 хвілін

# Шлях у краіну Роўнасці

*Перашкода – гэта і ёсць шлях.*

Дзэн-будыйская прыказка

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • гендарныя пытанні,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць,<br>• адукацыя. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | больш за 4 чалавекі |
| **Час** | 120 хвілін |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне прадугледжвае працу ў малых групах, выкарыстанне фантазіі і навыкаў малявання, якія дапамогуць разгледзець пытанні гендарнай роўнасці і дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын. |
| **Звязаныя правы** | • свабода ад дыскрымінацыі па прыкмеце полу і гендару;<br>• права на ўступленне ў шлюб і стварэнне сям’і;<br>• права на роўнасць перад законам. |
| **Мэты** | • прадставіць будучы свет, дзе роўнасць з'яўляецца нормай;<br>• развіць камунікатыўныя навыкі, фантазію, творчыя здольнасці і ўменне супрацоўнічаць;<br>• прасоўваць справядлівасць і павагу. |
| **Матэрыялы** | • 2 вялікія аркушы паперы фармату А3 або папера для фліпчарта для кожнай малой групы;<br>• рознакаляровыя маркеры ў колькасці, дастатковай для ўсіх малых груп;<br>• карта, пажадана турыстычная або іншая, якая паказвае фізічныя характарыстыкі мясцовасці, напрыклад горы, даліны, рэкі, лясы, населеныя пункты, масты і інш.; |
| **Падрыхтоўка** | • азнаёмцеся з картай і ўмоўнымі адзнакамі, якія ў ёй выкарыстаны. |

## Інструкцыі

**Частка 1**. Вызначэнне праблем і мазгавы штурм, нацэлены на іх рашэнне: 15 хвілін.

1. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на малыя групы па 3–5 чалавек. Выдайце кожнай групе аркуш паперы і ручкі. Прапануйце ім намаляваць 3 калонкі аднолькавай шырыні на ўсю вышыню аркуша.
2. Нагадаеце, што ў краіне Роўнасці пануе поўная роўнасць палоў. Папрасіце ўдзельнікаў прывесці канкрэтныя прыклады таго, якой яны ўяўляюць сабе гэту краіну. Адзін з удзельнікаў павінен уносіць інфармацыю ў першую калонку.
3. Цяпер папрасіце групу падумаць пра тое, як выглядае сітуацыя сёння, паразважаць над кожным пунктам 1-й калонкі і абмеркаваць, што трэба зрабіць, каб перайсці з сённяшняга дня ў будучую краіну Роўнасці. Унясіце прапанаваныя дзеянні ў другую калонку побач з кожным пунктам першай калонкі.
4. Цяпер прапануйце ўдзельнікам падумаць пра перашкоды, з якімі яны могуць сутыкнуцца на шляху да краіны Роўнасці, пра тое, як іх пераадолець. Запішыце адказы ў трэцюю калонку.

**Частка 2.** Стварэнне карты: 40 хвілін.

1. Коратка агледзьце карту, звярніце ўвагу на тое, як намаляваны контуры, пазначаны горы і рэкі, як выглядаюць сімвалы, якія абазначаюць лясы, балоты, будынкі, лініі электраперадач і г. д.

2. Цяпер прапануйце ўдзельнікам падумаць пра іншыя сімвалы. Спытайце іх, ці ведаюць яны народныя казкі або іншыя гісторыі, у якіх маральныя ідэалы паказаны метафарычна ў выглядзе падарожжа героя. Уявіце, што, напрыклад, дрымучы лес можа метафарычна абазначаць зло, а чырвоны наліўны яблык быць сімвалам спакусы. Падарожнік можа прадэманстраваць маральную моц, пераадольваючы бурную раку, або дабрыню, дапамагаючы жывёле, якая трапіла ў бяду.
3. Выдайце кожнай групе яшчэ адзін вялікі аркуш паперы. Растлумачце, што ўдзельнікі будуць ствараць сваю выдуманую карту будучыні, і на ёй будуць ландшафты сучаснасці і будучыні, а таксама сцяжынка (або сцяжынкі) ад аднаго да іншага. Ім трэба прыдумаць свае сімвалы для геаграфічных аб'ектаў і перашкод, якія могуць стрымліваць падарожніка на шляху ў краіну Роўнасці або, наадварот, дапамагаць яму.
4. Збярыце групы на агульнае пасяджэнне і папрасіце іх паказаць свае карты.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**8 сакавіка**
Міжнародны жаночы дзень
**3 лістапада**
Міжнародны дзень мужчын

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з абмеркавання таго, як было наладжана ўзаемадзеянне ўнутры груп, як прымаліся рашэнні аб тым, што адлюстроўваць на карце, і як яны малявалі карту. Цяпер пагаварыце пра тое, якой на самай справе павінна быць краіна Роўнасці і што перашкаджае дасягнуць яе.

- Ці спадабалася ўдзельнікам практыкаванне? Чаму?
- Якую калонку было лягчэй за ўсё запоўніць, а якую – цяжэй за ўсё? Чаму?
- Якія галоўныя адметныя рысы краіны Роўнасці?
- Што трэба змяніць, каб пабудаваць грамадства, дзе пануе гендарная роўнасць?
- Гаворачы аб праве не падвяргацца дыскрымінацыі, ці можна лічыць палітыку станоўчай дыскрымінацыі прыдатнай кароткатэрміновай мерай, накіраванай на дасягненне гендарнай роўнасці?
- Калі б вы маглі ацаніць сваю краіну ў параўнанні з іншымі краінамі свету па роўнасці магчымасцей мужчын і жанчын, колькі балаў вы б далі ёй па дзесяцібальнай сістэме (1 бал азначае вялікую няроўнасць, 10 – амаль ідэальную роўнасць)?
- Чаму так важна рабіць акцэнт менавіта на правах жанчын?
- Акрамя жанчын, якія іншыя сацыяльныя групы падвяргаюцца дыскрымінацыі ў вашым грамадстве? У чым гэта праяўляецца? Якія правы чалавека парушаюцца?
- Якім чынам можна пашырыць магчымасці ўразлівых груп патрабаваць выканання іх правоў?
- Якую ролю адыгрывае адукацыя ў пашырэнні магчымасцей для актыўных дзеянняў?
- Якую ролю павінна адыгрываць адукацыя ў галіне правоў чалавека ў пашырэнні правоў і магчымасці актыўна дзейнічаць?

## Парады для фасілітатараў

Растлумачце, што прыклады жыцця ў краіне Роўнасці павінны быць вельмі канкрэтнымі. Калі ўдзельнікам будзе цяжка іх прыдумаць, дапамажыце ім і прапануйце падумаць пра тое, напрыклад, колькі жанчын засядаюць у парламенце ці маюць поспех у бізнесе, пра розніцу ў даходах, пра тое, колькі гадзін у дзень працуюць мужчыны і колькі – жанчыны, як яны праводзяць вольны час і як размяркоўваюць хатнія абавязкі, пра колькасць працаўнікоў, занятых няпоўны працоўны дзень, пра хатні гвалт, пра праследаванні ў школе і на працы, пра тое, якімі мужчыны і жанчыны паўстаюць у СМІ.

Ніколі не рабіце занадта вялікі акцэнт на сімвалічнасці, бо некаторым людзям бывае цяжка ўспрымаць метафарычныя ідэі. Калі ўдзельнікі зайшлі ў тупік, спрабуючы перадаць свае думкі, іх можна зрушыць з мёртвага пункта, намаляваўшы, напрыклад, вобраз жанчыны, якая ідзе па мосце адукацыі, каб пераадолець раку прадузятасцей супраць жанчын, якія жадаюць стаць юрыстамі. Або яшчэ прыклад: вобраз мужчыны, які знаходзіць задавальненне, працуючы выхавацелем у дзіцячым садзе з маленькімі дзецьмі. Вядома, вам трэба знайсці прыклады гендарных стэрэатыпаў, якія адлюстроўваюць рэальную сітуацыю ў вашым грамадстве.

## Варыянты

Групы могуць зрабіць макеты ландшафту з усялякага «смецця». У гэтым выпадку вам трэба мець цэлы набор скрыначак, слоічкаў, цюбікаў, паперы, каменьчыкаў, гаек, кавалкаў вяроўкі і шэрсці, сашчэпак і г. д. Клей і кардон таксама спатрэбяцца для стварэння падставак для макетаў.

Метад малявання карты для параўнання цяперашняга і будучага можна адаптаваць для большасці тэм, калі вы хочаце, каб удзельнікі свабодна і творча падышлі да пошуку рашэнняў праблемы.

## Прапановы па далейшай працы

Абмеркаваўшы аспекты гендарнай роўнасці ў сучаснасці і ў будучыні, можна звярнуцца да практыкавання «Храналогія правоў» і выкарыстаць апісаны там метад, каб успомніць знакамітых жанчын; заахвоцьце ўдзельнікаў правесці даследаванне і даведацца, як гендарная роўнасць змянялася з ходам гісторыі. Пашукайце ў Інтэрнэце па запыце «жыццяпіс знакамітых жанчын» (timeline famous women).

У якасці альтэрнатывы вы можаце вывучыць пытанні дыскрымінацыі і права на культурную самабытнасць у кантэксце ўстойлівага развіцця, выканаўшы практыкаванне «Мака-кітабоі» на старонцы 215.

## Ідэі для дзеяння

Высветліце, якія меры прадугледжаны ў вашай школе, клубе або на працы для забеспячэння роўных магчымасцей для ўсіх без дыскрымінацыі па гендарнай прыкмеце, і абмяркуйце, як гэтыя меры ажыццяўляюцца і якія змены ці дадатковыя намаганні патрабуюцца, каб наблізіць вашу арганізацыю да статусу «краіны Роўнасці».

Па пошукавым запыце «аргументы на карысць парытэтнай дэмакратыі» (arguments for parity democracy) знайдзіце спасылку на вельмі карысны сайт Еўрапейскага жаночага лобі (EWL) і яго праграму дзеянняў і лабіравання. Дадатковую інфармацыю пра жанчын у палітыцы вы знойдзеце на сайце www.iknowpolitics.org.

## Дадатковая інфармацыя

У аснове гэтага практыкавання ляжыць канцэпцыя «пашырэння паўнамоцтваў». Гэты тэрмін складана перавесці, а часам складана і растлумачыць – нават на англійскай мове! «Пашырэнне паўнамоцтваў» (empowerment) – гэта і сродак, і вынік педагагічнай мадэлі, якую некаторыя называюць «вызваленчай» адукацыяй. Адно з азначэнняў гэтага паняцця дае Oxfam: «Пашырэнне паўнамоцтваў мае на ўвазе супраціўленне такім формам уціску, якія прымушаюць мільёны людзей іграць нейкую ролю ў сваім грамадстве ў няроўных умовах або з парушэннем іх правоў чалавека».

# Гульні з відарысамі

*Фотаздымак замяняе тысячу слоў, і фотаапарат не хлусіць – ці ўсё ж такі хлусіць?*

| | |
|---|---|
| **Складанасць** | узровень 1 |
| **Памер групы** | любы |
| **Час** | 30 хвілін |
| **Тэмы** | агульныя правы чалавека. |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні ўдзельнікі працуюць з відарысамі, якія адлюстроўваюць артыкулы Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (УДПЧ). |
| **Звязаныя правы** | • усе правы чалавека. |
| **Мэты** | • прыцягнуць увагу да важнасці правоў чалавека ў паўсядзённым жыцці;<br>• развіць навыкі «візуальнай пісьменнасці», слухання і камунікацыі;<br>• абуджаць спачуванне і павагу чалавечай годнасці. |
| **Матэрыялы** | • набор з 20–30 пранумараваных фатаграфій;<br>• вялікі стол;<br>• табліца на сцяне з піералікам артыкулаў УДПЧ (скарочаны варыянт прыводзіцца на старонцы 600). |

Агульныя правы чалавека

Узровень 1

Любы памер групы

30 хвілін

## Інструкцыі

1. Раскладзіце фатаграфіі на вялікім стале.
2. Папрасіце ўдзельнікаў працаваць індывідуальна.
3. Зачытайце адзін з артыкулаў УДПЧ і запішыце яго на дошцы (фліпчарце).
4. Папрасіце ўдзельнікаў паглядзець на фатаграфіі і выбраць тую, якая, на іх думку, лепш за ўсё ілюструе гэты артыкул.
5. Затым папрасіце кожнага па чарзе расказаць, якую фатаграфію ён выбраў і чаму.
6. Запішыце нумары выбраных фатаграфій на дошцы.
7. Правядзіце яшчэ чатыры-пяць раўндаў, зачытваючы розныя артыкулы з УДПЧ (чаргуйце грамадзянскія і палітычныя, а таксама сацыяльныя і эканамічныя правы).

## Аналіз і ацэнка

Спачатку прааналізуйце ход практыкавання, а затым пагаварыце пра тое, што новага даведаліся ўдзельнікі.

- Ці выбралі ўдзельнікі розныя фатаграфіі ў розных раўндах або вырашылі, што адной ці дзвюх дастаткова?
- Ці выбіралі розныя ўдзельнікі адны і тыя ж фатаграфіі ў розных раўндах або ў іх былі зусім розныя ўяўленні аб тым, як праілюстраваць розныя правы? Што гэта кажа нам аб індывідуальным бачанні свету кожным чалавекам?
- Праглядзіце спіс на фліпчарце. Якія фатаграфіі выбіралі часцей за ўсё? Што ў іх такога асаблівага? Чаму іх так часта выбіралі? Ці мелі пры гэтым значэнне памер або колер фатаграфій або галоўным было тое, што на іх было адлюстравана?
- Ці была адна фатаграфія абрана некалькі разоў для ілюстрацыі розных правоў?
- Ці быў хто-небудзь не згодны з тым, як іншыя члены групы інтэрпрэтавалі тую ці іншую фатаграфію?
- Ці былі фатаграфіі, якія ніхто ні разу не выбраў? Ці маглі яны, тым не менш, быць выкарыстаны для ілюстрацыі правоў чалавека? Якіх канкрэтна?

## Парады для фасілітатараў

Адну фатаграфію можна выбіраць колькі хочаце разоў. Адну фатаграфію можна выбіраць некалькі разоў як у адным, так і ў розных раўндах. Іншымі словамі, у розных удзельнікаў яна можа асацыявацца з нейкім адным артыкулам УДПЧ або адразу з некалькімі.

Звярніцеся да старонкі 61 главы 1 «Метады, якія ляжаць у аснове практыкаванняў “Компаса”», дзе вы зможаце атрымаць дадатковую інфармацыю аб тым, як падрыхтаваць сваю калекцыю фатаграфій. Яны могуць адлюстроўваць самыя розныя аспекты «жыцця на Зямлі» і ўключаць выявы асобных людзей і груп, людзей розных узростаў, культур і здольнасцей. Няхай гэта будуць фатаграфіі, зробленыя ў сельскіх і гарадскіх раёнах, якія адлюстроўваюць прамысловасць і сельскую гаспадарку і прадстаўляюць людзей у хвіліны працы і вольнага часу. Не спрабуйце неяк упарадкаваць фатаграфіі падчас нумарацыі. Яна патрэбна толькі для таго, каб фатаграфіі было лёгка ідэнтыфікаваць.

Заўсёды правярайце, ці маюцца аўтарскія правы на малюнкі і фатаграфіі, якія вы хочаце выкарыстаць.

Неабходнасць вашай дапамогі ўдзельнікам падчас аналізу фатаграфій будзе залежаць ад ступені іх «візуальных здольнасцей». Вы можаце пачаць практыкаванне з сумеснага абмеркавання адной або некалькіх фатаграфій. У якасці арыенціра вы можаце выкарыстаць пытанні з раздзела «Дадатковая інфармацыя», прыведзеныя ніжэй.

## Варыянты

Папрасіце ўдзельнікаў выбраць тую фатаграфію, якая, на іх думку, лепш за ўсё адлюстроўвае паняцце правоў чалавека. Калі ўсе зробяць свой выбар, папрасіце іх растлумачыць яго прычыны.

Вы можаце зрабіць копіі ілюстрацый Панчо да главы 5 і папрасіць удзельнікаў расказаць, якія правы чалавека яны адлюстроўваюць.

Калі вы хочаце выкарыстаць замест відарысаў відэа, паспрабуйце выканаць практыкаванне «Сыграем гэта!», у якім для вывучэння паняцця правоў чалавека выкарыстоўваецца тэатральная тэхніка; папрасіце групу зняць відэа і размясціць ролік на сайце youtube.com.

## Прапановы па далейшай працы

Папрасіце ў каго-небудзь камеру ці падумайце пра тое, каб купіць якую-небудзь на распродажы або з рук, і здыміце «Погляды на правы чалавека» на матэрыяле вашага раёна.

Практыкаванне «Змяніце свае акуляры» на старонцы 126 дапаможа паглядзець на навакольны свет з пункту гледжання правоў чалавека і зрабіць адпаведныя здымкі.

Вобразы адлюстроўваюць не толькі фатаграфіі – іх ствараюць сітуацыі і падзеі. Дайце групе магчымасць «убачыць» дыскрымінацыю, выконваючы практыкаванне «Зрабі крок наперад» на старонцы 281.

## Ідэі для дзеяння

Зрабіце выстаўку фатаграфій на аснове праекта «Погляды на правы чалавека». У якасці альтэрнатывы вы можаце скарыстацца прыведзенымі ніжэй ідэямі па стварэнні плакатаў і арганізаваць іх выстаўку.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**25 кастрычніка**
Міжнародны дзень мастака

# Іншыя гульні з відарысамі

## *Частка відарыса*

**Матэрыялы (падрыхтоўка)**

- Знайдзіце фатаграфіі, якія расказваюць простую гісторыю. Разрэжце кожную з іх на дзве часткі, каб два новыя відарысы дазвалялі ўдзельнікам прачытаць гісторыю не зусім так, як яна выглядала, калі два відарысы складалі адзінае цэлае;
- Пакладзіце абедзве часткі фатаграфіі ў канверт. Вам спатрэбіцца адзін канверт на кожнага ўдзельніка.

### Інструкцыі

1. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на пары.
2. Дайце кожнай пары па два канверты.
3. Скажыце ўдзельнікам, каб кожны з іх па чарзе адкрыў канверт і даў свайму партнёру адну частку відарыса. Няхай партнёр скажа, што ён думае аб агульным сюжэце відарыса, хто на ім прадстаўлены і што ён робіць.
4. Пасля гэтага першы ўдзельнік павінен аддаць партнёру другую частку відарыса і спытаць, што ён думае пра сюжэт зараз, калі ў яго перад вачыма поўная карціна.
5. Затым пераходзьце да абмеркавання:
   - Ці былі якія-небудзь нечаканасці?
   - Як часта людзі прымаюць за цэлае тое, што бачаць, і забываюць, што частка можа быць не «ўсёй гісторыяй»?

### Парады для фасілітатараў

Вы можаце таксама выкарыстаць гэта практыкаванне ў якасці «ледакола».

## *Подпіс пад відарысам*

**Матэрыялы (падрыхтоўка)**

- Набор з 5 пранумараваных фатаграфій;
- 5 палоскі паперы і ручка для кожнага ўдзельніка;
- скотч або клей;
- 5 вялікіх аркушаў паперы фармату А3 або папера для фліпчарта.

### Інструкцыі

1. Раскладзіце фатаграфіі на стале і папрасіце ўдзельнікаў індывідуальна або ў парах прыдумаць подпіс для кожнай з іх – адзін подпіс напісаць на кожнай палосцы паперы.
2. Калі ўдзельнікі справяцца з задачай, паказвайце фатаграфіі па адной і прасіце ўдзельнікаў зачытваць свае подпісы да іх.
3. Прыклейце кожную фатаграфію ў цэнтры вялікага аркуша паперы і папрасіце ўдзельнікаў прыклеіць свае подпісы клеем або скотчам вакол яе, каб зрабіць «плакат».
4. Прыклейце плакаты на сцяну.
5. Зрабіце кароткі агляд фатаграфій і подпісаў да іх.
   - Які подпіс лічыцца ўдалым?
   - Калі відарыс замяняе тысячу слоў, навошта тады патрэбны подпісы?

### Парады для фасілітатараў

Выберыце відарысы, якія адлюстроўваюць тэму, да якой вы хочаце прыцягнуць увагу ўдзельнікаў, а таксама дазваляюць даследаваць іх здольнасць прыдумляць забаўныя і яркія подпісы.

Некаторыя з ілюстрацый Панчо да главы 5 даюць добры матэрыял для гэтага практыкавання.

## *Надпісы ў воблачку*

**Матэрыялы (падрыхтоўка)**

- Фатаграфіі, па адной для двух удзельнікаў (дзве ці больш пар павінны атрымаць адну і тую ж фатаграфію);
- папера і ручка, па адной для двух удзельнікаў;
- клей.

### Інструкцыі

1. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на пары. Раздайце фатаграфіі, аркушы паперы і ручкі.
2. Папрасіце іх падумаць, хто ці што паказана на фатаграфіях, дзе, калі і як яны былі зроблены.
3. Папрасіце ўдзельнікаў наклеіць фатаграфію на паперу і напісаць у воблачку рэплікі персанажаў.
4. Папрасіце пары падзяліцца вынікамі сваёй працы і пераходзьце да кароткага аналізу:
    - Наколькі цяжка было аналізаваць фатаграфіі і пісаць рэплікі?
    - Параўнайце аналіз аднолькавых фатаграфій, выкананы рознымі парамі.
    - Якія стэрэатыпы ўдзельнікі знайшлі на фатаграфіях і ў рэпліках у воблачках?

### Парады для фасілітатараў

Не трэба абмяжоўвацца фатаграфіямі людзей. Чаму б не ўключыць у практыкаванне фатаграфіі жывёл? Гэта можа аказацца асабліва плённым, калі вы захочаце пагаварыць аб стэрэатыпах. Вы можаце пачаць практыкаванне, сказаўшы ўдзельнікам, што жывёлы ў мультфільмах часта паводзяць сябе згодна з рознымі стэрэатыпамі, а затым папрасіць групу прывесці прыклады такіх стэрэатыпаў на фатаграфіях і ў рэпліках.

Некаторыя з ілюстрацый Панчо да главы 5 даюць добры матэрыял для гэтага практыкавання.

## *Выпала з кадра!*

**Матэрыялы (падрыхтоўка)**

- папера, каляровыя алоўкі і маркеры;
- вялікія аркушы паперы, па адным на пару ўдзельнікаў;
- матэрыялы для калажу (па жаданні);
- фатаграфіі.

### Інструкцыі

1. Раскладзіце фатаграфіі так, каб усе маглі іх добра бачыць.
2. Растлумачце, як фатографы і рэдактары выбіраюць і «кадрыруюць» фатаграфіі, змяняючы іх памер, каб прыцягнуць увагу гледача менавіта да таго, што яны хочуць паказаць.
3. Папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на пары і выбраць пэўную фатаграфію, з якой яны хацелі б папрацаваць. Папрасіце іх паглядзець на фатаграфію, а затым наклеіць яе на вялікі аркуш паперы. Пасля гэтага яны павінны намаляваць тое, што, на іх думку, знаходзіцца за межамі фатаграфіі, г. зн. вярнуць яе ў кантэкст.
4. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца вынікамі сваёй працы і абмеркаваць наступнае:
    - Чаму фатографы і рэдактары абразаюць фатаграфіі?
    - Ці можна разглядаць такое абразанне як адну з форм цэнзуры?

### Парады для фасілітатараў

Удзельнікі павінны мець абсалютную свабоду, калі дамалёўваюць фатаграфіі; яны могуць рабіць гэта як у рэалістычнай, так і, наадварот, фантастычнай манеры.

Калі ў вас ёсць магчымасць, вы можаце правесці гэта практыкаванне з выкарыстаннем лічбавых фатаграфій і камп’ютара.

# Электрастанцыя

*Няхай гэта электрастанцыя выпрацоўвае творчую энергію чалавека!*

**Тэмы**

- мір і гвалт,
- грамадзянскасць і ўдзел,
- агульныя правы чалавека.

**Складанасць** узровень 3

**Памер групы** Больш за 10 чалавек (малыя групы па 3–5 чалавек)

**Час** 90 хвілін

**Агляд** Удзельнікі праводзяць мазгавы штурм па праявах гвалту, абмяркоўваючы вядомыя ім выпадкі з паўсядзённага жыцця, а потым шукаюць крэатыўныя шляхі вырашэння гэтай праблемы.

**Звязаныя правы**

- права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць;
- свабода ад дыскрымінацыі;
- свабода ад умяшання ў прыватнае і сямейнае жыццё, жыллё і перапіску.

**Мэты**

- выявіць акты гвалту і іх прычыны і знайсці шляхі вырашэння праблемы;
- развіць навыкі супрацоўніцтва і працы ў групах;
- абудзіць пачуццё справядлівасці і адказнасці ў адносінах з іншымі людзьмі.

**Матэрыялы**

- адрэзак моцнай вяроўкі, даўжынёй роўны шырыні памяшкання, які імітуе электрычны провад;
- аркушы паперы фармату А4 двух розных колераў, напрыклад чырвонага і зялёнага;
- маркеры, па адным на кожную малую групу;
- рэквізіт: гучны званок або гудок, каскі, белы халат, кусачкі (сапраўдныя або зробленыя з кардону);
- 2 рулоны скотча;
- два памяшканні (неабавязкова, але пажадана);
- памочнік, які будзе даваць гудкі і светлавыя сігналы, а таксама займецца іншымі спецэфектамі.

**Падрыхтоўка**

- адно памяшканне абсталюйце пад «электрастанцыю». Ачысціце месца пасярэдзіне. Працягніце вяроўку (якая імітуе электрычны провад) праз пакой на ўзроўні плеч і надзейна замацуйце яе канцы.

Мір і гвалт

Грамадзянскасць і ўдзел

Агульныя правы чалавека

Узровень 3

Больш за 10 чалавек (малыя групы па 3–5 чалавек)

90 хвілін

## Інструкцыі

1. Растлумачце ўдзельнікам, што яны будуць працаваць на электрастанцыі. Звычайныя электрастанцыі выпрацоўваюць электрычнасць з урану, вугалю, газу, смецця, біяпаліва, сонечных прамянёў, ветру або хваль. Але наша электрастанцыя выпрацоўвае энергію з актаў гвалту, а таму з’яўляецца патэнцыяльна небяспечнай, і яе трэба або закрыць, або перавесці на іншае паліва. Вы (як фасілітатар) будзеце загадчыкам электрастанцыі, а ўдзельнікі будуць іграць ролю манцёраў.

**Частка 1. Мазгавы штурм актаў гвалту**

2. Папрасіце кожнага ўдзельніка коратка выказацца на тэму «Гвалт вакол мяне». Удакладніце, што гаворка не ідзе пра такія сур'ёзныя рэчы, як тэрарызм ці генацыд, але, хутчэй, пра гвалт, з якім мы сутыкаемся ў паўсядзённым жыцці – у школе або ў маладзёжных клубах, на вуліцы ці дома.

3. Падзяліце ўдзельнікаў на групы па 3–5 чалавек і раздайце кожнай групе па тры аркушы (чырвонай) паперы і маркер. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца вынікамі мазгавога штурму і прыйсці да агульнай думкі наконт таго, якія формы гвалту патрабуюць умяшання ў першую чаргу. Удзельнікі павінны запісаць іх ключавымі словамі або кароткімі фразамі на асобных аркушах паперы вялікімі літарамі.
4. Збярыце аркушы і хутка прагледзіце іх. Калі адны і тыя ж формы гвалту паўтараюцца, пакіньце адзін ліст, а астатнія адкладзіце ў бок.
5. Дайце ўдзельнікам перапынак на пяць хвілін, каб падрыхтавацца да другой часткі практыкавання. Развесьце аркушы паперы на «электрычным провадзе» на адлегласці каля 0,5 м адзін ад аднаго. Замацуйце скотчам так, каб яны заставаліся на месцы і не зляталі.

**Частка 2. На электрастанцыі**

6. Калі ўсё будзе гатова, і аркушы з «формамі гвалту» будуць прымацаваны да вяроўкі, скажыце групе, што вы толькі што атрымалі паведамленне ад адказнага за здароўе і бяспеку аб тым, што станцыя будзе зачынена, пакуль яны, «манцёры», не знойдуць іншае паліва для яе.
7. Запрасіце «манцёраў» на «электрастанцыю». Падзяліце іх на дзве каманды і раздайце кожнай шмат аркушаў (зялёнай) паперы, маркеры і рулон скотча.
8. Скажыце, што перад імі электрычны провад, а кожны ліст – гэта праява гвалту.
9. Растлумачце, што адна з прычын таго, чаму станцыя такая небяспечная, заключаецца ў тым, што гвалт дае энергію вельмі няроўным патокам, што нярэдка прыводзіць да скачкоў. Калі гэта здараецца, хуткі спосаб не дапусціць выбуху на станцыі – гэта перарэзаць провад; але гэта вельмі небяспечная працэдура, і яе трэба пазбягаць любой цаной. Калі будзе набліжацца асабліва моцны скачок, пачнуць міргаць лямпачкі і прагучыць аварыйны сігнал. Удзельнікі павінны дзейнічаць хутка, каб пагасіць скачок энергіі. Для гэтага яны павінны будуць прыдумаць, як трансфармаваць праявы гвалту, развешаныя на электрычным провадзе, у пазітыўныя дзеянні.
10. Растлумачце, што рабіць, калі ўдзельнікі пачуюць гукавы сігнал і ўбачаць мірганне лямпачкі. Вы пакажаце ім месца, дзе збіраецеся перарэзаць провад, і зачытаеце словы, напісаныя на аркушах, якія вісяць па абодва бакі ад планаванага месца разрэзу проваду. У абедзвюх каманд будзе не больш за 1 хвіліну, каб прыдумаць, як лепш адказаць на гэтыя формы гвалту. Яны павінны запісаць свае прапановы (кожную на асобным аркушы зялёнай паперы) і як мага хутчэй прымацаваць іх да проваду ў тым месцы, дзе вы збіраецеся яго перарэзаць.
11. Зараз запусціце электрастанцыю і дайце ёй папрацаваць адну-дзве хвіліны. Папрасіце памочніка даць гукавы і светлавы сігналы. Вазьміце кусачкі і зрабіце выгляд, што збіраецеся перарэзаць провад у пэўным месцы. Гучна зачытайце абедзве формы гвалту і дайце камандам знак прыступаць да працы па выратаванні сітуацыі.
12. Праз хвіліну выключыце гукавы і светлавы сігналы, адкладзіце ў бок кусачкі, выйдзіце наперад і зачытайце, што напісана на «аркушах з рашэннем». Коратка абмяркуйце гэтыя рашэнні з усёй групай. Прапануйце групам унесці папраўкі або адкінуць тыя аркушы, рашэнні на якіх пасля абмеркавання здаюцца нерэалістычнымі. Адарвіце абодва аркушы з «формамі гвалту» і ўздыхніце з палёгкай.
13. Паўтарайце 11 і 12 этапы да таго часу, пакуль усе аркушы з «формамі гвалту» не будуць заменены на «аркушы з рашэннем».
14. У заключэнне зніміце ўсе аркушы з «рашэннямі» з проваду і прымацуйце іх на сцяну побач з «праявамі гвалту».

## Аналіз і ацэнка

Спачатку абмяркуйце ход практыкавання, а затым кожную праяву гвалту разам з прапанаванымі рашэннямі.

- Як адчувалі сябе ўдзельнікі падчас практыкавання? Ці спадабалася яно ім? Чаму? Чаму не?
- Ці ўсе згодны з тым, што любая форма гвалту небяспечная?

- Якія прычыны розных праяў гвалту знайшлі ўдзельнікі?
- Ці рэалістычныя прапанаваныя рашэнні? У бліжэйшай перспектыве? У доўгатэрміновай перспектыве?
- З якімі цяжкасцямі або з якім супраціўленнем можна сутыкнуцца падчас рэалізацыі гэтых рашэнняў?
- Як найбольш эфектыўна моладзь можа прадухіляць гвалт і адстойваць альтэрнатыўныя, мірныя рашэнні?
- Якія правы чалавека парушаюцца ў выніку гвалту?

## Парады для фасілітатараў

Вам спатрэбіцца прыкладна 10 хвілін на правядзенне 1-й часткі практыкавання (мазгавы штурм), каля 60 хвілін для працы на электрастанцыі і 20 хвілін на аналіз і ацэнку.

Калі трэба дапамагчы ўдзельнікам падчас мазгавога штурму, вы можаце прывесці прыклады праяў гвалту ў адносінах да асобных людзей, напрыклад цкаванне, прысвойванне мянушак, кпіны, злыя жарты, тэлефонныя званкі і тэкставыя паведамленні (SMS) з пагрозамі, а таксама вандалізм у адносінах да асабістай уласнасці. Вы таксама можаце згадаць тыя формы гвалту, якія не накіраваны супраць асобнага чалавека, напрыклад тыя, што мы бачым у фільмах або чуем у песнях.

У працы па пункце 11 мэта каманд – распрацаваць 2-3 прапановы па паводзінах у выпадку кожнай формы гвалту, але досыць будзе і адной. Прапанаваныя рашэнні павінны быць рэалістычнымі.

Поспех практыкавання шмат у чым залежыць ад таго, ці атрымаецца ў вас стварыць рабочую атмасферу і абудзіць ва ўдзельнікаў пачуццё неабходнасці не дапусціць разразанне проваду і дзейнічаць хутка. Вы можаце спампаваць гукі працуючых механізмаў і гукавыя сігналы з Інтэрнэту. Іграючы ролю «загадчыка», вы можаце надзець белы халат і каску; калі ёсць магчымасць, дазвольце «манцёрам» таксама прыдумаць сабе касцюмы. Акрамя таго, можна падумаць аб тым, каб правесці гэта практыкаванне ў падвальным памяшканні з водаправоднымі трубамі. Вядома, пэўны ўзровень вашага акцёрскага майстэрства надасць практыкаванню жвавасці, але асаблівыя ўменні тут не патрэбны. Проста старайцеся падтрымліваць «тонус» дыскусіі ў перапынках паміж кароткімі выступленнямі ўдзельнікаў. Шырокія дэбаты пакіньце да этапа аналізу.

Калі ўдзельнікам патрабуюцца дадатковыя тлумачэнні таго, як прыдумаць ідэю для вырашэння праблемы, вы можаце прывесці наступныя прыклады. Калі гаворка ідзе пра «цкаванне», можна спланаваць школьныя інфармацыйныя семінары па прафілактыцы цкавання або падрыхтаваць пасрэднікаў з ліку аднагодкаў. Што тычыцца «тэлевізійнага гвалту», то можна выступіць за забарону трансляцыі фільмаў са сцэнамі гвалту да 11 гадзін вечара ці ж прыдумаць для дзяцей іншыя заняткі ў якасці альтэрнатывы прагляду тэлеперадач.

Калі ўдзельнікаў не вельмі многа, вы можаце правесці практыкаванне і з адной групай «манцёраў». Сэнс дзялення на дзве групы складаецца ў тым, што кожная з іх вельмі часта прапануе розныя рашэнні адной і той жа праблемы, што пашырае круг магчымасцей. Вы таксама можаце паскорыць тэмп выканання практыкавання, дадаўшы элемент спаборніцтва. Для гэтага раздайце кожнай з каманд аркушы паперы рознага колеру і паглядзіце, якая каманда прыме больш рашэнняў.

## Прапановы па далейшай працы

Падчас працы на «электрастанцыі» могуць закранацца гендарныя пытанні ці праблемы дыскрымінацыі. Нават калі гэтага не здарыцца, вам будзе цікава разгледзець пытанні, звязаныя з самавызначэннем асобы і правам на роўную годнасць і павагу. Звярніце ўвагу на практыкаванне «Хто я такія?» на старонцы 332.

## Ідэі для дзеяння

Распачніце актыўныя дзеянні для вырашэння адной з закранутых у практыкаванні праблем. Напрыклад, калі вы выбераце тэму цкавання, група можа выступіць з прапановай правесці ў школе семінар на гэту тэму і ўключыць гэта пытанне ў парадак дня наступнага пасяджэння школьнага савета або савета аб'яднання.

### Дадатковая інфармацыя

Практыкаванне «Электрастанцыя» распрацавана на аснове практыкавання, прапанаванага Дарыюшам Гжэмным з Асацыяцыі дзяцей і моладзі («Шанц»), г. Глогаў, Польшча.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**4 лістапада**
Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека была падпісана ў гэты дзень у 1950 годзе

**Заўвага.**
Гэту методыку можна адаптаваць для разгляду любых пытанняў, звязаных з выяўленнем праблем і пошукам рашэнняў.

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Культура і спорт

Мір і гвалт

Узровень 3

4–30 чалавек (малыя групы па 4–5 чалавек)

120 хвілін

# Адказ расізму

*Кожны нясе адказнасць за тое, каб заўважаць любыя праявы расізму і шукаць рашэнне праблем, звязаных з ім!*

**Складанасць** узровень 3

**Памер групы** 4–30 чалавек (малыя групы па 4–5 чалавек)

**Час** 120 хвілін

**Тэмы**
- дыскрымінацыя і нецярпімасць,
- культура і спорт,
- мір і гвалт.

**Агляд**
У гэтым практыкаванні ўдзельнікі ролевай гульні разыгрываюць сур'ёзны інцыдэнт для вывучэння наступных праблем:
- расізм, стэрэатыпы і культурныя адрозненні;
- распаўсюджанасць некаторых форм расізму і прадузятасці, асабліва ў дачыненні да цыганоў-рама;
- як змагацца з расізмам у школе і іншых навучальных установах.

**Звязаныя правы**
- роўнасць чалавечай годнасці і правоў;
- свабода ад дыскрымінацыі;
- свабода думкі, сумлення і рэлігіі.

**Мэты**
- паглыбіць разуменне культурных адрозненняў і інстытуцыянальнага расізму;
- развіць навыкі калектыўнага ўдзелу, камунікацыі і супрацоўніцтва;
- умацаваць пачуццё адказнасці, справядлівасці і салідарнасці.

**Матэрыялы**
- вялікія аркушы паперы або папера для фліпчарта, маркеры;
- 4 добраахвотнікі для інсцэніроўкі;
- ролевыя карткі;
- ролевая картка з апісаннем «сур'ёзнага інцыдэнту»;
- рэкамендацыі для фасілітатара;
- копіі школьнай палітыкі і рэкамендацый па процідзеянні расізму; па адной для двух удзельнікаў;
- копіі раздатачнага матэрыялу «Некаторыя практычныя заўвагі»; іх таксама можна запісаць на вялікім аркушы паперы;
- папера і ручкі.

**Падрыхтоўка**
- вывучыце апісанне крытычнага інцыдэнту, у выпадку неабходнасці адаптуйце яго з улікам вашай сітуацыі;
- выберыце чатырох добраахвотнікаў і папрасіце іх падрыхтаваць вельмі кароткую сцэнку на аснове апісанага інцыдэнту і паказаць яе астатнім членам групы;
- зрабіце 5 копій карткі са сцэнарыем крытычнага інцыдэнту (па адной для кожнага выканаўцы і адну для фасілітатара);
- зрабіце копію рэкамендацый для фасілітатара.

## Інструкцыі

Практыкаванне складаецца з дзвюх частак: часткі 1, якая прадугледжвае агляд ведаў удзельнікаў наконт тэрміна «расізм», і часткі 2, у якой вядзецца распрацоўка плана дзеянняў на выпадак праяў расізму ў вашай школе, клубе або арганізацыі.

**Частка 1. Што мы разумеем пад тэрмінам «расізм»?**

1. Пачніце практыкаванне з мазгавога штурму, каб вызначыць гэта паняцце.
2. Праявы расізму і ўзаемнае непаразуменне паміж прадстаўнікамі розных культур – з'ява паўсядзённая. З дапамогай мазгавога штурму высветліце, якія дзеянні ў паўсядзённым жыцці можна аднесці да расізму.
3. Папрасіце чатырох добраахвотнікаў прыняць удзел у ролевай гульні. Раздайце ім ролевыя карткі і копіі з апісаннем крытычнага інцыдэнту; дайце 15 хвілін на падрыхтоўку.
4. Растлумачце, што ўсе астатнія ўдзельнікі з’яўляюцца гледачамі. Раздайце ім паперу і ручкі і скажыце, што яны паглядзяць тры кароткія сцэнкі, паміж якімі будуць невялікія перапынкі, калі гледачы змогуць запісаць ключавыя словы, якія адлюстроўвалі б іх меркаванне наконт убачанага.
5. Папрасіце добраахвотнікаў прадставіць сваю інсцэніроўку.
6. У канцы правядзіце кароткі разбор каментарыяў гледачоў:
   a. Што гледачы запісалі падчас першага перапынку? Што прывяло іх да такіх заключэнняў?
   b. Што гледачы запісалі падчас другога перапынку? Што прывяло іх да такіх заключэнняў?
   c. Да якой высновы гледачы прыйшлі ў канцы? Якія ў іх былі здагадкі?
7. У ходзе дыскусіі высветліце, што, на думку ўдзельнікаў, педагогі, бацька Гюлы і дырэктар школы маглі – ці павінны былі – зрабіць, каб знайсці справядлівае рашэнне?

**Частка 2. Распрацоўка плана дзеянняў на выпадак праяў расізму**

1. Растлумачце, што ў гэтай частцы практыкавання ўдзельнікам трэба будзе распрацаваць асноўныя прынцыпы барацьбы з праявамі расізму і стварыць адпаведную палітыку для школы.
2. Метадам мазгавога штурму вызначце розныя групы «дзеючых асоб» у школе; гэта, напрыклад, могуць быць вучні, настаўнікі, дырэктар, тэхнічны персанал, бібліятэкары, вадзіцелі школьнага аўтобуса і вартаўнікі, у тым ліку тыя, хто сочыць за гульнявой пляцоўкай.
3. Падзяліце ўдзельнікаў на малыя групы па 4–5 чалавек для абмеркавання абавязкаў пералічаных катэгорый у адносінах да праяў расізму. Дайце групам 30 хвілін на абмеркаванне і падрыхтоўку дакладу з кароткім выкладам тэзісаў на фліпчарце.
4. Запрасіце групы прадставіць вынікі сваёй працы на агульным пасяджэнні. Фасілітатар павінен запісаць кароткае рэзюмэ ўсіх пунктаў на дошцы або фліпчарце.
5. Папрасіце ўдзельнікаў зрабіць агляд палітык і рэкамендацый, якія ўжо маюцца ў іх школе. Што ў іх варта змяніць?
6. Цяпер папрасіце ўдзельнікаў распрацаваць свае палітыкі. Няхай кожная малая група працуе над нейкім адным аспектам (этапам або мерай). Напрыклад, калі патрабуецца агульнае для ўсёй школы абвяшчэнне пэўнай заявы пра расізм і дыскрымінацыю, адна з груп можа заняцца яе напісаннем. Групам трэба таксама абмеркаваць, як яны будуць прадстаўляць вынікі сваёй працы на агульным пасяджэнні: акрамя пісьмовага тэксту, яны могуць выкарыстаць відарысы, калаж, пантаміму і г. д., каб лепш перадаць свае ідэі.
7. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы на агульным пасяджэнні і абмяркоўваюць шляхі іх практычнай рэалізацыі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з абмеркавання самога практыкавання і высветліце, якія правы чалавека апынуліся пад пагрозай, затым абмяркуйце, што новага даведаліся ўдзельнікі і што ім рабіць далей.

- Наколькі распаўсюджаны расізм у вашай школе і ў грамадстве ў цэлым?
- Ці вядомы вам якія-небудзь праявы расізму ў вашай школе або супольнасці?
- Ці пакутуюць якія-небудзь групы ад расізму больш, чым іншыя? Якія групы? Чаму? Ці былі тыя ж самыя групы аб'ектам нападак 20 ці 50 гадоў таму?
- Якое стаўленне да цыганоў-рама ў вашай краіне і ў іншых краінах Еўропы?
- Якія стэрэатыпы ў вас ёсць у дачыненні да цыганоў-рама? Як узніклі гэтыя стэрэатыпы? Як іх можна абвергнуць?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**21 сакавіка**
Міжнародны дзень барацьбы за ліквідацыю расавай дыскрымінацыі (Дзень процідзеяння расізму)

- Якія правы чалавека апынуліся пад пагрозай у крытычным інцыдэнце?
- Ці дапамагло практыкаванне ўдзельнікам змяніць свае ўяўленні аб тым, што з'яўляецца праявай расізму? У якой меры? Прывядзіце прыклады.
- Хто нясе адказнасць за тое, каб у вашай школе або арганізацыі не было праяў расізму?
- Мець правільную палітыку на выпадак праяў расізму, вядома, важна, але хіба не лепш было б наогул не мець патрэбы ў такіх палітыках? Што можна і трэба зрабіць, каб выкараніць прычыны расізму ў школе і ў грамадстве ў цэлым?

## Парады для фасілітатараў

Для вас важна ведаць членаў групы і іх біяграфію і ў выпадку неабходнасці ўносіць адпаведныя змены ў практыкаванне. Актыўнасць будзе значна вышэй, калі сітуацыя акажацца набліжанай да рэальнасці, якая знаёма групе. З іншага боку, будзьце гатовы да магчымага ўсплёску эмоцый. Важна звяртаць увагу на пачуцці тых, хто сам адчувае сябе ахвярай дыскрымінацыі ў школе.

Мазгавы штурм – класічны спосаб пачаць практыкаванне, але вы можаце ўзрушыць удзельнікаў, расказаўшы расісцкі анекдот; няхай ён будзе накіраваны супраць групы, прадстаўнікоў якой у вашым класе або маладзёжнай групе няма. У кожнай краіне ёсць анекдоты пра прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Вы можаце пачаць занятак, папрасіўшы некалькіх удзельнікаў расказаць такія анекдоты. Абмяркуйце пасля гэтага розніцу паміж расісцкімі і нерасісцкімі анекдотамі. Напрыклад, анекдоты пра цыганоў-рама ці пра яўрэяў расісцкія або нацыяналістычныя? Гэта дапамагло б групе падысці да вызначэння расісцкіх анекдотаў і праяў расізму (гл. ніжэй у раздзеле «Дадатковая інфармацыя»).

У пункце 5 часткі 1 вы можаце выкарыстаць метады форум-тэатра ці тэатральную тэхніку (гл. старонку 67).

У пункце 6 часткі 1 ад удзельнікаў можна чакаць усплёску эмоцый, якія могуць знайсці адлюстраванне ў каментарыях пасля кожнай сцэнкі, што можа ўскладніць аналіз сітуацыі. Праца пойдзе лепш, калі вы будзеце прытрымлівацца канкрэтыкі і заклікаеце групу сфакусіравацца на тым, што паказваюць акцёры.

У пункце 4 часткі 2 практыкавання можа высветліцца, што вынікі працы недастаткова канкрэтныя для пераходу далей. У такім выпадку скарыстайце раздатачны матэрыял «Некаторыя практычныя заўвагі» для паляпшэння вынікаў першых чатырох этапаў.

## Варыянты

Практыкаванне можна адаптаваць і для абмеркавання праблемы цкавання. Калі цкаванне прадстаўляе сабой актуальную для групы праблему, разгледзіце магчымасць правесці практыкаванне «Ці ёсць у нас альтэрнатывы?» на старонцы 140, перш чым пераходзіць да распрацоўкі палітыкі па барацьбе з цкаваннем.

## Прапановы па далейшай працы

Правярайце сітуацыю і палітыкі рэгулярна, напрыклад адзін-два разы ў год. Палітыкі трэба пераглядваць для таго, каб упэўніцца, што яны на самай справе павінны адпавядаць пастаўленым мэтам. Грамадства пастаянна мяняецца, і палітыкі павінны мяняцца разам з ім, каб заставацца актуальнымі і дапамагаць вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць у новых умовах.

Калі вы хочаце арганізаваць нейкую кампанію, то практыкаванне «Доста!» на старонцы 151 дапаможа вам.

Яшчэ адно практыкаванне, дзе ў цэнтры ўвагі знаходзяцца забабоны і дыскрымінацыя, – «Маё жыццё не шоу!» на старонцы 232, дзе гаворка ідзе пра кіберцкаванне. Калі група хоча разгледзець выпадкі дыскрымінацыі ў адносінах да людзей з інваліднасцю, можна правесці практыкаванне «Спорт для ўсіх» на старонцы 276.

## Ідэі для дзеяння

Працягвайце працаваць над палітыкамі для сваёй школы або арганізацыі і дамагайцеся іх выканання. Наладзьце сувязь з антырасісцкімі праектамі ў іншых краінах. Напрыклад, з праграмай «Школы без расізму», якая ажыццяўляецца ў Бельгіі і патрабуе, каб мінімум 60 % школьнага калектыву падпісалі і выконвалі заяву аб адказе ад дыскрымінацыі (http://members.multimania.nl/astrada/szr/swr.html).

## Дадатковая інфармацыя

### Вызначэнні расізму

Расізм, у агульных рысах, – гэта паводзіны, словы або ўчынкі, якія выказваюць добразычлівае або нядобразычлівае стаўленне да людзей на падставе колеру іх скуры, культуры або этнічнага паходжання. Больш завуаліраваныя формы расізму такія ж шкодныя, як і адкрытыя.

Інстытуцыянальная форма расізму вызначаецца як калектыўная адмова якой-небудзь арганізацыі забяспечыць адпаведнае прафесіянальнае аказанне паслуг людзям з-за колеру іх скуры, культуры або этнічнага паходжання. Гэта назіраецца ці адчуваецца ў працэдурах, паводзінах і стаўленні, якія становяцца дыскрымінацыйнымі ў сілу ненаўмыснай праявы забабонаў, неабдуманасці, няўважлівасці і расісцкіх стэрэатыпаў у дачыненні да прадстаўнікоў этнічных меншасцей. Расісцкія інцыдэнты і нападкі магчымы ў любой установе незалежна ад колькасці навучэнцаў, якія прадстаўляюць этнічныя меншасці.

Расісцкім лічыцца любы інцыдэнт, які ўспрымаецца як такі ахвярай або любой іншай асобай, напрыклад:

**Прычыненне фізічнай шкоды**. Да гэтай катэгорыі адносяцца відавочныя прыклады гвалтоўных нападкаў або фізічнага запалохвання як дзяцей, так і дарослых, якія адносяцца да меншасцей, а таксама «дробныя» выпадкі запалохвання, якія могуць выклікаць кумулятыўны эфект.

**Славесныя абразы**. Абраза прадстаўнікоў меншасцей, высмейванне ў любой форме іх культуры (музыкі, адзення, кухні) – больш відавочныя прыклады такога тыпу расізму. Маюць месца і іншыя, менш відавочныя абразлівыя заўвагі з боку педагогаў, вучняў, іншых дарослых, напрыклад выпадковыя рэмаркі з расісцкім падтэкстам абразлівага характару.

**Адмова ад супрацоўніцтва і непавага**. Адмова ад супрацоўніцтва або адсутнасць павагі да навучэнцаў, педагогаў, трэнераў, маладзёжных працаўнікоў і іншых прадстаўнікоў меншасцей з боку прадстаўнікоў школы або іншай навучальнай установы могуць быць праявамі расізму, калі відавочна расісцкая матывацыя або калі «ахвяра» яе адчувае. Непавага можа быць ненаўмыснай, калі, напрыклад, настаўнік або трэнер праяўляе недасведчанасць аб культурных традыцыях вучня ў такой форме, што той адчувае сябе нязручна ці лічыць сябе пакрыўджаным.

**Іншыя праявы**. Расісцкія жарты і ўжыванне расісцкай тэрміналогіі, нашэнне расісцкай сімволікі, значкоў, адзення з надпісамі і г. д. расісцкія графіці, распаўсюджванне расісцкай літаратуры, плакатаў, прысутнасць расісцкіх або фашысцкіх арганізацый у школе ці яе наваколлі, распаўсюджванне дарослымі стэрэатыпаў, што можа прывесці да дыскрымінацыі.

Многія праявы расізму не такія відавочныя. Часта менавіта завуаліраваныя праявы цяжэй за ўсё выяўляць і пераадольваць. Многія расісцкія інцыдэнты з удзелам навучэнцаў не адбываюцца ў прысутнасці настаўнікаў або дарослых. Менавіта таму важна распрацаваць у школах адпаведныя палітыкі з тым, каб усе члены школьнага калектыву адразу заўважалі праявы расізму, паведамлялі пра іх і змагаліся з імі ў рамках сваіх паўнамоцтваў.

Больш інфармацыі пра расізм, антысемітызм, прадузятасць і варожасць да цыганоў-рама можна знайсці ў раздзеле «Дыскрымінацыя і нецярпімасць» главы 5 на сайце www.coe.int/compass.

## Раздатачныя матэрыялы

### Ролевыя карткі

**Ролевая картка дырэктара школы**

Больш за ўсё вы непакоіцеся аб рэпутацыі школы ў плане бяспекі і крадзяжу.

**Ролевая картка 1-га настаўніка**

Вы заўважылі, што ў школе знікаюць не толькі грошы, але і рэчы. Вы звярнулі ўвагу, што на мінулым тыдні Гюла прыйшоў у школу з мабільным тэлефонам.

**Ролевая картка 2-га настаўніка**

Вы – класны кіраўнік Гюлы. Вы дастаткова добра яго ведаеце, і ён вам падабаецца. Гэта добры, удумлівы і старанны хлопчык, але ў яго няма сяброў.

**Ролевая картка бацькі**

Гюла – добры хлопчык. Вы разумееце важнасць адукацыі і заўсёды правяраеце, ці зрабіў сын дамашняе заданне, перш чым дазволіць яму пайсці гуляць у футбол. На мінулым тыдні ў яго быў дзень нараджэння.

### Крытычны інцыдэнт

Кожная сцэна адбываецца ў кабінеце дырэктара

**Сцэна 1: дырэктар, 1-шы і 2-гі настаўнікі**

Дырэктар, 1-шы і 2-гі настаўнікі абмяркоўваюць праблему і рэакцыю на ўсплёск кішэнных крадзяжоў у школе. Было некалькі выпадкаў, напрыклад, спачатку знікла аўтаручка, а потым шмат чаго стала знікаць, але ў асноўным грошы.

Ходзяць розныя чуткі пра тое, хто б гэта мог зрабіць, і больш за ўсіх пад падазрэннем Гюла – цыган-рама.

Час: 3–5 хвілін.

**Сцэна 2: дырэктар, бацька Гюлы і 1-шы настаўнік**

Дырэктар прымушае бацьку Гюлы прызнацца, што крадзяжы – справа рук яго сына. Бацька сцвярджае, што сын не мог гэтага зрабіць. Тым не менш ён просіць прабачэння і згодны кампенсаваць скрадзеныя грошы.

Настаўнікам вельмі няёмка ў гэтай сітуацыі, і яны абяцаюць захаваць усё ў тайне. Так, Гюла можа заставацца ў школе, але і бацьку трэба больш уважліва сачыць за сынам.

Час: 3–5 хвілін.

**Сцэна 3: дырэктар і 2-гі настаўнік**

Дырэктар і 2-гі настаўнік абмяркоўваюць становішча ў школе, якое значна палепшылася. Яны задаволены, што інцыдэнт, як яны думаюць, вычарпаны.

Уваходзіць 1-шы настаўнік; ён паведамляе, што паліцыя толькі што арыштавала вучня (не Гюлу) за кішэнныя крадзяжы, якія той ажыццяўляў каля варот школы. Ён прызнаўся ва ўсіх выпадках крадзяжу грошай.

Яны абмяркоўваюць сваю рэакцыю на гэту навіну.

Час: 3–5 хвілін.

### Рэкамендацыі для фасілітатара

Папрасіце добраахвотнікаў паказаць свае сцэнкі. Падчас перапынкаў паміж імі спантанна задавайце пытанні і прасіце гледачоў запісваць ключавыя словы, якія перадаюць іх меркаванне на дадзеным этапе.

**Першы перапынак**. Першае пытанне да гледачоў: «Што б вы зрабілі на месцы дырэктара?»
**Другі перапынак**. Другое пытанне да гледачоў: «Ці лічыце вы развязку інцыдэнту здавальняючай?»
**Трэці перапынак**. Трэцяе пытанне да гледачоў: «Якое ваша меркаванне цяпер?»

**Некаторыя практычныя заўвагі, якія варта мець на ўвазе пры распрацоўцы палітыкі процідзеяння расізму**.

Вырашаючы праблему расізму і яго праяў, неабходна распрацаваць і ажыццяўляць палітыку на ўзроўні ўсёй школы (арганізацыі). Важна, каб стаўленне да праяў расізму было сугучным з агульнай палітыкай і практыкай школы. Вострыя праблемы трэба лічыць «асаблівымі, але не ізаляванымі». Варта ўлічваць некаторыя практычныя моманты:

- Школа павінна афіцыйна і цвёрда заявіць, што не пацерпіць ніякіх расісцкіх інцыдэнтаў ці праяў.
- У школьнай палітыцы павінен быць дакладна распісаны парадак дзеянняў у выпадку расісцкага інцыдэнту.
- Агульнашкольны падыход, уключаючы адпаведную працэдуру і ўзгодненыя дзеянні па вырашэнні расавых канфліктаў, павінен распаўсюджвацца на ўсіх людзей, якія маюць дачыненне да школьнай супольнасці: кіраўніцтва, супрацоўнікаў (педагогаў і дапаможных працаўнікоў), бацькоў, вучняў, студэнтаў і наведвальнікаў.
- Павінна быць яснае разуменне таго, што кожны член школьнага калектыву абавязаны выяўляць і спыняць праявы расізму і расавага прыгнёту.
- Падыход павінен быць паслядоўным, каб кожны ведаў, што ад яго чакаюць.
- Варта памятаць пра тое, што рэакцыя на інцыдэнт павінна наступіць неадкладна, як толькі ён адбыўся ці быў выяўлены.
- Любыя меры ў адказ на інцыдэнт павінны прымацца ў загадзя вызначаны тэрмін.

Крыніца: http://www.northants-ecl.gov.uk/apps/IPS/msc/rig/hme.asp

COMPASS

Агульныя правы чалавека

Узровень 1

Больш за 8 чалавек

60 хвілін

# «Бінга!» на тэму правоў

*Што мы ведаем пра правы чалавека?*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • агульныя правы чалавека. |
| **Складанасць** | узровень 1 |
| **Памер групы** | больш за 8 чалавек |
| **Час** | 60 хвілін |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне ўяўляе сабой простую віктарыну і варыянт гульні «Бінга!», у якой удзельнікі дзеляцца сваімі ведамі аб правах чалавека і вопытам у гэтай галіне. |
| **Звязаныя правы** | • любыя правы чалавека. |
| **Мэты** | • дабіцца разумення таго, што правы чалавека распаўсюджваюцца на ўсіх і ўсюды;<br>• развіць уменне слухаць і крытычна думаць;<br>• прывіць павагу да іншых людзей і да іх меркаванняў. |
| **Матэрыялы** | • па адным экзэмпляры пытанняў віктарыны і алоўку на кожнага ўдзельніка;<br>• папера для фліпчарта і маркеры. |
| **Падрыхтоўка** | • зрабіце ксеракопію старонкі з пытаннямі віктарыны на вялікім аркушы паперы або на аркушы паперы для фліпчарта;<br>• азнаёмцеся з асноўнымі правамі, пералічанымі ў УДПЧ (гл. старонку 600) і ў Канвенцыі аб правах дзіцяці (гл. старонку 605). |

## Інструкцыі

1. Раздайце лісты з пытаннямі віктарыны і алоўкі.
2. Растлумачце ўдзельнікам, што яны павінны знайсці сабе партнёра і задаць яму адно з пытанняў віктарыны. Ключавыя словы адказу трэба запісаць у адпаведнай графе.
3. Пасля гэтага пары разбіваюцца, і ўдзельнікі знаходзяць сабе іншых партнёраў.
4. Мэта гульні заключаецца не толькі ў тым, каб запоўніць усе графы табліцы, але і ў тым, каб на кожнае пытанне адказваў іншы ўдзельнік.
5. Удзельнік, які атрымаў адказы на ўсе пытанні і запоўніў усе графы табліцы, гучна крычыць: «Бінга!». Ён/яна/яны – пераможцы гульні.
6. Пераходзьце да дыскусіі. Зачытайце пытанне з першай графы віктарыны і папрасіце ўдзельнікаў па чарзе зачытаць атрыманыя на гэта пытанне адказы. Запішыце на фліпчарце ключавыя словы. Дайце ўдзельнікам магчымасць коратка пракаментаваць адказы.
7. Калі табліца на фліпчарце будзе запоўнена, перайдзіце ў пачатак і больш глыбока абмяркуйце адказы ў кожнай графе.

## Аналіз і ацэнка

- Ці ўсе пытанні мелі дачыненне да правоў чалавека? Да якіх канкрэтна?
- На якія пытанні было цяжэй за ўсё адказаць? Чаму?
- Якія пытанні былі самымі спрэчнымі? Чаму правы такія неадназначныя?
- Як удзельнікі даведаліся аб правах чалавека і аб іх парушэннях? Ці давяраюць яны крыніцам такой інфармацыі?

## Парады для фасілітатараў

Вы можаце па жаданні ўносіць змены ў любыя пытанні віктарыны, каб адаптаваць яе да інтарэсаў і ўзроўню вашай групы.

Пазначаючы адказы ўдзельнікаў на кожнае пытанне, запісвайце толькі ключавыя словы. Сэнс табліцы ў тым, каб аблегчыць абмеркаванне на наступным этапе. Пасля кожнага раўнда гульні давайце кароткія тлумачэнні, калі вас просяць удакладніць нейкае пытанне ці падказаць, як яго разумець. Адзначце для сябе пытанні, якія патрабуюць паглыбленага абмеркавання, і паабяцайце вярнуцца да іх пазней.

Можа здарыцца так, што ўдзельнікі будуць прыводзіць прыклады, якія акажуцца для вас незнаёмымі, ці таму, што будуць не так шырока вядомы, ці таму, што будуць узяты з асабістага жыцця. Гэта не мае значэння. Нельга ж ведаць усё пра ўсё! Вы можаце спытаць удзельнікаў, адкуль яны ўзялі тую ці іншую інфармацыю, і абмеркаваць яе дакладнасць і надзейнасць гэтай крыніцы. Безумоўна, гэта добрая магчымасць падштурхнуць удзельнікаў да крытычнага асэнсавання атрыманай інфармацыі ў цэлым.

Некаторыя адказы будуць неадназначнымі. Напрыклад, нехта можа сказаць, што аборт – гэта адмаўленне ў праве на жыццё. Некаторыя члены групы будуць цвёрда стаяць на гэтым пункце гледжання, іншыя ж будуць гэтак жа рашуча не згаджацца. Першы ўрок, які можна атрымаць з гэтай спрэчкі, заключаецца ў тым, што любое пытанне важна разгледзець з усіх бакоў і паспрабаваць высветліць, чаму нехта прытрымліваецца менавіта такога меркавання. Можна не згаджацца з нейкім меркаваннем, але чалавека, які яго прытрымліваецца, трэба паважаць.

Яшчэ адзін урок, які мы можам атрымаць: мы павінны ведаць аб правах чалавека менавіта таму, што яны патрэбны нам усім і пастаянна развіваюцца, а меркаванне кожнага патрэбна, каб надаць правам значнасць. У справе інтэрпрэтацыі і прымянення правоў чалавека няма абсалютнай яснасці, тут нельга ўсё вырашыць раз і назаўсёды; правы патрабуюць пастаяннай пераацэнкі і ўдасканалення. Таму кожны абавязаны ўдзельнічаць у працэсе прасоўвання і абароны правоў чалавека.

## Прапановы па далейшай працы

На прыкладзе аднаго або двух пытанняў, якія выклікалі спрэчкі, абмяркуйце дылемы, з якімі мы сутыкаемся ў рэальным жыцці, імкнучыся развіваць культуру павагі да правоў чалавека.

Правы чалавека можна вывучаць і праз візуальныя вобразы. Высветліце, як удзельнікі бачаць правы чалавека, выканаўшы практыкаванне «Улада кветак» на старонцы 177. Яно можа пацягнуць за сабой цэлы шэраг дыскусій, напрыклад пра стэрэатыпы, фарміраванне нашых уяўленняў аб свеце і дыскрымінацыю.

Магчыма, групу зацікавіць і тое, як СМІ асвятляюць падзеі і як можна надаць правам чалавека больш вагі. Знайдзіце раздзел «Робім навіны» ў навучальным пакеце «Усе розныя – усе роўныя».

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**8 мая**
Міжнародны дзень Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца

## Раздатачныя матэрыялы

### Пытанні віктарыны

| | | |
|---|---|---|
| Назва дакумента, які абвяшчае правы чалавека. | Асаблівае права, якое павінны мець усе дзеці. | Песня (фільм, кніга) пра правы чалавека. |
| Права, якога пазбаўлены пэўныя групы насельніцтва ў вашай краіне. | Права чалавека, якога асабіста вы пазбаўлены. | Арганізацыя, якая вядзе барацьбу за правы чалавека. |
| Наш агульны абавязак у дачыненні да правоў чалавека. | Прыклад дыскрымінацыі. | Права, якога часам пазбаўлены жанчыны. |
| Нейкая асоба, якая вядзе барацьбу за правы чалавека. | Парушэнне права на жыццё. | Прыклад парушэння права чалавека на недатыкальнасць прыватнага жыцця. |
| Права чалавека, у якім часта адмаўляюць маладым людзям. | Група ці супольнасць, чыя свабода ад дыскрымінацыі часта парушаецца ў вашай краіне. | Прыклад парушэння права на бяспечнае навакольнае асяроддзе ў вашай супольнасці. |

# Барацьба за багацце і ўладу

*У жыцці адны змагаюцца за свае мары, а іншыя – за багацце і ўладу!*

**Тэмы**
- беднасць,
- глабалізацыя,
- здароўе.

**Складанасць** узровень 3

**Памер групы** 8–25 чалавек

**Час** 90 хвілін

**Агляд** Гэта практыкаванне ўяўляе сабой мадэліраванне барацьбы за багацце і ўладу, дэманструе няроўнасць і несправядлівасць беднасці.

**Звязаныя правы**
- роўнасць чалавечай годнасці і правоў;
- права на дастатковы ўзровень жыцця;
- права на здароўе, ежу і прытулак.

**Мэты**
- развіць разуменне несправядлівасці, якая ўзнікае ў выніку нераўнамернага размеркавання багацця і ўлады;
- развіць навыкі крытычнага мыслення;
- абудзіць пачуццё справядлівасці і павагі чалавечай годнасці.

**Матэрыялы**
- 120 манет;
- 3–4 пары шкарпэтак;
- 2 вялікія аркушы паперы і маркеры;
- папера і ручкі;
- адкрытая прастора.

**Падрыхтоўка**
- прачытайце ўсю інструкцыю, каб мець уяўленне аб практыкаванні ў цэлым. Звярніце ўвагу, што яно складаецца з трох частак: часткі 1 – «Барацьба» (10 хвілін), часткі 2 – «Ахвяраванні» (10 хвілін) і часткі 3 – «Забеспячэнне эканамічнай справядлівасці» (40 хвілін). У канцы праводзіцца абмеркаванне;
- адкладзіце ў бок 20 манет;
- выберыце трох чалавек на ролю мігрантаў;
- павесьце на сцяну табліцу, якая будзе паказваць узровень дабрабыту гульцоў (гл. ілюстрацыю);
- падрыхтуйце табліцу «Ганаровыя донары».

## Інструкцыі

Растлумачце, што сутнасць гульні складаецца ў мадэліраванні сітуацыі. Удзельнікі павінны будуць размеркаваць паміж сабой сусветныя багацці і ўладу.

**Частка 1. Барацьба** (10 хвілін)

1. Растлумачце, што мэта гульні складаецца ў тым, каб атрымаць як мага больш манет. Ёсць толькі адно правіла: ні ў якім разе нельга дакранацца да іншага гульца (вы можаце ўвесці за гэта штраф, напрыклад у памеры адной манеты).
2. Папрасіце ўсіх, за выключэннем тых, хто іграе «мігрантаў», сесці на падлозе ў вялікі круг (каб было досыць месца для гульні).
3. Вазьміце адкладзеныя 20 манет і раздайце іх любым чатыром ці пяці ўдзельнікам.

COMPASS

Беднасць

Глабалізацыя

Здароўе

Узровень 3

8–25 чалавек

90 хвілін

4. Дайце чатыром іншым удзельнікам па пары шкарпэтак. Растлумачце, што яны павінны надзець іх на рукі і не здымаць на працягу ўсёй гульні. Тлумачэнне сэнсу раздачы манет і шкарпэтак адкладзіце да падвядзення вынікаў.
5. Раўнамерна рассыпце 100 манет у цэнтры круга.
6. Па вашым умоўным сігнале ўдзельнікі павінны сабраць як мага больш манет. На гэта спатрэбіцца не больш за дзве хвіліны!
7. Пасля таго як усе манеты будуць сабраны, папрасіце гульцоў паведаміць астатнім членам групы пра сваё багацце. Адзначце ў табліцы дабрабыту імёны гульцоў і колькасць сабраных імі манет.
8. Нагадайце групе, што манеты сімвалізуюць багацце і ўладу ў гэтым свеце. Ад іх колькасці ў кожнага ўдзельніка будзе залежаць яго здольнасць задаволіць свае патрэбы (напрыклад, у харчаванні, жыллі, адзенні, медыцынскім абслугоўванні і базавай адукацыі) і жаданні (напрыклад, атрымаць вышэйшую адукацыю, купіць аўтамабіль, камп’ютар, цацкі, тэлевізар і іншыя прадметы раскошы, з’ездзіць на адпачынак). Колькасць манет азначае наступнае:
   - 6 і больш манет: гульцы змогуць задаволіць усе свае асноўныя патрэбы і большасць сваіх жаданняў;
   - 3–5 манет: гульцы змогуць задаволіць свае асноўныя патрэбы;
   - 1–2 манет: гульцоў чакае цяжкае жыццё з-за хвароб, дрэннага харчавання і жылля, адсутнасці дастатковай адукацыі для атрымання працы.

**Частка 2. Ахвяраванні** (10 хвілін)
1. Скажыце ўдзельнікам, што пры жаданні яны могуць падзяліцца манетамі з іншымі, хоць ніхто іх да гэтага не прымушае. Скажыце ім, што той, хто так паступіць, атрымае званне донара, і яго імя будзе ўнесена ў спіс «Ганаровых донараў».
2. Дайце ўдзельнікам 3–4 хвіліны для пераразмеркавання манет, калі яны таго пажадаюць.
3. Затым папрасіце тых, хто падзяліўся сваімі манетамі, назваць свае імёны і сумы зробленых імі ахвяраванняў. Унясіце іх у спіс «Ганаровых донараў».
4. Спытайце, ці не перайшоў хто-небудзь з адной катэгорыі ў іншую пасля пераразмеркавання манет, і адлюструйце гэтыя змены ў табліцы пры дапамозе стрэлак.

**Частка 3. Забеспячэнне эканамічнай справядлівасці** (40 хвілін)
1. Падзяліце гульцоў на тры групы ў адпаведнасці з колькасцю манет у іх (вялікае багацце, сярэдняе багацце і маленькае багацце).
2. У кожную з трох груп увядзіце па адным «імігранце». Адзначце для сябе іх рэакцыю на тое, што ім дасталася менавіта гэта, а не іншая група, але абмеркаванне рэакцый адкладзіце да заканчэння гульні.
3. Раздайце ручкі і паперу. Дайце кожнай групе заданне распрацаваць план справядлівага размеркавання манет (сусветнага багацця), каб паменшыць разрыў паміж людзьмі з рознай колькасцю багацця і ўлады. У сваім плане дзеянняў кожная група павінна:
   - пазначыць, што неабходна зрабіць (калі такая неабходнасць існуе);
   - расказаць, што група плануе рабіць і чаму; і
   - растлумачыць, чаму менавіта яе план здольны забяспечыць справядлівасць.
4. Дайце групам 10 хвілін на распрацоўку планаў. Растлумачце, што план не павінен быць занадта падрабязным, – трэба назваць толькі некаторыя з магчымых мер, якія варта прыняць для вырашэння праблемы беднасці.
5. Папрасіце кожную групу выбраць аднаго ўдзельніка, які прадставіць план астатнім і адкажа на магчымыя пытанні. Запішыце прапанаваныя планы на вялікім аркушы паперы.
6. Цяпер абвясціце, што лепшы план будзе выбірацца галасаваннем. Галасы будуць размяркоўвацца наступным чынам:
   - кожны гулец з групы «Вялікае багацце і ўлада» будзе мець 5 галасоў;
   - кожны гулец з групы «Сярэдняе багацце і ўлада» будзе мець 2 галасы;
   - кожны гулец з групы «Маленькае багацце і ўлада» будзе мець 1 голас.
7. Пачніце працэдуру галасавання. Колькасць галасоў, адданых за кожны план, запішыце на вялікім аркушы паперы. Абвясціце, які план «перамог» і будзе рэалізаваны.
8. Рэалізуйце гэты план, пры неабходнасці пераразмеркаваўшы багацце.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з кароткага абмеркавання самога практыкавання, высветліце, ці спадабалася яно ўдзельнікам. Затым абмяркуйце, што адбылося, што новага яны даведаліся і якое дачыненне мае гэта практыкаванне да правоў чалавека. Каб распачаць абмеркаванне, задайце наступныя пытанні:

- Якія пачуцці выклікалі ва ўдзельнікаў метады набыцця і размеркавання манет? Ці былі яны справядлівымі?
- Чаму некаторыя ўдзельнікі ахвяравалі свае манеты іншым? Каб іх адзначылі? Бо яны адчувалі сябе вінаватымі? Па нейкіх іншых прычынах?
- Як сябе адчувалі тыя, хто атрымаў манеты ў частцы 2 практыкавання? Ці былі яны ўдзячны? Можа, яны адчувалі, што донары ставяцца да іх паблажліва?
- Што вы можаце сказаць пра гульцоў са шкарпэткамі? Каго яны прадстаўляюць? У якой групе яны апынуліся ў рэшце рэшт?
- Што можна сказаць пра трох «мігрантаў», уключаных у групы? Ці лічаць яны, што з імі абышліся справядліва? Ці падобна тое, што здарылася з імі, на тое, што адбываецца з людзьмі ва ўсім свеце? З якімі канкрэтна людзьмі? Ці залежыць наш лёс ад выпадку?
- Якія адрозненні паміж планамі справядлівага размеркавання можна вылучыць? Ці адлюстроўваюць такія планы дабрабыт групы, якая іх распрацавала?
- Чаму адны гульцы атрымалі больш галасоў, чым іншыя? Наколькі дакладна такое галасаванне адлюстроўвае рэальную карціну размеркавання ўлады ў свеце?
- Ці парушаюцца правы чалавека пры такім нераўнамерным размеркаванні багацця і ўлады? Калі так, то якія канкрэтна?
- Хто лічыцца «заможным», а хто – «бедным» у свеце, у вашай краіне і ў вашай мясцовасці? Як яны дасягнулі такога становішча?
- Ці павінны «заможныя» клапаціцца пра «бедных»? Чаму? Па прычынах, звязаных з бяспекай, эканомікай, мараллю, рэлігіяй ці палітыкай? Па якіх прычынах «заможныя» могуць падзяліцца грашыма або рэсурсамі з «беднымі»? Ці вырашыць гэта праблему беднасці?
- Што могуць зрабіць «бедныя», каб палепшыць сваю сітуацыю? Што робяць «бедныя» ва ўсім свеце і ў нашай краіне для вырашэння праблемы няроўнасці ў размеркаванні багацця і ўлады?
- Ці лічыце вы, што неабходна правесці пераразмеркаванне багацця і ўлады ва ўсім свеце? Чаму? Калі так, то як бы вы прапанавалі гэта зрабіць? На якіх прынцыпах заснаваны вашы прапановы па змяненні сітуацыі?
- Ці можа дзейнасць па абароне правоў чалавека стаць інструментам пераразмеркавання багацця?

## Парады для фасілітатараў

Мэтай гэтага практыкавання з'яўляецца прыцягненне ўвагі ўдзельнікаў да несправядлівага размеркавання багацця і ўлады ў свеце, але ёсць небяспека, што яно можа толькі замацаваць тую няроўнасць, якая існуе. Таму вам варта папярэдне высветліць сацыяльнае і эканамічнае становішча ўдзельнікаў і кіраваць дыскусіяй адпаведным чынам.

Падкрэсліце, што, як і ў рэальным жыцці, калі ўдзельнікі аддаюць частку сваіх манет, яны губляюць частку свайго багацця і прывілей, якія гэта багацце прыносіць.

Паспрабуйце захапіць маладых людзей гульнёй, каб яны ўвайшлі ў ролю і паводзілі сябе так, як быццам манеты – гэта і ёсць сапраўднае іх багацце. Вы можаце сказаць ім, што пасля гульні яны змогуць узяць гэтыя манеты сабе і на перапынку «купіць» сабе за іх напіткі і (або) пячэнне. Калі прыём са шкарпэткамі здасца вам не вельмі прыдатным, знайдзіце іншыя сродкі, каб падкрэсліць, што некаторыя гульцы маюць больш багацця і ўлады, чым іншыя. Напрыклад, некаторым удзельнікам можна дазволіць уступаць у гульню праз 15–30 секунд пасля яе пачатку. У частцы 3 «Забеспячэнне эканамічнай справядлівасці» вы можаце спецыяльна выклікаць ва ўдзельнікаў адчуванне прывілеяванасці або, наадварот, абмежаванасці ў магчымасцях, даўшы, напрыклад:

- крэслы, шклянкі вады, пячэнне і гэтак далей тым, хто валодае вялікім багаццем;
- некалькі крэслаў тым, хто валодае сярэднім багаццем;
- нічога, акрамя месца на падлозе, тым, хто валодае маленькім багаццем.

COMPASS

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**17 кастрычніка**
Міжнародны дзень барацьбы за ліквідацыю беднасці

**Табліца дабрабыту**

| Вялікае багацце і ўлада (6 або больш манет) | Сярэднае багацце і ўлада (3–5 манет) | Маленькае багацце і ўлада (1–2 манеты) |
|---|---|---|
| | | |

Пытанні для аналізу і ацэнкі з'яўляюцца складанымі і могуць запатрабаваць глыбокага і доўгага абмеркавання. Калі часу ў вас нямнога або група занадта вялікая, вы можаце падзяліць пытанні паміж малымі групамі. Малыя групы павінны быць «змешаныя», г. зн., у іх варта ўключыць прадстаўнікоў розных катэгорый дабрабыту. Прасачыце за тым, каб усе пункты гледжання прагучалі на агульным пасяджэнні і каб кожны атрымаў магчымасць пачуць усе пытанні і паразважаць над імі.

## Варыянты

Частку практыкавання, прысвечаную барацьбе, можна адаптаваць для абмеркавання праблем асоб з інваліднасцю. Можна прапанаваць такі спосаб: зафіксуйце руку ўдзельніка за спінай, і ён стане «аднарукім»; калі ён праўша, пакіньце яму левую руку, і наадварот. Нехта мог бы насіць на вачах павязку, нехта іншы – працаваць, лежачы на падлозе, яшчэ хтосьці – сядзець у крэслах, так што яму давялося б нахіляцца, каб нешта зрабіць на падлозе, нехта яшчэ мог бы сядзець на падлозе, скрыжаваўшы ногі і не маючы магчымасці перамяшчацца, у той час як іншыя могуць гэта рабіць, і гэтак далей.

## Прапановы па далейшай працы

Ёсць шмат розных спосабаў разумення паняцця «багацце», напрыклад, у залежнасці ад колькасці бедных людзей у грамадстве, ад паказчыкаў смяротнасці і індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу. А што тэрмін «багацце» азначае для членаў вашай групы? Для ўдзелу ў дыскусіі па гэтым пытанні запрасіце каго-небудзь з НГА, якая займаецца пытаннямі развіцця.

Вы можаце працягнуць абмеркаванне гэтай праблемы або папрасіць удзельнікаў напісаць справаздачу. Можна прапанаваць наступныя тэмы:

- Якім чынам багацце і ўлада ўплываюць на здольнасць чалавека карыстацца правамі чалавека і дабівацца павагі чалавечай годнасці?
- Ці накладаюць багацце і ўлада нейкую адказнасць?

Група можа працягнуць абмеркаванне тэмы багацця і яго размеркавання, звярнуўшыся да практыкавання «Колькі нам патрэбна?» на старонцы 189.

## Ідэі для дзеяння

Звяжыцеся з арганізацыяй, якая працуе з беднымі ў вашым раёне, і высветліце, у чым яны маюць патрэбу. Затым распрацуйце праект, каб паспрабаваць дапамагчы ім.

Часам бывае дастаткова распаўсюдзіць інфармацыю пра праблему, каб гэта паслужыла штуршком да пачатку перамен. Напрыклад, можна прапанаваць удзельнікам абмеркаваць пытанні размеркавання багацця з іх бацькамі і сябрамі.

## Дадатковая інфармацыя

Сістэмы мясцовага гандлёвага абмену ўяўляюць сабой, як правіла, мясцовыя гандлёвыя сеткі, якія выкарыстоўваюць сваю ўласную ўнутраную валюту. У іх аснове ляжыць кааператыўная форма арганізацыі, а кіруюць імі самі карыстальнікі, і таму іх члены, якія валодаюць большымі багаццямі, не маюць большага ўплыву і не спажываюць больш за сваю справядлівую долю рэсурсаў. Такія сістэмы з'яўляюцца правераным спосабам стымуляцыі мясцовай эканомікі, асабліва ў гарадах у стане заняпаду. Увядзіце «Local Exchange Trading Systems» у пошукавую сістэму або перайдзіце на сайт http://www.gmlets.u-net.com/.

Статыстыка па розных спосабах вымярэння багацця і беднасці знаходзіцца ў главе 5 у раздзеле аб беднасці.

**Купля прадуктаў праз арганізацыю Fairtrade («Справядлівы гандаль») з'яўляецца дзейсным спосабам падтрымкі вытворцаў у краінах, якія развіваюцца. Гэта арганізацыя дапамагае фермерам і рабочым зарабляць на дастатковы ўзровень жыцця**.
http://www.fairtrade.net/
http://www.european-fairtrade-association.org/

# Убачыць свае магчымасці

*Глядзі на магчымасці, а не на абмежаванні!*

**Тэмы**

- інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці,
- дыскрымінацыя і нецярпімасць,
- дзеці.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** 6–36 чалавек

**Час** 120 хвілін

**Агляд** Гэта практычнае заданне, мэтай якога з’яўляецца выклікаць суперажыванне людзям з інваліднасцю. Сярод іншага закранае наступныя пытанні:

- перашкоды на шляху інтэграцыі людзей з інваліднасцю ў грамадства;
- успрыманне правоў людзей з інваліднасцю як асноўных правоў чалавека.

**Звязаныя правы**

- права не падвяргацца дыскрымінацыі;
- роўнасць чалавечай годнасці і правоў;
- права на сацыяльнае забеспячэнне.

**Мэты**

- звярнуць увагу на некаторыя паўсядзённыя праблемы людзей з інваліднасцю;
- развіць разуменне патрэб людзей з інваліднасцю і ўменне адказваць на іх;
- выклікаць пачуцці суперажывання і салідарнасці.

**Матэрыялы**

**Для ўводзін**:

- аркуш паперы і ручка на кожнага ўдзельніка.

**Для часткі 2, на кожную пару**:

- поліэтыленавы пакет, у якім ляжыць ліст капусты ці салаты, аловак, крэйда, ліст дрэва (любога), аркуш каляровай паперы і бутэлька або банка прахаладжальнага напітку;
- павязка (на вочы);
- аркуш паперы і ручка.

**Для часткі 3, на пару**:

- 1 ролевая картка;
- аркуш паперы і ручка.

**Для часткі 4**:

- інвалідны вазок, адзін на 8 чалавек;
- прастора для стварэння трасы з перашкодамі (пераважна ў іншым пакоі, але ў гэтым няма абсалютнай неабходнасці); іншым варыянтам можа быць правядзенне занятку на вольным паветры;
- перашкоды: сталы, крэслы, дошкі, стосы старых газет і г. д.;
- вялікі аркуш паперы або дошка, маркеры;
- гадзіннік або секундамер.

**Падрыхтоўка**

- падрыхтуйце ролевыя карткі на падставе прапанаваных ніжэй сітуацый або прыдумайце свае ўласныя;
- па магчымасці папярэдне падрыхтуйце другі пакой для бегу з перашкодамі. Яшчэ лепш выйсці на вуліцу, дзе вы зможаце праклaсці трасу ў больш складаных умовах;
- калі вы вырашылі праводзіць практыкаванне ў памяшканні, расстаўце сталы і крэслы так, каб стварыць вузкія праходы, а дошкі або стосы газет на падлозе кампенсуюць вам адсутнасць натуральных перашкод.

**Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці**

**Дыскрымінацыя і нецярпімасць**

**Дзеці**

**Узровень 2**

**6–36 чалавек**

**120 хвілін**

## Інструкцыі

Практыкаванне складаецца з чатырох частак: часткі 1 – «Уводзіны», часткі 2 – «Прагулка з павязкай на вачах», часткі 3 – «Мова жэстаў» і часткі 4 – «Гонкі на інвалідных вазках».

**Частка 1. Уводзіны (10 хвілін)**

1. Растлумачце, што ў практыкаванні асноўная ўвага будзе прысвечана тром відам інваліднасці: парушэнням зроку, парушэнням слых і немаце, паралічу.
2. Папрасіце ўдзельнікаў на працягу некалькіх хвілін падумаць, як бы яны хацелі, каб з імі абыходзіліся ў выпадку інваліднасці, і якога абыходжання яны б не хацелі. Няхай яны запішуць некалькі ключавых слоў.
3. Папрасіце ўдзельнікаў запісаць, чаго б яны больш за ўсё баяліся, калі б атрымалі інваліднасць.
4. Пасля гэтага папрасіце іх перавярнуць аркушы з запісамі і падрыхтавацца «ступіць у рэальнасць».

**Частка 2. Прагулка з павязкай на вачах**

1. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на пары. Раздайце павязкі. Адзін з пары павінен іграць ролю сляпога, другі – яго павадыра. «Павадыр» адказвае за бяспеку свайго падапечнага ўвесь час выканання практыкавання. Ён можа толькі аднаскладова («так» або «не») адказваць на простыя пытанні, якія тычацца бяспекі.
2. «Павадыры» вядуць сваіх падапечных на прагулку на пяць хвілін (уключаючы ўздымы і спускі па лесвіцы і, па магчымасці, выхад на вуліцу).
3. Пасля прагулкі «павадыр» падводзіць «сляпога» да яго крэсла, на якім таго чакае сюрпрыз – пакет. Што ж у ім?
4. «Сляпы» павінен вызначыць яго змесціва. Задача партнёра – запісваць яго здагадкі.
5. «Сляпыя» здымаюць павязкі і аглядаюць прадметы з пакета. Запрасіце ўдзельнікаў гульні коратка абмяняцца ўражаннямі і адкрыццямі са сваімі напарнікамі.
6. Перш чым пераходзіць да часткі 3, дайце ўсім некалькі хвілін на «выхад з ролі».

**Частка 3. Мова жэстаў**

1. Партнёры мяняюцца ролямі, але на гэты раз «павадыр» становіцца інвалідам, нямым, а партнёр – яго фізічна здаровым памочнікам.
2. Раздайце гульцам-інвалідам карткі з апісаннем сітуацый, якія яны не павінны паказваць сваім партнёрам. Памочнікам раздайце паперу і ручкі.
3. Растлумачце, што «нямыя» павінны выкласці сваю праблему памочнікам. Ім нельга ні размаўляць, ні пісаць, ні маляваць. Памочнікі запісваюць тое, што яны зразумелі з паведамлення.
4. Пасля запісу «паведамлення» «нямы» паказвае партнёру картку. Дазвольце парам абмеркаваць ход гульні, яе вынікі і цяжкасці.

**Частка 4. Гонкі на інвалідных вазках**

1. Азнаёмце ўдзельнікаў з трасай. Растлумачце, што пераможцам стане той, чый час праходжання трасы будзе лепшым. За сутыкненне з перашкодамі на шляху даюцца штрафныя балы.
2. Запісвайце вынікі на вялікім аркушы паперы.
3. Пасля таго як усе жадаючыя прымуць удзел у гонцы, зрабіце кароткі перапынак і прыступайце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з агляду частак 2–4 практыкавання на агульным пасяджэнні, а потым абмяркуйце, што ўдзельнікам было вядома аб праблеме ў самым пачатку практыкавання і што яны даведаліся ў канцы.

1. Пачніце з абмеркавання прагулкі «ўсляпую»; папрасіце «сляпых» і «павадыроў» адказаць на наступныя пытанні:
   - Што яны адчувалі, выконваючы практыкаванне?
   - Што было цяжэй за ўсё? Што было смешна, а што – страшна?
   - Наколькі цяжка было давярацца і апраўдваць давер?
2. Затым пераходзьце да абмеркавання часткі 2 «Мова жэстаў»:
   - Што кожны ўдзельнік адчуваў падчас практыкавання?
   - Што было цяжэй за ўсё? Што было смешна, а што – страшна?
   - Ці было пачуццё адчаю ад таго, што знакі, якія паказвае «нямы», не знаходзілі разумення?
   - Ці было адчуванне адчаю ці няёмкасці ад таго, што вы не разумееце «нямога»?
3. А цяпер разбярыце частку «Гонкі на інвалідных вазках»:
   - Якія адчуванні выклікала абмежаванне ў перамяшчэнні?
   - Што было цяжэй за ўсё? Што было смешна, а што – страшна?
4. Вярніцеся да страхаў і спадзяванняў, якія былі ва ўдзельнікаў на пачатку занятку; няхай кожны прачытае свае запісы.
   - Ці апраўдаліся хаця б некаторыя са страхаў?
   - Як удзельнікі спрабавалі дапамагчы партнёрам?
   - Як успрымалася дапамога?
   - Наколькі проста вызначыць, у якіх аб'ёмах патрэбна дапамога?
5. Чым канкрэтна ўдзельнікаў пужала інваліднасць? Што было падставай для такіх страхаў? Ці ўзнікаў у іх калі-небудзь страх атрымаць інваліднасць у выніку няшчаснага выпадку ці хваробы?
6. Што падчас практыкавання здзівіла больш за ўсё?
7. Ці ведаюць удзельнікі якога-небудзь чалавека з парушэннямі зроку, слыху ці якія ўжываюць інвалідны вазок? Што ўяўляе сабой іх сацыяльнае жыццё? Як на іх рэагуюць іншыя?
8. Падумайце аб тым, што акружае людзей з інваліднасцю ў будынках, на вуліцах: наколькі навакольнае асяроддзе ўлічвае патрэбы людзей з інваліднасцю?
9. Што можна і трэба зрабіць, каб забяспечыць роўнасць і годнасць людзей, якія маюць інваліднасць?
10. Ці адносяцца правы людзей з інваліднасцю да правоў чалавека? Якія правы, абвешчаныя ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (УДПЧ), асабліва актуальныя ў гэтым выпадку?
11. Што можа зрабіць ваша школа, аб'яднанне ці мясцовая маладзёжная група, каб спрыяць роўнасці і годнасці людзей з інваліднасцю?

## Парады для фасілітатараў

Пераадоленне трасы (частка 4) не павінна заняць больш за 2–3 хвіліны, асабліва, калі ў вас усяго 2–3 вазкі. Калі ўдзельнікам трэба будзе занадта доўга чакаць сваёй чаргі, яны пачнуць нудзіцца. Інвалідныя вазкі можна паспрабаваць пазычыць у мясцовай бальніцы ці ў арганізацыі, якая аказвае дапамогу людзям, якім часова патрэбны такі вазок. Калі такой магчымасці няма, стварыце эфект «інваліднасці», прымусіўшы ўдзельнікаў, напрыклад, прайсці дыстанцыю ў гумовых ботах вялізнага памеру, апранутых не на тую нагу.

Характар правядзення практыкавання шмат у чым залежыць ад самой групы. Пераканайцеся, што ўсе разумеюць, што ім трэба будзе акунуцца ў «імітацыю рэчаіснасці», якая дасць ім магчымасць перажыць стан інваліднасці і адпаведныя пачуцці. Растлумачыце, што мэта практыкавання заключаецца не ў тым, каб пакпіць з кагосьці ці спецыяльна выклікаць стрэс або разгубленасць. Удзельнікі павінны іграць «натуральна», не пераігрываць. Папярэдзьце іх, што ў нейкія моманты яны могуць адчуць няёмкасць і няўпэўненасць, але нічога дрэннага ці небяспечнага з імі не адбудзецца.

COMPASS

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**3 снежня**
Міжнародны дзень людзей з інваліднасцю

### Убачыць свае магчымасці

Калі часу на ўсе тры «імітацыі рэчаіснасці» няма, абмяжуйцеся адной або дзвюма. З усіх трох імітацый прагулка з павязкай на вачах, напэўна, выклікае самыя моцныя і цяжкія адчуванні. Таму, калі вы вымушаны абмежавацца толькі адной імітацыяй, выберыце гэту. Няхай удзельнікі ў парах памяняюцца ролямі, каб кожны атрымаў адпаведны вопыт. Не забудзьце падрыхтаваць другі набор прадметаў для распазнавання, якія будуць схаваны ў пакеце.

Гэта сур'ёзнае практыкаванне, але будзьце гатовы да шматлікіх смешных сітуацый. Умешвайцеся толькі ў тых выпадках, калі ўзнікае нейкая рэальная рызыка фізічнай траўмы для ўдзельнікаў або калі яны дазваляюць сабе кпіць з людзей з інваліднасцю. Можаце абмеркаваць гэту праблему на этапе ацэнкі, запрасіўшы ўдзельнікаў адказаць на наступныя пытанні: калі людзі высмейваюць людзей з інваліднасцю? Хто так робіць і чаму? У якіх выпадках можна кпіць з людзей з інваліднасцю? Як вызначыць мяжу паміж добразычлівым жартам і абразай?

## Варыянты

У залежнасці ад асаблівасцей групы вы можаце разыграць многія іншыя віды абмежаванняў, у тым ліку менш відавочныя з іх, напрыклад няздольнасць да вучобы або моўныя цяжкасці. Можна таксама разыграць сітуацыю абмежаванай дзеяздольнасці, выкліканай узростам. Гэта будзе спрыяць лепшаму разуменню моладдзю тых цяжкасцей, з якімі сутыкаюцца пажылыя людзі і якія звязаны з наяўнасцю (або адсутнасцю) умоў для годнага жыцця.

## Прапановы па далейшай працы

Калі вы працуеце з дзецьмі, азнаёмцеся з артыкулам 23 КПД, дзе абвяшчаецца, што дзеці з інваліднасцю маюць права на асаблівы догляд, адукацыю і падрыхтоўку, якія дазволяць ім жыць паўнавартасным і годным жыццём. Дайце групам заданне даведацца больш пра людзей з інваліднасцю, якія жывуць у іх асяроддзі (уключаючы сям'ю). Няхай яны паспрабуюць высветліць, якія сацыяльныя паслугі і забеспячэнне тыя атрымліваюць. Ці ёсць дзеці з інваліднасцю ў вашай маладзёжнай групе, арганізацыі ці школе? Ці могуць яны рабіць усё тое, што і астатнія? Калі не, то чаму?

Калі групе падабаюцца ролевыя гульні, можна выканаць практыкаванне «Я хачу працаваць», якое дапаможа даведацца пра бар'еры, якія даводзіцца пераадольваць людзям з абмежаванымі магчымасцямі на шляху да атрымання працы.

Калі група жадае даведацца, як рэагаваць на «паўсядзённыя» праблемы, звязаныя з дыскрымінацыяй іншага роду – дыскрымінацыяй па прыкмеце расы, звярніцеся да практыкавання «Адказ расізму» на старонцы 254.

## Ідэі для дзеяння

Прапануйце ўдзельнікам адшукаць уразлівую групу і абмеркаваць, што яны могуць (павінны) зрабіць, каб дапамагчы гэтым людзям. Кіраўніцтва і ідэі шукайце ў раздзеле дапаможніка «Дзеянні ў падтрымку правоў чалавека». Важна супрацоўнічаць са спецыялізаванымі арганізацыямі, якія займаюцца праблемамі людзей з інваліднасцю, і пачынаць з тых патрэб людзей з інваліднасцю, якія яны самі вылучаюць у якасці асноўных.

## Дадатковая інфармацыя

Узровень клопату пра людзей з інваліднасцюі забеспячэння іх правоў значна адрозніваецца ў розных краінах – фармальна з-за розных эканамічных магчымасцей, а на самай справе таму, што дзесьці да праблем роўнасці і сацыяльнай салідарнасці з людзьмі з інваліднасцю ставяцца больш сур'ёзна, чым у іншых месцах. Напрыклад, у адных краінах служба сацыяльнага забеспячэння плаціць за слыхавыя апараты, а ў іншых – не. Дзесьці ёсць спецыяльныя палажэнні аб забеспячэнні людзей з парушэннямі слыху дадатковымі тэлекамунікацыйнымі прыладамі, а дзесьці гэта не прадугледжана, а калі чалавеку з інваліднасцю патрэбны вазок з электрапрывадам, у некаторых краінах за яе плаціць дзяржава або супольнасць.

Інфармацыю аб дыскрымінацыі людзей з інваліднасцю вы знойдзеце ў раздзеле дадатковай інфармацыі аб інваліднасці і дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці.

## Раздатачныя матэрыялы

### Ролевыя карткі

**Сітуацыя 1**.

Паспрабуйце без слоў растлумачыць сябру, што вы сталі ахвярай гвалту. У парку на вас напала група маладых хуліганаў; у вас скралі сумку і вас збілі. Спытайце, як прайсці да паліцэйскага ўчастка.

Памятайце, што размаўляць, пісаць ці маляваць забараняецца!

**Сітуацыя 2.**

Вы – у сталовай. Гэта можа быць сталовая школы, а можа – Еўрапейскага маладзёжнага цэнтра. Растлумачце кухару, што вы не ясце спагеці з соусам «Баланьезэ», бо вы строгі вегетарыянец: вы не толькі не ўжываеце мяса, але і адмаўляецеся ад любых малочных прадуктаў (яек, малака, сыру і г. д.).

Памятайце, што размаўляць, пісаць ці маляваць забараняецца!

**Заўвага**.
Гэта практыкаванне прапанавала доктар Моніка Мадай, прэзідэнт венгерскай НГА Közös Sors («Адзін лёс»), якая працуе ў інтарэсах сацыяльнай інтэграцыі як людзей з інваліднасцю, так і людзей без інваліднасці. Яна таксама міжнародны маладзёжны трэнер, удзельнік шматлікіх праграм, сама мае інваліднасць ад нараджэння.

Рэлігія і вера

Глабалізацыя

Адукацыя

Узровень 2

Любы памер групы (малыя групы па 5–6 чалавек)

90 хвілін

# Хутка састарэе

*Тое, што мы лічым немагчымым сёння, стане магчымым у наступнае дзесяцігоддзе.*

Канстанс Бэйкер Мотлі[1]

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • рэлігія і вера;<br>• глабалізацыя;<br>• адукацыя. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | любы (малыя групы па 5–6 чалавек) |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні прапануецца абмеркаваць, як развіваюцца перакананні, як яны набіраюць сілу і як і чаму змяняюцца з цягам часу. |
| **Звязаныя правы** | • свабода думкі, сумлення і рэлігіі;<br>• свабода перакананняў і выказвання меркавання;<br>• права свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці супольнасці. |
| **Мэты** | • развіць разуменне сацыяльных аспектаў перакананняў;<br>• развіць крытычнае мысленне і навыкі вядзення дыскусіі;<br>• спрыяць развіццю непрадузятасці і схільнасці даследаваць цікавыя пытанні. |
| **Матэрыялы** | • карткі са сцверджаннямі, адзін набор на малую групу;<br>• вялікі аркуш паперы і ручкі на кожную групу. |
| **Падрыхтоўка** | • Зрабіце копіі раздатачнага матэрыялу, пры неабходнасці дадайце або выдаліце некаторыя сцверджанні і разрэжце на карткі. Зрабіце па адным наборы картак для кожнай малой групы. |

## Інструкцыі

1. Растлумачце, што ў гэтым практыкаванні гаворка пойдзе пра тое, як перакананні мяняюцца з цягам часу. Спачатку ўдзельнікі павінны будуць абмеркаваць перакананні мінулых пакаленняў, якія сёння ўжо састарэлі, а затым пяройдуць да абмеркавання сваіх уласных перакананняў, якія іх дзеці і ўнукі палічаць састарэлымі.
2. Правядзіце мазгавы штурм на тэму таго, што ўдзельнікі разумеюць пад тэрмінам «перакананне».
3. Затым папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на малыя групы па 5–6 чалавек.
4. Кожная група павінна выбраць каго-небудзь, хто будзе запісваць асноўныя тэзісы іх дыскусіі на вялікім аркушы паперы і потым выступіць на агульным пасяджэнні.
5. Папрасіце групы азнаёміцца з карткамі і выбраць з іх 5, якія змяніліся з часоў іх дзядоў і з якімі яны хацелі б папрацаваць.
6. Бярыце абраныя карткі па чарзе і абмяркоўвайце перакананні, якія былі ў дзядоў удзельнікаў наконт іх. Адкуль яны ўзяліся? Якім чынам набіралі сілу? Ці можна лічыць іх мудрымі з цяперашняга пункту гледжання? Чаму?
7. Зараз папрасіце ўдзельнікаў уявіць сабе, якім будзе жыццё іх дзяцей або ўнукаў і ў што яны будуць верыць. Як іх разуменне выбраных сцверджанняў будзе адрозніваецца ад вашага? Чаму яны будуць думаць па-іншаму?
8. Запрасіце малыя групы на агульнае пасяджэнне і папрасіце прадстаўнікоў кожнай групы коратка расказаць пра свае высновы.

[1]Канстанс Бэйкер Мотлі, якой належаць словы: «Тое, што мы лічым немагчымым сёння, стане магчымым у наступным дзесяцігоддзі», стала ў 1966 годзе першым федэральным суддзёй ЗША з жанчын афраамерыканскага паходжання.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з кароткага агляду практыкавання, а затым перайдзіце да абмеркавання праблем глабалізаванага свету, дзе перакананні і каштоўнасці пастаянна змяняюцца.

- Ці было сур'ёзнае рознагалоссе ўнутры груп?
- Наколькі розныя або аднолькавыя высновы розных груп?
- Адкуль бяруцца нашы вераванні і перакананні? Ці ёсць нейкія агульныя падставы для таго, каб сцвярджаць, што раней было так ці гэтак, а ў будучыні будзе зусім не так?
- Чаму перакананні змяняюцца?
- Ці існуюць абсалютныя перакананні? Калі так, то якога роду і чаму? Калі не, то чаму перакананні не з'яўляюцца абсалютнымі?
- Якія перавагі даюць чалавеку перакананні?
- Як нашы перакананні абмяжоўваюць нас?
- Што можа прымусіць вас змяніць свае перакананні?
- Наколькі лёгка змяняць перакананні? Якія віды перакананняў з'яўляюцца больш моцнымі, а якія змяняюцца прасцей? Чаму?
- Як людзі могуць абараніць сябе ад прапаганды і ілжывых сцверджанняў, напрыклад ад піяру палітыкаў, ад адмаўлення факта змены клімату або ад спроб махлярскіх кампаній завалодаць вашымі грашыма?
- Прывядзіце прыклады абмежавання права на свабоду меркаванняў і іх выказвання. Хто павінен вырашаць, што гэтыя абмежаванні маюць права на існаванне?
- Ці можаце вы прывесці прыклады парушэння свабоды думкі, сумлення і рэлігіі ў вашай супольнасці, горадзе, краіне, Еўропе і ў свеце ў цэлым?

## Парады для фасілітатараў

Нягледзячы на тое, што праца ідзе ў малых групах, некаторыя ўдзельнікі могуць саромецца выказваць сваё меркаванне па асобных пытаннях. Адным са спосабаў пазбегнуць гэтага з'яўляецца такое фарміраванне малых груп, пры якім сябры працуюць разам і адчуваюць сябе камфортна. Іншы спосаб заключаецца ў тым, каб пачаць абмеркаванне з менш вострых тэм, а потым, па меры набыцця ўпэўненасці, перайсці да больш спрэчных пытанняў.

Працэс будовы свету, у якім павага правоў чалавека з'яўляецца нормай, у той ці іншай меры патрабуе перагляду перакананняў большасці людзей. Таму першапачатковая ідэя гэтага практыкавання заключаецца ў тым, каб дапамагчы ўдзельнікам зразумець, што перакананні людзей уяўляюць сабой сацыяльныя элементы і прадукты грамадства і часу, у якіх яны жывуць. Можна спадзявацца, што пасля заканчэння практыкавання ўдзельнікі будуць больш ведаць аб тым, чаму перакананні маюць такія глыбокія карані і чаму іх цяжка разглядаць аб'ектыўна. Яны таксама зразумеюць, што без адукацыі, яснага разумення фактычнага становішча рэчаў і добрых навыкаў крытычнага мыслення вельмі цяжка мяняць перакананні, нават калі яны з'яўляюцца шкоднымі ці проста састарэлымі.

Слова «перакананне» часта выкарыстоўваюцца ў адносінах да рэлігіі, напрыклад, калі людзі кажуць пра сваё «перакананне ў існаванні Бога». Аднак такое выкарыстанне гэтага слова з'яўляецца надта вузкім, і вы павінны ўпэўніцца ў тым, што ўдзельнікі добра разумеюць поўнае значэнне гэтага слова. Быць перакананым у чымсьці значыць прыняць гэта ў якасці ісціны. Такім чынам, усё, што мы ведаем, – гэта перакананне. Мы ствараем перакананні, каб замацаваць наша разуменне навакольнага свету, і як толькі мы іх стварылі, мы схільны гэтых перакананняў прытрымлівацца. На сайце http://changingminds.org даступна вялікая колькасць інфармацыі аб тым, што такое перакананні, як яны фарміруюцца і функцыянуюць.

## Варыянты

Пазнаёмце групу з некаторымі з гэтых ідэй з дапамогай метаду аналізу сцверджанняў, апісанага на старонцы 63. Гэты варыянт не прадугледжвае для ўдзельнікаў магчымасці гаварыць – яны павінны выслухаць пункты гледжання іншых, каб лепш разабрацца ў пэўных пытаннях.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**5 кастрычніка**
Міжнародны дзень настаўнікаў

**Піяр** – гэта спосаб такога прадстаўлення інфармацыі або сітуацыі, калі вы самі або вашы ідэі паўстаюць у станоўчым святле (з Оксфардскага слоўніка).

## Прапановы па далейшай працы

У залежнасці ад таго, як пройдзе гэта практыкаванне, вы можаце разгледзець перакананні наконт асабістых адносін з дапамогай практыкаванняў «Пагаворым пра секс» або «Вернікі».

Вы таксама можаце разгледзець права на свабоду рэлігіі і перакананняў з дапамогай практыкавання «Мячэць у Сліпівілі», у якім прапануецца разыграць пасяджэнне гарадскога савета, калі абмяркоўваецца будаўніцтва новай мячэці ў традыцыйна хрысціянскім раёне.

## Ідэі для дзеяння

Разам са сваімі сябрамі або аднакласнікамі выберыце калектыўныя перакананні, якія могуць нанесці шкоду або стаць прычынай дыскрымінацыі людзей у вашай мясцовасці, напрыклад перакананні наконт гомасексуальнасці, выкарыстання кантрацэпцыі, абортаў, адносін па-за шлюбам або роляў дзяўчынак і хлопчыкаў. Запрасіце прадстаўніка НГА ці іншай арганізацыі выступіць на гэту тэму для лепшага разумення пытання. Затым вырашайце, якія будуць вашы дзеянні.

Вы таксама маглі б напісаць п'есу на гэту тэму і паставіць яе для мясцовых жыхароў. Памятайце, што значна лягчэй прыцягнуць гледачоў і запоўніць аўдыторыю, калі ваша прадстаўленне супадзе з адным з міжнародных або еўрапейскіх памятных дзён.

Калі вы адчуваеце, што ўпэўнена валодаеце тэмай, адаптуйце гэта практыкаванне для выкарыстання падчас нефармальных сустрэч з сябрамі, сям'ёй і калегамі. Няхай яны падзеляцца з вамі сваімі думкамі і перакананнямі па пэўных пытаннях. Майце пры гэтым на ўвазе, што некаторыя людзі могуць вельмі адчувальна ставіцца да пэўных тэм.

## Дадатковая інфармацыя

Перакананне – гэта вера ў тое, што пэўнае сцверджанне або ідэя з'яўляюцца сапраўднымі. Людзі могуць казаць, што яны перакананы, што нешта з'яўляецца сапраўдным, па розных прычынах: яны самі былі сведкамі гэтага, у іх ёсць добрыя падставы так меркаваць ці проста таму, што ў іх ёсць вера.

Вера ёсць цвёрдая перакананасць у сапраўднасці ці надзейнасці чалавека, ідэі або рэчы. Гэта перакананасць у тым, што нешта з'яўляецца сапраўдным таму, што так кажа важная асоба. Вера можа мець вельмі спецыфічнае значэнне ў некаторых рэлігійных кантэкстах.

Разуменне таго, як развіваюцца перакананні, з'яўляецца важным крокам на шляху да стварэння культуры правоў чалавека. Праведзеныя псіхолагамі даследаванні працэсаў фарміравання перакананняў і адносін паміж перакананнямі і дзеяннямі дазволілі вызначыць, што перакананні фарміруюцца рознымі шляхамі:

- Мы схільны засвойваць перакананні людзей, якія акружаюць нас у дзяцінстве. Часта прыводзяць словы Альберта Эйнштэйна, які сказаў, што цвярозы розум – гэта сума забабонаў, набытых ва ўзросце да васямнаццаці гадоў. Нашы палітычныя перакананні вельмі моцна залежаць ад палітычных перакананняў, найбольш распаўсюджаных у грамадстве, у якім мы жывём. Большасць людзей вызнаюць рэлігію, якой іх навучылі ў дзяцінстве.
- Людзі могуць пераняць перакананні ад харызматычнага лідара, нават калі гэтыя перакананні ідуць насуперак усім іх ранейшым перакананням і штурхаюць іх на дзеянні, якія супярэчаць іх уласным інтарэсам. У такіх выпадках людзі з рацыянальным складам розуму, патрапіўшы ў стан, вядомы як кагнітыўны дысананс, спрабуюць узгадніць рэальную сітуацыю з верай і супярэчнасцямі, якія ўзніклі.
- Паўтарэнне фарміруе перакананні, таксама як некаторыя перакананні фарміруюцца, напрыклад, выявамі сексу, кахання і іншымі моцнымі станоўчымі эмоцыямі. На гэтым феномене грунтуецца ўся рэкламная індустрыя.
- Фізічная траўма, асабліва такая, што цягне за сабой пашкоджанне галаўнога мозга, можа радыкальна змяніць перакананні чалавека.

Тым не менш нават адукаваныя людзі, якія добра ведаюць працэсы фарміравання перакананняў, часта празмерна чапляюцца за свае перакананні і дзейнічаюць на іх аснове, нават калі гэта ідзе насуперак іх уласным інтарэсам.

На святкаванні Сусветнага дня настаўніка ў 2010 годзе Прабхакара Шышыла з Каледжа ім. Неру ў Суле, Індыя, сказаў: «Настаўнікі павінны прывіваць вучням навыкі рацыянальнага мыслення». Ці згодны вы з гэтым выказваннем?

## Раздатачныя матэрыялы

**Ролевыя карткі**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Вера ў тое, што зямля плоская. | Вера ў тое, што смяротнае пакаранне можна апраўдаць. | Вера ў тое, што секс да шлюбу – гэта грэх. | Вера ў тое, што можна пазбавіцца ад захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам, уступіўшы ў палавыя зносіны з нявінніцай і перадаўшы іх ёй. |
| Вера ў тое, што памерці за свайго караля, краіну або рэлігію – гэта вялікі гонар. | Вера ў тое, што курэнне не так ужо і дрэнна для вашага здароўя. | Уяўленні аб карысці выкарыстання наркотыкаў і алкаголю. | Вера ў тое, што расы можна адрозніць па колеры скуры, тыпу твару, форме чэрапа, профілю, памеры, тэкстуры і колеры валасоў. |
| Уяўленні аб гадаванні і выхаванні дзяцей. | Вера ў тое, што розныя расы адрозніваюцца маральнымі якасцямі і інтэлектам. | Вера ў тое, што псіхічнае захворванне з'яўляецца ганебным. | Уяўленні аб ролі мужчыны і жанчыны ў сям'і. |
| Уяўленні аб выкарыстанні ў ежу мяса. | Вера ў павагу да паліцыі і іншых органаў улады. | Перакананне, што цунамі і тарнада – гэта гнеў Божы за грахі чалавека. | Уяўленні аб абортах і сурагатным мацярынстве. |
| Уяўленні аб кантрацэпцыі і выкарыстанні кантрацэптываў. | Уяўленні аб абыходжанні са злачынцамі: турэмнае зняволенне супраць рэабілітацыі. | Уяўленні аб парнаграфіі і прастытуцыі. | Уяўленні аб аднаполых шлюбах. |
| Уяўленні аб дапамозе невылечна хворым пацыентам здзейсніць самагубства. | Вера ў тое, што ружовы колер ідзе немаўлятам-дзяўчынкам, а сіні – хлопчыкам. | Уяўленні аб здольнасцях мужчын і жанчын выконваць адну і тую ж працу. | Вера ў тое, што дзяўчынкі і хлопчыкі павінны гуляць у розныя гульні. |
| Уяўленні аб адносінах па-за шлюбам. | Уяўленні аб татуіроўках і пірсінгу. | Уяўленні аб нараджэнні дзяцей па-за шлюбам. | Уяўленні аб блюзнерстве. |
| Уяўленні аб людзях, якія не маюць рэлігіі. | Уяўленні аб нудыстах і аб з'яўленні на людзях топлес. | Уяўленні аб мастурбацыі (сексуальнасці). | Уяўленні аб разводзе (адзінокіх бацьках). |

COMPASS

Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці

Культура і спорт

Здароўе

Узровень 2

Любы памер групы (малыя групы па 6–8 чалавек)

120 хвілін

# Спорт для ўсіх

*Вы калі-небудзь спрабавалі гуляць у баскетбол, седзячы ў інвалідным вазку?*

**Тэмы**
- інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці,
- культура і спорт,
- здароўе.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** любы (малыя групы па 6–8 чалавек)

**Час** 120 хвілін

**Агляд** Гэта практыкаванне патрабуе вялікіх выдаткаў энергіі. Удзельнікі выкарыстоўваюць сваю фантазію і творчыя задаткі для стварэння новых гульняў.

**Звязаныя правы**
- права карыстацца сваім фізічным і разумовым здароўем;
- роўнасць чалавечай годнасці і правоў;
- права на адпачынак і вольны час.

**Мэты**
- прыцягнуць увагу да таго факта, што людзей адхіляюць ад заняткаў спортам па сацыяльных і палітычных прычынах;
- развіць навыкі працы ў групе, крэатыўнасць і ўменне супрацоўнічаць;
- прывіць павагу і развіць інклюзіўнасць, асабліва ў адносінах да людзей з інваліднасцю.

**Матэрыялы**
- адкрытая прастора;
- капялюш;
- ролевыя карткі;
- павязкі на вочы (лепш эластычныя);
- брусок з дрэва або падобнага матэрыялу (каб прымацаваць папружкі пад ступню) памерам прыкладна 30 см х 12 см х 10 см.

Вам таксама спатрэбіцца набор рэквізіту для кожнай малой групы. Рэкамендуем:
- вялікае вядро або кошыкі для папяровага смецця;
- клубок тоўстай вяроўкі;
- мячы;
- газеты;
- крэйда для адзнакі меж;
- нажніцы і бінты для вырабу рэквізіту.

**Падрыхтоўка**
- вызначце, якія фізічныя недахопы вы хочаце ўключыць у гэта практыкаванне, і падрыхтуйце ролевыя карткі; раскладзіце па адпаведных наборах павязкі на вочы, вушныя тампоны, бінты і г. д.;
- падрыхтуйце ролевыя карткі і раскладзіце іх па наборах для кожнай групы;
- раскладзіце астатні рэквізіт так, каб атрымаўся адзін набор на кожную малую групу.

## Інструкцыі

1. Раскажыце ўдзельнікам пра Міжнародны дзень масавага спорту і растлумачце, што яны павінны прыдумаць новую гульню ў духу ідэі «Спорт для ўсіх». Адзіная ўмова: такая гульня павінна ўключаць нейкі тып актыўнасці, які на працягу 15 хвілін будзе падтрымліваць ва ўдзельнікаў павышанае сэрцабіцце.

2. Папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на малыя групы.
3. Вазьміце капялюш з ролевымі карткамі і прапануйце кожнаму ўдзельніку выцягнуць адну з іх. Тым, каму выпала картка з назвай фізічнага абмежавання, дайце некалькі хвілін, каб увайсці ў ролю, напрыклад надзець павязку на вочы ці прывязаць руку за спіну.
4. Дайце групам трыццаць хвілін на стварэнне гульні ў духу ідэі «Спорт для ўсіх», г. зн. такой, у якой зможа ўдзельнічаць кожны. Можна выкарыстоўваць любыя прадметы рэквізіту або ўсе адразу. Мэты і правілы новай гульні вызначаюць групы, прычым у іх распрацоўцы павінен прыняць удзел кожны.
5. Запрасіце групы згуляць у гульні, прыдуманыя іншымі групамі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з агляду таго, як члены груп узаемадзейнічалі адзін з адным і ці атрымалі яны задавальненне ад практыкавання. Цяпер перайдзіце да абмеркавання саміх гульняў, магчымасцей удзелу ў іх і абмежаваных фізічных магчымасцей увогуле.

- Як ішла распрацоўка гульні? Якія фактары вы прымалі да ўвагі? Што змянілася ад таго, што ў групе некаторыя ўдзельнікі мелі інваліднасць?
- Як ішла праца ў групах? Як прымаліся рашэнні: дэмакратычна ці аднаасобна?
- Пытанне да тых, хто іграў ролю чалавека з інваліднасцю: ці цяжка было іграць гэту ролю? Як вы лічыце, ці ўдалося вам сыграць яе рэалістычна? Ці задаволены вы сваім укладам у канчатковы вынік?
- Пытанне да здаровых удзельнікаў: што вам давялося ўлічваць у ходзе гульні для пераадолення бар'ераў, якія маглі б перашкодзіць поўнаму і актыўнаму ўдзелу людзей з інваліднасцю?
- На якія кампрамісы вы пайшлі, ствараючы такія гульні, каб потым можна было сказаць, што гэта сапраўды быў «Спорт для ўсіх»?
- Як вы думаеце, што значыць быць маладым чалавекам з інваліднасцю ў вашай краіне? З якімі асаблівымі цяжкасцямі вы б сутыкнуліся?
- Ці лічыце вы, што правы людзей з інваліднасцю цалкам выконваюцца? Калі не, скажыце, якія з іх выконваюцца менш за ўсё, і назавіце асноўныя прычыны.
- На якіх падставах асобныя групы людзей выключаюцца са спорту ў рэальным жыцці? Ці можна гэта лічыць парушэннем іх правоў чалавека?

## Парады для фасілітатараў

Паспрабуйце зрабіць так, каб склад груп быў змяшаным: каб у іх уваходзілі і высокія, і нізкарослыя, людзі ў акулярах і без акуляраў, прадстаўнікі абодвух палоў, людзі рознага ўзросту, целаскладу і г. д.

Размяркуйце ролі так, каб у кожнай групе было не больш за два чалавекі з інваліднасцю. У кожнай групе могуць быць людзі з аднолькавымі або рознымі формамі інваліднасці. Калі ў кожнай групе апынуліся ўдзельнікі з аднолькавымі формамі інваліднасці, пазней можна будзе параўнаць, як яны справіліся з аднымі і тымі ж праблемамі. Калі ж у групе апынуліся ўдзельнікі з рознымі формамі інваліднасці, то будзе цікава даведацца, ці падыходзіць створаная групай гульня для людзей з любымі формамі інваліднасці ці толькі з тымі, якія прадстаўлены ў іх групе.

У залежнасці ад групы вам, магчыма, лепш будзе пачаць занятак з мазгавога штурму паняцця гульні ў цэлым. Напрыклад, высветліць, што ў гульні павінны быць выразныя мэты або задачы, а таксама правілы. Можа спатрэбіцца вызначыць нейкія абмежаванні, напрыклад, адносна таго, што гульня павінна праводзіцца ў пэўным месцы ці працягвацца не больш за 20 хвілін.

Калі групам ніяк не ўдаецца выканаць заданне ці ж яны не задаволены вынікам, падкрэсліце, што так здараецца і ў рэальным жыцці, але гэта не азначае, што гэта практыкаванне (ці праца групы) не ўдалося. Падчас аналізу не забудзьце абмеркаваць, што канкрэтна не дазволіла дасягнуць поспеху і чаму некаторыя ўдзельнікі расчараваны вынікам.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**26 мая**
Міжнародны дзень масавага спорту

Падчас аналізу ўдзельнікі могуць заўважыць, што выключэнне і дыскрымінацыя ў спорце не такія вялікія праблемы, бо людзі, як правіла, выбіраюць тыя віды спорту, якімі ім лягчэй займацца ад прыроды. Напрыклад, высакарослы аддае перавагу баскетболу, а менш атлетычны гуляе ў більярд або ў шахматы. Аднак праблема ўзнікае тады, калі ўсю ўвагу і магчымасці ўдзельнічаць у спаборніцтвах атрымліваюць перспектыўныя маладыя людзі, а тыя, хто жадае займацца спортам на аматарскім узроўні, атрымліваюць значна менш. У некаторых відах спорту адсяванне адбываецца па прыкмеце матэрыяльнага дабрабыту, напрыклад, з-за дарагоўлі экіпіроўкі і заняткаў з трэнерамі.

## Варыянты

Калі вы хочаце выкарыстаць гэта практыкаванне ў першую чаргу для развіцця навыкаў працы ў групе, дайце адной групе заданне прыдумаць гульню з упорам на супрацоўніцтва, а другой – на саперніцтва. Падчас аналізу параўнайце, ад якой гульні ўдзельнікі атрымалі больш задавальнення.

Вы можаце выкарыстаць гэта практыкаванне, каб падкрэсліць, што роўнасць, справядлівасць і правы чалавека таксама з'яўляюцца «правіламі гульні». У такім выпадку вы можаце адкінуць элемент «інваліднасці» і засяродзіць увагу на тым, як удзельнікі разам стваралі свае гульні, а пытанне аб тым, ці ўсе, у тым ліку людзі з інваліднасцю, маглі ўдзельнічаць, пакіньце на агульнае абмеркаванне.

Добрыя правілы, як і правы чалавека, існуюць для таго, каб зрабіць гульню сумленнай і абмежаваць перавагу адных гульцоў над іншымі. Правілы гульні распаўсюджваюцца на ўсіх гульцоў, г. зн. носяць такі ж усеагульны характар, як і правы чалавека. Многія правілы прадугледжваюць як правы, так і абавязкі. Напрыклад, футбаліст мае права біць нагамі мяч, але не саперніка. У выпадку парушэння правілаў прымяняецца пакаранне.

Працэс прыняцця рашэнняў аб змене правілаў можна параўнаць з унясеннем паправак у прававыя нормы ў «рэальным жыцці». Як гэта робіцца: шляхам выдання ўказаў, змены законаў або правядзення рэферэндуму, праз кансультацыі з НГА ці іншымі грамадскімі групамі?

Падчас аналізу можна абмеркаваць:

- Якія гульні спадабаліся ўдзельнікам больш за ўсё? Што трэба, каб стварыць «добрую гульню»?
- Наколькі важны выразныя і справядлівыя правілы для ўключэння ў гульню максімальнай колькасці ўдзельнікаў?
- Розныя артыкулы УДПЧ можна разглядаць як правілы жыцця ў плюралістычным свеце. Але ці добрыя гэтыя правілы? Напрыклад, ці прымальныя яны для ўсіх «гульцоў» (для ўсіх людзей у свеце)? Ці дастаткова гэтых правілаў або іх занадта шмат? Ці справядлівыя яны? Ці ўсе «гульцы» (усе краіны) выконваюць правілы?

## Прапановы па далейшай працы

Калі групе цікава папрацаваць над іншымі аспектамі роўнасці, прапануйце ёй практыкаванне «Шлях у краіну Роўнасці» на старонцы 244, дзе ідзе гаворка аб праблемах гендарнай роўнасці. Практыкаванне з мадэліраваннем сітуацыі «Барацьба за багацце і ўладу» на старонцы 263 дазваляе звярнуць увагу на няроўнасць у размеркаванні багацця. Яно таксама падымае пытанні роўнасці магчымасцей людзей з інваліднасцю.

## Ідэі для дзеяння

Арганізуйце ўсеагульны «Дзень спорту». Запрасіце маладых людзей з іншых клубаў згуляць у вашы новыя гульні. Групе трэба падумаць, як зрабіць гульню максімальна даступнай для ўсіх.

Звяжыцеся з Міжнароднай асацыяцыяй садзейнічання развіццю масавага спорту ТАФІСА, і няхай прыдуманыя вамі гульні стануць укладам у Міжнародны дзень масавага спорту.

Устанавіце кантакты з мясцовымі арганізацыямі, якія аказваюць падтрымку людзям з інваліднасцю, і пацікаўцеся, як вы можаце дапамагчы ім і быць карыснымі.

Правядзіце даследаванне ў вашай школе, клубе або ў месцах сходаў і ўнясіце прапановы, якія дазволяць зрабіць наваколле больш зручным для людзей з інваліднасцю.

## Дадатковая інфармацыя

**ТАФІСА** – буйная міжнародная арганізацыя, якая прасоўвае ідэю «Спорт для ўсіх» і налічвае больш за 200 арганізацый-удзельнікаў з больш чым 130 краін на ўсіх кантынентах. Яна арганізуе практычныя праграмы і спартыўныя мерапрыемствы ў цесным супрацоўніцтве, напрыклад, з МАК, СААЗ, Міжнародным саветам спартыўнай навукі і фізічнага выхавання і ЮНЕСКА.

http://www.tafisa.net

ТАФІСА – арганізатар Міжнароднага дня масавага спорту. Міжнародны дзень масавага спорту – гэта міжнародныя спаборніцтвы ў рамках фізкультурнай і спартыўнай праграмы «Спорт для ўсіх», у якіх удзельнічаюць прадстаўнікі супольнасцей з усіх краін свету. Выпрабаваць сябе могуць усе жадаючыя: прадстаўнікі як супольнасцей, якія налічваюць толькі некалькі тысяч чалавек, так і найбуйнейшых гарадоў свету. Мэта заключаецца ў падтрымцы фізічнай культуры і спорту ў рамках праграмы «Спорт для ўсіх», прычым не толькі сярод людзей, якія і так знаходзяцца ў добрай фізічнай форме і любяць актыўна праводзіць час, але і ўцягванне ў спорт людзей любога ўзросту, полу і ўзроўню падрыхтоўкі. Адзіная ўмова: у гульні павінна прысутнічаць нейкая форма актыўнасці, якая падтрымлівае ва ўдзельнікаў павышанае сэрцабіцце на працягу 15 хвілін.

**Маладзёжныя Алімпійскія гульні**. Мэта Маладзёжных Алімпійскіх гульняў (МАГ) – заклікаць моладзь усяго свету займацца спортам і жыць у адпаведнасці з алімпійскімі каштоўнасцямі.

http://www.olympic.org

**Паралімпійскі рух**. Задача Міжнароднага паралімпійскага камітэта (МПК) – спрыяць таму, каб удзельнікі Паралімпіяд дамагаліся найвышэйшых спартыўных дасягненняў, а таксама развіваць магчымасці для ўдзелу ў спартыўных мерапрыемствах для ўсіх людзей з інваліднасцю – ад пачаткоўцаў да спартсменаў вышэйшага ўзроўню. Акрамя таго, МПК падтрымлівае паралімпійскія каштоўнасці, сярод якіх мужнасць, рашучасць, натхненне і роўнасць.

www.paralympic.org/IPC

Вам і ўдзельнікам важна ведаць і ўлічваць розніцу паміж тэрмінамі «глухі», «тугавухі» і «чалавек са слабым слыхам»:

- **глухі**: культурная, лінгвістычная і палітычная ідэнтычнасць, якая характарызуе шматлікіх людзей, пазбаўленых слыху. Члены супольнасці глухіх прымаюць адзіныя культурныя нормы, каштоўнасці і традыцыі гэтай групы. Яны звычайна выкарыстоўваюць мову знакаў і жэстаў у якасці «першай» мовы;
- **тугавухі**: тэрмін, якім абазначаюць няздольнасць чуць нармальную гаворку і навакольныя гукі; гэта медыцынскі тэрмін для абазначэння адсутнасці слыху;
- **чалавек са слабым слыхам**: людзі з рознай ступенню страты слыху, якія маюць зносіны ў асноўным з дапамогай гукавой гаворкі, дапамагаючы сабе чытаннем па вуснах. Такія людзі могуць карыстацца дапаможнымі прыладамі і (або) кахлеарнымі імплантатамі і падтрымліваць рэшткавы слых спецыяльнымі прыстасаваннямі. У медыцынскім плане такі чалавек можа лічыцца глухім, але пры выкарыстанні тэхнічных сродкаў можа атрымаць паўнавартаснае выхаванне і адукацыю нават пры абмежаваннях слыху.

Азначэнні і інфармацыя па тэме правоў чалавека і дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці знаходзяцца ў раздзеле «Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці» ў главе 5 на сайце www.coe.int/compass.

## Раздатачныя матэрыялы

### Ролевыя карткі

**Вы – глухі чалавек**.

Устаўце ў вушы тампоны. Вы не можаце ні чуць, ні гаварыць; вы маеце зносіны на мове жэстаў, а таксама з дапамогай малявання і пісьма. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**Вы слаба чуеце**.

Устаўце вату ў вушы. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**Вы перамяшчаецеся ў інвалідным вазку**.

Сядзьце ў інвалідны вазок і патрэніруйцеся кіраваць ім. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**У вас няма адной рукі**.

Прывяжыце адну руку за спіну з дапамогай бінту. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**У вас няма абедзвюх рук**.

Звяжыце бінтам абедзве рукі за спінай. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**Вы кульгаеце**.

Прывяжыце бінтам драўляны брусок да адной ступні, каб адна ваша нага стала даўжэй за іншую. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**У вас няма адной нагі**.

Прывяжыце бінтам ступню да задняй часткі сцягна, быццам у вас няма нагі ніжэй калена. Устаньце на мыліцы. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**Вам дрэнна даецца вучоба**.

Вы нервуецеся, у вас няма ўпэўненасці ў сабе, і вам усё трэба тлумачыць вельмі падрабязна. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**Вы маеце парушэнне зроку**.

Надзеньце павязку на вочы. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**Вы – глуханямы чалавек.**

Устаўце ў вушы тампоны. Вы не можаце ні чуць, ні гаварыць; вы маеце зносіны на мове жэстаў, а таксама з дапамогай малявання і пісьма. Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

**Вы – абсалютна здаровы чалавек без фізічных абмежаванняў**.

Іграйце сваю ролю натуральна, не пераігрывайце і пазбягайце стэрэатыпаў.

# Зрабі крок наперад

*Усё пачынаецца з правоў іншага чалавека і майго бясконцага абавязку іх паважаць.*

Эмануэль Левінас

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • дыскрымінацыя і нецярпімасць,<br>• беднасць,<br>• агульныя правы чалавека. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | 10–30 чалавек |
| **Час** | 60 хвілін |
| **Агляд** | Мы ўсе роўныя, але некаторыя больш роўныя за іншых. У гэтым практыкаванні ўдзельнікі бяруць на сябе пэўныя ролі і далей дзейнічаюць у залежнасці ад шанцаў і магчымасцей, якія ім выпадаюць у жыцці. |
| **Звязаныя правы** | • права на роўнасць чалавечай годнасці і правоў;<br>• права на адукацыю;<br>• права на стандартны ўзровень жыцця, неабходны для падтрымання здароўя і дабрабыту. |
| **Мэты** | • павысіць дасведчанасць аб няроўнасці магчымасцей;<br>• развіць фантазію і крытычнае мысленне;<br>• абудзіць пачуццё суперажывання тым, каму менш пашанцавала ў жыцці. |
| **Матэрыялы** | • ролевыя карткі;<br>• адкрытая прастора (калідор, вялікае памяшканне або пляцоўка на вольным паветры);<br>• магнітафон або прайгравальнік кампакт-дыскаў і мяккая (спакойная) музыка;<br>• капялюш. |
| **Падрыхтоўка** | • Уважліва прачытайце інструкцыі. Праглядзіце спіс «сітуацый і падзей» і адаптуйце яго з улікам асабліваcцей групы;<br>• Зрабіце па адной ролевай картцы на кожнага ўдзельніка. Скапіруйце адаптаваныя карткі з дапамогай ксеракса або перапішыце ад рукі, разрэжце іх на палоскі, складзіце некалькі разоў і пакладзіце ў капялюш. |

**Дыскрымінацыя і нецярпімасць**

**Беднасць**

**Агульныя правы чалавека**

**Узровень 2**

**10–30 чалавек**

**60 хвілін**

## Інструкцыі

1. Стварыце спакойную атмасферу, уключыўшы нягучную фонавую музыку, або папрасіце ўсіх проста захоўваць цішыню.
2. Няхай кожны ўдзельнік выцягне ролевую картку з капелюша. Папрасіце яго не агучваць яе і не паказваць іншым.
3. Прапануйце ўсім заняць месцы (пажадана на падлозе) і ўважліва прачытаць свае карткі.
4. Затым папрасіце ўдзельнікаў пачаць уваходзіць у свае ролі. Каб дапамагчы ім у гэтым, зачытайце некаторыя з наступных пытанняў, робячы паўзу пасля кожнага, каб ва ўдзельнікаў быў час падумаць і вобразна ўявіць сябе і сваё жыццё.
    - Як прайшло ваша дзяцінства? У якім вы жылі доме? У якія гульні гулялі? Чым займаліся вашы бацькі?
    - Што ўяўляе сабой ваша штодзённае жыццё сёння? Якое ваша сацыяльнае асяроддзе? Што вы робіце па раніцах, у другой палове дня, увечары?
    - Які вобраз жыцця вы ведзяце? Дзе вы жывяце? Колькі зарабляеце ў месяц? Чым займаецеся ў вольны час? Як праводзіце адпачынак?
    - Што вас хвалюе, чаго вы асцерагаецеся?

8. Папрасіце ўсіх удзельнікаў захоўваць абсалютную цішыню і выстраіцца ў шарэнгу (як на лініі старту).
9. Паведаміце ўдзельнікам, што збіраецеся зачытаць спіс сітуацый і падзей. Кожны раз, калі хто-небудзь з удзельнікаў можа станоўча адказаць на зачытанае сцверджанне, ён павінен зрабіць крок наперад. Астатнія застаюцца на сваіх месцах нерухома.
10. Зачытвайце па адной сітуацыі за раз, робячы паўзу пасля кожнай з іх, каб ва ўдзельнікаў быў час зрабіць крок наперад і паглядзець на сваю пазіцыю адносна астатніх.
11. У канцы папрасіце ўсіх запомніць сваю канчатковую пазіцыю. Дайце пару хвілін для выхаду з роляў і прыступайце да аналізу на агульным абмеркаванні.

## Аналіз і ацэнка

Спытайце пра ўражанні ад практыкавання ў цэлым, а потым пераходзьце да абмеркавання закранутых праблем і высвятлення таго, чаму ўдзельнікі навучыліся.

- Якія адчуванні ўзнікалі пры пераходзе наперад або стаянні на месцы?
- У які момант тыя, хто часцей «ішоў» наперад, заўважылі, што астатнія ад іх адстаюць?
- Ці ўзнікала ў каго-небудзь адчуванне, што ў нейкі момант яго асноўныя правы чалавека парушаліся?
- Ці могуць удзельнікі адгадаць, якую ролю кожны выконваў у практыкаванні (на гэтым этапе кожны раскрывае сваю ролю)?
- Наколькі лёгка ці цяжка было ўдзельнікам іграць свае ролі? Як яны ўяўлялі сабе чалавека, ролю якога ігралі?
- Ці адлюстроўвае гэта практыкаванне ў нейкай ступені сітуацыю ў грамадстве ў цэлым? Якім чынам?
- Якія правы чалавека пастаўлены на карту ў кожнай з роляў? Ці мог хто-небудзь сказаць, што яго правы чалавека парушаліся або што ён не меў да іх доступу?
- Якія першачарговыя меры можна было б прыняць з мэтай вырашэння праблем няроўнасці ў грамадстве?

## Парады для фасілітатараў

Калі практыкаванне выконваецца на вольным паветры, паклапаціцеся пра тое, каб усім было добра вас чуваць, асабліва калі ў вас вялікая група. Можа быць, варта скарыстацца дапамогай асістэнтаў, каб яны перадавалі ўдзельнікам вашы словы.

Пасля раздачы роляў на этапе абдумвання хтосьці з удзельнікаў можа паскардзіцца, што ён дрэнна ўяўляе сабе жыццё асобы, чыю ролю яму трэба сыграць. Растлумачце, што гэта не мае прынцыповага значэння і што ён павінен сыграць так, як можа, выкарыстоўваючы сваю фантазію.

Каштоўнасць гэтага практыкавання заключаецца ў тым, што ўдзельнікі наглядна бачаць павелічэнне разрыву паміж людзьмі, асабліва бліжэй да канца, калі адлегласць паміж тымі, хто ішоў наперад, і тымі, хто заставаўся на месцы, не можа не кідацца ў вочы. Для ўзмацнення гэтага эфекту важна адаптаваць ролі з улікам жыццёвых рэалій удзельнікаў практыкавання. Уносячы пэўныя карэктывы, сачыце за тым, каб магчымасць рухацца наперад (г. зн. адказваць станоўча) заставалася толькі ў мінімальнай колькасці ўдзельнікаў. Гэты прынцып прымяняецца і ў тым выпадку, калі ў вас вялікая група і вам трэба прыдумаць дадатковыя ролі.

На этапе аналізу і ацэнкі важна высветліць, на падставе чаго ва ўдзельнікаў склалася ўяўленне аб іх персанажах – на падставе асабістага вопыту ці іншых крыніц інфармацыі (з навін, кніг, анекдотаў)? Ці ўпэўнены яны ў дакладнасці ўяўленняў і інфармацыі аб гэтых асобах, на якія яны абапіраюцца? Такім чынам вы можаце паказаць, як працуюць стэрэатыпы і прадузятасці.

**Заўвага.**
Гэта практыкаванне распрацаваў Эльс ван Моўрык (Something Els) і іншыя.

Гэта практыкаванне асабліва карыснае, калі вы хочаце правесці сувязь паміж рознымі пакаленнямі правоў (грамадзянска-палітычнымі, з аднаго боку, і сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі – з другога) і доступам да іх. Праблемы беднасці і сацыяльнага выключэння з'яўляюцца следствам не толькі афіцыйнага прызнання правоў, хоць менавіта ў гэтым і заключаецца праблема бежанцаў і асоб у пошуках прытулку; вельмі часта праблемай складаецца ў адсутнасці эфектыўнага доступу да гэтых правоў.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**15 чэрвеня**
Сусветны дзень харчавання

## Варыянты

Першы варыянт дазваляе яшчэ раз паглядзець на сімволіку няроўнасці. Вам спатрэбіцца доўгая тонкая нітка або папяровая стужка, якую можна лёгка разарваць. Калі ўдзельнікі стануць у шарэнгу (як на стартавай лініі), прайдзіце ўздоўж яе, разгортваючы стужку. Пакуль вы ідзяце, кожны ўдзельнік бярэцца за стужку і аказваецца «звязаным» ёй з іншымі. Калі настане час зрабіць крок наперад, некаторыя ўдзельнікі апынуцца перад дылемай: зрабіць крок і разарваць стужку ці ж застацца на месцы. Можа здарыцца і так, што тыя, хто засталіся ззаду, будуць вінаваціць тых, хто пайшоў наперад, у тым, што яны разарвалі стужку. У такім выпадку мае сэнс нагадаць удзельнікам правіла, што кожны раз, калі нехта адказвае «так», ён павінен зрабіць крок наперад. У адваротным выпадку ён павінен заставацца на месцы і не рухацца.

Другі варыянт: правядзіце першы раўнд, як было апісана, а затым перайдзіце да другога, які дасць магчымасць выявіць недаацэненыя раней уменні. Удзельнікі іграюць тыя ж ролі. У другім раўндзе зачытайце падрыхтаваныя загадзя сітуацыі, робячы акцэнт на перавагах, якія могуць мець прадстаўнікі ўразлівых груп насельніцтва менавіта з-за іх становішча, напрыклад:

- Вы размаўляеце больш чым на дзвюх мовах і карыстаецеся імі кожны дзень.
- Вы пераадолелі свой фізічны або псіхічны недахоп, і гэта дало вам упэўненасць у сабе і досыць унутранай сілы, каб захоўваць спакой, нават стаўшы беспрацоўным.
- Вы пакутуеце ад невылечнай хваробы і лепш за іншых ведаеце каштоўнасць жыцця.
- Вы выраслі ў глухой вёсцы і лепш за іншых ведаеце, што такое экалагічны крызіс, які ўзнік з-за змены клімату.
- Вы ведаеце, як жыць са сціплым бюджэтам і дзе можна сэканоміць на куплях.

З дапамогай гэтага метаду можна падкрэсліць няроўнасць у многіх праблемных абласцях, напрыклад у доступе да вады, удзеле ў палітычным і грамадскім жыцці, у гендарных пытаннях. Калі вы засяродзіцеся на іншай праблеме, вам прыйдзецца прыдумаць іншыя ролі і сітуацыі, але пры гэтым памятайце, што некаторыя з іх могуць быць вельмі далікатнымі.

Каб атрымаць як мага больш ідэй і дамагчыся больш глыбокага разумення праблемы ўдзельнікамі, варта спачатку папрацаваць у малых групах, а затым абмяняцца думкамі на агульным абмеркаванні. У такім выпадку фасілітатару, хутчэй за ўсё, спатрэбяцца памочнікі. Паспрабуйце гэты метад у малых групах, пачынаючы з другой паловы аналізу, калі ўдзельнікі ўжо назавуць свае ролі. Папрасіце іх падумаць, у каго ў грамадстве шанцаў і магчымасцей больш, а ў каго – менш і што ў першую чаргу можна і трэба зрабіць, каб прыступіць да вырашэння праблемы няроўных магчымасцей. Можна таксама папрасіць удзельнікаў узяць у якасці прыкладу аднаго з персанажаў і вызначыць, што можна зрабіць для яго, г. зн., якую адказнасць і якія абавязкі ў адносінах да гэтага чалавека нясуць яны асабіста, грамадства і дзяржава.

## Прапановы па далейшай працы

У залежнасці ад сацыяльнага кантэксту, у якім вы працуеце, вы можаце запрасіць на размову з групай прадстаўнікоў арганізацый, якія выступаюць у падтрымку тых ці іншых культурных або сацыяльных меншасцей. Даведайцеся, за што яны ў цяперашні час змагаюцца і як вы разам з маладымі людзьмі можаце ім дапамагчы. Такая асабістая сустрэча дасць магчымасць абмеркаваць некаторыя прадузятасці і стэрэатыпы, аб якіх ішла гаворка ў практыкаванні.

Калі групе захочацца даведацца больш аб праблемах няроўнасці магчымасцей у галіне адукацыі і аб мерах, якія прымаюцца для вырашэння гэтых праблем, звярніцеся да практыкавання «Адукацыя для ўсіх?» на старонцы 158.

## Зрабі крок наперад

Групе можа спатрэбіцца больш часу для таго, каб разгледзець стэрэатыпныя вобразы людзей, прадстаўленых у гэтым практыкаванні. Можна выкарыстаць практыкаванне «Еўрачыгунка: выбіраем вагон» (Euro-rail 'a la carte') з навучальнага пакета «Усе розныя – усе роўныя» і спытаць удзельнікаў, з якімі людзьмі яны больш за ўсё або менш за ўсё хацелі б ехаць у адным вагоне.

## Ідэі для дзеяння

Выкарыстайце ідэі з папярэдняга раздзела. Падумайце, як вы разам з іншымі маладымі людзьмі можаце дапамагчы арганізацыям і групам, якія працуюць з сацыяльнымі і культурнымі меншасцямі, і пераўтварыце вашы ідэі ў канкрэтныя справы.

## Раздатачныя матэрыялы

### Ролевыя карткі

| | |
|---|---|
| Вы – адзінокая маці, беспрацоўная. | Вы – старшыня маладзёжнай арганізацыі, звязанай з палітычнай партыяй, якая ў дадзены час трымае ўладу. |
| Вы – дачка дырэктара мясцовага банка, вывучаеце эканоміку ва ўніверсітэце. | Вы – сын імігранта-кітайца, які валодае паспяховым прадпрыемствам хуткага харчавання. |
| Вы – дзяўчына-мусульманка арабскага паходжання, якая жыве разам з бацькамі, якія строга прытрымліваюцца норм сваёй рэлігіі. | Вы – дачка пасла ЗША ў краіне, дзе вы зараз жывяце. |
| Вы – салдат тэрміновай службы, які выконвае свой воінскі абавязак. | Вы – уладальнік паспяховай імпартна-экспартнай фірмы. |
| Вы – малады чалавек з інваліднасцю, які перамяшчаецца выключна ў вазку. | Вы – пенсіянер, у мінулым рабочы абутковай фабрыкі. |
| Вы – 17-гадовая дзяўчына-рама, якая не скончыла пачатковую школу. | Вы – сяброўка маладога мастака, які ўжывае наркотыкі. |
| Вы – жанчына з ВІЧ сярэдняга ўзросту, працаўніца сэкс-бізнэсу. | Вы – 22-гадовая лесбіянка. |
| Вы – беспрацоўны выпускнік універсітэта, які чакае першай магчымасці атрымаць працу. | Вы – манекеншчыца афрыканскага паходжання. |
| Вы – 24-гадовы бежанец з Афганістана. | Вы – 27-гадовы бяздомны. |
| Вы – імігрант з Малі. | Вы – 19-гадовы сын селяніна ў аддаленым горным сяле. |

## Сітуацыі і падзеі

Зачытайце ўслых наступныя сітуацыі. Пасля зачытвання кожнай з іх дайце ўдзельнікам час вырашыць, рабіць крок наперад ці не, а таксама азірнуцца на іншых.

- У вас ніколі не было сур'ёзных фінансавых цяжкасцей.
- У вас добрае жыллё з тэлевізарам і тэлефонам.
- Вы адчуваеце, што ваша мова, рэлігія і культура карыстаюцца павагай у грамадстве, у якім вы жывяце.
- Вы адчуваеце, што ваша меркаванне па сацыяльных і палітычных пытаннях мае вагу.
- Да вас звяртаюцца за парадай па розных пытаннях.
- Вы не баіцеся, што вас спыніць паліцыя.
- Вы ведаеце, да каго звярнуцца за парадай і дапамогай у выпадку неабходнасці.
- Вы ніколі не адчувалі дыскрымінацыі з-за свайго паходжання.
- Ваша сацыяльная і медыцынская абароненасць цалкам адпавядае вашым патрэбам.
- Раз у год вы можаце сабе дазволіць паехаць на адпачынак.
- Вы можаце сабе дазволіць запрашаць да сябе сяброў на вячэру.
- У вас цікавае жыццё, і вы з аптымізмам глядзіце ў будучыню.
- Вы адчуваеце, што можаце сабе дазволіць вучыцца і працаваць па абранай вамі прафесіі.
- Вы не баіцеся праследавання ці нападкаў на вуліцах або ў прэсе.
- Вы можаце прыняць удзел у нацыянальных і мясцовых выбарах.
- Вы можаце свабодна адзначаць найбольш важныя рэлігійныя святы са сваякамі і блізкімі сябрамі.
- Вы маеце магчымасць удзельнічаць у міжнародных семінарах за мяжой.
- Мінімум раз у тыдзень вы можаце сабе дазволіць схадзіць у тэатр або ў кіно.
- Вам не трэба баяцца за будучыню сваіх дзяцей.
- Вы можаце сабе дазволіць купіць новае адзенне як мінімум раз у тры месяцы.
- Вы можаце сабе дазволіць закахацца ў любога, каго выбераце.
- Ваш прафесіянальны вопыт карыстаецца прызнаннем і павагай у грамадстве, у якім вы жывяце.
- Вы можаце карыстацца Інтэрнэтам і выгадамі, якія ён дае.
- Вы не баіцеся наступстваў змены клімату.
- Мы можаце свабодна наведаць любы сайт у Інтэрнэце, не асцерагаючыся цэнзуры.

COMPASS

Грамадзянскасць і ўдзел

Навакольнае асяроддзе

Праца

Узровень 4

4–10 чалавек

90 хвілін

# Аповесць пра два гарады

*Цывілізацыя – гэта лад жыцця і адносіны да ўсіх людзей з роўнай павагай.*

Карасон Акіна

**Тэмы**
- грамадзянскасць і ўдзел,
- навакольнае асяроддзе,
- праца.

**Складанасць** узровень 4

**Памер групы** 4–10 чалавек

**Час** 90 хвілін

**Агляд** Гэта настольная гульня, удзельнікі якой выбіраюць горад, у якім хацелі б жыць, і выгоды, якімі хацелі б карыстацца. Сярод іншых закранаюцца наступныя пытанні:
- сацыяльная салідарнасць;
- сэнс выплаты падаткаў;
- каштоўнасць дэмакратыі на месцах.

**Звязаныя правы**
- права на сацыяльнае забеспячэнне;
- права мець уласнасць;
- права на дастатковы ўзровень жыцця.

**Мэты**
- зразумець важнасць сацыяльнага дабрабыту для жыцця супольнасці;
- развіць навыкі камунікацыі і ўменне працаваць у камандзе;
- садзейнічаць сцвярджэнню каштоўнасцей салідарнасці і адказнасці перад грамадствам.

**Матэрыялы**
- 1 экзэмпляр настольнай гульні;
- картка або папера фармату А3 (пажадана, але неабавязкова);
- 1 іґральныя косці;
- сашчэпкі двух колераў (напрыклад, чырвоныя і сінія). Колькасць сашчэпак кожнага колеру павінна быць аднолькавай. У кожнага ўдзельніка павінна быць дастатковая колькасць сашчэпак;
- нажніцы;
- любая клейкая маса, якую лёгка адклеіць (напрыклад, Blu-tac);
- 4 наборы зменных картак;
- 2 канверты;
- грошы (6000 у. а. на гульца);
- 2 экзэмпляры «Заданняў для банкіра горада»;
- 1 экзэмпляр «Заданняў для банкіра гульні»;
- папера і ручкі;
- секундамер;
- праектар і слайды з правіламі гульні (па жаданні).

**Падрыхтоўка**
- Прачытайце інструкцыі, каб азнаёміцца з гульнявым полем, зменнымі карткамі і правіламі гульні;
- Выражце зменныя карткі з двух лістоў. Каб не пераблытаць, пакладзіце іх у два канверты, пазначаныя А і Б (астатнія два лісты будуць выкарыстоўвацца як даведачны матэрыял на пасяджэннях гарадскога савета);
- Ксеракопію гульнявога поля прыклейце на кардон або тоўстую паперу, каб яна даўжэй вам паслужыла і ёю было зручней карыстацца;
- Выберыце трох удзельнікаў на ролі банкіраў – па адным банкіры на горад, і яшчэ адзін будзе банкірам гульні. Раздайце абодвум банкірам гарадоў і банкіру гульні лісты з іх заданнямі. Папрасіце банкіраў зрабіць карткі ці значкі, па якіх іх можна будзе вылучыць сярод іншых удзельнікаў гульні;

- Падзяліце астатніх удзельнікаў на дзве роўныя групы. Адной раздайце чырвоныя сашчэпкі, а другой – сінія;
- Папрасіце кожнага гульца зрабіць сабе «фішку», напісаўшы сваё імя на лістку паперы, згарнуўшы яго ў трубачку і замацаваўшы сашчэпкай свайго колеру;
- Надрукуйце грошы! Зрабіце копіі банкнот са старонкі 354, разрэжце іх, каб у кожнага гульца (грамадзяніна) было 6000 у. а.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**1 кастрычніка**
Сусветны дзень Хабітат

## Інструкцыі

1. Растлумачце, што гэта практыкаванне ўяўляе сабой настольную гульню, і пакажыце ўдзельнікам ігральнае поле. Прадэманструйце маршрут горада А, а потым – маршрут горада Б. Адзначце месцы, дзе яны перасякаюцца, і пакажыце квадрацікі, дзе ўдзельнікі атрымліваюць зарплату, выплачваюць падаткі і маюць магчымасць «усё памяняць», г. зн. перасяліцца ў іншы горад і гуляць там.
2. Растлумачце правілы гульні (гл. раздатачныя матэрыялы ніжэй). Пераканайцеся, што ўсе іх зразумелі. Вызначце, калі гульня павінна завяршыцца.
3. Скажыце банкірам прымацаваць на адзенне прыкметныя значкі, каб гульцы ведалі, каму плаціць падаткі.
4. Пачынайце гульню! Пасля яе завяршэння пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з агляду працэсу гульні, затым абмяркуйце з удзельнікамі, хто чаму навучыўся.

1. Ці атрымалі ўдзельнікі задавальненне ад гульні? Што ў ёй спадабалася, а што не?
2. Ці не падалося ў пачатку гульні несправядлівым тое, што адным трэба плаціць больш падаткаў, чым іншым? Ці захоўвалася гэта адчуванне яшчэ некаторы час?
3. Як праходзілі пасяджэнні гарадскога савета? Ці быў працэс прыняцця рашэнняў дэмакратычным?
4. Як сябе адчувалі тыя, хто не згаджаўся з рашэннямі гарадскога савета?
5. Хто перасяліўся ў іншы горад? Чаму?
6. Ці ахвяраваў хто-небудзь на пасяджэнні гарадскога савета грошы з уласнай кішэні на грамадскія патрэбы? Чаму яны гэта зрабілі?
7. У пачатку гульні сацыяльныя ўмовы ў гарадах А і Б былі аднолькавымі. А ў канцы гульні? Ці з'явіліся нейкія адрозненні? Якія канкрэтна?
8. У якім горадзе вы б хацелі жыць? Чаму?
9. Ці варта плаціць больш высокія падаткі, каб усім жылося лепш? Ці вы б лепш пакінулі ўвесь свой заробатак сабе і купілі тое, што вам неабходна і чаго хочацца, самі?
10. Што адбылося з двума гарадамі ў канцы гульні? Ці апынуліся яны ў «краіне роўнасці – Эквалândыі», дзе жыхары, аб'яднаныя духам супольнасці, гатовы плаціць за сацыяльныя выгоды, або ў «краіне эгаістаў – Эгаландыі», жыхары якой апантаныя індывідуалізмам і не жадаюць гэтага рабіць?
11. Якую б ацэнку вы далі свайму гораду па шкале ад 1 (абсалютная Эгаландыя) да 10 (абсалютная Экваландыя)?
12. Па чарзе паглядзіце на ўсе квадраты гульнявога поля. Якія правы чалавека парушаюцца?
13. Ці ёсць супольнасці або групы ў вашай краіне, чыё права на ўзровень жыцця, неабходны для падтрымання здароўя і дабрабыту (артыкул 25 УДПЧ), парушаецца? Што гэта за супольнасці і групы і чаму так адбываецца?

## Парады для фасілітатараў

Для любога чалавека, знаёмага з настольнымі гульнямі, гэта гульня не будзе складанай; тым не менш паспрабуйце як мага больш даходліва растлумачыць яе правілы. Гульцам будзе лягчэй, калі вы напішаце правілы на фліпчарце, пакажаце на слайдах або раздасце копіі ўсім удзельнікам.

http://www.gmlets.u-net.com/

Ідэальная колькасць удзельнікаў, якія выступаюць у ролі грамадзян, – да дзесяці чалавек, і на пачатку гульні ў кожным горадзе павінна быць роўная колькасць «насельніцтва». Калі ў групе, скажам, 16 чалавек, няхай банкіры працуюць у парах. Калі ў вас большая група, лепш правесці дзве гульні. У гэтым выпадку не забудзьце падрыхтаваць другі набор матэрыялаў і запрасіць памочніка для правядзення другой гульні.

Карысная парада: перш чым прапаноўваць гульню групе, згуляйце ў яе з сябрамі або суседзямі. Тады вам будзе прасцей даваць інструкцыі, а сама гульня пройдзе больш гладка.

## Прапановы па далейшай працы

У практыкаванні «Шлях у краіну Роўнасці» на старонцы 244 вы можаце працягнуць даследаваць фактары, якія спрыяюць або перашкаджаюць развіццю роўнасці ў грамадстве. «Варыянты нашай будучыні» на старонцы 240 – гэта яшчэ адно практыкаванне, якое дапаможа высветліць, якія сілы прыводзяць да перамен і дапамагаюць маладым людзям паверыць, што яны могуць пабудаваць менавіта такую будучыню, у якой хочуць жыць.

## Ідэі для дзеяння

Знайдзіце копію плана развіцця раёна або горада, у якім вы жывяце, і абмяркуйце яго ў групе. Разгледзьце праблемы, якія вас турбуюць, напрыклад, якія патрэбы будуць у мясцовай моладзі ў будучыні і наколькі гэты план здольны іх задаволіць. Вы таксама можаце даследаваць праблемы людзей з інваліднасцю ці пытанне бяспекі на вуліцах, у тым ліку планы павелічэння бяспекі для веласіпедыстаў. Данясіце да органаў мясцовай улады сваё меркаванне, прыняўшы ўдзел у грамадскіх сходах, або прапануйце мясцовым жыхарам стварыць блог, напішыце артыкул у газету ці арганізуйце грамадскі сход або інфармацыйна-асветніцкае мерапрыемства.

Група можа захацець даведацца больш пра «партыцыпатарнае бюджэтаванне» і натхніцца рознымі мясцовымі ініцыятывамі, якія рэалізуюцца ва ўсім свеце. Таксама ўдзельнікі могуць даведацца больш пра «Гарады ў пераходны перыяд» і аб'яднаць свае намаганні з намаганнямі іншых у рамках мясцовай ініцыятывы па распрацоўцы ўстойлівай палітыкі ва ўмовах змены клімату і неабходнасці зніжэння выкідаў CO2.

## Дадатковая інфармацыя

«Партыцыпатарнае бюджэтаванне» – гэта працэс прамога дэмакратычнага ўдзелу мясцовых жыхароў у прыняцці рашэнняў аб прыярытэтных выдатках з грамадскага бюджэту, напрыклад на мясцовыя экалагічныя праекты, сацыяльныя аб'екты, мерапрыемствы па забеспячэнні бяспекі на дарогах або мясцовыя ініцыятывы па барацьбе са злачыннасцю. Пашукайце карысныя спасылкі на гэту тэму па запыце «партыцыпатарнае бюджэтаванне».

«Гарады ў пераходны перыяд» (www.transitiontowns.org) – гэта сусветная сацыяльная сетка, якая аб'ядноўвае людзей, якія задаюцца пытаннем: як наша супольнасць можа адказаць на выклікі або на магчымасці, звязаныя з «праходжаннем піку здабычы нафты» і змяненнем клімату? Яны працуюць на месцах і шукаюць спосабы скараціць спажыванне энергіі, а таксама палепшыць самазабеспячэнне. Сярод гэтых ініцыятыў можна адзначыць наступныя: стварэнне грамадскіх садоў для вырошчвання прадуктаў харчавання; праект «Біржы адходаў», у рамках якога адходы аднаго прадпрыемства перадаюцца іншаму, якое выкарыстоўвае іх у сваіх мэтах; рамонт старых рэчаў замест адпраўкі іх на сметнік і развіццё гандлёвых сістэм мясцовага абмену (http://www.gmlets.u-net.com/).

**Заўвага.**
У гульні людзі, якія збіраюць падаткі і распараджаюцца фінансамі горада, называюцца «банкірамі». У рэальным жыцці банкіры такіх функцый не выконваюць. Гэты тэрмін ужыты ў гульні таму, што менавіта ён выкарыстоўваецца ў многіх папулярных настольных гульнях, напрыклад у «Манаполіі». Калі слова «банкір» здаецца вам не самым прыдатным, прыдумайце замест яго якое-небудзь іншае, скажам, «фінансіст».

**Еўрапейскі кодэкс сацыяльнага забеспячэння**

Еўрапейскі кодэкс сацыяльнага забеспячэння Савета Еўропы набыў моц у 1968 годзе. Па стане на сакавік 2010 года яго ратыфікавала 21 дзяржава – удзельніца Савета Еўропы. Кодэкс прадугледжвае шырокі спектр мер сацыяльнай абароны, у тым ліку гарантыі:

- медыцынскага абслугоўвання, уключаючы агульную, спецыялізаваную і неадкладную медыцынскую дапамогу;
- дапамогі па беспрацоўі;
- дапамогі па старасці;
- дапамогі па інваліднасці.

**Раздатачныя матэрыялы**

## Колькасць гульцоў

Ад 7 да 13. Трое іграюць ролю банкіраў. На пачатку гульні колькасць гульцоў у абодвух гарадах павінна быць аднолькавай.

## Мэта гульні

Перамагае гулец, у якога ў канцы гульні акажацца больш за ўсё грошай.

## Як гуляць

1. Трое гульцоў прызначаюцца на ролі банкіраў: адзін у горадзе А, другі – у горадзе Б, трэці – банкір гульні.
2. Палова гульцоў атрымлівае чырвоныя фішкі, другая палова – сінія.
3. У пачатку гульні гульцы пароўну дзеляцца на дзве каманды. У кожнай камандзе пароўну «чырвоных» і «сініх» гульцоў. Адна каманда падарожнічае па маршруце горада А, другая – па маршруце горада Б.
4. Усе гульцы пачынаюць з квадрата «Старт і зарплата».
5. Гулец мае права перайсці ў іншы горад толькі ў тым выпадку, калі знаходзіцца ў квадраце «Магчымасць пераходу».
6. Першапачаткова зарплата кожнага гульца адпавядае яго колеру:
   - «сінія» гульцы: 500;
   - «чырвоныя» гульцы: 100.
7. Кіньце косці, каб вызначыць, хто пачне. Гульню пачынае той, у каго выпала больш; потым гульцы кідаюць косці па чарзе, рухаючыся па крузе супраць гадзіннікавай стрэлкі.
8. Усе гульцы па чарзе кідаюць косці і перасоўваюць свае фішкі па маршруце свайго горада на адпаведную колькасць квадратаў. Паставіўшы фішку на квадрат, гулец зачытвае ўслых інструкцыі і выконвае іх.
9. Заўвага: калі гулец па інструкцыі павінен вярнуцца назад, ён адступае, пакуль не спыніцца на патрэбным квадраце, але ўжо не выконвае напісаныя на ім інструкцыі.
10. Калі гульцу трэба плаціць, а грошай не хапае, ён застаецца ў гэтым квадраце і становіцца «жабраком».
11. У адным квадраце адначасова могуць знаходзіцца некалькі гульцоў.

## Спецыяльныя квадраты

### Выплата падаткаў

Кожны раз, праходзячы квадрат «Выплата падаткаў», гулец павінен заплаціць падатак (прычым нават у тым выпадку, калі гулец там не спыняецца). Сума падатку залежыць ад заробку гульца і ад горада.
Горад А: 40 % пры заробку 500 і больш;
10 % пры заробку 100 і менш.
Горад Б: 10 % незалежна ад заробку.

Заўвага! Беспрацоўны, які не атрымлівае дапамогі, вызваляецца ад выплаты падаткаў. Беспрацоўны, які атрымлівае дапамогу, плаціць 10 % ад гэтай дапамогі незалежна ад горада. Падатак выплачваецца банкіру адпаведнага горада (гульцы ў горадзе А плацяць банкіру горада А, а гульцы ў горадзе Б – банкіру горада Б).

### Зарплата

Кожны раз, праходзячы квадрат «Старт і зарплата» (не абавязкова спыняцца на ім, дастаткова нават прайсці), гулец атрымлівае сваю зарплату ў банкіра гульні. Калі гэта беспрацоўны і калі ў горадзе дзейнічае сістэма сацыяльнага забеспячэння, ён атрымлівае дапамогу па беспрацоўі ў банкіра горада.

**Магчымасць пераходу**

Апынуўшыся ў квадраце «Магчымасць пераходу», гулец вырашае, ці хоча перайсці з аднаго горада ў іншы (з горада А ў горад Б альбо з горада Б у горад А). Для пераходу неабходна паведаміць пра такое рашэнне банкірам і астатнім гульцам. Пачынаючы з наступнага ходу, гулец будзе рухацца ўжо па маршруце іншага горада.

Гулец, які змяніў горад, працягвае атрымліваць тую ж зарплату, што і раней, але плаціць падаткі ў адпаведнасці з законамі новага горада.

## Пасяджэнні гарадскога савета

Усе гульцы прысутнічаюць на пасяджэннях савета свайго горада. Такое пасяджэнне дазваляе змяніць курс гарадской палітыкі (калі гэта неабходна).

Пасяджэнне можна праводзіць пасля кожнай пятай выплаты падаткаў. Банкіры litарадоў вядуць улік колькасці людзей, якія прайшлі квадрат выплаты падаткаў у іх горадзе. Пасля таго як пяты гулец пройдзе гэты квадрат, банкір склікае пасяджэнне.

Гульцы горада вырашаюць, хочуць яны праводзіць пасяджэнне ці не.

На час пасяджэння гульня прыпыняецца, і гульцы іншага горада таксама чакаюць, пакуль яно не завершыцца.

Гульцам даецца 5 хвілін, каб вызначыць патрэбнасці горада і неабходныя змены ў гарадской палітыцы. Варыянты палітыкі пазначаны на зменных картках, а гараджане могуць паглядзець у сваім экзэмпляры спіса зменных картак, якія пытанні стаяць на парадку дня (г. зн. з якіх варыянтаў яны могуць выбіраць).

Каб змяніць гарадскую палітыку, гульцы павінны купіць зменную картку на сродкі з падатковых паступленняў горада. Кошт пазначаны на кожнай картцы. Гарадскі савет можа ажыццяўляць толькі тыя змены, якія можа сабе дазволіць. Банкір горада выплачвае патрэбную суму банкіру гульні. Колькасць купленых картак (і змен у палітыцы) абмяжоўваецца толькі фінансавымі магчымасцямі горада.

Калі гарадскі савет перажывае фінансавыя цяжкасці, ён можа перапрадаць адну або некалькі сваіх зменных картак банкіру гульні за 50 % ад першапачатковага кошту.

Багатыя гараджане могуць па жаданні ўнесці свае сродкі ў гарадскую казну для куплі зменных картак.

Банкір прымацоўвае зменныя карткі да адпаведных квадратаў гульнявога поля з дапамогай вельмі невялікай колькасці клейкай масы.

## Зменныя карткі

Усяго ёсць 17 зменных картак з варыянтамі рашэнняў па змене палітыкі, якія гарадскі савет можа прыняць на сваім пасяджэнні. Карткі набываюцца ў банкіра гульні па пазначаным на іх намінальным кошце. Пасля куплі банкір горада прыляпляе картку (карткі) на пэўны квадрат гульнявога поля ў адпаведнасці з рашэннем гараджан.

Памяняць можна любы квадрат. Калі падчас змены на гэтым квадраце знаходзіцца гулец, ён дзейнічае ў адпаведнасці з папярэднімі інструкцыямі. Новыя правілы ўступаюць у сілу толькі для наступнага гульца, які пападзе на гэты квадрат.

На пасяджэнні гарадскога савета грамадзяне (гульцы) прымаюць рашэнні наконт гарадской палітыкі і могуць купіць адну або больш зменных картак. За ўсе карткі трэба плаціць.

## Жабракі

Гулец, у якога няма грошай для выплаты падаткаў або іншых плацяжоў, застаецца ў тым квадраце, дзе яго напаткала такая доля, і становіцца «жабраком». Аднак калі ў яго горадзе ёсць прытулак для бяздомных, жабрак, калі захоча, можа не заставацца ў сваім квадраце, а пераначаваць там, але гэта не вызваляе яго ад даўгоў.

«Жабрак» можа папрасіць грошай у любога гульца, які патрапіў на яго квадрат. Кожны гулец сам вырашае, даць яму грошай ці не. Калі ў «жабрака» аказалася дастаткова грошай для пагашэння сваіх даўгоў, ён чакае сваёй чаргі, плаціць, кідае косці і працягвае гульню.

«Жабрак» кідае косці кожны другі раз, як выпадае яго чарга, і атрымлівае наступны шанц:

- калі выпала 6: знаходзіць 50 у. а. у сметніцы;
- калі выпала 5: збірае 20 пустых піўных бутэлек, здае іх у пункт прыёму шклатары (калі ён ёсць у горадзе) і атрымлівае 50 у. а.;
- калі выпала 4: вы атрымлівае 10 у. а. ад першага гульца, які перасячэ квадрат «жабрака»;
- калі выпала 3: прапускае сваю чаргу, бо замерзае і спіць;
- калі выпала 2: прачынаецца ў парку і знаходзіць пад лаўкай 10 у. а. Калі горад добраўпарадкаваў парк, знаходзіць 20 у. а.;
- калі выпала 1: становіцца ахвярай рабавання. Наступную міласціну, якую вам дадуць, ці любыя іншыя грошы, якія атрымае, трэба будзе аддаць банкіру горада.

Выйгрышы «жабраку» выплачвае банкір горада, у якім той жыве.

## Калі заканчваецца гульня?

Гульцы вырашаюць, калі яны закончаць гульню, да яе пачатку. Яны могуць выбраць адзін з наступных варыянтаў:
• пасля таго, як першы гулец пройдзе 20 раўндаў;
• праз пэўны час, скажам, праз 45 хвілін.

Заўвага: гульня аўтаматычна завяршаецца ў выпадку банкруцтва аднаго з гарадоў.

Перамагае гулец, у якога ў канцы гульні будзе больш за ўсё грошай.

**Зменныя карткі**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Добраўпарадкаванне парку, будаўніцтва ў ім плавальнага басейна і дзіцячай пляцоўкі. Кошт – 200 у. а. | Уборка парку. Кошт – 100 у. а. | Цяпер дарогі ў добрым стане. Перайдзіце на тры квадраты наперад. Кошт – 400 у. а. | Дарогі ў досыць добрым стане, калдобіны залатаны, але латкі вытрымаюць толькі да наступнага пасяджэння гарадскога савета. Кошт – 200 у. а. |
| Вы губляеце працу! Фонд дапамогі беспрацоўным выплачвае вам 30 % ад вашай зарплаты. Рэзервовы фонд горада павінен пры гэтым складаць не менш за 1000 у. а. | Вы захварэлі. Гарадская бальніца цалкам субсідзіруецца. Вы плаціце толькі 10 у. а. Кошт – 600 у. а. | Вы захварэлі. Гарадская бальніца субсідзіруецца часткова. Вы плаціце толькі 30 у. а. Кошт – 400 у. а. | Пляж бясплатны, радуйцеся! Субсідзіраванне бясплатнага доступу абыходзіцца гораду ў 100 у. а. |
| Сітуацыя на дарогах стала лепш пасля ўвядзення ў строй веласіпеднай дарожкі. Яна абышлася ў 150 у. а. | Канец забастоўкі школьных настаўнікаў! Кідайце косці яшчэ раз. Кошт павышэння зарплаты – 400 у. а. | Адкрылі новы тэатр і кінатэатр. Кошт – 400 у. а. | Ваш бацька выйшаў на пенсію, але грошай не атрымлівае. Стварыце сістэму пенсіённага забеспячэння. Кошт – 400 у. а. |
| Хочацца пачытаць? Завітайце ў бібліятэку! Кідайце косці яшчэ раз. Кошт бібліятэкі – 200 у. а. | Пабудаваны дзіцячы дом, беспрытульнікаў больш няма на вуліцах. Кошт дзіцячага дома – 200 у. а. | Сістэма перапрацоўкі адходаў скарачае колькасць смецця. Перайдзіце на тры квадраты наперад. Кошт сістэмы – 150 у. а. | Вы сутыкнуліся з юрыдычнай праблемай. Звярніцеся да бясплатнага юрыста. Перайдзіце на два квадраты наперад. Кошт – 200 у. а. |
| У горадзе не засталося бяздомных. Пабудаваны прытулак. Кошт – 200 у. а. | | | |

«Грошы» для гульні знаходзяцца на старонцы 354.

## Спіс задач банкіра горада

Першапачаткова ў гарадоў няма сваіх грошай. Усе прыбыткі ідуць з падаткаў, што выплачваюць гульцы пры праходжанні адпаведных квадратаў.

1. У сваіх уліковых лістах банкіры горада адзначаюць, колькі гульцоў прайшло праз квадрат «Выплата падаткаў», і пасля кожнага пятага склікаюць пасяджэнне гарадскога савета.
2. Банкіры горада збіраюць падаткі пры праходжанні гульцамі адпаведных квадратаў. Заўвага: гульцы, якія перайшлі ў іншы горад, плацяць падаткі ў адпаведнасці з яго законамі.

Схема падаткаабкладання:
Горад А: 40 % пры заработку 500 і больш;
10 % пры заработку 100 ці менш.
Горад Б: 10 % незалежна ад заработку.
Беспрацоўны, які не атрымлівае дапамогі, вызваляецца ад падаткаў.
Беспрацоўны, які атрымлівае дапамогу, плаціць 10 % ад яе.

3. Іншыя задачы банкіраў горада:

- адказваць за грошы горада;
- аплачваць куплю зменных картак у банкіра гульні;
- прыляпляць зменныя карткі на адпаведныя квадраты гульнявога поля згодна з рашэннем гараджан, прынятым на пасяджэнні гарадскога савета;
- кіраваць фондам дапамогі беспрацоўным у адпаведнасці з рашэннямі горада;
- выплачваць дапамогу па беспрацоўі гульцам, якія маюць на яе права, калі горад прыняў рашэнне стварыць сістэму сацыяльнага забеспячэння. Пры гэтым на момант яе стварэння ў гарадскім банку павінна знаходзіцца не менш за 1000 у. а.;
- наглядаць за «жабракамі» ў горадзе, сачыць, каб яны гулялі сумленна, калі кідаюць косці:
    - калі выпала 6: ён знаходзіць 50 у. а. у сметніцы;
    - калі выпала 5: ён збірае 20 пустых піўных бутэлек, здае іх у пункт прыёму шклатары (калі ён ёсць у горадзе) і атрымлівае 50 у. а.;
    - калі выпала 4: ён атрымлівае 10 у. а. ад першага гульца, які перасячэ квадрат «жабрака»;
    - калі выпала 3: ён напіваецца і прапускае сваю чаргу, бо спіць;
    - калі выпала 2: ён прачынаецца ў парку і знаходзіць пад лаўкай 10 у. а. Калі горад добраўпарадкаваў парк, ён знаходзіць 20 у. а.;
    - калі выпала 1: ён становіцца ахвярай рабавання. Наступную міласціну, якую яму дадуць, ці любыя іншыя грошы, якія ён атрымае, трэба будзе аддаць банкіру горада.

Заўвага: вы выплачваеце жабраку грошы, калі гэтаму чалавеку пашанцавала іх знайсці ў парку ці ў сметніцы, і атрымліваеце ад гэтага чалавека грошы ў выпадку рабавання.

**Улік выплаты падаткаў**

Кожны раз, калі гулец з вашага горада праходзіць праз квадрат «Выплата падаткаў», прымайце грошы і адзначайце гэта птушкай у адпаведным сегменце круга. Пасля праходжання пятага гульца склікайце першае пасяджэнне гарадскога савета. Пасля аднаўлення гульні пачынайце ставіць птушкі ў другім крузе і г. д.

**1-е пасяджэнне**




**2-е пасяджэнне**




**3-е пасяджэнне**




**4-е пасяджэнне**




**5-е пасяджэнне**




**6-е пасяджэнне**



**Ролевая картка банкіра гульні**

На пачатку гульні ўсе грошы знаходзяцца ў банкіра гульні. Банкір гульні абавязаны:

1. Забяспечваць бесперашкодны ход гульні:
    - пачаць гульню;
    - забяспечыць выкананне правілаў;
    - сачыць за працягласцю пасяджэнняў (максімум 5 хвілін) гарадскога савета і
    - завяршыць гульню праз пэўны час або пасля таго, як першы гулец пройдзе ўзгодненую колькасць раўндаў.
2. Весці запісы:
    - у пачатку гульні запісаць імя, колер і горад кожнага гульца;
    - лічыць, колькі разоў кожны гулец праходзіць стартавы квадрат.
3. Выплачваць гульцам зарплату ў пачатку гульні і пры кожным наступным праходжанні квадрата «Старт і зарплата». Зарплата выплачваецца ў адпаведнасці з колерам гульца незалежна ад горада:
    - сінім гульцам: 500 у. а.
    - чырвоным гульцам: 100 у. а.
4. Атрымліваць грошы ў кошт куплі зменных картак ад банкіраў горада.

*Уліковы ліст*

Запісвайце імёны гульцоў чырвонай або сіняй ручкай у адпаведнасці з іх «колерам». Для ўліку раўндаў зручна карыстацца метадам «пяці рысак»: першыя чатыры рыскі начарціце вертыкальна, а пятай перакрэсліце іх па дыяганалі. Шосты раўнд гульні азначае пачатак новых пяці рысак. Гэта дазволіць хутка і лёгка падлічыць раўнды. Вось як выглядае падлік пасля дванаццаці раўндаў: 

| **Гульцы горада А ў пачатку гульні** | |
|---|---|
| Імя гульца | Колькасць разоў праходжання квадрата «Старт» (да 20 разоў) |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

| **Гульцы горада Б у пачатку гульні** | |
|---|---|
| Імя гульца | Колькасць разоў праходжання квадрата «Старт» (да 20 разоў) |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

# Аповесць пра два гарады

ГОРАД Б —>

На дарогах многа калдобін, падарожжы займаюць шмат часу. Прапусціце адзін ход.

Дзеці з вуліцы абрабавалі вас. Аддайце 10 у. а.

Пустое месца

Вы захварэлі, а бальніц няма. Вярніцеся на 3 квадраты назад.

Вы выйгралі ў латарэю! Атрымайце 50 у. а.

# Гульнявое поле

Парк забруджаны і патрабуе добраўпарадкавання. Прапусціце 1 ход, каб дапамагчы з уборкай.

Няма чым заняцца вечарам. Вам нудна. Вярніцеся на 3 квадраты назад

Ваш бацька выйшаў на пенсію, але не атрымлівае ніякіх грошай. Дапамажыце яму 20 у. а.

Няма чым заняцца вечарам. Вам нудна. Вярніцеся на 3 квадраты назад

**Старт + зарплата**

Дзеці з вуліцы абрабавалі вас. Аддайце 10 у. а.

Пустое месца

На дарогах многа калдобін, падарожжы займаюць шмат часу. Прапусціце адзін ход.

**Магчымасць пераходу**

Вы захварэлі, а бальніц няма. Вярніцеся на 3 квадраты назад.

Пустое месца

Пустое месца

Пустое месца

ГОРАД А —>

Цудоўны дзень, каб схадзіць на пляж! Уваход платны — 10 у. а.

На жаль, вас звольнілі з працы.

Вы сутыкнуліся з юрыдычнай праблемай. Звярніцеся да юрыста, кошт яго паслуг — 50 у. а.

Няма чаго пачытаць. Купіце кнігу за 10 у. а.

COMPASS

**Дапаможнік па адукацыі ў галіне правоў чалавека з удзелам моладзі**

На жаль, вас звольнілі з працы.

Цудоўны дзень, каб схадзіць на пляж! Уваход платны — 10 у. а.

Няма чаго пачытаць. Купіце кнігу за 10 у. а.

Узялі на працу! Зарплата не змянілася.

Пустое месца

Вы выйгралі ў латарэю! Атрымайце 50 у. а.

Узялі на працу! Зарплата не змянілася.

Забастоўка смецяроў. Прапусціце адзін ход, каб адвезці сваё смецце на звалку.

**Магчымасць пераходу**

Да вас прычапіўся п'яны бяздомны. Прапусціце 1 ход, каб вырашыць сітуацыю.

Парк забруджаны і патрабуе добраўпарадкавання. Прапусціце 1 ход, каб дапамагчы з уборкай.

Аўтобусы не ходзяць, бярыце таксі за 10 у. а.

**Выплата падаткаў**

Пустое месца

Школьныя настаўнікі бастуюць, каб атрымаць больш высокую зарплату. Прапусціце 1 ход, каб застацца дома з дзецьмі.

Ваш бацька выйшаў на пенсію, але не атрымлівае ніякіх грошай. Дапамажыце яму 20 у. а.

Аўтобусы не ходзяць, бярыце таксі за 10 у. а.

**Пасяджэнне гарадскога савета**

Пасля кожнай 5-й выплаты падаткаў

Да вас прычапіўся п'яны бяздомны. Прапусціце 1 ход, каб вырашыць сітуацыю.

Пустое месца

Забастоўка смецяроў. Прапусціце адзін ход, каб адвезці сваё смецце на звалку.

Вы сутыкнуліся з юрыдычнай праблемай. Звярніцеся да юрыста, кошт яго паслуг — 50 у. а.

Школьныя настаўнікі бастуюць, каб атрымаць больш высокую зарплату. Прапусціце 1 ход, каб застацца дома з дзецьмі.

# Тэрарызм

*Тэрарызм непрымальны ні пры якіх абставінах.*
*Мы павінны ўсе разам змагацца супраць яго, ужываючы метады, якія не ставяць пад пагрозу нашу павагу да вяршэнства закону і правоў чалавека і не выкарыстоўваюцца іншымі для апраўдання такіх дзеянняў.*

Ганна Лінд

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • вайна і тэрарызм,<br>• мір і гвалт,<br>• глабалізацыя. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | любы памер групы (малыя групы па 4–5 чалавек) |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Агляд** | Выкарыстоўваючы метад аналізу сітуацыі, удзельнікі абмяркоўваюць аспекты, якія робяць нейкі ўчынак тэрарыстычным актам, і выпрацоўваюць азначэнне тэрарызму. |
| **Звязаныя правы** | • права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць;<br>• свабода ад катаванняў і зневажальнага абыходжання;<br>• права на мір. |
| **Мэты** | • паглыбіць разуменне прычын тэрарызму і таго, як з ім змагацца;<br>• развіць навыкі аналізу інфармацыі і крытычнага мыслення;<br>• заахвоціць незалежнае мысленне і ўдумлівае стаўленне да падзей. |
| **Матэрыялы** | • карткі з апісаннем сітуацый;<br>• раздатачны матэрыял у выглядзе «Пытанняў для абмеркавання»;<br>• па аркушы паперы фармату А4 і алоўку для кожнай малой групы;<br>• фліпчарт і маркеры. |
| **Падрыхтоўка** | • Скапіруйце і нарэжце карткі з апісаннем сітуацый. Вам спатрэбіцца па адным камплекце картак для кожнай групы;<br>• Скапіруйце «Пытанні для абмеркавання», па адным экзэмпляры на кожную групу. |

## Інструкцыі

1. Спытайце ўдзельнікаў, як яны разумеюць слова «тэрарызм». Правядзіце мазгавы штурм гэтага паняцця і паспрабуйце выпрацаваць рабочае азначэнне. Прапановы, што паступілі, запішыце на фліпчарце.
2. Раскажыце ўдзельнікам, што існуе цэлы шэраг міжнародных дагавораў па барацьбе з тэрарызмам, але ні адзін з іх не дае азначэння тэрміна «тэрарызм»! Адной з прычын такога становішча можа быць тое, што дзяржавы – удзельніцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый часта па-рознаму бачаць бягучыя канфлікты і класіфікуюць пэўныя дзеянні як «тэрарыстычныя» або «нетэрарыстычныя», кіруючыся рознымі інтарэсамі.
3. Падкажыце, што для распрацоўкі азначэння тэрарызму можа спатрэбіцца група аб'ектыўных асоб, напрыклад ваша група! Растлумачце, што гэта практыкаванне дапаможа ім да канца занятку даць сваё ўласнае азначэнне тэрарызму.
4. Падзяліце ўдзельнікаў на малыя групы па 4–5 чалавек і раздайце ім наборы картак з апісаннем сітуацый і аркушы паперы. Папрасіце іх па чарзе абмеркаваць кожнае сцверджанне і вырашыць, ці з'яўляецца яно прыкладам тэрарызму, прывёўшы адпаведныя довады.
5. Праз 20 хвілін збярыце групы разам і азнаёмцеся з вынікамі іх абмеркаванняў. Звярніце асаблівую ўвагу на асноўныя прычыны адмовы ў прызнанні некаторых падзей актамі тэрарызму.
6. Коратка абмяркуйце адрозненні паміж высновамі розных груп, даючы кожнаму боку магчымасць растлумачыць сваё рашэнне. Спытайце ўдзельнікаў, якія з сітуацый былі для іх найбольш цяжкімі.

COMPASS

Вайна і тэрарызм
Мір і гвалт
Глабалізацыя
Узровень 2
Любы памер групы (малыя групы па 4–5 чалавек)
90 хвілін

7. Папрасіце ўдзельнікаў вярнуцца ў малыя групы і сфармуляваць сваё ўласнае азначэнне тэрарызму ў адпаведнасці з тымі рашэннямі, якія яны прынялі раней, або любымі меркаваннямі, выказанымі ў ходзе абмеркавання.
8. Праз 10–15 хвілін папрасіце групы прадставіць свае варыянты азначэння. Затым пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

- Ці даўся вам пошук азначэння паняцця «тэрарызм» цяжэй ці лягчэй, чым вы сабе ўяўлялі? Чаму?
- Ці падаліся вам рэалістычнымі прапанаваныя сітуацыі? Ці «прызнаў» хто-небудзь у нейкай сітуацыі выпадкі, звязаныя з рэальнымі падзеямі? Што гэта былі за падзеі? Ці паўплывала гэта акалічнасць на ваша рашэнне?
- Чаму, на ваш погляд, дзяржавам – удзельніцам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый так цяжка дасягнуць згоды ў азначэнні тэрарызму?
- Чым тэрарыстычныя акты адрозніваюцца – калі можна гаварыць пра адрозненні – ад ваенных дзеянняў? Ці лічыце вы, што адны з іх больш апраўданыя, чым іншыя?
- Як вы думаеце, ці павінны быць пэўныя асноўныя правілы, абавязковыя для выканання ўсімі бакамі (уключаючы дзяржавы) падчас «вайны з тэрарызмам»? Ці ёсць рэчы, якія нельга дазволіць ні аднаму з бакоў? Якія?
- Ці лічыце вы, што гвалтоўныя дзеянні ў нейкіх выпадках могуць быць апраўданы? Чаму так ці чаму не?
- Як вы думаеце, да якіх правоў чалавека маюць дачыненне сітуацыі, якія вы абмеркавалі?
- Ці можна апраўдаць які-небудзь з выпадкаў «з пункту гледжання правоў чалавека»?
- Чаму людзі становяцца тэрарыстамі? Чаму людзі здзяйсняюць злачынствы, мэта якіх заключаецца ў тым, каб прычыніць боль іншым людзям або напужаць іх?
- Ці можна сказаць, якія людзі становяцца тэрарыстамі? Ці можаце вы ўявіць сабе нейкае моцнае пачуццё, здольнае навесці вас на думку аб пазбаўленні каго-небудзь жыцця?
- Ці можна ўвогуле знайсці апраўданне забойству грамадзянскіх асоб? Або тэрарыстаў? Або каго-небудзь іншага?

## Парады для фасілітатараў

Відавочна, што гэта тэма абуджае супярэчлівыя пачуцці і выклікае палеміку, і ваш падыход да яе будзе ў значнай ступені залежаць ад пэўных характарыстык вашага рэгіёну або групы. Вы можаце адкласці ў бок любую з картак, якая здасца вам непрымальнай, і гэта таксама распаўсюджваецца на пытанні для абмеркавання. Вы таксама можаце ўключыць іншыя сітуацыі, якія маюць большае дачыненне да паўсядзённага жыцця вашай групы.

Для таго каб практыкаванне было плённым, удзельнікі павінны адчуваць, што яны могуць выказваць свае думкі без боязі крытыкі з вашага боку ці з боку іншых членаў групы. Магчыма, вам варта агучыць гэта на пачатку занятку і атрымаць ад кожнага згоду захоўваць канфідэнцыяльнасць. Скажыце групе, што практыкаванне прадугледжвае працу з цяжкімі пытаннямі, і нашы эмоцыі могуць супярэчыць таму, што людзі прызнаюць у якасці «правільных» адказаў.

Калі вам спатрэбяцца факты і лічбы, якія маглі б абудзіць цікавасць удзельнікаў да занятку па гэтай тэме, адпаведныя статыстычныя даныя па барацьбе з тэрарызмам вы можаце знайсці на сайце www.nationmaster.com.

Падчас працы над пунктам 6, калі групы будуць спрабаваць распрацаваць уласныя азначэнні тэрарызму, будзе карысна даць некалькі спасылак на папярэднія сітуацыі, каб дапамагчы з высновамі. У прыватнасці, «Пытанні для абмеркавання» можна раздаць удзельнікам да пачатку працы над азначэннямі, але іх можна выкарыстаць і ў канцы, каб «пратэсціраваць» прапанаваныя варыянты.

Перш чым пачаць абмеркаванне сувязі паміж правамі чалавека і тэрарызмам, пераканайцеся, што ўдзельнікі ведаюць наступнае:

a) кожны чалавек мае права на жыццё, і гэта права гарантавана артыкулам 3 УДПЧ, артыкулам 2 Еўрапейскай канвенцыі па правах чалавека і іншымі міжнароднымі дакументамі;

b) нават падчас вайны, калі прымяненне ўзброенай сілы рэгулюецца нормамі міжнароднага гуманітарнага права (МГП), наўмыснае нападзенне на грамадзянскія аб'екты не дапускаецца. МГП устанаўлівае пэўныя базавыя правілы, якія павінен выконваць кожны з бакоў узброенага канфлікту (гл. дадатковую інфармацыю ніжэй).

## Прапановы па далейшай працы

Парэкамендуйце групе даведацца як мага больш пра выпадкі тэрарызму з прыведзеных прыкладаў або пра тэрарыстычныя акты з гісторыі і тое, як яны скончыліся.

Калі група зацікавіцца прычынамі, па якіх людзі ўчыняюць гвалтоўныя дзеянні, звярніцеся да практыкавання «Кіданне камянёў» на старонцы 299. Для вывучэння іншых аспектаў гвалту можна рэкамендаваць практыкаванне «Гвалт у маім жыцці» на старонцы 317.

## Дадатковая інфармацыя

Адпаведныя артыкулы міжнароднага гуманітарнага права і міжнароднага заканадаўства па правах чалавека:

**Заканадаўства па правах чалавека: права на жыццё**

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека:

«Кожны чалавек мае права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць» (артыкул 3).

Еўрапейская канвенцыя аб правах чалавека:

«Права кожнага чалавека на жыццё абараняецца законам...» (артыкул 2).

**Міжнароднае гуманітарнае права: прынцып адрознення**

Міжнароднае гуманітарнае права (МГП) – гэта важны раздзел міжнароднага права, які прымяняецца ў перыяд узброеных канфліктаў. МГП датычыцца ўсіх бакоў узброенага канфлікту, нават калі адзін з іх дзейнічае ў мэтах самаабароны. МГП адносіцца да міжнародных канфліктаў і канфліктаў лакальнага характару і прымяняецца ў роўнай меры да ўзброеных груп, якія змагаюцца супраць дзяржавы, і да саміх дзяржаў.

Адным з найбольш важных прынцыпаў МГП з'яўляецца «прынцып адрознення», які абвяшчае, што ваюючыя бакі павінны праводзіць адрозненне паміж грамадзянскімі асобамі і ўдзельнікамі баявых дзеянняў і паміж грамадзянскімі аб'ектамі і ваеннымі цэлямі.

Пратакол I да Жэнеўскіх канвенцый:

«Грамадзянскае насельніцтва ў цэлым, а таксама асобныя грамадзянскія асобы не павінны з'яўляцца аб'ектам нападзення. Акты або пагрозы гвалту, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца пасеяць страх сярод грамадзянскага насельніцтва, забараняюцца» (артыкул 51.2).

**Міжнароднае гуманітарнае права: забарона актаў тэрарызму**

Чацвёртая Жэнеўская канвенцыя:

«Калектыўныя пакаранні, гэтак жа як і ўсякія меры запалохвання або тэрору, забаронены» (артыкул 33).

Пратаколы 1 і 2 да Жэнеўскіх канвенцый:

«Грамадзянскае насельніцтва ў цэлым, а таксама асобныя грамадзянскія асобы не павінны з'яўляцца аб'ектам нападзення. Акты або пагрозы гвалту, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца пасеяць страх сярод грамадзянскага насельніцтва, забараняюцца» (артыкул 51.2, 1 пратакол; і артыкул 13.2, пратакол 2).

Іншыя артыкулы МГП забараняюць браць заложнікаў і нападаць на месцы выканання рэлігійных абрадаў.

Для знаёмства з працай Савета Еўропы ў сферы тэрарызму, у тым ліку з кіруючымі прынцыпамі барацьбы з тэрарызмам і захавання правоў чалавека, гл. дадатковую інфармацыю па вайне і тэрарызме ў главе 5 на сайце www.coe.int/compass.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**21 мая**
Сусветны дзень барацьбы з тэрарызмам

## Раздатачныя матэрыялы

### Карткі з апісаннем сітуацый

| | |
|---|---|
| **Сітуацыя 1**. Група людзей вядзе ўзброеную кампанію з мэтай пазбавіцца ад таталітарнага ўрада. Яны заклалі бомбу ў Міністэрстве абароны, выбух якой прывёў да гібелі 12 чалавек. | **Сітуацыя 2**. Невядомы праследуе адзінокіх маці, адпраўляючы ім пісьмы з пагрозамі ў адрас іх дзяцей. Выпадкаў гвалту не было, але жанчыны вельмі напалоханы і баяцца выводзіць дзяцей на вуліцу. |
| **Сітуацыя 3**. У ходзе вайны паміж дзвюма краінамі адна з іх кідае на тэрыторыю другой ядзерную бомбу, забіваючы каля 100 000 грамадзянскіх асоб. | **Сітуацыя 4**. Дырэктар буйной касметычнай кампаніі атрымаў пісьмо-бомбу, выбух якой нанёс яму цяжкія раны. Ананімны адпраўнік пісьма абвінавачвае кампанію ў эксплуатацыі жывёл. |
| **Сітуацыя 5**. Група людзей вядзе працяглую кампанію супраць ваенных аб'ектаў, рэгулярна выкарыстоўваючы выбуховыя рэчывы. У выніку гэтых акцый загінула некалькі вайскоўцаў. | **Сітуацыя 6**. У барацьбе за незалежнасць члены этнічных меншасцей рэгулярна бамбяць месцы грамадскага карыстання. Яны загадзя папярэджваюць, каб людзі маглі эвакуіравацца з будынкаў, але ёсць выпадкі гібелі мірных жыхароў. |
| **Сітуацыя 7**. Краіна мае хімічную зброю і заяўляе, што гатова выкарыстаць яе, калі адчуе пагрозу ад любой іншай краіны. | **Сітуацыя 8**. Група злачынцаў захоплівае банк, бярэ супрацоўнікаў у заложнікі, а пазней расстрэльвае іх, каб замесці сляды. |
| **Сітуацыя 9**. Нацыяналістычныя групы патрулююць і бяруць пад кантроль буйныя гарады, рэгулярна збіваючы і запалохваючы прадстаўнікоў іншых этнічных груп. | **Сітуацыя 10**. Таталітарная дзяржава кіруе сваім насельніцтвам метадам запалохвання: любы, хто выступае супраць дзяржавы, падвяргаецца арышту; людзей рэгулярна арыштоўваюць, катуюць і нават караюць смерцю. |
| **Сітуацыя 11**. Арганізаваная злачынная групоўка вымагае грошы ў мясцовых прадпрымальнікаў. Калі хтосьці адмаўляецца плаціць, іх маёмасць спальваюць, а часам забіваюць і іх саміх. | **Сітуацыя 12**. У ходзе вайны супраць паўстанцаў акупацыйная армія атакуе вёскі беспілотнымі самалётамі. Паведамляецца пра ахвяры сярод грамадзянскага насельніцтва, сярод загінуўшых ёсць цэлыя сем'і. |
| **Сітуацыя 13**. Рабочыя з краіны А штодня ўязджаюць у краіну Б. Пагранічнікі краіны Б пастаянна вымотваюць грамадзян краіны А, старанна правяраючы іх дакументы, часта праводзяць асабісты дагляд і затрымліваюць людзей з краіны А без прычыны. | **Сітуацыя 14**. Падчас дзесяцігадовай грамадзянскай вайны 19-гадовая жанчына трапіла ў рукі групы з 10 баевікоў. Спачатку камандзір групы сам згвалтаваў яе, а затым загадаў сваім людзям зрабіць тое ж самае. |
| **Сітуацыя 15**. У горадзе праходзіць міжнародная канферэнцыя. Паліцыя атрымала паўнамоцтвы арыштаваць любога і ўтрымліваць яго на працягу 12 гадзін без прад'яўлення якіх-небудзь абвінавачанняў. Людзей папярэджваюць, каб ніхто не выходзіў на дэманстрацыі. | **Сітуацыя 16**. «Трэба працаваць яшчэ больш, магілы яшчэ не запоўнены», – заклікаў дыктар радыё Руанды. |

## Пытанні для абмеркавання

Пытанні для абмеркавання падчас дыскусій:

- Ці заўсёды тэрарыстычны акт накіраваны на тое, каб справакаваць страх (жах) сярод насельніцтва?
- Ці з'яўляецца любое дзеянне, якое выклікае ў людзей страх, тэрарыстычным актам?
- Ці можа дзяржава (урад) удзельнічаць у тэрарызме, або тэрарызм заўсёды накіраваны супраць афіцыйных інстытутаў краіны?
- Ці заўсёды тэрарызм імкнецца выклікаць ахвяры сярод грамадзянскага насельніцтва, або ён можа быць накіраваны супраць ваенных цэлей ці супраць уласнасці?
- Ці можа акт тэрарызму быць апраўданы ў якіх-небудзь выпадках?

# Кіданне камянёў

*У спрэчцы з каменем яйка заўсёды памыляецца.*

Афрыканская прыказка

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • вайна і тэрарызм,<br>• мір і гвалт,<br>• дзеці. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | 12–20 чалавек (малыя групы па 6–7 чалавек) |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні ролевая гульня выкарыстоўваецца для вывучэння прычын, па якіх людзі здзяйсняюць акты гвалту. |
| **Звязаныя правы** | • права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць;<br>• права на прызнанне правасуб'ектнасці асобы;<br>• права на роўную абарону з боку закону. |
| **Мэты** | • развіць разуменне прычын, якія прымушаюць людзей быць жорсткімі, і наступстваў іх жорсткасці і гвалту;<br>• развіць уменні адказваць на гвалт без ужывання гвалту;<br>• абудзіць пачуццё спагады, справядлівасці і адказнасці. |
| **Матэрыялы** | • копіі раздатачнага матэрыялу, па адной на малую групу;<br>• камяні (па жаданні). |
| **Падрыхтоўка** | • зрабіце копіі раздатачных матэрыялаў, па адным экзэмпляры для кожнай малой групы;<br>• падрыхтуйце досыць месца, каб малыя групы маглі правесці рэпетыцыі, а затым прадставіць невялікую ролевую гульню перад усёй аўдыторыяй. |

## Інструкцыі

1. Папрасіце ўдзельнікаў успомніць які-небудзь інцыдэнт, калі яны адчувалі гнеў, злаваліся або нерваваліся і таму хацелі здзейсніць нешта разбуральнае. Папрасіце ўсіх памаўчаць некалькі хвілін, каб у думках вярнуцца ў той стан.
2. Папрасіце некалькіх добраахвотнікаў падзяліцца з іншымі членамі групы ўспамінамі пра такія інцыдэнты, даць кароткае апісанне таго, што здарылася, і тых эмоцый, якія яны перажылі.
3. Цяпер перайдзіце да ролевай гульні, выдаўшы сябе за чалавека, гатовага кінуць камень. Ваша пастава павінна выказваць вельмі моцны гнеў або расчараванне і перадаваць гатоўнасць кінуць камень. Захоўвайце гэту позу на працягу некалькіх секунд.
4. Падзяліце ўдзельнікаў на малыя групы па 6–7 чалавек. Скажыце ім, што ў іх ёсць 30 хвілін, каб падрыхтаваць кароткую ролевую гульню, якая пакажа інцыдэнт, у канцы якога чалавек будзе гатовы вось-вось кінуць камень.
5. Раздайце копіі пытанняў для абмеркавання і растлумачце, што яны могуць дапамагчы групам распрацаваць сваю ролевую гульню.
6. Праз 30 хвілін збярыце ўсіх разам і папрасіце кожную малую групу паказаць сваю інсцэніроўку астатнім. Пасля кожнага выступлення дайце ўдзельнікам некалькі хвілін на пытанні і кароткае абмеркаванне ўбачанага.
7. Затым пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

COMPASS

Вайна і тэрарызм

Мір і гвалт

Дзеці

Узровень 2

12–20 чалавек (малыя групы па 6–7 чалавек)

90 хвілін

### Аналіз і ацэнка

- Ці адчулі вы, што кожная ролевая гульня мае свой сэнс? Ці дапамаглі яны вам зразумець, што менавіта можа справакаваць чалавека кінуць камень?
- Ці былі пачуцці або эмоцыі, якія можна назваць агульнымі для розных ролевых гульняў і лічыць галоўнымі стымуламі жадання здзейсніць гвалт?
- Чаму, на ваш погляд, у людзей часам з'яўляецца жаданне пашкодзіць што-небудзь ці параніць каго-небудзь? Ці можа акт прычынення шкоды або болю на самай справе дапамагчы ў вырашэнні таго, што яго выклікала? Чаму так? Чаму не?
- Ці дапамагло гэта практыкаванне вам лепш зразумець вашы ўласныя праявы гвалту або праявы гвалту з боку людзей з вашага асяроддзя? Калі дапамагло, то як?
- Ці існуюць акты гвалту, якія вы наогул не можаце зразумець? Ці можаце вы зразумець, што прымушае людзей ваяваць ці падрываць будынкі або іншых людзей?
- Як вы разумееце тэрарыстычныя пагрозы, з якімі сёння сутыкаюцца некаторыя краіны?
- Ці ёсць розніца паміж разуменнем прычын гвалту і апраўданнем яго? Ці важна спрабаваць зразумець, што хаваецца за актамі гвалту? Чаму? Чаму не?
- Як лепш за ўсё рэагаваць на акты гвалту? Назавіце перавагі і недахопы адказу на гвалт яшчэ большым гвалтам і адказу зусім без ужывання гвалту.
- Якія правы чалавека былі пастаўлены на карту ў кожнай з ролевых гульняў?

### Парады для фасілітатараў

Калі ўдзельнікі групы недастаткова добра ведаюць адзін аднаго, вы можаце прапусціць першае заданне (успомніць і расказаць пра інцыдэнт з уласнага жыцця). У якасці альтэрнатывы вы можаце даць заданне ўспомніць падобны інцыдэнт, але асэнсаваць яго і падзяліцца сваімі пачуццямі ў малых групах, калі ўдзельнікі пажадаюць гэта зрабіць.

Ролевыя гульні могуць даць удзельнікам магчымасць агучыць іх рэальныя расчараванні. Верагодна, ім спатрэбіцца больш часу, каб добра абдумаць свае пачуцці без спешкі.

Выдзеліце некалькі хвілін на пытанні пасля кожнай ролевай гульні, каб група пачула ацэнку свайго выступлення і адказала на пытанні аўдыторыі, але не дазваляйце абмеркаванню зацягвацца на гэтым этапе. Лепш нават паглядзець усе выступленні і толькі потым перайсці да абмеркавання агульных пытанняў, закранутых у іх.

Падчас аналізу вы можаце самі падняць пытанне аб тэрарыстычным гвалце або даць гэта зрабіць удзельнікам. Паспрабуйце арганізаваць свабоднае абмеркаванне магчымых матываў здзяйснення тэрарыстычных актаў, не асуджаючы іх адразу ж у самым пачатку занятку. Будзе карысна разгледзець псіхалагічныя прычыны такіх дзеянняў асобна ад іх магчымых наступстваў, для чаго можна выкарыстаць дрэва праблем і зрабіць гэта ў форме самастойнага практыкавання (гл. ніжэй).

Важна паспрабаваць знайсці баланс паміж аналізам асобы тых людзей, якія здзяйсняюць акты гвалту, з аднаго боку, і кваліфікацыяй актаў гвалту як непрымальных, з іншага боку, асабліва ў выпадках, дзе іх наступствы прымушаюць пакутаваць іншых. Абедзве гэтыя пазіцыі сугучны з ідэяй правоў чалавека, і абедзве неабходны для таго, каб знайсці шляхі выхаду з цыкла гвалту і ўзаемнага недаверу.

### Варыянты

Вобраз чалавека, які кідае камень, звязаны ў вачах многіх людзей з рэпартажамі з акупаваных палесцінскіх тэрыторый і з фотаздымкамі маладых палесцінцаў у СМІ, у тым ліку зусім маленькіх дзяцей, якія кідаюць камяні ў ізраільскіх салдат. Вы можаце пакласці такі сюжэт у аснову сцэнарыя гэтай ролевай гульні або аднаго з наступных практыкаванняў, каб разам з удзельнікамі паразважаць пра тое, як вайна парушае правы дзяцей.

## Прапановы па далейшай працы

Вазьміце рэальны прыклад гвалту ў вашым горадзе ці раёне і паспрабуйце адлюстраваць яго ў форме апавядання аб падзеях, якія да яго прывялі. Вы маглі б прадставіць усё як храналагічную паслядоўнасць падзей, кожная з якіх цягнула за сабой іншую. Папрасіце групу паспрабаваць вызначыць пункты на храналагічнай лініі, калі гвалт можна было прадухіліць ці спыніць эскалацыю канфлікту.

Вы можаце працягнуць вывучэнне тэмы тэрарызму ў практыкаванні «*Чахал супраць Вялікабрытаніі*» на старонцы 120.

Акт кідання камянёў часам звязваюць са звычаем пакарання праз забіццё камянямі. Адносіны паміж рэлігійнымі і культурнымі звычаямі і правамі чалавека заўсёды цікавыя і разам з тым спрэчныя. Калі група захоча вывучыць, як звычаі і вераванні змяняюцца з цягам часу, перайдзіце да практыкавання «Хутка састарэе» на старонцы 272.

Для вывучэння гвалту з боку кіберхуліганаў рэкамендуецца выканаць практыкаванне «Маё жыццё не шоу!» на старонцы 232.

## Ідэі для дзеяння

Успомніце прыклады актаў гвалту ў межах вашага раёна, пра якія ўжо ішла гаворка ў практыкаванні, і высветліце, якія арганізацыі працуюць над рашэннем праблемы і як яны дапамагаюць тым, хто выступаў у іх у ролі злачынцаў ці ахвяр. Абмяркуйце, як ваша група можа садзейнічаць прадухіленню розных актаў гвалту.

Паводле ацэнак ААН, у 2008 годзе ва ўсім свеце было больш за 250 000 дзяцей-салдат. Даведайцеся больш пра гэтых дзяцей, якія вымушаны прымаць удзел у гвалтоўных дзеяннях, і далучыцеся да адной са шматлікіх кампаній, накіраваных на тое, каб спыніць выкарыстанне непаўналетніх у якасці салдат. Вы таксама можаце даведацца аб працы арганізацый, якія займаюцца рэабілітацыяй былых дзяцей-салдат. Шукайце па пошукавым запыце «дзеці-салдаты» або азнаёмцеся з данымі на сайтах www.warchild.org, www.hrw.org або www.redhandday.org.

## Дадатковая інфармацыя

Дрэва праблем з'яўляецца карысным візуальным інструментам для аналізу праблем. Яно ўяўляе сабой спалучэнне мазгавога штурму і так званай «карты думак», або асацыятыўнай карты. Ствол дрэва ўяўляе сабой праблему. Удзельнікі пачынаюць з вызначэння прычын праблемы, якія прадстаўлены каранямі, а затым пераходзяць да выяўлення наступстваў, якія прадстаўлены галінамі. Праблемы і наступствы могуць быць выкліканы, напрыклад, сацыяльнымі, эканамічнымі і палітычнымі фактарамі. Яны таксама могуць быць абумоўлены адносінамі людзей і іх паводзінамі. Для атрымання дадатковай інфармацыі па гэтым пытанні наведайце сайт www.thechangeagency.org і ўвядзіце ў акне пошуку «дрэва праблем».

## Раздатачныя матэрыялы

**Пытанні для абмеркавання**

Падчас планавання ролевай гульні вам варта прадумаць наступныя пытанні:

- Хто гэты чалавек і ў што ці ў каго гэты чалавек кідае камень?
- Якая сувязь паміж чалавекам, які кідае камень, і прадметам або тымі, у якіх кідаюць гэты камень?
    - Ёсць побач з гэтым чалавекам хто-небудзь яшчэ, ці гэты чалавек адзін/адна/адні??
- Калі побач знаходзіцца яшчэ нехта, як яны ўдзельнічаюць (калі ўдзельнічаюць) у гэтым інцыдэнце?
- Чаго хоча дамагчыся чалавек, які кідае камень?
- Якія падзеі прывялі да кідання каменю? Ці было гэта імпульсіўным жэстам або запланаваным учынкам?
- Ці выклікана рашэнне кінуць камень нейкай канкрэтнай падзеяй?
- Якія пачуцці бушуюць у душы чалавека, калі чалавек рыхтуецца кінуць камень?
- Якія пачуцці валодалі чалавекам у перыяд падрыхтоўкі да гэтага акта?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**12 лютага**
Дзень чырвонай рукі

Сярод арганізацый, якія падтрымліваюць глабальную кампанію «Дзень чырвонай рукі», можна вызначыць такія, як Human Rights Watch, Amnesty International, Маладзёжны Чырвоны Крыж Германіі, Terre des homes і Plan International. www.redhandday.org.

**Заўвага**.
Ідэя практыкавання запазычана з працы Файоны Макбет і Ніка Файна «Гульня з агнём» (New Society Publishers, 1995 год).

COMPASS

Агульныя правы чалавека

Гістарычная памяць

Рэлігія і вера

Узровень 3

Любы памер групы

60 хвілін і больш

# Храналогія правоў

*Гісторыя вучыць усяму, нават будучыні.*

Ламарцін

**Тэмы**
- агульныя правы чалавека,
- гістарычная памяць,
- рэлігія і вера.

**Складанасць** узровень 3

**Памер групы** любы памер групы

**Час** 60 хвілін і больш

**Агляд** Удзельнікі калектыўнымі намаганнямі ствараюць храналогію падзей, якія сталі вехамі ў развіцці канцэпцыі правоў ад 2000 года да н. э. да цяперашняга часу, і робяць прагнозы на будучыню. Гэты метад таксама можа быць выкарыстаны для вывучэння гісторыі любой групы людзей.

**Звязаныя правы**
- права на адукацыю, уключаючы адукацыю ў галіне правоў чалавека;
- права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць;
- свабода рэлігіі і перакананняў.

**Мэты**
- даць веды пра развіццё правоў чалавека ў гісторыі;
- развіць навыкі камунікацыі і крытычнае мысленне;
- абудзіць цікавасць да вывучэння правоў чалавека і прывіць абавязак абараняць іх.

**Матэрыялы**
- рулон шырокага малярнага скотча;
- сцяна даўжынёй 10–12 метраў;
- блокі стыкераў 3 розных колераў;
- фліпчарт і маркеры рознага колеру.

**Падрыхтоўка**
- Прачытайце старонкі 395–400 главы 4, каб атрымаць уяўленне пра гісторыю развіцця правоў чалавека;
- З дапамогай малярнага скотча адзначце на сцяне доўгую гарызантальную лінію на ўзроўні вачэй. Прыкладна ў 50 см ад левага краю напішыце «2000 г. да н. э. », а ў 50 см ад правага – «2010 г.» (або бягучы год). Таксама адзначце даты 1000 г. да н. э., 0 г. і 1000 г. н. э.;
- На 4 стыкерах напішыце «Цывілізацыі ў Егіпце і Кітаі», «Росквіт асірыйскай, вавілонскай і мінойскай цывілізацый», «Рымская імперыя – галоўная сіла ў свеце» і «Каралеўствы Заходняй Еўропы і Візантыйская імперыя на ўсходзе».

## Інструкцыі

1. Пазнаёмце ўдзельнікаў з храналагічнай лініяй. Растлумачце, што каля 4000 г. назад (2000 г. да н. э.) у Егіпце і Кітаі квітнелі першыя цывілізацыі. Каля 1000 г. да н. э. прыйшла чарга асірыйскай, вавілонскай і мінойскай цывілізацый. На мяжы першага года нашай эры галоўнай сілай былі рымляне, у 1000 г. у Заходняй Еўропе паўстала шмат каралеўстваў, а Візантыйская імперыя правіла на большай частцы ўсходу. Адзначце сённяшнюю дату.
2. Растлумачце групе, што іх задача заключаецца ў тым, каб запоўніць гэту лінію падзеямі, якія звязаны з правамі чалавека. Гэта могуць быць даты нараджэння ці смерці людзей, якія стваралі законы ці прапаведавалі справядлівасць і змагаліся за яе, даты падзей, якія змянілі ўяўленні людзей аб правах і спрыялі прыняццю законаў і канвенцый, якія абараняюць правы людзей.

3. Раздайце ўсім удзельнікам стыкеры кожнага колеру. Растлумачце, што розныя колеры адносяцца да розных катэгорый. Напрыклад, сіні колер прызначаны для важных падзей, звязаных з правамі чалавека, жоўты – для важных асоб або ўстаноў, а зялёны – для важных дакументаў і законаў. Запішыце гэту інфармацыю на фліпчарце, каб удзельнікі не заблыталіся.
4. Растлумачце, што падзеі могуць быць мясцовымі, рэгіянальнымі, нацыянальнымі або міжнароднымі. Удзельнікі павінны прыступіць да індывідуальнай працы, спрабуючы ўспомніць аднаго чалавека, адну падзею і адзін закон або канвенцыю. Кожны з іх павінен напісаць дату і назву падзеі ці асобы на стыкеры адпаведнага колеру, а затым прыклеіць яго на храналагічную лінію.
5. Мэта заключаецца ў тым, каб кожны ўдзельнік прыклеіў тры стыкеры, а група ў цэлым прыклеіла на храналагічную лінію як мага больш падзей, дат і імён. Калі хто-небудзь убачыць, што яго ідэя ўжо размешчана на сцяне, яму трэба будзе ўспомніць нешта іншае. Калі нехта зойдзе ў тупік, можна звярнуцца да сяброў ці пашукаць інфармацыю ў Інтэрнэце.
6. Падкажыце ўдзельнікам, што яны могуць чэрпаць натхненне ў падзеях на сцяне. Не забараняйце, калі хтосьці захоча адзначыць больш за тры падзеі.
7. Калі ўсе справяцца, няхай уся група збярэцца ля сцяны і азнаёміцца са стыкерамі. Папрасіце кожнага патлумачыць свой выбар дат, імён і падзей.
8. Растлумачце, што на сёння праца з гэтым практыкаваннем скончана, і папрасіце ўсіх успомніць новыя даты, імёны і падзеі да наступнага занятку. Поўны аналіз і ацэнку правядзіце пасля яго.

## Аналіз і ацэнка

- Ці лёгка было знайсці інфармацыю для храналагічнай лініі? Якія крыніцы аказаліся карыснымі?
- Якія звесткі больш за ўсё зацікавілі, здзівілі або шакіравалі ўдзельнікаў? Чаму?
- Якія асноўныя сілы вызначалі развіццё правоў чалавека на працягу ўсёй гісторыі?
- Ці важна ведаць гісторыю правоў чалавека? Чаму?
- Якія новыя правы спатрэбяцца нам у будучыні?

## Парады для фасілітатараў

Калі ў групе ёсць спецыяліст па гісторыі, даручыце яму праверыць каляндар на дакладнасць.

Памятайце, што ў свеце існуе больш за 40 розных календароў, у тым ліку кітайскі, ісламскі, індуісцкі, яўрэйскі, персідскі і будыйскі, таму нельга выключаць блытаніны ў датах: напрыклад, 2010 год у хрысціянскім календары адпавядае 1431 году ў ісламскім календары. Гэту акалічнасць варта заўсёды мець на ўвазе і тлумачыць розніцу ў датах і календарах як праяву культурнай разнастайнасці.

## Варыянты

Падрыхтуйце карткі з датамі і падзеямі, пералічанымі ніжэй, і выкарыстайце іх для віктарыны. Зачытайце імя чалавека, падзею або закон і спытайце, хто можа назваць звязаную з імі дату. Затым замацуйце карткі на храналагічнай лініі правоў. Няхай гэтыя арыенціры стануць для групы крыніцай натхнення.

Папрасіце ўдзельнікаў знайсці выказванні вядомых людзей, прыклады дасягненняў у галіне музыкі, літаратуры і мастацтва, спартыўных мерапрыемстваў, якія спрыялі прапагандзе і сцвярджэнню правоў чалавека. Дадайце іх на сцяну.

Гэта практыкаванне можна правесці на адкрытай прасторы (у рамках семінара, у класе…); пры гэтым храналагічную лінію можна дапаўняць у любы час.

Гэты метад вельмі добра падыходзіць для дыскусіі, прысвечанай памяці і гісторыі народа. Неабходную інфармацыю можна знайсці ў Інтэрнэце па адпаведных пошукавых запытах, напрыклад «храналогія цыганоў-рама», «храналогія Арменіі» або «храналогія саамаў Лапландыі».

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**23 жніўня**
Міжнародны дзень памяці ахвяр гандлю рабамі і яго ліквідацыі

## Прапановы па далейшай працы

Выкарыстайце адну з дат вашага календара ў якасці падставы для аб'яднання намаганняў вашай групы і іншых груп з мэтай арганізацыі мерапрыемства па прапагандзе правоў чалавека.

Калі група захоча больш даведацца пра сучасных герояў барацьбы за правы чалавека, вы можаце выканаць з імі практыкаванне «Змагары за правы» на старонцы 167.

Калі група цікавіцца тым, як ідэі змяняюцца і развіваюцца з цягам часу, можна выканаць практыкаванне «Хутка састарэе» на старонцы 272.

## Ідэі для дзеяння

Праілюструйце храналагічную лінію правоў фатаграфіямі і малюнкамі і правядзіце выстаўку або падрыхтуйце ілюстраваную храналогію правоў для адкрытага мерапрыемства з удзелам прадстаўнікоў грамадскасці.

## Дадатковая інфармацыя

Кароткі спіс выбраных падзей, якія звычайна звязваюць з гісторыяй правоў чалавека:

**1760** г. да н. э. – цар Вавілона Хамурапі складае «Кодэкс Хамурапі» (высечаны на вялікім камені, кодэкс абяцае «зрабіць так, каб у каралеўстве панавала правасуддзе, … і садзейнічаць дабрабыту народа»);

**1440** г. да н. э. (прыблізна) – Тора Майсея дае плямёнам Ізраіля дзесяць запаведзяў, у тым ліку падрабязнае апісанне пакаранняў за парушэнне запаведзі «не забі»;

**528–486** г. да н. э. – у Індыі Буда прапаведуе маральнасць, павагу да жыцця, адмову ад гвалту і правільныя паводзіны;

**26–33** г. н.э. – Ісус Хрыстос прапаведуе маральнасць, цярпімасць, справядлівасць, дараванне і любоў;

**613–632** н. э. – прарок Магамет вучыць прынцыпам роўнасці, справядлівасці і спачування, якія выкладзены ў Каране;

**930** г. – у Ісландыі заснаваны альтынг – найстарэйшы парламенцкі інстытут у свеце;

**1215** г. – у Англіі падпісана Вялікая хартыя вольнасцей (гэты дакумент абмежаваў уладу караля і даў свабодным людзям права прыняць суд ад сваіх суграмадзян);

**1789** г. – падпісана французская Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна (Нацыянальная асамблея прымае дэкларацыю, якая гарантуе права на свабоду, роўнасць, уласнасць, бяспеку і супраціўленне прыгнёту);

**1791** г. – у Злучаных Штатах Амерыкі прыняты Біль аб правах (Кангрэс Злучаных Штатаў прымае Біль аб правах, які ўносіць папраўкі ў Канстытуцыю ЗША і гарантуе права на суд прысяжных, свабоду слова, веравызнання, сходаў і выказвання меркавання);

**1807** г. – прыняты брытанскі і амерыканскі законы супраць рабства;

**1859** г. – бітва пры Сальферына, якая натхніла Анры Дзюнана на стварэнне Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа і прывяла да прыняцця першай Жэнеўскай канвенцыі (па міжнародным гуманітарным праве);

**1863** г. – стварэнне Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа;

**1864** г. – прынята Жэнеўская канвенцыя;

**1899** г. – падпісана першая Гаагская канвенцыя. Разам з Жэнеўскімі канвенцыямі яна ўтварае аснову міжнароднага гуманітарнага права;

**1893** г. – Новая Зеландыя становіцца першай краінай у свеце, якая дае жанчынам права голасу;

**1945** г. – канец Другой сусветнай вайны;

**1945**г. – створана Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН) («… каб дадаткова ўмацаваць веру ў асноўныя правы чалавека, у годнасць і каштоўнасць чалавечай асобы…»);

**1948** г. – ААН прымае Ўсеагульную дэкларацыю правоў чалавека;

**1950** г. – Савет Еўропы прымае Еўрапейскую канвенцыю аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод;

**1961** г. – у выніку кампаніі ў абарону двух партугальскіх студэнтаў, прыгавораных да сямі гадоў турэмнага зняволення за тое, што сказалі тост за свабоду, была створана арганізацыя Amnesty International;

**1965** г. – прынята Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (уступіла ў сілу ў 1969 г.);

**1966** г. – прыняты Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (уступілі ў сілу ў 1976 г.);

**1969** г. – прынята Амерыканская канвенцыя па правах чалавека (уступіла ў сілу ў 1978 г.);

**1976** г. – у Саўэта ўспыхнула паўстанне, якое стала паваротным момантам вызваленчай барацьбы ў Паўднёвай Афрыцы;

**1979** г. – прынята Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (уступіла ў сілу ў 1981 г.);

**1981** г. – прынята Афрыканская хартыя правоў чалавека і народаў (прынята Арганізацыяй афрыканскага адзінства, якая цяпер завецца Афрыканскі саюз);

**1984** г. – прынята Канвенцыя супраць катаванняў (уступіла ў сілу ў 1987 г.);

**1989** г. – прынята Канвенцыя аб правах дзіцяці (уступіла ў сілу ў 1990 г.; гэта найбольш шырока ратыфікаваны дагавор па правах чалавека, яго не ратыфікавалі толькі ЗША і Самалі);

**1990** г. – прынята Каірская дэкларацыя правоў чалавека ў ісламе;

**1992** г. – канферэнцыя ААН па навакольным асяроддзі і развіцці прымае «Дэкларацыю Рыа-дэ-Жанэйра па навакольным асяроддзі і развіцці»;

**1990** г. – прынята Міжнародная канвенцыя аб абароне правоў усіх працаўнікоў-мігрантаў і членаў іх сем'яў (уступіла ў сілу ў 2003 г.);

**2007** г. – прынята Канвенцыя аб правах людзей з інваліднасцю (канвенцыя атрымала найбольшую колькасць падпісанняў сярод усіх канвенцый ААН у дзень адкрыцця для падпісання і ўступіла ў сілу ў маі 2008 г.).

http://www.gwu.edu/~erpapers/humanrights/timeline/
http://www.hreoc.gov.au/info_for_students/essentials/timeline/index.html

COMPASS

Дэмакратыя

Грамадзянскасць і ўдзел

Агульныя правы чалавека

Узровень 4

Любы памер групы

270 хвілін

# Галасаваць ці не галасаваць?

*Удзел у выбарах – святое таінства дэмакратыі.*

Тэадор Хезберг

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • дэмакратыя,<br>• грамадзянскасць і ўдзел,<br>• агульныя правы чалавека. |
| **Складанасць** | узровень 4 |
| **Памер групы** | любы памер групы |
| **Час** | 270 хвілін |
| **Агляд** | У практыкаванні прапануецца правесці ў супольнасці апытанне грамадскай думкі з мэтай вывучэння праблем галасавання на выбарах і грамадзянскага ўдзелу. |
| **Звязаныя правы** | • права на ўдзел у кіраванні краінай і ў свабодных выбарах;<br>• свабода перакананняў і выказвання меркавання;<br>• права на мірныя сходы і аб'яднанні. |
| **Мэты** | • навучыцца шанаваць магчымасць удзелу ў выбарах;<br>• развіць навыкі пошуку і крытычнага аналізу інфармацыі;<br>• навучыцца шанаваць асабісты ўклад кожнага грамадзяніна ў дэмакратыю. |
| **Матэрыялы** | • апытальныя лісты 1 і 2, па адным наборы на пару;<br>• копіі ўстаўкі 1 (інструкцыі па правядзенні апытання), па адной на пару;<br>• ручкі або алоўкі на кожнага ўдзельніка;<br>• аркушы паперы фармату А3 ці паперы для фліпчарта, маркеры;<br>• скотч. |
| **Падрыхтоўка** | • зрабіце копію ўстаўкі 2 (узор апытальнага ліста) на вялікім аркушы паперы ў якасці нагляднага дапаможніка;<br>• зрабіце копіі апытальных лістоў 1 і 2 на паперы для фліпчарта для падвядзення вынікаў;<br>• складзіце графік правядзення практыкавання; для першай часткі (уводзіны ў апытанне) спатрэбіцца 60 хвілін, для другой (сам працэс апытання) – 120 хвілін, для трэцяй (аналіз вынікаў, аналіз і ацэнка) – 90 хвілін. |

## Інструкцыі

**Частка 1. Уводзіны ў апытанне**

1. Растлумачце, што мэтай першай часткі занятку з'яўляецца падрыхтоўка да правядзення апытання грамадскай думкі аб прычынах удзелу ці няўдзелу ў галасаванні.
2. Спытайце ўдзельнікаў, ці збіраюцца яны галасаваць на бліжэйшых (можа быць, першых у іх жыцці) нацыянальных або мясцовых выбарах. Папрасіце ўсіх падняць рукі згодна з іх намерам і падзяліце ўдзельнікаў на дзве групы: тых, хто жадае галасаваць (А), і тых, хто не жадае (Б). Тых, хто вагаюцца, выпадкова размяркуйце па абедзвюх групах, каб атрымаць дзве больш-менш аднолькавыя па велічыні групы.
3. Дайце групам 15 хвілін на выкладанне сваіх аргументаў «за» і «супраць» удзелу ў выбарах на вялікіх аркушах паперы.
4. Збярыце ўсіх удзельнікаў разам і папрасіце прадстаўніка кожнай з груп зачытаць іх спіс. Дайце ўдзельнікам час для кароткага абмеркавання і ўнясення дадатковых аргументаў у спісы.

5. Раздайце копіі апытальных лістоў 1 і 2. Звярніце ўвагу ўдзельнікаў на вялікі ліст з наглядным кіраўніцтвам і падкрэсліце тое, што ліст 1 прызначаны для аргументаў тых, хто не галасуе, а ліст 2 – для тых, хто галасуе. Падкрэсліце, што змест абодвух лістоў супадае, за выключэннем другога пытання, якое ў абодвух лістах сфармулявана па-рознаму. Зачытайце пытанні, каб пераканацца, што ўсе ўсё зразумелі.
6. Цяпер растлумачце метад уліку адказаў. Пакажыце групе ўзор і растлумачце, як карыстацца метадам «пяці рысак» для ўліку.
7. Раздайце кожнай пары інструкцыі па правядзенні апытання. Зачытайце іх і абмяркуйце:
   - Якім чынам удзельнікі збіраюцца забяспечыць сапраўды выпадковы выбар рэспандэнтаў?
   - Колькі рэспандэнтаў павінна апытаць кожная пара (чым больш, тым лепш!)?
   - Дзе і калі будзе праводзіцца апытанне?
   - Калі апытанне будзе завершана?
   - Калі трэба вярнуцца для абмеркавання вынікаў?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**18 сакавіка**
Першыя ў Еўропе парламенцкія выбары шляхам усеагульнага галасавання прайшлі ў Фінляндыі ў 1917 годзе

**Частка 2. Апытанне**

1. Пераканайцеся, што кожны ўдзельнік зразумеў свае задачы, і прыступайце да апытання.
2. Узгадніце час вяртання.

**Частка 3. Аналіз вынікаў**

Пары збіраюцца разам, каб супаставіць, прааналізаваць і абмеркаваць атрыманыя вынікі. На гэта даецца 60 хвілін.

1. Папрасіце пары падсумаваць свае вынікі ў кожнай графе і адлюстраваць іх у дзвюх вялікіх табліцах. Гэта дазволіць арганізаваць усе даныя і падлічыць агульны вынік для ўсёй групы. Таксама варта запісаць прычыны, названыя рэспандэнтамі. Калі адну і тую ж прычыну называлі некалькі разоў, падлічыце, колькі канкрэтна, выкарыстоўваючы, зноў жа, метад «пяці рысак».
2. Калі ўся інфармацыя будзе ўнесена ў табліцы, папрасіце ўсіх падлічыць наступнае:
   - агульная колькасць апытаных;
   - працэнтныя долі тых, хто галасуе, і тых, хто не галасуе, ад агульнай колькасці апытаных;
   - працэнтныя долі апытаных мужчын і жанчын;
   - працэнтныя долі ўзроставых груп;
   - узроставая група, у якой было менш за ўсё тых, хто галасуе;
   - узроставая група, у якой было больш за ўсё тых, хто галасуе;
   - самыя распаўсюджаныя аргументы на карысць адмовы ад галасавання;
   - самыя распаўсюджаныя аргументы на карысць галасавання;
   - якіх аргументаў (і «за», і «супраць» галасавання) было больш: звязаных з асобамі або з партыямі?
3. Цяпер прыступайце да абмеркавання таго, наколькі практыкаванне спадабалася ўдзельнікам і што новага яны даведаліся.

## Аналіз і ацэнка

У ходзе агульнага абмеркавання вынікаў вы можаце падняць, напрыклад, наступныя пытанні:

- Якія ў групы склаліся адчуванні падчас правядзення апытання? У цэлым, наколькі ахвотна людзі адказвалі на пытанні?
- Ці цяжка было праводзіць апытанне? Ці спадабалася ім рабіць гэта?
- Ці атрымалася групе сабраць «рэпрэзентатыўную» выбарку насельніцтва ў цэлым? З якімі цяжкасцямі яны пры гэтым сутыкнуліся?
- Чаму цяжка рабіць высновы на падставе вынікаў груп і як гэтых цяжкасцей можна пазбегнуць?
- Якія з атрыманых статыстычных даных асабліва здзівілі групу?
- Што ў выніках апытання аказалася для ўдзельнікаў колькі-небудзь нечаканым?

Галасаваць ці не галасаваць?

- Ці супадаюць адказы рэспандэнтаў з меркаваннямі ў групе? Ці можна лічыць групу «рэпрэзентатыўнай выбаркай» насельніцтва?
- Што група зрабіла б інакш пры паўторным правядзенні апытання? Ці былі дапушчаны памылкі?
- Ці адлюстроўваюць вынікі апытання рэальную карціну адносін да галасавання ў вашай супольнасці? Чаму? Чаму не?
- Ці можна давяраць вынікам, або іх можна лічыць толькі арыенціровачнымі?
- На статыстычныя даныя часта спасылаюцца як на факты ў пацвярджэнне таго ці іншага аргумента. Наколькі асцярожна трэба ставіцца да статыстыкі?
- Якога меркавання наконт неабходнасці (або непатрэбнасці) удзелу ў галасаванні зараз прытрымліваецца група? Ці змяніў хто-небудзь з членаў групы сваё меркаванне ў той ці іншы бок? Калі так, то пад уплывам якіх аргументаў?
- Ці з'яўляецца ўдзел у выбарах правам чалавека? Як дэмакратыя замацавана ў дакументах аб правах чалавека?



## Парады для фасілітатараў

Частка 1 (планаванне апытання) служыць падрыхтоўкай да часткі 2 (самога апытання). Ужо з самага пачатку вы можаце падкрэсліць, што мэта занятку заключаецца ў тым, каб даць моладзі магчымасць усвядоміць каштоўнасць непасрэднага ўдзелу ў дэмакратычным працэсе. Мэтазгодна рабіць упор менавіта на гэтым, а не на «перакананні» ў важнасці ўдзелу ў галасаванні. Растлумачце, што вы хацелі б, каб у канцы занятку кожны ўдзельнік прыняў асабістае рашэнне, але для гэтага ім трэба азнаёміцца з усёй разнастайнасцю прычын удзелу ў галасаванні, якія існуюць.

Паспрабуйце зрабіць абмеркаванне прычын, па якіх людзі галасуюць ці не галасуюць (пункт 4), максімальна «аб'ектыўным», не імкнучыся да таго, каб тыя, хто галасуе, пераканалі тых, хто не галасуе. Не марнуйце шмат часу на гэтым этапе – ён накіраваны выключна на тое, каб падрыхтаваць глебу для апытання.

Калі вы будзеце абмяркоўваць канкрэтныя спосабы правядзення апытання (пункт 7), памятайце аб цяжкасцях, з якімі група можа сутыкнуцца. Камусьці можа не спадабацца, што незнаёмыя людзі падыходзяць да яго з пытаннямі на вуліцы. У такім выпадку групам можна параіць правесці апытанне сярод сваіх сяброў ці знаёмых.

Вельмі важна рэальна ацаніць, які аб'ём інфармацыі можа быць апрацаваны ў працэсе аналізу. Не імкніцеся сабраць вельмі шмат даных, інакш вы патонеце ў падліках. Калі група вялікая, кожная пара можа апытаць менш людзей, чым ёй давялося б апытаць у складзе невялікай групы.

**Узор запаўнення ліста**

***Апытальны ліст 1. Тыя, хто не галасуе***

Пытанне 1. Ваша ўзроставая група? (Адказваць неабавязкова)

| | Маладзей за 25 гадоў | 25–40 гадоў | 40–60 гадоў | Старэй за 60 гадоў | Адмовіліся паведаміць |
|---|---|---|---|---|---|
| Мужчыны | ~~IIII~~ ~~IIII~~ II | ~~IIII~~ ~~IIII~~ II | ~~IIII~~ ~~IIII~~ II | ~~IIII~~ II | ~~IIII~~ ~~IIII~~ II |
| Жанчыны | ~~IIII~~ II | II | ~~IIII~~ II | II | II |

Пытанне 2. Якая была галоўная прычына вашага няўдзелу ў галасаванні на папярэдніх выбарах?

| Я думаў, што гэта ніяк не паўплывае на вынік | Не было кандыдата, за якога я хацеў бы аддаць свой голас | Я не падтрымліваю палітыку ніводнай партыі | Мяне ўсё гэта не цікавіць | Іншыя прычыны (назваць якія) |
|---|---|---|---|---|
| ~~IIII~~ ~~IIII~~ II | ~~IIII~~ II | ~~IIII~~ ~~IIII~~ ~~IIII~~ ~~IIII~~ II | ~~IIII~~ | Мяне ў той час не было дома.<br>Я не давяраю палітыкам.<br>Мяне папрасілі не галасаваць. |

## Прапановы па далейшай працы

Азнаёмцеся з дадатковай інфармацыяй аб дэмакратыі ў главе 5 на сайце www.coe.int/compass, а таксама даведайцеся, калі ў вашай краіне жанчыны ўпершыню атрымалі права голасу. Таксама даведайцеся, якія групы насельніцтва (дзеці, імігранты, зняволеныя і г. д.) не маюць такога права. Абмяркуйце прычыны і справядлівасць такога становішча.

Таксама можна арганізаваць дэбаты з іншымі групамі або школамі аб неабходнасці змены ўзросту, з якога маладыя людзі атрымліваюць права голасу.

У дэмакратычным грамадстве ў грамадзян ёсць шмат магчымасцей адстойваць свае інтарэсы па пытаннях, якія іх закранаюць. Практыкаванне пад назвай «Электрастанцыя» на старонцы 251 дасць удзельнікам магчымасць падумаць пра шляхі ажыццяўлення змен у грамадстве.

## Ідэі для дзеяння

Арганізуйце святкаванне дня, у які жанчынам у вашай краіне далі права голасу.

Калі вы высветлілі, што ў вас у краіне ёсць групы насельніцтва, пазбаўленыя права голасу, і вы лічыце, што гэта несправядліва, напішыце пісьмо свайму дэпутату парламента з выказваннем заклапочанасці па гэтым пытанні. Паспрабуйце знайсці аднадумцаў, якія маглі б таксама падпісаць ваша пісьмо.

## Дадатковая інфармацыя

Вас можа зацікавіць інфармацыя пра «кропкавую дэмакратыю» (dotmocracy) як спосаб стымулявання ўдзелу шляхам галасавання. Кропкавая дэмакратыя як працэс прыняцця рашэнняў групай пры роўных магчымасцях і ўдзеле яе членаў з'яўляецца правераным метадам, якія спрашчае збор і вызначэнне прыярытэтных ідэй сярод вялікай групы насельніцтва. Удзельнікі запісваюць свае ідэі і прастаўляюць кропкі пад тымі, якія ім больш падабаюцца. У канчатковым выніку атрымліваецца візуальная прэзентацыя калектыўных пераваг групы ў выглядзе графіка (http://www.dotmocracy.org/).

## Раздатачныя матэрыялы

**Рэкамендацыі па правядзенні апытання**

***Каго апытваць***

Адбор кандыдатаў для апытання павінен быць выпадковым, г. зн., што нельга «выбіраць» таго ці іншага рэспандэнта з-за таго, што чалавек «маладога ўзросту», «старога ўзросту», «добра выглядае», «жаночага полу» і г. д. Паспрабуйце пазбегнуць прадузятасці.

Спытайце ў чалавека, ці не супраць гэты чалавек адказаць на некалькі пытанняў на ўмовах ананімнасці, і растлумачце, што вынікі апытання не будуць нідзе публікавацца і будуць выкарыстоўвацца толькі гэтай групай.

***Запіс адказаў***

Калі рэспандэнт згодны, спытайце, ці скарыстаў чалавек (ён/яна/яны) сваё права голасу на апошніх выбарах. Калі адказ адмоўны, запаўняйце ліст 1 (для тых, хто не галасаваў). Калі адказ станоўчы, запаўняйце ліст 2 (для тых, хто галасаваў).

> **Па пытанні 1**. Рэспандэнт можа назваць свой узрост толькі па ўласным жаданні. Калі чалавек не хоча гэтага рабіць, стаўце птушку ў апошняй калонцы.
> **Па пытанні 2.** Прапануйце рэспандэнту магчымыя варыянты адказу і папрасіце выбраць адзін з іх. Калі чалавек назаве іншую прычыну, упішыце яе ў калонку «Е». Заўвага: розніца паміж калонкамі «В» і «С» у тым, што ў «В» ідзе гаворка аб канкрэтных асобах, а ў «С» – аб партыях.

Адзнакі павінны быць акуратнымі, каб потым іх лягчэй было падлічыць. Паспрабуйце змясціць адказы як мага большай колькасці рэспандэнтаў на адным лісце. Па кожным агучаным пытанні можна зрабіць толькі адну адзнаку.

## Апытальны ліст 1. Тыя, хто не галасуе

**Пытанне 1. Ваша ўзроставая група? (Адказваць неабавязкова)**

| | Маладзей за 25 гадоў | 25–40 гадоў | 40–60 гадоў | Старэй за 60 гадоў | Вырашылі не гаварыць |
|---|---|---|---|---|---|
| МУЖЧЫНЫ | | | | | |
| ЖАНЧЫНЫ | | | | | |

**Пытанне 2. Якая была галоўная прычына вашага няўдзелу ў галасаванні на папярэдніх выбарах?**

A. Я думаў, што гэта ніяк не паўплывае на вынік.
B. Не было кандыдата, за якога я хацеў бы аддаць свой голас.
C. Я не падтрымліваю палітыку ніводнай партыі.
D. Мяне ўсё гэта не цікавіць.
E. Іншая прычына (назваць якая).

| A | B | C | D | E |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

## Апытальны ліст 2. Тыя, хто галасуе

**Пытанне 1. Ваша ўзроставая група? (Адказваць неабавязкова)**

| | Маладзей за 25 гадоў | 25–40 гадоў | 40–60 гадоў | Старэй за 60 гадоў | Адмовіліся паведаміць |
|---|---|---|---|---|---|
| МУЖЧЫНЫ | | | | | |
| ЖАНЧЫНЫ | | | | | |

**Пытанне 2. Якая была галоўная прычына вашага ўдзелу ў галасаванні на папярэдніх выбарах?**

A. Я лічу гэта сваім дэмакратычным абавязкам.
B. Я хацеў аддаць свой голас за [пэўнага кандыдата].
C. Я хацеў аддаць свой голас за [пэўную партыю].
D. Я не хацеў, каб перамог нехта яшчэ [іншы кандыдат ці іншая партыя].
E. Іншая прычына (назваць якая).

| A | B | C | D | E |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

COMPASS

Праца

Дэмакратыя

Грамадзянскасць і ўдзел

Узровень 3

10–15 чалавек

120 хвілін

# Пасяджэнне прафсаюза

*За добрую працу належыць адпаведная аплата!*

**Тэмы**
- праца,
- дэмакратыя,
- грамадзянскасць і ўдзел.

**Складанасць** узровень 3

**Памер групы** 10–15 чалавек

**Час** 120 хвілін

**Агляд** Гэта практыкаванне ўяўляе сабой мадэліраванне перагавораў аб памеры заработнай платы і ўмовах працы паміж працадаўцам і працаўнікамі з удзелам прадстаўнікоў прафсаюза. Сярод іншых абмяркоўваюцца наступныя пытанні:
- роля прафсаюзаў;
- калектыўныя перагаворы на рабочым месцы;
- правы рабочых.

**Звязаныя правы**
- права на працу;
- права на справядлівыя ўмовы працы;
- права на стварэнне прафсаюзаў і ўступленне ў іх, права на забастоўку.

**Мэты**
- пашырыць разуменне працы і ролі прафсаюзаў у грамадзянскай супольнасці;
- развіць навыкі прыняцця рашэнняў метадам кансэнсусу;
- спрыяць актыўнаму ўдзелу ў жыцці грамадства, развіццю пачуцця адказнасці і салідарнасці.

**Матэрыялы**
- копіі раздатачнага матэрыялу 1 «Сітуацыя», па адной на кожнага ўдзельніка;
- копіі раздатачнага матэрыялу 2 «Кароткі гласарый па тэрміналогіі працоўных адносін», па адной на кожнага ўдзельніка;
- біркі для распазнавання (па жаданні);
- папера, каляровыя маркеры і ручкі (па жаданні);
- два памяшканні (пажадана, але неабавязкова).

**Падрыхтоўка**
- Прачытайце апісанне практыкавання, у тым ліку раздатачныя матэрыялы, каб быць гатовым адказаць на пытанні гульцоў;
- Падрыхтуйце пакой. Расстаўце ў круг пяць крэслаў для прадстаўнікоў бакоў, якія ўдзельнічаюць у перагаворах, і для старшыні пасяджэння. За імі расстаўце крэслы для астатніх удзельнікаў.

## Інструкцыі

1. Раскажыце пра практыкаванне: растлумачце, што яно прадугледжвае інсцэніроўку сустрэчы працадаўцаў, з аднаго боку, з працаўнікамі і прадстаўнікамі прафсаюза – з другога. Канчатковая мэта сустрэчы – дасягнуць пагаднення па пытаннях зарплаты і ўмоў працы працаўнікоў шляхам калектыўных перагавораў.
2. У якасці размінкі папрасіце групу вырашыць, якой будзе назва кампаніі і ў якой галіне яна будзе дзейнічаць. Гэта можа быць рэальная ці выдуманая кампанія, якая вырабляе рэальную ці выдуманую прадукцыю. Няхай удзельнікі прыдумаюць назву і для прафсаюза.
3. Падзяліце ўдзельнікаў на дзве групы ў адносінах 2:1. Меншая група будзе прадстаўляць працадаўцаў, а большая – працаўнікоў і прадстаўнікоў прафсаюза.

4. Раздайце ўдзельнікам копіі матэрыялу 1 «Сітуацыя» і матэрыялу 2 «Кароткі гласарый па тэрміналогіі працоўных адносін». Дайце ўдзельнікам 10 хвілін на азнаямленне з матэрыяламі, затым пераканайцеся, што ўсе іх зразумелі.
5. Коратка абмалюйце, як будзе праходзіць інсцэніроўка. Пасяджэнне арганізавалі працадаўцы, адзін з якіх старшынствуе на ім. Яны першыя выкладуць сваю прапанову, затым настане чарга прафсаюза і працаўнікоў. Пасля гэтага бакі павінны пастарацца прыйсці да пагаднення.
6. Папрасіце ўдзельнікаў узгадніць рэгламент сустрэчы, напрыклад, ці варта абмяжоўваць выступленні ў ходзе перагавораў па часе, скажам, дзвюма хвілінамі? Якая будзе агульная працягласць сустрэчы? Ці будуць кароткія перапынкі для кансультацый прадстаўнікоў з тымі, каго яны прадстаўляюць, і г. д. Хто ўвогуле мае права выступаць акрамя прадстаўнікоў?
7. Пасля высвятлення ўсіх дэталей папрасіце ўдзельнікаў разысціся па сваіх групах для падрыхтоўкі да перагавораў (30 хвілін). Працадаўцы павінны выбраць двух прадстаўнікоў і старшыню пасяджэння. Работнікі і прафсаюз павінны выбраць двух прадстаўнікоў. Затым абедзве групы павінны:
   - распрацаваць новую прапанову і прадставіць яе на пасяджэнні;
   - вызначыць паўнамоцтвы сваіх прадстаўнікоў па вядзенні перагавораў;
   - дамовіцца аб мінімальных патрабаваннях, г. зн. аб найгоршым варыянце і мінімальных умовах, на якія яны будуць гатовы пайсці.
8. Калі групы падрыхтуюцца, запрасіце іх прадстаўнікоў сесці ў пяць крэслаў, якія стаяць кругам, а астатніх – заняць месцы за імі. Дайце старшыні знак адкрыць пасяджэнне.
9. Пасля завяршэння перагавораў зрабіце невялікі перапынак, каб удзельнікі маглі выйсці з роляў, і пераходзьце да аналізу і ацэнкі.

## Аналіз і ацэнка

Спачатку даведайцеся, ці спадабалася ўдзельнікам практыкаванне, а затым пераходзьце да абмеркавання таго, што адбылося і што новага яны даведаліся:

- Як дзве групы супрацоўнічалі, каб прыняць рашэнне па сваіх першапачатковых прапановах? Складана ім было ці лёгка?
- Ці ўлічвалі групы толькі свае ўласныя інтарэсы пры распрацоўцы першапачатковых прапаноў або таксама прымалі да ўвагі інтарэсы кампаніі?
- Ці распрацавалі групы канкрэтную тактыку вядзення перагавораў?
- Як прайшло пасяджэнне? Ці ўсе жадаючыя мелі магчымасць выказацца?
- Ці здолелі бакі прыйсці да ўзаемапрымальнага рашэння?
- Права быць членам прафсаюза – гэта прызнанае права чалавека. Наколькі важнае гэта права? Якімі былі б наступствы адсутнасці гэтага права?
- Наколькі добра людзі ведаюць, што такое прафсаюзы і чым яны займаюцца?
- Наколькі моцныя прафсаюзы ў вашай краіне? Ці ёсць у вас арганізацыі працадаўцаў?
- Ці ёсць сярод удзельнікаў члены прафсаюзаў? Чаму яны ўступілі ў прафсаюз? У чым плюсы і мінусы такога рашэння?

## Парады для фасілітатараў

Перш чым праводзіць гэта практыкаванне, неабходна высветліць грамадскае меркаванне і агульнае стаўленне да прафсаюзаў у вашай краіне. Напрыклад, гэта ідэя можа сустрэць супраціўленне ў былых сацыялістычных краінах, дзе яшчэ памятаюць той час, калі прафсаюзы абвяшчаліся «школай камунізму». У такім выпадку, магчыма, варта пачаць практыкаванне з разбору ўяўленняў і стэрэатыпаў аб прафсаюзах у грамадстве. Вы таксама можа папрасіць удзельнікаў звязацца з мясцовай прафсаюзнай арганізацыяй, каб атрымаць інфармацыю з першых рук, і правесці дадатковыя даследаванні па праблемах працоўных адносін у іх краіне. Акрамя таго, можаце падкрэсліць важнасць і актуальнасць прафсаюзаў у абароне правоў працаўнікоў незалежна ад палітычнай сістэмы.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**1 мая**
Дзень міжнародный салідарнасці рабочых

Пасяджэнне прафсаюза

У залежнасці ад групы можа спатрэбіцца даць дадатковыя рэкамендацыі па працэсе вядзення калектыўных перагавораў. Вы можаце даць удзельнікам некалькі падказак па асноўных пытаннях, якія варта ўлічыць падчас распрацоўкі пазіцый і прапаноў, напрыклад:

- Ці згодны працаўнікі адмовіцца ад павышэння зарплаты ў інтарэсах захавання ўсіх працоўных месцаў?
- Звальненне якіх катэгорый працаўнікоў было б прымальным у выпадку непазбежнасці скарачэння штату?
- Ці рэалістычныя вашы прапановы? Ці не пацягнуць яны за сабой занадта цяжкія эканамічныя наступствы для кампаніі?

Дайце сустрэчы і перагаворам ісці сваім парадкам. Калі, напрыклад, працаўнікі і прафсаюзы лічаць мэтазгодным аб'явіць забастоўку для дасягнення сваіх мэт, забяспечце іх фламастарамі і паперай, каб яны маглі падрыхтаваць плакаты для ўдзельнікаў пікета. Калі ж працадаўцы вырашаць не дапускаць рабочых да працы, г. зн. абвясціць лакаўт, падрыхтуйце другі пакой, куды маглі б пайсці рабочыя.

У большасці краін Еўропы калектыўныя перагаворы рэгламентуюцца законам. Можа быць, мае сэнс знайсці тэкст такога закона і зрабіць копіі яго важнейшых артыкулаў, каб удзельнікі маглі рэалізаваць увесь патэнцыял гэтага практыкавання.

## Варыянты

Яшчэ адным прыкладам сітуацыі, якая патрабуе перагавораў аб правах, з'яўляецца пасяджэнне ў школе, прысвечанае канфлікту з-за «праблемнага» навучэнца. У пасяджэнні могуць прыняць удзел навучэнец і яго бацькі, з аднаго боку, і дырэктар разам з прадстаўнікамі школьнай адміністрацыі і бацькоўскага камітэта – з другога.

## Прапановы па далейшай працы

Запрасіце прадстаўніка прафсаюза выступіць перад удзельнікамі. Тэлефоны прафсаюзаў вы знойдзеце ў мясцовым тэлефонным даведніку. Як правіла, прафсаюзы з гатоўнасцю адгукаюцца на такія просьбы, імкнучыся быць бліжэй да моладзі, і гэта стане для вас цудоўнай магчымасцю!

Калі групе спадабалася абмяркоўваць такія ідэі, ёй можа прыйсціся даспадобы практыкаванне «Дзе вы стаіце?», у якім удзельнікі павінны адстойваць свае погляды па цэлым шэрагу пытанняў, звязаных з правамі чалавека.

## Ідэі для дзеяння

Знайдзіце інфармацыю аб правах працоўных у вашай краіне. Незалежна ад таго, поўная ў вас занятасць ці вы зарабляеце на «кішэнныя» выдаткі, няпоўны ў вас працоўны дзень або вы рабочы-студэнт ці заняты на летніх работах, пацікаўцеся, якія ў вас ёсць правы, напрыклад права на больш высокую аплату начной працы або працы ў выхадныя дні, права быць добрасумленным падаткаплацельшчыкам, права на страхаванне, на выкарыстанне належнага абсталявання і г. д.; таксама вывучыце заканадаўства аб ахове здароўя і бяспекі.

Распрацуйце разам з мясцовым прафсаюзам праект з мэтай папулярызацыі прафсаюзнага руху сярод моладзі.

## Дадатковая інфармацыя

Міжнародная канфедэрацыя прафсаюзаў (МКП) прадстаўляе інтарэсы 176 мільёнаў працаўнікоў у 151 краіне і адміністрацыйнай тэрыторыі і мае 301 нацыянальны філіял. Яна штогод расследуе выпадкі парушэння прафсаюзных правоў і публікуе падрабязныя справаздачы пра выпадкі абмежавання правоў, напрыклад, на ўступленне ў прафсаюзы, на забастоўкі, на вядзенне калектыўных перагавораў і абарону працаўнікоў ва ўсіх краінах свету, уключаючы многія краіны Еўропы. Гл. www.ituc-csi.org.

23 сакавіка 2010 г. МКП распачала кампанію з мэтай звязаць прафсаюзную дзейнасць ва ўсім свеце з працаўладкаваннем моладзі і яе ўдзелам у розных арганізацыях. У новай Маладзёжнай кампаніі выкарыстоўваецца шырокі набор інструментаў, уключаючы відэапрадукцыю, сацыяльныя сеткі, плакаты і вэб-сайты, а таксама спецыяльнае кіраўніцтва па правядзенні кампаніі.

Больш звестак аб удзеле моладзі ў прафсаюзах можна знайсці ў раздзеле дадатковай інфармацыі па тэме працы ў главе 5 на сайце www.coe.int/compass.

**Заўвага.**
Гэта практыкаванне падрыхтавана пры ўдзеле брытанскага прафсаюза GMO, Еўрапейскага прафсаюзнага каледжа (ETUCO) і Асацыяцыі па еўрапейскай падрыхтоўцы рабочых да ўздзеяння новых тэхналогій (AFETT).

## Раздатачныя матэрыялы

**Раздатачны матэрыял 1. Сітуацыя**

Дзеянне адбываецца на пасяджэнні з удзелам працадаўцаў і працаўнікоў, а таксама прадстаўнікоў прафсаюза, чые спробы прыйсці да згоды па пытанні аб павышэнні заработнай платы зайшлі ў тупік.

Фабрыка працуе кругласутачна 365 дзён у год. На прадпрыемстве налічваецца 1000 працаўнікоў, у тым ліку кіраўніцтва. Усе рабочыя – члены прафсаюза.

Фірма перажывае фінансава-эканамічныя цяжкасці, але банкруцтва ёй пакуль не пагражае. Прыбыткі застаюцца высокімі, але за апошні год з-за спаду ў галіне пайшлі на спад і яны. За апошнія тры гады рэальная зарплата знізілася на 3 %, колькасць занятых скарацілася на 10 %.

Работнікі патрабуюць павышэння зарплаты адпаведна павышэнням у іншых галінах прамысловасці.

Кіраўніцтва ў сваю чаргу заявіла, што любое павышэнне зарплаты пацягне за сабой скарачэнне штату. Яно прапанавала работнікам і прафсаюзу абмеркаваць наступны варыянт:

- павышэнне стаўкі зарплаты па індывідуальных кантрактах на 4 % (бягучая інфляцыя складае 2 % у год) на працягу года;
- налічэнне зарплаты, зыходзячы з колькасці гадзін, адпрацаваных за год, а не за дзень ці тыдзень, і адмена звышурочнай працы;
- скарачэнне штату (на 10 % у першую чаргу за кошт сумяшчальнікаў, занятых няпоўны час і стажораў па прынцыпе «апошнім наняты – першым звольнены») і звальненне па ўласным жаданні.

Прапанову кіраўніцтва агульны сход працаўнікоў адхіліў, асцерагаючыся значнага пагаршэння ўмоў (на той час у 40 % працаўнікоў плата за звышурочныя складала значную частку зарплаты). Прафсаюзы і працаўнікі прадставілі сустрэчную прапанову:

- павысіць стаўкі на 9 % за два гады;
- звышурочныя і прэміяльныя пакінуць без змен;
- штат не скарачаць, а любых працаўнікоў, звольненых па скарачэнні штатаў, адправіць на перападрыхтоўку за кошт прадпрыемства;
- калі кампанія не задаволіць патрабаванні, працаўнікі пачнуць забастоўку.

Гэта сустрэчная прапанова была адхілена кіраўніцтвам, якое сцвярджала, што прапанаваныя прафсаюзам і працаўнікамі захады не вырашаюць праблем кампаніі.

Перамовы працягваюцца ўжо два месяцы.

Палітыка кампаніі прадугледжвае правядзенне спецыяльнага пасяджэння з удзелам усіх зацікаўленых бакоў у выпадку недасягнення згоды за два месяцы. Менавіта гэта пасяджэнне і з'яўляецца тэмай інсцэніроўкі. На ім абодва бакі павінны прадставіць новыя, рэалістычныя прапановы, каб закласці аснову для дасягнення ўзаемапрымальнага пагаднення.

Усяго за сталом перагавораў павінна знаходзіцца пяць чалавек: два прадстаўнікі кіраўніцтва, старшыня пасяджэння (прызначаны працадаўцамі) і два прадстаўнікі прафсаюза. Паколькі спецыяльнае пасяджэнне праходзіць адкрыта, на ім могуць прысутнічаць усе працаўнікі.

**Раздатачны матэрыял 2. Кароткі гласарый па тэрміналогіі працоўных адносін**

| | |
|---|---|
| **Калектыўныя перагаворы**: | Гэта працэс перагавораў, падчас якога прадстаўнікі працадаўцаў і працаўнікоў імкнуцца сумеснымі намаганнямі дасягнуць пагаднення і вырашыць такія пытанні, як памер заработнай платы і ўмовы працы. |
| **Лакаўт**: | Адзін з самых радыкальных спосабаў праяўлення ўлады працадаўца. Пры лакаўце працадавец забараняе работнікам з'яўляцца на працоўным месцы, г. зн., літаральна пакідае іх за дзвярыма прадпрыемства, спрабуючы прымусіць іх прыняць свае патрабаванні. |
| **Скарачэнне штату**: | Скарачэнне штату адбываецца тады, калі працаўнікоў звальняюць з прычыны рашэння працадаўцы спыніць свой бізнес. Звольненыя па скарачэнні могуць мець права на адпаведныя выплаты ў якасці кампенсацыі. |
| **Выхадная дапамога**: | Калі пастаянны працаўнік звольнены несправядліва ці з прычыны рэарганізацыі кампаніі, ён мае права на атрыманне кампенсацыі, названай выхадной дапамогай. Памер выхадной дапамогі звычайна вызначаецца, зыходзячы з былой зарплаты працаўніка, напрыклад, яна можа быць роўнай тыднёвай зарплаце, памножанай на колькасць прапрацаваных гадоў. |
| **Забастоўка**: | Права на забастоўку з'яўляецца асноўным сацыяльным правам чалавека, якое разглядаецца як неабходны элемент паспяховых калектыўных перагавораў і сродак ураўнаважвання першапачаткова няроўных адносін паміж працадаўцам і работнікам. Забастоўка – гэта адмова працаўнікоў ад выканання работы або стварэнне перашкод для яе выканання. Рабочыя не могуць абвясціць забастоўку, калі ім захочацца. Для гэтага ім неабходна выканаць шэраг умоў, якія звычайна апісваюцца ў заканадаўстве і адрозніваюцца ад краіны да краіны. |
| **Прафсаюз**: | Прафсаюз – гэта аб'яднанне, якое існуе для абароны інтарэсаў працаўнікоў, уключаючы ў пытаннях аплаты і ўмоў працы. Прафсаюз звычайна прадстаўляе рабочых на перагаворах з працадаўцамі. У многіх краінах прафсаюзы аб'яднаны ў канфедэрацыі. |

# Гвалт у маім жыцці

*Кіруйцеся трыма асноўнымі прынцыпамі: павага да сябе, павага да іншых, адказнасць за ўсе свае дзеянні.*

Далай-лама

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • мір і гвалт,<br>• вайна і тэрарызм,<br>• здароўе. |
| **Складанасць** | узровень 3 |
| **Памер групы** | любы памер групы |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Агляд** | Падчас выканання гэтага практыкавання ўдзельнікі абмяркоўваюць свой асабісты вопыт, звязаны з міжасабовым гвалтам. |
| **Звязаныя правы** | • права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць;<br>• свабода думкі, сумлення і перакананняў;<br>• свабода ад катаванняў і зневажальнага абыходжання. |
| **Мэты** | • паглыбіць веды і разуменне таго, што значыць быць аб'ектам гвалту, высветліць прычыны гвалту;<br>• спрыяць развіццю навыкаў станоўчага пераадолення сітуацый, звязаных з гвалтам;<br>• развіць каштоўнасці цярпімасці і адказнасці. |

Мір і гвалт

Вайна і тэрарызм

Здароўе

Узровень 3

Любы памер групы

90 хвілін

## Інструкцыі

1. Растлумачце ўдзельнікам, што гэта практыкаванне – магчымасць для іх падзяліцца сваімі пачуццямі і думкамі аб міжасабовым гвалце ў тых выпадках, калі гвалт прымяняўся супраць іх і калі яны самі ўжывалі гвалт.
2. Прасачыце за тым, каб усе ўдзельнікі зразумелі і запомнілі правілы ўдзелу ў групавой працы: да кожнага варта ставіцца з павагай, усё, што будзе сказана, павінна заставацца канфідэнцыяльным, нікога нельга прымушаць гаварыць тое, што паставіць яго ў няёмкае становішча.
3. Правядзіце кароткі мазгавы штурм для абмеркавання паняцця «гвалт» і папрасіце ўдзельнікаў прывесці прыклады гвалту з паўсядзённага жыцця, напрыклад славесныя абразы, крыўдныя насмешкі і сарказм, спробы прайсці без чаргі, відавочна бесцырымонныя паводзіны, шлёпанне дзіцяці або больш моцныя ўдары каму-небудзь, запалохванне з боку банд, рабаванне, дробны крадзеж або кішэнныя крадзяжы, вандалізм і г. д.
4. Папрасіце ўсіх на працягу 5 хвілін успомніць эпізоды са свайго асабістага жыцця, калі:
   a) хтосьці ўжываў гвалт супраць іх;
   b) яны ўжывалі гвалт супраць іншых;
   c) калі яны станавіліся сведкамі гвалту, але не ўмешваліся.
5. Папрасіце добраахвотнікаў прывесці прыклады са свайго асабістага вопыту і абмяркуйце іх з групай. Няхай яны раскажуць, што адбылося і што яны адчуваюць у сувязі з гэтым. Пажадана прывесці па два прыклады ў кожнай з катэгорый – «a», «b» і «c».
6. Каратка запішыце сутнасць інцыдэнтаў на фліпчарце.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з кароткага абмеркавання практыкавання ў цэлым, спытайце, ці было яно складаным і чаму. Пасля гэтага прааналізуйце прычыны і вынікі розных інцыдэнтаў.

- Чаму ўзнікла сітуацыя, якая суправаджалася гвалтам?
- Чаму вы паводзілі сябе менавіта так?
- Як бы паступілі іншыя члены групы ў такіх абставінах?
- Што вы маглі б зрабіць па-іншаму? Ці ёсць якія-небудзь прапановы ў групы?
- Што можна было б зрабіць, каб прадухіліць інцыдэнт?
- Чаму яны не ўмяшаліся ў выпадках, прыведзеных як прыклад у катэгорыі «с»?
- Ці былі ў гэтых інцыдэнтах нейкія агульныя прычыны, або ўсе яны былі ўнікальныя?
- Колькі інцыдэнтаў узнікалі ў выніку непаразумення, колькі сталі вынікам злосці, раздражнёнасці ці рэўнасці, і колькі – вынікам адрозненняў у культуры, звычаях, думках або вераваннях?
- Што разумеюць пад словам «цярпімасць»? Якое азначэнне далі б яму вы?
- Ці трэба цярпець усё, што робяць ці гавораць іншыя людзі?
- Чаму цярпімасць з'яўляецца выключна важнай для прапаганды правоў чалавека?

## Парады для фасілітатараў

Падкрэсліце, што мэтай гэтага практыкавання з'яўляецца развіццё навыкаў пераадолення сітуацый, звязаных з гвалтам, шляхам вызначэння прычын, усведамлення пачуццяў і эмоцый і развіцця ўмення весці сябе цвёрда і ўпэўнена, каб узяць сітуацыю пад кантроль. Падкрэсліце, што задача практыкавання – знайсці негвалтоўныя спосабы вырашэння сітуацый, звязаных з гвалтам, а не дапамагчы пацярпелым перажыць траўму. Калі хтосьці пацярпеў ад гвалту, прапануйце яму сустрэцца пазней для прыватнай размовы, падчас якой вы зможаце дапамагчы яму знайсці прафесіянальнага кансультанта.

Будзьце гатовы да нечаканасцей і падтрымлівайце тых, каму практыкаванне здасца цяжкім або занадта эмацыянальным. Вы не можаце ведаць гісторыю кожнага ўдзельніка, што адбывалася ці адбываецца зараз у яго сям'і. Можа здарыцца так, што некаторыя ўдзельнікі перажылі сумны вопыт сутыкнення з гвалтам, напрыклад жорсткае абыходжанне з дзецьмі, хатні гвалт, псіхалагічны або эмацыянальны гвалт, кіберцкаванне, сексуальны гвалт, расізм, цкаванне ў школе або на працы, хамства на дарогах, прычыненне шкоды сабе, спробы самагубства, злачынствы на глебе нянавісці, тэрарызм, генацыд, вайна, ваенныя злачынствы і злачынствы з ужываннем гвалту.

Нагадайце ўдзельнікам змест артыкула 1 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека: «Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны надзелены розумам і сумленнем і павінны ставіцца адзін да аднаго ў духу брацтва». Калі мы хочам, каб іншыя выконвалі ўмовы гэтага артыкула, мы і самі павінны іх прытрымлівацца.

Калі ў вас у групе больш за 10 чалавек, можна падзяліць іх на малыя групы, у якіх яны раскажуць свае гісторыі.

## Варыянты

Гэта практыкаванне добра падыходзіць для інсцэніроўкі. Папрасіце ад двух да чатырох удзельнікаў разыграць які-небудзь інцыдэнт. Астатнія ўдзельнікі няхай назіраюць. Вы можаце перыядычна спыняць ролевую гульню і прасіць гледачоў выказаць свае каментарыі ці прапановы аб тым, як сітуацыя павінна развівацца далей. Як варыянт, гледачы могуць непасрэдна ўмешвацца ў сцэнічнае дзеянне, змяняючы акцёраў і прыдумляючы альтэрнатыўныя сюжэтныя хады.

Замест форум-тэатра вы можаце арганізаваць «Тэатр вобразаў» (гл. старонку 67). Гэта вельмі эфектыўны спосаб заклікаць удзельнікаў задумацца пра гвалт. Папрасіце аднаго ўдзельніка – скульптара – «вылепіць» зборную карціну або сцэну гвалту, выкарыстоўваючы ў якасці матэрыялу целы сваіх калег. Калі скульптар скончыць працу, група можа даць каментарыі і задаць пытанні. На наступным этапе можна пераўтварыць створаную «скульптуру» ў станоўчы вобраз, у якім гвалту няма месца.

## Прапановы па далейшай працы

Вы можаце абмеркаваць супярэчнасць у Дэкларацыі прынцыпаў цярпімасці ААН, якая падымае пытанне аб межах цярпімасці: «Цярпімасць сугучна павазе да правоў чалавека, але не азначае памяркоўнага стаўлення да сацыяльнай несправядлівасці ці адмовы ад сваіх перакананняў або іх аслаблення. Яна азначае, што кожны вольны прытрымлівацца сваіх перакананняў і прызнае такое ж права за іншымі». Задайце ўдзельнікам пытанне: калі «цярпімасць не азначае памяркоўнага стаўлення да сацыяльнай несправядлівасці», то як чалавек можа адначасова дапускаць, што «кожны вольны прытрымлівацца сваіх перакананняў», асабліва калі гэтыя перакананні з'яўляюцца расісцкімі або фанатычнымі?

Даведайцеся пра арганізацыі, якія аказваюць падтрымку ахвярам гвалту, напрыклад, арганізуюць тэлефонныя лініі або сеткі падтрымкі ахвяр. Даведайцеся пра іншыя арганізацыі, якія спрыяюць узаемаразуменню і цярпімасці ў грамадстве.

Калі вы хочаце працягнуць працу над тэмай міру і гвалту, можаце звярнуць увагу на практыкаванні «Хатнія справы» на старонцы 144, дзе разбіраюцца выпадкі хатняга гвалту, «Маё жыццё не шоу!» на старонцы 232, прысвечанае кіберцкаванню, і «Ці ёсць у нас альтэрнатывы?» на старонцы 140, дзе ідзе гаворка пра цкаванне.

## Ідэі для дзеяння

Звяжыцеся з мясцовай арганізацыяй, якая змагаецца за мір і ненасілле, і даведайцеся, як вы маглі б дапамагчы ёй у якасці валанцёраў.

## Дадатковая інфармацыя

У сваім «Дакладзе аб сітуацыі ў свеце: гвалт і яго ўплыў на здароўе» (2002 г.) Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) дала наступнае азначэнне гвалту: «Гвалт – гэта наўмыснае прымяненне фізічнай сілы ці ўлады, сапраўднае або ў выглядзе пагрозы, накіраванае супраць сябе, іншай асобы, групы асоб ці супольнасці, вынікам якога з'яўляецца траўма, смерць, псіхалагічная траўма, адхіленні ў развіцці або рознага роду шкода (альбо маецца высокая ступень верагоднасці гэтага)».

**Дэкларацыя прынцыпаў цярпімасці ААН**

Артыкул 1. Паняцце цярпімасці

1.1. Цярпімасць азначае павагу, прыняцце і шанаванне багатай разнастайнасці культур нашага свету, нашых формаў самавыяўлення і спосабаў праяўлення чалавечай індывідуальнасці. Ёй спрыяюць веды, адкрытасць, зносіны і свабода думкі, сумлення і перакананняў. Цярпімасць – гэта гармонія ў разнастайнасці. Гэта не толькі маральны абавязак, але і палітычнае і прававое патрабаванне. Цярпімасць – каштоўнасць, якая робіць магчымым дасягненне міру, – спрыяе замене культуры вайны культурай міру.

1.2. Цярпімасць не саступка, паслуга або патуранне. Цярпімасць – гэта перш за ўсё актыўная пазіцыя, якая фарміруецца на аснове прызнання ўсеагульных правоў і асноўных свабод іншых. Ні ў якіх абставінах цярпімасць не можа служыць апраўданнем замахаў на гэтыя асноўныя каштоўнасці. Цярпімасць павінны праяўляць асобныя людзі, групы і дзяржавы.

1.3. Цярпімасць – гэта абавязак, на якім грунтуюцца правы чалавека, плюралізм (у тым ліку культурны плюралізм), дэмакратыя і вяршэнства права. Цярпімасць прадугледжвае адмову ад дагматызму і абсалютызацыі і падтрымлівае нормы, устаноўленыя ў міжнародных прававых актах у галіне правоў чалавека.

1.4. Цярпімасць, сугучная павазе да правоў чалавека, не азначае памяркоўнага стаўлення да сацыяльнай несправядлівасці ці адмовы ад сваіх перакананняў або іх аслаблення. Яна азначае, што кожны вольны прытрымлівацца сваіх перакананняў і прызнае такое ж права за іншымі. Яна азначае прызнанне таго, што людзі, якія па сваёй прыродзе адрозніваюцца па знешнім выглядзе, становішчы, гаворцы, паводзінам і каштоўнасцям, маюць права жыць у міры і захоўваць сваю індывідуальнасць. Яна таксама азначае, што погляды аднаго чалавека не могуць быць навязаны іншым.

Міжнародны дзень ненасілля, абвешчаны ААН, адзначаецца ва ўсім свеце і спрыяе прасоўванню ненасілля шляхам адукацыі і інфармавання грамадскасці. Ён праводзіцца штогод 2 кастрычніка і супадае з днём нараджэння вядомага індыйскага лідара Махатмы Гандзі.

COMPASS

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**2 кастрычніка**
Міжнародны дзень ненасілля

COMPASS

Навакольнае асяроддзе

Глабалізацыя

Здароўе

Узровень 2

Больш за 10 чалавек

30 хвілін

# Сетка жыцця

*Пацягніце ў прыродзе за адну рэч, і вы ўбачыце, што яна звязана з усім астатнім светам!*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • навакольнае асяроддзе,<br>• глабалізацыя,<br>• здароўе. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | больш за 10 чалавек |
| **Час** | 30 хвілін |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне прадугледжвае мазгавы штурм сувязей у глабальнай харчовай сетцы. Удзельнікі даследуюць наступныя пытанні:<br>• узаемазалежнасць жывога і нежывога;<br>• уздзеянне ўсіх відаў чалавечай дзейнасці на навакольнае асяроддзе і яго наступствы. |
| **Звязаныя правы** | • права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць;<br>• права свабодна распараджацца сваімі прыроднымі багаццямі і рэсурсамі;<br>• свабода рэлігіі і перакананняў. |
| **Мэты** | • развіць разуменне ўзаемазалежнасці жывога і нежывога;<br>• развіць навыкі сумеснай працы і крытычнае мысленне;<br>• выклікаць павагу да неад'емнай каштоўнасці жыцця. |
| **Матэрыялы** | • клубок тонкай вяроўкі або моцных нітак. |

## Інструкцыі

Гэта практыкаванне складаецца з трох частак: часткі 1 – стварэння сеткі жыцця; часткі 2 – яе разбурэння; часткі 3 – мазгавога штурму мер па абароне навакольнага асяроддзя.

**Частка 1**

1. Папрасіце ўдзельнікаў стаць у круг.
2. Растлумачце, што яны будуць будаваць мадэль сеткі жыцця.
3. Для пачатку вазьміце ў рукі клубок нітак і назавіце расліну, напрыклад капусту.
4. Трымаючыся за канец ніткі, кіньце клубок каму-небудзь з тых, хто стаіць у крузе. Чалавек ловіць клубок, і паміж вамі двума працягнецца прамая лінія з ніткі.
5. Гэты чалавек цяпер называе жывёлу, якая есць капусту, напрыклад вусеня. Затым, не выпускаючы са сваіх рук ніткі, кідае клубок трэцяму чалавеку ў крузе.
6. Трэці чалавек называе жывёлу, якая есць вусеняў, напрыклад птушку або, калі ведае віды птушак, то можна назваць канкрэтна дразда. Затым гэты чалавек кідае клубок наступнаму чалавеку.
7. Працягвайце гульню да таго часу, пакуль клубок не перасячэ прастору ў крузе па ўсіх напрамках і ніткі не пакрыюць яе крыж-накрыж у выглядзе сеткі, якая і прадстаўляе сабой «сетку жыцця».

**Частка 2**

8. Цяпер папрасіце кожнага ўдзельніка па чарзе прывесці канкрэтны прыклад таго, што можа пашкодзіць гэту сетку жыцця (напрыклад, аўтамабільныя дарогі, якія праходзяць праз пашу, празмерны вылаў рыбы або спальванне выкапнёвага паліва). Кожны, хто прывядзе такі прыклад, павінен адпусціць нітку.
9. Калі ўсе выкажуцца, прапануйце ўдзельнікам паглядзець на кучу зблытаных нітак, якія ляжаць на падлозе. Скажыце ім, што менавіта такім будзе наш свет, калі мы нічога не будзем рабіць, але гэтага можна пазбегнуць; заўсёды ёсць простыя рэчы, якія мы ўсе можам зрабіць, каб ратаваць што-небудзь, што патрабуе выратавання.

**Частка 3**

10. Прапануйце ўдзельнікам па чарзе даць абяцанне здзяйсняць простыя практычныя дзеянні для выратавання свету. Напрыклад, эканоміць электраэнергію, выключаючы свой камп'ютар, а не пакідаючы яго ў рэжыме чакання, есці менш мяса або менш лётаць самалётамі.
11. Пасля таго як кожны дасць такое абяцанне, няхай удзельнікі падымуць ніткі з падлогі.
12. У канцы практыкавання паглядзіце хвіліну на новую сетку і адзначце, што яна ўжо не такая, якой была раней. Ужо занадта позна брацца за яе поўнае аднаўленне – яно немагчыма, таму што выміранне незваротнае.

## Аналіз і ацэнка

Спачатку спытайце, што ўдзельнікі адчулі, калі ўбачылі разбурэнне сеткі, а потым сталі ствараць новую. Затым перайдзіце да абмеркавання звязаных з гэтым пытанняў і даведайцеся, што трэба зрабіць, каб абараніць навакольнае асяроддзе.

- Што вы адчулі, калі ўбачылі паступовае разбурэнне сеткі?
- Ці лёгка было называць жывёл і расліны ў розных харчовых сетках? Наколькі глыбокімі ведамі прыродазнаўства могуць пахваліцца людзі?
- Ці мае значэнне для вас, калі, напрыклад, белыя мядзведзі вымруць праз 10 гадоў?
- Як вы сябе адчувалі, калі назіралі фарміраванне новай сеткі?
- Ці лёгка вам было назваць свае асабістыя дзеянні, якія маглі б паменшыць наша ўздзеянне на навакольнае асяроддзе?
- Наколькі эфектыўнымі з'яўляюцца індывідуальныя дзеянні?
- Хто нясе адказнасць за ахову навакольнага асяроддзя? ААН, урады, НГА, людзі?
- Раўнавага ў прыродзе – вельмі складаная рэч, і цяжка прадказаць, якія глабальныя наступствы будзе мець тое ці іншае канкрэтнае дзеянне. Як жа пасля гэтага можна прымаць рашэнні аб выкарыстанні рэсурсаў Зямлі?
- Як трэба прымаць рашэнні аб выкарыстанні таго ці іншага рэсурсу? Напрыклад, ці варта высякаць лясы, каб зямля выкарыстоўвалася пад пасевы збожжавых культур? Людзі, выжыванне якіх залежыць ад лясных рэсурсаў, будуць пакутаваць з-за тых, хто атрымлівае прыбытак ад сельскай гаспадаркі. На карту ставіцца прынцып роўнасці.
- У артыкуле 1 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах гаворыцца, што «ўсе народы для дасягнення сваіх мэт могуць свабодна распараджацца сваімі прыроднымі багаццямі і рэсурсамі». Ці азначае гэта, што людзі маюць права наносіць шкоду навакольнаму асяроддзю?
- Мы залежым ад нашага навакольнага асяроддзя, якое дае нам ежу і чыстае паветра. Без здаровага навакольнага асяроддзя мы не маглі б жыць. Гэта ўмова нашага існавання. Ці азначае гэта, што наш найвялікшы абавязак заключаецца ў тым, каб паважаць навакольнае асяроддзе, тым самым абмяжоўваючы сваё права на яго выкарыстанне (у той жа меры, у якой мы абавязаны паважаць правы і свабоды іншых людзей, абмяжоўваючы свае ўласныя)?
- Ці патрэбны нам нейкія новыя правы чалавека, каб абараніць нас ад наступстваў змены клімату?

## Парады для фасілітатараў

Гэта практыкаванне лепш за ўсё выконваць з групай у 10–15 чалавек. Калі ў вас больш удзельнікаў, выконвайце гэта практыкаванне ў некалькіх групах.

Кожны харчовы ланцуг можа служыць ілюстрацыяй рэальных або магчымых адносін, напрыклад трава – авечкі – людзі, або планктон – кіты, або планктон – селядцы – свінні (свіней часта кормяць рыбнай мукой) – людзі – тыгры! Памятайце, што калі жывёла памірае, то яе цела гніе з удзелам бактэрый, даючы мінералы, якія далей выкарыстаюць расліны. Так жыццёвы цыкл пачынаецца зноў. Мільярды і мільярды такіх цыклаў пераплятаюцца паміж сабой, ствараючы сетку жыцця.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**2 кастрычніка**
Міжнародны дзень змяншэння рызыкі стыхійных бедстваў

Папрасіце, каб удзельнікі згадалі і назвалі як мага больш розных харчовых ланцугоў. Няхай падумаюць пра лясы, горы, нізінныя і верхавыя балоты, сажалкі і вадаёмы, рэкі і моры. Магчыма, трэба будзе дапамагчы ім, сказаўшы нешта накшталт: «А цяпер мінералы змываюцца ў мора і становяцца ежай для марскога фітапланктону (раслiннага планктону)». Ці, напрыклад, каб перанесці ўвагу ад марской экасістэмы да экасістэмы сушы, вы можаце сказаць: «Цяпер чайка, якая з’ела зялёнага краба, паляцела на пошукі чаго-небудзь ядомага сярод адходаў фермерскай гаспадаркі, дзе і загінула». Калі гулец не можа прыдумаць наступнае звяно ланцуга, папрасіце іншых членаў групы прапанаваць свае ідэі.

У частцы 2, калі першыя некалькі ўдзельнікаў выпусцяць ніткі з рук, гэта спачатку не будзе мець вялікага эфекту, таму што ніткі, якія застануцца, перакрыжоўваючыся, будуць падтрымліваць астатнюю частку сеткі. Але пасля таго як больш гульцоў выпусцяць ніткі з рук, вы ўбачыце, як на падлогу ўпадзе бясформенная куча нітак, вакол якой будуць стаяць некалькі людзей, якія ўжо нічым не змогуць гэтай сетцы дапамагчы.

Падчас працы над часткай 3 вам трэба быць гатовым да спрэчных адказаў на пытанне «Што шкодзіць сетцы?» Некаторыя людзі, напрыклад вегетарыянцы, могуць сказаць, што сетцы шкодзіць спажыванне людзьмі ў ежу мяса. Вы павінны прыняць да ўвагі гэты пункт гледжання і затым папрасіць іншых гульцоў выказаць іх меркаванне. Аднак устрымайцеся ад працяглых дыскусій на гэтым этапе; будзе лепш, калі вы скончыце гульню, а потым вернецеся да гэтага пытання падчас аналізу і абмеркавання.

Паспрабуйце не ўвязнуць у дыскусіі і пастаянна памятайце пра асноўную задачу практыкавання – даследаваць уплыў чалавечай дзейнасці на навакольнае асяроддзе.

Вы можаце знайсці добрыя прыклады паспяховых ініцыятыў на сайце www.ecotippingpoints.org. Таксама звярніце ўвагу на мясцовыя крыніцы інфармацыі. Напрыклад, у Партугаліі асацыяцыя Quercus (www.quercus.pt) рэгулярна выкарыстоўвае грамадскае тэлебачанне для таго, каб інфармаваць аб экалагічных праблемах і расказваць аб мерах, якія дазваляюць змякчыць наша ўздзеянне на навакольнае асяроддзе і жыць «экалагічна чыстым» спосабам.

Перад тым, як ставіць пытанні аб узаемасувязі паміж правамі чалавека і навакольным асяроддзем, азнаёмцеся з дадатковай інфармацыяй у главе 5 на сайце www.coe.int/compass.

Гэта практыкаванне добра падыходзіць для правядзення ў рамках заняткаў па прыродазнаўстве.

## Варыянты

У частцы 2, калі вы просіце ўдзельнікаў прывесці канкрэтныя прыклады таго, што шкодзіць сетцы жыцця, вазьміце нажніцы і пасля кожнага прыкладу разрэзвайце сетку. Паступова сетка будзе разбурацца, і ў канцы занятку каля вашых ног застанецца ляжаць куча кавалкаў нітак. Знішчаная сетка з’яўляецца вельмі магутным вобразам, і сітуацыя ў свеце сапраўды катастрафічная, але пры гэтым важна, каб людзі не адчувалі сябе бездапаможнымі перад пастаўленай задачай. Таму будзе вельмі карысна спецыяльна вылучыць час для правядзення кароткага мазгавога штурму або абмеркавання прагрэсу, які ўжо дасягнуты ў справе абароны навакольнага асяроддзя.

## Прапановы па далейшай працы

Правядзіце мазгавы штурм паспяховых экалагічных мерапрыемстваў, якія праходзілі на мясцовым і глабальным узроўні. У нас заўсёды застаецца надзея! Ва ўсім свеце шмат неабыякавых і актыўных людзей, якія працуюць для стварэння ўстойлівага асяроддзя, якое мы павінны пакінуць наступным пакаленням. Выдатныя прыклады практычнай дзейнасці ў гэтай сферы можна знайсці ў кнізе «Барацьба са змяненнем клімату: супольнасці падаюць прыклад», выдадзенай альянсам Act International Alliance.

https://actalliance.org/

Гэта практыкаванне можна выкарыстаць у якасці першага этапа дыскусіі на тэму «Правы чалавека і навакольнае асяроддзе». Напрыклад, карысна ўзняць такія пытанні: ці павінна быць сярод правоў чалавека асобнае права на навакольнае асяроддзе? Ці мае навакольнае асяроддзе іншую і важнейшую каштоўнасць, чым інструментальная? Ці мае сэнс даваць правы жывёлам? (Дадатковую інфармацыю па гэтых пытаннях гл. на сайце www.coe.int/compass.)

Развіццё ўстойлівага выкарыстання рэсурсаў патрабуе палітычнай волі, часу, намаганняў і грошай. Падумайце, як шмат маглі б зрабіць усе краіны разам пры дапамозе арганізацыі экалагічнай адукацыі, правядзення навуковых даследаванняў і рэалізацыі практычных прыродаахоўных мерапрыемстваў, калі б яны не трацілі так шмат грошай на ўзбраенне і ваенныя выдаткі. Калі група захоча глыбей вывучыць гэтыя пытанні, можна выканаць практыкаванне «Колькі нам патрэбна?» на старонцы 189.

Змяненне клімату ўплывае на ўсё жывое ў гэтым свеце. Цяжкія наступствы такіх бедстваў, як паводкі, апустыньванне і павышэнне ўзроўню мора, азначаюць, што многія людзі не змогуць выжыць у іх цяперашніх месцах пражывання і будуць вымушаны перамяшчацца ў іншыя. Калі вас зацікавіць вывучэнне праблем так званых кліматычных бежанцаў, можна звярнуцца да практыкавання «Тры рэчы» на старонцы 78.

## Ідэі для дзеяння

Прыміце ўдзел у мясцовых экалагічных праектах. Ёсць шмат НГА, з якімі вы можаце звязацца:

- Youth and Enviroment Europe (YEE). Гэта парасоністая арганізацыя, якая аб'ядноўвае больш за сорак рэгіянальных і нацыянальных аўтаномных маладзёжных арганізацый, якія займаюцца вывучэннем і абаронай прыроды і навакольнага асяроддзя ва ўсёй Еўропе (www.tigweb.org);
- Climate Action Network Europe (CAN-E). Гэта асацыяцыя прызнана вядучай еўрапейскай сеткай, якая займаецца пытаннямі клімату і энергетычных рэсурсаў. Маючы больш за 127 членаў у 25 краінах Еўропы, CAN-E каардынуе працу па прадухіленні небяспечных змяненняў клімату і садзейнічанні ўстойліваму развіццю энергетыкі і навакольнага асяроддзя ў Еўропе;
- «Сябры Зямлі» (Friends of the Earth). www.foei.org;
- «Сусветны фонд дзікай прыроды» (WWF) працуе з урадамі, прадпрымальнікамі і супольнасцямі па ўсім свеце для таго, каб чалавек і прырода развіваліся гарманічна, захоўваючы біялагічную разнастайнасць і прыродныя рэсурсы планеты (www.wwf.org).

Паменшыце вашы асабістыя выкіды вугляроду ў атмасферу (вугляродны след). На сайце www.cutco2.org вы можаце знайсці шэраг практычных парад. Вы таксама можа скарыстацца рэкамендацыямі групы «Маладыя людзі шукаюць рашэнні, якія дазволяць знізіць выкіды вуглякіслага газу» (Young People Finding Solutions to Reduce Their Carbon Footprint) на Facebook.

## Дадатковая інфармацыя

У прыродзе ўсё звязана з усім. Усё жывое і нежывое звязана праз розныя цыклы, напрыклад вугляродны цыкл і кругазварот вады. Харчовыя ланцугі з'яўляюцца часткай гэтых цыклаў. Харчовы ланцуг пачынаецца, калі зялёныя расліны выкарыстоўваюць светлавую энергію ад сонца і мінералы, якія знаходзяцца ў глебе і вадзе, каб забяспечыць сваё харчаванне і атрымаць энергію, каб жыць і расці. Калі расліну, напрыклад капусту, хтосьці з'ядае, то мінералы і энергія, назапашаныя ў яе лістах, перадаюцца, напрыклад, вусеню і выкарыстоўваюцца ім, каб жыць і развівацца. Паколькі кожную жывёлу ў сваю чаргу з'ядае нейкая іншая, то энергія і мінералы перадаюцца далей па харчовым ланцугу. Калі жывёла, якая знаходзіцца ў верхняй частцы харчовага ланцуга, памірае, яе цела гніе, яго «з'ядаюць» бактэрыі. Мінералы, якія знаходзіліся ў яе арганізме, засвойваюцца раслінамі, і так пачынаецца новы харчовы ланцуг.

Мір і гвалт

Глабалізацыя

СМІ

Узровень 2

Любы памер групы

60 хвілін

# Калі прыйдзе заўтра

*Калі ты судзіш іншых гэтак жа, як гэта сістэма асудзіла цябе, ты будзеш нічым не лепшы за тых, хто прыгаварыў цябе да смерці.*

Дуайт Аданандус

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • мір і гвалт;<br>• глабалізацыя;<br>• СМІ. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | любы |
| **Час** | 60 хвілін |
| **Агляд** | У гэтым практыкаванні выкарыстоўваюцца інфармацыйныя даведкі і дыскусія для вывучэння наступных пытанняў:<br>• абарона грамадства ад злачынцаў;<br>• правы чалавека ў дачыненні да злачынцаў;<br>• смяротнае пакаранне. |
| **Звязаныя правы** | • права на жыццё;<br>• свабода ад катаванняў і зневажальнага абыходжання;<br>• права на роўнасць чалавечай годнасці. |
| **Мэты** | • разгледзець прадузятасці ў адносінах да злачынцаў і падумаць аб некаторых наступствах смяротнага пакарання;<br>• развіць уменне слухаць і крытычна асэнсоўваць інфармацыю;<br>• падтрымаць пачуццё чалавечай годнасці і справядлівасці. |
| **Матэрыялы** | • копіі раздатачных матэрыялаў «Калі прыйдзе заўтра», па адным экзэмпляры на ўдзельніка;<br>• аркуш паперы і аловак на кожнага члена групы;<br>• фліпчарт або вялікія аркушы паперы і ручкі для запісу асноўных пунктаў агульнага абмеркавання. |

## Інструкцыі

**Этап 1**.

1. Прачытайце ўслых частку 1 раздатачных матэрыялаў да практыкавання «Калі прыйдзе заўтра». Скончыўшы чытанне, дайце ўдзельнікам 5 хвілін, каб яны згадалі асноўныя моманты і запісалі іх сваімі словамі. Потым папрасіце іх абмяняцца запісамі з тымі, хто сядзіць побач, прачытаць запісы і пракаментаваць іх.
2. Папрасіце некалькіх добраахвотнікаў прачытаць услых свае запісы, пасля чаго абмяркуйце разыходжанні ў версіях. Ці запомніў нехта больш падрабязнасцей, чым іншыя? Ці з'явіліся ў кагосьці ў запісах нейкія дэталі, не згаданыя ў зыходнай гісторыі?
3. Папрасіце ўдзельнікаў апісаць сваю рэакцыю на апавяданне. Хто, на іх думку, з'яўляецца апавядальнікам? Што здарылася?

**Этап 2**.

4. Прачытайце ўслых газетную выразку і другую частку апавядання Нанона.
5. Потым дайце ўдзельнікам 10–15 хвілін на абмеркаванне новай інфармацыі з партнёрамі. Раздайце ім копіі матэрыялу «Калі прыйдзе заўтра» на той выпадак, калі яны захочуць спаслацца на нейкія факты з тэксту.
6. Папрасіце ўдзельнікаў прадумаць наступныя пытанні:

- Ці змянілася іх меркаванне аб Дуайце ці Наноне, калі ім стала вядома, што яны былі ў спісе асуджаных на смерць? Як змянілася меркаванне ўдзельнікаў? Чаму?
- Што, на іх думку, меў на ўвазе Дуайт, калі сказаў: «Калі ты судзіш іншых гэтак жа, як гэта сістэма асудзіла цябе, ты будзеш нічым не лепшы за тых, хто прыгаварыў цябе да смерці»? Ці згодны яны з ім?

7. Вынесіце гэта пытанне на агульнае абмеркаванне, выслухайце думкі розных пар наконт гэтых пытанняў.

## Аналіз і ацэнка

Гэта практыкаванне можна ўжыць для таго, каб узняць шэраг важных і цікавых пытанняў, якія могуць стаць прадметам далейшых практыкаванняў і дыскусій. Аднак у працэсе аналізу рэкамендуецца разбіраць тыя тэмы, якія групы ўжо прапрацавалі, а не ўводзіць нейкія цалкам новыя аспекты (гл. ніжэй у пункце «Парады для фасілітатара»).

- Ці дапамагло гэта практыкаванне вам даведацца аб чым-небудзь новым пра сябе? Ці прымусіла яно вас пераасэнсаваць якія-небудзь з вашых ранейшых меркаванняў або перакананняў?
- Як вы думаеце, што павінна было праілюстраваць гэта практыкаванне? Ці была дасягнута вызначаная мэта? Калі не, то чаму?
- Што гэта практыкаванне расказала вам аб праве на жыццё (калі яно наогул нешта расказала)? Ці былі закрануты падчас дыскусіі якія-небудзь іншыя правы?

Напішыце гэтыя пытанні на вялікім аркушы паперы або на фліпчарце для выкарыстання ў будучыні.

## Парады для фасілітатараў

Падчас першай дыскусіі (пасля зачытвання першай часткі) важна, каб удзельнікі не атрымалі ніякіх падказак аб становішчы гэтых двух персанажаў; паспрабуйце выцягнуць з удзельнікаў іх уражанні аб дзеючых асобах, не даючы ім зразумець, што ў вас ёсць на гэта пэўная прычына. Перад удзельнікамі пастаўлена мэта разгледзець чалавечыя якасці двух персанажаў, нічога не ведаючы аб іх мінулым ці сённяшняй сітуацыі.

Абмен запісамі паміж удзельнікамі ў канцы першага этапа павінен паказаць ім, што адну і тую ж інфармацыю можна ўспрымаць цалкам па-рознаму і з рознай ступенню дэталізацыі. Варта падкрэсліць, што гэта не «экзамен» і ўдзельнікам не трэба саромецца сваіх запісаў; гэта, хутчэй, спосаб ілюстрацыі розных пунктаў гледжання. Папрасіце выказацца тых удзельнікаў, чыё меркаванне радыкальна адрозніваецца ад пункту гледжання астатніх. Спытайце, чым гэта можа тлумачыцца, напрыклад, чаму адны ўдзельнікі запомнілі нейкія звесткі, на якія іншыя не звярнулі ўвагі.

Хутчэй за ўсё, практыкаванне само па сабе паставіць занадта шмат пытанняў для аднаго занятку, так што паспрабуйце ўтрымліваць дыскусію ў вызначаных межах, не дазваляючы ўдзельнікам пераключацца на абмеркаванне іншых звязаных пытанняў, напрыклад смяротнага пакарання. Старайцеся засяродзіць увагу групы на двух асноўных пытаннях:

1. Да якой ступені мы, дзяржава і кожны чалавек, схільны «судзіць» людзей на падставе таго, што яны (на нашу думку) здзейснілі. Верагодна, гэта і меў на ўвазе Дуайт, кажучы пра тое, што не трэба «судзіць» іншых так, як дзяржава асудзіла яго (і Нанона). Дзяржава, па сутнасці, перастала лічыць іх людзьмі на падставе таго, што яны (на думку дзяржавы) здзейснілі ў мінулым.
2. Нават так званыя «закаранелыя злачынцы» захоўваюць уласцівыя ім чалавечыя якасці, прытым не толькі «клапатлівасць і спачуванне», пра якія кажа Дуайт, але і «адчай і дэпрэсію» – пачуцці, якія Нанон лічыць вынікам турэмнага зняволення.

Абмяркоўваючы тэму «права на жыццё», старайцеся не ператвараць свае каментарыі ў аргументы «за» ці «супраць» смяротнага пакарання. Вядзіце дыскусію вакол пытання аб тым, ці можна сказаць, што гэтыя два чалавекі ўсё яшчэ **валодаюць** (падкрэсліце слова «валодаюць») правам на жыццё, а калі не, то як чалавек можа «страціць» гэта права. Напрыклад, ці мае хтосьці права пазбаўляць іншых грамадзян гэтага права, нават калі яны здзейснілі злачынствы?

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**10 кастрычніка**
Міжнародны дзень барацьбы са смяротным пакараннем

«11 песень, якія ўзрушылі свет». З выпуску журнала Songlines World Music за сакавік 2009 года:
**Free Nelson Mandela** – Джэры Дамерс і The Special AKA;
**From Little Things Big Things Grow** – Кеў Кармодзі і Пол Келі;
**Get up, Stand up** – Боб Марлі;
**Gracias a la Vida** – Мерседэс Соса;
**Al Atlal** – Ум Кульсум;
**Biko** – Пітэр Габрыэль;
**Didi** – Халед;
**Imagine** – Джон Ленан;
**Zombie** – Фела Куці;
**Nkosi Sikelel' iAfrika** – метадысцкі гімн, складзены Енохам Сантонга ў 1897 годзе;
**Djelem Djelem** – цыганскі гімн, напісаны Яркам Яванавічам на матыў традыцыйнай цыганскай мелодыі.

## Прапановы па далейшай працы

Песня заўсёды была магутным інструментам барацьбы за правы чалавека. Група можа паслухаць некалькі песень, прысвечаных барацьбе за свабоду і справядлівасць, або скласці свае ўласныя.

Вы можаце паказаць фільм, звязаны з гэтай праблемай. Рэкамендуем:

- «Мярцвяк ідзе» – рэж. Цім Робінс, 1995 год. Амерыканскі фільм пра тое, як сястра Хелен пасябравала са зняволеным, які знаходзіўся ў камеры смертнікаў;
- «Дэкалог 5: не забі» – рэж. Кшыштаф Кеслёўскі, 1988 год. Галоўны персанаж, малады чалавек 20 гадоў, здзейсніў жорсткае забойства, але і дзяржава карае яго смерцю такім жа варварскім спосабам. Драма паказвае, што любое жыццё варта павагі і ніхто не можа быць забіты;
- «У бездань» – рэж. Вернер Херцаг, 2011 год. Размовы смертніка Майкла Перы і яго ахвяр даюць глебу для разважанняў наконт прычын, па якіх людзі – і дзяржава – забіваюць.

**Заўвага.**
Поўны тэкст практыкавання «Калі прыйдзе заўтра» можна знайсці на вэб-сайце Канадскай кааліцыі супраць смяротнага пакарання (Canadian Coalition against the Death Penalty): http://www.ccadp.org.

Вы таксама можаце прачытаць або паставіць (поўнасцю або фрагментамі) п’есу «Рэабілітаваныя» Джэсікі Бланк і Эрыка Енсэна (theexonerated.com). У п’есе чаргуюцца маналогі галоўных герояў і сцэны, знятыя ў судзе і турме, якія расказваюць гісторыі шасці мужных людзей, якія адчулі на сабе ўсю жахлівую несправядлівасць амерыканскай судовай сістэмы, але здолелі пераадолець усё і выжыць.

Даследуйце пытанні, прыведзеныя ў канцы практыкавання. Правядзіце афіцыйныя дэбаты або выкарыстайце метад «Выбірай!». Можна разгледзець наступныя тэмы:

- Праблемы, звязаныя з пакараннем: якую мэту праследуе заключэнне злачынцаў пад варту і (або) смяротнае пакаранне? Ці робіцца гэта перш за ўсё для абароны грамадства, з’яўляецца спробай змяніць іх паводзіны ці адплатай (помстай)?
- Смяротнае пакаранне: якія аргументы можна прывесці ў падтрымку і супраць смяротнага пакарання?
- Бяспека краіны супраць бяспекі чалавека: як далёка можа зайсці дзяржава ў барацьбе з самымі закаранелымі злачынцамі або тэрарыстамі? Напрыклад, ці можна апраўдаць катаванні меркаваннямі «бяспекі краіны»?

Вы можаце распрацаваць праект на тэму смяротнага пакарання ў сувязі з правамі дзіцяці. У некаторых краінах дзеці прыгаворваюцца да смяротнага пакарання і могуць быць пакараны. Знайдзіце больш інфармацыі па гэтай тэме па пошукавым запыце «Death Row Kids» (дзеці ў камеры смертнікаў), а таксама відэаролікі на youtube.com.

## Ідэі для дзеяння

Наведайце вэб-сайт Канадскай кааліцыі супраць смяротнага пакарання (http://ccadp.proboards.com) і прачытайце пісьмы зняволеных. Затым напішыце пісьмо аднаму з прыгавораных да смяротнага пакарання (на вэб-сайце кааліцыі ёсць інфармацыя аб тым, як стаць сябрамі па перапісцы і як звязацца з мясцовай асацыяцыяй Amnesty International).

Знайдзіце апошняе абнаўленне інфармацыі аб Наноне Уільямсе на сайце www.nawisa.ch і падумайце, як бы вы маглі падтрымаць яго.

## Дадатковая інфармацыя

Адной з умоў членства ў Савеце Еўропы з’яўляецца адмена смяротнага пакарання. Па гэтай прычыне з 1997 года ў краінах – членах СЕ смяротныя пакаранні не праводзіліся.

2009 год стаў першым годам, калі ў Еўропе не быў пакараны ні адзін чалавек; аднак у сакавіку 2010 года ў Беларусі былі пакараны смерцю два чалавекі.

Інфармацыю аб краінах, якія ратыфікавалі дагаворы аб адмене смяротнага пакарання, вы можаце знайсці на сайце Amnesty International (www.amnesty.org).

Згодна з дакладам Amnesty International «Прыгаворы да смяротнага пакарання, вынесеныя і прыведзеныя ў выкананне ў свеце ў 2014 годзе», па меншай меры 2466 чалавек у 55 краінах былі прыгавораны да смяротнага пакарання ў тым годзе.

Гэта на 28 % больш, чым у 2013 годзе, калі ў 57 краінах было вынесена 1925 смяротных прыгавораў. Гэты рост быў у значнай ступені абумоўлены рэзкім павелічэннем колькасці смяротных прыгавораў у Егіпце (са 109 у 2013 годзе да 509 у 2014 годзе) і Нігерыі (са 141 у 2013 годзе да 659 у 2014 годзе); у абедзвюх краінах у некаторых выпадках суды выносілі масавыя прыгаворы.

Па меншай меры 19 094 чалавекі лічыліся прыгаворанымі да смяротнага пакарання ва ўсім свеце ў канцы 2014 года.

Артыкул «Колькасць пакаранняў скарачаецца, але не для непаўналетніх правапарушальнікаў», падрыхтаваны арганізацыяй Human Rights Watch 1 красавіка 2015 года, сцвярджае, што 2013 год адметны ростам выкарыстання смяротнага пакарання за злачынствы, учыненыя дзецьмі.

Іран амаль напэўна з’яўляецца сусветным лідарам у пакаранні смерцю непаўналетніх правапарушальнікаў: колькасць апошніх у 2014 годзе дасягнула 14, а за апошнія 10 гадоў – 77 чалавек. Акрамя таго, у мінулым годзе Іран вынес новыя смяротныя прыгаворы непаўналетнім злачынцам. У агульнай складанасці, у краіне зараз чакаюць смяротнага пакарання па меншай меры 160 непаўналетніх злачынцаў.

Смяротныя прыгаворы малалетнім злачынцам у мінулым годзе таксама былі вынесены ў Егіпце і на Шры-Ланцы; свайго лёсу чакаюць асуджаныя на смерць на Мальдывах, у Нігерыі, Пакістане, Саудаўскай Аравіі і Емене.

У 2013 годзе трое непаўналетніх злачынцаў былі пакараны ў Саудаўскай Аравіі, яшчэ некаторыя выпадкі, магчыма, мелі месца ў Іране і Емене.

У сакавіку 2014 года ў Пакістане быў пакараны смерцю Магамет Афзал, якому на момант вынясення прыгавору было 16 гадоў, а таксама суд гэтай краіны зацвердзіў смяротны прыгавор Шафкату Хусейну, якому на момант вынясення прыгавору ў 2004 годзе было 14 ці 15 гадоў.

Даклад Amnesty International «Дзеці і смяротны прыгавор: пакаранні па ўсім свеце з 1990 года», апублікаваны ў 2002 годзе, паказвае, што верхнюю частку спіса займае ЗША з найвялікшай колькасцю пакараных маладых людзей, якія здзейснілі злачынствы да дасягнення 18 гадоў, – 18 чалавек. У Пакістане пакараны адзін чалавек, якому на момант здзяйснення злачынства было толькі 13 гадоў.

Арганізацыя Human Rights Watch паведамляе, што з 2004 года вядомы выпадкі пакарання смерцю непаўналетніх толькі ў Іране, Судане, Кітаі і Пакістане. У Судане два такія пакаранні адбыліся ў 2005 годзе, у Кітаі адзін непаўналетні злачынец быў пакараны ў 2004 годзе, яшчэ адзін у Пакістане ў 2006 годзе. Для параўнання: у Іране пакарана па меншай меры тры непаўналетнія злачынцы ў 2004 годзе, восем – у 2005 годзе і чатыры – у 2006 годзе. Ва ўсім свеце толькі Кітай апярэджвае Іран па колькасці выкананых смяротных прыгавораў. У разліку на душу насельніцтва ў Іране штогод караюць больш людзей, чым у любой іншай краіне. (www.hrw.org – даныя на чэрвень 2007 года.)

COMPASS

Для таго каб даведацца, як жыве Нанон Уільямс, падпішыцеся на яго ў Facebook і Twitter.

Для больш падрабязнага азнаямлення са справай Нанона і памылкамі, дапушчанымі ў ходзе судовага разбору, наведайце http://murderpedia.org/male.W/w/williams-nanon.htm.

## Раздатачныя матэрыялы

**«Калі прыйдзе заўтра», аўтар Нанон Уільямс**

**Частка 1**

«На наступны дзень пасля смерці Дуайта Аданандуса я паглядзеў на жыццё цалкам па-новаму – я ўбачыў яго не такім, якое яно ёсць, ці, можа быць, не такім, якім я хацеў бы яго бачыць. Быў пачатак зімы, я ляжаў і думаў пра сябра, які заўсёды ўсміхаўся, нават калі дні здаваліся зусім пустымі, і гэтыя думкі рвалі маё сэрца. Асцярожна падняўшыся, каб узяць газету, прасунутую пад дзверы, я даведаўся пра яго гісторыю.

Чытаючы пра яго і разумеючы, што больш ніколі яго не ўбачу, я адчуваў, як быццам іголкі раз за разам утыкаюцца мне ў сэрца. Бывала, ён выходзіў, перавальваючыся, на двор і крычаў: «Як справы, хлапчук?» Я азіраўся вакол, потым глядзеў яму прама ў вочы і казаў: «Гэй, ты каго тут хлапчуком назваў?» І мы абодва пачыналі смяяцца, бо я быў самым маладым у нашым блоку. Успамінаючы цяпер гэтыя моманты, я адчуваю глыбокі сум, таму што не ўяўляю сябе на двары без Дуайта, адна прысутнасць якога разгладжвала злыя маршчыны на маім твары.

З гадамі мае звычкі правядзення вольнага часу змяніліся, аднак мне хацелася б думаць і спадзявацца, што гэтыя новыя звычкі зробяць мяне лепшым чалавекам – такім, якім аднойчы стаў Дуайт. У моманты слабасці я заўсёды лаўлю сябе на думцы аб тым, што б зрабіў у такой сітуацыі Дуайт.

«Помні, – бывала, казаў ён мне, – сістэма можа дабрацца да цябе толькі тады, калі ты сам ёй гэта дазволіш. Памірыся са сваім Богам, ужо не ведаю, які ён у цябе, і з усіх сіл старайся жыць як мага лепш і шанаваць жыццё». А потым працягваў: «Хлапчук, я не ведаю, як ты тут апынуўся, але ведаю, што табе тут не месца…»

**Частка 2**

«…На самай справе, тут нікому не месца – у камерах смяртнікаў. Тут сядзяць гвалтаўнікі, выкрадальнікі людзей, рабаўнікі, педафілы і садысты, якім на цябе напляваць. Але сярод іх ёсць і клапатлівыя, і поўныя спагады людзі, якія здзейснілі тыя ж самыя злачынствы, але здолелі змяніцца, і я хачу, каб ты заўсёды гэта памятаў, – сказаў ён мне за некалькі тыдняў да таго, як яго пакаралі смерцю. – Запомні гэта, нават калі забудзеш усё астатняе. Калі ты судзіш іншых гэтак жа, як гэта сістэма асудзіла цябе, ты будзеш нічым не лепшы за тых, хто прыгаварыў цябе да смерці!» Гэтыя словы дагэтуль гучаць у мяне ў вушах, і я не магу зразумець, чаму мне спатрэбілася так многа часу, каб уцяміць, што ён меў на ўвазе. Вядома, я чуў, што ён сказаў, і ў яго словах быў сэнс, але зразумець сэнс і цалкам усвядоміць значэнне тых слоў – зусім розныя рэчы. Напэўна, я і сапраўды быў яшчэ хлапчуком, як ён мяне называў, але праўда, калі ты, нарэшце, яе ўсведамляеш, усё роўна вярэдзіць душу.

Я ведаю, што турэмнае зняволенне – гэта псіхалагічны від катаванняў, які нагнятае адчай да таго часу, пакуль дэпрэсія не авалодае табой. Аднак некаторыя нейкім чынам захоўваюць незламаны дух і волю да жыцця. Што тычыцца Дуайта, то яму хапіла духу, і ўсё роўна, што ён там такое здзейсніў, што трапіў у камеру смяртнікаў, – сваёй мужнасцю ён змяніў жыццё іншых, тых, хто пры жыцці гніе на могілках гэтай сістэмы. «Я ведаю, хлапчук, гэта нялёгка, – казаў ён, – але ніхто не казаў, што жыццё лёгкае. Прымай кожны дзень такім, які ён ёсць, і пакуль ты бачыш святло ў канцы тунэля, няхай гэта святло будзе той сілай, якая вядзе цябе наперад». Гэта былі яго апошнія словы, сказаныя мне на развітанне са слязамі ў голасе, – да гэтага я ніколі не бачыў яго такім узрушаным. Я не бяруся растлумачыць, што гэта значыць для мяне; думаю, ён сказаў мне гэтыя словы для таго, каб я знайшоў у сабе сілы, якія падтрымлівалі мяне на працягу ўсіх гэтых гадоў і, верагодна, будуць падтрымліваць і ў будучыні. Я ніколі не адмаўляўся ад сваіх прынцыпаў ці ад рэчаў, якія я цаню больш за ўсё ў жыцці, – такіх, як мая сям’я, – так што, хутчэй за ўсё, заўтрашні дзень, калі ён настане, прынясе мне каханне і ўступленне ў нябеснае царства».

*Нанон Уільямс быў прыгавораны штатам Тэхас да смяротнага пакарання за цяжкае злачынства ў 1992 годзе, калі яму было 17 гадоў. Ён адмаўляе сваю віну, але правёў 13 гадоў у камеры смяртнікаў, пакуль у 2005 годзе яго прыгавор не быў заменены на пажыццёвае зняволенне рашэннем суддзі Вярхоўнага суда ЗША Роўпера В. Сіманса, які выступае за забарону смяротнага пакарання для непаўналетніх. У 2010 годзе справа Нанона павінна была быць перададзена ў Федэральны суд для разгляду доказаў яго невінаватасці і яго вызвалення на падставе таго, што ў 1992 годзе прысяжным былі дадзены няпраўдзівыя паказанні, а абарона на судзе не вялася належным чынам.*

Крыніца: Канадская кааліцыя супраць смяротнага пакарання.

**Газетная выразка**

Хантсвіл, 2 кастрычніка 1997 года. У сераду вечарам па прыгаворы суда быў пакараны рабаўнік, які дзевяць гадоў таму застрэліў бізнесмена з Сан-Антоніа, які спрабаваў перашкодзіць яму ўцячы пасля рабавання банка. Аданандус, 41-гадовы мужчына, быў прыгавораны да вышэйшай меры пакарання за забойства Вернана Ханана, які памёр ад стрэлу ў грудзі падчас сутычкі з Аданандусам у фае банка на поўначы Сан-Антоніа 28 студзеня 1988 года.

# Дзе вы стаіце?

*Што важней: мець дом, ежу і прадметы першай неабходнасці або мець магчымасць сказаць тое, што хочаш?*

**Тэмы**
- агульныя правы чалавека,
- грамадзянскасць і ўдзел,
- беднасць.

**Складанасць** узровень 2

**Памер групы** любы памер групы

**Час** 50 хвілін

**Агляд** У гэтым практыкаванні-дыскусіі ўдзельнікі літаральна «ўстаюць сцяной», адстойваючы сваё меркаванне.

**Звязаныя правы**
- усе правы чалавека.

**Мэты**
- зразумець адрозненні паміж грамадзянскімі і палітычнымі правамі, а таксама сацыяльнымі і эканамічнымі правамі;
- прымяніць і развіць навыкі вядзення дыскусіі і аргументацыі;
- абудзіць пачуццё павагі і адкрытасці новаму.

**Матэрыялы**
- адзін экзэмпляр старонкі са сцверджаннямі;
- вялікія аркушы паперы або папера для фліпчарта, ручкі;
- шнурок або крэйда (па жаданні);
- ксеракопіі скарочанага тэксту Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (УДПЧ), прыведзенага на старонцы 600 (па жаданні);
- дастаткова прасторы для свабоднага перамяшчэння.

**Падрыхтоўка**
- падрыхтуйце 2 плакаты: адзін з надпісам «Я згаджаюся», другі – з надпісам «Я не згаджаюся», і прымацуйце іх на падлозе ў процілеглых канцах пакоя так, каб удзельнікі маглі выстраіцца ў прамую лінію паміж імі (можна правесці лінію крэйдай або працягнуць шнурок);
- даведайцеся, чаму людзі кажуць аб падзеле правоў на «пакаленні», а таксама пра дзве катэгорыі правоў: грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя. (Гл. раздзел «Парады для фасілітатараў» ніжэй і главу 4.)

## Інструкцыі

1. Пачніце практыкаванне з кароткага тлумачэння адрозненняў паміж грамадска-палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі правамі.
2. Вылучыце пяць хвілін на мазгавы штурм для размеркавання розных правоў па гэтых катэгорыях. Напішыце спісы правоў на фліпчарце: у адным слупку грамадска-палітычныя правы, у другім – сацыяльна-эканамічныя.
3. Растлумачце, што цяпер вы зачытаеце шэраг сцверджанняў, з якімі ўдзельнікі могуць згадзіцца ў большай ці меншай ступені.
4. Звярніце ўвагу ўдзельнікаў на два плакаты з процілеглымі выказваннямі: «Я згаджаюся» і «Я не згаджаюся». Растлумачце ўдзельнікам, што яны могуць стаць на любым месы ўздоўж (уяўнай) лініі, але павінны пастарацца заняць месца як мага бліжэй да тых, чыё меркаванне максімальна супадае з іх меркаваннем. Удзельнікам дазваляецца коратка перагаворвацца, пакуль яны шукаюць сабе месцы.
5. Па чарзе зачытайце сцверджанні.
6. Заклікайце ўдзельнікаў абдумаць і абмеркаваць свае рашэнні. Папрасіце ўдзельнікаў, якія займаюць крайнія пазіцыі, растлумачыць, чаму яны сталі менавіта там. Спытайце тых, якія стаяць у цэнтры, што азначае яго пазіцыя: адсутнасць цвёрдага меркавання або адсутнасць адпаведных ведаў.

COMPASS

Агульныя правы чалавека

Грамадзянскасць і ўдзел

Беднасць

Узровень 2

Любы памер групы

50 хвілін

7. Дазвольце ўдзельнікам мяняць свае пазіцыі пасля таго, як яны выслухаюць довады іншых.
8. Пасля таго як вы абмяркуеце ўсе сцверджанні, збярыце ўсіх разам для аналізу.

### Аналіз і ацэнка

Спачатку абмяркуйце ход практыкавання, а потым спытайце, пра што новае даведаліся ўдзельнікі.

- Ці былі такія пытанні, на якія ўдзельнікі не маглі адказаць – або з-за таго, што ім цяжка было зрабіць выбар, або з-за незразумелай фармуліроўкі пытання?
- Чаму людзі мянялі свае пазіцыі ў ходзе дыскусіі?
- Ці стала нечаканасцю для ўдзельнікаў ступень іх рознагалосся па разгляданых пытаннях?
- Ці мае значэнне той факт, што меркаванні аб правах чалавека разыходзяцца?
- Ці лічыце вы, што існуюць «правільныя» або «няправільныя» адказы на розныя сцверджанні, або гэта пытанне асабістага меркавання?
- Ці можна чакаць, што калі-небудзь усе прыйдуць да адзінага меркавання па правах чалавека?
- Ці маецца прынцыповая розніца паміж (першымі) двума пакаленнямі правоў чалавека: грамадска-палітычнымі правамі і сацыяльна-эканамічнымі? Ці можна сказаць, якія з іх важней?
- Ці патрэбны нам яшчэ нейкія правы? Ці можа быць трэцяе пакаленне правоў чалавека?

## Парады для фасілітатараў

Вы можаце правесці асноўную частку практыкавання адносна хутка, не даючы шмат часу для абмеркавання паміж рознымі пунктамі, а пасля выбраць два ці тры сцверджанні і абмеркаваць іх больш падрабязна з усёй групай. Але мае сэнс спыніць практыкаванне ў пэўны момант, каб даць людзям магчымасць падумаць і пра некаторыя са сцверджанняў, і пра іх стаўленне да пазіцый іншых.

Гэта практыкаванне ахоплівае ўсе правы чалавека, але асаблівая ўвага надаецца сацыяльна-эканамічным правам, такім як права на працу, адпачынак, ахову здароўя і дастатковы жыццёвы ўзровень.

Прыведзеныя ніжэй сцверджанні сфармуляваны такім чынам, каб распачаць абмеркаванне ў кантэксце сучасных дэбатаў пра розніцу паміж грамадска-палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі правамі. У пачатку практыкавання няма неабходнасці паглыбляцца ў падрабязнасці, бо ў ходзе дыскусіі павінна з’явіцца шмат ідэй.

Аднак у якасці ўступлення можна спыніцца на двух момантах. Першы заключаецца ў тым, што дзве гэтыя групы правоў адрозніваюцца тым, што грамадска-палітычныя правы ўяўляюць сабой тыя маральныя патрабаванні, якія мы прад’яўляем ураду па грамадзянскіх і палітычных пытаннях, уключаючы права на справядлівы судовы разбор, права голасу, права на выказванне свайго меркавання і г. д., тады як сацыяльна-эканамічныя правы – гэта патрабаванні, звязаныя з сацыяльнымі і эканамічнымі пытаннямі, такімі як адсутнасць жылля, дрэннае медыцынскае забеспячэнне, беднасць і г. д.

Другі момант, на які варта звярнуць увагу ўдзельнікаў, заключаецца ў тым, што некаторыя бачаць прынцыповае адрозненне паміж рознымі катэгорыямі правоў. Многія сцвярджаюць, што сацыяльна-эканамічныя правы менш важныя, чым грамадска-палітычныя, і (або) іх складаней гарантаваць.

Падчас правядзення мазгавога штурму вы можаце раздаць удзельнікам копіі скарочанай версіі УДПЧ (старонка 600), каб асвяжыць яе ў памяці, ці ж зачытаць некаторыя з яе артыкулаў і папрасіць удзельнікаў аднесці іх да правільнай катэгорыі. Лічыцца, што артыкулы 16 і 22–29 у цэлым апісваюць сацыяльна-эканамічныя правы.

## Варыянты

Падрыхтуйце іншыя сцверджанні або папрасіце членаў групы прыдумаць свае.

## Прапановы па далейшай працы

Арганізуйце афіцыйныя дэбаты па адным з пытанняў, папрасіўшы ўдзельнікаў загадзя падрыхтаваць аргументы, а ў завяршэнне правядзіце галасаванне. Можаце запрасіць на гэтыя дэбаты іншых маладых людзей ці прадстаўнікоў грамадскасці.

Важна мець веды аб правах чалавека, але калі мы хочам забяспечыць гарантыі гэтых правоў, то неабходна быць яшчэ і актыўным грамадзянінам. Вам можа спадабацца практыкаванне «Выбірай!» на старонцы 164, прысвечанае таму, як пераканаць астатніх у правільнасці свайго меркавання.

У размове аб правах чалавека трэба старанна падбіраць словы і думаць пра тое, як яны будуць успрыняты. Напрыклад, трэба старанна выбіраць, што сказаць: «гей» або «гомасексуаліст», «людзі з абмежаванымі магчымасцямі», «інваліды» або «людзі з інваліднасцю». Магчыма, група захоча абмеркаваць пытанні паліткарэктнасці і прымальнай мовы на аснове практыкавання «Белая будучыня» з навучальнага пакета «Усе роўныя – усе розныя».

## Ідэі для дзеяння

Звяжыцеся з мясцовай арганізацыяй, якая займаецца пытаннямі правоў чалавека або сацыяльнага забеспячэння, і высветліце, які ўклад у яе працу вы можаце зрабіць.

## Дадатковая інфармацыя

У главе 4 дапаможніка ёсць даведачная інфармацыя аб розных пакаленнях правоў, у тым ліку ўводзіны да правоў «трэцяга пакалення».

## Раздатачныя матэрыялы

**Спіс сцверджанняў**

- Важней мець дом, ежу і прадметы першай неабходнасці, чым мець магчымасць сказаць тое, што хочаш.
- Праца – гэта абавязак, а не права чалавека.
- Самы галоўны абавязак любога ўрада заключаецца ў тым, каб накарміць усіх сваіх грамадзян.
- Права на «адпачынак і вольны час» – гэта раскоша, даступная толькі багатым.
- Не ўрад павінен клапаціцца пра тое, каб людзі не галадалі, а самі людзі!
- Для міжнароднай супольнасці не павінна мець значэнне, як мы абыходзімся са сваімі працаўнікамі.
- Бедныя краіны павінны ў першую чаргу забяспечыць базавы ўзровень жыцця для ўсіх, а ўжо пасля клапаціцца аб палітычных і грамадзянскіх правах сваіх народаў.
- Вельмі вялікая эканамічная няроўнасць з’яўляецца парушэннем асноўных правоў.
- Сацыяльна-эканамічныя правы апісваюць ідэал будучыні, але сучасны свет яшчэ не гатовы іх гарантаваць.
- Калі правы нельга гарантаваць, то ў іх няма ніякага сэнсу.
- Некаторыя правы важнейшыя за іншых.
- Так атрымліваецца, што ў некаторых людзей правоў больш, чым у іншых.
- Некаторыя людзі самі вырашылі стаць бяздомнымі.
- Багатыя больш шчаслівыя, чым бедныя.
- Немагчыма цалкам выкараніць беднасць.
- Мы не нараджаемся з правамі, мы іх атрымліваем.

COMPASS

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**5 снежня**
Міжнародны дзень добраахвотнікаў у імя эканамічнага і сацыяльнага развіцця

Гендарныя пытанні

Дыскрымінацыя і нецярпімасць

Рэлігія і вера

Узровень 2

Больш за 8 чалавек

25 хвілін

# Хто я такія?

*Я – гэта ўсе сувязі, якія я наладзіў з іншымі.*

Альбер Жакар

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • Гендарныя пытанні,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць,<br>• рэлігія і вера. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | больш за 8 чалавек |
| **Час** | 25 хвілін |
| **Агляд** | Гэта практыкаванне ўключае работу ў дыскусійных групах, мазгавы штурм, маляванне і групавую дыскусію, прысвечаныя вывучэнню розных бакоў асобы. |
| **Звязаныя правы** | • роўнасць чалавечай годнасці і правоў;<br>• свабода ад дыскрымінацыі;<br>• права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць. |
| **Мэты** | • паглыбіць разуменне канцэпцыі індывідуальнасці і пашырыць самасвядомасць;<br>• развіць навыкі камунікацыі;<br>• зацвердзіць салідарнасць і павагу. |
| **Матэрыялы** | • каляровыя ручкі і маркеры, па магчымасці розных колераў для кожнага ўдзельніка;<br>• па адным аркушы паперы на кожнага ўдзельніка;<br>• папера для фліпчарта і маркеры. |

## Інструкцыі

1. Для размінкі папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на пары, якія стануць дыскусійнымі групамі. Папрасіце іх уявіць сабе, што яны не знаёмы адзін з адным і павінны прадставіцца.
2. Затым прапануйце ўдзельнікам падумаць, пра што, на іх думку, важна ці цікава даведацца аб чалавеку падчас першай сустрэчы. Правядзіце мазгавы штурм, каб вызначыць агульныя катэгорыі такой інфармацыі, напрыклад імя, узрост, пол, нацыянальнасць, сямейнае становішча, веравызнанне, гендарная ідэнтычнасць, этнічная прыналежнасць, праца або вучоба, любімая музыка, хобі, віды спорту, любімыя і нелюбімыя рэчы ў цэлым і г. д.
3. Растлумачце ўдзельнікам, што яны павінны высветліць, ці шмат у іх агульнага з іншымі членамі групы. Раздайце ім паперу і ручкі і скажыце, што ў якасці першага кроку яны павінны адлюстраваць сваю асобу на малюнку. Яны павінны прадставіць сябе зоркамі, розныя аспекты асобы якіх выпраменьваюцца ў грамадства. Папрасіце членаў групы намаляваць сваю асабістую зорку, выбраўшы ад васьмі да дзесяці найбольш важных аспектаў сваёй асобы.
4. Няхай удзельнікі пройдуць па памяшканні і параўнаюць свае зоркі з зоркамі іншых. Калі хтосьці знойдзе ўдзельніка з такім жа праменем, ён павінен напісаць побач з гэтым праменем імя такога ўдзельніка (напрыклад, калі і Ян, і Анатоль намалявалі прамень «рэпер», яны абодва павінны напісаць імёны адзін аднаго каля гэтага праменя). Дайце 15 хвілін на выкананне гэтага задання.
5. Збярыце ўдзельнікаў у агульную групу і папрасіце расказаць, наколькі індывідуальнымі яны аказаліся. Вы можаце задаць наступныя пытанні:

- Якія аспекты асобы аказаліся агульнымі, а якія – непаўторнымі?
- Наколькі падобныя або розныя члены вашай групы? Чаго паміж імі больш – падабенства або адрозненняў?

6. У заключэнне правядзіце з групай мазгавы штурм па аспектах асобы, якія людзі выбіраюць самі і якія даюцца ім ад нараджэння. Запішыце іх у два слупкі на фліпчарце.

## Аналіз і ацэнка

Перайдзіце да абмеркавання таго, аб чым удзельнікі даведаліся пра сябе і пра іншых і якая тут прасочваецца сувязь з правамі чалавека.

- Аб чым удзельнікі даведаліся пра сябе? Ці цяжка было выбраць дзесяць самых важных характарыстык сваёй асобы?
- Ці былі ўдзельнікі здзіўлены вынікамі параўнання зорак? Больш ці менш у іх аказалася агульных бакоў, чым яны чакалі?
- Як паставіліся ўдзельнікі да разнастайнасці ў групе? Як яны лічаць: разнастайнасць робіць групу цікавейшай ці ж ускладняе сумесную працу?
- Ці мелі месца такія аспекты асобы іншых людзей, якія адразу ж выклікалі ва ўдзельнікаў рашучае абурэнне і словы: «Не, гэта не я!»? Напрыклад, я не футбольны фанат, не прыхільніца музыкі «тэхна», не аматар сабак, не гомасексуальнай арыентацыі і не хрысціянскай веры.
- Як развіваецца асоба? Якія яе бакі фарміруюцца пад уплывам грамадства, а якія ўласцівы ёй па прыродзе і з’яўляюцца нязменнымі?
- Калі ўзнімаць пытанне гендарнай ідэнтычнасці, якія яе аспекты фарміруюцца пад уплывам грамадства, а якія ўласцівы ёй па прыродзе і з’яўляюцца нязменнымі?
- Ці запісалі ўдзельнікі словы «жанчына» ці «мужчына»? Якія асацыяцыі выклікаюць словы «жанчына» і «мужчына» ва ўдзельнікаў? Ці аднолькавыя асацыяцыі ўзнікаюць у дачыненні да абодвух палоў і да ўсіх мужчын і ўсіх жанчын?
- У якой ступені людзей ацэньваюць па іх індывідуальных якасцях, і ў якой – па іх прыналежнасці да якой-небудзь групы?
- У якой ступені людзі вольныя ў выбары свайго самавызначэння? Якія гэта мае наступствы для іх саміх, для грамадства і асабліва для права чалавека на роўнасць і павагу?

## Парады для фасілітатараў

У назве гэтага практыкавання няма памылкі! Яно названа так спецыяльна, каб збянтэжыць удзельнікаў. Калі для гульні вам спатрэбіцца музычнае суправаджэнне, вы можаце выкарыстаць песню Фрэнка Запы «Ты ёсць тое, што ты быць, я быць тое, што ты ёсць…» (You are what you is, I is what you am…).

У ходзе размінкі вы можаце даць удзельнікам некаторыя падказкі, каб іх думкі ішлі ў патрэбным напрамку. Вы можаце прывесці ў прыклад сябе ці які-небудзь выдуманы персанаж.

Кожнаму ўдзельніку даецца свой колер для таго, каб яны ўсвядомілі, што кожны чалавек унікальны і што група ўяўляе сабой вясёлку з розных асоб. Калі ў вас вялікая група, а два або больш удзельнікаў атрымалі ручкі аднолькавага колеру, папрасіце іх пісаць розным почыркам.

Па жаданні вы можаце ўскладніць практыкаванне, прапанаваўшы ўдзельнікам намаляваць свае асабістыя зоркі з праменямі рознай даўжыні ў залежнасці ад таго, наколькі публічнай або прыватнай яны лічаць тую ці іншую адметную рысу сваёй асобы. Больш доўгія промені глыбей пранікаюць у грамадства і таму адлюстроўваюць больш публічныя бакі.

У ходзе заключнага мазгавога штурму могуць паўстаць наступныя аспекты (на шостым кроку):

- аспекты маёй асобы, якія я магу выбіраць: імя, сябры, праца, прыналежнасць да палітычнай партыі, любімая музыка, стыль адзення, футбольная каманда, за якую балець, месца жыхарства;
- аспекты маёй асобы, якія ўласцівы мне ад нараджэння: пол, узрост, рост, колер вачэй;
- некаторыя аспекты асобы могуць выклікаць неадназначную рэакцыю, напрыклад нацыянальнасць, гендарная ідэнтычнасць і сексуальная арыентацыя, веравызнанне, прыналежнасць да меншасцей.

**ВАЖНАЯ ДАТА**

**10 кастрычніка**
Сусветны дзень псіхічнага здароўя

У працэсе дыскусіі аб развіцці асобы, аб сацыяльна абумоўленых і атрыманых ад прыроды, нязменных аспектаў асобы таксама могуць узнікнуць спрэчныя пытанні, асабліва ў сувязі з веравызнаннем і гендарнай ідэнтычнасцю. Варта прапанаваць удзельнікам паразважаць над працэсам свайго сталення і над тым, як мяняліся з гадамі пэўныя аспекты іх асобы, можа быць, нават такія аспекты, якія яны лічылі нязменнымі.

Вы можаце зрабіць некаторыя высновы з дыскусіі, напрыклад, што мы ўсе – людзі, надзеленыя правамі, якія нельга падарыць і нельга адабраць, незалежна ад расы, колеру скуры, матэрыяльнага становішча, месца нараджэння і іншых прыкмет.

## Варыянты

Падчас працы над пунктам 3 інструкцый прапануйце ўдзельнікам намаляваць аўтапартрэт або прымацаваць сваю дзіцячую фатаграфію да цэнтра зоркі.

Калі імёны на зорках адсутнічаюць, удзельнікі могуць паспрабаваць адгадаць, якія зоркі каму належаць.

## Дадатковая інфармацыя

Навучальны пакет «Усе роўныя – усе розныя» змяшчае каштоўную інфармацыю і дадатковыя практыкаванні па пытаннях асобы.

## Прапановы па далейшай працы

Выканайце гэта практыкаванне, запрасіўшы да ўдзелу вашых сяброў, калег і членаў сям'і.

Гэта практыкаванне можна выкарыстаць як уводзіны да самых розных дыскусій, напрыклад, аб усеагульным характары правоў чалавека, аб дыскрымінацыі і ксенафобіі, аб правах дзяцей і аб грамадзянстве.

Калі група хоча працягнуць вывучэнне пытанняў асобы і гендарнай ідэнтычнасці, выканайце практыкаванне «Гераіні і героі» на старонцы 186.

Калі вы хочаце перайсці ад абмеркавання асобы да размовы аб праве чалавека на роўнасць і годнасць, а таксама аб правах чалавека ў цэлым, раім звярнуцца да практыкавання «Намалюй слова» на старонцы 156.

Калі ў вашай групе маюцца прадстаўнікі розных культур і вы жадаеце абудзіць цікавасць удзельнікаў да культур адзін аднаго, тады вам дапаможа практыкаванне «Мая гісторыя» з навучальнага пакета «Усе роўныя – усе розныя».



# Праца і дзеці

*Вам патрэбна праца? Тады не плануйце дзяцей!*

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • праца,<br>• гендарныя пытанні,<br>• дыскрымінацыя і нецярпімасць. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Памер групы** | 10–25 чалавек (малыя групы па 5 чалавек) |
| **Час** | 90 хвілін |
| **Агляд** | Гэта ролевая гульня на тэму:<br>• рэпрадуктыўных правоў на рабочым месцы;<br>• дыскрымінацыі жанчын на рабочым месцы. |
| **Звязаныя правы** | • права выбіраць працу па жаданні і ўступаць у прафсаюзы;<br>• права на ўступленне ў шлюб і стварэнне сям’і;<br>• свабода ад дыскрымінацыі. |
| **Мэты** | • паглыбіць веды аб рэпрадуктыўных правах жанчын;<br>• развіць навыкі крытычнага мыслення і вядзення дыскусіі;<br>• заахвоціць адкрытасць, пачуццё справядлівасці і сацыяльнай адказнасці. |
| **Матэрыялы** | • вялікі аркуш паперы, класная дошка або папера для фліпчарта, маркер;<br>• месца для працы ў малых групах і для ролевай гульні;<br>• дэкарацыі для ролевай гульні, стол і крэслы, ручка і папера. |
| **Падрыхтоўка** | • перапішыце сцэнарый на дошку, на вялікі аркуш паперы ці на фліпчарт. |

## Інструкцыі

1. Растлумачце, што тэмай ролевай гульні з’яўляюцца рэпрадуктыўныя правы жанчын на рабочым месцы. Правядзіце кароткі мазгавы штурм на тэму рэпрадуктыўных правоў жанчын, каб удзельнікі зразумелі, пра што ідзе гаворка.
2. Падзяліце ўдзельнікаў на малыя групы (максімум 5 чалавек у групе).
3. Зачытайце картку з апісаннем сітуацыі.
4. Дайце ўдзельнікам 20 хвілін, каб яны ў малых групах прыдумалі канчатак гісторыі і пераўтварылі яе ў сцэнку. Ролевая гульня павінна пачацца з сустрэчы Марыі і спадара Уладстока і не можа працягвацца больш за 5 хвілін.
5. Запрасіце ўсе малыя групы па чарзе прадставіць свае інсцэніроўкі. Каментарыі пакіньце для этапа аналізу.

## Аналіз і ацэнка

Пачніце з апытання малых груп аб тым, як яны прыдумлялі сцэнарыі сваіх ролевых гульняў, і дайце астатнім магчымасць выказаць сваё меркаванне. Затым пагаварыце пра наступствы гэтай сітуацыі і падумайце, як можна змагацца з дыскрымінацыяй такога роду.

- Ці здзівіла каго-небудзь такая сітуацыя? Ці здаралася падобнае ў вашай краіне?
- Як групы прыйшлі да рашэння аб далейшым развіцці гэтай сітуацыі?
- Ці былі прапанаваныя варыянты развіцця падзей рэалістычнымі? Што ў паводзінах Марыі магло ёй дапамагчы, а што згуляла супраць яе? Наколькі цяжка праяўляць у такіх сітуацыях настойлівасць, а не агрэсіўнасць або пакорлівасць?

**Праца**

**Гендарныя пытанні**

**Дыскрымінацыя і нецярпімасць**

**Узровень 2**

**10–25 чалавек (малыя групы па 5 чалавек)**

**90 хвілін**

- Якія правы маюць цяжарныя жанчыны на рабочым месцы ў вашай краіне?
- Чаму кампанія захацела паставіць Марыі такую ўмову? Ці справядлівая яна? Чаму не?
- Ці былі парушаны правы чалавека? Калі так, то якія?
- Калі б Марыя была мужчынам, ці папала б яна ў такую сітуацыю? Чаму? Чаму не?
- Чым адрозніваецца мужчынскі погляд на гэту праблему ад погляду жанчыны?
- Што, на вашу думку, можна зрабіць для прасоўвання і абароны рэпрадуктыўных правоў жанчын?

## Парады для фасілітатараў

Падумайце, ці варта ўключаць у малыя групы роўную колькасць юнакоў і дзяўчат. Вопыт падказвае, што заняткі ў «аднаполых» групах часта прыводзяць да больш правакацыйных паваротаў сюжэту, а дыскусія праходзіць больш жвава.

Удзельнікам можа быць не вядомы тэрмін «рэпрадуктыўныя правы», таму вам, магчыма, трэба будзе пазнаёміць іх з некаторымі ідэямі, каб яны маглі ўявіць сабе агульную карціну таго, што адбываецца.

Рэпрадуктыўныя правы ўключаюць права на:

- сексуальныя адносіны, якія прыносяць задавальненне, без страху заразіцца або захварэць;
- выбар, мець ці не мець дзяцей;
- паслугі службы па планаванні сям’і з магчымасцю зрабіць аборт пры паважлівым і чуйным абыходжанні з жанчынай і захаванні канфідэнцыяльнасці;
- палавое выхаванне.

Памятайце, што пры абмеркаванні выпадку з парушэннем правоў Марыі можа паўстаць такое спрэчнае пытанне, як аборт і проціпастаўленне правы жанчыны на выбар і права плода на жыццё. Гэта вельмі важная тэма, якая таксама мае вельмі асаблівае дачыненне да адукацыі ў галіне правоў чалавека, таму што патрабуе ад удзельнікаў непрадузятага стаўлення, адмовы ад стэрэатыпаў і забабонаў і выкарыстання навыкаў крытычнага мыслення. Яна добра ілюструе складанасць, уласцівую правам чалавека. Калі такое пытанне ўзнікне, вы можаце арганізаваць яго асобнае абмеркаванне ў іншы час.

## Варыянты

Выкарыстайце метад форум-тэатра (гл. старонку 67). Замест таго каб падзяліць усіх удзельнікаў на малыя групы, вы можаце папрасіць двух добраахвотнікаў разыграць сцэнку паміж Марыяй і спадаром Уладстокам перад астатнімі ўдзельнікамі, якія будуць выступаць у ролі назіральнікаў. Вы можаце перыядычна перапыняць прадстаўленне і прасіць назіральнікаў выказаць сваё меркаванне і здагадкі наконт таго, што павінна адбыцца далей. Як варыянт, назіральнікі могуць проста мяняцца месцамі з акцёрамі, каб прадставіць сітуацыю з іншага пункту гледжання і змяніць сюжэт ролевай гульні.

У гульню можна ўвесці і іншых персанажаў, напрыклад мужа Марыі, які можа быць прадстаўніком прафсаюза, і тады сітуацыя выйдзе за рамкі сустрэчы з супрацоўнікам аддзела кадраў.

Вы можаце замяняць імёны персанажаў на тыя, што больш распаўсюджаны ў вашай краіне.

Некаторым людзям цяжка ўдзельнічаць у ролевай гульні, тады замест яе прапануйце ім расказаць гісторыю. Падзяліце ўдзельнікаў на малыя групы, выдайце кожнай лісток з гісторыяй, папрасіце абмеркаваць яе і напісаць свой варыянт канцоўкі. Затым збярыце групы на агульнае пасяджэнне і параўнайце розныя варыянты канцовак.

## Прапановы па далейшай працы

Калі палавое выхаванне ўваходзіць у вучэбную праграму вашай школы, папрасіце вашага калегу-настаўніка ўключыць практыкаванне «Праца і дзеці» у план аднаго з урокаў. У якасці альтэрнатывы гэта практыкаванне можна выканаць на ўроку грамадазнаўства або гісторыі ці ў сувязі са святкаваннем Міжнароднага жаночага дня (8 сакавіка) або Міжнароднага дня сям’і (15 мая).

Група можа правесці невялікае даследаванне па пытанні рэпрадуктыўных правоў у вашай краіне. Пасля гэтага можна правесці апытанне як сярод жанчын, так і сярод працадаўцаў, каб паглядзець, як заканадаўства працуе на практыцы.

Удзельнікі таксама могуць вывучыць сітуацыю з палавым выхаваннем у іх краіне. Ці ахоплівае яна ўсе аспекты рэпрадуктыўных правоў?

Калі вы хочаце разгледзець іншыя віды дыскрымінацыі на рабочым месцы, можна правесці практыкаванне «Розныя зарплаты» на старонцы 135.

## Ідэі для дзеяння

Абмяркуйце пытанні рэпрадуктыўных правоў на савеце сваёй школы ці арганізацыі.

Высветліце, якія мясцовыя НГА выступаюць за рэпрадуктыўныя правы жанчын, і прыміце ўдзел у арганізаваных імі дэбатах і кампаніях.

## Дадатковая інфармацыя

**Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын**

Акрамя пытанняў грамадзянскіх правоў, Канвенцыя таксама надае асаблівую ўвагу пытанню, якое з'яўляецца жыццёва важным для жанчын, а менавіта пытанню аб рэпрадуктыўных правах. У прэамбуле гаворыцца, што «роля жанчыны ў дзетараджэнні не павінна быць падставай для дыскрымінацыі».

Канвенцыя пастаянна звяртае ўвагу на сувязь паміж дыскрымінацыяй жанчын і іх рэпрадуктыўнай роллю. Напрыклад, у артыкуле 5 Канвенцыя адстойвае «правільнае разуменне мацярынства як сацыяльнай функцыі», патрабуючы роўнай сумеснай адказнасці абодвух палоў за выхаванне дзяцей. Адпаведна, палажэнні аб абароне мацярынства і выхаванні дзяцей абвяшчаюцца як найважнейшыя правы і ўключаюцца ва ўсе раздзелы Канвенцыі, якія адносяцца да працаўладкавання, сямейнага права, аховы здароўя і адукацыі. Абавязацельствы з боку грамадства ўключаюць забеспячэнне сацыяльных паслуг, асабліва па доглядзе за дзецьмі, каб даць магчымасць грамадзянам спалучаць сямейныя абавязкі з працай і ўдзелам у грамадскім жыцці. Рэкамендуецца прыняцце спецыяльных мер па абароне мацярынства, якія «не павінны быць дыскрымінацыйнымі».

Артыкул 4 Канвенцыі таксама сцвярджае права жанчыны на рэпрадуктыўны выбар. Характэрна, што гэта адзіны дакумент па правах чалавека, які закранае пытанне планавання сям'і. Яна абвяшчае, што бакі прымаюць на сябе абавязацельства ўключыць кансультацыі па пытаннях планавання сям'і ў адукацыйны працэс (артыкул 10.h) і абавязацельства распрацаваць сямейны кодэкс, які гарантуе права жанчыны «свабодна і адказна вырашаць пытанне аб колькасці дзяцей і прамежку паміж іх нараджэннямі і мець доступ да інфармацыі, адукацыі і сродкаў, якія дазваляць ёй ажыццявіць гэта права» (артыкул 16.е).

## Раздатачныя матэрыялы

**Сцэнарый**

Марыя ўжо амаль год сядзіць без працы і актыўна яе шукае. Дзесяць дзён назад яна праходзіла інтэрв'ю на заняцце выдатнай пасады, пра якую яна заўсёды марыла. Усё склалася вельмі ўдала, і ёй прапанавалі гэта месца. Кампанія папрасіла яе падысці да спадара Уладстока, супрацоўніка аддзела кадраў, і падпісаць кантракт. Свае абавязкі і іншыя звязаныя з працай пытанні яна абмеркавала падчас інтэрв'ю. Марыя ўжо збіралася падпісаць кантракт, калі спадар Уладсток паведаміў ёй, што адной з умоў яе прыёму на працу стане падпісанне ёю абавязацельства не мець дзяцей на працягу двух наступных гадоў.

COMPASS

ВАЖНАЯ ДАТА

**15 мая**
Міжнародны дзень сям'і

www.un.org/womenwatch

# Каляндар правоў чалавека

Прыведзены ніжэй каляндар уяўляе сабой абноўлены спіс дзён, у якія людзі ва ўсім свеце адзначаюць правы чалавека, шануюць іх абаронцаў, успамінаюць парушэнні правоў чалавека, а таксама выказваюць свае надзеі і радасць. Памятныя даты, прыведзеныя ў спісе, уключаюць міжнародныя дні, афіцыйна абвешчаныя ААН, сусветныя дні, якія прызнаюцца НГА, гадавіны гістарычных падзей і дні нараджэння некаторых вядомых праваабаронцаў. Гэты спіс нельга лічыць поўным ці канчатковым – ён з’яўляецца толькі зыходным пунктам, і вы можаце дапаўняць яго ўласнымі памятнымі датамі.

Каляндар можна скапіраваць, аформіць у выглядзе плаката і выкарыстоўваць як насценны каляндар, каб абудзіць цікавасць да праблем правоў чалавека, паколькі ён дае добрае ўяўленне аб іх маштабе і разнастайнасці. Папрасіце ўдзельнікаў адказаць на пытанні: ці ўсе пералічаныя падзеі маюць для іх якое-небудзь значэнне? Якія мясцовыя і нацыянальныя важныя даты яны хацелі б дадаць?

Кожнае практыкаванне, прыведзенае ў главе 2, звязана з якой-небудзь памятнай датай. Каляндар можна выкарыстоўваць у якасці інструмента для распрацоўкі гадавой адукацыйнай праграмы ў сферы правоў чалавека. У пачатку кожнага тыдня або кожнага месяца можна праводзіць «тэматычнае» практыкаванне, напрыклад, 3 мая, у Сусветны дзень свабоды друку, можна правесці практыкаванне «Першая паласа», а 25 лістапада, у Міжнародны дзень ліквідацыі гвалту ў адносінах да жанчын, – практыкаванне «Хатнія справы». Можа здарыцца і так, што група захоча ўзяцца за справу і прыняць удзел у дзеяннях або мерапрыемствах, якія праводзяцца іншымі арганізацыямі, напрыклад экалагічнай групай у Дзень Зямлі, 22 красавіка.

Калі вам патрэбны зыходныя ідэі, каб пачаць нешта рабіць, вы можаце звярнуцца да раздзела «Практычная дзейнасць ад А да Я» ў навучальным пакеце «Усе роўныя – усе розныя». Падказкі і інструкцыі для ажыццяўлення эфектыўных дзеянняў вы знойдзеце ў главе 3 гэтага дапаможніка «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека».

Як разуменне правоў чалавека змяняецца і развіваецца з кожным годам, так мусіць мяняцца і развівацца гэты каляндар. Найважнейшая задача для вас – карыстальнікаў гэтага дапаможніка – заключаецца ў пошуку новых форм прыцягнення ўвагі да правоў чалавека штодня на працягу ўсяго года.

| Дата | Памятны дзень | Інфармацыя пра дату | Практыкаванне |
|---|---|---|---|
| 27 студзеня | Дзень памяці ахвяр халакосту | 27 студзеня быў вызвалены Аўшвіц-Біркенау – найбуйнейшы нацысцкі канцлагер. У 2005 годзе Генеральная Асамблея ААН абвясціла гэты дзень Міжнародным днём памяці ахвяр халакосту ў гонар тых, хто пацярпеў ад нацызму. | Тэгі памяці |
| 8 лютага | Сусветны дзень бяспечнага Інтэрнэту | Дзень бяспечнага Інтэрнэту арганізаваны Еўрапейскай сеткай цэнтраў бяспечнага Інтэрнэту Insafe для прасоўвання больш бяспечнага і адказнага выкарыстання анлайн-тэхналогіі і мабільных тэлефонаў, асабліва сярод дзяцей і моладзі. | Маё жыццё не шоу! |
| 12 лютага | Дзень чырвонай рукі | Арганізацыі, якія падтрымліваюць глабальную кампанію чырвонай рукі для спынення выкарыстання дзяцей-салдат, уключаюць Human Rights Watch, Amnesty International, Маладзёжны Чырвоны Крыж у Германіі, Terre des Hommes і Plan International. | Кіданне камянёў |
| 21 лютага | Міжнародны дзень роднай мовы | З 1999 года падтрымліваецца ЮНЕСКА з мэтай заахвочваць шырокія міжнародныя абавязацельствы па прасоўванні шматмоўя і лінгвістычнай разнастайнасці, уключаючы абарону моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення. | Моўны бар’ер |
| 8 сакавіка | Міжнародны жаночы дзень | 8 сакавіка – Міжнародны жаночы дзень, у які адзначаюць эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя дасягненні жанчын у мінулым, сучаснасці і будучыні. Упершыню Міжнародны жаночы дзень адзначаўся ў 1911 годзе. ААН пачала адзначаць Міжнародны жаночы дзень у 1975 годзе. | Шлях у краіну Роўнасці |

| Дата | Памятны дзень | Інфармацыя пра дату | Практыкаванне |
|---|---|---|---|
| 12 сакавіка | Сусветны дзень барацьбы з цэнзурай у Інтэрнэце | Сусветны дзень барацьбы з цэнзурай у Інтэрнэце быў абвешчаны 12 сакавіка 2009 года па просьбе арганізацый «Рэпарцёры без меж» і Amnesty International. | |
| 18 сакавіка | Першыя ў Еўропе парламенцкія выбары шляхам усеагульнага галасавання | Гэта адбылося ў Фінляндыі ў 1917 годзе. | Галасаваць ці не галасаваць? |
| 21 сакавіка | Сусветны дзень паэзіі | Заснаваны ЮНЕСКА ў 1999 годзе. Мэта гэтага дня – спрыяць чытанню, складанню, публікацыі вершаў і выкладанню паэзіі ва ўсім свеце. | |
| 21 сакавіка | Міжнародны дзень барацьбы за ліквідацыю расавай дыскрымінацыі | У гэты дзень у 1960 годзе паліцыя адкрыла агонь і забіла 69 чалавек падчас мірнай дэманстрацыі супраць законаў рэжыму апартэіду ў Шарпевілі (Паўднёвая Афрыка). Абвясціўшы гэты дзень у 1966 годзе, Генеральная Асамблея ААН заклікала сусветную супольнасць падвоіць намаганні, накіраваныя на знішчэнне ўсіх форм расавай дыскрымінацыі. | Адказ расізму |
| 22 сакавіка | Сусветны дзень водных рэсурсаў | Упершыню быў афіцыйна прапанаваны ў рамках дакумента «Парадак дня на XXI стагоддзе» на Канферэнцыі ААН па навакольным асяроддзі і развіцці (ЮНСЕД), якая прайшла ў 1992 годзе ў Рыа-дэ-Жанэйра (Бразілія), і пачаў адзначацца ў 1993 годзе. Яго мэта – садзейнічаць распаўсюджванню інфармацыі пра тое, наколькі развіццё водных рэсурсаў спрыяе эканамічнай прадукцыйнасці і сацыяльнаму дабрабыту. | |
| 23 сакавіка | Сусветны метэаралагічны дзень | Праца Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА) у галіне прагназавання надвор'я надзвычай важная для такіх абласцей, як харчовая бяспека, водныя рэсурсы і транспарт. | |
| 24 сакавіка | Сусветны дзень барацьбы з сухотамі | У гэты дзень у 1882 годзе годзе доктар Роберт Кох прадставіў сваё адкрыццё сухотнай палачкі групе лекараў у Берліне. Афіцыйна гэты дзень быў абвешчаны ў 1992 годзе Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя. | |
| 2-гі аўторак красавіка | Еўрапейскі дзень роўнай зарплаты | Заснаваны фондам BPW Europe, які аб'ядноўвае жанчын у бізнесе і прафесіі. | Розныя зарплаты |
| 7 красавіка | Сусветны дзень здароўя | Абвешчаны ў 1950 годзе Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя для павышэння дасведчанасці аб непатрэбных пакутах і намаганнях, неабходных для забеспячэння жыцця і добрага здароўя. | Хвіліначку |
| 8 красавіка | Міжнародны дзень цыганоў-рама | Гэты дзень быў афіцыйна абвешчаны ў 1990 годзе для падтрымкі цыганскай культуры і павышэння дасведчанасці аб праблемах, з якімі сутыкаюцца цыганы-рама. | Доста! |
| 23 красавіка | Сусветны дзень кніг і аўтарскага права | Адзначаючы гэты дзень, ЮНЕСКА імкнецца паспрыяць чытанню, выдавецкай справе і абароне інтэлектуальнай уласнасці пры дапамозе аўтарскага права. Гэты дзень упершыню адзначаўся ў 1995 годзе. Таксама вядомы як Сусветны дзень кнігі. | |
| 28 красавіка | Сусветны дзень аховы працы | Абвешчаны Міжнароднай арганізацыяй працы (МАП). | |
| 1 мая | Дзень міжнароднай салідарнасці рабочых | Таксама вядомы як «Першае мая». Адзначаецца як свята міжнароднага працоўнага руху. | Пасяджэнне прафсаюза |
| 2-я субота мая | Сусветны дзень справядлівага гандлю | Заснаваны Сусветнай арганізацыяй справядлівага гандлю. | Увага, мы ўсё бачым! |
| 3 мая | Сусветны дзень свабоды друку | Абвешчаны ЮНЕСКА ў 1993 годзе для падтрымкі свабоды друку ва ўсім свеце і прызнання свабоднай, плюралістычнай і незалежнай прэсы неад'емным кампанентам дэмакратычнага грамадства. | Першая паласа |
| 5 мая | Дзень Еўропы (для Савета Еўропы) | Штогадовае свята міру і адзінства ў Еўропе. Існуюць два асобныя святы, якія носяць назву «Дзень Еўропы»: 5 мая для Савета Еўропы і 9 мая для Еўрапейскага саюза. | Усе роўныя – усе розныя |

| Дата | Памятны дзень | Інфармацыя пра дату | Практыкаванне |
|---|---|---|---|
| 8 мая | Міжнародны дзень Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца | У гэты дзень успамінаюцца і прызнаюцца заслугі Нацыянальных таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца ва ўсім свеце. | «Бінга!» на тэму правоў |
| 8–9 мая | Дні памяці і прымірэння ў гонар тых, хто аддаў сваё жыццё падчас Другой сусветнай вайны | Абвешчаны ў 2004 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН у памяць аб усіх, хто загінуў падчас Другой сусветнай вайны. | Тэгі памяці |
| 15 мая | Міжнародны дзень сям'і | Абвешчаны ў 1993 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН для павышэння дасведчанасці аб пытаннях сям'і. | Праца і дзеці |
| 15 мая | Міжнародны дзень адмовы ад ваеннай службы па перакананнях сумлення | Заснаваны Інтэрнацыяналам праціўнікаў вайны для прасоўвання негвалтоўных дзеянняў супраць прычын вайны, а таксама для падтрымкі і аб'яднання ва ўсім свеце людзей, якія адмаўляюцца ад удзелу ў вайне або ў падрыхтоўцы да вайны. | |
| 17 мая | Міжнародны дзень барацьбы з гамафобіяй і трансфобіяй | ЮНЭЙДС, Аб'яднаная праграма ААН па ВІЧ (СНІДу). Каардынуецца «Камітэтам IDAHO», размешчаным у Парыжы. | Пагаворым пра секс |
| 17 мая | Сусветны дзень электрасувязі і інфармацыйнага грамадства | Заснаваны ААН у 2005 годзе для павышэння глабальнай дасведчанасці ў пытаннях сацыяльных змен, выкліканых з'яўленнем Інтэрнэту і новых тэхналогій. Адной з яго мэт з'яўляецца таксама памяншэнне лічбавага разрыву. | Уздзеянне Інтэрнэту |
| 21 мая | Сусветны дзень барацьбы з тэрарызмам | Сусветны дзень барацьбы з тэрарызмам накіраваны супраць усіх форм тэрарызму і гвалту. Ён быў заснаваны ў Індыі, таму што «кожны год тысячы маладых людзей пападаюць у сеткі тэрарыстычных лагераў і арганізацый». | Тэрарызм |
| 21 мая | Сусветны дзень культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця | Абвешчаны ў 2002 годзе ААН для абароны культурнай разнастайнасці як сродку дасягнення росквіту, устойлівага развіцця і мірнага суіснавання ў глабальных маштабах. | Варыянты нашай будучыні |
| 22 мая | Міжнародны дзень біялагічнай разнастайнасці | Заснаваны Генеральнай Асамблеяй ААН у 2000 годзе для садзейнічання біялагічнай разнастайнасці. Раней святкаваўся 29 снежня. | |
| 26 мая | Сусветны дзень масавага спорту | Праводзіцца штогод асацыяцыяй TAFISA (міжнароднай асацыяцыяй, якая прасоўвае ідэю «Спорт для ўсіх»). У гэты дзень супольнасці ва ўсім свеце спаборнічаюць адна з адной, каб матываваць як мага больш людзей быць больш фізічна актыўнымі. | Спорт для ўсіх |
| 28 мая | Еўрапейскае свята суседзяў | Гэты дзень фінансуецца Саветам Еўропы і накіраваны на ўмацаванне мясцовых супольнасцей з дапамогай арганізацыі раённых свят і іншых падобных мерапрыемстваў. | Кветкі і правы |
| 29 мая | Міжнародны дзень міратворцаў ААН | Абвешчаны ААН у 2002 годзе ў гонар усіх мужчын і жанчын, якія прымалі ўдзел у міратворчых аперацыях ААН і паказалі высокі ўзровень прафесіяналізму, адданасць і адвагу; свята шануе памяць тых, хто аддаў сваё жыццё за справу міру. | |
| 31 мая | Сусветны дзень без тытуню | Заснаваны ў 1987 годзе Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя для заахвочвання 24-часовага ўстрымання ад усіх форм тытуню і прыцягнення ўвагі сусветнай супольнасці да шырока распаўсюджанага ўжывання тытуню і адпаведных рызык для здароўя. | |
| 4 чэрвеня | Міжнародны дзень нявінных дзяцей – ахвяр агрэсіі | Праводзіцца з 1982 года для прызнання і напаміну людзям пра пакуты мноства дзяцей – ахвяр фізічнага, псіхалагічнага і эмацыянальнага гвалту і пра неабходнасць абароны правоў дзяцей. | Ці ёсць у нас альтэрнатывы? |

| Дата | Памятны дзень | Інфармацыя пра дату | Практыкаванне |
|---|---|---|---|
| 5 чэрвеня | Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя | Генеральная Асамблея ААН абвясціла гэты дзень у 1972 годзе з мэтай павысіць дасведчанасць грамадства пра неабходнасць аховы навакольнага асяроддзя. | Пагуляем на пальцах! |
| 12 чэрвеня | Сусветны дзень барацьбы з дзіцячай працай | Міжнародная арганізацыя працы (МАП) упершыню адзначыла Сусветны дзень барацьбы з дзіцячай працай у 2002 годзе. | Гісторыя Ашыка |
| 17 чэрвеня | Сусветны дзень барацьбы з апустыньваннем і засухай | Абвешчаны ААН у 1995 годзе для павышэння дасведчанасці аб неабходнасці міжнароднага супрацоўніцтва для барацьбы з апустыньваннем і наступствамі засухі, уключаючы рэалізацыю Канвенцыі па барацьбе з апустыньваннем. | |
| 20 чэрвеня | Сусветны дзень бежанцаў | Абвешчаны ў 2000 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН у гонар 50-гадовага юбілею прыняцця Канвенцыі аб статусе бежанцаў 1951 года. | Можна ўвайсці? |
| 23 чэрвеня | Дзень дзяржаўнай службы ААН | Абвешчаны ААН з мэтай падкрэсліць уклад дзяржаўнай службы ў працэс развіцця. | |
| 26 чэрвеня | Міжнародны дзень барацьбы з ужываннем наркотыкаў і іх незаконным абаротам | У 1987 годзе Генеральная Асамблея ААН вырашыла абвясціць гэты дзень для ўзмацнення мер і супрацоўніцтва з мэтай вызвалення сусветнага грамадства ад наркотыкаў. | |
| 26 чэрвеня | Міжнародны дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у падтрымку ахвяр катаванняў | Абвешчаны ААН у 1997 годзе, гэты дзень накіраваны на ліквідацыю катаванняў і эфектыўнае выкананне Канвенцыі 1984 года супраць катаванняў і іншага жорсткага, бесчалавечнага або зневажальнага абыходжання ці пакарання. Упершыню гэты дзень быў адзначаны 26 чэрвеня 1987 года. | *Чахал супраць Вялікабрытаніі* |
| 1-я субота ліпеня | Міжнародны дзень кааператываў | Абвешчаны ў 1992 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН. Гэтай датай адзначаецца стагоддзе Міжнароднага кааператыўнага альянсу ў пацвярджэнне таго, што кааператывы з'яўляюцца неабходным фактарам эканамічнага і сацыяльнага развіцця. | |
| 11 ліпеня | Сусветны дзень народанасельніцтва | Абвешчаны ў 1989 годзе Праграмай развіцця ААН (ПРААН) для прыцягнення ўвагі да тэрміновасці і важнасці праблем народанасельніцтва. | |
| 18 ліпеня | Міжнародны дзень Нельсана Мандэлы | У 2009 годзе ААН абвясціла 18 ліпеня «Міжнародным днём Нельсана Мандэлы» ў знак прызнання ўкладу былога прэзідэнта Паўднёвай Афрыкі ў культуру міру і свабоды. | Гераіні і героі |
| 2 жніўня | Дзень памяці ахвяр генацыду цыганоў-рама і сінці | Гэта дата азначае ліквідацыю так званага «сямейнага цыганскага лагера», калі нацысты забілі амаль тры тысячы мужчын, жанчын і дзяцей у газавых камерах Біркенау ў ноч з 2 на 3 жніўня 1944 года. | |
| 6 жніўня | Дзень памяці ахвяр Хірасімы | У гэты дзень шануюць памяць ахвяр першай атамнай бамбардзіроўкі ў Хірасіме (Японія) у 1945 годзе. | |
| 9 жніўня | Міжнародны дзень карэнных народаў свету | Абвешчаны ў 1994 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН для падтрымкі і абароны правоў карэнных народаў свету. | Мака-кітабоі |
| 12 жніўня | Міжнародны дзень моладзі | Абвешчаны ААН у 1999 годзе для прыцягнення ўвагі да праблем моладзі ва ўсім свеце. | Варыянты нашай будучыні |
| 23 жніўня | Міжнародны дзень памяці ахвяр гандлю рабамі і яго ліквідацыі | Дзень, абвешчаны ЮНЕСКА ў памяць ахвяр трансатлантычнага гандлю рабамі. Ён нагадвае пра падзеі, якія адбыліся 23 жніўня 1791 года, калі рабы Санта-Дамінга ў Карыбскім басейне паднялі паўстанне, якое ў канчатковым выніку прывяло да рэвалюцыі на Гаіці і спрыяла справе абароны правоў чалавека. | Храналогія правоў |
| | Еўрапейскі дзень памяці ахвяр сталінізму і нацызму | Абвешчаны Еўрапейскім парламентам у 2008 годзе. | |

| Дата | Памятны дзень | Інфармацыя пра дату | Практыкаванне |
|---|---|---|---|
| 8 верасня | Міжнародны дзень пісьменнасці | Абвешчаны ЮНЕСКА, гэты дзень упершыню быў адзначаны ў 1966 годзе. Яго мэта – падкрэсліць важнасць пісьменнасці для асоб, супольнасцей і грамадстваў. | Адукацыя для ўсіх? |
| 15 верасня | Міжнародны дзень дэмакратыі | Абвешчаны ААН у 2007 годзе. | Вузы супрацоўніцтва |
| 19 верасня | Дзень выбарчага права | У гэты дзень у 1893 годзе Новая Зеландыя дала жанчынам права голасу, стаўшы такім чынам першай краінай свету, у якой было ўведзена ўсеагульнае выбарчае права. | Выбірай! |
| 21 верасня | Міжнародны дзень міру | Абвешчаны ў 1981 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН як дзень усеагульнага спынення агню і адмовы ад гвалту, запрашэнне ўсіх нацый і людзей спыніць варожыя дзеянні ўсяго на адзін дзень. | Мячэць у Сліпівілі |
| 28 верасня | Міжнародны дзень права ведаць | Заснаваны прыхільнікамі свабоднага доступу да інфармацыі ва ўсім свеце. Упершыню адзначаўся ў 2003 годзе. Яго мэта – павышэнне дасведчанасці аб праве кожнага на доступ да інфармацыі, якой валодае ўрад. | На лесвіцы |
| 1-шы панядзелак кастрычніка | Сусветны дзень Хабітат (гарадоў без трушчоб) | Упершыню адзначаўся ў 1986 годзе. Мэта гэтага дня – заклікаць задумацца пра стан нашых гарадоў і асноўнае права чалавека на прыдатнае жыллё. | Аповесць пра два горады |
| 2-я серада кастрычніка | Міжнародны дзень змяншэння рызыкі стыхійных бедстваў | Абвешчаны ААН у 2002 годзе для прасоўвання глабальнай культуры памяншэння рызыкі бедстваў, уключаючы іх прадухіленне, змякчэнне і гатоўнасць да іх. | Сетка жыцця |
| 1 кастрычніка | Міжнародны дзень пажылых людзей | У 1990 годзе Генеральная Асамблея ААН абвясціла гэты дзень з мэтай павышэння дасведчанасці па пытаннях, якія тычацца пажылых людзей, і для прызнання ўкладу пажылых людзей у грамадства. | |
| 1 кастрычніка | Міжнародны дзень музыкі | Абвешчаны ў 1975 годзе Міжнародным музычным саветам для прасоўвання музыкі ва ўсіх пластах грамадства. | |
| 2 кастрычніка | Міжнародны дзень ненасілля | Міжнародны дзень ненасілля, абвешчаны ААН, прасоўвае ненасілле праз адукацыю і павышэнне дасведчанасці. Супадае з днём нараджэння Махатмы Гандзі. | Гвалт у маім жыцці |
| 5 кастрычніка | Сусветны дзень настаўніка | Абвешчаны ЮНЕСКА ў 1994 годзе з мэтай мабілізаваць падтрымку настаўнікаў і забяспечыць задавальненне настаўнікамі патрэб будучых пакаленняў. | Хутка састарэе |
| 7 кастрычніка | Сусветны дзень дзеянняў за дастойную працу | Абвешчанае ў 2008 годзе Міжнароднай канфедэрацыяй прафсаюзаў, гэта свята прысвечана змаганню прафсаюзаў ва ўсім свеце за дастойную працу. | Я хачу працаваць! |
| 2-гі чацвер кастрычніка | Сусветны дзень зроку | Сусветная арганізацыя аховы здароўя абвясціла гэты дзень днём прыцягнення глабальнай увагі да праблем слепаты, праблем зроку і рэабілітацыі людзей з праблемамі зроку. | Змяніце свае акуляры |
| 10 кастрычніка | Міжнародны дзень барацьбы са смяротным пакараннем | Адзначаецца з 2002 года па ініцыятыве Сусветнай кааліцыі супраць смяротнага пакарання. | Калі прыйдзе заўтра |
| 10 кастрычніка | Сусветны дзень псіхічнага здароўя | Упершыню адзначаўся ў 1992 годзе па ініцыятыве Сусветнай федэрацыі псіхічнага здароўя. | Хто я такія? |
| Тыдзень, на які выпадае 15 кастрычніка | Еўрапейскі тыдзень мясцовай дэмакратыі | Падтрымліваецца Саветам Еўропы для ўмацавання ведаў аб мясцовай дэмакратыі і прасоўвання ідэі аб удзеле ў мясцовым дэмакратычным жыцці. | Пачуць голас кожнага |
| 16 кастрычніка | Сусветны дзень харчавання | Абвешчаны ААН у 1979 годзе для павышэння дасведчанасці насельніцтва аб сусветнай праблеме харчавання і ўмацавання салідарнасці ў барацьбе з голадам, недаяданнем і беднасцю. | Зрабі крок наперад |
| 17 кастрычніка | Міжнародны дзень барацьбы за ліквідацыю беднасці | Абвешчаны ў 1992 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН для павышэння дасведчанасці аб неабходнасці ліквідацыі беднасці і нястачы ва ўсіх краінах, асабліва ў краінах, якія развіваюцца. | Барацьба за багацце і ўладу |

| Дата | Памятны дзень | Інфармацыя пра дату | Практыкаванне |
|---|---|---|---|
| 24 кастрычніка | Дзень Арганізацыі Аб’яднаных Нацый | Абвешчаны ў 1947 годзе ў гонар юбілею прыняцця Статута ААН. Гэты дзень «павінен быць прысвечаны інфармаванню народаў свету аб мэтах і дасягненнях Арганізацыі Аб’яднаных Нацый і ўзмацненню падтрымкі яе працы». | |
| 24–30 кастрычніка | Тыдзень раззбраення | У 1978 годзе ААН абвясціла Тыдзень раззбраення, каб падкрэсліць небяспеку гонкі ўзбраенняў, распаўсюдзіць інфармацыю пра неабходнасць яе спынення і павысіць разуменне насельніцтвам тэрміновасці праблемы раззбраення. | |
| 25 кастрычніка | Міжнародны дзень мастака | Міжнародны дзень мастака быў абвешчаны па масавай ініцыятыве простых людзей. 25 кастрычніка – дзень нараджэння Пікаса. | Гульні з відарысамі |
| 3 лістапада | Міжнародны дзень мужчын | Міжнародны дзень мужчын быў упершыню адзначаны ў 1999 годзе ў Трынідадзе і Табага. Гэта свята падтрымлівае ААН. Яно прыцягвае ўвагу да здароўя мужчын і хлопчыкаў, паляпшае гендарныя адносіны і падкрэслівае станоўчыя мужчынскія мадэлі для пераймання. | Шлях у краіну Роўнасці |
| 4 лістапада | Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека | Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека была падпісана ў гэты дзень у 1950 годзе. | Электрастанцыя |
| 6 лістапада | Міжнародны дзень прадухілення эксплуатацыі навакольнага асяроддзя падчас вайны і ўзброеных канфліктаў | Гэты дзень быў абвешчаны ААН у 2001 годзе для садзейнічання абароне нашага агульнага навакольнага асяроддзя падчас узброеных канфліктаў, калі экасістэмам і прыродным рэсурсам наносіцца шкода, якая мае працяглыя наступствы пасля заканчэння такіх канфліктаў і выходзіць за рамкі нацыянальных тэрыторый і сучаснага пакалення. | |
| 9 лістапада | Міжнародны дзень супраць фашызму і антысемітызму (Крыштальная ноч) | У гэты дзень у 1938 годзе нацысты пачалі масавыя пагромы яўрэяў. Многія сінагогі і крамы былі атакаваны і спалены. З-за разбітых вітрын гэта ноч атрымала назву «Крыштальная ноч». Дзень прызнаны Саветам Еўропы. | |
| 9 лістапада | Падзенне Берлінскай сцяны ў 1989 годзе | Гэты дзень сімвалізуе пачатак падзення бар’ераў паміж Заходняй і Усходняй Еўропай. | |
| 11 лістапада | Сусветны дзень навукі за мір і развіццё | Абвешчаны ЮНЕСКА ў 2001 годзе для павышэння ўзроўню інфармаванасці грамадскасці аб ролі навукі ў мірным і ўстойлівым развіцці грамадства. Ён таксама спрыяе нацыянальнай і міжнароднай салідарнасці ў пытаннях навуковага супрацоўніцтва паміж краінамі. | |
| 16 лістапада | Міжнародны дзень, прысвечаны цярпімасці | Абвешчаны ЮНЕСКА ў 1995 годзе для павышэння дасведчанасці аб небяспецы нецярпімасці. | Вернікі |
| 18 лістапада | Дзень барацьбы з гандлем людзьмі | Абвешчаны ў 2007 годзе ў адпаведнасці з рэкамендацыяй Еўрапейскага парламента; гэты дзень спрыяе павышэнню дасведчанасці аб неабходнасці паляпшэння палітыкі, накіраванай на прадухіленне гандлю людзьмі і барацьбу з ім. | |
| 20 лістапада | Сусветны дзень дзіцяці | Абвешчаны ААН у 1954 годзе як дзень сусветнага братэрства і разумення паміж дзецьмі, а таксама дзень мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне дабрабыту дзяцей ва ўсім свеце. | Правы дзяцей |
| 21 лістапада | Сусветны дзень тэлебачання | Абвешчаны ААН у 1996 годзе для заахвочвання абмену тэлевізійнымі праграмамі, прысвечанымі праблемам міру, бяспекі, а таксама сацыяльнага і эканамічнага развіцця і пашырэння культурнага абмену. | Гульні з відарысамі |
| 25 лістапада | Міжнародны дзень барацьбы за ліквідацыю гвалту ў адносінах да жанчын | Актывісткі адзначаюць 25 лістапада як дзень барацьбы супраць гвалту з 1981 года. У 1999 годзе гэты дзень быў прызнаны ААН з мэтай павысіць дасведчанасць грамадскасці і «сказаць “не” гвалту ў дачыненні да жанчын». | Хатнія справы |
| 29 лістапада | Міжнародны дзень салідарнасці з палесцінскім народам | Абвешчаны ААН у 1977 годзе з мэтай выказаць салідарнасць шляхам арганізацыі выставак, прысвечаных тэме правоў палесцінцаў, і іншых культурных мерапрыемстваў. | |

| Дата | Памятны дзень | Інфармацыя пра дату | Практыкаванне |
|---|---|---|---|
| 1 снежня | Сусветны дзень барацьбы са СНІДам | Абвешчаны ААН (СААЗ) у 1988 годзе з нагоды занепакоенасці пандэмічным размахам распаўсюджвання сіндрому набытага імунадэфіцыту (СНІДу). | Доступ да лекаў |
| 2 снежня | Міжнародны дзень барацьбы за адмену рабства | У памяць прыняцця ААН у 1949 годзе Канвенцыі аб барацьбе з гандлем людзьмі і з эксплуатацыяй прастытуцыі трэцімі асобамі. | |
| 3 снежня | Міжнародны дзень людзей з інваліднасцю | Абвешчаны ААН у 1992 годзе для павышэння дасведчанасці і вызначэння мер для паляпшэння сітуацыі людзей з інваліднасцю і забеспячэння іх роўнымі магчымасцямі. | Убачыць свае магчымасці |
| 5 снежня | Міжнародны дзень добраахвотнікаў у імя эканамічнага і сацыяльнага развіцця | Абвешчаны ААН у 1985 годзе для павышэння інфармаванасці пра ўклад валанцёрскіх службаў, стымулюючы такім чынам людзей любой прафесіі прапаноўваць свае паслугі ў якасці добраахвотнікаў як у сваёй краіне, так і за мяжой. | Дзе вы стаіце? |
| 9 снежня | Міжнародны дзень барацьбы з карупцыяй | Абвешчаны ААН у 2003 годзе для павышэння дасведчанасці аб карупцыі, спынення прыняцця карупцыі як непазбежнага факта і вызначэння карупцыі як адной з галоўных перашкод на шляху да развіцця. | |
| 10 снежня | Дзень правоў чалавека | У 1950 годзе Генеральная Асамблея ААН прапанавала ўсім дзяржавам і зацікаўленым арганізацыям адзначыць гэты дзень для таго, каб увекавечыць гадавіну прыняцця Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ў 1948 годзе. | Гульня «Намалюй слова», Сыграем гэта, Змагары за правы |
| 18 снежня | Міжнародны дзень мігранта | Абвешчаны ААН у 2002 годзе з мэтай забяспечыць павагу правоў чалавека і асноўных свабод усіх мігрантаў. | Тры рэчы |
| 20 снежня | Міжнародны дзень салідарнасці людзей | Ініцыятыва ААН, распачатая ў 2005 годзе ў рамках барацьбы з беднасцю для святкавання нашага адзінства ў разнастайнасці і прасоўвання салідарнасці для дасягнення Мэт развіцця тысячагоддзя. | Колькі нам трэба? |

# Стартавыя практыкаванні

*Пачатак – палова любой справы.*

Грэчаская прыказка

| | |
|---|---|
| **Тэмы** | • агульныя правы чалавека. |
| **Складанасць** | узровень 2 |
| **Час** | 15 хвілін |
| **Агляд** | Апісаныя ніжэй гульні і практыкаванні для пачатковага этапа заняткаў не толькі спрыяюць стварэнню ў групе пазітыўнай атмасферы, але і дапамагаюць весці навучанне правам чалавека ў займальнай гульнявой форме. |
| **Звязаныя правы** | • усе правы чалавека. |
| **Мэты** | • абудзіць цікавасць да ідэй правоў чалавека;<br>• развіць дух супрацоўніцтва;<br>• садзейнічаць развіццю крэатыўнасці, зарадзіць энергіяй і матываваць. |

Агульныя правы чалавека

Узровень 2

15 хвілін

## «*Компас» – гэта больш, чым кніга*

Гэта невербальнае практыкаванне з'яўляецца адным з цікавых спосабаў пазнаёміць з «Компасам» новую аўдыторыю.

### Інструкцыі

1. Пакладзіце экзэмпляр «Компаса» на падлогу і папрасіце ўдзельнікаў стаць вакол яго ў круг.
2. Растлумачце, што гэта практыкаванне будзе заснавана на пантаміме і што ўдзельнікі павінны выкарыстоўваць «Компас» так, як яны таго захочуць, – як быццам «Компас» гэта не кніга! – каб паказаць нейкае дзеянне. Пры гэтым група павінна здагадацца, у якой ролі выступае кніга.
3. Пакажыце гэта на прыкладзе, узяўшы кнігу ў рукі і сказаўшы: «Гэта не кніга… Што гэта такое?» Зрабіце выгляд, што вы ясце бутэрброд. Калі нехта скажа: «Бутэрброд!» – пакладзіце кнігу на падлогу і вярніцеся на сваё месца ў крузе.
4. Цяпер няхай удзельнікі па чарзе пакажуць свае пантамімы. Дазвольце ім падказваць і дапамагаць адзін аднаму і выходзіць наперад па меры гатоўнасці.

### Парады для фасілітатараў

Гэту тэхніку можна таксама выкарыстаць для пераходу да ацэнкі практыкаванняў і метадаў падчас навучання.

## *Памяняйцеся крэсламі!*

Гэта практыкаванне спрыяе выхаванню пачуцця ўпэўненасці і здольнасці выказваць свае думкі пры абмеркаванні розных пытанняў, звязаных з правамі чалавека.

### Матэрыялы:

- прасторнае памяшканне;
- крэслы – па адным на кожнага ўдзельніка плюс яшчэ адно дадатковае;
- загадзя падрыхтаваныя сцверджанні

## Інструкцыі

1. Папрасіце ўсіх сесці ў крэслы, расстаўленыя ў форме круга. Павінна застацца яшчэ адно дадатковае, незанятае крэсла.
2. Зачытайце першае сцверджанне і папрасіце тых, хто з ім згодны, хутка памяняцца крэсламі. Нязгодныя павінны заставацца на сваіх месцах. Той, хто не можа вызначыцца, павінен устаць, павярнуцца вакол сябе і зноў сесці.

## Парады для фасілітатараў

Гэта вясёлае практыкаванне для размінкі тыпу «ледакол» добрае само па сабе. Вы маглі б потым спытаць, якое дачыненне маюць агучаныя сцверджанні да правоў чалавека; аднак не забывайце, што гэта толькі размінка, і таму глыбокую дыскусію лепш не пачынаць.

Гэты прыём таксама можна выкарыстаць у якасці ўвядзення ў паглыбленую дыскусію. У гэтым выпадку вам варта памятаць пра мэты занятку і выкарыстоўваць сцверджанні, якія дапамогуць іх дасягнуць. Вы можаце пацікавіцца рэакцыяй удзельнікаў на сцверджанні і спытаць, чым абумоўлены іх розныя перакананні.

Магчымы і іншы варыянт: калі вы працуеце з пэўнай тэмай, папрасіце ўдзельнікаў напісаць на лістках паперы іх уласныя сцверджанні, якія можна будзе пакласці ў капялюш ці каробку і зачытаць па чарзе.

Вы можаце выбраць сцверджанні з прыведзенага ніжэй спіса або скарыстацца гэтым спісам, каб стварыць на яго аснове свае ўласныя сцверджанні:

- Мець дрэнную рэпутацыю горш для дзяўчынак, чым для хлопчыкаў.
- Маладым жанчынам можна не выдаляць валасы, якія растуць на целе.
- Нядобра, што ў крамах для дзяцей прадаюць трусікі-стрынгі.
- Маладыя жанчыны і маладыя мужчыны могуць быць добрымі сябрамі.
- Жанчыны рыхтуюць ежу лепш за мужчын.
- Геі і лесбіянкі павінны мець права ўступаць у шлюб.
- Калі б мой сябар ці сяброўка сказалі мне, што маюць нетрадыцыйную арыентацыю, мы б не перасталі сябраваць.
- Толькі худыя дзяўчаты могуць быць прыгожымі.
- Прыгажосць ідзе знутры.
- Ужо ў дзяцінстве дзяўчынкі лепш шыюць, а хлопчыкі лепш разбіраюцца ў тэхніцы.
- Часам згвалтаванне адбываецца па віне дзяўчыны (жанчыны);
- Мужчыну трэба мець мускулы.
- Мужчынам добра ўдаецца паказваць свае пачуцці.
- Імігранты заўсёды працавітыя, бо ў іх няма іншага выйсця.
- Балет не з’яўляецца прымальным заняткам для мужчыны.
- Для мужчыны натуральна трымаць усё пад кантролем і кіраваць.
- Лепш, калі прэзідэнт (прэм’ер-міністр) будзе мужчынскага полу.
- Муж не павінен зарабляць менш грошай, чым яго жонка.
- Распавядаючы сваім сябрам, што вы чагосьці баіцеся, вы паказваеце сваю слабасць.
- Расказваць аб пачуццях не мужчынская справа.
- Каханне з часам знікае.
- Секс патрабуе кахання.
- Уяўленні дарослых пра секс сёння ўжо састарэлі.
- У парнаграфічных часопісах можна знайсці карысныя парады наконт сексу.
- У часопісах для падлеткаў можна знайсці карысныя парады наконт сексу.
- Усе людзі раўнацэнныя.

## «Я добра ўмею…»

Гэта практыкаванне накiравана на развiццё станоўчай самаацэнкі і дэманстрацыю разнастайнасці і салідарнасці паміж членамі групы.

### Інструкцыі

1. Папрасіце ўсіх стаць у вельмі шырокі круг.
2. Запрасіце каго-небудзь зрабіць крок у цэнтр круга і расказаць, што ён добра ўмее рабіць.
3. Цяпер скажыце, каб уся група зрабіла крок наперад і паўтарыла імя першага ўдзельніка і тое, што ён добра ўмее рабіць.
4. Затым папрасіце каго-небудзь іншага зрабіць яшчэ адзін крок наперад.

### Парады для фасілітатараў

Зрабіце першапачатковы круг як мага больш шырокім – такім, каб у яго цэнтры заставалася прастора, пакуль з кожным новым раўндам круг будзе змяншацца. У канцы практыкавання ўдзельнікі будуць стаяць вельмі блізка адзін да аднаго.

## Прыемны Павел і неверагодная Наталля

Выкарыстоўвайце гэта практыкаванне ў працы з людзьмі, якія сустракаюцца ўпершыню. Акрамя знаёмства, яно спрыяе развіццю салідарнасці і павагі.

### Інструкцыі

1. Папрасіце ўсіх стаць у круг.
2. Папрасіце аднаго чалавека (любога) назваць сваё імя (напрыклад, Павел).
3. Папрасіце астатніх членаў групы ўспомніць станоўчыя прыметнікі, якія пачынаюцца з першай літары гэтага імені, г. зн. з літары П.
4. Няхай Павел выбера адзін з прапанаваных варыянтаў.
5. Цяпер папрасіце чалавека, які стаіць справа ад Паўла, сказаць: «Добры дзень, прыемны Павел! Мяне завуць… (напрыклад, Наталля)».
6. Папрасіце групу знайсці прыметнік для Наталлі (напрыклад, неверагодная).
7. А цяпер папрасіце наступнага чалавека сказаць: «Прывітанне, прыемны Павел і неверагодная Наталля, мяне завуць…».
8. Працягвайце гульню па крузе, пакуль усе не пазнаёмяцца.

### Парады для фасілітатараў

Важна памятаць, што ўпор робіцца на прыметнікі са станоўчым значэннем, якія пачынаюцца з той жа літары, што і імя чалавека, а не на пошук прыметнікаў, якія апісвалі б рэальныя якасці гэтага чалавека.

Кожны ўдзельнік мае права выбраць сабе прыметнік з ліку прапанаваных іншымі ўдзельнікамі.

Вы як фасілітатар павінны быць гатовы прапанаваць прыметнікі са станоўчым значэннем для любога з імён у выпадку, калі ні ў каго не будзе ідэй.

У якасці цікавага варыянта можна прапанаваць выбраць дзеянне, якое кожны ўдзельнік павінен будзе выканаць, назваўшы сваё імя. Напрыклад, Павел можа пагладзіць сябе па галаве. Тады групе трэба будзе запомніць кожнае імя, дзеянне і прыметнік.

## *Вузлы*

Гэта практыкаванне прадугледжвае супрацоўніцтва і сімвалізуе сумесную працу, накіраваную на пошук рашэнняў праблем.

### Інструкцыі

1. Папрасіце ўдзельнікаў падзяліцца на малыя групы па 6–8 чалавек.
2. Папрасіце ўсіх стаць у круг плячом да пляча і выцягнуць рукі перад сабой.
3. Пасля гэтага ўдзельнікі павінны працягнуць рукі і ўзяцца за рукі з іншымі ўдзельнікамі. Умовы: а) ніхто не можа трымаць абедзве рукі іншага ўдзельніка; б) ніхто не можа трымаць руку ўдзельніка, які стаіць побач з ім. (У выніку практыкавання атрымаецца вялікі вузел з рук!)
4. Цяпер папрасіце ўдзельнікаў разблытаць вузел, не адпускаючы рук.

### Парады для фасілітатараў

Удзельнікам трэба будзе пралазіць пад рукамі іншых або над імі. Для гэтага спатрэбіцца троху цярпення, але нечаканым вынікам стане адзін ці два вялікія кругі.

Гэта практыкаванне з’яўляецца добрай гульнёй-энерджайзерам. Калі вы захочаце атрымаць з яе нейкі ўрок, спытайце групу, што яны адчувалі, калі толькі зрабілі вузел: ці не здалося ім безнадзейным заданне яго разблытаць? Калі ў іх атрымалася яго выканаць, ці былі яны здзіўлены вынікам? Тут вы маглі б нагадаць ім словы Махатмы Гандзі: «Розніцы паміж тым, што мы робім, і тым, што мы здольны зрабіць, было б дастаткова, каб вырашыць большасць сусветных праблем».

## *Дакрануцца да падлогі*

Гэта практыкаванне-энерджайзер спрыяе развіццю духу супрацоўніцтва і навыкаў групавога прыняцця рашэнняў. Яно прадугледжвае цесны фізічны кантакт.

### Інструкцыі

1. Растлумачце групе, што ў гэтай гульні задзейнічаны дзевяць «кропак» цела, якія могуць дакранацца да падлогі: 2 нагі, 2 рукі, 2 локці, 2 калені і 1 лоб.
2. Папрасіце ўдзельнікаў размясціцца ў сярэдзіне пакоя. Назавіце лічбу ад 1 да 9 і скажыце, што яны павінны дакрануцца да падлогі названай колькасцю «кропак». Паўтарыце дзеянне яшчэ два разы.
3. Папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на пары. Назавіце лічбу ад 2 да 18. Пары павінны працаваць разам, каб дакрануцца да падлогі названай колькасцю «кропак». Паўтарыце дзеянне яшчэ два разы.
4. Паўтарыце раўнды з рабочымі групамі па 4, потым па 8 і нават 16 чалавек або да таго часу, пакуль усе не будуць працаваць разам.

### Парады для фасілітатараў

Вы можаце дазволіць удзельнікам размаўляць адзін з адным або, калі захочаце, папрасіць іх мець зносіны толькі пры дапамозе мовы жэстаў.

Калі чатыры чалавекі гуляюць разам, самай маленькай колькасцю дотыкаў для іх можа быць 2 – тады 2 два чалавекі будуць стаяць кожны на адной назе і пры гэтым трымаць на сабе іншых двух! Калі гуляюць чацвёра, самай маленькай колькасцю дотыкаў для іх будзе 4. (Найбольшай колькасцю дотыкаў будзе 4 х 9 = 36.) У кожным раўндзе максімальная колькасць дотыкаў не можа перавышаць колькасць людзей у групе больш, чым у 9 разоў!

Папрасіце ўдзельнікаў гуляць хутчэй. У вялікіх групах шмат часу ідзе на тое, каб вызначыць, каму і якой «кропкай» цела дакранацца да падлогі. Самае вясёлае пачынаецца тады, калі група з 8 чалавек спрабуе дакрануцца да падлогі 6 ці 8 «кропкамі».

## Алфавіт на падлозе

Гэта практыкаванне-энерджайзер добра падыдзе для таго, каб пазнаёміць удзельнікаў у самым пачатку занятку. Удзельнікі пачынаюць гульню, пытаючыся адзін у аднаго, як іх завуць і адкуль яны родам, не кажучы пры гэтым занадта шмат. Гэта практыкаванне таксама можа стаць добрым увядзеннем у дыскусію аб разнастайнасці і павазе да яе.

### Падрыхтоўка

- Напішыце кожную літару алфавіта на асобным аркушы паперы фармату А4.

### Інструкцыі

1. Раскідайце літары на падлозе ў выпадковым парадку і папрасіце ўдзельнікаў стаць у круг вакол іх.
2. Растлумачце, што збіраецеся задаць некалькі пытанняў, напрыклад: «Як вас завуць?» Пачуўшы гэта пытанне, удзельнікі павінны як мага хутчэй знайсці першую літару свайго імя і стаць побач з ёй, дакранаючыся да аркуша паперы наском нагі. Напрыклад, Надзея стане каля літары Н, Святлана – каля літары С і гэтак далей.
3. Калі ўсе знойдуць свае літары, прайдзіце па крузе і каля кожнай літары прасіце, каб удзельнікі хутка называлі сваё імя.
4. Паўтарыце практыкаванне, але ўжо з іншымі пытаннямі.

### Парады для фасілітатараў

Размяшчайце літары на падлозе такім чынам, каб вакол кожнай з іх было шмат прасторы, таму што вельмі верагодна, што больш чым аднаму чалавеку трэба будзе ўстаць каля пэўнай літары. На справе самае цікавае адбываецца тады, калі больш за 3 чалавек спрабуюць устаць каля адной і той жа літары і ім прыходзіцца трымацца адзін за аднаго.

Выпадковае размяшчэнне літар вымушае ўдзельнікаў дапамагаць адзін аднаму знайсці патрэбныя.

Калі ў вас інтэрнацыянальная група, будзьце асцярожны ў выбары алфавіта і выбірайце такія літары, якія лёгка зразумець і прачытаць. Літары розных алфавітаў, якія выглядаюць аднолькава і напісаны на адным аркушы паперы, заўсёды выклікаюць цікаўнасць.

У залежнасці ад складу групы вы можаце правесці больш ці менш раўндаў. Не трэба зацягваць практыкаванне. Можаце задаць наступныя пытанні:

- Як вас завуць?
- У якой краіне вы жывяце?
- У якой краіне вы нарадзіліся?
- Якая ваша любімая ежа (напоі)?
- Які ваш любімы колер?
- Якая ваша любімая кніга (стыль музыкі)?
- Які ваш дэвіз у жыцці?

### Дадатковая інфармацыя

Іншыя гульні і практыкаванні для пачатку заняткаў вы знойдзеце на гэтых сайтах:
• http://wilderdom.com/games/Icebreakers.html;
• http://www1.umn.edu/humanrts/edumat/hreduseries/hrhandbook/activities/11.htm;
• http://www.amnesty.ca/youth/youth_action_toolkit/icebreakers.php;
• http://www.corrymeela.org/sitepage/icebreakers.aspx;
• http://www.nationalserviceresources.org/taxonomy/term/183.

COMPASS

Агульныя правы чалавека

Узровень 1

Любы памер групы

10 хвілін

# Практыкаванні для ацэнкі навучання

*Нельга лічыць нешта пустым марнаваннем часу, калі вы выкарыстаеце вопыт з розумам.*

Агюст Радэн

| | |
|---|---|
| **Складанасць** | узровень 1 |
| **Памер групы** | любы памер групы |
| **Агляд** | Замацаванне з'яўляецца неад'емнай часткай эмпірычнага цыкла навучання, які ляжыць у аснове падыходу, які выкарыстоўваецца ў гэтым дапаможніку па адукацыі ў галіне правоў чалавека. Прыведзеныя ніжэй практыкаванні ўяўляюць сабой лёгкія і цікавыя метады, якія дапамогуць людзям вучыцца на ўласным вопыце. Іх можна выкарыстаць пасля завяршэння працы над адным з практыкаванняў «Компаса», але нельга замяняць імі падрабязны аналіз і ацэнку. Лепш за ўсё праводзіць іх у канцы навучальнага дня або больш працяглага перыяду навучання, каб удзельнікі атрымалі магчымасць у цэлым паразважаць аб тым, што і як яны вучаць, а таксама, калі фасілітатар хоча атрымаць хуткую зваротную сувязь. |
| **Звязаныя правы** | • права на адукацыю ў галіне правоў чалавека;<br>• права на адукацыю;<br>• права на ўдзел. |
| **Мэты** | • паглыбіць веды па пытаннях правоў чалавека і іх разуменне на аснове вопыту;<br>• развіць крытычнае мысленне;<br>• развіць звычку разважаць пра вопыт як крыніцу навучання;<br>• спрыяць правільнай ацэнцы працэсаў навучання. |

## *Заключная гульня*

**Час:** 10 хвілін.

### Інструкцыі

1. Коратка абмяркуйце, што адбылося падчас занятку.
2. Папрасіце ўдзельнікаў сесці ў круг.
3. Выберыце адно са сцверджанняў і папрасіце кожнага ўдзельніка па чарзе завяршыць яго. Каментарыі ці дыскусіі не дапускаюцца.
4. Правядзіце некалькі раўндаў, калі ў вас ёсць час або вы хочаце атрымаць больш падрабязную зваротную сувязь.

### Парады для фасілітатараў

Прыклады сцверджанняў:

- Лепшым у практыкаванні было ..., а горшым – ... .
- Самым цікавым было ..., а самым нудным – ... .
- Што мяне абурае больш за ўсё, дык гэта ..., а цаню я больш за ўсё ... .
- Самым смешным было ..., а самым сур'ёзным – ... .
- Мне б хацелася больш ... і менш ... .
- Я даведаўся, што ..., і хачу даведацца больш пра ... .
- Цяпер я хачу ... і спадзяюся на ... .
- Я зразумеў ..., і мне трэба ... .
- Больш за ўсё мяне здзівіла тое, што ... .
- Больш за ўсё мне спадабалася рабіць ..., а менш за ўсё – ... .
- Я адчуваў сябе найбольш упэўнена, калі рабіў ..., і менш упэўнена, калі рабіў ... .

Калі ў вас застанецца час, вы можаце атрымаць больш падрабязную зваротную сувязь, папрасіўшы ўдзельнікаў патлумачыць прычыны, якія хаваюцца за іх адказамі на сцверджанні. Напрыклад: «Лепшым у практыкаванні было …, таму што … . Горшым было …, таму што …».

## *«Высока» і «нізка»*

Гэты метад вельмі хуткі і дапаможа, калі вам не хапае часу!

**Час:** 2 хвіліны.

### Падрыхтоўка

- Прыдумайце 3 ці 4 пытанні, напрыклад: ці спадабалася вам практыкаванне? Ці даведаліся вы пра сябе што-небудзь новае? Ці зможаце вы выкарыстоўваць у паўсядзённым жыцці тое, пра што даведаліся?

### Інструкцыі

1. Растлумачце, што будзеце задаваць пытанні аб тым, ці спадабаўся ўдзельнікам занятак і пра што новае яны даведаліся. Яны павінны будуць адказаць на іх невербальна, выкарыстоўваючы мову цела. Калі яны захочуць пагадзіцца, ім трэба будзе падняць рукі над галавой і, магчыма, нават стаць на дыбачкі, калі яны вельмі згодныя. Тыя, хто катэгарычна не згодныя, павінны нізка прысесці ці нават легчы на падлогу. Іншыя павінны прыняць прамежкавыя позы, каб паказаць ступень сваёй згоды.
2. Зачытайце першае пытанне і дайце ўдзельнікам хвіліну, каб прыняць патрэбную позу.
3. Паглядзіце вакол і прыміце да ведама адказы людзей, але нічога не пытайцеся і не дазваляйце рабіць каментарыі.
4. Потым папрасіце ўдзельнікаў расслабіцца і зачытайце наступнае пытанне.

## *Пункты гледжання*

Гэты метад з’яўляецца хуткім і дае ўдзельнікам магчымасць пры жаданні зрабіць каментарый.

**Час:** 20 хвілін.

### Падрыхтоўка

- Прыдумайце 3 ці 4 пытанні, напрыклад: ці спадабалася вам практыкаванне? Ці даведаліся вы пра сябе што-небудзь новае? Ці зможаце вы выкарыстоўваць у паўсядзённым жыцці тое, пра што даведаліся?
- На асобных аркушах паперы фармату А4 напішыце 4 варыянты адказу: «Так», «Не», «Не ведаю» і «Я хачу нешта сказаць». Прымацуйце іх на розныя сцены пакоя.

### Інструкцыі

1. Пакажыце варыянты адказаў на сценах і растлумачце, што яны ўяўляюць сабой чатыры розныя пункты гледжання. Растлумачце, што размаўляць можна толькі таму, хто стане каля сцяны са словамі «Я хачу нешта сказаць».
2. Растлумачце, што збіраецеся зачытаць пытанне, пасля чаго кожны ўдзельнік павінен стаць каля сцяны, на якой прадстаўлены яго адказ. У працэсе ўдзельнікі могуць пераходзіць да іншых сцен.
3. Задайце першае пытанне аб практыкаванні.
4. Дайце ўдзельнікам час заняць патрэбнае месца, а затым дайце слова тым, хто хоча выказацца.

## *Зводка надвор'я*

У гэтым выпадку надвор'е з'яўляецца метафарай пачуццяў.

**Час:** 30 хвілін.

### Матэрыялы:

- папера і алоўкі (па жаданні).

### Інструкцыі

1. Коратка растлумачце ўдзельнікам, што ім трэба будзе выкарыстоўваць надвор'е ў якасці метафары сваіх пачуццяў.
2. Дайце ўдзельнікам 5–10 хвілін, каб падумаць пра дзень (навучанне, праект, працу, у якіх вы прымаеце ўдзел) і спытаць сябе: «Ці падабаецца мне гэта? Што я ад гэтага атрымліваю? Ці будзе мне ўсё гэта карысна?»
3. Затым папрасіце кожнага па чарзе апісаць свае пачуцці ў тэрмінах надвор'я.

### Парады для фасілітатараў

Калі будзеце тлумачыць ідэю метафары, дайце групе пару прыкладаў. Напрыклад: «Мой дзень пачаўся з невялікага туману. Затым бліжэй да абеду пайшоў лівень. Пасля абеду былі невялікія ападкі, але да канца дня выглянула сонца». Гэта азначае, што вы пачалі дзень неяк вяла ці не занадта ўпэўнена, а потым усё стала складвацца досыць непрыемна. Пасля абеду справы пайшлі лепш, і цяпер, нарэшце, вы адчуваеце, што шмат чаму навучыліся.

### Варыянты

Удзельнікі могуць не расказваць зводку надвор'я, а намаляваць яе.

Гэту простую ідэю можна выкарыстаць таксама для агляду праекта, напрыклад, у форме рэпартажу з футбольнага або хакейнага матчу або з месца іншых падзей, якія спадабаюцца ўдзельнікам.

## *Газетныя загалоўкі*

Удзельнікі працуюць у малых групах, каб распрацаваць макет першай паласы бульварнай газеты.

**Час:** 60 хвілін.

### Падрыхтоўка

- Для кожнай малой групы вам спатрэбіцца аркуш паперы фармату А3 і некалькі фламастараў.

### Інструкцыі

1. Папрасіце ўдзельнікаў разбіцца на невялікія групы па тры або чатыры чалавекі. Яны будуць рабіць першую старонку бульварнай газеты: вялікія загалоўкі і менш слоў!
2. Папрасіце іх абмеркаваць, што яны рабілі і што вынеслі з праекта ці практыкавання, і метадам мазгавога штурму разабраць самыя моцныя і самыя слабыя свае вынікі.
3. Кожная малая група павінна выбраць 5 або 6 «гісторый». Ім трэба разам напісаць загаловак для кожнай гісторыі, суправадзіўшы яго некалькімі сказамі, якія апісваюць яе кароткі змест. Не трэба пісаць гісторыю цалкам. Фатаграфія не з'яўляецца абавязковай, але прыйдзецца вельмі дарэчы.
4. Папрасіце малыя групы прадставіць вынікі сваёй працы.
5. Прэзентацыя і абмеркаванне праводзяцца па жаданні.

## *Рукзак*

Гэта практыкаванне асабліва карысна правесці ў канцы занятку. Малюнкі заўсёды скажуць больш, чым словы.

**Час:** 40 хвілін

### Матэрыялы:

- папера і каляровыя ручкі.

### Інструкцыі

1. Папрасіце ўдзельнікаў падумаць, пра што яны даведаліся падчас занятку (сустрэчы), і намаляваць саміх сябе, як яны махаюць на развітанне рукой і нясуць за плячыма вялікія рукзакі, у якіх ляжаць, напрыклад, рэчы, ідэі і надзеі, якія яны панясуць з сабой.
2. Яны павінны падумаць пра ўсё, аб чым даведаліся і што хацелі б захаваць, напрыклад кнігі або карціны, пачуцці, людзей, ідэі, новыя спосабы бачання свету, новыя сілы, якія яны здабылі, пераадолеўшы цяжкасці, і каштоўнасці.
3. Яны таксама могуць намаляваць рэчы, якія хацелі б кінуць у сметніцу. Гэта могуць быць шкодныя звычкі, старыя ідэі, цяжкія моманты, дрэннае харчаванне – абсалютна ўсё!
4. Паспрабуйце пераканаць удзельнікаў, што для выканання гэтага задання зусім не трэба быць вялікім мастаком. Простыя фігуркі людзей, словы і сімвалы ідэальна падыдуць для гэтай працы.


500
500
500Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
500
500
500Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
500
500
500Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
100
100
100Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
100
100
100Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
100
100
100Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
100
100
100Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
100
100
100Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
100
100
100Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
50
50
50Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
50
50
50Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
50
50
50Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
50
50
50Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
50
50
50Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
50
50
50Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
50
50
50Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe
10
10
10Ems
COMPASS
Manual for human rights education
Council of Europe

# Глава 3
# Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека

# Змест гэтай главы


**ПРА ГЭТУ ГЛАВУ 357**
**3.1 АДУКАЦЫЯ Ў ГАЛІНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І АКТЫВІЗМ 358**
Што такое актывізм? 358
Што такое «практычныя дзеянні»? 359
Калі група можа заняцца практычнымі дзеяннямі? 361

**3.2 ПРОСТЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ПАДТРЫМКУ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА 362**
Публічныя мерапрыемствы 362
Маладыя людзі ў ролі педагогаў 363
Рабіце гэта самастойна 364
Змена палітыкі ці паводзінаў прадстаўнікоў дзяржавы 365
Звяжыцеся з іншымі групамі або рухамі 367
Збор даных 368

**3.3 РАСПРАЦОЎКА ПЛАНА ДЗЕЯННЯЎ 370**
Перад пачаткам працы… 370
*Спазнайце сябе – SWOT-аналіз 370*
*Выбар праблемы 371*
*Вывучэнне праблемы 372*
*Дрэва праблемы 372*
*Прыклад дрэва праблемы 373*
*Пошук правільнага рашэння 373*
Планаванне акцыі 374
*Якой праблемай вы хочаце заняцца? 375*
*Хто ці што – ваша мэтавая аўдыторыя? 375*
*Якіх змен вы спадзеяцеся дамагчыся? 375*
*Як гэтыя змены павінны праявіцца? 375*
*Якімі сродкамі вы будзеце ўплываць на сваю аўдыторыю? 376*
Арганізацыйная праца 376
*Стварэнне табліцы заданняў 377*
Аналіз і ацэнка 378

# Пра гэту главу

Вы павінны былі заўважыць, што кожнае практыкаванне ў главе 2 мае ў сваім складзе раздзел «Ідэі для дзеяння». Чаму? Таму што мы лічым, што адукацыя ў галіне правоў чалавека, якая вядзецца толькі ў класе або ў маладзёжным цэнтры, з'яўляецца няпоўнай. Практычныя дзеянні – гэта неад'емная частка адукацыі ў галіне правоў чалавека як таму, што гэта спосаб зрабіць правы чалавека часткай жыцця маладых людзей, так і таму, што гэту адукацыю мы разумеем як адукацыю, нацэленую на перамены. Сама ідэя адукацыі ў галіне правоў чалавека складаецца ў тым, каб весці да дзеяння.

Нагадаем (гл. главу 1), што адукацыя ў галіне правоў чалавека нацэлена на атрыманне ведаў ***пра*** правы чалавека, ***праз*** правы чалавека і ***для*** забеспячэння непарушэння правоў чалавека. Практычныя дзеянні ***для*** сцвярджэння правоў чалавека, такім чынам, не дадатак да працэсу адукацыі, а яго неад'емная частка: брацца за справу і ажыццяўляць дзеянні азначае дзейнічаць за межамі традыцыйнай адукацыйнай сферы, рабіць нешта, каб правы чалавека сталі рэальнасцю – дзеля стварэння свету, дзе паўней выконваюцца правы чалавека.

Гэта глава пазнаёміць вас з практычнымі аспектамі адукацыі ў галіне правоў чалавека. Яе можна разглядаць як злучальнае звяно паміж практыкаваннямі главы 2, якія выконваюцца ў клубе або класе, і больш «прафесійнай» дзейнасцю, якая апісана ў главе 4. Хоць змест дадзенай главы звязаны ў першую чаргу з адукацыйнымі мэтамі, яна задумана як спосаб дапамагчы маладым людзям іграць больш актыўную ролю ў абароне і зацвярджэнні правоў чалавека.

• У раздзеле 1 мы разглядаем, што разумеецца пад актывізмам, што – пад практычнымі дзеяннямі, а таксама іх сувязь з адукацыяй у галіне правоў чалавека.

• У раздзеле 2 мы прапануем шэраг простых метадаў і ідэй для дзеянняў, якія вы можаце выкарыстоўваць з групай маладых людзей. Большасць прапаноў для дзеянняў, выкладзеных раней у главе 2, грунтуецца на гэтых метадах.

• У раздзеле 3 мы разглядаем некаторыя інструменты планавання, якія дазваляюць больш глыбока ўнікнуць у праблему шляхам распрацоўкі доўгатэрміновай стратэгіі і ўліку індывідуальных інтарэсаў і навыкаў удзельнікаў.

Кожны з раздзелаў з'яўляецца аўтаномным, хаця, прачытаўшы раздзелы 1 і 2, вы зможаце лепш зразумець раздзел 3.

**Свабодны ўніверсітэт**

Вясной 2008 года літоўскія студэнты і іншыя групы актыўнай моладзі арганізавалі серыю акцый пратэсту супраць рэформы, якая павінна была пакласці канец бясплатнай вышэйшай адукацыі. Незадаволеныя студэнты прынялі ўдзел у розных акцыях і занялі цэнтральную плошчу ў Віленскім універсітэце. Хоць ім не ўдалося спыніць рэформы, удзел у акцыях аб'яднаў іх і пераканаў у неабходнасці забеспячэння таго, што тыя, хто жадае атрымаць адукацыю, але не мае на гэта сродкаў, не будуць заставацца выключанымі з працэсу адукацыі. Таму студэнты вырашылі стварыць альтэрнатыўную прастору, свабодную ад традыцыйных універсітэцкіх дысцыплін і адкрытую для ўсіх. «Свабодны ўніверсітэт» стаў цэнтрам навучання для ўсіх, хто хоча вучыцца ці вучыць, месцам, свабодным ад расізму, сексізму, дыскрымінацыі, месцам, дзе веды не разглядаюцца як прывілей «экспертаў», а валодаць імі ў роўнай ступені мае права кожны.

Для атрымання дадатковай інфармацыі пашукайце Free University Luni у Інтэрнэце.

**Словы і думкі аб дзейным спачуванні, якія не ўвасабляюцца на практыцы, як прыгожыя кветкі: яркія, але без водару.**
*Тхіць Нят Хань*

COMPASS

# 3.1 Адукацыя ў галіне правоў чалавека і актывізм

## Што такое актывізм?

Слову «актывізм» толькі каля 100 гадоў, па меншай меры ў яго цяперашнім выкарыстанні, і паходзіць яно ад дзеяслоўнага словазлучэння быць актыўным. Актывіст гэта той, хто прымае актыўны ўдзел у кампаніях за якія-небудзь пераўтварэнні і змены, як правіла, у палітычнай або сацыяльнай сферы. Актывізм – гэта тое, што робяць актывісты, гэта значыць метады, якія яны выкарыстоўваюць для таго, каб дамагчыся перамен.

**Змагары за мір і права на пратэст**

Два актывісты, якія выступаюць за мір, арганізавалі публічнае чытанне імёнаў каля ўваходу ў дом на Даўнінг-стрыт, дзе жыве брытанскі прэм'ер-міністр. Адна з іх, Мая Эванс (23 гады), чытала імёны кожнага забітага брытанскага салдата, у той час як яе сябар чытаў доўгі спіс іракцаў, пра якіх было вядома, што яны загінулі падчас вайны ў Іраку. Маю арыштавалі, бо яна загадзя не паведаміла паліцыі аб падрыхтоўцы пратэсту. Падзея была асветлена ў брытанскіх СМІ і выклікала дыскусію пра свабоду слова і права на пратэст. У выніку гэтага, а таксама многіх іншых падобных выступленняў урад пагадзіўся перагледзець закон, які забараняе праводзіць пратэсты ў цэнтры Лондана без папярэдняга ўзгаднення з паліцыяй.

*«Я не хацела, каб мяне арыштавалі, ды я і не думала, што раблю нешта дрэннае, калі ў дажджлівую раніцу аўторка мы з калегам чыталі імёны загінуўшых у вайне. Я не думаю, што гэта крымінальнае злачынства, і не лічу, што мяне трэба было за гэта арыштоўваць».* Мая Эванс

Актывізм у дачыненні да правоў чалавека азначае абарону правоў чалавека, дзе б і на якім бы ўзроўні яны ні падвяргаліся пагрозе або ні парушаліся. Актывізм у абарону правоў чалавека, такім чынам, складаецца ў тым, каб рэагаваць на несправядлівасць, жорсткае абыходжанне, гвалт ці дыскрымінацыю і спрабаваць выправіць становішча. Актывізм азначае гатоўнасць аказваць дапамогу і паказваць салідарнасць з барацьбой іншых людзей, якія адстойваюць паважлівае і годнае да сябе стаўленне і спрыяюць пераходу да больш гуманнага, эгалітарнага грамадства, у якім правы будуць належным чынам паважацца. Каб дзейнічаць эфектыўна, актывістам трэба валодаць настойлівасцю, творчым падыходам, мэтанакіраванасцю, нярэдка мужнасцю, але, перш за ўсё, верай у чалавека і правы чалавека. Яны лічаць, што свет, у якім людзі паважаюць правы чалавека, магчымы, і хочуць, каб ён быў створаны.

### *Ці так моцна актывісты адрозніваюцца ад «нармальных» людзей? Якія якасці актывіста вы можаце вылучыць у сабе?*

**Зразумець, што правільна, і не рабіць гэтага ёсць адсутнасць смеласці.**
*Канфуцый*

Актывізм, несумненна, патрабуе прыхільнасці справе або ідэалу і выцякае з яе, і, як правіла, гэта прыхільнасць павінна быць пастаяннай і доўгатэрміновай. Напрыклад:

• Экалагічныя актывісты выйграюць адну бітву за спыненне будаўніцтва вугальнай электрастанцыі і адразу ж пачынаюць яшчэ адну кампанію супраць пашырэння ўзлётна-пасадачнай паласы.

• Актывісты, якія выступаюць за мір, вось ужо 30 гадоў вядуць барацьбу за распрацоўку міжнароднай канвенцыі аб забароне супрацьпяхотных мін.

• Мясцовыя актывісты, якія змагаюцца супраць закрыцця бальніцы або спартыўнай залы, імкнуцца дзейнічаць з розных бакоў, і, пацярпеўшы няўдачу на адным кірунку, падыходзяць да справы з іншага боку.

Хоць мы лічым, што кожны чалавек з'яўляецца «міні-актывістам», які ўступае на працягу свайго жыцця ў барацьбу за тыя ці іншыя справы, у дадзеным дапаможніку мы, як правіла, гаворым не пра актывізм, а хутчэй пра «практычныя дзеянні». Актывісты – у больш традыцыйным разуменні – таксама «бяруцца за справу» і займаюцца «практычнай дзейнасцю», але робяць гэта пастаянна, выкарыстоўваючы шмат розных метадаў, і яны не спыняцца, пакуль іх дзеянні не акажуць уплыў на справу, якую яны імкнуцца вырашыць. Маладыя людзі, з якімі вы працуеце, хутчэй за ўсё, не будуць пастаяннымі ўдзельнікамі якой-небудзь кампаніі, часам аб'ядноўваючыся з іншымі актывістамі, а часам выступаючы ў адзіночку па праблеме, якую яны лічаць на дадзены момант больш важнай.

*Ці зможаце вы назваць «справы», за якія вы браліся і якія адстойвалі? Ці можа адукацыя ў галіне правоў чалавека стаць для вас такой «справай»?*

**Будзь сам той зменай, якую ты б хацеў бачыць у свеце.**
*Гандзі*

# Што такое «практычныя дзеянні»?

Калі мы гаворым пра групу, якая бярэцца за справу і займаецца практычнай дзейнасцю, мы маем на ўвазе нешта большае, чым «фармальныя» практыкаванні, падобныя практыкаванням у главе 2, паколькі яна ахоплівае больш шырокае кола людзей, чым сама група. Практычныя дзеянні, як частка адукацыі ў галіне правоў чалавека, маюць на мэце дасягненне выніку, які каштоўны не толькі для самога навучання, але і для жыцця за межамі адукацыйнай сферы. Напрыклад:

• Наведванне ўдзельнікамі навучання мясцовага прытулку для бяздомных або цэнтра дапамогі бежанцам можа дапамагчы пераадолець бар'еры або забабоны і падбадзёрыць тых, каго наведалі маладыя людзі.

• Ліст у прэсу ад маладых людзей, якія крытыкуюць расісцкае або неталерантнае стаўленне, можа прыцягнуць увагу сродкаў масавай інфармацыі да іх поглядаў і заахвоціць журналістаў перагледзець іх уласныя прадузятыя думкі.

• Мясцовая фотавыстаўка з канкрэтнымі прыкладамі забруджвання асяроддзя ў вашым раёне дапаможа наведвальнікам адкрыць вочы на гэту праблему і, магчыма, пачаць рух, каб ёю заняцца.

**Тэатр з'яўляецца адной з формаў ведаў, ён павінен і можа таксама служыць сродкам пераўтварэння грамадства. Тэатр можа дапамагчы нам будаваць нашу будучыню, а не проста чакаць яе.**
*Аўгуста Баал*

Кожная такая акцыя нацэлена на канкрэтны вынік і аказвае ўплыў за межамі групы і вучэбнай аўдыторыі, але яна таксама пашырае магчымасці маладых людзей і натхняе іх. Практычная дзейнасць можа падаць жыццёвы ўрок: раскрыць значэнне правоў чалавека і зрабіць іх чымсьці пазітыўным. Бачыць, што вашы дзеянні могуць пайсці на карысць іншым і, у тым ліку, вам самім, – гэта важны ўрок, магутны стымул і наглядны прыклад таго, што становішча спраў можа мяняцца, калі мы самі ўдзельнічаем у яго змене.

*Калі вы працавалі ў групе, якая праводзіла акцыю, якія асноўныя вынікі былі дасягнуты з пункту гледжання ўздзеяння самога мерапрыемства і з пункту гледжання навучання?*

**Адукацыя ў галіне правоў чалавека, практычныя дзеянні і актывізм: у чым адрозненне?**

• Практыкаванні ў главе 2 пабудаваны так, каб вучэбная праца была сканцэнтравана, галоўным чынам, на групе: яе мэта – навучанне кожнага ўдзельніка.

• Практычныя дзеянні за межамі навучальнага працэсу маюць адукацыйнае значэнне для групы, але яна таксама накіравана і на канкрэтныя праблемы знешняга свету.

• Для актывістаў – як прафесійных, так і тых, хто дзейнічае ў вольны ад асноўнай працы час – адзінай рэальнай мэтай з'яўляецца дасягненне выніку і ўздзеянне на знешні свет. Актывісты будуць працягваць працаваць і праводзіць кампаніі да таго часу, пакуль іх мэта не будзе дасягнута.

**«Дзеці, якія растуць» (Putos que a ta cria)**

Група маладых людзей афрыканскага паходжання, якія жывуць на ўскраіне Лісабона, абрала музыку, каб выказаць пачуццё сацыяльнага адчужэння і навучыць іншых паважаць культурную разнастайнасць. Як тлумачаць на сваім сайце члены групы, імігранты другога пакалення часта адчуваюць сябе «выключанымі з супольнасці ў краіне, у якой яны нарадзіліся і жывуць, і выключанымі з супольнасці ў краінах, дзе нарадзіліся і жылі іх бацькі. Адным са спосабаў выказаць гэту дылему і бязвыхаднасць, якую яна параджае, заўсёды была музыка».

Такім чынам, маладыя артысты вырашылі выкарыстаць рэп і іншую музыку як форму сацыяльнай адукацыі, здольнай зацікаўліваць маладых людзей і садзейнічаць сацыяльнаму яднанню. Для гэтага яны выкарыстоўвалі рытм і паэзію і спрыялі таму, каб і іншыя рэперы сталі выкарыстоўваць музыку як сродак сацыяльнага пераўтварэння. Пасля правядзення некалькіх падрыхтоўчых курсаў і пры падтрымцы Маладзёжнай праграмы Еўрапейскага саюза група «Putos qui a ta cria» запісала два кампакт-дыска і DVD, прыняла ўдзел у розных грамадскіх мерапрыемствах, арганізавала маладзёжны фестываль па правах чалавека і натхніла іншых рэпераў. «Хіп-хоп – гэта весела, але і дзейсна».

http://www.myspace.com/putosquiatacria



# Калі група можа заняцца практычнай дзейнасцю?

Кароткі адказ – «у любы час». Акцыі на месцах, падобныя апісаным у раздзеле 2 гэтай главы, у большасці выпадкаў могуць праводзіцца да або пасля навучальнага практыкавання ў клубе ці класе. Перавага правядзення акцыі пасля практыкавання ў тым, што група глыбей зразумее праблемы і зможа больш творча падыходзіць да выбару аптымальнай формы акцыі. Перавага правядзення акцыі да выканання практыкаванняў – у тым, што група, уразумеўшы важнасць праблемы, будзе больш свядома ўдзельнічаць у навучальным практыкаванні.

Адукатары, якія рэгулярна займаюцца адукацыяй у галіне правоў чалавека, часта пераходзяць ад адной мадэлі да іншай у залежнасці ад канкрэтнай тэмы, узроўню зацікаўленасці або дасведчанасці групы і ад іх уласных адносін з гэтай групай. Мы паспрабавалі звязаць многія акцыі, прапанаваныя ў гэтай главе, з асобнымі практыкаваннямі, пра якія гаворка ішла ў главе 2. Назвы гэтых практыкаванняў прыводзяцца на палях, і многія акцыі дапаўняюць «Ідэі для дзеянняў», якія прыводзяцца ў заключнай частцы адпаведных практыкаванняў. Амаль усе ідэі для дзеянняў можна выкарыстоўваць у якасці ўводзін, перад практыкаваннямі ці пасля іх, як спосаб паказаць практычнае значэнне ўжо вывучаных праблем.

COMPASS

**Грамадзянскі актывізм – гэта тое, што падштурхоўвае вас рабіць маленькія справы кожны дзень. У нейкі момант вы разумееце, што змяненне гэтага свету становіцца сэнсам вашага жыцця. Часам вы думаеце, што вы можаце зрабіць многае, каб працягнуць руку дапамогі тым, хто ў ёй мае патрэбу. Вы становіцеся свабодным і бачыце свет новымі вачыма.**
*Іван Кандраценка, галоўны рэдактар расійскай студэнцкай газеты «Пераход».*

# 3.2 Простыя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека

*Калі вы бачыце несправядлівасць ці не верыце, што палітыка вядзецца сумленна, што вы робіце ў такой сітуацыі? Як вы паказваеце іншым людзям, што вы адчуваеце?*

**Адысці ад адказнасці ў канфлікце паміж моцным і слабым азначае стаць на бок моцнага, а не застацца нейтральным.**
*Паулу Фрэйрэ*

У гэтым раздзеле разглядаюцца некаторыя падыходы да арганізацыі адукацыі ў галіне правоў чалавека, якія вы зможаце выкарыстоўваць у вашай супольнасці. Гэтыя прапановы не з'яўляюцца чымсьці радыкальным і незвычайным, і вы, хутчэй за ўсё, ужо карыстаецеся многімі з іх у вашай працы: дызайн плакатаў, правядзенне дэбатаў, арганізацыя культурных мерапрыемстваў, сустрэчы з прадстаўнікамі розных арганізацый, адпраўленне лістоў і гэтак далей. Такія, на першы погляд, нескладаныя метады на самай справе выкарыстоўваюцца прафесійнымі актывістамі, і яны эфектыўныя!

Прыведзены ніжэй спіс – гэта толькі прыклад таго, што вы маглі б зрабіць разам са сваёй групай. Яго прызначэнне – абудзіць ідэі, а не даць гатовыя рэцэпты для дзеяння. Падыходзьце творча, спытайце ўдзельнікаў, якая справа, на іх думку, будзе больш карыснай або больш цікавай і будзе адпавядаць кваліфікацыі выканаўцаў.

## Публічныя мерапрыемствы

Публічныя мерапрыемствы, такія як вулічны тэатр, марш пратэсту, петыцыі або сядзячыя забастоўкі, маюць розныя мэты, але пералічаныя ніжэй з'яўляюцца, верагодна, самымі важнымі:

• Павысіць ступень дасведчанасці па вызначаным пытанні.

• Прыцягнуць іншых людзей да справы.

• Дамагчыся асвятлення ў сродках масавай інфармацыі.

• Паказаць палітыкам і службовым асобам, што грамадства назірае за іх дзеяннямі!

Калі вы плануеце публічнае мерапрыемства, памятайце, што важна рабіць тое, што прыцягне ўвагу: рассмяшыце людзей ці неяк па-іншаму прымусьце іх спыніцца і паглядзець; магчыма, вы нават вырашыце шакіраваць іх. Вам неабходна разгаварыць людзей!

**Крытычная маса**

У многіх еўрапейскіх гарадах, як правіла, у апошнюю пятніцу кожнага месяца дзясяткі, а часта і сотні веласіпедыстаў збіраюцца, каб пратэставаць супраць загружанасці вуліц машынамі. Гэты акт спантанны: няма ні арганізатараў мерапрыемства, ні запланаванага маршруту. Вялікая колькасць веласіпедыстаў разам едуць па вуліцах, каб запаволіць рух транспарту, прыцягнуць увагу да праблем забруджвання або небяспекі язды на веласіпедзе па запоўненых аўтамабілямі дарогах ці проста, каб паказаць, што ва ўладзе людзей знізіць тэмп звыклага гарадского жыцця, і адчуць радасць ад падзеленых агульных мэт і ідэалаў. Матывы ў людзей розныя, і многія веласіпедысты едуць з плакатамі і лозунгамі, якія яны хочуць давесці да ўвагі грамадскасці.

Тое, што пачыналася з некалькіх веласіпедыстаў, якія едуць разам, ператварылася ў масавае мерапрыемства і ў многіх гарадах стала штомесячнай традыцыяй.

Для атрымання дадатковай інфармацыі гл. www.critical-mass.info.

***Прапановы для групы:***

• Напішыце песню, мюзікл або сваю ўласную п'есу і сыграйце іх на вуліцы.

• Зрабіце плакат і ўстройце дэманстрацыю каля будынка мясцовай кампаніі ў знак пратэсту супраць забруджвання навакольнага асяроддзя, аўтсорсінгу працоўнай сілы, парушэння працоўных правоў – супраць усяго, што ўяўляецца важным на цяперашні момант.

• Вырабіце постары ці лістоўкі з інфармацыяй аб вашай праблеме і раздайце іх ці раскладзіце ў публічных месцах.

• Стварыце старонку ў Facebook для абмеркавання вашай праблемы, а затым выкарыстоўвайце іншыя сродкі ўзаемадзеяння ў сацыяльных сетках, каб прыцягнуць паслядоўнікаў.

Людзі часта кажуць, што дэманстрацыі з'яўляюцца пустой тратай часу, але на што будзе паказваць той факт, што ніхто не хоча ўдзельнічаць у дэманстрацыях па пэўнай праблеме?

**Голас «99 %»**

Рух «Захапі!» распаўсюдзіўся амаль на 1000 гарадоў у больш за 80 краінах у 2011 годзе. Часткова пад уплывам «Арабскай вясны», калі дэманстранты адмовіліся разысціся, пакуль іх патрабаванні не былі выкананы, актывісты, моладзь і многія іншыя ўсталявалі палаткі і стварылі невялікія самадастатковыя суполкі, якія «захапілі» адкрытыя прасторы ў цэнтрах гарадоў па ўсім свеце. Сваім лозунгам «Мы – 99 %» яны хацелі прыцягнуць увагу да таго факту, што велізарнае багацце, назапашанае ў руках адзінак, падрывае прынцып дэмакратыі, і выказвалі пратэст супраць рэзкага скарачэння выдаткаў на сацыяльныя паслугі, якія закранаюць большасць насельніцтва.

# Маладыя людзі ў ролі педагогаў

Праз публічныя мерапрыемствы, падобныя тым, якія прыведзены ў папярэднім раздзеле, ажыццяўляецца не столькі навучанне, колькі перадача імгненных і нескладаных пасланняў, якія абуджаюць свядомасць і прымушаюць задумацца («сеюць насенне» думак). Маладыя людзі могуць быць выдатнымі адукатарамі і часта больш эфектыўнымі ў прыцягненні да справы новых асоб, у змяненні поглядаў да праблем, асабліва калі аўдыторыяй з'яўляюцца іх равеснікі. Тлумачэнне іншым якой-небудзь праблемы таксама дапаможа маладым людзям удакладніць свае пазіцыі і здабыць яшчэ большую ўпэўненасць.

**Праект «Пауэрпод» (Powerpod Project) http://www.edinburgh-powerpod.org**

Эдынбургская арганізацыя «Вудкрафт Фоўк» (Woodcraft Folk) выйграла грант на выкарыстанне прычэпа з сонечнымі панэлямі і ветранымі турбінамі ў якасці практычнага навучальнага дапаможніка па аднаўляльных крыніцах энергіі. Праект быў прадстаўлены перад маладымі людзьмі ў Лотыяне, Шатландыя. Прычэп, вядомы як «Пауэрпод» (Powerpod), быў выраблены студэнтамі мясцовага ўніверсітэта для дэманстрацыі дзеяння сонечнай электрычнай і сонечнай цеплавой энергіі, а таксама альтэрнатыўнай ветраной энергіі.

Першая група актывістаў-адукатараў «Вудкрафт Фоўк» адправілася ў Цэнтр альтэрнатыўных тэхналогій, дзе яны азнаёміліся з навуковымі і тэхнічнымі аспектамі «Пауэрпода». Па вяртанні яны распрацавалі цыкл заняткаў для дзяцей і моладзі іх узросту. На гэтай аснове была арганізавана сістэма курсаў і семінараў з удзелам іншых груп «Вудкрафт» у гэтым раёне.

Семінары выклікалі вялікую цікавасць у сферах як фармальнай, так і нефармальнай адукацыі.

Крыніца: http://www.scotland.gov.uk/Topics/SustainableDevelopment/EWFenergytrailer



**Спасылкі на практыкаванні:** Многія з практыкаванняў падымаюць агульныя пытанні, якія могуць быць тэмай кампаніі па павышэнню дасведчанасці, напрыклад: ***«Гісторыя Ашыка»*** (дзіцячая праца), ***«Пагаворым пра секс»*** (гендарныя пытанні/гамафобія), ***«Адказ расізму»*** (расізм, дыскрымінацыя).

**Тым, хто хоча вучыцца, часта перашкаджае аўтарытэт тых, хто навучае.**
*Цыцэрон*

**Спасылкі на практыкаванні:** Выкарыстоўвайце практыкаванні ***«Дзе вы стаіце?»*** або ***«Выбірай!»***, каб знайсці пытанні, якія прадстаўляюць інтарэс для маладых людзей, і дапамагчы ім папрактыкавацца ў аргументацыі і вядзенні дыскусіі.

Выкарыстоўвайце практыкаванне ***«Сыграем гэта!»***, каб актывізаваць творчае мысленне аб праблемах правоў чалавека, а таксама ў якасці матэрыялу для пантамімы або інсцэніроўкі.

Выкарыстоўвайце практыкаванне ***«Адукацыя для ўсіх»***, каб задумацца аб адукацыі, аб тым, што яна значыць, чаму яна важна і як яна закранае ўсе бакі жыцця.

***Прапановы для групы:***

• Арганізуйце публічныя дэбаты па пытанні, якое ўяўляе інтарэс, напрыклад скарачэнне выдаткаў на адукацыю, непарушэнне правоў чалавека ў дачыненні да злачынцаў, скарачэнне ваенных праграм дзеля зніжэння ўзроўню беднасці. Запрасіце да ўдзелу службовых асоб і вашых сяброў.

• Зрабіце сваё ўласнае відэа ці арганізуйце тэатральную пастаноўку на тэму правоў чалавека.

• Напішыце артыкул для мясцовай (ці агульнанацыянальнай) газеты або папрасіце ў мясцовага радыё або тэлебачання ўзяць у вас інтэрв'ю. Ці можаце вы дадаць такую карцінку, каб яна прыцягвала ўвагу?

• Выберыце праблему, у якой група добра разбіраецца, і распрацуйце праграму навучання, якое будзе праводзіцца ўдзельнікамі групы, з іншымі групамі або вучнямі мясцовай школы. Вы маглі б правесці з групай маладых людзей гутарку аб правах чалавека або выканаць якое-небудзь практыкаванне з главы 2?

**Праект «Жывая бібліятэка»**

Група з Вроцлава (Польшча) арганізавала «Жывую бібліятэку», дзе кнігі прадстаўлены людзьмі з розных культурных, сацыяльных груп або супольнасцей іншага роду. «Кнігі» можна «пазычыць» для паўгадзіннай гутаркі. Гаворка ідзе пра групы людзей, у дачыненні да якіх існуе тэндэнцыя сацыяльнага адчужэння і парушэння правоў чалавека, напрыклад асобы з нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыяй, цыганы-рама, асобы з інваліднасцю, рэлігійныя меншасці і г. д.

На працягу 2 дзён працы бібліятэкі прыйшлі 600 чалавек і больш за 100 чалавек пазычылі «кнігу». Мерапрыемства асвятлялася дзяржаўнымі і прыватнымі тэле- і радыёканаламі, а таксама ў друкаваных выданнях.

Ідэя «Жывой бібліятэкі» складаецца ў тым, каб развеяць забабоны. Яна дазволіла наведвальнікам, якія, магчыма, мелі прадузятае меркаванне пра тыя ці іншыя групы насельніцтва, сустрэцца, пагаварыць і выслухаць. Пасля размовы з «кнігамі» «чытачы» зрабілі наступныя каментарыі:

«Гэта дапамагло мне прыняць рашэнні, якія датычацца майго жыцця».

«Я шмат чаго зразумеў; размовы з некаторымі людзьмі літаральна зламалі мае стэрэатыпы».

Больш поўная інфармацыя аб метадалогіі «Жывой бібліятэкі» знаходзіцца на сайце www.coe.int/compass.

# Рабіце гэта самастойна

**Тэрмін «тэатр герылья» (партызанскі тэатр) выкарыстоўваецца для апісання спантанных, нечаканых выступленняў у не прызначаных для гэтых мэт грамадскіх месцах. Як правіла, гэтыя выступы накіраваны на тое, каб сродкамі сатыры, пратэсту і «карнавальных» прыёмаў звярнуць увагу публікі на палітычныя/сацыяльныя праблемы.** *Вікіпедыя*

Ёсць некалькі спосабаў, з дапамогай якіх ваша група можа дамагчыся змен непасрэдна, не звяртаючыся да палітыкаў, грамадскасці або іншых пасярэднікаў. Гэта можа стаць самай удзячнай справай, таму што вынік адразу відаць і члены групы бачаць, што менавіта іх дзеянні зрабілі перамены магчымымі.

Многія маладзёжныя групы, напрыклад, актыўна аказваюць непасрэдную дапамогу неабароненым групам насельніцтва, чые правы парушаюцца. Нярэдка такім людзям павінна дапамагаць дзяржава, таму што менавіта дзяржава нясе адказнасць за тое, каб правы грамадзян не парушаліся. Тым не менш, калі дзяржава не выконвае сваіх абавязацельстваў, грамадству часта даводзіцца ўмешвацца і аказваць патрэбную дапамогу.

Маладыя людзі могуць дапамагчы запоўніць гэты прабел – часта досыць проста знаходзіцца побач, рэгулярна сустракацца з тымі, хто перажывае цяжкасці, выслухваць іх праблемы або скласці ім кампанію, падтрымаць размову. Такі вопыт заўсёды карысны для абодвух бакоў. Наведванне людзей або груп, якія з'яўляюцца неабароненымі, і выяўленне недапрацовак з боку дзяржавы таксама можа надаць вялікую важкасць аргументам маладых людзей пры звароце да адпаведных службовых асоб або сродкаў масавай інфармацыі з мэтай публічнага асвятлення праблемы.

*Падумайце пра канкрэтную групу насельніцтва: якія праблемы, звязаныя з правамі чалавека, дапамагло б вырашыць наведванне маладымі людзьмі?*

### *Іншыя прапановы для групы:*

• Паклапаціцеся пра занядбаную частку вашага раёна: пасадзіце кветкі ці гародніну і зрабіце месца такім, каб людзі захацелі тут бываць.

• Прапануйце жыхарам раёна свае паслугі ў галіне садаводства ці іншую дапамогу. Ці можа ваша група стаць цэнтрам навучання, як Свабодны ўніверсітэт, згаданы ў пачатку гэтай главы?

• Папытайце ў суседзяў старую фарбу, аздобныя матэрыялы: прывядзіце ў парадак маладзёжны цэнтр або мясцовы грамадскі цэнтр, ці нават чый-небудзь дом!

• Спячыце што-небудзь і прынясіце ў прытулак для бяздомных або самотнаму суседу. Альбо раздайце выпечку разам з лістоўкамі – выкарыстоўвайце гэта як спосаб прыцягнення ўвагі да вашай справы.

**«Сеяць насенне»**

У многіх краінах свету атрымалі развіццё ініцыятывы па выкарыстанні пустак для стварэння садоў. Гэта часам называюць «партызанскім садаводствам» (guerrilla gardening), ад іспанскага слова guerrilla, які азначае «маленькая вайна». 1 мая групай «Брусельскія фермеры» было абвешчана Міжнародным днём партызанскага садаводства сланечніку. У 2010 годзе каля 5000 чалавек па ўсім свеце прынялі ўдзел у абвешчаным мерапрыемстве і пасеялі насенне сланечніку ў сваіх раёнах.

# Змена палітыкі ці паводзінаў прадстаўнікоў дзяржавы

Паколькі, як мы памятаем, менавіта дзяржава або прадстаўнікі дзяржавы абавязаны забяспечваць выкананне правоў чалавека, змены ў палітыцы ці ў законах і нарматыўных актах часта з'яўляюцца канчатковай мэтай кампаній за правы чалавека.

Гэта можа здацца занадта «сур'ёзнай» вобласцю для маладых людзей або вобласцю, дзе яны наўрад ці могуць што-небудзь памяняць. Тым не менш змяненне палітыкі адбываецца на нацыянальным, міжнародным ці лакальным узроўні ў выніку сукупнасці актаў ціску, якія часта ідуць адзін за адным па розных каналах уздзеяння. Не выключана, што маладыя людзі, якія ўключаюцца ў барацьбу за правы чалавека, будуць здольны ўнесці такі ж уклад у гэты працэс, як і вопытныя актывісты. У іх, мабыць, больш шанцаў на поспех на лакальным узроўні або на ўзроўні ўстаноў, таму што тут маштабы меншыя і больш рэальна атрымаць доступ да людзей, што ўдзельнічаюць у прыняцці важных рашэнняў. Тым не менш не выключайце працу на нацыянальным або нават на міжнародным узроўні, калі група вырашыць паспрабаваць гэта.

COMPASS

**Спасылкі на практыкаванні:** Выкарыстоўвайце практыкаванне ***«Варыянты нашай будучыні»***, каб людзі задумаліся пра свой раён і пра тое, як тут выкарыстоўваецца прастора.

Выкарыстоўвайце практыкаванне ***«На лесвіцы»***, каб знайсці спосабы, з дапамогай якіх маладыя людзі маглі б быць у большай ступені ўцягнутымі ў жыццё мясцовай супольнасці.

Выкарыстоўвайце практыкаванне ***«Барацьба за багацце і ўладу»***, каб вывучаць ідэі справядлівасці, а таксама пачуцці тых, хто падвяргаецца сацыяльнаму адчужэнню.

**Свет з'яўляецца небяспечным месцам не з-за тых, хто чыніць зло, а з-за тых, хто глядзіць на гэта і нічога не робіць.**
*Альберт Эйнштэйн*

Часам лепшы спосаб аказаць ціск на прадстаўнікоў дзяржавы – гэта супрацоўніцтва і давядзенне вашых аргументаў да іх разумення. Часам праз пратэст або ціск. Як правіла, палітыка змяняецца ў выніку ўздзеяння па розных напрамках – праз супрацоўніцтва і праз канфрантацыю.

*Ці ведаюць маладыя людзі, з якімі вы працуеце, хто прадстаўляе іх палітычныя погляды на мясцовым, нацыянальным і еўрапейскім узроўні?*

**Адукацыйныя рэформы, адкладзеныя ў выніку студэнцкіх пратэстаў**

Існуе пераканаўчая гісторыя студэнцкіх пратэстаў у многіх краінах, і лічыцца, што студэнцкія выступленні часта аказвалі прамы ўплыў на палітыку ці служылі штуршком для іншых груп, гатовых выказаць сваю незадаволенасць палітычнымі рашэннямі.

У 2008 годзе французскі ўрад прапанаваў унесці шэраг змяненняў у навучальны працэс, у тым ліку істотна скараціць колькасць выкладчыкаў і паменшыць колькасць вучэбных гадзін. Студэнты выйшлі на вуліцы ў гарадах па ўсёй краіне, і ўрад быў вымушаны адкласці рэформы.

**Спасылкі на практыкаванні:** Выкарыстоўвайце практыкаванне ***«Колькі нам патрэбна?»***, каб разгледзець «Мэты развіцця тысячагоддзя» і абавязацельствы ўрада па іх выкананні.

Выкарыстоўвайце практыкаванне ***«Чахал супраць Вялікабрытаніі»***, каб разыграць судовы разбор у Еўрапейскім судзе. Удзельнікі могуць разгледзець рашэнні, вынесеныя супраць іх уласнай краіны, і ўбачыць, які ўплыў гэта аказала на яе палітыку.

Выкарыстоўвайце практыкаванне ***«Пасяджэнне прафсаюза»***, каб папрактыкавацца ў навыках вядзення перамоў і разгледзець адносіны паміж працаўнікамі і працадаўцам.

## *Прапановы для групы:*

• Звяжыцеся з мясцовымі службовымі асобамі, адказнымі за канкрэтнае рашэнне, з апазіцыйнымі палітыкамі ці з яшчэ якімі-небудзь асобамі, што маюць уплыў на палітыку. Папрасіце аб сустрэчы або арганізуйце грамадскія слуханні і запрасіце іх прыняць удзел у гэтых мерапрыемствах.

• Складзіце петыцыю і збярыце як мага больш подпісаў. Запрасіце журналістаў, калі вы будзеце ўручаць свой зварот таму, на каго збіраецеся паўплываць.

• Даведайцеся пра абавязацельствы ўрада па выкананні правоў чалавека і аб дагаворах, якія былі ім падпісаны. Звяжыцеся з адвакатамі або НГА, якія працуюць у гэтай галіне, і папрасіце ў іх параду. Затым звярніцеся з лістом да вашага дэпутата ў парламенце або да мясцовага палітыка, што мае дачыненне да вашай праблемы, даведайцеся, якія дзеянні яны ажыццяўляюць, каб забяспечыць выкананне гэтых абавязацельстваў. Інфармуйце СМІ!

• Пацікаўцеся, якія існуюць механізмы на нацыянальным або міжнародным узроўні, якія вы можаце выкарыстоўваць для звароту са скаргай або запытам у афіцыйны орган.

**Назіранне за працай паліцыі**

LegalTeam – гэта група маладых кансультантаў, актывістаў і экспертаў у сферы прававых адносін, якія працуюць у Расіі. Яны спецыялізуюцца на аказанні юрыдычнай дапамогі і абароне правоў людзей, якія прымаюць удзел у грамадскіх сходах ці дэманстрацыях. Многія з такіх людзей з-за свайго ўдзелу ў такіх мерапрыемствах адчуваюць ціск з боку паліцыі. Аналагічныя ініцыятывы існуюць у многіх краінах.

Група ў Расіі першапачаткова была створана, каб адсочваць і прадухіляць парушэнні правоў чалавека падчас саміту «Вялікай васьмёркі» ў Санкт-Пецярбургу ў 2006 годзе. Затым яна перарасла ў арганізацыю, якая займаецца навучаннем актывістаў заканадаўству аб пратэстнай дзейнасці і таму, як выстаўляць абвінавачанні супраць уладаў, што, магчыма, злоўжываюць сваімі паўнамоцтвамі. Група праводзіць семінары і выпусціла шэраг інфармацыйных матэрыялаў. Іх старонка ў LiveJournal стала віртуальным месцам сустрэчы для дыскусій і кансультацый і служыць сродкам для каардынацыі дзеянняў.

(http://community.livejournal.com/legal_team).

# Звяжыцеся з іншымі групамі або рухамі

Пахвальна, калі маладыя людзі ініцыююць свае ўласныя акцыі, але часта бывае карысна прыняць удзел у больш шырокім руху і набрацца вопыту праз сумесную працу з іншымі арганізацыямі. Ёсць шмат арганізацый, як «прафесійных» НГА, так і спантанных нізавых рухаў, якія займаюцца правамі чалавека, і многія з іх будуць рады далучыць да справы маладых людзей і атрымаць іх падтрымку. Памятайце, што сама арганізацыя не заўсёды пазіцыянуе сваю працу як працу ў галіне «правоў чалавека»; аднак займаючыся праблемамі бяздомных, дзіцячай беднасці, гвалту ў сям'і, расізму, дыскрымінацыі і многімі іншымі, арганізацыя, зразумела, дбае пра правы чалавека, незалежна ад таго, заяўляе яна пра гэта прама ці не.

Маладыя людзі могуць прымаць удзел у кампаніях, якія праводзяцца такімі арганізацыямі, або для больш актыўнага ў іх удзелу могуць прапанаваць дапамогу ў планаванні і падрыхтоўцы мерапрыемства. Нізавыя ініцыятывы, не забяспечаныя належным фінансаваннем, заўсёды будуць рады дапамозе добраахвотнікаў, ды і ў прынцыпе яны даюць больш магчымасцей для праяўлення ўласнай ініцыятывы. Буйнейшыя НГА могуць падзяліцца практычным вопытам у абмен на дапамогу маладых людзей у якасці пазаштатных валанцёраў. Такі шлях дазваляе маладым людзям атрымаць магчымасць папрацаваць з прафесійнымі актывістамі і набыць карысны практычны досвед, а таксама даведацца больш аб рабоце трэцяга сектара.

**Калі пашанцуе, то адна фантазія можа цалкам пераўтварыць мільён рэальнасцей.**
*Мая Энджэлау*

*Ці ведаеце вы, якія мясцовыя арганізацыі займаюцца пытаннямі правоў чалавека? Ці існуюць нейкія канкрэтныя пытанні, якім не надаецца дастатковай увагі?*

**Рух «Ежа замест бомбаў»**

«Ежа замест бомбаў» гэта нізавы рух за мір, які ўзнік у Злучаных Штатах і ў цяперашні час ахоплівае многія краіны свету. Невялікія групы добраахвотнікаў, даведаўшыся пра гэты рух, прапануюць бясплатную вегетарыянскую ежу не толькі бяздомным, але любому, хто пажадае, без усялякіх абмежаванняў. Яны робяць гэта не толькі для таго, каб дапамагчы тым, хто галадае, але і для таго, каб звярнуць увагу на той факт, што перанакіраванне ваенных выдаткаў і ліквідацыя страт і разбазарвання прадуктаў маглі б спыніць голад у свеце. Рух не мае афіцыйнай арганізацыі, але заклікае людзей ствараць «мясцовыя аддзяленні» і раздаваць ежу ў якасці палітычнай акцыі. Аддзяленні руху «Ежа замест бомбаў» існуюць усюды ў ЗША і ў многіх гарадах Еўропы. Для атрымання дадатковай інфармацыі гл. http://www.foodnotbombs.net/.

«Я лічу, што рух «Ежа замест бомбаў» вытрымаў выпрабаванне часам, таму што яго ўдзельнікі могуць адразу бачыць вынік, і потым людзі мяняюцца, калі бачаць, што яны могуць збіраць ежу і непасрэдна ўплываць на жыццё іншых людзей, дзелячыся ежай і раздаючы прадукты. Іншы аспект, які спрыяе даўгавечнасці гэтага руху, закладзены ў нашым прынцыпе не мець лідараў і заахвочваць кожную групу шукаць кансэнсусу пры прыняцці рашэнняў. Добраахвотнікі адчуваюць, што, выконваючы гэту працу, яны дзейнічаюць па сваёй волі, а не па загадзе, і ведаюць, што ніхто не зарабляе грошы на іх працы. Яны нясуць асабістую адказнасць за тое, каб «Ежа замест бомбаў» дзейнічала». Кіт МакГенры, заснавальнік руху «Ежа замест бомбаў»

### *Прапановы:*

• Высветліце, якія мясцовыя арганізацыі займаюцца праблемамі, што цікавяць групу: арганізуйце сустрэчу з іх прадстаўнікамі і папрасіце групу падумаць пра тое, у чым можа заключацца яе ўдзел.

• Разгледзьце кампаніі, якія праводзяць больш буйныя вядомыя арганізацыі па правах чалавека, такія як «Урачы без меж», Amnesty International, Save the Children, «Міжнародная федэрацыя лігі за правы чалавека» (FIDH) або «Грынпіс», і абмяркуйце з групай, над якімі праблемамі яны хацелі б папрацаваць і ў якіх кампаніях хацелі б прыняць удзел.

• Звярніцеся да раздзела «Планаванне і дзеянні» ў гэтай главе і пацікаўцеся, ці не захоча група стварыць сваю ўласную арганізацыю для працы па канкрэтнай праблеме. Яны могуць звязацца з іншымі маладзёжнымі групамі або прыцягнуць сяброў з карыснымі навыкамі і ідэямі для папаўнення сваіх шэрагаў. Менавіта так і ствараюцца арганізацыі па правах чалавека!

**«Міжнародны маладзёжны праваабарончы рух»**

«Міжнародны маладзёжны праваабарончы рух» (YHRM) з'яўляецца міжнароднай сеткай маладых людзей і арганізацый, галоўным чынам, з краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Маладыя людзі працуюць разам, каб абараняць і прасоўваць ідэі і прынцыпы правоў чалавека, падтрымліваць акцыі адзін аднаго і фарміраваць новае пакаленне абаронцаў правоў чалавека. YHRM паўстаў у 1998 годзе па ініцыятыве невялікай групы маладых людзей. Сёння гэты рух аб'ядноўвае больш за 1000 чалавек з 37 краін. Больш падрабязная інфармацыя даступна на сайце www.yhrm.org.

# Збор даных

**Маладыя людзі і іх уцягнутасць – «Што вам трэба?»**

У невялікім польскім гарадку мясцовае маладзёжнае аб'яднанне было занепакоена нізкім узроўнем уцягнутасці маладых людзей у грамадскае жыццё. Яны ведалі, што мясцовыя ўлады маюць слабае ўяўленне пра моладзь горада і пра яе патрэбы, таму яны вырашылі сабраць інфармацыю для таго, каб даць больш поўную карціну пра інтарэсы моладзі. Яны выкарыстоўвалі цэлы шэраг розных інструментаў і метадаў, напрыклад сацыяльныя сеткі, тэкставыя паведамленні, інтэрв'ю на вуліцах і размовы са сваімі сябрамі, калегамі і сем'ямі. Затым па выніках даследавання група арганізавала публічную выстаўку. З дапамогай экспертаў яны склалі афіцыйны дакумент, выклаўшы ў ім атрыманыя вынікі, і адправілі яго мэру. Гэта быў першы выпадак у горадзе, калі галасы маладых людзей былі пачуты.

Даследаванні і маніторынг з'яўляюцца важнымі інструментамі ў працы любога актывіста як для таго, каб прадставіць групе, якая рыхтуецца да актыўных дзеянняў па пэўным пытанні, карціну патрэб і праблем, так і ў якасці рычагоў уздзеяння на ўлады або сродку інфармавання грамадскасці. Ведаць праблему з розных бакоў неабходна для таго, каб паспяхова планаваць мерапрыемствы. Або, як у прыведзеным вышэй прыкладзе, інфармацыя сама па сабе можа быць эфектыўным спосабам уздзеяння на ўлады.

Як могуць групы займацца зборам інфармацыі, напрыклад такім, які прыведзены вышэй, і быць упэўненымі, што інфармацыя карысная не толькі ім самім, але таксама і для вырашэння канкрэтнага пытання? Іншымі словамі, як быць упэўненым у тым, што збор інфармацыі з'яўляецца не толькі адукацыйнай дзейнасцю, але і пачаткам акцыі?

• Варта быць упэўненым, што ваша інфармацыя свежая, ці сенсацыйная, ці малавядомая – напрыклад, яна змяшчае даныя пра тое, што ў вашым родным горадзе вось столькі маладых людзей начуюць на вуліцах, даныя пра іх узрост, пра тое, як яны апынуліся на вуліцы і што яны кажуць аб сваіх патрэбах.

• Падумайце, каму патрэбна інфармацыя і як бы вы хацелі, каб ёю распарадзіліся. Ці паспрабуеце вы самі пераканаць мясцовых палітыкаў або будзеце старацца аказваць на іх ціск праз грамадскую думку альбо ж з дапамогай міжнародных арганізацый?

• Падумайце аб формах прадстаўлення інфармацыі: напрыклад, выстаўка, падобная той, што была арганізавана польскай групай, можа быць больш прывабнай для шырокай публікі, чым радок статыстычных даных!

• Таксама праінфармуйце СМІ аб выніках вашага даследавання, нават калі ўздзеянне на іх меркаванні не было галоўнай мэтай вашай акцыі. Гэта стане гарантыяй таго, што ўзнятае вамі пытанне проста так не «разыйдзецца».

**Спасылкі на практыкаванні:** Паспрабуйце практыкаванне ***«Галасаваць ці не галасаваць?»***, каб маладыя людзі набраліся вопыту ў правядзенні даследаванняў.

Выкарыстоўвайце практыкаванне ***«Сетка жыцця»*** для вывучэння пытанняў, звязаных з навакольным асяроддзем і яго забруджваннем; затым знайдзіце «вугляродны калькулятар» у Інтэрнэце і дапамажыце ўдзельнікам разлічыць іх вугляродны след.

**Маладыя людзі – назіральнікі на выбарах**

На парламенцкіх выбарах у Арменіі маладым людзям з гэтай і іншых краін была дадзена магчымасць прыняць удзел у назіранні за выбарамі. Перш за ўсё, быў выпушчаны «Дапаможнік для маладога назіральніка», які змяшчаў усю неабходную інфармацыю для назірання за ходам працэсу выбараў. У дапаможніку былі асветлены прававыя пытанні, растлумачана само паняцце выбараў і іх неабходнасць, расказана аб палітычных партыях, якія дзейнічаюць у Арменіі, і задачах місіі назірання.

Каля 82 маладых людзей прынялі ўдзел у назіранні за выбарамі. Па завяршэнні яны апублікавалі даклад, які быў распаўсюджаны сярод зацікаўленых бакоў.

З ім можна азнаёміцца на сайце Федэрацыі маладзёжных клубаў Арменіі www.youthclubs.am.

# 3.3 Распрацоўка плана дзеянняў

**Правы чалавека ў гісторыі**

Група школьнікаў у вёсцы Плюса, Расія, захацела даведацца больш пра эпоху Сталіна і пра жыццё пры тым рэжыме. Школьнікі вырашылі звярнуцца да людзей, якія памятаюць тыя гады; яны некалькі разоў сустракаліся, каб абмеркаваць, як яны будуць падыходзіць да людзей, праводзіць інтэрв'ю, а затым збіраць, супастаўляць і прадстаўляць інфармацыю грамадскасці.

Яны правялі больш за 70 інтэрв'ю са сваякамі, суседзямі, настаўнікамі школ і тымі, хто захацеў падзяліцца ўспамінамі і разважаннямі аб пражытым. Затым дзеці арганізавалі выстаўку ў некалькіх вёсках Пскоўскай вобласці з фотаздымкамі і фрагментамі з розных інтэрв'ю. Апытаныя былі рады, што да іх праяўляюць цікавасць і што ў іх ёсць магчымасць пагаварыць пра часы, што былі цяжкімі, але і былі гадамі іх станаўлення. Часам апавяданні адклікаліся болем і сумам у сэрцах прадстаўнікоў старэйшага і маладога пакалення. Але зараз у тых і іншых з'явілася больш паразумення і эмпатыі адзін да аднаго, яны сталі глыбей разумець падзеі, іх матывы і ўплыў на асабістае жыццё, вопыт выжывання людзей у такія цяжкія часы. Інтэрв'ю можна паглядзець на http://wiki.antarchia.org/tiki-index.php.

**Калі вы крычыце «Наперад!», то абавязкова ўказвайце кірунак, куды менавіта наперад. Пагадзіцеся, што калі, не паказваючы напрамкі, выпаліць гэтым словам адначасова ў манаха і рэвалюцыянера, то яны пойдуць па цалкам розных дарогах.**

*Антон Чэхаў*

Як правіла, любое дзеянне патрабуе ўважлівага планавання, і актывізм не з'яўляецца выключэннем. Прысвечаны планаванню занятак дапаможа групе засяродзіцца на тым, што вы хочаце і здольны ўчыніць, які найлепшы спосаб дасягнення мэты. Калі ў вас больш амбіцыйныя мэты, то такі першы крок неабходны, бо акцыя, якая не дасягае жаданага выніку ці сутыкаецца з нечаканымі праблемамі, дэмаралізуе. Неабходна, каб ваша першая справа была паспяховай.

Гэты раздзел пазнаёміць вас з адным са спосабаў пабудовы плана, а таксама дапаможа засяродзіць увагу групы на найбольш эфектыўным метадзе дасягнення пастаўленай мэты. Гэтыя метады карысныя для разавай акцыі, падобнай тым, якія апісаны ў папярэднім раздзеле, але яны таксама дастасавальныя і для падрыхтоўкі працяглай кампаніі, якая можа ўключаць у сябе цэлы шэраг акцый, накіраваных на дасягненне адной мэты.

# Перад пачаткам працы...

### *Спазнайце сябе – SWOT-аналіз*

*Ці ведаеце вы, якімі навыкамі валодаюць члены групы? Ці ведаеце вы іх канкрэтныя інтарэсы?*

**Той можа, хто лічыць, што ён можа.**
*Буда*

У кожнай групе ёсць схаваныя таленты, і кожны член групы мае свае сімпатыі і антыпатыі, асаблівыя навыкі, а таксама заўсёды ёсць нешта, што яму даецца з вялікай цяжкасцю. Каб быць упэўненым у тым, што група зробіць максімум у адпаведнасці са здольнасцямі і магчымасцямі яе членаў, карысна арганізоўваць спецыяльныя заняткі. SWOT-аналіз – эфектыўны спосаб вырашэння гэтай задачы. Такі аналіз таксама ўлічвае не залежныя ад групы знешнія абставіны, якія могуць паўплываць на тое, што вы ў стане зрабіць.

Акронім SWOT уяўляе сабой абрэвіятуру англійскіх слоў, якія расшыфроўваюцца як:

• Strengths («моцныя бакі»): тое, што група робіць добра.

• Weaknesses («слабыя бакі»): тое, што група робіць не вельмі добра.

• Opportunities («магчымасці»): магчымасці за межамі групы, якія могуць быць выкарыстаны ў інтарэсах яе дзейнасці.

• Threats («пагрозы»): знешнія фактары, якія могуць стаць на шляху пастаўленых групай мэт.

Пры правядзенні аналізу не спяшайцеся, патрацьце на яго не менш за гадзіну. Падзяліце групу на чатыры працоўныя секцыі і размяркуйце паміж імі задачы выяўлення SWOT: моцных і слабых бакоў, магчымасцей і пагроз. Затым зноў збярыце групу і высветліце, ці згодны ўдзельнікі з высновамі сваіх калег. Пры неабходнасці ўдакладніце і дапоўніце адпаведныя раздзелы.

Прыведзеная ніжэй дыяграма з'яўляецца прыкладам завершанага аналізу і можа падказаць групе карысныя ідэі. Аднак не дазваляйце ў дакладнасці яе капіраваць! Майце на ўвазе, што кожная група ўнікальная і ў яе будуць іншыя моцныя (і слабыя) бакі, якія трэба вызначыць самастойна.

**Прыклад завершанага SWOT аналізу**

| **Якія моцныя бакі нашай групы?** | **Якія слабыя бакі нашай групы?** |
|---|---|
| • Яна вялікая!<br>• У нас ёсць час – і жаданне заняцца справай<br>• Бацька Міхася – палітык<br>• У нас ёсць месца для сходаў у цэнтры горада<br>• У Марыны добра атрымліваецца выступаць публічна<br>• У Васіля ёсць камп’ютар | • Занадта шмат лідараў!<br>• У нас няма грошай<br>• Вельмі мала хлопчыкаў<br>• Мы ніколі не рабілі нічога падобнага раней і таму мы нервуемся<br>• Некаторыя з нас жывуць далёка ад цэнтра горада<br>• Мы не заўсёды добра працуем групай |
| **Якія магчымасці існуюць за межамі групы?** | **Якія існуюць знешнія пагрозы нашай дзейнасці?** |
| • Набліжаюцца выбары<br>• Ёсць гранты пад праекты з бежанцамі<br>• Еўрапейскі суд толькі што вынес рашэнне супраць нашай краіны, якое асуджае дрэннае абыходжанне са зняволенымі<br>• У нас ёсць новы будынак гарадскога савета, зручны для правядзення тэатралізаваных выступленняў | • Эканамічная сітуацыя нестабільная<br>• У некаторых з нас набліжаюцца экзамены<br>• Гарадская рада пагражае забараніць грамадскія сходы<br>• Шырока распаўсюджана негатыўнае стаўленне да таго, што працоўныя месцы дастаюцца бежанцам, а не мясцовым жыхарам<br>• Занадта холадна, каб рабіць нешта на вуліцы<br>• Нашы бацькі не хочуць, каб мы займаліся чымсьці рызыкоўным |

## *Выбар праблемы*

Як групе выбраць праблему, над якой яна будзе працаваць? У большасці выпадкаў гаворка ідзе аб пытаннях, якія члены групы лічаць важнымі і над якімі яны хочуць працаваць. Рэальныя падзеі, такія як землятрус на Гаіці, голад у Судане або высяленне сям'і з дому ў вашым раёне, могуць даць імпульс для такога выбару. Асноўнай цяжкасцю можа стаць дасягненне агульнай згоды наконт таго, якую праблему выбраць і якім чынам лепш за ўсё за яе ўзяцца.

**Пачынайце з таго, што правільна, а не з таго, што прымальна.**
*Франц Кафка*

Вам трэба будзе зрабіць так, каб рашэнні прымаліся з агульнай згоды ўсіх членаў групы, так што не спяшайцеся пачынаць разгляд праблем: вылучыце дастаткова часу, каб абмеркаваць перавагі кожнага і абгаварыць пераважнасць выбару гэтай, а не іншай праблемы. Звярніце ўвагу на тое, што ім яшчэ прадставіцца выпадак заняцца іншымі праблемамі. А таксама, што самае галоўнае – трэба зрабіць так, каб у ходзе мерапрыемства група заставалася згуртаванай, а калі хтосьці катэгарычна супраць пэўнага выбару, то не варта настойваць. Паспрабуйце дасягнуць кансэнсусу ў групе, а не прымаць рашэнне большасцю.

*Як зрабіць так, каб рознагалоссі ў групе былі хутчэй карыснымі, чым разбуральнымі?*

## *Вывучэнне праблемы*

**Дрэвы і камяні навучаць вас таму, што вы ніколі не зможаце даведацца ад майстроў.**
*Св. Бернард Клервоскі (каля 1100 г.)*

### Дрэва праблемы

Карысным інструментам для спасціжэння пытання, над якім вы будзеце працаваць, з'яўляецца дрэва праблемы. Гэты метад дазваляе разабраць пытанне, разгледзець прычыны і вынікі і ўпісаць яго ў кантэкст іншых праблем у грамадстве. Дрэва праблемы можа быць карысным як для больш глыбокага разумення пытання ўдзельнікамі, так і для пошуку больш стратэгічнага рашэння.

Узор дрэва праблем можна ўбачыць на наступнай старонцы; у якасці зыходнага пункта тут узята праблема беспрытульных дзяцей. Група можа выкарыстоўваць такі парадак дзеянняў, каб пабудаваць дрэва для ўласнага пытання:

• Пачніце з таго, што ў цэнтры вялікага аркуша паперы запішыце праблему, над якой вы хочаце працаваць.

• Ніжэй выпішыце ўсе фактары, ад якіх залежыць праблема, і злучыце іх так, каб сфарміраваліся карані вашай зыходнай праблемы.

• Разгледзьце кожны корань па адным і прааналізуйце іх, беручы пад увагу ўсе фактары, ад якіх залежыць праблема.

• Рабіце так да таго часу, пакуль можаце працягваць: дрэва можа мець больш глыбокія карані, чым вы думаеце.

• Паспрабуйце падоўжыць такім жа чынам і «галіны» дрэва: яны будуць вынікамі вашай зыходнай праблемы. Можа выявіцца, што тое, з чаго вы пачалі, як з асноўнай задачы, на самай справе корань або галіна іншага дрэва.

• Калі вы скончыце, паглядзіце на дрэва. Ці трэба вам займацца задачай, якую вы першапачаткова паставілі перад сабой, або спачатку адным з яе фактараў? Ці дапамагла вам пабудова дрэва прадумаць шляхі, як узяцца за вырашэнне праблемы?




**Пошук правільнага рашэння**

Важна ведаць, што вы хацелі б атрымаць у выніку вашай акцыі! Што будзе лічыцца поспехам? Прапануйце групе абдумаць, чаго яе члены хочуць дабіцца і як будуць вызначаць, дасягнулі яны поспеху ці не. Удзельнікі могуць зноў звярнуцца да дрэва праблемы і выкарыстоўваць яго для пошуку канкрэтных рашэнняў. Як правіла, ліквідацыя каранёў праблемы вядзе да рашэнняў, размешчаных вышэй на дрэве. Напрыклад, калі б было больш сацыяльнага жылля або арэндная плата была б ніжэй, значна больш маладых людзей маглі б мець дах над галавой.

Памятайце, што пры вырашэнні складанага пытання часта цяжка дамагчыся змены ў існуючай палітыцы і адна акцыя рэдка прыводзіць да перамен. Група павінна рэалістычна адносіцца да таго, на што яна можа разлічваць. Нагадайце членам групы, што нават «маленькі» вынік можа быць неацэнным укладам у вырашэнне больш сур'ёзнай праблемы. Эфектыўныя кампаніі амаль заўсёды будуюцца менавіта з такіх «малых» дзеянняў, і ўсё, чаго б ні дасягнула ваша група, можа ў далейшым быць выкарыстана альбо падхоплена іншымі актывістамі, якія займаюцца гэтай праблемай.

Для групы карысна правесці мазгавы штурм некаторых агульных падстаў для ажыццяўлення практычных дзеянняў. Цалкам верагодна, што гэта дапаможа выбраць тыя дзеянні, якія будуць найбольш прыдатнымі для вырашэння пытання, і дапаможа вызначыць шэраг канкрэтных задач, якія, на думку членаў групы, рэальна дасягальныя.

**Адзінае, што мяне турбавала, – гэта тое, што мы так доўга чакалі, каб выступіць з гэтым пратэстам.**
*Роза Паркс*

*Успомніце акцыю пратэсту, сведкам якой вы былі ці пра якую нядаўна чулі: якога выніку, на вашу думку, спрабавалі дамагчыся арганізатары? Ці дасягнулі яны ў гэтым поспеху? Чаму так ці чаму не?*

# Планаванне акцыі

Ваша група выбрала праблему і цяпер мае ўяўленне пра тое, што яна магла б распачаць. Надышоў час вызначыць механізм, які будзе выкарыстаны для дасягнення пастаўленай мэты.

Блок-схему, размешчаную ніжэй, можна выкарыстоўваць як пакрокавы падыход да выбару гэтага механізму, а таксама для атрымання ўпэўненасці ў тым, што група зможа дасягнуць жаданага з дапамогай абранага метаду. Блок-схема ўключае 5 крокаў, якія падводзяць да прыняцця рашэння аб найбольш прыдатнай форме акцыі, і паказвае, як гэты працэс можа працаваць у выпадку 5 умоўных прыкладаў.

Кожны крок тлумачыцца больш падрабязна ў наступным раздзеле.

**Планаванне акцыі – дыяграма**

**A. Якой праблемай вы хочаце заняцца?**

1. Хімічная кампанія забрудзіла мясцовую раку
2. Асоба, якая шукала прытулак, памерла ў паліцыі
3. Расізм у дачыненні да імігрантаў у нашай лакальнай супольнасці
4. Працоўная эксплуатацыя дзяцей мультынацыянальнымі кампаніямі
5. Узроўні ўжывання наркотыкаў сярод моладзі

**B. Хто ці што – ваша мэтавая аўдыторыя?**

1. Жыхары горада і кіраўнікі кампаніі
2. Арганізацыі па абароне правоў чалавека
3. Жыхары нашай супольнасці
4. Грамадская думка
5. Адміністрацыя мясцовай школы

**C. Якіх змен вы спадзяецеся дамагчыся?**

1. Каб кампанія ліквідавала забруджванне
2. Каб яны заняліся гэтай справай і супрацоўнічалі з афіцыйным следствам
3. Каб некаторыя людзі змянілі свой погляд на гэта
4. Павялічыць свядомасць наконт гэтага пытання
5. Каб у школьны расклад былі ўнесены адукацыйныя заняткі для барацьбы з ужываннем наркотыкаў

**D. Як гэтыя змены павінны праявіцца?**

1. Іх прысароміць грамадская думка
2. Яны ўбачаць важкасць доказаў і той факт, што нічога не робіцца
3. Яны сустрэнуцца з членамі супольнасцей і ўбачаць, што яны таксама добрыя людзі
4. Мы дадзім ім інфармацыю
5. Дырэктар убачыць важнасць гэтай праблемы і зразумее, што мы можам дапамагчы

**E. Якімі сродкамі вы будзеце ўплываць на сваю аўдыторыю?**

1. Дэманстрацыя на галоўнай вуліцы для збору подпісаў і ўручэння петыцыі кіраўнікам кампаніі
2. Мы звяжамся з нацыянальнымі і мясцовымі арганізацыямі па абароне правоў чалавека і дадзім ім інфармацыю па гэтай справе
3. Мы арганізуем «Жывую бібліятэку», дзе будуць прысутнічаць члены гэтых супольнасцей
4. Мы арганізуем выстаўку ў маладзёжным цэнтры і будзем распаўсюджваць інфармацыю пра яе па горадзе
5. Мы будзем праводзіць семінары ў школе і ў маладзёжным цэнтры па тэмах, звязаных з ужываннем наркотыкаў

## *Якой праблемай вы хочаце заняцца?*

Гэты крок просты: ён атрымаецца ў выніку выканання групай практыкавання з дрэвам праблемы. Калі вы гэта практыкаванне яшчэ не выконвалі, паспрабуйце, каб група як мага дакладней сфармулявала праблему, якой яна хоча заняцца.

## *Хто ці што – ваша мэтавая аўдыторыя?*

Калі толькі вы не спадзяецеся вырашыць праблему неадкладна, мэтавай аўдыторыяй для вашай акцыі могуць быць не абавязкова менавіта тыя людзі, якія валодаюць магчымасцю ажыццявіць неабходнае змяненне. Хутчэй за ўсё, ваша акцыя будзе не больш чым крокам на гэтым шляху; напрыклад, можна пастарацца прыцягнуць увагу грамадскасці да вашага пытання і такім чынам аказаць ціск на ўрад. Або арганізаваць групу з мясцовых актывістаў, каб яна магла працаваць над пытаннем, што вас цікавіць.

Вашай мэтавай аўдыторыяй у блоку В будзе група людзей, на якіх вы ўздзейнічаеце праз сваю акцыю. Яна можа складацца з больш чым адной групы; напрыклад, у першай ячэйцы блок-схемы мэтавай аўдыторыяй з'яўляюцца і жыхары горада, і кіраўнікі кампаній. Рэалізацыя акцыі залежыць ад таго, ці будуць жыхары горада падпісваць петыцыю, якая затым будзе перададзена кіраўнікам кампаніі, спадзеючыся на тое, што яна акажа свой уплыў і кампанія будзе вымушана ачысціць раку.

## *Якіх змен вы спадзяецеся дамагчыся?*

Гэта пытанне зноў жа ставіцца ў дачыненні менавіта да вашай акцыі, але не абавязкова да той самай змены, якая з'яўляецца вашай канчатковай мэтай. Наўрад ці, напрыклад, якое-небудзь дзеянне, зробленае вашай групай, зможа пакласці канец працоўнай эксплуатацыі дзяцей мультынацыянальнымі кампаніямі! Аднак вы здольны абудзіць цікавасць да гэтай праблемы, што падштурхне іншых да праяўлення актыўнасці ў розных формах, а гэта, у сваю чаргу, можа быць дастатковым, каб выклікаць змены ў палітыцы кампаніі або ў дзяржаўным рэгуляванні такіх кампаній.

Гэты блок – для таго, каб падумаць над пытаннямі, чаго павінна дасягнуць акцыя і як вызначыць, ці ўдалася яна. Паспрабуйце настроіць членаў групы на тое, каб быць максімальна канкрэтнымі і вырашыць, як ацаніць поспех або няўдачу акцыі. Выкарыстоўвайце падказкі з раздзела 3.4.1.4 «Пошук правільнага рашэння» вышэй.

## *Як гэтыя змены павінны праявіцца?*

Гэта пытанне не пра механізм, які група будзе выкарыстоўваць, а пра тое, як акцыя, па чаканнях групы, будзе «працаваць», і гэта пытанне часта звязана з псіхалогіяй змены чалавечай свядомасці ці ўсведамлення неабходнасці паступаць па-іншаму. Гэта вельмі важнае пытанне, пра якое нярэдка забываюць, а яго ігнараванне можа паўплываць на выніку вашай акцыі.

Дапусцім, напрыклад, што група занепакоена ростам папулярнасці нацыяналістычных або протафашысцкіх арганізацый і хоча заняцца гэтым пытаннем. Члены групы могуць пачаць падкладваць інфармацыйныя лістоўкі пад дзверы людзей, якія жывуць у раёне, дзе падтрымка гэтых арганізацый высокая. Аднак калі члены групы не зразумеюць, чаму людзі сімпатызуюць нацыяналістычным арганізацыям, лістоўкі могуць нават зрабіць эфект, супрацьлеглы чаканаму. Група павінна падумаць пра тое, як лістоўка можа змяніць стаўленне чалавека і што яна павінна змяшчаць, каб быць эфектыўнай для гэтай мэты. Члены групы павінны быць у курсе канкрэтных прычын і праблем, якія ляжаць у аснове росту падтрымкі нацыяналістычных арганізацый.

Гэты блок носіць, па сутнасці, «кантрольны» характар, каб падумаць аб тым, што павінна адбывацца, каб «вынік» адразу і абавязкова атрымліваўся з сітуацыі, якая зараз склалася.

COMPASS

**Сімволіка ў публічных выступленнях як форма пратэсту:**

• Вывешванне сцягоў з адпаведнай сімволікай
• Нашэнне сімвалаў
• Малітва і набажэнства
• Уручэнне прадметаў-сімвалаў
• Распрананне ў знак пратэсту
• Знішчэнне сваёй уласнасці
• Сімвалічныя светлавыя сігналы
• Дэманстрацыя партрэтаў
• Размалёўванне ў знак пратэсту
• Новыя знакі і імёны
• Сімвалічныя гукі
• Сімвалічныя рэкламацыі
• Грубыя жэсты

Узята з «198 метадаў негвалтоўных акцый»: http://www.peacemagazine.org/198.htm

**Вучні супраць расізму: іх дапамога адміністрацыі школы**

У сельскай школе ў Партугаліі навічкі, якія прыехалі з Румыніі і Украіны, сталі мішэнню расісцкіх выказванняў і дзеянняў з боку іншых вучняў школы. Настаўнікі і савет школы не ведалі, як рэагаваць, бо для рэгіёну гэта была зусім новая праблема.

Шэраг навучэнцаў, заклапочаных тым, што адбываецца, звярнуліся па дапамогу і параду да супрацоўніка па рабоце з моладдзю ў мясцовым цэнтры адпачынку. Разам яны арганізавалі ў школе тыднёвую кампанію, названую «Іншыя звонку, аднолькавыя ўнутры» (Diferente por fora, Igual por dentro). Для таго каб ліквідаваць гэту праблему, улічвалася кожная хвіліна на працягу ўсяго дня – прыём ежы, урокі, вольны час – і ўвесь час праводзіліся розныя мерапрыемствы. Клуб тэатральнага мастацтва выкарыстаў форум-тэатр, выдаваліся самаробныя плакаты і значкі, у цэнтры вольнага часу былі арганізаваны мастацкія выступленні, былі паказаны фільмы, а ў сталовай падаваліся пірожныя з розных краін. Тыдзень быў такім паспяховым, што школа вырашыла арганізоўваць падобнае мерапрыемства кожны год.

### *Якімі сродкамі вы будзеце ўплываць на сваю аўдыторыю?*

Вось у чым вам дапамагае блок-схема! На дадзеным этапе выбар менавіта таго, што павінна зрабіць група, атрымаецца звузіць шляхам праходжання папярэдніх крокаў. Група павінна цяпер здолець скласці спіс магчымых мерапрыемстваў, якія дапамогуць дамагчыся пераходу, аб якім гаварылася ў папярэднім блоку. Заклікайце групу творча думаць, паглядзіце на некаторыя з прапаноў раздзела 2 гэтай главы і выкарыстоўвайце кейс-метад. Таксама нагадайце, што нельга забываць характэрныя асаблівасці групы. Паспрабуйце яшчэ раз зрабіць канчатковы выбар на аснове кансэнсусу.

**«Новыя тактыкі ў галіне правоў чалавека»**

«Новыя тактыкі» ўяўляе сабой разнастайную групу міжнародных арганізацый, кансультантаў і практыкаў, якая існуе для прасоўвання тактычных інавацый і стратэгічнага мыслення ў рамках міжнароднай супольнасці па правах чалавека. З 1999 года праект «Новыя тактыкі ў галіне правоў чалавека» стварыў унікальныя рэсурсы, арганізаваныя хутчэй вакол магчымых рашэнняў, чым вакол канкрэтных пытанняў, геаграфічных рэгіёнаў або мэтавых груп. Гэтыя рэсурсы дазваляюць актывістам распазнаваць унікальныя асаблівасці іх сітуацыі і шукаць падыходы, якія былі паспяхова выкарыстаны ў іншых месцах, але могуць падысці і тут. Рэсурс дапамагае актывістам аб'ядноўваць розныя тактыкі ў комплексную стратэгію.

Многія з рэсурсаў на розных мовах можна знайсці на вэб-сайце www.newtactics.org.

# Арганізацыйная праца

Ёсць яшчэ адзін заключны этап перад правядзеннем ідэй групы ў жыццё. Перш чым справа дойдзе да практыкі, настойліва рэкамендуецца, каб група распрацавала план дзеянняў для вырашэння арганізацыйных пытанняў. Хоць ён можа быць неістотным для простай акцыі, такі план стане карыснай звычкай для групы і будзе гарантаваць, што заданні размеркаваны на роўнай аснове ў адпаведнасці з навыкамі і перавагамі ўдзельнікаў. План павінен таксама гарантаваць, што нішто не забыта!

Трэба будзе вырашыць:

• Якія заданні павінны быць выкананы?

• Хто якое заданне (або заданні) будзе выконваць?

• Калі заданні павінны быць выкананы?

### *Стварэнне табліцы заданняў*

Ніжэй прыводзіцца табліца, якая паказвае ўяўную акцыю з заданнямі, размешчанымі ў адпаведнасці з трыма названымі вышэй пытаннямі. Запоўніце яе з групай, выкарыстоўваючы наступныя пункты як кіраўніцтва:

1. Пераканайцеся, што ўсё запісана, каб можна было кантраляваць выкананне планаў. Вам спатрэбяцца два вялікія аркушы паперы і фламастар.

2. Пераканайцеся, што ўсім ясна, які абмяркоўваецца пункт. Выберыце аднаго чалавека пісцом і напішыце загаловак у верхняй частцы аркуша. Прадумайце разам спіс усіх работ, якія неабходна выканаць, і запішыце іх на вялікім аркушы паперы, каб кожны мог іх бачыць.

3. Прадумайце з групай увесь дзень, уявіце, што павінна адбывацца, і праверце яшчэ раз, што вы нічога не выпусцілі з-пад увагі.

4. Цяпер прайдзіцеся па спісе і вызначце, ці варта выконваць работы «Неадкладна», «Хутка» або «Пазней»: пастаўце Н, З або П каля кожнай работы.

5. Выкарыстоўвайце другі аркуш паперы ў якасці «аркуша для рашэння». Пералічыце ўсе заданні, якія трэба будзе выканаць, зверху ўніз на левым баку; затым у наступным слупку запішыце, хто будзе выконваць кожную з іх. Нарэшце, у трэцім слупку адзначце крайнія тэрміны выканання кожнай работы.

6. Размяркуйце працу сярод усіх удзельнікаў: не даручайце яе аднаму або двум людзям. Падумайце, што адбудзецца, калі яны захварэюць або будуць перагружаны іншымі справамі!

**Узор аркуша для рашэння**

| **Мерапрыемства: вулічная акцыя па правах меншасцей** | | |
|---|---|---|
| **Заданне** | **Хто яе выконвае** | **Калі** |
| Скласці лістоўкі для раздачы | Вера, Пецця | Сустрэчы 10-га і 17-га верасня |
| Арганізаваць публікацыю | Рома, Васіль | Пасля 20-га верасня |
| Зрабіць банеры/плакаты | Усе | Тыдзень, што пачынаецца з 24-га верасня |
| Купіць матэрыялы для плакатаў і г. д. | Надзя, Маша, Ваня | Тыдзень, што пачынаецца з 17-га верасня |
| Зацікавіць іншых людзей | Надзя, Марына, Таня | Тыдзень, што пачынаецца з 17-га верасня |
| Звязацца з мясцовым саветам | Дзіма, Каця | Калі дата будзе ўзгоднена |
| Паведаміць паліцыі | Дзіма, Каця | |
| Пастарацца забяспечыць прысутнасць уплывовай мясцовай асобы | Толя, Ганна | |
| Апавясціць групы меншасцей | Люда, Алена | |
| Напісаць чарнавыя версіі прамоў | Наташа, Васіль, Вера | |
| Арганізаваць закускі | Оля, Коля | |
| Прыбраць пасля заканчэння маніфестацыі | Наташа, Васіль, Рома, Алена | |

# Аналіз і ацэнка

Як у любой дзейнасці, у адукацыі ў галіне правоў чалавека жыццёва важна ўзяць тайм-аўт пасля завяршэння акцыі, каб апытаць групу і ацаніць, што прайшло добра і што магло б быць зроблена лепш. Група, хутчэй за ўсё, пасля заканчэння акцыі адчувае моцныя эмоцыі, адмоўныя ці станоўчыя. Важна даць магчымасць абмеркаваць іх і падзяліцца імі з іншымі членамі групы. Гэта таксама дапаможа ў планаванні далейшых мерапрыемстваў.

Наступныя пытанні могуць быць карыснымі ў якасці асновы для правядзення аналізу.

• Якія вашы адчуванні на наступны дзень пасля акцыі? (Гэта можна зрабіць у форме хуткага апытання групы.)

• Што, па вашых адчуваннях, атрымалася добра?

• Ці аказалася нешта больш цяжкім, чым вы сабе ўяўлялі?

• Ці было штосьці нечаканага?

• Як вы думаеце, ці можна з праведзенага мерапрыемства вынесці ўрокі, якія спатрэбіліся б у наступны раз?

• Ці дасягнулі мы таго, што запланавалі?

• Ці дабіліся мы яшчэ нейкіх вынікаў, якія, магчыма, не прадбачылі?

• Ці задаволены вы сабой і ці хацелі б вы ўзяцца за што-небудзь падобнае зноў?

• Што мы будзем рабіць цяпер?!

**Буцы для Афрыкі**

Эміль быў вучнем 7 класа ў школе Фрэдэрыксберг у Саро, Данія, а Анаклайта быў у гэтай школе запрошаным настаўнікам з Паўднёвай Афрыкі. У ходзе дыскусіі з класам аб хатнім і школьным жыцці Анаклайта выказаўся пра тое, што ў дзяцей і маладых людзей у Даніі шмат магчымасцей і шмат рэчаў. Ён сказаў, што ў яго дома, у Паўднёвай Афрыцы, у яго вучняў не было нармальнага футбольнага поля, а ўжо пра футбольныя буцы і казаць няма чаго. Гэта навяло вучняў на думку арганізаваць збор ношаных футбольных буцаў, каб паслаць іх у школу Анаклайта. Яны спыталі яго, што ён пра гэта думае. Адказ быў станоўчым, і вучні размясцілі абвесткі з заклікам да ахвяраванняў у іх уласнай і ў суседніх школах. Мясцовы футбольны клуб пачуў аб гэтай ідэі і ахвяраваў некалькі пар са свайго склада забытых рэчаў.

Нечакана ў Эміля і яго сяброў апынулася цэлая куча абутку: каля 100 пар буцаў, пасляць якія ў Яганэсбург будзе каштаваць, як яны выявілі да свайго замяшання, 500 дацкіх крон (цэлых 67 еўра)! Яны задумаліся, што ж рабіць далей. Для пачатку яны рассартавалі абутак, каб зразумець, ці сапраўды яго ўвесь варта адпраўляць. Спыніліся на 75 парах. Затым ім трэба было знайсці грошы на паштовыя выдаткі, і іх клас напісаў лісты ў некалькі гуманітарных арганізацый і ў мясцовы савет, звярнуліся яны па падтрымку і ў мясцовую газету, і на радыё. Пасля шэрагу няўдач адзін чалавек – старшыня мясцовай турыстычнай асацыяцыі, якая арганізуе падарожжы ў Паўднёвую Афрыку, – звязаўся з газетай і прапанаваў дапамогу. У выніку паўгадавых клопатаў і намаганняў Эміль змог, нарэшце, аднесці пасылкі на пошту і адправіць абутак у Яганэсбург для вучняў Анаклайта.

Крыніца: Міжнародны абмен настаўнікаў (The Global Guest Teacher), Фонд Інтэркультура (AFS Interkultur), Данія

# Глава 4
# Разуменне правоў чалавека

# Змест гэтай главы

**УВОДЗІНЫ** **381**
**4.1 ШТО ТАКОЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА?** **382**

Асноўныя каштоўнасці 383
Характарыстыкі правоў чалавека 383
Гістарычны агляд 384
Правы чалавека ў розных частках свету 388
Як нам скарыстацца нашымі правамі? 390
Дылемы правоў чалавека 391

**4.2 ЭВАЛЮЦЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА** **395**

Абяцанні, абяцанні… 395
Якімі правамі мы валодаем? 395
Навука наступае 399

**4.3 ЮРЫДЫЧНАЯ АБАРОНА ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА** **401**

Правы чалавека ў кожнай краіне 401
Правы чалавека прызнаны ў пагадненнях 402
Асноўныя міжнародныя дакументы 403
Забеспячэнне захавання правоў чалавека 411
Ці дастаткова гэтага? 417

**4.4 ПРАВААБАРОНЧЫ АКТЫВІЗМ І РОЛЯ НГА** **418**

Што такое НГА? 418
Віды праваабарончых НГА 419
Як яны ўздзейнічаюць на працэс? 419
Прыклады паспяховага актывізму 421

**4.5 ПЫТАННІ І АДКАЗЫ АБ ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА** **424**
**4.6 ПЫТАННІ НА ЗАСЫПКУ** **427**

# Уводзіны

Адукацыя ў галіне правоў чалавека немагчыма без саміх правоў чалавека. Любы чалавек, які бярэцца за адукацыю ў галіне правоў чалавека, павінен, перш за ўсё, ведаць іх і разумець іх сутнасць. Правы чалавека можна разумець і тлумачыць проста ці складана; іх можна тлумачыць у абстрактнай і канцэптуальнай форме або з дапамогай практычных прыкладаў з рэальнага жыцця; іх можна разглядаць у глабальным аспекце або з пункту гледжання вопыту асобных тэрыторый. Але пры гэтым важна, каб кожны, хто бярэцца навучаць іншых правам чалавека, умеў растлумачыць, што гэта такое, і мог бы даць адказы на пытанні аб правах чалавека. Першая задача фасілітатара адукацыі ў галіне правоў чалавека – зрабіць так, каб маладыя людзі захапляліся вывучэннем правоў чалавека, а гэта падразумявае даць ім дакладную інфармацыю, разбурыць міф аб складанасці пытанняў у галіне правоў чалавека і растлумачыць многія дылемы, звязаныя з правамі чалавека. Але нельга гэтага рабіць, ігнаруючы галоўныя канцэпцыі і каштоўнасці, якія ляжаць у аснове правоў чалавека, а менавіта: універсальнасць, непадзельнасць і неадчужальнасць. Фасілітатар адукацыі ў галіне правоў чалавека выступае ў ролі «пасла» і абаронцы правоў чалавека, але, калі ён будзе няздольны растлумачыць і даць адказы на ключавыя пытанні аб правах чалавека, усе яго намаганні будуць марнымі. Вядома, як і ў многіх іншых аспектах правоў чалавека, падчас вывучэння правоў чалавека ўзнікаюць самыя розныя пытанні, і ніхто не чакае, што выкладчык мае адказы на кожнае з іх. Аднак ён павінен ведаць, дзе іх шукаць, і развіваць ва ўдзельнікаў уменне знаходзіць свае ўласныя адказы.

**Правы чалавека – гэта тое, што ў вас ніхто не можа адабраць.**
*Рэнэ Касэн*

Памылкі наконт паходжання правоў чалавека (напрыклад, ходкае меркаванне аб тым, што гэта нібыта «заходняя» вынаходка), іх універсальнасці і прынцыпу правапрымянення могуць лёгка ператварыць добра прадуманы занятак на тэму правоў чалавека ў пустыя дэбаты, якія яшчэ больш умацуюць сумненні і памылковыя погляды замест таго, каб іх развеяць. Навучанне аб правах чалавека з'яўляецца найважнейшым і бясспрэчным складнікам адукацыі ў галіне правоў чалавека, без якога ўсё астатняе губляе сэнс.

Правы чалавека павінен разумець кожны, а не толькі спецыялісты.

У гэтай главе мы даём чытачам дапаможніка *«Компас»* дадатковую інфармацыю пра тое, што такое правы чалавека, як яны развіваліся і як іх варта абараняць і прасоўваць. Зразумела, тут не прадстаўлена вычарпальная інфармацыя пра паняцці і сістэмы правоў чалавека. Але, як і іншыя раздзелы дапаможніка *«Компас»*, гэта глава дае чытачам важныя зыходныя пункты і забяспечвае базавымі звесткамі. А самі выкладчыкі правоў чалавека ў далейшым паклапоцяцца пра тое, каб шукаць дадатковую інфармацыю ў адпаведнасці з характарам іх праграм і запытам удзельнікаў. Гэту главу таксама не варта ўспрымаць як нейкі тэзіс у духу «Што кожны павінен ведаць аб правах чалавека». Замест гэтага яна закранае мноства важных аспектаў правоў чалавека. Некаторым удзельнікам і выкладчыкам спатрэбіцца ведаць больш (або менш) аб тым, у прыватнасці, якім чынам правы чалавека развіваліся і як яны абаронены ў іх уласных краінах.

Главу завяршае раздзел, які змяшчае пытанні, адказы і «пытанні на засыпку» на тэму правоў чалавека; тут жа прыведзены некаторыя найбольш частыя пытанні і сумненні па праблемах, звязаных з правамі чалавека.

Правы чалавека пастаянна пераглядаюцца, развіваюцца і ўдасканальваюцца.

Паколькі правы чалавека – гэта (недасканалыя) тварэнні (гэтак жа недасканалых) людзей, яны пастаянна падвяргаюцца крытычнай ацэнцы, пераглядаюцца, развіваюцца і ўдасканальваюцца. Мы разлічваем на тое, што карыстальнікі дапаможніка *«Компас»* унясуць свой уклад у яго абнаўленне, у прыватнасці паведамляючы нам пра тыя змены, якія адбыліся пасля яго публікацыі.

COMPASS

# 4.1 ШТО ТАКОЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА?

Правы чалавека падобны да панцыру: яны абараняюць вас; яны падобны да правілаў, паколькі кажуць вам, як можна сябе паводзіць; і яны падобны да суддзяў, таму што вы можаце да іх апеляваць. Яны абстрактныя – як эмоцыі; і як эмоцыі, яны належаць кожнаму і існуюць, што б вакол ні адбывалася.

Яны падобны да прыроды, таму што іх можна таптаць; і падобныя да духу, таму што іх немагчыма разбурыць. Як сам час, яны аднолькава ставяцца да ўсіх нас: багатых і бедных, старых і маладых, белых і чорных, высокіх і нізкарослых. Яны прапануюць нам павагу і патрабуюць ад нас ставіцца з павагай да іншых. Мы можам часам разыходзіцца ў вызначэнні дабрыні, праўды і справядлівасці, але мы пачынаем разумець, што гэта за паняцці, сустрэўшыся з іх антыподамі – злосцю, няпраўдай і несправядлівасцю – у жыцці.

*Ці можаце вы даць вызначэнне правам чалавека? Як вы растлумачыце, што гэта такое?*

**Калі мы называем нешта правам чалавека, мы маем на ўвазе, што чалавек можа прад'явіць грамадству справядлівае патрабаванне абараніць яго ў гэтым праве, якое яму належыць, няхай гэта будзе сілай закону, праз адукацыю або ўздзеянне на грамадскую думку.**
*Джон Сцюарт Міль*

Права – гэта патрабаванне, пра якое мы справядліва заяўляем. Я маю права на тавары ў маім кошыку, калі я за іх заплаціў. Грамадзяне маюць права абіраць прэзідэнта, калі гэта гарантавана канстытуцыяй іх краіны, а дзіця мае права наведаць заапарк, калі яго бацькі гэта яму паабяцалі. На ўсё гэта людзі маюць права разлічваць пры ўмове, што другім бокам былі дадзены адпаведныя абяцанні або гарантыі.

Але правы чалавека ўяўляюць сабой патрабаванні іншага характару. Яны не залежаць ад абяцанняў або гарантый іншага боку. Права чалавека на жыццё не залежыць ад абяцанняў іншага чалавека не забіваць яго. Жыццё яго можа ад гэтага залежаць, але не права на жыццё. Яго права на жыццё залежыць толькі ад аднаго: таго, што ён чалавек.

Прызнанне правоў чалавека азначае прызнанне таго, што кожнаму чалавеку дадзена права патрабаваць захавання наступных палажэнняў: я валодаю гэтымі правамі, што б вы ні гаварылі і ні рабілі, таму што я, дакладна гэтак жа, як і вы, чалавек. Правы чалавека ўласцівы кожнаму чалавеку і належаць яму па праве нараджэння.

Чаму гэта патрабаванне не прадугледжвае нейкіх пэўных паводзінаў у якасці яго абгрунтавання? Чаму б не запатрабаваць, каб людзі самі заслужылі свае правы?

У рэшце рэшт, патрабаванне захавання правоў чалавека носіць маральны характар і грунтуецца на маральных каштоўнасцях. Маё права на жыццё на самой справе азначае, што нікому не дазволена пазбавіць мяне жыцця – гэта проста недапушчальна. Гэта зацвярджэнне наўрад ці мае патрэбу ў абгрунтаванні. Напэўна, любы чытач пагадзіцца з такім падыходам, бо ў адносінах да сябе ўсе мы прызнаем, што ў нашым жыцці і быцці ёсць такія аспекты, якія недатыкальны і ў якія ніхто не павінен урывацца, бо гаворка ідзе пра жыццёва важныя бакі нашага быцця, якія вызначаюць, хто мы такія і што мы такое; яны маюць істотнае значэнне для нашай чалавечай прыроды і нашай чалавечай годнасці. Без правоў чалавека мы не можам рэалізаваць цалкам наш чалавечы патэнцыял. Правы чалавека ўсяго толькі пераносяць гэта разуменне з узроўню аднаго індывіда на ўсіх астатніх людзей планеты. Калі я магу выстаўляць падобныя патрабаванні, значыць, гэта можа зрабіць і любы іншы.

**Кожны раз, калі робіцца несправядлівасць, здаецца, што справядлівасці ніколі і не існавала.**
*Жазэ Сарамагу*

*Чаму недапушчальна парушаць чыё-небудзь права на жыццё? Чаму недапушчальна пазбаўляць каго-небудзь жыцця? Ці гэта аднолькавыя пытанні?*

# Асноўныя каштоўнасці

У аснове канцэпцыі правоў чалавека ляжаць дзве асноўныя каштоўнасці: **чалавечая годнасць і роўнасць.** Правы чалавека можна разумець як нешта, што вызначае базавыя нормы, неабходныя для таго, каб жыць з пачуццём годнасці; і іх універсальнасць вынікае з таго, што, па меншай меры, у гэтым усе людзі роўныя. Мы не павінны і не можам тут кагосьці выдзяляць.

Па сутнасці, каб прыняць канцэпцыю правоў чалавека, дастаткова толькі прызнання гэтых двух перакананняў, або каштоўнасцей, і наўрад ці хто-небудзь стане з імі спрачацца. Менавіта таму правы чалавека атрымліваюць падтрымку з боку ўсіх сусветных культур, усіх цывілізаваных урадаў і ўсіх асноўных рэлігій. Амаль паўсюдна прызнана, што ўлада дзяржавы не можа быць бязмежнай або самавольнай; яна павінна быць абмежавана неабходнасцю забеспячэння ўсім, хто знаходзіцца пад яе юрысдыкцыяй, хаця б мінімальных умоў захавання чалавечай годнасці.

З гэтых дзвюх асноўных каштоўнасцей можна вывесці многія іншыя, і з іх дапамогай дакладней вызначыць, як на практыцы павінны суіснаваць людзі і грамадства. Напрыклад:

**Свабода:** паколькі чалавечая воля складае важную частку чалавечай годнасці. Прымус рабіць нешта насуперак нашаму жаданню прыніжае чалавечую асобу.

**Павага да іншых:** паколькі адсутнасць павагі да іншых не дазваляе ацаніць іх індывідуальнасць і іх чалавечую годнасць.

**Недапушчальнасць дыскрымінацыі:** паколькі роўнасць людзей у чалавечай годнасці азначае, што мы не можам судзіць аб правах і магчымасцях людзей, зыходзячы з іх фізічных ці іншых уласцівасцей.

**Талерантнасць:** паколькі нецярпімасць паказвае на адсутнасць павагі да адрозненняў; а роўнасць не азначае аднастайнасці.

**Справядлівасць:** паколькі людзі, роўныя ў сваёй прыналежнасці да чалавечага роду, заслугоўваюць справядлівага стаўлення.

**Адказнасць:** паколькі павага да правоў іншых людзей прадугледжвае адказнасць кожнага чалавека за яго дзеянні і патрабуе ад яго намаганняў, накіраваных на рэалізацыю яго правоў і правоў усіх людзей.

**Я разглядаю смяротную кару як лютую і амаральную з'яву, што падрывае маральныя і прававыя асновы грамадства. Я перакананы, ... што жорсткасць спараджае толькі жорсткасць.**
*Андрэй Сахараў*

# Характарыстыкі правоў чалавека

Філосафы могуць бясконца працягваць спрэчкі аб прыродзе правоў чалавека, але міжнародная супольнасць ужо заявіла аб сваёй непахіснай прыхільнасці ідэі абароны правоў чалавека, прыняўшы ў 1948 годзе Ўсеагульную дэкларацыю правоў чалавека. З тых часоў міжнародная супольнасць замацавала дзейсныя прынцыпы УДПЧ у шматлікіх міжнародных, рэгіянальных і нацыянальных прававых дакументах. УДПЧ не распрацоўвалася як юрыдычна абавязковы дакумент, але дзякуючы ўвядзенню яе нормаў у шматлікія далейшыя юрыдычна абавязковыя дагаворы (вядомыя як «канвенцыі» або «пагадненні»), прававы статус гэтых нормаў сёння не падлягае сумневу.

**Правы чалавека неад'емныя.**

Гэта азначае, што вы не можаце іх згубіць, паколькі яны маюць дачыненне да самога факта чалавечага існавання, яны ўласцівы ўсім людзям. Пры пэўных абставінах дзеянне некаторых з іх, хоць і не ўсіх, можа быць прыпынена або абмежавана. Напрыклад, калі хтосьці прызнаны вінаватым у здзяйсненні злачынства, ён ці яна могуць быць пазбаўлены волі; ці ўрад нейкай краіны можа ўвесці надзвычайнае становішча, заявіўшы пра гэта публічна, а затым можа адмяніць некаторыя правы, напрыклад абмежаваць свабоду перамяшчэння, увёўшы каменданцкую гадзіну.

**Як ваш боль непрыемны вам, так і боль іншых непрыемны ім. Памятаючы гэты прынцып роўнасці, стаўцеся да іншых з павагай і спачуваннем.**
*Суман Сутам*

**Правы чалавека непадзельныя, узаемазалежныя і ўзаемазвязаныя.**

Гэта азначае, што розныя правы чалавека па сутнасці звязаны паміж сабой і не могуць разглядацца паасобку. Ажыццяўленне аднаго права залежыць ад ажыццяўлення многіх іншых правоў, і няма ніводнага права, якое было б важнейшым за астатнія.

**Правы чалавека ўніверсальныя.**

А гэта значыць, што яны роўна дастасавальныя да ўсіх людзей ва ўсім свеце, прычым без абмежаванняў па часе. Кожны мае права карыстацца правамі чалавека, без якіх бы там ні было адрозненняў на падставе «расавай» або этнічнай прыналежнасці, колеру скуры, полу, сексуальнай арыентацыі, інваліднасці, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, нараджэння ці іншага становішча.

**Суверэннасць дзяржавы прадугледжвае яе адказнасць, і галоўная адказнасць за абарону народа ўскладзена на саму дзяржаву.**
*Даклад Міжнароднай камісіі па пытаннях умяшання і дзяржаўнага суверэнітэту, 2001 г.*

Варта адзначыць, што ўніверсальнасць правоў чалавека ніякім чынам не пагражае багатай разнастайнасці індывідуальнасцей ці культур. «Універсальнасць» і «аднастайнасць» не з'яўляюцца сінонімамі. Разнастайнасць прадугледжвае свет, у якім усе роўныя і ў роўнай ступені заслугоўваюць павагі. Правы чалавека выступаюць у ролі мінімальных стандартаў, якія прымяняюцца да ўсіх людзей; кожная дзяржава і кожнае грамадства маюць права вызначаць і ўжываць больш высокія або больш канкрэтныя стандарты. Напрыклад, мы бачым, што ў сферах эканомікі, сацыяльнага і культурнага жыцця кажуць аб неабходнасці прыняць меры для паступовай поўнай рэалізацыі правоў у гэтых сферах, але пры гэтым няма выразна заяўленай пазіцыі наконт павышэння падаткаў для дасягнення гэтай мэты. І тады гэта ўжо справа кожнай краіны і кожнага грамадства прымаць палітычныя рашэнні ў залежнасці ад унутраных умоў.

# Гістарычны агляд

Ідэя таго, што людзі валодаюць неад'емнымі правамі, караніцца ў многіх культурах і старажытных традыцыях. Шматлікія прыклады шанаваных кіраўнікоў і ўплывовейшых зборнікаў законаў з гісторыі чалавецтва паказваюць нам, што каштоўнасці, увасобленыя ў правах чалавека, не з'яўляюцца ні «заходнім вынаходніцтвам», ні вынаходніцтвам XX стагоддзя. Яны сталі адказам на ўсеагульныя патрэбы чалавека і на патрабаванні аб пошуку справядлівасці. У кожнай супольнасці людзей былі свае ідэалы і сістэмы забеспячэння справядлівасці, якія захаваліся ў выглядзе традыцый – вусных або пісьмовых – хоць не ўсе гэтыя традыцыі дажылі да нашых дзён.

## *Старажытная гісторыя*

• Збор законаў Хамурапі ў Вавілоне (Ірак, каля 2000 г. да н. э.) быў першым пісьмовым кодэксам законаў і быў заснаваны гэтым вавілонскім царом. У ім даваўся зарок «зрабіць так, каб у царстве кіравала справядлівасць, знішчаць злых і жорсткіх, не дазваляць моцным прыгнятаць слабых, ... адукоўваць краіну і садзейнічаць дабрабыту народа».

• Прыводзяцца словы старажытнаегіпецкага фараона (каля 2000 г. да н. э.), які даваў указанне сваім падначаленым: «Калі з Верхняга або Ніжняга Ніла прыязджае прасіцель, … зрабіце так, каб усё праходзіла ў адпаведнасці з законам, каб быў выкананы звычай і паважаліся правы кожнага чалавека».

• Хартыя Кіра (Іран, каля 539 г. да н. э.) была складзена царом Персіі Кірам для народа яго краіны. Хартыя прызнавала права народа на свабоду і бяспеку, рэлігійную цярпімасць, свабоду перамяшчэння, свабоду ад рабства і некаторыя сацыяльныя і эканамічныя правы.

• У аснове вучэння Канфуцыя (каля 500 г. да н. э.) ляжыць канцэпцыя «рэн», галоўная ідэя якой – спачуванне і любоў да іншых людзей. Канфуцый сказаў: «Не рабі іншым таго, чаго не хочаш сабе». Кітайскі эксперт па канфуцыянстве доктар Пэн-чунь Чан, які прыняў актыўны ўдзел у стварэнні праекта УДПЧ, лічыў, што ў аснове ідэі абароны правоў чалавека ляжыць менавіта вучэнне Канфуцыя.

• Імам Алі ібн аль-Хусэйн у пачатку VIII стагоддзя н. э. напісаў сваё «Пасланне аб правах». Па нашых звестках, гэты ліст з'яўляецца першым дакументальным сведчаннем таго, якім было стаўленне да правоў чалавека ў тую эпоху, і гэта пасланне стала першай спробай не негатыўнага, а пазітыўнага падыходу да канцэпцыі правоў чалавека. У гэтым пасланні даецца метадалагічны спіс з 50 такіх правоў чалавека, і па сваім духу яны адлюстроўваюць гледжанні ранняга ісламу.

• Хартыя Мандэ (1222 г. н. э.) і Хартыя Курукан Фуга (1236 г. н. э.) сістэматызуюць вусныя традыцыі краін Заходняй Афрыкі і адстойваюць такія прынцыпы як дэцэнтралізацыя, ахова навакольнага асяроддзя, правы чалавека і культурная разнастайнасць.

Чалавек становіцца чалавекам у таварыстве іншых людзей.

• Афрыканскі погляд на свет, які пазначаецца зулускім словам ubuntu, адлюстроўвае саму сутнасць таго, што значыць быць чалавекам. Гэта паняцце выдатна падкрэслівае важнасць павагі да ўсіх членаў супольнасці, важнасць гасціннасці і вялікадушнасці. Выраз «чалавек становіцца чалавекам у таварыстве іншых людзей» лепш за ўсё перадае змест слова ubuntu. І гэта паняцце ў цэлым мае прамое дачыненне да правоў чалавека. Калі мы становімся людзьмі ў таварыстве іншых, тады, пазбаўляючы іншых людзей іх права быць чалавекам, мы самі перастаём быць людзьмі. Таму так важна і неабходна адстойваць правы іншых, дараваць і атрымліваць прабачэнне і паважаць правы іншых людзей.

*Якія дзеячы (палітычныя, літаратурныя і рэлігійныя) у гісторыі вашай краіны дамагаліся прызнання каштоўнасцей, звязаных з правамі чалавека, ці адстойвалі такія каштоўнасці?*

### *XIII–XVIII стагоддзі*

На працягу стагоддзяў ва ўсіх сусветных цывілізацыях ідэя ўсеагульных правоў чалавека эвалюцыянавала, абапіраючыся на паняцці годнасці і павагі. Аднак спатрэбіліся намаганні многіх пакаленняў, каб ідэя павагі гэтых паняццяў была замацавана ў законах. Часта менавіта гістарычны вопыт дае нам рашучасць узводзіць правы чалавека ў ранг закону. І гэта, натуральна, яшчэ не канец шляху. Па меры таго як узбагачаюцца нашы веды пра гісторыю іншых культур, мы, без усякага сумнення, знойдзем і ў іншых культурах гістарычныя сведчанні спроб сцвярджэння правоў чалавека заканадаўчым шляхам.

**На кожным гістарычным этапе чуліся галасы пратэсту супраць прыгнёту; аднак на працягу доўгага часу не было яснасці ў бачанні шляхоў вызвалення чалавека. Па меры нашага руху да сучаснасці гэтыя галасы і гэта бачанне ператвараліся ў праграмы сацыяльнай абароны і часам замацоўваліся ў канстытуцыях дзяржаў.**
*Мішлін Р. Ішэй*

• У 1215 годзе англійская знаць і прадстаўнікі духавенства, прыняўшы Вялікую хартыю вольнасцей (Magna Carta), прымусілі караля Англіі згадзіцца правіць у адпаведнасці з законам. Хартыя абараняла толькі правы прывілеяванага класа (знаці), і таму тут гаворка не ідзе аб правах чалавека саміх па сабе. Але хартыя стала дакументам, на які людзі часта спасылаліся, каб абараніць свае свабоды, паколькі яна абмяжоўвала каралеўскую ўладу і прызнавала свабоды і правы людзей.

• У 1689 годзе англійскі парламент прыняў закон, у якім заяўлялася, што ён больш не пацерпіць каралеўскага ўмяшання ў свае справы. Гэты дакумент, вядомы як Біль аб правах, забараняў манарху прыпыняць дзеянне законаў без згоды парламента, прадугледжваў свабодныя выбары членаў парламента і дэклараваў, што свабода слова ў парламенце не магла быць аспрэчана ні ў судах, ні дзе-небудзь яшчэ.

**Свабода – гэта наша ўлада над намі самімі.**
*Гуга Гроцый*

• Гуга Гроцый (1583–1645) шырока вядомы як заснавальнік навукі міжнароднага права. У сваёй кнізе *«Аб праве вайны і міру»* ён прадстаўляе сістэму агульных прынцыпаў, заснаваных на «натуральным праве», якое, на яго думку, павінна аб'ядноўваць усе нацыі, незалежна ад мясцовых законаў і звычаяў. На працягу XVII–XVIII стагоддзяў некаторыя еўрапейскія філосафы працягвалі развіваць канцэпцыю «натуральных правоў».

COMPASS

**Біль аб правах – гэта тое, на што людзі маюць права, у цэлым і ў прыватнасці, насуперак жаданням любога ўрада на зямлі; гэта тое, у чым не можа адмовіць ні адзін справядлівы ўрад.**
*Томас Джэферсан, 1787 г.*

**Мэта ўсякага палітычнага саюза – захаванне натуральных і неад'емных правоў чалавека. Гэтыя правы – на свабоду, на ўласнасць, на бяспеку і на супраціўленне прыгнёту.**
*Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна, 1789 г., Францыя*

**Будучы ад прыроды зусім вольным, роўным і незалежным, ні адзін чалавек… не можа быць падпарадкаваны палітычнай уладзе іншага без яго згоды.**
*Джон Лок*



• Джон Лок (1689) распрацаваў тэорыю, паводле якой кожны чалавек мае некаторыя правы ад нараджэння, і яны не даруюцца ўрадамі або іх законамі. Пры гэтым легітымнасць урада залежыць, па сутнасці, ад таго, наколькі ён захоўвае гэтыя натуральныя правы. Ідэя, згодна з якой з натуральных правоў чалавека павінны выцякаць пэўныя прававыя гарантыі, атрымлівала ўсё большае прызнанне і стала знаходзіць адлюстраванне ў канстытуцыях шэрагу краін. Правы чалавека перафармулявалі гэту ідэю і замацавалі яе ў сістэме ўзаемаадносін паміж урадамі і грамадзянамі.

• У 1776 годзе большасць брытанскіх калоній у Паўночнай Амерыцы, прыняўшы Дэкларацыю незалежнасці Злучаных Штатаў, абвясцілі сваю незалежнасць ад Брытанскай імперыі. Дэкларацыя ў значнай ступені грунтавалася на тэорыях Лока і Мантэск'ё пра «натуральныя правы» чалавека. Заснаваная на перакананні, што важны захаванне ўлады дзяржавы і абарона свабод, Дэкларацыя ўстала на абарону такіх паняццяў, як: неад'емныя правы; абарона індывідуальных правоў людзей; свабода слова, прэсы, падачы петыцый і правядзення сходаў; права на канфідэнцыяльнасць прыватнага жыцця; на справядлівы судовы разбор; роўнасць перад законам і свабода веравызнання.

• У 1789 годзе французы звярглі ў сябе ў краіне манархію і заснавалі першую Французскую рэспубліку. Французская Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна была народжана рэвалюцыяй і напісана прадстаўнікамі духавенства, дваранства і простых грамадзян, якія такім чынам рэалізавалі ідэі вядомых асветнікаў, такіх як Вальтэр, Мантэск'ё, Энцыклапедысты і Русо. У Дэкларацыі рэзка крытыкавалася палітычная і прававая сістэма манархіі, а «свабода, уласнасць, бяспека і права на супраціўленне прыгнёту» былі вызначаны як натуральныя правы чалавека. Дэкларацыя замяніла сістэму арыстакратычных прывілеяў, што існавалі пры манархіі, прынцыпам роўнасці перад законам. Аднак спатрэбілася шмат часу, каб увасобіць у жыццё яе эгалітарныя прынцыпы і тэарэтычныя канцэпцыі роўнасці правоў. Тады ў грамадстве панавала глыбокая несправядлівасць, і для ператварэння дэкларацыі ў жыццё спатрэбіліся намаганні некалькіх пакаленняў.

## *Раннія міжнародныя пагадненні: рабства і праца*

У XIX і XX стагоддзях шэраг праблем з галіны правоў чалавека выйшлі на пярэдні план і сталі разглядацца на міжнародным узроўні. Перш за ўсё, гэта былі праблемы рабства, прыгоннага права, бесчалавечных умоў працы і працоўнай эксплуатацыі дзяцей. Прыкладна да гэтага часу адносіцца і прыняцце першых міжнародных пагадненняў, якія тычацца правоў чалавека. Хоць гэтыя пагадненні прапаноўвалі дзейсныя меры па абароне правоў, у іх аснове ўсё ж ляжалі ўзаемныя абавязацельствы паміж дзяржавамі. У гэтым праяўляецца іх вострая супярэчнасць сучасным пагадненням аб правах чалавека, дзе абавязкі наўпрост звязаны з уладальнікамі правоў чалавека.

• У Англіі і Францыі рабства было аб'яўлена па-за законам прыкладна ў пачатку XIX стагоддзя, а ў 1814 годзе брытанскі і французскі ўрады падпісалі Парыжскі дагавор аб супрацоўніцтве з мэтай спынення гандлю рабамі. На Брусельскай канферэнцыі 1890 года быў падпісаны Акт супраць рабства, які пазней быў ратыфікаваны васямнаццаццю дзяржавамі. Гэтым абвяшчаецца намер пакласці канец гандлю рабамі з Афрыкі.

• Аднак гэта не вырашала праблему прымусовай працы і факта існавання жорсткіх умоў працы. Нават Міжнародная канвенцыя 1926 года пра рабства, нацэленая на адмену рабства ў любых яго формах, не змагла спыніць шырока распаўсюджаную практыку прымусовай працы да самых 1940-х гадоў.

• Стварэнне ў 1919 годзе Міжнароднай арганізацыі працы (МАП) стала матэрыялізацыяй ідэі, што ўсеагульнага і трывалага міру можна дамагчыся толькі на аснове прынцыпу сацыяльнай справядлівасці. МАП распрацавала сістэму міжнародных стандартаў працы, якія забяспечваюць належныя ўмовы для плённай працы, свабоду, роўнасць, бяспеку і годнасць працоўных.

• Адна са сфер дзейнасці МАП – барацьба з працоўнай эксплуатацыяй дзяцей, асабліва ў горшых яе формах. Сёння гэта барацьба ідзе па многіх напрамках, уключаючы папулярызацыю міжнародных пагадненняў аб дзіцячай працы, такіх як Канвенцыя МАП № 182 аб горшых формах дзіцячай працы і Канвенцыя МАП № 138 аб мінімальным узросце найму на працу.

• З 1899 па 1977 год было заключана мноства важных дагавораў у галіне міжнароднага гуманітарнага права, і яны акрэслілі новую сферу супрацоўніцтва паміж дзяржавамі на першым этапе яго развіцця. Міжнароднае гуманітарнае права ўводзіць узброеныя канфлікты ў прававое поле. Несумненна, як міжнароднае гуманітарнае права, так і правы чалавека павінны выконвацца ва ўсіх выпадках, напрыклад у дачыненні да палонных. Аднак у міжнародным гуманітарным праве больш дэталёва апісаны многія іншыя пытанні, што ўзнікаюць у часы канфліктаў, напрыклад пра дапушчальнасць прымянення пэўнай зброі і тактыкі ваенных дзеянняў.

*Чаму, на вашу думку, паўстала неабходнасць у міжнародных пагадненнях, і таго, каб кожная краіна проста распрацавала свае ўласныя нормы, недастаткова?*

### *XX стагоддзе*

Ідэя заканадаўчай абароны правоў чалавека ад самавольства кіруючых уладаў пачала атрымліваць шырокае прызнанне ў XX стагоддзі, асабліва з моманту стварэння Лігі Нацый і Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), а таксама з пачаткам іх барацьбы за правы меншасцей, правы працоўных і за іншыя каштоўнасці. Краіны ўжо прызналі важнасць кадыфікацыі гэтых правоў у пісьмовай форме, і згаданыя вышэй дакументы сталі, такім чынам, раннімі папярэднікамі многіх цяперашніх пагадненняў аб правах чалавека. Аднак па-сапраўднаму на міжнародную сцэну правы чалавека вынеслі падзеі Другой сусветнай вайны. Пасля ўсіх жудасных зверстваў, учыненых у гэтай вайне – уключаючы халакост і маштабныя ваенныя злачынствы – паўстала неабходнасць неадкладнага стварэння новай сістэмы міжнародных прававых нормаў і, перш за ўсё, стварэння сістэмы правоў чалавека, якімі мы іх ведаем сёння.

Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, падпісаны 26 чэрвеня 1945 г., адбіў гэта становішча. Статут заяўляе, што асноўнай задачай ААН з'яўляецца «пазбавіць будучыя пакаленні ад бедстваў вайны» і «зноў умацаваць веру ў асноўныя правы чалавека, у годнасць і каштоўнасць чалавечай асобы, у раўнапраўе мужчын і жанчын».

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (УДПЧ) была распрацавана Камісіяй ААН па правах чалавека, адным з органаў ААН, і прынята на пасяджэнні Генеральнай Асамблеі 10 снежня 1948 года. Несумненна, прыняцце УДПЧ стала вялікім прарывам, і сёння дэкларацыя застаецца самым важным у свеце інструментам абароны правоў чалавека. Нават не з'яўляючыся юрыдычна абавязковай, УДПЧ стала крыніцай натхнення для прыняцця шматлікіх абавязацельстваў па абароне правоў чалавека, няхай гэта будзе на нацыянальным, рэгіянальным або міжнародным узроўні. З той пары міжнароднай супольнасцю быў распрацаваны і прыняты цэлы шэраг асноватворных дакументаў, якія павінны гарантаваць захаванне заяўленых у ёй прынцыпаў. Дадатковую інфармацыю пра некаторыя з гэтых міжнародных пагадненняў можна знайсці далей у гэтай главе.



**Лепш памерці з голаду вольным, чым быць сытым рабом.**
*Эзоп*

**Войны будуць працягвацца, пакуль чалавецтва не зверне ўвагу на тое, што прырода чалавека ўсюды аднолькавая, дзе б у свеце мы ні знаходзіліся.**
*П'ер Дако*

# Правы чалавека ў розных частках свету

Пасля прыняцця Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ў розных рэгіёнах свету былі распрацаваны свае ўласныя сістэмы абароны правоў чалавека, якія існуюць разам з сістэмай, створанай ААН. На дадзены момант існуюць рэгіянальныя ўстановы абароны правоў чалавека ў Еўропе, Амерыцы і Афрыцы. У арабскім свеце і ў краінах Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (ASEAN) таксама робяцца крокі да інстытуцыянальнага замацавання рэгіянальных стандартаў правоў чалавека. Але пры гэтым многія краіны ў гэтай частцы свету таксама ратыфікавалі асноўныя дагаворы і канвенцыі ААН, тым самым выказаўшы сваю згоду з іх асноўнымі прынцыпамі, і добраахвотна ўзялі на сябе абавязацельствы па выкананні міжнароднага права ў дачыненні да правоў чалавека.

У Еўропе на варце розных правоў чалавека і звязаных з імі стандартаў і інструментаў, якія ўжываюцца на ўсім кантыненце, стаіць Савет Еўропы. Пра яго ролю і, у прыватнасці, пра тое, як ён выкарыстоўвае Еўрапейскую канвенцыю і Еўрапейскі суд па правах чалавека, будзе больш падрабязна расказана ніжэй.

Апрача Савета Еўропы, таксама іграюць важную ролю Еўрапейскі саюз і Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ).

Еўрапейскі саюз

Намаганні Еўрапейскага саюза па абароне правоў чалавека атрымалі новы імпульс з прыняццем Лісабонскага дагавора, які ўвайшоў у сілу 1 снежня 2009 года і даў поўнае юрыдычнае абгрунтаванне Хартыі фундаментальных правоў Еўрапейскага саюза. У хартыі выкладзены грамадзянскія, палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя правы, што павінны выконваць як дзяржавы-ўдзельніцы, так і сам Еўрапейскі саюз. Еўрапейскі суд будзе выступаць супраць любога палажэння ў заканадаўстве Еўрасаюза, якое супярэчыць хартыі, і правяраць законы дзяржаў – членаў ЕС на іх адпаведнасць хартыі, пакідаючы за нацыянальнымі судамі прыняцце рашэнняў па паўсядзённых пытаннях. Хартыя падзяляе правы на шэсць «катэгорый»: годнасць, свабода, роўнасць, салідарнасць, грамадзянскія правы і справядлівасць. Катэгорыя «годнасць» гарантуе права на жыццё і ўводзіць забарону на катаванні, рабства і смяротную кару. Катэгорыя «свабода» ўключае права на прыватнае жыццё, уступленне ў шлюб, свабоду думкі і выказвання меркаванняў, права сходаў, права на адукацыю, права на працу, права мець уласнасць і прытулак. Да катэгорыі «роўнасць» адносяцца правы дзяцей і пажылых людзей. Катэгорыя «салідарнасць» уключае сацыяльныя правы і правы працоўных, права на справядлівыя ўмовы працы, абарону ад неабгрунтаванага звальнення і доступ да медыцынскай дапамогі. У лік «грамадзянскіх правоў» уваходзяць права на галасаванне і свабода перамяшчэння, а катэгорыя «справядлівасць» гарантуе права на эфектыўныя сродкі прававой абароны, справядлівы судовы разбор і прэзумпцыю невінаватасці.

Агенцтва па фундаментальных правах (АФП) з'яўляецца экспертным органам, які збірае звесткі аб сітуацыі з асноўнымі (фундаментальнымі) правамі чалавека ў краінах Еўрапейскага саюза, кансультуе і дае рэкамендацыі па паляпшэнні існуючай сітуацыі. Агенцтва не займаецца маніторынгам, але супрацоўнічае з адпаведнымі ўстановамі, падаючы ім рэкамендацыі аб тым, як лепш ажыццяўляць асноўныя правы.

Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) аб'ядноўвае 56 дзяржаў Еўропы, Цэнтральнай Азіі і Паўночнай Амерыкі. Хоць яна спецыяльна не займаецца абаронай правоў чалавека, яе глабальны падыход да бяспекі дазваляе ўжываць яе для вырашэння шырокага кола праблем, уключаючы пытанні, звязаныя з правамі чалавека, нацыянальнымі меншасцямі, дэмакратызацыяй, стратэгіямі па абароне парадку, барацьбой з тэрарызмам, дзейнасцю ў галіне эканомікі і экалогіі. Выступаючы за правы чалавека, АБСЕ дзейнічае пры пасярэдніцтве Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ), штаб-кватэра якога знаходзіцца ў Варшаве. БДІПЧ дзейнічае на ўсёй прасторы дзяржаў, якія ўваходзяць у АБСЕ, і назірае за выбарамі, развіццём дэмакратычных працэсаў, выкананнем правоў чалавека, а таксама займаецца праблемамі, звязанымі з талерантнасцю, дыскрымінацыяй і вяршэнствам права. Праца Бюро, арыентаваная на маладых людзей, ахоплівае пытанні, звязаныя з адукацыяй у галіне правоў чалавека, барацьбой з антысемітызмам і ісламафобіяй.

АБСЕ
http://www.osce.org/odihr

У Міжамерыканскім рэгіёне стандарты і механізмы абароны правоў чалавека заснаваны на палажэннях Амерыканскай дэкларацыі правоў і абавязкаў чалавека (1948 г.) і Амерыканскай канвенцыі аб правах чалавека (1969 г.). Тут таксама дзейнічаюць спецыяльныя прававыя акты, у якіх гаворка ідзе пра бежанцаў, пра прадухіленне катаванняў і пакаранне за іх, пра адмену смяротнай кары, пра знікненні людзей, гвалт у адносінах да жанчын, пра ахову навакольнага асяроддзя і іншыя праблемы.

Арганізацыя амерыканскіх дзяржаў

Афрыканская хартыя правоў чалавека і народаў увайшла ў сілу ў кастрычніку 1986 года, а да 2007 года яе ратыфікавалі 53 дзяржавы. Хартыя ўяўляе інтарэс, бо ўпор у ёй робіцца на трохі іншыя палажэнні, чым у аналагічных дакументах, прынятых у іншых частках свету:

Афрыканскі саюз

• У адрозненне ад Еўрапейскай ці Амерыканскай канвенцый, Афрыканская хартыя ўключае сацыяльныя, эканамічныя і культурныя правы, а таксама грамадзянскія і палітычныя правы ў рамках аднаго і таго ж дагавора.

• Афрыканская хартыя закранае не толькі індывідуальныя правы, але і прадугледжвае калектыўныя правы народаў.

• Хартыя таксама прызнае, што асоба мае не толькі правы, але і абавязкі, і нават пералічвае пэўныя абавязкі асобы ў адносінах да сям'і, грамадства, дзяржавы і міжнароднай супольнасці.

**Кожны чалавек мае абавязкі перад грамадствам, у якім толькі і магчыма свабоднае і поўнае развіццё яго асобы.**

*Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека*

## *Як вы думаеце, чаму ў хартыі правоў чалавека згадваюцца таксама і абавязкі? Ці лічыце вы, што яны павінны быць упісаны ва ўсе дакументы па правах чалавека?*

У арабскім свеце рэгіянальная Камісія па правах чалавека дзейнічае з 1968 года, але яе паўнамоцтвы ў галіне прасоўвання правоў чалавека адрозніваюцца вялікай выбіральнасцю і абмежаванасцю. Перагледжаная Арабская хартыя правоў чалавека была прынята Лігай арабскіх дзяржаў у 2004 годзе і ўвайшла ў сілу ў 2008 годзе.

Арабская хартыя правоў чалавека

Арабская хартыя агаворвае сацыяльна-эканамічныя і грамадзянска-палітычныя правы, а таксама робіць спасылку на «агульную цывілізацыю» арабскіх дзяржаў. Уваход у сілу хартыі і механізмаў яе маніторынгу – Арабскага камітэта па правах чалавека і Арабскай падкамісіі па правах чалавека – быў успрыняты з адабрэннем як абнадзейлівая прыкмета паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека ў дадзеным рэгіёне. У той жа час хартыя падверглася жорсткай крытыцы за тое, напрыклад, што ў ёй адсутнічае забарона на жорсткія пакаранні, а эканамічныя і сацыяльныя правы гарантаваны толькі грамадзянам краін гэтага рэгіёну, што некаторыя правы заснаваны на законах шарыяту. Сярод недахопаў хартыі адзначалася таксама, што яна дазваляе смяротную кару ў адносінах да дзяцей, калі гэта прадугледжваецца нацыянальным заканадаўствам, і ў ёй дапускаюцца абмежаванні свабоды думкі, сумлення і веравызнання, калі гэта прадугледжана законам.

COMPASS

ASEAN

У рэгіёне Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (ASEAN) прыкладваюцца намаганні, каб гэты рэгіянальны орган выканаў свае прынятыя ў 2009 годзе абавязацельствы па стварэнні Міжурадавай камісіі па правах чалавека. У дакуменце 2009 года, які вызначае сферу кампетэнцыі камісіі, падкрэслена, што яна будзе выступаць за «захаванне міжнародных прынцыпаў правоў чалавека, у тым ліку ўніверсальнасці, непадзельнасці, узаемазалежнасці і ўзаемазвязанасці ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод, а таксама за бесстароннасць, аб'ектыўнасць, адсутнасць выбіральнасці, адсутнасць дыскрымінацыі і недапушчэнне дваістых стандартаў і палітызацыі».

# Як нам скарыстацца нашымі правамі?

Правы чалавека існуюць для ўсіх нас. Так як жа мы можам імі скарыстацца? Ясна, што простага іх існавання недастаткова, каб пакласці канец парушэнням правоў чалавека, якія, як усе мы ведаем, здзяйсняюцца кожны дзень, ва ўсіх частках свету. Ці могуць яны сапраўды нешта змяніць? Як мы можам іх выкарыстоўваць?

## *Ці ведаеце вы, што рабіць, калі вашы правы чалавека парушаюцца?*

### *Прызнанне вашых правоў*

**Маральныя каштоўнасці, як вецер, нябачныя. Але вы ведаеце, што вецер ёсць, мяркуючы па шолаху лісця на дрэвах. І вы разумееце, што маральныя каштоўнасці існуюць, мяркуючы па ўчынках людзей.**

*Ева Анчэл*

У наступным раздзеле мы разглядаем розныя віды правоў чалавека, якія абаронены міжнародным правам. Калі нам вядома, якія менавіта галіны чалавечага існавання суадносяцца з нормамі законаў аб правах чалавека, і мы ведаем, што ўрады, згодна з гэтымі нормамі, прынялі на сябе адпаведныя абавязацельствы, мы можам пачынаць аказваць ціск на іх у той ці іншай форме. У гэтым раздзеле паказана, што амаль усе праявы несправядлівасці маюць дачыненне да правоў чалавека: няхай гэта будзе беднасць (у невялікім маштабе), нанясенне шкоды навакольнаму асяроддзю, праблемы здароўя, умовы працы, палітычныя рэпрэсіі, выбарчыя правы, генная інжынерыя, праблемы меншасцей, тэрарызм, генацыд… і гэтак далей. І нават сёння колькасць праблем не перастае расці.

Некаторыя з праблем, звязаных з прымяненнем заканадаўства па правах чалавека, разглядаюцца непасрэдна ў раздзеле «Пытанні і адказы». У ім даюцца кароткія адказы на некаторыя з найбольш агульных пытанняў аб правах чалавека і пытанняў, якія часта задаюцца ў гэтай сувязі.

Калі вам неабходна высветліць, як лепш абараніць нейкае канкрэтнае права, напрыклад права на здароўе, на адукацыю ці справядлівыя ўмовы працы, вам будзе карысна азнаёміцца з асноўнай інфармацыяй, прысвечанай канкрэтнай праблеме, на сайце www.coe.int/compass.

### *Выкарыстанне прававых механізмаў*

Мы разгледзім прававыя механізмы, якія існуюць для абароны розных сфер чалавечых інтарэсаў. У Еўропе, а цяпер і ў Афрыцы, і ў Паўднёвай і Паўночнай Амерыцы ёсць суд, які разглядае скаргі пра парушэнні правоў – Еўрапейскі суд па правах чалавека (ЕСПЧ). Нават калі скаргі не падпадаюць пад юрысдыкцыю Еўрапейскага суда, як мы ўбачым, існуюць і іншыя механізмы, якія дазваляюць прыцягнуць дзяржавы да адказнасці за іх дзеянні і прымусіць іх да выканання сваіх абавязацельстваў у адпаведнасці з міжнародным правам правоў чалавека. Нам лягчэй ад самога факта існавання такіх прававых нормаў, нават калі не заўсёды ёсць прававыя сродкі, каб прымусіць дзяржавы да іх выканання.

***Лабіраванне, правядзенне кампаній і актывізм***

Важную ролю ў аказанні ціску на дзяржавы іграюць розныя асацыяцыі, няўрадавыя грамадскія арганізацыі, дабрачынныя аб’яднанні і іншыя ініцыятыўныя групы грамадзян. Гэта тэма разглядаецца ў раздзеле, прысвечаным ролі актывістаў і НГА. Дзейнасць такіх арганізацый асабліва важна для простых людзей, і не толькі таму, што яны займаюцца справамі канкрэтных асоб, але і таму, што яны даюць звычайнаму чалавеку магчымасць актыўна ўдзельнічаць у абароне правоў іншых. У рэшце рэшт, гэтыя асацыяцыі складаюцца са звычайных людзей! Мы таксама разгледзім, як яны дзейнічаюць, каб палепшыць становішча з правамі чалавека, а таксама некаторыя прыклады іх паспяховых акцый.

*Ці былі вы калі-небудзь удзельнікам кампаніі ў абарону правоў чалавека ці актывістам у гэтай галіне?*

***Пачні ўдзельнічаць***

У главе 3 «Практычныя дзеянні ў падтрымку правоў чалавека» апісваецца, якімі могуць быць гэтыя меры ва ўмовах паўсядзённага жыцця, і прыводзяцца прыклады акцый, прыняць удзел у якіх маглі б вы самі. Маладзёжныя групы маюць велізарны патэнцыял для ціску на ўрады ці міжнародныя арганізацыі з тым, каб выпадкі парушэння правоў чалавека прадухіляліся або траплялі ў поле зроку грамадскасці. Прыведзеныя ў гэтай главе прыклады павінны падказаць вам, якія канкрэтныя меры могуць прымаць ваша ці іншая групы, а таксама бліжэй пазнаёміць вас з паўсядзённай працай недзяржаўных арганізацый.

# Дылемы правоў чалавека

Рэалізаваць правы чалавека – гэта значыць умець пераадольваць перашкоды на гэтым шляху. Па-першае, некаторыя ўрады, палітычныя партыі ці кандыдаты ва ўладу, дзеячы сацыяльнай і эканамічнай сферы, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці часта гавораць «на мове правоў чалавека», але пры гэтым не бяруць на сябе абавязацельстваў абараняць гэтыя правы. Часам прычынай гэтаму з'яўляецца недастатковае разуменне таго, да чаго заклікаюць стандарты правоў чалавека. У іншых выпадках гаворка ідзе аб наўмысным злоўжыванні і жаданні выставіць сябе змагаром за правы чалавека і стварыць сабе станоўчы імідж у вачах усяго свету. Па-другое, урады, палітычныя партыі, кандыдаты ва ўладу ці грамадзянскія актывісты могуць крытыкаваць іншых за парушэнне правоў чалавека, але пры гэтым самі не выконваць стандарты правоў, а гэта называецца палітыкай дваістых стандартаў. Па-трэцяе, могуць быць выпадкі, калі правы адных людзей абмяжоўваюцца дзеля абароны правоў іншых. Часам гэта можа быць справядліва, паколькі правы чалавека не бязмежныя, і, ажыццяўляючы свае правы, чалавек не павінен перашкаджаць іншым людзям карыстацца іх правамі. Тым не менш трэба быць пільнымі і не дапускаць, каб «абарона правоў іншых людзей» не стала простай адгаворкай для ўвядзення абмежаванняў. Важна, каб маніторынгам падобных выпадкаў займаліся актыўныя прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці і незалежныя судовыя органы. Па-чацвёртае, ёсць прыклады, калі сама па сабе абарона правоў адной групы людзей можа пацягнуць за сабой абмежаванне правоў іншых. І гэта трэба адрозніваць ад прыведзенага вышэй прыкладу празмернага абмежавання правоў. У такіх выпадках не заўсёды проста выступаць у ролі суддзі.

**Пры ажыццяўленні сваіх правоў і свабод кожны чалавек павінен спазнаць толькі такія абмежаванні, якія ўстаноўлены законам выключна з мэтай забеспячэння належнага прызнання і павагі правоў і свабод іншых і задавальнення справядлівых патрабаванняў маралі, грамадскага парадку і агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве.**

*УДПЧ, артыкул 29 (2)*

### Калізія правоў

Правы таксама могуць канфліктаваць паміж сабой. «Калізіямі правоў» называюцца канфлікты, якія могуць паўстаць паміж living рознымі правамі чалавека або паміж аднымі і тымі ж правамі, але ў дачыненні да розных людзей. У якасці прыкладу можна прывесці выпадак, калі двум пацыентам, каб выжыць, трэба новае сэрца; але для трансплантацыі ёсць усяго адно. У гэтым выпадку права на жыццё аднаго пацыента ўступае ў калізію з такім жа правам іншага пацыента. Іншы прыклад звязаны з эўтаназіяй, калі чыё-небудзь права на жыццё ўступае ў канфлікт з яго (яе) правам памерці або быць пазбаўленым(-ай) зневажальнага абыходжання з сабой. Гэта выпадкі канфліктаў розных правоў у дачыненні да аднаго чалавека. Трэцім прыкладам можна лічыць сітуацыі, калі ў канфлікт уступаюць розныя правы розных людзей. Адным з прыкладаў гэтага з'яўляецца сітуацыя, якая разглядалася ў Камітэце ААН па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі ў рамках справы «Яўрэйская суполка Осла і інш. супраць Нарвегіі». У 2000 годзе групоўка, якая называе сябе «Бутбойз» (пераклад: хлопчыкі ў ботах), справіла марш у гонар нацысцкага лідара Рудольфа Геса. Удзельнікі былі апрануты ў «напаўвайсковую» ўніформу, а кіраўнік маршу, спадар Тэр'е Сьёлі, выступіў з антысеміцкай прамовай, пасля якой удзельнікі шматразова выканалі нацысцкае прывітанне і пракрычалі «Зіг хайль!». У дадзеным выпадку меў месца канфлікт паміж правам спадара Сьёлі на свабоду самавыяўлення і правам яўрэйскай суполкі не падвяргацца дыскрымінацыі. Камітэт ААН пастанавіў, што ў заявах спадара Сьёлі ўтрымліваліся ідэі расавай перавагі і нянавісці, і таму яго вельмі агрэсіўная прамова не падпадае пад абарону права на свабоду самавыяўлення.

**Становіцца ўсё больш відавочным, што жаночае абразанне, злачынствы «ў абарону гонару», прымусовыя шлюбы і іншыя падобныя праяўленні не будуць выкаранены, пакуль жанчыны не стануць роўнымі і паўнапраўнымі ўдзельніцамі сацыяльнага, эканамічнага, культурнага і палітычнага жыцця сваіх супольнасцей.**

*Халіма Эмбарэк Варзазі*[1]

### Культурныя традыцыі

Традыцыйныя культурныя звычаі адлюстроўваюць каштоўнасці і перакананні членаў супольнасці на працягу многіх пакаленняў. У кожнай сацыяльнай групы ў свеце ёсць спецыфічныя традыцыйныя звычаі і вераванні: некаторыя з іх з'яўляюцца карыснымі для ўсіх членаў супольнасці, тады як іншыя шкодзяць канкрэтным групам, напрыклад жанчынам. Да гэтых шкодных звычаяў адносяцца: жаночае абразанне; прымусовае кармленне жанчын; ранняе замужжа; розныя забароны і звычаі, якія не дазваляюць жанчынам кантраляваць сваю фертыльнасць; забароны, звязаныя з ежай; перавага сына і яе ўплыў на статус дзяцей-дзяўчынак; забойства нованароджаных дзяўчынак; ранняя цяжарнасць; традыцыя аплаты выкупу за нявесту. Нягледзячы на тое, што з-за сваёй шкоднай прыроды такія звычаі парушаюць міжнародныя нормы правоў чалавека, яны працягваюць існаваць, таму што тыя, хто іх практыкуе, не толькі не ставяць іх пад сумненне, але і лічаць праяўленнем высокай маралі.

*Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека*

Шкодныя традыцыйныя практыкі

Шэраг звычаяў, якія негатыўна ўплываюць на здароўе жанчын і дзяцей і парушаюць міжнародныя стандарты правоў чалавека, часта называюць «шкоднымі традыцыйнымі практыкамі». Гэта не азначае, што ўсе традыцыйныя практыкі шкодныя і парушаюць правы чалавека, але калі гэта адбываецца, мы павінны ставіць іх пад сумненне і займацца іх выкараненнем.

Звычайная практыка ў многіх культурах – «дагаворныя шлюбы», пры якіх маладая дзяўчына – ці юнак – часта ў вельмі юным узросце абавязаны выходзіць замуж за чалавека (ажаніцца з чалавекам), абранага(-ым) яе (яго) сямействам. (Адзначым, што «дагаворны» шлюб і шлюб прымусовы – гэта не адно і тое ж). Ці варта гэту практыку забараніць дзеля абароны правоў дзяцей і моладзі? Ці, можа, гэта было б непавагай культурнай традыцыі?

У якасці іншых прыкладаў можна назваць практыку жаночага абразання, што працягвае існаваць у многіх краінах. Тысячы людзей пакутуюць ад наступстваў такіх звычаяў, і большасць людзей, безумоўна, лічыць іх сур'ёзным парушэннем правоў чалавека. Ці варта разглядаць жаночае абразанне як культурную асаблівасць, да якой можна ставіцца «талерантна», ці як парушэнне права чалавека на фізічную недатыкальнасць і здароўе?

Абарона ўсіх правоў чалавека для ўсіх прадугледжвае адмову ад шкодных традыцыйных практык. Нікому не можа быць адмоўлена ў правах чалавека і ў годнасці на падставе неабходнасці выканання патрабаванняў традыцыі і культуры; да таго ж традыцыі і культуры не высечаны ў камені – яны змяняюцца і эвалюцыянуюць, і тыя, што былі актуальнымі яшчэ дваццаць гадоў таму, часта не маюць сэнсу ў вачах сённяшняга пакалення. Існуючыя шкодныя традыцыі таксама нагадваюць нам пра тое, што барацьба за правы чалавека абапіраецца на адукацыйныя праграмы і намаганні ў гэтай сферы. Шматлікіх шкодных традыцыйных практык немагчыма пазбавіцца толькі шляхам рэпрэсій і асуджэння: каб дамагчыся эфекту, патрабуюцца адукацыя і ўдзел усіх зацікаўленых асоб. Нават калі канчатковая адказнасць ускладзена на дзяржавы, якія падпісалі міжнародныя дагаворы па правах чалавека, шкодныя традыцыі выжываюць дзякуючы дзеянням асобных людзей пры падтрымцы сем'яў і супольнасцей, у якіх захоўваюцца такія практыкі. Іх змяненне не можа быць навязана «зверху», для гэтага неабходна пастаянная адукацыйная праца з закранутымі сем'ямі і супольнасцямі, бо толькі так можна прымірыць правы чалавека з тым, што лічыцца спецыфічнымі культурнымі правамі і звычаямі.

*Ці павінны культурныя звычаі ставіцца вышэй універсальнасці правоў чалавека?*

**Хоць значэнне нацыянальнай і рэгіянальнай спецыфікі і розных гістарычных, культурных і рэлігійных асаблівасцей неабходна мець на ўвазе, дзяржавы, незалежна ад іх палітычных, эканамічных і культурных сістэм, нясуць абавязак прасоўваць і абараняць усе правы чалавека і асноўныя свабоды.**
*Венская дэкларацыя (1993 г.)*

## *Дзеля добрай справы*

Часам міжнародная супольнасць выкарыстоўвае санкцыі, каб пакараць рэжымы, якія лічацца сістэматычнымі парушальнікамі правоў чалавека. Такія санкцыі забараняюць гандаль з краінай-парушальнікам з тым, каб аказаць ціск на яе ўрад і прымусіць яго перагледзець сваю палітыку. Рашэнні пра такія дзеянні часам прымаюцца дзяржавай у аднабаковым парадку, а часам яны здабываюць форму санкцыі Савета Бяспекі ААН. Некаторыя краіны былі цалкам ізаляваны ад сусветнай супольнасці: так, Паўднёвая Афрыка была ізалявана на доўгія гады з-за яе агіднай сістэмы апартэіду, і на працягу дзесяцігоддзяў уводзіліся санкцыі супраць Ірака, Паўночнай Карэі, Ірана і іншых краін. Несумненна, наступствы такіх санкцый адчуваюць на сабе і звычайныя людзі, але больш за ўсё ад іх пакутуе менш абароненая частка грамадства. Ці прымальна такая форма барацьбы з парушэннямі правоў чалавека ў якіх-небудзь асобна ўзятых краінах?

У дакладзе «Адказнасць па абароне» Міжнароднай камісіі па пытаннях умяшання і дзяржаўнага суверэнітэту гучыць заклік да асцярожнасці і робіцца ўпор на тое, што лепш прэвентыўныя меры, чым дзеянні ў адказ. Аднак калі сусветная супольнасць вымушана звярнуцца да «выключных і надзвычайных мер» і «ўзброенага ўмяшання ў мэтах абароны людзей», Міжнародная камісія настойвае на акрэсленні парога ў дачыненні да масавай гібелі людзей або этнічных чыстак. Калі такое адбываецца, камісія дэкларуе наступныя «Прынцыпы асцярожнасці»:

• Добры намер: асноўная мэта ўмяшання, якія б ні былі іншыя матывы ў дзяржаў, што ажыццяўляюць умяшанне, павінна быць у тым, каб спыніць ці прадухіліць пакуты людзей. Добры намер лягчэй ажыццявіць сумеснымі дзеяннямі з удзелам іншых бакоў пры падтрымцы з боку грамадскай думкі ў рэгіёне і саміх людзей, што пакутуюць ці знаходзяцца пад пагрозай.

**Справядлівасць – гэта права слабейшага.**
*Жазэф Жубер*

• Апошняя інстанцыя: ваеннае ўмяшанне можа быць апраўдана толькі тады, калі ўсе неваенныя варыянты прадухілення або мірнага вырашэння крызісу былі разгледжаны і ёсць важкія падставы лічыць, што яны не прывядуць да жаданага выніку.

• Прапарцыянальныя меры: маштабы, працягласць і інтэнсіўнасць планаванага ваеннага ўмяшання павінны складаць мінімум, неабходны для дасягнення пастаўленай мэты абароны людзей.

• Разумныя перспектывы: павінен існаваць разумны шанц на поспех у дасягненні спынення або прадухілення пакут людзей, які б апраўдаў умяшанне; і наступствы дзейнасці не павінны лічыцца горшымі за наступствы бяздзейнасці.

Аглядваючыся назад, што вы думаеце пра гэтыя меры засцярогі ў дачыненні, напрыклад, да рэакцыі міжнароднай супольнасці на Разню ў Срэбраніцы ў 1995 годзе, да праведзенай НАТА бамбардзіроўкі Косава ў 1999 годзе або да інтэрвенцыі ў Афганістан у 2001 годзе? Ці могуць такія дзеянні быць апраўданы з пункту гледжання іх канчатковых вынікаў, калі яны прыводзяць да вялікай колькасці ахвяр?

## *Ці можна выкарыстоўваць абарону правоў чалавека ў якасці апраўдання для ваеннай кампаніі?*

**Там, дзе насельніцтва адчувае істотны ўрон у выніку ўнутранай вайны, бунту, рэпрэсій, ці з-за няздольнасці дзяржавы функцыянаваць нармальна, і такая дзяржава не жадае або не можа спыніць ці прадухіліць такі ўрон, прынцып неўмяшання перадаецца пад адказнасць міжнароднай супольнасці.**

*Даклад Міжнароднай камісіі па пытаннях умяшання і дзяржаўнага суверэнітэту, 2001 г.*

У красавіку 2001 года Камісія ААН па правах чалавека адхіліла ідэю аб тым, што дзеля барацьбы з тэрарызмам можна ахвяраваць абарону правоў чалавека. Рэзалюцыя 2001/24 асудзіла ўзброеныя напады, звязаныя з канфліктам у Чачэнскай Рэспубліцы Расійскай Федэрацыі і парушэннямі гуманітарнага права з боку чачэнскіх паўстанцаў, а таксама некаторыя метады, што прымяняліся ў Чачні расійскімі федэральнымі сіламі. Рэзалюцыя заклікала Расійскую Федэрацыю стварыць незалежную нацыянальную камісію для расследавання вышэйзгаданых парушэнняў, якая б працавала ў адпаведнасці з прызнанымі міжнароднымі стандартамі.

## ***Правы чалавека пастаянна мяняюцца і развіваюцца***

Не на ўсе пытанні, узнятыя ў папярэднім раздзеле, ёсць дакладныя адказы: нават сёння яны застаюцца прадметам лютых спрэчак. У нейкай меры гэтыя спрэчкі важны. Яны сведчаць як аб плюралізме ў падыходах, што з'яўляецца асновай для паняцця правоў чалавека, так і пра тое, што правы чалавека – гэта не навука, не застылая «ідэалогія», а вобласць маральна-этычнай і прававой думкі, і гэта вобласць пастаянна развіваецца. Мы не павінны чакаць, што адказы будуць адназначнымі. Праблемы, што разглядаюцца, складаныя, і для іх вырашэння патрэбен збалансаваны падыход, які дапаможа вывучыць кожны выпадак у асобнасці.

Аднак гэта не азначае, што адказаў няма наогул і што няма ніводнай вобласці, дзе была б дасягнута згода. Такіх абласцей шмат, і іх колькасць узрастае амаль штодня. Праблема рабства выклікала дыскусіі, а сёння талерантны падыход па гэтым пытанні больш не лічыцца прымальным, бо права на свабоду ад рабства цяпер універсальна прызнана як асноўнае права чалавека. Жаночае абразанне, хоць і атрымлівае падтрымку некаторых людзей з нагоды меркавання аб неабходнасці захавання культурных звычаяў, шырока асуджаецца як парушэнне правоў чалавека. Такое ж стаўленне і да смяротнай кары – прынамсі, у Еўропе, дзе краіны – члены Савета Еўропы альбо адмянілі смяротную кару, альбо ўвялі мараторый на прывядзенне прысудаў у выкананне. На справе адмена смяротнай кары ў цяперашні час з'яўляецца абавязковай умовай для членства ў Савеце Еўропы. Па даных Amnesty International, больш за дзве трэці краін свету адмянілі смяротную кару ў сваім заканадаўстве або на практыцы. Па стане на 2009 год 58 краін захавалі смяротную кару, але ў большасці сваёй яе не ўжывалі.

Таму мы павінны верыць, што многія з гэтых пытанняў таксама знойдуць сваё рашэнне. Тым часам мы можам уключыцца ў дыскусію і вынесці сваё ўласнае меркаванне па спрэчных пытаннях, памятаючы пра дзве асноўныя каштоўнасці – роўнасць і чалавечую годнасць. Калі якое-небудзь дзеянне ў адносінах да любога чалавека прыніжае яго годнасць, значыць, яно супярэчыць духу правоў чалавека.

# 4.2 Эвалюцыя правоў чалавека

«Усе правы чалавека ўніверсальныя, непадзельныя, узаемазалежныя і ўзаемазвязаныя».

*Венская дэкларацыя, 1993 год*

# Абяцанні, абяцанні…

Нашы лідары прынялі ад нашага імя велізарную колькасць абавязацельстваў! Калі б усе абяцанні, пад якімі яны падпісаліся, былі выкананы, наша жыццё было б мірным, бяспечным, здаровым і камфортным; нашы прававыя сістэмы былі б справядлівымі і забяспечвалі ўсім аднолькавую абарону; а нашы палітычныя працэсы былі б адкрытымі і дэмакратычнымі і служылі інтарэсам людзей.

Дык што ж ня так? Адна з прычын, здавалася б, дробязь, складаецца ў наступным: палітыкі – такія ж людзі, як і ўсе мы, і яны часта ідуць па лініі найменшага супраціўлення, калі яны ведаюць, што гэта ім сыдзе з рук. Дык што нам трэба дакладна высветліць, якія абяцанні былі дадзены ад нашага імя, і пачаць дамагацца іх выканання.

*Вы заўсёды робіце тое, што абяцалі? Нават калі вам ніхто пра гэта не нагадвае?*

# Якімі правамі мы валодаем?

Мы ведаем, што маем права на захаванне ўсіх нашых правоў чалавека. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і іншыя пагадненні ахопліваюць шырокае кола розных правоў, таму мы будзем разглядаць іх у тым парадку, у якім яны распрацоўваліся і былі прызнаны на рэгіянальным узроўні або ўсёй міжнароднай супольнасцю. Самы вядомы спосаб класіфікацыі гэтых правоў – вылучэнне правоў «першага, другога і трэцяга пакалення», таму мы пойдзем такім шляхам, хоць хутка ўбачым, што такая класіфікацыя мае абмежаваную сферу прымянення, а часам і проста ўводзіць у зман. Гэтыя катэгорыі не ёсць нешта строга акрэсленае. Гэта ўсяго толькі адна з многіх класіфікацый розных правоў. Большасць правоў залічваецца адразу да некалькіх катэгорый. Напрыклад, права на выказванне свайго меркавання з'яўляецца як грамадзянскім, так і палітычным правам. Яно неабходна для ўдзелу ў палітычным жыцці, а таксама з'яўляецца асноўным для нашай асабістай свабоды.

**Апынуцца ў турме не праблема. Праблема ў тым, каб не здацца.**

*Назым Хікмет*

### *Грамадзянскія і палітычныя правы (правы першага пакалення)*

Гэтыя правы пачалі тэарэтычна афармляцца ў XVII і XVIII стагоддзях, і ў іх аснове ляжалі, галоўным чынам, палітычныя меркаванні. Паступова сталі прызнаваць, што ёсць рэчы, якія нельга пакідаць на меркаванне ўсемагутных правіцеляў, і што людзі павінны мець нейкі ўплыў на кірунак палітыкі, якая тычыцца іх. Дзвюма цэнтральнымі ідэямі былі ідэя асабістай свабоды і ідэя абароны асобы ад дзяржаўнага дэспатызму.

Сёння грамадзянскія і палітычныя правы падрабязна выкладзены ў Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП) і Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод (ЕКПЧ), і яны ўключаюць у сябе такія правы, як права на ўдзел у кіраванні дзяржавай і права не падвяргацца катаванням. Гэтыя правы традыцыйна разглядаюцца многімі – прынамсі, на «Захадзе» – як найбольш важныя правы чалавека. У наступным раздзеле мы ўбачым, што такі погляд з'яўляецца памылковым.

Палітыкі схільны злоўжываць паняццем «правы чалавека»

У перыяд «халоднай вайны» краіны Савецкага блока падвяргаліся жорсткай крытыцы за пагарду грамадзянскімі і палітычнымі правамі. Тыя, у сваю чаргу, адказвалі крытыкай у адрас заходніх дэмакратый за ігнараванне асноўных сацыяльных і эканамічных правоў. Гэта пытанне мы яшчэ разгледзім. У абодвух крытычных выказваннях быў, па меншай меры, адзін момант ісціны. Гэта таксама паказвае, як паняцце «правы чалавека» можа злоўжывацца палітыкамі.

«Жах сітуацыі... заключаецца ў тым, што дзяржавы і міжнародная супольнасць, у цэлым, працягваюць занадта часта мірыцца з парушэннямі эканамічных, сацыяльных і культурных правоў, якія, калі б яны адбыліся ў дачыненні да грамадзянскіх і палітычных правоў, выклікалі б жах і абурэнне і прывялі б да сумесных заклікаў неадкладна прыняць меры для выпраўлення сітуацыі».

*Заява Камітэта ААН па эканамічных, сацыяльных і культурных правах, зробленая на Сусветнай канферэнцыі па правах чалавека ў Вене ў 1993 г.*

## Сацыяльныя, эканамічныя і культурныя правы (правы другога пакалення)

**Спачатку ежа, а мараль потым.**

*Бертальд Брэхт*

Гэтыя правы датычацца таго, як людзі жывуць і працуюць поплеч, а таксама задавальнення іх асноўных патрэбаў. Такія правы заснаваны на ідэях роўнасці і гарантуюць доступ да асноўных сацыяльных і эканамічных выгад, паслуг і магчымасцей. Гэтыя правы атрымлівалі ўсё большае міжнароднае прызнанне пад уплывам наступстваў пачатковага перыяду індустрыялізацыі і ўздыму працоўнага класа. Два гэтыя фактары прывялі да з'яўлення новых патрэб і новых уяўленняў аб годным жыцці. Людзі ўсвядомілі, што чалавечая годнасць патрабуе большага, чым проста неўмяшанне з боку дзяржавы, прадугледжанае грамадзянскімі і палітычнымі правамі. Сацыяльныя, эканамічныя і культурныя правы абвяшчаюцца ў Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП), а таксама ў Еўрапейскай сацыяльнай хартыі Савета Еўропы.

Сацыяльныя, эканамічныя і культурныя правы заснаваны на ідэях роўнасці і гарантаванага доступу да асноўных сацыяльных і эканамічных выгад, паслуг і магчымасцей.

• Сацыяльныя правы – гэта тыя правы, якія неабходны для паўнавартаснага ўдзелу ў жыцці грамадства. Яны ўключаюць, па меншай меры, права на адукацыю, права на стварэнне і ўтрыманне сям'і, а таксама многія з правоў, якія часта разглядаюць як «грамадзянскія», напрыклад права на адпачынак, на ахову здароўя, на недатыкальнасць прыватнага жыцця і свабоду ад дыскрымінацыі.

• Эканамічныя правы ўключаюць, як прынята лічыць, права на працу, на годны ўзровень жыцця, на жыллё і на пенсійнае забеспячэнне па старасці або інваліднасці. Эканамічныя правы адлюстроўваюць той факт, што для чалавечай годнасці неабходны пэўны мінімальны ўзровень матэрыяльнага забеспячэння, а таксама тое, што адсутнасць, напрыклад, паўнавартаснай працы або жылля можа быць псіхалагічна зневажальнай.

• Культурныя правы аднесены да культурнага «ладу жыцця» грамадства. Ім часта надаюць менш увагі, чым правам многіх іншых тыпаў. Яны ўключаюць права свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці грамадства і, магчыма, таксама і права на адукацыю. Аднак многія іншыя правы, афіцыйна не аднесеныя да «культурных», жыццёва неабходны супольнасцям розных меншасцей, каб яны маглі захаваць у навакольным грамадстве сваю асаблівую культуру: напрыклад, права на адсутнасць дыскрымінацыі і роўную абарону законам.

### *Калектыўныя правы (правы трэцяга пакалення)*

Спіс міжнародна прызнаных правоў чалавека не застаецца нязменным. Хоць ніводнае з правоў, пералічаных ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (УДПЧ), за больш чым 60 гадоў яе існавання не было пастаўлена пад пытанне, новыя пагадненні і дакументы ўдакладнілі і развілі некаторыя з базавых канцэпцый, закладзеных у тым фундаментальным дакуменце.

Гэтыя дадаткі сталі вынікам шматлікіх фактараў: часткова яны паўсталі як адказ на змены ва ўяўленні аб чалавечай годнасці, часткова з прычыны з'яўлення новых пагроз і магчымасцей. Што датычыцца новай асаблівай катэгорыі правоў, прапанаваных у якасці правоў «трэцяга пакалення», то яны сталі следствам больш глыбокага разумення рознага роду перашкод, якія могуць стаяць на шляху ажыццяўлення правоў першага і другога пакаленняў.

Права на развіццё, права на мір, права на здаровае навакольнае асяроддзе, права на гуманітарную дапамогу...

Ідэя, якая ляжыць у аснове правоў трэцяга пакалення, – гэта ідэя салідарнасці, і гэтыя правы ахопліваюць калектыўныя правы грамадства ці народаў, такія як права на ўстойлівае развіццё, на мір ці на здаровае навакольнае асяроддзе. Крайняя беднасць, войны, экалагічныя і стыхійныя бедствы ў многіх рэгіёнах свету прывялі да таго, што прагрэс у сферы захавання правоў чалавека там аказаўся вельмі абмежаваны. З гэтай прычыны многія палічылі, што неабходна прызнаць новую катэгорыю правоў чалавека: гэтыя правы гарантавалі б грамадствам, асабліва ў краінах, якія развіваюцца, неабходныя ўмовы для забеспячэння ўжо прызнаных правоў першага і другога пакалення.

Правы, якія часцей за ўсё ўключаюцца ў катэгорыю правоў трэцяга пакалення, – гэта права на развіццё, на мір, на здаровае навакольнае асяроддзе, права на сумеснае выкарыстанне агульнай спадчыны чалавецтва, на камунікацыю і на гуманітарную дапамогу.

Аднак гэта катэгорыя правоў выклікае і спрэчкі. Некаторыя эксперты выступаюць супраць самой ідэі такіх «калектыўных правоў», паколькі калектыўныя правы належаць супольнасцям людзей ці нават цэлым дзяржавам. Яны лічаць, што правы чалавека могуць належаць выключна асобным людзям. Гэта не проста спрэчка пра словы, паколькі ёсць асцярогі, што такое змяненне ў тэрміналогіі можа даць некаторым дыктатарскім рэжымам «падставу» для адмовы ў правах чалавека (індывідуальных) дзеля гэтых калектыўных, напрыклад рэзка абмяжоўваючы грамадзянскія правы дзеля «эканамічнага развіцця».

Часам выказваецца і такая заклапочанасць: паколькі мяркуецца, што гарантам правоў трэцяга пакалення стане не дзяржава, а міжнародная супольнасць, вызначыць адказных будзе немагчыма. На каго ці на што плануецца ўскласці адказнасць за забеспячэнне міру на Каўказе або Сярэднім Усходзе, ці за абарону ад знішчэння трапічных лясоў Амазонкі, ці за прыняцце мер супраць змянення клімату?

І тым не менш, як бы мы ні вырашылі называць гэтыя правы, ёсць агульнае меркаванне, што гэта сфера патрабуе далейшых даследаванняў і дадатковай увагі з боку міжнароднай супольнасці. Некаторыя калектыўныя правы ўжо прызнаны, у прыватнасці ў Афрыканскай хартыі правоў чалавека і народаў і ў Дэкларацыі аб правах карэнных народаў. Сама Ўсеагульная дэкларацыя правоў чалавека ўключае права народаў на самавызначэнне, а права чалавека на развіццё было сфармулявана ў Дэкларацыі Генеральнай Асамблеі ААН 1986 года.

Права на развіццё з'яўляецца неад'емным правам чалавека, у сілу якога кожны чалавек і ўсе народы маюць права ўдзельнічаць у такім эканамічным, сацыяльным, культурным і палітычным развіцці, пры якім могуць быць цалкам рэалізаваны ўсе правы чалавека і асноўныя свабоды, а таксама садзейнічаць яму і карыстацца яго выгадамі. Артыкул 1, Дэкларацыя ААН аб праве на развіццё.

## *Ці ёсць правы больш і менш важныя?*

Розныя віды правоў больш шчыльна звязаны паміж сабой, чым можна падумаць, мяркуючы па іх назвах.

У сілу розных прычын, як ідэалагічных, так і палітычных, сацыяльныя і эканамічныя правы з цяжкасцю прабівалі сабе дарогу да прызнання на адным узроўні з грамадзянскімі і палітычнымі правамі. Калі для звычайнага чалавека з'яўляецца відавочным, што мінімальны ўзровень жыцця, жыллё і прымальныя ўмовы працы аднолькава важны для чалавечай годнасці, то палітычныя дзеячы не заўсёды гатовы прызнаць гэта. Адна з прычын гэтага, несумненна, у тым, што забеспячэнне асноўных сацыяльных і эканамічных правоў кожнага чалавека ў свеце запатрабавала б грандыёзнага пераразмеркавання рэсурсаў. А палітыкі добра ведаюць, што гэта не тая палітыка, за якую галасуюць.

Таму такія палітыкі заяўляюць, што правы другога пакалення адрозніваюцца ад першага пакалення – грамадзянскіх і палітычных правоў. Першае сцвярджэнне, якое часта сустракаецца, грунтуецца на тым, што сацыяльныя і эканамічныя правы нерэалістычныя, што яны застануцца неажыццяўляльнымі, па меншай меры ў бліжэйшай перспектыве, і што мы павінны рухацца да іх толькі паступова. Такі падыход быў прыняты і ў Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах: урады павінны толькі прадэманстраваць, што яны прымаюць меры да таго, каб гэтыя мэты былі дасягнуты калісьці ў будучыні. Гэты пастулат, вядома ж, не бясспрэчны, і, як уяўляецца, ён больш грунтуецца на палітычных меркаваннях, чым на чым-небудзь іншым. Многія незалежныя даследаванні паказваюць, што ў свеце дастаткова рэсурсаў і сродкаў, каб сумеснымі намаганнямі – калі яны будуць зроблены – забяспечыць задавальненне асноўных патрэб кожнага чалавека.

Другое зацвярджэнне складаецца ў тым, што паміж правамі першага і другога пакаленняў існуе прынцыповае тэарэтычнае адрозненне: першы тып правоў патрабуе ад урадаў толькі ўстрымання ад вызначаных дзеянняў (гэта так званыя «негатыўныя» правы); у той час як другі тып патрабуе ад урадаў станоўчага ўмяшання (гэта «пазітыўныя» правы). Згодна з гэтым аргументам, чакаць ад урадаў пазітыўных мер, напрыклад для забеспячэння ўсіх харчаваннем, не рэалістычна, таму яны і не абавязаны прадпрымаць што-небудзь у гэтай сферы. А без абавязацельстваў з таго ці іншага боку наогул ніякага права ў агульнапрынятым сэнсе гэтага слова быць не можа.

Аднак у гэтай логіцы мае месца няправільнае разуменне двух асноўных момантаў.

Па-першае, грамадзянскія і палітычныя правы ні ў якім разе не з'яўляюцца чыста негатыўнымі. Напрыклад, для таго, каб урад гарантаваў свабоду ад катаванняў, недастаткова, каб самі службовыя асобы ўрада ўстрымаліся ад катавання людзей! Сапраўдная свабода ад катаванняў патрабуе стварэння складанай сістэмы праверак і кантролю: сістэм абароны парадку, юрыдычных механізмаў, свабоды інфармацыі і доступу ў месцы пазбаўлення волі і многага іншага. Тое ж самае датычыцца забеспячэння права голасу і ўсіх астатніх грамадзянскіх і палітычных правоў. Іншымі словамі, акрамя ўстрымання ад негатыўных дзеянняў гэтыя правы патрабуюць ад урадаў пазітыўных крокаў.

Па-другое, сацыяльныя і эканамічныя правы (дакладна гэтак жа, як грамадзянскія і палітычныя) таксама патрабуюць, каб урады ўстрымліваліся ад некаторых дзеянняў: напрыклад ад забеспячэння кампаній вялікімі падатковымі ільготамі, ад стымулявання развіцця ў тых рэгіёнах, якія і без таго ўжо адносна прасунутыя, або ад увядзення гандлёвых тарыфаў, ад якіх пакутуюць краіны, якія развіваюцца, і г. д.

*Якія пазітыўныя дзеянні трэба распачаць ураду, каб забяспечыць свабодныя і справядлівыя выбары?*

У рэчаіснасці розныя віды правоў значна цясней звязаны паміж сабой, чым можна падумаць, мяркуючы па іх назвах. Эканамічныя правы зліваюцца з палітычнымі; грамадзянскія часта нельга адрозніць ад сацыяльных. Назвы правоў карысны для складання агульнай карціны, але яны могуць і ўводзіць у зман. Многія правы могуць падпадаць пад любую катэгорыю, а рэалізацыя правоў з адной катэгорыі можа залежаць ад таго, як ажыццяўляюцца правы з іншай катэгорыі.

У гэтай сувязі дарэчы ўспомніць, як гэта разуменне зафіксавана ў Венскай дэкларацыі і ў Праграме дзеянняў 1993 года, дзе ў параграфе 5 прызнана, што:

Усе правы чалавека ўніверсальныя, непадзельныя, узаемазалежныя і ўзаемазвязаныя. Міжнародная супольнасць павінна ставіцца да правоў чалавека глабальна, на справядлівай і роўнай аснове, з аднолькавым падыходам і роўнай увагай.

### *Іншыя аргументы наконт «асноўных» і «іншых» правоў*

Класіфікацыя правоў па «пакаленнях» – гэта не толькі імкненне размежаваць правы ў кантэксце іх распаўсюджвання. Ва ўмовах надзвычайнага становішча некаторыя правы могуць быць часткова адменены, а іншыя не могуць. Агульна прызнана, што некаторыя правы з'яўляюцца jus cogens, гэта значыць прынятымі міжнароднай супольнасцю дзяржаў у якасці нормаў, ад якіх ні ў якім разе нельга адступаць: напрыклад забарона генацыду, рабства і сістэматычнай расавай дыскрымінацыі. Некаторыя правы з'яўляюцца «абсалютнымі» ў тым сэнсе, што яны не могуць быць адменены або абмежаваны ў сваім праяўленні, – напрыклад забарона катаванняў. «Мінімальныя асноўныя» абавязацельствы прывязаны да пэўных эканамічных і сацыяльных правоў – такіх, як права на першасную медыцынскую дапамогу, на прытулак і адукацыю. Можна таксама пачуць меркаванне, што калектыўныя правы з'яўляюцца «асноўнымі», паколькі яны ствараюць ахоўную сістэму, унутры якой затым рэалізуюцца індывідуальныя правы. У гэтай тэме няма выразнага кансэнсусу або адзінай тэорыі, і большасць назіральнікаў асабліва падкрэсліваюць важнасць універсальнасці, непадзельнасці і ўзаемазалежнасці правоў.

Аднак, незалежна ад распаўсюджвання правоў, развіццё навукі часам выклікае неабходнасць прыстасаваць нормы правоў чалавека да новых умоў. Гэта пытанне будзе разгледжана ніжэй.

# Навука наступае

Яшчэ адной вобласцю, дзе новыя правы атрымліваюць прызнанне, з'яўляецца ахова здароўя і медыцына. Новыя навуковыя адкрыцці, у прыватнасці ў галіне геннай інжынерыі і перасадкі органаў і тканак, выявілі мноства пытанняў, звязаных з этыкай і правамі чалавека. У выніку навукова-тэхнічнага прагрэсу ў гэтых сферах прыйшлося задацца пытаннямі аб самой прыродзе жыцця.

Савет Еўропы адказаў на гэты выклік часу прыняццем новага міжнароднага пагаднення – Канвенцыі аб абароне правоў чалавека і чалавечай годнасці ў сувязі з прымяненнем дасягненняў біялогіі і медыцыны (далей называецца «Канвенцыяй Аўеда»), 1999 год. Гэта канвенцыя была падпісана трыццаццю і ратыфікавана дзесяццю дзяржавамі – удзельніцамі Савета Еўропы. Яна змяшчае рэкамендацыі па шэрагу праблематычных пытанняў, закранутых у папярэднім раздзеле.

COMPASS

**Як права на самавызначэнне, так і права на развіццё ... абодва яны з'яўляюцца індывідуальнымі і калектыўнымі правамі.**

*Чыдзі Ансэльм Адынкал*

**Кожны чалавек мае права […] удзельнічаць у навуковым прагрэсе і карыстацца яго дабротамі.**

*Артыкул 27, УДПЧ*

Канвенцыя Савета Еўропы ў Аўеда

Кароткі змест найбольш актуальных артыкулаў:

• Любая форма дыскрымінацыі ў дачыненні да асобы па прыкмеце яе генетычнай спадчыны забараняецца.

• Прагнастычнае генетычнае тэсціраванне можа ажыццяўляцца толькі ў медыцынскіх мэтах, а не для таго, каб, напрыклад, прадвызначыць фізічныя ўласцівасці, якія разаўюцца ў дзіцяці ў далейшым жыцці.

• Умяшанне ў геном чалавека, накіраванае на яго мадыфікацыю, можа быць здзейснена толькі ў прафілактычных, дыягнастычных або тэрапеўтычных мэтах.

• Не дапускаецца выкарыстанне дапаможных медыцынскіх тэхналогій дзетараджэння ў мэтах выбару полу будучага дзіцяці.

• Адабранне ў жывога донара органаў ці тканак для іх трансплантацыі можа ажыццяўляцца выключна з мэтай лячэння рэцыпіента (артыкул 21 – «Забарона на атрыманне фінансавай выгады»)

**Любое ўмяшанне з мэтай стварэння чалавека, генетычна ідэнтычнага іншаму чалавеку, жывому або мёртваму, забараняецца.**

*Дадатковы пратакол да Канвенцыі аб абароне правоў чалавека і чалавечай годнасці, Парыж, 1998 г.*

Генная інжынерыя ўяўляе сабой метад свядомага змянення ўнаследаваных уласцівасцей арганізма шляхам унясення змен у яго генетычны матэрыял. Прагрэс у гэтай галіне выклікаў бурныя спрэчкі па шэрагу розных пытанняў, звязаных з этычнымі нормамі і правамі чалавека. Напрыклад, ці можна дазволіць змяненне клетак зародка, калі гэта прывядзе да пастаянных генетычных змен ва ўсім арганізме і ў наступных пакаленнях? Ці можна дазволіць кланіраванне чалавечага арганізма з асобнага гена, калі гэта дазволена рабіць з мышамі і авечкамі?

## *Ці павінны існаваць абмежаванні ў сферы навуковых даследаванняў?*

Развіццё біямедыцынскіх тэхналогій таксама зрабіла магчымай перасадку дарослых і эмбрыянальных органаў ці тканак з аднаго арганізма ў іншы. Падобнаireннай інжынерыі, гэты кірунак медыцыны тоіць у сабе велізарны патэнцыял для паляпшэння якасці жыцця некаторых людзей і нават выратавання людзей ад смерці. Але задумайцеся над некаторымі спрэчнымі пытаннямі, якія ўзніклі з прычыны прагрэсу:

• Калі можна выратаваць ці палепшыць чыёсьці жыццё, выкарыстоўваючы орган нябожчыка, ці заўсёды трэба спрабаваць гэта зрабіць? Ці целы памерлых людзей таксама заслугоўваюць павагі?

• Як можам мы гарантаваць, што ва ўсіх, хто мае патрэбу, будуць роўныя магчымасці атрымання органаў для перасадкі, калі колькасць апошніх абмежавана?

• Ці павінны існаваць законы, якія рэгулююць захаванне органаў і тканак?

• Ці існуе падыход да праблемы генетычна мадыфікаванай ежы і кармоў (ГМА), заснаваны на правах чалавека? Калі так, то ў чым ён заключаецца?

# 4.3 Юрыдычная абарона правоў чалавека

Мы ўжо ведаем, што правы чалавека – гэта неад'емныя правы, якімі валодае кожны чалавек. Але як нам скарыстацца гэтымі правамі? Дзе знайсці пацвярджэнне таго, што яны афіцыйна прызнаны дзяржавамі? І як гэтыя правы рэалізуюцца?

## Правы чалавека ў кожнай краіне

Бясспрэчна, абарона правоў чалавека і іх разуменне залежаць, перш за ўсё, ад узроўню дасягненняў краіны і механізмаў, якія існуюць на нацыянальным узроўні. Законы, палітычныя рашэнні, працэсуальныя нормы і механізмы на нацыянальным узроўні з'яўляюцца ключавымі фактарамі для рэалізацыі правоў чалавека ў кожнай краіне. Таму важна, каб правы чалавека сталі часткай нацыянальных канстытуцыйных і прававых сістэм, каб прафесійныя юрысты ўмелі ўжываць на практыцы стандарты правоў чалавека, а парушэнні правоў чалавека падвяргаліся асуджэнню і санкцыям. Нацыянальныя стандарты маюць больш прамое ўздзеянне, а нацыянальныя працэсуальныя нормы больш даступны ў параўнанні з рэгіянальнымі і міжнароднымі. Як сказала Элеанора Рузвельт:

У канчатковым выніку, абарона правоў чалавека ажыццяўляецца, перш за ўсё, з дапамогай механізмаў на нацыянальным узроўні

Дзе, у рэшце рэшт, пачынаюцца ўсеагульныя правы чалавека? У невялікіх населеных пунктах, недалёка ад дома – такіх блізкіх і такіх маленькіх, што іх не відаць на ніводнай карце свету. Але для асобнага чалавека яны складаюць цэлы свет: гэта квартал, дзе ён жыве; школа ці каледж, які ён наведвае; фабрыка, ферма або офіс, дзе ён працуе. Гэта месца, дзе кожны мужчына, кожная жанчына і кожнае дзіця шукае справядлівасці, роўных магчымасцей, аднолькавай павагі да годнасці без дыскрымінацыі. І ўжо калі тут гэтыя правы нічога не значаць, то наўрад ці яны нешта значаць дзе-небудзь яшчэ.[2]

Таму абавязак дзяржавы выконваць, прасоўваць, абараняць і ажыццяўляць правы з'яўляецца першарадным, а роля рэгіянальных і міжнародных судоў – другасная, паколькі яны ўступаюць у гульню ў асноўным тады, калі дзяржава мэтанакіравана ці паслядоўна парушае правы чалавека. Нам усім вядомы прыклады таго, як людзям прыходзілася звяртацца ў рэгіянальныя і міжнародныя арганізацыі, каб тыя канстатавалі парушэнне правоў на нацыянальным узроўні. Заклапочанасць або садзейнічанне з боку рэгіянальнай ці міжнароднай супольнасці могуць дапамагчы аднавіць захаванне правоў у дадзенай краіне, але гэта робіцца толькі тады, калі ўсе ўнутраныя меры абароны там ужо былі выкарыстаны і вычарпаны. Таму мы прысвецім астатнюю частку гэтага раздзела менавіта такому сцэнарыю. Што рабіць, калі ўлады асобна ўзятай краіны не забяспечылі належную абарону правоў чалавека?

*Як вы думаеце, чаму нават тыя дзяржавы, у якіх дрэнна забяспечаны правы чалавека, гатовы падпісваць міжнародныя пагадненні па правах чалавека?*

# Правы чалавека прызнаны ў пагадненнях

**Усякая душа – заложніца сваіх дзеянняў.**

*Каран*

Калі гаварыць аб міжнародным узроўні, дзяржавы збіраюцца на міжнародныя сустрэчы і распрацоўваюць пагадненні, прадметам якіх з'яўляюцца правы чалавека. Гэтыя пагадненні ўстанаўліваюць для дзяржаў аб'ектыўныя стандарты паводзін, якія накладваюць на іх пэўныя абавязкі ў адносінах да грамадзян. Пагадненні могуць быць двух відаў: юрыдычна абавязковыя і неабавязковыя.

Абавязковы дакумент, часта званы «дагаворам», «канвенцыяй» або «пактам», уяўляе сабой добраахвотнае абавязацельства дзяржавы забяспечваць захаванне правоў чалавека на нацыянальным узроўні. Кожная асобная дзяржава заяўляе аб сваёй прыхільнасці да прыняцця гэтых стандартаў, ратыфікуючы іх ці далучаючыся да дакумента (простае падпісанне дакумента не робіць яго абавязковым для выканання, але сведчыць пра жаданне садзейнічаць гэтаму). У адпаведнасці з Венскай канвенцыяй аб праве міжнародных дагавораў ад 1979 года, дзяржавы маюць права рабіць агаворкі або заявы, тым самым вызваляючы сябе ад некаторых абавязацельстваў па дакуменце, але мэта складаецца ў тым, каб як мага больш дзяржаў паставілі свой подпіс пад дакументам. У рэшце рэшт, лепш, калі дзяржава паабяцае выконваць хоць нейкія правы чалавека, чым увогуле ніякія! Праўда, гэты механізм можа станавіцца крыніцай злоўжыванняў і даваць дзяржавам падставу адмаўляць сваім грамадзянам у асноўных правах, дазваляючы пры гэтым «пазбягаць» міжнароднага кантролю ў тых ці іншых галінах.

Правы чалавека «пранізваюць» законы на нацыянальным узроўні. Міжнародныя нормы правоў чалавека натхнілі краіны ўвесці такія стандарты ў свае канстытуцыі і заканадаўства. Яны таксама забяспечваюць механізмамі кампенсацыі за парушэнне правоў чалавека на нацыянальным узроўні.

У адрозненне ад абавязковых дакументаў неабавязковыя – гэта, у асноўным, проста заявы ці палітычныя пагадненні дзяржаў, дзе абяцаецца прыкласці ўсе намаганні, каб забяспечыць захаванне тых ці іншых правоў, але без якіх-небудзь юрыдычных абавязацельстваў. На практыцы гэта звычайна азначае адсутнасць нейкага афіцыйнага (або юрыдычнага) механізму рэалізацыі, нават пры наяўнасці сур'ёзных палітычных абавязацельстваў па яго распрацоўцы.

*У чым сэнс простага «абяцання» выконваць стандарты правоў чалавека, калі яно не падмацавана прававымі механізмамі? Ці гэта лепш, чым нічога?*

**Закон не можа змяніць сэрца, але ён утаймоўвае бессардэчных людзей.**

*Марцін Лютэр Кінг*

Пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН або канферэнцыі ААН па канкрэтных пытаннях часта прыводзяць да прыняцця дэкларацыі ААН або якога-небудзь неабавязковага для выканання дакумента, таксама званага «мяккім правам». Лічыцца, што ўсе дзяржавы, проста ў сілу іх членства ў ААН або ў сілу іх удзелу ў канферэнцыі, згодны з прынятай дэкларацыяй. На нацыянальным узроўні прызнанне правоў чалавека таксама павінна быць вынікам згоды паміж дзяржавай і яе народам. Калі правы чалавека прызнаюцца на нацыянальным узроўні, яны становяцца, перш за ўсё, палітычным абавязацельствам дзяржавы перад сваім народам.

# Асноўныя міжнародныя дакументы

Сам факт з'яўлення новых пагадненняў аб абароне правоў чалавека сведчыць аб росце разумення важнасці правоў чалавека. Гэта перамога не толькі абаронцаў правоў чалавека, але ўсіх людзей наогул. Следствам гэтых поспехаў стала распрацоўка вялікага і складанага зводу дакументаў па правах чалавека, а таксама працэдур іх рэалізацыі.

Звычайна пагадненні па правах чалавека падраздзяляюць на тры асноўныя катэгорыі: па іх геаграфічным ахопе (рэгіянальныя або ўніверсальныя), па катэгорыі правоў, якія ў іх прадугледжваюцца, або, дзе гэта актуальна, па катэгорыі асоб ці груп асоб, на якіх распаўсюджваецца абарона правоў чалавека.

Толькі ў рамках ААН існуе больш за сотню дакументаў, якія адносяцца да правоў чалавека, і калі мы да іх дададзім дакументы, прынятыя на розных рэгіянальных узроўнях, лічба будзе яшчэ больш значнай. Мы не можам разгледзець тут усе гэтыя дакументы, таму ў дадзеным раздзеле мы звернемся толькі да некаторых з іх, найбольш важных для мэт адукацыі ў галіне правоў чалавека, якія заяўлены ў *«Компасе»*:

• дакументы, якія былі шырока прызнаны і заклалі аснову для развіцця іншых пагадненняў па правах чалавека, у прыватнасці Міжнародны біль аб правах чалавека (інфармацыя па больш канкрэтных дакументах, такіх як Канвенцыя аб статусе бежанцаў, Канвенцыя аб генацыдзе, і дакументах, што тычацца міжнароднага гуманітарнага права, прадстаўлена ў тэматычных раздзелах главы 5 на сайце www.coe.int/compass.);

• дакументы, якія адносяцца да канкрэтных пытанняў або бенефіцыяраў правоў чалавека, пра якія ідзе гаворка ў дадзеным дапаможніку;

• асноўныя еўрапейскія дакументы.

## *Пагадненні ААН*

Найбольш важным універсальным пагадненнем па правах чалавека з'яўляецца Ўсеагульная дэкларацыя правоў чалавека, прынятая ў 1948 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН. Яна атрымала настолькі шырокае прызнанне, што яе першапачаткова неабавязковы характар змяніўся, і цяпер на яе часта спасылаюцца як на юрыдычна абавязковы дакумент звычайнага міжнароднага права. Гэты дакумент па правах чалавека стаў пробным каменем у гэтай сферы і натхніў сусветную супольнасць на прыняцце дзясяткаў іншых міжнародных і рэгіянальных пагадненняў, сотняў нацыянальных канстытуцый і іншых заканадаўчых актаў.

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека з'яўляецца найважнейшым з усіх дакументаў па правах чалавека.

УДПЧ складаецца з прэамбулы і 30 артыкулаў, у якіх выкладзены правы чалавека і асноўныя свабоды, на якія маюць права ўсе мужчыны і жанчыны ў свеце, не падвяргаючыся ніякай дыскрымінацыі. Яна ахоплівае як грамадзянскія і палітычныя правы, так і сацыяльныя, эканамічныя і культурныя правы:

• права на роўнасць;
• свабода ад дыскрымінацыі;
• права на жыццё, свабоду і асабістую бяспеку;
• свабода ад рабства;
• свабода ад катаванняў і зневажальнага абыходжання;
• права на прызнанне правасуб’ектнасці асобы;
• права на роўнасць перад законам;
• права на прававую абарону з боку кампетэнтнага судовага органа;
• свабода ад самавольнага арышту і выгнання;
• права на справядлівае публічнае судовае разбіральніцтва;
• права лічыцца невінаватым, пакуль віна не даказана;

• свабода ад умяшання ў асабістае жыццё, сям'ю, жыллё і перапіску;
• права на свабоднае перамяшчэнне ў краіне і за яе межы;
• права на прытулак у іншых краінах ад праследавання;
• права на грамадзянства і свабоду мяняць яго;
• права на ўступленне ў шлюб і стварэнне сям'і;
• права мець асабістую ўласнасць;
• свабода рэлігіі і перакананняў;
• свабода думкі і інфармацыі;
• права на ўдзел у мірных сходах і асацыяцыях;
• права на ўдзел у кіраванні краінай і ў свабодных выбарах;
• права на сацыяльнае страхаванне;
• права мець жаданую працу і права ўступаць у прафсаюзы;
• права на адпачынак і вольны час;
• права на годны ўзровень жыцця;
• права на адукацыю;
• права на ўдзел у культурным жыцці грамадства;
• права на сацыяльны парадак у адпаведнасці з патрабаваннямі УДПЧ.

У дэкларацыі таксама асабліва падкрэсліваецца, што менавіта на грамадскасць і саміх грамадзян ускладаецца абавязак забяспечваць свабоднае і поўнае развіццё, а таксама захаванне правоў і свабод іншых людзей. Аналагічным чынам, асобныя людзі і дзяржавы не могуць спасылацца на прапісаныя ў дэкларацыі правы пры парушэнні правоў чалавека.

Міжнародны біль аб правах чалавека

**Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах** (МПГПП) і **Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах** (МПЭСКП) увайшлі ў сілу ў 1976 годзе і з'яўляюцца асноўнымі юрыдычна абавязковымі пагадненнямі, якія ўжываюцца ва ўсім свеце. Абодва пакты былі распрацаваны з мэтай пашырыць правы, выкладзеныя ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, і надаць ім юрыдычную сілу (у рамках дагавора). Разам з Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека і яе адпаведнымі факультатыўнымі пратаколамі гэтыя пакты складаюць Міжнародны біль аб правах. Кожны з пактаў, як вынікае з іх назваў, адносіцца да розных катэгорый правоў, хоць яны абодва падзяляюць занепакоенасць, напрыклад, па пытанні дыскрымінацыі. Абодва дакументы знайшлі шырокае прызнанне: так, па стане на лістапад 2010 года, МПГПП быў ратыфікаваны 166 краінамі, а МПЭСКП – 160 краінамі.

Услед за Міжнародным білем аб правах ААН прыняла яшчэ сем дагавораў, у якіх гаворка ідзе аб асаблівых правах або асаблівых «бенефіцыярах» гэтых правоў. У аснове ідэі асаблівых правоў і іх бенефіцыяраў – напрыклад, правоў дзіцяці – ляжаў той факт, што, нягледзячы на дастасавальнасць усіх правоў чалавека ў дачыненні да дзяцей і маладых людзей, дзеці не маюць роўнага доступу да гэтых агульных правоў, таму яны маюць патрэбу ў асаблівай дадатковай абароне.

**Канвенцыя аб правах дзіцяці** (1989 г.) прызнае, што правы чалавека распаўсюджваюцца таксама і на дзяцей і што людзі, якія не дасягнулі ўзросту 18 гадоў, маюць патрэбу ў асаблівай абароне з мэтай забяспечыць іх усебаковае развіццё, выжыванне і павагу іх асаблівых інтарэсаў.

**Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі** (1965 г.) забараняе і асуджае расавую дыскрымінацыю і патрабуе, каб дзяржавы-ўдзельніцы прынялі меры для яе канчатковага выкаранення, выкарыстоўваючы для гэтага ўсе належныя сродкі, уключаючы меры, якія прымаюцца дзяржаўнымі органамі ці іншымі.

**Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын** (CEDAW, 1979 г.) прысвечана дыскрымінацыі, якой часта сістэматычна падвяргаюцца жанчыны і прычынай якой з'яўляюцца «адрозненне, выключэнне або абмежаванне па прыкмеце полу, якое накіравана на паслабленне ці ануляванне прызнання, карыстання або ажыццяўлення жанчынамі [...] у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, культурнай, грамадзянскай ці любой іншай вобласці» (артыкул 1). Дзяржавы абавязваюцца асуджаць такую дыскрымінацыю і прымаць неадкладныя меры для забеспячэння роўнасці.

**Канвенцыя супраць катаванняў і іншых формаў жорсткага, бесчалавечнага або зневажальнага абыходжання** (1984 г.) вызначае катаванне як «прычыненне моцнага болю ці пакут, фізічных або маральных» (артыкул 1.1) з намерам атрымаць звесткі, у якасці пакарання або прымусу ці на глебе дыскрымінацыі. Гэты дакумент абавязвае дзяржавы-ўдзельніцы прымаць эфектыўныя меры для прадухілення катаванняў на тэрыторыі іх юрысдыкцыі і забараняе высылаць людзей на іх радзіму, калі ёсць прычына меркаваць, што там яны будуць падвергнуты катаванням.

**Канвенцыя аб абароне правоў працаўнікоў-мігрантаў і членаў іх сем'яў** (1990 г.) да паняцця «працаўнік-мігрант» адносіць «асобу, якая будзе займацца, займаецца або займалася дзейнасцю, якая аплачваецца, у дзяржаве, грамадзянінам(-кай) якой ён ці яна не з'яўляецца» (артыкул 2.1), а таксама членаў яго (яе) сям'і. Апрача акрэслівання агульных правоў чалавека, якімі павінны карыстацца гэтыя людзі, канвенцыя ўдакладняе, што ні ў дакументальным або юрыдычным плане, ні ў рэальным жыцці нельга дапускаць дыскрымінацыю ў дачыненні да карыстання правамі чалавека, напрыклад правам на свабоду і бяспеку і на абарону ад гвалту ці пазбаўлення волі.

**Канвенцыя аб правах людзей з інваліднасцю** (2006 г.) адзначыла не толькі істотны зрух у вызначэнні таго, што такое людзі з інваліднасцю, але і спрыяла іх прызнанню ў якасці суб'ектаў, якія карыстаюцца, у поўнай ступені і нароўні з усімі, правамі чалавека і асноўнымі свабодамі. Канвенцыя тлумачыць парадак прымянення правоў у дачыненні да гэтых людзей і абавязвае дзяржавы-ўдзельніцы прымаць разумныя меры для таго, каб людзі з абмежаванымі магчымасцямі маглі эфектыўна карыстацца сваімі правамі, напрыклад забяспечыць ім доступ да сацыяльных паслуг і культурнага жыцця.

**Канвенцыя супраць гвалтоўнага знікнення людзей** (2006 г.) разглядае феномен, які стаў глабальнай праблемай. Канвенцыя забараняе «арышт, затрыманне, выкраданне або пазбаўленне волі ў любой іншай форме» (артыкул 2), няхай нават гэта будзе прадстаўнікамі дзяржавы ці іншымі асобамі, якія дзейнічаюць са згоды дзяржаў, і не прызнае ніякіх асаблівых абставін, якія могуць паслужыць падставай для адмовы ў прызнанні факта пазбаўлення волі і ўтойвання інфармацыі пра лёс і месцазнаходжанне зніклай асобы. Мэта дакумента – пакласці канец гэтым цынічным выкрутам і спробам сур'ёзна і беспакарана парушаць правы чалавека.

| *Асноўныя дагаворы ААН па правах чалавека* | | |
|---|---|---|
| ***Назва дакумента*** | ***Наглядная арганізацыя*** | ***Факультатыўныя пратаколы*** |
| **Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі** (1965 г.) | Камітэт па ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі | |
| **Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах** (1966 г.) | Камітэт па правах чалавека | Першы факультатыўны пратакол аб парадку падачы індывідуальных скаргаў<br>Другі факультатыўны пратакол, нацэлены на адмену смяротнага пакарання |
| **Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах** (1966 г.) | Камітэт па эканамічных, сацыяльных і культурных правах | Факультатыўны пратакол аб прызнанні кампетэнтнасці камітэта для разгляду прашэнняў, пададзеных асобнымі людзьмі ці групамі асоб (2008 г.) |
| **Канвенцыя аб правах дзіцяці** (1989 г.) | Камітэт па правах дзіцяці | Факультатыўны пратакол аб удзеле дзяцей ва ўзброеных канфліктах (2000 г.)<br>Факультатыўны пратакол аб гандлі дзецьмі, дзіцячай прастытуцыі і дзіцячай парнаграфіі (2000 г.) |
| **Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын** (1979 г.) | Камітэт па ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын | Факультатыўны пратакол аб праве падачы індывідуальных скаргаў |
| **Канвенцыя супраць катаванняў і іншых формаў жорсткага, бесчалавечнага або зневажальнага абыходжання** (1984 г.) | Камітэт супраць катаванняў і іншых формаў жорсткага, бесчалавечнага або зневажальнага абыходжання | Факультатыўны пратакол аб стварэнні сістэмы рэгулярнага нагляду з боку незалежных міжнародных і нацыянальных арганізацый – пад эгідай падкамітэта па прадухіленні катаванняў (2002 г.) |
| **Канвенцыя аб абароне правоў працаўнікоў-мігрантаў і членаў іх сем'яў** (1990 г.) | Камітэт аб абароне правоў працаўнікоў-мігрантаў і членаў іх сем'яў | |
| **Канвенцыя аб правах людзей з інваліднасцю** (2006 г.) | Камітэт аб правах людзей з абмежаванымі магчымасцямі | Факультатыўны пратакол, які дазваляе асобным людзям і групам асоб падаваць петыцыі ў камітэт |
| **Канвенцыя супраць гвалтоўнага знікнення людзей** (2006 г.) | Камітэт супраць гвалтоўнага знікнення людзей | |

## *Абарона пэўных груп на ўзроўні ААН і на еўрапейскім узроўні*

Нароўні з прызнаннем асноўных правоў асобы, у некаторых дакументах па правах чалавека прызнаюцца таксама правы пэўных груп людзей. Такія асаблівыя меры абароны прыняты з-за мінулых выпадкаў дыскрымінацыі, накіраванай на гэтыя групы людзей, і з-за іх неабароненага і ўразлівага становішча ў грамадстве. Даць гэтым групам асаблівую абарону не значыць даць ім нейкія новыя правы чалавека; тут гаворка ідзе, хутчэй, пра тое, каб зрабіць замацаваныя ва УДПЧ правы даступнымі для ўсіх. Таму было б няправільна меркаваць, што прадстаўнікі меншасцей маюць больш правоў, чым большасць насельніцтва; і калі ў меншасцей і ёсць асаблівыя правы, то яны закліканы проста гарантаваць ім роўны доступ да ажыццяўлення іх грамадзянскіх, палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў. Далей ідуць прыклады груп, якія карыстаюцца асаблівай абаронай:

**Дзяржавы павінны ахоўваць самі меншасці і іх нацыянальную ці этнічную, культурную, рэлігійную або моўную самабытнасць на сваіх адпаведных тэрыторыях, а таксама ствараць умовы для прасоўвання такой самабытнасці.**
*Дэкларацыя ААН аб правах меншасцей*

## Меншасці

У міжнародных дакументах па правах чалавека не дадзена дакладнага вызначэння паняцця «меншасць», але ў іх меншасці звычайна апісваюцца як групы, што характарызуюцца нацыянальнай ці этнічнай, рэлігійнай або моўнай самабытнасцю, якая адрознівае іх ад большасці насельніцтва і якую яны хочуць захаваць. Меншасці і іх правы абаронены:

• на ўзроўні ААН – артыкулам 27 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, а таксама Дэкларацыяй аб правах асоб, якія належаць да нацыянальных або этнічных, рэлігійных і моўных меншасцей, прынятай у 1992 годзе;

• на еўрапейскім узроўні – абавязковым дакументам: Рамачнай канвенцыяй аб абароне нацыянальных меншасцей, якая прадугледжвае стварэнне кантрольнага органа, які складаецца з незалежных экспертаў – Кансультатыўнага камітэта па гэтай рамачнай канвенцыі. Іншыя падраздзяленні Савета Еўропы таксама маюць інструменты абароны правоў меншасцей: гэта Еўрапейская хартыя рэгіянальных моў або моў меншасцей, Еўрапейская камісія па барацьбе з расізмам і нецярпімасцю, а таксама Камісар па правах чалавека. Усе яны іграюць важную ролю;

• наяўнасцю ў рамках Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) спецыяльнай пасады Вярхоўнага камісара па справах нацыянальных меншасцей і адпаведнымі дакументамі АБСЕ.

## Дзеці

На ўзроўні ААН асноўную абарону дзецям забяспечвае Канвенцыя аб правах дзіцяці 1989 года – дакумент, які сабраў больш за ўсё ратыфікацый у свеце (яго не ратыфікавалі толькі ЗША і Самалі). Канвенцыя змяшчае чатыры асноўныя прынцыпы: абарона ад дыскрымінацыі; абавязацельства найлепшага забеспячэння інтарэсаў дзіцяці; яго права на жыццё, выжыванне і развіццё; а таксама павага поглядаў дзіцяці.

**Дзіцём з'яўляецца кожная чалавечая істота да дасягнення ёй 18-гадовага ўзросту, калі па законе, прымянімым да дадзенага дзіцяці, яно не дасягае паўналецця раней.**

*Канвенцыя ААН аб правах дзіцяці*

У Афрыцы асноўныя правы дзяцей, з улікам выключнасці сітуацыі на кантыненце, вызначае Афрыканская хартыя па правах і дабрабыце дзіцяці. Гэты дакумент увайшоў у сілу ў 1999 годзе. Арганізацыяй ісламскай канферэнцыі ў 2004 годзе быў прыняты Пакт аб правах дзіцяці ў ісламскіх краінах. У красавіку 2010 года была заснавана Камісія па прасоўванні і абароне правоў жанчын і дзяцей у рэгіёне Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (ASEAN).

1 ліпеня 2010 года ўвайшла ў сілу Канвенцыя Савета Еўропы аб абароне дзяцей ад сексуальнай эксплуатацыі і сексуальнага гвалту. Гэта канвенцыя стала першым дакументам, у якім пералічаны ўсе формы сексуальнага гвалту ў адносінах да дзяцей, якія кваліфікуюцца як крымінальныя злачынствы, у тым ліку тыя, што здзяйсняюцца дома ці ў сям'і.

## Бежанцы

Правы бежанцаў асабліва гарантуюцца Канвенцыяй аб статусе бежанцаў 1951 года і Вярхоўным камісарам ААН па справах бежанцаў. Адзіная рэгіянальная сістэма, якая ўключае спецыяльны дакумент аб абароне бежанцаў, існуе ў Афрыцы, дзе ў 1969 годзе была прынята Канвенцыя аб некаторых аспектах праблемы бежанцаў. У Еўропе пэўная дадатковая абарона бежанцаў прадугледжана Еўрапейскай канвенцыяй аб абароне правоў чалавека.

## Жанчыны

Імкнучыся забяспечыць роўнасць мужчын і жанчын па ўсім свеце, у 1979 годзе ААН прыняла Канвенцыю аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын у якасці спецыяльнага дакумента, які абараняе правы жанчын.

У 2009 годзе Савет Еўропы прыняў дэкларацыю пад назвай «Зрабіць гендарную роўнасць рэальнасцю». Гэта дэкларацыя прыйшла на змену папярэдняй, прынятай дваццаць гадоў таму, – Дэкларацыі роўнасці мужчын і жанчын. Мэта дэкларацыі 2009 года – ліквідаваць разрыў паміж фактычнай і юрыдычнай роўнасцю палоў. Яна заклікае дзяржавы – удзельніцы Савета Еўропы ліквідаваць структурныя прычыны няроўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі, забяспечваючы эканамічную незалежнасць і падтрымку жанчынам, выкараняючы сталыя стэрэатыпы і змагаючыся з праявамі пагарджання годнасцю і правамі жанчын. Для гэтага трэба прыняць эфектыўныя меры па прадухіленні гендарнага гвалту, а таксама інтэграваць канцэпцыю роўнасці палоў у адносінах да ўдзелу ў кіраванні.

## Іншыя групы

Такім групам, як людзі з абмежаванымі магчымасцямі, таксама даецца асаблівая абарона, бо яны знаходзяцца ва ўразлівым становішчы, якім лягчэй злоўжываць. Гэта замацавана ў Канвенцыі ААН аб правах людзей з інваліднасцю, і менавіта пра гэтыя правы пойдзе больш падрабязная гаворка ў главе 5 на сайце www.coe.int/compass.

Іншыя групы, напрыклад карэнныя народы, таксама атрымалі асаблівую абарону на міжнародным узроўні, што знайшло выраз у Дэкларацыі ААН 2007 года аб правах карэнных народаў; праўда, яна пакуль не набыла сілу юрыдычна абавязковага дакумента.

*Ці ёсць у вашай супольнасці іншыя групы, якія маюць патрэбу ў асаблівай абароне?*

## *Дакументы рэгіянальнага ўзроўню*

Як мы бачылі вышэй, міжнародныя і рэгіянальныя дакументы ў асноўным прытрымліваюцца адных і тых жа мінімальных стандартаў, але яны могуць і адрозніваецца ў тым, на чым яны акцэнтуюць увагу, ці ў падыходзе да рэгіянальных праблем. Напрыклад, праблема асоб, перамешчаных унутры краіны, спачатку прыцягнула ўвагу ў Афрыканскім рэгіёне і толькі затым выклікала заклапочанасць ААН. Аналагічным чынам, механізм, які рэгламентуе наведванне месцаў утрымання зняволеных з мэтай прадухілення іх катаванняў, першапачаткова быў прыняты на еўрапейскім узроўні, і толькі потым Канвенцыя ААН супраць катаванняў пацвердзіла тыя ж правілы адпаведным факультатыўным пратаколам. Гэтыя прыклады паказваюць, як рэгіянальныя і міжнародныя нормы і механізмы могуць дапамагчы прасоўваць і абараняць правы чалавека.

Практычная перавага рэгіянальных нормаў і сістэм абароны правоў чалавека складаецца ў тым, што яны маюць большыя шанцы на ўлік геаграфічных, гістарычных, палітычных, культурных і сацыяльных асаблівасцей. Яны бліжэй да «дому» і, хутчэй за ўсё, будуць карыстацца большай падтрымкай. Яны бліжэйшыя па духу тым, хто распрацоўвае палітыку і праводзіць яе ў жыццё, а таксама і тым людзям, што пакутуюць ад парушэнняў правоў. Таму мы можам лічыць іх «другім фронтам» у барацьбе за правы чалавека, пры гэтым першым фронтам з'яўляецца нацыянальны ўзровень, другім – рэгіянальны, а трэцім – міжнародны.

У чатырох з пяці рэгёнаў свету ўжо створаны сістэмы абароны правоў чалавека. Задача рэгіянальных дакументаў заключаецца ў тым, каб распрацаваць стандарты ў галіне правоў чалавека і механізмы іх падтрымкі на рэгіянальным узроўні, не прыніжаючы пры гэтым універсальнасць правоў чалавека. Па меры свайго развіцця рэгіянальныя сістэмы, дзякуючы эканамічнаму ўздыму ці па гістарычных і палітычных прычынах, таксама сутыкнуліся з неабходнасцю сфармуляваць рэгіянальныя праваабарончыя абавязацельствы, якія, дарэчы, часта ўмацоўваюць механізмы і гарантыі, што існуюць у сістэме ААН. Сапраўды, ёсць нямала прыкладаў таго, што рэгіянальныя стандарты аказваюцца вышэй за стандарты, узгодненыя на міжнародным узроўні; адзін з такіх прыкладаў – афрыканская сістэма, якая стала першай сістэмай, што прызнала неабходнасць дадатковай абароны, прычым не толькі ў адносінах да бежанцаў, але і для асоб, перамешчаных унутры краіны.

Рэгіянальныя стандарты ў галіне правоў чалавека часта аказваюцца вышэй за стандарты ААН і нават умацоўваюць іх.

У Міжамерыканскім рэгіёне існуе Арганізацыя амерыканскіх дзяржаў, а галоўным абавязковым дакументам з'яўляецца Амерыканская канвенцыя аб правах чалавека 1969 года.

У Афрыцы мы знаходзім Афрыканскую хартыю правоў чалавека і народаў, якая ўвайшла ў сілу ў 1986 годзе ў рамках Афрыканскага саюза (раней вядомага як Арганізацыя афрыканскага адзінства).

На азіяцкім кантыненце да цяперашняга часу не існуе рэальна дзеючай сістэмы, і адзіным рэгіянальным дакументам па правах чалавека з'яўляецца не абавязковая для выканання народная хартыя 1998 года, ініцыяваная грамадзянскай супольнасцю, – Азіяцкая дэкларацыя правоў чалавека.

COMPASS

### *Дакументы еўрапейскага ўзроўню*

У Еўропе існуе добра адладжаная сістэма абароны правоў чалавека, створаная ў рамках Савета Еўропы, а краевугольным каменем гэтай сістэмы з'яўляецца Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і яе інструмент – Еўрапейскі суд па правах чалавека, размешчаны ў Страсбургу.

*Як вы думаеце, чаму розныя рэгіёны палічылі неабходным стварыць уласныя сістэмы абароны правоў чалавека?*

Савет Еўропы, з яго 47 дзяржавамі-ўдзельніцамі, іграе ключавую ролю ў прасоўванні правоў чалавека ў Еўропе. Яго галоўны дакумент па правах чалавека – Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод (вядомая таксама як Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека – ЕКПЧ). Яна прынята ўсімі дзяржавамі – удзельніцамі Савета Еўропы, паколькі яе прыняцце – адно з абавязковых умоў членства ў Савеце. Канвенцыя была прынята ў 1950 годзе, але ўвайшла ў сілу толькі праз тры гады. Яна ахоплівае грамадзянскія і палітычныя правы, і галоўная яе вартасць – гэта механізм рэалізацыі: Еўрапейскі суд па правах чалавека. Еўрапейскім судом і яго юрыдычнай сістэмай захапляюцца ва ўсім свеце, на іх часта спасылаюцца ААН і канстытуцыйныя суды многіх краін, а таксама рэгіянальныя ўстановы.

У Еўропе, як і ў ААН, сацыяльныя і эканамічныя правы разглядаюцца ў асобным дакуменце. Еўрапейская сацыяльная хартыя (перагледжаная) з'яўляецца абавязковым дакументам, які ўключае правы, што гарантуюць еўрапейцам адпаведны ўзровень жыцця. Хартыя падпісана 45 дзяржавамі-ўдзельніцамі і, па стане на 2010 год, ратыфікавана 30 з іх.

Акрамя гэтых двух асноўных дакументаў, у сваёй дзейнасці ў галіне правоў чалавека Савет Еўропы выкарыстоўвае таксама і іншыя спецыяльныя пагадненні і канвенцыі, якія дапаўняюць гарантыі і палажэнні ЕКПЧ, у прыватнасці для разгляду канкрэтных выпадкаў ці для абароны ўразлівых груп насельніцтва. У дадатак да звычайных сістэм маніторынгу існуюць і іншыя незалежныя органы, такія як Еўрапейская камісія па барацьбе з расізмам і нецярпімасцю і Камісар па правах чалавека. У цэлым у сваёй працы па абароне правоў чалавека Савет Еўропы павінен браць пад увагу ўсе навіны ў сацыяльнай сферы, у галіне навукі і тэхналогій, а таксама ўлічваць магчымыя праблемы, якія яны могуць выклікаць у дачыненні да правоў чалавека.

### Развіццё правоў чалавека

У дакументах па правах чалавека адлюстравана наша найноўшае разуменне таго, што сабой уяўляе чалавечая годнасць і што трэба для яе захавання. Але такія дакументы, здаецца, заўсёды спазняюцца на адзін крок, паколькі яны накіраваны на рашэнне ўжо вядомых праблем, а не тых, якія настолькі глыбока «ўраслі» ў наша грамадства, што мы ўсё яшчэ не можам убачыць іх у кантэксце правоў і іх парушэння.

У сваёй заканатворчай рабоце Савет Еўропы імкнецца прапанаваць Камітэту міністраў новыя прававыя нормы, якія адпавядалі б сацыяльным мерам, накіраваным на рашэнне праблем, якія ўзнікаюць у дзяржавах-удзельніцах і ўваходзяць у сферу кампетэнцыі Савета Еўропы. У рамках гэтых мер можа быць прапанавана ўвесці новыя прававыя нормы або адаптаваць ужо існуючыя. Менавіта так эвалюцыянуюць працэсуальныя нормы Еўрапейскага суда па правах чалавека, падтрымліваючы эфектыўнасць яго працы; так былі прыняты палажэнні аб адмене смяротнай кары, і так набылі шырокую вядомасць такія новыя заснаваныя на канвенцыях дакументы, як Канвенцыя аб барацьбе з гандлем людзьмі, прынятая ў 2005 годзе.

У гэтым сэнсе дакументы па правах чалавека заўсёды будуць пастаянна пераглядацца і ўдасканальвацца. Наша разуменне, прэцэдэнтнае права і – самае галоўнае – нашы дзеянні, накіраваныя на абарону правоў чалавека, дапамогуць нам няспынна пашыраць сферу дзеяння правоў чалавека. І калі нейкія палажэнні канвенцый і дагавораў па правах чалавека часам не апраўдваюць нашых спадзяванняў, то гэта яшчэ не падстава для сумненняў у тым, што правы чалавека ўяўляюць сабой у кантэксце надзей усяго чалавецтва. Заканадаўства па правах чалавека будзе часта адставаць ад спадзяванняў праваабаронцаў, але яно па-ранейшаму застаецца для іх самай надзейнай апорай.

**Асноўныя дакументы Савета Еўропы па правах чалавека і механізмы іх рэалізацыі**




## Барацьба з расізмам і нецярпімасцю

Усе дакументы па абароне правоў чалавека, якога стандарту яны б ні прытрымліваліся – ААН, Савета Еўропы, ЕС або АБСЕ, утрымліваюць гарантыі забеспячэння роўнасці і адмовы ад дыскрымінацыі. На ўзроўні ААН за выкананнем Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі, якая ўвайшла ў сілу ў 1969 годзе, сочыць экспертны орган – Камітэт па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі. Гэты камітэт прымае і разглядае справаздачы дзяржаў на прадмет іх адпаведнасці канвенцыі, ажыццяўляе працэсуальныя дзеянні па раннім папярэджанні для прадухілення сітуацый, дзе праява нецярпімасці пагражае перарасці ў сур'ёзны канфлікт і парушыць палажэнні канвенцыі, а таксама прымае індывідуальныя скаргі, калі тая ці іншая дзяржава дала на гэта згоду. У сваю чаргу, калі гаворка ідзе аб праблемах, звязаных з занятасцю, таварамі і паслугамі, якія прапануюцца дзяржавай і прыватнымі асобамі, ужываецца Дырэктыва ЕС па расавай роўнасці.

Еўрапейская камісія па барацьбе з расізмам і нецярпімасцю – гэта механізм, які дзейнічае ў рамках Савета Еўропы. Задачай створанай у 1993 годзе Еўрапейскай камісіі па барацьбе з расізмам і нецярпімасцю з'яўляецца барацьба супраць расізму, ксенафобіі, антысемітызму і нецярпімасці на агульнаеўрапейскім узроўні, а таксама ў рамках абароны правоў чалавека. Дзейнасць камісіі ўключае ўсе неабходныя меры для барацьбы з гвалтам, дыскрымінацыяй і забабонамі ў дачыненні да асобных людзей або груп людзей, у прыватнасці на падставе расы, колеру скуры, мовы, рэлігіі, нацыянальнасці і нацыянальнага ці этнічнага паходжання.

Членаў камісіі ўрады адпаведных краін выбіраюць з улікам глыбіні іх ведаў у галіне барацьбы з нецярпімасцю. Яны прызначаюцца ў асабістай якасці і дзейнічаюць незалежна ад урадаў.

Асноўная праграма дзеянняў камісіі ўключае:

• індывідуальную працу ў кожнай краіне-члене, у тым ліку правядзенне паглыбленага аналізу сітуацыі з мэтай распрацоўкі пэўных канкрэтных прапаноў і далейшых мер, якія з іх вынікаюць;

• працу над агульнымі тэмамі (збор і распаўсюджванне станоўчага вопыту па канкрэтных аспектах для ілюстрацыі рэкамендацый камісіі, а таксама распрацоўка агульных рэкамендацый);

• працу з грамадскасцю, уключаючы правядзенне ў краінах-членах тлумачальных і інфарматыўных нарад, каардынацыю дзеянняў з агульнанацыянальнымі і мясцовымі НГА, прапаганду антырасісцкіх поглядаў і падрыхтоўку навучальных матэрыялаў.

**Дадатковы пратакол № 12 да Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека**

У 2000 годзе быў прыняты дадатковы пратакол (Пратакол № 12) да Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека, ён увайшоў у сілу ў 2005 годзе. На пачатак 2011 года ён быў падпісаны 19 дзяржавамі і ратыфікаваны 18. Пратакол у асноўным накіраваны на забарону дыскрымінацыі.

ЕКПЧ ужо гарантуе права на свабоду ад дыскрымінацыі (артыкул 14), аднак гэта палажэнне лічыцца недастатковым у параўнанні з палажэннямі іншых міжнародных пагадненняў, напрыклад УДПЧ і МГПГП. Асноўнай прычынай такога меркавання з’яўляецца той факт, што гэты артыкул 14, у адрозненне ад палажэнняў іншых дакументаў, не змяшчае асобнай забароны дыскрымінацыі; у артыкуле дыскрымінацыя забараняецца толькі ў тым сэнсе, у якім яна можа перашкаджаць людзям «рэалізоўваць правы і свабоды», выкладзеныя ў гэтай канвенцыі. Калі гэты пратакол увайшоў у сілу, забарона дыскрымінацыі здабыла сваё «асобнае жыццё», незалежнае ад астатніх палажэнняў Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека. Суд упершыню прызнаў парушэнне гэтага палажэння ў 2009 годзе пры разглядзе справы «Сейдзіч і Фінцы супраць Босніі і Герцагавіны» (скаргі № 27996/06 і № 34836/06, 22 снежня 2009 г.).

# Забеспячэнне захавання правоў чалавека

Як жа мы можам дамагчыся таго, каб гэтыя ахоўныя механізмы працавалі? Хто ці што забяспечыць выкананне дзяржавамі іх абавязацельстваў?

На нацыянальным узроўні гэта праца ажыццяўляецца судамі – калі пагадненні аб абароне правоў чалавека ратыфікаваны або ўключаны ў нацыянальнае заканадаўства – а таксама, у залежнасці ад краіны, у офісах амбудсменаў, у камітэтах па правах чалавека, саветах па правах чалавека, парламенцкіх камітэтах і г. д.

Асноўнымі міжнароднымі наглядными органамі з'яўляюцца камісіі ці камітэты і суды, якія складаюцца з незалежных членаў – экспертаў ці суддзяў, і ніводны з гэтых органаў не павінен складацца толькі з прадстаўнікоў адной дзяржавы. У сваёй дзейнасці гэтыя органы выкарыстоўваюць наступныя асноўныя механізмы:

• скаргі (пададзеныя асобнымі людзьмі, групамі асоб або дзяржавамі);

• судовыя справы;

• працэдуры прадстаўлення дакладаў.

Паколькі ў розных дакументах па правах чалавека і ў рэгіянальных праваабарончых сістэмах часта прадугледжаны розныя працэдуры забеспячэння захавання правоў чалавека, для лепшага разумення іх дзеяння варта прывесці некалькі прыкладаў.

### *Скаргі*

Скаргі на дзяржавы падаюцца камісіі або камітэту ў рамках працэдуры, якая звычайна называецца квазісудовай. Затым кантрольны орган выносіць рашэнне, чакаючы, што адпаведная дзяржава яго выканае, хоць ніякай правапрымяняльнай працэдуры для гэтага не існуе. Часта для таго, каб выказаць сваю згоду з сістэмай разгляду скаргаў, дзяржава павінна зрабіць адпаведную заяву або ратыфікаваць факультатыўны пратакол. Прыкладамі органаў, якія разглядаюць скаргі, з'яўляюцца Камітэт па правах чалавека (або «Камітэт МПГПП») і Камітэт па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі, што існуюць у рамках сістэмы ААН, а таксама Міжамерыканская камісія па правах чалавека ў Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў.

*Калі б мы маглі заснаваць Міжнародны суд па правах чалавека, якія санкцыі ён мог бы ўжываць?*

### Судовыя справы

Еўрапейскі суд па правах чалавека

Міжамерыканскі суд па правах чалавека

Афрыканскі суд па правах чалавека і народаў

На цяперашні момант існуюць тры пастаянна дзеючыя рэгіянальныя суды, якія выступаюць у ролі органаў нагляду за захаваннем правоў чалавека: Еўрапейскі суд па правах чалавека, Міжамерыканскі суд па правах чалавека і Афрыканскі суд па правах чалавека і народаў. Міжамерыканскі суд па правах чалавека быў заснаваны Арганізацыяй амерыканскіх дзяржаў у 1979 годзе з мэтай растлумачыць і ўвасобіць у жыццё палажэнні Амерыканскай канвенцыі аб правах чалавека. Афрыканскі суд – самы малады з гэтых трох рэгіянальных судоў – пачаў працу ў студзені 2004 года. Ён разглядае справы, кіруючыся Афрыканскай хартыяй аб правах чалавека і народаў, і пад яго юрысдыкцыю падпадаюць дзяржавы – удзельніцы Афрыканскага саюза. Суд засядае ў горадзе Аруша (Танзанія), суддзі былі абраны ў 2006 годзе, і яны вынеслі першае судовае рашэнне ў снежні 2009 года, заявіўшы, што разгледжаная імі справа «Ёгагамбае супраць Сенегала» не падпадае пад іх юрысдыкцыю.

Міжнародны крымінальны суд

Пасля ратыфікацыі 60 краінамі Рымскага статута ў 2002 годзе быў заснаваны першы пастаянны Міжнародны крымінальны суд для разгляду спраў, звязаных з ваеннымі злачынствамі, злачынствамі супраць чалавецтва і генацыдам. Гэты Міжнародны крымінальны суд (МУС) разглядае справы асоб, якія абвінавачваюцца ў злачынствах супраць чалавецтва, генацыдзе і ваенных злачынствах, але толькі ў выпадках, калі нацыянальныя суды не жадаюць ці не могуць расследаваць або караць за гэтыя злачынствы. На сённяшні дзень МУС расследаваў пяць выпадкаў, якія мелі месца ў Паўночнай Угандзе, Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы, Судане (Дарфур) і Кеніі. Наватарская прэцэдэнтная практыка суда дапамагла лепш зразумець правы чалавека, напрыклад у іх сувязі з такімі паняццямі, як падбухторванне да здзяйснення генацыду і права на свабодныя і справядлівыя выбары.

Міжнародны суд ААН – асноўны судовы орган Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Роля яго двaякая: уладжваць у адпаведнасці з міжнародным правам юрыдычныя спрэчкі, якія выносяцца дзяржавамі на яго разгляд, і даваць кансультацыйныя заключэнні па прававых пытаннях. Прад'яўляць іскі супраць іншых дзяржаў могуць толькі дзяржавы, і звычайна гэтыя іскі датычацца міждзяржаўных пагадненняў. Пагадненні могуць закранаць базавыя пытанні адносін паміж дзяржавамі (напрыклад, камерцыйных або тэрытарыяльных), але могуць датычыцца і правоў чалавека. Міжнародны суд ААН не прымае да разгляду справы па правах чалавека і іншыя скаргі ад прыватных асоб. Аднак яго праца ў рамках разгляду спраў, пададзеных дзяржавамі ці міжнароднымі арганізацыямі, спрыяла прасоўванню правоў чалавека праз тлумачэнне і развіццё правіл і прынцыпаў у галіне правоў чалавека. Суд разглядае справы, звязаныя з такімі правамі, як права на самавызначэнне, на свабоду ад дыскрымінацыі, на свабоду перамяшчэння, на забарону на катаванні і г. д.

Міжнародны суд ААН

Многія блытаюць Еўрапейскі суд па правах чалавека, Еўрапейскі суд і Міжнародны суд ААН. У рэчаіснасці, яны вельмі істотна адрозніваюцца адзін ад аднаго па геаграфіі іх юрысдыкцыі і па відах спраў, якія яны разглядаюць.

Еўрапейскі суд з'яўляецца органам Еўрапейскага саюза. Галоўны абавязак гэтага суда складаецца ў забеспячэнні таго, каб законы Еўрапейскай супольнасці інтэрпрэтаваліся і ўжываліся аднастайна ва ўсіх дзяржавах-удзельніцах. У аснове яго дзейнасці ляжаць не правы чалавека, а законы Еўрапейскай супольнасці, хоць часам законы супольнасці могуць закранаць нейкія аспекты правоў чалавека.

Міжнародны суд ААН – асноўны судовы орган ААН; пра яго ролю было сказана вышэй.

## *Еўрапейскі суд па правах чалавека*

Еўрапейскі суд па правах чалавека ў Страсбургу набыў вядомасць па мностве прычын, але, мабыць, перш за ўсё, таму, што ён удыхнуў жыццё ў тэкст Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і надаў яму сэнс. Адна з галоўных пераваг гэтага суда – яго сістэма абавязковай юрысдыкцыі, якая азначае, што, як толькі дзяржава ратыфікуе канвенцыю ці далучаецца да яе, такая дзяржава аўтаматычна аддае сябе пад юрысдыкцыю Еўрапейскага суда. Такім чынам, з моманту ратыфікацыі супраць дзяржавы можа быць распачата справа аб парушэнні правоў чалавека.

Яшчэ адна прычына поспеху гэтага суда – юрыдычная сіла яго пастаноў. Дзяржавы абавязаны выконваць канчатковыя пастановы гэтага суда. За гэтым сочыць Камітэт міністраў Савета Еўропы.

У 2009 годзе гэты суд вынес 1625 пастаноў, гэта значыць больш 4 пастаноў у дзень (уключаючы выхадныя і святочныя дні!).

Якую б справу ні разглядаў Еўрапейскі суд, працэдура разгляду прадугледжвае магчымасць пазасудовага мірнага пагаднення, заснаванага на пасярэдніцтве паміж бакамі. Акрамя таго, Суду ўдаецца ісці ў нагу з часам. Калі ён быў створаны ў 1959 годзе, гэта быў толькі часова дзеючы суд, які працаваў сумесна з Еўрапейскай камісіяй па правах чалавека. З павелічэннем колькасці спраў, якія разглядаліся, паўстала неабходнасць у пастаянна дзеючым судзе, і такі быў заснаваны ў лістападзе 1998 года. Такое павелічэнне колькасці спраў для разгляду, безумоўна, сведчыць аб паспяховай працы суда, але ёсць рызыка, што такая нагрузка можа паўплываць на якасць і эфектыўнасць работы судовай сістэмы. Людзі ведаюць, што суд існуе і што ён заўсёды гатовы заступіцца за іх, калі парушаюцца іх асноўныя правы. Аднак аўтарытэт і дзейснасць Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека павінны атрымліваць падтрымку на нацыянальным узроўні ў адпаведнасці з «прынцыпам субсідыярнасці» (максімальнага імкнення да рашэння праблем на месцах), гэта значыць менавіта дзяржавы нясуць асноўную адказнасць за прадухіленне парушэнняў правоў чалавека і выпраўленне становішча, калі парушэнні мелі месца.

**Разборы спраў у Еўрапейскім судзе па правах чалавека**




**Крыніца:**
www.echr.coe.int

## Знакавыя справы Еўрапейскага суда па правах чалавека

• ***Сёрынг супраць Вялікабрытаніі*** (чэрвень 1989 г.). У гэтай справе ўдзельнічаў чалавек, якога павінны былі выдаць Злучаным Штатам па абвінавачанні ў забойстве, г. зн. у злачынстве, якое там каралася смерцю. Суд палічыў, што экстрадыцыя гэтага чалавека ў ЗША супярэчыла б артыкулу 3 Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека, якая забараняе катаванні, бесчалавечнае ці іншае зневажальнае абыходжанне або пакаранне, якое прыніжае годнасць чалавека. Адным з наступстваў гэтага рашэння было распаўсюджванне абароны грамадзян дзяржаў – членаў Савета Еўропы за межы Еўропы. Гэты падыход, які потым прымяняўся і ў іншых справах, у прыватнасці ў справе *Джабары супраць Турцыі* (ліпень 2000 г.), таксама дазволіў абараніць асоб, якія шукаюць прытулак, ад высылкі назад у краіну, дзе іх жыццё апынулася б у небяспецы.

• ***Тайрэр супраць Вялікабрытаніі*** (сакавік 1978 г.). У гэтай справе суд палічыў, што прымяненне ў якасці пакарання малалетніх злачынцаў цялеснай кары супярэчыць Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека, таму што гэта парушае гарантаванае ў артыкуле 3 права не падвяргацца катаванням або бесчалавечнаму ці іншаму зневажальнаму абыходжанню або пакаранню, якое прыніжае годнасць чалавека. Як заявіў суд, «яго пакаранне, пры якім ён разглядаўся як аб'ект, што знаходзіўся ва ўладзе дзяржаўных органаў, уяўляла сабой парушэнне аднаго з галоўных палажэнняў артыкула 3, менавіта аб абароне годнасці чалавека і яго фізічнай недатыкальнасці». Гэты выпадак – добры прыклад таго, што Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека – гэта жывы арганізм, і што суд ідзе ў нагу са светапоглядам нашага грамадства, які пастаянна змяняецца.

• ***Какінакіс супраць Грэцыі*** (красавік 1993 г.). Гэта была цікавая справа, якая тычылася канфлікту паміж правамі розных людзей. У яе аснове ляжала праблема празелітызму (звароту іншых у сваю веру) і пытанне, ці не парушае выкладанне рэлігіі (права на якое гарантавана артыкулам 9 Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека) права іншага чалавека на свабоду веравызнання.

Суд палічыў неабходным правесці выразнае адрозненне паміж навучаннем, прапаведаваннем або абмеркаваннем рэлігіі амаральнымі і падманнымі спосабамі, накіраванымі на тое, каб пераканаць чалавека змяніць рэлігію (напрыклад, абяцанні матэрыяльных і сацыяльных выгад, прымяненне гвалту ці ідэалагічнай апрацоўкі).

• ***DH супраць Чэшскай Рэспублікі*** (лістапад 2007 г.). Гэта справа была ўзбуджана 18 падлеткамі цыганскага паходжання ў сувязі з тым, што дзеці цыганоў-рама падвяргаліся сегрэгацыі і адпраўляліся ў спецыяльныя школы для дзяцей з цяжкасцямі пры навучанні, нават калі яны і не адносіліся да гэтай катэгорыі дзяцей. Гэта таксама азначала, што потым у іх будзе мала шанцаў атрымаць доступ да адукацыі больш высокага ўзроўню і менш магчымасцей для годнага працаўладкавання. У сваім рашэнні суд упершыню прызнаў факт парушэння артыкула 14 (забарона дыскрымінацыі), угледзеўшы ў справе «прынцып» расавай дыскрымінацыі ў пэўнай сферы грамадскага жыцця, у дадзеным выпадку ў дзяржаўных школах. Суд пастанавіў, што дадзеная сістэмная расавая сегрэгацыя пры навучанні парушае палажэнні ЕКПЧ (артыкул 14) аб абароне ад дыскрымінацыі. Ён таксама адзначыў, што агульная палітыка ці меры, якія прымаюцца, нават сфармуляваныя нейтральнымі тэрмінамі, могуць тым не менш падвяргаць дыскрымінацыі асобныя групы і прыводзіць да ўскоснай дыскрымінацыі супраць іх. Гэты выпадак стаў першым, які закрануў складаную сістэму расавай сегрэгацыі ў галіне адукацыі.

### *Ці разглядаліся ў Еўрапейскім судзе па правах чалавека якія-небудзь важныя справы супраць вашай краіны?*

### ***Справаздачы і аналіз***

Большасць пагадненняў у галіне правоў чалавека патрабуе, каб дзяржавы перыядычна падавалі адпаведныя справаздачы. Іх складаюць самі дзяржавы, кіруючыся рэкамендацыямі нагляднага органа. Мэтай стварэння такіх справаздач і правядзення далейшага аналізу адпаведным кантрольным органам з'яўляецца адкрыты абмен думкамі пра складаныя праблемы, з якімі бакі сутыкнуліся ў сваёй працы па абароне адпаведных правоў. Справаздачы адкрыта абмяркоўваюцца ў рамках так званага «дыялогу дзяржаў». Справаздачы дзяржаў абмяркоўваюцца паралельна з «ценявымі» справаздачамі, якія падаюцца НГА, маюць дачыненне да дадзенай дзяржавы і заснаваны на ўласных крыніцах такіх НГА і праведзеным імі аналізе. Пасля таго як дыялог паміж прадстаўнікамі дзяржавы і незалежнымі экспертамі – членамі кантрольнага органа адбыўся, апошні выказвае свае заўвагі адносна таго, ці падтрымлівае дадзеная дзяржава стандарты, устаноўленыя ў разгледжаным прававым дакуменце. У гэтых заўвагах улічваюцца і станоўчыя моманты, і крытычныя аспекты разгледжанай сітуацыі ў дзяржаве. Прыкладамі пагадненняў, якія патрабуюць перыядычнага стварэння такіх справаздач, з'яўляюцца Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП), Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП) і Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (CEDAW).

Акрамя ўдзелу ў дыялогу дзяржаў, кантрольныя органы таксама могуць быць упаўнаважаны вывучаць сітуацыю з правамі чалавека «на месцы» (in situ), атрымліваючы інфармацыю з першых рук. Для арганізацыі большасці такіх візітаў можа спатрэбіцца афіцыйны дазвол дзяржавы на расследаванне канкрэтных выпадкаў. Тым не менш робяцца крокі з мэтай дамагчыся атрымання адкрытых запрашэнняў, напрыклад ад дзяржаў, якія публічна заявілі пра гатоўнасць у любы момант прыняць любога назіральніка са спецыяльным мандатам ААН.

Для многіх праваабарончых інструментаў таксама былі распрацаваны больш дакладныя працэдуры, якія дазваляюць здзяйсняць рэгулярныя раптоўныя візіты з мэтай не толькі рэагаваць на парушэнні правоў чалавека, але і прадухіляць іх.

COMPASS

ЕКПП прадухіляе зневажальнае абыходжанне з людзьмі, пазбаўленымі волі, у Еўропе

Адным з такіх прыкладаў з'яўляецца Еўрапейская канвенцыя па прадухіленні катаванняў і бесчалавечнага ці зневажальнага абыходжання або пакарання (1987 г.). У яе аснове ляжыць сістэма наведванняў членамі Еўрапейскага камітэта па прадухіленні катаванняў (ЕКПП) месцаў пазбаўлення волі, напрыклад турмаў і прыёмнікаў-размеркавальнікаў для непаўналетніх, аддзяленняў паліцыі, вайсковых казармаў і псіхіятрычных бальніц. Члены камітэта высвятляюць, як абыходзяцца з затрыманымі людзьмі, і ў выпадку неабходнасці рэкамендуюць прыняць меры па ажыццяўленні права не падвяргацца катаванням або бесчалавечнаму абыходжанню. Гэты механізм натхніў на стварэнне падобнага на ўзроўні ААН. Дэлегацыі ЕКПП перыядычна наведваюць дзяржавы – удзельніцы канвенцыі, але яны таксама могуць пры неабходнасці прыязджаць са «спецыяльнымі» візітамі. Па стане на 9 жніўня 2012 года камітэт здзейсніў 323 візіты і апублікаваў 272 справаздачы.

Даклады ЕКПП, як правіла, публікуюцца:

http://www.cpt.coe.int

Важную ролю камітэт сыграў падчас галадовак у турмах Турцыі ў 2000–2001 гадах. Калі турэцкі ўрад рыхтаваўся правесці змены ў турэмнай сістэме, некаторыя зняволеныя звярнуліся да галадовак у знак пратэсту супраць запланаваных рэформаў. Дэманстрацыі перараслі ў сутыкненні. Тады камітэт актыўна ўключыўся ў перамовы з урадам і ўдзельнікамі галадовак, расследуючы падзеі, звязаныя з галадоўкамі, і аналізуючы, як прапанаваныя законапраекты могуць адбіцца на турэцкай турэмнай сістэме. Пачынаючы з 1999 года, дэлегацыі камітэта наведвалі Турцыю кожны год, за выключэннем 2008 г. Зусім нядаўна ЕКПП пачаў наведваць Сербію, Албанію і Грэцыю.

### *Камісар Савета Еўропы па правах чалавека*

Пост Камісара Савета Еўропы па правах чалавека быў заснаваны ў 1997 годзе. Гэты незалежны орган мае на мэце як прасоўванне канцэпцыі правоў чалавека, так і забеспячэнне захавання і эфектыўнай рэалізацыі правоў чалавека ў краінах – членах Савета Еўропы. Камісар абіраецца Парламенцкай асамблеяй тэрмінам на шэсць гадоў без права перавыбрання.

Камісар па правах чалавека – гэта несудовы орган, чыя дзейнасць павінна дапаўняць працу іншых органаў Савета Еўропы, якія займаюцца прасоўваннем правоў чалавека. Камісар павінен ажыццяўляць свае функцыі з поўнай незалежнасцю і бесстароннасцю, у той жа час паважаючы правамоцнасць розных наглядных органаў, створаных згодна з Еўрапейскай канвенцыяй аб абароне правоў чалавека або згодна з іншымі пагадненнямі Савета Еўропы па правах чалавека.

www.coe.int/commissioner

Асноўныя задачы Камісара па правах чалавека:

• спрыяць эфектыўнаму выкананню правоў чалавека і дапамагаць дзяржавам-ўдзельніцам прымяняць стандарты правоў чалавека, прынятыя Саветам Еўропы;

• садзейнічаць навучанню і дасведчанасці аб правах чалавека ў дзяржавах – удзельніцах Савета Еўропы;

• выяўляць магчымыя недахопы ў заканадаўстве і правапрымяняльнай практыцы ў галіне правоў чалавека;

• садзейнічаць працы нацыянальных інстытутаў амбудсменаў і іншых праваабарончых структур; і

• даваць рэкамендацыі і інфармацыю па абароне правоў чалавека ў рэгіёне.

Камісар можа, па сваёй пасадзе, займацца любой праблемай у межах сваёй кампетэнцыі. Хоць Камісар не разглядае індывідуальныя скаргі, ён можа прымаць меры на падставе любой інфармацыі, якая адносіцца да справы, у дачыненні да агульных аспектаў абароны правоў чалавека, абвешчаных у дакументах Савета Еўропы.

Такая інфармацыя з просьбай прыняць па ёй адпаведныя меры можа паступаць у адрас Камісара ад урадаў, нацыянальных парламентаў, нацыянальных амбудсменаў або аналагічных органаў, а таксама ад асобных людзей і арганізацый. Праца Камісара прадугледжвае складанне справаздач, падрыхтоўку рэкамендацый, фармуляванне меркаванняў і распрацоўку падыходаў да правоў чалавека ў дачыненні да асоб, якія шукаюць прытулак, імігрантаў і цыганоў-рома.

Варта памятаць, што Камісар Савета Еўропы па правах чалавека і Камісар ААН па правах чалавека – гэта не адно і тое ж.

Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека

Многія НГА лабіравалі стварэнне пасады Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, і пытанне аб яго заснаванні было ўзгоднена на Сусветнай канферэнцыі ААН па правах чалавека ў Вене ў 1993 годзе, калі канферэнцыя рэкамендавала Генеральнай Асамблеі разгледзець пытанне аб прызначэнні такога Вярхоўнага камісара, чыёй задачай будзе прасоўванне і абарона ўсіх правоў чалавека як прыярытэтных каштоўнасцей. Пасада была заснавана ў тым жа годзе.

Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека прызначае Генеральны сакратар ААН з ухвалення Генеральнай Асамблеі. Гэта павінен быць чалавек «высокіх маральных прынцыпаў», які мае досвед у галіне правоў чалавека як афіцыйны працаўнік ААН, які нясе асноўную адказнасць за мерапрыемствы ААН у галіне правоў чалавека. У яго кампетэнцыю ўваходзіць: прасоўванне, абарона, садзейнічанне эфектыўнаму ажыццяўленню ўсіх правоў, узаемадзеянне і вядзенне дыялогу з урадамі па тэмах забеспячэння правоў чалавека, умацаванне міжнароднага супрацоўніцтва і каардынацыя з ААН у мэтах прасоўвання і абароны ўсіх правоў чалавека. У якасці вышэйшай службовай асобы па правах чалавека ААН, Вярхоўны камісар таксама ўзначальвае Ўпраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (УВКПЧ) і яго рэгіянальныя і нацыянальныя аддзяленні. УВКПЧ падтрымлівае шырокі круг мерапрыемстваў ААН па правах чалавека і праводзіць працу па прасоўванні і абароне правоў чалавека, а таксама па забеспячэнні захавання ўніверсальных нормаў правоў чалавека, уключаючы Сусветную праграму па адукацыі ў галіне правоў чалавека.

# Ці дастаткова гэтага?

Многія скажуць, што правы чалавека ў свеце дрэнна выконваюцца з-за адсутнасці належных механізмаў правапрымянення. Часта рашэнне аб тым, ці варта выконваць атрыманыя рэкамендацыі, пакідаецца на меркаванне саміх дзяржаў. У многіх выпадках рэальныя гарантыі правоў асобнага чалавека або групы асоб залежаць ад ціску міжнароднай супольнасці і, у значнай ступені, ад працы НГА. І такая сітуацыя далёка ад задавальняючай, бо перш чым выпадак парушэння правоў чалавека будзе рэальна разгледжаны ААН ці Саветам Еўропы, можа прыйсціся вельмі доўга чакаць.

Ці можна штосьці зрабіць, каб змяніць такое становішча? Перш за ўсё, неабходна дамагчыся таго, каб дзяржавы гарантавалі правы чалавека на нацыянальным узроўні і распрацавалі належны механізм ліквідацыі любых парушэнняў. Адначасова трэба аказваць ціск на дзяржавы, каб яны далі абавязацельствы ў рамках тых механізмаў, якія прадугледжваюць прымяненне прававых санкцый.

COMPASS

# 4.4 Праваабарончы актывізм і роля НГА

«Кожны чалавек мае права індывідуальна і сумесна з іншымі імкнуцца абараняць і ажыццяўляць правы чалавека і асноўныя свабоды на нацыянальным і міжнародным узроўні, а таксама прасоўваць такую канцэпцыю».

***Артыкул 1, Дэкларацыя ААН аб праваабаронцах***

# Што такое НГА?

**Уставай, падымайся, абараняй свае правы!**

*Боб Марлі*

Тэрмін «няўрадавы» або «некамерцыйны» звычайна выкарыстоўваецца для абазначэння катэгорыі арганізацый, якія імкнуцца ўносіць уклад у фарміраванне грамадзянскай супольнасці. Такія арганізацыі, як правіла, характарызуюцца тым, што мэтай іх існавання з'яўляецца не фінансавы прыбытак, а нешта іншае. Аднак гэта «нешта» можа ўключаць велізарнае мноства мэт і самыя разнастайныя ініцыятывы і дзеянні. Круг НГА уключае як невялікія ініцыятыўныя групы, якія ўзнікаюць, напрыклад, у сувязі з нейкімі прыродаахоўнымі праблемамі або канкрэтнымі парушэннямі правоў чалавека, так і дабрачынныя арганізацыі ў сферы адукацыі, прытулкі для жанчын, культурныя асацыяцыі, рэлігійныя арганізацыі, юрыдычныя фонды, праграмы гуманітарнай дапамогі (гэты спіс можна працягнуць) і, нарэшце, вялізныя міжнародныя арганізацыі з сотнямі ці нават тысячамі аддзяленняў і членаў у розных частках свету.

У гэтым раздзеле мы коратка разгледзім тую істотную ролю, якую такія арганізацыі сыгралі (і працягваюць іграць) у абароне правоў чалавека ва ўсім свеце. Практычна на любым узроўні, дзе робяцца спробы абараніць годнасць асобных грамадзян ад замахаў дзяржаўнай улады, НГА іграюць вырашальную ролю:

• змагаючыся з асобнымі парушэннямі правоў чалавека альбо непасрэдна, альбо звяртаючыся з нагоды «знакавых» выпадкаў у адпаведныя судовыя органы;

• аказваючы прамую дапамогу тым, чые правы былі парушаны;

• дамагаючыся змяненняў у нацыянальным, рэгіянальным ці міжнародным заканадаўстве;

• садзейнічаючы ўдасканаленню зместу гэтага заканадаўства;

• распаўсюджваючы сярод насельніцтва веды аб правах чалавека і культывуючы павагу да іх.

Уклад НГА важны не толькі з пункту гледжання дасягнутых вынікаў, і, адпаведна, аптымізму, які яны абуджаюць адносна абароны правоў чалавека ў нашым свеце, але і таму, што НГА ў самым прамым сэнсе ўяўляюць сабой сродак абароны, даступны як для асобных людзей, так і для груп асоб ва ўсім свеце. Яны – як і многія іншыя арганізацыі – кіруюцца і каардынуюцца прыватнымі асобамі, але апроч гэтага іх сіла ў немалой ступені абумоўлена добраахвотнай падтрымкай іх справы іншымі членамі грамадства. Гэты факт надае ім асаблівую значнасць у вачах тых людзей, якія хацелі б унесці свой уклад у паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека ў свеце.

# Віды праваабарончых НГА

На Сусветнай канферэнцыі ААН па правах чалавека 1993 года, вядомай як Венская канферэнцыя, прысутнічалі прадстаўнікі 841 НГА з усяго свету, кожная з якіх вызначыла сваю місію як праца з правамі чалавека. Хоць гэта лічба сама па сабе ўражвае, яна ўяўляе толькі малую крыху ад агульнай колькасці дзеючых у свеце праваабарончых НГА.

Большасць арганізацый, якія абвясцілі сябе «праваабарончымі», як правіла, займаюцца абаронай грамадзянскіх і палітычных правоў. Найбольш вядомымі з такіх арганізацый, па меншай меры, на міжнароднай арэне, з'яўляюцца Amnesty International, Human Rights Watch, Міжнародная федэрацыя за правы чалавека, Human Rights First і InterRights. Аднак, як мы ўжо бачылі, грамадзянскія і палітычныя правы з'яўляюцца толькі адной з многіх катэгорый розных правоў чалавека, прызнаных міжнароднай супольнасцю. Больш за тое, новыя правы працягваюць узнікаць нават сёння. Калі мы прымем усё гэта пад увагу і ўключым у гэты спіс НГА, якія супрацьстаяць беднасці, гвалту, расізму, бяздомнасці, праблемам аховы здароўя і аховы прыроды, не кажучы пра шматлікія іншыя, то сапраўдная колькасць НГА, занятых абаронай правоў чалавека ў той ці іншай форме, будзе лічыцца ва ўсім свеце сотнямі тысяч.

*Ці ведаеце вы якую-небудзь НГА, якая змагаецца за правы чалавека ў вашай краіне?*

# Як яны ўздзейнічаюць на працэс?

НГА могуць спрабаваць удзельнічаць у працэсе абароны правоў чалавека на многіх розных напрамках і ўзроўнях, і ў адпаведнасці з характарам іх мэт будуць змяняцца стратэгіі, што імі прымяняюцца: мэты могуць быць больш агульнымі ці больш канкрэтнымі, доўгатэрміновымі або кароткатэрміновымі, мясцовага, нацыянальнага, рэгіянальнага або міжнароднага маштабу і г. д.

**Гасподзь дае нам рукі, але сам Ён за нас масты не будуе.**

*Арабская прыказка*

## А. Непасрэдная дапамога

Агульнай адметнай рысай НГА, якія дзейнічаюць у сферы сацыяльных і эканамічных правоў, з'яўляецца аказанне прамой дапамогі ахвярам парушэнняў правоў чалавека ў той ці іншай форме. Гэта можа быць гуманітарная дапамога, абарона ці навучанне новым навыкам. Калі права абаронена законам, гэта можа быць юрыдычная дапамога або кансультацыі па пытаннях падачы іску.

Аднак у многіх выпадках прамая дапамога чалавеку, які папакутаваў ад парушэння правоў чалавека, ці праваабаронцу альбо не ўяўляецца магчымай, альбо з'яўляецца не лепшым спосабам выкарыстоўваць рэсурсы арганізацыі. У такіх выпадках, а іх, відаць, большасць, НГА павінны працаваць на перспектыву і адшукваць іншыя шляхі, каб альбо выправіць сітуацыю з парушэннем правоў, альбо прадухіліць з'яўленне падобных сітуацый у будучыні.

## Б. Збор дакладнай інфармацыі

Калі і існуе фундаментальная стратэгія, якая ляжыць у аснове розных формаў дзейнасці НГА, то, магчыма, гаворка ідзе пра спробу выявіць вінаватых у несправядлівасці. Вельмі часта ўрады могуць ухіляцца ад абавязацельстваў па падпісаных імі міжнародных пагадненнях або ад іншых прававых стандартаў, таму што вынікі іх палітыкі проста невядомы шырокай публіцы. Збор такой інфармацыі і яе выкарыстанне для таго, каб прасоўваць празрыстасць дзеянняў урадаў у галіне правоў чалавека, неабходны для прыцягнення вінаватых да адказнасці і таму часта прымяняюцца НГА. Яны імкнуцца аказаць ціск на людзей ці на ўрады, выяўляючы выпадкі, якія заклікаюць да чалавечага пачуцця справядлівасці, а затым даводзяць іх да агульнага ведама.

Дзве найбольш вядомыя арганізацыі, якія добра зарэкамендавалі сябе дакладнасцю маніторынгу і складання справаздач, – Amnesty International і Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа. Абедзве арганізацыі маюць аўтарытэт не толькі сярод шырокай публікі, але і ў ААН, дзе іх справаздачы разглядаюцца як частка афіцыйнага маніторынгу дзейнасці ўрадаў, якія пагадзіліся лічыць сябе звязанымі ўмовамі міжнародных пагадненняў.

## B. Правядзенне кампаній і лабіраванне

**Пацешна перапісвацца з кіраўнікамі аўтарытарных ці рэпрэсіўных рэжымаў. Дыктатар – твой сябар па перапісцы, і ты яго гэтымі сваімі лістамі дастаеш.**

*Стынг*

Міжнародныя арганізацыі часта праводзяць кампаніі і дзеянні па адстойванні інтарэсаў, каб выклікаць змены ў палітыцы. Зноў жа, існуюць шматлікія формы, і НГА паспрабуе прыняць найбольш прыдатныя, улічваючы мэты, якія яна мае, характар «аб'екта» і, вядома ж, яе ўласныя наяўныя рэсурсы. Ніжэй прыведзены некаторыя распаўсюджаныя метады ўздзеяння:

• кампаніі па адпраўцы лістоў – метад, якім эфектыўна карыстаюцца Amnesty International і іншыя НГА. Арганізацыі «бамбардзіруюць» урадавых чыноўнікаў лістамі ад тысяч сваіх членаў па ўсім свеце;

• вулічныя акцыі або дэманстрацыі з асвятленнем у СМІ, якія звычайна праяўляюць цікавасць да такіх мерапрыемстваў, могуць выкарыстоўвацца, калі арганізацыі хочуць заручыцца грамадскай падтрымкай або прыцягнуць да чаго-небудзь увагу грамадскасці і «прысароміць» урад;

• СМІ і надалей часта будуць іграць важную ролю ў практыцы лабіравання, але цяпер усё большае значэнне набываюць сацыяльныя сеткі і Інтэрнэт;

• НГА падаюць свае ценявыя справаздачы кантрольным органам ААН, ствараючы, такім чынам, больш агульную карціну рэальнага становішча правоў чалавека ў той ці іншай краіне.

У дадатак да дэманстрацый падтрымкі або грамадскага абурэння, НГА таксама могуць праводзіць неафіцыйныя сустрэчы або брыфінгі для службовых асоб. Часам простай пагрозы зрабіць што-небудзь здабыткам галоснасці бывае дастаткова, каб дамагчыся змен у палітыцы ці практыцы, як паказана ў прыведзенай ніжэй гісторыі. Калі калісьці для гэтага выкарыстоўваліся касеты, плакаты або факс, зараз для гэтага служаць кампаніі электронных рассылак і падачы петыцый, інтэрнэт-сайты, блогі і сацыяльныя сеткі.

Наогул, чым шырэй падтрымка з боку грамадскасці або нейкіх іншых уплывовых інстытутаў (напрыклад, іншых урадаў), тым большая верагоднасць таго, што кампанія дасягне сваіх мэт. Нават калі НГА не заўсёды звяртаюцца да такой падтрымкі наўпрост, указання на магчымасць мабілізацыі супраць урада ці некалькіх урадаў шырокага народнага руху бывае дастаткова, каб да іх голасу прыслухаліся.

*Ці праводзіліся ў вашай краіне якія-небудзь прыкметныя кампаніі? Які быў вынік?*

### Г. Адукацыя ў галіне правоў чалавека і павышэнне дасведчанасці

Многія праваабарончыя НГА займаюцца, па меншай меры, у якасці аднаго з напрамкаў сваёй дзейнасці, інфармаваннем грамадскасці або адукацыйнай працай. Разумеючы, што аснову іх падтрымкі складае шырокая грамадскасць, НГА імкнуцца данесці да асобных людзей як мага больш інфармацыі аб праблемах, звязаных з правамі чалавека. Чым лепш людзі дасведчаны пра гэтыя праблемы і пра метады абароны правоў чалавека, тым большая верагоднасць выканання такіх правоў, што, у сваю чаргу, дае больш магчымасцей мабілізаваць падтрымку ў выпадку канкрэтных парушэнняў правоў чалавека. Менавіта гэтая падтрымка або патэнцыйная падтрымка ляжыць у аснове поспехаў НГА ў паляпшэнні становішча ў галіне правоў чалавека.

**Задача адукацыі ў галіне правоў чалавека – засяродзіцца на пытаннях удзелу, дaступнасці і інклюзіўнасці.**

*Форум «Вучыцца, жыць і змагацца за правы чалавека», 2009 г.*

# Прыклады паспяховага актывізму

## Цэнтр па жыллёвых правах і высяленнях

Гэта праваабарончая арганізацыя была створана ў 1994 годзе, і яе праца накіравана на абарону жыллёвых правоў і прадухіленне прымусовых высяленняў ва ўсім свеце. Цэнтр кіруецца міжнароднымі прававымі дакументамі, пры гэтым разумеючы, што «жыллё» – гэта нешта большае, чым дах над галавой. Цэнтр падкрэслівае, што «прыкладна палова насельніцтва зямлі не мае доступу да годнага жылля, хоць гэта права гарантавана ў міжнародных дакументах па правах чалавека». У сваёй працы па абароне правоў на годнае жыллё гэты цэнтр і яго партнёры ва ўсім свеце займаюцца аналізам, прапагандай, асветай і падрыхтоўкай кадраў для працы ў судзе па такіх пытаннях, як:

• прымусовыя высяленні;

• гарантыі супраць беспадстаўнага высялення;

• доступ да зямлі;

• водазабеспячэнне і каналізацыя;

• жанчыны і жыллёвыя правы;

• судовая і прававая абарона;

• рэстытуцыя (аднаўленне першапачатковага прававога становішча) і вяртанне;

• уплыў катастрафічных падзей на жыллёвыя правы.

У лістападзе 2010 года ў адным са сваіх нядаўніх знакавых рашэнняў, выкладзеным у дакуменце «Цэнтр па жыллёвых правах і высяленнях супраць Італіі», Камітэт Савета Еўропы па сацыяльных правах (які кантралюе выкананне перагледжанай Еўрапейскай сацыяльнай хартыі) канстатаваў, што Італія парушыла правы яе насельніцтва ў асобе этнічнай групы цыганоў-рама, руйнуючы іх лагеры і выганяючы іх з краіны. Масавыя высылкі з краіны прадстаўнікоў этнічнай групы цыганоў-рама, якія з'яўляюцца грамадзянамі іншых дзяржаў Еўрасаюза, але не Італіі, істотна павялічыліся пасля 2008 года. Былі выяўлены наступныя парушэнні: дыскрымінацыя і парушэнне правоў цыганоў-рама на годнае жыллё, на сацыяльную, прававую і эканамічную абарону, абарону ад беднасці і сацыяльнага выгнання, а таксама парушэнне права вандроўных сем'яў цыганоў-рама на абарону і дапамогу. Італію таксама крытыкавалі за правядзенне палітыкі, з-за якой цыганы-рама падвяргаюцца жыллёвай сегрэгацыі і пражываюць у вельмі нездавальняючых жыллёвых умовах.

Гл. вэб-сайт Цэнтра па жыллёвых правах і высяленнях: http://www.cohre.org

**Артыкул 31 – права на жыллё**

З мэтай забеспячэння эфектыўнага ажыццяўлення права на жыллё Бакі абавязваюцца прымаць меры, накіраваныя на:

1) садзейнічанне доступу да жылля адэкватнага ўзроўню;

2) прадухіленне і зніжэнне ўзроўню бяздомнасці з мэтай яе паступовай ліквідацыі;

3) забеспячэнне даступнай цаны на жыллё для маламаёмасных людзей.

Еўрапейская сацыяльная хартыя (перагледжаная), 1996 г.

## Клопат пра экалогію ў Швейцарыі

**Таксічная спадчына хімічнай прамысловасці не павінна легчы цяжарам на плечы будучых пакаленняў.**

*Стэфан Вэбер, актывіст Грынпіс*

З 1961 па 1976 г. некалькі буйных хімічных заводаў скінулі больш 114 000 тон таксічных адходаў хімічнай вытворчасці ў былы гліняны кар'ер у Бонфале (Швейцарыя). Сёння скідаць адходы было б супрацьзаконна, але ў 1961 годзе, калі пачалося запаўненне кар'ера, закон падобных звалак не забараняў. Таксічныя адходы там і засталіся, працягваючы атручваць мясцовасць і навакольнае асяроддзе сумессю арганічных і неарганічных забруджвальнікаў.

14 мая 2000 года каля 100 актывістаў арганізацыі «Грынпіс» занялі тэрыторыю хімічнай звалкі ў Бонфале і запатрабавалі, каб хімічныя кампаніі, якія скідалі туды таксічныя адходы, узялі на сябе ўсю адказнасць за яе ачыстку. Актывісты заявілі, што яны будуць заставацца на тэрыторыі звалкі да таго часу, пакуль хімічныя кампаніі не абавяжуцца ачысціць яе так, каб яна больш не ўяўляла небяспекі ні для здароўя людзей, ні для навакольнага асяроддзя.

Гл. вэб-сайт Грынпіс:

www.greenpeace.org

Захоп тэрыторыі звалкі вымусіў хімічныя прадпрыемствы пайсці на сустрэчу з прадстаўнікамі мясцовых суполак і Грынпіс, і, у выніку, яны, нарэшце, падпісалі пагадненне, па якім падрыхтоўка тэхніка-эканамічнага абгрунтавання ачысткі павінна быць завершана да лютага 2001 года, і ў гэтым жа годзе павінны пачацца ачышчальныя работы. Прадпрыемствы таксама пагадзіліся на паўнавартасны ўдзел мясцовых суполак і экалагічных арганізацый у працэсе ачысткі і абавязаліся інфармаваць мясцовыя суполкі аб ступені забруджвання грунтавых вод і пітной вады ў выніку скіду адходаў. 7 ліпеня 2001 г. Грынпіс спыніў сваю акцыю на тэрыторыі звалкі.

## Супрацьдзеянне дыскрымінацыі – Еўрапейскі цэнтр па правах цыганоў-рама

Гл. вэб-сайт Еўрапейскага цэнтра па правах цыганоў-рама: http://www.errc.org

Цэнтр імкнецца да таго, каб праблемы, звязаныя з правамі чалавека ў адносінах да суполак цыганоў-рама, былі выразна прадстаўлены ў палітычным парадку дня ў Еўропе і за яе межамі. Праводзячы дбайныя даследаванні, цэнтр падае падрабязную актуальную інфармацыю пра стан правоў чалавека ў дачыненні да цыганоў-рама, у прыватнасці пра гвалт, з якім яны сутыкаюцца, пра структурныя формы дыскрымінацыі ў адносінах да іх і пра адмову ў доступе да эканамічных і сацыяльных правоў. Цэнтр імкнецца палепшыць сітуацыю з правамі чалавека ў адносінах да суполак рама, падвышаючы інфармаванасць, распрацоўваючы адпаведную палітыку і стратэгію судовых працэсаў. Праведзеныя кампаніі выявілі выпадкі вуснай праявы гвалту і нянавісці ў адносінах да прадстаўнікоў этнічнай групы цыганоў-рама, сегрэгацыі ў галіне адукацыі, прымусовага высялення і стэрылізацыі.

Праца гэтага цэнтра ў сферы адукацыі ў галіне правоў чалавека накіравана, перш за ўсё, на пашырэнне правоў актывістаў рама ў іх барацьбе за нацыянальную роўнасць. Для гэтага арганізуюцца стажыроўкі, даюцца стыпендыі на навукова-даследчую працу, арганізуюцца семінары і публікуюцца навучальныя дапаможнікі, такія як «Ведаць свае правы і змагацца за іх: дапаможнік для актывістаў руху за правы цыганоў-рама».

«Даследаванні, праведзеныя Еўрапейскім цэнтрам па правах цыганоў-рама ў Балгарыі, Венгрыі, Чэшскай Рэспубліцы, Славакіі і Румыніі ў пачатку 2010 года пры садзейнічанні паліцыі, НГА і службаў па барацьбе з гандлем людзьмі, паказалі, што на долю цыганоў-рама прыпадае 50–80 % ахвяр [гандлю людзьмі] у Балгарыі, 40–80 % у Венгрыі, 70 % у Славакіі і да 70 % у некаторых раёнах Чэшскай Рэспублікі».

Інфармацыйны бюлетэнь па правах цыганоў-рама, Еўрапейскі цэнтр па правах цыганоў-рама.

## Алмазныя войны

Global Witness – гэта НГА, якая праводзіць кампаніі для вырашэння канфліктаў, звязаных з прыродакарыстаннем і карупцыяй, што прыводзяць да парушэння адпаведных экалагічных правоў і правоў чалавека. Гэта НГА імкнецца даводзіць да агульнага ведама факты праявы жорсткасці, што вынікаюць з вышэйзгаданага, і прыцягнуць вінаватых да адказнасці.

Гл. іх вэб-сайт:

http://www.globalwitness.org

У цэнтры ўвагі адной з яе кампаній апынуліся канфлікты вакол «крывавых алмазаў» або «спрэчных алмазаў»: справа ў тым, што алмазы залягаюць на тэрыторыях, падкантрольных узброеным бандам і групоўкам, якія не падпарадкоўваюцца законным і прызнаным на міжнародным узроўні ўрадам. Алмазы выкарыстоўваюцца для фінансавання ўзброенай барацьбы супраць гэтых урадаў або для процідзеяння рашэнням Савета Бяспекі ААН. Global Witness сабрала дастаткова доказаў таго, што гэтыя прыродныя рэсурсы выкарыстоўваліся на аплату канфліктаў у Афрыцы, што прывяло да гібелі і перамяшчэння мільёнаў людзей. Тэрарыстычныя групы, такія як Аль-Каіда, таксама выкарыстоўвалі алмазы для фінансавання сваёй дзейнасці і як сродак адмывання грошай. Global Witness у супрацоўніцтве з іншымі НГА актыўна праводзіла бесперапынныя лабісцкія акцыі, у выніку чаго разгарнулася глабальная кампанія за кантроль над алмазаздабыўнай прамысловасцю.

У маі 2000 года прадстаўнікі вядучых краін, што здабываюць алмазы і гандлююць імі, прадстаўнікі алмазнай прамысловасці, а таксама НГА, у тым ліку Global Witness, сустрэліся ў Кімберлі, ПАР, і абвясцілі аб стварэнні ў 2003 годзе міжнароднай сістэмы сертыфікацыі алмазаў, якая атрымала назву «Кімберлійскі працэс». Згодна з гэтай схемай, усе алмазы, прадаваныя краінамі – удзельнікамі пагаднення, павінны быць сертыфікаваны так, каб пакупнікі былі ўпэўнены, што прадукцыя паступіла з тэрыторый, свабодных ад канфліктаў. Global Witness афіцыйна сочыць за выкананнем гэтай сістэмы і працягвае кампанію за ўмацаванне і эфектыўнае выкананне яе правілаў. Яшчэ адна мэта гэтай кампаніі – зрабіць так, каб алмазы больш ніколі не былі «палівам» для канфліктаў, а сталі рухаючай сілай развіцця.

У 2003 годзе Global Witness стала адным з намінантаў на Нобелеўскую прэмію міру за яе ўклад у барацьбу супраць «алмазных» канфліктаў.

## Пандусы для інвалідных вазкоў у Тузле

У 1996 годзе НГА, якая займаецца праблемамі людзей з інваліднасцю, у г. Тузле (Боснія і Герцагавіна), вырашыла правесці кампанію па інфармаванні грамадскасці аб транспартных праблемах. Арганізацыя пад назвай «Лотас» паставіла мэтай прыцягнуць увагу людзей да праблем, з якімі сутыкаюцца людзі з абмежаванымі магчымасцямі, і транспартных праблем і намеціла канкрэтныя задачы, уключаючы стварэнне спецыяльных паркovак для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, палягчэнне доступу ў грамадскі транспарт і забеспячэнне зручнага ўезду на тратуары і на дарогі. Мерапрыемствы праводзіліся на працягу тыдня, як раз напярэдадні выбарчай кампаніі. У выніку дасведчанасць грамадскасці павысілася, а ўсе тратуары ў Тузле былі абсталяваны пандусамі для інвалідных вазкоў!

**З поўнай перакананасцю заяўляю, што ва ўсёй Босніі і Герцагавіне Тузла з'яўляецца самым зручным горадам для людзей у інвалідных вазках.**

*Удзельнік кампаніі, Тузла*

COMPASS

# 4.5 Пытанні і адказы аб правах чалавека

### *Што такое «правы чалавека»?*

Правы чалавека – гэта тое, чым, згодна з нормамі маралі, надзелены кожны чалавек, які жыве ў свеце, проста з той прычыны, што ён чалавек. Дамагаючыся рэалізацыі нашых правоў, мы звяртаемся, як правіла, да ўласнага ўрада з пазіцый маралі, кажучы: так паступаць нельга, таму што гэта – уварванне ў сферу маёй маралі і абраза маёй асабістай годнасці. Ніхто – ні чалавек, ні ўрад – ніколі не можа адабраць у нас нашых правоў чалавека.

### *Адкуль яны ўзяліся?*

Яны паўсталі таму, што чалавек акрамя фізічнай, мае таксама маральную і духоўную сутнасць. Правы чалавека патрэбны для таго, каб абараніць і захаваць чалавечую сутнасць кожнага, каб забяспечыць кожнаму чалавеку годнае жыццё – жыццё, годнае чалавечай асобы.

### *Чаму нехта «павінен» іх паважаць?*

Перш за ўсё таму, што чалавечая сутнасць уключае і маральны складнік. Большасць людзей, калі ім паказаць на тое, што яны ўшчамляюць чыюсьці асабістую годнасць, пастараюцца гэтага не рабіць. Як правіла, людзі не хочуць чыніць шкоды іншым. Аднак цяпер, акрамя маральных санкцый уласнага або чужога сумлення, у большасці краін свету існуюць законы, якія абавязваюць урады паважаць асноўныя правы сваіх грамадзян, нават калі ім гэтага, можа быць, і не хочацца.

### *Хто валодае правамі чалавека?*

Абсалютна ўсе. Злачынцы, кіраўнікі дзяржаў, дзеці, мужчыны, жанчыны, афрыканцы, амерыканцы, еўрапейцы, бежанцы, асобы без грамадзянства, беспрацоўныя, працоўныя, банкіры, асобы, абвінавачаныя ў здзяйсненні тэрарыстычных актаў, працаўнікі дабрачынных устаноў, настаўнікі, танцоры, касманаўты...

### *Нават злачынцы і кіраўнікі дзяржаў?*

Абсалютна ўсе. Злачынцы і кіраўнікі дзяржаў – таксама людзі. Сіла правоў чалавека заключаецца ў тым, што яны прызнаюць усіх роўнымі з пункту гледжання валодання чалавечай годнасцю. Хтосьці часам можа парушыць чые-небудзь правы ці стаць пагрозай для грамадства, і таму можа паўстаць неабходнасць тым ці іншым чынам абмежаваць правы такіх людзей, каб абараніць правы іншых, але толькі ў пэўных межах. Гэтыя межы вызначаюцца як мінімум, неабходны для захавання чалавечай годнасці.

### *Чаму некаторым групам патрабуюцца асаблівыя правы чалавека? Ці азначае гэта, што ў іх больш правоў, чым у іншых людзей?*

Не, не азначае, але некаторыя групы, такія як цыганы-рама ў Еўропе, даліты («недатыкальныя») ці пэўныя касты ў Індыі, так доўга падвяргаліся дыскрымінацыі ў тым ці іншым грамадстве, што спатрэбіліся спецыяльныя меры, каб забяспечыць ім роўны з іншымі людзьмі стандарт правоў чалавека. Было б смешна меркаваць, што пасля доўгіх гадоў укаранёнай дыскрымінацыі і існавання стэрэатыпаў, адкрытай нянавісці і сацыяльных бар'ераў будзе дастаткова проста даць ім агульнапрымянімыя правы, мяркуючы, што гэтага будзе дастаткова для захавання роўнасці.

COMPASS

## *Чаму гаворка ідзе аб правах людзей, а не аб іх адказнасці?*

Нягледзячы на тое, што некаторыя філосафы і НГА вылучылі важкія аргументы на карысць неабходнасці вызначыць меру адказнасці людзей і нават прадставілі ў абарону гэтага доваду свае «кодэксы» ці «дэкларацыі», супольнасць праваабаронцаў у цэлым маўчыць наконт гэтай спрэчкі. Прычына ў тым, што многія ўрады ставяць «дараванне» правоў у залежнасць ад пэўных «абавязкаў», якія накладаюцца на людзей урадам або кіраўніком, з-за чаго сама ідэя правоў чалавека як правоў, якімі ён валодае па праве нараджэння, губляе сэнс. І ўсё ж, зразумела, усе мы – асобныя людзі і групы людзей – павінны з усёй адказнасцю ставіцца да правоў іншых, не злоўжываць імі, але паважаць і прасоўваць, як свае ўласныя правы. І ў гэтым кантэксце артыкул 29 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека прызнае, што: «1. Кожны чалавек мае абавязкі перад грамадствам, у якім толькі і магчыма свабоднае і поўнае развіццё яго асобы. 2. Пры ажыццяўленні сваіх правоў і свабод кожны чалавек павінен спазнаць толькі такія абмежаванні, якія ўстаноўлены законам выключна з мэтай забеспячэння належнага прызнання і павагі правоў і свабод іншых і задавальнення справядлівых патрабаванняў маралі, грамадскага парадку і агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве».

## *Хто сочыць за выкананнем правоў чалавека?*

Усе мы павінны за гэтым сачыць. Існуюць законы, як нацыянальныя, так і міжнародныя, якія абмяжоўваюць свабоду дзеянняў урадаў у дачыненні да сваіх грамадзян, але, калі ніхто ім не пакажа на тое, што сваімі дзеяннямі яны парушаюць міжнародныя нормы, урады могуць беспакарана працягваць парушэнні. Кожны з нас як асоба павінен у паўсядзённым жыцці не толькі паважаць правы іншых, але і ўважліва сачыць за дзеяннямі нашых і не нашых урадаў. Сістэмы абароны правоў існуюць для таго, каб усе мы маглі імі скарыстацца.

## *Як я магу абараніць свае правы?*

Паспрабуйце звярнуць увагу іншых на тое, што вашы правы былі парушаны; запатрабуйце іх выканання. Дайце супрацьлегламу боку зразумець: вам вядома, што ён не мае права абыходзіцца з вамі падобным чынам. Вылучыце адпаведныя артыкулы ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Канвенцыі аб абароне правоў чалавека ці іншых міжнародных дакументах. Калі адпаведныя законы ёсць у вашай уласнай краіне, спашліцеся і на іх. Паведаміце іншым аб тым, што здарылася: паведаміце прэсе, напішыце вашаму дэпутату парламента і кіраўніку дзяржавы, праінфармуйце пра гэта НГА, якія займаюцца правамі чалавека. Спытайце ў іх рады. Калі ёсць магчымасць, пагаварыце з адвакатам. Паспрабуйце зрабіць так, каб ураду стала вядома аб вашых дзеяннях. Дайце яму зразумець, што вы не збіраецеся адступаць. Прадэманструйце падтрымку, на якую вы можаце разлічваць. Нарэшце, калі ўсё астатняе не дапамагло, вы можаце звярнуцца ў суд.

## *Як мне звярнуцца ў Еўрапейскі суд па правах чалавека?*

Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод вызначае працэдуры разгляду індывідуальных скаргаў. Аднак прыняцце спраў да разгляду рэгламентуецца строгімі патрабаваннямі. Напрыклад, да падачы справы ў Еўрапейскі суд вы павінны пацвердзіць, што ваша скарга ўжо падавалася ў нацыянальныя суды вашай краіны (аж да самай вышэйшай інстанцыі!). Калі вы хочаце паспрабаваць і лічыце, што ваша скарга адказвае ўстаноўленым патрабаванням, яе можна прадставіць. Аднак вам настойліва рэкамендуецца звярнуцца за радай да юрыста або НГА, якія дзейнічаюць у гэтай галіне, і пераканацца, ці сапраўды ў вас ёсць рэальны шанц на поспех. Майце на ўвазе, што вынясенню канчатковага рашэння можа папярэднічаць працяглы і складаны працэс!

### *У каго мне патрабаваць выканання маіх правоў?*

Захавання амаль усіх асноўных правоў чалавека, пералічаных у міжнародных пагадненнях, вы павінны патрабаваць ад урада вашай краіны ці ад афіцыйных службовых асоб дзяржавы. Правы чалавека абараняюць вашы інтарэсы ад замахаў дзяржавы, таму вы павінны патрабаваць іх выканання ад дзяржавы або ад яе прадстаўнікоў. Калі вы лічыце, што вашы правы парушаюцца, напрыклад вашым працадаўцам або суседам, вы не можаце наўпрост спасылацца на міжнародныя законы аб правах чалавека, за выключэннем тых выпадкаў, калі ўрад вашай краіны быў абавязаны прыняць меры, каб не дапусціць такіх дзеянняў працадаўцаў або суседзяў.

### *Ці ляжыць на кім-небудзь абавязак абараняць мае правы?*

Так. Права не мае сэнсу, калі на некага не ўскладзены адпаведная адказнасць ці абавязак. Маральны абавязак не замахвацца на вашу асабістую годнасць ускладзены на кожнага чалавека, але ўрад вашай краіны, падпісаўшы міжнародныя пагадненні, нясе не толькі маральную, але і юрыдычную адказнасць.

### *Правы чалавека з’яўляюцца праблемай толькі ў недэмакратычных краінах?*

Нават сёння ў свеце няма такой краіны, дзе б заўсёды цалкам выконваліся ўсе правы чалавека. У адных краінах парушэнні могуць адбывацца часцей, чым у іншых, закранаць большую ці меншую частку насельніцтва, але ўсякае, нават адзінкавае парушэнне ўяўляе праблему, якая не павінна была ўзнікнуць і якой трэба займацца. Чалавеку, чые правы былі парушаны ў краіне, дзе дэмакратыя ўстанавілася ўжо даўно, наўрад ці будзе лягчэй ад таго, што ў цэлым у яго краіне становішча з выкананнем правоў чалавека лепш, чым у іншых краінах свету.

### *Ці дамагліся мы прагрэсу ў барацьбе з парушэннямі правоў чалавека?*

Так, і вялікага прагрэсу – нават калі часам ён і здаецца кропляй у моры. Успомніце пра выкараненне рабства, пра тое, што жанчыны атрымалі права голасу, пра краіны, якія адмянілі смяротную кару, пра вызваленне вязняў сумлення ў выніку міжнароднага ціску, пра крах рэжыму апартэіду ў Паўднёвай Афрыцы, пра справы, разгледжаныя ў Еўрапейскім судзе, і законы, змененыя ў выніку гэтага. Задумайцеся над тым, што паступовае развіццё культуры міжнародных зносін азначае, што нават найбольш аўтарытарным рэжымам даводзіцца сёння лічыцца з правамі чалавека, калі яны хочуць быць прынятымі на міжнароднай арэне. Станоўчых вынікаў было дасягнута шмат, асабліва за апошнія 50 гадоў, але значна больш яшчэ трэба будзе зрабіць.

# 4.6 Пытанні на засыпку

*Як можна сцвярджаць, што правы чалавека ўніверсальныя, калі ва ўсім свеце ёсць людзі, якія пакутуюць ад парушэння іх правоў?*

І ўсё ж гэтыя людзі маюць права. Тое, што з імі абыходзяцца падобным чынам, супярэчыць не толькі маральным нормам, але і ўзгодненым міжнародным нормам. Прадстаўнікі дзяржаў-парушальнікаў лічацца вінаватымі ў адпаведнасці з міжнародным правам, і некаторыя краіны за гэта рэальна «караюцца» міжнароднай супольнасцю шляхам прымянення санкцый ці нават ваеннымі сродкамі. Аднак ва ўжыванні такіх мер часта магчыма самавольства, паколькі яны залежаць не столькі ад ступені парушэння правоў, колькі ад інтарэсаў іншых краін. З заснаваннем Міжнароднага крымінальнага суда з'явілася магчымасць трохі наблізіцца да ліквідацыі гэтай юрыдычнай хібы. Будучы першым пастаянна дзеючым на падставе палажэнняў Рымскага статута судовым органам, гэты суд зможа дапамагчы пакласці канец беспакаранасці тых, хто здзейсніў, на думку міжнароднай супольнасці, найбольш сур'ёзныя злачынствы: генацыд, злачынствы супраць чалавецтва і ваенныя злачынствы.

*Якая карысць ад Універсальнай дэкларацыі правоў чалавека, калі няма механізму яе правапрымянення?*

Хоць міжнароднага суда, які судзіў бы ўрады па артыкулах Універсальнай дэкларацыі правоў чалавека, пакуль што не існуе, гэты дакумент мае велізарную гістарычную значнасць і нават сёння працягвае быць міжнародным эталонам для ацэнкі дзейнасці ўрадаў. Сёння ўрады ведаюць, што ў выпадку наўмыснага парушэння пералічаных у дэкларацыі правоў чалавека ім пагражае перспектыва асуджэння ці нават прыняцця нейкіх санкцый урадамі іншых краін. Працэс гэты не заўсёды цалкам аб'ектыўны (!), але ўсё ж такі пачатак пакладзены. Дэкларацыя таксама стала фундаментам амаль усіх распрацаваных міжнародных пагадненняў, якія (у большай ці меншай ступені) забяспечаны механізмам правапрымянення.

*Якая мне карысць ад «правоў чалавека», калі ўрад маёй краіны штодня парушае правы простых людзей і асуджэнне з боку міжнароднай супольнасці яго ніколькі не турбуе?*

Зноў жа, гэта толькі пачатак, такія правы лепш, чым наогул ніякіх. У пэўных абставінах і пры правільным падыходзе правы чалавека могуць аказаць уздзеянне на ўрад, і ён зменіць сваю практыку, калі не цалкам, то часткова. Часам – у выпадку асабліва грубых або асабліва частых парушэнняў – такое змяненне можа здацца нязбытнай марай, але гісторыя неаднаразова даказвала, што і гэта магчыма. Да таго ж, для гэтага сёння існуе больш магчымасцей, чым было да нядаўняга часу. Працэс перамен можа ісці павольна, але ўжо той факт, што людзі маюць пэўныя правы, якія атрымліваюць усё больш шырокае прызнанне ва ўсім свеце (і, такім чынам, звяртаюць на сябе хоць нейкую ўвагу ўрадаў), дае нам магутную зброю і важную перавагу.

*Калі я паважаю правы іншых, ці азначае гэта, што я павінен(-нна) дазваляць ім рабіць усё, што ім уздумаецца?*

Не, не азначае – калі іх жаданні прывядуць да парушэння вашых або чыіхсьці яшчэ правоў. Аднак, магчыма, варта задумацца, ці не выстаўляеце вы празмерных патрабаванняў у дачыненні да аб'ёму вашых правоў – чыесьці паводзіны могуць вас раздражняць ці здавацца няправільнымі, але яны зусім не абавязкова будуць парушэннем вашых правоў. Таму, калі вы хочаце, каб іншыя дазвалялі вам паводзіць сябе так, як вам хочацца, трэба выхоўваць у сабе больш памяркоўнае стаўленне да паводзін іншых!

### *Абараняючы свае правы, ці магу я ўжываць любыя меры, уключаючы гвалтоўныя?*

Як правіла, не. Але ў выпадку сапраўднай самаабароны дапушчальна законнае выкарыстанне сілы ў адпаведнасці са ступенню небяспекі, якая вам пагражае. Выкарыстанне сілы недапушчальна ў мэтах «помсты» за зробленае вам зло і магчыма толькі для прадухілення далейшай шкоды. Катаванні недапушчальны ні пры якіх абставінах.

### *Чаму я павінен(-нна) паважаць правы іншых, калі іншыя не паважаюць мае правы?*

Па-першае, таму, што, не паважаючы правы іншых, вы самі ж можаце нажыць сабе непрыемнасці; па-другое, таму, што іншыя заслугоўваюць вашай павагі проста з той прычыны, што яны людзі; і, па-трэцяе, таму, што тым самым вы падаяце іншым прыклад, павялічваючы верагоднасць таго, што і да вас таксама будуць ставіцца з павагай. Зрэшты, у канчатковым выніку ўсё залежыць ад вас, ад таго, якім чалавекам вы хочаце быць і ў якім свеце вы хочаце жыць. Так што вы можаце задумацца, што скажа пра вас той факт, што вы будзеце паводзіць сябе падобна тым, чые паводзіны вам не падабаюцца. Або падумайце, якім быў бы наш свет, калі б усе парушалі правы адзін аднаго па прынцыпе «вока за вока».

### *Чаму тых, хто парушае правы іншых самым бесчалавечным чынам, трэба лічыць годнымі правоў «чалавека»?*

Пагадзіцца з гэтай часткай тэорыі правоў чалавека, мабыць, наколькі цяжка, настолькі і неабходна. Часам можа здацца, што ў некаторых людзях так мізэрна мала чалавечых якасцей, што людзьмі іх можна лічыць толькі ўмоўна. У гэтай сувязі, як відаць, важна адзначыць наступнае:

• па-першае, нягледзячы на ўяўную бесчалавечнасць некаторых людзей, якая-небудзь чалавечнасць прысутнічае ў кожным. Злачынцы любяць сваіх маці, дзяцей, мужоў і жонак – яны хоць каго-небудзь ды любяць. Злачынцы адчуваюць боль, адзіноту, роспач і рэўнасць і хочуць, каб іх прызнавалі, шанавалі, падтрымлівалі, любілі і разумелі. Усім ім – усім да аднаго – знаёмы калі не большасць, то хоць нейкія з гэтых чыста чалавечых пачуццяў. І гэта робіць іх людзьмі, прычым людзьмі, годнымі нашай павагі;

• па-другое, жадаючы прычыніць злачынцам такія ж пакуты, якія яны прычынілі іншым, мы не зробім сабе нічога добрага: падобныя пачуцці толькі робяць нас менш годнымі павагі;

• па-трэцяе, нават калі раптам аб'явіцца злачынец у «чалавечым» абліччы, але пазбаўлены якіх бы там ні было чалавечых уласцівасцей (а такога ніколі яшчэ не бывала), хто з нас мог бы з поўнай упэўненасцю сказаць, што гэта «Не Чалавек»? Якімі крытэрыямі мы б кіраваліся? Можа, тым, што ён не здольны любіць і быць любімым? Але што, калі мы памылімся ў гэтым меркаванні?

Трэці пункт нагадвае, што нам варта задумацца, як рызыкоўна для чалавецтва ў цэлым даручаць адным людзям судзіць іншых, калі наступствы такога суда страшныя і незваротныя. Няўжо мы сапраўды хочам стварыць свет, дзе падобныя прысуды будуць магчымы і дзе асобным людзям будзе проста адмоўлена ў правах чалавека і, такім чынам, у праве называцца чалавекам? Але без абсалютнай універсальнасці ўсіх правоў чалавека менавіта такі свет мы і атрымаем.

## Спасылкі

"Europe, Youth, Human Rights, Report of the Human Rights Week", by Yael Ohana (ed.), European Youth Centre, Budapest, 2000.
Garzón Valdés, E., "Confusiones acerca de la relevancia moral de la diversidad cultural", CLAVES de Razón Práctica, No. 74, Madrid, Julio / Agosto, 1997.
«Правы чалавека», базавы дапаможнік для супрацоўнікаў ААН, Упраўленне Вярхоўнага камісара па правах чалавека, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, Жэнева, 2001 г.
Даступны на сайце: http://www.ohchr.org/Documents/Publications/HRhandbooken.pdf
Levin, L., Human Rights, Questions and Answers, Unesco, Paris, 1996.
Donnelly, Jack, Universal Human Rights in theory and practice, Cornell University Press, 1989.
Freeman, Michael, Human Rights: Key Concepts, Polity Press, London 2002.
Ishay, Micheline R. ed., The Human Rights Reader, Routledge, London, 1997.
Rishmawi, M., The Arab Charter on Human Rights and the League of Arab States: An Update, Human Rights Law Review, 10.1, pp. 169–178
Symonides, Janusz ed., Human Rights: New Dimensions and Challenges, Manual on Human Rights, Unesco / Dartmouth Publishing, Paris, 1998.
Robertson A. and Merrills J, Human rights in the world, Manchester University Press, 1996. Сайт Савета Еўропы па біяэтыцы: www.legal.coe.int/bioethics
http://www.udhr.org/history/biographies/bioer.htm, цытата Элеаноры Рузвельт.
Hanski, R., Suksi, M. (eds.), An introduction to the international protection of human rights: a textbook, Åbo Akademi University Institute for Human Rights, 1999.
Інфармацыйны бюлетэнь № 2 (рэд. 1), Міжнародны біль аб правах чалавека. Упраўленне Вярхоўнага камісара па правах чалавека, www.unhchr.ch/html/menu6/2/fs2.htm.
Вярхоўны камісар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, www.unhchr.ch.
Кароткі даведнік па Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека. Выданне Савета Еўропы. Еўрапейскі суд па правах чалавека, www.echr.coe.int.
Камітэт па прадухіленні катаванняў і бесчалавечнага ці зневажальнага абыходжання або пакарання, www.cpt.coe.int.
Сайт Савета Еўропы па гендарнай роўнасці, www.coe.int/t/dghl/standardsetting/equality/default_en.asp
Еўрапейская сацыяльная хартыя, www.coe.int/T/DGHL/Monitoring/SocialCharter.
Рамачная канвенцыя па абароне нацыянальных меншасцей, www.coe.int/t/dghl/monitoring/minorities.
Сайт Еўрапейскай камісіі па барацьбе з расізмам і нецярпімасцю, www.coe.int/t/dghl/monitoring/ecri. Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, www.ohchr.org.
Камісар Савета Еўропы па правах чалавека, www.coe.int/t/commissioner
Risse T., Ropp S., Sikkink K., The Power of human rights, Cambridge University Press, 1999.
Forsythe, D., Human rights in International Relations, Cambridge University Press, 2000. www.speaktruth.org
Hijab, Nadia, Human Rights and Human Development: Learning from Those Who Act, HDRO Background paper, 2000.

[1]Спецыяльны дакладчык ААН па пытаннях традыцыйных практык, якія шкодзяць здароўю жанчын і дзяўчынак.

[2]http://www.udhr.org/history/biographies/bioer.htm

Глава 5

# Даведачная інфармацыя пра глабальныя тэмы правоў чалавека

# Змест гэтай главы


| | |
|---|---|
| Уводзіны ў главу 5 з унесенымі зmяненнямі | 433 |
| Дзеці | 435 |
| Грамадзянскасць і ўдзел | 436 |
| Культура і спорт | 437 |
| Дэмакратыя | 438 |
| Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці | 439 |
| Дыскрымінацыя і нецярпімасць | 440 |
| Адукацыя | 441 |
| Навакольнае асяроддзе | 442 |
| Гендарныя пытанні | 443 |
| Глабалізацыя | 444 |
| Здароўе | 445 |
| СМІ | 446 |
| Міграцыя | 447 |
| Мір і гвалт | 448 |
| Беднасць | 449 |
| Рэлігія і вера | 450 |
| Гістарычная памяць | 451 |
| Вайна і тэрарызм | 452 |
| Праца | 453 |

# Уводзіны ў главу 5 з унесенымі зьяненнямі

Глава 5 «Компаса» выдання 2012 года змяшчала больш за 150 старонак даведачнай інфармацыі, звязанай з дзевятнаццаццю глабальнымі тэмамі правоў чалавека, якія былі вызначаны як асабліва актуальныя для моладзі. Мэта дадзенай інфармацыі – даць агульны агляд кожнай тэмы з уключэннем базавых звестак, дастатковых для вызначэння дзейнасці ў кантэксце палітыкі, грамадства і правоў чалавека. Ідэя заключалася ў тым, каб фасілітатар быў упэўнены ў дастатковасці інфармацыі для распачынання дзейнасці. Пры гэтым яна не была занадта падрабязнай, каб не здавацца цяжкай.

Выданне 2015 года «Компаса» надрукавана без уключэння зыходнай главы 5. Гэта абумоўлена не тым, што фасілітатары могуць абысціся без даведачнай інфармацыі – яна, безумоўна, мае вельмі важнае значэнне, а тым, што такая інфармацыя павінна адлюстроўваць актуальныя даныя ў дачыненні да падзей, якія зараз адбываюцца, палітычных змяненняў і меркаванняў наконт правоў чалавека. Напрыклад, у сувязі з апошнімі падзеямі ў Сірыі, Нарвегіі і Парыжы ўзніклі новыя пытанні, звязаныя з тэмай вайны і тэрарызму. Значнае павелічэнне колькасці мігрантаў, якія перасякаюць Міжземнае мора, і ўвогуле змены ў стаўленні да імігрантаў у Еўропе, прынамсі палітыкамі, заслугоўваюць згадвання ў даведачнай інфармацыі ў раздзелах, прысвечаных міграцыі, дыскрымінацыі і нецярплівасці.

Па меры развіцця падзей паступова змяняюцца і праблемы ў вобласці правоў чалавека. У мінулым мірыліся з рабствам і выступалі ў падтрымку смяротнай кары, а зараз гэта разглядаецца ў якасці парушэння правоў чалавека. У цяперашні час дылемамі ў галіне правоў чалавека з'яўляюцца, напрыклад, канфлікты правоў наконт свабоды выказвання меркавання і пэўных культурных практык, якія негатыўна ўплываюць на здароўе жанчын і дзяцей. Усе пытанні належыць пастаянна абмяркоўваць і пераглядаць, каб паглыбіць разуменне правоў чалавека на нашым шляху да ўніверсальнай культуры правоў чалавека.

Найлепшы спосаб захоўваць актуальнасць даведачнай інфармацыі – апублікаваць яе ў Інтэрнэце, дзе яе з лёгкасцю можна абнаўляць. Раней Інтэрнэт не быў так шырока распаўсюджаны і некаторыя карыстальнікі «Компаса» маглі што-небудзь прапусціць. Аднак зараз доступ стаў прасцей і лагічным было б размясціць даведачную інфармацыю анлайн на сайце www.coe.int/compass.

Абарона правоў чалавека з'яўляецца абавязкам кожнага. У сувязі з гэтым мы запрашаем – настойліва просім – усіх карыстальнікаў «Компаса» выказваць свае меркаванні і заўвагі, каб «Компас» у цэлым і глава 5 у прыватнасці заставаліся карыснымі дакументамі. Форма зваротнай сувязі даступна на сайце www.coe.int/compass.

## *Тэмы і даведачная інфармацыя*

Выданне «Компаса» 2012 года будавалася вакол дзевятнаццаці глабальных тэм правоў чалавека, якія, як было вызначана, маюць асаблівую цікавасць для моладзі. Канчатковы спіс тэм быў складзены ў выніку абмеркавання і аналізу зваротнай сувязі паміж Саветам Еўропы, каардынацыйнага камітэта «Компаса», аўтарамі дапаможніка і сеткай актывістаў у сферы правоў чалавека. Мэтай напісання «Компаса» было стварэнне такога дапаможніка па адукацыі ў галіне правоў чалавека, якім можна было б карыстацца незалежна

ад папярэдніх ведаў у гэтай вобласці. Для гэтага спатрэбілася напісанне даведачнай інфармацыі, якая бы задаволіла патрэбы людзей, якія толькі пачынаюць знаёміцца з гэтымі тэмамі і правамі чалавека; інфармацыя павінна быць простай, але не спрошчанай, мэтанакіраванай і дастатковай. Такім чынам, розныя артыкулы распрацоўваліся, разглядаліся і зацвярджаліся ў рамках доўгага працэсу, каб забяспечыць правільнасць, актуальнасць і збалансаванасць інфармацыі. Вынікам працы стала глава 5, дзе кожная з дзевятнаццаці глабальных тэм правоў чалавека была прадстаўлена і змяшчала наступнае:

- азначэнні і ключавыя паняцці;
- праблемы, дакументы і ўстановы;
- пытанні, якія асабліва датычацца моладзі;
- пытанні для чытача, якія б наводзілі на асэнсаванне дылем і праблем;
- апісанне ролі і працы Савета Еўропы;
- крыніцы, важныя арганізацыі, НГА, спасылкі на сайты і дадатковая літаратура па тэме.

Уся зыходная глава 5 даступна ў Інтэрнэце на сайце www.coe.int/compass. Ніжэй прапаноўваецца кароткі агляд інфармацыі, якую можна знайсці ў Інтэрнэце. Мы спадзяёмся, што гэтыя невялікія тэксты заахвоцяць чытачоў наведаць сайт www.coe.int/compass, каб падрыхтавацца да правядзення практыкаванняў. Важна звярнуць увагу карыстальнікаў на тое, што змесціва главы 5 у Інтэрнэце не павінна разглядацца ў якасці канчатковых тэкстаў. Яны з’яўляюцца спробай прадставіць разуменне праблем на момант іх напісання.

## *Забеспячэнне актуальнасці даведачнай інфармацыі*

Мы спадзяёмся, што нашы карыстальнікі будуць дапамагаць нам захоўваць даведачную інфармацыі актуальнай і важнай, і будзем рады вашым каментарыям і ідэям. Вы можаце звязацца з намі на сайце www.coe.int/compass праз форму зваротнай сувязі. Дзякуем!

# Дзеці






**Практыкаванні па тэме**

Сыграем гэта!
Гісторыя Ашыка
Правы дзяцей
Ці ёсць у нас альтэрнатывы?
Адукацыя для ўсіх
Улада кветак
Пачуць голас кожнага
Варыянты нашай будучыні
Убачыць свае магчымасці
Кіданне камянёў

У міжнародных нормах у вобласці правоў чалавека змяшчаецца вызначэнне дзіцяці як асобы ва ўзросце да 18 гадоў. У 2005 годзе, згодна з інфармацыяй, атрыманай ад ЮНІСЕФ, усяго ў свеце налічвалася 2,2 млрд дзяцей, 200 мільёнаў з якіх жылі ў Еўропе.

Агульнапрызнаным з'яўляецца той факт, што дзеці маюць асаблівую патрэбу ў клопаце і дапамозе. Па гэтай прычыне яны маюць сваё ўласнае правааховўнае пагадненне. Канвенцыя аб правах дзіцяці (КПД) была прынята Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый у 1989 годзе. У аснове ўсёй Канвенцыі ляжаць чатыры кіруючыя прынцыпы: забарона дыскрымінацыі, найлепшыя інтарэсы дзіцяці, права на жыццё, выжыванне і развіццё і павага да поглядаў дзіцяці.

У главе 5 анлайн-дакумента разглядаюцца такія пытанні, як вулічныя дзеці, гандаль людзьмі, цялесныя пакаранні, кіберцкаванне і выявы сцэн сексуальнага гвалту, а таксама сексуальны гвалт і дзіцячыя амбудсмены.

# Грамадзянскасць і ўдзел






**Практыкаванні па тэме**

Мячэць у Сліпівілі
Сыграем гэта!
Увага, мы ўсё бачым!
Адукацыя для ўсіх?
Выбірай!
Змагары за правы
Гераіні і героі
Пачуць голас кожнага
Вузы супрацоўніцтва
На лесвіцы
Электрастанцыя
Аповесць пра два гарады
Галасаваць ці не галасаваць
Пасяджэнне прафсаюза
Дзе вы стаіце?

## Што такое грамадзянскасць?

Традыцыі грамадзянскасці і адносіны да яго мяняюцца на працягу гісторыі і ва ўсім свеце ў залежнасці ад краін, гісторый, супольнасцей, культур і ідэалогій, а іх разнастайнасць прыводзіць да розных разуменняў канцэпцыі грамадзянскасці. Сёння найбольш агульнае разуменне гэтай канцэпцыі звязана з юрыдычнымі адносінамі паміж індывідуумам і дзяржавай; тое, што і грамадзянства. У артыкуле 15 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека прызнаецца права на грамадзянства, права змяняць сваё грамадзянства і права не быць пазбаўленым грамадзянства.

Удзел у культурным і палітычным жыцці прызнаецца ў шэрагу міжнародных дамоўленасцей у галіне правоў чалавека. Дрэннае здароўе, нізкі ўзровень адукацыі, абмежаванні ў адносінах да свабоднага выказвання меркаванняў, беднасць і г. д. – усё гэта ўплывае на нашу магчымасць прымаць удзел у працэсах і структурах, якія закранаюць нас і нашы правы. Таксама без удзелу мы не можам пабудаваць грамадства, заснаванае на правах чалавека.

У главе 5 анлайн-дакумента можна знайсці інфармацыю пра правы моладзі і іх рэальнае становішча; пра магчымасці розных груп маладых людзей рэалізаваць свае права на грамадзянства і пра шэраг пытанняў ад маніпуляцый да сумеснага прыняцця рашэнняў. Усё гэта можа разглядацца пад загалоўкам «Удзел».

Савет Еўропы вядзе вельмі моцную маладзёжную палітыку і актыўна заахвочвае маладых людзей у сваю працу.

# Культура і спорт






**Практыкаванні па тэме**
Вернікі
Хвіліначку
Мака-кітабоі
Тэгі памяці
На лесвіцы
Адказ расізму
Спорт для ўсіх

Культурныя правы былі ўпершыню выкладзены ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ў артыкуле 27: кожны чалавек мае права свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці грамадства, атрымліваць асалоду ад мастацтва і ўдзельнічаць у навуковым прагрэсе і карыстацца яго дабротамі. З іншага боку, ні ў адной з дэкларацый або пактаў аб абароне правоў чалавека не змяшчаецца канкрэтнага згадвання спорту. Спорт з’яўляецца ўніверсальным аспектам усіх культур, які звязаны з многімі правамі чалавека. Акрамя таго, спорт распаўсюджаны сярод моладзі, таму мы і вырашылі ўключыць яго ў якасці глабальнай тэмы правоў чалавека ў «Компас». Спорт таксама з’яўляецца важнай часткай права на здароўе. Існуе шмат парушэнняў правоў чалавека, звязаных са спортам, якія падрываюць годнасць і павагу асобы, напрыклад, выкарыстанне допінгу, які паляпшае спартыўныя вынікі, «прафесійныя фалы», расізм і футбол – гэта толькі некаторыя моманты з тых, што прыведзены ў главе 5 анлайн-дакумента.

Там таксама можна знайсці інфармацыю пра гульцоў, якія служаць у якасці прыкладаў для пераймання, паралімпійскія гульні і абмеркаванне пытання «Ці павінны паважацца ўсе культурныя практыкі?»

# Дэмакратыя




**Практыкаванні па тэме**
Выбірай!
Вузы супрацоўніцтва
Галасаваць ці не галасаваць
Пасяджэнне прафсаюза

Тэрміну «дэмакратыя» даволі цяжка даць азначэнне. Прасцей кажучы, яе можна разглядаць як «улада народа». Сувязь паміж правамі чалавека і дэмакратыяй глыбокая і носіць двухбаковы характар: кожная нейкім чынам залежыць ад іншай і з'яўляецца без яе няпоўнай. Правы на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі (УДПЧ, артыкул 18), свабода выказвання меркаванняў (УДПЧ, артыкул 19) і свабода мірных сходаў і аб'яднанняў (УДПЧ, артыкул 20) непарыўна звязаны з ідэяй дэмакратыі. Аднак любое парушэнне іншых правоў таксама будзе ўплываць на тое, у якой ступені народ можа прымаць удзел у кіраванні краінай. Беднасць, дрэннае здароўе або адсутнасць жылля – усё гэта можа ўскладніць магчымасць прымаць удзел. Удзел у дэмакратыі мае важнае значэнне для маладых людзей. Тут можна працытаваць: «Калі асобы, якія дасягнулі 16-гадовага ўзросту, лічацца дастаткова сталымі для ўступлення ў шлюб і для таго, каб працаваць, ці не павінны яны мець магчымасць галасаваць?»

У главе 5 анлайн-дакумента можна знайсці інфармацыю пра ўсё вышэйзгаданае, а таксама звесткі пра развіццё дэмакратыі, розныя мадэлі, якія існуюць у сучасным свеце, і шматлікія праблемы, звязаныя з дэмакратыяй.

# Інваліднасць і дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці




**Практыкаванні па тэме**

Змяніце свае акуляры
Розныя зарплаты
Я хачу працаваць
Убачыць свае магчымасці
Спорт для ўсіх

Агульнапрызнанага вызначэння «інваліднасці» не існуе. У Канвенцыі ААН аб правах людзей з інваліднасцю (2006 г.) заяўляецца, што «інваліднасць – гэта паняцце, якое эвалюцыяніруе, і што інваліднасць з'яўляецца вынікам узаемадзеяння, якое адбываецца паміж людзьмі з расстройствамі і бар'ерамі, абумоўленымі міжасабовымі адносінамі і асяроддзем, і якое замінае іх поўнаму і эфектыўнаму ўдзелу ў жыцці грамадства нароўні з іншымі».

Дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці можа быць вызначана як дыскрымінацыйныя, прыгнятальныя, абразлівыя паводзіны, звязаныя з перакананнем у тым, што людзі з інваліднасцю з'яўляюцца непаўнацэннымі ў параўнанні з іншымі.

Дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці ўяўляе сабой праблему ў галіне правоў чалавека тады, калі, напрыклад, адсутнічае або абмяжоўваецца права на роўны доступ да занятасці, культуры або сямейнага жыцця. Еўгенічныя праграмы, падобныя да тых, якія практыкаваліся нацыстамі, што прывяло да забойства больш чым 200 000 людзей з інваліднасцю, парушаюць права на жыццё. А як быць з працэдурамі дародавых даследаванняў і правам жанчын, якія вырашылі зрабіць аборт? Гэтыя супярэчныя пытанні прадстаўлены ў главе 5 анлайн-дакумента.

# Дыскрымінацыя і нецярпімасць

**Практыкаванні па тэме**

Мячэць у Сліпівілі
Доступ да лекаў
Усе розныя – усе роўныя
Вернікі
Можна ўвайсці?
Розныя зарплаты
Доста!
Гераіні і героі
Я хачу працаваць!
Моўны бар'ер
Пагаворым пра секс
Шлях у краіну Роўнасці
Адказ расізму
Убачыць свае магчымасці!
Зрабі крок наперад
Хто я такія?
Праца і дзеці




Дыскрымінацыя і нецярпімасць з'яўляюцца двюма з найбольш распаўсюджаных формаў паводзін, якія прыводзяць да парушэнняў правоў чалавека. Дыскрымінацыя ўзнікае тады, калі з людзьмі абыходзяцца горш, чым з іншымі ў аналагічнай сітуацыі, толькі таму, што яны належаць, або мяркуецца, што яны належаць да пэўнай групы ці катэгорыі асоб. Нецярпімасць – гэта адсутнасць павагі да практык або перакананняў, якія адрозніваюцца ад уласных.

Прынцыпы роўнасці і недыскрымінацыі выкладзены ў артыкулах 1 і 2 УДПЧ і ў артыкуле 14 ЕКПЧ. Дыскрымінацыя мае прамыя наступствы ў дачыненні да тых людзей і груп, якія падвяргаюцца дыскрымінацыі ў сілу свайго ўзросту, інваліднасці, нацыянальнасці, паходжання, палітычных перакананняў, расавай прыналежнасці, рэлігіі, палавой або гендарнай прыналежнасці, сексуальнай арыентацыі, мовы, культуры і па многіх іншых прыкметах. Часам мы ажыццяўляем так званую «пазітыўную дыскрымінацыю» (робім пазітыўныя дзеянні) у мэтах ліквідацыі няроўнасці, напрыклад, укладваючы сродкі ў бедныя сельскія раёны, каб дапамагчы маладым людзям шляхам павышэння магчымасці працаўладкавання і адукацыі. Мы задаём пытанне: ці можна наогул апраўдаць дыскрымінацыю?

У главе 5 анлайн-дакумента праводзіцца абмеркаванне гэтага і іншых пытанняў, у тым ліку механізмаў, якія падтрымліваюць структурную няроўнасць у дэмакратычных супольнасцях праз «тыранію большасці». Вы таксама знойдзеце падрабязную інфармацыю аб стэрэатыпах і забабонах і розных формах дыскрымінацыі, пералічаных вышэй, а таксама аб антысемітызме, цыганафобіі і антыцыганскіх настроях.

# Адукацыя







**Практыкаванні па тэме**
Правы дзяцей
Адукацыя для ўсіх?
Колькі нам патрэбна?
Пачуць голас кожнага
Маё жыццё не шоу
Шлях у краіну Роўнасці
Хутка састарэе

Адукацыя – гэта працэс, з дапамогай якога грамадства перадае назапашаныя веды, навыкі і каштоўнасці ад аднаго пакалення да іншага. Яна адначасова з'яўляецца адным з правоў чалавека і неабходным сродкам для рэалізацыі іншых правоў чалавека. З-за важнасці адукацыі дзве з вызначаных ААН Мэт развіцця тысячагоддзя звязаны з адукацыяй. Мэта 2: забяспечыць, каб да 2015 года ўсе дзеці свету, як хлопчыкі, так і дзяўчынкі, завяршалі атрыманне поўнага курса пачатковай школьнай адукацыі, і Мэта 3: заахвочваць гендарную роўнасць і пашырэнне правоў жанчын шляхам ліквідацыі гендарнай няроўнасці ў адукацыі. Тым не менш, нягледзячы на намеры, у 2011 годзе, паводле ацэнак, 57 мільёнаў дзяцей ва ўсім свеце да гэтага часу не ходзяць у школу, 69 мільёнаў падлеткаў не маюць базавых навыкаў, назапашаных пры атрыманні няпоўнай сярэдняй адукацыі, і ў многіх краінах захоўваецца гендарная няроўнасць.

Доступ да адукацыі – гэта такі фактар, які ўплывае на ўсіх маладых людзей і наконт якога яны маюць сваё дакладнае меркаванне. Акрамя таго, іх выключнае становішча заключаецца ў іх імкненні дзейнічаць, і, такім чынам, яны павінны быць належным чынам інфармаванымі аб сваіх правах і разумець палітычны і сацыяльны кантэкст іх сістэм адукацыі. Таму мы раім спачатку азнаёміцца з інфармацыяй, якая прыведзена ў главе 5 анлайн-дакумента. Мы апісваем канцэпцыю чатырох якасцей адукацыі: даступнасць, адкрытасць, прымальнасць і здольнасць прыстасоўвацца, і праблемы, якія ЮНЕСКА выдзеліла ў якасці «чатырох слупоў» адукацыі: вучыцца жыць сумесна, вучыцца атрымліваць веды, вучыцца дзейнічаць і вучыцца існаваць.

# Навакольнае асяроддзе

**Практыкаванні па тэме**

Тры рэчы
Увага, мы ўсё бачым
Пагуляем на пальцах
Першая паласа
Мака-кітабоі
Варыянты нашай будучыні
Аповесць пра два гарады
Сетка жыцця




«Чалавек павінен мець асноўнае права на свабоду, роўнасць і спрыяльныя ўмовы жыцця ў навакольным асяроддзі, якасць якога дазваляе весці годнае і належнае жыццё». Гэта цытата ўзята з Стакгольмскай дэкларацыі 1972 года аб Канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па праблемах навакольнага асяроддзя чалавека і можа разглядацца як стартавая пляцоўка для заснаванага на правах чалавека падыходу да аховы навакольнага асяроддзя. Людзі ўсведамляюць, што што б мы ні рабілі – распрацоўвалі радовішчы карысных выкапняў, секлі дрэвы, займаліся будаўніцтвам або фермерствам, забруджвалі навакольнае асяроддзе – нашы дзеянні маюць наступствы як на мясцовым, так і на глабальным узроўні, зараз і ў будучыні. Таму наша занепакоенасць наконт навакольнага асяроддзя непарыўна звязана з занепакоенасцю адносна чалавецтва і чалавечнасці, і ў гэтым аспекце павінны дзейнічаць прынцыпы роўнасці, адказнасці і непарушэння правоў.

Маладыя людзі, як правіла, вельмі занепакоены станам навакольнага асяроддзя, у рэшце рэшт размова ідзе пра іх будучыню. Вельмі часта іх перш за ўсё яны звяртаюць увагу на якую-небудзь мясцовую праблему, але змяненне клімату – гэта асноўная праблема, якую адчуваюць усе людзі па ўсім свеце – хаця некаторыя адчуваюць яе мацней, чым іншыя. Гэтая праблема звязана з пытаннем роўнасці, так як і пытанне росту насельніцтва.

В главе 5 анлайн-дакумента можна пачытаць пра гэту занепакоенасць маладых людзей і ўбачыць прыклады парушэнняў, напрыклад парушэнне права на жыццё ў выніку ранняй смерці, выкліканай рознымі формамі забруджвання паветра і недахопу бяспечнага і нармальнага водазабеспячэння. Прычынамі парушэнняў права на жаданую працу, права на харчаванне і на ўдзел у культурным жыцці могуць быць спосабмі, якімі мы выкарыстоўваем зямлю для вядзення сельскай гаспадаркі, распрацоўкі радовішчаў карысных выкапняў, для функцыянавання іншых галін прамысловасці, а таксама транспартных сістэм і гарадоў.

Таксам можна азнаёміцца з інфармацыяй пра прапанову ўвядзення такога паняцця, як «злачынства экацыду», якое абазначае маштабнае разбурэнне прыроднага навакольнага асяроддзя, якое можна прызнаць міжнародным злачынствам супраць міру, нароўні з генацыдам, злачынствамі супраць чалавечнасці і чалавецтва і разглядаць у Міжнародным крымінальным судзе.

# Гендарныя пытанні




**Практыкаванні па тэме**
Розныя зарплаты
Хатнія справы
Гераіні і героі
Пагаворым пра секс
Шлях у краіну Роўнасці
Хто я такія?
Праца і дзеці

Гендарная праблематыка комплексна, незаўважна і адкрыта закранае кожнага. Наша сексуальная і гендарная ідэнтычнасць з’яўляюцца неаддзельнымі аспектамі чалавечай натуры. Тэрміны пол, гендарная прыналежнасць, гендарная ідэнтычнасць і сексуальная арыентацыя часта блытаюць, хоць яны і маюць розныя значэнні. У главе 5 анлайн-дакумента вы можаце знайсці азначэнні гэтых і іншых сумежных тэрмінаў.

Гендарная роўнасць з'яўляецца адным з асноўных правоў чалавека, і ўсе міжнародныя дамовы ў галіне правоў чалавека ў роўнай ступені адносяцца як да мужчын, так і да жанчын. Правы людзей часта парушаюцца на падставе іх гендарнай ідэнтычнасці і сексуальнай арыентацыі, але жанчыны з’яўляюцца асабліва ўразлівымі. Некаторыя з асноўных праблем датычацца ўдзелу (у адукацыі, працы, прыняцця палітычных і грамадскіх рашэнняў), гвалту на падставе гендарнай прыналежнасці (напрыклад, хатні гвалт, жаночае абразанне, гандаль людзьмі, аборты на падставе полу), узброеных канфліктаў (каля 90 % ахвяр складаюць грамадзянскія асобы, большасць з якіх – жанчыны і дзеці) і беднасці (жанчыны складаюць больш за 70 % беднага насельніцтва свету), а таксама сексуальных і рэпрадуктыўных правоў (прымусовыя шлюбы і прыняцце рашэнняў адносна кантролю нараджэння). Прызнаючы іх асаблівую ўразлівасць, у 1979 годзе была прынята Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (CEDAW).

Усё часцей ААН выказваецца ў падтрымку правоў ЛГБТ-людзей, якія таксама часта парушаюцца. Аднак ААН да гэтага часу не прызнала Джак'якарцкія прынцыпы, якія былі распрацаваны ў 2006 годзе на пасяджэнні Міжнароднай камісіі юрыстаў і групы міжнародных экспертаў па правах чалавека.

# Глабалізацыя




**Практыкаванні па тэме**
Доступ да лекаў
Усе роўныя – усе розныя
Гісторыя Ашыка
Увага, мы ўсё бачым
Пагуляем на пальцах
Першая паласа
Колькі нам патрэбна?
Мака-кітабоі
Барацьба за ўладу
Хутка састарэе
Тэрарызм
Сетка жыцця
Калі прыйдзе заўтра

І нават калі большасць з нас адчуваюць, што такое глабалізацыя, сама гэта канцэпцыя з'яўляецца складанай і пры гэтым мае самыя разнастайныя сувязі з правамі чалавека. Лічыцца, што глабалізацыя, з аднаго боку, з’яўляецца прычынай парушэння правоў чалавека, але, з іншага боку, дае рухам у падтрымку правоў чалавека магчымасць пераадольваць яе крайнасці і негатыўныя наступствы пры дапамозе глабалізаванай медыясеткі. У главе 5 анлайн-дакумента вы можаце пачытаць пра эканамічнае ўздзеянне глабалізацыі і глабальных міжнародных эканамічных і гандлёвых інстытутаў, а таксама пра ўздзеянне на культурныя і сацыяльныя аспекты і пра рухі ў падтрымку «глабалізацыі з чалавечым тварам».

Менавіта рэакцыя на негатыўныя наступствы глабалізацыі прывяла да прасоўвання некаторых аспектаў правоў чалавека. Напрыклад, да больш падрабязнага тлумачэння права на развіццё і да састаўлення 10 прынцыпаў Глабальнага дагавора ААН, ініцыятывы для стварэння стратэгічнай палітыкі для кампаній.

Глабалізацыя і ваганні ў эканамічным, сацыяльным, культурным і палітычным парадку непрапарцыянальна моцна ўздзейнічаюць на маладых людзей, якія знаходзяцца ў працэсе пераходу да дарослага жыцця. З іншага боку, для многіх маладых людзей глабалізацыя дае больш магчымасцей для вандровак, працы, навучання і атрымання досведу розных ладаў жыцця і культур. Савет Еўропы адыгрывае важную ролю ў садзейнічанні арганізацыі мерапрыемстваў, якія аб’ядноўваць маладых людзей з самых розных маладзёжных арганізацый.

# Здароўе




Права на здароўе прызнаецца ў шматлікіх міжнародных і рэгіянальных дакументах у галіне правоў чалавека, у тым ліку ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (артыкул 25) і Еўрапейскай сацыяльнай хартыі.

Права на здароўе не трэба разумець як права быць здаровымі: немагчыма забяспечыць абарону ад усіх магчымых прычын парушэнняў здароўя чалавека. Гаворка ідзе пра права кожнага, без дыскрымінацыі, на доступ да розных паслуг, структур і тавараў, а таксама на доступ да адпаведных умоў жыцця, што неабходны для таго, каб быць як мага больш здаровым.

Нягледзячы на добрыя намеры, велізарная няроўнасць працягвае існаваць як на лакальным, так і на глабальным узроўні, а прыклады можна знайсці ў раздзеле 5 у Інтэрнэце. У раздзеле таксама ёсць інфармацыя пра моладзь і здароўе і пра здаровы лад жыцця. Сталенне ва ўмовах беднасці, дрэннага харчавання, адсутнасці фізічнай актыўнасці і (або) залежнасці можа мець наступствы якія могуць працягвацца да канца жыцця. У Еўропе моладзь мае па меншай меры на 50 % больш шанцаў атрымаць траўму на працы, чым старэйшыя людзі.

Сярод іншых тэм, якія закранаюцца ў раздзеле 5 у Інтэрнэце, можна адзначыць наркотыкі, сексуальнае і рэпрадукцыйнае здароўе, псіхічнае здароўе і беднасць і доступ да лекаў.

**Практыкаванні па тэме**

Доступ да лекаў
Ці ёсць у нас альтэрнатывы?
Хатнія справы
Варыянты нашай будучыні
Хвіліначку
Пагаворым пра секс
Барацьба за багацце і ўладу
Спорт для ўсіх
Гвалт у маім жыцці
Сетка жыцця

# СМІ



**Практыкаванні па тэме**
Увага, мы ўсё бачым!
Першая паласа
Пачуць голас кожнага
Хутка састарэе
Калі прыйдзе заўтра
Дзе вы стаіце?




СМІ, прэса, тэлебачанне, радыё, кінематограф, CD, DVD, Сусветнае павуцінне і Інтэрнэт забяспечваюць нас сучаснымі інфармацыйнымі магістралямі, якія служаць для павышэння дасведчанасці, удзелу і глабальнаму актывізму ў галіне правоў чалавека, але пры гэтым існуе рызыка распальвання нянавісці, распаўсюджання стэрэатыпаў і дэзынфармацыі.

Права чалавека, якое непасрэдна звязана са СМІ, – гэта права на свабоду думкі і выказвання меркавання. У главе 5 анлайн-дакумента можна азнаёміцца з правам на свабоду выказвання меркавання і фактарамі, якія ёй пагражаюць, напрыклад механізмы дзяржаўнага кантролю над СМІ, гвалт у адносінах да журналістаў, камерцыйны націск і доступ да інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Еўрапейскі суд па правах чалавека прайшоў вялікі шлях у пытанні забеспячэння прававымі рамкамі ў дачыненні да таго, у якой меры можа быць абмежавана свабода выказвання меркавання ў адпаведнасці з артыкулам 10 (2) УДПЧ.

У главе 5 анлайн-дакумента можна таксама прачытаць пра тое, што свабода выказвання меркавання супярэчыць іншым правам чалавека, напрыклад праву на прыватнае жыццё, сямейнае жыццё і забарону дыскрымінацыі. Таксама маюцца звесткі пра спажывальніцтва, гвалт, каштоўнасці, стэрэатыпы і самапавагу, у прыватнасці звязаныя з моладдзю, якая як група кожны дзень праводзіць шмат часу, выкарыстоўваючы СМІ.

# Міграцыя




**Практыкаванні па тэме**
Тры рэчы
Можна ўвайсці?
Моўны бар'ер
*Чахал супраць Вялікабрытаніі*

У сучасным глабалізаваным свеце людзі знаходзяцца ў пастаянным руху: некаторыя дзеля адпачынку, некаторыя дзеля працы або вучобы, а іншыя бягуць ад вайны і дыскрымінацыі. Аднак адрозненне паміж так званымі добраахвотнымі і змушанымі мігрантамі на практыцы можа быць не такім яўным. Мадэлі міграцыі таксама не заўжды зразумелыя: а ці ведалі вы, што больш за 12 мільёнаў чалавек, народжаных у Расіі, жывуць за мяжой, і 12 мільёнаў чалавек замежнага паходжання зараз жывуць у Расіі?

У главе 5 анлайн-дакумента вы можаце прачытаць азначэнні і апісанні розных катэгорый мігрантаў, сярод якіх часовыя працоўныя мігранты (гастарбайтары), высокакваліфікаваныя бізнес-мігранты, незаконныя мігранты (недакументаваныя або самавольныя), вымушаныя мігранты, члены сям'і і мігранты, якія вяртаюцца, а таксама перамешчаныя ўнутры краіны асобы, бежанцы і асобы, якія шукаюць прытулак.

У дакуменце «Парадак дня 2020» можна знайсці падрабязную інфармацыю пра міграцыйную палітыку МАМ і ЕС і працу Савета Еўропы, у тым ліку пра рамачны дакумент аб маладзёжнай палітыцы.

Лічыцца, што маладыя людзі, якія ўдзельнічаюць у такіх праграмах, як Erasmus Mundus, спрыяюць распаўсюджанню разнастайнасці. Аднак, паводле ацэнак, у Еўропе жывуць каля 12 мільёнаў маладых людзей, якія лічацца імігрантамі, нягледзячы на тое, што яны нарадзіліся і выраслі ў гэтых краінах, бо іх бацькі былі імігрантамі. Як вынік, гэта «другое пакаленне» імігрантаў пакутуе ад дыскрымінацыі, расізму і парушэнняў іх правоў чалавека. Таксама ў нявыгадным становішчы знаходзяцца маладыя бежанцы, асобы, якія шукаюць прытулак, і перамешчаныя ўнутры краіны асобы.

**Практыкаванні па тэме**
Можна ўвайсці?
*Чахал супраць Вялікабрытаніі*
Хатнія справы
Ці ёсць у нас альтэрнатывы?
Пагуляем на пальцах
Тэгі памяці
Маё жыццё не шоу
Электрастанцыя
Адказ расізму
Тэрарызм
Кіданне камянёў
Гвалт у маім жыцці
Калі прыйдзе заўтра

# Мір і гвалт




У главе 5 анлайн-дакумента мы прыводзім пашыранае разуменне гвалту, што ўключае ў сябе не толькі прамы «паводніцкі» гвалт, але яшчэ і структурны і культурны гвалт. Мы таксама прапануем больш шырокае разуменне міру, які, такім чынам, азначае не толькі адсутнасць гвалтоўных канфліктаў, але і наяўнасць справядлівасці і роўнасці, а таксама павагу да правоў чалавека і да Зямлі. Мір з’яўляецца істотным элементам для ажыццяўлення ўсіх правоў чалавека. Мір таксама з'яўляецца прадуктам правоў чалавека і ўсё часцей прызнаецца правам чалавека, якое фарміруецца зараз, або часткай так званых правоў салідарнасці.

Бяспека чалавека – гэта канцэпцыя, цесна звязаная з мірам і гвалтам. Яна звязана з абаронай асоб і ад прамой пагрозы фізічнага гвалту, і ад ускосных пагроз, звязаных з беднасцю і іншымі формамі сацыяльнай, эканамічнай ці палітычнай няроўнасці, а таксама з прыроднымі бедствамі і хваробамі.

У раздзеле 5 у Інтэрнэце мы даём аргументацыю таго, што гвалтоўныя дзеянні часам неабходны, каб абараняць правы чалавека іншых людзей, і абмяркоўваем механізмы, неабходныя для таго, каб забяспечыць эфектыўную і справядлівую сістэму крымінальнага правасуддзя.

Маладзёжны сектар Савета Еўропы мае больш чым 40-гадовы досвед працы ў галіне міжкультурнай адукацыі, урэгулявання канфліктаў і адукацыі ў галіне правоў чалавека. Напрыклад, Маладзёжны лагер міру дае моладзі магчымасць, часам упершыню ў жыцці, асабіста паразмаўляць з людзьмі з «іншага боку».





# Беднасць




**Практыкаванні па тэме**
Змяніце свае акуляры
Барацьба за багацце і ўладу
Зрабі крок наперад
Дзе вы стаіце?

Мы жывём у свеце, дзе адзін мільярдэр зарабляе столькі ж грошай, колькі складае гадавы аб'ём вытворчасці цэлай краіны. У главе 5 анлайн-дакумента вы можаце прачытаць пра розныя спосабы азначэння паняцця і ацэнкі беднасці. Абсалютная беднасць – гэта нястача рэсурсаў для забеспячэння асноўных жыццёвых патрэб, што ўключаюць сярод іншага пітную ваду, ежу і санітарныя ўмовы. У Еўропе беднасць у асноўным разумеецца як адносная беднасць, пры якой чалавек або сям'я лічацца беднымі, калі іх даход і рэсурсы ніжэй за тыя, што ўспрымаюцца як адэкватныя або сацыяльна прымальныя ў грамадстве, у якім яны жывуць.

Правы чалавека асабліва важны пры памяншэнні маштабаў беднасці. Напрыклад, парушэнні правоў на здароўе, адукацыю, дастойную працу, нармальную ежу, годныя жыллёвыя ўмовы, асабістую бяспеку і роўны доступ да правасуддзя прыводзяць да таго, што многія людзі вымушаны жыць у беднасці. У маладых людзей, якія выраслі ва ўмовах беднасці, звычайна горшы стан здароўя, ёсць цяжкасці ў навучанні і паводзінах, сустракаюцца раннія цяжарнасці, дрэнна развітыя навыкі і гэтак далей – спіс працягваецца! Паводле Еўрастата, больш за 20 % моладзі ва ўзросце да 24 гадоў жылі ў беднасці ў 2010 годзе ў ЕС.

Дэкларацыя аб праве на развіццё, прынятая Генеральнай Асамблеяй ААН у 1986 годзе, – гэта вельмі важны дакумент, бо ён прапануе падыход да развіцця і барацьбы супраць беднасці на аснове правоў чалавека. Пазней, у 2000 годзе, былі складзены Мэты развіцця тысячагоддзя ААН, першая з якіх – ліквідаваць крайнюю беднасць і голад. На жаль, прадбачыцца яшчэ шмат працы.

# Рэлігія і вера






**Практыкаванні па тэме**
Мячэць у Сліпівілі
Вернікі
Улада кветак
Хутка састарэе
Храналогія правоў
Хто я такія?

У самым простым сэнсе рэлігія апісвае «стаўленне чалавека да таго, што ён лічыць свяшчэнным, святым, духоўным або чароўным». Перакананні – гэта больш шырокі тэрмін: гэта такі стан розуму, калі мы лічым нешта верным, нават калі мы не ўпэўнены на 100 %, што зможам гэта даказаць. Перакананні могуць быць рэлігійнымі, філасофскімі або ідэалагічнымі. Рэлігіі і іншыя формы перакананняў у нашым асяроддзі ўплываюць на нашу ідэнтычнасць, незалежна ад таго, лічым мы сябе рэлігійнымі або духоўнымі ці не.

Права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі замацавана ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і многіх іншых дакументах у галіне правоў чалавека. Як і ўсе іншыя правы чалавека, гэта свабода не павінна быць «вышэй» за іншыя свабоды, і часам узнікаюць супярэчнасці паміж ёй і іншымі правамі чалавека, такімі як свабода выказвання меркавання і свабода слова, а таксама свабода ад дыскрымінацыі па прыкмеце полу ці сексуальнай арыентацыі.

На працягу ўсёй гісторыі рэлігіі многія рэлігійныя і грамадскія характарыстыкі глыбока ўкараніліся ў мясцовую культуру і адбіліся на літаратуры, мастацтве, музыцы і г. д. Уплыў рэлігій можа быць яшчэ мацнейшы, калі краіны прымаюць дзяржаўную рэлігію. Часта рэлігія і рэлігійныя пастулаты могуць змешвацца з палітычнымі, эканамічнымі ці сацыяльнымі вымярэннямі грамадства.

У главе 5 анлайн-дакумента прыведзена шмат прыкладаў дыскусій у рамках праваабарончай супольнасці, напрыклад, аб традыцыйных цырымоніях з удзелам дзяцей, аб законах, якія тычацца шлюбу і разводу, аб жаночым абразанні і аб пазбаўленні некаторых правоў асоб, якія не з'яўляюцца прыхільнікамі больш магутнай рэлігійнай групы. Факт аб тым, што такія практыкі глыбока ўкараніліся ў культуры і традыцыях, не робіць іх больш простымі.

Нецярпімасць і дыскрымінацыя ў дачыненні да мусульман, хрысціян і яўрэяў разглядаюцца ў тым кантэксце, які прадугледжаны работай Савета Еўропы, асабліва з маладымі людзьмі. Прыводзяцца прыклады судовых працэсаў у Еўрапейскім судзе па правах чалавека ў адносінах да рэлігіі і перакананняў, адукацыі і вайсковай службы маладых людзей.

# Гістарычная памяць






**Практыкаванні па тэме**
Доста!
Тэгі памяці
Храналогія правоў

Грубыя парушэнні правоў чалавека, такія як халакост, гандаль рабамі, генацыд і этнічныя чысткі, не так лёгка забыць або дараваць тым, хто быў імі закрануты. Захаванне гістарычнай памяці, калі яно робіцца належным чынам, можа даць пэўнае пачуццё задаволенасці тым, хто быў часткай падзей, а маладыя людзі, якія не былі непасрэдна закрануты, могуць даведацца, да чаго прыводзіць чалавечае дзеянне або бяздзейнасць, фанатызм, расізм, рэлігійная нецярпімасць. Захаванне гістарычнай памяці можа служыць у якасці папераджальнага сігналу для грамадства, яно можа дапамагчы нам засвоіць урокі мінулага, каб не паўтараць гэтыя памылкі ў будучыні.

Няма права чалавека, непасрэдна звязанага з захоўваннем гістарычнай памяці, але тыя падзеі, якія памятаюцца, амаль заўсёды звязаны з тым, што правы чалавека пэўных груп былі цалкам праігнараваны. У главе 5 анлайн-дакумента мы пералічваем некаторыя падзеі, пра якія не заўсёды памятаюць, хоць яны гэтага і заслугоўваюць, і апісваем, што трэба рабіць, каб аднавіць справядлівасць у адносінах да ахвяр. Мы таксама апісваем некаторыя адукацыйныя практыкі, мэтай якіх з’яўляецца пераадоленне нянавісці з боку моладзі і прасоўванне міжнароднай салідарнасці.

Савет Еўропы ўзнік на руінах Другой сусветнай вайны і працуе над распаўсюджаннем дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства права, каб нагадаць нам пра наступствы існавання таталітарных ідэалогій, якія дамінавалі ў першай палове ХХ стагоддзя. У 1954 годзе ў Еўрапейскай культурнай канвенцыі была падкрэслена важнасць выкладання гісторыі ўсіх дзяржаў-удзельніц у еўрапейскім вымярэнні. У 2001 годзе Савет Еўропы заснаваў Дзень памяці ахвяр халакосту і прадухілення злачынстваў супраць чалавецтва.

# Вайна і тэрарызм

**Практыкаванні па тэме**
Тры рэчы
*Чахал супраць Вялікабрытаніі*
Доста!
Колькі нам патрэбна?
Моўны бар'ер
Тэгі памяці
Тэрарызм
Кіданне камянёў
Гвалт у маім жыцці




Акты вайны або тэрарызму ствараюць настолькі сур'ёзную пагрозу самім асновам правоў чалавека, што ствараецца ўражанне іх краху. Аднак нават у разгар такога распаду чалавечнасці правы чалавека працягваюць дзейнічаць і могуць даць пэўную мінімальную абарону і некаторую надзею на справядлівасць.

У главе 5 анлайн-дакумента робіцца спроба, нягледзячы на цяжкасці, даць вызначэнне паняццям «вайна» і «тэрарызм». Вядзецца дыскусія пра ўжыванне сілы ў міжнародным праве і аб спрэчнай канцэпцыі «Абавязку абараняць» (Responsibility to protect (R2P)). Напрыклад, ставіцца пытанне «Ці можа бамбардзіроўка краіны, з усімі яе наступствамі, быць найлепшым спосабам прасоўвання міру і ўрэгулявання канфлікту, які вельмі часта глыбока ўкараніўся?» Таксама прыводзіцца інфармацыя аб законах вайны, Жэнеўскіх канвенцыях, ваенных злачынствах і Міжнародным крымінальным судзе.

У дачыненні да правоў чалавека і тэрарызму існуе дзве асноўныя вобласці, у якіх канцэпцыі правоў чалавека і тэрарызму могуць уступаць у канфлікт. Па-першае, гэта сам па сабе акт тэрарызму, а па-другое – меры, якія могуць быць прыняты афіцыйнымі органамі ў працэсе спробы барацьбы з тэрарызмам. Варта адзначыць, што заканадаўства аб правах чалавека складаецца для абароны людзей ад парушэння іх правоў і свабод урадамі і што Суд па правах чалавека не можа судзіць тэрарыстычную групу.

Вайна і тэрарызм з'яўляецца тэмай, якая асабліва актуальная для маладых людзей. Грамадзянскія асобы, асабліва жанчыны і дзеці, з'яўляюцца найбольш уразлівымі ў ваенны час, дзеці могуць быць прымушаны станавіцца салдатамі, а маладыя людзі, асабліва тыя, хто шукае сваю ідэнтычнасць, часта становяцца мішэнню тэрарыстычных груп.

# Праца




Практыкаванні па тэме

Гісторыя Ашыка

Увага, мы ўсё бачым!

Розныя зарплаты

Я хачу працаваць

Аповесць пра два гарады

Пасяджэнне прафсаюза

Праца і дзеці

Права на працу з'яўляецца правам чалавека, якое часта называюць сацыяльна-эканамічным правам. Годная праца неабходна для годнага жыцця, дае нам сродкі для існавання, а таксама спрыяе нашаму індывідуальнаму развіццю і ўвогуле ўмацоўвае супольнасці і грамадства. Глава 5 у Інтэрнэце тлумачыць, што права на працу ўключае ў сябе больш, чым проста мець магчымасць працаваць. Кожны чалавек мае права на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы, бяспеку на працоўным месцы, справядлівую аплату працы, роўнае ўзнагароджанне за працу роўнай каштоўнасці, роўныя магчымасці, разумныя гадзіны працы і адпачынку, а таксама права на арганізацыю і вядзенне калектыўных перамоў. У главе 5 анлайн-дакумента таксама ёсць інфармацыя пра прафсаюзы, Міжнародную арганізацыю працы (МАП) і Еўрапейскую сацыяльную хартыю.

Паводле ацэнак, у 2011 годзе толькі ў Еўрапейскім саюзе было 7,5 мільёна маладых людзей, якія траплялі ў катэгорыю «NEET» (не ў сферы занятасці, адукацыі або прафесійнай падрыхтоўкі). Праз беспрацоўе ў моладзі часта ўзнікаюць сацыяльныя і медыцынскія праблемы, такія як гвалт, злачыннасць, самагубства і злоўжыванне наркотыкамі і алкаголем. Для моладзі наяўнасць працы азначае значна больш, чым наяўнасць сродкаў самазабеспячэння: гэта таксама інструмент для набыцця жыццёвага досведу. Стажыроўкі могуць быць сродкам памяншэння адлегласці да сталага працоўнага месца, але многія маладыя людзі часта адчуваюць сябе выкарыстанымі сістэмай.

Дзіцячая праца з’яўляецца яшчэ адной праблемай, што ўплывае на моладзь. У 2010 годзе налічвалася 215 мільёнаў дзяцей ва ўсім свеце, якія былі ўцягнуты ў дзіцячую працу, звязаную з рабствам, прымусовай працай, сексуальнай эксплуатацыяй, незаконнай дзейнасцю або працай у небяспечных умовах. У Еўропе ёсць абмежаванні, але многія дзеці і маладыя людзі па-ранейшаму вымушаны працаваць «па суботах» або «пасля школы або каледжа» – часам, каб зарабіць больш кішэнных грошай, але часта, каб зрабіць свой значны ўклад у сямейны бюджэт.

# Дадаткі

# Змест главы

**ВЫБРАНЫЯ МІЖНАРОДНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА**

**Статус ратыфікацыі асноўных міжнародных дакументаў па правах чалавека...457**

**Арганізацыя Аб’яднаных Нацый.........................................................................458**

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (агляд і поўная версія)..........................................459

Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (агляд).............................................461

Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (агляд)...........................461

Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі..................................................462

Канвенцыя аб правах дзіцяці (агляд)...........................................................................................463

Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (агляд)................464

Канвенцыя аб абароне ўсіх асоб ад гвалтоўных знікненняў (агляд).........................................465

Канвенцыя аб правах людзей з інваліднасцю (агляд)..................................................................465

**Савет Еўропы.......................................................................................................467**

Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека (агляд і поўная версія).........................468

Еўрапейская сацыяльная хартыя (кароткі пераказ)....................................................................473

Рамачная канвенцыя аб абароне нацыянальных меншасцей (агляд).......................................474

Еўрапейская хартыя рэгіянальных моў або моў меншасцей (агляд)........................................474

Канвенцыя аб процідзеянні гандлю людзьмі...............................................................................475

Хартыя Савета Еўропы аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека.........................................................................................................................476

**ГЛАСАРЫЙ.........................................................................................................478**

| **Статус ратыфікацыі асноўных міжнародных дакументаў па правах чалавека**<br>дзяржавамі – удзельніцамі Еўрапейскай культурнай канвенцыі<br>(па стане на 25 мая 2012 г.) | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **АРГАНІЗАЦЫЯ АБ’ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ** | | | | | | | **САВЕТ ЕЎРОПЫ** | | | | | | |
| **КРАІНЫ** | Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах | Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах | Канвенцыя аб правах дзіцяці | Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі | Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын | Канвенцыя аб правах людзей з інваліднасцю | Міжнародная канвенцыя аб абароне ўсіх асоб ад гвалтоўных знікненняў | Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека | Еўрапейская сацыяльная хартыя | Еўрапейская сацыяльная хартыя (перагледжаная) | Рамачная канвенцыя аб абароне нацыянальных меншасцей | Рамачная канвенцыя па папярэджанні катаванняў і бесчалавечнага або зневажальнага абыходжання або пакарання | Еўрапейская хартыя рэгіянальных моў або моў меншасцей | Канвенцыя аб процідзеянні гандлю людзьмі |
| **Уступ у сілу** | 03.01.1976 | 23.03.1976 | 02.09.1990 | 04.01.1969 | 03.09.1981 | 03.05.2008 | 23.12.2010 | 03.09.1953 | 26.02.1965 | 01.07.1999 | 01.02.1998 | 01.02.1989 | 01.03.1998 | 01.02.2008 |
| Азербайджан | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Албанія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Андора | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | | ✓ | | ✓ | | ✓ |
| Арменія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Аўстрыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Балгарыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Беларусь | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | | | | | | | |
| Бельгія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | | ✓ |
| Боснія і Герцагавіна | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| «Былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія» | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Венгрыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Вялікабрытанія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Германія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | |
| Грузія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Грэцыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | | ✓ | | ✓ | | |
| Данія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Ірландыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Ісландыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | | ✓ | | ✓ | | ✓ |
| Іспанія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Італія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Казахстан | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | | | | | | | |
| Кіпр | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Латвія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Літва | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | |
| Ліхтэнштэйн | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | |
| Люксембург | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ |
| Малдова | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Мальта | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Манака | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | | ✓ | | ✓ | | |
| Нарвегія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Нідэрланды | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Партугалія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Польшча | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Расійская Федэрацыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | |
| Румынія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Сан-Марына | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ |
| Святы Прастол | | | ✓ | ✓ | | | | | | | | ✓ | ✓ | ✓ |
| Сербія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Славакія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Славенія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Турцыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | | ✓ | | ✓ | | |
| Украіна | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Фінляндыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | |
| Францыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | | ✓ | | ✓ |
| Харватыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Чарнагорыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Чэхія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | |
| Швейцарыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | |
| Швецыя | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ |
| Эстонія | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | ✓ | | |

## УСЕАГУЛЬНАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА
*(агляд)*

**Артыкул 1**

Права на роўнасць

**Артыкул 2**

Свабода ад дыскрымінацыі

**Артыкул 3**

Права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць

**Артыкул 4**

Свабода ад рабства

**Артыкул 5**

Свабода ад катаванняў і зневажальнага абыходжання

**Артыкул 6**

Права на прызнанне правасуб’ектнасці асобы

**Артыкул 7**

Права на роўнасць перад законам

**Артыкул 8**

Права на прававую абарону з боку кампетэнтнага судовага органа

**Артыкул 9**

Свабода ад самавольнага арышту і выгнання

**Артыкул 10**

Права на справядлівы публічны судовы разбор

**Артыкул 11**

Права лічыцца невінаватым, пакуль віна не даказана

**Артыкул 12**

Свабода ад умяшання ў асабістае жыццё, сям’ю, жыллё і перапіску

**Артыкул 13**

Права на свабоднае перамяшчэнне ў краіне і за яе межы

**Артыкул 14**

Права на прытулак у іншых краінах ад праследавання

**Артыкул 15**

Права на грамадзянства і свабоду мяняць яго

**Артыкул 16**

Права на ўступленне ў шлюб і стварэнне сям’і

**Артыкул 17**

Права на валоданне маёмасцю

**Артыкул 18**

Свабода рэлігіі і перакананняў

**Артыкул 19**

Свабода думкі і інфармацыі

**Артыкул 20**

Права на мірныя сходы і аб’яднанні

**Артыкул 21**

Права на ўдзел у кіраванні сваёй краінай і ў свабодных выбарах

**Артыкул 22**

Права на сацыяльнае забеспячэнне

**Артыкул 23**

Права на пажаданую працу і ўдзел у прафесійных саюзах

**Артыкул 24**

Права на адпачынак і вольны час

**Артыкул 25**

Права на адэкватны ўзровень жыцця

**Артыкул 26**

Права на адукацыю

**Артыкул 27**

Права на ўдзел у культурным жыцці супольнасці

**Артыкул 28**

Права на сацыяльны парадак, які выкладзены ў гэтай Дэкларацыі

**Артыкул 29**

Абавязкі грамадства для вольнага і поўнага развіцця асобы

**Артыкул 30**

Свабода ад дзяржаўнага ці асабістага ўмяшання ў вышэйзгаданыя правы

*Аўтарскія правы © Рэсурсны цэнтр па правах чалавека, Універсітэт Мінесоты. Прыводзіцца з дазволу.*

# Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека

*Прэамбула*

Прымаючы пад увагу, што прызнанне годнасці, якая ўласціва ўсім членам чалавечай сям'і, і роўных і неад'емных правоў іх з'яўляецца асновай свабоды, справядлівасці і ўсеагульнага міру,

Прымаючы пад увагу, што грэбаванне і пагарда да правоў чалавека прывялі да варварскіх актаў, якія абураюць сумленне чалавецтва, і што стварэнне такога свету, у якім людзі будуць мець свабоду слова і перакананняў і будуць свабоднымі ад страху і галечы, абвешчана як высокае імкненне людзей,

Прымаючы пад увагу, што неабходна, каб правы чалавека ахоўваліся ўладай закону з мэтай забеспячэння таго, каб чалавек не быў вымушаны ўжываць у якасці апошняга сродку паўстанні супраць тыраніі і прыгнечання,

Прымаючы пад увагу, што неабходна садзейнічаць развіццю дружалюбных адносін паміж народамі,

Прымаючы пад увагу, што народы Аб'яднаных Нацый пацвердзілі ў Статуце сваю веру ў асноўныя правы чалавека, у годнасць і каштоўнасць чалавечай асобы і ў раўнапраўе мужчын і жанчын і вырашылі садзейнічаць сацыяльнаму прагрэсу і паляпшэнню ўмоў жыцця пры большай свабодзе,

Прымаючы пад увагу, што дзяржавы-ўдзельніцы абавязаліся садзейнічаць у супрацоўніцтве з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый усеагульнай павазе і захаванню правоў чалавека і асноўных свабод,

Прымаючы пад увагу, што ўсеагульнае разуменне характару гэтых правоў і свабод мае велізарнае значэнне для поўнага выканання гэтага абавязацельства,

**ГЕНЕРАЛЬНАЯ АСАМБЛЕЯ абвяшчае гэту УСЕАГУЛЬНУЮ ДЭКЛАРАЦЫЮ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА** ў якасці задачы, да выканання якой павінны імкнуцца ўсе народы і ўсе дзяржавы з тым, каб кожны чалавек і кожны орган грамадства, увесь час маючы на ўвазе гэту Дэкларацыю, імкнуліся шляхам асветы і адукацыі садзейнічаць павазе гэтых правоў і свабод і забеспячэнню шляхам нацыянальных і міжнародных прагрэсіўных мерапрыемстваў усеагульнага і эфектыўнага прызнання і ажыццяўлення іх як сярод народаў дзяржаў – удзельнікаў Арганізацыі, так і сярод народаў тэрыторый, што знаходзяцца пад іх юрысдыкцыяй.

**Артыкул 1.**

Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны надзелены розумам і сумленнем і павінны ставіцца адзін да аднаго ў духу брацтва.

**Артыкул 2.**

Кожны чалавек павінен валодаць усімі правамі і ўсімі свабодамі, якія абвешчаны гэтай Дэкларацыяй, без якога б ні было адрознення, як, напрыклад, у адносінах да расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных або іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, маёмаснага, саслоўнага або іншага становішча. Акрамя таго, не павінна рабіцца ніякага адрознення на аснове палітычнага, прававога або міжнароднага статусу краіны або тэрыторыі, да якой чалавек належыць, незалежна ад таго, ці з'яўляецца гэта тэрыторыя незалежнай, падапечнай, несамакіравальнай або як-небудзь інакш абмежаванай у сваім суверэнітэце.

**Артыкул 3.**

Кожны чалавек мае права на жыццё, на свабоду і на асабістую недатыкальнасць.

**Артыкул 4.**

Ніхто не павінен утрымлівацца ў рабстве або ў паднявольным стане; рабства і гандаль рабамі забараняюцца ва ўсіх выглядах.

**Артыкул 5.**

Ні над кім не павінны ўчыняцца катаванні або жорсткае, бесчалавечнае ці зневажальнае абыходжанне і пакаранне.

**Артыкул 6.**

Кожны чалавек, дзе б ён ні знаходзіўся, мае права на прызнанне сваёй правасуб'ектнасці.

**Артыкул 7.**

Усе людзі роўныя перад законам і маюць права, без усякага адрознення, на роўную абарону закону. Усе людзі маюць права на роўную абарону ад якой бы ні было дыскрымінацыі, якая парушае гэту Дэкларацыю, і ад якога б ні было падбухторвання да такой дыскрымінацыі.

**Артыкул 8.**

Кожны чалавек мае права на эфектыўнае аднаўленне ў правах кампетэнтнымі нацыянальнымі судамі ў выпадках парушэння яго асноўных правоў, якія дадзены яму канстытуцыяй або законам.

**Артыкул 9.**

Ні над кім не павінны ўчыняцца самавольны арышт, затрыманне або выгнанне.

**Артыкул 10.**

Кожны чалавек для вызначэння яго правоў і абавязкаў і для ўстанаўлення абгрунтаванасці прад'яўленага яму крымінальнага абвінавачання мае права на падставе поўнай роўнасці на тое, каб яго справа была разгледжана публічна і з захаваннем усіх патрабаванняў справядлівасці незалежным і непрадузятым судом.

**Артыкул 11.**

(1) Кожны чалавек, які абвінавачваецца ў злачынстве, мае права лічыцца невінаватым да таго часу, пакуль яго віна не будзе ўстаноўлена законным парадкам шляхам публічнага судовага разбору, пры якім яму забяспечваюцца ўсе магчымасці для абароны.

(2) Ніхто не можа быць асуджаны за злачынства на падставе ўчынення якога-небудзь дзеяння або за бяздзейнасць, якія ў час іх учынення не з'яўляліся злачынствам па нацыянальных законах або па міжнародным праве. Не можа таксама накладацца пакаранне больш цяжкае, чым тое, якое магло быць ужыта ў той час, калі злачынства было зроблена.

**Артыкул 12.**

Ні над кім не павінна ўчыняцца самавольнае ўмяшанне ў яго асабістае і сямейнае жыццё, самавольны замах на недатыкальнасць яго жылля, тайну яго перапіскі або на яго гонар і рэпутацыю. Кожны чалавек мае права на абарону закону ад такога ўмяшання або такіх замахаў.

**Артыкул 13.**

(1) Кожны чалавек мае права свабодна перамяшчацца і выбіраць сабе месцапражыванне ў межах любой дзяржавы.

(2) Кожны чалавек мае права пакідаць любую краіну, у тым ліку сваю ўласную, і вяртацца ў сваю краіну.

**Артыкул 14.**

(1) Кожны чалавек мае права шукаць прытулак ад праследавання ў іншых краінах і карыстацца гэтым прытулкам.

(2) Гэта права не можа быць выкарыстана ў выпадку праследавання, сапраўды заснаванага на ўчыненні непалітычнага злачынства або дзеяння, якое супярэчыць мэтам і прынцыпам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Артыкул 15.**

(1) Кожны чалавек мае права на грамадзянства.

(2) Ніхто не можа быць самавольна пазбаўлены свайго грамадзянства або права змяніць сваё грамадзянства.

**Артыкул 16.**

(1) Мужчыны і жанчыны, якія дасягнулі паўналецця, маюць права без усякіх абмежаванняў, незалежна ад расы, нацыянальнасці або рэлігіі, браць шлюб і засноўваць сям'ю. Яны карыстаюцца аднолькавымі правамі ў адносінах да ўступлення ў шлюб, падчас знаходжання ў шлюбе і падчас яго скасавання.

(2) Шлюб можа быць заключаны толькі пры свабоднай і поўнай згодзе абодвух бакоў, якія бяруць шлюб.

(3) Сям'я з'яўляецца натуральнай і асноўнай ячэйкай грамадства і мае права на абарону з боку грамадства і дзяржавы.

**Артыкул 17.**

(1) Кожны чалавек мае права валодаць маёмасцю як аднаасобна, так і сумесна з іншымі.

(2) Ніхто не павінен быць самавольна пазбаўлены сваёй маёмасці.

**Артыкул 18.**

Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэта права ўключае ў сябе свабоду мяняць сваю рэлігію або перакананні і свабоду вызнаваць сваю рэлігію або перакананні як аднаасобна, так і разам з іншымі, публічным або прыватным парадкам у вучэнні, богаслужэнні і выкананні рэлігійных і рытуальных абрадаў.

**Артыкул 19.**

Кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў і на свабоднае выражэнне іх; гэта права ўключае ў сябе свабоду бесперашкодна прытрымлівацца сваіх перакананняў і свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі сродкамі і незалежна ад дзяржаўных граніц.

**Артыкул 20.**

(1) Кожны чалавек мае права на свабоду мірных сходаў і аб'яднанняў.

(2) Ніхто не павінен прымушацца ўступаць у якое-небудзь аб'яднанне.

**Артыкул 21.**

(1) Кожны чалавек мае права прымаць удзел у кіраванні сваёй краінай непасрэдна або пры дапамозе свабодна выбраных прадстаўнікоў.

(2) Кожны чалавек мае права роўнага доступу да дзяржаўнай службы ў сваёй краіне.

(3) Воля народа павінна быць асновай улады ўрада; гэта воля павінна знаходзіць сабе выказванне ў перыядычных і нефальсіфікаваных выбарах, якія павінны праводзіцца пры ўсеагульным і роўным выбарчым праве шляхам тайнага галасавання або пры дапамозе іншых раўназначных форм, якія забяспечваюць свабоду галасавання.

**Артыкул 22.**

Кожны чалавек як член грамадства мае права на сацыяльнае забеспячэнне і на ажыццяўленне неабходных для падтрымання яго годнасці і для свабоднага развіцця яго асобы правоў у эканамічнай, сацыяльнай і культурнай галінах пры дапамозе нацыянальных намаганняў і міжнароднага супрацоўніцтва і ў адпаведнасці са структурай і рэсурсамі кожнай дзяржавы.

**Артыкул 23.**

(1) Кожны чалавек мае права на працу, на свабодны яе выбар, на справядлівыя і добрыя ўмовы працы і на ахову ад беспрацоўя.

(2) Кожны чалавек без якой-небудзь дыскрымінацыі мае права на роўную аплату за роўную працу.

(3) Кожны, хто працуе, мае права на справядлівую і здавальняючую ўзнагароду, якая забяспечвае вартае чалавека існаванне для яго самога і яго сям'і і дапаўняецца пры неабходнасці іншымі сродкамі сацыяльнага забеспячэння.

(4) Кожны чалавек мае права ствараць прафесійныя саюзы і ўступаць у прафесійныя саюзы для аховы сваіх інтарэсаў.

**Артыкул 24.**

Кожны чалавек мае права на адпачынак і вольны час, у тым ліку права на разумнае абмежаванне працоўнага дня і на перыядычны водпуск, які аплачваецца.

**Артыкул 25.**

(1) Кожны чалавек мае права на такі жыццёвы ўзровень, уключаючы харчаванне, адзенне, жыллё, медыцынскі догляд і неабходнае сацыяльнае абслугоўванне, які неабходны для падтрымання здароўя і дабрабыту яго самога і яго сям'і, і права на забеспячэнне на выпадак беспрацоўя, хваробы, інваліднасці, удаўства, надыходу старасці або іншага выпадку страты сродкаў да існавання па незалежных ад яго акалічнасцях.

(2) Мацярынства і дзяцінства даюць права на асобую апеку і дапамогу. Усе дзеці, якія нарадзіліся ў шлюбе або па-за шлюбам, павінны карыстацца аднолькавай сацыяльнай абаронай.

**Артыкул 26.**

(1) Кожны чалавек мае права на адукацыю. Адукацыя павінна быць бясплатнай па меншай меры ў тым, што датычыцца пачатковай і агульнай адукацыі. Пачатковая адукацыя павінна быць абавязковай. Тэхнічная і прафесійная адукацыя павінна быць агульнадаступнай, вышэйшая адукацыя павінна быць аднолькава даступнай для ўсіх на падставе здольнасцей кожнага.

(2) Адукацыя павінна быць накіравана на поўнае развіццё чалавечай асобы і на павелічэнне павагі да правоў чалавека і асноўных свабод. Адукацыя павінна садзейнічаць узаемаразуменню, цярпімасці і дружбе паміж усімі народамі, расавымі або рэлігійнымі групамі і павінна садзейнічаць дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па падтрыманні міру.

(3) Бацькі маюць права прыярытэту ў выбары віду адукацыі для сваіх малалетніх дзяцей.

**Артыкул 27.**

(1) Кожны чалавек мае права свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці грамадства, цешыцца мастацтвам, удзельнічаць у навуковым прагрэсе і карыстацца яго дабротамі.

(2) Кожны чалавек мае права на ахову яго маральных і матэрыяльных інтарэсаў, якія з'яўляюцца вынікам навуковых, літаратурных або мастацкіх прац, аўтарам якіх ён з'яўляецца.

**Артыкул 28.**

Кожны чалавек мае права на сацыяльны і міжнародны парадак, пры якім правы і свабоды, якія выкладзены ў гэтай Дэкларацыі, могуць быць цалкам ажыццёўлены.

**Артыкул 29.**

(1) Кожны чалавек мае абавязкі перад грамадствам, у якім толькі і магчыма свабоднае і поўнае развіццё яго асобы.

(2) Пры ажыццяўленні сваіх правоў і свабод кожны чалавек павінен спазнаць толькі такія абмежаванні, якія ўстаноўлены законам выключна з мэтай забеспячэння належнага прызнання і павагі правоў і свабод другіх, задавальнення справядлівых патрабаванняў маралі, грамадскага парадку і агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве.

(3) Ажыццяўленне гэтых правоў і свабод ні ў якім разе не павінна супярэчыць мэтам і прынцыпам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Артыкул 30.**

Нішто ў гэтай Дэкларацыі не можа быць вытлумачана як забеспячэнне якой-небудзь дзяржавы, групы асоб або асобных людзей правам займацца якой-небудзь дзейнасцю або ўчыняць дзеянні, накіраваныя на знішчэнне правоў і свабод, выкладзеных у гэтай Дэкларацыі.

## Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах

*(неафіцыйны агляд)*

- *Гэты Пакт быў прыняты Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 16 снежня 1966 года і ўступіў у сілу 23 сакавіка 1976 года. Да мая 2012 года Пакт быў ратыфікаваны 167 дзяржавамі.*
- *У Пакце падрабязна разбіраюцца грамадзянскія і палітычныя правы і свабоды, пералічаныя ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.*
- *Згодна з артыкулам 1 Пакта, дзяржавы абавязваюцца садзейнічаць праву **на самавызначэнне** і паважаць гэта права. Таксама Пакт прызнае **права народаў свабодна валодаць, гандляваць і распараджацца сваімі прыроднымі багаццямі і рэсурсамі**.*

**Сярод асабістых правоў грамадзян, гарантаваных Пактам, наступныя:**

**Артыкул 2**

Права на сродкі юрыдычнай абароны пры парушэнні правоў чалавека, нават калі парушальнік дзейнічаў як службовая асоба.

**Артыкул 3**

Права на роўнасць паміж мужчынамі і жанчынамі ў ажыццяўленні грамадзянскіх і палітычных правоў.

**Артыкул 6**

Права на жыццё і выжыванне.

**Артыкул 7**

Свабода ад бесчалавечнага або зневажальнага абыходжання або пакарання.

**Артыкул 8**

Свабода ад рабства і паднявольнага становішча.

**Артыкул 9**

Права на свабоду і асабістую недатыкальнасць, свабоду ад самавольнага арышту або затрымання.

**Артыкул 11**

Свабода ад турмы з-за даўгоў.

**Артыкул 12**

Права на свабоду перамяшчэння.

**Артыкул 14**

Права на роўнасць перад законам; права лічыцца невінаватым да таго часу, пакуль віна не даказана, і разлічваць на справядлівы і публічны разбор справы непрадузятым судом.

**Артыкул 16**

Права на прызнанне правасуб'ектнасці чалавека.

**Артыкул 17**

Права на прыватнае жыццё і яго абарону законам.

**Артыкул 18**

Свабода думкі, сумлення і рэлігіі.

**Артыкул 19**

Свабода меркаванняў і іх выказвання.

**Артыкул 20**

Забарона прапаганды вайны або нацыянальнай, расавай ці рэлігійнай нянавісці.

**Артыкул 21**

Права на мірныя сходы.

**Артыкул 22**

Права на свабоду аб'яднанняў.

**Артыкул 23**

Права на ўступленне ў шлюб і стварэнне сям'і

**Артыкул 24**

Правы дзяцей (статус непаўналетніх, грамадзянства, рэгістрацыя і імя).

**Артыкул 25**

Права ўдзельнічаць у вядзенні дзяржаўных спраў, галасаваць і быць выбраным, атрымліваць доступ да дзяржаўнай службы.

**Артыкул 26**

Права на роўнасць перад законам і роўную абарону.

**Артыкул 27**

Права членаў рэлігійных, этнічных ці моўных меншасцей карыстацца сваёй культурай, вызнаваць сваю рэлігію і карыстацца сваёй мовай.

Пакт мае абавязковую юрыдычную сілу; Камітэт па правах чалавека, заснаваны ў адпаведнасці з артыкулам 28, сочыць за яго выкананнем.

Першы Факультатыўны пратакол вызначае індывідуальныя механізмы падачы скаргаў адносна МПГПП. Да мая 2012 года пратакол быў ратыфікаваны 114 дзяржавамі.

Другі Факультатыўны пратакол уступіў у сілу ў 1991 годзе, ён накіраваны на адмену смяротнага пакарання. Да мая 2012 года ён быў ратыфікаваны 74 дзяржавамі.

## Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах

*(неафіцыйны агляд)*

*Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (1966 г.) разам з Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека (1948 г.) і Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах (1966 г.) складаюць Міжнародны біль аб правах чалавека. У адпаведнасці з Усеагульнай дэкларацыяй Пакт прызнае, што «...ідэал свабоднай чалавечай асобы, якая карыстаецца грамадзянскай і палітычнай свабодай і свабодай ад страху і галечы, можа быць дасягнуты толькі ў тым выпадку, калі ствараюцца ўмовы, пры якіх кожны можа карыстацца сваімі грамадзянскімі і палітычнымі правамі, а таксама эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі правамі».*
*Пакт уступіў у сілу ў 1976 годзе і ў маі 2012 года быў ратыфікаваны 160 краінамі.*

**Артыкул 1**

Усе народы маюць права на самавызначэнне, у тым ліку права вызначаць свой палітычны статус і свабодна ажыццяўляць сваё эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё.

**Артыкул 2**

Кожная дзяржава-ўдзельніца абавязваецца прымаць меры ў максімальна магчымай ступені для дасягнення поўнай рэалізацыі правоў, замацаваных у гэтым дагаворы. Кожны чалавек мае права на роўныя правы без якой-небудзь дыскрымінацыі.

**Артыкул 3**

Дзяржавы абавязваюцца забяспечыць роўныя для мужчын і жанчын правы карыстання ўсімі правамі ў гэтым дагаворы.

**Артыкул 4**

Абмежаванні могуць адносіцца да гэтых правоў толькі ў тым выпадку, калі яны сумяшчальныя з характарам гэтых правоў і выключна з мэтай спрыяць агульнаму дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве.

**Артыкул 5**

Ні адзін чалавек, група або ўрад не маюць права знішчаць якія-небудзь з гэтых правоў.

**Артыкул 6**

Кожны чалавек мае права на працу, у тым ліку права зарабляць сабе на жыццё на свабодна выбранай і прынятай працы.

**Артыкул 7**

Кожны чалавек мае права на справядлівыя ўмовы працы; справядлівую зарплату, якая забяспечвае годнае жыццё для чалавека і яго сям'і; роўную аплата за роўную працу; бяспечныя і здаровыя ўмовы працы; роўныя магчымасці для прасоўвання па службе; адпачынак і вольны час.

**Артыкул 8**

Кожны чалавек мае права ствараць прафесійныя саюзы і ўступаць у іх, а таксама мае права на забастоўку.

**Артыкул 9**

Кожны чалавек мае права на сацыяльнае забеспячэнне, у тым ліку сацыяльнае страхаванне.

**Артыкул 10**

Для сям'і павінны забяспечвацца абарона і дапамога. Шлюб павінен заключацца па свабоднай згодзе абодвух бакоў. Асаблівая абарона павінна забяспечвацца маці. Асаблівыя меры павінны ажыццяўляцца ў інтарэсах дзяцей, без якой-небудзь дыскрымінацыі. Дзеці і падлеткі павінны быць абаронены ад эканамічнай эксплуатацыі. Іх праца ў небяспечных або шкодных умовах павінна быць забаронена. Павінны быць прадугледжаны ўзроставыя абмежаванні: праца дзяцей ва ўзросце ніжэй за гэтыя абмежаванні павінна быць забаронена.

**Артыкул 11**

Кожны чалавек мае права на дастатковы жыццёвы ўзровень для сябе самога і сваёй сям'і, што ўключае ў сябе дастатковае харчаванне, адзенне і жыллё. Кожны чалавек мае права быць свабодным ад голаду.

**Артыкул 12**

Кожны чалавек мае права на найвышэйшы дасягальны ўзровень фізічнага і псіхічнага здароўя.

**Артыкул 13**

Кожны чалавек мае права на адукацыю. Пачатковая адукацыя павінна быць абавязковай і бясплатнай для ўсіх.

**Артыкул 14**

Тыя дзяржавы, у якіх абавязковая бясплатная пачатковая адукацыя не з'яўляецца даступнай для ўсіх, павінны распрацаваць план па забеспячэнні такой адукацыі.

**Артыкул 15**

Кожны чалавек мае права прымаць удзел у культурным жыцці і карыстацца перавагамі навуковага прагрэсу.

Пакт кантралюецца Камітэтам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па эканамічных, сацыяльных і культурных правах.

Крыніца: Рэсурсны цэнтр Мінесоты па правах чалавека, на аснове матэрыялаў Цэнтра ААН па правах чалавека, Міжнароднага біля аб правах, інфармацыйнага бюлетэня # 2.

## Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі
*(неафіцыйны агляд)*

Міжнародная канвенцыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (КЛРД) грунтуецца на Дэкларацыі 1963 года аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі.

Дэкларацыя змяшчае чатыры асноўныя моманты:

- *Любая дактрына аб расавай дыферэнцыяцыі або перавазе з'яўляецца навукова ілжывай, маральна цяжкай, сацыяльна несправядлівай і небяспечнай і не мае ніякага абгрунтавання ў тэорыі або на практыцы.*
- *Расавая дыскрымінацыя, а тым больш палітыка ўрада, заснаваная на расавай перавазе ці нянавісці, парушае асноўныя правы чалавека, ставіць пад пагрозу сяброўскія адносіны паміж народамі, супрацоўніцтва паміж краінамі і міжнародны мір і бяспеку.*
- *Расавая дыскрымінацыя наносіць шкоду не толькі тым, хто з'яўляецца яе аб'ектам, але і тым, хто яе практыкуе.*
- *Сусветная грамадскасць, свабодная ад расавай сегрэгацыі і дыскрымінацыі, фактараў, якія ствараюць нянавісць і падзел, з'яўляецца асноўнай мэтай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.*

**Артыкул 1**

Вызначэнне расавай дыскрымінацыі: любое адрозненне, выключэнне, абмежаванне або перавага на аснове расы, колеру скуры, сацыяльнага, нацыянальнага або этнічнага паходжання з мэтай ці следствам парушэння правоў на роўныя правы чалавека. Палітыка або меры пазітыўных дзеянняў не павінны лічыцца расавай дыскрымінацыяй.

**Артыкул 2**

Дзяржавы-ўдзельніцы асуджаюць расавую дыскрымінацыю і абавязваюцца праводзіць палітыку па яе ліквідацыі ва ўсіх магчымых формах. Дзяржавы-ўдзельніцы не прымаюць ніякіх праяў расавай дыскрымінацыі і дзейнічаюць для забеспячэння таго, каб ніякія дзяржаўныя органы і ўстановы не ўдзельнічалі ў дыскрымінацыі. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца не спансіраваць, не абараняць і не падтрымліваць расавую дыскрымінацыю з боку любых асоб або арганізацый. Дзяржавы-ўдзельніцы разглядаюць дзяржаўную, нацыянальную і мясцовую палітыку і змяняюць або адмяняюць законы і правілы, якія ствараюць або ўвекавечваюць расавую дыскрымінацыю. Дзяржавы-ўдзельніцы забараняюць і спыняюць расавую дыскрымінацыю любымі асобамі, групамі або арганізацыямі. Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць неабходныя меры для развіцця і абароны асоб, якія належаць да пэўных расавых груп, у мэтах гарантавання ім поўнага і роўнага ажыццяўлення правоў чалавека.

**Артыкул 3**

Дзяржавы-ўдзельніцы асуджаюць апартэід і абавязваюцца прадухіляць, забараняць і выкараняць любую падобную практыку на сваёй тэрыторыі.

**Артыкул 4**

Дзяржавы-ўдзельніцы асуджаюць любую прапаганду і ўсе арганізацыі, заснаваныя на ідэях расавай перавагі. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца дзейнічаць у мэтах выкаранення любога падбухторвання да дыскрымінацыі і забараняюць распаўсюджванне ідэй, заснаваных на расавай перавазе і актах гвалту ці падбухторвання да гвалту ў дачыненні да любой расы.

**Артыкул 5**

Дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца забараняць, ліквідаваць расавую дыскрымінацыю і гарантаваць усім без адрознення права на роўнасць перад законам, асабліва ў ажыццяўленні правоў на правасуддзе; бяспеку чалавека; палітычныя правы, у тым ліку права голасу і права балатавацца на выбарах, удзельнічаць у дзяржаўных і грамадскіх справах і мець роўны доступ да дзяржаўнай службы; права на свабоду перамяшчэння і пражывання; права пакідаць любую краіну, у тым ліку сваю родную, і вяртацца ў яе; права на грамадзянства; права на ўступленне ў шлюб і выбар мужа або жонкі; права на валоданне маёмасцю; права атрымання ў спадчыну; права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; права на свабоду меркаванняў і іх свабоднае выказванне; права на мірныя сходы і аб'яднанні; эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы, у прыватнасці права на працу, свабодны яе выбар, роўную аплату за роўную працу, справядлівае і здавальняючае ўзнагароджанне; права ствараць прафсаюзы і ўступаць у іх; права на жыллё; права на ахову здароўя, медыцынскае абслугоўванне, сацыяльнае забеспячэнне і сацыяльныя паслугі; права на адукацыю і прафесійную падрыхтоўку; права на роўны ўдзел у культурнай дзейнасці; права доступу да любога месца або службы, прызначаных для выкарыстання шырокай грамадскасцю.

**Артыкул 6**

Дзяржавы-ўдзельніцы забяспечваюць кожнаму чалавеку, які знаходзіцца пад іх юрысдыкцыяй, эфектыўную абарону, у тым ліку сродкі прававой абароны, ад актаў расавай дыскрымінацыі.

**Артыкул 7**

Дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца прымаць меры ў галіне адукацыі, навучання і г. д. для барацьбы з прадузятасцямі, якія вядуць да расавай дыскрымінацыі.

Крыніца: Цэнтр ААН па правах чалавека і Народны рух за вывучэнне правоў чалавека www.pdhre.org

## Канвенцыя аб правах дзіцяці
*(неафіцыйны агляд)*

- Канвенцыя аб правах дзіцяці (КПД) з'яўляецца найбольш агульнапрызнаным дакументам у галіне правоў чалавека, ратыфікаваным усімі краінамі ў свеце, за выключэннем дзвюх. Канвенцыя аб'ядноўвае ў сябе поўны спектр правоў чалавека – грамадзянскія, палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы – у адносінах да дзяцей у адзіным дакуменце. Канвенцыя была прынята Генеральнай Асамблеяй ААН 20 лістапада 1989 года і ўступіла ў сілу ў верасні 1990 года.
- У Канвенцыі ў 41 артыкуле выкладзены правы чалавека, якія павінны выконвацца і абараняцца ў адносінах да кожнага дзіцяці ва ўзросце да васямнаццаці гадоў.

**Артыкул 1**

Вызначэнне дзіцяці як «кожны чалавек ва ўзросце да васямнаццаці гадоў», калі толькі ў нацыянальным заканадаўстве не замацавана дасягненне паўналецця ў больш раннім узросце.

**Артыкул 2**

Правы, гарантаваныя ў Канвенцыі, павінны забяспечвацца без якой-небудзь дыскрымінацыі.

**Артыкул 3**

Ва ўсіх дзеяннях у адносінах да дзяцей першачарговая ўвага павінна надавацца найлепшым інтарэсам дзіцяці.

**Артыкул 5**

Дзяржава павінна паважаць адказнасць, правы і абавязкі бацькоў або пашыранай сям'і.

**Артыкул 6**

Кожнае дзіця мае неад'емнае права на жыццё.

**Артыкул 7**

Дзіця мае права на імя, на атрыманне грамадзянства, права ведаць сваіх бацькоў і на тое, каб яго бацькі клапаціліся пра яго.

**Артыкул 8**

Дзіця мае права на асобу і грамадзянства.

**Артыкул 9**

Дзіця мае права не аддзяляцца ад сваіх бацькоў, за выключэннем яго інтарэсаў і судовай працэдуры.

**Артыкул 12**

Дзіця мае права выказваць думкі па ўсіх пытаннях, якія закранаюць яго, і меркаванню дзіцяці павінна надавацца адпаведная вага.

**Артыкул 13**

Дзіця мае права на свабоду выказвання меркаванняў, у тым ліку права шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любых відаў.

**Артыкул 14**

Правы дзіцяці на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі павінны паважацца.

**Артыкул 15**

Дзіця мае права на свабоду аб'яднанняў і мірных сходаў.

**Артыкул 16**

Ні адно дзіця не павінна падвяргацца адвольнаму або незаконнаму ўмяшанню ў яго асабістае жыццё, сям'ю, жыллё або перапіску; дзіця павінна быць абаронена ад незаконных замахаў на яго гонар і рэпутацыю.

**Артыкул 17**

Дзяржава павінна забяспечваць права дзіцяці на доступ да інфармацыі і матэрыялаў з нацыянальных і міжнародных крыніц.

**Артыкул 18**

Бацькі нясуць асноўную адказнасць за выхаванне і развіццё дзіцяці.

**Артыкул 19**

Дзяржава павінна прымаць усе неабходныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, сацыяльныя і асветніцкія меры для абароны дзіцяці ад усіх форм фізічнага або псіхічнага гвалту, траўмаў, жорсткага абыходжання, пагарды, дрэннага абыходжання або эксплуатацыі.

**Артыкул 24**

Дзіця мае права на найвышэйшы дасягальны ўзровень здароўя з наданнем асобай увагі першаснай медыка-санітарнай дапамозе і развіццю прафілактычнай аховы здароўя.

**Артыкул 26**

Дзіця мае права карыстацца выгадамі сацыяльнага забеспячэння.

**Артыкул 27**

Дзіця мае права на такі ўзровень жыцця, які дазволіць фізічнае, псіхічнае, духоўнае, маральнае і сацыяльнае развіццё.

**Артыкул 28**

Дзіця мае права на адукацыю. Дзяржава павінна зрабіць пачатковую адукацыю абавязковай, даступнай і бясплатнай для ўсіх і заахвочваць развіццё розных форм сярэдняй адукацыі, зрабіць іх даступнымі для кожнага дзіцяці. Школьная дысцыпліна павінна забяспечвацца ў адпаведнасці з годнасцю дзіцяці. Адукацыя павінна быць накіравана на развіццё асобы дзіцяці, талентаў і здольнасцей, павагу да правоў чалавека і асноўных свабод, адказнае жыццё ў свабодным грамадстве ў духу міру, дружбы, узаемаразумення, памяркоўнасці і роўнасці, развіцця павагі да прыроднага асяроддзя.

**Артыкул 30**

Дзіця мае права карыстацца сваёй уласнай культурай.

**Артыкул 31**

Дзіця мае права на адпачынак і вольны час, права гуляць, свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці і займацца мастацтвам.

**Артыкул 32**

Дзіця павінна быць абаронена ад эканамічнай эксплуатацыі і ад выканання працы, якая з'яўляецца небяспечнай для яго жыцця і развіцця.

**Артыкул 33**

Дзіця павінна быць абаронена ад незаконнага ўжывання наркатычных сродкаў.

**Артыкул 34**

Дзіця павінна быць абаронена ад усіх форм сексуальнай эксплуатацыі і сексуальнага гвалту, выкарыстання дзяцей у прастытуцыі або ў іншых незаконных сексуальных практыках, у парнаграфіі і парнаграфічных матэрыялах.

**Артыкул 38**

Дзяржава павінна прымаць усе магчымыя меры для абароны і догляду дзяцей, якія пацярпелі ў выніку ўзброенага канфлікту.

**Артыкул 40**

Кожнае дзіця, якое абвінавачваецца ў здзяйсненні злачынства, павінна гарантавана лічыцца невінаватым да таго часу, пакуль віна не даказана, мець юрыдычную дапамогу ў прадстаўленні яго справы; дзіця не можа быць прымушана да дачы паказанняў або прызнання віны; права на асабістае жыццё дзіцяці павінна цалкам выконвацца; справа павінна разглядацца ў парадку, які адпавядае ўзросту дзіцяці, абставінам і самаадчуванню. Ні смяротнае пакаранне, ні пажыццёвае турэмнае зняволенне, якое не прадугледжвае магчымасці вызвалення, не назначаюцца за злачынствы, учыненыя дзецьмі ва ўзросце да 18 гадоў.

З поўным тэкстам Канвенцыі і факультатыўных пратаколаў можна азнаёміцца на шматлікіх інтэрнэт-сайтах, такіх як ЮНІСЕФ (www.unicef.org/crc), і спампаваць тэкст з іх.
Крыніца: Цэнтр ААН па правах чалавека і Народны рух за вывучэнне правоў чалавека www.pdhre.org

**Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (CEDAW)**
*прынята ў 1979 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН, уступіла ў сілу 3 верасня 1981 года*
*(неафіцыйны агляд)*

**Артыкул 1**

Вызначэнне дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын як «...любое адрозненне, выключэнне або абмежаванне па прыкмеце полу, якое мае следствам або мэтай якога з'яўляецца прыніжэнне або адмаўленне прызнання, рэалізацыі або ажыццяўлення жанчынамі, незалежна ад іх сямейнага становішча, на аснове роўнасці мужчын і жанчын правоў чалавека і асноўных свабод у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, культурнай, грамадзянскай або любой іншай сферы».

**Артыкул 2**

Асуджае дыскрымінацыю ў адносінах да жанчын ва ўсіх яе формах; дзяржавы-ўдзельніцы пагаджаюцца забяспечыць прававыя рамкі абароны ад дыскрымінацыі і выконваць прынцып роўнасці.

**Артыкул 3**

Дзяржавы пагаджаюцца прымаць меры ва ўсіх сферах – грамадзянскіх, палітычных, эканамічных, сацыяльных і культурных, каб гарантаваць ажыццяўленне і рэалізацыю правоў чалавека ў адносінах да жанчын і фундаментальных свабод на аснове роўнасці з мужчынамі.

**Артыкул 4**

Дазваляе дзяржавам-удзельніцам прымаць «часовыя спецыяльныя меры» для паскарэння дасягнення роўнасці.

**Артыкул 5**

Неабходнасць прымаць адпаведныя меры, каб змяніць культурныя мадэлі паводзін, а таксама неабходнасць сямейнага выхавання, каб прызнаць сацыяльную функцыю мацярынства і агульную адказнасць за выхаванне дзяцей мужчынамі і жанчынамі.

**Артыкул 6**

Абавязвае дзяржавы-ўдзельніцы прыняць меры па спыненні гандлю жанчынамі і прыцягнення жанчын да прастытуцыі.

**Артыкул 7**

Жанчыны маюць роўнае права голасу, права займаць дзяржаўныя пасады, а таксама ўдзельнічаць у грамадзянскай супольнасці.

**Артыкул 8**

Жанчыны маюць такое ж права, як і мужчыны, працаваць і прадстаўляць свае ўрады на міжнародным узроўні.

**Артыкул 9**

Жанчыны маюць роўныя з мужчынамі правы на атрыманне, змяненне або захаванне свайго грамадзянства і грамадзянства сваіх дзяцей.

**Артыкул 10**

Абавязвае дзяржавы-ўдзельніцы ліквідаваць дыскрымінацыю ў галіне адукацыі, у тым ліку ў прафесійнай падрыхтоўцы, доступе да вучэбных планаў і іншых сродках атрымання роўнай адукацыі, а таксама ліквідаваць стэрэатыпныя ўяўленні пра ролю мужчын і жанчын.

**Артыкул 11**

Заклікае дзяржавы-ўдзельніцы прымаць меры па спыненні дыскрымінацыі ў сферы занятасці і забеспячэння ўсіх правоў у гэтай галіне, у тым ліку права на працу, магчымасцей працаўладкавання, роўнага ўзнагароджання, свабоднага выбару прафесіі і занятасці, сацыяльнага забеспячэння і абароны.

**Артыкул 12**

Патрабуе ад дзяржаў-удзельнікаў прымаць меры па ліквідацыі дыскрымінацыі ў галіне аховы здароўя, у тым ліку забяспечваць доступ да такіх паслуг, як планаванне сям'і.

**Артыкул 13**

Жанчыны маюць такія ж правы, як і мужчыны, ва ўсіх сферах сацыяльна-эканамічнага жыцця, напрыклад права на сямейную матэрыяльную дапамогу, іпатэчныя крэдыты, банкаўскія крэдыты, а таксама ўдзел у забаўляльных і спартыўных мерапрыемствах.

**Артыкул 14**

Засяроджваецца на рашэнні канкрэтных праблем, з якімі сутыкаюцца жанчыны ў сельскай мясцовасці, у тым ліку ў вобласці ўдзелу жанчын у працэсе планавання развіцця, доступу да адэкватнай медыцынскай дапамогі, крэдытавання, адукацыі і належных умоў жыцця.

**Артыкул 15**

Жанчыны і мужчыны роўныя перад законам. Жанчыны маюць законнае права заключаць дагаворы, валодаць маёмасцю і выбіраць месца жыхарства.

**Артыкул 16**

Патрабуе мер па забеспячэнні роўнасці ў шлюбе і сямейных адносінах, у тым ліку роўных з мужчынамі правоў на свабодны выбар шлюбу, роўных правоў і абавязкаў у адносінах да дзяцей, у тым ліку права свабодна вызначаць колькасць дзяцей, інтэрвал паміж іх нараджэннем і сродкі, каб ажыццявіць гэта; а таксама патрабуе аднолькавых правоў уласнасці.

**Артыкулы 17–30**

Працэдуры справаздачнасці і адміністраванне Канвенцыі.

## Міжнародная канвенцыя аб абароне ўсіх асоб ад гвалтоўных знікненняў
*(неафіцыйны агляд)*

Артыкул 1 забараняе гвалтоўныя знікненні; *ніякія выключныя абставіны, у тым ліку стан вайны або пагроза вайны, унутраная палітычная нестабільнасць ці любое іншае надзвычайнае становішча, не могуць служыць апраўданнем гвалтоўнага знікнення*.

«Гвалтоўнае знікненне» вызначаецца ў артыкуле 2 Канвенцыі як *арышт, затрыманне, выкраданне або любая іншая форма пазбаўлення волі з боку агентаў дзяржавы ці асоб або груп асоб, якія дзейнічаюць з дазволу, пры падтрымцы або са згоды дзяржавы, з наступнай адмовай прызнаць факт пазбаўлення волі або з утойваннем звестак пра лёс ці месцазнаходжанне зніклай асобы, з прычыны чаго гэта асоба знаходзіцца па-за абаронай закону*.

Шырока распаўсюджанае або сістэматычнае выкарыстанне гвалтоўных знікненняў далей вызначаецца як злачынства супраць чалавечнасці (артыкул 6).

Дзяржавы-ўдзельніцы Канвенцыі таксама абавязваюцца:

- расследаваць акты гвалтоўнага знікнення і прыцягваць вінаватых да адказнасці;
- гарантаваць, што гвалтоўнае знікненне з'яўляецца злачынствам у адпаведнасці з крымінальным заканадаўствам дзяржавы;
- устанавіць сваю юрысдыкцыю ў дачыненні да злачынства гвалтоўнага знікнення, калі меркаваны злачынец знаходзіцца на яе тэрыторыі, нават калі ён (яна) не з'яўляецца грамадзянінам або рэзідэнтам;
- супрацоўнічаць з іншымі дзяржавамі ў справе забеспячэння праследавання правапарушальнікаў або іх выдачы, а таксама ў справе аказання дапамогі ахвярам гвалтоўных знікненняў або пошуку іх месцазнаходжання і вяртання іх астанкаў;
- выконваць мінімальныя прававыя нормы адносна пазбаўлення волі, у тым ліку права на аспрэчванне заключэння перад судом;
- стварыць рэестр асоб, якія ў цяперашні час знаходзяцца ў зняволенні, і даць магчымасць сваякам і адвакатам доступ да гэтага рэестра;
- гарантаваць, што ахвяры гвалтоўных знікненняў або непасрэдна пацярпелыя ад яго маюць права на атрыманне кампенсацыі і пакрыцця страт (артыкул 24. 4);
- права на атрыманне кампенсацыі ўключае ў сябе матэрыяльны і маральны аспект, а таксама ў выпадку неабходнасці іншыя формы кампенсацыі, такія як: а) аднаўленне першапачатковага прававога становішча, б) аднаўленне добрага імя, в) выкананне патрабаванняў, у тым ліку аднаўленне годнасці і кампенсацыі; г) гарантыю непаўтарэння (артыкул 24. 5).

Канвенцыя павінна рэгулявацца Камітэтам па гвалтоўных знікненнях, члены якой выбіраюцца з удзельнікаў Канвенцыі. Дзяржавы-ўдзельніцы абавязаны паведамляць гэтаму Камітэту аб мерах, прынятых імі з мэтай выканання Канвенцыі, на працягу двух гадоў пасля далучэння да яе.

Канвенцыя ўключае ў сябе дадатковую сістэму падачы скаргаў, з дапамогай якіх грамадзяне дзяржаў-удзельнікаў могуць звярнуцца да Камітэта па дапамогу ў пошуку зніклага чалавека. Дзяржавы-ўдзельніцы могуць далучыцца да гэтай сістэмы ў любы час, але могуць адмовіцца ад яе толькі пасля падпісання.

Крыніца: «Вікіпедыя», па стане на 25 мая 2012 г.

## Канвенцыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб правах людзей з інваліднасцю
*(неафіцыйны агляд)*

**Артыкул 1. Мэта**

Мэта Канвенцыі заключаецца ў падтрымцы, абароне і забеспячэнні поўнага ажыццяўлення ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх людзей з інваліднасцю. Да людзей з інваліднасцю адносяцца людзі з устойлівымі фізічнымі, разумовымі, інтэлектуальнымі ці сэнсарнымі парушэннямі, якія пры ўзаемадзеянні з рознымі бар'ерамі могуць сутыкацца з перашкодамі іх поўнаму і эфектыўнаму ўдзелу ў жыцці грамадства нароўні з іншымі.

**Артыкул 2. Вызначэнні**

Гэты артыкул вызначае некаторыя з ключавых тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца ў Канвенцыі, у тым ліку «зносіны»; «мова»; «дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці»; «разумнае прыстасаванне» і «ўніверсальны дызайн».

**Артыкул 3. Агульныя прынцыпы**

Канвенцыя заснавана на прынцыпах павагі годнасці; недыскрымінацыі; уцягнення і ўключэння ў жыццё грамадства; павагі да асаблівасцей; роўнасці магчымасцей; даступнасці; роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі; павагі да дзяцей.

**Артыкул 4. Агульныя абавязкі**

Краіны павінны прыняць шэраг мер пры актыўным удзеле людзей з інваліднасцю з мэтай забяспечваць і падтрымліваць поўную рэалізацыю ўсіх правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх людзей з інваліднасцю без якой-небудзь дыскрымінацыі.

**Артыкул 5. Роўнасць і недыскрымінацыя**

Усе людзі роўныя перад законам і па законе. Кожны чалавек мае права на роўную абарону і карысць закону без якой-небудзь дыскрымінацыі.

**Артыкул 6. Жанчыны з інваліднасцю**

Жанчыны і дзяўчынкі з інваліднасцю адчуваюць множную дыскрымінацыю. Краіны павінны прыняць усе неабходныя меры для забеспячэння таго, каб жанчыны з інваліднасцю маглі ў поўнай меры карыстацца правамі і свабодамі, выкладзенымі ў Канвенцыі.

**Артыкул 7. Дзеці з інваліднасцю**

Дзеці з інваліднасцю маюць тыя ж правы чалавека, што і ўсе іншыя дзеці. Ва ўсіх дзеяннях у дачыненні да дзяцей з інваліднасцю першачарговая ўвага надаецца найлепшым інтарэсам дзіцяці. Дзеці з інваліднасцю маюць права выказваць сваё меркаванне па ўсіх пытаннях, якія датычацца іх.

**Артыкул 8. Асветніцка-выхаваўчая работа**

Дзяржавы павінны павышаць дасведчанасць аб правах, магчымасцях і ўкладзе людзей з інваліднасцю. Дзяржавы павінны кінуць выклік стэрэатыпам і прадузятасцям, якія тычацца людзей з інваліднасцю, шляхам прасоўвання, адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі і праграм павышэння дасведчанасці.

**Артыкул 9. Даступнасць**

Людзі з інваліднасцю маюць права на доступ да ўсіх аспектаў жыцця грамадства нароўні з іншымі, у тым ліку да фізічнага асяроддзя, транспарту, інфармацыі і сувязі, а таксама іншых аб'ектаў і паслуг, якія прапануюцца насельніцтву.

**Артыкул 10. Права на жыццё**

Людзі з інваліднасцю маюць права на жыццё. Дзяржавы павінны прыняць усе неабходныя меры для забеспячэння таго, каб людзі з інваліднасцю маглі эфектыўна карыстацца гэтым правам нароўні з іншымі.

**Артыкул 11. Сітуацыі рызыкі і надзвычайныя гуманітарныя сітуацыі**

Краіны павінны прымаць усе неабходныя меры для забеспячэння абароны і бяспекі ўсіх людзей з інваліднасцю ў сітуацыях рызыкі, у тым ліку ва ўзброеных канфліктах, надзвычайных гуманітарных сітуацыях і пры стыхійных бедствах.

**Артыкул 12. Роўнасць перад законам**

Людзі з інваліднасцю маюць права на правасуб'ектнасць. Людзі з інваліднасцю маюць правадольнасць нароўні з іншымі ва ўсіх аспектах жыцця. Краіны павінны прымаць належныя меры для падтрымкі людзей з інваліднасцю, каб яны маглі эфектыўна ажыццяўляць сваю праваздольнасць.

**Артыкул 13. Доступ да правасуддзя**

Людзі з інваліднасцю маюць права на эфектыўны доступ да правасуддзя нароўні з іншымі, у тым ліку шляхам забеспячэння для іх адпаведных умоў.

**Артыкул 14. Свабода і асабістая недатыкальнасць**

Людзі з інваліднасцю маюць права на свабоду і асабістую недатыкальнасць нароўні з іншымі. Наяўнасць інваліднасці сама па сабе не можа апраўдаць пазбаўленне волі.

**Артыкул 15. Свабода ад катаванняў або жорсткага, бесчалавечнага або зневажальнага абыходжання ці пакарання**

Людзі з інваліднасцю маюць права на свабоду ад катаванняў і жорсткага, бесчалавечнага або зневажальнага абыходжання ці пакарання. Ніхто не павінен падвяргацца медыцынскім або навуковым эксперыментам без сваёй свабоднай згоды.

**Артыкул 16. Свабода ад эксплуатацыі, гвалту і здзекаў**

Людзі з інваліднасцю маюць права на абарону ад усіх форм эксплуатацыі, гвалту і здзекаў, у тым ліку адносна іх полу, як дома, так і па-за яго межамі.

**Артыкул 17. Абарона цэласнасці чалавека**

Кожны чалавек з інваліднасцю мае права на павагу сваёй фізічнай і псіхічнай цэласнасці нароўні з іншымі.

**Артыкул 18. Свабода перамяшчэння і грамадзянства**

Людзі з інваліднасцю маюць права на грамадзянства. Дзеці з інваліднасцю маюць права на імя, права ведаць сваіх бацькоў і на тое, каб іх бацькі клапаціліся пра іх.

**Артыкул 19. Самастойны лад жыцця і ўдзел у жыцці грамадства**

Людзі з інваліднасцю маюць права самастойна жыць у грамадстве. Краіны павінны забяспечыць для людзей з інваліднасцю магчымасць выбіраць, дзе і з кім жыць, а таксама забяспечыць неабходную для гэтага падтрымку.

**Артыкул 20. Асабістая мабільнасць**

Краіны павінны прымаць эфектыўныя і належныя меры для забеспячэння асабістай мабільнасці для людзей з інваліднасцю, па сваім выбары парадку і тэрмінаў, а таксама па даступнай цане. Людзі з інваліднасцю маюць права на доступ да якасных сродкаў мабільнасці, да дапаможных тэхналогій і разнастайных форм дапамогі і пасрэднікаў.

**Артыкул 21. Свабода выказвання меркаванняў і перакананняў і доступ да інфармацыі**

Людзі з інваліднасцю маюць права выказваць сваё меркаванне, у тым ліку свабодна паведамляць і атрымліваць інфармацыю і ідэі праз любыя формы зносін, у тым ліку праз даступныя формы і тэхналогіі, мову жэстаў, шрыфт Брайля і альтэрнатыўныя сродкі сувязі, сродкі масавай інфармацыі і ўсе іншыя даступныя сродкі камунікацыі.

**Артыкул 22. Недатыкальнасць прыватнага жыцця**

Людзі з інваліднасцю маюць права на прыватнае жыццё. Інфармацыя пра людзей з інваліднасцю, у тым ліку асабістая інфармацыя і інфармацыя пра іх здароўе, павінна быць абаронена.

**Артыкул 23. Павага дома і сям'і**

Людзі з інваліднасцю маюць права браць шлюб і ствараць сям'ю. Краіны павінны забяспечыць эфектыўную і належную падтрымку для людзей з інваліднасцю ў выхаванні дзяцей, а таксама забяспечыць альтэрнатыўны догляд за дзецьмі з інваліднасцю, калі іх сям'я не ў стане клапаціцца пра іх.

**Артыкул 24. Адукацыя**

Людзі з інваліднасцю маюць права на адукацыю без дыскрымінацыі. Краіны павінны забяспечыць для людзей з інваліднасцю атрыманне доступу да інклюзіўнай, якаснай і бясплатнай пачатковай і сярэдняй адукацыі ў грамадстве. Краіны павінны таксама забяспечыць разумныя прыстасаванні і індывідуальную падтрымку для адукацыйнага і сацыяльнага развіцця ў максімальнай ступені.

**Артыкул 25. Здароўе**

Людзі з інваліднасцю маюць права на найвышэйшы дасягальны ўзровень здароўя без дыскрымінацыі. Краіны павінны прыняць усе неабходныя меры, уключаючы меры з улікам гендарных аспектаў, каб людзі з інваліднасцю мелі доступ да такога ж асартыменту, якасці і ўзроўню медыцынскага абслугоўвання, які даступны для ўсіх астатніх і які знаходзіцца блізка да месца іх пражывання.

**Артыкул 26. Абілітацыя і рэабілітацыя**

Краіны павінны прыняць эфектыўныя і належныя меры для таго, каб людзі з інваліднасцю маглі развівацца, дасягаць максімальных здольнасцей і захоўваць іх, быць незалежнымі і ўдзельнічаць у жыцці грамадства праз забеспячэнне для іх паслуг і праграм абілітацыі і рэабілітацыі.

**Артыкул 27. Праца і занятасць**

Людзі з інваліднасцю маюць права на працу, у тым ліку працу ў адкрытым і даступным асяроддзі. Краіны павінны прыняць адпаведныя меры па пашырэнні магчымасцей працаўладкавання і кар'ернага росту для людзей з інваліднасцю.

**Артыкул 28. Дастатковы жыццёвы ўзровень і сацыяльная абарона**

Людзі з інваліднасцю маюць права на дастатковы жыццёвы ўзровень, у тым ліку харчаванне, ваду, адзенне і жыллё, і эфектыўную сацыяльную абарону, у тым ліку скарачэнне маштабаў галечы і ўдзел у праграме дзяржаўнага жылля.

**Артыкул 29. Удзел у палітычным і грамадскім жыцці**

Людзі з інваліднасцю маюць права ўдзельнічаць у палітычным і грамадскім жыцці, у тым ліку галасаваць на выбарах і быць выбранымі.

**Артыкул 30. Удзел у культурным жыцці, правядзенне вольнага часу, адпачынак і заняткі спортам**

Людзі з інваліднасцю маюць права прымаць удзел у культурным жыцці нароўні з іншымі, у тым ліку права на доступ да культурных матэрыялаў, спектакляў і паслуг, а таксама арганізацыю вольнага часу, адпачынку і спартыўных мерапрыемстваў.

**Артыкул 31. Статыстыка і збор даных**

Краіны павінны збіраць інфармацыю пра людзей з інваліднасцю пры актыўным удзеле саміх людзей з інваліднасцю, каб яны маглі лепш зразумець бар'еры, з якімі яны сутыкаюцца, і зрабіць права Канвенцыі рэальнымі.

**Артыкул 32–50**

Артыкулы 32–50 тлумачаць, якім чынам краіны, якія звязаны Канвенцыяй, павінны ў поўнай меры ўносіць свой уклад. Яны таксама тлумачаць абавязак даваць справаздачы Камітэту Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах людзей з інваліднасцю аб тым, як дзяржавы рэалізуюць Канвенцыю.

Крыніца: Цэнтр па правах чалавека для людзей з інваліднасцю ww.disabilityhumanrights.org

## Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і яе пратаколы

*Спрошчаная версія выбраных артыкулаў*[1]

### Рэзюмэ прэамбулы

Урады краін – удзельнікаў Савета Еўропы імкнуцца да міру і ўмацавання адзінства на аснове правоў чалавека і фундаментальных свабод. У адпаведнасці з дадзенай Канвенцыяй яны вырашаюць зрабіць першыя крокі да ажыццяўлення многіх правоў, якія змяшчаюцца ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.

**Артыкул 1. Абавязацельства паважаць правы чалавека**

Дзяржавы павінны забяспечыць выкананне правоў, названых у дадзенай Канвенцыі, для кожнага чалавека.

**Артыкул 2. Права на жыццё**

У кожнага чалавека ёсць права на жыццё.

**Артыкул 3. Забарона катаванняў**

Ніхто не мае права прычыніць чалавеку шкоду або катаваць яго. Нават у зняволенні чалавечая годнасць павінна паважацца.

**Артыкул 4. Забарона рабства і прымусовай працы**

Забараняецца ставіцца да чалавека як да раба або прымушаць яго да працы.

**Артыкул 5. Права на свабоду і асабістую недатыкальнасць**

Кожны чалавек мае права на свабоду. Калі чалавека арыштоўваюць, ён мае права ведаць прычыну. Калі чалавек арыштаваны, ён мае права паўстаць перад судом у бліжэйшы час або быць вызваленым да суда.

**Артыкул 6. Права на справядлівы судовы разбор**

Кожны чалавек мае права на справядлівы судовы разбор перад непрадузятым і незалежным суддзёй. Калі асобу абвінавачваюць у здзяйсненні злачынства, яна лічыцца не вінаватай, пакуль яе віна не даказана. Такая асоба мае права на дапамогу адваката, які павінен быць аплачаны дзяржавай, калі ў яе не хапае сродкаў.

**Артыкул 7. Пакаранне выключна на аснове закону**

Ніхто не можа быць прызнаны вінаватым у здзяйсненні злачынства, калі на момант здзяйснення не існавала адпаведнага закону.

**Артыкул 8. Права на павагу прыватнага і сямейнага жыцця**

Кожны чалавек мае права на павагу свайго прыватнага і сямейнага жыцця, жылля і перапіскі.

**Артыкул 9. Свабода думкі, сумлення і рэлігіі**

Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі. Кожны чалавек мае права вызнаваць сваю рэлігію дома і ў грамадскіх месцах і мяняць сваю рэлігію па ўласным жаданні.

**Артыкул 10. Свабода выказвання меркавання**

Кожны чалавек мае права адказна гаварыць і пісаць тое, што думае, і даваць і атрымліваць інфармацыю ад іншых. Гэта права ўключае ў сябе свабоду друку.

**Артыкул 11. Свабода сходаў і аб'яднанняў**

Кожны чалавек мае права прымаць удзел у мірных сходах і ствараць аб'яднанні або далучацца да іх, у тым ліку да прафсаюзаў.

**Артыкул 12. Права на ўступленне ў шлюб**

Кожны чалавек мае права браць шлюб і мець сям'ю.

**Артыкул 13. Права на эфектыўныя сродкі прававой абароны**

Калі правы чалавека парушаюцца, ён можа афіцыйна падаць скаргу ў суд ці іншы дзяржаўны орган.

**Артыкул 14. Забарона дыскрымінацыі**

У кожнага чалавека ёсць гэтыя правы незалежна ад колеру скуры, полу, мовы, палітычных ці рэлігійных перакананняў або сацыяльнага паходжання.

**Артыкул 15. Адступленне ад выканання абавязкаў пры надзвычайных сітуацыях**

Падчас вайны ці іншага надзвычайнага становішча ўрад можа адступаць ад выканання правоў чалавека, але толькі ў выпадку крайняй неабходнасці. Нават тады ўрад не можа, напрыклад, адвольна катаваць або забіць чалавека.

**Артыкул 16. Абмежаванне на палітычную дзейнасць замежнікаў**

Урады могуць абмежаваць палітычную дзейнасць замежнікаў, нават калі гэта будзе супярэчыць артыкулам 10, 11 або 14.

**Артыкул 17. Забарона злоўжывання правамі**

Нішто ў гэтай Канвенцыі не можа быць выкарыстана для нанясення шкоды правам і свабодам, замацаваным у Канвенцыі.

**Артыкул 18. Межы выкарыстання абмежаванняў у дачыненні да правоў**

Большасць правоў у гэтай Канвенцыі можа быць абмежавана агульным законам, які прымяняецца да ўсіх. Такія абмежаванні дапускаюцца толькі ў тым выпадку, калі яны строга неабходны.

**Артыкулы 19–51**

Гэтыя артыкулы тлумачаць, як працуе Еўрапейскі суд па правах чалавека.

**Артыкул 34. Індывідуальныя скаргі**

Калі правы чалавека, змешчаныя ў Канвенцыі, парушаны ў адной з дзяржаў-удзельнікаў, асоба павінна спачатку звярнуцца да ўсіх кампетэнтных нацыянальных органаў. Калі ў пэўным выпадку гэта не працуе, можна звярнуцца непасрэдна ў Еўрапейскі суд па правах чалавека ў Страсбургу.

**Артыкул 52. Запыты Генеральнага сакратара**

Па запыце Генеральнага сакратара Савета Еўропы ўрад павінен растлумачыць, як яго нацыянальнае заканадаўства абараняе правы дадзенай Канвенцыі.

**ПРАТАКОЛЫ ДА КАНВЕНЦЫІ**

**Артыкул 1 Пратакола № 1. Абарона маёмасці**

Кожны чалавек мае права валодаць маёмасцю і карыстацца ёю.

**Артыкул 2 Пратакола № 1. Права на адукацыю**

Кожны чалавек мае права хадзіць у школу.

**Артыкул 3 Пратакола № 1. Права на свабодныя выбары**

Кожны чалавек мае права выбіраць урад сваёй краіны тайным галасаваннем.

**Артыкул 2 Пратакола № 4. Свабода перамяшчэння**

Калі чалавек законна знаходзіцца ў межах краіны, ён мае права ісці туды, куды захоча, і жыць там, дзе захоча.

**Артыкул 1 Пратакола № 6. Адмена смяротнай кары**

Чалавек не можа быць прыгавораны да смяротнай кары ці быць пакараным дзяржавай.

**Артыкул 2 Пратакола № 7. Права на абскарджанне ў крымінальных справах**

Кожны чалавек можа звярнуцца ў вышэйстаячы суд, калі ён быў асуджаны за здзяйсненне злачынства.

**Артыкул 3 Пратакола № 7. Кампенсацыя за неправамернае асуджэнне**

Кожны чалавек мае права на кампенсацыю, калі ён быў асуджаны за здзяйсненне злачынства і высветлілася, што ён не вінаваты.

**Артыкул 1 Пратакола № 12. Агульная забарона дыскрымінацыі**

Ніякі чалавек не можа падвяргацца дыскрымінацыі з боку дзяржаўных органаў па прычынах, напрыклад, колеру скуры, полу, мовы, палітычных ці рэлігійных перакананняў або сацыяльнага паходжання.

[1]Гэта спрошчаная версія была падрыхтавана Дырэктаратам па камунікацыях Савета Еўропы выключна ў адукацыйных мэтах. Тэксты, якія маюць прававую аснову, можна знайсці ў афіцыйных апублікаваных версіях Канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод і пратаколаў да яе.

## Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека

*са зменамі, унесенымі Пратаколамі № 11 і 14 з моманту іх уступлення ў сілу 1 чэрвеня 2010 г.*

## Канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод

*Рым, 04.11.1950*

УРАДЫ, ЯКІЯ ПАДПІСАЛІ ГЭТУ КАНВЕНЦЫЮ і якія з'яўляюцца членамі Савета Еўропы, прымаючы пад увагу Ўсеагульную дэкларацыю правоў чалавека, абвешчаную Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 10 снежня 1948 года; улічваючы, што гэта Дэкларацыя мае мэтай забяспечыць усеагульнае і эфектыўнае прызнанне і ажыццяўленне абвешчаных у ёй правоў; лічачы, што мэтай Савета Еўропы з'яўляецца дасягненне большага адзінства паміж яго членамі і што адным са сродкаў дасягнення гэтай мэты з'яўляецца абарона і развіццё правоў чалавека і асноўных свабод; пацвярджаючы сваю глыбокую прыхільнасць асноўным свабодам, якія з'яўляюцца асновай справядлівасці і ўсеагульнага міру і выкананне якіх найлепшым чынам забяспечваецца, з аднаго боку, сапраўды дэмакратычным палітычным рэжымам, а з другога боку, усеагульным разуменнем і выкананнем правоў чалавека, якім яны адданы; поўныя рашучасці як Урады еўрапейскіх дзяржаў, рухомыя адзіным імкненнем і з агульнай спадчынай палітычных традыцый, ідэалаў, свабоды і вяршэнства права, зрабіць першыя крокі на шляху забеспячэння калектыўнага ажыццяўлення некаторых з правоў, выкладзеных ва Ўсеагульнай дэкларацыі, пагадзіліся аб наступным:

### РАЗДЗЕЛ I. ПРАВЫ І СВАБОДЫ

**Артыкул 1. Абавязацельства паважаць правы чалавека**

Высокія Дагаворныя Бакі забяспечваюць кожнаму, хто знаходзіцца пад іх юрысдыкцыяй, правы і свабоды, вызначаныя ў раздзеле I гэтай Канвенцыі.

**Артыкул 2. Права на жыццё**

1. Права кожнай асобы на жыццё абараняецца законам. Ніхто не можа быць наўмысна пазбаўлены жыцця інакш як у мэтах выканання смяротнага прысуду, вынесенага судом за ўчыненне злачынства, у адносінах да якога законам прадугледжана такое пакаранне.
2. Пазбаўленне жыцця не разглядаецца як парушэнне гэтага артыкула, калі яно з'яўляецца вынікам абсалютна неабходнага прымянення сілы:

a) для абароны любой асобы ад супрацьпраўнага гвалту;

b) для ажыццяўлення законнага затрымання або папярэджання ўцёкаў асобы, заключанай пад варту на законных падставах;

c) для падаўлення ў адпаведнасці з законам бунту або мяцяжу.

**Артыкул 3. Забарона катаванняў**

Ніхто не павінен падвяргацца ні катаванням, ні бесчалавечнаму або зневажальнаму абыходжанню ці пакаранню.

**Артыкул 4. Забарона рабства і прымусовай працы**

1. Ніхто не павінен утрымлівацца ў рабстве або паднявольным стане.
2. Ніхто не павінен прыцягвацца да прымусовай ці абавязковай працы.
3. Для мэт гэтага артыкула тэрмін «прымусовая ці абавязковая праца» не ўключае ў сябе:
   a) любую працу, якую звычайна павінна выконваць асоба, якая знаходзіцца ў зняволенні згодна з палажэннямі артыкула 5 гэтай Канвенцыі або ўмоўна вызвалена ад такога зняволення;
   b) усякую службу ваеннага характару, а ў тых краінах, у якіх правамерным прызнаецца адмова ад ваеннай службы на падставе перакананняў, службу, прызначаную замест абавязковай ваеннай службы;
   c) усякую службу, абавязковую ў выпадку надзвычайнага становішча або бедства, якое пагражае жыццю або дабрабыту насельніцтва;
   d) усякую працу або службу, якая з'яўляецца часткай звычайных грамадзянскіх абавязкаў.

**Артыкул 5. Права на свабоду і асабістую недатыкальнасць**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду і асабістую недатыкальнасць. Ніхто не можа быць пазбаўлены волі інакш як у наступных выпадках і ў парадку, устаноўленым законам:
   a) законнае ўтрыманне пад вартай асобы, асуджанай кампетэнтным судом;
   b) законнае затрыманне або заключэнне пад варту (арышт) асобы за невыкананне вынесенага ў адпаведнасці з законам рашэння суда або з мэтай забеспячэння выканання любога абавязацельства, прадпісанага законам;
   c) законнае затрыманне або заключэнне пад варту асобы, выкананае з тым, каб яна паўстала перад кампетэнтным органам па абгрунтаваным падазрэнні ў здзяйсненні правапарушэння або ў выпадку, калі маюцца дастатковыя падставы меркаваць, што неабходна прадухіліць здзяйсненне ёй правапарушэння або перашкодзіць ёй схавацца пасля яго здзяйснення;
   d) заключэнне пад варту непаўналетняй асобы на падставе законнай пастановы для выхаваўчага нагляду або яе законнае заключэнне пад варту, выкананае з тым, каб яна паўстала перад кампетэнтным органам;
   e) законнае заключэнне пад варту асоб з мэтай прадухілення распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў, а таксама законнае заключэнне пад варту псіхічнахворых, алкаголікаў, наркаманаў ці валацуг;
   f) законнае затрыманне або заключэнне пад варту асобы з мэтай прадухілення яе незаконнага ўезду ў краіну або асобы, супраць якой робяцца захады па яе высылцы або выдачы.
2. Кожнаму арыштаванаму неадкладна паведамляюцца на зразумелай яму мове прычыны яго арышту і любое прад'яўленае яму абвінавачанне.
3. Кожны затрыманы або зняволены пад варту ў адпаведнасці з падпунктам (с) параграфа 1 гэтага артыкула неадкладна дастаўляецца да суддзі ці да іншай службовай асобы, надзеленай, згодна з законам, судовай уладай, і мае права на судовы разбор на працягу разумнага тэрміну або на вызваленне да суда. Вызваленне можа быць абумоўлена забеспячэннем гарантый яўкі ў суд.
4. Кожны, хто пазбаўлены волі ў выніку арышту або заключэння пад варту, мае права на неадкладны разгляд судом правамернасці яго заключэння пад варту і на вызваленне, калі яго заключэнне пад варту прызнана судом незаконным.
5. Кожны, хто стаў ахвярай арышту або заключэння пад варту ў парушэнне палажэнняў гэтага артыкула, мае права на кампенсацыю.

**Артыкул 6. Права на справядлівы судовы разбор**

1. Кожны чалавек у выпадку спрэчкі аб яго грамадзянскіх правах і абавязках або пры прад'яўленні яму любога крымінальнага абвінавачання мае права на справядлівы і публічны разбор справы ў разумны тэрмін незалежным і непрадузятым судом, створаным на падставе закону. Судовае рашэнне аб'яўляецца публічна, аднак прэса і грамадства могуць не дапускацца на судовыя пасяджэнні на працягу ўсяго працэсу або яго часткі па меркаваннях маралі, грамадскага парадку ці нацыянальнай бяспекі ў дэмакратычным грамадстве, а таксама калі таго патрабуюць інтарэсы непаўналетніх, або для абароны прыватнага жыцця бакоў, або ў той меры, у якой гэта, на думку суда, строга неабходна – пры асаблівых абставінах, калі галоснасць парушала б інтарэсы правасуддзя.
2. Кожны чалавек, які абвінавачваецца ў здзяйсненні крымінальнага злачынства, лічыцца невінаватым да таго часу, пакуль яго віна не будзе ўстаноўлена законным парадкам.
3. Кожны чалавек, які абвінавачваецца ў здзяйсненні крымінальнага злачынства, мае як мінімум наступныя правы:
   a) быць неадкладна і падрабязна апавешчаным на зразумелай яму мове аб характары і прычыне прад'яўленага яму абвінавачання;
   b) мець дастатковы час і магчымасці для падрыхтоўкі сваёй абароны;
   c) абараняць сябе асабіста, або пры дапамозе выбранага ім самім абаронцы, або пры недахопе ў яго сродкаў для аплаты паслуг абаронцы карыстацца паслугамі прызначанага яму абаронцы бясплатна, калі таго патрабуюць інтарэсы правасуддзя;
   d) дапытваць сведкаў, якія паказваюць супраць яго, або мець права на тое, каб гэтыя сведкі былі дапытаны, і мець права на выклік і допыт сведак на сваю карысць на тых жа ўмовах, што і для сведак, якія паказваюць супраць яго;
   e) карыстацца бясплатнай дапамогай перакладчыка, калі чалавек не разумее мовы, якая выкарыстоўваецца ў судзе, ці не гаворыць на гэтай мове.

**Артыкул 7. Пакаранне выключна на аснове закону**

1. Ніхто не можа быць асуджаны за здзяйсненне якога-небудзь дзеяння або за бяздзейнасць, якое, у адпаведнасці з дзеючым у момант яго здзяйснення нацыянальным або міжнародным правам, не з'яўлялася крымінальным злачынствам. Не можа таксама накладацца пакаранне больш цяжкае, чым тое, якое падлягала прымяненню ў момант здзяйснення крымінальнага злачынства.
2. Сапраўдны артыкул не перашкаджае асуджэнню і пакаранню любой асобы за ўчыненне якога-небудзь дзеяння або за бяздзейнасць, якое ў момант яго здзяйснення з'яўлялася крымінальным злачынствам у адпаведнасці з агульнымі прынцыпамі права, прызнанымі цывілізаванымі краінамі.

**Артыкул 8. Права на павагу прыватнага і сямейнага жыцця**

1. Кожны чалавек мае права на павагу свайго асабістага і сямейнага жыцця, свайго жылля і перапіскі.
2. Не дапускаецца ўмяшанне з боку публічных уладаў у ажыццяўленне гэтага права, за выключэннем выпадку, калі такое ўмяшанне прадугледжана законам і неабходна ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі і грамадскага парадку, эканамічнага дабрабыту краіны, у мэтах прадухілення беспарадкаў або злачынстваў, для аховы здароўя або маралі ці абароны правоў і свабод іншых асоб.

**Артыкул 9. Свабода думкі, сумлення і рэлігіі**

1. Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэта права ўключае ў сябе свабоду мяняць сваю рэлігію або перакананні і свабоду вызнаваць сваю рэлігію або перакананні як індывідуальна, так і разам з іншымі, публічным або прыватным парадкам, у багаслужэнні, навучанні, адпраўленні рэлігійных і культавых абрадаў.
2. Свабода вызнаваць сваю рэлігію або перакананні падлягае толькі абмежаванням, якія прадугледжаны законам і неабходны ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах грамадскай бяспекі, для аховы грамадскага парадку, здароўя або маралі ці для абароны правоў і свабод іншых асоб.

**Артыкул 10. Свабода выказвання меркавання**

1. Кожны чалавек мае права свабодна выказваць сваё меркаванне. Гэта права ўключае ў сябе свабоду прытрымлівацца свайго меркавання і свабоду атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі без якога-небудзь умяшання з боку публічных уладаў і незалежна ад дзяржаўных меж. Гэты артыкул не перашкаджае дзяржавам ажыццяўляць ліцэнзаванне радыёвяшчальных, тэлевізійных ці кінематаграфічных прадпрыемстваў.
2. Ажыццяўленне гэтых свабод, якое накладае абавязкі і адказнасць, можа быць звязана з пэўнымі фармальнасцямі, умовамі, абмежаваннямі або санкцыямі, якія прадугледжаны законам і неабходны ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, тэрытарыяльнай цэласнасці ці грамадскага парадку, у мэтах прадухілення беспарадкаў і злачынстваў, для аховы здароўя і маральнасці, абароны рэпутацыі або правоў іншых асоб, прадухілення выдавання інфармацыі, атрыманай канфідэнцыяльна, або забеспячэння аўтарытэту і непрадузятасці правасуддзя.

**Артыкул 11. Свабода сходаў і аб'яднанняў**

1. Кожны мае права на свабоду мірных сходаў і на свабоду аб'яднання з іншымі, у тым ліку права ствараць прафесійныя саюзы і ўступаць у іх для абароны сваіх інтарэсаў.
2. Ажыццяўленне гэтых правоў не падлягае ніякім абмежаванням, акрамя тых, якія прадугледжаны законам і неабходны ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі і грамадскага парадку, у мэтах прадухілення беспарадкаў і злачынстваў, для аховы здароўя і маральнасці або абароны правоў і свабод іншых асоб. Гэты артыкул не перашкаджае ўвядзенню законных абмежаванняў на ажыццяўленне гэтых правоў асобамі, якія ўваходзяць у склад узброеных сіл, паліцыі або адміністрацыйных органаў дзяржавы.

**Артыкул 12. Права на ўступленне ў шлюб**

Мужчыны і жанчыны, якія дасягнулі шлюбнага ўзросту, маюць права браць шлюб і ствараць сям'ю ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, якое рэгулюе ажыццяўленне гэтага права.

**Артыкул 13. Права на эфектыўныя сродкі прававой абароны**

Кожны чалавек, чые правы і свабоды, выкладзеныя ў гэтай Канвенцыі, парушаны, мае права на эфектыўныя сродкі прававой абароны ў дзяржаўным органе, нават калі гэта парушэнне было здзейснена асобамі, якія дзейнічалі ў афіцыйнай якасці.

**Артыкул 14. Забарона дыскрымінацыі**

Карыстанне правамі і свабодамі, выкладзенымі ў гэтай Канвенцыі, павінна быць забяспечана без якой бы ні было дыскрымінацыі па прыкмеце полу, расы, колеру скуры, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, прыналежнасці да нацыянальных меншасцей, маёмаснага становішча, нараджэння ці па любых іншых прыкметах.

**Артыкул 15. Адступленне ад выканання абавязкаў пры надзвычайных сітуацыях**

1. У выпадку вайны ці пры іншых надзвычайных абставінах, якія пагражаюць жыццю нацыі, любы з Высокіх Дагаворных Бакоў можа прымаць меры ў адступленне ад сваіх абавязацельстваў па гэтай Канвенцыі толькі ў той ступені, у якой гэта абумоўлена незвычайнасцю абставінаў, пры ўмове, што такія меры не супярэчаць іншым яго абавязацельствам па міжнародным праве.
2. Гэта палажэнне не можа служыць падставай для якога б ні было адступлення ад палажэнняў артыкула 2, за выключэннем выпадкаў гібелі людзей у выніку правамерных ваенных дзеянняў, ці ад палажэнняў артыкула 3, параграфа 1 артыкула 4 і артыкула 7.
3. Любы з Высокіх Дагаворных Бакоў, які выкарыстоўвае гэта права адступлення, вычарпальным чынам інфармуе Генеральнага сакратара Савета Еўропы аб уведзеных ім мерах і аб прычынах іх прыняцця. Ён таксама ставіць у вядомасць Генеральнага сакратара Савета Еўропы пра дату спынення дзеяння такіх мер і аднаўленне ажыццяўлення палажэнняў Канвенцыі ў поўным аб'ёме.

**Артыкул 16. Абмежаванне на палітычную дзейнасць замежнікаў**

Нішто ў артыкулах 10, 11 і 14 не можа разглядацца як перашкода для Высокіх Дагаворных Бакоў уводзіць абмежаванні на палітычную дзейнасць замежнікаў.

**Артыкул 17. Забарона злоўжывання правамі**

Нішто ў гэтай Канвенцыі не можа тлумачыцца наступным чынам: што якая-небудзь дзяржава, якая-небудзь група асоб або якая-небудзь асоба мае права займацца якой бы ні было дзейнасцю або ўчыняць якія б ні было дзеянні, накіраваныя на скасаванне правоў і свабод,

прызнаных у гэтай Канвенцыі, або на іх абмежаванне ў большай меры, чым гэта прадугледжваецца ў Канвенцыі.

**Артыкул 18. Межы выкарыстання абмежаванняў у дачыненні да правоў**

Абмежаванні, якія дапускаюцца ў гэтай Канвенцыі ў дачыненні да згаданых правоў і свабод, не павінны прымяняцца ў іншых мэтах, чым тыя, для якіх яны былі прадугледжаны.

**РАЗДЗЕЛ II. ЕЎРАПЕЙСКІ СУД ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА**

**Артыкул 19. Заснаванне Суда**

У мэтах забеспячэння выканання абавязацельстваў, прынятых на сябе Высокімі Дагаворнымі Бакамі па дадзенай Канвенцыі і Пратаколах да яе, засноўваецца Еўрапейскі суд па правах чалавека, які далей называецца «Суд». Ён працуе на пастаяннай аснове.

**Артыкул 20. Колькасць суддзяў**

Колькасць суддзяў, якія ўваходзяць у склад Суда, роўная колькасці Высокіх Дагаворных Бакоў.

**Артыкул 21. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да суддзяў**

1. Суддзі павінны валодаць самымі высокімі маральнымі якасцямі і задавальняць патрабаванням, якія прад'яўляюцца пры прызначэнні на высокія судовыя пасады, або быць прававедамі з агульнапрызнаным аўтарытэтам.
2. Суддзі ўдзельнічаюць у працы Суда ў асабістай якасці.
3. На працягу ўсяго тэрміну знаходжання на пасадзе суддзі не павінны ажыццяўляць ніякай дзейнасці, несумяшчальнай з іх незалежнасцю, непрадузятасцю або з патрабаваннямі, якія вынікаюць з характару іх працы на працягу поўнага працоўнага дня. Усе пытанні, якія ўзнікаюць у сувязі з прымяненнем палажэнняў гэтага параграфа, вырашаюцца Судом.

**Артыкул 22. Выбары суддзяў**

Суддзі выбіраюцца Парламенцкай асамблеяй ад кожнага з Высокіх Дагаворных Бакоў большасцю галасоў са спіса, які ўключае трох кандыдатаў, прапанаваных Высокім Дагаворным Бокам.

**Артыкул 23. Тэрмін паўнамоцтваў і вызваленне ад пасады**

1. Суддзі выбіраюцца тэрмінам на дзевяць гадоў. Яны не могуць быць перавыбраны.
2. Тэрмін паўнамоцтваў суддзяў мінае па дасягненні імі 70 гадоў.
3. Суддзі займаюць свае пасады да самай замены. Разам з тым і пасля замены яны працягваюць разглядаць справы, якія ўжо паступілі да іх.
4. Суддзя можа быць вызвалены ад пасады толькі ў выпадку, калі іншыя суддзі большасцю ў дзве трэці галасоў прымуць рашэнне аб тым, што ён перастаў адпавядаць гэтым патрабаванням.

**Артыкул 24. Сакратарыят і дакладчыкі**

1. У Суда маецца Сакратарыят, правы, абавязкі і арганізацыя якога вызначаюцца Рэгламентам Суда.

2. Калі Суд засядае ў складзе аднаасобнага суддзі, Суд карыстаецца паслугамі дакладчыкаў, якія ажыццяўляюць свае функцыі пад кіраўніцтвам Старшыні Суда. Яны ўтвараюць падраздзяленне Сакратарыята Суда.

**Артыкул 25. Пленарныя пасяджэнні Суда**

На пленарных пасяджэннях Суд:

a) выбірае свайго Старшыню і аднаго або двух намеснікаў Старшыні тэрмінам на тры гады; яны могуць быць перавыбраны;

b) утварае Палаты, якія ствараюцца на пэўны тэрмін;

c) выбірае Старшынь Палат Суда; яны могуць быць перавыбраны;

d) прымае Рэгламент Суда;

e) выбірае Сакратара-канцлера Суда і аднаго або некалькіх яго намеснікаў;

f) прадстаўляе якое-небудзь хадайніцтва ў адпаведнасці з параграфам 2 артыкула 26.

**Артыкул 26. Аднаасобныя суддзі, камітэты, Палаты і Вялікая Палата**

1. Для разгляду перададзеных яму спраў Суд засядае ў складзе аднаасобнага суддзі, камітэтаў з трох суддзяў, Палаты з сямі суддзяў і Вялікай Палаты з сямнаццаці суддзяў. Палаты Суда ўтвараюць камітэты на пэўны тэрмін.
2. Па хадайніцтве пленарнага пасяджэння Суда Камітэт міністраў мае права сваім аднагалосным рашэннем на пэўны тэрмін паменшыць колькасць суддзяў у складзе Палаты да пяці.
3. Засядаючы па справе аднаасобна, суддзя не мае права разглядаць ніякую скаргу, пададзеную супраць Высокага Дагаворнага Боку, ад якога гэты суддзя выбраны.
4. Суддзя, выбраны ад Высокага Дагаворнага Боку, які выступае бокам у спрэчцы, засядае па справе як ex officio член Палаты і Вялікай Палаты. У выпадку адсутнасці такога суддзі або калі ён не можа ўдзельнічаць у пасяджэнні, у якасці суддзі па справе засядае асоба, прызначаная Старшынёй Суда са спіса, загадзя прадстаўленага гэтым Бокам.
5. У склад Вялікай Палаты ўваходзяць таксама Старшыня Суда, намеснікі Старшыні Суда, Старшыні Палат і іншыя члены Суда, выбраныя ў адпаведнасці з Рэгламентам Суда. У тых выпадках, калі справа передаецца ў Вялікую Палату ў адпаведнасці з палажэннямі артыкула 43, у яе пасяджэннях не мае права ўдзельнічаць ні адзін з суддзяў Палаты, якая вынесла пастанову, за выключэннем Старшыні гэтай Палаты і суддзі, выбранага ад Высокага Дагаворнага Боку, які выступае бокам у спрэчцы.

**Артыкул 27. Кампетэнцыя аднаасобных суддзяў**

1. Аднаасобны суддзя мае права аб'явіць непрымальнай скаргу, пададзеную ў адпаведнасці з артыкулам 34, або выключыць яе са спіса спраў, якія падлягаюць разгляду Судом, калі такое рашэнне можа быць прынята без дадатковага вывучэння скаргі.
2. Гэта рашэнне з'яўляецца канчатковым.
3. Калі аднаасобны суддзя не аб'яўляе непрымальнай скаргу або не выключае яе са спіса спраў, якія падлягаюць разгляду, то гэты суддзя накіроўвае яе ў камітэт або Палату для дадатковага вывучэння.

**Артыкул 28. Кампетэнцыя Камітэтаў**

1. У дачыненні да скаргі, пададзенай у адпаведнасці з артыкулам 34, камітэт мае права аднагалосным рашэннем:

   a) аб'явіць яе непрымальнай або выключыць яе са спіса спраў, якія падлягаюць разгляду, калі такое рашэнне можа быць прынята без дадатковага вывучэння скаргі; або

   b) аб'явіць яе прымальнай і адначасова вынесці пастанову па сутнасці скаргі, калі пытанне, якое ляжыць у аснове справы і тычыцца тлумачэння або прымянення палажэнняў дадзенай Канвенцыі або Пратаколаў да яе, ужо з'яўляецца прадметам трывала зацверджанага прэцэдэнтнага права Суда.
2. Рашэнні і пастановы, якія прымаюцца ў адпаведнасці з параграфам 1, з'яўляюцца канчатковымі.
3. Калі суддзя, выбраны ад Высокага Дагаворнага Боку, які выступае бокам у спрэчцы, не з'яўляецца членам камітэта, апошні мае права на любой стадыі вытворчасці па справе прапанаваць гэтаму суддзю заняць месца аднаго з членаў камітэта, улічваючы пры гэтым усе фактары, якія маюць дачыненне да справы, у тым ліку пытанне, ці аспрэчвае гэты Бок прымяненне працэдуры, прадугледжанай параграфам (b) пункта 1.

**Артыкул 29. Рашэнні Палат аб прымальнасці скаргі і па сутнасці справы**

1. Калі не было прынята ніякага рашэння ў адпаведнасці з палажэннямі артыкулаў 27 або 28 ці не было вынесена ніякай пастановы ў адпаведнасці з палажэннямі артыкула 28, Палата выносіць рашэнне аб прымальнасці і па сутнасці індывідуальных скаргаў, пададзеных у адпаведнасці з палажэннямі артыкула 34. Рашэнне аб прымальнасці скаргі можа быць вынесена асобна.
2. Палата выносіць рашэнне аб прымальнасці скаргі Дзяржавы, пададзенай у адпаведнасці з артыкулам 33, і па сутнасці справы. Рашэнне аб прымальнасці скаргі прымаецца асобна, калі толькі Суд у выключных выпадках не прыме рашэнне аб адваротным.

**Артыкул 30. Уступка юрысдыкцыі на карысць Вялікай Палаты**

Калі справа, якая знаходзіцца на разглядзе Палаты, закранае сур'ёзнае пытанне, якое тычыцца тлумачэння палажэнняў Канвенцыі або Пратаколаў да яе, або калі рашэнне пытання можа ўвайсці ў супярэчнасць з раней вынесенай Судом пастановай, Палата можа да вынясення сваёй пастановы ўступіць юрысдыкцыю на карысць Вялікай Палаты, калі ні адзін з бакоў не пярэчыць супраць гэтага.

**Артыкул 31. Паўнамоцтвы Вялікай Палаты**

Вялікая Палата:

a) выносіць рашэнні па скаргах, пададзеных у адпаведнасці з артыкулам 33 або артыкулам 34, калі якая-небудзь з Палат уступіла юрысдыкцыю на падставе палажэнняў артыкула 30 або калі справа накіравана ёй у адпаведнасці з палажэннямі артыкула 43;

b) прымае рашэнні па пытаннях, перададзеных на разгляд Суда Камітэтам Міністраў у адпаведнасці з параграфам 4 артыкула 46; і

c) разглядае запыты аб вынясенні кансультатыўных заключэнняў, накіраваных у адпаведнасці з палажэннямі артыкула 47.

**Артыкул 32. Кампетэнцыя Суда**

1. У вядзенні Суда знаходзяцца ўсе пытанні, якія тычацца тлумачэння і прымянення палажэнняў Канвенцыі і Пратаколаў да яе, якія могуць быць яму перададзены ў выпадках, прадугледжаных палажэннямі артыкулаў 33, 34, 46 і 47.
2. У выпадку спрэчкі адносна кампетэнцыі Суда па канкрэтнай справе пытанне вырашае сам Суд.

**Артыкул 33. Міждзяржаўныя справы**

Любы Высокі Дагаворны Бок можа перадаць у Суд пытанне аб любым меркаваным парушэнні палажэнняў Канвенцыі і Пратаколаў да яе іншым Высокім Дагаворным Бокам.

**Артыкул 34. Індывідуальныя скаргі**

Суд можа прымаць скаргі ад любой фізічнай асобы, любой няўрадавай грамадскай арганізацыі або любой групы прыватных асоб, якія сцвярджаюць, што з'явіліся ахвярамі парушэння адным з Высокіх Дагаворных Бакоў іх правоў, прызнаных у гэтай Канвенцыі або ў пратаколах да яе. Высокія Дагаворныя Бакі абавязваюцца ніякім чынам не перашкаджаць эфектыўнаму ажыццяўленню гэтага права.

**Артыкул 35. Умовы прымальнасці**

1. Суд можа прымаць справу да разгляду толькі пасля таго, як былі вычарпаны ўсе ўнутраныя сродкі прававой абароны, як гэта прадугледжана агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права, і на працягу шасці месяцаў з даты вынясення нацыянальнымі органамі канчатковага рашэння па справе.
2. Суд не прымае да разгляду ніякую індывідуальную скаргу, пададзеную ў адпаведнасці з артыкулам 34, калі яна:
   a) з'яўляецца ананімнай; або
   b) з'яўляецца па сутнасці аналагічнай той, якая ўжо была разгледжана Судом, ці ўжо з'яўляецца прадметам іншай працэдуры міжнароднага судовага разбору або ўрэгулявання і калі яна не ўтрымлівае новых фактаў, якія маюць дачыненне да справы.
3. Суд аб'яўляе непрымальнай любую індывідуальную скаргу, пададзеную ў адпаведнасці з артыкулам 34, калі ён палічыць, што:

a) гэта скарга з'яўляецца несумяшчальнай з палажэннямі дадзенай Канвенцыі або Пратаколаў да яе, відавочна неабгрунтаванай або з'яўляецца злоўжываннем правам падачы скаргі; або

b) заяўнік не панёс значнай шкоды, калі толькі прынцып павагі да правоў чалавека, як яны вызначаны ў дадзенай Канвенцыі і пратаколах да яе, не патрабуе разгляду скаргі па сутнасці, а таксама пры ўмове, што на гэтай падставе не можа быць адмоўлена ў разглядзе справы, якая не была належным чынам разгледжана ўнутрыдзяржаўным судом.

4. Суд адхіляе любую перададзеную яму скаргу, якую палічыць непрымальнай у адпаведнасці з гэтым артыкулам. Ён можа зрабіць гэта на любой стадыі разгляду.

**Артыкул 36. Удзел трэцяга боку**

1. У дачыненні да любой справы, якая знаходзіцца на разглядзе якой-небудзь з Палат або Вялікай Палаты, кожны Высокі Дагаворны Бок, грамадзянін якога з'яўляецца заяўнікам, мае права прадстаўляць пісьмовыя заўвагі і прымаць удзел у слуханнях.
2. У інтарэсах належнага адпраўлення правасуддзя Старшыня Суда можа запрасіць любы Высокі Дагаворны Бок, які не з'яўляецца бокам у справе, або любую зацікаўленую асобу, якая не з'яўляецца заяўнікам, прадставіць пісьмовыя заўвагі ці прыняць удзел у слуханнях.
3. У дачыненні да любой справы, якая знаходзіцца на разглядзе якой-небудзь з Палат або Вялікай Палаты, Камісар Савета Еўропы па правах чалавека мае права прадстаўляць пісьмовыя заўвагі і прымаць удзел у слуханнях.

**Артыкул 37. Спыненне вытворчасці па справе**

1. Суд можа на любой стадыі разбору прыняць рашэнне аб спыненні вытворчасці па справе, калі абставіны дазваляюць зрабіць выснову аб тым, што:
   a) заяўнік больш не мае намеру дамагацца разгляду сваёй скаргі; або
   b) спрэчка была ўрэгулявана; або
   c) па любой іншай прычыне, устаноўленай Судом, калі далейшы разгляд скаргі з'яўляецца неапраўданым.

Тым не менш Суд працягвае разгляд скаргі, калі гэтага патрабуе выкананне правоў чалавека, гарантаваных дадзенай Канвенцыяй і Пратаколамі да яе.

2. Суд можа прыняць рашэнне аднавіць скаргу ў спісе спраў, якія падлягаюць разгляду, калі палічыць, што гэта апраўдана абставінамі.

**Артыкул 38. Працэдура разгляду справы**

Суд разглядае справу з удзелам прадстаўнікоў бакоў і, калі гэта неабходна, прадпрымае расследаванне абставін справы, для эфектыўнага правядзення якога зацікаўленыя Высокія Дагаворныя Бакі ствараюць усе неабходныя ўмовы.

**Артыкул 39. Міравыя пагадненні**

1. На любой стадыі вытворчасці па справе Суд мае права прадставіць сябе ў распараджэнне зацікаўленых бакоў з мэтай заключэння міравога пагаднення па справе на аснове павагі правоў чалавека, як яны вызначаны ў дадзенай Канвенцыі і Пратаколах да яе.
2. Працэдура, прадугледжаная параграфам 1, носіць канфідэнцыяльны характар.
3. У выпадку дасягнення міравога пагаднення Суд выключае справу са свайго спіса шляхам вынясення пастановы, у якой даецца толькі кароткае выкладанне фактаў і дасягнутага рашэння.
4. Гэта рашэнне накіроўваецца Камітэту міністраў, які ажыццяўляе нагляд за выкананнем умоў міравога пагаднення, як яны выкладзены ў рашэнні.

**Артыкул 40. Адкрытыя судовыя пасяджэнні і доступ да дакументаў**

1. Калі ў сілу выключных абставін Суд не прыме іншага рашэння, яго пасяджэнні з'яўляюцца адкрытымі.
2. Доступ да дакументаў, перададзеных на захоўванне ў Сакратарыят, адкрыты для грамадства, калі Старшыня Суда не прыме іншага рашэння.

**Артыкул 41. Справядлівая кампенсацыя**

Калі Суд аб'яўляе, што мела месца парушэнне Канвенцыі або Пратаколаў да яе, а ўнутранае права Высокага Дагаворнага Боку дапускае магчымасць толькі частковай ліквідацыі наступстваў гэтага парушэння, Суд у выпадку неабходнасці прысуджае справядлівую кампенсацыю пацярпеламу боку.

**Артыкул 42. Пастановы Палат**

Пастановы Палат становяцца канчатковымі ў адпаведнасці з палажэннямі параграфа 2 артыкула 44.

**Артыкул 43. Перадача справы ў Вялікую Палату**

1. На працягу трох месяцаў з даты вынясення Палатай пастановы ў выключных выпадках магчымы зварот любога з бакоў у справе аб перадачы яе на разгляд Вялікай Палаты.
2. Калегія ў складзе пяці суддзяў Вялікай Палаты прымае зварот, калі справа паднімае сур'ёзнае пытанне, якое тычыцца тлумачэння або прымянення палажэнняў дадзенай Канвенцыі або Пратаколаў да яе, ці іншае сур'ёзнае пытанне агульнага характару.
3. Калі калегія прымае зварот, то Вялікая Палата выносіць па справе сваю пастанову.

**Артыкул 44. Канчатковыя пастановы**

1. Пастанова Вялікай Палаты з'яўляецца канчатковай.
2. Пастанова любой з Палат становіцца канчатковай, калі:
   a) бакі заяўляюць, што яны не будуць прасіць аб перадачы справы ў Вялікую Палату; або
   b) па заканчэнні трох месяцаў з даты вынясення пастановы не паступіў зварот аб перадачы справы ў Вялікую Палату; або

c) калегія Вялікай Палаты адхіляе зварот аб передачы справы згодна з артыкулам 43.

3. Канчатковая пастанова падлягае публікацыі.

**Артыкул 45. Матывіроўка пастаноў і рашэнняў**

1. Пастановы, а таксама рашэнні аб прымальнасці або непрымальнасці скаргаў павінны быць матываванымі.
2. Калі пастанова ў цэлым або часткова не выказвае аднагалоснага меркавання суддзяў, то любы суддзя мае права выказаць сваю асобую думку.

**Артыкул 46. Абавязковая сіла і выкананне пастаноў**

1. Высокія Дагаворныя Бакі абавязаны выконваць канчатковыя пастановы Суда па любой справе, у якой яны з'яўляюцца бакамі.
2. Канчатковая пастанова Суда накіроўваецца Камітэту міністраў, які ажыццяўляе нагляд за яе выкананнем.
3. Калі Камітэт міністраў лічыць, што нагляду за выкананнем канчатковай пастановы перашкаджае праблема тлумачэння гэтай пастановы, ён мае права перадаць дадзенае пытанне на разгляд Суда для вынясення ім пастановы па пытанні тлумачэння. Рашэнне аб перадачы пытання на разгляд Суда патрабуе большасці галасоў у дзве трэці ад ліку прадстаўнікоў, упаўнаважаных прымаць удзел у працы Камітэта.
4. Калі Камітэт міністраў лічыць, што Высокі Дагаворны Бок адмаўляецца падпарадкавацца канчатковай пастанове па справе, у якой ён выступае бокам, ён мае права пасля накіравання афіцыйнага паведамлення гэтаму Боку і шляхам прыняцця рашэння большасцю галасоў у дзве трэці ад ліку прадстаўнікоў, упаўнаважаных прымаць удзел у працы Камітэта, перадаць на разгляд Суда пытанне, ці не парушыў гэты Бок свае абавязацельства, устаноўленае ў адпаведнасці з параграфам 1.
5. Калі Суд знаходзіць факт парушэння параграфа 1, ён перадае справу ў Камітэт міністраў для разгляду мер, якія падлягаюць прыняццю. Калі Суд не знаходзіць факт парушэння параграфа 1, ён перадае справу ў Камітэт міністраў, які закрывае разгляд справы.

**Артыкул 47. Кансультатыўныя заключэнні**

1. Суд можа па просьбе Камітэта міністраў выносіць кансультатыўныя заключэнні па юрыдычных пытаннях, якія тычацца тлумачэння палажэнняў Канвенцыі і Пратаколаў да яе.
2. Такія заключэнні не павінны закранаць ні пытанні, якія адносяцца да зместу або аб'ёму правоў ці свабод, вызначаных у раздзеле І Канвенцыі і Пратаколах да яе, ні іншыя пытанні, якія Суду або Камітэту міністраў, магчыма, спатрэбілася б закрануць пры разглядзе якога-небудзь звароту, прадугледжанага Канвенцыяй.
3. Рашэнне Камітэта міністраў запытаць кансультатыўнае заключэнне Суда прымаецца большасцю галасоў прадстаўнікоў, якія маюць права засядаць у Камітэце.

**Артыкул 48. Кампетэнцыя Суда ў дачыненні да кансультатыўных заключэнняў**

Пытанне пра тое, ці адносіцца накіраваны Камітэтам міністраў запыт аб вынясенні кансультатыўнага заключэння да кампетэнцыі Суда, як яна вызначана ў артыкуле 47, вырашае Суд.

**Артыкул 49. Матывіроўка кансультатыўных заключэнняў**

1. Кансультатыўныя заключэнні Суда павінны быць матываванымі.
2. Калі кансультатыўнае заключэнне ў цэлым або часткова не выказвае аднагалоснага меркавання суддзяў, то любы суддзя мае права выказаць сваю асобую думку.
3. Кансультатыўнае заключэнне Суда накіроўваецца Камітэту міністраў.

**Артыкул 50. Расходы на ўтрыманне Суда**

Расходы, звязаныя з дзейнасцю Суда, нясе Савет Еўропы.

**Артыкул 51. Прывілеі і імунітэты суддзяў**

Суддзі пры выкананні сваіх функцый карыстаюцца прывілеямі і імунітэтамі, прадугледжанымі артыкулам 40 Статута Савета Еўропы і ў пагадненнях, заключаных на яго аснове.

**РАЗДЕЛ III. РОЗНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

**Артыкул 52. Запыты Генеральнага сакратара**

Па атрыманні просьбы ад Генеральнага сакратара Савета Еўропы кожны Высокі Дагаворны Бок прадстаўляе тлумачэнні адносна таго, якім чынам яго ўнутранае права забяспечвае эфектыўнае выкананне любога з палажэнняў дадзенай Канвенцыі.

**Артыкул 53. Гарантыі ў дачыненні да прызнаных правоў чалавека**

Нішто ў гэтай Канвенцыі не можа быць вытлумачана як абмежаванне або прыніжэнне любога з правоў чалавека і асноўных свабод, якія могуць забяспечвацца заканадаўствам любога Высокага Дагаворнага Боку або любым іншым пагадненнем, у якім ён удзельнічае.

**Артыкул 54. Паўнамоцтвы Камітэта міністраў**

Нішто ў гэтай Канвенцыі не прыніжае паўнамоцтваў Камітэта міністраў, якімі ён надзелены ў сілу Статута Савета Еўропы.

**Артыкул 55. Адмова ад іншых сродкаў урэгулявання спрэчак**

Высокія Дагаворныя Бакі згодны, калі іншае не ўстаноўлена асобым пагадненнем, не звяртацца да дзеючых паміж імі дагавораў, канвенцый або дэкларацый пры перадачы на разгляд, шляхам накіравання заявы, спрэчкі з нагоды тлумачэння або прымянення палажэнняў дадзенай Канвенцыі і не выкарыстоўваць іншыя сродкі ўрэгулявання спрэчкі, чым прадугледжаныя дадзенай Канвенцыяй.

**Артыкул 56. Тэрытарыяльная сфера дзеяння**

1. Любая дзяржава пры ратыфікацыі або ў далейшым можа заявіць шляхам паведамлення Генеральнаму сакратару Савета Еўропы аб тым, што дадзеная Канвенцыя з улікам параграфа 4 гэтага артыкула распаўсюджваецца на ўсе тэрыторыі або на любую з іх, за знешнія зносіны якіх яна нясе адказнасць.
2. Дзеянне Канвенцыі распаўсюджваецца на тэрыторыю або тэрыторыі, названыя ў паведамленні, пачынаючы з трыццатага дня пасля атрымання Генеральным сакратаром Савета Еўропы гэтага паведамлення.
3. Палажэнні дадзенай Канвенцыі прымяняюцца на згаданых тэрыторыях з належным улікам мясцовых умоў.
4. Любая дзяржава, якая зрабіла заяву ў адпаведнасці з параграфам 1 гэтага артыкула, можа ў далейшым у любы час заявіць у дачыненні да адной або некалькіх тэрыторый, названых у гэтай заяве, аб прызнанні кампетэнцыі Суда прымаць скаргі ад фізічных асоб, няўрадавых грамадскіх арганізацый або груп прыватных асоб, як гэта прадугледжана артыкулам 34 Канвенцыі.

**Артыкул 57. Агаворкі**

1. Любая дзяржава пры падпісанні дадзенай Канвенцыі або пры здачы ёй на захоўванне яе ратыфікацыйнай граматы можа зрабіць агаворку да любога канкрэтнага палажэння Канвенцыі ў дачыненні да таго, што той ці іншы закон, які дзейнічае ў гэты час на яе тэрыторыі, не адпавядае гэтаму палажэнню. У адпаведнасці з гэтым артыкулам агаворкі агульнага характару не дапускаюцца.
2. Любая агаворка, зробленая ў адпаведнасці з гэтым артыкулам, павінна ўтрымліваць кароткае выкладанне адпаведнага закону.

**Артыкул 58. Дэнансацыя**

1. Высокі Дагаворны Бок можа дэнансаваць дадзеную Канвенцыю толькі пасля заканчэння пяці гадоў з даты, калі ён стаў Бокам Канвенцыі, і па заканчэнні шасці месяцаў пасля накіравання паведамлення Генеральнаму сакратару Савета Еўропы, які інфармуе пра гэта іншыя Высокія Дагаворныя Бакі.
2. Дэнансацыя не вызваляе адпаведны Высокі Дагаворны Бок ад яго абавязацельстваў па гэтай Канвенцыі ў дачыненні да любога дзеяння, якое магло з'явіцца парушэннем такіх абавязацельстваў і магло быць здзейснена ім да даты ўступлення дэнансацыі ў сілу.
3. Любы Высокі Дагаворны Бок, які перастае быць членам Савета Еўропы, на тых жа ўмовах перастае быць і Бокам гэтай Канвенцыі.
4. Канвенцыя можа быць дэнансавана ў адпаведнасці з палажэннямі папярэдніх пунктаў у дачыненні да любой тэрыторыі, на якую распаўсюджвалася яе дзеянне паводле палажэнняў артыкула 56.

**Артыкул 59. Падпісанне і ратыфікацыя**

1. Дадзеная Канвенцыя адкрыта для падпісання дзяржавамі – удзельніцамі Савета Еўропы. Яна падлягае ратыфікацыі. Ратыфікацыйныя граматы здаюцца на захоўванне Генеральнаму сакратару Савета Еўропы.
2. Еўрапейскі саюз мае права далучыцца да гэтай Канвенцыі.
3. Дадзеная Канвенцыя ўступае ў сілу пасля здачы на захоўванне дзесяці ратыфікацыйных грамат.
4. Для тых дзяржаў, якія ратыфікуюць Канвенцыю ў далейшым, яна ўступае ў сілу з даты здачы імі на захоўванне іх ратыфікацыйных грамат.

5. Генеральны сакратар Савета Еўропы паведамляе ўсім дзяржавам – удзельніцам Савета Еўропы аб уступленні Канвенцыі ў сілу, аб Высокіх Дагаворных Баках, якія ратыфікавалі яе, і аб здачы ратыфікацыйных грамат, якія могуць быць атрыманы пасля.

ВЫКАНАНА Ў РЫМЕ 4 ЛІСТАПАДА 1950 ГОДА на англійскай і французскай мовах, прычым абодва тэксты маюць аднолькавую сілу, у адзіным экзэмпляры, які захоўваецца ў архіве Савета Еўропы. Генеральны сакратар накіроўвае завераныя копіі ўсім дзяржавам, якія падпісалі Канвенцыю.

## Еўрапейская сацыяльная хартыя (перагледжаная)
*(агляд)*

Еўрапейская сацыяльная хартыя (перагледжаная) 1996 года, якая ўступіла ў сілу 1 ліпеня 1999 года, увасабляе ў адным інструменце ўсе правы, гарантаваныя Еўрапейскай сацыяльнай хартыяй 1961 года, Дадатковым пратаколам 1988 года, і дадае новыя правы і папраўкі, прынятыя Бакамі. Яна паступова замяняе першапачатковую Хартыю 1961 года.

Хартыя гарантуе правы і свабоды, якія датычацца ўсіх асоб у іх паўсядзённым жыцці.

Асноўныя правы, замацаваныя ў Хартыі, наступныя:

**Жыллё:**

- доступ да адэкватнага і недарагога жылля;
- скарачэнне бяздомнасці; жыллёвая палітыка, арыентаваная на ўсе ўразлівыя катэгорыі;
- працэдуры абмежавання прымусовага высялення;
- роўны доступ для неграмадзян да сацыяльнага жылля і жыллёвых ільгот;
- будаўніцтва жылля і жыллёвыя льготы, звязаныя з патрэбамі сям'і.

**Здароўе:**

- даступныя, эфектыўныя медыцынскія ўстановы для ўсяго насельніцтва;
- палітыка прафілактыкі захворванняў, у тым ліку гарантыя здаровага навакольнага асяроддзя;
- ліквідацыя прафесійнай шкоднасці з мэтай забеспячэння таго, каб здароўе і бяспека на працоўным месцы былі прадугледжаны законам і гарантаваліся на практыцы;
- абарона мацярынства.

**Адукацыя:**

- бясплатная пачатковая і сярэдняя адукацыя;
- бясплатныя і эфектыўныя паслугі па прафарыентацыі;
- доступ да пачатковага навучання (агульная і прафесійная сярэдняя адукацыя), вышэйшай адукацыі ва ўніверсітэце і іншых установах, прафесійнай падрыхтоўкі, у тым ліку бесперапыннага навучання;
- спецыяльныя меры для замежных грамадзян;
- школьная інтэграцыя дзяцей з інваліднасцю;
- доступ да адукацыі і прафесійнага навучання для людзей з інваліднасцю.

**Працаўладкаванне:**

Свабода працаваць:

- забарона на прымусовую працу;
- забарона на працаўладкаванне дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў;
- асаблівыя ўмовы працы ад 15 да 18 гадоў;
- права зарабляць сабе на жыццё шляхам свабоднага выбару прафесіі і заняткаў.

Справядлівыя ўмовы працы:

- эканамічная і сацыяльная палітыка, накіраваная на забеспячэнне поўнай занятасці;
- доступ да працы для асоб з інваліднасцю;
- справядлівыя ўмовы працы ў дачыненні да аплаты і працоўнага часу;
- абарона ў выпадку звальнення;
- абарона ад сексуальнага і псіхалагічнага дамагання.

Калектыўныя правы:

- свабода ствараць прафсаюзы і арганізацыі працадаўцаў для абароны эканамічных і сацыяльных інтарэсаў; індывідуальная свабода вырашаць, далучацца да іх ці не;
- прасоўванне сумесных кансультацый, вядзенне калектыўных перамоў, пагаджальная працэдура і добраахвотны арбітраж;
- права на забастоўку.

**Юрыдычная і сацыяльная абарона:**

- прававое становішча дзіцяці;
- абыходжанне з непаўналетнімі правапарушальнікамі;
- абарона ад жорсткага абыходжання і здзекаў;
- забарона любой формы эксплуатацыі (сексуальнай ці іншай);
- прававая абарона сям'і (роўнасць мужа і жонкі ўнутры шлюбнай пары і ў адносінах да дзяцей, абарона дзяцей у выпадку разрыву сям'і);
- права на сацыяльнае забеспячэнне, сацыяльны дабрабыт і сацыяльныя паслугі;
- права на абарону ад галечы і сацыяльнай ізаляцыі;
- догляд за дзецьмі;
- спецыяльныя меры для пажылых людзей.

**Перамяшчэнне асоб:**

- права на ўз'яднанне сям'і;
- права грамадзян пакідаць краіну;
- працэсуальныя гарантыі ў выпадку высылкі;
- спрашчэнне іміграцыйных фармальнасцей.

**Недапушчэнне дыскрымінацыі:**

- права жанчын і мужчын на роўнае абыходжанне і роўныя магчымасці ў сферы працаўладкавання;
- гарантыя ўсім грамадзянам і замежнікам, якія законна пражываюць і (або) працуюць у краіне, што ўсе правы, замацаваныя ў Хартыі, прымяняюцца незалежна ад расы, полу, узросту, колеру скуры, мовы, рэлігіі, меркаванняў, нацыянальнага паходжання, сацыяльнага паходжання, стану здароўя або асацыяцыі з нацыянальнай меншасцю;
- забарона дыскрымінацыі на аснове сямейных абавязкаў;
- права асоб з інваліднасцю на сацыяльную інтэграцыю і ўдзел у жыцці грамадства.

У Хартыі ёсць механізм кантролю, заснаваны на падачы нацыянальных справаздач дзяржавамі-ўдзельніцамі (Пратакол 1991 года), а таксама сістэма калектыўных скаргаў (Пратакол 1995

года), якая дазваляе, у прыватнасці, прафсаюзам і няўрадавым грамадскім арганізацыям падаваць калектыўныя прэтэнзіі.

Еўрапейскі камітэт сацыяльных правоў (ЕКСП) з’яўляецца органам, адказным за кантроль выканання ў дзяржавах – удзельніцах Хартыі.

Камітэт складаецца з 15 незалежных і непрадузятых членаў, якія выбіраюцца Камітэтам міністраў Савета Еўропы на шэсць гадоў, гэты тэрмін можа быць узноўлены адзін раз.

## Рамачная канвенцыя аб абароне нацыянальных меншасцей
(*агляд*)

Канвенцыя з’яўляецца першым юрыдычна абавязковым шматбаковым дакументам, які тычыцца абароны нацыянальных меншасцей у цэлым. Яе мэта – абараніць існаванне нацыянальных меншасцей на адпаведных тэрыторыях Бакоў. Канвенцыя накіравана на садзейнічанне поўнай і сапраўднай роўнасці нацыянальных меншасцей шляхам стварэння належных умоў, якія дазваляюць ім захоўваць і развіваць сваю культуру і захоўваць сваю самабытнасць.

У Канвенцыі выкладаюцца прынцыпы ў адносінах да асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцей, у сферы грамадскага жыцця, такія як:

- недапушчэнне дыскрымінацыі,
- садзейнічанне сапраўднай роўнасці,
- заахвочванне і захаванне культуры, рэлігіі, мовы і традыцый,
- свабода мірных сходаў,
- свабода аб’яднанняў,
- свабода выказвання меркаванняў,
- свабода думкі, сумлення і рэлігіі,
- права на доступ да сродкаў масавай інфармацыі і іх выкарыстанне,
- свабода, звязаная з мовай і адукацыяй,
- трансгранічныя кантакты і супрацоўніцтва,
- удзел у эканамічным, культурным і грамадскім жыцці,
- забарона прымусовай асіміляцыі.

Механізм маніторынгу Канвенцыі заснаваны на справаздачах, якія дзяржавы-ўдзельніцы абавязаны падаваць. Адказнасць за разгляд справаздач ляжыць на Камітэце міністраў Савета Еўропы, аднак Кансультатыўны камітэт экспертаў аказвае дапамогу Камітэту міністраў.

Кансультатыўны камітэт складаецца з 18 членаў, якія выбіраюцца Камітэтам міністраў з кандыдатаў, прапанаваных дзяржавамі-ўдзельніцамі. Не ўсе краіны могуць мець аднаго са сваіх кандыдатаў у Камітэце, таму нявыбраныя кандыдаты змяшчаюцца ў рэзервовы спіс дадатковых членаў. Кансультатыўны камітэт упаўнаважаны атрымліваць інфармацыю з іншых крыніц, акрамя дзяржаўных справаздач: напрыклад, ён можа таксама арганізоўваць сустрэчы з прадстаўнікамі ўрадаў і незалежнымі крыніцамі. Кансультатыўны камітэт можа таксама наведваць дзяржавы пры разглядзе іх справаздач, у ходзе чаго Камітэт сустракаецца з урадам, НГА, суполкамі меншасцей, навукоўцамі і іншымі зацікаўленымі бакамі.

## Еўрапейская хартыя рэгіянальных моў або моў меншасцей
(*агляд*)

Хартыя распрацавана, з аднаго боку, для абароны і прасоўвання рэгіянальных моў і моў меншасцей як аспекту культурнай спадчыны Еўропы, якому пагражае небяспека, а, з другога боку, для таго, каб даць магчымасць людзям, якія размаўляюць на рэгіянальнай мове ці мове меншасці, выкарыстоўваць яе ў прыватным і грамадскім жыцці. Хартыя ахоплівае рэгіянальныя мовы і мовы меншасцей, нетэрытарыяльныя мовы і афіцыйныя мовы, якія выкарыстоўваюцца менш шырока.

У Хартыі выкладаюцца галоўныя прынцыпы і мэты, на якіх дзяржавы павінны засноўваць сваю палітыку, заканадаўства і практыку і якія разглядаюцца як прынцыпы і мэты, якія забяспечваюць неабходную аснову для захавання адпаведных моў.

Восем асноватворных прынцыпаў і мэт заключаюцца ў наступным:

- Прызнанне рэгіянальных моў або моў меншасцей як адлюстравання культурнага багацця.
- Павага да геаграфічнага раёна кожнай рэгіянальнай мовы ці мовы меншасці.
- Неабходнасць рашучых дзеянняў па прасоўванні такіх моў.
- Падтрымка і (або) заахвочванне выкарыстання такіх моў вусна і пісьмова, у грамадскім і прыватным жыцці.
- Прапанаванне адпаведных форм і сродкаў для вывучэння такіх моў на ўсіх адпаведных этапах і навучання на іх.
- Прасоўванне адпаведных транснацыянальных абменаў.
- Забарона ўсіх форм неапраўданага адрознення, выключэнняў, абмежаванняў або пераваг, звязаных з выкарыстаннем рэгіянальнай мовы ці мовы меншасці і прызначаных для таго, каб перашкодзіць падтрымцы або развіццю такой мовы ці паставіць яе пад пагрозу.
- Прасоўванне дзяржавамі ўзаемаразумення паміж усімі лінгвістычнымі групамі краіны.

Акрамя таго, у Хартыі выкладаецца шэраг канкрэтных мер, накіраваных на заахвочванне выкарыстання рэгіянальных моў або моў меншасцей у грамадскім жыцці. Гэтыя меры ахопліваюць наступныя сферы: адукацыя, правасуддзе, адміністрацыйныя органы і дзяржаўныя службы, сродкі масавай інфармацыі, культурныя мерапрыемствы і аб’екты, эканамічная і сацыяльная дзейнасць і трансгранічныя абмены.

Хартыя прадугледжвае механізм маніторынгу для ацэнкі таго, як яна прымяняецца ў дзяржаве-ўдзельніцы, з мэтай (у выпадку неабходнасці) выпрацоўкі рэкамендацый па ўдасканаленні яе заканадаўства, палітыкі і практыкі. Цэнтральным элементам механізму маніторынгу з’яўляецца Камітэт незалежных экспертаў. Гэты камітэт:

- разглядае перыядычныя справаздачы дзяржавы;
- пры неабходнасці задае шэраг пытанняў Боку па любых незразумелых аспектах справаздачы;
- арганізуе азнаямленчую паездку ў дзяржаву для сустрэчы з уладамі, няўрадавымі грамадскімі арганізацыямі або любым іншым кампетэнтным органам для ацэнкі прымянення Хартыі;
- разглядае любую дадатковую інфармацыю, прадстаўленую асацыяцыямі і іншымі органамі, юрыдычна заснаванымі ў адпаведнай дзяржаве і зацікаўленымі ў сферы моў;

- рыхтуе сваю ўласную экспертную справаздачу на аснове атрыманай інфармацыі і накіроўвае яе Камітэту міністраў, у тым ліку прапановы па тым, якія рэкамендацыі трэба даць дзяржавам.

Адзін раз у два гады Генеральны сакратар Савета Еўропы павінен прадставіць у Парламенцкую асамблею падрабязную справаздачу аб прымяненні Хартыі. Гэта гарантуе, што члены парламентаў краін Еўропы будуць інфармаваны аб выкарыстанні Хартыі, што дазволіць ім пры неабходнасці аказаць палітычны ціск, каб заахвоціць нацыянальныя ўрады прыняць адпаведныя меры.

## Канвенцыя аб процідзеянні гандлю людзьмі
*(неафіцыйны агляд)*

Канвенцыя Савета Еўропы аб процідзеянні гандлю людзьмі (была адкрыта для падпісання ў Варшаве 16 мая 2005 года з нагоды 3-га Саміту кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў Савета Еўропы). 24 кастрычніка 2007 года Канвенцыя атрымала дзясятую ратыфікацыю, у выніку чаго ўступіла ў сілу 1 лютага 2008 года. Канвенцыя ўяўляе сабой усёабдымны дагавор, у якім асноўная ўвага надаецца абароне ахвяр гандлю людзьмі і абароне іх правоў. Яна таксама накіравана на прадухіленне гандлю людзьмі і на судовае праследаванне гандляроў людзьмі. Акрамя таго, Канвенцыя прадугледжвае стварэнне эфектыўнага і незалежнага механізму маніторынгу, здольнага кантраляваць выкананне абавязацельстваў, якія змяшчаюцца ў Канвенцыі. Канвенцыя не абмяжоўваецца дзяржавамі – удзельніцамі Савета Еўропы; дзяржавы, якія не з’яўляюцца членамі Савета, і Еўрапейскі саюз таксама могуць стаць Бакамі Канвенцыі.

***Мэта і вобласць прымянення канвенцыі***

Канвенцыя заснавана на прызнанні прынцыпу, згодна з якім гандаль людзьмі ўяўляе сабой парушэнне правоў чалавека і з’яўляецца злачынствам для годнасці і цэласнасці чалавека. Канвенцыя Савета Еўропы з’яўляецца ўсёабдымным дагаворам, мэты якога наступныя:

- прадухіленне гандлю людзьмі,
- абарона правоў чалавека ў дачыненні да ахвяр гандлю людзьмі,
- судовае праследаванне гандляроў.

***Канвенцыя прымяняецца да:***

- усіх форм гандлю людзьмі: нацыянальных або транснацыянальных, звязаных або не звязаных з арганізаванай злачыннасцю;
- любых ахвяр: жанчын, мужчын або дзяцей;
- любых форм эксплуатацыі: сексуальная эксплуатацыя, прымусовая праца або паслугі і г. д.

***Меры, прадугледжаныя Канвенцыяй***

- Павышэнне дасведчанасці асоб, уразлівых да гандлю людзьмі, і дзеянні, накіраваныя на стварэнне перашкод «спажыўцам», з’яўляюцца аднымі з асноўных мер па прадухіленні гандлю людзьмі.
- Ахвяры гандлю людзьмі павінны быць прызнаны ў гэтым статусе, каб не дапусціць, каб паліцыя і дзяржаўныя органы разглядалі іх як незаконных мігрантаў або злачынцаў.
- Ахвярам гандлю людзьмі прапануецца фізічная і псіхалагічная дапамога і падтрымка іх рэінтэграцыі ў грамадства. Сярод прапанаваных мер – лячэнне, кансультаванне і інфармацыя, а таксама адпаведнае жыллё. Ахвяры таксама маюць права на атрыманне кампенсацыі.
- Ахвяры маюць права мінімум на 30 дзён для аднаўлення і пазбаўлення ад уплыву гандляроў людзьмі, прыняцця рашэння адносна іх магчымага супрацоўніцтва з уладамі. Аднаўляльны від на жыхарства можа быць прапанаваны, калі гэта патрабуе іх асабістая сітуацыя або калі ахвярам неабходна застацца, каб супрацоўнічаць у крымінальным расследаванні.
- Гандаль людзьмі будзе разглядацца як крымінальнае злачынства: гандляры людзьмі і іх саўдзельнікі будуць праследавацца па законе.
- Прыватнае жыццё і бяспека ахвяр гандлю людзьмі будуць абаронены ў ходзе судовага разбору.
- Магчымасць прыцягнення да крымінальнай адказнасці тых, хто карыстаецца паслугамі ахвяры, калі яны ведаюць, што гэта асоба з’яўляецца ахвярай гандлю людзьмі.
- Канвенцыя прадугледжвае магчымасць не накладаць штрафаў на ахвяр за іх удзел у незаконнай дзейнасці, калі яны былі вымушаны зрабіць гэта ў сваёй сітуацыі.
- Грамадзянская супольнасць адыгрывае важную ролю ў прадухіленні гандлю людзьмі і абароне ахвяр. Такім чынам, Канвенцыя заахвочвае супрацоўніцтва паміж дзяржаўнымі органамі, няўрадавымі грамадскімі арганізацыямі і членамі грамадзянскай супольнасці.

***Маніторынг***

Механізм маніторынгу складаецца з двух элементаў: GRETA, групы незалежных экспертаў па барацьбе з гандлем людзьмі, і Камітэта Бакоў, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі Камітэта міністраў Бакоў Канвенцыі і прадстаўнікі

Бакоў, якія не з'яўляюцца членамі Савета Еўропы. GRETA сочыць за ажыццяўленнем Канвенцыі; яна складае справаздачы аб ацэнцы мер, прынятых Бакамі. Тыя Бакі, якія не ў поўнай меры выконваюць меры, вызначаныя ў Канвенцыі, павінны будуць актывізаваць свае дзеянні. Акрамя таго, Камітэт Бакоў можа таксама выносіць рэкамендацыі Боку на аснове справаздачы GRETA.

## Хартыя Савета Еўропы аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека

Прынята ў рамках Рэкамендацыі CM/Rec (2010)7 Камітэтам міністраў

## РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Сфера прымянення**

Палажэнні гэтай Хартыі разглядаюць пытанні выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека ў адпаведнасці з азначэннямі, выкладзенымі ў пункце 2. Хартыя не тычыцца непасрэдна такіх звязаных галін, як міжкультурная адукацыя, адукацыя ў сферы роўнасці і адукацыя ў падтрымку ўстойлівага развіцця і міру, за выключэннем тых выпадкаў, калі яны перасякаюцца і ўзаемадзейнічаюць з выхаваннем дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыяй у галіне правоў чалавека.

**Азначэнні**

У мэтах гэтай Хартыі:

a. «Выхаванне дэмакратычнай грамадзянскасці» азначае выхаванне, падрыхтоўку, адукацыю, інфармацыю, практыку і дзейнасць, накіраваныя, дзякуючы перадачы навучэнцам ведаў, навыкаў і разумення, а таксама развіццю іх пазіцый і паводзін, на пашырэнне іх магчымасцей ажыццяўляць і абараняць свае дэмакратычныя правы і адказнасць у грамадстве, шанаваць разнастайнасць і адыгрываць актыўную ролю ў дэмакратычным жыцці з мэтай прасоўвання і абароны дэмакратыі і вяршэнства права.

b. «Адукацыя ў галіне правоў чалавека» азначае выхаванне, падрыхтоўку, адукацыю, інфармацыю, практыку і дзейнасць, накіраваныя, дзякуючы перадачы навучэнцам ведаў, навыкаў і разумення, а таксама развіццю іх пазіцый і паводзін, на пашырэнне іх магчымасцей спрыяць стварэнню і абароне агульнай культуры правоў чалавека ў грамадстве з мэтай прасоўвання і абароны правоў чалавека і асноўных свабод.

c. «Фармальная адукацыя» азначае структураваную сістэму адукацыі і падрыхтоўкі, якая ахоплівае этапы да пачатковай школы, пачатковую школу, а таксама сярэднюю школу і ўніверсітэцкую адукацыю. Як правіла, такая адукацыя забяспечваецца ў агульных або прафесійных навучальных установах і па яе завяршэнні выдаецца атэстат аб адукацыі.

d. «Нефармальная адукацыя» азначае любую запланаваную праграму адукацыі, закліканую пашырыць кола навыкаў і кампетэнцый, за межамі рамак фармальнай адукацыі.

e. «Інфармальная адукацыя» азначае працэс, які адбываецца на працягу ўсяго жыцця і падчас якога кожны чалавек выбудоўвае сваю пазіцыю, каштоўнасці, атрымлівае навыкі і веды пад уплывам адукацыі і фактараў свайго ўласнага асяроддзя, а таксама штодзённага вопыту (сям'і, групы аднагодкаў, суседзяў, у выніку сустрэч, у бібліятэцы, са СМІ, на працы, у гульні і г. д.).

**Узаемасувязь паміж выхаваннем дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыяй у галіне правоў чалавека**

Выхаванне дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыя ў галіне правоў чалавека не толькі цесна звязаны паміж сабой, але і дапаўняюць адна адну. Яны адрозніваюцца, хутчэй, па асноўных акцэнтах і сферы прымянення, а вось мэты і метады ў іх аднолькавыя. У выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці асноўная ўвага надаецца дэмакратычным правам, адказнасці і актыўнаму ўдзелу ў грамадзянскай, палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай, прававой і культурнай сферах жыцця грамадства, у той час як адукацыя ў галіне правоў чалавека ахоплівае больш шырокі спектр правоў чалавека і асноўных свабод усіх магчымых аспектаў грамадскага жыцця.

**Канстытуцыйныя структуры і прыярытэты дзяржаў-удзельнікаў**

Ніжэй выкладзены задачы, прынцыпы і палітыкі, якія прымяняюцца:

a) пры ўмове належнага захавання канстытуцыйных структур кожнай дзяржавы-ўдзельніцы з выкарыстаннем сродкаў, якія адпавядаюць гэтым структурам;

b) пры ўмове ўліку прыярытэтаў і патрэб кожнай дзяржавы-ўдзельніцы.

## РАЗДЗЕЛ II. ЗАДАЧЫ І ПРЫНЦЫПЫ

**Задачы і прынцыпы**

Пры вызначэнні сваёй палітыкі, заканадаўства і практыкі дзяржавы-ўдзельніцы заклікаы кіравацца наступнымі задачамі і прынцыпамі.

a. Мэта заключаецца ў тым, каб забяспечыць кожнай асобе, якая знаходзіцца на іх тэрыторыі, магчымасць выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека.

b. Працэс навучання ў рамках выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека адбываецца на працягу ўсяго жыцця. Эфектыўнае навучанне ў гэтай галіне ўключае ў сябе шырокі спектр удзельнікаў, у тым ліку палітыкаў, спецыялістаў у сферы адукацыі, навучэнцаў, бацькоў, адукацыйныя ўстановы, органы адукацыі, дзяржаўных служачых, няўрадавыя грамадскія і маладзёжныя арганізацыі, СМІ і грамадскасць.

c. Усе сродкі адукацыі і падрыхтоўкі – фармальныя, нефармальныя і інфармальныя – адыгрываць сваю ролю ў гэтым працэсе навучання і з'яўляюцца каштоўнымі для прасоўвання сваіх прынцыпаў і выканання пастаўленых задач.

d. Няўрадавыя грамадскія і маладзёжныя арганізацыі заклікаы ўнесці свой каштоўны ўклад у выхаванне дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыю ў галіне правоў чалавека менавіта на аснове нефармальнай і інфармальнай адукацыі, таму ім неабходны магчымасці і адпаведная падтрымка для таго, каб яны маглі зрабіць гэты ўклад.

e. Працэсы выкладання і навучання павінны адпавядаць каштоўнасцям і прынцыпам у сферы дэмакратыі і правоў чалавека і прасоўваць іх; у прыватнасці, кіраванне адукацыйнымі ўстановамі, уключаючы школы, павінна адлюстроўваць каштоўнасці правоў чалавека, спрыяць ім і пашыраць паўнамоцтвы і актыўны ўдзел у гэтым працэсе навучэнцаў, выкладчыкаў і зацікаўленых удзельнікаў, у тым ліку бацькоў.

f. Важным аспектам усяго комплексу выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека з'ўляецца садзейнічанне сацыяльнай згуртаванасці і міжкультурнаму дыялогу, а таксама павышэнне ролі разнастайнасці і роўнасці, у тым ліку гендарнай роўнасці; для гэтага надзвычай важна развіваць веды, асабістыя і грамадскія навыкі і ўзаемаразуменне, якія рэгулююць канфлікты, павышаюць узровень ацэнкі і разумення адрозненняў паміж рэлігійнымі і этнічнымі групамі, ствараюць узаемную павагу да чалавечай годнасці і агульных каштоўнасцей, заахвочваюць да дыялогу і спрыяюць негвалтоўнаму ўрэгуляванню праблем і спрэчак.

g. Адна з галоўных мэт любога выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека заключаецца не толькі ў тым, каб надзяліць навучэнцаў ведамі, разуменнем і навыкамі, але і ў тым, каб развіць гатоўнасць дзейнічаць у грамадстве з мэтай прасоўвання прынцыпаў правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права.

h. Пастаянная падрыхтоўка і развіццё ведаў спецыялістаў і маладзёжных лідараў у сферы адукацыі, а таксама саміх выкладчыкаў аб прынцыпах і практыцы выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека з'яўляюцца жыццёва важнай часткай ажыццяўлення і забеспячэння ўстойлівага і эфектыўнага навучання; яны павінны адпаведным чынам планавацца і забяспечвацца рэсурсамі.

i. Неабходна заахвочваць партнёрства і супрацоўніцтва паміж шырокім колам зацікаўленых удзельнікаў, задзейнічаных у забеспячэнні выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека на рэгіянальным і мясцовым узроўнях, такім чынам, каб атрымаць максімальную карысць з іх ролі, у тым ліку сярод палітыкаў, спецыялістаў у сферы адукацыі, навучэнцаў, бацькоў,

адукацыйных устаноў, няўрадавых грамадскіх і маладзёжных арганізацый, СМІ і грамадскасці.

j. Улічваючы міжнародны характар каштоўнасцей і абавязацельстваў у галіне правоў чалавека, а таксама агульных прынцыпаў, якія ляжаць у аснове дэмакратыі і вяршэнства права, важна, каб дзяржавы-ўдзельніцы развівалі міжнароднае і рэгіянальнае супрацоўніцтва і спрыялі яму ў дзейнасці, якую ахоплівае гэта Хартыя, у тым ліку выяўленню перадавога вопыту і абмену ім.

**РАЗДЗЕЛ III. ПАЛІТЫКІ**

**Фармальная агульная і прафесійная адукацыя**

Дзяржавы-ўдзельніцы павінны ўключаць выхаванне дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыю ў галіне правоў чалавека ў навучальныя праграмы – у рамках фармальнай адукацыі на ўзроўні навучання да пачатковай адукацыі, на ўзроўні пачатковай і сярэдняй школьнай адукацыі, а таксама да агульнай і прафесійнай адукацыі і падрыхтоўкі. Дзяржавы-ўдзельніцы павінны таксама падтрымліваць, разглядаць і абнаўляць асноўныя задачы і метады выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека ў гэтых навучальных праграмах, для таго каб забяспечваць іх актуальнасць і падтрымліваць устойлівы характар іх развіцця.

**Вышэйшая адукацыя**

Дзяржавы-ўдзельніцы заклiканы заахвочваць, з належным улікам прынцыпаў акадэмічных свабод, уключэнне выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека ў вышэйшых навучальных установах, у прыватнасці для будучых спецыялістаў у галіне адукацыі.

**Дэмакратычнае кіраванне**

Дзяржавы-ўдзельніцы павінны спрыяць дэмакратычнаму кіраванню ва ўсіх адукацыйных установах як жаданаму і плённаму метаду кіравання і як практычнаму сродку навучання дэмакратыі і захавання правоў чалавека. Яны павінны спрыяць адпаведнымі сродкамі актыўнаму ўдзелу навучэнцаў, педагагічнага саставу і зацікаўленых удзельнікаў, у тым ліку бацькоў, у кіраванні адукацыйнымі ўстановамі, а таксама заахвочваць да гэтага.

**Прафесійная падрыхтоўка**

Дзяржавы-ўдзельнікі павінны прапаноўваць настаўнікам, іншым работнікам сферы адукацыі, маладзёжным лідарам і выкладчыкам неабходную першасную і сістэматычную падрыхтоўку і развіццё ў сферы выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека. Гэта забяспечваецца прадстаўленнем паглыбленых ведаў і разуменнем задач і прынцыпаў гэтай дысцыпліны, а таксама адпаведных метадаў выкладання і навучання ў дадатак да іншых асноўных навыкаў, якія адпавядаюць іх галіне падрыхтоўкі.

**Роля няўрадавых грамадскіх і маладзёжных арганізацый і іншых удзельнікаў**

Дзяржавы-ўдзельніцы павінны ўмацоўваць ролю няўрадавых грамадскіх і маладзёжных арганізацый у выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека, асабліва ў тым, што тычыцца нефармальнай адукацыі. Яны павінны прызнаваць гэтыя арганізацыі і іх дзейнасць як каштоўную частку сістэмы адукацыі, аказваць ім па магчымасці неабходную падтрымку і ў поўнай меры выкарыстоўваць вопыт, які яны могуць перадаць ва ўсе формы навучання. Дзяржавы-ўдзельніцы павінны таксама распаўсюджваць інфармацыю аб выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека сярод іншых удзельнікаў, у прыватнасці ў СМІ і ў шырокіх колах грамадскасці, а таксама заахвочваць да гэтага для таго, каб мець магчымасць максімальна выкарыстоўваць той уклад, які яны здольныя зрабіць у гэтай галіне.

**Крытэрыі ацэнкі**

Дзяржавы-ўдзельніцы павінны распрацаваць крытэрыі ацэнкі для вызначэння эфектыўнасці навучальных праграм па выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека. Неад'емнай часткай такіх ацэнак павінна быць зваротная сувязь з боку навучэнцаў.

**Даследчая дзейнасць**

Дзяржавы-ўдзельніцы павінны ініцыяваць і распаўсюджваць навуковыя даследаванні па пытаннях выхавання дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека з мэтай пераасэнсавання бягучай сітуацыі, якая склалася ў гэтай галіне, і прапанавання адпаведным удзельнікам, у тым ліку палітыкам, адукацыйным установам, кіраўнікам школ, настаўнікам, вучням, няўрадавым грамадскім і маладзёжным арганізацыям, параўнальных даных, якія дазволяць ім ацаніць, павысіць эфектыўнасць і выніковасць сваёй дзейнасці, а таксама ўдасканаліць яе. Гэтыя даследаванні, акрамя ўсяго іншага, павінны ўключаць у сябе пытанні навучальных праграм, інавацыйнай практыкі, метадаў выкладання і развіцця сістэм ацэнак, у тым ліку крытэрыяў і паказчыкаў ацэнкі. Па меры мэтазгоднасці дзяржавы-ўдзельніцы павінны дзяліцца вынікамі гэтых даследаванняў з іншымі дзяржавамі-ўдзельніцамі і зацікаўленымі асобамі.

**Навыкі ў прасоўванні сацыяльнай згуртаванасці, павагі да разнастайнасці і ў рэгуляванні разыходжанняў і канфліктаў**

Ва ўсіх сферах адукацыі дзяржавы-ўдзельніцы павінны спрыяць выкарыстанню падыходаў і метадаў выкладання, накіраваных на навучанне жыццю ў дэмакратычным і культурным грамадстве, на атрыманне навучэнцамі ведаў і навыкаў у прасоўванні сацыяльнай згуртаванасці, павагі да разнастайнасці і роўнасці, station ацэнкі адрозненняў –
асабліва паміж рознымі рэлігійнымі і этнічнымі групамі, а таксама на вырашэнне любых спрэчак і непаразуменняў негвалтоўным шляхам, паважаючы пры гэтым правы іншых, а таксама на барацьбу з усімі формамі дыскрымінацыі і гвалту, перш за ўсё з тымі, якія суправаджаюцца здзекаваннямі і праследаваннем.

**РАЗДЗЕЛ IV. АЦЭНКА І СУПРАЦОЎНІЦТВА**

**Ацэнка і агляд**

Дзяржавы-ўдзельніцы павінны рэгулярна ацэньваць стратэгіі і палітыку, якія яны ажыццяўляюць у рамках Хартыі, і адпаведным чынам адаптаваць такія стратэгіі і палітыку. Яны могуць рабіць гэта ў супрацоўніцтве з іншымі дзяржавамі-ўдзельніцамі, напрыклад на рэгіянальнай аснове. Любая дзяржава-ўдзельніца можа таксама папрасіць дапамогі з боку Савета Еўропы.

**Супрацоўніцтва ў нагляднай дзейнасці**

Дзяржавы-ўдзельніцы павінны, калі гэта мэтазгодна, супрацоўнічаць адна з адной і праз Савет Еўропы пры дасягненні мэт і рэалізацыі прынцыпаў, выкладзеных у гэтай Хартыі, шляхам:

a) правядзення працы па тэмах і вызначаных прыярытэтах, якія прадстаўляюць узаемную цікавасць;

b) умацавання шматбаковай і трансгранічнай дзейнасці, уключаючы існуючую сетку каардынатараў па выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека;

c) абмену, развіцця, сістэматызацыі і забеспячэння распаўсюджвання перадавога вопыту;

d) інфармавання ўсіх адпаведных удзельнікаў, у тым ліку грамадскасці, пра мэты і выкананне Хартыі;

e) падтрымкі еўрапейскіх сетак няўрадавых грамадскіх і маладзёжных арганізацый, у тым ліку спецыялістаў у сферы адукацыі, а таксама шляхам супрацоўніцтва паміж імі.

**Міжнароднае супрацоўніцтва**

Дзяржавы-ўдзельніцы павінны абменьвацца вынікамі сваёй працы па выхаванні дэмакратычнай грамадзянскасці і адукацыі ў галіне правоў чалавека ў рамках Савета Еўропы з іншымі міжнароднымі арганізацыямі.

## Гласарый

Мэта гэтага гласарыя зводзіцца да таго, каб даць карыстальнікам «Компаса» кароткае вызначэнне або тлумачэнне асноўных паняццяў, канвенцый і тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца ў дапаможніку. Для атрымання больш падрабязнай інфармацыі чытачу варта звярнуцца да адпаведных раздзелаў даведачнай інфармацыі па тэмах у главе 5 і карыстацца Інтэрнэтам.

**Агаворка:** выключэнні, якія дзяржава робіць у дачыненні да дагавора, напрыклад да тых яго палажэнняў, якія яна не згодна выконваць. Пры гэтым агаворкі не могуць падрываць фундаментальнае значэнне самога дагавора.

**Адстойванне інтарэсаў:** публічная падтрымка або прапанаванне ідэі, паляпшэнне або спосаб рабіць нешта.

**Алігархія:** праўленне невялікай групы магутных людзей.

**Амбудсмен:** незалежная службовая асоба, якую звычайна назначае ўрад ці парламент і якой даручаецца расследаваць скаргі з боку асобных грамадзян. Слова «амбудсмен» паходзіць са старанарвежскай мовы і азначае «прадстаўнік».

**Амерыканская канвенцыя аб правах чалавека:** (Амерыканская канвенцыя); дагавор у галіне правоў чалавека, прыняты Арганізацыяй амерыканскіх дзяржаў (ААД) у 1969 годзе. Яго сфера дзеяння – Паўночная, Цэнтральная і Паўднёвая Амерыка.

**Антысемітызм:** страх, нянавісць, абурэнне, падазронасць, забабоны, дыскрымінацыя або несправядлівае абыходжанне з асобамі яўрэйскага паходжання або з тымі, хто вызнае іўдаізм. Сучасныя формы антысемітызму ўключаюць адмаўленне халакосту.

**Апартэід:** бесчалавечныя акты забойстваў, згвалтаванняў, катаванняў, звароту ў рабства ці іншыя злачынствы супраць чалавечнасці, учыненыя ў кантэксце інстытуцыялізаванага рэжыму сістэматычнага падаўлення і дамінавання адной расавай групы ў дачыненні да іншай расавай групы або груп і з намерам захаваць такі рэжым.

**Арабская хартыя правоў чалавека:** прынята Саветам Лігі арабскіх дзяржаў 22 мая 2004 года. Яна сцвярджае прынцыпы, выкладзеныя ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, у міжнародных пактах аб правах чалавека і Каірскай дэкларацыі аб правах чалавека ў ісламе.

**Арганізацыя Аб'яднаных Нацый:** міжнародная міждзяржаўная арганізацыя (МДА), заснаваная ў 1945 годзе пасля Другой сусветнай вайны з мэтай падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, развіцця дружалюбных адносін паміж дзяржавамі і садзейнічання сацыяльнаму прагрэсу, павышэнню ўзроўню жыцця і ўмацаванню правоў чалавека.

**Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ):** міжурадавая арганізацыя ў галіне бяспекі, членамі якой з'яўляюцца практычна ўсе краіны Еўропы і Цэнтральнай Азіі, ЗША і Канады. Паўнамоцтвы АБСЕ распаўсюджваюцца на такія пытанні, як кантроль над узбраеннямі, правы чалавека, свабода прэсы і сумленныя выбары.

**Аб’яднанне:** арганізацыя, сфарміраваная групай людзей з мэтай дасягнення пэўнай задачы. Такія арганізацыі могуць называцца добраахвотнымі арганізацыямі, добраахвотнымі аб’яднаннямі і аб'яднаннямі без правоў юрыдычнай асобы. Няўрадавыя грамадскія арганізацыі (НГА) – гэта аб’яднанні. Аб’яднанні ўтвараюць аснову таго, што называюць «грамадзянскай супольнасцю».

**Асоба, якая шукае прытулак:** чалавек, які імкнецца атрымаць міжнародную абарону і па заяве якога аб набыцці афіцыйнага статусу бежанца яшчэ не было вынесена рашэння.

**Аўтакратыя:** праўленне адной асобы або невялікай групы, якая мае неабмежаваную ўладу або паўнамоцтвы, або ўлада ці паўнамоцтвы такой асобы або групы.

**Афрыканская хартыя правоў чалавека і народаў:** (Афрыканская хартыя, якую часам называюць таксама Банжульскай хартыяй); рэгіянальны дагавор у галіне правоў чалавека для афрыканскага кантынента, прыняты Арганізацыяй афрыканскага адзінства (ААА) у 1981 годзе.

**Ацэнка:** структураваная размова паміж фасілітатарамі і ўдзельнікамі з мэтай даць апошнім магчымасць прааналізаваць і ацаніць усё, чаму яны навучыліся падчас дзейнасці на аснове вопыту і ўдзелу. У гэтым працэсе ўдзельнікі аналізуюць, як гэта навучанне звязана з тым, што яны ўжо ведалі, і як яны могуць выкарыстоўваць атрыманыя веды ў будучыні.

**Бежанец:** асоба, якая па прычыне абгрунтаванага страху праследавання па прыкмеце расы, рэлігіі, нацыянальнасці, прыналежнасці да канкрэтнай сацыяльнай групы або з-за палітычных меркаванняў

знаходзіцца за межамі краіны свайго грамадзянства і не можа ці па прычыне такога страху не жадае карыстацца абаронай гэтай краіны. Тэрмін таксама выкарыстоўваецца ў больш агульным плане для апісання асобы, якая аказалася ў сітуацыі, падобнай да той, у якой знаходзяцца бежанцы, напрыклад, асобы, якая шукае прытулак.

**Біль аб правах:** заява ў канстытуцыі аб правах чалавека ці аб грамадзянскіх правах, у якой пералічваюцца формы абароны ад умяшальніцтва з боку ўрадаў. Гл. таксама «Міжнародны біль аб правах чалавека».

**Ваенныя злачынствы:** злачынствы, учыненыя падчас канфлікту, унутранага ці міжнароднага, якія звязаны з сур'ёзным парушэннем гуманітарнага права або іншых законаў, якія адносяцца да ўзброеных канфліктаў. Гаагскія канвенцыі 1899 і 1907 гадоў, разам з Жэнеўскай канвенцыяй 1949 года, адносяцца да першых афіцыйных міжнародных прававых актаў, якія прысвечаны вайне і ваенным злачынствам, а таксама гуманнаму абыходжанню з ахвярамі вайны.

**Выключэнне:** дэкларацыя дзяржавы – удзельніцы дагавора, якая дазваляе гэтай дзяржаве прыпыніць ці абмежаваць некаторыя правы, напрыклад, падчас вайны. Некаторыя правы ніколі не могуць быць прадметам выключэнняў, напрыклад права на свабоду ад катаванняў.

**Вярхоўны камісар па правах чалавека:** асноўная службовая асоба ААН па правах чалавека. Вярхоўны камісар узначальвае Бюро вярхоўнага камісара па правах чалавека, якое было створана для падтрымкі механізмаў ААН у галіне правоў чалавека. (Не блытаць з Камісарам па правах чалавека – органам Савета Еўропы.)

**Вяршэнства права:** ні адна асоба, ці то службовая асоба, ці то кароль ці прэзідэнт, не стаіць вышэй за закон. Аднолькавыя законы прымяняюцца да тых, хто кіруе, і да тых, кім кіруюць.

**Генацыд:** сістэматычнае забойства з намерам знішчыць, цалкам ці часткова, групу асоб з-за іх нацыянальнасці, расавай, этнічнай ці рэлігійнай прыналежнасці. Таксама нанясенне сур'ёзнай фізічнай або псіхалагічнай шкоды і гвалтоўнае перамяшчэнне дзяцей з гэтай групы ў іншую групу.

**Гендар:** сацыяльная канцэпцыя, якая вызначае ролі, перакананні, каштоўнасці і ўзаемаадносіны паміж жанчынамі і мужчынамі. Калі палавая прыналежнасць вызначаецца біялогіяй, г. зн. біялагічнымі адрозненнямі паміж мужчынамі і жанчынамі, то гендар вызначаецца грамадствам; амаль заўсёды служыць мэтам падпарадкавання жанчын мужчынам.

**Глабалізацыя:** як правіла, гэты тэрмін апісвае працэс усё большай узаемазалежнасці і абмену паміж нацыямі, перш за ўсё ў эканамічнай, сацыяльнай і культурнай сферах. Гэты тэрмін выкарыстоўваецца таксама для абазначэння асаблівай формы міжнароднай інтэграцыі, накіраванай на служэнне інтарэсам прыватнай улады, карпарацый-вытворцаў і фінансавых устаноў, цесна звязаных з магутнымі дзяржавамі.

**Грамадзянская супольнасць:** адносіцца ў сукупнасці да добраахвотных грамадзянскіх і грамадскіх арганізацый, аб’яднанняў і ўстаноў, напрыклад, зарэгістраваных дабрачынных фондаў, недзяржаўных арганізацый, грамадскіх груп, жаночых арганізацый, канфесійных арганізацый, прафесійных аб'яднанняў, прафсаюзаў, груп самадапамогі і груп падтрымкі, якія ўтвараюць аснову дзеючага дэмакратычнага грамадства. Грамадзянская супольнасць разглядаецца як асобная ад дзяржаўных і камерцыйных арганізацый на рынку.

**Грамадзянскія правы:** (часам вядомыя як грамадзянскія свабоды); катэгорыя правоў і свабод, якія абараняюць асоб ад неабгрунтаваных дзеянняў з боку дзяржаўных органаў і забяспечваюць ім магчымасць удзельнічаць у грамадзянскім жыцці дзяржавы без дыскрымінацыі або судовага праследавання.

**Грамадзянства:** а) юрыдычныя адносіны паміж асобай і дзяржавай, у выніку якіх узнікаюць узаемныя правы і абавязкі, або b) тэрмін, які выкарыстоўваецца для апісання агульных узаемаадносін паміж асобамі і дзяржавай, да якой яны «адносяцца», уключаючы чаканыя формы паводзін і пазіцый.

**Гуманітарнае права:** звод правоў, заснаваных у асноўным на Жэнеўскіх канвенцыях, які абараняе некаторых асоб падчас узброенага канфлікту, дапамагае ахвярам і абмяжоўвае метады і сродкі вядзення ўзброеных дзеянняў для таго, каб звесці да мінімуму разбурэнні, колькасць ахвяр і празмерныя чалавечыя пакуты.

**Дагавор:** (выкарыстоўваецца як сінонім тэрмінаў «канвенцыя» і «пакт»); афіцыйнае пагадненне паміж нацыянальнымі дзяржавамі, якое вызначае і змяняе іх узаемныя абавязацельствы. Калі дзяржава ратыфікуе прыняты дагавор, артыкулы гэтага дагавора становяцца часткай яго ўнутраных юрыдычных абавязацельстваў.

**Далучэнне:** замяняе традыцыйны двухэтапны працэс падпісання і ратыфікацыі дагавора, які ўжо дзейнічае. Дзяржава, якая далучаецца да дагавора, становіцца неадкладна звязанай ім. Прыкладам практычнага прымянення ідэі далучэння з'яўляецца пытанне неабходнасці далучэння Еўрапейскага саюза да ЕКПЧ.

**Дзяржавы-ўдзельніцы:** краіны, якія з'яўляюцца членамі міжурадавых арганізацый (напрыклад, Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Савета Еўропы).

**Дзяржаўны суверэнітэт:** ідэя, згодна з якой урад валодае вышэйшым юрыдычным правам вызначаць тое, што робіцца ў рамках яго юрысдыкцыі. Міжнародныя дакументы ў галіне правоў чалавека вызначаюць пэўныя абмежаванні на суверэнітэт, таксама як і членства ў такіх міжнародных арганізацыях, як Еўрапейскі саюз.

**Дыскрымінацыя:** любое размежаванне, адчужэнне або абмежаванне пераваг на падставе такіх прыкмет, як расавая прыналежнасць, культура, этнічнае паходжанне, нацыянальнасць, сексуальная арыентацыя, рэлігія, фізічная інваліднасць ці іншыя характарыстыкі, не звязаныя з канкрэтнай сітуацыяй.

**Дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці:** дыскрымінацыйная, абразлівая практыка або практыка прыніжэння правоў іншых, звязаная з перакананасцю ў тым, што людзі з інваліднасцю горшыя за іншых.

**Дэкларацыя:** дакумент, у якім абвяшчаюцца ўзгодненыя прынцыпы і стандарты, але які пры гэтым не з'яўляецца юрыдычна абавязвальным. На канферэнцыях ААН, напрыклад Канферэнцыі ААН па правах чалавека ў Вене ў 1993 годзе і Сусветнай канферэнцыі па пытаннях становішча жанчын у Пекіне ў 1995 годзе, як правіла, рыхтуецца два тыпы дэкларацый: адна, складзеныя прадстаўнікамі ўрадаў, і адна з боку няўрадавых грамадскіх арганізацый (НГА). На Генеральнай Асамблеі ААН часта прымаюцца важныя дэкларацыі, якія пры гэтым не маюць юрыдычна абавязвальнай сілы.

**Дэкларацыя аб правах дзіцяці:** была прынята Генеральнай Асамблеяй ААН у 1959 годзе. У гэтым неабавязвальным дакуменце выкладаюцца дзесяць агульных прынцыпаў, якія пазней ляглі ў аснову Канвенцыі аб правах дзіцяці (КПД), прынятай у 1989 годзе.

**Дэмакратыя:** такая форма кіравання, пры якой паўнамоцтвы па кіраванні зыходзяць ад народа праз правядзенне прамога рэферэндуму або праз прадстаўнікоў, выбраных людзьмі, якія маюць права ўдзельнічаць у галасаванні.

**Еўрапейскі камітэт па сацыяльных правах:** орган, адказны за правядзенне маніторынгу выканання дзяржавамі Еўрапейскай сацыяльнай хартыі. Камітэт складаецца з 15 незалежных і непрадузятых экспертаў, якія праводзяць рэгулярныя сустрэчы для разгляду дакладаў дзяржаў – членаў Сацыяльнай хартыі.

**Еўрапейская канвенцыя аб абароне ад катаванняў або зневажальнага годнасць абыходжання або пакарання:** рэгіянальны дагавор у галіне абароны правоў чалавека, прыняты ў 1987 годзе Саветам Еўропы, мэтай якога з'яўляецца прадухіленне розных парушэнняў у дачыненні да правоў людзей, якія ўтрымліваюцца дзяржаўнымі органамі пад вартай у такіх месцах, як турмы, цэнтры для непаўналетніх правапарушальнікаў, паліцэйскія ўчасткі, лагеры бежанцаў або псіхіятрычныя бальніцы.

**Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод (ЕКПЧ):** (Еўрапейская канвенцыя, Еўрапейская канвенцыя аб правах чалавека) – рэгіянальны дагавор аб абароне правоў чалавека, прыняты ў 1950 годзе Саветам Еўропы. Усе дзяржавы – удзельніцы Савета Еўропы з'яўляюцца бакамі ў ЕКПЧ, а ад новых членаў чакаецца, што яны ратыфікуюць гэту Канвенцыю як мага хутчэй.

**Еўрапейская культурная канвенцыя:** (прынята Саветам Еўропы ў 1954 годзе; уступіла ў сілу ў 1955 годзе); рэгіянальны дагавор, які забяспечвае афіцыйныя рамкі для работы Савета Еўропы ў галіне адукацыі, культуры, спадчыны, моладзі і спорту. Культурная канвенцыя, якая з'яўляецца дадаткам да Еўрапейскай канвенцыі, накіравана на падтрыманне еўрапейскай культуры і развіццё ўзаемаразумення і павагі культурнай разнастайнасці паміж рознымі народамі Еўропы.

**Еўрапейская сацыяльная хартыя:** (прынята Саветам Еўропы ў 1962 годзе, перагледжана ў 1996 годзе); рэгіянальны дагавор, які гарантуе сацыяльныя і эканамічныя правы чалавека; яна дапаўняе Еўрапейскую канвенцыю, якая ў асноўным тычыцца грамадзянскіх і палітычных правоў.

**Еўрапейскі парламент:** парламенцкі орган Еўрапейскага саюза, які выбіраецца напрамую. Парламент засядае ў двух месцах: у Страсбургу і ў Бруселі. У Еўрапейскім парламенце 736 дэпутатаў.

**Еўрапейскі саюз (ЕС):** эканамічны і палітычны саюз дзяржаў-членаў, размешчаны ў Еўропе, дзейнасць якога накіравана на рэгіянальную інтэграцыю і сацыяльнае супрацоўніцтва.

Еўрапейскі саюз быў створаны на падставе Маастрыхцкага дагавора ў 1993 годзе.

**Еўрапейскі суд па правах чалавека:** гэты наднацыянальны суд, размешчаны ў Страсбургу, быў створаны на падставе Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і прадугледжвае магчымасць юрыдычнага абскарджання ў апошняй інстанцыі для асоб, якія мяркуюць, што іх правы чалавека былі парушаны ўдзельнікам Канвенцыі.

**Еўрапейскі суд правасуддзя Еўрапейскіх супольнасцей:** (часта згадваецца проста як «Суд»); створаны ў 1952 годзе. Задача Суда, размешчанага ў Люксембургу, заключаецца ў тым, каб забяспечваць тлумачэнне і прымяненне заканадаўства ЕС аднолькава ва ўсіх краінах ЕС, каб гэта заканадаўства было роўным для ўсіх. Ён сочыць за тым, напрыклад, каб нацыянальныя суды не выносілі розных пастаноў па адным і тым жа пытанні.

**Жыццёвая пазіцыя:** набор ідэй, якія дапамагаюць зразумець свет і знайсці сэнс і каштоўнасць жыцця; агульнае абазначэнне, якое ахоплівае як рэлігійныя, так і альтэрнатыўныя погляды без дыскрымінацыі ў дачыненні да той ці іншай пазіцыі.

**Жэнеўскія канвенцыі:** чатыры дагаворы, прынятыя ў 1949 годзе пад эгідай Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа (МКЧК) у Жэневе, Швейцарыя. У іх вызначаюцца правілы, якія прымяняюцца пры ўзброеным канфлікце, у прыватнасці, адносна абыходжання з хворымі і раненымі салдатамі, маракамі і пілотамі, ваеннапалоннымі і грамадзянскімі асобамі, якія знаходзяцца пад кантролем ворага.

**Звычайнае міжнароднае права:** практыка, якая прызнаецца заканадаўствам на аснове звычаяў і традыцый. Каб стаць звычайным міжнародным правам, такая практыка павінна ўключаць два аспекты: аднастайна і паслядоўна прымяняцца дзяржавай доўгі час, а таксама атрымаць прызнанне ў якасці абавязковай (opinio juris). Гэта важная і карысная крыніца міжнароднага права, таму што звязвае ўсе дзяржавы ў незалежнасці ад таго, ці ўзгаднілі яны дагавор.

**Здольнасці, якія развіваюцца:** прынцып, які выкарыстоўваецца ў Канвенцыі аб правах дзіцяці (КПД), які рэкамендуе больш шырока рэалізоўваць правы дзіцяці з улікам развіцця яго кагнітыўнай і эмацыянальнай сталасці.

**Злачынствы супраць міру:** у міжнародным праве мае наступныя значэнні: (і) планаванне, падрыхтоўка, ініцыяцыя або вядзенне захопніцкай вайны або вайны ў парушэнне міжнародных дагавораў, пагадненняў або дамоўленасцей; (іі) удзел у агульным плане або змове для здзяйснення якіх-небудзь актаў, згаданых у пункце (і). Вядомы таксама як Нюрнбергскія прынцыпы.

**Злачынствы супраць чалавечнасці:** шырока распаўсюджаныя або сістэматычныя акты гвалту, накіраваныя супраць любога грамадзянскага насельніцтва. Напрыклад, забойствы; знішчэнне; зварот у рабства; катаванне; згвалтаванне; сексуальнае рабства; гвалтоўная цяжарнасць; праследаванне якой-небудзь групы па такіх прыкметах, як, сярод іншага, раса, этнічнае паходжанне, гендар; гвалтоўнае знікненне людзей; злачынства апартэіду і іншыя акты жорсткасці аналагічнага характару, якія ўключаюць наўмыснае прычыненне вялікіх пакут або сур'ёзных траўм ці шкоды псіхічнаму або фізічнаму здароўю.

**Знікненне:** тэрмін, які выкарыстоўваецца, калі людзі знікаюць таму, што былі забіты або таемна ўзяты пад варту ўрадам ці іншымі арганізацыямі. Людзі знікаюць з-за сваіх палітычных поглядаў ці дзейнасці, накіраванай супраць несправядлівага рэжыму ці дактрыны арганізацый.

**Інструменты:** любы афіцыйны пісьмовы дакумент дзяржавы ці дзяржаў, у якім правы падаюцца як неабавязвальныя прынцыпы (дэкларацыя) або кадыфікуюцца правы, якія з'яўляюцца юрыдычна абавязвальнымі ў дачыненні да тых дзяржаў, якія іх ратыфікавалі (пакт, дагавор або канвенцыя). Інструменты могуць быць нацыянальнымі ці міжнароднымі.

**Інфармальная адукацыя:** працэс, які адбываецца на працягу ўсяго жыцця і падчас якога кожны чалавек набывае перакананні, каштоўнасці, навыкі і веды са штодзённага вопыту і дзякуючы ўплыву адукацыі і ўласнага асяроддзя (сям'і, групы аднагодкаў, суседзяў, рынку, бібліятэк, СМІ, працы, гульняў і г. д.).

**Кадыфікацыя, кадыфікаваць:** працэс афіцыйнага афармлення закону або правоў у пісьмовых інструментах.

**Калектыўныя правы:** правы груп на абарону сваіх інтарэсаў і ідэнтычнасці; часам іх называюць «правамі трэцяга пакалення». Гэтыя правы існуюць у дадатак да індывідуальных правоў.

**Камісар па правах чалавека:** незалежны орган у рамках Савета Еўропы, які мае паўнамоцтвы садзейнічаць інфармаванасці аб правах чалавека і іх выкананню ў дзяржавах – удзельніцах Савета Еўропы. Гл. таксама «Вярхоўны камісар па правах чалавека».

**Камісія па правах чалавека:** орган ААН, у цяперашні час яго замяніў Савет па правах чалавека.

**Камітэт па правах чалавека:** орган ААН, які складаецца з 18 экспертаў, якія збіраюцца тры разы на год, каб разгледзець пяцігадовыя даклады, прадстаўленыя 162 дзяржавамі – удзельніцамі ААН аб выкананні імі Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП).

**Кампетэнцыя:** здольнасць выконваць працу або задачы. У адносінах да абароны правоў чалавека – веды і разуменне, неабходныя моладзі для больш глыбокага разумення пытанняў правоў чалавека, а таксама навыкі, перакананні і каштоўнасці, неабходныя для абароны правоў чалавека.

**Канвенцыя:** абавязковая да выканання дамова паміж дзяржавамі; выкарыстоўваецца як сінонім тэрмінаў «дагавор» і «пакт». Канвенцыя мае большую моц, чым дэкларацыя, паколькі яна з'яўляецца юрыдычна абавязвальным дакументам для тых урадаў, якія яе ратыфікавалі.

**Канстытуцыя:** звод законаў, на падставе якіх ажыццяўляецца кіраванне краінай або арганізацыяй. У большасці краін канстытуцыя з'яўляецца пісьмовай і ўяўляе сабой узгоднены вышэйшы закон краіны; у ёй выкладаюцца асновы дзяржавы і яе палітычнай сістэмы. Лічыцца, што ў чатырох краінах пісьмовай канстытуцыі не існуе; у іх заканадаўства развіваецца праз судовыя пастановы і прэцэдэнты.

**Карэнныя народы:** вызначаюцца праз сваё стаўленне да зямлі, а таксама праз неад'емныя характарыстыкі, якія ў іх могуць быць. Яны пацярпелі ад каланізацыі, заўсёды з'яўляюцца ізаляванымі ў сваіх дзяржавах і часта арганізаваны па племяннай прыкмеце. Многія карэнныя народы імкнуцца да прызнання сваіх правоў як асобных народаў, уключаючы права на самавызначэнне, а таксама права на ажыццяўленне кантролю над развіццём сваіх супольнасцей. Дэкларацыя ААН аб правах карэнных народаў, 2007 год.

**Кіраванне канфліктам:** дзеянні, якія прымаюцца з галоўнай мэтай прадухілення вертыкальнай (узмацненне гвалту) або гарызантальнай (тэрытарыяльнае распаўсюджванне) эскалацыі існуючых канфліктаў з прымяненнем гвалту.

**Комплексны гендарны падыход:** усеагульна прынятая стратэгія для прасоўвання гендарнай роўнасці. Гэта не з'яўляецца мэтай само па сабе, а хутчэй сродкам для дасягнення мэт гендарнай роўнасці праз забеспячэнне таго, каб гендарныя падыходы і ўвага да мэт гендарнай роўнасці былі ў цэнтры ўсёй дзейнасці, уключаючы распрацоўку палітык, размеркаванне рэсурсаў і планаванне, рэалізацыю і маніторынг праграм і праектаў.

**Ксенафобія:** (ірацыянальны) страх перад чужаземцамі, людзьмі з іншых краін або ў цэлым перад рэчамі замежнага паходжання. Ксенафобія можа прыводзіць да дыскрымінацыі, расізму, гвалту і нават да ўзброенага канфлікту з чужаземцамі.

**Культура:** шырокі звод калектыўных пазіцый, каштоўнасцей, мэт і практык, часта заснаваных на гістарычных традыцыях, агульных для пэўнай структуры, арганізацыі ці групы.

**Культурныя правы:** права на захаванне ўласнай культурнай ідэнтычнасці і развіццё.

**ЛГБТ:** скарачэнне для абазначэння лесбіянак, гомасексуалістаў, бісексуалаў і трансгендараў.

**Маральныя правы:** правы, якія вынікаюць з агульных этычных прынцыпаў, такіх як справядлівасць і правасуддзе.

**Меншасць:** любая этнічная, моўная або рэлігійная група ў дзяржаве, якая не займае дамінуючай пазіцыі і складаецца з асоб, у якіх развіта пачуццё прыналежнасці да гэтай групы і намер захоўваць і развіваць сваю ідэнтычнасць.

**Мігрант:** тэрмін, які шырока выкарыстоўваецца ў працы Еўрапейскага камітэта па міграцыі для абазначэння, у залежнасці ад кантэксту, эмігрантаў, мігрантаў, якія вяртаюцца, іммігрантаў, бежанцаў, перамешчаных асоб, асоб імігранцкага паходжання і (або) прадстаўнікоў этнічных меншасцей, якія былі ўтвораны ў выніку іміграцыі.

**Міжкультурны:** тэрмін адносіцца да ўзаемазалежнасці і ўзаемадзеяння паміж рознымі моўнымі і этнічнымі супольнасцямі. Міжкультурны падыход сцвярджае, што рэальнасць з'яўляецца плюралістычнай, комплекснай і дынамічнай і што такое ўзаемадзеянне з'яўляецца неад'емнай часткай усяго жыцця і культуры.

**Міжнародная арганізацыя працы (МАП):** створана ў 1919 годзе. Трохбаковая ўстанова ААН, якая аб'ядноўвае ўрад, працадаўцаў і працаўнікоў у дзяржавах-удзельніцах для садзейнічання належным умовам працы з павагай да чалавечай вартасці ва ўсім свеце.

**Міжнародны біль аб правах чалавека:** неафіцыйная назва, якая ахоплівае Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека (УДПЧ), Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП) і Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП), а таксама Факультатыўныя пратаколы да іх.

**Міжнародны крымінальны суд (МКС):** пастаянны трыбунал, створаны ў 2002 годзе і размешчаны ў Гаазе, Нідэрланды, для праследавання асоб за здзяйсненне актаў генацыду, злачынстваў супраць чалавечнасці, ваенных злачынстваў і злачынстваў у форме агрэсіі. (МКС не варта блытаць з Міжнародным Судом.)

**Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП):** (прыняты ў 1966 годзе і ўступіў у сілу ў 1976 годзе); адзін з асноўных міжнародных дагавораў у галіне правоў чалавека; у МПГПП заяўляецца, што ўсе людзі валодаюць шырокім спектрам грамадзянскіх і культурных правоў, а таксама вызначаюцца спосабы кантролю за іх выкананнем у дзяржавах-удзельніцах.

**Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП):** (прыняты ў 1966 годзе і ўступіў у сілу ў 1976 годзе); адзін з асноўных міжнародных дагавораў у галіне правоў чалавека; у МПЭСКП заяўляецца, што ўсе людзі валодаюць шырокім спектрам эканамічных, сацыяльных і культурных правоў.

**Міжнародны Суд (МС):** (Сусветны суд); асноўны судовы орган Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Ён размешчаны ў Гаазе, Нідэрланды, і яго галоўная задача – вырашаць юрыдычныя спрэчкі, з якімі да яго звяртаюцца дзяржавы, і выдаваць кансультацыйныя заключэнні па юрыдычных пытаннях, прадстаўленых яму належным чынам упаўнаважанымі міжнароднымі органамі, установамі і Генеральнай Асамблеяй ААН. (МС не варта блытаць з Міжнародным крымінальным судом.)

**Міждзяржаўныя арганізацыі (МДА):** арганізацыі, якія фінансуюцца некалькімі ўрадамі з мэтай каардынацыі намаганняў. ААН з'яўляецца міжнароднай МДА. Некаторыя МДА з'яўляюцца рэгіянальнымі, напрыклад Савет Еўропы, Арганізацыя афрыканскага адзінства, некаторыя – альянсамі, напрыклад Арганізацыя Паўночнаатлантычнага дагавора (НАТА), а некаторыя займаюцца вырашэннем канкрэтных задач, напрыклад Міжнародная арганізацыя па міграцыі (МАМ).

**Міратворчасць:** (у тым ліку міратворчасць на этапе пасля канфлікту); дзеянні, што прымаюцца ў сярэдне- і доўгатэрміновым плане для пераадолення глыбінных прычын канфліктаў з прымяненнем гвалту.

**Маладзёжны ўдзел:** гл. «Удзел».

**Мультыкультурны:** людзі розных культур, якія пражываюць сумесна ў супольнасці, узаемадзейнічаюць у рознай ступені, але ў той жа час захоўваюць свае адметныя рысы.

**Навык:** здольнасць добра ажыццяўляць дзейнасць або выконваць працу, перш за ўсё дзякуючы вопыту. Здольнасць абараняць правы чалавека ўключае, напрыклад, навыкі камунікатыўных зносін, рэгуляванне праблем, творчае мышленне, уменне весці перамовы і працаваць у камандзе.

**Натуральныя правы:** правы, якія належаць людзям проста таму, што яны людзі. Іх таксама называюць неад'емнымі правамі; яны лічацца відавочнымі і ўніверсальнымі правамі, якія не залежаць ад законаў, традыцый ці вераванняў асобнай культуры ці ўрада.

**Неадчужальны:** тэрмін адносіцца да правоў, якія належаць кожнаму чалавеку і не могуць быць адабраныя ў яго ні пры якіх абставінах.

**Неанацызм:** тэрмін апісвае ўзнікшыя пасля Другой сусветнай вайны ўльтраправыя палітычныя ці сацыяльныя рухі і ідэалогіі, якія імкнуцца адрадзіць нацызм або іншыя яго формы, заснаваныя на расавым або этнічным нацыяналізме.

**Непадзельны:** тэрмін апісвае важнасць адносін да ўсіх правоў чалавека як да часткі непадзельнага і непарыўнага цэлага. Чалавеку нельга адмовіць у канкрэтным праве чалавека на падставе таго, што яно «менш важнае», чым іншыя, ці «не з'яўляецца галоўным».

**Нерэгулярная міграцыя:** тэрмін, які большасць даследчыкаў у галіне міграцыі выкарыстоўвае замест тэрмінаў «нелегальная», «незадакументаваная» або «недазволеная» міграцыя для таго, каб падкрэсліць, што ні адзін чалавек не з'яўляецца нелегальным сам па сабе.

**Няўрадавыя грамадскія арганізацыі (НГА):** арганізацыі, створаныя незалежна ад урада, як правіла, з мэтай лабіравання, заняцця дабрачыннай або актывісцкай дзейнасцю. Некаторыя з'яўляюцца маштабнымі і міжнароднымі, напрыклад Чырвоны Крыж, Amnesty International, рух скаўтаў, Human Rights Watch, Еўрапейскі маладзёжны форум. Іншыя могуць быць невялікімі і мясцовымі, напрыклад арганізацыя па падтрымцы асоб з інваліднасцю ў асобным горадзе; кааліцыя па прасоўванні правоў жанчын у канкрэтным лагеры бежанцаў. Са спісам НГА у вашай краіне можна азнаёміцца ў базе даных Савета Еўропы: http://ngo-coe.org.

**Нефармальная адукацыя:** любая запланаваная праграма адукацыі па-за рамкамі фармальнай адукацыі, накіраваная на пашырэнне набору навыкаў і кампетэнцый, напрыклад, праца з моладдзю.

Нефармальную адукацыю таксама называюць нефармальным навучаннем.

**Аналіз:** структураваная размова паміж фасілітатарамі і ўдзельнікамі, накіраваная на тое, каб правесці агляд дзейнасці на аснове вопыту і ўдзелу; абмеркаванне таго, што мела месца і як адчувалі сябе пры гэтым удзельнікі. Мэта заключаецца ў тым, каб дапамагчы ўдзельнікам растлумачыць свае думкі і пачуцці ў бяспечных умовах.

**Падпісанне:** падпісанне дагавора з'яўляецца першым крокам для таго, каб стаць бокам у дагаворы, што заўсёды азначае крок у напрамку ратыфікацыі. Падпісваючы дагавор, дзяржава выказвае свой намер у будучыні прыняць усе абавязацельствы, якія вынікаюць з яго, і ўстрымлівацца ад чаго-небудзь, што супярэчыла б гэтым абавязацельствам.

**Падсправаздачнасць:** працэс, які патрабуе ад урада паказаць, растлумачыць і абгрунтаваць выкананне сваіх абавязацельстваў перад народам.

**Пакт:** абавязковая да выканання дамова паміж дзяржавамі; выкарыстоўваецца як сінонім тэрмінаў «канвенцыя» і «дагавор». Асноўнымі міжнароднымі пактамі ў галіне правоў чалавека з'яўляюцца Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП) і Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП), абодва прынятыя ў 1966 годзе.

**Палітычныя правы:** права асоб прымаць удзел у палітычным жыцці сваёй супольнасці і грамадства, напрыклад шляхам галасавання за ўрад.

**Папярэджанне канфлікту:** дзеянні, якія прымаюцца на працягу кароткага часу для зніжэння відавочнай напружанасці і (або) для папярэджання ўзнікнення або паўтарэння канфлікту з прымяненнем гвалту.

**Парламенцкая асамблея Савета Еўропы (ПАСЕ):** размешчана ў Страсбургу; ПАСЕ праводзіць свае пасяджэнні чатыры разы на год для абмеркавання актуальных пытанняў і звароту да еўрапейскіх урадаў аб ажыццяўленні ініцыятыў і зваротнай справаздачнасці. 318 прадстаўнікоў прызначаюцца з ліку членаў нацыянальных парламентаў 47 дзяржаў – членаў Савета Еўропы.

**Пасрэдніцтва:** працэс, падчас якога трэцяя асоба дапамагае бакам у спрэчцы ўрэгуляваць свае разыходжанні шляхам абмеркавання пытання для таго, каб знайсці агульную пазіцыю, з якой будуць згодны абодва гэтыя бакі.

**Пашырэнне правоў і магчымасцей:** павелічэнне духоўнай, палітычнай, сацыяльнай ці эканамічнай сілы асоб і супольнасцей. Тэрмін выкарыстоўваецца ў дачыненні да намаганняў па забеспячэнні для ізаляваных асоб або груп магчымасцей заявіць пра свае правы на ўсебаковы ўдзел у жыцці грамадства на аснове, напрыклад, заканадаўства, станоўчага дзеяння і навучання.

**Перамовы:** працэс, падчас якога бакі спрэчкі размаўляюць адзін з адным для таго, каб вырашыць сваю праблему.

**Плутакратыя:** сістэма праўлення, пры якой кіруюць ці маюць уладу найбольш багатыя людзі краіны.

**Пол:** біялагічныя адрозненні паміж мужчынамі і жанчынамі, якія маюць універсальны характар і не змяняюцца. Пол адрозніваецца ад гендара, які адносіцца да сацыяльных характарыстык, якія чалавек набывае або вывучвае падчас сацыялізацыі ў якасці члена пэўнай супольнасці.

**Права на развіццё:** права груп расці ў культурным, палітычным і эканамічным плане такім чынам, каб іх правы чалавека і асноўныя свабоды былі рэалізаваны ў поўнай і прагрэсіўнай меры. Дэкларацыя ААН аб праве на развіццё 1986 года.

**Правы другога пакалення:** правы, якія адлюстроўваліся ў публічных заявах у пачатку XX стагоддзя і ў асноўным уключалі эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы, такія як належны ўзровень жыцця, аховы здароўя, жылля і адукацыі. Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах у асноўным кадыфікуе менавіта гэтыя правы. Паколькі гэты тэрмін прадугледжвае вяршэнства грамадзянскіх і палітычных правоў над эканамічнымі і сацыяльнымі правамі, то ён пастунова выходзіць з ужывання.

**Правы першага пакалення:** правы, якія ў цэлым былі прызнаны як правы чалавека ў XVII–XVIII стагоддзях. Яны ўключаюць усе грамадзянскія і палітычныя правы чалавека, такія як права на ўдзел у галасаванні, права на жыццё і свабоду, а таксама свабоду выказвання меркавання, рэлігіі і сходаў. У асноўным гэтыя правы замацаваны ў Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП). Паколькі гэты тэрмін прадугледжвае вяршэнства грамадзянскіх і палітычных правоў над правамі другога пакалення, г. зн. эканамічнымі і сацыяльнымі правамі, то ён пастунова выходзіць з ужывання.

**Правы трэцяга пакалення:** правы, якія нельга адназначна кваліфікаваць як грамадска-палітычныя ці як сацыяльна-эканамічныя; якія з'явіліся ў другой

палове XX стагоддзя. Яны ўключаюць права на здаровае навакольнае асяроддзе, права на мір, права на развіццё і права на прыродныя рэсурсы. Гл. таксама «Калектыўныя правы».

**Правы чалавека:** правы, якія належаць усім людзям ва ўсім свеце. Правы чалавека з'яўляюцца непадзельнымі, неадчужальнымі і ўсеагульнымі і паважаюць роўнасць і годнасць кожнага чалавека.

**Прафсаюз:** аб'яднанне працоўных пэўнай прафесіі або рамёстваў, якое абараняе агульныя інтарэсы працоўных, напрыклад, у дачыненні да паляпшэння ўмоў працы. Права на стварэнне прафсаюза або ўступленне ў яго, а таксама права на правядзенне калектыўных перамоў у дачыненні да зарплат з'яўляюцца шырока прызнанымі правамі чалавека.

**Рабства:** практыка, заснаваная на адносінах улады і падпарадкавання, у сілу чаго адзін чалавек валодае іншым і можа прымушаць яго працаваць ці аказваць іншыя паслугі на яго карысць. Сучасныя формы рабства ўключаюць гандаль дзецьмі, дзіцячую прастытуцыю, эксплуатацыю дзіцячай працы, выкарыстанне дзяцей ва ўзброеных канфліктах, даўгавую кабалу, гандаль людзьмі, эксплуатацыю прастытуцыі і прымусовай працы.

**Развіццё:** комплексны эканамічны, сацыяльны, культурны і палітычны працэс, які накіраваны на пастаяннае ўдасканаленне дабрабыту ўсяго насельніцтва і ўсіх асоб на аснове іх актыўнага, свабоднага і важкага ўдзелу ў развіцці і ў справядлівым размеркаванні выгод ад гэтага развіцця. Гл. таксама «Права на развіццё».

**Раздзяленне ўлад:** раздзяленне дзяржаўнай улады на розныя галіны такім чынам, каб ні адна з іх не мела абсалютнага кантролю. Звычайна раздзяленне вылучае заканадаўчую галіну, якая прымае законы, выканаўчую галіну, якая выконвае законы; і незалежную судовую галіну, якая назірае за выкананнем законаў.

**Рамачная канвенцыя:** канвенцыя, у якой вызначаюцца прынцыпы і нормы, на якіх будуць заснаваны міжнародныя дзеянні, і ў якой замацоўваецца працэдура вядзення перагавораў наконт больш падрабязных дамоўленасцей, неабходных для вырашэння пэўнага пытання.

**Рамкі правоў чалавека:** узаемазвязаны звод міжнародных і рэгіянальных інструментаў, які актыўна развіваецца; у яго інструментах вызначаюцца правы чалавека і замацоўваюцца механізмы па прасоўванні і абароне гэтых правоў.

**Расізм:** вера ў тое, што характарыстыкі людзей залежаць ад іх этнічнай групы ці племені і што члены іншых груп і плямён («рас») не могуць быць такімі ж добрымі, як члены сваёй, або несправядлівае абыходжанне з членамі іншых «рас» на падставе такога меркавання.

**Ратыфікацыя, ратыфікаваць:** працэс, падчас якога заканадаўчы орган дзяржавы пацвярджае дзеянні ўрада па падпісанні дагавораў; афіцыйная працэдура, у рамках якой дзяржава становіцца звязанай дагаворам пасля яго прыняцця. Пасля ратыфікацыі дзяржава становіцца бокам дагавора.

**Ролевая гульня:** кароткая пастаноўка, разыграная ўдзельнікамі. Людзі бяруць за аснову свой жыццёвы вопыт для ролевай гульні, якая адлюстроўвае пэўную сітуацыю; ролевыя гульні ў большасці выпадкаў заснаваны на імправізацыі. Задача ролевай гульні заключаецца ў тым, каб дазволіць удзельнікам перажыць сітуацыі і знайсці рашэнне праблем у бяспечных умовах.

**Савет Бяспекі ААН (СБ ААН):** адзін з асноўных органаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якому даручана падтрымліваць міжнародны мір і бяспеку. У яго ўваходзяць 5 пастаянных членаў, кожны з якіх мае права вета ў дачыненні да любога рашэння Савета Бяспекі, а таксама 10 непастаянных членаў.

**Савет Еўропы:** заснаваны ў 1949 годзе для абароны і прасоўвання правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права. Сёння яго 47 дзяржаў-членаў ахопліваюць практычна ўвесь еўрапейскі кантынент. Штаб-кватэра знаходзіцца ў Страсбургу.

**Савет па правах чалавека:** міжурадавы орган у сістэме ААН, які складаецца з 47 дзяржаў і адказны за ўмацаванне прасоўвання і абароны правоў чалавека на планеце. Савет быў створаны Генеральнай Асамблеяй ААН у сакавіку 2006 года і замяніў Камісію па правах чалавека. Асноўная задача Савета – разглядаць сітуацыі парушэння правоў чалавека і даваць у гэтай сувязі свае рэкамендацыі.

**Салідарныя правы:** гл. «Калектыўныя правы».

**Сацыяльныя правы:** правы, неабходныя для ўсебаковага ўдзелу ў жыцці грамадства. Сацыяльныя правы гарантуюць Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП) і Еўрапейская сацыяльная хартыя.

**Свабода выказвання меркавання:** свабода выказваць погляды ў друкаваных і іншых СМІ, а таксама атрымліваць і распаўсюджваць ідэі. Тэрмін «свабода выказвання меркавання» часта выкарыстоўваецца ў агульным плане для спасылкі на

артыкулы 19 і 18 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека разам ці паасобку.

**Сімуляцыя:** пашыраная, структураваная ролевая гульня, якая змяшчае ўдзельніка ў незнаёмыя сітуацыі і ролі.

**Слуханні:** працэс, падчас якога зацікаўленыя бакі і любыя іншыя асобы, якія могуць быць закрануты вынікам, маюць магчымасць даць паказанні, задаць пытанні ці зарэгістраваць пярэчанні ў дачыненні да якой-небудзь праблемы. Напрыклад, слуханні можа праводзіць мясцовы або ўрадавы дэпартамент, міжнародны орган або спецыяльна створаная камісія.

**Смяротнае пакаранне:** ухваленае пазбаўленне жыцця дзяржавай у якасці пакарання за злачынства. Еўрапейская канвенцыя аб правах чалавека першапачаткова прадугледжвала магчымасць смяротнага пакарання, аднак цяпер забараняе яго на сваёй тэрыторыі (Пратакол № 6), нават падчас вайны (Пратакол № 13). Большасць краін у свеце ў цяперашні час адмянілі смяротнае пакаранне.

**Спецыяльны дакладчык:** чалавек, выбраны органам у галіне правоў чалавека, такім як Савет па правах чалавека ААН, каб прадставіць даклад па канкрэтнай тэме, напрыклад па тэме ўмоў жылля, дзіцячай прастытуцыі і дзіцячай парнаграфіі, гвалту ў адносінах да жанчын або становішча ў галіне правоў чалавека ў той ці іншай краіне.

**Пазітыўнае дзеянне:** меры, што прымаюцца ўрадам ці прыватнымі прадпрыемствамі, каб кампенсаваць дыскрымінацыю ў мінулым, напрыклад у сферы адукацыі і працы ў дачыненні, напрыклад, жанчын, якія належаць да канкрэтных рас, этнічных груп, рэлігій або маюць інваліднасць. Пазітыўнае дзеянне – гэта адзін са спосабаў даць уразлівым групам роўнасць па сутнасці. Пазітыўнае дзеянне трэба разглядаць як часовую меру да дасягнення роўнасці.

**Пазітыўная дыскрымінацыя:** тэрмін, які мае тое ж значэнне, што і пазітыўнае дзеянне.

**Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый:** установачы дагавор Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Быў аднагалосна прыняты 25 чэрвеня 1945 года. У ім выкладзены правы і абавязкі дзяржаў-членаў, а таксама вызначаюцца органы і працэдуры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Стэрэатып:** вельмі спрошчанае, абагульненае і нярэдка падсвядома прадузятае меркаванне аб людзях ці ідэях, якое можа прыводзіць да забабонаў і дыскрымінацыі. Абагульненне, у рамках якога характарыстыкі, уласцівыя частцы групы, распаўсюджваюцца на ўсю групу.

**Судовая практыка:** юрыдычны тэрмін, які адносіцца да збору спраў і прынцыпаў, вызначаных на падставе гэтых спраў, у кожным канкрэтным судзе, напрыклад судовая практыка Еўрапейскага суда па правах чалавека.

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ):** міжурадавая арганізацыя пад эгідай ААН, якая ажыццяўляе сваю дзейнасць у мэтах падтрымкі аховы здароўя ў маштабах усяго свету.

**Талерантнасць:** гатоўнасць прыняць паводзіны і перакананні, якія адрозніваюцца ад вашых уласных, хоць вы і можаце пры гэтым не згаджацца з імі і не ўхваляць іх. Дэкларацыя аб прынцыпах талерантнасці (ЮНЕСКА 1995 год).

**Трансфармацыя канфлікту:** працэс, дзякуючы якому канфлікты, такія як войны і міжэтнічны і міжрэлігійны гвалт, змяняюцца або трансфармуюцца ў мірныя вынікі. Гэта працяглы працэс, які вырашае глыбінныя прычыны канфлікту, а таксама рэгулюе паводзіны і пазіцыі бакоў-удзельнікаў.

**Трацейскі разбор:** працэс, падчас якога замест звароту ў суд бакі канфлікту просяць трэцюю асобу выслухаць іх аргументы і прыняць рашэнне, якое яны абавязваюцца выканаць.

**Трэнер:** асоба, якая рыхтуе праграмы навучальных мерапрыемстваў, напрыклад дыскусій, навучальных візітаў, прагляду фільмаў і правядзення практыкаванняў на аснове «Компаса», для групы ўдзельнікаў. Пры правядзенні практыкаванняў на аснове «Компаса» трэнер або настаўнік працуе з групай моладзі ў атмасферы дэмакратыі і бярэ на сябе ролю фасілітатара.

**Трэнінг**: працэс набыцця ведаў, навыкаў і перакананняў, неабходных для пэўнай працы або дзейнасці, напрыклад для таго, каб абараняць правы чалавека.

**Удзел:** удзел у грамадскім жыцці супольнасці або грамадства ў цэлым. Перагледжаная Еўрапейская хартыя аб удзеле моладзі ў грамадскім жыцці на мясцовым і рэгіянальным узроўнях – гэта міжнародны палітычны дакумент, закліканы садзейнічаць маладзёжнаму ўдзелу на мясцовым узроўні; прыняты Кангрэсам Савета Еўропы ў 2003 годзе.

**Узаемазалежны:** адносіцца да разумення таго, што выкарыстанне пэўнага права чалавека залежыць ад даступнасці ўсіх іншых правоў. Напрыклад, ваша магчымасць удзельнічаць у кіраванні сваёй краінай напрамую залежыць ад вашага права выказваць сваё

меркаванне, ад вашага стану здароўя, свабоды перамяшчэння і адсутнасці дыскрымінацыі.

**Унутрана перамешчаныя асобы (УПА):** асобы або групы асоб, якія былі вымушаны пакінуць свае дамы або месцы звычайнага пражывання, напрыклад у выніку або каб пазбегнуць наступстваў узброенага канфлікту, сітуацый усеагульнага гвалту, парушэнняў правоў чалавека ці прыродных або тэхнагенных катастроф, і якія не перасякалі міжнародную мяжу.

**Урэгуляванне канфлікту:** дзеянні, якія прымаюцца на працягу кароткага часу для спынення канфлікту з прымяненнем гвалту.

**Усеагульнасць:** прынцып, паводле якога правамі чалавека валодаюць усе людзі ва ўсіх дзяржавах і супольнасцях на свеце.

**Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (УДПЧ):** (Усеагульная дэкларацыя); прынята Генеральнай Асамблеяй 10 снежня 1948 года. Асноўны дакумент ААН, які ўстанаўлівае стандарты і нормы ў галіне правоў чалавека. Усе дзяржавы дамовіліся выконваць УДПЧ. Нягледзячы на тое, што гэта дэкларацыя задумвалася як неабавязвальная, з цягам часу розныя яе палажэнні атрымалі такое шырокае прызнанне, што цяпер яе можна лічыць часткай звычайнага міжнароднага права.

**Устойлівае развіццё:** развіццё, якое суадносіцца з патрэбамі сённяшняга дня, але пры гэтым не падрывае магчымасці будучых пакаленняў задаволіць свае ўласныя патрэбы. Першы раз тэрмін быў выкарыстаны Сусветнай камісіяй па навакольным асяроддзі і развіцці (СКНАР) на пасяджэнні, якое праводзілася па ініцыятыве ААН у 1983 годзе.

**Уступленне ў сілу:** працэс, дзякуючы якому дагавор становіцца ў поўнай меры абавязвальным у дачыненні да тых дзяржаў, якія яго ратыфікавалі. Гэта адбываецца тады, калі дасягаецца мінімальны лік ратыфікацый, прадугледжаны ў дагаворы.

**Факультатыўны пратакол:** дагавор, які ўносіць змены ў іншы дагавор, напрыклад, праз дадатковыя працэдуры або палажэнні. Ён завецца «факультатыўным» таму, што ўрад, які ратыфікаваў першапачатковы дагавор, можа вырашаць, ці ратыфікаваць тыя змены, якія змяшчаюцца ў гэтым пратаколе.

**Фармальная адукацыя:** структураваная сістэма адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі, якая ахоплівае ўзроўні ад дзіцячага сада і пачатковай школы да сярэдняй школы і ўніверсітэта. Як правіла, такая адукацыя ажыццяўляецца ў агульных або прафесійных навучальных установах і завяршаецца выдачай пасведчання аб адукацыі.

**Фасілітатар:** асоба, якая рыхтуе, праводзіць і каардынуе дзейнасць на аснове «Компаса». Фасілітатар – гэта чалавек, які «стварае ўмовы», «дапамагае», заахвочвае іншых у тым, каб навучацца і развіваць свой патэнцыял. Роля фасілітатара заключаецца ў тым, каб ствараць бяспечныя ўмовы, у якіх удзельнікі навучаюцца праз вопыт, даследаванне, абмен. Гэта справа не аднаго чалавека, таму фасілітатар не з'яўляецца лідарам-«экспертам», які дзеліцца ведамі з іншымі. Кожны павінен расці дзякуючы абмену вопытам, як удзельнікі, так і фасілітатары.

**Фашызм:** сістэма кіравання, заснаваная на ідэалогіі нацыянальнай або расавай перавагі і жорсткім кантролі за ўсімі аспектамі палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця. Для гэтай сістэмы характэрны гвалтоўнае падаўленне апазіцыі і крытыкі, кантроль над СМІ, дзяржаўны кантроль над прамысловасцю, гандлем і г. д., а таксама агрэсіўны нацыяналізм і нярэдка расізм.

**Хартыя:** дакумент, у якім выкладаецца набыццё правоў ці прывілеяў.

**Хартыя асноўных правоў:** дагавор, які змяшчае палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя правы грамадзян Еўрапейскага саюза. Ён з'яўляецца абавязковым для дзяржаў – членаў ЕС, калі яны прымяняюць заканадаўства ЕС.

**Ценявая справаздача:** неафіцыйная справаздача, падрыхтаваная органамі або асобамі, якія прадстаўляюць грамадзянскую супольнасць, і накіраваны ў камітэт па маніторынгу дагавора ў галіне правоў чалавека. Такія справаздачы, як правіла, супярэчаць афіцыйным справаздачам аб адпаведнасці ўмовам дагавора і іх выкананні, якія прадстаўляе ўрад у рамках сваіх абавязацельстваў па дагаворы, або дапаўняюць іх.

**Экалагічныя правы:** як правіла, тэрмін выкарыстоўваецца для апісання правоў асоб на бяспечнае, здаровае і экалагічна ўстойлівае навакольнае асяроддзе. Часам выкарыстоўваецца для абазначэння «правоў», якімі можа валодаць само навакольнае асяроддзе, уключаючы правы жывёл, раслін і экасістэм на выжыванне ва ўмовах уплыву чалавечай дзейнасці.

**Эканамічныя правы:** правы, якія звязаны з вытворчасцю, развіццём і кіраваннем матэрыяльнымі выгодамі, неабходнымі для жыцця. Яны абвешчаны ў УДПЧ і гарантуюцца на падставе МПЭСКП і Еўрапейскай сацыяльнай хартыі.

**Эканоміка:** тое, што звязана з фактарамі вытворчасці, развіцця або кіравання матэрыяльным багаццем.

**Юрыдычныя правы:** (іх таксама называюць «законныя правы»); правы, якія замацаваны ў заканадаўстве, якія можна абараняць і па абарону якіх можна звяртацца ў судовыя органы. Тэрмін таксама выкарыстоўваецца для апісання правоў чалавека, звязаных з юрыдычнымі працэсамі, напрыклад права на справядлівы судовы разбор.

**ЮНІСЕФ:** (Дзіцячы фонд Арганізацыі Аб'яднаных Нацый); выступае за абарону правоў дзяцей, садзейнічанне задавальненню іх асноўных патрэб і пашырэнне іх магчымасцей для рэалізацыі свайго патэнцыялу ў поўнай меры. ЮНІСЕФ кіруецца Канвенцыяй аб правах дзіцяці і імкнецца да таго, каб яна стала міжнародным стандартам паводзін у адносінах да дзяцей.